НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

*Д. А. Крывашэй*

# ДЗЯРЖАЎНАЯ КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БЕЛАРУСІ
## (1991–2010 гг.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
«Беларуская навука»
2014

УДК 008(476)“1991/2010”
ББК 71.4(4Беи)
К85

Р э ц э н з е н т ы:

доктар гістарычных навук, прафесар С. Я. Сяльверстава,
доктар гістарычных навук, дацэнт В. Ф. Голубеў,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт В. М. Папко,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт М. У. Глеб,
кандыдат гістарычных навук С. А. Траццяк

*Работа падрыхтавана ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» (навуковы кіраўнік праграмы – доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя). Заданне «08» – «Рэспубліка Беларусь у сістэмных пераўтварэннях: гістарычны вопыт і сучаснасць» (навуковы кіраўнік – доктар палітычных навук, прафесар Л. Я. Землякоў)*

**Крывашэй, Д. А.**

К85 Дзяржаўная культурная палітыка ў Беларусі (1991–2010 гг.) / Д. А. Крывашэй. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 521 с.

ISBN 978-985-08-1761-7.

У даследаванні разгледжаны агульныя прынцыпы рэалізацыі культурнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь за дваццацігадовы перыяд (1991–2010 гг.). Аўтар спыняецца на асноўных праблемах, якія ўзнікалі пры ўзаемадзеянні дзяржаўнай палітыкі і культуры, аналізуе сацыяльна-эканамічныя фактары, якія аказвалі ўплыў на фарміраванне культурнай палітыкі. Абагульнена практыка дзяржавы па падтрымцы культуры і мастацтва, захаванні культурнай спадчыны, развіцці індустрый культуры і культурнага супрацоўніцтва, рэалізацыі культурных правоў жыхароў.

Кніга будзе цікава як спецыялістам па кіраванні ў сацыяльна-гуманітарнай сферы, так і навукоўцам, студэнтам, усім, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі.

**УДК 008(476)“1991/2010”**
**ББК 71.4(4Беи)**

**ISBN 978-985-08-1761-7**

© Крывашэй Д. А., 2014
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2014

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УВОДЗІНЫ

У наш час істотна ўзраслі значэнне і важнасць культуры як неад’емнай часткі сапраўднага прагрэсу чалавека і грамадства. Культура стала разглядацца як індустрыя, якая стварае не толькі аб’екты культуры, але і рабочыя месцы, дапамагае розным сацыяльным групам камунікаваць паміж сабой, а чалавеку – знаходзіць сваю ідэнтычнасць. Яна адыгрывае вялікую ролю пры сацыяльнай інтэграцыі, аказвае ўздзеянне на фарміраванне сацыяльнага асяроддзя. Культура любой краіны ў постіндустрыяльную эпоху з’яўляецца неад’емнай часткай нацыянальнай эканомікі [894, с. 9].

Перад дзяржавамі паўстала пытанне аб выпрацоўцы і правядзенні эфектыўнай культурнай палітыкі, якая б адпавядала мэтам усяго грамадства і міжнароднай супольнасці. Практычная рэалізацыя сучасных прынцыпаў і мэт дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры ў Рэспубліцы Беларусь сутыкаецца з шэрагам цяжкасцей, што патрабуе іх новага вывучэння, усведамлення ролі дзяржавы ў рэгуляванні сацыякультурных працэсаў, меж і спосабаў яе ўздзеяння на развіццё культуры.

Пасля набыцця Рэспублікай Беларусь дзяржаўнага суверэнітэту пачалі фарміравацца новая мадэль узаемадзеяння культуры і ўлады, новыя формы падтрымкі мастацтва. Аднак аказалася немагчыма адразу адмовіцца ад звыклых стэрэатыпаў у кіраванні сферай культуры, якая мела вялікую матэрыяльную залежнасць ад дзяржавы.

Пры гэтым беларускае мастацтва за кароткі перыяд прайшло праз даволі складаныя трансфармацыйныя працэсы. Набыццё незалежнасці абумовіла зварот беларускіх дзеячаў культуры да новых тэм у творчасці, дазволіла з’явіцца вялікай колькасці мастацкіх напрамкаў і стыляў. Беларуская культура атрымала больш магчымасцей для ўдзелу ў сусветных культурных працэсах, яно стала моцным фактарам для фарміравання нацыянальнай ідэі і самасвядомасці, павагі да айчыннай гісторыі.

Актуальнасць дадзенага даследавання абумоўлена патрабаваннямі гістарычнай навукі ў комплексным даследаванні культурных працэсаў з выкарыстаннем міждысцыплінарнага падыходу, выяўленні пазітыўнага і негатыўнага вопыту развіцця ўзаемаадносін дзяржавы і культуры ў 1991–2010 гг.

Мэтай работы з’яўляецца комплексны аналіз сферы культуры Беларусі ў 1991–2010 гг. як аб’екта ўздзеяння з боку розных структур улады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да галоўных задач адносяцца:

характарыстыка асноўных механізмаў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры;

аналіз месца і ролі грамадскіх арганізацый у выпрацоўцы і рэалізацыі культурнай палітыкі;

асвятленне шляхоў забеспячэння рэалізацыі культурных правоў жыхароў.

У якасці храналагічных рамак даследавання вызначаны 1991–2010 гг. Яны ахопліваюць перыяд ад юрыдычнага афармлення незалежнасці Рэспублікі Беларусь да заканчэння выканання трэцяга пяцігадовага плана сацыяльна-эканамічнага развіцця дзяржавы.

У дадзеным даследаванні пад тэрмінам «дзяржаўная культурная палітыка» разумеецца комплекс мер, якія здзяйсняе дзяржава ва ўзаемадзеянні з грамадскімі арганізацыямі па забеспячэнні захавання, развіцця і распаўсюджання культуры, духоўнага, маральнага, эстэтычнага выхавання грамадзян. Гэта вызначэнне сфармулявана, зыходзячы з артыкула 5 закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» рэдакцыі 1991 г. [24].

На Стакгольмскай канферэнцыі 1998 г. ЮНЕСКА заклікала паставіць культурную палітыку ў цэнтр стратэгіі развіцця. У рэкамендацыях краінам-удзельніцам выказвалася прапанова для паспяховай інтэграцыі культурнай палітыкі ў палітыку развіцця звярнуць асаблівую ўвагу на тыя аспекты, якія ў культурнай палітыцы могуць быць агульнымі з аспектамі сацыяльнай і эканамічнай палітыкі [370, с. 12].

Праведзены аналіз нарматыўных прававых актаў дазволіў нам прапанаваць сваё вызначэнне тэрміна «работнік сферы культуры», які аб’ядноўвае работнікаў культуры, творчых работнікаў, іншых фізічных асоб, якія займаюцца дзейнасцю ў сферы культуры ці знаходзяцца ў працоўных адносінах з арганізацыямі культуры. Работнікі сферы культуры выконваюць шмат разнастайных функцый: інфармацыйную, адукацыйную, культурную, эстэтычную, камунікацыйную, функцыю сацыяльнай памяці і інш. На іх ускладзена шматфункцыянальная місія: фарміраванне каштоўнасных арыентацый, духоўнае ўзбагачэнне, выхаванне і сацыяльная адаптацыя.

Вывучэнне гістарыяграфіі і крыніц даследавання, метадалагічных падыходаў дазволілі выпрацаваць структуру працы, якая найбольш поўна дазваляе рэалізаваць пастаўленую мэту даследавання.

Па-першае, асноўная ўвага нададзена палітыцы органаў дзяржаўнай улады і кіравання ў галіне культуры. У асобнай главе разгледжаны механізмы рэалізацыі культурнай палітыкі (палітыка-прававы, фінансава-эканамічны, кадравы).

Па-другое, як асобны суб’ект культурнай дзейнасці выдзелены грамадскія арганізацыі. На прыкладзе дзейнасці творчых саюзаў, таварыстваў і асацыяцый нацыянальна-культурнай, культурнай і мастацкай накіраванасці разглядаецца фарміраванне ў Беларусі механізма мэтанакіраванага і эфектыўнага ўдзелу грамадскіх структур у працэсах прыняцця рашэнняў у галіне культуры, здзяйснення грамадскага кантролю над сферай культурнага жыцця нашай краіны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па-трэцяе, як асобная праблема, якая характарызуе стан рэалізацыі асноўных задач дзяржавы ў сферы культуры, вылучаны ўдзел асобных груп карыстальнікаў і спажыўцоў культурных даброт і паслуг, грамадства ў культурным жыцці.

Па-чацвёртае, значная ўвага нададзена развіццю дзяржаўных і недзяржаўных устаноў культуры, асобных галін культуры, якія скампанаваны ў дзве групы – індустрыі культуры (мастацкая літаратура, выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное і манументальнае мастацтва, тэатральная творчасць, музычнае мастацтва, кінавытворчасць і кінапракат, сродкі масавай інфармацыі) і гісторыка-культурная спадчына (мерапрыемствы па ахове спадчыны, бібліятэкі, музеі, архівы, турызм). Даследаванне дазволіла прасачыць змену іх стану, месца і ролі ў пастаўцы культурных тавараў і паслуг, забеспячэнні доступу да культуры, тэндэнцый развіцця дзяржаўнай палітыкі і яе ўплыву на развіццё індустрый культуры, прыватнай ініцыятывы.

У якасці асобнага аспекту дзяржаўнай культурнай палітыкі вызначана знешняя культурная палітыка. Прааналізавана яе развіццё як на двухбаковым, так і на шматбаковым і рэгіянальным узроўнях.

Спадзяемся, што работа зверне ўвагу беларускага грамадства на праблемы культуры, будзе садзейнічаць навучанню менеджараў і адміністратараў культуры, прадстаўнікоў недзяржаўнага сектара і сферы індустрый культуры. Даследаванне паспрыяе пошуку новых падыходаў да рэалізацыі дзяржаўнай культурнай палітыкі ў Беларусі, заснаваных на супрацоўніцтве дзяржавы, прыватнага сектара і работнікаў сферы культуры. Такая палітыка будзе мець пазітыўнае ўздзеянне на культурную сферу ў цэлым і будзе садзейнічаць фарміраванню развітай грамадзянскай супольнасці ў прыватнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глава 1

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА АСЭНСАВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

## 1.1. Культурная палітыка як метадалагічная праблема

Вызначэнне культурнай палітыкі як «комплексу аперацыйных прынцыпаў, адміністратыўных і фінансавых відаў дзейнасці і працэдур, якія забяспечваюць аснову дзеянняў дзяржавы ў галіне культуры», было дадзена ЮНЕСКА ў 1968 г. У гэтым кантэксце рэалізацыя культурнай палітыкі ўяўляе «ўсю суму сумленных і абдуманых дзеянняў (ці адсутнасць дзеянняў) у грамадстве, якія накіраваны на дасягненне пэўных культурных мэт праз аптымальнае выкарыстанне ўсіх фізічных і духоўных рэсурсаў, якія мае ў сваім распараджэнні грамадства ў дадзены час» [870, с. 3].

Яшчэ ў 1970 г. на сусветнай канферэнцыі міністраў культуры ў Венецыі пад эгідай ЮНЕСКА была звернута ўвага на тое, што «культурная палітыка стаіць перад дзвюма асноўнымі задачамі: задачай канструктыўнага, творчага выкарыстання новых тэхнічных магчымасцей, а таксама змагання з негатыўнымі наступствамі тэхнічнага прагрэсу і празмернай камерцыялізацыяй» [895, с. 18].

Былі вызначаны чатыры пастулаты, накіраваныя на арганізацыю культурна-асветнага жыцця:

ускладанне на дзяржаўную ўладу адказнасці за справы культуры, ахову існуючых культурных вартасцей і актыўнае стварэнне ўмоў для з'яўлення новых стымулаў культурнай дзейнасці;

ураўнанне ў правах культуры з адукацыяй і навукай як абшарамі грамадскай і дзяржаўнай планавай дзейнасці;

прымяненне сістэматычных планаў і перспектыўных прагнозаў развіцця культурнай палітыкі, культуры;

сувязь прадстаўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі з навукова-даследчымі асяродкамі.

Гэтыя чатыры пастулаты прывялі да прыняцця агульнага тэзісу аб тым, што культура з'яўляецца не толькі ўпрыгожаннем, але і інтэгральнай часткай грамадскага жыцця, а культурная палітыка павінна разглядацца ў шырокім кантэксце дзяржаўнай і сацыяльнай палітыкі ўвогуле, незалежна ад прынятых адміністрацыйных рамак.

Як любая палітыка, культурная палітыка – гэта дзейнасць, якая забяспечвае стабілізацыю дзяржаўнай улады і развіццё грамадства. «Палітыка накіроўвае дзеянне на дасягненне мэты ці выкананне задачы. Яна тлумачыць, якім чынам павінны быць дасягнуты мэты, вызначаючы вехі, у адпаведнасці з якімі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходна рухацца. Яна прызначана для захавання пастаянства мэтаў, а таксама для таго, каб пазбегнуць прыняцця недальнабачных рашэнняў, заснаваных на неадкладных патрабаваннях» [890, с. 158]. Спецыфіка ж культурнай палітыкі ў тым, што «культура з'яўляецца не толькі аб'ектам, але і суб'ектам гэтай палітыкі – перадусім таму, што з'яўляецца сістэмай, якая самаразвіваецца і самарэгулюецца, а таксама таму, што якім бы ні быў суб'ект прыняцця рашэнняў у сферы культурнай палітыкі, ён знаходзіцца ў арэале пэўнай культуры, з'яўляецца яе прадуктам. Па сутнасці, размова ідзе аб дыялектыцы кіравання і самаарганізацыі ў рамках сістэмы сацыяльнай рэгуляцыі культуры» [414, с. 163].

Ажыўленне культурнай дзейнасці садзейнічае сацыяльнаму і эканамічнаму развіццю і росквіту. Справядлівасць гэтага тэзісу пацвердзілі праведзеныя даследаванні ў шэрагу краін. Атрыманыя вывады знайшлі сваё адлюстраванне ў справаздачы ЮНЕСКА «Наша творчая разнастайнасць» (1996) і Савета Еўропы «Імкненне да цэласнасці» (1997). Названыя дакументы паклалі аснову распрацоўцы новай канцэпцыі культуры як сродку развіцця грамадства.

На Стакгольмскай канферэнцыі 1998 г. ЮНЕСКА заклікала паставіць культурную палітыку ў цэнтр стратэгіі развіцця. У рэкамендацыях краінам-удзельніцам прапанавалася для паспяховай інтэграцыі культурнай палітыкі ў палітыку развіцця звярнуць асаблівую ўвагу на тыя аспекты, якія ў культурнай палітыцы могуць быць агульнымі з аспектамі сацыяльнай і эканамічнай палітыкі [370, с. 12]. Такім чынам, адбылося замацаванне змены падыходу да культурнай палітыкі са спажывецкага («культура для ўсіх», «культура для кожнага») да заснаванага на разуменні ролі культуры як сродку развіцця грамадства («культура – крыніца чалавечага развіцця»).

Галоўным тэарэтыкам сучаснага разумення культурнай палітыкі з'яўляецца Т. Беннетт. Ён надае вялікую ўвагу праблеме суб'екта і мэты культурных даследаванняў. Вучоны адзначае адсутнасць дакладна вызначанай вобласці даследаванняў культурнай палітыкі з узгодненымі парадыгмамі даследавання і метадалогіяй. Яна аб'ядноўвае работы рознага дысцыплінарнага паходжання – кіраванне мастацкай сферай, даследаванні камунікацый, гарадскія даследаванні (urban studies), культуралагічныя даследаванні (cultural studies), эканоміку куль-туры – і яшчэ не падрыхтаваная да вызначэння, як гэтыя розныя часткі могуць быць аб'яднаны ў адзінае цэлае [866, с. 6].

Да гэтага недахопу выразнасці на канцэптуальным узроўні дадаецца недахоп выразнасці на ўзроўні палітыкі. Калі месца эканамічнай і сацыяльнай палітыкі дакладна вызначана ў праграмах урадаў, то месца культурнай палітыкі часта ясна не акрэсліваецца. Яна існуе распылена паміж рознымі «партфелямі» (мастацтва, камунікацыі, турызму). Як вынік гэтага і самі даследаванні распылены і дрэнна скаардынаваны.

Т. Беннетт прапаноўвае звесці культурную палітыку да дзейнасці тых устаноў і арганізацый, якія складаюць культурны сектар, якія ўцягнуты ў вытворчасць і размеркаванне культурных тавараў і паслуг, а таксама кіраванне культурнымі рэсурсамі. Дадзенае вызначэнне ахоплівае як грамадска-фінасу-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

емыя ўстановы (бібліятэкі, мастацкія галерэі, музеі, паркі, грамадскае радыё і тэлебачанне), так і прыватныя (камерцыйныя сродкі інфармацыі, выдавецтвы). Яно таксама ўключае як аднолькава важныя высокую і папулярную культуру, бо іх месца ўзгоднена ў межах афіцыйнай іерархіі мастацтваў і часта адыгрывае істотную ролю ў актуальных культурных працэсах і атрыманых выніках.

Т. Беннетт выдзяляе чатыры катэгорыі культурнай палітыкі:

палітыка ўрада як на нацыянальным, так і на мясцовым узроўнях (заканадаўства ў галіне культуры, фінансаванне, падатковая палітыка, цэнзура, субсідыі, меры абароны, міжнародныя абавязкі);

развіццё дзяржаўных і недзяржаўных устаноў культуры, асобных галін культуры (даследаванне іх стану і ўплыву дзяржаўнай палітыкі, пастаўка культурных тавараў і паслуг, доступ да ўстаноў культуры, уплыў стымулюючых урадавых мер на развіццё індустрый культуры, уплыў падатковых ільгот на развіццё прыватнай ініцыятывы, уключэнне асобных абшчын у развіццё камунікацый);

трэці сектар, ці грамадзянская супольнасць (няўрадавыя арганізацыі, палітычныя партыі, таварыствы і асацыяцыі, аб’яднанні па інтарэсах, узросце, поле, нацыянальнай прыналежнасці, рэлігіі і да т. п., якія непасрэдна ўплываюць на працэс палітыкі);

асобныя групы карыстальнікаў, удзельнікаў і спажыўцоў культурных тавараў і паслугаў (даследаванне спажыўцоў, гледачоў, грамадства і асобных груп, удзелу ў культурным жыцці, якасных і каштоўнасных арыенціраў).

Даследчык звязвае культурную палітыку з інтарэсамі развіцця: развіццём індустрый культуры, культурным развіццём супольнасцей, развіццём культурных і грамадзянскіх правоў, развіццём культурнай разнастайнасці, узаемаадносінамі культуры і гарадскога развіцця, развіццём культурнай тоеснасці. Ён звяртае ўвагу на тое, што за гэтай сувяззю культуры і развіцця ляжыць зацікаўленасць той роляй, якую палітыка можа адыгрываць у развіцці культуры – у сэнсе шляхоў жыцця, г. зн. каштоўнасцей, звычаяў, традыцый, значэння пэўнай грамадскай групы ці людзей.

Праблемам вызначэння зместу культурнай палітыкі прысвечаны даследаванні расійскага вучонага А. Фліера. Ён звяртае ўвагу на тое, што культурная палітыка мае два ўзроўні стратэгіі і практыкі ўпраўленчай дзейнасці: уласна культурную палітыку і аператыўнае кіраванне бягучымі культуратворчымі працэсамі. Культурная палітыка, па вызначэнні вучонага, сукупнасць абгрунтаваных навуковых поглядаў і мерапрыемстваў па ўсебаковай сацыяльна-культурнай мадэрнізацыі грамадства, структурнай рэформе ўсёй сістэмы інстытутаў культуры, аптымізацыі спалучэння дзяржаўных і грамадскіх кампанентаў ў сацыяльна-культурным жыцці, навуковым і адукацыйным забеспячэнні наступнага рэгулявання сацыяльна-культурных працэсаў, мэтанакіраванай падрыхтоўкі кадраў. Галоўным жа з’яўляецца «асэнсаваная карэкціроўка агульнага зместу айчыннай культуры» [807, с. 4].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аператыўнае кіраванне бягучымі сацыяльна-культурнымі працэсамі А. Фліер разглядае як комплекс практычных дзеянняў па аднаўленні актуальных культурных форм у рамках наяўных фінансавых і арганізацыйных сродкаў [807, с. 4].

Развіваючы гэту думку, А. Мамедава заўважае, што «культурная палітыка дзяржавы забяспечвае інтарэсы існуючай улады ў сферы культуры і выкарыстанне рэгулятыўнага патэнцыялу культуры ў інтарэсах суб’екта гэтай палітыкі». Яна выдзяляе тры ўзроўні палітыкі ў сферы культуры – ідэалогія, тэхналогія і арганізацыя гэтай палітыкі. Першы ўключае ў сябе вызначэнне меж ахопу культурнай дзейнасці, суб’екта палітыкі ў дадзенай сферы, выпрацоўку на гэтай аснове стратэгіі і тактыкі. Тэхналогіі ахопліваюць спосабы, формы, механізмы рэалізацыі сфармуляваных мэт, «якія ўласна і з’яўляюцца зместам культурнай палітыкі». Трэці ўзровень прадстаўляе сам працэс здзяйснення пазначаных мэт з дапамогай пэўнага інструментарыю – арганізацыйнага, кадравага, фінансавага і г. д. [414, с. 167].

Ключавымі ў прыведзеным вызначэнні падаюцца тры моманты, з якіх складаецца культурная палітыка: мэты дзяржавы, прынцыпы рэалізацыі, адміністрацыйныя і эканамічныя магчымасці.

Па меркаванні Э. Арловай, структура дзяржаўнай культурнай палітыкі ў сучасных умовах уключае ў сябе наступныя віды дзейнасці:

«вызначэнне стратэгічных і тактычных напрамкаў культурных змен, якія садзейнічаюць мадэрнізацыі грамадства;

выдзяленне на гэтай базе прыярытэтных праблем, якія падлягаюць рашэнню ў спецыялізаваных сферах культуры, вызначэнне адпаведных кампанентаў і арганізацыйных форм;

змяненне механізмаў прыняцця культурна-палітычных рашэнняў з устанаўленнем пастаяннай сувязі паміж трыма асноўнымі суб’ектамі культурнай палітыкі – суб’ектамі кіравання, экспертамі-спецыялістамі і грамадскасцю» [625, с. 19].

Адной з асноўных форм рэалізацыі культурнай палітыкі з’яўляецца дзяржаўнае кіраванне. «У выпадку з кіраўнічым уздзеяннем на культуру размова ідзе аб дзейнасці дзяржавы па забеспячэнні ўнутранага парадку ў культуры, якім для яе з’яўляецца самаарганізацыя», – заўважае А. Мамедава [414, с. 167]. У функцыі дзяржаўнай адміністрацыі ўваходзяць: рэгламентацыйна-ўпарадкавальная і арганізатарская – выканаўчая [881, с. 7].

Пры гэтым уся сістэма кіравання ў сферы культуры павінна быць арыентавана на ўрэгуляванне разнастайных суб’ектна-аб’ектных адносін шляхам выкарыстання пэўных механізмаў рэгуляцыі грамадска-культурнай дзейнасці адпаведна з навукова распрацаванымі мэтамі і задачамі культурнай палітыкі. Спецыфічнасць кіравання культурнымі працэсамі ў тым, што тут асноўная ўвага надаецца канкрэтным механізмам рэгулявання культурнай дзейнасці ў адпаведнасці з нормамі і прынцыпамі, мэтамі і задачамі, якія сфарміраваны на ўзроўні ідэалогіі культурнай палітыкі [285, с. 5].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Арнольдаў разглядае культурную палітыку зусім з іншага ракурсу. Па-першае, яго цікавіць механізм кіраўніцтва сацыяльнымі інстытутамі культуры, змест культурнай палітыкі і сучасныя падыходы да яе вывучэння. Спалучэнне такіх розных па сваім падыходзе поглядаў на культурную палітыку дазваляе больш поўна і змястоўна разглядзець ролю дзяржавы ў развіцці і падтрымцы мастацтва на сучасным этапе. Ён заўважае два аспекты дзейнасці – эканамічны і сацыяльны, прычым апошні з іх адыгрывае галоўную ролю [69, с. 200].

В. Жыдкоў і К. Сакалоў лічаць, што «культурная палітыка – не лакальная дзейнасць таго ці іншага ведамства, а сумесная дзейнасць усіх маючых дачыненне да культуры структур па здзяйсненні нейкай адзінай, узаемазвязанай ў сваіх частках агульнадзяржаўнай культурнай палітыкі» [233, с. 580].

Г. Маеўскі карыстаецца інстытуцыйным падыходам да вызначэння культурнай палітыкі і разглядае яе як дзяржаўную культурную палітыку. Па меркаванні аўтара, «у адрозненні ад савецкага часу сучаснай культурнай палітыцы не хапае цэльнасці, месца ў выразнай дзяржаўнай ідэалогіі, фінансавання, дакладных унутраных і знешніх прыярытэтаў. <...> Эфектыўнасць культурнай палітыкі, якая не мае дакладнай гуманістычнай і дзяржаўнай аксеалогіі, выклікае сумненне» [397, с. 87].

Нягледзячы на разнастайнасць поглядаў на праблему акрэслення зместу культурнай палітыкі, мы можам вызначыць асноўныя механізмы яе здзяйснення: палітыка-прававы, адміністрацыйны (арганізацыйна-структурны), фінансава-эканамічны, кадравы.

Магутныя матэрыяльныя і фінансавыя рэсурсы, заканадаўчыя акты, арганізацыйна-ўпраўленчыя механізмы мае дзяржава як асноўны суб’ект культурнай палітыкі, які праз свае органы рэгулюе працэсы функцыянавання і развіцця культуры. Дзяржава мае задачу ўзгаднення інтарэсаў усіх суб’ектаў культурнага жыцця, у першую чаргу ўсіх творцаў і астатняй супольнасці. Знойдзены кампраміс увасабляецца ў мэтах культурнай палітыкі, якія рэалізуюцца праз дзяржаўныя адміністрацыйныя органы сумесна з іншымі зацікаўленымі структурамі коштам дзяржаўных сродкаў (і з магчымасцю далучэння іншых крыніц фінансавання). Ад таго, наколькі дзяржава здолее рашыць гэтую нялёгкую задачу, залежыць эфектыўнасць яе культурнай палітыкі.

Неабходна заўважыць, што падыходы вучоных, якія займаюцца даследаваннем культурнай палітыкі, вельмі блізкія. Яны дакладна акрэсліваюць суб’екты культурнай палітыкі і гавораць аб механізмах актыўнай дзейнасці дзяржаўнай улады адносна сацыяльных інстытутаў і суб’ектаў культуры. Пры гэтым галоўным з’яўляецца пошук пэўнага набору ўмоў, меж і прыярытэтаў у сферы культуры з мэтай арганізацыі працэсаў адбору і трансляцыі культурных каштоўнасцей для дасягнення пэўных мэт. Такі падыход мае інструментальную накіраванасць, яскрава падкрэслівае залежнасць палітыкі і культуры, уздымае праблему больш шырокай трактоўкі суб’екта і аб’екта культурнай палітыкі. У рамках дадзенага падыходу «прынцыповая каштоўнасць культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вызначаецца яе здольнасцю служыць разнастайным палітычным мэтам і стратэгіям, якія накіраваны на грамадскае развіццё ці рашэнне сацыяльных праблем» [420, с. 128]. Разам з тым развіццё дадзенай інструментальнай канцэпцыі прывяло да ўзнікнення ў грамадстве страхаў, што «культура і мастацтва пераўтворацца ва ўтылітарныя інструменты, якія пастаўлены на службу палітычным мэтам» [420, с. 128].

Канцэптуальныя распрацоўкі тыпаў і мадэляў культурнай палітыкі замежнымі вучонымі праводзяцца па розных прынцыпах: рэгіянальным (з улікам узроўню сацыяльна-эканамічных сістэм і да т. п.); у залежнасці ад мэт і метадаў рэалізацыі палітыкі ў галіне культуры; ступені яе цэнтралізацыі ці дэцэнтралізацыі і г. д. Тэарэтыкі і практыкі культурнай палітыкі па-рознаму падыходзяць да вызначэння мэт культурнай палітыкі, механізмаў яе рэалізацыі і вынікаў.

Тэрмін «культурная палітыка» таксама, як і тэрміны «культура» і «палітыка», з'яўляецца шматзначным. На той змест, які ўкладаюць у гэты тэрмін у розных краінах, наносяць свой адбітак гістарычныя традыцыі станаўлення дзяржаўнасці, традыцыі ўзаемаадносін дзяржавы і сферы культуры, сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства, дэмакратычныя традыцыі, месца і роля пэўнай нацыянальнай культуры ў рэгіёне і свеце.

Не проста дадзены тэрмін уваходзіў у жыццё краін былога сацыялістычнага лагера. У пачатку 1990-х гг. падазрона адносіліся да ўсякага роду планавання, якое вельмі нагадвала перыяд планавай гаспадаркі, і нават ставілі пад сумненне поспех якой-небудзь культурнай палітыкі, спадзеючыся ў першую чаргу на рынкавыя рашэнні і фонды. Аднак, нягледзячы на новыя магчымасці свабоды творчасці і перамяшчэння культурных вартасцей, вельмі хутка пачалі з'яўляцца перашкоды і цяжкасці. Фундаментальныя змены закранулі ўсе бакі грамадскіх адносін: палітычную сістэму, эканамічную сферу, спосаб і ўзровень жыцця грамадзян, нацыянальныя адносіны, а таксама непасрэдна псіхалогію асобы. У такой сітуацыі была заканамернай і неабходнай трансфармацыя ў сферы культуры.

Бум на фармальную выпрацоўку дакументаў па культурнай палітыцы прыпадае на другую палову 1990-х гг. Хоць ён і не датычыць у роўнай ступені ўсіх посткамуністычных краін. Напрыклад, Венгрыя і Славенія да 2004 г. не мелі дакумента, які б акрэсліваў абавязкі дзяржавы адносна культуры, дзяліў адказнасць паміж цэнтрам, уладамі рэгіёнаў і трэцім сектарам і да т. п. Палітычныя эліты Венгрыі заблыталіся ў вызначэнні таго, што называецца грамадскім кантактам ці, іншымі словамі, зборам абавязкаў дзяржавы адносна грамадства ў галіне культуры. У гэты перыяд з'явілася шмат прававых дакументаў, якія фрагментарна ўпарадкоўвалі пэўныя сферы культурнай палітыкі.

Разам з гэтым можна адзначыць адно істотнае падабенства ў падыходах. Культурная палітыка разглядаецца з пазіцый этатызму. Вядучая роля застаецца за дзяржавай як асноўным суб'ектам. Адрозненні заўважаюцца ў вызначэнні



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значнасці месца і ролі дзяржавы, маштабах дзяржаўнай адказнасці за сферу культуры, у вызначэнні яе суб'ектаў і аб'ектаў.

Паняцце культурнай палітыкі ў нацыянальных дакладах па культуры, падрыхтаваных для Савета Еўропы, падаецца праз апісанне існуючай сістэмы механізмаў і сродкаў практычнай яе рэалізацыі. У сувязі з гэтым само паняцце за рэдкім выключэннем застаецца не сфармуляваным.

Прывядзём найбольш характэрныя трактоўкі.

*Швецыя.* Культурная палітыка як сістэма заканадаўчых і фінансавых мер, якія каардынуюць культурнае развіццё ў краіне, якое ахоплівае ўсе слаі грамадства і адбываецца ў розных абласцях культуры [885].

*Расійская Федэрацыя.* Дзяржаўная культурная палітыка (палітыка дзяржавы ў галіне культурнага развіцця) – сукупнасць прынцыпаў і нормаў, якімі кіруецца дзяржава ў сваёй дзейнасці па захаванні, развіцці і распаўсюджанні культуры, а таксама сама дзейнасць дзяржавы ў галіне культуры [627, арт. 3].

*Аўстрыя.* Культурная палітыка – узаемадзеянне, супрацоўніцтва паміж дзяржаўным і прыватным сектарамі, правінцыямі і муніцыпалітэтамі, незалежнымі грамадскімі арганізацыямі з мэтай аказання падтрымкі, стварэння канкурэнцыі і павышэння канкурэнцыі галіны культуры, якая арыентавана на аказанне паслуг насельніцтву [370, с. 168].

*Фінляндыя.* Культурная палітыка як апасродкаваны ўдзел дзяржавы ў кіраванні культурай пры шырокім удзеле грамадскіх арганізацый у выпрацоўцы рашэнняў пры захаванні дзяржаўнай уласнасці і дзяржаўнага фінансавання і адсутнасцю яскрава акрэсленай ролі рэгіёнаў [370, с. 204–205].

*Харватыя.* Культурная палітыка – сукупнасць рэгулюючых прынцыпаў, мэт і інструментаў, якія выкарыстоўваюцца ў культурнай сферы, а таксама вынікі іх прымянення [871, с. 19].

Нягледзячы на такую разнастайнасць, у прыведзеных прыкладах заўважаецца значнае падабенства канцэптуальных падыходаў. У першую чаргу неабходна канстатаваць, што ў змест паняцця кожная краіна закладвае пэўны комплекс мэт дзяржавы, накіраваных на сферу культуры. Адначасова акрэсліваюцца метады іх рэалізацыі (менавіта ў іх канкрэтызацыі назіраецца найбольшае разыходжанне) шляхам вызначэння кампетэнцыі суб'ектаў і праваднікоў культурнай палітыкі, акрэслення паняццяў «культура» і «культурнае жыццё» як аб'ектаў рэгулявання, а таксама вызначэння механізмаў рэалізацыі культурнай палітыкі.

Паняцце «культурная палітыка» ў заканадаўчай базе Беларусі ў вывучаемы перыяд заставалася не сфармуляваным. Яно падавалася праз апісанне існуючай сістэмы механізмаў і сродкаў практычнай яе рэалізацыі. Так, Закон «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» 1991 г. [24] вызначаў абавязкі дзяржавы ў галіне культуры праз ўзаемадзеянне дзяржавы з грамадскімі арганізацыямі з мэтай забеспячэння развіцця культуры, духоўнага, маральнага, эстэтычнага выхавання грамадзян (арт. 5). Асноўнымі механізмамі называліся: арганізацыйна-прававы, эканамічны, кадравы, навукова-прагнастычны. Больш падра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бязны пералік кампетэнцый дзяржавы ў галіне культуры прыводзіўся ў артыкуле 7. У новай рэдакцыі закона 2004 г. адзначаецца: «дзяржаўная палітыка ў галіне культуры – комплекс мераў, якія прымаюцца дзяржаўнымі органамі Рэспублікі Беларусь па захаванню, развіццю і распаўсюджанню культуры, арганізацыйнаму, прававому, фінансаваму, матэрыяльна-тэхнічнаму, кадраваму, інфармацыйнаму і іншаму забеспячэнню культурнай дзейнасці» (арт. 1.4) [46].

Як можна заўважыць, у змест паняцця закладзены пэўны комплекс мэт дзяржавы, накіраваных на сферу культуры. За час існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь адбыліся пэўныя змены ў вызначэнні асноўных стратэгічных мэт культурнай палітыкі. У першую чаргу гэта абумоўлена іх частковай ці поўнай рэалізацыяй, палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі зменамі. У прэамбуле рэдакцыі Закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» 1991 г. вялася гаворка аб «рэалізацыі суверэнных правоў Рэспублікі Беларусь у галіне культуры; рэалізацыі прынцыпаў ідэалагічнай і палітычнай незалежнасці культуры ад грамадска-палітычных структур; стварэнні прававых умоў для свабоднага самаразвіцця культурных працэсаў; забеспячэнні матэрыяльных і фінансавых гарантый развіцця культуры і сацыяльнай абароне работнікаў культуры ва ўмовах рыначных адносін».

Мэты, якія акрэслівае новая рэдакцыя Закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» 2004 г., больш адпавядаюць патрабаванням, выпрацаваным ЮНЕСКА. У арт. 10 сярод асноўных мэт дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры названы: забеспячэнне і абарона канстытуцыйнага права кожнага на ўдзел у культурным жыцці; устанаўленне свабоды мастацкай творчасці і іншай творчай дзейнасці; садзейнічанне захаванню, развіццю і распаўсюджанню культуры на карысць інтарэсаў чалавека і грамадства; сацыяльная абарона работнікаў культуры і творчых работнікаў; абарона грамадскай маралі, сцвярджэнне гуманістычных ідэй і высокіх маральных пачаткаў у грамадскім жыцці, фарміраванне эстэтычнага жыццёвага асяроддзя; развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне культуры.

Задачы выпрацоўваліся ў трох напрамках – забеспячэнне асноўных культурных запатрабаванняў, кіраванне культурай, сацыяльна-палітычныя рашэнні.

Калі мэты з'яўляюцца стратэгічнай базай культурнай палітыкі, то асноўныя задачы (ці прыярытэты) звязаны з канкрэтнай тактыкай рэалізацыі гэтых мэт заканадаўчым, адміністрацыйным і фінансавым шляхамі. Менавіта ў гэтым пытанні пры параўнанні дзвюх рэдакцый закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» не відаць змен. Абедзве рэдакцыі Закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» сярод асноўных называюць:

ахову спадчыны, мовы, народнай творчасці;

стварэнне і папулярызацыю твораў мастацтва і літаратуры для дзяцей;

стварэнне ўмоў для эстэтычнай адукацыі і выхавання дзяцей і моладзі;

папулярызацыю класічных твораў мастацкай літаратуры і мастацтва, лепшых узораў сучаснай культуры;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забеспячэнне развіцця культуры ў сельскай мясцовасці, пашырэнне культурнай інфраструктуры вёскі.

Ведучы гаворку аб дзяржаўным рэгуляванні культурнай сферы, неабходна дакладна разумець, што ў дадзеным выпадку культура разглядаецца не ў канцэптуальным плане, а падаецца як асобная сфера са сваім наборам інстытуцый і асобных частак. Адпаведна рэдакцыі Закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» 2004 г. да сферы яго дзейнасці аднесены: ахова гісторыка-культурнай спадчыны, бібліятэчная справа, кінематаграфія, музейная справа, народнае мастацтва, народныя промыслы (рамёствы), выданне твораў літаратуры, дзейнасць па арганізацыі культурнага адпачынку, па эстэтычным выхаванні і культуралагічнай адукацыі, па стварэнні аб'ектаў культурнай інфраструктуры, дзейнасць СМІ ў частцы, якая звязана са стварэннем, выкарыстаннем, распаўсюджаннем і папулярызацыяй культурных каштоўнасцей, мастацкая творчасць, навукова-даследчая і метадычная дзейнасць, міжнароднае культурнае супрацоўніцтва, прафесійная дзейнасць у галіне мастацкай літаратуры, прафесійная дзейнасць у галіне мастацкай літаратуры і мастацтва. А таксама «іншыя напрамкі, звязаныя з ажыццяўленнем і забеспячэннем культурнай дзейнасці, калі іншае не вызначана гэтым Законам» (арт. 2) [46].

Нягледзячы на адсутнасць тэрміна «культурная палітыка» ў нарматыўных прававых актах Рэспублікі Беларусь, ён выкарыстоўваўся ў разнастайных выступленнях як першых асоб дзяржавы, так і дзяржаўных служачых. У 2003 г., выступаючы з лекцыяй перад студэнтамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Г. Лукашэнка вызначыў прыярытэты і задачы дзяржаўнай культурнай палітыкі [387]. Сярод іх былі названы: стварэнне сучаснай нарматыўна-прававой базы культуры; фарміраванне эфектыўна дзейнага эканамічнага механізму галіны культуры; стварэнне ўмоў для выяўлення і развіцця творчых здольнасцей кожнага грамадзяніна Беларусі, шырокі доступ усіх членаў грамадства да дасягненняў нацыянальнай і міравой культуры; захаванне гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа; умацаванне кадравага патэнцыялу і матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры; пашырэнне і паглыбленне міжнароднага культурнага супрацоўніцтва.

### 1.2. Крыніцы

Базу крыніц даследавання складаюць разнастайныя апублікаваныя і неапублікаваныя дакументы і матэрыялы, якія раскрываюць рознабаковыя аспекты культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Адметнае месца сярод іх займаюць *актавыя крыніцы* па пытаннях культурнага будаўніцтва. Сярод іх можна вызначыць наступныя групы: 1) заканадаўчыя акты (Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, законы Рэспублікі Беларусь, дэкрэты і ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь); 2) пастановы Парламента і Урада Рэспублікі Беларусь; 3) нарматыўныя прававыя акты рэспубліканскіх органаў дзяржаўнай улады і кіравання; 4) іншыя прававыя акты (рэгламенты,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструкцыі, правілы, статуты, палажэнні, загады, рашэнні). У іх закладзены асновы існавання і функцыянавання дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў краіны, вызначаны правы і абавязкі розных суб'ектаў гаспадарання, акрэслена, сярод іншага, і прававая аснова іх дзейнасці. Аналіз зместу розных рэдакцый заканадаўчых і іншых нарматыўна-прававых актаў дазваляе вызначыць асноўныя напрамкі дзяржаўнай культурнай палітыкі і метады яе рэалізацыі. Выкарыстанне гісторыка-генетычнага метаду і метаду параўнаўчага аналізу пры працы з гэтым тыпам крыніц даваляе прасачыць змены, якія адбываліся на працягу вывучаемага перыяду ў пазіцыі дзяржавы адносна сферы культуры.

Дадзеныя дакументы выдаваліся ў спецыялізаваных выданнях («Збор пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь», «Збор дэкрэтаў, указаў Прэзідэнта і пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь», «Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь» і інш.), а таксама публікаваліся ў электронных базах («Эталон-Беларусь», «Кансультант-Плюс») і размяшчаліся ў інтэрнэце на афіцыйным сайце Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі (www.ncpi.gov.by).

Асобную групу нарматыўных крыніц складаюць комплексныя праграмы, накіраваныя як на рэгуляванне ўсёй сферы культуры Беларусі і яе рэгіёнаў (Праграма дзеянняў па пераадоленні эканамічнага крызісу ў культуры на 1993–1994 гг., Дзяржаўная праграма «Функцыяніраванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года», Галіновая праграма «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.», «Асноўныя напрамкі развіцця культуры і мастацтва Мінскай вобласці на 1999–2005 гг. і інш.), так і яе асобных галін («Кадры культуры: 2006–2010 гг.», «Праграма дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры на 1994–1996 гг.», «Беларусы ў свеце», Рэспубліканская праграма па захаванні і падтрымцы народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў у Рэспубліцы Беларусь, Рэспубліканская праграма аўтаматызацыі бібліятэк і інш.).

Галоўнай крыніцай інфармацыі па тэме даследавання быў фонд 974 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, у якім знаходзяцца дакументы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. У 2014 г. ён змяшчаў дакументы па 2005 г. уключна. Для больш поўнага асвятлення тэмы былі вывучаны матэрыялы архіва Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, а таксама грамадскіх устаноў. Выбраныя крыніцы маюць актавы і канцылярскі характар. Гэта неапублікаваныя статуты, загады, пастановы, пратаколы пасяджэнняў, дзелавая перапіска, планы работы і справаздачы, афіцыйныя хронікі дзейнасці і г. д. Звесткі, якія яны ўтрымліваюць, датычаць усіх напрамкаў дзейнасці Міністэрства культуры і дазваляюць прасачыць механізм выпрацоўкі і рэалізацыі культурнай палітыкі дзяржавы, дзейнасць творчых саюзаў па абароне сваіх правоў.

Карыснымі былі матэрыялы Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва. У ім захоўваюцца дакументы Камітэта па дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь за 1991–1994 гг. (фонд 371), Саюза кампазітараў Беларусі (Беларускага саюза кампазітараў) з 1991 па 1997 г. (фонд 119), Саюза мастакоў Беларусі (Беларускага саюза мастакоў) да 1998 г. (фонд 82) і інш. Сярод

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

дакументаў творчых саюзаў найбольшую цікавасць выклікаюць стэнаграмы з'ездаў, пратаколы пасяджэнняў прэзідыумаў саюзаў, перапіска па арганізацыйна-творчых пытаннях. Гэтыя крыніцы дазваляюць раскрыць сацыяльна-эканамічныя ўмовы дзейнасці творцаў у 1990-я гг., вызначыць асноўныя напрамкі дзейнасці творчых саюзаў у той перыяд, зразумець ролю і месца творчых саюзаў у культурнай палітыцы краіны.

Багаты матэрыял аб культурным жыцці акумулюе аддзел навуковай інфармацыі па праблемах культуры і мастацтва (АНІКМ) Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дзе з неапублікаваных дакументаў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, упраўленняў культуры аблвыканкамаў і іншых рэспубліканскіх і рэгіянальных устаноў культуры створаны даведачна-інфармацыйны фонд. Аддзел адсочвае матэрыялы перыядычнага друку па праблеме, падзеі культурнага жыцця краіны. Доўгі час ім выдавалася некалькі перыядычных зборнікаў – «Асноўныя службовыя дакументы» (выходзіў да 2004 г., змяшчаў загады, пастановы калегій, планы работы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, упраўленняў культуры аблвыканкамаў і іншую афіцыйную інфармацыю), «Культурнае жыццё Беларусі» (з 1997 г. – «Хроніка культурнага жыцця», з 2005 г. – у электронным выглядзе). Выданні прызначаліся для сістэматычнага інфармавання кіруючых работнікаў і спецыялістаў у галіне культуры і мастацтва аб падзеях і фактах культурнага жыцця рэспублікі.

Па тэме даследавання была таксама выкарыстана розная даведачная і даведачна-бібліяграфічная літаратура: «Беларуская энцыклапедыя», «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», «Тэатры Беларусі» [789], энцыклапедыя «Тэатральная Беларусь» [787], «Музеі Беларусі» [434], энцыклапедыя «Культура Беларусі» [358], «Энцыклапедыя беларускай папулярнай музыкі» [843], энцыклапедычны даведнік «Сучасная Беларусь» [732], «Летапіс друку Беларусі», «Новыя кнігі Беларусі».

Асобую групу складаюць *статыстычныя* зборнікі і матэрыялы: «Статыстычны штогоднік Рэспублікі Беларусь» [692–699], «Грашовыя даходы і расходы насельніцтва Рэспублікі Беларусь» [201], «Рэспубліка Беларусь у лічбах» [683–691], «Статыстычны агляд тэатральна-відовішчных і культурна-асветных устаноў сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь» [751–753], «Статыстычны партрэт культуры Беларусі» [754, 755], «Установы культуры і мастацтва Рэспублікі Беларусь» [796–798], «Культура ў Рэспубліцы Беларусь» [360, 362], «Праца і занятасць у Рэспубліцы Беларусь» [776], «Колькасць, склад і прафесійнае навучанне кадраў» [819–821], «Турызм і турыстычныя рэсурсы ў Рэспубліцы Беларусь» [782–784] і інш.

Аналіз статыстычных звестак дазваляе прасачыць дынаміку колькасных змен у дзейнасці асобных галін сферы культуры. На жаль, звесткі, якія ўтрымліваюцца ў дадзеных выданнях, часам супярэчлівыя. За два дзесяцігоддзі неаднаразова змянялася методыка падлікаў і падачы дадзеных. Напрыклад, былі зменены класіфікатары відаў эканамічнай дзейнасці. Часам звесткі па культуры групіраваліся разам са звесткамі з іншых сфер сацыяльнай галіны, часам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падаваліся толькі па ўстановах, якія падпарадкоўваліся Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь. Гэта не дазволіла правесці поўны аналіз колькасных паказчыкаў дзейнасці тэатраў (адсутнічаюць звесткі па недзяржаўным установам), музеяў (адсутнічаюць звесткі па прыватным музеям, дзейнасці музеяў, якія ўваходзяць у структуру іншых міністэрстваў і ведамстваў), кадравага складу (да 2008 г. адсутнічаюць звесткі па прадпрыемствам і ўстановам недзяржаўнай формы ўласнасці; у склад кадраў культуры не ўключаліся творчыя работнікі), не захаваліся звесткі аб колькасці і паказчыках дзейнасці недзяржаўных кінастудый, галерэй, клубаў і інш. Істотныя перашкоды ў зборы і акумуляцыі інфармацыі аб юрыдычных асобах стварала недасканаласць сістэмы дзяржаўнай рэгістрацыі. Напрыклад, на працягу 1990-х гг. парадак рэгістрацыі змяняўся 4 разы (у 1993, 1996, 1998 і 1999 гг.) [801]. У сувязі з пераводам на новыя фарматы захавання інфармацыі фактычна страчаны звесткі з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і прыватных прадпрымальнікаў за 1990-я гг.

У дзяржаўных архівах практычна адсутнічаюць дакументы ліквідаваных юрыдычных асоб, якія займаліся дзейнасцю ў сферы культуры, не захоўваюцца дакументы аб рэгістрацыі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Асобнае значэнне пры распрацоўцы тэмы даследавання меў *перыядычны друк* Беларусі. Інтэрв'ю з дзеячамі культуры і мастацтва, кіраўнікамі выканаўчых органаў, афіцыйная хроніка культурнага жыцця, паведамленні аб распрацоўцы, падпісанні і выкананні нарматыўна-прававых актаў у галіне культуры, артыкулы аб цікавых падзеях культурнага жыцця краіны і замежжа, аналітычныя і мастацтвазнаўчыя матэрыялы, якія закраналі розныя бакі стану і перспектыў развіцця культуры як у Беларусі, так і на міжнародным узроўні, пастаянна друкаваліся ў часопісах «Мастацтва» і «Тэатральная творчасць», штотыднёвіках «Літаратура і мастацтва», «Культура», штодзённых рэспубліканскіх і абласных газетах.

Істотнай крыніцай інфармацыі з'яўляліся інтэрнэт-рэсурсы афіцыйных органаў улады Рэспублікі Беларусь, перыядычных выданняў, устаноў культуры і мастацтва: сайты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры, газеты «Культура», часопіса «Мастацтва» і інш.

Крыніцы даследавання па сваім змесце характарызуюцца разнастайнасцю і насычанасцю інфармацыяй. Іх выкарыстанне і вывучэнне дазваляе ўсебакова асвятліць пытанне, вызначанае ў якасці тэмы даследавання.

### 1.3. Гістарыяграфія

Пытанні культурнай палітыкі шырока распрацоўваюцца расійскімі вучонымі. Сярод тэарэтычных даследаванняў неабходна адзначыць работы Г. М. Галуцкага [171], Т. Г. Багатыровай [139], Г. А. Смірнова [723], А. У. Мамедавай [414], А. І. Арнольдава [69], В. Жыдкова і К. Сакалова [233] Г. Маеўскага [397] і інш.

Праблемы культурнай палітыкі ў розных аспектах разгледжаны ў шэрагу дысертацый, абароненых у Расіі і Украіне. Гэта працы па гісторыі [97, 226, 415],

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

філасофіі [88, 89, 173, 214, 254, 384], культуралогіі [180, 276, 308, 628, 766], юрыспрудэнцыі [242, 432], паліталогіі [149, 158, 764], эканоміцы [354, 428], дзяржаўным кіраванні [282].

Украінскі даследчык А. Грыцэнка параўноўвае вопыт як старых дэмакратый (Англіі і Францыі), так і краін Усходняй Еўропы, Расіі і Украіны [189]. Ён адзначае галоўную праблему – магчымасць, неабходнасць, спосаб і ступень умяшання ўлады (дзяржавы) у культуру. Аўтар разглядае механізмы культурнай палітыкі (юрыдычны і эканамічны), актуальныя канцэпцыі сацыяльна-культурнага развіцця (глабалізм, мультыкультуралізм) і створаныя імі праблемы нацыянальнай культурнай ідэнтычнасці.

Адным з першых даследчыкаў, які звярнуў увагу на станаўленне культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у пачатку 1990-х гг., быў У. У. Качаноўскі. У сваёй працы «Гісторыя культуры Беларусі» ён прааналізаваў заканадаўства галіны, вызначыў асноўныя фактары, якія павінны садзейнічаць развіццю беларускай нацыянальнай культуры. Сярод іх: арыентацыя на гістарычнае мінулае народа, поўнае здзяйсненне дзяржаўнага суверэнітэту, развіццё духоўнай мастацкай і матэрыяльнай культуры, «правядзенне ў жыццё разумнай, збалансаванай і рэалістычнай дзяржаўнай палітыкі ў галіне культурнага будаўніцтва» [290].

Аналіз мастацкай культуры Беларусі, яе сутнасці, суадносін з прафесійным мастацтвам і народнай творчасцю, а таксама ажыццяўленне дзяржаўнай палітыкі ў адносінах да яе ў розныя гістарычныя перыяды правёў А. У. Русецкі. Дзве главы працы [702] прысвечаны актуальным праблемам беларускай мастацкай культуры. Аналізуючы працэсы пачатку 1990-х гадоў, аўтар вызначае наступныя яе характэрныя рысы. Па-першае, палітызацыя творчай інтэлігенцыі, удзел у стварэнні і дзейнасці рознага роду аб’яднанняў, асацыяцый, саюзаў, партый. Пры гэтым робіць вывад аб тым, што «палітычныя гульні аказалі адмоўны ўплыў на мастацтва на пачатковым этапе яго развіцця ў межах дзяржаўнай незалежнасці і суверэнітэту» [702, с. 282]. Па-другое, камерцыялізацыя мастацкай творчасці, змяненне яе структуры, пераарыентацыя на масавы попыт, развіццё выразна меркантыльных падыходаў да мастацкага твора і яго шляху да спажыўца, арыентацыя мастака на асабістае ўзбагачэнне. Па-трэцяе, раз’яднанне дзеячаў мастацкай культуры. [...] Па-чацвёртае, ператварэнне адраджэння нацыянальнай культуры асобнымі сіламі і рухамі ў самамэту. Па-пятае, няздольнасць дзяржавы: а) выканаць свае дзяржаўныя акты аб культуры і прынцыпах яе развіцця і функцыянавання; б) забяспечыць фінансава-матэрыяльную дзейнасць творчых саюзаў і арганізацый; в) стрымаць разлом пазітыўнай сістэмы падрыхтоўкі кадраў, якая склалася па прынцыпе: мастацкая школа – мастацкае вучылішча – мастацкае ВНУ. Па-шостае, адбыліся негатыўныя зрухі ў механізме распаўсюджвання мастацкай культуры. Сродкі дастаўкі тыражаванага мастацтва развіваюцца значна хутчэй, чым сетка традыцыйных каналаў, а значыць, змяніліся і формы кантактаў насельніцтва з мастацкай культурай, а таксама спосабы яе выкарыстання [702].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адносна перыяду 1995 – пачатку 2000 гг. даследчык гаворыць аб такіх характэрных зменах у мастацкай культуры нашай краіны, як больш раўнамерны ахоп тэрыторыі рэспублікі разнапланавымі мастацкімі мерапрыемствамі; больш цесная сувязь духоўнага і свецкага, агульназначнага і сакральнага; стабілізацыя творчага жыцця і дзейнасці творчых саюзаў і прафесійных творчых калектываў. Значная ўвага ім нададзена раскрыццю сутнасці ролі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урада краіны, Міністэрства культуры ў садзейнічанні развіццю мастацкай культуры.

На жаль, грунтоўных комплексных даследаванняў праблемы культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь яшчэ не створана. Некаторыя аспекты гэтай праблемы вывучаюцца ў кандыдацкай дысертацыі С. Л. Вілейкі на тэму «Асаблівасці культурнай палітыкі ва Узброеных сілах Рэспублікі Беларусь ва ўмовах іх рэфармавання» [150], В. М. Папко «Дзяржаўная палітыка Беларусі ў галіне прафесійнай мастацкай культуры (1985–2000 гг.)» [636], доктарскіх дысертацыях і манаграфіях В. Г. Шадурскага «Культурныя сувязі Беларусі з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы (1945–1990-я гады)» [824], Л. М. Гайдукевіча «Турызм у міжнародных адносінах краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (1989–2009 гг.)» [164, 165].

Даследаванне праблемы ўзаемаадносін улады і культуры ў вывучаемы перыяд можна адшукаць у працах, якія прысвечаны агульным пытанням гісторыі культуры Беларусі. Неабходна канстатаваць, што ў працах беларускіх гісторыкаў распрацоўка праблемы ідзе па прынцыпе: нацыянальна-культурнае адраджэнне – асноўныя дасягненні (прозвішчы, падзеі) – недахопы – міжнароднае супрацоўніцтва. Такі падыход характэрны як для падручнікаў для школ, дапаможнікаў для ВНУ, так і для кніг, прэтэндуючых называцца акадэмічнымі [369, 394, 448, 453].

Пытанні нацыянальна-культурнага адраджэння канца 1980 – пачатку 1990-х гг. разгледжаны ў кнізе Л. Лыча і У. Навіцкага «Гісторыя культуры Беларусі». Асаблівую ўвагу аўтары надаюць развіццю літаратуры, тэатральнага і музычнага мастацтва, культурна-асветнай рабоце. Па-за ўвагай засталіся такія важныя пытанні, як кінамастацтва, выяўленчае і манументальнае мастацтва, дзейнасць па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Толькі адзін абзац прысвечаны развіццю музеяў [392].

Значнае месца ўдзяляецца асвятленню развіцця беларускай культуры перыяду незалежнасці ў працы С. А. Парашкова «Гісторыя культуры Беларусі» [641]. У раздзеле «Сучаснае культурнае жыццё Беларусі» аўтар спыняецца не толькі на раскрыцці асноўных напрамкаў дзейнасці культурна-асветных арганізацый і ўстаноў мастацтва, але і на захадах дзяржавы па падтрымцы і развіцці сферы культуры.

Найбольш поўна працэсы, якія адбываліся ў культуры нашай краіны ў 1990-х гг., адлюстраваны ў кнізе «Беларусь на мяжы тысячагоддзяў», якая выйшла з друку ў 2000 г. Акрамя тэатральнай праблематыкі (Р. Смольскі) ў ёй даволі глыбока разгледжана развіццё і актуальны стан выяўленчага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(В. І. Жук), музычнага мастацтва (Н. А. Юўчанка), уплыў унутрыпалітычных фактараў і міжнародных сувязяў (А. В. Казловіч) і іншыя аспекты культурнага жыцця грамадства. Гэта праца, па сутнасці, з'яўляецца адной з першых спроб абагульніць матэрыял аб развіцці мастацтва Беларусі ў перыяд незалежнасці [120].

Аналіз становішча культуры Беларусі на мяжы ХХ–ХХІ стст. праведзены У. П. Скараходавым у манаграфіі «Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі» [720]. Аўтар выкладае сваё бачанне дыялектыкі ўзаемадзеяння дзяржавы і культуры, некаторых аспектаў фінансавання галіны культуры, арганізацыі яе кіравання, стану прафесійнага тэатральнага, выяўленчага, музычнага і кінамастацтва. Пры аналізе сітуацыі ў сферы культуры аўтар абапіраецца на шматлікія публікацыі і статыстычныя дадзеныя, большасць якіх тычыцца 2001–2003 гг.

Культуры і мастацтву прысвечаны трэці том энцыклапедычнага даведніка «Сучасная Беларусь». Яго аўтары прадставілі агляд развіцця галіны за 1991–2006 гг. У асобным артыкуле В. Добрыцкай [209] прааналізаваны асноўныя паказчыкі развіцця ўстаноў культуры, заканадаўства, прыярытэты культурнай палітыкі дзяржавы, дасягненні асноўных галін. За выключэннем перыяду 1991–1995 гг. аўтар сканцэнтравала ўвагу на дасягненнях і пераказе палажэнняў асноўных заканадаўчых актаў, якія рэгулююць культурную дзейнасць. Сярод навуковых артыкулаў выдзяляецца артыкулы, у якіх аналізуюцца працэсы ў культурным жыцці Беларусі, што да гэтага часу былі абыдзены ўвагай даследчыкаў, – «Антрэпрыза» (А. Стэльмах), «Эстрадная музычная культура» (Н. Юўчанка). Па-за ўвагай засталіся пытанні эканомікі галіны, кадравай палітыкі, адукацыі ў сферы культуры, аховы гісторыка-культурнай спадчыны, месца і ролі творчых саюзаў у выпрацоўцы і рэалізацыі культурнай палітыкі. У выданні вельмі мала ўвагі нададзена развіццю ўстаноў культуры Эі мастацтва, якія не ўваходзяць у структуру Міністэрства культуры.

У шостым томе шматтомнага выдання «Гісторыя Беларусі», які пабачыў свет у 2011 г., пытанні развіцця культуры ў 1991–2009 гг. разгледжаны ў двух параграфах апошняга раздзела. Найбольш змястоўным бачыцца першы [437], аўтары якога У. Навіцкі і В. Папко прасочваюць асноўныя моманты развіцця культуры пры парламенцкай форме праўлення. Але ў тэксце прыведзены асобныя падзеі, якія тычацца папярэдніх гадоў ці далёка сягаюць за перыяд 1991–1994 гг. Напрыклад, публікацыя асобных літаратурных твораў, правядзенне фестываляў, тэатральныя пастаноўкі, адкрыццё помнікаў. Калі У. Навіцкі і В. Папко звярнулі ўвагу на развіццё літаратуры, тэатральнай творчасці і музычнага і выяўленчага мастацтва, то аўтар другога параграфа Л. Лыч для характарыстыкі развіцця сферы пры прэзідэнцкай форме праўлення ў якасці асноўных праблем вызначыў становішча матэрыяльнай базы і кадраў галіны, літаратуру і кнігадрукаванне, культурнае жыццё нацыянальных меншасцей, культурнае ўзаемадзеянне з іншымі дзяржавамі [393].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналітычны агляд развіцця галіны культуры нашай краіны зроблены ў даследаванні «Культура Беларусі: 20 гадоў развіцця» [356], падрыхтаванай у Інстытуце культуры Беларусі. У 12 раздзелах даследавання разледжаны фактычна ўсе пытанні – ад фінансавання і заканадаўства да аматарскага мастацтва і навуковай дзейнасці. У дадатку змешчаны статыстычны аналіз дзейнасці ўстаноў культуры галіны за два дзесяцігоддзі.

Сярод значнай колькасці навуковых артыкулаў вызначаецца артыкул П. Р. Ігнатовіча «Культурная палітыка Рэспублікі Беларусь на этапе трансфармацыі грамадства» [269]. У ім аўтар закранае праблемы дзяржаўнага кіравання сферай культуры, гісторыю развіцця заканадаўчай базы, вызначае асноўныя мэты і задачы культурнай палітыкі, асноўныя шляхі яе рэалізацыі, асвятляе стан распрацаванасці праблемы, спыняецца на характарыстыцы стану культуры Беларусі ў канцы XX ст., праблемах галіны. Сацыяльна-філасофскі аналіз культуры Беларусі дадзены ў артыкуле Н. М. Дзялендзік «Стан культуры Беларусі ў сучасны перыяд» [205].

Аналіз існаваўшай у 1990-х гг. сістэмы падрыхтоўкі ***кадраў*** для ўстаноў культуры даецца ў калектыўнай працы «Падрыхтоўка кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы» [191]. Аўтары прапанавалі перспектыўныя кірункі фарміравання кадравага патэнцыялу краіны ў галіне культуры, распрацавалі канцэпцыю культуралагічнай адукацыі, якая была прапанавана ў якасці асновы для падрыхтоўкі спецыялістаў галіны. Праведзены аналіз размеркавання колькасці навучэнцаў па ВНУ рэспублікі сведчыў, што структура прыёму ў іх не адлюстроўвала патрэбнасці грамадства ў кадрах з вышэйшай адукацыяй. У якасці пацвярджэння гэтага прыводзіцца параўнанне прыёму студэнтаў па двух кірунках: культура і мастацтва, з аднаго боку, і ваенных спецыялістаў, з другога. Толькі ў Ваенную акадэмію за кошт дзяржаўнага бюджэту штогод у 1990-х гг. прымаліся 1000 курсантаў. У той час па трох ВНУ культуры і мастацтва ў 1996 г. быў здзейснены набор толькі ў колькасці 790 чалавек. І толькі на мяжы стагоддзяў назіралася ўстойлівая тэндэнцыя да павелічэння – у 2000 г. колькасць паступіўшых у ВНУ культуры і мастацтва дасягнула 1263 чалавекі [191, с. 46–47]. Незбалансаванасць падрыхтоўкі кадраў назіралася і ў педагагічнай сферы, сістэме падрыхтоўкі і працаўладкавання інжынерна-тэхнічных кадраў. Калі ў гэтых галінах відавочнай была значная перавытворчасць спецыялістаў, то ў галіне культуры іх не хапала.

Іншай праблемай, якая негатыўна адбівалася на якасці і колькасці падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй, з'яўлялася дубліраванне спецыяльнасцей і спецыялізацый у многіх ВНУ. Вельмі яскрава гэта выявілася ў сістэме культуралагічнай і мастацтвазнаўчай адукацыі. У краіне адбывалася распыленне падрыхтоўкі спецыялістаў па розных навучальных установах, якія не мелі неабходнай матэрыяльнай і педагагічнай асновы.

Аўтары прыходзяць да высновы, што ў пачатку 2000-х гадоў наспела неабходнасць распрацоўкі праграм і падрыхтоўкі значна больш шырокай палітры спецыяльнасцей, якія адпавядалі б новым умовам дзейнасці, асабліва ў сферы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вольнага часу. Патрабаваліся спецыялісты ў галіне рэкламна-выставачнай дзейнасці, юрыспрудэнцыі і права ў галіне культуры, мастацтвазнаўцы-маркетолагі, эканамісты культуралагічнага профілю, фінансавыя мэнеджары інфармацыйнага бізнесу і бібліятэчнай справы, бібліятэкары-бібліятэрапеўты.

У 2006 г. Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры па выніках сацыялагічнага маніторынгу была падрыхтавана аналітычная запіска, у якой была дадзена ацэнка сацыяльнай характарыстыкі, прафесійнай культуры і мабільнасці кадраў галіны [649]. Даследаванне пацвердзіла абгрунтаванасць асноўных напрамкаў кадравай палітыкі галіны, якія былі замацаваны ў праграме «Кадры культуры: 2006–2010 гады», сутнасць якіх заключалася ў правядзенні комплекснага аналізу кадравага забеспячэння галіны культуры і вывучэння яго дынамікі, а таксама стварэння і ўкаранення эфектыўнай сістэмы адаптацыі маладых спецыялістаў.

У сярэдзіне 1990-х гг. тэарэтыкі і практыкі культурнай галіны актыўна абмяркоўвалі шляхі распрацоўкі і рэалізацыі новай дзяржаўнай культурнай палітыкі ў нашай краіны ў новых ***сацыяльна-эканамічных умовах***.

У 1994 г. выйшла даследаванне І. Шыршова «Прагнастычная мадэль арганізацыйна-эканамічных ператварэнняў галіны культуры ў Рэспубліцы Беларусь» [831]. Аўтар разглядае знешнія і ўнутраныя ўмовы выхаду культуры з крызісу, працэс рэканструкцыі сеткі бюджэтных устаноў і тых прадпрыемстваў культуры, якія датуюцца. Асобая ўвага нададзена пытанню рэфармавання дзяржаўнага рэгулявання пераходных пераўтварэнняў галіны культуры, структурнай перабудовы капітальных укладанняў у гэтай галіне. Аўтар спыняецца на рэзервах скарачэння, эканоміі і рацыянальнага выкарыстання дзяржаўных сродкаў у культуры. Галіна культуры разглядаецца ім як галіна эканомікі, у якой дзейнічаюць тыя ж эканамічныя законы, што і ўсюды. Ва ўмовах таго часу выйсце з крызісу бачылася даследчыкам толькі ў карэнным рэфармаванні, скарачэнні сеткі бюджэтных устаноў і стратных прадпрыемстваў культуры, ператварэнню іх у эканамічна свабодныя кампаніі: акцыянерныя, кааператыўныя, кааператыўна-акцыянерныя і інш., якія валодаюць рацыянальнымі стратэгіямі камерцыйна-прадпрымальніцкай дзейнасці, перадавымі інфармацыйнымі тэхналогіямі ў галіне культуры. Аўтар прапаноўвае будаваць сетку культурных устаноў, зыходзячы з вывучэння структуры духоўна-практычных запытаў розных катэгорый насельніцтва пэўнай тэрытарыяльнай супольнасці шляхам складання сацыяльна-культурных карт прафесіяналамі-культуролагамі. Складанне такіх карт павінна было даказаць бессэнсоўнасць утрымання грувасткай, дарага каштуючай сеткі бюджэтных устаноў і планава-стратных прадпрыемстваў культуры, якія ў сваёй большасці, па меркаванні І. Шыршова, працавалі не на насельніцтва, а на сябе і мелі ўтрымальніцкі характар.

Выказвалася прапанова ўвесці трохскладовае размеркаванне сродкаў на: фонд гарантаванага эканамічнага забеспячэння, фонд мэтавай матэрыяльна-тэхнічнай падтрымкі і фонд рэзервова-стымулюючага забеспячэння прыяры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэтных кірункаў культурнай галіны. Абгрунтоўвалася неабходнасць пабудовы сістэмы грантавага фінансавання.

У сярэдзіне 1990-х гг. тэарэтыкі і практыкі актыўна абмяркоўвалі шляхі распрацоўкі і рэалізацыі культурнай палітыкі нашай краіны ў новых сацыяльна-эканамічных умовах. Звяртае на сябе ўвагу справаздача аб працы творчай лабараторыі «Асновы рэгіянальнай культурнай палітыкі і фарміраванне сацыяльна-культурных праграм», якая адбылася падчас працы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Культурная сфера вольнага часу: стан, праблемы, пошукі» (Мінск, снежань 1995 г.) [351]. Удзельнікі творчай лабараторыі прапаноўвалі перайсці да фінансавання галіны культуры праз рэалізацыю рэгіянальных мэтавых праграм. Былі распрацаваны «Прыкладная структура тэрытарыяльнай праграмы падтрымкі і развіцця культуры» і «Метадычныя рэкамендацыі па стварэнню доўгатэрміновых мэтавых праграм на 1996–1998 гг.». У рэкамендацыях канферэнцыі адзначалася, што «ў рэспубліцы не надаецца належнай увагі правядзенню глыбокага сацыялагічнага і культуралагічнага аналізу сучаснага стану і тэндэнцый развіцця культуры, адчуваецца недахоп абгрунтаваных распрацовак ажыццяўлення дзяржаўнай сацыяльна-культурнай палітыкі».

Тэарэтычныя праблемы эканомікі сацыяльна-культурнай сферы Беларусі ўвогуле і сістэмы ўстаноў культуры і мастацтва ў прыватнасці разглядаў М. Сакалоўскі [735]. Ён асобна выдзеліў культурна-асветныя ўстановы, тэатральна-відовішчныя арганізацыі і кінамастацтва з кінаабслугоўваннем. Аўтар вызначае, што асновай дзяржаўных гарантый захавання, развіцця і распаўсюджання культуры ў Рэспубліцы Беларусь у пачатку 2000-х гг. заставалася бюджэтнае фінансаванне. Аналізуючы становішча сферы ў перыяд крызісу 1991–1995 гг., адзначаецца, што на скарачэнне сеткі і наведвання ўстаноў культуры ў значнай ступені паўплывала зніжэнне іх папулярнасці і змена культурных запытаў насельніцтва, пашырэнне магчымасцей тэлебачання, з’яўленне новых відаў забаваў на аснове відэа- і камп’ютарных тэхналогій, распаўсюджанне і рост папулярнасці дыскатэк, начных клубаў і казіно. На жаль, аўтар не прыводзіць падрабязных звестак па аб’ёмах фінансавання сферы, не аналізуе матэрыяльна-тэхнічную базу. Такія пытанні, як прагназаванне і планаванне, працоўныя рэсурсы і аплата працы, разгледжаны толькі ў кантэксце сацыяльна-культурнай сферы ў цэлым.

Сярод даследаванняў стану культуры Беларусі вызначаюцца працы, у якіх разглядаюцца асобныя галіны культуры. Найбольш грунтоўна праблемы беларускага нацыянальнага ***тэатра*** даследаваны ў манаграфіях і артыкулах доктара мастацтвазнаўства Р. Смольскага. У 1998 г. выйшаў зборнік яго артыкулаў і рэцэнзій «Тэатр у прасторы часу» [729], дзе аўтар разважае пра развіццё беларускага тэатра: некаторыя спектаклі, асобныя тэатры, маладую беларускую драматургію, фестывалі. У 1999 г. убачыла свет грунтоўная праца Р. Б. Смольскага «На скрыжаванні: тэатр у працэсах станаўлення і развіцця нацыянальнай свядомасці беларусаў» [728].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё тэатральнага мастацтва ў 90-х гадах XX ст. разглядаецца ў манаграфіі Т. Я. Гаробчанкі «На мяжы стагоддзяў: сучасны беларускі драматычны тэатр», якая прысвечана гісторыі беларускага тэатра і разбору найбольш удалых спектакляў гэтага перыяду. Ва ўступе і заключэнні сваёй кнігі аўтар робіць невялікі аналіз асноўных элементаў дзяржаўнай культурнай палітыкі. На думку аўтара, да іх неабходна аднесці стварэнне спецыяльных фондаў Прэзідэнта па падтрымцы дзеячаў культуры і творчай моладзі, устанаўленне ўрадавых стыпендый, дзяржзаказ на стварэнне спектакляў, фінансаванне фестываляў, канферэнцый і г. д. [172]

Праблемам развіцця сучаснага беларускага тэатра лялек прысвечана кандыдацкая дысертацыя С. Ф. Юркевіча [847], у якой аналізуецца працэс трансфармацыі тэатральнага лялечнага мастацтва ў 90-я гады XX ст., у тым ліку фестывальны рух, стварэнне новых тэатраў. У кандыдацкай дысертацыі Г. Л. Галкоўскай «Студыйныя тэатры Беларусі ў 80-90-х гадах» [169] разглядаецца такая з'ява ў айчыннай культуры, як дзейнасць тэатраў-студый, якія сталі пляцоўкамі для творчых эксперыментаў у тэатральным мастацтве. Абедзьве дысертацыі маюць мастацтвазнаўчы характар і не закранаюць пытанне ўплыву дзяржавы на развіццё музычнага і тэатральнага мастацтва.

Больш грунтоўнае даследаванне дзейнасці тэатраў-студый прадстаўлена ў манаграфіі Г. Л. Галкоўскай [170]. Аўтар прыходзіць да высновы, што «асвойваючы нетрадыцыйную для нацыянальнага тэатра эстэтыку абсурду і працуючы ва ўмовах рынку па прынцыпах самаакупнасці, тэатры-студыі 1980–1990-х гг. былі вымушаны спалучаць у сваёй дзейнасці эксперыментальныя і творчыя задачы, што ўскладняла творчы працэс і абумоўлівала супярэчлівасць развіцця студыйных тэатраў. Спецыфіка арганізацыі беларускага студыйнага руху заключалася не толькі ў не характэрнай для яго эканамічнай і мастацкай аўтаноміі, але і ў прынцыпах узаемаадносін паміж кіраўніком і студыйцамі, дзе рэжысёр выступаў як працадаўца. Прынцып гасразліковай мадэлі, які быў запазычаны ў расійскіх эксперыментатараў, аказаўся нежыццядзейным» [170, с. 91].

У 2012 г. пабачыў свет том акадэмічнай серыі «Беларусы», прысвечаны тэатральнаму мастацтву [116]. У чацвёртым раздзеле разгледжаны пытанні сучаснай беларускай драматургіі, дзейнасць тэатраў-студый канца 1980 – пачатку 1990-х гг. і новых тэатраў, якія з'явіліся ў апошняе дваццацігоддзе. Асобныя параграфы адведзены мастацтвазнаўчаму аналізу пастановак трох тэатраў: Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа і Тэатра юнага гледача. Істотная ўвага мастацтвазнаўцамі нададзена аналізу беларускамоўных спектакляў у тэатрах краіны ў 90-я гады XX – пачатку XXI ст.

Праблемы развіцця тэатральнага мастацтва разгледжаны ў шэрагу артыкулаў. Разнастайным пытанням існавання тэатральнай антрэпрызы прысвечаны артыкулы А. М. Стэльмах [762, 763]. Гісторыі тэатра «Дзе-Я?» і творчасці яго рэжысёра Н. Трухана прысвечаны артыкул Р. Альшэўскага [618]. Аўтар адзначае, што названы тэатр з самага пачатку быў пабудаваны па прынцыпе на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыянальнага тэатра. А ўвогуле большасць знакавых спектакляў у гісторыі прафесійнага беларускага тэатра звязана менавіта з пастаноўкай твораў беларускіх драматургаў. Аўтар канстатуе пачатак 1990-х гг. як час пікавай цікаўнасці да нацыянальнай тэмы і наступны спад. Аналізуючы дзейнасць тэатра «Дзе-Я?», падкрэсліваецца, што кожны новы спектакль азначаў новы падыход. Тэатр пастаянна эксперыментаваў, шукаў новыя формы. Па меркаванні даследчыка, гісторыя тэатра «Дзе-Я?» стала адной з цікавейшых старонак гісторыі беларускага тэатра. Калектыў быў дзецішчам свайго часу і не мог існаваць у іншых умовах і пры іншым мастацкім кіраўніку. Месца Новага драматычнага тэатра, пераемніка тэатра «Дзе-Я?», у культурнай прасторы Беларусі, аналіз рэпертуару і ўзаемадзеяння з публікай разглядаецца ў артыкуле Л. Лявонавай [395].

На працягу 1990-х гг. у перыядычным друку з артыкуламі па праблемах тэатральнага працэсу выступала тэатразнаўца Т. А. Ратабыльская. У 2000 г. артыкулы выйшлі пад вокладкай кнігі «Спыніся, імгненне…» [677].

Гісторыі ***кінамастацтва*** Беларусі ў 1986–2003 гг. прысвечаны чацвёрты том калектыўнага даследавання супрацоўнікаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі [179]. Дастаткова падрабязна разгледжаны стан дзяржаўнай кінавытворчасці, кіна- і відэапракату ва ўмовах рынку, істотнае месца адведзена гісторыі дзейнасці незалежных студый. Асобныя раздзелы прысвечаны іграваму, неіграваму і анімацыйнаму кіно. Аўтары аналізуюць палітыку дзяржавы адносна кінагаліны, спыняюцца на асноўных механізмах яе ўздзеяння на кінавытворчасць. Значнае месца займае крытычны аналіз становішча. Сярод іншага выказваецца погляд, што «рэзкае скарачэнне бюджэтнага фінансавання кінагаліны ў пачатку 1990-х гадоў і непасрэдна звязаная з гэтым стратэгічная ўстаноўка кіруючых інстанцый на самафінансаванне абвастрылі праблему запатрабаванасці беларускіх фільмаў» [179, с. 132]. Аўтары звяртаюць увагу на тое, што найбольш хадавым кінатаварам з’яўляецца анімацыя, аднак ніводная ініцыятыва энтузіястаў-аніматараў не была падтрымана. Кіраўнікамі кінагаліны не была своечасова ацэнена і перспектыўнасць хутка растучага тэлерынку [179, с. 132–133].

Падрабязна разглядаюцца ў даследаванні праблемы стварэння і кінапракатнага лёсу двух айчынных «блокбастараў» – «У жніўні 44-га…» і «Анастасія Слуцкая». Значная ўвага нададзена падрыхтоўцы творчай змены і кадравай палітыцы ў галіне наогул.

Новым і змястоўным па аналізе з’яўляецца параграф даследавання, прысвечаны незалежным студыям. Апошнія прайшлі ў сваім станаўленні і развіцці прыкладна адны і тыя ж этапы, шлях паступовай эвалюцыі ад рамантычнага падыходу да кінавытворчасці да прагматычнага. «У выніку ці не для большасці з іх такое паняцце, як «некамерцыйнае кіно», знікла вельмі хутка» [179, с. 147].

Выяўленню асноўных праблем у сістэме адносін «кіно–глядач», вывучэнню структуры і асаблівасцей глядацкай аўдыторыі г. Мінска было прысвечанае сацыялагічнае даследаванне, праведзенае ў канцы 2003 – пачатку 2004 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры. [251, 252]. Аўтары па выніках даследавання выказаліся за павышэнне значнасці і прэстыжу айчыннай кінакрытыкі, далучэнне гледачоў да дасягненняў айчыннага і сусветнага кіно, прапаганду культурнай спадчыны беларускага кінематографа. Неабходным бачылася якаснае паляпшэнне рэкламнай дзейнасці кінатэатраў.

Да 80-годдзя беларускага кінематографа Беларускі саюз кінематаграфістаў выдаў зборнік артыкулаў «Беларускае кіно ў асобах» [122]. Кінамастацтва Беларусі ў кантэксце сацыякультурных працэсаў 1990 – пачатку 2000-х гг. – тэма артыкула У. Скараходава [719]. Аналіз дасягненняў і праблем беларускага кіно на мяжы стагоддзяў правёў В. Шэнько [842].

У даследаванні «Беларусы» (т. 12: «Экраннае мастацтва») [115] на значным фактaлагічным матэрыяле праводзіцца навуковы аналіз дзейнасці «Беларускага відэацэнтра», падрабязна разглядаецца творчасць беларускіх дакументалістаў перыяду незалежнасці. Значную цікавасць выклікаюць старонкі, на якіх выкладаецца гісторыя развіцця анімацыйнага кіно, вызначаны асноўныя дасягненні і напрамкі развіцця гэтага віду экраннага мастацтва ў XXI ст. Аднак у даследаванні не знайшлося месца для раскрыцця праблем кіно, узаемаадносін дзяржавы і творцы, уплыву складаных трансфармацыйных працэсаў на мастацкую творчасць.

Развіццё жанрава-стылёвых форм тэлевізійнага дакументальнага кіно на матэрыяле творчага аб'яднання «Тэлефільм» Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь – тэма кандыдацкай дысертацыі Н. Р. Сцяжко [758]. Дакументальныя тэлефільмы, створаныя ў 1990-х гг., аналізуюцца ў трэцяй главе дысертацыі. Аўтар робіць выснову, што дакументальнае кіно гэтых гадоў адышло ад жорсткіх жанравых канонаў, атрымала новае дыханне, набыло багацце стылёвай разнастайнасці. Гэта час росквіту паэтычнага тэлекіно.

Аналізу працэсаў, якія адбываліся ў беларускім кіно, прысвечаны артыкул Л. Зайцавай [243]. Аўтар спрабуе знайсці адказы на наступныя пытанні: што наогул было зроблена на «Беларусьфільме» ў XXI ст., якімі былі прыярытэты і ці былі яны наогул, ці існавала прадуманая сістэмная вытворчая палітыка? Падводзячы вынікі, даследчыца гаворыць неабходнасці ў мэтах захавання самабытнасці беларускага ігравога кінамастацтва падтрымліваць традыцыйныя напрамкі яго развіцця, у якіх яно мела цікавыя здабыткі (дзіцячае кіно, гістарычныя фільмы) і развіваць запатрабаваныя часам кірункі (кіно сацыяльнай праблематыкі ў розных формах); выкарыстоўваць усе магчымыя шляхі распаўсюджвання фільмаў (не толькі пракат і паказ на ТБ, але і відэакасеты, CD- і DVD-дыскі); утрымліваць у краіне, даючы магчымасць працаваць, нацыянальныя кінакадры, інакш цяжка будзе гаварыць аб захаванні нацыянальнай мастацкай школы.

Аналізу тэатральнай і тэлекінематаграфічнай школы Беларусі ў кантэксце еўрапейскай культурнай прасторы прысвечаны артыкул У. Мішчанчука [430]. Дзейнасць незалежных кінастудый на мяжы 1980–1990-х гадоў – у цэнтры ўвагі артыкула А. Ю. Пастоевай [658]. Аўтар заўважае, што незалежныя студыі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

змаглі выпускаць прадукцыю, аналагічную праектам «Беларусьфільма», за меншыя сродкі. Пры гэтым іх фільмы ў жанравым і праблемна-тэматычным плане былі больш канкурэнтаздольнымі на знешніх рынках, бо на іх не ўплывала меркаванне вышэйшых інстанцый. Акрамя гэтага, у перыяд эканамічнай нестабільнасці першай паловы 1990-х гг. актыўнасць незалежных студый адыграла амаль што выратавальную ролю ў жыцці дзяржаўнай кінастудыі краіны – пастаноўка фільмаў на сродкі прыватных інвестараў забяспечвала працай дастаткова вялікую колькасць супрацоўнікаў «Беларусьфільма». Незалежныя кінастудыі на практыцы апрабіравалі новыя, значна таннейшыя, тэхналогіі кінавытворчасці [658, с. 202].

Сярод прац, прысвечаных пытанням развіцця ***музеяў***, значную цікавасць выклікаюць матэрыялы сацыялагічнага даследавання «Музей і наведвальнік», праведзенага ў 1997–1998 гг. супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры на базе Нацыянальнага мастацкага музея [435]. Аўтары канстатавалі недастатковую развітасць рэкламнай дзейнасці, прапаганды музея ў сродках масавай інфармацыі як крыніцах фарміравання аўдыторыі мастацкага музея. У працэсе музейнай камунікацыі рэкамендавалася асаблівую ўвагу звяртаць на музейны маркетынг, пашырэнне рынку музейных друкаваных выданняў. У мэтах выпрацоўкі аптымальнай стратэгіі фарміравання аўдыторыі вартым даследчыкі лічылі правядзенне маніторынгу дынамікі мадэлі паводзінаў наведвальнікаў у адносінах да музея, структуры музейнай аўдыторыі і асобных груп наведвальнікаў [435, с. 51].

У 2000 г. спецыялістамі гэтай жа ўстановы было падрыхтавана комплекснае сацыялагічнае даследаванне работы музеяў Беларусі з аўдыторыяй [304].

Здабыткі і перспектывы развіцця дзяржаўных музеяў Беларусі разгледжаны ў артыкуле А. Сташкевіч «Беларускія музеі на шляху перамен» [757]. Даючы станоўчую ацэнку нарматыўна-прававой базе музейнай галіны, аўтар заўважае: «удасканаленне заканадаўства і здзяйсненне першых крокаў па мадэрнізацыі музейнай галіны выявілі і яшчэ больш узмацнілі да гэтай пары існаваўшыя праблемы, без рашэння якіх працэс мадэрнізацыі можа аказацца неэфектыўным». Практычна ўсе яны выкліканы зменамі ўмоў існавання музеяў і палягаюць «у супярэчаннях паміж сучаснымі прафесійнымі і сацыяльнымі стандартамі і састарэлымі падыходамі да арганізацыі і здзяйснення музейнай дзейнасці» [757, с. 20]. Шэраг праблем, па меркаванні А. Сташкевіч, абумоўлены ростам музейнай сеткі, якая не забяспечана дастатковымі сродкамі па ўтрыманні і далейшым развіцці. Другая праблема – тыпалагічная няроўнасць у развіцці музейнай сеткі, калі прыкладна 50% дзяржаўных музеяў прыпадала на краязнаўчыя. Найбольш вострай была праблема камплектавання і захавання музейных экспанатаў. Непасрэдна музейных супрацоўнікаў датычыла праблема выбару мадэлі і стратэгіі развіцця, вызначэння ў самой сутнасці і структуры той культурнай інфармацыі, якую музей прэзентуе грамадству ў выглядзе экспазіцый і іншых форм камунікацыі. На гэтым шляху неабходна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

было пераадолець шэраг метадалагічных, музеялагічных, практычных праблем. Даследчыца канстатавала крызіс музейнай прэзентацыі (толькі 7 % музейнага фонду выкарыстоўвалася ў якасці прэзентацый для публікі, адсутнічала пастаянная экспазіцыя прыкладна ў 20 рэгіянальных музеях).

Істотнай крыніцай выпраўлення становішча магло б стаць прыцягненне пазабюджэтных сродкаў, аднак развіццё платных паслуг стрымлівалася па прычыне «адноснай эканамічнай несвабоды беларускіх музеяў і недасканаласці заканадаўства ў сферы эканамічных адносін, а менавіта адсутнасці падатковых ільгот, існавання практыкі абавязковага ліцэнзавання некаторых відаў дзейнасці, празмернага адміністравання з боку дзяржавы» [757, с. 22].

Гісторыя станаўлення сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі ўласных кадраў музейных спецыялістаў у перыяд незалежнасці – асноўная тэма артыкула А. Мацевасян [422].

Шэраг артыкулаў прысвечаны даследаванню месца і ролі музеяў у выхаванні насельніцтва [130, 194, 424].

Неабходна адзначыць, што праблема дзяржаўнай палітыкі ў ***музычным*** мастацтве распрацавана ў літаратуры значна горш, чым, напрыклад, адносна кіно ці тэатра.

У якасці асобнага тома акадэмічнай серыі «Беларусы» ў 2008 г. пабачыла свет кніга «Музыка» [114]. У ім сярод іншага дадзены мастацтвазнаўчы аналіз працэсаў, якія адбываліся ў музычным мастацтве Беларусі перыяду незалежнасці, звернута ўвага на асноўныя дасягненні сімфанічнай, камерна-інструментальнай музыкі, опернага і балетнага мастацтва.

У 2012 г. выйшла фундаментальнае даследаванне «Беларускае канцэртна-выканальніцкае мастацтва: апошняя трэць XX – пачатак XXI ст.» [123]. У ім на падставе аналізу творчай дзейнасці музыкантаў усіх выканальніцкіх спецыяльнасцей створана цэласная карціна развіцця беларускага музычнага канцэртна-выканальніцкага мастацтва ў апошнія 40 гадоў (1971–2011 гг.). На думку аўтараў, унікальнай канцэртнай пляцоўкай для дэманстрацыі творчых сіл і выканальніцкага мастацтва сталі шматлікія конкурсы, якія праводзяцца ў нашай краіне. Важнейшым фактарам абнаўлення і ўзбагачэння музычнага жыцця стала пашырэнне кантактаў з замежнымі калегамі. Значная ўвага ў манаграфіі нададзена дзейнасці Беларускага саюза музычных дзеячаў.

Абставіны развіцця беларускай музычнай эстрады ў канцы першага дзесяцігоддзя XXI ст. разгледзела І. Смірнова [724]. Яна звярнула ўвагу на практычную адсутнасць выбудаванай інфраструктуры прадпрымальніцкай дзейнасці ў адзначанай сферы, неістотныя памеры рынку музычнай прадукцыі, што не дазваляе гаварыць аб прыбытковасці інвестыцый. Побач з гэтым эстраднае шоу патрабавала значных капіталаўкладанняў, актуальным было ўкараненне ў беларускай эстрадзе новых інфармацыйных тэхналогій. У інфраструктуры Белдзяржфілармоніі і Белканцэрта, на думку аўтара, наспела неабходнасць укаранення новых форм кіраўнічых і арганізацыйных тэхналогій.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даследаванню праблемы развіцця беларускай музычнай культуры ў 1970–1990-я гг. прысвечаны артыкул І. М. Шумскай [835]. Аднак у ім няма аналізу мерапрыемстваў дзяржавы па падтрымцы і развіцці гэтага віду мастацтва.

Сярод аўтараў, якія пісалі аб беларускім музычным мастацтве, неабходна вылучыць карэспандэнта газеты «Літаратура і мастацтва» С. Берасцень. У яе артыкулах прадстаўлена шырокая палітра падзей у музычным жыцці. Акрамя інфармацыі аб канкрэтных канцэртах, фестывалях, творчых калектывах ці з'ездах Саюза кампазітараў аўтар аналізуе дзейнасць арганізатараў гэтых мерапрыемстваў і іх фінансаванне [131–135].

Развіццё ***манументальнага*** мастацтва Беларусі суправаджалася актыўнымі дыскусіямі і спрэчкамі ў прэсе (асабліва ў 1990-я гг.). Аднак ніводнай спецыяльнай манаграфіі, прысвечанай гэтай тэме, не напісана. Хацелася б адзначыць артыкул К. У. Прэнц, прысвечаны манументальнай скульптуры 1990-х гг. [672]. Аўтар робіць аналіз перыядычнага друку па дадзенай тэматыцы, закранаючы стварэнне асноўных помнікаў, галоўныя тэндэнцыі ў развіцці гэтага віду мастацтва.

Асноўныя тэндэнцыі і характэрныя рысы манументальнай скульптуры Беларусі перыяду незалежнасці разгледжаны ў артыкуле Л. Лапцэвіч [376]. Тлумачэнне тэндэнцый развіцця скульптуры і жывапісу, разгляд ролі дзяржавы ў стварэнні помнікаў і бюстаў дадзена ў артыкуле В. І. Жука «Выяўленчае мастацтва» са згаданай манаграфіі «Беларусь на мяжы тысячагоддзяў» [237]. Аўтар лічыць, што ў 1990-я гг. дзяржава амаль не кантралявала працэс узвядзення помнікаў: «Дзяржзаказ, які існаваў раней, кануў у небыццё… Калі раней менавіта дзяржава выступала асноўным заказчыкам і вызначала, каму, дзе і які помнік трэба ўзводзіць, то зараз назіраецца рэзкая дэцэнтралізацыя, калі заказчыкам можа выступаць той, у каго ёсць грошы. Помнікі замаўляюцца, выконваюцца і ўстанаўліваюцца без кантролю з боку Міністэрства культуры і Саюза мастакоў» [237]. У гэтай з'яве бачыліся як станоўчыя (прыток інвестыцый, актывізацыя грамадскіх арганізацый у гэтым кірунку), так і адмоўныя праявы (у некаторых выпадках недастатковы мастацкі ўзровень твораў).

Характарыстыку развіцця пейзажнага ***жывапісу*** Беларусі апошніх дзесяцігоддзяў дае В. І. Жук [235]. Аўтар называе пейзажны жанр самым шануемым у акрэслены перыяд. З аднаго боку, ён тлумачыць гэту акалічнасць развіццём арт-рынку, які скарэкціраваў мастакоў у сваёй творчасці. З другога – шырокае звяртанне да пейзажу тлумачыцца стомленасцю ад няспыннай жыццёвай мітусні, расчараванасцю ў сацыяльных міражах, у своеасаблівым крызісе, які, на думку даследчыка, перажывае мастацтва і эпоха ў цэлым.

Інстытуцыйныя змены ў мастацкім жыцці Беларусі канца XX ст. прасочаны А. Ізафатавай [256]. Яна звяртае ўвагу на змену ў сярэдзіне 1990-х гг. акцэнту з дзейнасці мастацкіх груп на дзейнасць прыватных незалежных галерэй. У гэты перыяд спынілі сваю дзейнасць заснаваныя яшчэ ў канцы 1980-х мастацкія аб'яднанні. Прычыну даследчыца бачыць у пераарыентацыі мастака з калектыўнай ідэнтыфікацыі на асабістую. Да таго ж да гэтага перыяду



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

большасць мастакоў выпрацоўвалі свой уласны непаўторны стыль. На жаль, даследчыца не ўлічвае іншых прычын па-за сферай мастацтва. Напрыклад, у змене заканадаўства адносна грамадскіх арганізацый, падатковай палітыкі і да т. п. Таксама нельга гаварыць аб выпрацоўцы да сярэдзіны 1990-х гг. у мастакоў свайго ўласнага стылю. Гэта адносіцца толькі да аднаго пакалення, а ў мастацтва кожны год прыходзяць маладыя дзеячы, якія знаходзяцца ў пошуку ўласнай манеры.

Пастаянным аўтарам часопіса «Мастацтва» з’яўляўся Ф. Ястраб. У яго публікацыях разглядаліся пытанні выяўленчага мастацтва, становішча мастака ў сучасным грамадстве, уздзеянне сацыяльна-эканамічных працэсаў на творчасць [856]. Ён жа з’яўляецца аўтарам шэрага навуковых публікацый. У адной з іх аўтар, разважаючы аб ўзаемаадносінах духоўнасці, мастацтва і рынку, выказвае меркаванне, што рынак ці рыначная арыентацыя пераважаюць над ранейшымі формамі арыентацыі мастака. У грамадскім прызнанні мастака ўсё большую ролю адыгрывае камерцыйны поспех. Ф. Ястраб перасцерагае: «Усякае прыстасаванне сваёй творчасці да патрэб моманту ці то ідэалагічных, ці то эканамічных, якім бы шчырым ні быў сам мастак, – заўсёды трагічна для мастака, грамадства, часу» [857, с. 268] На пытанне адносна таго, ці можа дзяржава нейкім чынам уплываць на сітуацыю камерцыялізацыі культуры, ці патрэбна сур’ёзная падтрымка культуры, аўтар дае станоўчы адказ. Пры гэтым абмежаванасць сродкаў вымушае дзяржаву выпрацаваць даволі ясную і адэкватную сітуацыі культурную палітыку, якая павінна заключацца не толькі ў выдачы субсідый пад пэўныя праекты, а перш за ўсё ў структурным напрамку – прававым, падатковым, страхавым. «Працэдуры размеркавання дзяржаўных сродкаў павінны быць дастаткова “празрыстымі”, тым самым выклікаць давер да культурных інстытуцый», – заўважае Ф. Ястраб.

Разважаючы пра праблемы падрыхтоўкі спецыялістаў галерэйнай справы, Ф. Ястраб у 2006 г. адзначаў, што развіццё арт-рынку стрымлівалася падчас недахопам не столькі спецыялістаў традыцыйных напрамкаў – юрыстаў, мастацтвазнаўцаў і г. д., але і напрамкаў новых, абумоўленых рэаліямі рынкавай эканомікі, – мэнеджараў, прадзюсараў, экспертаў, спецыялістаў па сувязях з грамадскасцю, прафесійных рэкламістаў, спецыялістаў па фандрайзінгу, маркетолагаў [859].

Грунтоўны разгляд стыляў і жанраў беларускай ***літаратуры*** канца XX – пачатку XXI ст. правяла Г. Кісліцына ў сваёй манаграфіі «Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы» [295]. У даследаванні значная ўвага нададзена гісторыі стварэння і дзейнасці Таварыства вольных літаратураў, Бум-Бам-Літа, выдавецкіх праектаў. Аналізуючы карэнныя змены, якія адбыліся ў беларускай літаратуры ў 1990-я гг., аўтар прыходзіць да высновы: «Адной з істотных прыкмет таго, што змены, якія адбываліся з нацыянальнай культурай, насілі татальны характар, з’яўляецца змяненне ролі мастацкай літаратуры ў жыцці грамадства. Беларуская культура перастала быць літаратурацэнтрычнай, а пісьменнікі зніклі не толькі з дзяржаўных інстытутаў улады. Але і, па



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

вялікім рахунку, – з цэнтра ўвагі грамадскасці. Яны перасталі ўспрымацца як стваральнікі альтэрнатыўнага светапогляду, аддаўшы гэта права палітыкам і журналістам, і абмежавалі сваю дзейнасць стварэннем мастацкіх тэкстаў, не прэтэндуючы на ісціну ў якой бы то ні было інстанцыі. Толькі асобныя з пісьменнікаў старэйшага пакалення здолелі пераадолець той духоўны крызіс, што быў выкліканы перманентнай зменай мастацкага канона савецкай эпохі і змаглі годна ўвайсці ў Новую літаратурную сітуацыю, узбагаціўшы нацыянальнае пісьменства новымі тэмамі, новымі мастацкімі прыёмамі і недзе больш глыбокім поглядам на жыццё» [295, с. 32–33].

Асноўныя напрамкі і тэндэнцыі развіцця маладой беларускай паэзіі, прозы і драматургіі 1980–1990-х гг., аналіз творчасці найбольш яркіх прадстаўнікоў кожнага літаратурнага жанру прадставіў у сваім даследаванні А. Бельскі [142]. Аўтар прыходзіць да высновы, што «наша літаратура выйшла на шлях гістарычна праўдзівага мыслення, пазбавілася многіх ганебных догмаў, прыкрых стэрэатыпаў мінулага, стала прапаведніцай нацыянальнай ідэі і патрыятызму, чалавекалюбнай філасофіі, нязгаснай трывогі і болю ў век Чарнобыля і іншых бедаў ды няшчасцяў» [126, с. 206]. А. Бельскі – аўтар шматлікіх артыкулаў па акрэсленай тэме [127].

Літаратурную сітуацыю пачатку 1990-х гг., для якой быў характэрны эксперымент і пошукі індывідуальнасці, ахарактарызавала Л. Корань [718].

У 2003 г. пабачыла свет другая кніга чацвёртага тома «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя» [178]. Акрамя раздзелаў, прысвечаных аналізу прозы (С. А. Андраюк), паэзіі (А. І. Бельскі) і драматургіі (С. С. Лаўшук), гэта выданне каштоўнае прыведзенай хронікай літаратурнага жыцця краіны за 1986–2000 гг.

Агляд развіцця прозы і паэзіі незалежнай Беларусі быў прадстаўлены аўтарамі (С. А. Андраюк, Л. Н. Гарэлік) адпаведных раздзелаў энцыклапедычнага даведніка «Сучасная Беларусь» [67, 181].

Аналізу беларускай прозы першага дзесяцігоддзя XXI ст. прысвечаны артыкул І. Шаўляковай [830]. На праблеме постмадэрнізму ў творчасці беларускіх аўтараў засяроджана ўвага ў артыкулах Д. Жукоўскага [238] і М. Шчура [838].

Сучаснаму літаратурнаму працэсу, ролі пісьменніка ў жыцці грамадства была прысвечана рэспубліканская канферэнцыя, якая адбылася ў 2006 г. [759]. Яе ўдзельнікі аналізавалі перадумовы станаўлення новай культурнай парадыгмы ў беларускай літаратуры (Н. В. Дзенісюк), мастацкія пошукі драматургаў (Д. Л. Мамачкін), нетрадыцыйныя жанры ў беларускай паэзіі (Н. М. Пыско), адлюстраванне постчарнобыльскай свядомасці ў прозе (В. В. Стральцова), традыцыі і наватарства ў беларускай літаратуры (А. Туровіч), модусы духоўнай арыентацыі герояў сучаснай беларускай «малой» прозы (І. М. Шаладонаў).

Фантастычны жанр у сучаснай беларускай прозе стаў тэмай артыкула Г. Зенавай [250].

Праблемам творчага пошуку драматургаў, традыцый і наватарства ў новых п’есах канца XX – пачатку XXI ст., раскрыццю ролі драматурга ў абуджэнні нацыянальнай самасвядомасці прысвечаны даследаванні С. С. Лаўшука [378].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасная беларуская драматургія выступае ў якасці прадмета цэласнага мастацтвазнаўчага вывучэння ў даследаванні Ф. В. Драбені [213]. Аўтар на падставе вялікай колькасці твораў разглядае асноўныя напрамкі яе жанрава-стылістычнага развіцця. Безумоўнай заслугай з'яўляецца аналіз сучаснай беларускай драматургіі для дзяцей. Істотным недахопам даследавання з пункту гледжання гісторыка з'яўляецца адсутнасць даціровак напісання п'ес.

Развіццю ***народнага*** выяўленчага і дэкаратыўнага мастацтва Беларусі прысвечана манаграфія Р. Шауры [829]. У асобнай главе разгледжаны стан і шляхі развіцця народнай творчасці на сучасным этапе, структура дзяржаўных і грамадскіх устаноў і арганізацый, іх дзейнасць у сферы народнай творчасці ў 1990-я гады. Шмат увагі нададзена арганізацыйна-змястоўным момантам падрыхтоўкі кадраў для сферы народнай мастацкай творчасці. Сярод іншага аўтар выказваецца за стварэнне бесперапынных адукацыйных структур на аснове паэтапнага, мэтанакіраванага развіцця асобы ад дашкольнага ўзросту да прафесійнай дзейнасці чалавека. Мастацкая адукацыя, па меркаванні даследчыка, таксама павінна базіравацца на бесперапыннасці і пераемнасці працэсу навучання і выхавання [829, с. 227].

Аспекты дзяржаўнай палітыкі ў галіне захавання традыцыйнага мастацтва асвятляюцца ў артыкулах А. М. Макрушыч [410]. Аўтар вызначае два асноўныя напрамкі дзейнасці дзяржаўных устаноў у гэтай сферы: збор і зберажэнне аўтэнтычнага фальклору ў фіксаваных формах, прадметаў народных рамёстваў (промыслаў) і стварэнне механізму заахвочвання дзеячаў і арганізацый, якія займаюцца адраджэннем, захаваннем і папулярызацыяй народнага мастацтва, народных рамёстваў і промыслаў [411, с. 196].

Разнастайныя праблемы, звязаныя як з вызначэннем тэрміна «нематэрыяльная культура», так і з яе фіксацыяй, захаваннем і вывучэннем разгледжаны ў артыкуле прафесара А. І. Смоліка [725]. Аналіз дзейнасці музеяў Беларусі ў канцы 2000-х гг. даў аўтару падставу сцвярджаць, што прыкладна толькі каля 20 % музеяў ад агульнай іх колькасці даволі грунтоўна займаюцца ў сваёй дзейнасці рэпрэзентацыяй нематэрыяльнай культурнай спадчыны [725, с. 238].

Развіццё розных форм аматарскай творчасці Беларусі ў пачатку XXI ст., аналіз яе стану і эффектыўнасці разледжаны ў зборніку артыкулаў супрацоўнікаў кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, які пабачыў свет у 2009 г. [65].

На нашу думку, цікавасць у даследчыкаў могуць выклікаць матэрыялы, якія друкаваліся ў інфармацыйна-аналітычным зборніку, што перыядычна да 2004 г. выдавала Нацыянальная бібліятэка Беларусі, – «Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва». На яго старонках рэгулярна з'яўляліся аналітычныя артыкулы, аўтары якіх аналізавалі становішча, працэсы і тэндэнцыі развіцця беларускага мастацтва, прыводзілі агляды мастацкіх сувязей Беларусі з замежнымі краінамі па гадах, стан і праблемы дзейнасці філармоній, тэатраў, музеяў, творчых калектываў і саюзаў, агляды матэрыялаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыядычнага друку, якія прысвечаны значным падзеям культурнага жыцця краіны [396, 398, 401, 403, 406, 407, 419].

Дастаткова шырока ў навуковых публікацыях разгледжана праблема захавання ***гісторыка-культурнай спадчыны***. Сярод аўтараў – юрыст І. Э. Мартыненка [416–418], культуролаг С. К. Кагановіч [277], мастацтвазнаўца Т. Варфаламеева [147], гісторык і чыноўнік І. Чарняўскі [816].

Розным праблемам культурнага жыцця рэспублікі былі прысвечаны **навукова-практычныя канферэнцыі**. Сярод іх – навуковыя форумы па агульных пытаннях гісторыі [176, 221], праблемах развіцця культуры ў цэлым [206, 263, 430, 813, 814] і асобных яе галін [60, 101, 102, 113, 225, 357, 673, 768], падрыхтоўкі кадраў [711, 750], міжнароднага супрацоўніцтва [98–100, 119, 156, 722, 875], культурных працэсаў у сучаснай Беларусі [5, 791, 844, 846].

Аналіз дазваляе канстатаваць значную колькасць замежных даследаванняў тэарэтыка-метадалагічных праблем культурнай палітыкі. На жаль, пакуль адзінкавыя навуковыя працы, у якіх закранаюцца пытанні станаўлення і рэалізацыі культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Асаблівай увагі патрабуюць праблемы ўзаемаадносін суб'ектаў культурнай дзейнасці, механізмаў рэалізацыі і выніковасці прымаемых рашэнняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глава

# 2

# АСНОЎНЫЯ МЕХАНІЗМЫ РЭАЛІЗАЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ

## 2.1. Распрацоўка палітыка-прававых асноў дзеянняў у сферы культуры

Практычна да 80-х гадоў мінулага стагоддзя працэс рэгулявання галіны культуры Беларусі здзяйсняўся шляхам прыняцця значнай колькасці прыватных рашэнняў па напрамках і сферах культурнай дзейнасці. Непасрэдна Міністэрства культуры рэспублікі займалася распрацоўкай разнапланавых інструкцый і метадычных указанняў. У канцы 1980-х гг. у БССР дзейнічаў толькі адзін рэспубліканскі закон, які датычыў культуры, – «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» (1978).

Уступіўшы ў 1990 г. на самастойны шлях развіцця, беларуская дзяржава яшчэ да прыняцця новай Канстытуцыі заўважна актывізавала сваю заканатворчую дзейнасць. Калі ў папярэднія часы Беларусь у асноўным дубліравала прававыя акты саюзных органаў, то цяпер рэспубліканскія органы прадстаўнічай і заканадаўчай улады імкнуліся заявіць сваю пазіцыю ва ўсіх сферах эканамічнага, палітычнага і сацыяльнага жыцця грамадства. Не засталіся паза ўвагай і пытанні культуры.

Адраджэнне каштоўнасцей культуры, працэсы дэмакратызацыі жыцця грамадства, нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва патрабавалі правядзення работы па стварэнні заканадаўчай базы для паспяховага развіцця культуры, яе асноўных галін. Першым заканадаўчым актам, які вызначаў агульныя контуры дзяржаўнай культурнай палітыкі ў перыяд рэфармавання эканомікі, быў ***Закон «Аб культуры»*** (1991 г.), прыняты 4 чэрвеня 1991 г. Ён быў накіраваны, сярод іншага, на «здзяйсненне прынцыпаў ідэалагічнай і палітычнай незалежнасці культуры ад грамадска-палітычных структур, стварэнне прававых умоў для свабоднага самаразвіцця культурных працэсаў, забеспячэнне матэрыяльных і фінансавых гарантый развіцця культуры» а таксама «сацыяльную абарону работнікаў культуры ва ўмовах рынкавых адносін» [24].

Артыкул 3 сярод асноўных прынцыпаў культурнай дзейнасці замацаваў свабоду творчай дзейнасці, плюралізм напрамкаў і стыляў у творчасці, адмову ад манапалізму ў культуры. Тут жа дэкларавалася абарона інтэлектуальнай уласнасці. Вызначыўшы ў якасці прыярытэту развіццё беларускай нацыянальнай культуры, закон замацоўваў права на бесперашкодную культуратворчую дзейнасць на тэрыторыі краіны для ўсіх нацыянальных супольнасцей.

Артыкул 4 замацаваў права грамадзян Рэспублікі Беларусь на свабоду мастацкай творчасці і права на карыстанне дасягненнямі культуры. Асобна адзначалася права грамадзян краіны займацца любым відам культуранй дзейна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сці (акрамя той, што забаронена законам), аб’ядноўвацца ў творчыя саюзы, асацыяцыі, таварыствы і іншыя культурныя аб’яднанні. Грамадскім аб’яднанням ў сферы культуры быў прысвечаны артыкул 18.

Артыкул 5 дэклараваў абавязак дзяржаўных органаў ва ўзаемадзеянні з грамадскімі аб’яднаннямі ўдасканальваць сістэму сацыяльных, арганізацыйна-прававых і эканамічных гарантый развіцця мастацтва і культуры, фарміраваць сістэму прадпрыемстваў і ўстаноў мастацтва і культуры, весці падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў, ствараць стымулы да мастацкай творчасці.

Асобны артыкул закона (арт. 19) дэклараваў стварэнне дзяржавай умоў для развіцця традыцыйнай культуры.

У сферы прафесійнай творчай дзейнасці артыкул 21 замацаваў гарантыю дзяржавы па стварэнні неабходных умоў для творчага развіцця ўсіх відаў прафесійнага мастацтва і літаратуры, архітэктуры і дызайну, работы народных майстроў. Гэта павінна было забяспечвацца сістэмай эканамічных, сацыяльных і прававых гарантый, атрымання бясплатных адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі, павышэннем кваліфікацыі, правам свабоднага аб’яднання ў творчыя саюзы (асацыяцыі, таварыствы, суполкі), прыняццем мер па сацыяльнай абароне прафесійных творчых работнікаў.

Палажэнне артыкула 3 аб свабодзе творчай дзейнасці падрабязна выкладзена ў асобным артыкуле закона (арт. 22). Адпаведна яму кожны з суб’ектаў творчасці меў права самастойна вызначаць змест, форму, жанр, мову, стыль твораў мастацтва і культуры. Прадпрыемствы і ўстановы культуры, творчыя арганізацыі і калектывы самастойна зацвярджалі свае творчыя планы і вызначалі рэпертуарную палітыку, неслі адказнасць за арганізацыйна-творчую дзейнасць, вызначаную ў адпаведнасці з іх статутамі і палажэннямі.

У якасці крытэрыяў сацыяльнай значнасці твораў мастацтва і культуры закон вызначаў сцвярджэнне нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, фарміраванне высокіх грамадзянскіх і маральных якасцей, арыгінальнасць, высокія мастацкі і эстэтычны ўзроўні.

Для рашэння пэўных культурных задач, стымулявання творчага пошуку органам кіравання культурай надавалася права даваць мэтавыя творчыя заказы (у тым ліку і на конкурснай аснове) прадпрыемствам, установам, арганізацыям культуры, творчым калектывам, дзеячам культуры і мастацтва з іх згоды на стварэнне новых твораў мастацтва, канцэртных праграм і аказанне культурных паслуг (арт. 23).

Кожны творчы калектыў і выканаўца меў права праводзіць у любы час у любым населеным пункце краіны гастролі па прамым сувязям на падставе дамоваў з дзяржаўнымі органамі мясцовага самакіравання, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі (арт. 25).

У законе знайшлі ўвасабленне абавязкі дзяржавы па матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні культуры (арт. 40), аплаце працы і сацыяльным гарантыям работнікам культуры (раздзел IX).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Артыкул 45 прадугледжваў падаткаабкладанне аўтарскіх ганарараў адпаведна заканадаўству краіны, а артыкул 46 дэклараваў абарону аўтарскіх правоў.

Асобны раздзел X закона быў накіраваны на прававое забеспячэнне пытанняў падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і атэстацыі кадраў.

На парадку дня востра стаялі і патрабавалі заканадаўчага замацавання пытанні ратыфікацыі міжнародных канвенцый ЮНЕСКА ў галіне культуры; фарміравання развітай рыначнай інфраструктуры культуры, з аднаго боку, і адлюстравання статусу некамерцыйных прадпрыемстваў культуры – з другога; падключэння да сусветных сетак інфармацыйнага банка звестак аб культуры [438, спр. 2060, арк. 129].

У той час у мэтах рэалізацыі Закона «Аб культуры» бачылася неабходнасць распрацоўкі і прыняцця сістэмы заканадаўчых актаў. Сярод іх называліся: аб бібліятэках; аб ахове і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны; аб тэатрах і тэатральна-відовішчных прадпрыемствах; аб кіно і кінапракаце; аб музеях і запаведніках; аб мастацкіх промыслах і рамёствах [438, спр. 2072, арк. 82].

Акрамя гэтага, прапаноўвалася прыняцце шэрага пастаноў Урада Рэспублікі Беларусь па пытаннях дзейнасці прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і органаў культуры і пытаннях культурнай дзейнасці. Пералік апошніх дазваляе вызначыць прыярытэтныя напрамкі планаваных у той час сумесных дзеянняў дзяржавы ў галіне культуры. Напрыклад, прапаноўвалася падрыхтаваць пастанову Урада аб распрацоўцы норм забяспечанасці населеных пунктаў установамі культуры і праграму рэалізацыі прыярытэтаў развіцця культуры; аб стварэнні рэспубліканскай экспертнай камісіі і парадку вывазу культурных каштоўнасцей за мяжу; аб унясенні дапаўненняў у горадабудаўнічыя нарматывы; аб мерах па вяртанні культурных каштоўнасцей. Цікавым падаецца прапанова аб распрацоўцы пастановы аб абмежаванні, забароне і прыпыненні культурных акцый [438, спр. 2060, арк. 130].

У той час востра стаяла праблема змены нарматыўных дакументаў, якія рэгулявалі фінансава-эканамічную дзейнасць устаноў культуры, адмены састарэлых саюзных пастаноў. Фактычна да другой паловы 1990-х гг. па шэрагу аспектаў фармальна лічыліся дзейнічаючымі, а ў некаторых выпадках і выкарыстоўваліся нормы заканадаўства СССР і БССР, якія супярэчылі ці не адпавядалі зместу Закона «Аб культуры». А канкрэтныя нарматыўныя акты, якія б зыходзілі з яго зместу, яшчэ не былі прыняты. Не была праведзена сістэматызацыя нормаў новага заканадаўства краіны, якія прама рэгламентавалі культурную дзейнасць ці мелі адносіны да яе. Гэта, напрыклад, парадак ліцэнзавання, крэдытавання, выпуску каштоўных папер, стварэння грамадскіх аб’яднанняў, рэгуляванне дзейнасці органаў улады і кіравання, знешнеэканамічная і міжнародная дзейнасць, рэгістрацыя прадпрыемстваў, матэрыяльнае забеспячэнне, цэнаўтварэнне, падаткаабкладанне, працоўныя адносіны, прыватызацыі і раздзяржаўленне [814, с. 63].

Як заўважала ў 1996 г. В. Захарошка, закон «рэальна ўстанаўлівае толькі асновы дзяржаўнай культурнай палітыкі. Сёння [1996 г.] не існуе дакладных

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

прынцыпаў размеркавання мясцовых бюджэтаў пры рэзка ўзрастаючых выдатках апошніх на забеспячэнне камунальных службаў, гарадской гаспадаркі, грамадскага транспарту. Недастаткова эфектыўна рэалізуецца функцыя падатковага заканадаўства – стымуляванне развіцця працэсаў самафінансавання прадпрыемстваў галіны. Сістэма дзяржаўных пошлін на вываз вырабаў народнай промыслаў робіць апошнія неканкурэнтаздольнымі на сусветным рынку, што перашкаджае пранікненню самабытнай беларускай культуры ў сферу міравой культуры» [814, с. 61–62].

Права грамадзян на ўдзел у культурным жыцці было замацавана ў артыкуле 51 ***Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь***. Адпаведна Асноўнаму закону, яно забяспечвалася агульнай даступнасцю каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, якія знаходзіліся ў дзяржаўных і грамадскіх фондах, развіццём сеткі культурна-асветных устаноў. Канстытуцыя гарантавала свабоду мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці і выкладання, замацавала адказнасць дзяржавы за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, пражываючых на тэрыторыі дзяржавы (арт. 15); надала статус дзяржаўнай беларускай і рускай мовам (арт. 17), роўныя правы жанчынам з мужчынамі ў культурнай дзейнасці, гарантавала права моладзі на духоўнае і маральнае развіццё, стварэнне дзяржавай неабходных умоў для свабоднага і эфектыўнага ўдзелу моладзі ў культурным развіцці (арт. 32); гарантавала права грамадзянам на атрыманне, захаванне і распаўсюджанне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб культурным жыцці (арт. 34); права кожнага захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, карыстацца роднай мовай і выбіраць мову зносін (арт. 50); абавязак кожнага берагчы гісторыка-культурную, духоўную спадчыну і іншыя нацыянальныя каштоўнасці (арт. 54).

Развіццё нацыянальнага заканадаўства ў 1990-х гг. прывяло да ўзнікнення мноства юрыдычных калізій і няўзгодненасці паміж Законам Рэспублікі Беларусь «Аб культуры» і прынятымі пазней нарматыўнымі прававымі актамі. Напрыклад, у частцы першай артыкула 4 Закона «Аб культуры» было замацавана права грамадзян Рэспублікі Беларусь на карыстанне дасягненнямі культуры, у той жа час у артыкуле 51 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, сфармуляванага з улікам Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека 1948 г. і Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах 1966 г., было абвешчана іншае па сваім змесце і суб'ектах права – права кожнага на ўдзел у культурным жыцці.

Існавалі і іншыя як тэрміналагічныя, так і змястоўныя разыходжанні паміж Законам Рэспублікі Беларусь «Аб культуры» і Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь «Аб падатках і зборах, што збіраюцца ў бюджэт Рэспублікі Беларусь», «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» і іншымі заканадаўчымі актамі [439, спр. 753, арк. 85].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Закон «Аб культуры» рэдакцыі 1991 г. меў мноства юрыдычных, тэхнічных і змястоўных недахопаў: у ім не было замацавана тэрміналагічнае адзінства, не вызначана сістэма тыпаў арганізацый культуры ў залежнасці ад характару іх дзейнасці, адсутнічалі нормы, якія б замацоўвалі асновы прававога становішча тэатраў, цыркаў і канцэртных арганізацый, клубных устаноў і паркаў, а таксама спецыфічных суб'ектаў творчай дзейнасці – калектываў мастацкай творчасці, не быў вызначаны ўзровень прававога рэгулявання, на якім павінны развівацца і дэталізавацца агульныя нормы закона [439; 753, арк. 85].

Вынікам стала прыняцце спачатку змен (2001 г.), а затым і новай (у 2004 г.), значна пашыранай ***рэдакцыі закона «Аб культуры»*** [46]. У змест быў уключаны шэраг новых артыкулаў. Напрыклад, артыкул 38 вызначыў дзейнасць тэатральна-відовішчных устаноў. З'яўленне такога артыкула было вельмі своечасовым, паколькі раней адсутнічаў заканадаўчы акт, які рэгуляваў такую дзейнасць. У новай рэдакцыі закона шмат увагі было нададзена асаблівасцям прававога становішча і парадку дзейнасці арганізацый культуры. Упершыню асобная глава (5) была адведзена калектывам мастацкай творчасці. У ёй быў вызначаны статус прафесійных і аматарскіх калектываў, якія не з'яўляюцца арганізацыямі культуры, парадак іх стварэння і адносіны паміж заснавальнікамі, закрануты пытанні кіравання, правоў і г. д.

Асобны артыкул (6) быў прысвечаны пытанням свабоды творчай дзейнасці (уключаючы аўтэнтычна-фальклорную дзейнасць), пад якой разумелася права выбару напрамкаў, прыёмаў і метадаў творчай дзейнасці, самастойнага вызначэння яе формы і зместу, жанру, мовы, стылю і ажыццяўлялася як на прафесійнай, так і на аматарскай аснове.

Закон акрэсліў выпадкі, калі дзяржаўныя органы (арганізацыі), іх службовыя асобы, юрыдычныя і фізічныя асобы маглі ўмешвацца ў творчы працэс. Пры гэтым акрэслівался, што не з'яўляюцца ўмяшаннем у творчы працэс дзеянні, заснаваныя на дагаворы з суб'ектам творчай дзейнасці аб стварэнні і выкарыстанні вынікаў творчага працэсу (арт. 6).

Непасрэдна творчая дзейнасць, уключаючы аўтэнтычна-фальклорную дзейнасць, магла ажыццяўляцца як на прафесійнай, так і на непрафесійнай (аматарскай) аснове, як індывідуальна, так і на калектыўнай аснове (арт. 7).

Закон пацвердзіў права суб'ектаў культурнай дзейнасці пры распаўсюджванні і папулярызацыі вынікаў творчай дзейнасці самастойна вызначаць рэпертуарную палітыку і змест культурных праграм, распаўсюджваць і папулярызаваць творы мастацкай літаратуры і мастацтва, розныя па відах, напрамках (школах), форме і змесце, жанры, мове, стылю; папулярызаваць творчасць розных аўтараў, выканаўцаў і калектываў мастацкай творчасці. У асобных выпадках, прадугледжаных законам, магла быць накладзена забарона або абмежаванне апублікавання, публічнага выканання і паказу твораў мастацкай літаратуры і мастацтва, абнародавання іх іншым спосабам, забарона або абмежаванне правядзення іншых культурных мерапрыемстваў (арт. 9).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўнымі мэтамі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры закон вызначыў (арт. 10):

забеспячэнне і абарона канстытуцыйнага права кожнага на ўдзел у культурным жыцці;

устанаўленне гарантый свабоды мастацкай творчасці і іншай творчай дзейнасці;

садзейнічанне захаванню, развіццю і распаўсюджванню культуры на карысць інтарэсаў чалавека і грамадства;

сацыяльная абарона работнікаў культуры і творчых работнікаў;

абарона грамадскай маралі, сцвярджэнне гуманістычных ідэй і высокіх маральных пачаткаў у грамадскім жыцці, фарміраванне эстэтычнага жыццёвага асяроддзя;

развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне культуры.

Прыярытэтамі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры былі названы:

захаванне, развіццё і распаўсюджванне беларускай нацыянальнай культуры і мовы;

стварэнне, распаўсюджванне і папулярызацыя твораў мастацкай літаратуры і мастацтва для дзяцей і моладзі;

стварэнне ўмоў для эстэтычнага выхавання, мастацкай і культуралагічнай адукацыі дзяцей і моладзі;

папулярызацыя класічных твораў мастацкай літаратуры і мастацтва, іншых эстэтычных і маральных каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры;

забеспячэнне функцыянавання і развіцця культуры ў сельскай мясцовасці.

Закон гарантаваў усім грамадзянам Рэспублікі Беларусь, замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства дастойны ўзровень культурнага жыцця; атрыманне, захоўванне і распаўсюджванне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб культурным жыцці; удзел у культурным жыцці; свабоду творчай дзейнасці; захаванне і развіццё нацыянальных культурных традыцый; ахову інтэлектуальнай уласнасці ў галіне культуры; эстэтычнае выхаванне, мастацкую і культуралагічную адукацыю; свабоду аб'яднанняў у галіне культуры; стварэнне арганізацый культуры (арт. 15–20).

Сярод абавязкаў грамадзян Рэспублікі Беларусь было вызначана зберажэнне гісторыка-культурнай, духоўнай спадчыны і іншых нацыянальных культурных каштоўнасцей, павага да культуры і мовы ўсіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць у нашай краіне.

Артыкул 21 закона дае ўяўленне аб відах і тыпах арганізацый культуры, што дазваляе канстатаваць, што работнікаў апошніх можна з поўнай упэўненасцю аднесці да катэгорыі «работнікі сферы культуры». Арганізацыі культуры ў Рэспубліцы Беларусь па форме ўласнасці падзяляюцца на дзяржаўныя і прыватныя, па асноўнай мэце дзейнасці – на камерцыйныя і некамерцыйныя. Асноўныя тыпы арганізацый культуры – бібліятэкі; музеі; карцінныя, мастацкія галерэі і галерэі мастацтваў, выставачныя залы, панарамы і іншыя выставачныя арганізацыі ў галіне культуры; клубы, палацы (дамы, цэнтры) культуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэнтры (дамы) народнай творчасці (народнага мастацтва, фальклору), цэнтры (дамы) рамёстваў, маладзёжныя культурныя цэнтры, цэнтры нацыянальных культур і іншыя клубныя ўстановы; паркі культуры і адпачынку, гарадскія сады, заапаркі, заасады; кніжныя палаты; тэатры; цыркі; філармоніі і іншыя канцэртныя арганізацыі; арганізацыі кінематаграфіі; творчыя майстэрні; арганізацыі народных промыслаў (рамёстваў); навукова-праектныя і вытворчыя рэстаўрацыйныя арганізацыі; навукова-даследчыя ўстановы і метадычныя цэнтры народнай творчасці (культурна-асветніцкай работы). Усе арганізацыі па відах дзейнасці былі падзелены на дзве групы – культурна-асветныя і тэатральна-відовішчныя.

З мэтай стымулявання творчага пошуку, падтрымкі таленавітых аўтараў і выканаўцаў Міністэрству культуры Рэспублікі Беларусь рэдакцыяй закона 2004 г. было прадстаўлена права размяшчаць у суб'ектаў культурнай дзейнасці сацыяльна-творчыя заказы – дагаворы на стварэнне новых твораў мастацкай літаратуры, фільмаў, тэатральных пастановак і канцэртных праграм, арганізацыю і правядзенне выставак, фестываляў, аглядаў, конкурсаў і іншых культурных мерапрыемстваў.

Значная ўвага была нададзена перыядычнаму перагляду дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў у галіне культуры і забеспячэнню іх рэалізацыі, прыняццю мер па стварэнні комплексу дзяржаўных арганізацый культуры, які б гарантаваў задавальненне асноўных духоўных патрэб насельніцтва з улікам пэўных гістарычных, нацыянальных і геаграфічных асаблівасцей мясцовасці.

Для стымулявання дабрачыннай і спонсарскай дзейнасці ў галіне культуры фізічным і юрыдычным асобам, якія ажыццяўлялі гэту дзейнасць, закон дэклараваў прадстаўленне льготы.

У мэтах правядзення фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў у галіне культуры законам было прадугледжана стварэнне навукова-даследчых устаноў, метадычных цэнтраў народнай творчасці, культурна-асветніцкай работы.

Згодна з апошняй рэдакцыяй закона, прафесійным і аматарскім калектывам, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай культуры і маюць адметныя дасягненні ў галіне мастацтва на працягу 10 гадоў, маглі быць прысвоены званні «заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь» і «заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь», а пастаянна дзеючым аматарскім калектывам пры наяўнасці адпаведнага мастацкага ўзроўню і творчых паказчыкаў – званне «народны» («узорны»), прафесійным калектывам, якія з'яўляюцца арганізацыямі культуры і ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай культуры і мастацтва, мог быць прысвоены статус «нацыянальны», «акадэмічны».

Законам таксама былі вызначаны прыярытэты міжнароднага культурнага супрацоўніцтва – захаванне і ахова культурных каштоўнасцей, міжнародны культурны абмен, культурныя сувязі з суайчыннікамі, якія пражываюць за

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мяжой, навукова-даследчая дзейнасць у галіне культуры, правядзенне фестываляў, конкурсаў, аглядаў і іншых культурных мерапрыемстваў.

Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь у раздзеле V «Інтэлектуальная ўласнасць» змяшчаў главу, прысвечаную аўтарскаму праву і сумежным правам. Такім чынам, фарміраванне ў Беларусі заканадаўства ў галіне інтэлектуальнай уласнасці забяспечыла ўключэнне ў эканамічны абарот прадуктаў інтэлектуальнай дзейнасці, узнікненне і станаўленне ў рэспубліцы ўнутрыдзяржаўнага рынку ліцэнзій. У сувязі з гэтым даследчыкі і распрацоўшчыкі сталі больш увагі надаваць заканадаўчаму афармленню правоў на вынікі сваёй працы, што пацвярджалася пастаянным павелічэннем колькасці пададзеных заявак на ахову правоў і існаваннем пацвярджаючых гэтыя правы дакументаў» [106, с. 58].

На канец 2010 г. заканадаўчая база сферы культуры складалася з наступных законаў: «Аб культуры» (1991, новая рэдакцыя 2004), «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» (1992, новы закон 2006), «Аб музеях і музейным фондзе» (1996, новы закон 2005), «Аб кінематаграфіі» (2004), «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах)» (1999), «Аб творчых саюзах і творчых работніках» (1999), «Аб бібліятэчнай справе» (1995, новая рэдакцыя 2002), «Аб нацыянальным архіўным фондзе і архівах» (1994, новая рэдакцыя 1999), «Аб нацыянальных меншасцях» (1992), «Аб ахове аўтарскіх і сумежных правоў» (1996), «Аб асновах архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» (1996).

У пачатку 1990-х гг. у краіне былі створаны ***юрыдычныя падставы для развіцця прыватнай ініцыятывы ў сферы культуры***. Артыкул 17 Закона «Аб уласнасці» [533], уведзенага ў дзеянне 1 студзеня 1991 г., сярод аб’ектаў права прыватнай уласнасці называў аб’екты культуры і мастацтва. Артыкул 9 закона вызначыў тры формы ўласнасці: прыватную, калектыўную і дзяржаўную.

Згаданыя палажэнні знайшлі сваё адлюстраванне ў законах, якія непасрэдна датычылі сферы культуры. Так, у артыкуле 15 Закона «Аб культуры» [24] гаварылася аб тым, што дзяржава гарантуе развіццё разнастайных па тыпах і відах дзейнасці прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры. Пры гэтым віды і юрыдычныя формы апошніх вызначаліся згаданым вышэй законам, а таксама законам «Аб прадпрыемствах у Рэспубліцы Беларусь». Непасрэдна ў тэксце закона «Аб культуры» слова «прыватныя» згадваецца толькі двойчы – у адносінах да бібліятэк (арт. 33: «гарантуецца развіццё і дзейнасць кааператыўных і прыватных бібліятэк») і музеяў (арт. 34).

Побач з гэтым закон прадугледжваў магчымасць стварэння дзейнічаючых на гаспадарчым разліку выставачных залаў, карцінных галерэй, павільёнаў (арт. 27), канстатаваў права юрыдычных і фізічных асоб у рамках дзеючага заканадаўства на стварэнне і дзейнасць прадпрыемстваў кіна-, відэапаказу, а таксама кінатэатраў, кінаўстановак, відэазалаў і відэасалонаў (частка 2-я арт. 28).

У наступныя гады ў краіне быў прыняты шэраг нарматыўных прававых актаў, якія дэталізавалі прававыя рамкі прыватнай ініцыятывы ў сферы культуры. Напрыклад, права на стварэнне прыватных музеяў было замацавана ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Інструкцыі аб парадку стварэння і адкрыцця музеяў і іх экспазіцый» [13]. Дакумент быў распрацаваны ў адпаведнасці з прынятым у 1996 г. Законам «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь». Да музеяў, заснаваным на недзяржаўнай форме ўласнасці, былі аднесены музеі недзяржаўных прадпрыемстваў, арганізацый, аб'яднанняў і ўстаноў, а таксама прыватныя музеі. Інструкцыя вызначала, што прыватныя музеі могуць стварацца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь пры наяўнасці рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей, а таксама пры ўмове іх экспанавання, захаванасці і прэзентацыі наведвальнікам.

У 2001 г. у закон «Аб культуры» былі ўнесены змены, і з назвы артыкула зніклі словы «юрыдычныя формы», а таксама частка другая [528].

У новай рэдакцыі «Закона аб культуры» [46] (2004) у адпаведнасці з палажэннямі Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь было замацавана палажэнне аб тым, што па форме ўласнасці арганізацыі культуры дзеляцца на дзяржаўныя і прыватныя, а па мэтах дзейнасці – на камерцыйныя і некамерцыйныя (арт. 21). Акрамя гэтага, артыкул 15 закона дэклараваў права грамадзян Рэспублікі Беларусь на стварэнне арганізацый культуры (п. 1.9).

Значны ўплыў на развіццё культурнай палітыкі аказвалі ***нормы міжнароднага права***. Па стане на 2010 г. Рэспубліка Беларусь з'яўлялася ўдзельніцай наступных міжнародных Канвенцый у сферы культуры: Бернскай канвенцыі аб ахове літаратурных і мастацкіх твораў (Парыжскага акта ад 24 ліпеня 1971 г., змененага 28 верасня 1979 г.), Канвенцыі ЮНЕСКА па абароне сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, Канвенцыі ЮНЕСКА па абароне культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту, Еўрапейскай культурнай канвенцыі, Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыражэння.

Удзел у канвенцыях дазваляў Беларусі абменьвацца з іншымі краінамі-удзельніцамі спецыяльнымі ведамі і вопытам, выкарыстоўваць новыя тэхналогіі і стымуляваць партнёрскія сувязі для пашырэння абмену інфармацыяй і паляпшэння культурнага ўзаемаразумення, атрымаць больш шырокі доступ да глабальнага рынку і міжнародных сетак распаўсюджання культурных тавараў і паслуг.

У канцы 2000 г. Урад Рэспублікі Беларусь і Сусветная арганізацыя інтэлектуальнай уласнасці падпісалі сумесную Праграму супрацоўніцтва. У мэтах яе далейшага развіцця 11 чэрвеня 2003 г. уступіў у сілу Мемарандум «Аб узаемаразуменні паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Сусветнай арганізацыяй інтэлектуальнай уласнасці».

Сярод мэт, якія адзначаны ў гэтым дакуменце, – удасканаленне беларускага нацыянальнага заканадаўства ў галіне інтэлектуальнай уласнасці з улікам вопыту, набытага іншымі краінамі, і міжнародных тэндэнцый гарманізацыі грамадства; абарона традыцыйных ведаў і фальклору з дапамогай сістэмы інтэлектуальнай уласнасці і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Разуменне неабходнасці пошуку выхаду з крызіснага стану прывёў у сярэдзіне 1990-х гг. да пачатку выкарыстання ***праграмна-мэтавага падыходу***. У 1991 г. Міністэрства культуры ў адпаведнасці з планам дзейнасці Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы аб стабілізацыі эканомікі і сацыяльнай абароне насельніцтва займалася распрацоўкай канцэпцыі і праграмы развіцця культуры да 2000 г. [438, спр. 2060, арк. 113]. Праграма павінна была ўключаць канцэпцыю адраджэння і развіцця беларускай нацыянальнай культуры; палажэнні аб рэалізацыі прыярытэтаў развіцця культуры ў Беларусі. У якасці асобных прапаноўвалася распрацаваць праграмы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння культуры; адраджэння гісторыка-культурнай спадчыны і рэгіянальна-этнічнага аблічча населеных месцаў рэспублікі; аднаўлення старажытных гарадоў, пасяленняў і стварэння міжнароднага турыстычнага кальца «Белая Русь». Да гэтага пераліку неабходна дадаць праграмы, распрацоўка якіх пачалася ў 1991 г.: прыярытэтнага развіцця сферы культуры сяла; развіцця культуры малых гарадоў; эстэтычнага выхавання дзяцей; далучэння насельніцтва рэспублікі да мастацкай культуры; стварэння рэспубліканскага культурна-турыстычнага цэнтра ў г. Мінску; пашпартызацыі аб'ектаў культуры і стварэнне камп'ютарнага банка дадзеных; уваходжання арганізацый і прадпрыемстваў Міністэрства культуры ў рыначныя адносіны; адраджэння традыцыйных мастацкіх промыслаў і рамёстваў [438, спр. 2060, арк. 128–129].

У першай палове 1990-х гг. былі здзейснены праграмы «Родная мова», «Спадчына», «Памяць», «Вольны час». У 1994–1996 г. дзейнічала «Праграма дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры».

Эканамічны крызіс унёс істотныя карэктывы ў планы. У лютым 1992 г. была прынята галіновая Праграма дзеянняў па пераадоленні эканамічнага крызісу ў культуры на 1993–1994 гг. У ёй былі вызначаны меры эканамічнага, арганізацыйнага і прававога характару для вырашэння праблемы культурнага развіцця грамадства краіны. Сутнасць праблемы бачылася ў неадпаведнасці (і нават супярэчнасці) існуючых арганізацыйных форм культурнай дзейнасці, інфраструктуры, матэрыяльна-тэхнічнага і кадравага забеспячэння ўстаноў культуры, характару стыхійнага культурнага самавызначэння грамадства новым мэтам і задачам дзяржаўнай культурнай палітыкі [439, спр. 1, арк. 36–41].

Адсутнасць рашэння гэтай праблемы ў кантэксце праблем эканомікі культуры праяўлялася ў выглядзе нерацыянальнага выкарыстання фінансавых і культурных рэсурсаў, неабгрунтаванага скарачэння сеткі ўстаноў культуры і мастацтва, скарачэння колькасці спажыўцоў традыцыйных формаў культурнага абслугоўвання, калі сродкі, якія выдаткоўваліся дзяржавай на культурныя паслугі, перацякалі ў пазабюджэтную сферу.

У праграме адзначалася, што ў пераходны перыяд да рыначнай эканомікі дзяржава, у асобе Міністэрства культуры, аб'ектыўна застаецца асноўным гарантам, які павінен забяспечыць усялякую падтрымку культурнай дзейнасці. Асноўная задача дзяржаўнай культурнай палітыкі ў гэты перыяд бачылася ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захаванні культурнага патэнцыялу нацыі і кантролі над зменамі, якія адбываліся ў сферы культуры.

Адпаведна праграме стратэгічнымі напрамкамі дзейнасці дзяржавы па пераадоленні крызісных з'яў у эканоміцы культуры павінны былі стаць: распрацоўка прававога і сацыяльна-эканамічнага механізма забеспячэння культурнай дзейнасці на аснове Закона «Аб культуры»; забеспячэнне эфектыўнага выкарыстання дзяржаўных сродкаў і сродкаў Фонду развіцця культуры і мастацтва; стварэнне спрыяльных умоў для паступлення сродкаў з пазабюджэтных крыніц фінансавання культуры; забеспячэнне развіцця навукова-метадычнага і кадравага патэнцыялу для ажыццяўлення культурнай дзейнасці ў рыначных умовах [439, спр. 1, арк. 36–41].

У адпаведнасці з пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 229 ад 1 красавіка 1996 г. «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай падтрымцы культуры» Міністэрствам культуры па ўзгадненні з зацікаўленымі цэнтральнымі органамі кіравання быў вызначаны шэраг напрамкаў дзейнасці і асобных праектаў у сферы культуры [439, спр. 106, арк. 51]. Сярод іх: распрацоўка законаў Рэспублікі Беларусь «Аб тэатральна-відовішчных прадпрыемствах», «Аб народных мастацкіх промыслах і рамёствах», «Аб ахове фальклору», забеспячэнне дзейнасці вучэбных тэатральных студый, стварэнне Вышэйшых курсаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы спецыялістаў тэатральнага мастацтва, пастаноўка штогод па дзяржзаказе не менш за 50 назваў п'ес беларускай і класічнай драматургіі [439, спр. 97, арк. 80–84].

У другой палове 1990-х гг. зноў вярнуліся да пытання распрацоўкі дзяржаўнай праграмы развіцця культуры. Аб неабходнасці такога дакумента выказаўся Прэзідэнт краіны ў час сустрэчы з дзеячамі культуры 29 снежня 1997 г.: «Гэта павінна быць усеабдымная праца з вялікай перспектывай. Яна павінна стаць асновай для вырашэння важнейшых праблем, пачынаючы ад падрыхтоўкі кадраў для ўсіх сфер культуры і заканчваючы канкрэтнымі метадычнымі распрацоўкамі па кожнаму віду і напрамку дзейнасці» [790].

У чэрвені 1998 г. прайшлі парламенцкія слуханні па пытанні «Дзяржаўная нацыянальная праграма "Культура" і ўдасканаленне заканадаўчай базы галіны ў Рэспубліцы Беларусь» [439, спр. 285, арк. 53]. Выказаныя прапановы былі абагульнены, і на іх падставе Міністэрства культуры распрацавала рэкамендацыі для выкарыстання аблвыканкамам і Мінскім гарвыканкамам у падрыхтоўцы рэгіянальных праграм развіцця культуры і мастацтва на 2000–2005 гг. У лістападзе 1998 г. на калегіі Міністэрства культуры было разгледжана пытанне аб праграмах развіцця культуры і мастацтва абласцей рэспублікі на 1999–2005 гг. Праграмы ўлічвалі існаваўшы на той момант стан развіцця культуры ў рэгіёнах і былі прызначаны забяспечыць захаванне тыпу традыцыйнай культуры, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры, сацыяльную падтрымку творчай інтэлігенцыі, стварэнне ўмоў для эстэтычнага выхавання дзяцей і моладзі [439, спр. 210, арк. 11–76]. На Магілёўшчыне асаблівая ўвага была нададзена стварэнню матэрыяльнай базы, канцэнтрацыі

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

сродкаў па стратэгічных напрамках, укараненне комплекснай сістэмы прапаганды выяўленчага мастацтва. Сістэма развіцця народных промыслаў была прыярытэтам на Віцебшчыне, захаванне ўнікальнай народнай творчасці – на Гомельшчыне, праграмная форма стымулявання культурных працэсаў – у Мінскай вобласці. Праграма Брэстчыны вызначылася стварэннем сістэмы эстэтычнага выхавання, курсам на развіццё мастацкай самадзейнасці. На Гродзеншчыне планавалася шмат увагі надаць выкарыстанню рэгіянальных асаблівасцей з улікам этнічных і прафесійных умоў духоўнага жыцця рэгіёна [439, спр. 277, арк. 40].

Распрацаваная па даручэнні кіраўніка краіны Дзяржаўная праграма «Функцыяніраванне і развіццё культуры да 2005 года» [208] была прынята ў 2001 г. Сярод яе прыярытэтаў былі: захаванне фальклору; падтрымка тэатраў і кінематаграфіі; развіццё прафесійнага мастацтва; інфарматызацыя сферы культуры.

У напрамку забеспячэння рэалізацыі палажэнняў Дзяржаўнай праграмы за перыяд 2001–2005 гг. Міністэрства культуры прыняло праграмы: інфарматызацыі галіны; развіцця тэатральнай справы; развіцця кінавідэамастацтва; захавання і развіцця народнай творчасці; праграму работы з кадрамі; канцэпцыю развіцця музейнай справы; перспектыўныя планы ўмацавання матэрыяльнай базы і рэстаўрацыі аб'ектаў культуры; праграму развіцця гастрольнаканцэртнай дзейнасці і інш.

У далейшым распрацоўка і зацвярджэнне дзяржаўных праграм захавання і развіцця культуры, забеспячэнне іх выканання як адзін з напрамкаў дзяржаўнага кіравання ў галіне культуры быў замацаваны ў артыкуле 12 рэдакцыі Закона «Аб культуры» 2004 г. Дадзены артыкул звяртаў увагу на неабходнасць уліку магчымасцей уздзеяння вынікаў рэалізацыі дзяржаўных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця на захаванне і развіццё культуры, а таксама ўздзеянне самой культуры на гэтыя вынікі.

У працяг рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры ў 2006 г. была падрыхтавана Галіновая праграма «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.» (зацверджана калегіяй Міністэрства культуры 30 мая 2006 г. № 40) [168].

Перспектывы развіцця культуры краіны знайшлі адлюстраванне і ў больш шырокіх праграмах, якія распрацоўваліся ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 1998 г. № 157-З «Аб дзяржаўным прагназаванні і праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь». Так, Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь, ухваленая пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 сакавіка 1997 г. № 255, прадугледжвала мадэрнізацыю эканомікі і грамадства, зыходзячы з існаваўшых на той час тэндэнцый сусветнага эканамічнага развіцця, шматвектарнай накіраванасці знешнеэканамічнай дзейнасці ў адпаведнасці з інтарэсамі краіны пры захаванні суверэнітэту дзяржавы. Яна базіравалася на рацыянальным спалучэнні рэгулюючых функцый дзяржавы ў забеспячэнні спрыяльных умоў гаспадарання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з развіццём прыватнай ініцыятывы і эфектыўным рынкавым механізмам гаспадарання.

У Асноўных напрамках сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2010 г., прынятых у 2000 г., прадугледжвалася ў акрэслены перыяд закласці асновы фарміравання новага постіндустрыяльнага грамадства і развіваць механізм дзеяння *сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі* [581]. Як важнейшая задача вызначалася інтэнсіўнае развіццё турыстычнай інфраструктуры. Ставілася задача шырэй уцягваць гісторыка-культурныя каштоўнасці краіны ў індустрыю турыстычнага бізнесу. У якасці адной з асноўных мэт дзяржаўнай палітыкі называлася адраджэнне і развіццё нацыянальнай культуры. Пры гэтым акрэсліваліся і першачарговыя задачы: захаванне дзеючай сеткі ўстаноў культуры і якаснае яе развіццё; умацаванне і абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы; забеспячэнне разнастайнасці культурнага жыцця і даступнасці паслуг устаноў культуры для ўсіх слаёў грамадства; істотнае павышэнне ўзроўню культурнага абслугоўвання; укараненне новых мадэляў і тыпаў устаноў культуры.

Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2001–2005 гг. [585] вызначала ў якасці адной з асноўных мэт дзяржаўнай палітыкі адраджэнне і развіццё нацыянальнай культуры, наданне ёй як аднаму з важнейшых кампанентаў духоўнага жыцця грамадства прыярытэтнага напрамку ў сацыяльна-эканамічным жыцці краіны. Прадугледжвалася павысіць уплыў культуры на ўсе сферы грамадскага жыцця, станаўленне дзяржаўнасці, фарміраванне спрыяльнага жыццёвага асяроддзя нацыі, умацаванне міжнароднага аўтарытэту Беларусі. Для дасягнення пастаўленых мэт праграма прадугледжвала рэалізацыю наступных задач: захаванне і якаснае нарашчэнне сеткі ўстаноў культуры; умацаванне і абнаўленне яе матэрыяльна-тэхнічнай базы; забеспячэнне даступнасці і разнастайнасці паслуг устаноў культуры для ўсяго насельніцтва; захаванне гісторыка-культурнай спадчыны.

У праграме звярталася ўвага на тое, што асноўныя напрамкі нацыянальнай культурнай палітыкі і прыярытэты развіцця галіны вызначаны Дзяржаўнай праграмай «Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г.».

Комплекс мер па вядучых напрамках дзейнасці ў сферы культуры прадугледжвала распрацаваная ў 2004 г. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. У якасці галоўнай мэты развіцця культуры да 2010 г. было вызначана развіццё і ўмацаванне інфраструктуры галіны для забеспячэння доступу жыхароў да культурных даброт і інфармацыйных рэсурсаў. У гэты перыяд павінна была сфарміравацца сістэма маніторынгу дзеючых дзяржаўных праграм. Сярод канкрэтных мер былі вызначаны: захаванне дзеючай сеткі ўстаноў культуры і мастацтва і якаснае яе ўдасканаленне; стварэнне новых культурных аб’ектаў, здольных больш гнутка рэагаваць на змены ў патрэбнасцях і запытах насельніцтва; умацаванне і абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы; захаванне рухомай і нерухомай культурнай спадчыны; стварэнне банку дадзеных аб гісторыка-культур-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най спадчыне Беларусі, народным мастацтве і рамёствах; развіццё прафесійнай творчасці і прафесійнай мастацкай адукацыі, народных промыслаў і традыцыйнай культуры; павышэнне ўзроўню і якасці паслуг [445].

Важнай мэтай Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г. з’яўляецца стварэнне ўмоў, пры якіх кожны грамадзянін, сацыяльная група і арганізацыя будуць мець магчымасць удзелу ў працэсе распрацоўкі і прыняцця дзяржаўных рашэнняў, ацэньваць іх уздзеянне на структуры грамадзянскай супольнасці, дзейнасць сацыяльна-палітычных інстытутаў. Пры гэтым павінны быць максімальна задзейнічаны магчымасці няўрадавых арганізацый (НУА), працоўных і прафсаюзаў, дзелавых і навуковых колаў ў рэалізацыі стратэгіі ўстойлівага развіцця [445, с. 171].

Стратэгічнай мэтай у галіне культуры, згодна з праграмай сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2006–2010 гг. [586], было вызначана захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, стварэнне ўмоў для для ўсебаковага развіцця асобы, росту яе творчай ініцыятывы, духоўных і эстэтычных патрэбнасцей. Гэта павінна было значна павысіць ролю асобы як галоўнай рухаючай сілы новага постіндустрыяльнага грамадства. Для дасягнення гэтай мэты прадугледжвалася вырашэнне наступных задач:

забеспячэнне даступнасці культурных каштоўнасцей і паслуг, павышэнне іх узроўню і якасці, павелічэнне аб’ёму для жыхароў сяла, паляпшэнне культурнага абслугоўвання аддаленых вёсак;

рэалізацыя праграмы рэстаўрацыі, рэканструкцыі і захавання прырытэтных гісторыка-культурных каштоўнасцей беларускага народа, уключэнне іх у культурны і турыстычны абарот. Вызначэнне і аднаўленне ў рэгіёнах краіны найбольш значных сельскіх гістарычных сядзіб з мэтай выкарыстання ў якасці аб’ектаў культурна-дасугавай дзейнасці;

распрацоўка і ўкараненне рацыянальнай сістэмы размяшчэння сельскіх устаноў культуры;

забеспячэнне рэалізацыі кадравай палітыкі па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы спецыялістаў культуры і мастацтва на аснове ўкаранення новых адукацыйных тэхналогій;

стварэнне пры сярэдніх спецыяльных навучальных установах культуры і мастацтва ў абласных гарадах кансультацыйных цэнтраў для аказання метадычнай дапамогі і выяўлення на сяле адораных дзяцей і таленавітай моладзі.

Акрамя гэтага, законам Рэспублікі Беларусь «Асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь» [580] ад 14 лістапада 2005 г. прадугледжвалася: забеспячэнне агульнадаступнасці каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, якія знаходзяцца ў дзяржаўных і грамадскіх фондах (гл. 2, п. 3); садзейнічанне развіццю культуры і мастацтва; даступнасць і разнастайнасць паслуг арганізацый культуры для ўсяго насельніцтва; захаванне і рэалізацыя выхаваўча-адукацыйнага патэнцыялу гісторыка-культурнай спадчыны (гл. 1,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

п. 16); прыцягненне знешніх інтэлектуальных і навуковых рэсурсаў для навуковага, адукацыйнага і культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь (гл. 2, п. 34).

Пытанням развіцця культуры надавалася важнае значэнне ў ***пасланнях Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь*** беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь.

У пасланні 1997 г. была звернута ўвага на пытанні духоўнага развіцця народа ва ўмовах адкрытай экспансіі «масавай культуры». Гаварылася аб неабходнасці паставіць заслон на шляху іх распаўсюджання. У той жа час кіраўнік дзяржавы заяўляў аб адкрытасці да шырокага культурнага супрацоўніцтва ў імя ўзбагачэння духоўнага жыцця беларускага народа лепшымі дасягненнямі шматнацыянальнага сусветнага мастацтва. Асобна падкрэсліваўся намер падтрымліваць творчую інтэлігенцыю, «без якой немагчыма паўнавартаснае дэмакратычнае грамадства» [388, с. 2].

У наступным годзе Прэзідэнт заклікаў больш увагі ўдзяляць пытанням прафесійнага мастацтва і традыцыйных форм культуры, падтрымцы талентаў, павышэнню статусу творчых людзей, асабліва маладых. У сувязі з гэтым у якасці актуальных задач на бліжэйшую перспектыву ім бачылася распрацоўка дзяржаўнай праграмы развіцця культуры, а таксама адпаведных рэгіянальных праграм, якія б вызначалі комплекс мер па сацыяльнай падтрымцы творчай інтэлігенцыі, работнікаў культуры, захаванні і абнаўленні музейнага фонду, бібліятэк і іншых аб'ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння.

У пасланні выказваўся намер аб падтрымцы фестываляў прафесійнага мастацтва і народнай творчасці, заахвочванні маладых талентаў, адораных дзяцей, удасканаленні сістэмы эстэтычнага выхавання [385, с. 4].

Цяжкасці эканамічнага крызісу 1998–1999 гг. патрабавалі ўзмацнення ролі дзяржавы ў падтрымцы культуры. «У пераходны перыяд асноўны клопат па развіцці культуры, умацаванні духоўных падмуркаў грамадства павінна ўзяць на сябе дзяржава. Нацыянальнай культуры не выжыць без актыўнага ўдзелу дзяржавы ў яе лёсе», – адзначалася ў Пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь у 1999 г.

Як асабліва актуальную кіраўнік дзяржавы адзначаў праблему фінансавання сферы культуры. Побач з нарошчваннем аб'ёмаў і тэмпаў выдзялення фінансавых сродкаў і выхаду на гарантаваны Законам Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» узровень бачылася неабходным садзейнічаць адраджэнню традыцый дабрачыннасці. Для гэтага прапаноўвалася распрацаваць формы падтрымкі апошняй, у тым ліку праз ільготную падатковую палітыку, падняцце грамадскага прэстыжу дабрачыннасці. Гэта павінна было быць замацавана ў законах рэспублікі.

Прэзідэнт падкрэсліваў: «Фарміраванне цэльнай канцэпцыі дзяржаўнага рэгулявання і падтрымкі развіцця культуры павінна стаць перадумовай забеспячэння эфектыўнай нацыянальнай палітыкі ў гэтай галіне. Работа органаў культуры павінна быць пабудавана так, каб яны былі здольныя даць нашым грамадзянам зарад высокіх намераў, далучыць маладое пакаленне да каштоў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насцей духоўнай і культурнай спадчыны беларускага народа, усёй сусветнай цывілізацыі» [389, с. 2].

У сувязі з гэтым перад Урадам і Міністэрствам культуры ставілася задача захавання высокакваліфікаваных кадраў, правядзення кардынальных змен у развіцці айчыннага кінематографа і кінапракату, заканчэння распрацоўкі дзяржаўнай праграмы развіцця культуры і адпаведных рэгіянальных праграм.

Галоўнай задачай дзяржавы ў сферы культуры ў пасланні 2001 г. называлася захаванне і якаснае развіццё сеткі ўстаноў культуры, укараненне іх новых мадэляў і тыпаў, забеспячэнне разнастайнасці паслуг і іх даступнасці, зберажэнне гісторыка-культурнай спадчыны. «Аднак галоўнае, – адзначыў Прэзідэнт, – неабходна беражліва адносіцца да людзей гэтай сферы. […] І гэта павінна выражацца ў пастаянным клопаце пра іх» [391].

Упершыню спецыяльны раздзел «Аб развіцці нацыянальнай культуры» з'явіўся ў пасланні ў 2002 г. У ім адзначалася, што «нацыянальная культура выконвае важную функцыю, аб'ядноўваючы розныя слаі насельніцтва і сферы жыцця грамадства – эканоміку, палітыку, права, надае іх развіццю ўнутраную логіку, забяспечвае гістарычную перспектыву народа, фарміруе пачуццё годнасці і патрыятызму асобы». У пасланні былі сфарміраваны напрамкі развіцця галіны:

захаванне і развіццё сеткі ўстаноў і арганізацый культуры галіны;

фарміраванне эфектыўнага дзейнічаючага эканамічнага механізму развіцця культуры;

умацаванне кадравага патэнцыялу, абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы;

стварэнне ўмоў для шырокага доступу ўсіх членаў грамадства да дасягненняў нацыянальнай і сусветнай культуры, выяўлення і развіцця творчых здольнасцей кожнага грамадзяніна краіны;

захаванне гісторыка-культурнай спадчыны і развіццё нацыянальных культурных традыцый;

пашырэнне і паглыбленне міжнароднага культурнага супрацоўніцтва на агульнадзяржаўным і рэгіянальным узроўнях;

удасканаленне нарматыўна-прававой базы.

Адзначалася неабходнасць надання асаблівай увагі развіццю культуры і мастацтва ў рэгіёнах, ахове помнікаў гісторыі і культуры, прыняцця канкрэтных мер па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы кінематаграфіі, павышэнні канкурэнтаздольнасці беларускіх фільмаў, узвядзення новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, паслядоўнага развіцця рэстаўрацыйнай будаўнічай базы [657].

У 2003 г., выступаючы перад парламентарыямі, Прэзідэнт выказаўся за стварэнне ўмоў для раскрыцця талентаў, развіцця культуры [656].

У 2004 і 2005 гг. значная ўвага ў пасланнях была нададзена турызму, стварэнню яго адпаведнай інфраструктуры. У 2005 г. гэтай сферы быў адведзены асобны раздзел «Беларусь – краіна турызму». У якасці стратэгічнай задачы было вызначана развіццё ўязнога турызму.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

Яшчэ адным важным аспектам палітыкі дзяржавы, на які звярталася ўвага ў 2004 г., была дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі. Кіраўнік дзяржавы адзначыў рост прафесійнага ўзроўню нацыянальных электронных СМІ, іх прынцыповасць і аб’ектыўнасць. Выказаў спадзяванне на тое, што «павагай у нашым грамадстве карыстаюцца і будуць карыстацца тыя СМІ (не важна, дзяржаўныя ці прыватныя), якія працуюць на стварэнне, на развіццё беларускага грамадства» [654].

Не засталіся не заўважанымі ў пасланні 2004 г. поспехі беларускіх артыстаў на дзіцячым конкурсе Еўрабачання, перамога беларускага выканаўцы на «Славянскім базары». Разам з гэтым перад Міністэрствам культуры была пастаўлена задача «навесці неабходны парадак, і не толькі ў канцэртнай дзейнасці». Прэзідэнт падкрэсліў: «Мастацтва паклікана фарміраваць высокую маральнасць і прывіваць эстэтычны густ. Нізкапробным «шоу» патрэбна актыўна і мэтанакіравана супрацьпастаўляць сапраўднае мастацтва – высокамастацкія і цікавыя творы, якія ўзбагацяць духоўную скарбніцу нашага народа» [654].

На наступны год пытанням культуры ў Пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу быў адведзены асобны раздзел «Культура – аснова самабытнасці народа». Быў падкрэслены прыярытэт народнай культуры, якая была названа «вечнай каштоўнасцю і нацыянальным здабыткам».

Былі адзначаны дасягненні – будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі, рэканструкцыя Нацыянальнага мастацкага музея, рэстаўрацыя замкаў у Міры і Нясвіжы, шырокі выбар твораў беларускіх аўтараў, другое нараджэнне беларускага кінематографа. Кіраўнік дзяржавы прапанаваў ствараць добрае дзіцячае кіно, мультыплікацыйныя фільмы для малышоў.

З высокай трыбуны было заяўлена аб намеры дзяржавы падтрымліваць тых дзеячаў культуры і мастацтва, якія сапраўды займаюцца творчасцю. Былі адзначаны добрыя вынікі такой непапулярнай меры, як увядзенне спачатку 50%, а затым 75 % квоты на гучанне беларускай музыкі ў эфіры.

Прэзідэнт паставіў задачу працаваць з маладымі талентамі, ствараць для іх умовы, і вынік не прымусіць сябе чакаць.

«Культура – аснова духоўнасці нашага народа», – заявіў А. Р. Лукашэнка. Падобную ролю ў жыцці грамадства, на думку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адыгрываюць сродкі масавай інфармацыі. Перад імі была пастаўлена мэта забеспячэння высокай якасці, у тым ліку ў тэхнічным плане. У якасці перспектывы было вызначана лічбавае тэлебачанне. Як бясспрэчны прарыў у сусветную інфармацыйную прастору было названа з’яўленне спадарожнікавага тэлеканала «Беларусь-ТБ».

Перад сродкамі масавай інфармацыі была пастаўлена мэта абароны грамадства ад дэструктыўных фактараў, згубнага ўздзеяння культу насілля, жорсткасці і амаральнасці. Функцыя СМІ, на думку Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, «не толькі адлюстраванне, але і фарміраванне грамадскай думкі. Яны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляюцца эфектыўным інструментам падтрымкі пастаяннай узаемасувязі паміж грамадствам і ўладай» [614].

У наступныя два гады ў пасланнях увага не надавалася сферы культуры. У 2008 г. яна была названа «магутным фактарам грамадскіх пераўтварэнняў», «сферай, якая валявым рашэннем ці ўказаннем зверху не развіваецца. Яе ствараюць людзі, якіх у Беларусі дастаткова». Прэзідэнт бачыў задачу дзяржавы ў фарміраванні асяроддзя, спрыяльнага для творчасці. Ім была выказана ўпэўненасць у тым, што ва ўсіх відах мастацтва можа быць створаны свой, нацыянальны шэдэўр. Быў агучаны заклік «давайце тварыць маладым», бо ім уласцівы свежы погляд на рэчаіснасць, нестандартнае светаразуменне. Пры гэтым талент павінен мець магчымасць самарэалізавацца ў сваёй краіне [225].

Важным кампанентам фарміравання маральных устояў беларускага грамадства павінен быў стаць працэс пошуку і вяртання на Радзіму гістарычных і культурных каштоўнасцей Беларусі, якія апынуліся за яе межамі. У гэтай справе, на думку Прэзідэнта, павінна была праявіцца грамадская ініцыятыва.

У галіне сродкаў масавай камунікацыі ставілася задача стварэння сваёй творчай прадукцыі, якая адпавядала б традыцыям беларускага грамадства. Крытыка была выказана на адрас рэгіянальнай прэсы і тэлебачання. Міністэрству інфармацыі неабходна было заняцца гэтай праблемай. У выніку мясцовыя СМІ павінны былі «канкурыраваць не то што з рэспубліканскай, але і з расійскай, замежнай прэсай».

Усе беларускія СМІ павінны былі перайсці ад пасіўнага «асвятлення падзей» і рэагавання на інфармацыйныя нагоды да актыўнай паступальнай работы па фарміраванні прыцягальнай для масавай аўдыторыі нацыянальнай і рэгіянальнай інфармацыйнай прасторы.

Пасланне 2009 г. таксама было вызначана значнай увагай да пытанняў культуры. У кантэксце абвешчанага Года роднай зямлі вельмі актуальнай з'яўлялася тэма развіцця культурнага турызму. Прэзідэнт з горыччу канстатаваў адсутнасць турыстычнай інфраструктуры ў невялікіх населеных пунктах. А менавіта там былі размешчаны помнікі, унесеныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Перад абласнымі і раённымі ўладамі была пастаўлена задача заняцца гістарычнымі палацамі, сядзібамі, малабюджэтным сельскім турызмам, экалагічным турызмам.

Адначасова ставілася задача зрабіць даброты культуры дасягальнымі для ўсіх катэгорый насельніцтва: «Жыхары нават самай маланаселенай вёскі павінны быць ахоплены якасным культурным абслугоўваннем, у тым ліку перасоўнымі відэакомплексамі і бібліятэкамі» [653].

У пасланні шмат гаварылася аб дзяржаўна-грамадскім партнёрстве. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь адказваў на крытыку неразвітасці ў Беларусі грамадзянскай супольнасці, гаварыў аб неабходнасці грамадскім аб'яднанням імкнуцца да ўстанаўлення балансу сваіх інтарэсаў і інтарэсаў дзяржавы. Было заяўлена, што для фарміравання сацыяльна актыўнай асобы неабходна эфектыўна выкарыстоўваць патэнцыял культуры. Пры гэтым «важна не проста за-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хаваць узоры самабытнага мастацтва, але і забяспечыць развіццё і прапаганду нацыянальных традыцый». У гэтым напрамку важным бачылася адраджэнне краязнаўчай працы.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь гаварыў аб нерэалізаванасці ў поўнай меры творчага і ідэйна-выхаваўчага патэнцыялу работнікаў культуры: «за апошнія гады не з'явілася ніводнага магутнага, прагрымеўшага на ўсю краіну спектакля нацыянальнай, патрыятычнай тэматыкі. Заніжана патрабавальнасць да адбору сапраўды таленавітых твораў у іншых відах мастацтва» [653].

У пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу 2010 г. [655] падкрэслівалася: «Беларуская культура з'яўляецца неад'емнай часткай дзяржаўнага суверэнітэту. Яна дапамагае нам адчуваць сябе адзіным, унікальным і самабытным народам, з'яўляецца свайго роду "вакцынай" супраць вірусаў духоўнай дэградацыі». Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь акрэсліў, што дзяржава чакае ад культуры:

твораў, здольных падняць патрыятычны дух народа, яскрава і выразна паказаць усяму свету мінулае і сучаснае Беларусі, стварыць вобразы сапраўдных нацыянальных герояў;

беражлівай і карпатлівай працы па захаванні спадчыны;

забеспячэння даступнасці культурных даброт для ўсіх грамадзян, уключаючы жыхароў малых гарадоў і вёскі, актыўнага ўдзелу ў выхаванні моладзі.

У сваім выступленні Прэзідэнт востра выказваўся аб становішчы ў айчынным кінематографе, калі «на працягу апошніх трох гадоў даходы ад продажу прадукцыі кінастудыі «Беларусьфільм» складаюць трохі болей за шэсць працэнтаў ад укладзеных у яе вытворчасць сродкаў». Крытычныя заўвагі былі накіраваны ў бок пісьменнікаў і кампазітараў: «як не было, так і няма ад нашых пісьменнікаў выдатных твораў, якія б палюбіліся шырокаму колу чытачоў. Прафесійныя кампазітары не могуць напісаць песню, з якой Беларусь змагла б з годнасцю выступіць на конкурсе "Еўрабачанне"». Прэзідэнт з горыччу заклікаў: «Дзе вы, пісьменнікі і кампазітары?.. Прынясіце свой шэдэўр. Мы заплацім вам вялікія грошы».

Кіраўнік краіны спалучыў дзяржаўную падтрымку творцаў з выніковасцю іх працы: «будзем падтрымліваць – калі будзеце даваць вынік. Ці хоць паабяцаеце, што ўкладзеныя грошы не прападуць». Ён падкрэсліў неабходнасць больш эфектыўнага выкарыстання дзяржаўных рэсурсаў на падтрымку культуры і мастацтва, увязання фінансавання з той ідэалагічнай і творчай аддачай, якую атрымлівае ад іх грамадства. Адначасова была пастаўлена задача фарміравання сістэмы, здольнай павялічыць прыток пазабюджэтнага інвеставання ў культуру. У пасланні было выказана пажаданне аб больш прагматычным падыходзе да аднаўлення і выкарыстання помнікаў культуры, утрымліваўся заклік беражліва і асцярожна адносіцца не толькі да матэрыяльных помнікаў, але і да аб'ектаў нематэрыяльнай культуры, асабліва да дзяржаўных моў.

Значны ўплыў на выпрацоўку і прыняцце рашэнняў у сферы культурнай палітыкі нашай краіны аказвалі ***даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

20 чэрвеня 1996 г. пад старшынствам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адбылася рэспубліканская нарада з кіраўнікамі абласных, гарадскіх і раённых выканаўчых камітэтаў па пытаннях развіцця сацыяльна-культурнай сферы. На ёй было дадзена даручэнне аб ўдасканаленні падаткаабкладання прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў сацыяльнай сферы, нарматыўнай базы, якая рэгламентавала развіццё платных паслуг і камерцыйнай дзейнасці ў сацыяльна-культурным комплексе. Была пастаўлена задача распрацаваць прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнай культурнай палітыкі і механізм іх мэтавага фінансавання з улікам мясцовых культурных традыцый, цікаўнасцей і запатрабаванняў канкрэтных катэгорый насельніцтва, этнанацыянальных асаблівасцей і сацыяльна-эканамічных магчымасцей. Аблвыканкамам і Мінгарвыканкаму прадпісвалася забяспечыць строгае выкананне законаў «Аб культуры» і «Аб бібліятэчнай справе» ў частцы ўдасканалення існаваўшай сеткі ўстаноў культуры і мастацтва. Міністэрству працы неабходна было разгледзець пытанне аб памеры даплат грамадзянам, якія мелі ганаровыя званні «народны», а таксама работнікам вядучых творчых калектываў, якія мелі званне «акадэмічны». Асобным пунктам даручалася распрацоўка і ўнясенне ва Урад прапаноў па ўдасканаленні кінаабслугоўвання насельніцтва. Міністэрства культуры па ўзгадненні з Мінфінам і Мінпрацы павінна было да 1 верасня распрацаваць прапановы па ўдасканаленні нарматыўнай базы, якая рэгламентавала б вучэбна-выхаваўчы працэс, аплату працы і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы Рэспубліканскага ліцэя пры Беларускай акадэміі музыкі [439, спр. 97, арк. 49–51].

31 жніўня 1996 г. адбылася сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з творчай інтэлігенцыяй. Па яе выніках былі дадзены даручэнні па развіцці маладзёжнага эстраднага мастацтва. У прыватнасці, аб стварэнні ў 1996 г. у г. Мінску Маладзёжнага тэатра эстрады[1]; прыняцці мер па забеспячэнні працай эстрадных выканаўцаў і калектываў; упарадкаванні дзейнасці суб’ектаў гаспадарання, якія займаліся канцэртнай дзейнасцю; прапагандзе айчыннага эстраднага мастацтва; павышэнні ўзроўню канцэртна-відовішчных мерапрыемстваў; стварэнні школы-студыі па падрыхтоўцы артыстаў эстрады па класе вакалу, харэаграфіі, акцёрскім мастацтве, а таксама па падрыхтоўцы вядучых эстрадных шоу, дыск-жакеяў, гукарэжысёраў і майстроў па свеце. У пратакол даручэнняў па выніках сустрэчы былі ўнесены пытанні аб выдзяленні ў 1996 г. жылой плошчы тым з эстрадных выканаўцаў, хто меў патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў; аб выдзяленні па заяўках Мінкультуры ў арэнду памяшканняў для творчых эстрадных калектываў і студыйна-творчых майстэрань. Асобна даручалася распрацаваць мерапрыемствы па прапагандзе ў сродках масавай інфармацыі айчыннага эстраднага мастацтва [439, спр. 98, арк. 179–180].

Адпаведна пратаколу даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па выніках сустрэчы з дзеячамі культуры ў снежні 1997 г. у мэтах захавання і далейшага развіцця нацыянальнай культуры, сацыяльнай падтрымкі творчай інтэ-

[1] Урачыстае адкрыццё тэатра адбылося 29 мая 1997 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лігенцыі, пашырэння творчых сувязей беларускіх дзеячаў культуры з прадстаўнікамі культур іншых краін прадугледжвалася стварэнне Фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва, распрацоўка Дзяржаўнай праграмы развіцця культуры, рэгіянальных праграм сацыяльнай падтрымкі творчай інтэлігенцыі, работнікаў культуры, уключаючы выдзяленне службовага жылля тэатрам і канцэртным арганізацыям [так у дакуменце. – *Д. К.*], захавання і развіцця музейнага фонду, умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы музеяў і бібліятэк, выдзялення мэтавых сродкаў для іх камплектавання; захавання, рэканструкцыі і рэарганізацыі аб'ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння з улікам спецыфікі і рэгіянальных умоў развіцця прафесійнай і самадзейнай творчасці, арганізацыі вольнага часу насельніцтва. Сярод даручэнняў было аднаўленне ў 1998 г. практыкі правядзення штогадовых семінараў творчай моладзі з удзелам вядучых дзеячаў культуры і мастацтва, выданне лепшых твораў маладых празаікаў, паэтаў і драматургаў; вывучэнне пытання аб стварэнні спецыялізаванага выдавецтва па выпуску нотнай, вучэбна-метадычнай і іншай літаратуры для галіны; выдзяленне сродкаў на закупку відэапраекцыйных установак для паляпшэння кінавідэаабслугоўвання сельскага насельніцтва. Савету Міністраў даручалася распрацаваць праграму манументальнай прапаганды; разгледзець пытанне павелічэння ставак аўтарскага ўзнагароджання за стварэнне твораў літаратуры і мастацтва; падрыхтаваць прапановы аб заснаванні прэмій і грантаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выдатным дзеячам культуры і мастацтва; разгледзець пытанне паэтапнага павышэння заработнай платы работнікам вядучых творчых калектываў краіны; унесці прапановы ў Парламент аб удасканаленні заканадаўства Рэспублікі Беларусь з улікам мадэльнага Закона «Аб творчых работніках і творчых саюзах», які быў прыняты Міжпарламенцкай Асамблеяй дзяржаў – удзельніц СНД 6 снежня 1996 г. [439, спр. 212, арк. 251–252].

Пратакол даручэнняў па выніках нарады «Аб мерах па рашэнню праблем развіцця культуры і мастацтва», якая адбылася 1 лютага 2001 г., быў накіраваны на вырашэнне разнастайных пытанняў: ад заканадаўчых да матэрыяльна-тэхнічных. Іх рэалізацыя на практыцы дазволіла зменшыць падатковую нагрузку на творчыя саюзы, кінавідэавытворчасць, надала больш самастойнасці ў фарміраванні цэн на паслугі культуры, увяла ў практыку новыя меры матэрыяльнага стымулявання дзеячаў культуры і мастацтва, палепшыла кадравае забеспячэнне, актывізавала кінавідэавытворчасць, палепшыла матэрыяльна-тэхнічны стан асобных устаноў культуры і мастацтва, камплектаванне бібліятэк, дазволіла накіраваць сродкі на стварэнне новых пастановак і канцэртных праграм, правядзенне гастроляў, мэтавае набыццё кінавідэафільмаў для дзяцей і юнацтва, рэстаўрацыю і будаўніцтва будынкаў устаноў культуры [439, спр. 584, арк. 26–26 зв.].

У плане мерапрыемстваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па выкананні даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дадзеных 17 снежня 2003 г. на сустрэчы з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі, было акрэслена 19 пытанняў, патрабуючых вырашэння. Сярод іх – распрацоўка праекта рас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

параджэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб выдзяленні грашовых сродкаў на стварэнне кінафільма, прысвечанага 60-годдзю Перамогі, унясенне прапаноў аб зніжэнні арэнднай платы для дзяржаўных арганізацый культуры, прыняцце мер па ўдасканаленні парадку здзяйснення гастрольнай дзейнасці дзяржаўнымі тэатральна-відовішчнымі і канцэртнымі ўстановамі, распрацоўка праекта праграмы рэканструкцыі, тэхнічнага перааснашчэння будынкаў дзяржаўных тэатраў, выкананне дзяржаўнага заказу на стварэнне канцэртных праграм для Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь, распрацоўка рэспубліканскай праграмы настаўніцтва майстроў мастацтваў, хадайніцтва аб будаўніцтве ў 2006 г. у г. Мінску жылога дама для работнікаў культуры і творчых работнікаў, аказанне садзейнічання ў арганізацыі падпіскі на перыядычныя выданні рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва» публічнымі бібліятэкамі і інш. [439, спр. 886, арк. 35–40].

Шэраг даручэнняў па ўдасканаленні матэрыяльна-тэхнічнай базы, падрыхтоўкі спецыялістаў, удасканаленні навучальнага працэсу быў дадзены па выніках наведвання Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў 23 мая 2002 г. і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі 2 чэрвеня 2003 г. [439, спр. 887, арк. 217–219]. Пры гэтым на сустрэчы з выкладчыкамі і студэнтамі Беларускай акадэміі мастацтваў 15 мая 2003 г. Кіраўнік дзяржавы акрэсліў пяць важнейшых напрамкаў дзейнасці структур улады ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры. Гэта стварэнне сучаснай нарматыўна-прававой базы культуры; фарміраванне эфектыўна дзеючага эканамічнага механізма галіны культуры; стварэнне ўмоў для выяўлення і развіцця творчых здольнасцей кожнага грамадзяніна Беларусі; захаванне гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа; умацаванне кадравага патэнцыялу і матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры [439, спр. 886, арк. 42].

Такім чынам, у вывучаемы перыяд вялася актыўная распрацоўка палітыка-прававых асноў дзейнасці ў сферы культуры. Усе асноўныя галіны атрымалі заканадаўчае забеспячэнне. Далейшае развіццё нарматыўнай прававой базы бачылася ў яе ўдасканаленні і прывядзенні ў адпаведнасць з новымі рэаліямі развіцця краіны, арыентацыі на максімальнае задавальненне патрэб творцаў, работнікаў культурнай галіны і ўсіх спажыўцоў культурнай прадукцыі.

### 2.2. Фінансава-эканамічны механізм

Адным з ключавых механізмаў рэалізацыі дзяржаўнай культурнай палітыкі з'яўляецца фінансава-эканамічны. Ён складаецца з такіх аспектаў, як фінансаванне, падаткаабкладанне, ганарарная палітыка і аплата працы, цэнаўтварэнне. Дзяржава праз бюджэтныя асігнаванні аказвае падтрымку ўсіх прамых удзельнікаў культурнай дзейнасці: вытворцаў і спажыўцоў культурных даброт, стваральнікаў культурных каштоўнасцей, іх збіральнікаў і захавальнікаў. У Рэспубліцы Беларусь у вывучаемы перыяд выкарыстоўваліся розныя спосабы размеркавання бюджэтных сродкаў – як непасрэдна бюджэтнае фінан-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

саванне розных груп удзельнікаў культурнай дзейнасці, так і праз арганізацыю спецыяльных фондаў падтрымкі культуры і мастацтва.

Эканамічныя аспекты праваадносін дзяржавы з арганізацыямі культуры і мастацтва занялі значнае месца ў прынятым у 1990 г. Законе «Аб культуры». У ім была прадстаўлена наступная структура фінансавання: дзяржаўны бюджэт, фонды, падатковыя льготы.

Артыкул 36 прадугледжваў, што фінансаванне культуры будзе здзяйсняцца праз спецыяльны рэспубліканскі фонд а таксама фонды мясцовых Саветаў народных дэпутатаў. Крыніцамі фарміравання фондаў называліся: дабрачынныя паступленні; прыбытак ад правядзення спецыяльных латарэй, аўкцыёнаў, выстаў; паступленні ад продажу і набыцця каштоўных папер, якія павінны былі выпускацца фондам.

Асобны артыкул (38) ускладаў на мясцовыя саветы народных дэпутатаў абавязак культурнага абслугоўвання насельніцтва на падставе ўстаноўленых нарматываў і гарантаваных бюджэтных асігнаванняў.

У адпаведнасці з Законам «Аб мясцовым самакіраванні і мясцовай гаспадарцы ў Рэспубліцы Беларусь» [502], існуючым у першай палове 1990-х гг. бюджэтным і падатковым заканадаўствам мясцовыя Саветы народных дэпутатаў мелі права самастойна вызначаць звыш устаноўленых нормаў памер бюджэтнага фінансавання ўстаноў культуры, якія знаходзіліся на іх тэрыторыі, незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

Акрамя гэтага, прадугледжвалася стварэнне добраахвотных фондаў развіцця культуры грамадскімі арганізацыямі, прафсаюзамі, творчымі саюзамі, прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі і грамадзянамі (арт. 39).

У законе было замацавана палажэнне аб гарантаванай долі бюджэтных сродкаў на развіццё мастацтва і культуры ў памеры не менш за 3 % ад агульнай сумы Дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь (арт. 36).

На жаль, на практыцы рэалізацыя палажэнняў Закона «Аб культуры» адносна пытання як прамога, так і ўскоснага фінансавання сутыкалася са шматлікімі перашкодамі.

Вельмі цяжкім становішча было напачатку 1990-х гг. У 1992 г. не была пачата праца на 40% запланаваных да будаўніцтва аб'ектах культуры. У сувязі з падаражаннем будаўніча-мантажных работ, абсталявання і матэрыялаў выдзеленыя асігнаванні былі ў асноўным накіраваны на фінансаванне будаўніцтва рэспубліканскага Палаца культуры і харэаграфічнага вучылішча. Выкананне аб'ёму будаўніча-мантажных работ пры ўзвядзенні першага аб'екта склала 68% гадавога плана. У 1993 г. яго будаўніцтва фактычна было замарожана [831, с. 53–54].

У жніўні 1992 г. Міністэрства культуры сярод асноўных напрамкаў прадухілення спаду ў развіцці беларускай нацыянальнай культуры і адпаведных мер яе выратавання называла: прыярытэт культуры ў забеспячэнні бюджэтнымі сродкамі; удзел суб'ектаў рынкавай эканомікі, а таксама грамадскіх арганізацый і асобных грамадзян у развіцці і фінансаванні культуры і мастацтва;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рацыянальнае спалучэнне бюджэтнага фінансавання і камерцыйных пачаткаў у дзейнасці ўстаноў культуры, захаванне ўзроўню бюджэтнага фінансавання і паступовае павелічэнне да памераў, прадугледжаных законам «Аб культуры», павелічэнне памераў тарыфных каэфіцыентаў работнікаў культуры і мастацтва, зыходзячы з крытэрыю ацэнкі ўзроўню кваліфікацыі работнікаў прамысловасці; ільготнае падаткаабкладанне ўстаноў культуры і мастацтва, сацыяльная абарона іх работнікаў; умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы галіны [438, спр. 2078, арк. 43].

Пры гэтым вырашэнне пытання матэрыяльнай падтрымкі галіны Міністэрства бачыла ў атрыманні сродкаў не толькі з бюджэтных крыніц, але і камерцыйнага эфекту ад дзейнасці прадпрыемстваў мастацтва і культуры за кошт: павелічэння паступленняў ад продажу білетаў і рэкламнай прадукцыі; развіцця сістэмы платных паслуг; выкарыстання свабодных памяшканняў для арганізацыі працы сумесных прадпрыемстваў, якія садзейнічаюць развіццю нацыянальнай культуры; стварэння відэапраграм аб шэдэўрах беларускай нацыянальнай культуры; распрацоўкі і стварэння культурна-пазнавальных праграм, адраджэння этнічна-нацыянальных промыслаў і мастацкіх рамёстваў; падтрымкі сацыяльна-культурных і навукова-тэхнічных ініцыятыў рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню па вывучэнні і пераадоленні вынікаў Чарнобыльскай катастрофы; стварэння дынамічных творчых груп з удзелам рознага тыпу капіталаўкладанняў, у тым ліку спонсарскіх, заахвочвальных (грантаў), міласэрных суб’ектаў [438, спр. 2078, арк. 44].

Усе асноўныя прапановы, якія ўтрымліваліся ў згаданым лісце, увайшлі ў зацверджаную ў лютым 1993 г. загадам міністра культуры Праграму дзеянняў па пераадоленні эканамічнага крызісу ў культуры на 1993–1994 гг. [439, спр. 1, арк. 38–41]. Дакумент фактычна меў дэкларатыўны характар і павінен быў стаць асновай для выпрацоўкі канкрэтных дзеянняў. Аднак эканамічны крызіс перашкодзіў рэалізаваць разнастайныя намеры ці аддаліў іх ажыццяўленне. Не былі створаны Камерцыйны банк культуры, а сістэма грантаў пачала рэалізоўвацца толькі з 1998 г. (часу стварэння Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва). Толькі ў 2002 г. была рэалізавана ідэя аб стварэнні дабрачыннага білета «Захаваць нашу спадчыну» ў форме рэспубліканскай тыражнай латарэі «Скарбніца».

Адным са шляхоў далейшага развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы культуры і мастацтва Праграмай дзеянняў па пераадоленні эканамічнага крызісу ў культуры на 1993–1994 гг. называлася прыцягненне замежных інвестараў для будаўніцтва аб’ектаў культуры і вытворчай базы галіны. Побач з гэтым Міністэрства выступіла ініцыятарам пастановы Урада «Аб часовай недапушчальнасці прыватызацыі і перадачы ў арэнду ўстаноў культуры ў Рэспубліцы Беларусь» і выказвалася аб неабходнасці вырашыць пытанне аб перадачы ў сваю сістэму тых устаноў культуры, ад утрымання якіх адмаўляліся працоўныя калектывы і арганізацыі [438, спр. 2078, арк. 45–47].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У кастрычніку 1992 г. Міністэрства культуры звярнулася ва Урад з абгрунтаваннем мэтазгоднасці правядзення акумуляцыі ўсёй выдзеленай фінансавай долі дзяржбюджэту ў спецыяльным Фондзе развіцця культуры і мастацтва, які быў створаны ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21 лістапада 1991 г. № 434 [438, спр. 2079, арк. 6–7]. Меркавалася, што гэта дазволіць Міністэрству ажыццяўляць больш гнуткую і дзейсную культурную палітыку, зыходзячы з вызначаных законам і выпрацаваных прыярытэтаў не з наяўных структур і артыкулаў затрат. Сістэма фінансавання ўстаноў Міністэрства культуры павінна была базіравацца на наступных прынцыпах: устанаўленне агульных канчатковых аб'ёмаў фінансавання; канцэнтрацыя ўсіх сродкаў, выдзеленых з дзяржаўнага бюджэту Міністэрству культуры, у Фондзе развіцця культуры і мастацтва; выдзяленне прыярытэтаў у размеркаванні сродкаў Фонду з улікам дзяржаўнай нацыянальнай культурнай палітыкі; прыцягненне пазабюджэтных крыніц фінансавання і акумуляванне іх у Фондзе развіцця культуры і мастацтва [438, спр. 2079, арк. 6–7].

Ужо першыя гады працы Фонду прадэманстравалі, што Міністэрства культуры атрымала магчымасць пашырыць і замацаваць эканамічныя сувязі ўстаноў культуры нашай краіны з арганізацыямі і прадпрыемствамі культуры іншых краін, аказаць дапамогу развіццю і ўзаемаўзбагачэнню нацыянальнай культуры, культур іншых народаў, што пражываюць на тэрыторыі Беларусі, праводзіць работу па зберажэнні гістарычных і культурных каштоўнасцей. Практыка паказала, што пры вызначэнні задач і выкарыстанні сродкаў Фонду развіцця культуры і мастацтва выявілася шмат напрамкаў арганізацыі яго дзейнасці, якія былі не зацверджаны Палажэннем аб парадку стварэння і выкарыстання Фонду. У 1993 г. Фонд аказваў фінансавую падтрымку народным мастацкім калектывам, якія дзейнічалі ў сістэме Міністэрства і іншых ведамстваў, праграмы па падтрымцы таленавітых дзяцей, навучэнцаў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, удзельнічаў у фінансаванні асобных аб'ектаў культуры (майстэрань, дамоў адпачынку, аматарскіх аб'яднанняў, якія адраджалі народныя мастацкія традыцыі, промыслы і г. д.) [439, спр. 10, арк. 167].

У Фондзе былі створаны крыніцы для часовай фінансавай дапамогі (на зваротнай аснове) малым прадпрыемствам, якія былі зарэгістраваны пры Фондзе па ўзгадненні з Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, аказвалася фінансавая дапамога ўпраўленням і аддзелам культуры на месцах. Сродкі Фонду накіроўваліся на падтрымку нацыянальных аб'яднанняў беларусаў за мяжой, дзейнасці творчых саюзаў, грамадскіх і іншых арганізацый, якія ўносілі ўклад у адраджэнне і развіццё нацыянальнай культуры.

Стварэнне Фонду развіцця культуры і мастацтва Міністэрства культуры аказала станоўчы ўплыў на развіццё ініцыятывы на месцах, у абласцях. У некаторых раёнах краіны былі арганізаваны і афіцыйна зарэгістраваны аналагічныя фонды, у дзейнасці якіх Міністэрства па магчымасці аказвала фінансавую падтрымку. Гэта дазваляла мэтанакіравана выкарыстоўваць сродкі на развіццё нацыянальнай мовы, культуры, станаўленне дзяржаўнасці рэспублікі, рэстаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рацыю помнікаў гісторыі і культуры і вяртанне культурных каштоўнасцей з-за мяжы [439, спр. 10, арк. 168].

Жыццё ўносіла свае карэктывы ў дзейнасць Фонду. Не кожны год усе плануемыя напрамкі дзейнасці рэалізоўваліся. Напрыклад, у 2001 г. з плануемых 6500,0 тыс. рублёў паступленні склалі толькі 3720,0 тыс. рублёў. З 11 напрамкаў дзейнасці былі падтрыманы толькі 4: аказанне фінансавай дапамогі творчым работнікам сістэмы культуры (1515,3 з плануемых 1600,0 тыс. руб); утрыманне творчых работнікаў, накіраваных Міністэрствам на вучобу ці стажыроўку за мяжу, а таксама затраты па замежных камандзіроўках (553,6 з 900,0 тыс. руб па плане); прэміраванне калектываў і асобных супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва рэспублікі (60,0 з 1000,0 тыс. руб па плане); іншыя выдаткі (1125,8 з 1100,0 тыс. руб па плане). Ні на фінансаванне выдаткаў па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў і прадпрыемстваў, ні на падтрымку ініцыятыў аб’яднанняў беларусаў за мяжой, як і на падтрымку дзейнасці творчых саюзаў, фінансаванне праграм па падтрымцы таленавітых дзяцей, сродкі не былі накіраваны [439, спр. 584, арк. 56].

Выступаючы на навуковай канферэнцыі «Чалавек. Культура. Эканоміка» ў 1996 г., першы намеснік міністра культуры У. Рылатка так акрэсліваў эканамічны напрамак культурнай палітыкі Беларусі той пары: «Мы пераходзім да рынкавых адносін у галіне культуры. […] Але думаю, што мы з вамі пераходзім не да рынкавых адносін у мастацтве, а да змены форм дзяржаўнай падтрымкі. Формы будуць мяняцца, таму што мяняецца грамадства. Будуць з’яўляцца гранты, значыць, будуць канкурэнты, будзе конкурсная сістэма, будуць нарматывы, якія будуць абмяжоўваць выкарыстанне грошай у іншых мэтах. Паступова мы прыйдзем да новых форм дзяржаўнай падтрымкі мастацтва і культуры ў цэлым. Таму што якая б ні была сама па сабе эканоміка, пераносіць на мастацтва, у жыццё яе прынцыпы нельга» [814, с. 7–8].

Ва ўмовах недахопу сродкаў Міністэрства культуры было вымушана значна абмежаваць выдаткі, сканцэнтраваўшыся на асобных праектах. Пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 229 ад 1 красавіка 1996 г. «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай падтрымцы культуры» былі вызначаны прыярытэты фінансавання на перыяд з 1997 па 2000 г. Сярод іх: умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы культуры: рэстаўрацыя, капітальнае будаўніцтва, капітальны рамонт, набыццё музычных інструментаў, абсталявання, апаратуры для творчых калектываў, тэатраў, канцэртных арганізацый, устаноў культуры і навучальных устаноў, штогадовы заказ і закупка не менш за 450 музычных твораў, не менш за 40 назваў драматычных твораў беларускіх аўтараў, стварэнне 2 цыркавых праграм з удзелам беларускіх артыстаў, пастаноўка штогод па дзяржзаказе не менш за 50 назваў п’ес беларускай і класічнай драматургіі [439, спр. 97, арк. 80–84].

У 1997 г. бюджэтныя расходы Міністэрства культуры на набыццё абсталявання і капітальны рамонт узраслі ў 8,7 раза. Было закуплена абсталяванне для студыі гуказапісу Маладзёжнага тэатра эстрады, аснашчана дырэкцыя Палаца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэспублікі, павялічаны асігнаванні навучальным установам на набыццё абсталявання, асобным распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Нацыянальная кінастудыя атрымала сродкі на набыццё кіназдымачнай апаратуры [40].

У 1997 г. музеі ўпершыню за папярэднія гады поўнасцю выкарысталі сродкі на набыццё абсталявання і капітальны рамонт будынкаў. Асноўнымі аб’ектамі будаўніцтва ў 1997 г. была прыбудова да Нацыянальнага мастацкага музея і прыбудова да творчых майстэрань Беларускай акадэміі мастацтваў. Сродкі таксама накіроўваліся на рэстаўрацыю замка ў г. п. Мір, нацыянальнага гісторыка-культурнага запаведніка «Нясвіж», музея гісторыі беларускага кіно, Дома-музея А. Міцкевіча ў вёсцы Завоссе Баранавіцкага раёна [40, с. 11].

На працягу 1990-х гг. праграмна-праектнае фінансаванне мела дастаткова фрагментарны характар. Калі фінансавыя сродкі накіроўваліся на вырашэнне найбольш актуальных пытанняў, то хутчэй на ратаванне і захаванне, а не на развіццё. Толькі ў канцы 1990-х гг. была спроба прыняцця галіновай дзяржаўнай праграмы. Фактычна распрацаваная ў 1999 г. яна была зацверджана толькі з 2001 г. [208]. У далейшым кожныя пяць гадоў прымаліся падобныя праграмы як на агульнадзяржаўным, так і на мясцовым узроўнях (больш падрабязна гл. раздзел 2.1).

У пачатку 2000-х гг. дзяржавай таксама датавалася 75% сродкаў на выданне беларускамоўнай літаратуры. Доля бюджэтнага фінансавання большасці тэатраў дасягала 90% выдаткаў на іх утрыманне [106, с. 65].

Нягледзячы на значную дапамогу дзяржавы па падтрымцы, развіцці і ўмацаванні базы культуры, яна не ў поўнай меры адпавядала тагачасным патрабаванням. У 2001 г. 900 клубных устаноў і 350 бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры патрабавалі капітальнага рамонту, амаль 50 клубаў і 25 бібліятэк знаходзіліся ў аварыйным стане [106, с. 65].

Перыяд 2001–2002 гг. вызначыўся істотнымі цяжкасцямі для галіны культуры. Назіралася памяншэнне ўдзельнай вагі прадугледжаных па артыкуле «Культура» бюджэтных выдаткаў. Напрыклад, у Брэсцкай вобласці ў 2000 г. на набыццё абсталявання ўстановам культуры было выдзелена 5,5 % абласнога бюджэту, у 2001 г. – 5,4, а ў 2002 г. – толькі 0,5 %. На капітальны рамонт адбылося змяншэнне ад 13,8 % у 2000 г. да 8,8 у 2001 г. і 3,1 % у 2002 г. Гэта значна абцяжарвала выкананне пратакола даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2001 г. №1 «Аб мерах па рашэнню праблем развіцця культуры і мастацтва» [439, спр. 587, арк. 173].

Як паказала жыццё, палітычнае рашэнне аб фінансаванні галіны культуры ў памеры 3 % ад агульнай сумы дзяржбюджэту, якое было ў 1990 г. замацавана ў Законе «Аб культуры», не знайшло падмацавання фінансавымі сродкамі. У 1990 г. бюджэтныя выдаткі на культуру складалі 0,76%, у 1991 г. – 0,8, у 1992 г. – 0,84, у 1993 г. – 1,9, у 1995 г. – толькі 0,6, у 1997 г. – 0,95, у 1998 г. – 1,4, у 1999 г. – 1,2, у 2000 г. – 1,4 % [689, с. 269]. Калі параўнаць памер гэтых выдаткаў з валавым унутраным прадуктам, то аказваецца, што яны фактычна заставаліся амаль на адным узроўні (табл. 1).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 1.* **Выдаткі кансалідаванага бюджэту Рэспублікі Беларусь на культуру і мастацтва, кінематаграфію (у % ад ВУП) [104, с. 112; 738, с. 35]**

| Год | 1995 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2008 | 2009 | 2010 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Доля | 0,4 | 0,4 | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 0,8 | 0,6 | 0,4 |

Не былі рэалізаваны і намеры, выказаныя Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь у Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу Рэспублікі Беларусь у 1999 г. адносна пазіцый дзяржавы па фінансаванні культуры: «Нацыянальнай культуры не выжыць без актыўнага ўдзелу дзяржавы ў яе лёсе. […] Мы павінны паступова нарошчваць аб'ёмы і тэмпы выдзялення фінансавых сродкаў на развіццё культуры, выходзіць на гарантаваны Законам Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» узровень. Патрэбна садзейнічаць адраджэнню традыцый дабрачыннасці, шукаць належныя формы іх падтрымкі, у тым ліку і шляхам правядзення льготнай падатковай палітыкі, падымаць іх грамадскі прэстыж. Гэта павінна быць замацавана ў законах рэспублікі» [389, с. 3].

У новай рэдакцыі Закона «Аб культуры» 2004 г. з'явілася палажэнне аб тым, што «аб'ём бюджэтнага фінансавання на ўтрыманне і развіццё галіны культуры і мастацтва ўстанаўліваецца ў памеры да 1 % ад валавога ўнутранага прадукту» (частка 2, арт. 49). Калі ўсе палажэнні новай рэдакцыі ўступалі ў сілу з дня афіцыйнага апублікавання нарматыўнага прававога акта, то пункт 2 артыкула 49 уступіў у сілу з 1 студзеня 2009 г. Для дасягнення вызначанага паказчыка прадугледжвалася паэтапнае павелічэнне з 1 студзеня 2004 г., адпаведна закону аб бюджэце на чарговы фінансавы (бюджэтны) год, расходаў на культуру і мастацтва ў памеры 0,1 % ад валавога ўнутранага прадукту з улікам фінансава-эканамічнага становішча, якое склалася ў рэспубліцы. Але і гэта не было выканана. Фактычныя расходы на культуру ў 2008 г. (з улікам сродкаў на капітальнае будаўніцтва) склалі 0,83 % ад валавога ўнутранага прадукту, у 2009 г. – 0,62 %, а на 2010 г. было запланавана толькі 0,5 % [103, с. 109]. Фактычна ў 2010 г. гэты паказчык склаў 0,4 % ад валавога ўнутранага прадукту.

Дадатковымі крыніцамі фінансавання дзейнасці ўстаноў культуры, адпаведна новай рэдакцыі закона, называліся прыбыткі ад прадпрымальніцкай дзейнасці, банкаўскія крэдыты, добраахвотныя ахвяраванні фізічных і юрыдычных асоб, іншыя, не забароненыя заканадаўствам крыніцы (частка 5, арт. 49).

Адным з крокаў па забеспячэнні бюджэтнага фінансавання культуры стала ўвядзенне ў 2003 г. нарматыўна-мэтавага падыходу да фінансавання ўстаноў культуры. Асновай стаў *мінімальны сацыяльны стандарт па культуры.* У рамках яго фінансаванне бягучых выдаткаў здзяйснялася на падставе зацверджаных нарматываў фінансавых выдаткаў на адзінку аказваемай паслугі. Падобная мадэль фінансавання прадстаўлялася як аплата дзяржавай адпаведных вынікаў і стымул да павелічэння выніковых параметраў. Гэта дазволіла ўстановам культуры атрымаць гарантаваны аб'ём сродкаў, прывесці ў неабходны стан

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

матэрыяльна-тэхнічную базу, забяспечыць прадстаўленне насельніцтву асноўных традыцыйных паслуг культуры на высокім узроўні, пры гэтым захоўваючы даступныя цэны і тарыфы на гэтыя паслугі, а таксама стварыць базу для развіцця новых відаў паслуг. Як адзначалі самі спецыялісты Міністэрства культуры, у апошнія два гады перад прыняццем сацыяльнага стандарту «асігнаванні з бюджэту для ўстаноў культуры выдзяляюцца толькі на аплату працы і камунальныя паслугі, што не забяспечвае пашырэнне відаў паслуг культуры насельніцтву і аказанне іх на адпаведным узроўні» [439, спр. 744, арк. 108].

Увядзенне нарматыву было накіравана на забеспячэнне прадстаўлення мінімальнага пераліку паслуг устаноў культуры, захаванне існуючай сеткі клубаў і дамоў культуры, дамоў рамёстваў і фальклору (новыя тыпы культурных устаноў, якія пачалі стварацца ў сярэдзіне 1990-х гг.), музеяў, кінавідэапрадпрыемстваў і бібліятэк.

Нарматыў бюджэтнай забяспечанасці расходаў на культуру ў разліку на аднаго чалавека быў вызначаны ў памеры 1,5 базавай велічыні, у тым ліку 1,3 – за кошт бюджэтнага фінансавання, 0,2 – за кошт аказання платных паслуг [488]. У сярэднім па рэспубліцы забяспечанасць расходаў на культуру з улікам усіх крыніц сродкаў у разліку на 1 жыхара ў 2003 г. складала 1,9 базавай велічыні, у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту – 1,7, платных паслуг – 0,2 базавай велічыні. Выкананне нарматыву сацыяльнага стандарту па культуры дасягалася шляхам упарадкавання сеткі, стварэння новых тыпаў устаноў культуры, росту колькасці клубных фарміраванняў і новых паступленняў у бібліятэчныя фонды [439, спр. 744, арк. 123].

У 2010 г. расходы на культуру ў адпаведнасці з планамі бюджэтнага фінансавання і прагнознымі аб'ёмамі платных паслуг культуры з разліку на аднаго жыхара ў сярэднім па рэспубліцы складалі 3,0 базавай велічыні, у тым ліку за кошт сродкаў бюджэту – 2,4 базавай велічыні, платных паслуг – 0,6 базавай велічыні [104, с. 111].

У канцы вывучаемага перыяду адносна тэатральна-відовішчных арганізацый і арганізацый кінематаграфіі, якія здзяйснялі паказ і пракат фільмаў, выкарыстоўваўся прынцып нарматыўнага фінансавання шляхам выдзялення субсідый з бюджэту. Урад краіны ў 2010 г. адзначаў, што дадзеная сістэма фінансавання не стымулявала да пошуку новых форм дзейнасці, павелічэння ўласных даходаў і аптымізацыі вытворчых затрат. Дзяржаўныя арганізацыі культуры атрымлівалі бюджэтныя сродкі на пагашэнне страт. Фактычна субсідыі ішлі на пакрыццё розніцы паміж іх даходамі і выдаткамі. Гэта акалічнасць у ходзе праверкі арганізацый культуры Камітэтам дзяржаўнага кантролю прывяла да абвінавачання ў незаконным расходаванні імі бюджэтных сродкаў [81, т. 12, арк. 16].

Напрыклад, дзяржаўныя тэатральна-відовішчныя арганізацыі мелі права атрымліваць субсідыі толькі на пакрыццё выдаткаў, якія ўзніклі ў выніку продажу білетаў па цэнах, якія рэгуляваліся Міністэрствам культуры (25 % ад агульнага аб'ёму), а ўсе астатнія свае выдаткі павінны былі пакрываць самастойна.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Такое патрабаванне было нездзяйсняемым. У 2009 г. суадносіны бюджэтных сродкаў, выдзеленых тэатрам, і іх уласных даходаў склалі адпаведна 70 і 30 %. Вывесці на самаакупнасць праз шматкратнае павышэнне свабодных коштаў на білеты было нерэальна. Магчымасці дзяржаўнай падтрымкі арганізацый культуры былі прадугледжаны артыкуламі 44–47 Бюджэтнага кодэксу. Аднак канкрэтныя напрамкі такой падтрымкі ў ім не былі вызначаны [81, т. 12, арк. 16].

Для ліквідацыі існуючага прабелу ў заканадаўстве быў падрыхтаваны і прыняты асобны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, уведзены ў дзеянне з 1 студзеня 2011 г. [524]. Ім былі замацаваны канкрэтныя напрамкі дзяржаўнай падтрымкі тэатральна-відовішчных арганізацый, дзяржаўных паркаў культуры і адпачынку і заапаркаў, дзяржаўных арганізацый кінематаграфіі, якія здзяйснялі пракат, распаўсюджанне і паказ фільмаў, а таксама дзяржаўных арганізацый культуры змешанага тыпу ў частцы іх падраздзяленняў, якія здзяйснялі культурную дзейнасць шляхам стварэння твораў сцэнічнага (музычнага) мастацтва і правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў. Для іх быў уведзены нарматыўны парадак забеспячэння культурнай дзейнасці. У аснову нарматыву быў пакладзены колькасны паказчык – колькасць мерапрыемстваў, якія арганізацыі культуры павінны правесці за год, каб атрымаць бюджэтную субсідыю. Ён устанаўліваўся дыферэнцыравана для розных тыпаў арганізацый культуры з улікам іх рэжыму працы, спецыфікі творчай дзейнасці, наяўнасці ўласнай сцэнічнай пляцоўкі і іншых фактараў. Асобна было прадугледжана субсідзіраванне стварэння прэм’ерных пастановак і фільмаў. У выніку невыканання нарматываў атрыманыя сродкі павінны былі вяртацца ў бюджэт. Арганізацыі культуры таксама атрымалі права накіроўваць даходы, якія засталіся пасля пакрыцця выдаткаў на іх дзейнасць і правядзення абавязковых выплат у бюджэт, ва ўласныя фонды накаплення і спажывання.

Не стымулявала да пошуку новых эканамічных форм працы і практыка *бюджэтнага фінансавання культурых праектаў* дзяржаўных арганізацый: фестываляў, конкурсаў, канцэртаў, выстаў і інш. Пры атрыманні гэтымі арганізацыямі даходу звыш планаванага, на гэту розніцу памяншалася бюджэтнае фінансаванне. Такім чынам, арганізацыя не мела магчымасці правесці праект з прыбыткам [83, арк. 83].

У мэтах паляпшэння матэрыяльнай базы галіны культуры існавала практыка мэтавага выдзялення сродкаў у рамках фінансавання асобных праграм. У 2004 г. пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь была зацверджана *Дзяржаўная праграма па рэканструкцыі і тэхнічнаму пераасначэнню дзяржаўных тэатраў Рэспублікі Беларусь на 2004–2010 гг.* Мэтай праграмы, якая была падоўжана да 2013 г., было правядзенне работ па пераўтварэнні архітэктурнага вобліку тэатральных будынкаў, наданне ім больш прывабнага выгляду, павышэнне бяспекі, правядзенне тэхнічнага перааснашчэння ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі. Праграмай было ахоплена 24 тэатры, з якіх 18 – у перыяд 2004–2010 гг. [81, т. 12, арк. 16].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэканструкцыя і рэстаўрацыя аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны здзяйснялася ў рамках *Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы*. У 2010 г. работы вяліся на 15 аб'ектах, сярод якіх былі замкавы комплекс у г. п. Мір, палаца-паркавы ансамбль у г. Нясвіжы, будынак Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, Косаўскі палаца-паркавы ансамбль, комплекс былога калегіума іезуітаў у вёсцы Юравічы Калінкавіцкага раёна, палаца-паркавы ансамбль у вёсцы Жылічы Кіраўскага раёна і інш. [81, т. 3, арк. 18].

Па форме *дзяржаўнага заказу* ў межах выдзеленых бюджэтных сродкаў Міністэрства культуры фінансавала набыццё твораў выяўленчага і музычнага мастацтва, пастаноўку спектакляў і стварэнне канцэртных праграм. Напрыклад, у перыяд з 2001 па 2005 г. Міністэрства набыло і перадала ў музеі твораў на суму звыш 400 млн рублёў. У перыяд 2005–2006 гг. былі аб'яўлены дзяржаўныя заказы на стварэнне мастацкіх твораў для экспазіцыі «Інтэр'еры ратушы XVIII – першай паловы XIX ст.» Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», партрэтаў алімпійскіх чэмпіёнаў (па заказе Алімпійскага камітэта) [168, с. 42].

Дзяржава побач з прамым фінансаваннем сферы культуры выкарыстоўвала і *ўскосны механізм* падтрымкі – падатковае заканадаўства.

Законам «Аб культуры» было замацавана палажэнне аб тым, што дзяржава стымулюе накіраванне сродкаў на фінансаванне культуры, выкарыстоўваючы метады эканамічнага рэгулявання і льготнага падаткаабкладання (арт. 43). Прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы культуры, выдаткі на ўтрыманне якіх поўнасцю пакрываліся за кошт рэспубліканскага ці мясцовых бюджэтаў ці якія атрымлівалі дзяржаўныя датацыі з бюджэту, законам былі вызвалены ад падатку на прыбытак. Гэтая ж падатковая льгота распаўсюджвалася на прыбытак гаспадарча-разліковых прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый, зарэгістраваных на тэрыторыі краіны творчых саюзаў і асобных грамадскіх арганізацый, накіраваная імі сваім заснавальнікам на здзяйсненне іх статутнай дзейнасці. Асобна закон замацаваў вызваленне ў межах заканадаўства па падаткаабкладанні ад падатку на прыбытак сумаў прыбытку, пералічаных зарэгістраваным на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь Беларускаму добраахвотнаму таварыству аховы помнікаў гісторыі і культуры, Нацыянальнаму фонду адукацыі і культуры, рэспубліканскім і мясцовым фондам развіцця культуры, Таварыству беларускай мовы імя Ф. Скарыны, аб'яднанню беларусаў свету «Бацькаўшчына», а таксама пералічаных прадпрыемствам, арганізацыям і ўстановам культуры. На той час памер сумы, на якую распаўсюджвалася льгота, складаў 1 % ад прыбытку (Закон ад 22 снежня 1991 г. «Аб падатках на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый»).

Закон дэклараваў магчымасць устанаўлення падатковым заканадаўствам іншых ільгот па падаткаабкладанні прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый культуры, «уключаючы арганізацыі, якія займаюцца рамонтам, рэстаўрацыяй і рэканструкцыяй помнікаў гісторыі» (арт. 43).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У верасні 1992 г. Міністэрства культуры накіравала ў тагачасны Белдзяржэканомплан краіны прапановы па ўдасканаленні падатковага заканадаўства. Для прыцягнення дадатковых рэсурсаў на развіццё культуры, стымулявання спонсарства і мецэнацтва бачылася неабходнасць зацікаўлення прадпрыемстваў, устаноў другіх сфер дзейнасці і прыватных асоб у такім фінансаванні культуры. Міністэрства выказвалася аб тым, што дзяржава павінна гарантаваць спонсарам (мецэнатам) ільготнае падаткаабкладанне: «Неабходна, каб сума прыбытку, якая падлягае падаткаабкладанню, змяншалася на суму пералічаных у культуру сродкаў у якасці дабрачыннай дапамогі ці на грашовы эквівалент дапамогі, аказанай у выглядзе перадачы матэрыяльна-тэхнічных сродкаў або любых відаў паслуг. Агульная сума спонсарскіх (мецэнацкіх) сродкаў, накіраваных на патрэбы культуры і мастацтва, не павінна абмяжоўвацца адным працэнтам атрыманага спонсарам прыбытку ці прадпрымальнікам даходу за справаздачны перыяд, як гэта значыцца ў Законе» [438, спр. 2075, арк. 279]. У 1996 г. памер сумы дапамогі ўстановам культуры і мастацтва, якая не падлягае падаткаабкладанню, быў павялічаны да 5 % ад балансавага прыбытку [468]. Гэта норма існавала да канца 2010 г.

Побач з гэтым Міністэрства культуры адзначала, што ўстаноўленая Законам «Аб культуры» (арт. 43) ільгота па падаткаабкладанні прыбытку, якая прадугледжвала вызваленне ад падаткаў прадпрыемстваў і ўстаноў, якія поўнасцю знаходзіліся на бюджэтным фінансаванні або атрымлівалі датацыі з бюджэту, фактычна не дзейнічала [438, спр. 2075, арк. 278]. А ў 1996 г. яна ўвогуле была ліквідавана [468].

Яшчэ адной сур’ёзнай праблемай у той час называлася прыраўноўванне мастацкіх промыслаў па ўмовах падаткаабкладання да прамысловых прадпрыемстваў. Каб выжаць, майстры вымушаны былі замяніць выраб працаёмкіх вырабаў няпрофільнай прадукцыяй, больш выгаднай для вытворчасці. У выніку гублялася майстэрства і мастацкія якасці вырабаў, у якіх былі закладзены звесткі аб быце і культуры людзей [438, спр. 2075, арк. 280].

Прадугледжаны ў Законе 1991 г. «Аб падатках на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб’яднанняў, арганізацый» [507] падатак на прыбытак ад відэапаказу ў памеры 60 % паставіў пад пагрозу не толькі перспектыву развіцця дзяржаўнага відэапракату, але і само існаванне створанай на той момант матэрыяльнай базы. Міністэрства культуры лічыла, што такі памер падатку затармозіць развіццё відэасеткі ў краіне, дазволіць нажыцца прыватным асобам, прывядзе да значнага скарачэння існаваўшых на той момант і неперспектыўнасці адкрыцця новых відэазалаў. У сувязі з гэтым выказвалася просьба вызваліць ад выплаты падатку на прыбытак ад відэапаказу прадпрыемствы, установы і арганізацыі, якія ўваходзілі ў яго сістэму, устанавіўшы для іх падатак на прыбытак ў памеры 30 % [438, спр. 2076, арк. 174]. Гэта было здзейснена новай рэдакцыяй закона ад 19 красавіка 1996 г. (п. 8 арт. 4) [468]. А са студзеня 2002 г. падатак на прыбытак быў зніжаны да 24 % [476].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У першай рэдакцыі Закона «Аб падатках на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый» было палажэнне аб вызваленні ад падатку на прыбытак «прадпрыемстваў, якія належаць на правах уласнасці творчым саюзам Рэспублікі Беларусь» (п. 3 арт. 5). У снежні 1992 г. гэта фармуліроўка была ўдакладнена наступным чынам: «Вызваляюцца ад падатку на прыбытак прадпрыемствы, якія належаць на правах уласнасці творчым саюзам Рэспублікі Беларусь (архітэктараў, дызайнераў, пісьменнікаў, журналістаў, кінематаграфістаў, кампазітараў, мастакоў, музычных дзеячаў, тэатральных дзеячаў, фотамастакоў), Гільдыі кінаакцёраў Беларусі, Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў і культурных фондаў, Беларускаму фонду культуры, Літаратурнаму фонду Беларусі, Таварыству беларускай мовы імя Ф. Скарыны, а таксама створаныя імі творчыя майстэрні (студыі), якія адпавядаюць прафесійнай накіраванасці гэтых саюзаў, фондаў і таварыстваў» [475]. У 1996 г. гэты артыкул быў выключаны [468]. Творчыя саюзы павінны былі плаціць згаданы падатак.

Льготы былі вернуты толькі ў 2001 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 09 чэрвеня 2001 г. № 374 «Аб вызваленні асацыяцыі грамадскіх аб'яднанняў “Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў” і творчых саюзаў Рэспублікі Беларусь ад уплаты падаткаў на прыбытак і дабаўленую вартасць». Ім прадугледжвалася вызваленне: дзяржаўных арганізацый культуры і мастацтва, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, ад налічэння ўплаты падаткаў і іншых абавязковых плацяжоў у бюджэт, акрамя ўзносаў па дзяржаўным страхаванні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва; дзяржаўных прадпрыемстваў па кінавытворчасці ад уплаты падатку на прыбытак у частцы грашовых сродкаў, якія паступаюць ад інвестараў, пры ўмовах накіравання вызваленых сродкаў на кінавытворчасць; ільготныя крэдыты на будаўніцтва жылля. Заўважым, што гэта адбылося ў найбольш складаны для галіны перыяд змяншэння бюджэтнага фінансавання.

З 1992 па 2002 г. дзейнічала норма аб вызваленні ад падатку на прыбытак сумаў сродкаў, фактычна патрачаных прадпрыемствамі, якія з'яўляюцца ўласнікамі каштоўнасцей, унесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, на правядзенне навукова абгрунтаваных даследчых і рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ, якія датычаць гэтых каштоўнасцей (п. 9–5 арт. 5 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падатках на даход і прыбытак» ад 22 снежня 1991 г. № 1330-XII).

Сумы падатку, якія заставаліся ў распараджэнні прадпрыемстваў, арганізацый у сувязі з ільготным падаткаабкладаннем, падлягалі залічэнню ў фонд развіцця і маглі выкарыстоўвацца толькі на развіццё вытворчай базы (п. 11 арт. 5 Закона Рэспублікі Беларусь ад 22 снежня 1992 г. № 2061-XII) [475].

З 2003 па 2006 г. дзейнічала *вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць* (ПДВ) абаротаў ад рэалізацыі работ па рэканструкцыі і рэстаўрацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей, унесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (пп. 2.13 п. 2 арт. 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб падатку на дабаўленую вартасць») [463].

З 1996 г. установы культуры пачалі плаціць падатак на дабаўленую вартасць пры правядзенні платных мерапрыемстваў, што пагоршыла іх матэрыяльны стан [468].

У красавіку 1996 г. Міністэрства культуры звярталася ў Камісію па адукацыі, навуцы і культуры Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з прапановамі першачарговых мер па ўдасканаленні падатковага заканадаўства. На першым месцы стаяла вызваленне ад уплаты надзвычайнага падатку для ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС, падатку на дабаўленую вартасць прадпрыемстваў і ўстаноў культуры і мастацтва, якія фінансаваліся з бюджэту ці атрымоўвалі датацыю, а таксама творчых саюзаў і належачых ім на правах уласнасці прадпрыемстваў і арганізацый. Бачылася неабходным вызваліць ад падатку на дабаўленую вартасць кошт работ па рамонце, рэстаўрацыі і будаўніцтве аб'ектаў культуры, а таксама сумаў грашовых сродкаў, якія атрымлівалі ўстановы і арганізацыі культуры і мастацтва ў выглядзе фінансавай дапамогі і на папаўненне фондаў спецыяльнага прызначэння. Ад падатку на прыбытак прапаноўвалася вызваліць дзяржаўныя і недзяржаўныя суб'екты гаспадарання ў межах сум, накіроўваемых на аказанне фінансавай дапамогі, падтрымку і развіццё культуры і мастацтва. Звярталася ўвага на неабходнасць вызваліць ад уплаты мытных пошлін на музычныя інструменты, тэатральнае абсталяванне, якое набывалася дзяржаўнымі ўстановамі культуры і мастацтва і творчымі саюзамі за мяжой [439, спр. 92, арк. 18].

Непрадуманае падатковае заканадаўства значна ўскладняла дзейнасць устаноў культуры прафсаюзных арганізацый, усё больш камерцыялізуючы яе. У выніку скарачалася колькасць калектываў мастацкай самадзейнасці, зачыняліся гурткі і студыі народных промыслаў і рамёстваў, хаця па колькасці абслугоўваемага насельніцтва яны ў многіх месцах пераўзыходзілі дзяржаўныя ўстановы культуры [438, спр. 2075, арк. 280].

Толькі ў красавіку 2000 г. у адпаведнасці з Законам «Аб падатку на дабаўленую вартасць» была прынята Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь [602], якая зацвердзіла пералік паслуг у сферы культуры і мастацтва, абароты па рэалізацыі якіх на тэрыторыі краіны вызваляліся ад ПДВ. У 2006 г. ужо Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 194 быў зацверджаны новы значна пашыраны пералік паслуг [603]. Разам з гэтым было звужана кола арганізацый, паслугі якіх не абкладаліся ПДВ. У ранейшы пералік былі ўключаны паслугі культурна-асветных і кінавідовішчных арганізацый па правядзенні культурна-масавай работы сярод насельніцтва. Да такой работы адносіліся танцавальныя вечары, тэматычныя праграмы дыскатэк і дыскаклубаў, канцэртная дзейнасць, дзейнасць па арганізацыі выступленняў разнастайных артыстаў, па пастаноўцы і паказе тэатральных прадстаўленняў, спектакляў. Пры гэтым заканадаўствам не былі ўстаноўлены размежаванні ў прымяненні вызвалення ад ПДВ па дадзеных паслугах у залежнасці ад формы ўласнасці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыі, якая гэтыя паслугі аказвала. З 1 студзеня 2006 г. на падставе ўказа права на вызваленне ад ПДВ па такіх паслугах магло быць прадстаўлена толькі дзяржаўным арганізацыям, клубным установам, музеям, музеям-запаведнікам, выставачным арганізацыям у сферы культуры, бібліятэкам, паркам культуры і адпачынку, арганізацыям кінематаграфіі незалежна ад формы ўласнасці [229]. У тэксце ўказа таксама было змешчана тлумачэнне тэрміна «клубная ўстанова»: «арганізацыя культуры, створаная з адпаведнасці з заканадаўствам у форме ўстановы для здзяйснення асветных, выхаваўчых і забаўляльных функцый *некамерцыйнага* характару ў галіне культуры шляхам стварэння фізічным асобам спрыяльных умоваў для займання народнай і мастацкай творчасцю, задавальнення іх пазнаваўчых патрэбнасцей, а таксама патрэбнасцей у самаадукацыі, духоўным і фізічным развіцці, міжасабовых зносінах і адпачынку і *фінансуемая ўласнікам поўнасцю ці часткова*». Тэрмін «установа», адпаведна артыкулам 46 і 120 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, трактавалася як адна з форм некамерцыйных арганізацый і павінна была рэгістравацца як юрыдычная асоба.

Адпаведна артыкулу 96 Падатковага кодэкса, ад падатку на дабаўленую вартасць, якую збіралі мытныя органы пры ўвозе на тэрыторыю нашей дзяржавы, былі вызвалены мастацкія каштоўнасці, якія ўвозіліся ў парадку, вызначаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, у якасці дару арганізацыям культуры [441].

Артыкул 194 Падатковага кодэкса вызваляў ад сплаты зямельнага падатку зямельныя ўчасткі арганізацый, якія здзяйснялі сацыяльна-культурную дзейнасць і атрымлівалі субсідыі з бюджэту на пакрыццё страт ад гэтай дзейнасці, а таксама зямельныя ўчасткі бюджэтных арганізацый.

Артыкул 202 Падатковага кодэкса вызваляў ад сплаты зямельнага падатку пры перадачы ў арэнду згаданых вышэй участкаў, іншае выплатнае ці бязвыплатнае карыстанне будынкамі (памяшканнямі) і пабудовамі бюджэтнымі арганізацыямі, арганізацыям, якія здзяйснялі сацыяльна-культурную дзейнасць і атрымлівалі субсідыі з бюджэту на пакрыццё страт ад гэтай дзейнасці.

Акрамя гэтага, дзейнічала вызваленне ад сплаты падатку на нерухомасць адносна будынкаў і пабудоваў сацыяльна-культурнага прызначэння, будынкаў і пабудоваў, прызнаных у вызначаным парадку матэрыяльнымі гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі, уключанымі ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, па пераліку такіх каштоўнасцей, зацверджаным Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, пры ўмове выканання іх уласнікамі (уладальнікамі) заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны (арт. 186 Падатковага кодэкса).

Гэта норма дзейнічалала і ў выпадку, калі згаданыя будынкі і памяшканні (часткі памяшканняў) здаваліся арганізацыямі ў арэнду, іншае выплатнае карыстанне ці бязвыплатнае карыстанне бюджэтным арганізацыям, арганізацыям, якія здзяйснялі сацыяльна-культурную дзейнасць і атрымлівалі субсідыі з бюджэту (арт. 186 Падатковага кодэкса).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У развіццё тэзіса з Паслання Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу 2010 г. аб тым, што «сфера культуры павінна стаць прэстыжнай для ўкладання капіталу», Міністэрствам культуры было прапанавана стварыць сістэму падатковых прэферэнцый для развіцця нацыянальнай культуры, якія б садзейнічалі росту прыцягнення пазабюджэтных сродкаў у сферу культуры [655]. Гэта адпавядала норме артыкула 12 Закона «Аб культуры» (рэдакцыя 2004 г.), [46] які дэкларваў магчымасць дзяржаўных органаў, якія здзяйснялі рэгуляванне і кіраванне ў сферы культуры, у адпаведнасці са сваёй кампетэнцыяй стымуляваць культурную дзейнасць, дабрачынную дзейнасць і прадстаўленне бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі ў сферы культуры шляхам устанаўлення і прадстаўлення гарантый суб'ектам творчай дзейнасці, ільгот некамерцыйным арганізацыям культуры, а таксама фізічным і юрыдычным асобам, якія здзяйснялі дабрачынную дзейнасць і прадстаўленне бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі ў галіне культуры.

Міністэрства культуры пры падрыхтоўцы праекта нарматыўнага прававога акта «лічыла важным стварыць аднолькавыя ўмовы для ўсіх юрыдычных асоб, якія займаюцца культурнай дзейнасцю, бо, адпаведна з артыкулам 13 Канстытуцыі Рэспрублікі Беларусь, дзяржава прадстаўляе ўсім роўныя правы для здзяйснення гаспадарчай і іншай дзейнасці, акрамя забароненай законам, і гарантуе роўную абарону і роўныя ўмовы для развіцця ўсіх форм уласнасці» [81, т. 10, арк. 60].

Міністэрства адстойвала пазіцыю аб распаўсюджанні падатковых ільгот, якімі карысталіся бюджэтныя арганізацыі і арганізацыі, што атрымлівалі субсідыі, на ўсіх суб'ектаў гаспадарання, якія займаліся культурнай дзейнасцю, уключаючы арганізацыі кінематаграфіі. Прапаноўвалася ў праект Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «уключыць палажэнні аб непрызнанні аб'ектам падаткаабкладання падаткам на дабаўленую вартасць бязвыплатную перадачу тавараў (работ, паслуг), маёмасных правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці арганізацыям культуры для здзяйснення культурнай дзейнасці. Бачылася неабходным вызваліць ад падатку на дабаўленую вартасць, які браўся пры ўвозе на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь культурных каштоўнасцей, набытых арганізацыямі культуры, не абкладаць падаткам на прыбытак бязвыплатна атрыманую маёмасць, грашовыя сродкі, вызваліць ад падаткаабкладання прыбытак усіх арганізацый культуры, атрыманы ад культурнай дзейнасці...» [81, т. 10, арк. 60–61].

З боку Міністэрства культуры былі падрыхтаваны таксама прапановы па прыцягненні спонсарскіх сродкаў у культуру. Неабходна адзначыць, што парадак прадстаўлення і выкарыстання бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі на той час вызначаўся Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 ліпеня 2005 г. № 300. Аднак уклад спонсараў у фінансаванне культурнай дзейнасці быў нязначны. Можна прывесці некалькі найбольш значных прыкладаў спонсарскай падтрымкі і рэалізацыі сумесных праектаў з замежнымі фондамі і арганізацыямі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

З 2009 г. Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі рэалізоўвала праект з прадстаўніцтвам ААН у Рэспубліцы Беларусь (ПРАААН) па выдзяленні грантавых сродкаў на выплату стыпендыі Фонда Марыі Шарапавай для маладых людзей з чарнобыльскага рэгіёна (3500 дол. ЗША за вучэбны год). У 2010 г. у стадыі распрацоўкі была сумесная праграма з ААТ «Прыёрбанк» па падтрымцы таленавітых студэнтаў Акадэміі (стажыроўка двух чалавек у Аўстрыі) [83, арк. 54].

Шматгадовым і плённым было супрацоўніцтва Нацыянальнага мастацкага музея і кампаніі «Брыціш Амерыкан Табака», якое дазволіла прыцягнуць значныя фінансавыя сродкі для арганіазцыі міжнародных выставачных праектаў, выдання каштоўных альбомаў і буклетаў [83, арк. 54–55].

Пры фінансавай падтрымцы гэтай кампаніі Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала альбом «Рарытэты Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі», у 2008 г. здзейсніла тыражыраванне дыска «Слуцкае Евангелле: беларускі рукапіс XVI ст.». У рамках акцыі «Рарытэтныя выданні – беларускай скарбніцы» бібліятэка атрымала 26 унікальных старадрукаваных кніг, беларускіх перыядычных выданняў і карт [83, арк. 55].

Прыкладам трывалага партнёрства з’яўлялася шматгадовае супрацоўніцтва сімфанічнага аркестра Маладзечанскага музычнага вучылішча і прыватнай фірмы «ЭНЕФ» з Маладзечна. Быў створаны сумесны апякунчы савет. У адпаведнасці з падпісанай дамовай фірма штомесяц выдзяляла аркестру фінансавыя сродкі на рэкламна-інфармацыйную дзейнасць, транспарт, пашыў сцэнічных касцюмаў, пастаноўку канцэртных нумароў [83, арк. 55].

Яскравым прыкладам рэалізацыі культурнай падзеі са значнай падтрымкай прыватнага капіталу з’яўляўся фестываль Юрыя Башмета. Дзякуючы намаганням музыканта і прадзюсара Р. Крымера фестываль з самага пачатку (2005 г.) меў добрую падтрымку з боку спонсараў. З цягам часу фестываль набыў папулярнасць і стаў для многіх кампаній і банкаў прэстыжным мерапрыемствам для ўкладання сродкаў. Так, у 2010 г. пасля правядзення фестывалю ўсе бюджэтныя сродкі, вылучаныя Міністэрствам культуры, былі вернуты, паколькі спонсарская дапамога пакрыла ўсе выдаткі [83, арк. 72].

Новым па змесце і эканамічнай арганізацыі стаў Міжнародны фестываль «Уладзімір Співакоў запрашае», праведзены ўпершыню ў снежні 2010 г. Крыніцамі фінансавання сталі спонсарскія сродкі, сродкі Міжнароднага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва, Міністэрства культуры, даходы ад рэалізацыі білетаў. У арганізацыі фестывалю прымала ўдзел прыватная фірма – ТАА «Берын арт-менеджмент» [83, арк. 72].

Вельмі яркімі былі праекты, арганізаваныя з удзелам дзяржаўных арганізацый без прыцягнення бюджэтных сродкаў, – «Тэатральны тыдзень з Белгаспрамбанкам» (праводзіўся з 2007 г.), Калядны оперны форум (2010), праект А. Ліепы «Рускія сезоны» ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета (2010).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З мэтай прыцягнення сродкаў для фінансавання культурнай дзейнасці Міністэрства культуры прыняла рашэнне, што юрыдычныя асобы, якія бязвыплатна выдзелілі матэрыяльныя і фінансавыя сродкі для падтрымкі культуры за кошт уласных сродкаў, не павінны былі плаціць падаткі на тыя сродкі, што перадалі (былі адчужаны) арганізацыям культуры. Гучала прапанова вызваліць такія тавары (работы, паслугі), маёмасныя правы ад ПДВ, а прыбытак, накіраваны на дапамогу арганізацыям культуры, вызваліць ад падатку на прыбытак без абмежаванняў.

На думку Міністэрства, устанаўленне сацыяльнага падатковага вылічэння пры вызначэнні падатковай базы па падаходным падатку фізічных асоб на суму, перададзеную фізічнай асобай арганізацыям культуры ў выглядзе ахвяраванняў, дазволіла б прыцягнуць у сферу культуры сродкі фізічных асоб.

Прагучала таксама прапанова разгледзець магчымасць унясення змен у артыкул 553 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, які прадугледжваў, што ў агульнакарысных мэтах арганізацыям і ўстановам культуры (а не толькі ўстановам культуры, як гэта было ў дзеючай на той час рэдакцыі) можа ахвяравацца не толькі рэч ці права, але і бязвыплатнае выкананне работ, аказанне паслуг [81, т. 7, арк. 57].

Важнымі элементамі стварэння сістэмы стымулявання прыцягнення капіталу ў сферу культуры, на думку Міністэрства культуры, магло стаць прыняцце шэрага заахвочвальных мер. Напрыклад, узнагароджанне дзяржаўнымі ўзнагародамі мэцэнатаў, якія аказалі істотную падтрымку сферы культуры. Гэта мера не патрабавала ўнясення змен у заканадаўства. Адпаведна Закону Рэспублікі Беларусь ад 18 мая 2004 г. «Аб дзяржаўных узнагародах Рэспублікі Беларусь» за асаблівыя заслугі ў гуманітарнай, дабрачыннай дзейнасці, у справе абароны чалавечай годнасці і правоў грамадзян, міласэрнасці і іншыя высакародныя ўчынкі грамадзяне маглі быць узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны.

Іншымі магчымасцямі былі ўзнагароджанне нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» мецэнатаў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё культуры, правядзенне рэспубліканскага конкурсу «Мецэнат года» і заснаванне нагруднага знака «Мецэнат года» [81, т. 7, арк. 58].

З мэтай аказання арганізацыйнай, фінансавай і іншай дапамогі арганізацыям і ўстановам культуры Міністэрства культуры ініцыявала пытанне стварэння апякунскіх саветаў пры нацыянальных і найбольш значных установах культуры. Гэта дазволіла б стымуляваць уключэнне буйных камерцыйных кампаній краіны ў склад апякунскіх саветаў і аказання з іх боку істотнай дапамогі ўстановам культуры [81, т. 7, арк. 58].

Вынікам стала прыняцце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2011 г. № 145 «Аб некаторых пытаннях падаткаабкладання ў сферах культуры і інфармацыі», а таксама зацвярджэнне пастановай Савета Міністраў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэспублікі Беларусь ад 12 сакавіка 2011 г. № 308 Палажэння аб апякунскім савеце арганізацыі культуры.

У вывучаемы перыяд у сувязі з адсутнасцю ў краіне сістэмы садзейнічання развіццю дабрачыннасці і спонсарства дадатковае фінансаванне дзяржаўных арганізацый культуры адбывалася шляхам пашырэння пазабюджэтнай дзейнасці, спектра аказання ***платных паслуг*** насельніцтву. Адзначым, што яшчэ ў 1987 г. калегіяй Міністэрства культуры была прынята праграма першачарговых мер развіцця платных паслуг у галіне культуры. Да 1992 г. установы і прадпрыемствы культуры і мастацтва рэспублікі аказвалі больш за 30 відаў платных паслуг. Ацэньваючы дынаміку росту аб'ёму платных паслуг у перыяд да 1992 г. уключна, Міністэрства падкрэслівала, што нарошчванне за кошт павелічэння масы і разнастайнасці натыкалася на значныя цяжкасці. З аднаго боку, існуючая ў той час матэрыяльная база ўстаноў культуры не садзейнічала развіццю сістэмы платных паслуг: больш за 65 % клубаў і дамоў культуры не мелі памяшканняў для гуртковай работы і разлічаны былі толькі на правядзенне масавых мерапрыемстваў, у большасці музеяў адсутнічалі выставачныя залы, вельмі малой была сетка карцінных галерэй, што перашкаджала павелічэнню паказаў музейных калекцый, каля 75 % механізаваных атракцыёнаў у парках культуры і адпачынку патрабавалі спісання па тэхнічнай зношанасці, для культасветустаноў не хапала відэа- і камп'ютарнай тэхнікі і інш. [438, спр. 2079, арк. 216].

З другога боку, з пераходам эканомікі Рэспублікі Беларусь да рыначных адносін і ў сувязі са змяненнем эканамічных умоў работы галіны культуры з 1991 г. далейшае павелічэнне аб'ёму платных паслуг адбывалася толькі за кошт росту цэн на паслугі культуры пры адначасовым змяншэнні іх разнастайнасці. Праведзены ў той час спецыялістамі Міністэрства культуры аналіз развіцця сістэмы платных паслуг у новых эканамічных умовах даў падставы сцвярджаюць, што на 1992 г. магчымасці існуючай сістэмы культуры і культурнага абслугоўвання падтрымаць сябе практычна вычарпаны. Аб гэтым сведчыла стыхійнае памяншэнне колькасці клубных устаноў, кінатэатраў, музеяў, бібліятэк, скарачэнне колькасці спажыўцоў традыцыйных форм культурных паслуг і г. д. Адначасова з-за павелічэння кошту культурных паслуг скарачаўся ахоп насельніцтва гэтымі паслугамі і, такім чынам, паніжаўся культурны эфект ад дзейнасці ўстаноў культуры, нягледзячы на тое, што датацыі на ўтрыманне ўстаноў таксама значна ўзрасталі [438, спр. 2079, арк. 216].

У 1992 г. Міністэрства культуры лічыла неабходным здзейсніць наступныя крокі для развіцця сістэмы платных паслуг. У першую чаргу яно выказвалася за спыненне і ўзяцце пад кантроль працэсу скарачэння матэрыяльнай інфраструктуры культуры. Неабходным бачылася пашырэнне практыкі пераводу некаторых тыпаў устаноў культуры на арэндныя адносіны і заахвочванне за кошт падатковых ільгот да развіцця і пашырэння відаў паслуг, якія прадстаўлялі гэтыя ўстановы спажыўцу. Міністэрства культуры сумесна з Фондам развіцця культуры планавала арганізаваць продаж ліцэнзій установам і прад-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыемствам, прыватным асобам, камерцыйным структурам на правядзенне масавых відовішчаў, забаўляльных і іншых мерапрыемстваў [438, спр. 2079, арк. 216–217].

Адпаведна статыстычным дадзеным, у 1993 г. памер фінансавых паступленняў у клубныя ўстановы дзяржаўнай сеткі з пазабюджэтных крыніц складаў у сярэднім 7,3 % ад агульнага аб'ёму фінансавых паступленняў (на 0,6 % болей, чым у 1992 г.), з іх 6,1 % – паступленні ад вытворчай і камерцыйнай дзейнасці і 1,2 % – іншыя пазабюджэтныя паступленні. Становішча па абласцях істотна адрознівалася. У 1993 г. у Віцебскай вобласці ва ўстановах клубнага тыпу паступленні ад вытворчай і камерцыйнай дзейнасці складалі 11,5 %, а іншыя пазабюджэтныя паступленні – 4,3 % ад агульнага аб'ёму фінансавых паступленняў. У Магілёўскай вобласці ва ўстановах клубнага тыпу паступленні ад вытворчай і камерцыйнай дзейнасці складалі толькі 2,7 % [363, с. 33].

У 1997 г. уласныя сродкі прадпрыемстваў і ўстаноў культуры, атрыманыя ад аказання платных паслуг, склалі 9 % усіх паступленняў на ўтрыманне і развіццё галіны [40, с. 4]. У 2001 г. гэты паказчык складаў 10 %. Нягледзячы на актывізацыю работы па аказанні платных паслуг насельніцтву, прагнозныя паказчыкі па тэмпах росту аб'ёму платных паслуг у супастаўляльных цэнах не выконваўся. За 1995 г. ён склаў па сістэме Міністэрства культуры 67 % ад узроўню 1994 г., а ў 2001 г. – 87 % ад 2000 г. [439, спр. 587, арк. 166].

Асаблівая ўвага да пытання аказання платных паслуг насельніцтву і атрымання іншых відаў пазабюджэтных даходаў удзялялася ў 2000–2001 гг. Гэта было звязана, галоўным чынам, са складанай фінансавай сітуацыяй і нізкім забеспячэннем устаноў бюджэтнымі асігнаваннямі [439, спр. 587, арк. 173].

Як ужо адзначалася вышэй, з мэтай прыцягнення дадатковых пазабюджэтных сродкаў дзяржаўныя ўстановы культуры, якія фінансаваліся з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, былі ў 2001 г. вызвалены ад уплаты падатку на прыбытак і падатку на дабаўленую вартасць з накіраваннем вызваленых сум на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы і сацыяльнай абароны ў частцы дадатковых сродкаў, якія атрыманы ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, што з'яўлялася стымулам для развіцця прадпрымальніцтва [439, спр. 587, арк. 173].

Па выніках працы за 2001 г. па Брэсцкай вобласці 47 % у агульным аб'ёме платных паслуг культуры складалі даходы ад тэатральна-відовішчных арганізацый, 28,4 – клубных устаноў, 12 – школ мастацтваў і сярэдніх спецыяльных вучэбных устаноў, 10 – паслугі паркаў, 1,6 – бібліятэк і 1 % – даходы ад паслуг музеяў [439, спр. 587, арк. 170].

У 2003 г. доля ўласных сродкаў ў параўнанні з 2002 г. павялічылася: у Дзяржаўным аркестры сімфанічнай і эстраднай музыкі – з 29 да 40%, у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы – з 27 да 35%, у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага – з 10 да 23%, у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача – з 15 да 23%. Пазабюджэтныя паступленні Нацыянальнага мастацкага музея склалі 53% ад бюджэту, у Літаратур-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным музеі Янкі Купалы і Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ўласныя даходы склалі 28 % ад бюджэту [108, с. 28].

Гэта дазволіла накіраваць сродкі на аплату працы супрацоўнікаў. Напрыклад, за кошт уласных сродкаў Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета ў 2003 г. забяспечыў 33 % выдаткаў на аплату працы, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы – 27, Дзяржаўны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі – 18, Мінскі дзяржаўны цырк – 78, Гомельскі дзяржаўны цырк – 57 % [108, с. 28–29].

Частка сродкаў накіроўвалася на пастановачныя расходы, на аплату выдаткаў па гастролях, на аплату камунальных паслуг, паслуг сувязі і транспарту, бягучы рамонт. Музеі выкарыстоўвалі гэтыя сродкі для работ па стварэнні новых экспазіцый, умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы. Напрыклад, мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць – герой» на экспазіцыйныя работы выкарыстаў 25% ад атрыманых даходаў [108, с. 29].

Патрабаванне павелічэння прыбытку ад пазабюджэтнай дзейнасці прымушала шукаць новыя віды платных паслуг. Установы адукацыі арганізоўвалі завочныя падрыхтоўчыя курсы для абітурыентаў, уводзілі на платнай аснове новыя спецыяльнасці, адкрывалі новыя студыі, развівалі нетрадыцыйныя віды паслуг (шэйпінг, гуказапіс), навучалі насельніцтва камп'ютарным тэхналогіям, калектывы навучальных устаноў здзяйснялі канцэртную дзейнасць [439, спр. 587, арк. 26–27].

Вялікае значэнне ў павелічэнні прыбыткаў ад платных паслуг мела прыняцце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 жніўня 2002 г. № 434, згодна з якім было знята рэгуляванне Міністэрствам культуры цэн (тарыфаў) на паслугі музеяў, тэатральна-відовішчных арганізацый, за навучанне ў дзіцячых школах мастацтваў, што дазволіла арганізацыям больш аператыўна прымаць рашэнні аб змяненні ўзроўню цэн (тарыфаў) на паслугі і атрымліваць дадатковыя прыбыткі ад гэтых відаў дзейнасці. За Міністэрствам культуры засталося толькі права рэгуляваць цэны на білеты на 25 % месцаў у глядзельнай зале, якія ўстанаўліваліся на ўзроўні, які дазваляў наведваць тэатральна-відовішчныя мерапрыемствы катэгорыям насельніцтва з невысокім узроўнем даходу (студэнтам, вучнёўскай моладзі, пенсіянерам і інш.) [187, т. 3, арк. 141].

Пазабюджэтныя і ўласныя даходы арганізацый культуры на працягу 2002–2005 гг. складалі ў сярэднім 15% усіх сродкаў, якія накіроўваліся на развіццё культуры. У структуры даходаў устаноў культуры мясцовага падпарадкавання пазабюджэтныя сродкі складалі ў сярэднім 8–12 % [71, арк. 48].

Пачынаючы з 2004 г., Міністэрства культуры даводзіла мэтавы паказчык тэмпу росту платных паслуг. Была зацверджана галіновая праграма развіцця паслуг культуры на 2004–2005 гг. У 2005 г. у кожным сельскім населеным пункце ўстановамі культуры аказвалася не менш за 3 віды платных паслуг, у кожнай вобласці было ўведзена не менш за 10 новых відаў паслуг [71, арк. 49]. У структуры агульных паступленняў на фінансаванне арганізацый сістэмы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрства культуры пазабюджэтныя і ўласныя даходы ў 2010 г. склалі 16 % [104, с. 110].

У 2010 г. Міністэрства культуры прапаноўвала Ураду Беларусі з 2011 г. адмяніць давядзенне паказчыка па платных паслугах культуры насельніцтву. На думку спецыялістаў, далейшае павышэнне тэмпу росту гэтага паказчыка магло прывесці да камерцыялізацыі культуры і мастацтва, «парушэння асноўных задач, пастаўленых перад галіной культуры: здзяйсненне дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры, якая забяспечвае рэалізацыю правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь на свабоду мастацкай творчасці, удзел у культурным жыцці і карыстанне дасягненнямі культуры, доступ да культурных каштоўнасцей, развіццё супрацоўніцтва з замежнымі краінамі ў сферы культуры» [81, т. 5, арк. 36].

Міністэрствам культуры былі ажыццёўлены спробы пры падрыхтоўцы змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб музеях і Музейным фондзе» замацаваць палажэнне аб забароне ўстанаўліваць для дзяржаўных музеяў нарматывы ажыццяўлення дзейнасці, якая прыносіць даход, а таксама нарматывы атрымання даходаў з дадатковых крыніц фінансавання. Гэта абгрунтоўвалася тым, што «давядзенне да музеяў паказчыкаў па платных паслугах насельніцтву не спрыяе ажыццяўленню музейнай дзейнасці, больш таго, выключна негатыўна ўплывае на яе. Замест музейнай справы музейныя работнікі займаюцца пошукам новых шляхоў продажу паслуг музея насельніцтву» [81, т. 7, арк. 64, 68]. Аднак у канчатковы варыянт Закона Рэспублікі Беларусь ад 3 ліпеня 2011 г. № 281-З «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь “Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь”» гэта палажэнне не ўвайшло.

Пераход краіны да рынкавых адносін прывёў да значнага пагаршэння ***ўзроўню жыцця*** работнікаў культуры і мастацтва. У сакавіку 1992 г. сярэднемесячная зарплата ў галіне была не толькі ў 1,6 разы ніжэй, чым у народнай гаспадарцы, але і самай нізкай сярод галін сацыяльнай сферы. Рэзкае зніжэнне ўзроўню заробку ў галіне адбылося па дзвюх асноўных прычынах. Па-першае, ва ўмовах росту коштаў значна скараціліся магчымасці прыцягнення дадатковых крыніц фінансавання. Рост цэн на квіткі, напрыклад, у тэатральна-відовішчных прадпрыемствах прыводзіў да зніжэння запаўняльнасці глядзельных залаў. Пры павелічэнні максімальнага кошту квіткоў з 3–3,5 рублёў да 9–10 рублёў у Гомельскім цырку ўзровень запаўнення глядзельнай залы панізіўся з 97 да 71,9 %, у Мінскім цырку – са 100 да 88,2 %. Такое ж становішча склалася ў тэатрах і канцэртных залах. Па-другое, аднясенне работнікаў мастацтва і культуры ў асноўным да I і II груп па аплаце працы штучна знізіла значнасць кваліфікацыйнага ўзроўню спецыялістаў з вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія на той час складалі 63,4 % працуючых у галіне. У той час як у прамысловасці доля гэтай катэгорыі работнікаў складала 23,7 % [438, спр. 2077, арк. 161–162].

Негатыўным момантам у арганізацыі заработнай платы галіны ў той час з’яўляўся нізкі ўзровень даплат і прэмій у сярэднім заробку. У той час як па-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мер мінімальнай заработнай платы пастаянна пераглядаўся, памеры даплат, устаноўленыя работнікам за наяўнасць ганаровага звання, а таксама памеры сродкаў на прэміраванне, не змяняліся. Напрыклад, калі пры мінімуме заработнай платы, роўным 400 рублёў у месяц, удзельная вага надбаўкі за званне «Народны артыст СССР» у службовым акладзе вядучага майстра сцэны складала 18,2 %, то пры мінімуме 1050 рублёў – толькі 7 %. Акрамя гэтага, ніяк не ўлічваўся ўзровень прафесійнага майстэрства работнікаў прадпрыемстваў культуры і мастацтва, якія мелі ганаровыя званні «Заслужаны дзеяч мастацтваў», «Заслужаны артыст», «Заслужаны работнік культуры» і іншыя, атрыманыя ў былых рэспубліках СССР. Гэта не толькі зніжала ўзровень заработнай платы, але і ўносіла у яе арганізацыю элементы дыскрымінацыйнага парадку, звязаныя з нацыянальнай прыналежнасцю [438, спр. 2077, арк. 162–163]. Усяго ганаровыя званні ў галіне культуры на пачатак 1993 г. мелі 450 чалавек [439, спр. 7, арк. 367].

Зыходзячы з гэтага, Міністэрства культуры ў 1993 г. выступіла з прапановай вылічваць надбаўкі не ў цвёрдай суме, а ў працэнтах да службовага акладу; павялічыць памеры сродкаў на прэміраванне работнікаў галіны з 3 % фонду заработнай платы да ўзроўню, які склаўся ў прамысловасці; павялічыць памеры тарыфных каэфіцыентаў работнікаў прафесійнага мастацтва і культуры, зыходзячы з крытэрыю ацэнкі ўзроўню кваліфікацыі работнікаў прамысловасці [438, спр. 2077, арк. 162–163].

У пачатку 1994 г. даплаты за званні «Народны артыст Рэспублікі Беларусь» і «Народны артыст СССР» складалі адпаведна 150 і 250 рублёў (пастанова Дзяржкампрацы БССР № 3 ад 30.05.1991 г.), а сярэдняя заработная плата гэтых майстроў у сакавіку 1994 г. складала 340 тыс. рублёў. На той час у краіне працавалі 73 чалавекі, якія мелі званні «народны» [438, спр. 6, арк. 31].

З 1 чэрвеня 1994 г. творчым работнікам літаратуры і мастацтва, культуры і архітэктуры, якім былі прысвоены ганаровыя званні «Народны пісьменнік Рэспублікі Беларусь», «Народны артыст Рэспублікі Беларусь», «Народны мастак Рэспублікі Беларусь», «Народны архітэктар Рэспублікі Беларусь», за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту па месцы працы пачалі выплочваць штомесячныя даплаты ў памеры 5 мінімальных заработных плат незалежна ад займаемай пасады [500].

Аднак ужо праз год – у сакавіку 1995 г. – Урад змяніў парадак выплат. Замест штомесячных даплат былі ўведзены разавыя выплаты: 20 мінімальных заработных плат – работнікам, якія мелі ганаровыя званні «народны» і 10 мінімальных заработных плат – работнікам, якія мелі іншыя ганаровыя званні заслужаных работнікаў Рэспублікі Беларусь і СССР [593].

Восенню 1996 г. у мэтах выканання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 жніўня 1996 г. № 318 «Аб штомесячнай грашовай выплаце грамадзянам, якія маюць ганаровыя званні», Міністэрства працы прыняло пастанову [584], якая прадугледжвала штомесячную выплату ў памеры трох мінімальных заработных плат (з чэрвеня 2003 г. – трох базавых велічынь) згаданай катэгорыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадзян. Яна павінна была выплочвацца і пасля выхаду чалавека на пенсію. Да чэрвеня 2003 г. сума згаданай выплаты не абкладалася падаходным падаткам [482].

У пачатку 1996 г. была ўстаноўлена даплата за званне «акадэмічны» ў тэатрах і канцэртных арганізацыях краіны ў памеры 50 % ад мінімальнай заработнай платы кіруючым работнікам, а мастацкаму персаналу – 40 % ад мінімальнай заработнай платы [459]. З 1998 г. памер даплат змяніўся і распаўсюдзіўся таксама на калектывы, якія мелі званне «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь». [15] На той час даплаты складалі адпаведна 26 і 21 % ад тарыфнай стаўкі першага разраду [594].

Гэтыя даплаты не датычылі асобных катэгорый работнікаў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Першым яшчэ ў 1993 г. быў устаноўлены павышаючы каэфіцыент да акладаў у памеры ад 1,3 да 1,8 [569]. У 2000 г. ён быў зменшаны да 1,3 [501], а з 2001 г. вызначаны ў памеры 1,7 [595]. Работнікам Вялікага тэатра оперы і балета, непасрэдна прымаючым удзел у творчым працэсе, у 1996 г. былі вызначаны павышаючыя каэфіцыенты ад 1,3 да 1,8 [591], якія таксама былі перагледжаны ў 2000 г. і вызначаны ў памеры 30 % [501, дадатак 8]. З 2008 г. тарыфныя стаўкі (аклады) работнікам дадзенай установы былі павышаны ў сярэднім на 75 % [538].

На 40 і 30 % ад мінімальнай заработнай платы ў 1996 г. былі павышаны аклады адпаведна кіруючым работнікам і спецыялістам Нацыянальнага музея Рэспублікі Беларусь, нацыянальнага гісторыка-культурнага запаведніка «Нясвіж», Нацыянальнай бібліятэкі [459]. З 1998 г. – на 21 % і 16 % ад тарыфнай стаўкі першага разраду [594, дадатак 8].

У чэрвені 1997 г. Міністэрству культуры было дазволена ўстанаўліваць вядучым майстрам мастацтваў персанальныя аклады з надбаўкамі да 100 % у межах сродкаў аплаты працы [596].

У 1998 г. адбылося павышэнне ў сярэднім у 1,3 разы акладаў артыстычнага і мастацкага персаналу Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь Беларускай дзяржаўнай філармоніі [587]. У 1999 г. гэта было распаўсюджана на аклады спецыялістаў Нацыянальнага мастацкага музея [592], вядучых творчых работнікаў заслужаных калектываў Рэспублікі Беларусь Дзяржаўнага ансамбля танца Рэспублікі Беларусь і Беларускага харэаграфічнага ансамбля «Харошкі» [589], Дзяржаўнага акадэмічнага народнага аркестра Рэспублікі Беларусь імя І. Жыновіча Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча і Дзяржаўнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь [588]. У 2001 г. павышэнне склала 1,7 разы [595], а ў 2006 г. – 30 % [590].

У 2000 г. было ўдасканалена пытанне ўмоў аплаты працы работнікаў творчых арганізацый, якія мелі статус «нацыянальны», «акадэмічны» і званне «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь». Тарыфныя разрады дырэктарам, мастацкім кіраўнікам, галоўным спецыялістам і вядучым майстрам сцэны ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальных і акадэмічных тэатрах былі павышаны на два разрады, а мастацкага і артыстычнага персаналу гэтых арганізацый, а таксама кіраўнікоў і мастацкага персаналу заслужаных калектываў Рэспублікі Беларусь – на адзін разрад [501]. З гэтага ж года стала магчымым устанаўленне персанальных надбавак вядучым творчым работнікам у памеры да 30 тарыфных ставак першага разраду тэрмінам да аднаго года. Кіраўнікам тэатральна-відовішчных арганізацый было дадзена права ўстанаўліваць памер заработнай платы па дамоўленасці бакоў пры заключэнні кантрактаў з вядомымі творчымі работнікамі. У 2001 г. спачатку былі адменены, а потым адноўлены даплаты за катэгорыю артыстычнаму персаналу ў памеры ад 15 да 30 % ад тарыфнага акладу [439, спр. 414, арк. 15].

У 2003 г. адбылося павышэнне акладаў кіраўнікам, артыстычнаму і мастацкаму персаналу тэатральна-відовішчных і канцэртных арганізацый, якія мелі званне «нацыянальны акадэмічны» – на 60 % ад тарыфнай стаўкі першага разраду; «нацыянальны» – на 50 %, «акадэмічны» і «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь» – на 40 %, Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Нацыянальнага мастацкага музея, Нацыянальнай бібліятэкі, нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж», Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага запаведніка – на 50 % ад тарыфнай стаўкі першага разраду [501, дадатак 8].

Нягледзячы на прадпрымаемыя захады, узровень заработнай платы работнікаў культуры на працягу дзесяцігоддзя заставаўся адным з самых нізкіх у краіне. У 1997 г. ён складаў 70 % ад заработнай платы па народнай гаспадарцы, у 1998 г. – 67, у 1999 г. – 62, у 2000 г. – 66 % [439, спр. 368, арк. 169].

Міністэрства культуры неаднаразова штогод накіроўвала прапановы па паляпшэнні парадку і ўмоў працы работнікаў галіны як агульнага парадку па павышэнні тарыфных разрадаў і павелічэнні памераў сродкаў, якія выдзяляліся на матэрыяльнае заахвочванне, так і прапановы, якія тычыліся работнікаў канкрэтных тыпаў устаноў і асобных канкрэтных пасад. У 1999 г. у адпаведнасці з прапановамі Міністэрства на 1–2 разрады былі павялічаны тарыфныя разрады кіраўнікоў усіх устаноў культуры і мастацтва, навуковых супрацоўнікаў музеяў і шэрага спецыялістаў культурна-асветных устаноў. На 10 % быў павялічаны памер сродкаў, якія выдзяляліся з бюджэту на ўстанаўленне надбавак і на 20 % – на прэміраванне [439, спр. 368, арк. 169].

У мэтах сацыяльнай падтрымкі работнікаў культуры на працягу 1996–1999 гг. быў прыняты шэраг рашэнняў Урада і Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якія дазволілі палепшыць матэрыяльнае забеспячэнне творчых работнікаў. У 1999 г. Міністэрствам быў прапанаваны план паэтапнага павышэння заработнай платы работнікаў прафесійных творчых калектываў шляхам устанаўлення павышаючых каэфіцыентаў. У 2000 г. – прапанова аб устанаўленні дыферэнцыраваных павышаючых каэфіцыентаў да службовых акладаў работнікаў бібліятэк і музеяў [439, спр. 368, арк. 169].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзеля матэрыяльнай падтрымкі работнікаў галіны толькі на працягу 2001–2003 гг. былі распрацаваны і прыняты 18 указаў і распараджэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 11 пастаноў і распараджэнняў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, шэраг нарматыўных дакументаў міністэрстваў і ведамстваў. З 1 мая 2005 г. на 20 % была павышана заработная плата супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі. З 1 лістапада 2005 г. на 1–2 пункта былі павышаны тарыфныя разрады мастацка-вытворчага персаналу прадпрыемстваў кінавідэавытворчасці. Сярэдні заробак работнікаў культуры і мастацтва толькі ў 2005 г. склаў 81,1 % ад сярэдняга заробку па рэспубліцы. У асобныя гады ён быў значна ніжэй. Напрыклад, у 2000 г. – 65,9 %. У 2008–2010 гг. ён вагаўся на ўзроўні 72 (72,2 % у 2009 г.) – 74 % (73,3 % у 2008 г. і 73,9 % у 2010 г.) ( табл. 2) [699, с. 153].

*Табліца 2.* **Дынаміка сярэднемесячнай налічанай заработнай платы ў Рэспубліцы Беларусь па асобных відах эканамічнай дзейнасці, 1995–2010 гг., тыс. бел. рублёў [442, с. 127–128; 454; 695, с. 152–153; 699, с. 152–153]**

| Від дзейнасці | Год | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1995 | 1997 | 1999 | 2001 | 2003 | 2005 | 2007 | 2009 | 2010 |
| Сярэдні заробак | 755,1 | 2270,1 | 19580,8 | 123,0 | 250,7 | 463,7 | 694,0 | 981,6 | 1217,3 |
| Сельская гаспадарка | 468,3 | 1328,9 | 11281,7 | 78,2 | 136,9 | 286,3 | 429,6 | 674,7 | 840,1 |
| Прамысловасць | 861,9 | 2689,1 | 23864,6 | 143,1 | 276,7 | 490,7 | 745,6 | 1049,1 | 1315,0 |
| Адукацыя | 594,6 | 1873,9 | 14577,4 | 101,5 | 215,2 | 399,4 | 548,1 | 702,4 | 893,3 |
| Культура | 517,7 | 1596,0 | 12775,0 | 89,1 | 197,4 | 376,3 | 540,6 | 709,0 | 1086,1 |
| Мастацтва | 516,6 | 1544,8 | 12634,3 | 95,5 | 204,2 | | | | |

У краіне назіралася дыспрапорцыя ва ўзроўні заробку паміж сталіцай і рэгіёнамі. Так, у 2010 г. заробак у галіне культуры сталіцы быў амаль на ўзроўні сярэдняга заробку па краіне, а ў Гродзенскай вобласці работнікі культуры атрымлівалі на 36 % менш за мінчан (табл. 3).

*Табліца 3.* **Узровень намінальнай налічанай сярэднемесячнай заработнай платы работнікаў галіны культуры, 2000–2010 гг., тыс. бел. рублёў [699, с. 152–153; 776, с. 302–304]**

| Паказчык | | Год | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 2000 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
| Сярэдні заробак па краіне | | 76,8 | 463,7 | 582,2 | 694,0 | 868,2 | 981,6 | 1217,3 |
| Культура і мастацтва па краіне | | 38,8 | 376,3 | 467,8 | 540,6 | 640,9 | 709,0 | 900,1 |
| Да сярэдняга заробку па краіне, % | | 65,9 | 81,1 | 80,4 | 77,9 | 73,8 | 72,2 | 73,9 |
| г. Мінск | Культура і мастацтва | 49,6 | 481,4 | 616,9 | 707,9 | 865,2 | 985,4 | 1206,3 |
| | Да сярэднегарадскога ўзроўню, % | 64,6 | 85,2 | 86,9 | 81,9 | 78,4 | 78,0 | 78,5 |
| Гродзенская вобласць | Культура і мастацтва | 34,9 | 342,8 | 414,6 | 485,1 | 557,8 | 598,7 | 773,4 |
| | Да сярэднеабласнога ўзроўню, % | 66,2 | 80,5 | 77,4 | 76,4 | 70,3 | 66,9 | 70,0 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак і сярод сталічных устаноў культуры былі тыя, чые работнікі атрымлівалі заробак, ніжэйшы за сярэдні па галіне. Сярэдні заробак у Нацыянальным мастацкім музеі за 2009 г. складаў 619,2 тыс. рублёў пры сярэднім заробку па галіне 737,4 тыс. рублёў і сярэднім заробку па музеях краіны, роўным 622,2 тыс. рублёў. З-за адсутнасці перспектыў павышэння заработнай платы маладыя спецыялісты ў музеі доўга не затрымліваліся. За першы квартал 2010 г. цякучасць кадраў склала 45 чалавек. Гэта не спрыяла арганічнай змене пакаленняў для перадачы вопыту, бо тэрмін непасрэднага навучання маладога музейнага супрацоўніка ў прафесійным плане складаў 8–10 гадоў. У выніку ў музеі заставаліся працаваць людзі пенсійнага і прадпенсійнага ўзросту, а моладзь пераходзіла на больш высокааплатную працу. Пенсіянеры сярод кадраў кіраўнікоў складалі 11 чалавек, сярод спецыялістаў – 12 чалавек [81, т. 5, арк. 12].

Аплата ў сферы музейнай справы ў Беларусі на той час была несуразмернай з краінамі-суседзямі. У Расійскай Федэрацыі спецыялісты сярэдняга звяна са стажам (загадчык сектарам) атрымлівалі (у пераводзе па курсе беларускага рубля) 1740 тыс. бел. рублёў, у Украіне заробак загадчыка навуковага аддзела складаў 2400 тыс. бел. рублёў [81, т. 5, арк. 13].

У 1991–2007 гг. у краіне дзейнічалі нормы закона «Аб прыярытэтным сацыяльна-культурным і эканамічным развіцці сяла і аграпрамысловага комплексу» [529], якія прадстаўлялі пэўныя льготы работнікам культуры. Яны, як і ўсе сельскія жыхары, карысталіся электраэнергіяй у камунальных патрэбах па льготных тарыфах. Кіраўнікам устаноў культуры, якія знаходзіліся ў сельскай мясцовасці, спецыялістам, якія працавалі ў гэтых установах, было ўстаноўлена павышэнне службовых акладаў (тарыфных ставак) на 20 %. Калі яны пражывалі ў сельскіх населеных пунктах з недахопам працоўнай сілы, а таксама выязджалі ў гэтыя месцы для працы ў сацыяльнай сферы па запрашэнням гаспадарак і сельскіх Саветаў дэпутатаў, то такім работнікам прадстаўляліся па прыбыцці асобныя жылыя дамы (кватэры) з надворнымі пабудовамі, якія былі пабудаваны ці набыты за кошт сродкаў бюджэту ці гаспадарак з наступнай перадачай ва ўласнасць пры ўмове пражывання ў іх і работы ў сельскай гаспадарцы ці сацыяльнай сферы сяла ва ўзгаданай мясцовасці не менш за 10 гадоў.

У 2007 г. павышэнне на 20 % тарыфных ставак (акладаў) кіраўнікам і спецыялістам арганізацый (іх структурных падраздзяленняў) культуры, якія знаходзіліся ў сельскай мясцовасці, было вызначана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 254 [523].

Адным са шляхоў падтрымкі творцаў стаў механізм прадастаўлення спецыяльных ***прэмій і грантаў***.

Пастановай Урада № 412 ад 1 чэрвеня 1994 г. [498] было вырашана выдзеліць 25 дзяржаўных штомесячных стыпендый у памеры 6 мінімальных заработных плат для вядучых дзеячаў культуры і мастацтва, а таксама 25 стыпендый у памеры 4 мінімальных заработных плат для таленавітай моладзі. Стыпендыі прызначаліся тэрмінам на адзін год.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пачатку 1996 г. быў створаны *Фонд падтрымкі таленавітай моладзі*. З мэтай выяўлення і падтрымкі юных талентаў, развіцця здольнасцей і садзейнічання прафесійнаму росту іх майстэрства фонд аказваў дапамогу ў арганізацыі навучання таленавітай моладзі, выдзяляў сродкі на аплату стажыровак навучэнцаў, студэнтаў, маладых педагогаў, а таксама на правядзенне майстар-класаў вядучымі дзеячамі мастацтваў не толькі нашай рэспублікі, але і іншых краін, забяспечваў ўдзел творчай моладзі ў міжнародных конкурсах, выстаўках і іншых акцыях у галіне культуры і мастацтва, якія былі накіраваны на развіццё і ўзаемаўзбагачэнне нацыянальных культур.

За 15 гадоў сваёй дзейнасці спецыяльны Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі стаў адной з самых уплывовых і аўтарытэтных арганізацый краіны. З 1996 па 2010 г. на фінансаванне выдаткаў, звязаных з дзейнасцю фонду, было выдзелена больш за 5 млрд рублёў. Фінансавую падтрымку фонду атрымалі звыш 1800 чалавек. На ўдзел творчай моладзі ў міжнародных конкурсах, выстаўках і другіх акцыях у галіне культуры і мастацтва было выдзелена 269 грантаў [744].

У мэтах паляпшэння ўмоў для развіцця нацыянальнай культуры Беларусі, сацыяльнай падтрымкі творчай інтэлігенцыі, стымулявання яе працы, падтрымкі майстроў прафесійнага і народнага мастацтва па стварэнні высокамастацкіх, сацыяльна-значных твораў мастацтва і літаратуры, захаванні гістарычнай спадчыны і культурных традыцый беларускага народа Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі ў 1998 г. быў створаны *Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва*.

Савет фонду на падставе прапаноў арганізацый, устаноў, творчых саюзаў і іншых грамадскіх аб’днанняў у межах пэўных лімітаў прымаў рашэнні аб выдзяленні сродкаў на:

выплату ганарараў і грантаў на стварэнне твораў культуры і мастацтва;

набыццё інструментаў і матэрыяльных сродкаў для заняткаў па ўдасканаленні майстэрства і ажыццяўленні творчай дзейнасці;

арганізацыю стажыровак дзеячаў культуры і мастацтва, творчых праектаў у рэспубліцы і за яе межамі;

забеспячэнне ўдзелу творцаў у конкурсах, выстаўках, фестывалях, сімпозіумах і іншых акцыях у галіне культуры і мастацтва, накіраваных на зберажэнне і развіццё духоўнага багацця нацыі, гістарычнай спадчыны народа;

арганізацыю фестываляў, канцэртаў, выставак, выданне, стварэнне сцэнічных твораў, твораў выяўленчага мастацтва, правядзенне іншых мерапрыемстваў па выяўленні і заахвочванні талентаў, прапагандзе іх творчасці;

аказанне дапамогі ў арганізацыі павышэння кваліфікацыі, удасканалення прафесійнага майстэрства творчых работнікаў;

аказанне аднаразовай матэрыяльнай дапамогі дзеячам культуры і мастацтва [560].

Сродкі фонду выкарыстоўваліся на аплату пастановак спектакляў і канцэртных праграм, набыццё сцэнічных касцюмаў, музычных інструментаў і аб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сталявання, выданне кніг, набыццё твораў выяўленчага мастацтва для музеяў краіны, арганізацыю стажыровак дзеячаў мастацтва і інш.

У мэтах стымулявання і сацыяльнай падтрымкі творчай працы дзеячаў культуры і мастацтва з 1998 г. былі ўстаноўлены спецыяльныя штогадовыя прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у памеры 100 мінімальных заробкаў кожная за высокія творчыя дасягненні, а таксама гранты на стварэнне твораў культуры і мастацтва [549]. Яны выдзяляліся па 11 намінацыях за дасягненні ў галіне культуры і мастацтва, тры спецыяльныя прэміі «За уклад у выхаванне творчай моладзі», тры спецыяльныя прэміі «За уклад у развіццё міжнародных культурных сувязей Рэспублікі Беларусь», шэсць спецыяльных прэмій работнікам устаноў культуры і мастацтва за дасягненні ў эстэтычным і маральным выхаванні беларускага народа і прапаганду духоўных каштоўнасцей у наступных галінах: музейная справа, бібліятэчная справа, мастацкая самадзейнасць. У далейшым памер прэміі мяняўся таксама, як і агульная іх колькасць. З 2009 г. яны былі заменены на 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь памерам у 350 базавых велічынь [526]. У 2005 г. гранты перасталі выдзяляцца [480].

У 2001 г. было прадугледжана штогод устанаўліваць 100 дзеячам культуры і мастацтва персанальныя надбаўкі ў памеры 30 тарыфных ставак першага разраду тэрмінам на адзін год [490].

4 студзеня 2002 г. было падпісана Распараджэнне Прэзідэнта «Аб назначэнні стыпендый дзеячам культуры, адукацыі, культуры, аховы здароўя і таленавітым маладым вучоным» [106, с. 66–68].

Эканамічны крызіс пачатку 1990-х гг. падарваў выбудаваны механізм выплаты ***аўтарскага ўзнагароджання***. У 1991 г. дзейнічалі стаўкі аўтарскага ўзнагароджання, устаноўленыя ў студзені 1989 г. [553]. У маі 1992 г. стаўкі аўтарскага ўзнагароджання за літаратурна-драматычныя, музычныя і музычна-драматычныя творы, якія ствараліся па заказах радыё і тэлебачання, а таксама стаўкі аўтарскага ўзнагароджання за матэрыялы, якія перадаваліся па тэлебачанні і радыё, былі павялічаны ў 5 разоў адпаведна ўзроўню, вызначанага ў 1989 г. [575]. У снежні 1992 г. выйшла новая пастанова Урада, якая адмяніла папярэднюю [576]. Стаўкі аўтарскага ўзнагароджання за мастацка-графічныя і фотаграфічныя работы для друку і стаўкі аўтарскага ўзнагароджання за літаратурна-драматычныя, музычныя і музычна-драматычныя творы, якія ствараліся па заказах радыё і тэлебачання, а таксама стаўкі ганарару за тэлепрадукцыю былі павялічаны ў 10 разоў адпаведна стаўкам, вызначаным у 1989 г. Нарматыўны прававы акт прадпісваў у далейшым павялічваць стаўкі ў адпаведнасці з ростам мінімальнай заработнай платы. Адначасова Міністэрству інфармацыі і Міністэрству культуры даручалася перагледзець дзенічаючыя на той час стаўкі аўтарскага ўзнагароджання за выданне твораў навукі, літаратуры і мастацтва і за публічнае выкананне твораў літаратуры і мастацтва, а таксама іншыя работы. Адпаведныя прапановы пасля ўзгаднення з Міністэрствам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фінансаў і Дзяржаўным камітэтам па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва павінны былі быць унесены ва Урад.

У красавіку 1993 г. Міністэрства культуры звярталася ва Урад краіны з прапановай перагледзець згаданыя стаўкі аўтарскага ўзнагароджання. Калі раней за напісанне п'есы для драматычнага тэатра, на падрыхтоўку якой патрабавалася да 10 месяцаў, аўтар атрымоўваў 10–12 сярэдніх месячных акладаў, то на момант звароту за такую работу ён мог атрымаць толькі два такіх аклады. Вясной 1993 г. памеры аплаты аўтарам у галіне выяўленчага мастацтва і музыкі адносна ставак аўтарскага ўзнагароджання і жыццёвай рэальнасці 1989 г. паменшыліся ў 15–20 разоў. Пры існаваўшых на той час тэмпах інфляцыі практычна немагчыма было па цвёрдых стаўках заключаць дагаворы на творы, стварэнне якіх патрабавала тэрміну ад 1 да 3 гадоў. У выніку ўсяго гэтага частка творчай інтэлігенцыі наогул адышла ад аўтарскай дзейнасці, што стварала крызісную сітуацыю ў галіне развіцця нацыянальнага мастацтва. Улічваючы гэта, Міністэрства прасіла дазволу да канца 1993 г. прымяняць дамоўныя цэны пры набыцці ў аўтараў твораў драматургіі і музычнага мастацтва для іх публічнага выканання [439, спр. 8, арк. 133–134].

У снежні 1993 г. была прынята асобная ўрадавая Пастанова № 868 «Аб стаўках і парадку выплаты аўтарскага і іншых відаў узнагароджання за выданне твораў навукі, літаратуры і мастацтва, мастацка-графічныя і фатаграфічныя работы для друку і матэрыялы, якія перадаюцца па тэлебачанню і радыё» [556]. У частцы ставак аўтарскага ўзнагароджання за выданне арыгінальных літаратурна-мастацкіх твораў, твораў палітычнай, навуковай, вытворча-тэхнічнай і іншай літаратуры, музычных і музычна-літаратурных твораў, зборнікаў твораў, за пераклады твораў, а таксама парадак выплаты ўзнагароджання за выданне твораў навукі, літаратуры і мастацтва згаданы нарматыўны прававы акт быў заменены Пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 697 ад 1 лістапада 1996 г. [504]. Аднак у яе не былі ўключаны стаўкі аўтарскага ганарару за мастацка-графічныя і фатаграфічныя работы для друку. Такім чынам, склалася становішча, калі аўтары кніг працавалі па новых стаўках, а мастакі кнігі працавалі над тымі ж кнігамі па састарэлых расцэнках 1993 г. У 1999 г. гэта сітуацыя была выпраўлена [478].

Стаўкі і парадак выплаты аўтарскага і іншых відаў узнагароджання ў кінематаграфіі былі перагледжаны ў 2001 г. [505], а ў 2008 г. гэта адбылося адносна ставак за стварэнне твораў і матэрыялаў у сферы тэлебачання і радыёвяшчання [557]. Неабходна заўважыць, што нарматыўна вызначаўся максімальны памер ставак. Адпаведна пункта 5 Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 868 ад 27 снежня 1993 г., ён распаўсюджваўся толькі на выпадкі выкарыстання твораў з прыцягненнем бюджэтных сродкаў. А ў пункце 3 Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 201 ад 15 лютага 2008 г. вызначалася, што «выплаты аўтарскага і іншых відаў узнагароджання за творы і матэрыялы ў сферы тэлебачання і радыё, якія здзяйсняюцца за кошт сродкаў рэспублікан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скага бюджэту, здзяйсняюцца ў межах планавых бюджэтных асігнаванняў, прадугледжаных на выплату заработнай платы».

У 2010 г. былі ўнесены змены ў парадак выплаты аўтарскага і іншых відаў узнагароджання ў кінематаграфіі [465]. Цяпер пры аплаце за сцэнарыі бакі атрымалі права самастойна вызначаць парадак разліку (у тым ліку авансавыя плацяжы). Было ўрэгулявана пытанне выплат узнагароджання гукарэжысёру.

Паралельна з гэтым працэсам ішло нарматыўна-прававое афармленне пытання ставак аўтарскага ўзнагароджання за стварэнне твораў у галіне літаратуры і мастацтва для публічнага выканання ці за права першага публічнага выканання неапублікаваных твораў. 28 красавіка 1994 г. была прынята спецыяльная ўрадавая пастанова па гэтым пытанні (№ 286) [551]. На жаль, яна не зняла пытання ўплыву інфляцыі на рэальны памер ставак аўтарскага ўзнагароджання. У час узгаднення праекта дадзенага дакумента Міністэрства фінансаў узяло за аснову стаўкі аўтарскага ўзнагароджання, зацверджаныя пастановай Савета Міністраў БССР № 37 ад 11 студзеня 1989 г. Пры гэтым грашовы памер кожнай пазіцыі ставак 1989 г. быў падзелены на памер мінімальнай заработнай платы, які існаваў у той час (70 рублёў), а дакладны вынік гэтай арыфметычнай аперацыі, без уліку галапіруючай інфляцыі, вызначыў узровень ставак, якія былі прапанаваны да выкарыстання, пачынаючы з красавіка 1994 г. [439, спр. 91, арк. 162–163].

Праз два гады ў адпаведнасці з новай пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 342 ад 23.05.1996 г. «Аб стаўках аўтарскага ўзнагароджання за выкананне заказаў на стварэнне твораў літаратуры і мастацтва для публічнага выканання альбо за права першага публічнага выканання неапублікаваных твораў» стаўкі аўтарскага ўзнагароджання былі павялічаны ў 2 разы [439, спр. 145, арк. 140]. У сувязі з сацыяльна-эканамічнымі зменамі на працягу некалькіх гадоў Міністэрства культуры ініцыявала прыняцце новай пастановы аб мінімальных стаўках аўтарскага ўзнагароджання і заўсёды натыкалася на адмову Міністэрства фінансаў [439, спр. 373, арк. 111]. Толькі 29.11.2000 г. была прынята Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1818 «Аб мінімальных стаўках аўтарскага ўзнагароджання за выкананне заказаў на стварэнне твораў літаратуры і мастацтва для публічнага выканання або за права першага публічнага выканання неабнародаваных твораў» [503].

12 снежня 1994 г. была прынята Пастанова Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 243 «Аб стаўках аўтарскага ўзнагароджання за стварэнне твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва». Аднак практыка паказала, што прымяняць зацверджаныя стаўкі было фактычна немагчыма, бо ў большасці выпадкаў сабекошт матэрыялаў, арэнды памяшканняў, электраэнергіі і іншых кампанентаў, якія ўжываліся пры стварэнні твораў мастацтва, значна перавышаў узровень кампенсацыі ставак. Дзякуючы намаганням Беларускага саюза мастакоў, Міністэрства культуры Урад пайшоў насустрач творчай арганізацыі і двойчы прыпыняў дзеянне згаданых ставак. Адначасова з прыпыненнем дзейнасці згаданай пастановы ў лютым 1996 г. Урад даручыў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрству культуры пры ўзгадненні з Міністэрствам фінансаў унесці прапановы аб удасканаленні выплаты аўтарскага ўзнагароджання мастакам за стварэнне твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У вызначаны тэрмін згаданыя прапановы былі ўнесены. Аднак Кабінет Міністраў вярнуў іх Міністэрству культуры з мэтай дапрацоўкі ў адпаведнасці з пунктам 3 артыкула 26 Закона «Аб аўтарскім праве і сумежных правах». Сутнасць дапрацоўкі зводзілася да абавязковага вызначэння мінімальных ставак аўтарскага ўзнагароджання за стварэнне твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыладнога мастацтва. У далейшым Міністэрства культуры не змагло ўзгадніць праект з зацікаўленымі. Так, Міністэрства юстыцыі лічыла немэтазгодным пакідаць у табліцы ставак максімальныя паказчыкі. Разам з тым Беларускі саюз мастакоў, Міністэрства культуры, улічваючы асаблівасці ўваходжання ў рынак, прапаноўвалі station разгледзець «вілку» ставак, у якой пазначаны рэгулюемы калідор дзейнасці як заказчыка твора, так і яго выканаўцы пры афармленні дагавора і вызначэнні сумы аўтарскага ўзнагароджання. Наяўнасць згаданай «вілкі», на думку Міністэрства культуры, павінна было надаць упэўненасць бакам карыстацца не толькі ў асноўным мінімальнымі стаўкамі, але і пры фінансавых магчымасцях і якасцях твораў павышаць іх да адпаведнага ўзроўню ў рамках абмежавання. Прымаючы да ўвагі той факт, што ў краіне толькі Міністэрству культуры выдзялялася бюджэтнае фінансаванне на набыццё твораў выяўленчага мастацтва для музейнай сеткі, аналагічнымі стаўкамі карысталася Дзяржаўная экспертная камісія Міністэрства культуры па творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва [439, спр. 103, арк. 133–134].

Разам з тым ва ўмовах рынку пошукавы працэс мастакоў працягваўся і набыў пэўны вопыт у ацэнцы твораў. Пры абмеркаванні праблем аплаты аўтарскага ўзнагароджання дэлегаты XV з’езда мастакоў Рэспублікі Беларусь актыўна выказаліся за адмену ставак і прадстаўленне рыначнага права дамоўных цэн пры набыцці твораў. У гэтым мастакоў падтрымала Міністэрства культуры, што дазволіла згаданаму творчаму саюзу звярнуцца ў маі 1996 г. ва Урад з прапановамі па аплаце творчай працы мастакоў. Зыходзячы з таго, што сярод розных спецыялізацый у творчых фарміраваннях не ўдалося дасягнуць адзінага ацэначнага прынцыпу канчатковага этапу работы мастакоў як у сферы станковага (жывапіс, графіка, скульптура), манументальнага (мазаіка, роспіс, эграфіто і г. д.), дэкаратыўна-прыкладнога (кераміка, апрацоўка метала, выраб са шкла) мастацтва. Іх кошт шмат у якіх выпадках дыктаваўся дамоўнымі цэнамі, якія існавалі на такія матэрыялы, як шэрсць, фарбы для габелена, смальта, бронза, іншы метал для твораў манументальнага мастацтва, электраэнергія для керамістаў і г. д. Асабліва высокія цэны існавалі на той час на ўтрыманне творчых майстэрань мастакоў. Гэтыя акалічнасці вымушалі прасіць Урад надаць права бюджэтным установам і мастакам краіны рыначным метадам вызначаць кошт набываемых твораў выяўленчага мастацтва. Такой практыкі ў той час прытрымліваліся ў Расійскай Федэрацыі [439, спр. 94, арк. 110–111].



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У чэрвені 2002 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь у сваім даручэнні выказаўся за адмену абмежаванняў максімальных памераў ставак аўтарскага ўзнагароджання за стварэнне твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Пры гэтым патрабавалася пры рашэнні пытанняў аб набыцці твораў і вызначэнні памераў аўтарскага ганарару абавязкова ўлічваць адраснасць пакупкі, рэальную запатрабаванасць твораў, шырэй выкарыстоўваць практыку дзяржаўнага заказу на стварэнне буйных сацыяльна і эстэтычна значымых твораў выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога, музычнага мастацтва і драматургіі [439, спр. 731, арк. 56].

Вынікам стала прыняцце Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб мінімальных стаўках аўтарскага ўзнагароджання за стварэнне твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва» ад 25 верасня 2002 г. № 1319 [439, спр. 731, арк. 53].

Свайго вырашэння патрабавала і пытанне вызначэння ставак аўтарскага ўзнагароджання за выкарыстанне твораў літаратуры і мастацтва. Да прыняцця пастановы Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 267 ад 29 мая 1995 г. [554] яно адбывалася ў адпаведнасці з нарматыўнымі прававымі актамі БССР 1970–1980-х гг.[1]. Ужо праз два гады пастанова 1995 г. была заменена новай урадавай пастановай [577]. А ў 2008 г. былі ўрэгуляваны пытанні выплаты ўзнагароджання за ўзнаўленне ў асабістых мэтах аўдыёвізуальных твораў і твораў, якія ўвасоблены ў фанаграмах [511].

Побач з праблемай выплаты і памеру аўтарскага ўзнагароджання доўгі час існавала праблема распрацоўкі механізму іх падаткаабкладання. Законам «Аб падаходным падатку з грамадзян» ад 21 снежня 1991 г. (арт. 15) быў прадугледжаны канкрэтны ***парадак падаткаабкладання сум аўтарскага ўзнагароджання***. Стаўка падатку залежала ад сумы аўтарскага ўзнагароджання за год. У 1996 г. новай рэдакцыяй закона гэта палажэнне было выключана. Сумы аўтарскага ўзнагароджання былі ўключаны ў сукупны даход. Артыкулы, якія рэгулявалі парадак падаткаабкладання, былі выключаны. Засталіся толькі агульныя вызначэнні аб тым, што падатак з даходаў грамадзян, якія атрымоўвалі аўтарскае ўзнагароджанне, вылічваецца з улікам выдаткаў, звязаных з атрыманнем гэтых даходаў (арт. 12 гл. V) [477]. 26 ліпеня 1996 г. была прынята Пастанова Урада № 491, якая замацавала склад расходаў, якія павінны ўлічвацца падатковымі органамі пры падаткаабкладанні сум аўтарскага ўзнагароджання [454, спр. 218, арк. 10]. У 1999 г. з прыняццем новай рэдакцыі закона была прынята новая пастанова Урада [556]. У дадатак да яе быў зацверджаны су-

[1] Пастанова Савета Міністраў БССР ад 28 лютага 1973 г. № 62 «Об авторском вознаграждении за создание произведений декоративно-прикладного искусства и использование их в промышленности»; Пастанова Савета Міністраў БССР ад 4 ліпеня 1983 г. № 212 «О дальнейшем улучшении условий оплаты творчества советских композиторов и упорядочении выплаты авторского вознаграждения за публичное исполнение музыкальных произведений»; Пастанова Савета Міністраў БССР ад 17 студзеня 1989 г. № 37 «О ставках авторского вознаграждения за публичное исполнение произведений литературы и искусства».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

месны загад зацікаўленых міністэрстваў ад 28 ліпеня 1999 г. (Міністэрства культуры – № 262) «Аб зацверджанні палажэння аб складзе, памерах і парадку выключэння расходаў з сумаў аўтарскага ўзнагароджання і іншых даходаў фізічных асобаў» [439, спр. 606, арк. 109].

У рэдакцыі закона 2001 г. [469] прадугледжвалася, што для фізічных асоб, якія атрымалі аўтарскае ўзнагароджанне, абкладаемы падатак змяншаецца на суму дакументальна пацверджаных выдаткаў, звязаных з атрыманнем гэтых даходаў, а пры адсутнасці дакументальна пацверджаных выдаткаў, звязаных з атрыманнем аўтарскіх узнагароджанняў, даход змяншаецца на суму выдаткаў, што вылічваліся па нарматывах, вызначаных Урадам Рэспублікі Беларусь (арт. 16, п. 1, ч. 2).

У 2005 г. у законе «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў» з'явілася вызначэнне «прафесійныя падатковыя вылічэнні». Плацельшчыкі падаходнага падатку, якія атрымоўвалі аўтарскае ўзнагароджанне ці ўзнагароджанне за стварэнне, выкананне ці іншае выкарыстанне твораў навукі, літаратуры і мастацтва, маглі выкарыстаць прафесійнае падатковае вылічэнне ў памерах, якія былі акрэслены ў згаданым законе. Гэта вылічэнне з даходу можна было выкарыстаць замест атрымання прафесійнага падатковага вылічэння ў суме фактычна здзейсненых і дакументальна падверджаных выдаткаў (абзац 3-ці п. 1.3 гл. 16) [470]. Такім чынам, знікла неабходнасць выдання асобнай урадавай пастановы, якая вызначала нарматывы выдаткаў.

Доўгі час у краіне адсутнічаў дакладна выбудаваны і юрыдычна абгрунтаваны механізм ***падаткаабкладання іншых даходаў творчых работнікаў***. Адсутнасць дакладнага заканадаўчага вызначэння сістэматычнасці атрымання прыбытку, розныя падыходы ў заканадаўстве да прадпрымальніцкай дзейнасці фізічных асоб – аўтараў твораў прывяла да выпадкаў прыцягнення ў перыяд 1999–2001 гг. да адміністрацыйнай адказнасці мастакоў – членаў Беларускага саюза масткоў за рэалізацыю імі звыш аднаго разу на працягу года твораў мастацтва праз салоны-магазіны, галерэі, з творчых майстэрняў [439, спр. 606, арк. 107].

Яшчэ ў 1997 г. тагачасны Дзяржаўны падатковы камітэт у тлумачэннях «Па асобных пытаннях абкладання падаходным падаткам грамадзян і прадпрымальнікаў, якія здзяйсняюць сваю дзейнасць без утварэння юрыдычнай асобы» ўказваў на тое, што даходы, атрыманыя мастакамі ад рэалізацыі сваіх твораў без перадачы маёмасных правоў на іх выкарыстанне і без заключэння аўтарскай дамовы, неабходна разглядаць як даходы ад заняцця прадпрымальніцкай дзейнасцю, якая падлягае дзяржаўнай рэгістрацыі ў вызначаным парадку. Аднак гэта тлумачэнне не з'яўлялася нарматыўным прававым актам, што аднак не служыла перашкодай для прыцягнення мастакоў да адміністрацыйнай адказнасці [439, спр. 606, арк. 109].

Адпаведна логіцы, даходы, атрыманыя ад рэалізацыі аўтарскіх твораў, павінны былі ўносіцца ў дэкларацыю аб штогадовым сукупным даходзе пэўнага творцы. Пры гэтым юрыдычныя асобы (салоны-магазіны, галерэі і г. д.), якія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізавалі аўтарскія творы, падавалі даведкі ў падатковыя органы аб памерах налічаных і сплачаных у бюджэт сум падаходнага падатку з фізічных асоб. Пры такой практыцы не было неабходнасці абавязковай рэгістрацыі мастака як прадпрымальніка [439, спр. 606, арк. 108].

Прадстаўнікі падатковых органаў, якія ініцыявалі адміністрацыйную вытворчасць у судах, органы пракуратуры спасылаліся на артыкул 1 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, у якім прадпрымальніцкая дзейнасць была вызначана як сістэматычнае атрыманне прыбытку. У судах сістэматычнае атрыманне прыбытку трактавалася як атрыманне аўтарскага ўзнагароджання звыш аднаго разу ў год ад юрыдычных ці фізічных асоб, у тым ліку ад салонаў-магазінаў, галерэй, выставак-продажаў. Класіфікацыя судамі дзеянняў членаў Беларускага саюза мастакоў па артыкуле 154 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях (парушэнне правіл здзяйснення прадпрымальніцкай дзейнасці) грунтавалася на артыкуле 1 Грамадзянскага кодэкса [439, спр. 606, арк. 107].

Часткай 2 артыкула 17 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб творчых саюзах і творчых работніках» (рэдакцыя 1999 г) было ўстаноўлена, што культурная творчая дзейнасць творчых работнікаў не з’яўляецца прадпрымальніцкай дзейнасцю за выключэннем выпадкаў, калі яна накіравана на сістэматычнае атрыманне прыбыткаў ад яе вынікаў. Пры гэтым паняцце сістэматычнасці атрымання прыбытку не раскрывалася. Фармуліроўка дадзенага артыкула была некарэктнай з-за выкарыстання тэрміна «прыбытак» адносна творцаў. Эканоміка-прававая катэгорыя «прыбытак» адносілася да юрыдычных асоб адпаведна Закону Рэспублікі Беларусь «Аб падатках на даходы і прыбытак» ад 22 снежня 1991 г. Фізічныя асобы атрымлівалі «даход», што было замацавана ў Законе Рэспублікі Беларусь ад 21 студзеня 1991 г. «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў».

Часткай 2 пункта 1 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублік Беларусь № 12 ад 17 красавіка 2001 г. «Аб увядзенні адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асобаў, якія здзяйсняюць рэалізацыю тавараў, работ (паслуг), і аб некаторых пытаннях, звязаных з пазначанай дзейнасцю» было вызначана, што грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія не з’яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, пры разавай (несістэматычнай) рэалізацыі выробленых, перапрацаваных ці набытых імі для рэалізацыі тавараў на рынках адпаведна Пераліку (у які былі ўключаны творы жывапісу, графікі, скульптуры) плацілі штомесячна адзіны падатак. Паняцце сістэмнасці рэалізацыі па замысле Дэкрэта – звыш аднаго разу. Тэрміна для вызначэння сістэматычнага атрымання даходу ў дэкрэце не ўтрымлівалася, хаця справаздачны перыяд для выплаты адзінага падатку быў акрэслены адным месяцам [439, спр. 606, арк. 108].

Недастатковая выбудаванасць заканадаўства ў пачатку 2000-х гг. ставіла творцаў пад пагрозу быць асуджанымі па артыкуле 223 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (незаконная прадпрымальніцкая дзейнасць). У адпа-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

веднасці з гэтым артыкулам за атрыманне даходу ў буйным памеры (ад 250 і болей мінімальных заработных плат) без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка аўтар мог быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці з прымяненнем пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да трох гадоў. Пры атрыманні прыбытку звыш за 1000 мінімальных заробкаў – на тэрмін да пяці гадоў пазбаўлення волі. Творы скульптуры, манументальнага жывапісу і мазаікі, іншых буйных і працаёмкіх арыгінальных твораў ацэньваліся заказчыкамі і аўтарамі на такія і больш буйныя сумы. Пры гэтым мастак мог мець на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь некалькі заказаў адначасова. Калі б мастак і зарэгістраваўся ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка, то яму неабходна было б здзяйсняць прадпрымальніцкую дзейнасць. Пры яе нездзяйсненні на працягу шасці і больш месяцаў індывідуальны прадпрымальнік падлягаў адпаведна заканадаўству (ч. 3 п. 42.3 Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 лістапада 2000 г. № 22 «Аб унясенні зменаў і дапаўненняў у Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 сакавіка 1999 г. № 11 і некаторых пытаннях дзяржаўнай рэгістрацыі асобных юрыдычных асобаў») ліквідацыі па рашэнні рэгіструючага органа. У звароце Беларускага саюза мастакоў у Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у 2002 г. звярталася ўвага на тое, што: «мастак – творчая асоба. Яго праца залежыць ад натхнення. Ён мог пісаць карціны кожны дзень, а можа раз у некалькі гадоў. Карціны могуць прадавацца адразу пасля напісання, а могуць гадамі вісець у галерэях, майстэрнях, могуць прымацца на выставы, быць падаранымі ўстановам, арганізацыям, музеям. […] З судовай практыкі, якая склалася, непазбежны вывад, што ўсе аўтары – мастакі, пісьменнікі, вучоныя, паэты, канструктары, журналісты, якія ствараюць і рэалізуюць свае аўтарскія творы, спадкаемцы аўтараў, калекцыянеры, пры неаднаразовым адплатным выкарыстанні з дазволу аўтара (іншага праваўладальніка) музычнага твора, эстрадных песняў, надрукаванні аднаго ці некалькіх літаратурных твораў у перыядычным друку, увядзенні ў грамадзянскі зварот і распаўсюджанні напісаных кніг, пры атрыманні прыбытку ад сцэнічных пастановак аўтарскіх сцэнарыяў, пры атрыманні прыбытку ад укараняемых навуковых распрацовак і г. д., абавязаны рэгістравацца ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў» [439, спр. 606, арк. 112].

Для выпраўлення становішча 3 сакавіка 2003 г. быў прыняты Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 4, які адмяніў дзеянне Дэкрэта № 12. Нарматыўны прававы акт увёў адзіны падатак з грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія не з'яўляліся індывідуальнымі прадпрымальнікамі, пры разавай (несістэматычнай) рэалізацыі на рынках выробленых, перапрацаваных ці набытых імі для рэалізацыі тавараў адпаведна Пераліку відаў дзейнасці, пры здзяйсненні якіх індывідуальныя прадпрымальнікі і іншыя фізічныя асобы плацяць адзіны падатак і базавыя стаўкі адзінага падатку. У мэтах згаданага дэкрэта да разавай (несістэматычнай) рэалізацыі тавараў была аднесена рэалізацыя тавараў, якая здзяйснялася не больш за 30 дзён у каляндарным годзе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У «Пераліку відаў дзейнасці, пры здзяйсненні якіх індывідуальныя прадпрымальнікі і іншыя фізічныя асобы плацяць адзіны падатак, і базавых ставак адзінага падатку», які з’яўляўся дадаткам да дэкрэта, за рознічны гандаль (акрамя рознічнага гандлю праз аб’екты грамадскага харчавання), у тым ліку прадукцыяй уласнай вытворчасці, гандаль на рынках, гандаль па ўзорах, камісійны гандаль творамі жывапісу, графікі, скульптуры, прадметамі народных промыслаў была прадугледжана стаўка адзінага падатку ў памеры ад 12 да 36 еўра ў месяц, дзейнасць у галіне фатаграфіі – ад 20 да 60, вытворчасць кіна- і відэафільмаў па заказах грамадзян – ад 25 да 75, канцэртная дзейнасць, паслугі танцавальных залаў, плашчадак, дыскатэк і школ танцаў – ад 30 да 90, дзейнасць па арганізацыі і правядзенні канцэртаў, тэатральных і іншых забаўляльных мерапрыемстваў – ад 75 да 180 еўра ў месяц.

Праз два гады зноў адбыліся змены ў парадку спагнання адзінага падатку. «Палажэннем аб адзіным падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асобаў», зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 чэрвеня 2005 г. № 285 (далей – Указ № 285) быў павялічаны тэрмін, на працягу якога фізічныя асобы, якія не здзяйснялі прадпрымальніцкай дзейнасці, маглі займацца рознічным гандлем выраблёнымі, перапрацаванымі ці набытымі таварамі «не больш 60 дзён у каляндарным годзе» [514]. Праз год была вызначана максімальная дазволеная колькасць дзён у месяц для здзяйснення такой дзейнасці: «не больш 5 дзён у кожным каляндарным месяцы і не больш 60 дзён у каляндарным годзе». Пры гэтым у тэксце «Палажэння аб адзіным падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асобаў» з’явілася істотнае дапаўненне аб тым, што пад яго дзеянне «не падпадаюць фізічныя асобы, здзяйсняючыя ў адпаведнасці з заканадаўствам рамесную дзейнасць» [484]. Указам № 285 былі зменены і памеры базавых ставак адзінага падатку. Яны былі ранжыраваны на пяць груп. Найбольшы памер падатку павінны былі плаціць у г. Мінску і Мінскім раёне. Найменшы – у населеных пунктах, за выключэннем гарадоў абласнога падпарадкавання. У выніку вырас максімальны памер падатку. Напрыклад, за рознічны гандаль творамі жывапісу, графікі, скульптуры, прадметамі народных промыслаў у сталіцы, сталічным раёне і ва ўсіх абласных гарадах неабходна было заплаціць ад 12 да 45 еўра. У гарадах абласнога падпарадкавання і іншых населеных пунктах – ад 12 да 30 еўра.

Адначасова быў істотна пашыраны пералік відаў дзейнасці, пры здзяйсненні якіх індывідуальныя прадпрымальнікі і іншыя фізічныя асобы плацяць адзіны падатак. У яго асобным пунктам была ўнесена «дзейнасць па арганізацыі і правядзенню канцэртаў; паслугі паркаў з атракцыёнамі і ўстановаў па выкарыстанню гульнявых аўтаматаў без грашовага выйгрышу; паслугі па арганізацыі і правядзенню масавых гулянняў, навагодніх елак; дзейнасць, звязаная з арганізацыяй шоў забаўляльнага характару; дзейнасць цыркаў, лялечных тэатраў, забаўляльных ціраў». У Мінску і Мінскім раёне стаўка адзінага падатку за гэтыя віды дзейнасці была вызначана ў памеры 100–200 еўра.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У іншых населеных пунктах, за выключэннем гарадоў абласнога падпарадкавання, – 75–100 еўра. Дзейнасць па напісанні карцін, партрэтаў па заказах спажыўцоў была аб'яднана ў адну групу з афарбоўкай, гравіроўкай, нанясеннем друкаваных знакаў (малюнкаў на метале). У асобныя віды дзейнасці былі выдзелены паслугі тамады, дзейнасць дызайнераў і мастакоў-афарміцеляў.

Такім чынам, на працягу вывучаемага перыяду ў краіне адбывалася фарміраванне трохузроўневай сістэмы фінансавання культуры. На першым узроўні знаходзіліся прамыя бюджэтныя асігнаванні на патрэбы галіны праз рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты ў выглядзе субсідый і датацый. Яны дазвалялі забяспечыць нарматыўнае фінансаванне бюджэтных устаноў і арганізацый на бягучыя выдаткі па захаванні матэрыяльнай базы, выплату заробку работнікам. З 2003 г. у краіне стаў дзейнічаць сацыяльны стандарт бюджэтнага забеспячэння галіны.

Дадатковай крыніцай фінансавай падтрымкі была сістэма мэтавых праграм і канкрэтных праектаў. Калі ў 1990-х гг. былі адзінкавыя праграмы і праекты, якія атрымлівалі статус прыярытэтных, то ў пачатку 2000-х адбыўся пераход да комплекснага галіновага праграмна-мэтавага фінансавання.

Трэцім узроўнем стаў падатковы пратэкцыянізм як форма ўскоснага дзяржаўнага фінансавання. На працягу вывучаемага перыяду ён знаходзіўся ў пастаяннай дынаміцы, назіраліся перыяды пашырэння і звужэння падатковых ільгот як бюджэтным, некамерцыйным установам і грамадскім арганізацыям, так і камерцыйным арганізацыям і прадпрыемствам, а таксама творцам.

Новыя механізмы гаспадарання, абмежаванасць бюджэтнага фінансавання стымулявалі развіццё платных паслуг, пошук пазабюджэтных сродкаў. Калі доля паступленняў ад платных паслуг з кожным годам ўзрастала, то паступленні ад мецэнатаў так і не сталі істотнай крыніцай фінансавання, у першую чаргу з-за адсутнасці падатковых стымулаў.

У даследуемы перыяд матэрыяльны стан работнікаў культуры не змог істотна палепшыцца. Фактычна ў пачатку 1990-х гг. у сувязі з эканамічным крызісам і гіперінфляцыяй была парушана сістэма даплат і прэмій, якая склалася ў савецкі час. На яе аднаўленне спатрэбіўся дастаткова працяглы час. Быў перагледжаны парадак прызначэння даплат за наяўнасць ганаровых званняў і прэмій. Распаўсюдзілася практыка прызначэння персанальных акладаў і надбавак вядучым майстрам мастацтваў, павышэння акладаў асобным кіруючым работнікам і спецыялістам, даплат за катэгорыю. Пэўныя льготы па аплаце працы атрымалі работнікі культуры, якія жылі ці працавалі на сяле.

Новай крыніцай матэрыяльнай падтрымкі дзеячаў культуры і мастацтва стала сістэма спецыяльных прэмій і грантаў.

Нягледзячы на шэраг захадаў, узровень заработнай платы работнікаў культуры на працягу ўсяго перыяду заставаўся адным з самых нізкіх у краіне, а таксама назіралася дыспрапорцыя ва ўзроўні заробку паміж сталіцай і рэгіёнамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу ўсяго перыяду неаднаразова пераглядаліся памеры ставак і парадак выплаты аўтарскага ўзнагароджання за стварэнне твораў культуры і мастацтва, а таксама за іх выкарыстанне.

Доўгі час не мела дакладнага заканадаўчага вызначэння падаткаабкладанне творчых работнікаў, сістэматычнасць атрымання прыбытку. Гэта ставіла творцаў пад пагрозу быць асуджанымі за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць. Праблема была вырашана з увядзеннем з 2003 г. адзінага падатку з грамадзян, якія не з'яўляліся індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

Доўгі час не дакладным быў парадак падаткаабкладання сум аўтарскага ўзнагароджання. Толькі ў 2005 г. заканадаўча было замацавана вызначэнне «прафесійныя падатковыя вылічэнні».

### 2.3. Кадры сферы культуры

Узровень развіцця нацыянальнай культуры, яе духоўны патэнцыял і стваральныя магчымасці абумоўліваюць кадры. Яны складаюць аснову культурнага працэсу і належаць да стратэгічных рэсурсаў дзяржавы.

Першым заканадаўча афармленым дакументам, які вызначаў агульныя контуры дзяржаўнай культурнай палітыкі ў перыяд рэфармавання эканомікі, быў Закон «Аб культуры» (1991 г.), прыняты 4 чэрвеня 1991 г. Ён быў накіраваны сярод іншага на «сацыяльную абарону работнікаў культуры ва ўмовах рынкавых адносін» [24].

Непасрэдна работнікаў сферы культуры датычылі некалькі артыкулаў закона. Артыкул 3 сярод асноўных прынцыпаў культурнай дзейнасці замацаваў свабоду творчай дзейнасці, плюралізм напрамкаў і стыляў у творчасці, адмову ад манапалізму ў культуры. Тут жа дэкларавалася абарона інтэлектуальнай уласнасці. Вызначыўшы ў якасці прыярытэту развіццё беларускай нацыянальнай культуры, закон замацоўваў права на бесперашкодную культуратворчую дзейнасць на тэрыторыі краіны для ўсіх нацыянальных супольнасцей. Для творцаў істотным быў факт нарматыўнага забеспячэння сувязей беларускай нацыянальнай культуры з культурамі іншых народаў, зварот увагі на узмацненне асабістага пачатку ў культурнай дзейнасці, поўную самастойнасць культурнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь.

Важнымі для работнікаў сферы культуры з'яўляліся палажэнні артыкула 40 аб матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні культуры. Ім замацоўваўся абавязак мясцовых саветаў выдзяляць творчым работнікам у пастаяннае карыстанне частку нежылога фонду пад майстэрні, студыі, лабараторыі, залі і г. д., неабходныя для здзяйснення прафесійнай дзейнасці.

Асобны раздзел закона аб'яднаў палажэнні па аплаце працы і сацыяльным гарантыям работнікаў культуры (раздзел IX). Так, артыкул 44 дэклараваў, што дзяржава забяспечвае гарантаваны ўзровень аплаты працы і яе дыферэнцыяцыю ў залежнасці ад кваліфікацыі і вынікаў працы. Пры гэтым максімальная



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

велічыня заробку не абмяжоўвалася і вызначалася ў адпаведнасці з якасцю, колькасцю і відам працы ў межах сродкаў, накіраваных у фонд аплаты працы.

Асобны раздзел X закона быў накіраваны на прававое забеспячэнне пытанняў падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і атэстацыі кадраў. Вызначаўся прыярытэт пры працаўладкаванні па спецыяльнасці грамадзян, якія мелі спецыяльную адукацыю ў галіне культуры і мастацтва. Усе работнікі культуры, кіраўнікі дзяржаўных органаў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый культуры павінны былі праходзіць перыядычную атэстацыю. Немалаважным падаецца палажэнне аб садзейнічанні дзяржаўнымі органамі кіравання, прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі культуры, творчымі саюзамі і іншымі грамадскімі аб'яднаннямі ў падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў работнікаў культуры і мастацтва за мяжой, а таксама замежных грамадзян, у першую чаргу прадстаўнікоў беларускіх суполак, у навучальных установах Рэспублікі Беларусь.

У асобных законах, якія рэгулявалі дзейнасць у сферы культуры, утрымліваліся палажэнні, якія датычылі кадраў культуры.

Намі выяўлена толькі два законы, у якіх акрэсліваўся статус і правы асобных катэгорый работнікаў сферы культуры. Сярод апошніх – бібліятэчныя работнікі і музейныя работнікі. Прыняты ў 1995 г. Закон «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» [458] утрымліваў асобную главу, прысвечаную бібліятэчным кадрам. Артыкул 29 у частцы правоў і абавязкаў работнікаў бібліятэк спасылаўся на дзеючае заканадаўства краіны аб працы. Прыём на працу бібліятэчных работнікаў мог здзяйсняцца як на конкурснай аснове, так і па кантракце. Дадзеная катэгорыя работнікаў падлягала перыядычнай атэстацыі. Бібліятэчныя работнікі незалежна ад формы ўласнасці і парадку заснавання бібліятэк карысталіся роўнымі правамі ў сферы працоўных адносін, у галіне сацыяльнага страхавання і забеспячэння.

Закон замацаваў норму бясплатнага карыстання жылымі памяшканнямі, ацяпленнем і асвятленнем для бібліятэчных работнікаў, працуючых у сельскай мясцовасці і рабочых пасёлках. Ім таксама ўстанаўліваліся аклады па пасадзе (тарыфныя стаўкі) у параўнанні з аплатай працы бібліятэчных работнікаў, працуючых у гарадах.

Падрыхтоўка і павышэнне кваліфікацыі бібліятэчных кадраў, адпаведна артыкула 30 аналізуемага закона, павінны былі здзяйсняцца адпаведнымі вышэйшымі, сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі і курсамі. Пры назначэнні на штатныя пасады ў бібліятэках першаснае права надавалася асобам са спецыяльнай бібліятэчнай адукацыяй ці другой адпаведнай адукацыяй пры наяўнасці спецыяльнай падрыхтоўкі. На дзяржаўныя органы ці асоб, што ўтрымлівалі бібліятэкі, накладваўся абавязак ствараць умовы для падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі работнікаў бібліятэк праз існуючую сістэму павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры.

Адносна аплаты працы і сацыяльных гарантый артыкул 31 канстатаваў абавязак дзяржавы забяспечваць гарантаваны ўзровень аплаты працы біблія-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэчных работнікаў і яе дыферэнцыяцыю ў залежнасці ад кваліфікацыі і вынікаў працы. Канкрэтны памер аплаты працы кожнага работніка павінен быў вызначацца ў адпаведнасці з дамоўленасцю бакоў і не мог быць ніжэйшым за прадугледжаны заканадаўствам і калектыўнай дамовай. Максімальны ўзровень заробку не абмяжоўваўся і ўстанаўліваўся ў адпаведнасці з якасцю і колькасцю працы.

Як можна было заўважыць, у Законе «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» 1995 г. утрымліваецца некалькі азначэнняў, якія тычацца бібліятэчных кадраў, – «бібліятэчныя работнікі» і «работнікі бібліятэк».

У новай рэдакцыі Закона «Аб бібліяэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» 2002 г. глава «Бібліятэчныя кадры» адсутнічае [45]. Замест гэтага з’явіўся артыкул 13 «Бібліятэчныя работнікі», пад якімі разумеліся «фізічныя асобы, якія знаходзяцца ў працоўных адносінах з бібліятэкай на падставе заключанага працоўнага дагавора». Адносна правоў і абавязкаў бібліятэчных работнікаў, аплаты іх працы рабілася агаворка – «вызначаецца заканадаўствам». Заканадаўствам аб сацыяльным страхаванні і пенсіённым забеспячэнні рэгулявалася сацыяльнае страхаванне і пенсійнае забеспячэнне бібліятэчных работнікаў.

У прынятым 5 сакавіка 1996 г. Законе «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» [503] асобная глава прысвечана правам музеяў і сацыяльным гарантыям работнікам дзяржаўных музеяў. Дзяржава забяспечвала дадзенай катэгорыі работнікаў гарантаваны ўзровень аплаты працы, яе дыферэнцыяцыю ў залежнасці ад іх кваліфікацыі і вынікаў працы. Пры гэтым рэгуляванне аплаты працы павінна было здзяйсняцца ў адпаведнасці з Кодэксам аб працы. Супрацоўнікам музеяў было нададзена права на бясплатнае наведванне дзяржаўных музеяў і выставак. Асобна заўважалася, што работнікі музеяў у сваёй дзейнасці таксама кіруюцца іншым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, нормамі прафесійнай этыкі (арт. 24).

Неабходна адзначыць, што калі падрыхтоўка кадраў бібліятэчных работнікаў магла здзяйсняцца вышэйшымі, сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі і курсамі, то падрыхтоўка кадраў работнікаў музеяў – толькі адпаведнымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі (арт. 25). Дзяржаўныя і іншыя органы стваралі належныя ўмовы для прафесійнага росту і павышэння кваліфікацыі работнікаў музеяў.

У прааналізаваным законе, як і ў папярэднім, выкарыстоўваецца два вызначэнні – «супрацоўнік музея» і «работнік музея».

У новай рэдакцыі Закона «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» ад 12 снежня 2005 г. [26] адсутнічаюць палажэнні аб сацыяльных гарантыях, правах і абавязках дадзенай катэгорыі работнікаў. Толькі сярод тэрмінаў, якія выкарыстоўваюцца, прыведзена вызначэнне «музейны работнік» – фізічная асоба, якая на падставе працоўнага дагавора забяспечвае ажыццяўленне ў музеі музейнай дзейнасці.

У Законе «Аб кінематаграфіі» [494] утрымліваецца вызначэнне «работнікі кінематаграфіі», якое аб’ядноўвае творчых работнікаў і вытворча-тэхнічны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

персанал. Закон прадастаўляе права ўсім грамадзянам краіны на здзяйсненне кінематаграфічнай дзейнасці як на прафесійнай, так і на аматарскай аснове, на стварэнне грамадскіх арганізацый у мэтах абароны правоў работнікаў кінематаграфіі, здзяйснення адукацыйнай, выхаваўчай, дабрачыннай дзейнасці ў сферы кінематаграфіі (арт. 3). Дзяржава гарантуе грамадзянам свабоду выбару напрамкаў (школ), прыёмаў і метадаў творчай дзейнасці ў галіне кінематаграфіі, форм і спосабаў рэалізацыі сваіх творчых задум, а таксама вызначэння тэматыкі і жанраў сваіх фільмаў (арт. 4). Сярод спосабаў падтрымкі дзяржавай кінематаграфіі закон называе падрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку работнікаў кінематаграфіі, аказанне падтрымкі творчай моладзі і работнікам кінематаграфіі ў форме прысуджэння прэмій, прызначэння стыпендый, выдзялення грантаў і ў іншых формах сацыяльнай падтрымкі творчай працы (арт. 12). Парыхтоўка, павышэнне кваліфікацыі перападрыхтоўка работнікаў кінематаграфіі здзяйсняецца ўстановамі адукацыі і іншымі арганізацыямі ў адпаведнасці з заканадаўствам (арт. 23).

Новая рэдакцыя Закона ўтрымлівае вызначэнне «работнік культуры» – фізічная асоба, якая знаходзіцца ў працоўных адносінах з арганізацыяй культуры на падставе заключанага працоўнага дагавора (кантракта) і займаецца культурнай дзейнасцю. Побач з гэтым даецца тлумачэнне паняцця «дзеячы культуры і мастацтва», пад якімі разумеюцца работнікі культуры, творчыя работнікі, якія маюць ганаровыя званні ў галіне культуры. Вызначэнне «творчы работнік» закон не дае. Аднак яно было дадзена ў Законе «Аб творчых саюзах і творчых работніках». Побач з гэтым у рэдакцыі 2004 г. Закона «Аб культуры» прыведзены азначэнні «культурная дзейнасць»[1] і «творчая дзейнасць»[2]. А ў Законе «Аб творчых саюзах і творчых работніках» тлумачыцца тэрмін «культурная творчая дзейнасць»[3].

Змены культурных запатрабаванняў, абумоўленыя як сацыяльна-эканамічнымі працэсамі, так і пашырэннем выкарыстання новых тэхналогій, прывялі да скарачэння колькасці ўстаноў культуры і, такім чынам, да змяншэння патрэбнасці ў спецыялістах пэўных сегментаў культурнай сферы.

На гэты працэс адмоўнае ўздзеянне аказвала пагаршэнне сацыяльна-эканамічнага становішча работнікаў галіны ў гады сацыяльна-эканамічнага крызісу пачатку 1990-х гг.

[1] Культурная дзейнасць – дзейнасць па стварэнні, аднаўленні (адраджэнні), захаванні, ахове, вывучэнні, папулярызацыі, выкарыстанні і распаўсюджванні культурных каштоўнасцей, эстэтычным выхаванні, мастацкай і культуралагічнай адукацыі, арганізацыі культурнага адпачынку (вольнага часу) насельніцтва.

[2] Творчая дзейнасць – від культурнай дзейнасці, які ўключае мастацкую творчасць і іншую інтэлектуальную дзейнасць, што завяршаецца з'яўленнем новага, не існаваўшага раней самастойнага выніку інтэлектуальнай дзейнасці ў галіне культуры.

[3] Культурная творчая дзейнасць – інтэлектуальная творчасць, якая завяршаецца з'яўленнем новага, не існаваўшага раней самастойнага выніку ў галіне культуры, літаратуры, мастацтва і іншай культурнай творчай дзейнасці.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

У першай палове 1990-х гадоў назіраўся працэс выезду за мяжу высокапрафесійных выканаўцаў, музыкантаў, артыстаў, рэжысёраў і дырыжораў у пошуках больш аплачваемай працы. Толькі з Беларускай дзяржаўнай філармоніі за 1991–1994 гг. выехалі на працу ў Расію, Літву, заходнія дзяржавы 30 спецыялістаў высокага класа. Падобная сітуацыя назіралася ў ансамблі «Харошкі», дзе ўвесь склад аркестра падаў заявы на звальненне ў сувязі з выездам у ЗША. Многія артысты тэатраў, канцэртных арганізацый у абласцях вымушаны былі пакідаць творчую дзейнасць і пераходзіць у вытворчую ці камерцыйную сферы, не звязаныя з іх асноўнай кваліфікацыяй [438, спр. 12, арк. 112].

Цяжкае становішча з укамплектаваннем пасад кіраўнікоў творчых мастацкіх калектываў, асабліва ў раённых цэнтрах, сельскай мясцовасці склалася ў сувязі з прыняццем Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь Пастановы № 711 ад 25 лістапада 1992 г. «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнаму рэгуляванню і кантраляванню дзейнасці суб'ектаў гаспадарання». Да выхаду гэтага нарматыўнага прававога акта многія загадчыкі аддзелаў культуры рай- (гар)выканкамаў і кіраўнікі культасветустаноў, якія мелі спецыяльную адукацыю, разам з асноўнай работай сумяшчалі і кіраўніцтва самадзейнымі мастацкімі калектывамі. Гэта давала магчымасць службовым асобам для творчай дзейнасці і прафесійнага ўдасканалення. У выніку ўведзенай забароны служачым выканкамаў мясцовых саветаў народных дэпутатаў і кіраўнікам дзяржаўных арганізацый выконваць іншую аплачваемую работу на ўмовах сумяшчальніцтва шэраг спецыялістаў сістэмы культуры былі пазбаўлены такой магчымасці. Многія вядучыя мастацкія самадзейныя калектывы рэспублікі засталіся без кіраўнікоў. Міністэрства культуры звярталася ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь з прапановай унесці адпаведнае дапаўненне ў Пастанову Урада № 711 ад 25 лістапада 1992 г., якое б урэгулявала працу кіраўнікоў аддзелаў культуры і культасветустаноў [439, спр. 10, арк. 310–311]. У канцы 1993 г. гэта было здзейснена [489].

Істотнае змяншэнне колькасці работнікаў у галіне культуры адбылося ў другой палове 1995 г., калі раённыя і гарадскія ўладныя структуры арганізавалі скарачэнне кадраў у адпаведнасці з выкананнем Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб удакладненні бюджэту Рэспублікі Беларусь на 1995 год і часовых мерах па скарачэнню бюджэтных выдаткаў» ад 12 чэрвеня 1995 г. і адпаведнай пастановы Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 8 ліпеня 1995 г. № 433. У Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Урад краіны, Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь былі накіраваны тэлеграмы, лісты і звароты, якія сведчылі аб шматлікіх фактах, якія маглі прывесці да разбурэння структуры галіны і парушыць правы людзей на карыстанне культурнымі каштоўнасцямі.

Напрыклад, без дакладнага абгрунтавання на нарадах старшынь гар-, райвыканкамаў Гродзенскай вобласці былі дадзены вусныя даручэнні скараціць у г. Гродна 37 адзінак у бібліятэках і музеях, у Бераставіцкім раёне – 17 адзінак дырэктараў сельскіх клубных устаноў, у Свіслацкім – 18, Ашмянскім – 15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У Зельвенскім раёне палічылі магчымым перавесці загадчыкаў усіх 30 сельскіх клубаў на 0,5 стаўкі і г. д. Добрушскім райвыканкамам Гомельскай вобласці было прынята рашэнне скараціць адзіную пасаду інспектара аддзела культуры, у Валожынскім раёне Мінскай вобласці рашэннем выканкама быў скасаваны раённы метадычны цэнтр. У асобных раёнах Магілёўскай і Гомельскай абласцей патрабавалі скарачэння 30 % у галіне культуры [438, спр. 19, арк. 142].

Па статыстычных дадзеных за 1994 г., у сярэднім на адну клубную ўстанову выпадала дзве штатныя платныя адзінкі, а ў сельскай мясцовасці на адну бібліятэку – 1,05 работніка. За 1992–1994 гг. па краіне былі закрыты 524 бібліятэкі, 472 клуба і дамы культуры [438, спр. 19, арк. 142].

Міністэрства культуры вымушана было звярнуцца да старшынь аблвыканкамаў, Мінгарвыканкама, райвыканкамаў з патрабаваннем строга прытрымлівацца Метадычных указанняў Міністэрства фінансаў аб парадку правядзення скарачэння ў бюджэтных арганізацыях і ўстановах апарата кіравання, у якіх адзначалася, што скарачэнне колькасці кіруючых пасад павінна праводзіцца, маючы на ўвазе суміраваную колькасць кіруючых пасад па ўсіх, а не па асобных галінах народнай гаспадаркі. Падыход да скарачэння павінен быў адбывацца дыферэнцыраваны, каб насельніцтва не было пазбаўлена магчымасці займацца культурна-творчай дзейнасцю, і не была створана тым самым сацыяльная напружанасць. Пры гэтым неабходна было памятаць, што кіраўнікі структурных адзінак, якія адначасова выконвалі функцыі асноўнай дзейнасці, не ўваходзілі ў наменклатуру пасад кіруючага персаналу. У сувязі з гэтым не падлягалі скарачэнню работнікі, якія былі занятыя ва ўстановах культуры на шэрагу кіруючых пасад і адначасова выконвалі непасрэдна творчую, практычную культурна-асветную, вучэбна-выхаваўчую, доследна-аналітычную работу [438, спр. 19, арк. 142–143].

У перыяд з 1993 па 2000 г. колькасць бібліятэк галіны культуры скарацілася на 399 адзінак. У першую чаргу цярпела сельскае насельніцтва. Адным з выхадаў бачылася аб'яднанне сельскай і школьнай бібліятэк ці аб'яднанне бібліятэкі з клубам і спалучэнне ў адной асобе абавязкаў бібліятэчнага і клубнага работніка.

У гэты перыяд назіралася скарачэнне колькасці спецыялістаў з профільнай сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Па розных прычынах сферу дзейнасці бібліятэк пакінулі 177 чалавек. Адначасова павялічылася колькасць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Аднак з агульнай лічбы росту, якая складае 209 чалавек, са спецыяльнай адукацыяй у сферу бібліятэк прыйшлі працаваць толькі 3 чалавекі [191, с. 73].

Забяспечанасць спецыялістамі рэгіёнаў восенню 1999 г. выглядала наступным чынам: у сельскіх установах культуры і мастацтва Брэсцкай вобласці працавалі ў клубных установах 56,8 % спецыялістаў ад агульнай патрэбы, у бібліятэках – 63,1 %. Забяспечанасць педагагічнымі кадрамі дзіцячых школ мастацтваў складала 100 %. Вобласць мела вострую неабходнасць у акампаніятарах, кіраўніках харавых, харэаграфічных калектываў, арганізатарах воль-

нага часу, выкладчыках дзіцячых школ мастацтваў па фартэпіяна, тэорыі музыкі і баяна [439, спр. 296, арк. 250 зв.].

Аварыя на Чарнобыльскай АЭС адмоўна паўплывала на якасны склад кадраў сферы культуры Гомельскай, Магілёўскай і часткова Брэсцкай абласцей, асабліва забруджаных раёнаў. Нежаданне выпускнікоў навучальных устаноў ехаць на работу ў гэтыя месцы прывяло да таго, што колькаснае забеспячэнне спецыялістамі ўстаноў культуры і мастацтва Гомельскай вобласці, асабліва Брагінскага і Чачэрскага раёнаў, на пачатак 1999 г. складала ўсяго 38 %, Веткаўскага і Хойніцкага – 53 % і 43 % адпаведна, Нараўлянскага – 28 % [439, спр. 296, арк. 251].

Не менш значнай для Гомельскай вобласці была праблема адукацыйнага ўзроўню кіраўнікоў раённага звяна. Гэтаму паказчыку не адпавядала 40 % інспектараў аддзелаў культуры, 41 дырэктар раённых і гарадскіх дамоў культуры, 17 дырэктараў раённых цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм, 35 дырэктараў музычных школ, 17 % дырэктараў музеяў, якія не мелі вышэйшай адукацыі [439, спр. 296, арк. 251 зв.].

У Віцебскай вобласці ў гэты перыяд забяспечанасць клубных устаноў спецыялістамі складала 75%, бібліятэк – 73,1%. У Магілёўскай вобласці агульная лічба забяспечанасці спецыялістамі ўстаноў галіны знаходзілася на ўзроўні 87,4%. У 1998 г. з 28 запрошаных спецыялістаў з Беларускага ўніверсітэта культуры ў вобласць прыбылі 3 спецыяліста. У 1999 г. з 22 маладых спецыялістаў прыбылі толькі 5 чалавек [439, спр. 296, арк. 251 зв.].

У 1999 г. з агульнай колькасці 35 431 штатнай пасады спецыялістаў і кіраўнікоў сферы культуры па краіне 34% прыходзілася на сельскую мясцовасць. Колькасць вакансій у сельскай мясцовасці складала 6,3%, вышэйшую адукацыю мелі 11% работнікаў, сярэднюю спецыяльную – 41%, пенсійнага ўзросту дасягнулі 6% работнікаў [439, спр. 368, арк. 168].

У 2000 г. колькасць работнікаў сеткі клубных устаноў з вышэйшай профільнай адукацыяй складала 12,2 %, з сярэдняй спецыяльнай – 43,2 %. Разам з гэтым неабходна адзначыць, што ў 2000 г. больш за 40 % работнікаў клубных устаноў не мелі вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі [798, с. 22–23].

З мэтай паступовага якаснага абнаўлення кадравага патэнцыялу і забеспячэння ўстаноў культуры і мастацтва спецыялістамі Міністэрства культуры ў 2001 г. прыняло галіновую праграму «Кадры культуры: 2001 – 2005». У год прыняцця дакумента забяспечанасць кадрамі галіны культуры складала 92,6 % [439, спр. 418, арк. 53].

Праграма прадугледжвала распрацоўку мерапрыемстваў па павышэнні якасці прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы культуры і мастацтва; сістэмы маніторынгу ў запатрабаванасці спецыялістаў і стварэння на яе аснове канцэпцыі дзеянняў на рынку працы ў сферы культуры; удасканаленне падрыхтоўкі спецыялістаў у разрэзе спецыяльнасцей і спецыялізацый з улікам перспектыў сацыяльнага і культурнага развіцця дзяржавы, удасканаленне сіс-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэмы бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў сферы культуры [439, спр. 418, арк. 54–68].

У 2002 г. адбылася другая хваля масавага скарачэння штатнай колькасці работнікаў галіны культуры. Гэта было здзейснена ў адпаведнасці з даручэннем Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, якое было дадзена на пасяджэнні калегіі Адміністрацыі 23 лютага 2002 г., а таксама пратакола пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 красавіка 2002 г. № 8. На 1 студзеня 2002 г. агульная колькасць работнікаў сістэмы Міністэрства культуры складала па штаце 58 868 адзінак, у тым ліку апарату кіравання – 5732 адзінкі. У выніку здзяйснення мер па аптымізацыі структуры кіравання і ўпарадкавання сеткі падведамасных арганізацый штатная колькасць работнікаў галіны скарацілася на 2570 адзінак, ці на 4,5 %. У тым ліку былі скарочаны 572 штатныя адзінкі з ліку пасад, якія адносіліся да апарату кіравання, што склала 10 % штатнай колькасці работнікаў апарату кіравання [439, спр. 744, арк. 84].

Упраўленні культуры абласцей у адпаведнасці з рашэннямі аблвыканкамаў здзяйснялі ўпарадкаванне сеткі ўстаноў культуры. У сувязі з закрыццём устаноў, якія знаходзіліся ў маланаселеных пунктах ці ў нездавальняючым функцыянальным стане, была скарочана самая вялікая колькасць пасадаў – 1446 штатных адзінак, ці 56 % ад агульнай колькасці скарочаных пасад па галіне. У выніку рэарганізацыі і аб’яднання ўстаноў культуры, пераўтварэння іх ва ўстановы новага тыпу было скарочана 109 адзінак (52 загадчыка сельскімі клубамі, 40 – бібліятэкараў, 17 – іншых спецыялістаў і рабочых). На прадпрыемствах кінавідэапракату было скарочана 138 адзінак (57 – пасад кіраўнікоў, 41 – іншых спецыялістаў, 26 – кінамеханікаў, 14 – рабочых) [439, спр. 744, арк. 85–86].

У 2005 г. была прынята новая пяцігадовая праграма «Кадры культуры: 2006 – 2010 гг.» [439, спр. 1049, арк. 163–177]. Стратэгічнай мэтай дакумента вызначана эфектыўнае выкарыстанне кадравага патэнцыялу, павышэнне творчай дзейнасці спецыялістаў устаноў культуры і мастацтва, якія здольныя забяспечыць развіццё беларускай культуры. Сярод новых напрамкаў вызначалася стварэнне і ўкараненне ва ўстановах культуры эфектыўнай сістэмы адаптацыі маладых спецыялістаў, удасканаленне механізма замацавання таленавітай моладзі ў вядучых установах культуры.

У плане мерапрыемстваў па выкананні галіновай праграмы знайшлі адлюстраванне меры па ўдасканаленні кадравай палітыкі галіны, па павышэнні эфектыўнасці падбору, расстаноўкі і ацэнкі кадраў, па рабоце з рэзервам кадраў, атэстацыі кіраўнікоў і спецыялістаў, па ўдасканаленні сістэмы падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэнні кваліфікацыі кадраў культуры, падрыхтоўцы кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі.

Калі аналізаваць становішча з забеспячэннем кадрамі ў асобных сферах галіны, то ў 1990-х гг., хіба, не было ніводнай, дзе яно было здавальняючым.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1997 г. на калегіі Міністэрства культуры адзначалася, што пагражаючы характар набыла кадравая сітуацыя ў тэатральным мастацтве. Тэатры рэспублікі мелі вострую патрэбу ў рэжысёрах-пастаноўшчыках. Ім не хапала 8 чарговых і двух галоўных рэжысёраў. Трох адзінак рэжысёраў не хапала Брэсцкаму тэатру драмы і музыкі, двух – Гродзенскаму абласному драмтэатру. Па адной – Мінскаму абласному драмтэатру, Маладзёжнаму тэатру, Нацыянальнаму тэатру імя Янкі Купалы, Мазырскаму драмтэатру імя У. Мележа [439, спр. 145, арк. 139].

Не лепш выглядала становішча і з акцёрскімі кадрамі. Усяго тэатрам рэспублікі ў 1997 г. не хапала 90 акцёраў. Найбольшую патрэбу ў іх адчувалі тэатр імя Янкі Купалы (13), імя Якуба Коласа (16), Магілёўскі абласны (10), Брэсцкі абласны (9) [439, спр. 145, арк. 139].

Асабліва востра стаяла праблема творчай моладзі. Сярэдні ўзрост акцёрскага цэху складаў каля 40 год, а ў некаторых тэатрах перавышаў яго. Кіраўнікі тэатраў і ўпраўленняў культуры Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай абласцей і г. Мінска шукалі шляхі амаладжэння творчага складу тэатраў праз стварэнне студый, курсаў падрыхтоўкі акцёраў з завочным навучаннем у Акадэміі мастацтваў на базе вучылішчаў мастацтваў, але іх намаганняў было недастаткова [439, спр. 145, арк. 139].

У 2000 г. тэатральны крытык Т. Арлова прадказвала: «мінулы сезон яскрава паказаў, што ў Беларусі наспявае хваравіты працэс змены пакаленняў рэжысёраў. Старэйшае пакаленне выйшла ў майстры: яны могуць не ставіць так шмат, як раней. Адпаведна патрэбны рэжысёры, якія будуць працаваць актыўна, а такіх пакуль не відаць. […] У тэатры павінен рэальна працаваць мастацкі савет, які, не ўшчамляючы інтарэсаў майстра, зможа вітаць і іншыя работы. Мне не зразумела сітуацыя ў Рускім тэатры, дзе, акрамя Луцэнкі, ніхто нічога не ставіць. Харошы майстар не павінен баяцца канкурэнцыі. Той жа Мазынскі на «Вольнай сцэне» вядзе сябе вельмі правільна – у яго ў тэатры ставяць Таліпаў, Растрыжэнкаў, Гузей, Дінаў..» [253]. У 2006 г. сярод намеснікаў кіраўнікоў тэатраў і іх памочнікаў цяжка было знайсці будучых кіраўнікоў. Гэта праблема ў той час закранала практычна 60% тэатральных калектываў рэспублікі, рэжысёраў да 35 гадоў ў тэатрах была адна трэць. У многіх тэатрах адсутнічала практыка выхавання рэжысёрскіх кадраў, у будучым, магчыма, патэнцыяльных творчых лідараў. Не было чарговых рэжысёраў у штаце Маладзечанскага, Мазырскага, Гомельскага абласных драматычных тэатраў, Віцебскага, Брэсцкага тэатра лялек [425].

Дастаткова востра стаяла пытанне замацавання маладых рэжысёрскіх і акцёрскіх кадраў. За перыяд 1991–1997 гг. Беларуская акадэмія мастацтваў набрала на вочную форму навучання 5 курсаў рэжысуры драмы і выпусціла 19 маладых спецыялістаў. Разам з тым толькі 8 з іх (42 %) засталіся працаваць у тэатрах рэспублікі па прафесіі. Па вочнай форме навучання рэжысёрскіх кадраў Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў у 2000 г. падрыхтавала



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5 рэжысёраў драмы, 4 з якіх атрымалі права на самастойнае працаўладкаванне. Толькі адзін з іх быў накіраваны на работу ў Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача і праз 2 гады працы пакінуў яго па прычыне складанасцей творчага ўваходжання ў трупу тэатра. У 2002 г. у штатах рэспубліканскіх і абласных драматычных тэатраў творчай моладзі ў галіне «рэжысура драмы» налічвалася толькі 4 чалавека пры чатырох існаваўшых у тэатрах рэжысёрскіх вакансіях.

Плённы вынік у фарміраванні акцёрскіх труп прынесла ініцыятыва стварэння пры тэатрах маладзёжных студый. У 1998 г. такая студыя пачала працаваць пры акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа. Яе ўдзельнікі ўваходзілі ў дапаможны склад тэатра і рыхтаваліся да атрымання вышэйшай спецыяльнай адукацыі. У 2002 г. на базе 2-га курса акцёрскага факультэта Акадэміі мастацтваў была сфарміравана тэатральная студыя ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя М. Горкага [439, спр. 587, арк. 49].

У многіх тэатрах не была пераадолена таксама праблема занятасці акцёрскага персаналу. Асабліва яна была актуальна для сталічных тэатраў. У сувязі з гэтым выказваліся прапановы аб неабходнасці правядзення атэстацыі творчых кадраў тэатраў, у першую чаргу рэспубліканскіх, з мэтай аптымізацыі трупы і матэрыяльнай падтрымкі творча перспектыўных артыстаў [425].

У 2002 г. агульная колькасць моладзі ва ўстановах рэспубліканскага і абласнога падпарадкавання дасягала 42 % і характарызавалася высокім спецыяльным адукацыйным узроўнем. Асноўную частку (70 %) складалі выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і студэнты-завочнікі, 14 % мелі спецыяльную адукацыю Беларускага ўніверсітэта культуры, 16 % атрымалі падрыхтоўку ў іншых навучальных установах культуры і мастацтва. У акадэмічных і асобных абласных драматычных калектывах рэспублікі доля маладых выканаўцаў налічвала ад 29 % – у тэатры імя М. Горкага, 38 % – у тэатры імя Янкі Купалы і да 41 % – у Гомельскім абласным драматычным тэатры. Побач з гэтым 80 % творчай моладзі складала абноўленая трупа Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі. Больш за палову мастацкага складу прыходзілася на творчую моладзь у Дзяржаўным маладзёжным тэатры, Брэсцкім і Магілёўскім абласных тэатрах [439, спр. 587, арк. 48].

За перыяд 2000–2002 гг. 20 % творчай моладзі звольніліся з тэатраў. Толькі з Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача за гэты перыяд звольніліся 6 маладых артыстаў. Адна з галоўных прычын – нізкая заработная плата пры высокай вытворчай нагрузцы маладых выканаўцаў. Сярод працаваўшых маладых спецыялістаў тэатраў краіны 35 % не мелі свайго жылля, 11 % размяшчаліся ў інтэрнатах. Доля моладзі Брэсцкага абласнога драматычнага тэатра, якая пражывала ў інтэрнатах рознай ступені падпарадкавання, у 2002 г. складала 52 % [439, спр. 587, арк. 50].

Сітуацыя з творчай моладдзю ў наступныя гады палепшылася толькі ў чатырох рэспубліканскіх драматычных тэатрах. Так, у 2009 г. з 198 акцёраў і 14



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэжысёраў ва ўзросце да 31 года былі 73 акцёра і 3 рэжысёра. За перыд 2006–2008 гг. назіраўся пастаянны прыток маладых спецыялістаў. У Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі іх колькасць павялічылася з 50 у 2006 г. да 60 % у 2008 г., у тэатры імя М. Горкага адпаведна з 24,4 да 37,7 %. Для тэатра беларускай драматургіі быў характэрны высокі працэнт занятасці моладзі ў рэпертуары (88,8 % у 2008 г.), адсутнасць бягучасці кадраў (50 % трупы мела стаж працы ад 5 да 15 гадоў). З-за гэтых прычын рэпертуар адрозніваўся вялікай разнастайнасцю, шмат якія спектаклі былі адрасаваны маладзёжнай аўдыторыі, значная ўвага надавалася дзіцячым спектаклям [79, т. 4, арк. 22].

Аднак праблема рэжысёрскіх кадраў па-ранейшаму заставалася актуальнай. Нягледзячы на тое, што за перыяд 2003–2008 гг. Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў падрыхтавала 32 чалавека па спецыяльнасці «рэжысура тэатра», у тэатрах яны не заявілі пра сябе. Часам спектаклі ў Акадэміі мастацтваў станавіліся адзінымі і апошнімі паўнавартаснымі работамі. Затым па розных прычынах яны заставаліся не запатрабаванымі, выключаліся з рэжысёрскага тэатральнага працэсу [79, т. 4, арк. 26].

У працы рэспубліканскіх драматычных тэатраў з творчай моладдзю шмат праблем заставалася невырашанымі. Яны тычыліся як матэрыяльных, так і творчых пытанняў. На гэта была звернута ўвага на калегіі Міністэрства культуры ў маі 2009 г. На ёй адзначалася вельмі рэдкая практыка арганізацыі аглядаў работы маладых акцёраў і рэжысёраў, драматургаў. Рэдка практыкаваўся заказ на работы, якія прапаноўвалі маладыя рэжысёры і рэжысёры-дэбютанты.

Рашэння патрабавала праблема занятасці моладзі ў рэпертуары адпаведна з творчымі магчымасцямі. Была відавочнай нераўнамернасць занятасці як па гадах, так і па тэатрах. Калі ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Янкі Купалы ў 2006 г. працэнт занятасці маладых складаў 52,7, то ў 2008 г. – толькі 35,1 %. У той час як у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Максіма Горкага гэты паказчык узрос з 75 у 2006 г. да 97 % у 2008 г. За гэты ж перыяд у бягучым рэпертуары у 23 з 29 спектакляў былі заняты маладыя акцёры. Самі акцёры адзначалі праблему занятасці ў другім складзе.

У тэатрах працягвалася тэндэнцыя да старэння труп. Сярэдні ўзрост акцёраў у 2009 г. складаў ад 45 гадоў у тэатры беларускай драматургіі да 55 гадоў у тэатры імя Максіма Горкага. У рэспубліканскіх драматычных тэатрах 48 акцёраў і рэжысёраў, ці больш чым кожны чацвёрты, знаходзіўся ва ўзросце звыш 60 гадоў. Быў парушаны прынцып прафесійнай пераемнасці паміж старэйшым і малодшым пакаленнямі рэжысёраў. Аб гэтым сведчылі праблемы з падборам мастацкіх кіраўнікоў у тэатры імя Янкі Купалы і імя Якуба Коласа.

Крытыкі адзначалі малую колькасць у акрэслены перыяд паўнавартасных акцёрскіх работ, якія б можна было падтрымаць і адзначыць. За 2006–2008 гг. ніхто з маладых акцёраў і рэжысёраў, за выключэннем аднаго выпадку ў 2007 г. у тэатры імя Янкі Купалы, не атрымаў дзяржаўных стыпендый і грантаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іншых стымулюючых надбавак. У мастацкіх саветах тэатра беларускай драматургі і тэатры імя Максіма Горкага зусім не была прадстаўлена моладзь [79, т. 4, арк. 26].

Кіраўніцтва рэспубліканскіх драматычных тэатраў імкнулася вырашыць пытанні сацыяльнай падтрымкі маладых кадраў. За 2006–2008 гг. палепшылі жыллёвыя ўмовы 30 сем'яў, у тым ліку 9 чалавек да 31 года, 12 чалавек атрымалі службовае жыллё. Толькі за 2008 г. палепшылі жыллёвыя ўмовы 7 сем'яў тэатра імя Янкі Купалы і 4 – тэатра імя Максіма Горкага. Аднак працягвала мець патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у 2009 г. 71 сям'я, з іх асобы да 31 года – 21 чалавек [79, т. 4. арк. 28, 29].

Вострай у рэгіёнах была праблема забяспечанасці кадрамі мастакоў. Напрыклад, сярод 45 чалавек-сяброў Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага саюза мастакоў у 2007 г. 10 былі пенсіянерамі. Арганізацыя не папаўнялася маладымі мастакамі – выпускнікамі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і іншых мастацкіх ВНУ. Яны не ехалі нават у абласны цэнтр з-за адсутнасці пастаяннай работы (работы па дзяржзаказе). За 6 гадоў у Гродна прыехаў толькі адзін мастак, які сам быў родам з гэтага горада. Выхад, па меркаванні старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення БСМ, мог стаць у выглядзе аднаўлення практыкі дзяржаўных заказаў [68].

У прэсе неаднаразова ўздымалася пытанне сацыяльнай неабароненасці маладога мастака. На думку І. Кузняцовай, маладыя творца, які вымушаны зарабляць на жыццё, аплату майстэрні педагагічнай або іншай справай, а творчасцю займацца толькі ў выхадныя дні, зніжае ўзровень майстэрства [817].

Па сведчанні спецыялістаў, сацыяльная неабароненасць мастакоў нашай краіны – першапрычына таго, што таленавітыя мастакі, асабліва маладыя, з'язджаюць з радзімы. Маладая мастачка А. Белявец у артыкуле «Каму патрэбны мастакі» ў часопісе «Мастацтва» на пытанне «Ці здольна дзяржава падтрымаць мастака?» адказала наступным чынам: «Калі ў спецыфічнай нашай эканоміцы не існуюць умовы для стварэння паўнацэннага арт-рынку, дык можа варта распрацаваць адпаведнае заканадаўства, згодна з якім дапамагаць мастаку будзе выгаднай і годнай справай?» [128].

Востра стаяла праблема забяспечанасці галіны рэстаўратарамі. У краіне на пачатак 2000 г. у музеях і іншых спецыялізаваных рэстаўрацыйных фарміраваннях налічвалася 63 мастака-рэстаўратара, з якіх у г. Мінску было 43 чалавекі (у «Мінскрэстаўрацыі» – 22). Фактычна на ўсе астатнія рэгіёны заставаліся толькі 14 спецыялістаў. Мастакі-рэстаўратары ўвогуле адсутнічалі ў музеях Мінскай і Гомельскай абласцей, а таксама ў музеях рэспубліканскага падпарадкавання – Аб'яднанні дзяржаўных літаратурных музеяў, Мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой», Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, Нацыянальным гісторыка-культурным запаведніку «Нясвіж». Практычна ніводнага прафесійнага мастака-рэстаўратара не мелі музеі раённага падпарадкавання, якія складалі больш за 82 % ад агульнай колькасці му-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зейных устаноў сістэмы Міністэрства культуры. Адсутнічалі мастакі-рэстаўратары па рухомых музейных каштоўнасцях і ў спецыялізаваных абласных рэстаўрацыйных фарміраваннях, за выключэннем ДП «Мінскрэстаўрацыя». У 1991 г. была зроблена спроба распачаць падрыхтоўку мастакоў-рэстаўратараў у Мінскім мастацкім вучылішчы. З 10 чалавек, якія былі прыняты на курс, закончылі навучанне 7, і толькі 3 з іх потым працавалі па спецыяльнасці. Другі набор быў распушчаны ўжо на другім курсе. Вынікам такога падыходу да вырашэння праблемы падрыхтоўкі рэстаўратараў з’явілася тое, што з 63 дзеючых спецыялістаў прыкладна 4–5 мелі вышэйшую катэгорыю, астатнія – альбо трэцюю, альбо зусім былі не атэставанымі і напрацоўвалі навыкі і вопыт практычнай работай. З распадам СССР фактычна спынілася практыка рэгулярных стажыровак беларускіх рэстаўратараў у былых рэстаўрацыйных цэнтрах, якія знаходзіліся ў гарадах Маскве і Санкт-Пецярбургу, ва Украіне і ў Прыбалтыцы, а таксама ў далёкім замежжы. Большасць дзеючых рэстаўратараў не мелі спецыяльнай профільнай адукацыі [439, спр. 351, арк. 10–11, 13].

Даволі сур’ёзна стаяла пытанне аб кадравай палітыцы ў галіне прафесійнай музыкі. З аднаго боку, гэта праяўлялася ў наяўнасці вакантных месцаў артыстаў, а з другога – у праблеме падбору кандыдатаў на пост дырыжораў вядучых аркестраў. Паколькі станоўчае рашэнне аб поўнай укамплектацыі аркестраў шмат у чым залежала ад таго, хто кіраваў калектывам, калегія 1997 г. бачыла неабходным распрацаваць сістэму падрыхтоўкі дырыжорскіх кадраў. Яшчэ ў 1992 г. пастановай калегіі Міністэрства культуры «Аб стане і выніках дзейнасці прафесійнага мастацтва» Белдзяржфілармоніі і Дзяржаўнаму акадэмічнаму Вялікаму тэатру оперы было даручана ўвесці стажорскія дырыжорскія стаўкі ў вядучых аркестрах, на якія павінны былі залічвацца па рэкамендацыях Савета па мастацтве і мастацкіх саветаў калектываў таленавітыя творчыя людзі. Аднак да 1997 г. не было распрацавана палажэнне аб стажорах [439, спр. 145, арк. 139].

Калегія Міністэрства культуры ў 1997 г. выказвалася аб неабходнасці звярнуць самую пільную ўвагу на падрыхтоўку сваіх нацыянальных дырыжорскіх кадраў, стварэнне неабходных умоў для творчага росту і ўдасканалення прафесійнага майстэрства перспектыўнай моладзі. Як адмоўны факт разглядалася сітуацыя з кіраўніцтвам Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам дырыжора-іншаземца М. Каца [439, спр. 145, арк. 139–140].

Калегія зацвердзіла Праграму падрыхтоўкі і падтрымкі нацыянальных дырыжорскіх і рэжысёрскіх кадраў. Сярод мерапрыемстваў праграмы былі: увядзенне ў план канцэртнага сезона 1997–1998 гг. Белдзяржфілармоніі цыкла абанементных канцэртаў з удзелам прафесійных аркестравых калектываў г. Мінска і лепшых маладых рэжысёраў; стварэнне магчымасці падрыхтоўкі і паказу канцэртных праграм з вядучымі філарманічнымі калектывамі г. Мінска найбольш адораным студэнтам 3–5 курсаў кафедры аркестровага дыры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жыравання Беларускай акадэміі музыкі, правядзенне майстар-класаў па дырыжыраванні для студэнтаў з запрашннем гастралюючых дырыжораў у г. Мінску. У планах было накіраванне штогод 1–2 таленавітых маладых дырыжораў у краіны Еўропы для ўдзелу ў Міжнародных майстар-класах па розных напрамках музычнага мастацтва [439, спр. 145, арк. 201–202].

У перыяд з 1994 па 2007 г. назіралася тэндэнцыя да паступовага росту колькасці супрацоўнікаў музеяў (з 2194 да 3218). Аднак і ў гэтай сферы адчуваўся недахоп спецыялістаў – музеязнаўцаў, навуковых супрацоўнікаў з профільнай адукацыяй. У параўнанні з 1990 г. у 1994 г. у музеях застаўся толькі кожны трэці спецыяліст-музейшчык (табл. 4). Доля навуковых супрацоўнікаў з вышэйшай адукацыяй па спецыяльнасці «музейная справа» ад агульнай колькасці навуковых супрацоўнікаў і экскурсаводаў у музеях вырасла з 3,4 у 1994 г. да 10,5 % у 2002 г. Прыкладна такі ж паказчык быў і ў 2007 г. (10,4 %). Пры гэтым зменшылася доля спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй па профілі музея. Калі ў 1994 г. яны складалі 64 % ад агульнай колькасці навуковых работнікаў і экскурсаводаў, то ў 2007 г. – 54,3 %. За 2008–2010 гг. звесткі атрымаць немагчыма з-за змены справаздачнасці.

*Табліца 4.* **Колькасць навуковых супрацоўнікаў і экскурсаводаў у музеях, чал. [271; 363, с. 54; 368, с. 73; 755, с. 58]**

| Вобласць | Год | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1990 | 1992 | 1994 | 1998 | 2000 | 2002 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 |
| Брэсцкая | 108 | 92 | 90 | 116 | 75 | 85 | 96 | 94 | 94 | 102 |
| Віцебская | 85 | 122 | 153 | 190 | 184 | 196 | 214 | 219 | 223 | 239 |
| Гомельская | 49 | 63 | 72 | 92 | 88 | 76 | 118 | 109 | 139 | 147 |
| Гродзенская | 69 | 76 | 82 | 74 | 66 | 63 | 97 | 98 | 101 | 106 |
| Магілёўская | 84 | 94 | 103 | 108 | 111 | 119 | 117 | 120 | 122 | 121 |
| Мінская | 72 | 91 | 103 | 93 | 68 | 66 | 114 | 120 | 132 | 134 |
| г. Мінск | 225 | 223 | – | – | – | – | 14 | 13 | 19 | 14 |
| Рэспубліканскага падпарадкавання | – | – | 209 | 210 | 289 | 280 | 357 | 366 | 373 | 377 |
| Па краіне | 692 | 761 | 812 | 883 | 881 | 885 | 1127 | 1139 | 1203 | 1240 |

Асабліва вострa недахоп спецыялістаў адчуваўся ў Гродзенскай, Брэсцкай і Магілёўскай абласцях. Напрыклад, у 2002 г. тут працавалі адпаведна 1,1 і 2 спецыяліста з вышэйшай адукацыяй па спецыяльнасці «музейная справа». У Мінскай вобласці такіх было 9 чалавек, 15 – у Віцебскай, 7 – у Гомельскай (гл. табл. 5). У той жа час толькі ВНУ мастацтва і культуры за перыяд 1999 – 2002 гг. выпусцілі 93 спецыяліста [755, с. 93]. Куды падзеліся гэтыя кадры? Рост колькасці спецыялістаў з вышэйшай музейнай адукацыяй склаў для ўстаноў рэспубліканскага падпарадкавання за гэты перыяд 51 чалавек. У той час як у іншых абласцях назіралася адмоўная дынаміка (37 спецыялістаў у 1998 г. і 35 – у 2002 г.). Неабходна ўлічыць, што спецыялістаў па музейнай справе рыхтавалі і ў некаторых класічных універсітэтах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найлепш становішча выглядала ў Віцебскай вобласці. За 1990–2007 гг. колькасць навуковых супрацоўнікаў і экскурсаводаў тут павялічылася ў 3 разы. Пры гэтым, калі ў 1990 г. у музеях вобласці не было ніводнага спецыяліста з вышэйшай спецыяльнай адукацыяй, то ў 2007 г. іх налічвалася 27 чалавек (кожны адзінаццаты). Лепш справы былі ў музеяў г. Мінска (кожны другі), Музеяў рэспубліканскага падпарадкавання (кожны шосты) і Мінскай вобласці (кожны дзявяты).

*Табліца 5.* **Колькасць навуковых супрацоўнікаў і экскурсаводаў з вышэйшай адукацыяй у музеях, чал. [271; 363, с. 54; 368, с. 73; 755, с. 58]**

| Вобласць | У тым ліку з вышэйшай адукацыяй | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Па музейнай справе | | | | | | | | | Па профілі музея | | | | | | | | |
| | Год | | | | | | | | | | | | | | | | | |
| | 1990 | 1992 | 1994 | 1998 | 2002 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 1990 | 1992 | 1994 | 1998 | 2002 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 |
| Брэсцкая | 1 | – | – | 15 | 1 | 1 | 1 | 1 | 5 | Няма звестак | 71 | 69 | 69 | 62 | 67 | 70 | 67 | 65 |
| Віцебская | – | – | 2 | 8 | 15 | 12 | 11 | 17 | 21 | | 69 | 82 | 101 | 119 | 133 | 135 | 147 | 156 |
| Гомельская | 3 | – | 2 | 6 | 7 | 7 | 6 | 8 | 9 | | 37 | 33 | 47 | 30 | 47 | 52 | 39 | 39 |
| Гродзенская | 1 | – | – | 1 | 1 | 5 | 4 | 4 | 5 | | 67 | 65 | 61 | 52 | 69 | 69 | 75 | 77 |
| Магілёўская | 1 | 1 | – | 4 | 2 | 5 | 4 | 5 | 8 | | 48 | 63 | 52 | 54 | 55 | 50 | 49 | 58 |
| Мінская | 2 | 4 | 4 | 3 | 9 | 12 | 14 | 15 | 15 | | 50 | 58 | 56 | 29 | 46 | 62 | 48 | 57 |
| г. Мінск | 85 | 35 | – | – | – | 6 | 5 | 9 | 6 | | 145 | – | – | – | 8 | – | 10 | – |
| Рэспубліканскага падпарадкавання | – | – | 22 | 5 | 58 | 46 | 62 | 60 | 60 | | – | 151 | 171 | 171 | 206 | 214 | 221 | 231 |
| Па краіне | 93 | 40 | 30 | 42 | 93 | 94 | 107 | 119 | 129 | | 487 | 521 | 557 | 517 | 631 | 651 | 656 | 673 |

Некалькі нечаканымі выглядаюць паказчыкі колькасці працуючай моладзі (да 30 гадоў) ва ўстановах культуры – у перыяд 2000–2008 гг. ён вагаўся на ўзроўні 25 % работнікаў. У той жа час у сферах адукацыі і аховы здароўя назіралася зніжэнне долі моладзі. Так, за 2000–2009 гг. зменшылася колькасць моладзі (да 30 гадоў) больш чым на 6 % (з 26,6 да 20,4 %), у ахове здароўя – больш чым на 4 % (з 24,2 да 19,9 %). Пры гэтым у галіне культуры быў высокі паказчык моладзі (да 31 года), якая займала кіруючыя пасады. У 2010 г. на пасадах кіраўнікоў працавалі 13,3 % ад агульнай колькасці работнікаў адпаведнай катэгорыі, занятых у галіне. Гэта значна вышэй, чым у адукацыі і ахове здароўя (адпаведна 7,5 % і 8,5 %). Сярод спецыялістаў моладзі было 35,5 %, сярод іншых спецыялістаў – 54,7 %. Апошнія лічбы значна вышэй за паказчыкі ў галіне адукацыі (адпаведна 26,6 і 28,3 %) і аховы здароўя (28,1 і 16,6 %). Побач з гэтым у галіне расла доля работнікаў, старэйшых за працаздольны ўзрост. Пачынаючы з 2000 г. назіраўся стабільны рост гэтага паказчыка – ад 11,3 % у 2000 г. да 14,9 % у 2010 г. (табл. 6). У апошнім выпадку лічбы вельмі падобныя да лічбаў галіны адукацыі (14,6 %) і аховы здароўя (14,9 %) [776, с. 116, 118, 120].

У перыяд 2002–2005 гг. супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры быў праведзены маніторынг «Сацыяльныя характары-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

стыкі, прафесійная культура і мабільнасць кадраў культуры». 78,7 % рэспандэнтаў пагадзілася з тым, што змест іх працы поўнасцю ці ў дастатковай ступені адпавядае ўзроўню іх кваліфікацыі. З гэтай лічбы 32,3 % лічылі сябе поўнасцю «на сваім месцы» [743, с. 11].

Вынікі апытання паказалі, што большасць спецыялістаў атрымалі адукацыю ва ўстановах галіны – 76,5 %. У навучальных установах іншага профілю атрымалі адукацыю 21 % апытаных (8,9 % – сярэднюю спецыяльную адукацыю, 11,7 % – вышэйшую). Самы значны працэнт работнікаў, якія атрымалі адукацыю ў іншай сферы, назіраўся сярод работнікаў музеяў – 65,7 %. Значная доля такіх людзей была сярод работнікаў клубных устаноў – 31,9 %. Сярод бібліятэчных работнікаў гэты паказчык складаў 18,3 % [743, с. 11].

*Табліца 6.* **Кадры культуры [776, с. 79–80; 119, 133–134, 194–195]**

| Паказчык | Год | | |
|---|---|---|---|
| | 2000 | 2005 | 2010 |
| Агульная колькасць работнікаў | 75084 | 83537 | 81935 |
| мужчын | 21525 (28,7%) | 23937 (28,7%) | 22561 (27,5%) |
| работнікаў, старэйшых за працаздольны ўзрост | 8476 (11,3%) | 9504 (11,4%) | 12181 (14,9%) |
| з вышэйшай і сярэдне-спецыяльнай адукацыяй | 50831 (67,7%) | 57379 (68,7%) | 56536 (69,0%) |
| Суадносіны прыём/звальненне, % | 112,6 | 107,4 | 99,5 |

У 2006 г. у цэлым па галіне культуры і мастацтва, якая падпарадкавана Міністэрству культуры, 42,3% работнікаў мелі вышэйшую адукацыю, 45,9% – сярэднюю спецыяльную [71, арк. 43]. У 2010 г. гэтыя паказчыкі складалі адпаведна 46 і 43 % [104, с. 84].

Па адукацыйным узроўні кіраўнікоў галіна культуры значна саступае ахове здароўя і адукацыі. У 2010 г. толькі 54,1 % кіраўнікоў, занятых у сферы культуры, мелі вышэйшую адукацыю. У ахове здароўя гэты паказчык складаў 77,7 %, адукацыі – 80,2 %. У той жа час у галіне быў значны працэнт кіраўнікоў з агульнай сярэдняй і агульнай базавай (уключаючы агульную пачатковую) адукацыяй – 7,4 % (у сярэднім па краіне – 4,1 %). Па гэтым паказчыку сфера культуры была на адным узроўні з сельскай гаспадаркай (7,6 %), значна саступаючы сферам адукацыі і аховы здароўя (адпаведна 3,7 і 2,3 %) [104, с. 144].

Важнай характарыстыкай кадравага складу з'яўляецца стаж працы. У сярэдзіне 2000-х гг. 25 % работнікаў працавалі ў галіне не з самага пачатку сваёй прафесійнай кар'еры. Большая за ўсё доля такіх людзей была сярод работнікаў клубных устаноў (26,8 %), бібліятэк (25,5 %), выкладчыкаў навучальных устаноў пачатковага ўзроўню (20,7 %). Побач з гэтым амаль палова (45,5 %) працавалі ў сферы культуры звыш 15 гадоў. Маладыя спецыялісты са стажам да 5 гадоў складалі 11,4 % ад агульнай колькасці работнікаў [743, с. 12].

Дадзеныя апытання паказалі, што большая частка работнікаў галіны паходзілі з сямей служачых і рабочых, што пражывалі ў невялікіх гарадах, гарад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скіх пасёлках і райцэнтрах, – 30,5 % і 17,8 % апытаных адпаведна. Некалькі менш было выхадцаў з сем'яў сельскіх рабочых і служачых з сяла (адпаведна 23,3 і 8,8 %). І зусім няшмат выхоўваліся ў сем'ях служачых і рабочых сталіцы і абласных гарадоў (адпаведна 14 і 4,1 %) [743, с. 12–13].

Большасць выпускнікоў (60 %) па заканчэнні вучобы зноў вярталіся на былое месца жыхарства ці ў месца падобнага тыпу пасялення. Толькі нязначная іх частка ехалі пасля вучобы ў больш дробныя вёскі і гарады – 16 %. Некалькі болей перасяляліся ў больш буйныя пасяленні – 24 %, у асноўным гэта былі выпускнікі з сяла (64,1 %) і невялікіх гарадоў (23 %) [743, с. 13].

Абагульнены сацыяльны партрэт работніка сферы культуры сярэдзіны 2000-х гг. выглядаў наступным чынам: жанчына ва ўзросце ад 30 да 50 гадоў з сярэдняй спецыяльнай ці вышэйшай адукацыяй, якая паходзіць (пераважна) з сям'і служачых, што пражывала ў невялікіх гарадах ці на сяле [743, с. 13].

У галіне быў стабільным працэнт адтоку кадраў. Штогод кадравы склад абнаўляўся прыкладна на чвэрць. Гэты паказчык быў значна вышэйшы, чым аналагічны ў адукацыі, і прыкладна адпавядаў паказчыкам у сельскай гаспадарцы [776, с. 197].

Па выніках згаданага вышэй апытання ў сярэдзіне 2000-х гг. 48,7 % рэспандэнтаў былі ў цэлым задаволены сваёй працай і не збіраліся яе мяняць, 28,6 % апытаных адказалі, што магчыма зменяць яе ў бліжэйшыя 3–5 гадоў. І толькі 4,5 % упэўнена заявілі, што збіраюцца гэта зрабіць. Прыкладна кожны шосты (16,9 %) увогуле аб гэтым не задумваўся. Адначасова 30,4 % рэспандэнтаў адзначылі, што калі б ім прадставілася магчымасць, то яны б змянілі прафесію. Пры гэтым большасць з іх (67,1 %) бачыла сябе ў іншай галіне.

Сярод прычын, чаму ўзнікла жаданне змяніць месца працы, называўся нездавальняючы ўзровень заработнай платы (56,4 % апытаных), адсутнасць перспектыў прафесійнага росту (13,3), магчымае скарачэнне штатаў (10,5), дрэнныя адносіны ў калектыве (9,0), новая работа (8,6), пераезд на новае месца жыхарства (5,6), стан здароўя (3,4), выхад на пенсію (3,4), закрыццё ўстановы (2,2 %). Сярод іншых прычын, якія склалі ў суме 9,9 % адказаў, былі названы: вялікая нагрузка, якая не кампенсавалася заробкам, слабая матэрыяльная база ўстаноў культуры [743, с. 14].

Два чалавека з пяці былі поўнасцю незадаволены сваім заробкам, 55 % – не зусім задаволены. Толькі 2 % былі задаволены.

Нізкі матэрыяльны ўзровень жыцця не дазваляў работнікам галіны поўнасцю аддавацца сваёй асноўнай працы, адцягваючы на «здабыванне грошаў» у іншых месцах. Апытанне паказала, што большасць рэспандэнтаў пастаянна ці час ад часу падпрацоўвалі (64 %). Некаторыя працавалі ў некалькіх месцах адначасова (28 % ад маючых дадатковы заробак). Дадатковы даход на асноўным месцы працы атрымлівалі 16 % апытаных (з іх 34,8 % пастаянна). Большасць (84 %) знаходзілі прыпрацоўку па-за працоўным месцам [743, с. 15–16].

Такім чынам, кадравая палітыка ў галіне культуры была накіравана на аптымізацыю структуры галіны, што ў асобных выпадках прыводзіла да ска-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рачэння работнікаў. У вывучаемы перыяд у галіне культуры адбылося некалькі істотных скарачэнняў колькасці работнікаў (у 1995 і 2002 гг.).

Як сведчыць статыстычны аналіз, тры чвэрці работнікаў складалі жанчыны ва ўзросце ад 30 да 50 гадоў. У апошнія гады была адзначана тэндэнцыя да павелічэння долі работнікаў пенсійнага ўзросту. Адначасова амаль кожны чацвёрты работнік галіны ў канцы 2000-х гадоў быў ва ўзросце да 30 гадоў.

Дзяржавай здзяйсняліся крокі па павышэнні якаснага ўзроўню кадраў. За пяць гадоў лічба спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй узрасла на амаль на 4 % (з 42,3 % у 2006 г. да 46 % у 2010 г.).

Штогод кадравы склад галіны абнаўляўся прыкладна на чвэрць. Асноўнай прычынай звальненняў была незадаволенасць нізкім узроўнем заработнай платы.

Асобныя сферы галіны ў вывучаемы перыяд адчувалі востры недахоп спецыялістаў. Гэта датычылася ў першую чаргу тэатральнай і музейнай справы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глава

# 3 РОЛЯ ГРАМАДСКІХ АБ'ЯДНАННЯЎ У РЭАЛІЗАЦЫІ КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ

Новая сітуацыя пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя паспрыяла з'яўленню шматлікіх грамадскіх аб'яднанняў, якія пачалі актыўна ўплываць на развіццё культурных працэсаў у Беларусі. Менавіта ў перыяд трансфармацыі сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сістэмы дзяржавы значэнне грамадскай актыўнасці насельніцтва, якая праяўляецца ў форме аб'яднання на аснове падобных норм і каштоўнасцей, значна ўзрастае. У гэты час актуальным становіцца актывізацыя працэсаў самарганізацыі і самакіравання грамадства, самастойны пошук ім шляхоў выйсця з цяжкай сітуацыі, абумоўленай трансфармацыйнымі працэсамі. Шмат праблем, якія дзяржава не можа вырашыць праз свае структуры, аказваюцца ў полі зроку грамадскіх аб'яднанняў.

З афармленнем у канцы 90-х гадоў XX ст. новай канцэпцыі ролі культуры як сродку развіцця грамадства («культура – крыніца чалавечага развіцця») усё больш прыхільнікаў знаходзіла ўяўленне аб тым, што прыняцце рашэнняў у сферы культурнай палітыкі знаходзіцца не толькі ў кампетэнцыі дзяржаўных структур. Папулярнасць набывае канцэпцыя «крэатыўнага кіравання». Адпаведна вызначэння Р. Мітчэл, «на мове менеджмента гэта азначае, што кіраванне здзяйсняецца праз структуры існуючых сетак, форумы, інстытуты і адміністрацыйныя сістэму, што зусім не азначае «бюракратычны» стыль рэалізацыі палітыкі, а мае на ўвазе гнуткасць і адкрытасць для далейшых інавацыяў» [296, с. 275].

Амаль ва ўсіх еўрапейскіх краінах можна знайсці прыклады далучэння насельніцтва да працэсу прыняцця рашэнняў у культуры: выкарыстанне незалежных экспертаў, стварэнне аўтаномных (незалежных) устаноў, якія займаюцца падзелам сродкаў на культуру, заснаванне таварыства прыхільнікаў, якія існуюць пры культурных установах, і г. д.

У адным са сваіх дакладаў у 1995 г. намеснік міністра культуры і друку Рэспублікі Беларусь У. Рылатка выказаў думку, што ў Беларусі ажыццяўляецца працэс «актыўнага фарміравання новых суб'ектаў культурнай палітыкі» [206, с. 12]. У першую чаргу гэта праяўлялася ў актывізацыі творчай дзейнасці нацыянальных суполак. Першай у шэрагу іншых функцыяй дзяржавы ў культурнай сферы ён назваў збалансаванне культурных інтарэсаў усіх сацыяльных слаёў, груп, суб'ектаў культуры і культурнай палітыкі.

Адзначаныя вышэй змены і тэндэнцыі ў развіцці сусветнай супольнасці знайшлі сваё адлюстраванне ў *Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага сацы-*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*яльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2020 г.* (далей – НСУР-2020). Стратэгія была распрацавана ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўным прагназаванні і праграмах сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь», улічвала важнейшыя праграмныя дакументы, прынятыя на той час у Рэспубліцы Беларусь, новыя міжнародныя пагадненні, у тым ліку Дэкларацыю тысячагоддзя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, прынятую Генеральнай Асамблеяй 8 верасня 2000 г., Палітычную дэкларацыю і План выканання рашэнняў Сусветнай сустрэчы на вышэйшым узроўні па ўстойлівым развіцці ў Ёханэсбургу (верасень 2002 г.) і інш.

У Нацыянальнай стратэгіі ў якасці важнейшых фактараў устойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь, палітычнай і сацыяльнай стабільнасці называецца ўмацаванне дэмакратычных прынцыпаў жыцця краіны і заснаванае на гэтай базе фарміраванне грамадзянскай супольнасці [445, с. 170].

Грамадзянская супольнасць – у вызначэнні Нацыянальнай стратэгіі – сукупнасць арганізацый, аб'яднанняў грамадзян, а таксама прававых нормаў, каштоўнасных установак, ідэй і ўяўленняў, праз якія рэалізуюцца групавыя і прыватныя інтарэсы членаў грамадства ва ўзаемадзеянні з органамі дзяржаўнай улады. Такімі структурамі з'яўляюцца няўрадавыя, рэлігійныя арганізацыі, прафесійныя саюзы, палітычныя партыі, грамадскія ініцыятывы і розныя нефармальныя групы па інтарэсах [445, с. 170].

Нацыянальная стратэгія адзначае абавязак арганізацый грамадзянскай супольнасці ўмацоўваць прававую і інстытуцыйную прастору ў напрамку ўдасканалення сярод іншага форм грамадскага кантролю над яго дзяржаўным і прыватным сектарамі эканомікі, функцыянавання свабодных і незалежных сродкаў масавай інфармацыі [445, с. 170–171].

Важнейшай мэтай НСУР-2020 з'яўляецца стварэнне ўмоў, пры якіх кожны грамадзянін, сацыяльная група і арганізацыя будуць мець магчымасць удзельнічаць у *працэсе выпрацоўкі і прыняцця* (выдзелена намі. – *Д. К.*) дзяржаўных рашэнняў, атрымліваць поўную інфармацыю аб наступствах рэалізацыі прынятых рашэнняў, ацэньваць іх уздзеянне на структуры грамадзянскай супольнасці, дзейнасць сацыяльна-палітычных інстытутаў.

Агульнымі задачамі ўсіх арганізацый грамадзянскай супольнасці Нацыяльная стратэгія называе:

распрацоўку механізмаў, якія дазваляюць няўрадавым арганізацыям, палітычным партыям, прафсаюзам і іншым арганізаваным групам насельніцтва адыгрываць паўнавартасную ролю ў працэсе пабудовы грамадзянскай супольнасці ў краіне, узаемадзейнічаць з дзяржаўнымі структурамі па асноўных пытаннях развіцця асобы, грамадства і дзяржавы;

узаемадзеянне структур грамадзянскай супольнасці з вышэйшымі органамі дзяржаўнай улады ў іх сумеснай дзейнасці па рэалізацыі асноўных правоў і свабод грамадзян;

распрацоўка механізмаў, якія дазваляюць структурам грамадзянскай супольнасці мэтанакіравана і эфектыўна ўдзельнічаць у працэсе забеспячэння ўстойлівага развіцця і экалагічнай бяспекі [445, с. 171].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аб важнай ролі культуры ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці ў Беларусі гаварыў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь на нарадзе «Аб мерах па рашэнню праблем развіцця культуры і мастацтва» ў лютым 2001 г.: «Развіццё грамадскіх інстытутаў, стварэнне грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў – усё гэта вызначае сучасны воблік Беларусі. У гэтых працэсах найбольшую актыўнасць праяўляе творчая інтэлігенцыя» [386].

Аб дзяржаўна-грамадскім партнёрстве шмат гаварылася ў Пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Нацыянальнаму сходу і беларускаму народу ў 2009 г. Была звернута ўвага на неабходнасць грамадскім аб'яднанням імкнуцца да ўстанаўлення балансу сваіх інтарэсаў і інтарэсаў дзяржавы. Адзначалася неабходнасць эфектыўнага выкарыстання патэнцыялу культуры для фарміравання сацыяльна актыўнай асобы [653].

Абавязак дзяржаўных органаў ва ўзаемадзеянні з грамадскімі аб'яднаннямі ўдасканальваць сістэму сацыяльных, арганізацыйна-прававых і эканамічных гарантый развіцця мастацтва і культуры, фарміраваць сістэму прадпрыемстваў і ўстаноў мастацтва і культуры, весці падрыхтўку кваліфікаваных кадраў, ствараць стымулы мастацкай творчасці быў замацаваны артыкулам 5 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб культуры» (1991 г.) [24].

Закон, які рэгуляваў прынцыпы стварэння, дзейнасці, віды грамадскіх яб'яднанняў быў прыняты яшчэ ў 1994 г. [568]. Пазней у яго уносіліся змены і дапаўненні (1995, 1999, 2001, 2003 гг.)[1]. У 2005 г. Закон «Аб грамадскіх аб'яднаннях» быў прыняты ў новай рэдакцыі [473].

Адпаведна закону, грамадскае аб'яднанне (ГА) з'яўлялася добраахвотным аб'яднаннем грамадзян, якія ў вызначаным заканадаўствам парадку яб'ядналіся на аснове агульнасці інтарэсаў для сумеснай рэалізацыі грамадзянскіх, сацыяльных, культурных і іншых правоў.

Закон не распаўсюджваўся на палітычныя партыі, прафесійныя саюзы, рэлігійныя арганізацыі, іх саюзы (асацыяцыі), рэспубліканскія дзяржаўна-грамадскія аб'яднанні, органы тэрытарыяльнага самакіравання, іншыя грамадскія фарміраванні, парадак стварэння і дзейнасці якіх вызначаўся адпаведнымі заканадаўчымі актамі.

Закон «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» (2004) (арт. 4) суб'ектамі культурнай дзейнасці вызначыў: работнікаў культуры, іншых фізічных асоб, арганізацыі культуры, суб'ектаў творчай дзейнасці (творчыя работнікі і іншыя фізічныя асобы, якія ажыццяўляюць творчую дзейнасць, калектывы мастацкай творчасці), дзяржаўныя органы, органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, навукова-даследчыя ўстановы і ўстановы адукацыі ў галіне культуры, іншых юрыдычных асоб (у асобных выпадках – падраздзяленні юрыдычных асоб, у тым ліку адасобленыя).

Уключэнне ў артыкул закона палажэння аб «іншых юрыдычных асобах» патрабуе некаторага тлумачэння. Адпаведна Грамадзянскаму Кодэксу Рэспуб-

[1] Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 95, 2/102; 2001 г., № 63, 2/779; 2003 г., № 74, 2/962.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лікі Беларусь [184] (арт. 46, ч. 1), «юрыдычнымі асобамі могуць быць арганізацыі, якія праследуюць атрыманне прыбытку ў якасці асноўнай мэты сваёй дзейнасці і (ці) размеркаванне атрыманага прыбытку паміж удзельнікамі (камерцыйныя арганізацыі), ці тыя, якія не маюць атрыманне прыбытку ў якасці такой мэты і не размяркоўваюць прыбытак паміж удзельнікамі (некамерцыйныя арганізацыі)».

Адпаведна кодэксу, некамерцыйныя арганізацыі могуць здзяйсняць прадпрымальніцкую дзейнасць настолькі, наколькі яна неабходна для іх статутных мэт, дзеля якіх яны створаны, і адпавядае гэтым мэтам. Для асобных форм некамерцыйных арганізацый заканадаўчымі актамі маглі быць устаноўлены правіла, якія прадугледжвалі іх права на заняцце прадпрымальніцкай дзейнасцю толькі шляхам стварэння (удзелу ў стварэнні) камерцыйных арганізацый (арт. 46, ч. 3).

Апошняе палажэнне ўтрымлівалася ў рэдакцыі «Закона аб грамадскіх аб'яднаннях» 2005 г. [473], які істотна абмежаваў магчымасць ГА займацца вытворча-гаспадарчай дзейнасцю. У рэдакцыі закона 1996 г. за ГА было прызнана права здзяйсняць вытворча-гаспадарчую дзейнасць, якая накіравана на вырашэнне статутных мэт і задач. Для шмат якіх ГА менавіта прыбытак ад гаспадарчай дзейнасці з'яўляўся фінансавай асновай існавання [383].

Кодэкс вызначыў формы некамерцыйных арганізацый: спажывецкія кааператывы, грамадскія ці рэлігійныя арганізацыі (аб'яднанні), якія фінансуюцца ўласнікам устаноў, дабрачынных і іншых фондаў, «а таксама ў іншых формах, якія прадугледжаны заканадаўчымі актамі» (арт. 46, ч. 2). Дапускалася стварэнне аб'яднанняў некамерцыйных арганізацый у форме асацыяцый і саюзаў (арт. 46, ч. 4). Больш падрабязна пытанні некамерцыйных арганізацый былі разгледжаны ў параграфе 5 кодэкса.

Артыкулы 118 і 119 Грамадзянскага кодэкса прысвечаны дзейнасці такой формы некамерцыйных арганізацый, як фонд. Палажэнні артыкулаў прыведзены ў адпаведнасць з палажэннямі Указа Прэзідэнта ад 1 чэрвеня 2005 г. № 302 «Аб некаторых мерах па ўпарадкаванню дзейнасці фондаў» [466]. Пад фондам разумелася некамерцыйная арганізацыя, якая не мае сяброўства, заснаваная грамадзянамі (грамадзянінам) і (ці) юрыдычнымі асобамі (юрыдычнай асобай) на аснове добраахвотных маёмасных складак, якая мела сацыяльныя, культурныя, адукацыйныя, навуковыя мэты, садзейнічанне развіццю фізкультуры і спорту ці іншыя грамадска карысныя мэты, якія пазначаны ў статуце фонду» (ч. 1 арт. 118).

З мэтай больш шырокага ўдзелу творчай інтэлігенцыі ў правядзенні дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры і мастацтва ў 2000 г. быў створаны *Грамадскі Савет па праблемах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь* [609]. Ідэя аб яго стварэнні была выказана ў час Парламенцкіх слуханняў па пытанні «Дзяржаўная нацыянальная праграма "Культура" і ўдасканаленне заканадаўчай базы галіны ў Рэспубліцы Беларусь» 29 чэрвеня 1998 г. [439, спр. 222, арк. 192]. Савет разглядаўся як пастаянна дзейнічаючы

кансультатыўны орган, які інфармуе Урад Рэспублікі Беларусь аб працэсах, што адбываліся ў галіне культуры і мастацтва. Ён павінен быў забяспечыць узаемадзеянне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь з арганізацыямі і дзеячамі культуры і мастацтва. Сярод асноўных задач савета была дзейнасць па падрыхтоўцы прапаноў па вызначэнні напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры і мастацтва і мер па яе рэалізацыі, удзел у падрыхтоўцы праектаў нарматыўных і прававых актаў па пытаннях культуры і мастацтва, прыцягненне ва ўстаноўленным парадку творчых саюзаў, грамадскіх аб'яднанняў, фондаў, юрыдычных і фізічных асоб да рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры і мастацтва, удзел у падрыхтоўцы прапаноў Урада Рэспублікі Беларусь па пытаннях сацыяльнай абароны работнікаў культуры і мастацтва. Арганізацыйнае забеспячэнне дзейнасці савета здзяйсняла Міністэрства культуры. Пасяджэнні павінны былі адбывацца не радзей аднаго разу ў квартал. Члены савета мелі права прымаць удзел у разглядзе адпаведнымі рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання пытанняў культуры і мастацтва.

Звестак аб канкрэтнай дзейнасці згаданага савета знайсці не атрымалася. У 2002 г. яго статус быў паніжаны – Рэспубліканскі грамадскі савет пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь. Задачы засталіся амаль цалкам тыя ж [439, спр. 585, арк. 222]. У Палажэнні аб савеце адзначалася, што ён з'яўляецца пастаянна дзеючым кансультацыйным органам, якія забяспечвае ўзаемадзеянне Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з арганізацыямі культуры і мастацтва, мясцовымі саветамі, грамадскімі арганізацыямі. Сябры савета маглі ўдзельнічаць у рабоце калегіі Міністэрства. Сярод першапачатковага складу савета ў 40 чалавек прадстаўнікоў творчых саюзаў было толькі тры – старшыня ГА «Беларускі саюз кампазітараў», старшыня ГА «Беларускі саюз тэатральных дзеячаў», прэзідэнт Асацыяцыі грамадскіх аб'яднанняў «Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў» [439, спр. 585, арк. 222а–223].

У лістападзе 2010 г. была прынята пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб стварэнні Рэспубліканскага грамадскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Як і папярэднікі, савет вызначаўся як пастаянна дзеючы кансультатыўны орган, які забяспечвае ўзаемадзеянне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання, арганізацый культуры, грамадскіх аб'яднанняў. А мэта яго стварэння была вызначана як «забеспячэнне больш шырокага ўдзелу творчай інтэлігенцыі ў ажыццяўленні дзяржаўнай культурнай палітыкі, аб'ектыўнай ацэнкі праблемных пытанняў і распрацоўкі канкрэтных мер па іх вырашэнні, дзейнасці тэатральных, музычных і іншых калектываў мастацкай творчасці і арганізацый культуры» [38].

Праект некалькі разоў праходзіў узгадненне ў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Упраўленне сацыяльна-культурнай сферы гэтага органа дзяржаўнага кіравання выказвалася за тое, каб ствараемы грамадскі савет прадстаўляў сабой «пляцоўку для грамадскага абмеркавання праблем развіцця



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры, выпрацоўкі канструктыўных прапаноў па іх рашэнні». Адзначалася, што «Савет ствараецца не для прэзентацыйных метаў, а для практычнай дзейнасці. У яго складзе магчыма прысутнасць людзей з рознымі поглядамі, але пры гэтым агульны настрой членаў савета павінен быць канструктыйным, а іх прапановы заклікананы дапамагаць рэалізацыі культурнай палітыкі, а не ісці ўразрэз з ёю». Пры абмеркаванні асабістага складу выказвалася меркаванне аб тым, каб савет быў «больш кампактным і складаўся з аўтарытэтных, падзяржаўнаму настроеных дзеячаў культуры і мастацтва, а не выпадковых і адыёзных фігур» [82, т. 11, арк. 57].

Прадстаўнікі творчых саюзаў увайшлі ў створаны ў 2004 г. адпаведна з пратаколам даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дадзеных 17 снежня 2003 г. на сустрэчы з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі, Аўтарскі савет пры Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве інтэлектуальнай уласнасці [545].

*Прыцягненне грамадскасці да прыняцця рашэнняў* атрымала прававое забеспячэнне артыкулам 13 Закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» рэдакцыі 2004 г. У ім адзначаецца: «дзяржаўныя органы ажыццяўляюць рэгуляванне і кіраванне ў галіне культуры ва ўзаемадзеянні з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, а таксама творчымі саюзамі і іншымі грамадскімі арганізацыямі (аб’яднаннямі), якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць. З мэтай стварэння арганізацыйных асноў узаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання ў галіне культуры і грамадскіх арганізацый (аб’яднанняў), якія ажыццяўляюць культурную дзейнасць, дзеячаў культуры і мастацтва, іншых суб’ектаў культурнай дзейнасці пры дзяржаўных органах могуць стварацца грамадскія саветы і іншыя кансультатыўныя органы» [46].

Юрыдычная магчымасць удзелу грамадскіх аб’яднанняў у справе аховы гісторыка-культурнай спадчыны была гарантавана артыкулам 4 новага Закона «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» [9], прынятага ў 2006 г. Гэтыя суб’екты сярод іншага атрымалі права аказваць дзяржаўным органам садзейнічанне ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны; ажыццяўляць грамадскі кантроль за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны; уносіць у дзяржаўныя ўстановы прапановы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

22 кастрычніка 2008 г. было прынята Палажэнне аб парадку ажыццяўлення грамадскімі аб’яднаннямі грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны [608]. Такі кантроль павінен быў здзяйсняцца шляхам удзелу прадстаўнікоў рэспубліканскіх грамадскіх аб’яднанняў у складзе грамадскайназіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Камісія стваралася з дзесяці прадстаўнікоў зарэгістраваных у вызначаным парадку рэспубліканскіх грамадскіх аб’яднанняў, статутнай мэтай ці прыярытэтным напрамкам дзейнасці якіх з’яўлялася ахова гісторыка-культурнай спадчыны, і прадстаўніка Міністэрства культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цяжка дакладна вызначыць ***колькасць грамадскіх арганізацый***, якія ў сваёй дзейнасці займаліся ў вывучаемы перыяд культурнымі праектамі[1]. Культурная дзейнасць была ўнесена ў статуты не толькі творчых саюзаў, але і маладзёжных, жаночых, дзіцячых арганізацый. Большасць грамадскіх аб'яднанняў Беларусі здзяйсняла сваю дзейнасць адначасова ў некалькіх напрамках.

Па дадзеных Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, на 1 студзеня 2011 г. у краіне было зарэгістравана 2325 грамадскіх аб'яднанняў.

Паводле інфармацыі базы дадзеных БРГА «Аб'яднаны шлях» можна вызначыць асноўныя напрамкі дзейнасці грамадскіх аб'яднанняў (табл. 1).

*Табліца 1.* **Размеркаванне грамадскіх аб'яднанняў Беларусі па некаторых напрамках дзейнасці, % (месца)**

| Напрамак дзейнасці ГА | Год | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 1998 | 2000 | 2004 | 2010 |
| Адукацыя, асвета, выхаванне | 9,7 (6) | 6,0 (6) | 17,4 (3) | 18,7 (4) |
| Дабрачыннасць | – | 11,0 (4) | 17,2 (4) | 20,3 (3) |
| Моладзевы, дзіцячы напрамак | 9,5 (8) | 5,1 (9) | 7,8 (8) | 10,5 (7) |
| Сацыяльная абарона, рэабілітацыя | 5,8 (12) | 14,7 (2) | 22,9 (1) | 27,4 (2) |
| Мастацтва, культура | 10,8 (5) | 15,1 (1) | 12,0 (6) | 15,0 (6) |
| Спорт, адпачынак, турызм | 15,4 (3) | 13,8 (3) | 19,4 (2) | 28,3 (1) |
| Чарнобыльскія арганізацыі | 20,8 (1) | 3,7 (11) | 4,5 (13) | 4,9 (17) |
| Арганізацыі нацыянальных меншасцей | 15,4 (2) | 3,4 (12) | 4,4 (14) | 5,6 (13) |

Значнае скарачэнне колькасці ГА, якія займаліся чарнобыльскімі праблемамі (у 2000 г. іх налічвалася болей чым у 5 разоў менш у параўнанні з 1998 г.) звязана з рэгламентацыяй па напрамках і відах дзейнасці, якая была ўведзена пры перарэгістрацыі ГА ў 1999 г.

У 2010 г. на трэцім месцы апынуліся ГА, якія займаліся дабрачыннай дзейнасцю. У 1998 г. дабрачыннасць як напрамак асобна не выдзяляўся, бо колькасць арганізацый дадзенай накіраванасці была нязначнай.

Адметна, што доля ГА, у якіх як асноўныя напрамкі дзейнасці былі заяўлены мастацтва і культура, заставалася стабільнай. Нават у 2000 г. гэты напрамак займаў першае месца. У 2004 г. ён перамясціўся на шостае месца і заставаўся там і ў 2010 г.

Аб пашырэнні грамадскай ініцыятывы па вырашэнні пытанняў развіцця культуры ў рэгіёнах краіны сведчыць павелічэнне колькасці менавіта рэгіянальных арганізацый. Па інфармацыі рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Аб'яднаны шлях», у 2005 г. працэнт грамадскіх аб'яднанняў, якія ў сваіх статутных мэтах вызначалі пытанні развіцця культуры і мастацтва, па абласцях

[1] У краіне вяліся некалькі рэестраў грамадскіх аб'яднанняў. Рэестры мясцовых ГА вялі ўпраўленні юстыцыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта і рэгіянальных абласных выканаўчых камітэтаў; рэестр рэспубліканскіх і міжнародных ГА – Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Адзінага рэестра не існавала, што не спрыяла збору інфармацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выглядаў наступным чынам: Віцебская вобласць – 14,58 %, Гродзенская – 17,5, Брэсцкая – 10,09, Мінская вобласць – 14,48, г. Мінск – 11,98 % [272].

Дынаміка трэцяга сектара ўключае не толькі працэс стварэння арганізацый, але і іх рэарганізацыю ці ліквідацыю. За перыяд за 2003–2005 гг. судамі краіны былі ліквідаваныя 157 ГА, а 190 прынялі рашэнне аб самаліквідацыі па патрабаванні органаў юстыцыі. Увогуле за гэтыя тры гады зачынілася 347 грамадскіх аб'яднанняў. Для параўнання адзначым, што колькасць новазарэгістраваных арганізацый у гэты перыяд складала 310: у 2003 г. – 94 арганізацыі, у 2004 г. – 155, у 2005 г. – 61 арганізацыя.

У канцы 2006 г. у рэспубліцы дзейнічала шырокая сетка ***нацыянальна-культурных аб'яднанняў***: яўрэйскіх – 46, літоўскіх – 8, польскіх – 7, нямецкіх і рускіх па 6, татарскіх і цыганскіх – па 5, азербайджанскіх, украінскіх і армянскіх – па 4, грузінскіх – 3, грэчаскіх і афганскіх – па 2, а таксама – башкірскае, дагестанскае, казахскае, карэйскае, латышскае, малдаўскае, сірыйскае, турэцкае, чувашскае, эстонскае, палестынскае, йеменскае [745]. Колькасць іх пастаянна змянялася. Толькі за 2003 г. было зарэгістравана 6 новых арганізацый, за 2004 – тры.

Дадзеныя арганізацыі здзяйснялі культурна-асветныя, дабрачынныя і адукацыйныя праграмы пры падтрымцы рэспубліканскіх і мясцовых улад. Дзейнасць усіх нацыянальных фарміраванняў была звязана перадусім з вывучэннем гісторыі, культуры, мастацтва сваіх народаў, правядзеннем сустрэч, семінараў, свят, фестываляў, выстаў, канферэнцый, наладжваннем творчых сувязей з краінамі паходжання. Ствараліся культурна-асветныя цэнтры, калектывы самадзейнага народнага мастацтва (у 2005 г. іх налічвалася каля 150). У краіне працавала 65 школ выходнага дня для прадстаўнікоў армянскай, азербайджанскай, грузінскай, грэчаскай, яўрэйскай, карэйскай, латышскай, літоўскай, малдаўскай, польскай, нямецкай, татарскай і ўкраінскай нацыянальнасцей, у якіх вучыліся да 5 тыс. чалавек [845].

Найбольш шматлікай і разгалінаванай з'яўлялася сетка аддзяленняў Саюза палякаў у Беларусі, якая ў 2001 г. складалася з 123 абласных, гарадскіх, рэгіянальных, сельскіх аддзелаў і аддзяленняў, 14 дамоў палякаў. Саюз беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын меў каля 100 падраздзяленняў у 26 населеных пунктах краіны [446, с. 36]. Адмоўнае ўздзеянне на культурную дзейнасць грамадскага аб'яднання аказаў грамадска-палітычны канфлікт 2005 г., які скончыўся распадам Саюза на дзве арганізацыі, адна з якіх не атрымала юрыдычнага афармлення. З 16 дамоў палякаў у 2010 г. працавала толькі два (у гарадах Лідзе і Магілёве). Спрэчкі вакол маёмасці некалькі разоў прыводзілі да абвастрэння міждзяржаўных беларуска-польскіх адносін [199].

Разнастайнай была культурная дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў літоўцаў. Пры садзейнічанні мясцовых улад у 2010 г. Гродзенскае грамадскае аб'яднанне літоўцаў «Тэвіне» арганізавала святкаванне 600-годдзя Грунвальдскай бітвы. Міжнародная грамадская арганізацыя «Клуб Гервячай» і грамадскае аб'яднанне «Гервяцкая абшчына літоўцаў» у тым жа годзе правялі ў вёсцы Рымдзюны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8-ы чэмпіянат Еўропы сярод літоўскіх абшчын па баскетболе. Пялескае грамадскае аб’яднанне літоўцаў «Гітміне» поруч з традыцыйным святкаваннем Дня Святога Лінаса выступіла адным з арганізатараў мерапрыемстваў, якія былі прысвечаны адкрыццю помніка Вялікаму Князю Літоўскаму Вітаўту на тэрыторыі Пялескай прыватнай сярэдняй школы з літоўскай мовай навучання (Воранаўскі раён). Акрамя згадай школы ў 2010–2011 гг. дзейнічала Рымдзюнская сярэдняя школа з літоўскай мовай навучання ў Астравецкім раёне. У дзвюх школах навучаліся 134 вучня [199].

Сярод грамадскіх арганізацый, якія маюць значную гісторыю сваёй дзейнасці, вызначаецца *Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры* (БДТАПГК). Створанае ў 1966 г. Таварыства стала масавай арганізацыяй у Беларусі і праводзіла значную працу па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Аддзяленні арганізацыі існавалі ва ўсіх абласных цэнтрах. Аднак з канца 1990-х гг. Таварыства пачало сутыкацца з шэрагам праблем. Прадстаўнікі БДТАПГК былі выключаны са складу Навукова-метадычнай рады Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, праекты нарматыўных актаў у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны распрацоўваліся без удзелу Таварыства. У 2004 г. будынак грамадскага аб’яднання, які быў пабудаваны ў пачатку 1980-х гг. на сродкі Таварыства, быў перададзены на баланс Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта.

7 чэрвеня 2007 г. адбыўся XI справаздачна-выбарчы з’езд БДТАПГК. На ім была прынята пастанова, у якой прадугледжвалася арганізацыйнае ўмацаванне Таварыства, правядзенне шэрага навукова-даследчых мерапрыемстваў па выяўленні і праверцы стану захаванасці раней выяўленых помнікаў, шырокай папулярызацыйнай і асветніцкай дзейнасці ў галіне культуры і гісторыі Беларусі.

Немалаважным пунктам пастановы з’явілася памкненне грамадскай арганізацыі праводзіць маніторынг выканання заканадаўства ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны і здзяйсненне кантролю дзейнасці ўпаўнаважаных у гэтай галіне дзяржаўных органаў у межах Канстытуцыі, дзеючага заканадаўства і Статута ГА БДТАПГК [56].

Акрамя маніторынгу і дакументавання парушэнняў заканадаўства Таварыства праводзіла на працягу 2008 г. вялікую працу па ўшанаванні памяці ахвяр таталітарных рэжымаў, заснавала прэмію імя Францішка Аляхновіча ў вышэйадзначанай галіне. Былі праведзены прэс-канферэнцыі, круглыя сталы па пытаннях аховы помнікаў, навукова-практычная канферэнцыя па падзеях пачатку 30-х гадоў XX ст. у Беларусі. Наладжваліся самастойна і сумесна з іншымі грамадскімі арганізацыямі і палітычнымі партыямі краязнаўчыя вандроўкі, у тым ліку ў музей клуба «Спадчына» ў Старых Дарогах, па мясцінах Слуцкага паўстання і інш. [747]

У рамках асветніцкай дзейнасці Таварыствам быў створаны сумесна з гомельскімі актывістамі відэафільм «Лес смерці» пра Гомельскія Курапаты, два краязнаўчыя відэапраекты «Гальшаны» і «Валанцёры», у рэгіёнах ажыццяўля-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лася выдавецкая дзейнасць. У Паставах, у Доме рамёстваў, 12 жніўня 2008 г. Таварыствам адкрыта фотавыстава амерыканскага фотамастака Д. Кунстадтэра «Палескія закоскі» [747].

Таварыства сумесна з Беларускай асацыяцыяй журналістаў у 2008 г. арганізавала некалькі прэс-тураў, прысвечаных праблеме зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны, вынікам якіх сталіся шматлікія публікацыі ў недзяржаўных СМІ. Яно ж выступіла суарганізатарам круглых сталоў па азначанай тэматыцы ў такіх уплывовых дзяржаўных газетах, як «Советская Белоруссия» і «Звязда», эфіры тэлеканала «Лад» [747].

Доўгі час Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў было адзінай грамадскай арганізацыяй такога напрамку. У вывучаемы перыяд былі створаны і актыўна дзейнічалі іншыя грамадскія арганізацый, статутамі якіх была вызначана падобная дзейнасць. Гэта Беларускі нацыянальны камітэт ІКАМОС, Беларускі фонд культуры, Краязнаўчае таварыства, некаторыя маладзёжныя арганізацыі (Беларуская асацыяцыя студэнтаў-архітэктараў, грамадскае аб'яднанне «Гісторыка»).

«*Гісторыка*» мела статус рэспубліканскага маладзёжнага грамадскага аб'яднання і пачала сваю дзейнасць у 2000 г. у Вілейцы. Прадметам дзейнасці арганізацыі з'яўлялася навукова-асветніцкая і даследчая дзейнасць моладзі ў галіне гісторыі і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Аб'яднанне актыўна дзейнічала ў напрамку выяўлення, даследавання і захавання мясцін, звязаных з гісторыяй Беларусі, садзейнічання ахове выяўленых аб'ектаў гісторыі і іх ушанавання, арганізавала навукова-пошуковыя экспедыцыі, адукацыйныя семінары і канферэнцыі.

БДТАПГК і «Гісторыка» ўвайшлі ў склад створанай у 2009 г. грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (падрабязней аб дзейнасці камісіі гл. у раздзеле 6.1).

Грамадскія арганізацыі былі ініцыятарамі валанцёрскага руху. Дзякуючы працы валанцёраў «Гісторыкі», Беларускай асацыяцыі студэнтаў-архітэктараў, Беларускага камітэта ІКАМОС, дабрачынных фондаў «Крэўскі замак» і «Любчанскі замак», праводзіліся работы па захаванні замкаў у Гальшанах, Крэве, Любчы, Усялюбе, царквы ў Сынкавічах і інш.

Напрыклад, у 2010 г. *дабрачынны фонд «Крэўскі замак»* займаўся ўпарадкаваннем рэшткаў старога млына ў Крэве і старых могілак у Навагрудку. Будаўнічыя матэрыялы валанцёры набывалі за свой кошт. «Гісторыка» арганізавала летнік па ачыстцы крыпты рода О'Руркаў у капліцы, што знаходзілася ва Усялюбе. За 8 гадоў дзейнасці дабрачыннага фонду «Любчанскі замак» амаль поўнасцю была адноўлена Кутняя вежа замка [839].

З красавіка 1987 г. адлічваецца гісторыя дзейнасці *Беларускага фонду культуры*, які быў створаны з мэтай адраджэння і развіцця нацыянальных традыцый, мовы, краязнаўчага руху. Фонд выступаў арганізатарам і фундатарам выставак, дабрачынных вечарын, фальклорных свят, навукова-практычных кан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ферэнцый, аказваў дапамогу суполкам беларусаў за мяжой. У 1980-х гг. Фонд атрымаў права адкрываць валютныя рахункі, выкарыстоўваць сродкі, якія былі атрыманы ад замежных грамадзян і арганізацый, для здзяйснення міжнародных кантактаў, правядзення культурных мерапрыемстваў за мяжой і для закупкі культурных каштоўнасцей. Фонд меў магчымасць выпуску сувенірнай прадукцыі, а таксама яе продажу ў краіне і за мяжой. Спецыяльным рашэннем Савета Міністраў БССР ад 12 мая 1988 г. Фонду былі перададзены Бабруйская галантарэйная фабрыка, Маладзечанская фабрыка мастацкіх вырабаў у вёсцы Огава Іванаўскага раёна, якія падпарадкоўваліся да гэтага Міністэрству мясцовай прамысловасці, вытворчы ўчастак Брэсцкай фабрыкі сувеніраў [822, с. 23]. Пры Фондзе працавала камісія «Вяртанне», якая займалася пошукам і вырашэннем пытанняў вяртання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, якая знаходзілася за мяжой. Доўгі час сумесна з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь Фонд выдаваў часопіс «Спадчына».

Найбольш масавай грамадскай арганізацыяй у вывучаемы перыяд з'яўлялася *Таварыства беларускай мовы* (ТБМ). У 2000 г. структуры Таварыства працавалі ў кожным раёне Мінска, ва ўсіх буйных гарадах і 64 раёнах Беларусі, а таксама за мяжой (Вільні, Рызе, Іркуцку, Маскве, Санк-Пецярбургу, Севастопалі). На 1 студзеня 2000 г. гэта грамадская арганізацыя налічвала не менш за 5500 актыўных сяброў. ТБМ было заснавана ў 1989 г. Арганізатарамі-заснавальнікамі выступілі Саюз пісьменнікаў Беларусі, міністэрствы адукацыі і культуры, інстытуты мовазнаўства і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па друку, Беларускі фонд культуры, таварыства «Радзіма», Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, Нацыянальная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь. Мэтай Таварыства з'яўлялася аднаўленне ў грамадстве стаўлення да роднай мовы як да нацыянальнай святыні, пашырэнне яе ўжытку ва ўсіх сферах жыцця краіны, усебаковае развіццё і захаванне яе чысціні і самабытнасці. Пры Таварыстве працавала ініцыятыўная група па стварэнні Беларускага нацыянальнага ўніверсітэта, беларускі бацькоўскі камітэт, кніжны і відэаклуб. У вывучаемы перыяд ТБМ выдала больш за 20 кніг мастацкай, навуковай, навукова-папулярнай, асветніцкай літаратуры. З сакавіка 1990 г. Таварыства выдавала штотыднёвую газету «Наша слова» [777].

Міжнароднае грамадскае аб'яднанне *Беларускі фонд развіцця культуры* пачало дзейнічаць у 1991 г. Яно рэалізоўвала праекты ў галіне культуры шляхам арганізацыйнай і вытворча-творчай падтрымкі культуралагічных праграм і праектаў. Фонд выдаў шэраг кніг культурнага напрамку, праводзіў штогадовыя паэтычныя святы «Час і месца», удзельнічаў у правядзенні кінафестывалю «Лістапад» і кінафестывалю «Жаночае кіно». Адной з адметных рыс дзейнасці – тэатральныя пастаноўкі з прыцягненнем маладых беларускіх рэжысёраў. У 1999 г. пры падтрымцы Фонду рэжысёр В. Жукаў паставіў п'есу «Маленькія трагедыі», а ў 2001 г. пастаноўка п'есы «Больш чым дождж...»



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

была здзейснена рэжысёрам П. Адамчыкавым у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы [886].

У 1991 г. было заснавана Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне *Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА* (РГА «БелАЮ»). Яго асноўнай мэтай з'яўлялася аб'яднанне дзяцей, моладзі і дарослых у клубы ЮНЕСКА для сумеснай дзейнасці ў галіне навукі, культуры і адукацыі па прапагандзе гуманных прынцыпаў і ідэалаў ЮНЕСКА, ідэй міру і ўзаемаразумення паміж людзьмі. Па стане на 2007 г. у склад РГА «БелАЮ» уваходзіла 67 клубаў ЮНЕСКА і 2 клуба, якія мелі статус клуба-кандыдата [708].

Клубам-кандыдатам на ўступленне ў «Беларускую асацыяцыю клубаў ЮНЕСКА» ў 2007 г. было Віцебскае культурна-асветнае аб'яднанне «Праметэй». На базе аб'яднання працавала маладзёжная дызайн-студыя, клуб інтэрнацыянальнай дружбы, этнаграфічны тэатр, школа У-ШУ. Па даручэнні Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта на базе аб'яднання «Праметэй» быў створаны Турыстычны рэкламна-інфармацыйны цэнтр для развіцця ўязнога турызму. Сумесна з аддзелам знешнепалітычных сувязей Віцебскага аблвыканкама аб'яднаннем быў распрацаваны і выдадзены мультымедыйны дыск аб патэнцыяле Віцебскай вобласці. Аб'яднанне «Праметэй» было пастаянным удзельнікам разнастайных міжнародных культурна-асветных праектаў. Адзін з іх – Міжнародны дзіцячы і маладзёжны пленэр «Віцебск – горад Шагала». Сумесна з Віцебскім абласным і гарадскім выканкамамі, а таксама пры падтрымцы Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь штогод праводзіўся Віцебскі адкрыты фестываль творчай моладзі. Аб'яднанне актыўна супрацоўнічала са Шведскім інстытутам культурнага турызму, які быў зацікаўлены ў развіцці праектаў, звязаных з даследаваннямі прысутнасці вікінгаў у Прыдзвінскім краі і гістарычнага шляху «З вараг у грэкі». Віцебскае культурна-асветнае аб'яднанне «Праметэй» з'яўлялася пастаянным удзельнікам Маладзёжных Ганзейскіх фестываляў і Дзён Ганзейскіх гарадоў [151].

Сярод вялікай колькасці грамадскіх аб'яднанняў, якія дзейнічалі ў Беларусі, асобна вылучаліся ***грамадскія арганізацыі творчых работнікаў***. У 2007 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала 15 творчых саюзаў (у 1994 г. іх было 9), якія аб'ядноўвалі каля 8 тыс. чалавек. Да іх ліку адносіліся Канфедэрацыя творчых саюзаў, Саюз тэатральных дзеячаў, Саюз кампазітараў, Саюз музычных дзеячаў, Саюз кінематаграфістаў, Саюз архітэктараў, Саюз дызайнераў, Саюз беларускіх пісьменнікаў, Саюз пісьменнікаў Беларусі, Саюз мастакоў, Гільдыя акцёраў кіно, Аўтарскі фонд кампазітараў, Гільдыя тэатральных рэжысёраў, Асацыяцыя кнігавыдаўцоў і кнігараспаўсюджвальнікаў, ГА «Фотамастацтва».

Большасць гэтых арганізацый – пераемнікі створаных яшчэ ў савецкія часы. Напрыклад, у лістападзе 1991 г. у Беларусі пачало дзейнічаць грамадскае аб'яднанне «Беларуская гільдыя акцёраў кіно», якая з'явілася правапераемнікам «Гільдыі кінаакцёраў Беларусі» – аддзялення Усесаюзнай Гільдыі акцёраў савецкага кіно. У тым жа годзе на базе музычнага таварыства БССР, якое існавала з 1988 г., быў заснаваны Беларускі саюз музычных дзеячаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З 1989 г. пачало дзейнічаць рэгіянальнае грамадскае аб'яднанне *Беларускі літаратурны саюз «Полоцкая ветвь»*. Яно аб'яднала рускамоўных паэтаў, празаікаў, драматургаў, перакладчыкаў, літаратурных крытыкаў і літаратуразнаўцаў з усіх абласцей рэспублікі. У 1992 г. аб'яднанне было зарэгістравана ў Полацкім гарвыканкаме. У 1993 г. пачало дзейнічаць Мінскае літаратурнае аб'яднанне. У лістападзе 1994 г. два аб'яднанні правялі ў Полацку ўстаноўчы сход і стварылі Беларускі літаратурны саюз «Полоцкая ветвь». У чэрвені 1996 г. была заснавана газета «Вестник культуры», да якой пазней далучыўся штоквартальны часопіс «Западная Двина» і альманах «Катарсизм» (2000 г.). На пачатак 2006 г. саюз аб'ядноўваў 12 аддзяленняў агульнай колькасцю 120 чалавек. За перыяд існавання сябры саюза выдалі больш за 100 кніг [869].

На хвалях 1990-х гг. побач з Саюзам пісьменнікаў з'явіліся такія літаратурна-творчыя аб'яднанні, як «Бум-Бам-Літ» і «Таварыства Вольных Літаратараў», узнік філіял Пэн-цэнтра (1989).

*Таварыства Вольных Літаратараў* было створана ў 1993 г. у г. Полацку. У яго ўвайшлі маладыя літаратары з розных гарадоў Беларусі: А. Аркуш (г. Полацк), Вінцэс Мудроў (г. Наваполацк), Ю. Гумянюк (г. Гродна), І. Сідарук (г. Кобрын), Л. Вашко (г. Масты) і інш. Таварыства ставіла перад сабой мэту падтрымкі нацыянальнай культуры ў рэгіёнах, выданне літаратурнай перыёдыкі і мастацкіх кніг, арганізацыю літаратурных сустрэч, вечарын, канферэнцый, папулярызацыю нацыянальнай літаратуры ў Беларусі і ў замежжы. Новае аб'яднанне ў 1994–1996 гг. правяло ў Полацку тры міжнародныя літаратурныя канферэнцыі. Друкаваным органам Таварыства лічыўся часопіс «Калоссе». У якасці канцэптульных ідэй для сваёй творчасці сябры ТВЛ абралі нонканфармізм, пострамантызм і рэгіяналізм.

Увесну 1995 г. была створана суполка «*Бум-Бам-Літ*». Яе сябры надрукавалі свае творчыя маніфесты ў газеце «Культура» [774]. Напачатку ў аб'яднанне ўваходзілі Ю. Барысевіч, М. Башура, А. Бахарэвіч, Ж. Васанская, Зм. Вішнеў, У. Гарачка, С. Мінскевіч, С. Патаранскі, І. Сін, А. Туровіч. Пераемніцай «Бум-Бам-Літа» стала суполка «Schmerzwerk», у якую ў 2000 г. увайшлі Ю. Барысевіч, Зм. Вішнеў, В. Гапеева, І. Сін.

У чэрвені 2002 г. устаноўчым сходам творчай інтэлігенцыі г. Полацка было створана гарадское грамадскае аб'яднанне *Творчая ініцыятыва*. Асноўнай мэтай новага аб'яднання была вызначана каардынацыя дзеянняў па стварэнні культурнага асяроддзя ў горадзе. «Творчая ініцыятыва» складалася з шасці секцый: музыкі, выяўленчага мастацтва, літаратуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, тэатра і сродкаў масавай інфармацыі [651].

У 1992 г. па ініцыятыве народнага артыста СССР М. Яроменка з мэтай аб'яднання намаганняў па сумесным адстойванні сваіх інтарэсаў у складаных эканамічных умовах было створана грамадскае аб'яднанне *Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў*. У 2007 г. у Канфедэрацыю ўваходзіла 13 творчых саюзаў. З 2002 г. грамадскае аб'яднанне існавала выключна на грамадскіх пачатках, нават не ўсе з яе саюзаў-удзельнікаў плацілі сяброўскія складкі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У маі 2007 г. адбылася справаздачна-выбарчая канферэнцыя Канфедэрацыі. У выступленнях кіраўнікі творчых саюзаў звярталі ўвагу на пэўную раскаардынаванасць дзеянняў творчых саюзаў і дзяржаўных праектаў у галіне культуры. Значная ўвага звярталася на тое, што творчыя саюзы мусяць прымаць больш дзейсны ўдзел у вырашэнні пытанняў прысуджэння ганаровых званняў, дзяржаўных узнагарод. Закранаючы пытанне дзяржаўнага фінансавання, выступоўцы гаварылі аб тым, што гэта не адзіная магчымасць існавання творчых арганізацый. Старшыня Беларускага саюза кінематаграфістаў Ю. Цвяткоў падкрэсліў, што нашмат важней за аднаразовыя фінансавыя «ўліванні» наладжванне трывалай і скаардынаванай працы паміж творчымі саюзамі і дзяржаўнымі структурамі. У справаздачы са справаздачна-выбарчай канферэнцыі, ведучы гаворку аб тым, што новым старшынёй Канфедрацыі быў абраны дэпутат Палаты Прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь Г. Давыдзька, карэспандэнт газеты «Культура» Т. Команава адзначыла: «Члены канфедэрацыі, па сутнасці, прагаласавалі за курс на збліжэнне творчай эліты краіны з дзяржаўнымі структурамі, асабліва адзначыўшы, што канфедэрацыя мусіць лічыць і лічыць сваёй задачай падтрымку дзяржаўнай ідэалогіі ў галіне культуры і мастацтва, яшчэ раз пацвярджаючы небезвядомы тэзіс пра тое, што нельга жыць у грамадстве і быць вольным ад яго» [302].

У 1992 г. быў заснаваны *Беларускі саюз майстроў народнай творчасці* (БСМНТ). Ён займаўся вырашэннем асноўных пытанняў навуковай, арганізацыйнай, творчай дзейнасці ў галіне традыцыйнага народнага мастацтва. У 2005 г. Саюз налічваў каля 400 сябраў-спецыялістаў у розных відах традыцыйнага мастацтва, народных умельцаў і майстроў са спецыяльнай падрыхтоўкай. Саюз меў абласныя аддзяленні ва ўсіх шасці абласных гарадах, а таксама раённыя аб'яднанні [829, с. 215].

Сярод мерапрыемстваў, арганізатарам якіх сумесна з Міністэрствам культуры выступаў Саюз, – рэспубліканскія святы-конкурсы народнай творчасці «Ганчарнае кола» (1995, 2004), «Саламяны цуд» (1997), «Лазовыя карункі» (1998), «Дрэва жыцця» (1999), «Ажурныя фантазіі» (2000), «Залатая падкова» (2001), рэспубліканская выстава «Калядныя ўзоры» (1998–1999). У 2006 г. адбылася рэспубліканская выстава «Жыватворныя крыніцы», дзе былі прадстаўлены экспанаты, якія сведчылі аб адраджэнні забытых відаў народнага рамяства, такіх як роспіс на шкле, выцінанка, бандарства, апрацоўка скуры, вырабы з бісеру і інш. На працягу 2001–2004 гг. аб'яднанне праводзіла рэспубліканскія пленэры разьбяроў-манументалістаў. Штогадовым былі рэспубліканскія выставы народнай творчасці «Калядныя ўзоры» [829, с. 215–216].

Як створанае пад патранажам Міністэрства культуры грамадскае аб'яднанне магло разлічваць на ўсебаковую падтрымку з боку дзяржавы. БСМНТ аказвала дапамогу майстрам па ўладкаванні на работу, у набыцці матэрыялаў і абсталявання, павышэнні кваліфікацыі і інш. Па ініцыятыве Саюза штогод Міністэрства культуры выдзяляла імянныя стыпендыі найбольш актыўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і заслужаным майстрам, каб матэрыяльна падтрымаць і мэтанакіравана скіраваць іх у творчай дзейнасці [829, с. 217].

У вывучаемы перыяд у Рэспубліцы Беларусь існавалі два творчыя аб'яднанні прафесіяналаў у сферы музычнага мастацтва: *Саюз кампазітараў Беларусі і Саюз музычных дзеячаў Беларусі* (СМДБ) (з 1995 г. – Беларускі саюз кампазітараў і Беларускі саюз музычных дзеячаў). У 1991 г. у складзе Саюза кампазітараў з'явілася Асацыяцыя сучаснай музыкі, у 1993 г. гэта арганізацыя стала называцца Таварыствам сучаснай музыкі з прычыны ўваходжання ў якасці Беларускай секцыі ў міжнароднае Таварыства сучаснай музыкі са штаб-кватэрай у Амстэрдаме [135].

Створаны на аснове Музычнага таварыства БССР Беларускі саюз музычных дзеячаў (далей – БСМД) аб'яднаў прадстаўнікоў музычнага, харэаграфічнага і эстраднага мастацтва, майстроў музычных інструментаў. Восенню 1991 г. на Пленуме БСМД была разгледжана праблема адраджэння айчыннай музычнай культуры. З апорай на навуковыя дасягненні айчыннага музыказнаўства, аргументавана даказаўшага самабытнасць і старажытнасць беларускай музычнай культуры, Саюз стаў адным з самых актыўных праваднікоў новых адраджэнскіх ідэй. Быў пакладзены пачатак сістэмнаму падыходу да вывучэння старажытнай музыкі. Пры СМДБ быў створаны творча-вытворчы цэнтр «Капэла» (з 1992 г. – нацыянальнае аб'яднанне «Беларуская капэла» ў сістэме Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь), былі арганізацыйна і фінансава падтрыманы ініцыятывы вяртання на радзіму гістарычных матэрыялаў і партытур, якія прыналежалі беларускаму народу [123].

Саюз стала падтрымліваў правядзенне многіх музычных фестываляў: «Снежаньскія музычныя вечары» ў г. Брэсце, фестывалі «Убельская ластаўка» ў г. Чэрвені, імя І. Салярцінскага ў г. Віцебску і інш. [661].

У 1992 г. пры СМДБ была створана Асацыяцыя беларускіх дамбрыстаў і мандаліністаў. Асацыяцыя выступіла з ідэяй правядзення дэкадаў народна-інструментальнага мастацтва «Славянскі вянок». У 1995 г. яна паклала пачатак рэспубліканскім фестывалям памяці Г. Жыхарава (першы – 1995 г., другі – 2003, трэці – 2005, чацвёрты – 2010 г.).

Асацыяцыя ўзяла пад сваю абарону знікаючы з музычнай культуры нашай краіны інструмент – мандаліну. Выпрацаваная і планамерна здзяйсняемая работа ў дадзеным напрамку дазволіла беларускім мандаліністам стабільна займаць на міжнародных конкурсах прызавыя месцы [123, с. 42].

Пры БСМД дзейнічалі Беларуская перкусійная асацыяцыя (утворана ў 1995 г.), Асацыяцыя беларускіх цымбалістаў (1997 г.), Асацыяцыя кіраўнікоў хораў хлопчыкаў і юнакоў (2006 г.), Асацыяцыя беларускіх баяністаў і акардыяністаў (2008 г.), Асацыяцыя оперна-сімфанічных дырыжораў (2009 г.), Асацыяцыя маладых беларускіх кампазітараў (2010 г.).

У склад Беларуская саюза музычных дзеячаў уваходзілі: «Мінск Оркестра» (з 1997 г.), ансамбль «Камерныя салісты Мінска» (з 2004 г.), квартэт духавых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструментаў з дрэва «Riviera» (з 2009 г.), Шаляпінскае таварыства Беларусі (з 2010 г.), творчы цэнтр «BelArtSound» (з 2010 г.).

Прапагандай беларускай нацыянальнай і сусветнай музычнай культуры, творчай падтрымкай таленавітай моладзі, ветэранаў сцэны і педагагічнай дзейнасцю займаўся створаны ў 2005 г. пры БСМД некамерцыйны прадзюсарскі цэнтр «Класіка».

Адной з прыярытэтных форм дзейнасці БСМД была работа па павышэнні прафесійнага і педагагічнага майстэрства музыкантаў. На працягу 1992–1993 гг. працавала Рэспубліканская школа музыказнаўцаў. У цесным супрацоўніцтве з Беларускай дзяржаўнай акадэміяй музыкі, Дзяржаўнай гімназіяй-каледжам пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры з 1993 г. пачалі праводзіцца Курсы вышэйшага выканальніцкага майстэрства, майстар-класы па розных спецыяльнасцях з запрашэннем для кіраўніцтва імі вядомых музыкантаў блізкага і дальняга замежжа [123, с. 51–52].

Творчая майстэрня «Эстрада» Беларускага саюза тэатральных дзеячаў у 1990-я гг. вяла работу па пастаноўцы буйных свят і тэматычных мерапрыемстваў у краіне. Сярод іх: мерапрыемствы да 10-й гадавіны Дня незалежнасці Беларусі, свята горада «Мінск – 930», «Свята пісьменніцтва і друку», Міжнародны фальклорны фестываль у Пінску і інш. [123, с. 54].

Міністэрства культуры і Беларускі саюз тэатральных дзеячаў у 1990-я гг. сумесна правялі некалькі творчых конкурсаў, якія стымулявалі стварэнне п’ес беларускімі драматургамі. З мэтай заахвочвання да творчых дасягненняў беларускага тэатральнага мастацтва ў 1992 г. яны ж заснавалі імянныя тэатральныя прэміі. Саюз тэатральных дзеячаў штогод уручаў прызы: «Крыштальная Паўлінка», «Крышттальны анёл», «Крыштальная зорка», «Крыштальная кветка».

Сярод новаўтвораных можна назваць грамадскае аб’яднанне «*Фотамастацтва*», якое было заснавана ў снежні 2003 г. на ўстаноўчым з’ездзе, на якім прысутнічалі 179 чалавек з усіх рэгіёнаў Беларусі. У лютым 2005 г. ГА было прынята ў Беларускую канфедэрацыю творчых саюзаў. Асноўнымі мэтамі дзейнасці новага творчага аб’яднання статутам былі вызначаны: садзейнічанне развіццю беларускага фатаграфічнага мастацтва і папулярызацыя яго дасягненняў у Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі; захаванне, памнажэнне і творчае выкарыстанне фатаграфічнай спадчыны як неад’емнай часткі беларускай культуры [707].

Плённа дзейнічаў *Беларускі саюз кінематаграфістаў*. У маі 1991 г. на VII з’ездзе Саюза была прынята культурна-камерцыйная праграма, якая прадугледжвала наладжванне ўласнай кіна-, відэавытворчасці, развіццё альтэрнатыўнага пракату фільмаў, больш актыўнае супрацоўніцтва з прэсай і бізнесам, падтрымку кінафестываляў і іншых культурных акцый у сферы кіно. Асобнае месца ў дакуменце было адведзена сацыяльнай абароне беларускіх кінематаграфістаў. Планавалася стварэнне Фонду развіцця беларускага кінематографа, які акумуляваў бы сродкі і рэсурсы не толькі з дзяржбюджэту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У далейшым пры Саюзе кінематаграфістаў былі створнаы творчыя студыі[1].

З мэтай спрыяння творчаму развіццю беларускага кінамастацтва Саюз рэгулярна праводзіў навукова-практычныя канферэнцыі. Толькі ў перыяд 1999–2001 гг. былі праведзены наступныя: «Беларускае ігравое кіно на парозе XXI ст.: рэальнасць і перспектывы», «Кінафестывалі Беларусі: праблемы, перспектывы», «Канцэпцыя развіцця беларускага кіно». Праблемам маладых беларускіх кінематаграфістаў была прысвечана навукова-практычная канферэнцыя «Беларускі кінематограф учора, сёння, заўтра...» з праглядам і абмеркаваннем дэбютных фільмаў (снежань 1998 г.) і круглы стол «Маладое кіно Беларусі: праблемы, будучыня...» (сакавік 1999 г.).

Саюз кінематаграфістаў неаднаразова выступаў суарганізатарам творчых конкурсаў. У 2002 г. – конкурсу на стварэнне сцэнарыя мастацкага фільма ў жанры камедыі, у 2006 г. – конкурсу дзіцячых і маладзёжных фільмаў «Тэрыторыя творчасці», у 2008 г. – конкурсу на стварэнне літаратурнага сцэнарыя мастацкага фільма.

Калі гаварыць увогуле, то асноўнымі напрамкамі дзейнасці творчых саюзаў з'яўлялася ***сацыяльна-прававая абарона*** сваіх членаў; правядзенне акцый, якія садзейнічаюць развіццю нацыянальнага мастацтва, захаванню традыцый, пашырэнню замежных сувязей. Яны мелі права пашыраць спектр сваёй дзейнасці, займацца выдавецтвам, арганізацыяй выстаў, пленэраў, канферэнцый і г. д. Аднак на працягу 1990-х гг. іх дзейнасць сутыкалася са шматлікімі праблемамі.

У 1992 г. дзяржава адабрала ў творчых саюзаў ільготу па падатку на дабаўленую вартасць, а ў 1996 г. – вызваленне ад падатку на прыбытак. На з'ездах гэтых грамадскіх аб'яднанняў у той час выказваліся пажаданні, каб ільготы былі вернуты, а таксама агучваліся прапановы, каб дзяржава ўзяла на сябе і аплату творчых майстэрань [93, спр. 446, арк. 220]. Цяжкія ўмовы існавання прымусілі творчыя саюзы шукаць падтрымкі ў дзяржавы. 19 красавіка 1994 г. ва Урад краіны звярнулася Канфедэрацыя творчых саюзаў. У кастрычніку 1994 г. у Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь адбылася сустрэча намесніка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь з кіраўнікамі творчых саюзаў і культурных фондаў Беларусі. На ёй былі абмеркаваны пытанні, якія былі выкладзены ў звароце ад 19 красавіка.

Па выніках сустрэчы былі дадзены даручэнні міністэрствам і ведамствам, мясцовым органам улады на вырашэнні праблем, якія былі пастаўлены творчымі саюзамі і культурнымі фондамі [438, спр. 10б, арк. 191].

На нарадзе было адзначана, што для нармальнай дзейнасці творчых саюзаў і культурных фондаў краіны тэрмінова неабходна было вырашыць пытанні аб вызваленні ад падатку на прыбытак творчыя саюзы, ад падатку на дабаўленую вартасць – прадпрыемствы, установы і арганізацыі творчых саюзаў Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў і культурных фондаў і Беларускага фонду

[1] Больш падпрабязна гл. раздзел 5.5 «Кінавідэавытворчасць і кінавідэапракат».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры[1]. Прапаноўвалася перадаць ва ўласнасць творчым саюзам, іх аддзяленням, прадпрыемствам і арганізацыям памяшканні, якія яны займалі пад праўленні, студыі, майстэрні, выставачныя залы, іншыя будынкі і аб'екты сацыяльна-культурнага прызначэння незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці. Бачылася неабходным устанавіць ільготную арэндную плату, а таксама льготную плату за камунальныя паслугі, электраэнергію, ацяпленне, водазабеспячэнне памяшканняў, якія займалі Беларуская канфедэрацыя творчых і культурных фондаў, творчыя саюзы і культурныя фонды, іх прадпрыемствы і арганізацыі. Патрабавала вырашэння пытанне па льготным набыцці матэрыялаў і сыравіны членамі творчых саюзаў для іх прафесійна-творчай дзейнасці, а таксама льготных крэдытных і доўгачасовых пазык для будаўніцтва і набыцця творчых майстэрань, студый, вытворчых пляцовак. Прапаноўвалася разгледзець пытанне аб вызваленні Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў і культурных фондаў, творчых саюзаў, Фонду культуры і іх арганізацый, якія займаліся правядзеннем выстаў, аўкцыёнаў і іншых мерапрыемстваў за мяжой, ад валютнага падатку і абавязковага продажу валюты ў бюджэт. Валютныя сродкі пры гэтым былі б накіраваны на ўмацаванне творчай і матэрыяльна-тэхнічнай базы саюзаў і фондаў, зберажэнне культурнай спадчыны. Бачылася неабходным устанавіць разлікі за пражыванне для іншаземных грамадзян, якія прыбывалі ў рэспубліку па папярэдне ўзгодненых планах па лініі творчых саюзаў, у грашовых знаках па тарыфах для грамадзян Беларусі. Прапаноўвалася вызваліць ад аплаты мытных пошлін матэрыялы, музычныя інструменты, тэхналагічнае абсталяванне, якія ўвозіліся на мытную тэрыторыю краіны і закупаліся Беларускай канфедэрацыяй творчых саюзаў і культурных фондаў, творчымі саюзамі і культурнымі фондамі за кошт уласных сродкаў або сродкаў, атрыманых у парадку кампенсацыі за правядзенне выстаў альбо іншых культурных мерапрыемстваў за мяжой [438, спр. 11, арк. 175].

Некаторыя з узнятых пытанняў былі станоўча вырашаны Мінгарвыканкамам. Напрыклад, спецыяльным распараджэннем ад 18 верасня 1994 г. у г. Мінску выканкам гарсавета прыраўняў творчыя саюзы і арганізацыі культуры да бюджэтных арганізацый і прадставіў ім ільготу па аплаце за цеплавую энергію. Былі прыраўнены да насельніцтва па аплаце за цяпло творчыя майстэрні мастакоў, якія арандавалі памяшканні за ўласны кошт. Асобным распараджэннем ад 11 сакавіка 1994 г. былі прыраўняны да творчых майстэрань мастакоў творчыя дызайн-студыі Саюза дызайнераў. Улічваючы складанае эканамічнае становішча ўстаноў культуры, творчых саюзаў і культурных фондаў Беларусі ў перыяд правядзення эканамічных рэформ, выканкам гарсавета рашэннем ад 7 лютага 1994 г. аднёс грамадскія арганізацыі, якія не мелі даходу ад сваёй дзейнасці, творчыя майстэрні (творчыя студыі) мастакоў, скульптараў, архітэктараў, дызайнераў, галерэю мастацтваў «Гал-Творчасць» да льготнай

[1] Ад падатку на прыбытак прадпрыемствы, якія належалі творчым саюзам, былі вызвалены Законам Рэспублікі Беларусь «Аб падатках на даходы і прыбытак прадпрыемстваў, аб'яднанняў, арганізацый».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

катэгорыі арандатараў са стаўкай у памеры 0,15 ад адзінай стаўкі арэнднай платы за нежылыя памяшканні. Адпаведна рашэння 13-й сесіі 21-га склікання Мінгарсавета № 335 ад 27.10.1993 г. на баланс творчым саюзам былі перададзены памяшканні, пабудаваныя за кошт іх долевага ўдзелу [438, спр. 11, арк. 147–148].

Вырашэнне пытання льготнага набыцця матэрыялаў і сыравіны членамі творчых саюзаў для прафесійнай дзейнасці бачылася магчымым шляхам выключэння з адпускной цаны падатку на дабаўленую вартасць. Для ўнясення прапаноў па змяненні парадку падаткаабкладання Беларускай канфедэрацыі творчых саюзаў неабходна было вызначыць пералік тавараў, якія будуць вызвалены ад гэтага падатку.

Пытанне аб ільготным крэдытаванні будаўніцтва і набыцці творчых майстэрань, студый і вытворчых пляцовак не знайшло падтрымкі з боку Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь [438, спр. 11, арк. 170].

Адносна перадачы творчым саюзам і культурным фондам займаемых імі памяшканняў Міністэрства па кіраванні дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі паведамляла, што рашэнне аб перадачы згаданых памяшканняў ва ўласнасць творчых саюзаў у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам могуць прымаць толькі мясцовыя Саветы дэпутатаў [438, спр. 11, арк. 136].

У сакавіку 1995 г. Саюз мастакоў Беларусі звярнуўся да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з шэрагам прапаноў па падтрымцы прафесійнага выяўленчага мастацтва. Сярод іх: вырашыць пытанне аб выкарыстанні сродкаў, выдзяляемых бюджэтнымі, гаспадарча-разліковымі і камерцыйнымі структурамі на мастацкае афармленне аб’ектаў грамадскага прызначэння толькі праз сістэму прафесійнага творчага Саюза мастакоў; увесці ліцэнзіі на выкананне мастацкіх работ; адмяніць усе віды падаткаў і збораў з прадпрыемстваў сістэмы Саюза мастакоў, якія звязаны са стварэннем твораў выяўленчага мастацтва альбо сродкі, якія былі пералічаны ў выглядзе падатку ў бюджэт дзяржавы, вяртаць на рахунак Саюза мастакоў для выкарыстання іх на статутную дзейнасць і сацыяльную падтрымку мастакоў; бязвыплатна перадаць ва ўласнасць Саюза мастакоў і іх аддзяленням на месцах ў бестэрміновае карыстанне аб’екты нерухомасці сацыяльна-культурнага прызначэння, творчыя майстэрні; выдзеліць частку сродкаў з рэспубліканскага бюджэту на ўтрыманне Рэспубліканскай мастацкай галерэі, выставачных залаў у абласных цэнтрах, дома-музея імя А. Бембеля; распрацаваць закон аб спонсарстве і мецэнацтве; паскорыць стварэнне і зацвярджэнне закона аб аўтарскім праве і стаўках аўтарскага ўзнагароджання за выкарыстанне твораў мастацтва ў прамысловасці і друку; тэрмінова вырашыць пытанне аб захаванні калекцыі твораў выяўленчага мастацтва, якая налічвала больш за 12 тысяч адзінак [438, спр. 52, арк. 84–85].

Па сутнасці асобных пытанняў Міністэрства культуры і друку звярталася ў розныя органы дзяржаўнай улады і кіравання. Па пытаннях зніжэння падаткаў, якімі абкладаліся прадпрыемствы Саюза мастакоў, быў атрыманы адмоўны адказ ад Дзяржаўнай падатковай інспекцыі. Пытанне зноў уздымалася ў чэрвені 1998 г. на парламенцкіх слуханнях «Дзяржаўная нацыянальная праграма



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Культура" і ўдасканаленне заканадаўчай базы галіны ў Рэспубліцы Беларусь». На зварот Міністэрства культуры ў Міністэрства фінансаў зноў быў атрыманы адмоўны адказ з наступным тлумачэннем: «Па пытанню вызвалення творчых калектываў і творчых саюзаў ад уплаты падаткаў лічым, што прадстаўленне льгот ставіць у няроўнае становішча суб'екты гаспадарання. Творчыя саюзы ствараліся ў адпаведнасці са сваімі статутамі як незалежныя грамадскія аб'яднанні, якія здзяйсняюць сваю дзейнасць на аснове дзеючага заканадаўства за кошт адлічэнняў прадпрыемстваў, майстэрань, якія належаць ім на правах уласнасці, сяброўскіх складак і іншых паступленняў» [439, спр. 222, арк. 199].

Адносна максімальнага зніжэння арэнднай платы за ўтрыманне майстэрань мастакоў Мінгарвыканкам і Віцебскі аблвыканкам прынялі станоўчыя рашэнні па перадачы часткі майстэрань ва ўласнасць Саюза мастакоў, зменшылі памеры арэндных ставак за ўтрыманне гэтых памяшканняў. Аднак значная частка іх знаходзілася ва ўласнасці камунальных службаў і мастакі па-ранейшаму не спраўляліся з высокімі для іх цэнамі. Мінскаму гарвыканкаму прапаноўвалася пагадзіцца з бартэрным прынцыпам аплаты (мастацкімі творамі аўтараў) за згаданыя памяшканні, аднак прапанова была адхілена [438, спр. 52, арк. 49].

У сувязі з нездавальняючымі ўмовамі захавання калекцыі твораў, якой валодаў Саюз беларускіх мастакоў, прапаноўвалася лепшыя з іх перадаць музейнай сетцы, аднак творчая арганізацыя па гэтай прапанове станоўчага рашэння не прыняла.

У чэрвені 1995 г. Саюз кампазітараў Беларусі звярнуўся да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з шэрагам просьбаў і прапановаў: павялічыць памер аўтарскага ўзнагароджання; садзейнічаць скарэйшаму прыняццю ў Беларусі закона аб ахове аўтарскіх правоў; павысіць сумы штомесячных даплат за ганаровыя званні; устанавіць павышаныя памеры пенсій для кампазітараў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё нацыянальнага мастацтва; садзейнічаць у перадачы будынку абласнога ваенкамата (пл. Свабоды, 15) на баланс Саюза кампазітараў; дапамагчы ў выдзяленні сродкаў для працягнення будаўніцтва Дома творчасці кампазітараў у Астрашыцкім гарадку; садзейнічаць у выдзяленні кампазітарам ссудаў на будаўніцтва жылля на льготных умовах; аднавіць датацыі выдавецтву «Беларусь» на выпуск прадукцыі беларускіх кампазітараў; выдзеліць грошы на закупку Саюзам капіравальнай тэхнікі [94, арк. 2–17; 438, спр. 53, арк. 223–229].

У снежні 1996 г. Саюз кампазітараў Беларусі зноў звярнуўся да Кіраўніка дзяржавы амаль з тымі ж прапановамі. Побач з перадачай будынка Ваеннага камісарыята і незавершанага дома творчасці кампазітараў выказвалася просьба аб прыняцці спецыяльнай урадавай пастановы аб спецыяльных фінансавых адлічэннях у фонды, якія былі створаны творчымі саюзамі. Зноў уздымалася пытанне аб нотадрукаванні і аб выдзяленні сродкаў Саюзу кампазітараў для ўдзелу ў долевым будаўніцтве [439, спр. 151, арк. 101].

Як сведчаць адказы зацікаўленых міністэрстваў, узнятыя ў зваротах пытанні не маглі быць станоўча вырашанымі. Выпуск нотнай прадукцыі выдавецтвам «Беларусь» не здзяйсняўся па прычыне адсутнасці попыту. Падобную

літаратуру ў далейшым стаў выпускаць Інстытут праблем культуры [439, спр. 151, арк. 102].

Спецыяльныя фінансавыя адлічэнні ў фонды творчых саюзаў ажыццяўляліся Камітэтам па аўтарскіх і сумежных правах Міністэрства юстыцыі на падставе нарматыўных актаў, прынятых у СССР. Адпаведна ім, канцэртныя ўстановы, філармоніі, тэатры рабілі адлічэнні ў памеры 2 % за выкарыстанне твораў мастацтва як ахоўваемых аўтарскім правам, так і перайшоўшых у грамадскі набытак, у фонды, створаныя творчымі саюзамі. За кошт гэтых паступленняў будаваліся дамы творчасці, жыллё, утрымлівалася і развівалася база творчых саюзаў, таксама аказвалася матэрыяльная дапамога пры часовай страце працаздольнасці, аплочваліся творчыя камандзіроўкі, праводзілася прафесійная вучоба творчай моладзі, рабілася скідка членам фонду за карыстанне яго паслугамі, аказвалася медыцынская дапамога хворым. За гэты ж кошт утрымлівалася арганізацыя, якая збірала праз сваіх агентаў гэтыя адлічэнні, усесаюзнае агенцтва па ахове аўтарскіх правоў [439, спр. 100, арк. 203]. Аднак пасля прыняцця Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскіх і сумежных правах», які не рэгламентаваў адлічэнні ў творчыя саюзы, Камітэт па аўтарскіх і сумежных правах быў вымушаны спыніць падобныя адлічэнні. Разумеючы неабходнасць дзяржаўнай падтрымкі творчых саюзаў, згаданы Камітэт пачаў заключаць дагаворы аб кіраванні маёмаснымі правамі аўтараў. Планавалася, што пасля заключэння дастатковай колькасці дагавораў пры Камітэце будзе створаны Аўтарскі савет, які ў вызначаным парадку распрацуе праект урадавай пастановы, у якой будуць устаноўлены выпадкі і парадак выплаты спецыяльных адлічэнняў за выкарыстанне на тэрыторыі краіны твораў, якія перайшлі ў грамадскі набытак. Толькі пасля гэтага Аўтарскі савет змог бы накіроўваць адлічэнні ў фонды творчых саюзаў [439, спр. 151, арк. 108]. Міністэрства фінансаў заўважала, што штогод на ўтрыманне Беларускага саюза кампазітараў прадугледжваліся бюджэтныя асігнаванні. Акрамя гэтага, Саюз, з'яўляючыся грамадскай арганізацыяй, у адпаведнасці з Законам «Аб грамадскіх арганізацыях» павінен быў фарміраваць уласныя сродкі за кошт уступных і сяброўскіх узносаў, добраахвотных ахвяраванняў, паступленняў ад правядзення лекцый, выстаў, спартыўных і іншых мерапрыемстваў, латэрэй а таксама іншых незабароненых заканадаўствам паступленняў. З гэтых крыніц фінансавання Саюз кампазітараў і мог самастойна стварыць неабходны фонд [439, спр. 151, арк. 103].

Неабгрунтаванымі выглядалі просьбы Саюза аб выдзяленні сродкаў для ўдзелу ў долевым будаўніцтве. Адпаведна нацыянальнай жыллёвай праграме, сродкі рэспубліканскага бюджэту на будаўніцтва жылля выдзяляліся толькі для льготных катэгорый грамадзян (ваеннаслужачым, звоненым у запас, інвалідам, удзельнікам вайны і прыраўняным да іх асобам) у вызначаным парадку. Не лепшым чынам выглядала становішча з перадачай будынка на пл. Свабоды, 15. Міністэрства абароны магло яго перадаць Саюзу кампазітараў пры ўмове прадастаўлення Мінскаму абласному камісарыяту іншага будынка [439, спр. 151, арк. 103–104].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сапраўды, даволі вострай на той час была праблема заканчэння будаўніцтва Дома творчасці кампазітараў «Астрашыцкі гарадок». Бюджэтнае фінансаванне яго было спынена ў 1995 г. Гэты аб'ект застаўся ў спадчыну ад Музычнага фонду СССР. Пасрэдніцкую дзейнасць паміж Саюзам кампазітараў і будаўнічымі арганізацыямі ажыццяўляў Беларускі аўтарскі фонд кампазітараў, але афіцыйнай перадачы на баланс альбо Саюза кампазітараў, альбо Беларускага аўтарскага фонду кампазітараў не было здзейснена. Міністэрства культуры падтрымала просьбу Саюза кампазітараў, бо лічыла, што перадача ва ўстаноўленым парадку ва ўласнасць Беларускаму саюзу кампазітараў Дома творчасці магла б дапамагчы вырашыць пытанні заканчэння будаўніцтва [439, спр. 151, арк. 107–108].

Станоўчым фактам з'яўляецца атрыманне, пачынаючы з 1996 г., членамі Беларускага саюза кампазітараў штогадовых дзяржаўных стыпендый на рэалізацыю пэўнага творчага праекта. На той час іх памер складаў 4 альбо 6 мінімальных зарплат штомесячна [112, с. 65].

Толькі ў 1997 г. творчыя саюзы здолелі дабіцца зніжэння платы за камунальныя паслугі, электраэнэргію і арэнду памяшканняў. Гэта было зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 красавіка 1997 г. № 255 «Аб мерах па дзяржаўнай падтрымцы творчых саюзаў» [497].

У такіх умовах творчыя саюзы вымушаны былі самастойна шукаць сродкі. Не заўсёды гэта ў іх атрымоўвалася. У красавіку 1997 г. Міністэрствам культуры была праведзена праверка вытворча-гаспадарчай і фінансавай дзейнасці Беларускага саюза кінематаграфістаў за 1996 г. Яна выявіла, што саюз шмат у чым не выконваў палажэнняў свайго Статута. Ім не праводзіліся конкурсы, лекцыі, выставы; не адбывалася вытворчасць, тыражыраванне і паказ кіна-, відэапрадукцыі; не адкрываліся і не ўтрымоўваліся дамы творчасці, клубы, базы адпачынку і турызму. Усе прыбыткі Беларускага саюза кінематаграфістаў былі атрыманы ад здачы ў арэнду памяшканняў будынка па вул. К. Маркса, 5, якое з'яўлялася муніцыпальнай уласнасцю.

Праверка выявіла шэраг істотных парушэнняў. Напрыклад, не выконваліся патрабаванні нарматыўных дакументаў па пытаннях аплаты працы. У выніку стаўка першага разрада неабгрунтавана была паднята да 200 %, што прывяло да недапаступлення падаткаў на прыбытак. Выдача беспрацэнтных ссудаў праводзілася з парушэннем умоў калектыўнай дамовы, без указання мэты расходавання сродкаў і ўзгаднення з прафсаюзным камітэтам.

З'яўляючыся толькі балансаўтрымальнікам будынка, саюз пайшоў на парушэнне рашэння Мінгарсавета і без дазволу ўласніка незаконна ўнёс у статутны фонд СЗАТ «Люмьер» права ўладання і карыстання нежылымі памяшканнямі плошчай 200 кв. метраў тэрмінам на 10 гадоў з пастаянна фіксаванай арэнднай платай на ўвесь тэрмін арэнды.

Нягледзячы на такія істотныя парушэнні, Міністэрства культуры выказвалася наступным чынам: «улічваючы неабходнасць захавання такой творчай арганізацыі, як Беларускі саюз кінематаграфістаў, пры ўмове поўнай ліквідацыі выяўленых праверкай парушэнняў, выпраўлення недахопаў у бухгалтар-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скім уліку, сістэме аплаты працы і выкарыстанні фінансавых сродкаў, просім аставіць на балансе саюза цяпер займаемае памяшканне па вул. К. Маркса, 6». Беларускаму саюзу кінематаграфістаў Міністэрства ўказвала на неабходнасць «безадкладна выправіць становішча ва ўзаемаадносінах з Мінгарвыканкамам. З улікам строгага выканання патрабаванняў нарматыўна-прававых актаў, рашэнняў зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў прадугледзець адлічэнні ў гарадскі бюджэт сродкаў, якія атрымліваліся ад арэнднай платы, у адпаведнасці з дзейнічаючымі нарматывамі» [439, спр. 154, арк. 226–227].

У канцы 1990-х гг. фінансава-эканамічнае становішча творчых саюзаў, як і ўсіх грамадскіх арганізацый, заставалася дрэнным. Як ужо адзначалася, адпаведна Грамадзянскаму кодэксу Рэспублікі Беларусь, статус «грамадскай арганізацыі» дазваляў «здзяйсняць прадпрымальніцкую дзейнасць толькі для дасягнення мэтаў, дзеля якіх яны былі створаны, і якая адпавядае гэтым мэтам». Такі стан рэчаў не дапускаў існаванне нават мінімальнага артыкулу прыбыткаў (напрыклад, ад правядзення дабрачынных кірмашоў, распродажу ўласных вырабаў і да т. п.). Такім чынам, арганізацыі «трэцяга сектара» былі вельмі недзеяздольнымі і слабымі, бо цалкам залежалі ад наяўнасці грантадаўцы і яго настрояў.

У пошуках фінансавання арганізацыі «трэцяга сектара» маглі накіравацца да «шырокай грамадскасці». Аднак гэты шлях у большасці выпадкаў патрабаваў тлумачэння сваёй мастацкай вартасці і вымагаў пэўнай кан'юнктуры. Галоўнымі крыніцамі фінансавання для беларускіх няўрадавых арганізацый з'яўляліся замежныя фонды. А замежнаму грантадаўцу была не заўсёды добра зразумелая сітуацыя ў краіне і стан культуры. Некаторыя арганізацыі ўжо дастаткова працяглы час існавалі за кошт дапамогі з фондаў. Для гэтага яны ахвяравалі «свабодай творчасці», падладкоўваючыся пад праекты пэўнага кшталту.

У выніку арганізацыі «трэцяга сектара» патрабавалі дапамогі ад дзяржавы. Пэўная дзяржаўная падтрымка аказваецца «зубрам» – творчым саюзам, гісторыя дзейнасці некаторых з якіх налічвала больш чым паўстагоддзя. Як адзначаў у сваім інтэрв'ю «Беларуская дзелавой газеце» ў 1998 г. тагачасны начальнік Упраўлення грамадскіх аб'яднанняў Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь М. Сухонін, дзяржава ўдзяляла вялікую ўвагу шэрагу грамадскіх і палітычна значымых напрамкаў і садзейнічала развіццю дзейнасці «трэцяга сектара», у тым ліку і праз адраснае выдзяленне бюджэтных сродкаў канкрэтным арганізацыям [617].

16 снежня 1999 г. быў прыняты *Закон «Аб творчых саюзах і творчых работніках»*. Артыкул 6 закона прысвечаны асноўным напрамкам і прынцыпам ўзаемаадносін дзяржаўных органаў і творчых саюзаў. Па сваёй сутнасці ён меў дэкларатыўны характар. Палажэнні ўтрымлівалі не канкрэтныя нормы, а пажаданні. Напрыклад, «дзяржаўныя органы могуць аказваць творчым саюзам падтрымку». Далей прыводзіўся вялікі пералік форм падтрымкі: дзяржаўныя датацыі, субсідыі, прэміі, гранты, мэтавыя і конкурсныя сацыяльна-творчыя заказы, ажыццяўленне палітыкі падаткаабкладання і рэжыму выкарыстання

валютных сродкаў, пакрыцця расходаў на правядзенне буйных культурных акцый, ільготнае карыстанне зямлёй, памяшканнямі, будынкамі, абсталяваннем, матэрыяламі, паслугамі, сродкамі сувязі, транспартам, электраэнергіяй.

Адпаведна артыкулу 7 закона, для здзяйснення агульнанацыянальных задач развіцця культуры і мастацтва, падтрымкі і развіцця талентаў творчыя саюзы мелі права ўдзельнічаць ў абмеркаванні і распрацоўцы заканадаўчых і іншых нарматыўных прававых актаў, якія адносіліся да сферы культуры і мастацтва, звяртацца ў дзяржаўныя органы з прапановамі па развіцці культуры, а таксама па сацыяльна-прававой абароне творчых работнікаў, атрымоўваць ад дзяржаўных органаў інфармацыю па пытаннях, якія датычаць дзейнасці творчых саюзаў і творчых работнікаў, свабодна распаўсюджваць інфармацыю аб сваёй дзейнасці, абараняць свае правы, а таксама аўтарскія, сумежныя і іншыя правы і інтарэсы сваіх сябраў, ствараць юрыдычныя службы і выкарыстоўваць іншыя формы прававой абароны, здзяйсняць прадпрымальніцкую дзейнасць адпаведна заканадаўству, звяртацца за дзяржаўнай падтрымкай у галіне эканамічнага рэгулявання іх дзейнасці.

Рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы маглі аказваць фінансавую дапамогу ў забеспячэнні функцыянавання аб’ектаў сацыяльна-культурнага прызначэння, якія знаходзіліся ва ўласнасці, бясплатным карыстанні творчымі саюзамі ці якія імі арандаваліся (галерэі, салоны, канцэртныя і выставачныя залі і інш.) і выкарыстоўваліся па мэтавым прызначэнні.

Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь здзяйснялі выдзяленне памяшканняў творчым саюзам (студыі, лабараторыі, майстэрні і інш.) для забеспячэння ўмоў іх дзейнасці, а таксама плошчаў для размяшчэння органаў кіравання творчымі саюзамі.

Творчыя саюзы маглі ствараць у сваёй структуры аддзяленні, секцыі, асацыяцыі, гільдыі і іншыя падраздзяленні па профілі адпаведнага віду культурнай творчасці, а таксама маладзёжныя секцыі і дзіцячыя творчыя саюзы.

У чэрвені 2000 г. Асацыяцыя грамадскіх аб’яднанняў «Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў» звярнулася да Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь з прапановамі па далейшым паляпшэнні ***ўмоў дзейнасці творчых саюзаў*** у Рэспубліцы Беларусь. Сярод іх былі пытанні вызвалення ад падатку на дабаўленую вартасць і на прыбытак, перадачы ў маёмасць саюзаў будынкаў і памяшканняў, у якіх размяшчаліся іх рэзідэнцыі, вызначэння парадку фінансавання міжнародных і дзяржаўных культурных праграм і акцый і рэжым выкарыстання валютных сродкаў на гэтыя мэты. Канфедэрацыя лічыла неабходным абавязаць Мінскі гарвыканкам выдзеліць памяшканні для размяшчэння саюзаў майстроў народнай творчасці, літаратурна-мастацкіх крытыкаў, аднавіць дзеянне палажэнняў жыллёвага заканадаўства аб выдзяленні творчым работнікам дадатковай жылой плошчы ў памеры 20 кв. метраў і аплаты яе ў аднакратным памеры, рэкамендаваць главам гарадскіх, раённых адміністрацый і выкан-камаў Саветаў народных дэпутатаў здзяйсняць прыватызацыю творчых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

майстэрань незалежна ад ведамаснай прыналежнасці будынкаў і памяшканняў, у якіх яны знаходзіліся. Канфедэрацыя прасіла дазволу з боку Урада, міністэрстваў архітэктуры і будаўніцтва, культуры, Дзяржаўнага камітэта па друку Рэспублікі Беларусь прадстаўляць бясплатныя ліцэнзіі творчым саюзам на здзяйсненне выдавецкай, гастрольна-канцэртнай дзейнасці (уключаючы рэалізацыю білетаў і абанементаў на тэатральна-відовішчныя, музычныя і культурна-асветныя мерапрыемствы). У звароце ўздымалася пытанне аб распрацоўцы Міністэрствам фінансаў праекта пастановы аб ільготах суб'ектам гаспадарання і камерцыйнай дзейнасці, якія здзяйснялі спонсарства, мецэнацтва, разавыя ахвяраванні грашовых, матэрыяльных сродкаў на мэты здзяйснення статутнай дзейнасці творчых саюзаў, установ культуры і мастацтва. Сярод прапаноў была і нечаканая – устанавіць статус дзяржаўнага служачага для работнікаў Асацыяцыі грамадскіх (!) арганізацый «Беларуская канфедэрацыя творчых саюзаў» [439, спр. 365, арк. 132].

У 2001 г. указам Прэзідэнта РБ № 374 ад 9 ліпеня творчыя саюзы Беларусі былі вызвалены ад выплаты падаткаў на прыбытак і на дабаўленую вартасць. У каментарыі да гэтага ўказа сцвярджалася, што «грамадскія аб'яднанні творчых работнікаў не ўваходзяць у дзяржаўныя структуры», аднак «ажыццяўляюць работу дзяржаўнай важнасці».

У далейшым дзяржава прадставіла шэраг ільгот ГА. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 верасня 2002 г. № 495 «Аб удасканаленні парадку вызначэння памераў арэнднай платы і перадачы ў бязвыплатнае карыстанне грамадскіх, адміністрацыйных і пераабсталяваных вытворчых будынкаў, пабудоў і памяшканняў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці» ГА, якія не здзяйсняюць вытворча-гаспадарчай дзейнасці, атрымалі льготы па арэндзе памяшканняў дзяржаўнай уласнасці.

Згаданы Указ Прэзідэнта № 495 не вырашыў матэрыяльных праблем творчых саюзаў. Шмат у чым гэты заканадаўчы акт меў негатыўныя наступствы. На падставе Дакладной запіскі ад 12 студзеня 2002 г. Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай фінансавай падтрымцы асобных грамадскіх аб'яднанняў ў 2002 г.» Міністэрства фінансаў зменшыла амаль на палову суму, якую Канфедэрацыя творчых саюзаў прасіла выдзеліць з бюджэту для ажыццяўлення сваёй дзейнасці. З 1 красавіка штатная колькасць апарата канфедэрацыі была скарочана напалову. Для атрымання бюджэтнага фінансавання творчымі саюзамі сумесна з канфедэрацыяй была распрацавана Праграма па нарошчванні духоўнага патэнцыялу грамадства і далучэнні шырокіх слаёў насельніцтва да сучасных дасягненняў культуры, літаратуры і мастацтва ў 2002 г. Аднак бюджэтнае фінансаванне не было адноўлена. У выніку над канфедэрацыяй навісла пагроза высялення з арэндуемых плошчаў, вырасла завінавачанасць па заработнай плаце, камунальных плацяжах. У падобным крытычным становішчы (на грані ліквідацыі) знаходзіліся наступныя творчыя саюзы: архітэктараў, дызайнераў, журналістаў, кампазітараў, яго аўтарскага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фонду, літаратурна-мастацкіх крытыкаў, тэатральных дзеячаў, майстроў народнай творчасці, музычных дзеячаў і Беларускі фонд культуры.

Выхад з становішча бачыўся ў вырашэнні пытання аб тэрміновым аднаўленні бюджэтнага фінансавання канфедэрацыі і аднаўленні мінімальнага фінансавання з бюджэта мерапрыемстваў творчых саюзаў. Акрамя гэтага, у звароце выказвалася думка аб неабходнасці «паскорыць з удзелам зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў стварэнне дзяржаўных прававых актаў, дазваляючых творчым саюзам і іх сябрам зарабляць сродкі на ўласную статутную дзейнасць. […] Перадаць ва ўласнасць творчым саюзам будынкі і памяшканні, у якіх у цяперашні час размешчаны іх кіруючыя органы і ўласныя прадпрыемствы. Разгледзець пытанні аб унясенні зменаў і дапаўненняў у заканадаўства Рэспублікі Беларусь па ахове аўтарскіх правоў» [439, спр. 665, арк. 123].

У 2005 г. да Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь звярнуўся старшыня Беларускага саюза кампазітараў (далей – БСК) з просьбай вырашыць наступныя праблемы: надаць саюзу статус дзяржаўнай установы, зацвердзіць штат супрацоўнікаў апарата ў колькасці 6 адзінак, вызваліць ад арэнднай платы, абсталяваць канцэртную залю і правесці касметычны рамонт памяшкання. У абгрунтаванні адзначалася: «Беларускі саюз кампазітараў не мае нічога агульнага з грамадскімі аб'яднаннямі і да 2002 года адносіўся да разраду арганізацый рэспубліканскага значэння, фінансаваўся з рэспубліканскага бюджэту, што ўключала выдаткі на камунальныя паслугі, заработную плату супрацоўнікаў і шмат іншых артыкулах, ад арэнднай платы быў вызвалены як бюджэтная арганізацыя». Кіраўніцтва саюза сцвярджала, што «на сённяшні момант склалася сітуацыя нявызначанасці: адны структуры адносяць нас да грамадскіх аб'яднанняў, другія – да творчых саюзаў, што зніжае аўтарытэт Беларускага саюза кампазітараў у грамадстве» [439, спр. 1078, арк. 47, 48].

Па прапанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у 2002 г. штат супрацоўнікаў апарата быў скарочаны з 13 да 4 адзінак. Са студзеня 2002 г. Беларускі саюз кампазітараў існаваў толькі за кошт членскіх узносаў. Супрацоўнікі апарата працавалі на грамадскіх пачатках. Міністэрства культуры «выдзяляла мінімальныя сродкі на правядзенне мерапрыемстваў, запланаваных БСК». Але гэтыя сродкі не паступалі на рахунак БСК і не ўключалі выдаткаў на заработную плату супрацоўнікаў і арэнду памяшканняў [439, спр. 1078, арк. 48].

У адказе за подпісам міністра культуры адзначалася, што ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 верасня 2002 г. № 495 грамадскаму аб'яднанню «Беларускі саюз кампазітараў» быў устаноўлены паніжаючы каэфіцыент 0,1 за арэндуемыя плошчы да 100 кв. метраў. «У той жа час, сапраўды, Беларускі саюз кампазітараў не мае магчымасці выплаты арэнднай платы і ўтрымання штатных адзінак для здзяйснення асноўнай статутнай дзейнасці, паколькі не вядзе ўласнай гаспадарчай дзейнасці» [439, спр. 1078, арк. 58–59].

Змяненне арганізацыйна-прававой формы БСК у той час не прадстаўлялася магчымым, бо «пераўтварэнне грамадскага аб'яднання ў дзяржаўную ўстанову заканадаўствам не прадугледжана». Фінансаванне грамадскага аб'яднання дзяр-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жавай бачылася магчыма толькі шляхам распрацоўкі Саюзам кампазітараў пэўнай дзяржаўнай праграмы дзейнасці на акрэслены перыяд, якая магла быць падтрымана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь [439, спр. 1078, арк. 59].

Аб важнасці канструктыўнай дзейнасці грамадскіх фарміраванняў гаварыў у сваім выступленні Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь на нарадзе «*Аб мерах па рашэнню праблем развіцця культуры і мастацтва*» ў лютым 2001 г. Ён падкрэсліў: «Усе мы жывем у адной краіне і ўсім нам неабходна думаць і клапаціцца аб яе дабрабыце. Паважаць Канстытуцыю, нашы дзяржаўныя сімвалы. Падавалася бы, гэта элементарныя абавязковыя нормы для кожнага цывілізаванага чалавека. Аднак менавіта ў творчым асяроддзі бывае гэтакая бравада і патугі рэвалюцыйных змен дзяржаўнага ладу. Сутнасць грамадзянскай супольнасці – не канфрантацыя, а сумесная канструктыўная праца грамадскіх арганізацый, рухаў, палітычных партый і ўсіх галін улады. Нам не патрэбны патрасенні і смута, нам патрэбны парадак і працвітанне краіны». Кіраўнік дзяржавы акрэсліў пазіцыю дзяржавы адносна дзейнасці творцаў, узаемаадносін дзяржавы і творцаў: «Цяпер патрэбна працаваць самастойна, уносіць свой канструктыўны ўклад у развіццё культуры, мастацтва, навукі, у эканамічны пад'ём краіны» [386].

Далейшае развіццё адносін дзяржавы і творчых саюзаў паказала, што дзяржава зацікаўлена менавіта ў канструктыўным супрацоўніцтве з творчымі саюзамі. У 2001 г. было спынена дзяржаўнае фінансаванне *Саюза беларускіх пісьменнікаў*. Саюз не здольны быў аплачваць рахункі, і ў 2006 г. рашэннем Гаспадарчага суда было прынятае рашэнне аб высяленні пісьменніцкай арганізацыі з арандуемага імі будынку (будынак Дома літаратара і паліклініка указам Прэзідэнта былі перададзены Кіраўніцтву справамі Адміністрацыі Прэзідэнта ў 1997 г.). У 2002 г. часопісы «Полымя», «Неман», «Крыніца», «Маладосць», «Всемирная литература» і газета «Літаратура і мастацтва», заснавальнікамі ці сузаснавальнікамі якіх быў Саюз беларускіх пісьменнікаў, падпарадкавалі новаўтворанай рэдакцыйна-выдавецкай установе «Літаратура і мастацтва».

У студзені 2003 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь прыняў пісьменніка, старшыню праўлення грамадскага аб'яднання «Беларускі літаратурны фонд» М. Чаргінца. Падчас сустрэчы А. Лукашэнка падкрэсліў: «Краіна і народ чакае новых цікавых твораў, якімі можна было б ганарыцца. Шмат тут залежыць ад саміх пісьменнікаў – іх адносін да народа і дзяржавы» [62].

Неканструктыўныя працэсы, якія адбываліся ў шэрагах Саюза беларускіх пісьменнікаў, прывялі да расколу арганізацыі. 18 лістапада 2005 г. адбыўся ўстаноўчы сход новай арганізацыі – *Саюза пісьменнікаў Беларусі*, якую ўзначаліў М. Чаргінец. У сваім звароце да літаратурнай грамадскасці краіны ўстаноўчы сход адзначаў: «На працягу больш чым дзесяцігоддзя Саюз пісьменнікаў усё болей палітызаваўся, на вачах ператварыўшыся ў саюзніка агрэсіўнага нацыяналізму і кан'юнктурнага палітыканства. Агрэсіўныя антыдзяржаўныя выпады працягвалі і працягваюць сыпацца адзін за другім, робіцца спроба падставіць пад сумнеў рэальныя дасягненні народа па ўсіх напрамках жыцця

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

і дзейнасці краіны. Праблемы творчасці ўсё менш хвалююць цяперашняе кіраўніцтва Саюза беларускіх пісьменнікаў. Званне пісьменніка з'яўляецца вельмі важным для нашай дзяржавы, і таму лёс гэтай прафесіі нельга давяраць кучцы палітыкаў ад літаратуры» [615].

Саюз беларускіх пісьменнікаў вымушаны быў не толькі змяніць юрыдычны адрас, але і перабудаваць сваю дзейнасць. У 2002 г. ён заснаваў новы часопіс «Дзеяслоў».

У лютым 2006 г. Міністэрства юстыцыі звярнулася ў Вярхоўны суд з прапановай ліквідацыі Саюза беларускіх пісьменнікаў, бо арганізацыя неаднаразова парушала патрабаванні Закона «Аб грамадскіх арганізацыях». У прыватнасці, арганізацыя згубіла ў чэрвені 2002 г. арыгінал Статута, а кіраўніцтва на працягу некалькіх гадоў не прадстаўляла ў рэгіструючы орган дакументы, неабходныя для вырабу дубліката. На будынку Дома літаратараў вісела таблічка з выявай герба «Пагоня», а таксама ГА на працягу чатырох месяцаў выкарыстоўвала няправільна выраблену пячатку і са студзеня 2003 г. не мела законнага юрыдычнага адрасу. Кіраўніцтва Саюза здолела выправіць парушэнні і прадставіла дакументы, якія гэта пацвердзілі. 22 мая 2006 г. іскавая заява аб ліквідацыі грамадскага аб'яднання была адклікана.

У той жа час з мэтай аказання дзяржаўнай падтрымкі грамадскаму аб'яднанню «Саюз пісьменнікаў Беларусі» 7 верасня 2006 г. Прэзідэнт падпісаў Указ № 564 «Аб некаторых пытаннях дзейнасці грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі" і аб унясенні зменаў і дапаўненняў у асобныя ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

Указам даручалася прыняцце шэрагу мер па забеспячэнні дзяржаўнага фінансавання дадзенай грамадскай арганізацыі (аплата працы работнікаў цэнтральнага апарата кіравання і кіравання абласных і Мінскага гарадскога аддзяленняў, выдаткі на транспарт, камандзіроўкі, камунальныя паслугі, паслугі сувязі, забеспячэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы і забеспячэнне мерапрыемстваў па прапагандзе мастацкай літаратуры). Упраўленню справамі Прэзідэнта было даручана выдзеліць ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» памяшканні для размяшчэння яго праўлення на аснове дагавора арэнды, а таксама вырашыць пытанні забеспячэння дадзенага ГА транспартнымі сродкамі, аргтэхнікай і сродкамі сувязі, а таксама іх абслугоўвання. Аблвыканкамам і Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту даручалася выдзеліць памяшканні для саветаў абласных і Мінскага гарадскога аддзялення Саюза і вырашыць пытанні фінансавання выдаткаў па аплаце працы работнікаў саветаў гэтых аддзяленняў і здзяйснення іх статутнай дзейнасці.

Такім чынам, грамадскія аб'яднанні ў вывучаемы перыяд сталі актыўнымі дзеячамі культурнага жыцця Беларусі. Гэта разнастайныя нацыянальныя суполкі, творчыя саюзы і аматарскія таварыствы. Акрамя рэалізацыі культурных правоў сваіх сяброў яны імкнуліся актыўна ўплываць на працэсы прыняцця рашэнняў у галіне культуры, здзяйсняць грамадскі кантроль за сферай культурнага жыцця нашай краіны. У краіне на заканадаўчым узроўні былі за-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кладзены асновы механізму мэтанакіраванага і эфектыўнага ўдзелу грамадскіх структур у гэтым напрамку.

Праведзены намі аналіз дазваляе вызначыць чатыры перыяды, якія адлюстроўваюць змены дзяржаўнай культурнай палітыкі ў аспекце далучэння грамадскасці да выпрацоўкі і рэалізацыі культурнай палітыкі.

*Першы перыяд – 1991–1996 гг.* Ён вызначаўся шырокай дэмакратызацыяй грамадска-палітычнага жыцця. Значна павялічылася колькасць творчых саюзаў і аб'яднанняў дзеячаў культуры і мастацтва. Быў прыняты Закон «Аб грамадскіх аб'яднаннях» (1994). Творчыя саюзы наладзілі культурна-камерцыйную дзейнасць. Побач з гэтым яны былі пазбаўлены падатковых ільгот і вымушаны былі разгарнуць актыўную дзейнасць за іх вяртанне. У новым Законе 1992 г. «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» не былі захаваны палажэнні аб удзеле прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый і грамадзян у ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры, існаваўшыя з 1978 г.

*Другі перыяд – 1997–1999 гг.* Вызначаецца актыўным змаганнем творчых саюзаў за свае правы і адначасовым узмацненнем дзяржаўнага кантролю за дзейнасцю грамадскіх аб'яднанняў. Асобным указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь творчыя саюзы атрымалі дзяржаўную падтрымку (1997 г.). Была створана сістэма адраснага выдзялення бюджэтных сродкаў канкрэтным арганізацыям. Аднак адбылося выключэнне прадстаўнікоў Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры са складу Навукова-метадычнай рады Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Заўважаўся істотны рост колькасці грамадскіх арганізацый, асноўным напрамкам дзейнасці якіх з'яўлялася культура і мастацтва. Быў прыняты Закон «Аб творчых саюзах і творчых работніках» (1999). На заканадаўчым узроўні было замацавана права творчых саюзаў удзельнічаць ў абмеркаванні і распрацоўцы заканадаўчых і іншых нарматыўных прававых актаў, якія адносіліся да сферы культуры і мастацтва, звяртацца ў дзяржаўныя органы з прапановамі па развіцці культуры, а таксама па сацыяльна-прававой абароне творчых работнікаў.

*Трэці перыяд – 2000–2006 гг.* Першыя спробы стварэння пастаянна дзейнічаючага кансультатыўнага Грамадскага савета па праблемах культуры і мастацтва (2000 г.). Павелічэнне колькасці рэгіянальных грамадскіх арганізацый, якія займаліся рознымі аспектамі культурнай дзейнасці. У краіне дзейнічала шырокая сетка нацыянальна-культурных аб'яднанняў, адбылося ўваходжанне прадстаўнікоў творчых саюзаў у Аўтарскі савет пры Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве інтэлектуальнай уласнасці (2004 г.). У новую рэдакцыю Закона «Аб культуры» ўвайшло палажэнне аб ажыццяўленні дзяржаўнымі органамі рэгулявання і кіравання ў галіне культуры ва ўзаемадзеянні з творчымі саюзамі і іншымі грамадскімі арганізацыямі. Закон прадугледжваў магчымасць стварэння арганізацыйных асноў такога ўзаемадзеяння ў форме грамадскіх саветаў і іншых кансультацыйных органаў. Важным дасягненнем гэтага перыяду з'яўляецца вяртанне страчанага яшчэ ў 1993 г. права грамадскіх арганізацый на здзяйсненне грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства Рэспуб-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама ўнясенне ў дзяржаўныя ўстановы прапаноў па гэтым пытанні. У новай рэдакцыі прыняты Закон «Аб грамадскіх арганізацыях» (2005 г.), які значна абмежаваў грамадскія арганізацыі ў магчымасцях здзяйснення вытворча-гаспадарчай дзейнасці.

У 2001 г. творчыя саюзы былі вызвалены ад выплаты падаткаў на прыбытак і на дабаўленую вартасць. У 2002 г. грамадскім арганізацыям, якія не здзяйснялі вытворча-гаспадарчую дзейнасць, далі шэраг ільгот па арэндзе памяшканняў. Побач з гэтым адбылося значнае скарачэнне бюджэтнага фінансавання творчых саюзаў. Прэзідэнтам краіны была акрэслена новая палітыка дзяржавы адносна творцаў, накіраваная на прадстаўленне ім самастойнасці ў пошуку сродкаў. Гэта азначала спыненне выдзялення з дзяржаўнага бюджэту сродкаў на дзейнасць творчых саюзаў. Пачынаючы з 2002 г. яны сталі існаваць амаль выключна на грамадскіх пачатках. Адбылося значнае скарачэнне супрацоўнікаў цэнтральных апаратаў творчых саюзаў. Пачаў фарміравацца новы механізм фінансавання дзейнасці творчых саюзаў з дзяржаўнага бюджэту – праз фінансаванне распрацаваных і зацверджаных на вышэйшым узроўні праграм культурнай дзейнасці. На гэты час прыпадае канфлікт органаў дзяржаўнага кіравання і ўлады з Саюзам беларускіх пісьменнікаў.

*Чацвёрты перыяд – 2007–2010 гг.* Значная актывізацыя працы грамадскіх арганізацый па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны. Далейшае развіццё атрымаў працэс фарміравання механізма мэтанакіраванага і эфектыўнага ўдзелу грамадскіх структур у працэсах прыняцця рашэнняў у галіне культуры, здзяйснення грамадскага кантролю за сферай культурнага жыцця нашай краіны. Адбылося ўваходжанне прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый у створаную пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь грамадскую назіральную камісію па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (2009 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глава
# 4 УДЗЕЛ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў КУЛЬТУРНЫМ ЖЫЦЦІ

## 4.1. Дынаміка культурнай актыўнасці насельніцтва

Істотныя змены ў жыцці грамадства, якія адбыліся дзякуючы ўкараненню дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, а таксама змены ў грамадска-палітычным і сацыяльна-эканамічным жыцці аказалі значнае ўздзеянне на форму ўдзелу ў культурным жыцці насельніцтва. Свабода выбару пашырылася, «прапанова» стала значна больш разнастайнай і даступнай. Гэта паставіла пад сумненне базавыя звычкі «спажыўцоў». Змяніўся і сам «спажывец», адбыўся значны падзел па ўзроўні даходаў, з’явіліся новыя сацыяльныя группы (індывідуальныя прадпрымальнікі, бізнесмены і да т. п.). Гэта паўплывала і на попыт на культурную прадукцыю.

У вызначаны перыяд працягваўся працэс ***уніфікацыі спажывання***. Напаўненне вольнага часу адбывалася за кошт прагляду тэлебачання, відэа, праслухоўвання аўдыёзапісаў, баўлення ў камп’ютарныя гульні і г. д. У кватэрах на працягу двух дзесяцігоддзя спачатку з’явіліся такія віды бытавой тэхнікі, як прайгравальнікі лазерных дыскаў і відэамагнітафоны, затым сістэмы спадарожнікавага тэлебачання і камп’ютары, а пазней безлімітны інтэрнэт з лічбавым тэлебачаннем. Так, з 1998 па 2010 г. колькасць розных магнітафонаў і відэакамер у насельніцтва павялічылася ў 4 разы, тэлевізараў з каляровым выяўленнем – амаль удвая. Калі ў 1998 г. персанальны камп’ютар мелі толькі заможныя сем’і, то ў 2010 г. такой тэхнікі налічвалася 44 адзінкі на 100 сем’яў (гл. табл. 1). За 15 гадоў (з 1995 по 2010 г.) з 61,5 да 98,5 % павялічылася доля хатніх гаспадарак, якія мелі тэлевізар з каляровым выяўленнем і больш чым у 11 разоў (з 5 % да 55,6 %) – хатніх гаспадарак, у якіх было прыстасаванне для запісу і прагляду відэа [740, с. 109; 741, с. 21]. За пяць гадоў (з 2005 па 2010 г.) больш чым у 3 разы павялічылася доля гаспадарак, у якіх быў персанальны камп’ютар (з 12,8 да 40,8 %) [261, с. 80]. Лічбавыя тэхналогіі стварылі новыя перспектывы для правядзення вольнага часу. З’явілася магчымасць устанавіць дома хатні кінатэатр ці сапраўдную студыю гуказапісу. З дапамогай персанальнага камп’ютара і відэакамеры непрафесіянал атрымаў магчымасць самастойна зняць фільм.

Такія віды вольнага часу патрабавалі значных фінансавых затрат. Пры гэтым ***самым папулярным відам правядзення вольнага часу*** заставалася ***тэлебачанне***. Па выніках сацыялагічнага апытання, праведзенага Інфармацыйнааналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у 2007 г. да *тэлебачання* больш-менш рэгулярна звярталася 97 % рэспандэнтаў. Кабельнае тэлебачанне глядзелі 22 % апытаных. Па дадзеных апытання студэнтаў, якое было праведзена ў снежні 2007 г., 54 % з іх глядзелі тэлеперадачы практычна штодзённа [680, с. 57, 58].

У 2010 г. кабельным тэлебачаннем карысталіся 48,8 %, эфірным – 39,6, спадарожнікавым – 16,2 % жыхароў [681, с. 69].

*Табліца 1.* **Наяўнасць прадметаў тэхнікі ў хатніх гаспадарках (на 100 хатніх гаспадарак, шт.) [740, с. 107; 741, с. 21]**

| Прадмет тэхнікі | Год | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 1998 | 2000 | 2005 | 2010 |
| Тэлевізары з каляровым выяўленнем | 81 | 89 | 118 | 149 |
| Персанальныя камп'ютары | – | 2 | 13 | 44 |
| Відэа-, DVD-магнітафоны, відэакамеры | 15 | 20 | 38 | 67 |

Аб тым, што тэлебачанне з'яўляецца асноўным відам правядзення вольнага часу, сведчаць паказчыкі часу, які штодзень праводзіцца перад тэлевізарам. У 2010 г. большасць насельніцтва (63,1 %) у сярэднім штосутачна траціла звыш адной гадзіны на прагляд тэлепраграм, у тым ліку 22 % рэспандэнтаў глядзелі тэлевізар звыш трох гадзін у суткі. Сярод моладзі гэтыя паказчыкі ніжэй – 48,2 % (у тым ліку 12,8 % глядзелі тэлебачанне звыш трох гадзін у суткі). Колькасць маладых людзей, якія ўвогуле не глядзелі тэлевізар, была ў 2 разы вышэй за сярэдні паказчык па рэспубліцы (8,9 %). Аўдыторыю тэлебачання забраў Інтэрнэт, у карыстальнікаў якім час прагляду тэлепраграм быў аналагічны з тым жа паказчыкам для маладзёжнай аўдыторыі – 52,6 % глядзелі тэлевізар звыш адной гадзіны [681, с. 71]. У сацыяльных сетках распаўсюдзілася выказванне, якое трапна характарызуе праблему культурных запатрабаванняў і самога спажыўца: «памер дыяганалі тэлевізара адваротна прапарцыянальны ўзроўню інтэлекту».

У канцы 2000-х гг. захавалася і нават узмацнілася тэндэнцыя да павелічэння ўзросту аўдыторыі асноўных рэспубліканскіх тэлеканалаў. Гэта галоўным чынам людзі старэйшых узроставых груп без істотных адрозненняў ва ўзроўні адукацыі. Замежныя тэлеканалы неэфірнага сегменту тэлебачання ў большай ступені цікавілі больш маладую і адукаваную аўдыторыю (пераважна з вышэйшай адукацыяй) [681, с. 71].

На другім месцы па папулярнасці сярод сродкаў масавай інфармацыі пасля тэлебачання быў *перыядычны друк*. Да яго ў 2007 г. звярталіся 83 % жыхароў краіны [680, с. 58]. Да пастаяннай аўдыторыі прэсы ў 2011 г. адносілася 59 % усяго насельніцтва, старэйшага за 18 гадоў. З яго 22,2 % чыталі газеты практычна штодзённа і 36,8 % звярталіся да іх хаця б раз на тыдзень. Увогуле не чыталі газет 17,9 % рэспандэнтаў і яшчэ 22,6 % звярталіся да іх эпізадычна [681, с. 79, 80].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2010 г. штотыднёвікі набывалі ці выпісвалі 58,9 % апытаных, штодзённыя газеты карысталіся папулярнасцю ў 27,4 % рэспандэнтаў. Электронныя версіі друкаваных выданняў чыталі 8,9 % апытаных [681, с. 73, 82].

Заўважна меншай папулярнасцю карысталася *радыё*, да якога ў 2007 г. звярталіся 65 % удзельнікаў апытання [680, с. 58]. У 2009 г. гэты паказчык склаў толькі 42,4 %, пры гэтым штодзённа радыё слухалі 30,3 % насельніцтва. Да яго часцей звярталіся пенсіянеры (50,9 %), рабочыя бюджэтнай сферы (48,5 %), моладзь (36,8 %); сяляне больш, чым гараджане (46,9 і 41 % адпаведна) [682, с. 60].

Калі параўнаць прыведзеныя паказчыкі з атрыманамі ў 1995 г. у выніку апытання, праведзенага супрацоўнікамі Беларускага інстытута праблем культуры ў 1995 г. у чатырох абласцях краіны (Гомельскай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай), то можна заўважыць некаторыя змены [306, с. 39]. За гэты час насельніцтва стала больш глядзець тэлебачанне (74,5 % у 1995 г. супраць 97 % у 2007 г.), менш слухаць радыё (51,1 % у 1995 г. і 30,3 % у 2008 г.). Паказчыкі чытачоў прэсы амаль не змяніліся (51,1 % у 1995 г. і 59 % у 2011 г.).

Працэсы глабалізацыі відазмянілі ***арыентацыі моладзі*** ў сферы правядзення вольнага часу. Адны віды дзейнасці страцілі сваю папулярнасць і шырокую распаўсюджанасць (тэхнічная творчасць, мастацкія і народныя промыслы), іншыя істотна змяніліся па сваім змесце (дыскатэкі, чытанне). Акрамя гэтага з'явіліся абсалютна новыя віды дзейнасці, якія раней не прысутнічалі ў сферы вольнага часу (Інтэрнэт). Сусветная інфармацыйная сетка прадставіла новыя магчымасці ў сферы культуры, дазволіла сфарміраваць альтэрнатыўныя традыцыйным захапленні і хобі, якія занялі важнае месца ў сферы актыўнага правядзення вольнага часу. Напрыклад, шырокае распаўсюджанне набыла камп'ютарная мультыплікацыя і камп'ютарны жывапіс. Усё больш прыхільнікаў набывала захапленне камп'ютарнай графікай і дызайнам [87, с. 342, 343].

У канцы 2007 г. ім карысталіся 80 % студэнтаў, з якіх 30 % практычна штодзённа [680, с. 60]. У 2009 г. да *Інтэрнэта* практычна штодзённа звярталіся 35,1 % моладзі ва ўзросце да 30 гадоў. У цэлым па краіне сярод усяго дарослага насельніцтва ім карысталіся штодзённа 13,7 %. Пры гэтым назіралася істотная дыспрапорцыя паміж горадам і вёскай (адпаведна 18 і 0,3 %) [682, с. 44].

Згодна з дадзенымі еўрапейскага агенцтва па інтэрнэт-даследаваннях Gemius Belarus за кастрычнік 2008 г., 12 % інтэрнэт-карыстальнікаў выкарыстоўвалі Інтэрнэт у мэтах загрузкі музыкі, 7,1 – загрузкі відэа, 2,9 – прагляду відэа. У маі 2010 г. сацыялагічнае апытанне, праведзенае прыватным прадпрыемствам «МАКСМИ БИ» ў Мінску і абласных гарадах, выявіла, што 36,5 % карыстальнікаў сеткі Інтэрнэт выкарыстоўвалі яе для скачвання аўдыё/відэаматэрыялаў, праграм [799, с. 351–352].

Дзейнасць па інтарэсах у хатніх умовах пры наяўнасці аудыё- і відэаапаратуры, спадарожнікавага і кабельнага тэлебачання, камп'ютара і інтэрнэта стала больш прывабнай за правядзенне вольнага часу па-за домам.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Статыстычныя дадзеныя дазваляюць гаварыць аб істотных зменах у спажыванні насельніцтвам некаторых культурных паслуг, якія прапануюцца ***установамі культуры*** (табл. 2). Самым істотным было падзенне колькасці наведвальнікаў кінатэатраў (у 11 разоў за 21 год), скарачэнне ў 2,5 разы слухачоў канцэртных устаноў. Адным з фактараў, які на гэта паўплываў, стала распаўсюджанне новых тэхналогій. Значна меншае ўздзеянне яны аказалі на наведванне бібліятэк і тэатраў. А вось паказчыкі наведванняў музеяў сведчаць аб адваротным працэсе – пасля падзення на мяжы стагоддзя адбыўся іх істотны рост.

*Табліца 2.* **Колькасныя паказчыкі абслугоўвання насельніцтва культурна-асветнымі і тэатральна-відовішчнымі ўстановамі (на 100 чал.) [360, с. 32, 48, 53, 77, 107, 138; 699, с. 241]**

| Паказчык | Год | | |
|---|---|---|---|
| | 1990 | 2000 | 2010 |
| Клубы. Колькасць платных наведванняў | – | – | 132 |
| Кінапракат. Колькасць гледачоў | 1150 | 119 | 100 |
| Бібліятэкі. Колькасць чытачоў | 47 | 45 | 40 |
| Музеі. Колькасць наведвальнікаў | 45 | 38 | 53 |
| Відэазалы і відэасалоны. Колькасць наведвальнікаў | 48 | 22 | 63 |
| Канцэртныя ўстановы. Колькасць слухачоў | 48 | 19 | 20 |
| Тэатры. Колькасць гледачоў | 26 | 21 | 21 |

Як можна заўважыць, за два дзесяцігоддзі адбыліся некаторыя змены ў перавагах спажыўцоў культурных паслуг. Калі ў 1990 г. паказчыкі наведвання бібліятэк, музеяў, канцэртных устаноў, відэазалаў і відэасалонаў былі амаль аднолькавымі, то ў 2010 г. назіраліся істотныя разыходжанні. Спажывец у 2010 г. больш наведваў відэазалы і відэасалоны, затым накіроўваўся ў музей, радзей – у бібліятэку і зусім рэдка – на канцэрт ці ў тэатр.

Нягледзячы на змены ў культурных перавагах насельніцтва ў адзначаны перыяд, у цэлым па рэспубліцы яго выдаткі на паслугі ўстаноў культуры заставаліся амаль без змен да канца 1990-х гг. Пасля назіралася павелічэнне. Паказчыкі 2005 і 2010 гг. былі на 50 % большыя за паказчыкі 1990 і 1995 гг. (табл. 3).

*Табліца 3.* **Структура грашовых выдаткаў насельніцтва па Рэспубліцы Беларусь (у % да выніку, усе выдаткі – 100 %) [201, с. 23; 360, с. 17]**

| Паказчык | Год | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1990 | 1995 | 1999 | 2005 | 2010 |
| Выдаткі на кіно, тэатр і іншыя відовішчы | 0,4 | 0,4 | 0,5 | – | – |
| На паслугі ўстаноў культуры | – | – | – | 0,6 | 0,6 |

Дадзеныя табл. 4 сведчаць аб залежнасці выдаткаў на паслугі культуры ад эканамічнага стану хатніх гаспадарак. Так, у перыяд крызісу 2009 г. назіралася іх істотнае змяншэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 4.* **Удзельная вага выдаткаў хатніх гаспадарак на паслугі ўстаноў культуры ў пераліку на аднаго члена ў агульным аб'ёме выдаткаў на паслугі за 2005–2010 гг., % [360, с. 24]**

| Год | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
| 3,0 | 3,2 | 3,3 | 3,2 | 2,4 | 2,6 |

Адначасова можна прасачыць дынаміку *платных паслуг* насельніцтву, якія аказалі ўстановы культуры. За 1991–2010 гг. найлепшым быў паказчык 2000 г. Аднак і ён складаў толькі палову ад перадкрызіснага 1990 г. (табл. 5). Гэта можа сведчыць аб пераразмеркаванні густаў насельніцтва ці росце цэн на іншыя паслугі. Напрыклад, у 2005–2010 гг. назіраўся рост у 6 разоў дадзенага паказчыка на турыстычна-экскурсійнае абслугоўванне (з 0,5 % у 2005 г. да 3 % у 2010 г.) і двухразовае павелічэнне платных паслуг у сферы спорту (з 0,5 % у 2005 г. да 1,0 % у 2010 г.) [360, с. 23].

*Табліца 5.* **Платныя паслугі насельніцтву ўстаноў культуры (у працэнтах да ўсіх аказаных паслуг, %) [360, с. 24; 739, с. 160]**

| Год | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 1990 | 1995 | 2000 | 2005 | 2010 |
| 3,7 | 1,3 | 1,9 | 1,3 | 1,6 |

У 2005 г. супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры было праведзена даследаванне рэальных запатрабаванняў гарадскога насельніцтва Магілёўскай вобласці ў сферы мастацкай культуры [455]. Яно паказала, што большасць насельніцтва мала наведвала ўстановы культуры і мастацтва. На спажыванне мастацтва і спосабы далучэння да яго значнае ўздзеянне аказвала пасрэдная сацыяльная актыўнасць людзей у розных сферах жыцця. Толькі пятая частка насельніцтва імкнулася да праявы самастойнасці, ініцыятыўнасці ў працы, пошуку новых рашэнняў. Сярод базавых каштоўнасцей, якія вызначаюць сэнс жыцця людзей, значную ролю займала сям'я (шчаслівае сямейнае жыццё). У самой сям'і найбольшай каштоўнасцю з'яўляліся дзеці. Дзеля духоўнага здароўя дзяцей бацькі клапаціліся аб іх адукацыі, разам наведвалі ўстановы мастацтва, рабілі больш разнастайным іх вольны час. Цікаўнасць бацькоў да мастацтва ўзрастала з памерамі гораду (больш развітай інфраструктурай культуры) – ад 51,7 % у Горках да 61,0 % у Магілёве.

Сярод відаў мастацтва, якія выклікалі найбольшую цікаўнасць, вызначаліся (у ранжыраваным выглядзе): кіно, мастацкая літаратура, музыка, тэатр, выяўленчае мастацтва.

У дзейнасці, звязанай з правядзеннем вольнага часу, апытаныя адзначылі каля 30 відаў заняткаў. На першым месцы (62,6 %) знаходзіўся прагляд тэлеперадач, на другім – адпачынак на прыродзе (50,2 %). У вольны час слухалі му-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зыку 40,8 % апытаных, чыталі мастацкую літаратуру – 38,3, наведвалі музычныя канцэрты – 23,6, кінатэатры – 13,5, тэатры – 11,1, мастацкія музеі і выставы – 11,0 %. Гэтыя лічбы па такіх паказчыках, як наведанне кінатэатраў і канцэртаў, не істотна адрозніваюцца ад агульных дадзеных па краіне, прыведзеных у табл. 2. Нізкае наведанне тэатраў і музеяў можна патлумачыць адсутнасцю выбару такіх устаноў.

Амаль 30 % насельніцтва рэгіёна не цікавілася ні тэатральным, ні выяўленчым мастацтвам. Яны аддавалі перавагу прагляду тэлепраграм, які лічылі адэкватнай заменай устаноў культуры. Найбольшай папулярнасцю ў такіх людзей карысталіся кінафільмы (52,0 %) і музычныя канцэрты (22,4 %). У цэлым тэлевізійныя перадачы глядзелі 97,4 % апытаных. Радыё пастаянна слухалі 70,9 % апытаных.

Даследаванне зафіксавала тэндэнцыю да пераключэння насельніцтва на хатнія формы спажывання кінапрадукцыі. Так, у 2005 г. 69,1 % апытаных Магілёўскай вобласці мелі дома прыстасаванні для прагляду відэафільмаў. Кожны трэці рэспандэнт адзначыў, што глядзіць на відэа 1–3 фільмы за тыдзень.

Новыя формы правядзення вольнага часу адмоўна паўплывалі і на чытанне. Сацыялагічнае даследаванне моладзевага асяроддзя, праведзенае ў 2007 і 2009 гг. супрацоўнікамі Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, вызначыла, што 43,5 % апытаных у асноўным вольны час аддавалі чытанню, а ў асяроддзі студэнтаў і навучэнцаў – 60 %. Сярод іншых напрамкаў актыўнага правядзення вольнага часу вучнямі школ і прафтэхвучылішч вызначаліся маляванне, лепка, роспіс па дрэве (12 %). Сачыненнем вершаў і прозы займаліся звыш 5 % навучэнцаў і звыш 8 % студэнтаў. Дадатковай адукацыяй – 19,3 % апытаных. Аднак спецыялісты адзначалі, што ў хатнім правядзенні вольнага часу моладзі ў другой палове 2000-х гг. пад уплывам шырокага распаўсюджання тэлебачання, кінаіндустрыі, сеткі Інтэрнэт намецілася і ўзмацнілася тэндэнцыя негатыўнага характару – выцясненне актыўных форм правядзення вольнага часу пасіўным адпачынкам («нічоганерабленнем»). Апошняе было характэрна для 8 % апытаных юнакоў і дзяўчат. Праглядам тэлеперадач і відэапраграм займаліся 38,6 % апытаных [87, с. 338–339].

Калі характарызаваць правядзенне вольнага часу па-за домам, то кожны трэці рэспандэнт (32,9 %) наведваў тэатр і кіно ці займаўся фізкультурай і спортам (31,3 %). Амаль 30 % навучэнцаў і студэнтаў удзельнічалі ў даследчых і мастацкіх калектывах (музычных, танцавальных) [87, с. 339].

Асноўную ролю ў прадстаўленні шырокіх магчымасцей для выкарыстання насельніцтвам свайго вольнага часу, разумнага і культурнага адпачынку, выхавання дзяцей, заняткаў спортам, самадзейнай творчасцю, стварэння розных формаў баўлення, асветніцтва, развіцця культурна-творчай дзейнасці належала ***ўстановам культуры клубнага тыпу***. За два дзесяцігоддзі іх колькасць зменшылася на 30 %.

Колькасць удзельнікаў клубных фарміраванняў за 2005–2010 гг. зменшылася з 3,8 % да 3,6 % ад усяго насельніцтва – з 369,5 тыс. да 348,1 тыс. чалавек

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[360, с. 138]. Па выніках даследавання рэальных запатрабаванняў гарадскога насельніцтва Магілёўскай вобласці ў сферы мастацкай культуры ў 2005 г. кожны пяты апытаны наведваў заняткі розных гурткоў, секцый, студый. У мастацкіх гуртках займалася 4,5 % рэспандэнтаў [455, с. 48].

Абагульненне вопыту арганізацыі мастацкіх калектываў дазваляе вылучыць асноўныя напрамкі іх творчай дзейнасці. Першае месца сярод іх займалі студыі, аматарскія калектывы мастацкай творчасці. На другім месцы знаходзіліся аматарскія аб'яднанні, клубы па інтарэсах. Іх колькасць на працягу ўсяго перыяду нязначна павялічылася. Найбольш істотныя змены ў бок змяншэння перажылі гурткі, курсы, майстэрні. Тут назіралася падзенне за 2005–2010 гг. у 3 разы (табл. 6).

*Табліца 6.* **Клубныя ўстановы і клубныя фарміраванні [360, с. 138; 632, с. 14]**

| Паказчык | Год | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1990 | 1995 | 2000 | 2005 | 2010 |
| Агульная колькасць клубных устаноў, у тым ліку: | 6030 | 4858 | 4654 | 4093 | 3695 |
| Міністэрства культуры | 5030 | 4399 | 4270 | 3838 | 3498 |
| арганізацый іншых органаў кіравання | 1000 | 459 | 384 | 255 | 197 |
| Знаходзіліся на сяле з агульнай колькасці клубных фарміраванняў | 5147 | 4205 | 4043 | 3548 | 3124 |

*Табліца 7.* **Клубныя фарміраванні [360, с. 140–141]**

| Паказчык | Год | |
|---|---|---|
| | 2005 | 2010 |
| Колькасць клубных фарміраванняў | 28734 | 27630 |
| *з іх для дзяцей* | 14476 | 14149 |
| У тым ліку: | 5040 | 5643 |
| аматарскія аб'яднанні, клубы па інтарэсах | | |
| у іх *удзельнікаў*, тыс. чал. | 101,0 | 105,9 |
| гурткі, курсы, майстэрні | 2930 | 945 |
| у іх *удзельнікаў*, тыс. чал. | 34,7 | 13,9 |
| Студыі, аматарскія калектывы мастацкай творчасці | 19496 | 19768 |
| у іх *удзельнікаў*, тыс. чал. | 214,8 | 212,8 |
| З іх колькасць: | | |
| вакальна-харавыя | 7801 | 7223 |
| у іх *удзельнікаў*, тыс. чал. | 89,8 | 77,8 |
| харэаграфічныя | 2811 | 2637 |
| у іх *удзельнікаў*, тыс. чал. | 45,3 | 43,3 |
| тэатральныя | 3392 | 3137 |
| у іх *удзельнікаў*, тыс. чал. | 36,9 | 33,3 |
| музычна-інструментальныя | 1014 | 767 |
| у іх *удзельнікаў*, тыс. чал. | 10,5 | 7,8 |
| Колькасць іншых клубных фарміраванняў | 1268 | 1274 |
| у іх *удзельнікаў*, тыс. чал. | 19,1 | 15,5 |
| Колькасць калектываў са званнем «народны», «узорны» | 1541 | 1774 |
| у іх *удзельнікаў*, тыс. чал. | 36,6 | 39,2 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значную колькасць аматарскіх калектываў складалі вакальна-харавыя (хор, ансамбль з акадэмічнай, народнай, эстраднай манерай выканання і інш.), тэатральныя (драматычныя, музычныя, лялечныя тэатры, тэатры паэзіі, пантамімы, мініяцюр і інш.) і харэаграфічныя (народны, класічны, бальны, эстрадны танец і інш.) аб’яднанні. Істотна паменела за апошнія пяць гадоў музычна-інструментальных (аркестры, ансамблі народных інструментаў, духавой, эстраднай, джазавай музыкі і інш.) калектываў (гл. табл. 7).

Насельніцтва магло задаволіць свае творчыя інтарэсы таксама ў студыях дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва (студыі жывапісу, лоза- і саломапляцення, керамікі, вышыўкі і ткацтва, фларыстыкі, апрацоўкі дрэва і скуры і інш.) у цыркавых, фота-, слайд-, кіна-, відэастудыях. Аматарская творчасць характарызавалася багатай жанрава-відавой разнастайнасцю як мастацкіх калектываў, так і аб’яднанняў аматараў мастацтва (клубы аматарскай песні, класічнай музыкі, народнай песні, тэатра, жывапісу, джаз-клубы, клубы самадзейных кампазітараў і паэтаў, артклубы і інш.).

З мэтай падтрымкі і стымулявання аматарскай мастацкай творчасці, павышэння яе ўплыву на працэсы развіцця грамадскай актыўнасці, далучэння да мастацка-эстэтычных каштоўнасцей розных груп насельніцтва ў Беларусі праводзіліся шматлікія святы, канцэрты, конкурсы, агляды і іншыя сацыяльна-культурныя акцыі. У 2000-я гг. штогод праводзілася каля 50 разнастайных фестываляў аматарскай творчасці. Сярод іх былі традыцыйнымі: фестываль аматарскай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», песні і музыкі «Дняпроўскія галасы», юных талентаў «Зямля пад белымі крыламі», народнага танца «Беларуская полька», тэатральнага «Тэатральныя скрыжаванні», фестываль народнай творчасці ветэранскіх калектываў «Не старэюць душой ветэраны», фальклорнага мастацтва «Берагіня». Галоўным аглядам стану аматарскай мастацкай творчасці краіны быў фестываль народнага мастацтва «Беларусь – мая песня» (1997–1998 гг., 2004–2005 гг., 2010–2011 гг.) [408, с. 9–11].

Даследаванні, праведзеныя навукова-творчай групай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у розных абласцях і этнарэгіёнах Беларусі на працягу 1993–2007 гг., дазволілі вызначыць асноўныя тэндэнцыі развіцця аматарскай мастацкай творчасці. Сярод іх: актывізацыя грамадскага інтарэсу да відаў мастацкай творчасці, заснаваных на гісторыка-культурных традыцыях; паступовы рост выканальніцкага майстэрства аматарскіх калектываў; рост ролі індывідуальнага фактару пры выбары відаў аматарскай дзейнасці, форм арганізацыі вольнага часу, зместу яго запаўнення; устаноўка на самапраяўленне і самавызначэнне, не столькі на сумесную калектыўную дзейнасць, колькі на асабісты кантакт з мастацтвам праз аматарства (выяўленчае мастацтва, народныя промыслы, дызайн, бардаўскую песню, сольныя эстрадныя спевы). Побач з гэтым назіраліся працэсы пашырэння стандартызацыі і тыражыравання тыповых відаў і форм аматарскай дзейнасці, мадэлей сацыяльна-культурнай актыўнасці ў сферы мастацкай творчасці. Значны ўплыў на яе адбываўся з боку шоу-бізнеса і музычнай індустрыі. Але ў межах клубнай практыкі не знайшлі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дастатковага развіцця такія сучасныя формы мастацка-творчай актыўнасці моладзі, як поп-, рок-музыка, джаз, бардаўская песня, дызайн і інш. [408, с. 15–16].

Вынікі тэарэтычных і прыкладных даследаванняў замежных вучоных (Т. Адорна, Х. Ганс, П. Бурдзье) дазволілі выявіць ***змены сацыяльнай матывацыі і спажывецкіх паводзінаў*** у сферы культуры. Фактычна яны даюць падставы гаварыць аб фарміраванні аўдыторыі новага тыпу, інтарэсы якой заключаюцца ў «перасячэнні межаў». Гэтыя «*новыя культурныя спажыўцы*» (the new culture consumer) выбіраюць усё, што можа даставіць задавальненне: культуру этнічную (мясцовую) і сусветную, папулярную і высокую, традыцыйную і сучасную. У адзін вечар яны слухаюць оперу, у наступны ідуць на рок-канцэрт ці лазернае шоу. У час адпачынку яны наведваюць традыцыйныя музеі і папулярныя эстрадныя прадстаўленні, выставы сучасных мастакоў і мясцовыя фальклорныя святы. Мяжа паміж элітарнай і масавай культурай размываецца [49].

Інтэнсіўнае развіццё індустрыі вольнага часу ў канцы XX – пачатку XXI ст. прывяло да значнага пашырэння відаў устаноў для культурнага адпачынку: цэнтры гульні, канцэртна-відовішчныя ўстановы, начныя клубы і інш. Адначасова адбываліся змены вобліку традыцыйных устаноў культуры. Скарачэнне наведвальнікаў бібліятэк і кінатэатраў, музеяў і выставачных залаў пры адначасовым скарачэнні фінансавання зрабіла надзвычай актуальнай праблему пошуку новых падыходаў да выйсця з крызісу, прыцягнення дадатковых сродкаў, выкарыстанне нестандартных рашэнняў. Актуальнымі сталі пытанні арганізацыі рэкламнай дзейнасці, стварэння інфармацыйна-аналітычных цэнтраў, правядзення маніторынгу змяненняў запатрабаванняў спажыўцоў да і т. п.

Звычайнай з’явай гэтага перыяду стала арганізацыя канцэртаў, музычных вечароў, фестываляў прыватнымі кампаніямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Гэтыя суб’екты культурнай сферы былі арыентаваны на вынік дзейнасці, а не на ўласна дзейнасць, на спажыўца і яго патрэбы, на вытворчасць якаснага культурнага прадукту, разумную эканомію сродкаў і зніжэнне затрат на вытворчасць, пошук эфектыўных шляхоў і механізмаў выдаткавання сродкаў, данясенне сваіх прадуктаў і паслуг да канечнага спажыўца. Для іх звычайным з’ўлялася работа ў рамках праектнага прынцыпу, выкарыстанне часовых праектных каманд, існаванне ва ўмовах шматканальнага атрымання сродкаў (заказы дзяржавы і мясцовых улад, сродкі спонсараў і грантадаўцаў, прыбытак, атрыманы ад рэалізацыі).

Пад уплывам новых тэхналогій адбыліся змены і ў вобліку дзеяча культуры. Тэарэтык мастацтваў Б. Гройс [879] намаляваў партрэт дзеяча мастацтва XXI ст. як у першую чаргу «авангарднага спажыўца». Па меркаванні даследчыка, функцыя мастацтва не можа надалей апісвацца толькі мастацкай творчасцю. У новых умовах стала важным пытанне накіраванасці дзеяча мастацтва на попыт.

У новых эканамічных умовах установы культуры і мастацтва былі вымушаны пашыраць кола аказваемых паслуг і дзейнасці. Пры гэтым у краіне адсутнічалі спецыялісты, здольныя прафесійна аказваць новыя паслугі. На-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыклад, у 2005 г. былі ўнесены змены ў Статут дзяржаўнай установы «Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі». Сярод прадмета і мэт дзейнасці тэатра з'явіліся такія, як выдавецкая і паліграфічная дзейнасць, здача ў наём уласнай нерухомай маёмасці, даследаванне кан'юнктуры рынку і выяўленне грамадскай думкі, рэкламная дзейнасць, дзейнасць у галіне фатаграфіі, дзейнасць інфармацыйных агенцтваў, прапанова іншых паслуг спажыўцам, дзейнасць бібліятэк і архіваў, іншая дзейнасць па арганізацыі адпачынку і забавы, не ўключаная ў іншыя групоўкі; прапанова іншых індывідуальных паслуг [439, спр. 1059, арк. 157].

У вывучаемы перыяд адбываліся працэсы паступовай камерцыялізацыі сферы культуры. Пашырылася колькасць прыватных галерэй, начных клубаў, шырокае развіццё набыў гандаль кнігамі і прадметамі мастацтва. Значна павялічылася колькасць няўрадавых арганізацый, якія ў сваіх статутных мэтах прапісалі дзейнасць у сферы культуры і мастацтва. У новых умовах будавалі сваю дзейнасць як творчыя саюзы, так і непасрэдна творцы.

Прыкладам праявы культурнай актыўнасці насельніцтва з'яўляліся ***грамадскія арганізацыі***. Калі ў мінулыя часы значны ўнёсак у рэалізацыю насельніцтвам сваіх культурных запатрабаванняў уносілі прафсаюзныя арганізацыі, то ў пачатку XXI ст. іх роля стала амаль незаўважнай. Так, колькасць устаноў клубнага тыпу прафсаюзных арганізацый у 2003 г. складала толькі восьмую частку ад паказчыка 1990 г. (адпаведна 90 і 773 адзінкі). Побач з гэтым амаль зніклі клубы, якія належалі сельскагаспадарчым арганізацыям (у 1990 г. іх было 139, а ў 2003 г. засталося 12) [220, с. 419].

Культурная дзейнасць была ўнесена ў статуты не толькі творчых саюзаў, але і маладзёжных, жаночых, дзіцячых арганізацый. Большасць грамадскіх аб'яднанняў Беларусі здзяйсняла сваю дзейнасць адначасова ў некалькіх напрамках[1].

Прыведзеныя дадзеныя сведчаць аб тым, што значная частка насельніцтва ў вывучаемы перыяд была за межамі культурнага жыцця ці ў недастатковай ступені ім ахоплена.

Пашырэнне асартыменту паслуг, якія прапаноўваліся ўстановамі культуры ў канцы 1990-х гг., не прывяло да росту аўдыторыі. Разам з тым адзначаўся рэзкі рост цікавасці да забаўляльных жанраў, мерапрыемстваў. На фоне агульных змен у сетцы ўстаноў і наборы прапануемых паслуг, з'яўлення цалкам новых (казіно, залы іграваых аўтаматаў) устаноў частка паслуг заставалася незапатрабаванай. Змяншалася колькасць наведванняў тэатраў, цыркаў, музеяў. Дыспрапорцыя попыту і прапановы ўзнікае не толькі з-за росту цэн на гэтыя паслугі, але і дзякуючы пашырэнню выбару, які з'явіўся ў насельніцтва [361, с. 191].

Вынікі сацыялагічнага апытання, праведзенага ў 2011 г., сведчаць, што значная частка рэспандэнтаў (46 %) былі не задаволены працай устаноў культуры. Прыкладна па 20 % адзначылі малаэфектыўную арганізацыю вольнага часу і слабую матэрыяльна-тэхнічную базу ўстаноў культуры, у сярэднім па

[1] Больш падрабязна іх дзейнасць разгледжана ў главе 3.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12 % апытаных былі незадаволены колькасцю ўстаноў культуры, слабым развіццём культуры ў сельскай мясцовасці, недахопам кваліфікаваных спецыялістаў. Як адзначалі сацыёлагі, за тры гады з часу папярэдняга апытання значымасць згаданых праблем не змянілася [681, с. 24].

Змена культурных густаў і запатрабаванасцей насельніцтва вымагала пошуку новых падыходаў да арганізацыі вольнага часу, новых форм працы ўстановамі культуры.

### 4.2. Удзел у культурным жыцці і праблема забеспячэння роўнага доступу да культуры

Права на культуру з'яўляецца адным з асноўных правоў чалавека. Толькі праз далучэнне да культуры, удзел у творчай дзейнасці можа адбыцца паўнавартасная сацыялізацыя асобы, фарміраванне яе грамадзянскай пазіцыі. Свабодны ўдзел у культуры з'яўляецца неабходным для развіцця асноўных гуманных каштоўнасцей і чалавечай годнасці. Сусветная дэкларацыя правоў чалавека 1948 г. называе права на ўдзел у культурным жыцці адным з фундаментальных правоў, аднак прынцып культурных правоў да сённяшняга часу застаецца адным з найменш рэалізуемых і неразвітых.

Існуе некалькі асноўных прынцыпаў правоў чалавека, якія ляжаць у аснове культурнай палітыкі. Яны могуць быць адрасаваны да:

правоў меншасцей (свабода выражэння сваёй моўнай і культурнай ідэнтычнасці, права на нацыянальнасць і права яе змены і г. д.);

жахароў (права на ўдзел у культуры і доступ да культурнага жыцця, свабода выбару і г. д.);

дзеячаў / творцаў (свабода выражэння, творчасці, доступ да сродкаў распаўсюджання ці размеркавання іх прац і ідэй і г. д.);

грамадства ў цэлым (абавязак паважаць і абараняць культуры праз узаемную цярпімасць і супрацоўніцтва і г. д.) [888].

Задача забеспячэння доступу да культуры з'яўляецца адным з асноўным напрамкаў культурнай палітыкі. Эфектыўны доступ да культуры і ўдзел у культурных дзеяннях усіх з'яўляецца істотным паказчыкам развітага грамадства, якое скіравана на ахоп увагай усіх сваіх членаў. Акрамя гэтага, удзел у культурных дзеяннях можа таксама быць інструментам дапамогі людзям і супольнасцям у пераадоленні беднасці і сацыяльнай ізаляванасці. Ад сацыяльнага выключэння найбольш церпяць тыя, хто знаходзіцца ў эканамічна неспрыяльных умовах і не мае сацыяльных ці фінансавых магчымасцей удзелу ў культурнай дзейнасці (асабліва маладыя беспрацоўныя і тыя, хто доўгі перыяд знаходзіцца без працы; пажылыя і бедныя); другую групу складаюць бежанцы і эмігранты; трэцюю – інваліды. Культурная ізаляванасць можа быць спецыфічнай (напрыклад, у выпадку этнічных груп, эмігрантаў, моўных меншасцей), так і больш агульнай, калі доступ да культуры абмежаваны з-за камбінацыі эканамічных і сацыяльных праблем.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яшчэ ў 1976 г. ЮНЕСКА прыняла Рэкамендацыі адносна ўдзелу людзей у поўным аб'ёме ў культурным жыцці і іх укладзе ў яго. У іх адзначаецца: «культура не проста накапленне работ і ведаў, якія стварае, збірае і захоўвае эліта для таго, каб потым перадаць іх усім; ці тое, што багатыя на мінулае і спадчыну людзі перадаюць іншым у якасці мадэлі, якую іх уласная гісторыя не змагла стварыць; культура не абмяжоўваецца доступам да твораў мастацтва і гуманізму, яна – адначасова авалоданне ведамі, неабходнасць у жыццёвым шляху і камунікацыі.

Доступ да культуры прадугледжвае канкрэтныя магчымасці, якія па сілах кожнаму. Напрыклад, шляхам стварэння адпаведных сацыяльна-эканамічных умоў для свабоднага атрымання інфармацыі, навучання, ведаў і разумення, а таксама для атрымання асалоды ад культурных каштоўнасцей і культурных даброт.

Удзел у культуры прадугледжвае канкрэтныя магчымасці, якія гарантаваны ўсім – групам ці індывідумам – свабоднага самавыражэння, дзеяння і ўдзелу ў культурных дзеяннях з мэтай поўнага развіцця асобы, гарманічнага жыцця і культурнага прагрэсу грамадства» [888].

Права грамадзян на ўдзел у культурным жыцці было замацавана ў артыкуле 51 *Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь*. Яно забяспечвалася агульнай даступнасцю каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, якія знаходзіліся ў дзяржаўных і грамадскіх фондах, развіццём сеткі культурна-асветных устаноў. Канстытуцыя гарантуе свабоду мастацкай, навуковай, тэхнічнай творчасці і выкладання.

Асноўныя напрамкі культурнай палітыкі нашай дзяржавы былі сфармуляваны ў шэрагу заканадаўчых актаў. Гэта перш за ўсё Закон «Аб культуры» (1990 г.). У ім былі акрэслены правы грамадзян на творчасць і карыстанне дасягненнямі культуры, абавязкі дзяржавы і грамадзян у галіне культуры, кампетэнцыя дзяржавы ў дадзенай галіне, правы іншых нацыянальнасцей і этнічных груп, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства [24].

У 2004 г. *Закон «Аб культуры»* быў прыняты ў новай рэдакцыі. Артыкул 12 наклаў абавязак на дзяржаўныя органы забеспячэння ў адпаведнасці з заканадаўствам свабоднага доступу да культурных каштоўнасцей і культурнай дзейнасці на льготных умовах для інвалідаў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, ваеннаслужачых тэрміновай службы, дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, навучэнцаў устаноў адукацыі, а таксама для тых, хто мае асаблівыя заслугі перад дзяржавай. У абавязак уводзілася стварэнне спрыяльных умоў для развіцця клубных устаноў для інвалідаў. Артыкул 18 дэклараваў права на ўдзел у культурным жыцці, а артыкул 16 – права на дастойны ўзровень культурнага жыцця. Закон замацаваў права грамадзян на дастойны ўзровень забяспечанасці з улікам іх месца жыхарства агульнадаступнымі паслугамі ў галіне культуры, арганізацыямі культуры, якія аказваюць такія паслугі, аб'ектамі культурнай інфраструктуры, а таксама якасны ўзровень распаўсюджваемых і папулягры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зуемых культурных каштоўнасцей і эстэтычнага жыццёвага асяроддзя. У артыкуле 23 гаварылася аб тым, што ў кожнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы Рэспублікі Беларусь Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі прымаюцца меры па стварэнні комплексу дзяржаўных арганізацый культуры, якія гарантавалі б задавальненне асноўных духоўных патрэбнасцей насельніцтва. Пры планаванні стварэння дзяржаўных арганізацый культуры павінны былі ўлічвацца гістарычныя, нацыянальныя і геаграфічныя асаблівасці мясцовасці. Ліквідацыя дзяржаўных устаноў культуры не дапускалася ў тым выпадку, калі яна выкліча немагчымасць выканання дзяржаўных мінімальных сацыяльных стандартаў у галіне культуры [46].

Палажэнні аб забеспячэнні роўнага доступу грамадзян да культурных паслуг утрымліваліся і ў законах, якія рэгулявалі асобныя напрамкі культурнай дзейнасці. Напрыклад, у артыкуле 6 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе» [458] і главе 6 рэдакцыі гэтага ж закона 2002 г. [45] канстатавалася права грамадзян на бібліятэчнае абслугоўванне (у новай рэдакцыі таксама на інфармацыйнае і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне і бібліятэчную дзейнасць). Гэта палажэнне атрымала сваё развіццё ў Тыпавых правілах карыстання бібліятэкамі ў Рэспубліцы Беларусь (15.11.1996 г.). У новай рэдакцыі Правіл (05.08.2008 г.) з мэтай практычнай рэалізацыі дзяржаўнай бібліятэчнай палітыкі, накіраванай на забеспячэнне роўных правоў доступу да інфармацыйных рэсурсаў усіх грамадзян, былі падрабязна апісаны асаблівасці абслугоўвання непаўналетніх чытачоў, а таксама людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Акрамя гэтага, асаблівая ўвага ў новай рэдакцыі была нададзена абслугоўванню шляхам нестацыянарных форм састарэлых асоб, якія не маюць магчымасці наведваць бібліятэку.

Рэспубліка Беларусь мае свой дэмакратычны вопыт ***забеспячэння культурных правоў нацыянальных меншасцей (супольнасцей)***. За гады незалежнасці створаны комплекс нарматыўна-прававых актаў, якія заканадаўча забяспечылі захаванне правоў асоб, якія да іх прыналежаць.

Артыкулы 5, 12, 14, 15, 22, 50, 52, 53 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь акрэслілі асновы палітыкі ў дадзенай сферы: дзяржава рэгулюе адносіны паміж нацыянальнымі супольнасцямі на падставе прынцыпаў роўнасці перад законам, павагі да іх правоў і інтарэсаў; яна адказная за захаванне гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны, свабоднае развіццё культур усіх нацыянальных супольнасцей, якія пражываюць на тэрыторыі рэспублікі; усе роўныя перад законам і маюць права без усялякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў; кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, роўна як ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і пазначэння сваёй нацыянальнай прыналежнасці; знявага нацыянальнай годнасці пераследуецца па закону; кожны мае права карыстацца роднай мовай, выбіраць мову зносін. Дзяржава гарантуе ў адпаведнасці з законам свабоду выбару мовы выхавання і навучання; забараняецца стварэнне і дзейнасць палітычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

партый, а роўна іншых грамадскіх арганізацый, якія вядуць прапаганду нацыянальнай і расавай варожасці; кожны, хто знаходзіцца на тэрыторыі рэспублікі, абавязаны акрамя заканадаўства прытрымлівацца і нацыянальных традыцый народаў Беларусі.

У Законе «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь» засведчана, што грамадзянства можа атрымаць кожны, хто пастаянна пражывае на тэрыторыі Беларусі, без усякіх дыскрымінацыйных абмежаванняў.

Рэалізацыі правоў асоб, якія належаць да нацыянальных супольнасцей, садзейнічала прыняцце ў лістападзе 1992 г. Закона «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь» (са зменамі і дапаўненнямі, прынятымі ў 2004 г.). Артыкул 5 сярод іншага гарантаваў кожнаму грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, які адносіў сябе да нацыянальнай, культурнай, моўнай супольнасці, права на атрыманне дапамогі з боку дзяржавы ў справе развіцця нацыянальнай культуры і адукацыі; права на вывучэнне і карыстання роднай мовай; права на друк і распаўсюджанне інфармацыі на роднай мове; права на ўстанаўленне культурных сувязей з суайчыннікамі за межамі рэспублікі; права на здзяйсненне нацыянальных і рытуальных абрадаў на роднай мове; права на захаванне сваіх нацыянальных традыцый, развіццё прафесійнага і самадзейнага мастацтва; права на стварэнне сваіх нацыянальных культурных супольнасцей (аб’яднанняў).

Падобныя палажэнні аб правах нацыянальных супольнасцей змяшчаюцца ў артыкуле 10 Закона «Аб культуры», артыкулах законаў «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» і «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі».

Са студзеня 1997 г. функцыя кантролю за выкананнем нацыянальнага заканадаўства і міжнародных пагадненняў у галіне захавання правоў асоб, якія прыналежаць да нацыянальных супольнасцей Беларусі, выконваў Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь [853] (з 2002 г. – Камітэт, з 2006 г. – Упаўнаважаны). З 1998 г. пры тагачасным Дзяржкамітэце дзейнічаў Каардынацыйны савет па справах нацыянальных супольнасцей Беларусі [631].

У 1995 г. пачаў дзейнічаць Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур (РЦНК), які каардынаваў дзейнасць нацыянальна-культурных аб’яднанняў, аказваў ім інфармацыйную, метадычную, творчую і практычную дапамогу. Быў створаны Савет РЦНК, які з’яўляўся яго грамадскім кансультатыўным органам. У склад савета ўваходзілі на добраахвотных пачатках прадстаўнікі зарэгістраваных нацыянальных культурна-асветных аб’яднанняў. Савет разглядаў і выносіў рэкамендацыі па пытаннях планавання работы РЦНК, правядзенні культурна-асветных мерапрыемстваў міжнацыянальнага характару і інш. У якасці кансультантаў, членаў журы да дзейнасці цэнтра далучаліся вядучыя майстры мастацтва рэспублікі.

На базе Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур у 2010 г. працавала 8 самадзейных мастацкіх калектываў, сярод якіх народны рускі хор імя А. Нікіцінай, народны хор украінскай песні «Крыніца», ансамбль польскай песні «Тэнча», ансамбль карэйскага танца «Арыран», армянскі фальклорны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ансамбль «Эрыбуні», фальклорны ансамбль «Украінская песня», тэатр украінскай песні і абраду «Ватра», шматнацыянальны эстрадны ансамбль «Шматгалоссе» [104, с. 58].

У розных рэгіёнах рэспублікі былі створаны дзяржаўныя нацыянальныя цэнтры, бібліятэкі ці асобныя фонды літаратуры на нацыянальных мовах.

У пачатку 2000-х гг. быў распрацаваны механізм мэтавага фінансавання нацыянальна-культурнай дзейнасці на рэспубліканскім і мясцовым узроўнях, вялася адпаведная работа з кіраўнікамі нацыянальна-культурных суполак і спецыялістамі ўстаноў культуры. Дзяржаўная праграма «Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г.» асноўнымі напрамкамі культурнай дзейнасці ў гэтай сферы вызначала:

фарміраванне адпаведных механізмаў рэгулявання культурнага жыцця нацыянальных супольнасцей і неабходных умоў для іх далейшага развіцця;

каардынацыю дзеянняў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з установамі і арганізацыямі, мэтай дзейнасці якіх з'яўляецца развіццё культур нацыянальных супольнасцей, у галіне распрацоўкі і рэалізацыі культурных праграм [208].

У 2005 г. была прынята Праграма развіцця канфесійнай сферы, нацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2006–2010 гг.

З улікам шматлікіх хадайніцтваў таварыстваў нацыянальных культурных меншасцей па пытаннях аказання ім садзейнічання ў арганізацыі асветніцкай дзейнасці і ў мэтах выканання Закона «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь» у 1994 г. на базе дзяржаўнай сеткі бібліятэк г. Мінска быў праведзены эксперымент, накіраваны на сумесную з нацыянальнымі культурнымі таварыствамі (аб'яднаннямі) дзейнасць па зборы і распаўсюджанні інфармацыі, звязанай з гісторыяй і культурай нацыянальных меншасцей [439, спр. 1, арк. 214].

18 сакавіка 2001 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё Літоўскага культурна-асветнага цэнтра ў в. Рымдзюны Астравецкага раёна.

У 2000 г. Гродзенскім гарвыканкамам прынята рашэнне аб прадстаўленні нацыянальным аб'яднанням памяшкання гарадскога дома культуры без арэнднай платы для правядзення мерапрыемстваў.

У жніўні 2010 г. адбылося дзясятае па ліку свята «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў», які быў арганізаваны Саюзам палякаў сумесна с Гродзенскім райвыканкамам. Штогадова праходзіў кірмаш народных умельцаў «Казюкі». На тэрыторыі Гродзенскай вобласці ў 2010–2011 гг. дзейнічалі дзве школы с польскай мовай навучання – СШ № 36 у г. Гродна і СШ № 8 у г. Ваўкавыску, у якіх навучаліся 522 вучні. Акрамя гэтага, у тым жа годзе польскую мову вывучалі ў 124 установах школьнай адукацыі, пазашкольнай выхаваўчай працы і дзіцячых садках у 14 раёнах вобласці і г. Гродна. У вобласці выдаваліся на польскай мове газета «Глос з-над Немна», часопісы «Слово ойчыстэ», «Земя Лідска», «Магазін польскі». На Лідскім радыё выходзіла ў эфір штодзённая паўгадзінная перадача на польскай мове. Тэлерадыёкампанія



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Гродна» пры ўзаемадзеянні з Саюзам палякаў арганізавала выпуск радыё- і тэлеперадач на польскай мове [447].

Плённа развівалася супрацоўніцтва бібліятэк г. Гродна з грамадска-культурнымі аб'яднаннямі, было распрацавана «Палажэнне аб бібліятэцы – цэнтры нацыянальных культур». У сярэдзіне 2000-х гг. былі заключаны дамовы паміж Цэнтральнай бібліятэчнай сістэмай г. Гродна і грамадскім аб'яднаннем літоўцаў «Тэвіне», украінскім культурна-асветным аб'яднаннем «Барвінок», грамадскім аб'яднаннем «Гродзенскі яўрэйскі грамадскі дом "Менора"», грамадскім аб'яднаннем татар г. Гродна. За кожным з аб'яднанняў была замацавана пэўная бібліятэка. Бібліятэка № 2 стала цэнтрам татарскай нацыянальнай культуры, Цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка арганізавала працу з аб'яднаннем яўрэяў, а бібліятэка № 10 стала цэнтрам нацыянальных культур літоўцаў, украінцаў і рускіх. З Саюзам палякаў Беларусі супрацоўнічала бібліятэка польскай літаратуры. У дамовах прадугледжвалася сумесная культурна-адукацыйная дзейнасць, быў акрэслены парадак прадстаўлення памяшкання на бясплатнай аснове, правядзенне масава-інфармацыйнай працы з боку бібліятэк, удзел членаў аб'яднання ў дзейнасці па абслугоўванні чытачоў, перадача аб'яднаннямі бібліятэкам кніжных калекцый, камплектаў кніг у дар ці ў часовае карыстанне [737].

У 2008 г. у бібліятэцы № 10 г. Гродна быў адкрыты Пакой нацыянальных культур. Такім чынам, грамадскія аб'яднанні літоўцаў, украінцаў і рускіх атрымалі памяшканні для правядзення сваіх пасяджэнняў і арганізацыі экспазіцыі дакументаў і матэрыялаў аб сваёй дзейнасці [737].

Напрацаваны вопыт па дзяржаўнай падтрымцы нацыянальна-культурных фарміраванняў акумуляваўся ў рэспубліканскіх фестывалях нацыянальных культур, якія праводзіліся кожныя два гады, пачынаючы з 1996 г., у г. Гродна. У 2004 г. у краіне ўпершыню шырока адзначаўся Сусветны дзень культурнай разнастайнасці ў імя дыялогу і развіцця (21 мая).

У 2010 г. акрамя дзвюх школ з польскай мовай навучання і дзвюх з літоўскай у краіне родную мову нацыянальных супольнасцей у розных арганізацыйных формах (вучэбны прадмет, факультатыўныя заняткі, гуртковая работа) вывучалі ў 120 агульнаадукацыйных установах прыкладна 5 тыс. чалавек. У тым ліку польскую – 4671 чалавек, яўрэйскую – 262, украінскую – 52, літоўскую – 15 чалавек [424].

Пытанні забеспячэння доступу да культуры і ўдзелу ў культурным жыцці ўлічваліся пры выпрацоўцы дзяржаўных праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і распрацаваных на іх падставе галіновых праграм па культуры.

У праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2006–2010 гг. мэтай дзяржавы ў галіне культуры вызначана захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, стварэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця асобы, росту яе творчай ініцыятывы, духоўных і эстэтычных запатрабаванняў.

Для дасягнення гэтай мэты прадугледжваўся шэраг дзеянняў. Асаблівая ўвага была нададзена ***культурнаму развіццю вёскі***.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Неабходна адзначыць, што пытанне культурнага абслугоўвання жыхароў сельскіх населеных пунктаў знаходзілася ў цэнтры ўвагі яшчэ ў часы перабудовы. У 1991 г. быў прыняты Закон *«Аб прыярытэтным сацыяльна-культурным і эканамічным развіцці сяла і аграпрамысловага комплексу»*. У адпаведнасці з перспектыўным планам развіцця сеткі дзіцячых школ эстэтычнай адукацыі, зацверджаным пастановай Савета Міністраў БССР № 158 «Аб дадатковых мерах па паляпшэнню эстэтычнага выхавання моладзі», у рэспубліцы была праведзена работа па разгортванні сеткі згаданых устаноў. У 1990 г. іх налічвалася 713 з кантынгентам навучэнцаў звыш 83 тыс. чалавек. Разам з дзяржаўнымі музычнымі, мастацкімі, харэаграфічнымі школамі, школамі мастацтваў ствараліся і калгасныя музычныя школы. У тым жа годзе іх налічвалася 230 (32 % ад агульнай колькасці) з кантынгентам больш за 7 тыс. чалавек. Аднак перавод устаноў культуры на рыначныя ўмовы гаспадарання адмоўна адбіўся на існаванні згаданых дзіцячых навучальных устаноў. Яны сталі рэзка скарачацца. Многія праўленні калгасаў, не маючы сродкаў, адмаўляліся ад фінансавання сваіх школ. У 1992 г. калгасных школ заставалася толькі 94. Гэта супярэчыла артыкулу 5 згаданага вышэй закона, у якім было занатавана палажэнне аб тым, што дзяржава гарантуе сацыяльную абарону сялянства, павышае яго жыццёвы ўзровень [438, спр. 2079, арк. 21–22]. На жаль, адмоўная тэндэнцыя назіралася і ў наступныя гады. Каб абараніць інтарэсы дзяцей і педагагічных калектываў былых калгасных музычных школ, Міністэрства культуры, органы культуры разам з мясцовымі саветамі народных дэпутатаў праводзілі работу па пераўтварэнні такіх навучальных устаноў у дзяржаўныя.

Некаторая стабілізацыя дзейнасці сельскіх устаноў культуры адбылася дзякуючы рэалізацыі *Праграмы дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры на 1994–1996 гг.* У гэты час пачалі ствараццa новыя тыпы ўстаноў культуры: клубы-бібліятэкі, бібліятэкі-клубы, клубы-музеі, цэнтры фальклору, вольнага часу і інш. Далейшае развіццё атрымала адраджэнне народных рамёстваў. На бюджэтнае фінансаванне былі ўзяты былыя калгасныя школы мастацтваў, якіх у 1997 г. налічвалася 267. Аднак для паляпшэння дзейнасці сельскіх устаноў культуры неабходна было вырашыць праблемы іх фінансавай падтрымкі з рэспубліканскага бюджэту. Аблвыканкамам пры фарміраванні мясцовых бюджэтаў неабходна было прадугледжваць асігнаванні на ўтрыманне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы незалежна ад ведамаснай прыналежнасці, асаблівую ўвагу пры гэтым звяртаць на забеспячэнне рэалізацыі рэгіянальных праграм развіцця народнага мастацтва, традыцыйных рамёстваў і промыслаў, поўнае забеспячэнне выдаткаў на камплектаванне бібліятэчных фондаў. Спецыялісты выказваліся аб тым, што вырашэнню праблем сельскіх устаноў культуры спрыяла б устанаўленне льготнага падаткаабкладання платных паслуг, мэтавае размеркаванне і накіраванне ў сельскія ўстановы культуры выпускнікоў навучальных устаноў культуры і мастацтва, разгляд пытання аб прадстаўленні работнікам ільгот у аплаце за карыстанне жылымі памяшканнямі і паслугамі па іх ацяпленні і асвятленні [439, спр. 157, арк. 184–185].


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1999 г. у сельскай мясцовасці дзейнічала 45 % спецыяльных навучальных устаноў, 73 % кінаўстановак, 87 % бібліятэк, 94 % клубных устаноў, 4 музеі і каля 20 філіялаў розных дзяржаўных музеяў ад агульнай колькасці па краіне; 17 з 41 па краіне дамоў (цэнтраў) рамёстваў, 30 з 32 па рэспубліцы дамоў (цэнтраў) фальклору, 39 з 40 школ народнай творчасці знаходзіліся ў сельскай мясцовасці [439, спр. 368, арк. 163–164].

Стан развіцця сельскай культуры другой паловы 1990-х гг. характарызаваўся наяўнасцю як пазітыўных, так і негатыўных тэндэнцый. Да ліку пазітыўных адносіцца прыпыненне памяншэння колькасці бібліятэк і клубаў (бібліятэк – з 4241 у 1995 г. да 4116 у 1999 г.; клубаў у тыя ж гады – з 4110 да 3981), павелічэнне кантынгенту дзіцячых школ мастацтваў усіх тыпаў, абнаўленне вопыту культурна-асветніцкай работы, рост колькасці фестываляў, конкурсаў, аглядаў, выставак і святаў мастацтва. У канцы 1990-х гг. назіралася тэндэнцыя да якаснага і колькаснага развіцця самадзейнай мастацкай творчасці. Пры сельскіх клубных установах працавала 16 тыс. гурткоў і калектываў (87 %), у тым ліку звыш 7 тыс. рознапрофільных клубных фарміраванняў для дзяцей і падлеткаў (88 %) [439, спр. 368, арк. 163–165].

Адным з дасягненняў дзяржаўнай культурнай палітыкі на сяле з’яўлялася захаванне і далейшае развіццё дзяржаўнай сістэмы мастацкай адукацыі, якая дазволіла забяспечыць роўны доступ у атрыманні мастацкай адукацыі. У 2003 г. на сяле налічвалася 241 школа, з якой 164 – музычных, 76 школ мастацтваў з рознапрофільнымі аддзяленнямі і адна школа народных рамёстваў. У выніку прыняцця рашэння аб дзяржаўным фінансаванні былых калгасных школ была прыпынена негатыўная тэндэнцыя іх значнага скарачэння. Акрамя гэтага пераўтварэнне вузкапрофільных дзіцячых вучэбных устаноў у школы мастацтва дазволіла павялічыць колькасць навучэнцаў на сяле ў 2003 г. на 17,3 тыс. чалавек у параўнанні з 1995 г. [439, спр. 753, арк. 211].

Улічваючы тое, што гастрольна-канцэртная дзейнасць не ахоплівала многія раёны і населеныя пункты, Міністэрства культуры ў другой палове 1990-х гг. знайшло магчымасць фінансаваць гастролі вядучых самадзейных калектываў. На працягу 1997–1999 гг. назіралася ажыўленне гастрольнай дзейнасці драматычных і лялечных тэатраў краіны па абслугоўванні сельскіх гледачоў і насельніцтва зон радыяцыйнага забруджання. Штогод Міністэрства культуры накіроўвала на гэтыя мерапрыемствы мэтавыя сродкі па дзяржаўным заказе. Усяго па краіне для сельскіх жыхароў тэатры паказалі ў 1999 г. больш за 700 спектакляў, якія наведалі каля 140 тыс. гледачоў [439, спр. 368, арк. 167].

У 1997 г. Міністэрства культуры ў адпаведнасці з пратаколам нарады ў прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь ад 5 верасня 1997 г. № 05/262 «*Аб удасканаленні дзейнасці ўстаноў культуры і развіцці кінавідэапракату на сяле»* запланавала замену кінапаказу на сельскіх кінаўстаноўках на праекцыйны відэапаказ. Эканамічныя разлікі паказвалі, што пры роўных выдатках на зарплату, аднолькавым кошце на білеты і колькасці сеансаў прыбытак не павінен быў змяніцца, а вось эксплуатацыйныя выдаткі кінаўстаноўкі абыходзіліся ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2,7 разы даражэй за аналагічныя выдаткі на відэапраекцыйную ўстаноўку. Пры гэтым рэпертуар відэакасет быў значна багацейшы за кінарэпертуар кінаўстаноўкі, і іх дастаўка не патрабавала спецыяльнага аўтатранспарту [439, спр. 161, арк. 201–202]. Гэта прапанова была рэалізавана ў канцы 1997 г., калі праз Белвідэацэнтр быў заключаны кантракт на набыццё 110 камплектаў відэапраекцыйных установак для сельскіх клубаў [439, спр. 207, арк. 94]. Было набыта 108 праекцыйных кінаўстановак. Найбольш эфектыўна задзейнічалі відэатэхніку ў Магілёўскай вобласці. Так, за кошт перасоўных відэапраектараў у Глускім раёне было ахоплена паслугамі 11 населеных пунктаў, у Кіраўскім – 10, у Крычаўскім – 24 [439, спр. 368, арк. 167].

На 1 студзеня 2003 г. у сельскай мясцовасці функцыянавала 2158 кінаўстановак (82 % ад агульнай колькасці па рэспубліцы) з колькасцю месцаў 395 665 (74 % ад рэспубліканскага паказчыка). Відэапаказам на сяле займаліся 164 відэазалы і відэасалоны з агульнай колькасцю пасадачных месцаў 10 793 (каля 50 % ад агульнай колькасці па рэспубліцы). У 2002 г. сельскія кінаўстаноўкі наведалі 2507,6 тыс. гледачоў, відэафільмы паглядзелі звыш 840 тыс. чалавек. Пашыралася практыка набыцця відэапраекцыйных сістэм. За кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў у 2002 г. было набыта 38 такіх камплектаў, у 2003 г. – 39. Набыццё новай відэапрадукцыі дазволіла павялічыць у параўнанні з 2002 г. колькасць відэазалаў і відэасалонаў у сельскай мясцовасці на 14, а колькасць месцаў у іх амаль на 1000 [439, спр. 753, арк. 210–211].

Значна горш выглядалі перспектывы ў сельскіх бібліятэк, якія разглядаліся як інфармацыйныя цэнтры. Самай значнай праблемай быў якасны склад фондаў. У сярэднім за год сельская бібліятэка атрымлівала 35–40 назваў кніг, 5–10 назваў часопісаў і 3–5 назваў газет, пераважна беларускіх. Толькі дзякуючы дзяржаўнай дапамозе, праз забеспячэнне сацыяльна-значнай літаратурай трымаўся інфармацыйны патэнцыял сельскіх філіялаў [439, спр. 368, арк. 166].

Істотнай праблемай у канцы 1990-х гг. было матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне ўстаноў культуры на сяле. Пры нормах абнаўлення музычных інструментаў і тэатральнай тэхнікі ў 8–10 % штогод на працягу 1991–1997 гг. фактычныя лічбы былі 1–1,5 %. Музычныя інструменты і тэатральная тэхніка маральна састарэлі і фізічна знасіліся, больш 75 % з іх не былі прыгодныя да далейшай эксплуатацыі і падлягалі спісанню. З-за тэхнічнага стану будынкі, у якіх размяшчаліся ўстановы культуры, у сваёй большасці патрабавалі рамонту. З 4600 будынкаў сельскіх клубных устаноў звыш 800 у 1998 г. патрабавалі рамонту, а 45 знаходзіліся ў аварыйным стане. Такое становішча ставіла пад пытанне магчымасць клубаў і навучальных устаноў выконваць ускладзеныя на іх функцыянальныя задачы. Асабліва востра гэта адчувалася адносна дзейнасці дзіцячых музычных школ і школ мастацтваў. У 1998 г. на матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці ўстаноў культуры (у цэлым па галіне) было выдзелена ў 9 разоў менш за неабходныя сродкі. Зыходзячы з пастановы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь ад 24.08.1998 г.,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

былі прыняты рэкамендацыі па выніках парламенцкіх слуханняў па пытанні «Дзяржаўная нацыянальная праграма “Культура”, адпаведна якім Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь было рэкамендавана абвясціць 1999 год годам умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскіх і навучальных устаноў культуры. У адпаведнасці з гэтым Міністэрства культуры прасіла Урад аб прыцягненні дадатковых грашовых сродкаў [439, спр. 227, арк. 91–93].

У 2001 г. у мэтах выканання Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 лістапада 2001 г. № 1653 «*Аб дадатковых мерах па рэалізацыі праграмы ўдасканалення аграпрамысловага комплексу Рэспублікі Беларусь на 2001–2005 гг.*» Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання распрацавала праграму перадачы аб’ектаў сацыяльна-бытавой і культурнай сферы, камунальнай гаспадаркі, сувязі, унутрыгаспадарчых дарог, электрычных і газавых сетак калгасаў, саўгасаў, іншых сельскагаспадарчых арганізацый прадпрыемствам і арганізацыям адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў. Галоўнай прычынай яе прыняцця быў пошук выйсця з крызіснай сітуацыі, у якой знаходзіліся сельскагаспадарчыя прадпрыемствы. У абгрунтаванні праграмы канстатавалася, што «разлікі на ўтрыманне сацыяльнай сферы за кошт сельскагаспадарчых прадпрыемстваў не апраўдаліся» [439, спр. 604, арк. 5]. Аналіз статыстычных дадзеных даваў падставы сцвярджаць, што «ў бліжэйшыя гады калгасы і саўгасы не будуць мець магчымасці фінансаваць аб’екты сацыяльна-бытавой і культурнай сферы і газавых сетак» [439, спр. 604, арк. 8]. Спецыялісты адзначалі, што за 1990-я гг. значна пагоршыўся эканамічны стан сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Калі ў 1990 г. у рэспубліцы было толькі 8 стратных гаспадарак, а ўзровень рэнтабельнасці вытворчасці складаў 43 %, то ў 1999 г. 47 % ад агульнай колькасці сельскагаспадарчых арганізацый спрацавала са стратамі, рэнтабельнасць па галіне склала 12 %. У 2000 г. такія вынікі мелі 1177 гаспадарак (49 % ад агульнай колькасці) пры узроўні рэнтабельнасці 3 % [439, спр. 604, арк. 8].

Толькі за першыя месяцы рэалізацыі задання праграмы на баланс мясцовых бюджэтаў было прынята (звесткі на 25 лютага 2002 г.) 253 аб’екта ўстаноў культуры ў Брэсцкай вобласці, 30 – у Віцебскай, 99 будынкаў – у Гомельскай, 110 аб’ектаў – у Гродзенскай, 20 устаноў культуры – у Магілёўскай. У Мінскай вобласці падлягала перадачы 448 аб’ектаў, у якіх размяшчаліся 665 устаноў культуры (клубы, бібліятэкі, музычныя школы) [439, спр. 604, арк. 15].

Істотны імпульс развіццю культурнай сферы сельскай мясцовасці быў нададзены прыняццем ***Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця сяла на 2005–2010 гг.*** З мэтай безумоўнага забеспячэння выканання вызначаных ёй заданняў Міністэрствам культуры была распрацавана і зацверджана галіновая праграма, асноўнымі напрамкамі якой былі вызначаны: удасканаленне структуры і сеткі, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскіх культурных устаноў, далучэнне працаўнікоў сяла да прафесіянальнага мастацтва, фарміраванне структуры эстэтычнай адукацыі ў сельскай мясцовасці, адраджэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і развіццё, далейшая папулярызацыя традыцыйнай культуры, народных промыслаў і рамёстваў, захаванне гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны, развіццё культурна-турыстычнай дзейнасці. У Праграме быў прадугледжаны комплекс дадатковых мер па паляпшэнні культурнага абслугоўвання сельскага насельніцтва, выхаванні сельскай моладзі на гісторыка-культурных традыцыях беларускага народа. Мелася на ўвазе захаванне назапашанага вопыту, усталяваных традыцый з улікам актывізацыі гэтай дзейнасці, узбагачэння яе новымі методыкамі і формамі работы, а таксама распрацоўка новых вытворчых напрамкаў, якія б стымулявалі стварэнне дадатковых рабочых месцаў, шырокае развіццё народных рамёстваў і промыслаў, рамесніцкіх школ і майстэрань, агратурызму [439, спр. 1050, арк. 69].

У кожнай вобласці рэспублікі былі вызначаны аб’екты гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны з паэтапным фарміраваннем на іх базе сядзібна-этнаграфічных комплексаў і турыстычных маршрутаў. На многіх з іх былі арганізаваны работы па рэканструкцыі дамоў-музеяў, стварэнні музейных комплексаў, аднаўленні палацава-паркавых ансамбляў з мэтай развіцця воднага, экалагічнага і сельскага турызму [439, спр. 1050, арк. 69].

Сумесная мэтанакіраваная работа Міністэрства культуры з упраўленнямі культуры аблвыканкамаў у справе развіцця культурнай дзейнасці па арганізацыі і правядзенні вольнага часу ў сельскай мясцовасці, захаванні і развіцці традыцыйнай культуры рэгіёнаў у рамках выканання заданняў галіновай і адпаведных абласных праграм на 2005 г. дазволіла стварыць пэўныя передумовы для выканання важнейшых кантрольных паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гг. (табл. 8).

*Табліца 8.* **Асноўныя вынікі рэалізацыі Раздзела 7 «Развіццё культурна-дасугавай дзейнасці ў сельскай мясцовасці, захаванне і развіццё традыцыйнай культуры рэгіёнаў» Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця сяла на 2005–2010 гг. [104, с. 57]**

| Назва мерапрыемства | Заданне на 2005–2010 гг. | 2005–2008 гг. | | 2009 г. | | 2010 г. | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | план | факт | план | факт | план | факт |
| Стварэнне ўстаноў культуры новага тыпу | 186 | 124 | 156 (126 %) | 32 | 37 (116 %) | 30 | 38 (127 %) |
| Стварэнне сельскіх і раённых дамоў рамёстваў | 22 | 14 | 18 (129 %) | 4 | 3 (75 %) | 4 | 8 (200 %) |
| Фарміраванне мабільнай сеткі ўстаноў культуры (аўтаклубы, бібліобусы, перасоўныя відэакомплексы) | 354 | 222 | 273 (123 %) | 66 | 39 (59 %) | 61 | 59 (98 %) |
| Камп’ютарызацыя буйных сельскіх бібліятэк з падключэннем іх да сеткі Інтэрнэт | 954 | 634 | 708 (112 %) | 160 | 162 (101 %) | 160 | 181 (113 %) |
| Арганізацыя пляцовак філарманічнага і тэатральнага абслугоўвання насельніцтва | 250 | 161 | 190 (118 %) | 43 | 50 (116 %) | 46 | 46 (100 %) |
| Адкрыццё філіялаў і класаў дзіцячых школ мастацтваў | 118 | 64 | 224 (350 %) | 27 | 39 (144 %) | 27 | 38 (140 %) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пашыралася гастрольна-канцэртнае абслугоўванне насельніцтва. Асновай яго развіцця было рашэнне аб стварэнні пляцовак тэатральна-канцэртнага абслугоўвання ў аграгарадках. Толькі на працягу 2005–2006 гг. у аграгарадках пачалі працаваць 124 такія пляцоўкі. Усяго ў аграгарадках у 2006 г. быў праведзены 441 канцэрт. У цэлым за 2006 г. для сельскіх жыхароў было дадзена звыш 1700 канцэртаў, што на 12,0 % больш, чым у папярэднім [76, т. 3, арк. 273].

За перыяд рэалізацыі праграмы была створана 231 клубная ўстанова новага тыпу, адкрыты 29 раённых і сельскіх дамоў (цэнтраў) рамёстваў, 8 з іх – у 2010 г., пачалі работу 6 школ народнай творчасці [104, с. 52]. За час рэалізацыі Праграмы быў створаны 371 перасоўны кінавідэакомплекс, аўтаклуб і бібліобус. За пяцігоддзе на базе сельскіх дамоў культуры было створана 286 пляцовак філарманічнага і тэатральнага абслугоўвання насельніцтва, што садзейнічала павышэнню інтэнсіўнасці канцэртнага абслугоўвання сельскіх жыхароў [104, с. 52].

За гады рэалізацыі Праграмы быў створаны 301 філіял і клас дзіцячых школ з рознымі напрамкамі мастацкай творчасці: тэатральнага, харэаграфічнага, музычнага, выяўленчага мастацтва і інш. У аграгарадках за перыяд рэалізацыі Праграмы была камп’ютарызавана 1051 бібліятэка [104, с. 54].

У выніку выканання праграмы сельскім установам культуры і мясцовым жыхарам сталі даступныя сучасныя дасягненні цывілізацыі: новыя інфармацыйныя тэхналогіі і Інтэрнэт для сельскіх бібліятэк, відэаўстаноўкі для дэманстрацыі відэафільмаў у клубных установах, рэгулярныя канцэртныя выступленні і творчыя сустрэчы з вядучымі мастацкімі калектывамі і майстрамі сцэны нашай рэспублікі і замежжа.

Асаблівасцю ўдасканалення сістэмы культурна-выхаваўчай работы на сяле стала тое, што яна пачала праводзіцца не столькі праз раённыя цэнтры, колькі праз аграгарадкі як апорныя базы, культурныя цэнтры сельскіх саветаў. У гэтай сістэме не засталіся без увагі і жыхары аддаленых і маланаселеных пунктаў. Перасоўныя ўстановы культуры ў адпаведнасці з распрацаванымі графікамі дапоўнілі магчымасці сацыяльна-культурных цэнтраў у рабоце з вяскоўцамі. Такім чынам, адначасова з канцэнтрацыяй і фарміраваннем паўнацэннай інфраструктуры сацыяльна-культурных аб’ектаў у аграгарадках і буйных населеных пунктах вырашалася праблема абслугоўвання жыхароў маланаселеных пунктаў аўтаклубамі, бібліобусамі, перасоўнымі кінавідэаўстаноўкамі.

У 2009 г. была распачата праца па стварэнні праекта Дзяржаўнай праграмы развіцця сельскіх тэрыторый на 2011–2015 гг., якая павінна была замацаваць дасягнутыя ў 2005–2010 гг. вынікі і стварыць умовы для далейшага развіцця культуры ў сельскай мясцовасці [104, с. 54]. Аднак у праекце, які абмяркоўваўся ў 2010 г., выдаткі на развіццё культуры склалі ў 80 разоў меншую лічбу ў параўнанні са сродкамі, якія былі выдзелены Дзяржаўнай праграмай адраджэння і развіцця сяла на 2005–2010 гг. У праекце Дзяржаўнай праграмы развіцця сельскіх тэрыторый на 2011–2015 гг. адсутнічалі мерапрыемствы па будаўніцтве новых і мадэрнізацыі існуючых аб’ектаў культуры. На той час у краіне налічваўся 151 аб’ект, на якім не былі завершаны будаўнічыя і рамонтныя ра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

боты. Такое становішча выклікала занепакоенасць аб развіцці сеткі ўстаноў культуры [81, т. 10, арк. 11].

Адным са шляхоў пашырэння доступу насельніцтва да культуры з'яўляецца выкарыстанне ***сучасных інфармацыйных тэхналогій***. Першым крокам стала стварэнне ў пачатку 1990-х гг. аўтаматызаванага бібліятэчнага каталога ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У другой палове 1990-х гг. быў распрацаваны аўтаматызаваны музейны каталог у Дзяржаўным гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе». У 1998 г. Міністэрства культуры прыняло Праграму аўтаматызацыі галіны культуры на 1999–2004 гг. і Праграму падключэння галіны культуры да сеткі Інтэрнэт. У адпаведнасці з прынятай у лістападзе 1991 г. пастановай Савета Міністраў краіны «Аб праграме інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь» фінансаванне ўсіх гэтых работ на абласным і раённым узроўнях ажыццяўлялася за кошт абласнога і мясцовых бюджэтаў, сродкаў зацікаўленых арганізацый [356, с. 79; 855].

У адпаведнасці з *Праграмай інфарматызацыі галіны культуры на 1999–2004 гг.* у 2001 г. была распрацавана першая версія канцэпцыі зводнага электроннага каталога музейных прадметаў. Далейшае праектаванне каталога аднавілася толькі ў 2006 г. пасля прыняцця Закона Рэспублікі Беларусь «*Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь*» ад 24 лістапада 2005 [669].

У 2002 г. была зацверджана «*Дзяржаўная праграма інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь на 2003–2005 гг. і на перспектыву да 2010 г.* "*Электронная Беларусь*"», распрацаваная ў працяг канцэпцыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне інфарматызацыі, адобранай Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 6 красавіка 1999 г. № 195. Асобны раздзел праграмы называўся «Садзейнічанне развіццю культуры і сродкаў масавай інфармацыі шляхам укаранення інфармацыйных камп'ютарных тэхналогій (ІКТ)». У ёй было адзначана, што найбольш развітай у выкарыстанні ІКТ з'яўляецца бібліятэчная галіна. Асноўнай задачай праграмы ў сферы культуры з'яўлялася фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў культуралагічнага профілю і прадстаўленне іх у нацыянальным сектары Інтэрнэт. Асноўнымі напрамкамі інфарматызацыі галіны былі вызначаны:

падключэнне ўстаноў культуры да Інтэрнэту;

стварэнне электроннай энцыклапедыі беларускай культуры і размяшчэнне яе ў Інтэрнэце;

распрацоўка тыпавых праграмных рашэнняў па прадстаўленні ў Інтэрнэце музеяў і іншых устаноў культуры;

стварэнне інфармацыйных рэсурсаў беларускай мовы (машыннага фонду) [487].

У пераліку асноўных мерапрыемстваў праграмы знаходзіліся: стварэнне карпаратыўнай бібліятэчнай сеткі; стварэнне і ўкараненне ў Нацыянальнай бібліятэцы праграмна-тэхнічнага комплексу алічбоўкі і архівіравання старадрукаў і рэдкіх выданняў; стварэнне на падставе інтэрнэт-тэхналогій тыпавога праекта «Электронная бібліятэка»; распрацоўка нацыянальнага інтэрнэт-партала «Культура Беларусі»; стварэнне сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі выданняў і вядзення электроннага каталога; стварэнне інфармацыйнай сістэмы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічнай інфармацыі; стварэнне нацыянальнай базы аўтарытэтных запісаў (аўтары, прадметныя рубрыкі і г. д.).

У 2004 г. Міністэрства культуры зацвердзіла *Праграму інфарматызацыі аб'ектаў культуры на 2005–2010 гг.*, якая рэалізоўвалася ў рамках комплекснай праграмы «Электронная Беларусь».

Па дадзеных Міністэрства культуры на пачатак 2006 г. у аўтаматызаваным рэжыме функцыянавала: 197 бібліятэк (разам з гарадскімі і дзіцячымі філіямі), 49 музеяў, у тым ліку ўсе музеі рэспубліканскага падпарадкавання, а таксама Брэсцкай і Мінскай абласцей, камп'ютарызаваны 183 сельскія бібліятэкі, звыш 150 аб'ектаў культуры мелі выхад у Інтэрнэт, 40 аб'ектаў культуры прадставілі ў Інтэрнэце свае сайты. Вялася работа па стварэнні электронных каталогаў і бібліяграфічных, поўнатэкставых і фактаграфічных баз бібліятэк; баз дадзеных па народнай творчасці; мультымедыйных баз.

Аднак меліся значныя адставанні ў аўтаматызацыі клубаў, тэатраў, паркаў, цыркаў, кінавідэавытворчасці. Са 130 музеяў толькі 38,5% працавала з выкарыстаннем аўтаматызаваных музейных сістэм. Ні ў адной ВНУ культуры і мастацтва не была ўведзена ў дзеянне комплексная аўтаматызаваная сістэма ў поўным аб'ёме, слаба фарміраваліся інтэрнэт-рэсурсы, якія дазвалялі здзяйсняць дыстанцыйнае навучанне [260].

На жаль, у вывучаемы перыяд былі адзінкавымі праграмы і праекты, накіраваныя на ***забеспячэнне культурных запытаў асяродкаў з абмежаваным доступам да культуры*** – эмігрантаў, бежанцаў, маламаёмасных, інвалідаў, беспрацоўных, хворых, вязняў і г. д. У большасці сваёй гэта звязана з тым, што вырашэнне праблем дадзеных асяродкаў з'яўлялася адной з асноўных задач *не культурнай*, а *сацыяльнай* палітыкі дзяржавы. Культурны аспект праблемы сацыяльнага ўключэння з'яўляўся інтэграванай часткай больш маштабных праграм, як цэнтральных, так і рэгіянальных, мясцовых органаў улады. Такія праекты каардынаваліся з іншымі мясцовымі службамі і ўстановамі, недзяржаўнымі арганізацыямі, адукацыйнымі ўстановамі і г. д. Разам з гэтым установы культуры ў гэты час назапасілі пэўны вопыт.

У 1992 г. спецыяльным загадам Міністэрства культуры вызначыла льготы для інвалідаў пры наведванні дзяржаўных устаноў галіны. Згодна з ім у тэатральна-відовішчных прадпрыемствах павінны былі выдзяляцца па 5 месцаў для бясплатнага карыстання імі інвалідаў I групы. Ва ўстановах клубнага тыпу інваліды ўсіх груп атрымалі права карыстання платнымі паслугамі (акрамя канцэртаў, спектакляў прафесійных калектываў і кінасеансаў) са скідкай 50 % цаны. У кінатэатрах і кінаўстаноўках арганізоўваліся льготныя кінасеансы для інвалідаў і ветэранаў з цэнамі на білеты на 50 % ніжэй. З 1 студзеня 1993 г. для гэтай катэгорыі жыхароў уводзілася бясплатнае наведванне музеяў. Міністэрства культуры загадала кіраўнікам органаў і ўстаноў культуры і мастацтва прадугледзець у планах работы сістэматычныя мерапрыемствы для інвалідаў, арганізацыю гурткоў і калектываў мастацкай самадзейнасці, аматарскіх аб'яднанняў, а таксама інфармаванне аб культурна-масавых і творчых мерапрыем-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ствах усіх аддзяленняў таварystваў інвалідаў, інвалідаў па зроку і глухіх [439, спр. 1, арк. 25–26].

У сакавіку 1992 г. была заснавана штогадовая прэмія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за падтрымку творчасці інвалідаў і стварэнне ўмоў для іх адпачынку. Па выніках 1993 г. гэта прэмія была прысуджана Віцебскаму абласному навукова-метадычнаму цэнтру народнай творчасці і культурна-асветнай работы [438, спр. 6, арк. 3].

Улічваючы неабходнасць стварэння сістэмы ў рабоце па рэабілітацыі інвалідаў праз творчасць і мастацтва, у красавіку 1993 г. Прэзідыум Цэнтральнага праўлення Рэспубліканскага таварыства інвалідаў і калегія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь вырашылі правесці фестываль творчасці інвалідаў «Творчасць – шлях да сябе» [439, спр. 3, арк. 63–64]. У 1997 г. прайшоў IV Рэспубліканскі фестываль творчасці інвалідаў «Мастацтва жыць – тварыць мастацтва». Міністэрства культуры выступіла заснавальнікам трох грашовых прэмій лепшым мастацкім калектывам на заключных мерапрыемствах фестывалю [439, спр. 163, арк. 93].

Як найменш сацыяльна абароненая група насельніцтва інваліды абслугоўваліся бібліятэкамі праз нестацыянарныя пункты выдачы з дапамогай кнiганошаў, дзейнічаў прыём заказаў па тэлефоне. Нацыянальная бібліятэка выдавала літаратуру па міжбібліятэчным абанеменце цэнтральнай бібліятэкі Беларускага таварыства інвалідаў па зроку для ажыццяўлення пераводу кніг на агучаны варыянт.

Установы культуры краіны актыўна ўдзельнічалі ў выкананні рэспубліканскіх праграм «Дзеці-інваліды», «Дзеці Чарнобыля», «Сацыяльнае забеспячэнне дзяцей і сям'і», «Жанчыны Рэспублікі Беларусь», «Моладзь Беларусі», а таксама праграм па праблемах інваліднасці, пажылых людзей, здаровага ладу жыцця і іншых; у правядзенні «Дня маці», «Дня сям'і», «Дня абароны дзяцей», «Міжнароднага дня інваліда» і арганізацыі спецыяльных мастацкіх праграм для розных катэгорый насельніцтва.

24 снежня 1998 г. калегія Міністэрства культуры разгледзела пытанне аб выкананні ўстановамі культуры Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзіцяці ў Рэспубліцы Беларусь» [439, спр. 210, арк. 192]. У той час дзіцячую аўдыторыю абслугоўвалі 7 тэатраў лялек і Рэспубліканскі тэатр юнага гледача, дзіцячая філармонія. У 1997 г. дзіцячыя тэатры паказалі 2341 спектакль, на якіх пабывалі каля 500 тыс. дзяцей. У краіне на той час працавала 271 дзіцячая бібліятэка, абслугоўвалася штогод звыш мільёна дзяцей. Звыш 13 тыс. дзяцей і падлеткаў наведвалі больш за 10 тыс. дзіцячых клубных аб'яднанняў. 180 дзіцячых мастацкіх калектываў насілі ганаровае званне «ўзорны». Рэспубліканская экспертная камісія па прадухіленні прапаганды парнаграфіі, насілля і жорсткасці надавала пільную ўвагу недапушчэнню знявагі чалавечай годнасці, годнага ўздзеяння на дзяцей у сродках масавай інфармацыі, літаратуры, відовішчных і іншых мерапрыемствах. Для дзяцей быў уведзены шэраг ільгот. Абмежавана да 30 % ад мінімальнай заработнай платы плата за навучанне ў дзіцячых школах



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтваў усіх тыпаў. Было прадугледжана бясплатнае наведванне музеяў дзецьмі-сіротамі. Дзяржава фінансавала большасць паездак для ўдзелу ў міжнародных фестывалях, конкурсах юных музыкантаў, танцораў, мастакоў. У Рэспубліканскім вучэбным комплексе гімназія-каледж пры Беларускай акадэміі музыкі і Дзяржаўным харэаграфічным каледжы было ўведзена бясплатнае харчаванне для навучэнцаў, якія пражывалі ў інтэрнатах. Побач з гэтым калегія адзначала пэўныя цяжкасці, якія існавалі ў матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні дзіцячай творчасці. Так, з-за абмежаванага бюджэтнага фінансавання на набыццё музычных інструментаў для школ мастацтваў адбывалася хуткае старэнне фонду музычных інструментаў. Калі ў 1992 г. праз сістэму «Белмузпрома» было набыта 272 піяніна, 119 цымбалаў, 80 гітар, то ўжо ў 1995 г. – толькі 8 піяніна, 15 цымбалаў. Мясцовая вытворчасць не выраблялa фарбаў для дзяцей, а гандаль прапаноўваў імпартныя матэрыялы па вялікім кошце, што практычна спыніла заняткі жывапісам у мастацкіх школах і вучылішчах [439, спр. 210, арк. 192–193].

У Беларусі папулярнасцю карысталася спецыяльная праграма для наведвальнікаў кінатэатраў. На сеансы, якія дэманстраваліся ў дзённы час, устанаўліваліся спецыяльныя кошты (звычайна напалову меншыя) – так званыя льготныя сеансы, разлічаныя на прадстаўленне магчымасці знаёмства з кіно маламаёмасным катэгорыям грамадзян. У выніку ў рэспубліцы назіралася тэндэнцыя да павелічэння колькасці гледачоў. Для параўнання, у 2002 г. іх было 10,5 млн, у 2005 – больш за 13 млн (гл. табл. 5, с. 299). Была наладжана практыка забеспячэння кінавідэапракатных арганізацый відэапраекцыйнымі ўстаноўкамі для паляпшэння абслугоўвання сельскага насельніцтва.

Асобную групу насельніцтва краіны, якая патрабавала асаблівай увагі, складалі *мігранты*. За 1996–2005 гг. рэспубліка прыняла больш за 35 тыс. вымушаных мігрантаў, на 1 жніўня 2006 г. 796 чалавек атрымалі статус *бежанцаў* [222]. Большая частка афіцыйна зарэгістраваных бежанцаў жыла ў Мінску. У Мінску Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Эўрыка» Фрунзенскага раёна даваў магчымасць дзецям бежанцаў разам з беларускімі равеснікамі ўдзельнічаць у разнастайных культурных мерапрыемствах. На працягу пяці гадоў у горадзе працавала праграма «Сацыялізацыя і адаптацыя дзяцей бежанцаў у Беларусі». У 2004 г. у ёй былі задзейнічаны каля 200 дзяцей бежанцаў і асоб, якія шукалі прыстанішча. Сярэдняя школа № 136 сталіцы была абрана базавай для адаптацыі дзяцей-бежанцаў. У Гродна для афганскіх і грузінскіх дзяцей былі арганізаваны курсы па вывучэнні роднай мовы і культурнай спадчыны. У Гомелі для бежанцаў былі створаны курсы па вывучэнні рускай мовы [619].

Значную групу сацыяльна ізаляваных грамадзян складаюць *інваліды*. Законы «Аб сацыяльнай абароне інвалідаў» (1991 г., новая рэдакцыя 2000 г.) і «Аб папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў» (1994 г.) накладалі абавязак на мясцовыя органы ўлады забяспечыць дадзенай катэгорыі грамадзян доступ у культурна-відовішчныя ўстановы і распрацаваць спецыяльныя мерапры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

емствы па забеспячэнні паляпшэння ўзроўню іх жыцця, стварэння роўных магчымасцей для поўнага ўдзелу ў жыцці грамадства. У Беларусі такіх жыхароў у 2005 г. налічвалася каля 480 тыс. чалавек, толькі ў сталіцы – 51 тыс. чалавек [203].

У 2005 г. была распрацавана дзяржаўная праграма па папярэджанні інваліднасці і рэабілітацыі інвалідаў на 2006–2010 гг. – ужо чацвёрты праграмны дакумент, разлічаны на пяцігодку. У яе распрацоўцы прымалі ўдзел міністэрствы аховы здароўя, адукацыі, грамадскія аб’яднанні інвалідаў. На жаль, у сістэму мерапрыемстваў не ўвайшлі культурныя акцыі і распрацоўкі шляхоў інтэграцыі інвалідаў у грамадства праз культуру, хаця ў гэтым напрамку існуе пэўны вопыт. З сярэдзіны 1990-х гг. у Мінску праводзіўся адзіны ў СНД фестываль спеваў пры дапамозе жэстаў «Сузор’е».

У Мінску, Пінску і Брэсце мясцовыя ўлады фінансавалі дзейнасць спецыяльных гарадскіх бібліятэк для сляпых. У сталіцы бібліятэка для сляпых ўваходзіла ў склад Цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк. Да 2003 г. яна знаходзілася ў структуры Беларускага таварыства сляпых. Чытачамі бібліятэкі ў 2005 г. з’яўлялася каля 2 тыс. чалавек (1500 – гарадскі абанемент і 500 – завочны). Бібліятэка сістэматычна праводзіла гурткі гучнага чытання, інфармавала карыстальнікаў пра новыя выданні кніг, праводзіла сустрэчы з пісьменнікамі, здзяйсняла надомнае абслугоўванне, раз на месяц рабіліся выезды па раёнах [203].

Работа з інвалідамі бібліятэк Мінска была накіравана не толькі на забеспячэнне доступу да інфармацыі, але і арганізацыю вольнага часу наведвальнікаў, стварэнне ўмоў для творчай дзейнасці чытачоў. Бібліятэкі імкнуліся дапамагчы чытачам-інвалідам адчуваць сябе раўнапраўнымі і патрэбнымі членамі грамадства. У бібліятэцы № 7 у 2005 г. праходзілі сустрэчы са спецыялістамі, пазнавальныя гадзіны для дзяцей-інвалідаў. Супрацоўнікі бібліятэкі № 4 запрашалі на свае мерапрыемствы («Ты пясчынка прыроды. Беражы сябе», «Пісьменніцкі аўтограф») і самі завітвалі ў госці да навучэнцаў СШ № 188, якія маюць праблемы са зрокам.

Работу з бацькамі дзяцей-інвалідаў разам з Саветам жанчын і Арганізацыяй дапамогі дзецям-інвалідам Першамайскага раёна праводзіла бібліятэка № 15. Не былі забытыя таленавітыя асобы, якіх шмат ёсць сярод інвалідаў. Так, у галерэі «Вільнюс» у 2005 г. дэманстравалі свае таленты ўдзельнікі студыі выяўленчага мастацтва «Палітра» рэабілітацыйнага цэнтра інвалідаў Першамайскага раёна (№ 18). Чытачы, якія належалі да гэтай групы карыстальнікаў, мелі магчымасць браць на дом літаратуру павышанага попыту бясплатна з фонду чытальнай залы [203].

З 2003 г. вядзе сваю гісторыю тэатр «Пераадоленне», які складаецца з маладых інвалідаў Брэсцкай вобласці і ўваходзіць у склад Брэсцкага маладзёжнага грамадскага аб’яднання «Інвалід і асяроддзе». У 2010 г. тэатр базіраваўся ў г. Пінску. Яго кіраўніком была Н. Голубева. У тым жа годзе калектыў прымаў удзел



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у фестывалі «Славянскі базар у Віцебску» [775]. Падобныя тэатры існавалі ў Кобрынскай школе-інтэрнаце (тэатр «Карусель», рэжысёр Ж. Драгак), Пінскай школе-інтэрнаце для дзяцей з парушэннямі слыху (тэатр «КІД», рэжысёр Н. Клюско) і іншых гарадах.

У сакавіку 2004 г. два тэатральных калектывы з Брэста – «Драматычны тэатр» з вытворчых майстэрань інвалідаў і «Жалейка» з Брэсцкай дапаможнай школы – прынялі ўдзел у III Львоўскім фестывалі тэатральных калектываў «Непратаптаны шлях», а ў красавіку таго ж года тэатр «Пераадоленне» ўпершыню дэбютаваў як прадстаўнік Беларусі на XIV Люблінскім фестывалі з той жа назвай [667].

Значны ўнёсак у сацыялізацыю маладых людзей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, рэалізацыю імі сваіх культурных запытаў зрабіў беларускі фестываль «Непратаптаны шлях», які з 2005 г. праводзіла згаданае вышэй Брэсцкае маладзёжнае грамадскае аб’яднанне «Інвалід і асяроддзе». У ім побач з беларускімі калектывамі прымалі ўдзел аматарскія тэатры з Украіны, Польшчы, Германіі, Літвы, Расіі. У 2010 г. адбыўся шосты фестываль [455].

Акрамя згаданага фестывалю грамадскае аб’яднанне «Інвалід і асяродзе» рэалізоўвала іншыя праекты, накіраваныя на сацыялізацыю інвалідаў пры дапамозе мастацтва. Так, у 2007–2009 гг. аб’яднанне здзейсніла праект «Інтэграцыя праз мастацтва». Адным з яго вынікаў стала арганізацыя працы фотаклуба «Погляд», стварэнне тэатральнай групы «Калейдаскоп», правядзенне шэрага семінараў [259]. У рамках праекта «Мастацтва быць сабою» ў верасні 2010 г. быў праведзены навучальны семінар для кіраўнікоў і рэжысёраў асобых тэатраў, практычныя заняткі з кіраўнікамі і ўдзельнікамі тэатральных калектываў [426].

Згаданыя праекты рэалізоўваліся пры непасрэдным удзеле дзяржаўных устаноў і органаў мясцовай выканаўчай улады – аддзелаў па справах моладзі Брэсцкіх аблвыканкама і гарвыканкама, упраўлення культуры і адукацыі аблвыканкама, цэнтра моладзевай творчасці і інш.

Такім чынам, у дзяржаўнай культурнай палітыцы ў Рэспубліцы Беларусь у вывучаемы перыяд былі дасягнуты пэўныя поспехі на шляху забеспячэння роўнага доступу грамадзян да культуры і ўдзелу ў культурным жыцці. Дзяржаўнай увагай былі ахоплены нацыянальныя меншасці, моладзь, інваліды і састарэлыя. Асаблівая ўвага надавалася культурнаму абслугоўванню сельскіх населеных пунктаў. Разам з гэтым у краіне не сфарміравалася ўяўленне аб культуры як істотным механізме сацыяльнага развіцця. Гэта падкрэслівалася і ў Нацыянальнай стратэгіі развіцця Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г., у якой побач з адзнакай дасягненняў дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры адзначаны і моманты, якія патрабуюць асаблівай увагі: «у сферы грамадскага і дзелавога жыцця культура яшчэ не разглядаецца як істотная парадыгма развіцця. У грамадстве павольна ўсведамляецца, што маральна-духоўныя імператывы, таксама як экалагічныя і эканамічныя, з’яўляюцца рашаючымі пры пераходзе да ўстойлівага развіцця» [445, с. 58].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дасягненню грамадскай еднасці жыхароў, барацьбе з сацыяльнай ізаляванасцю, на наш погляд, можа спрыяць распрацоўка нацыянальнай стратэгіі, у якой культурныя ўстановы будуць разглядацца як інструменты, з дапамогай якіх можна супрацьстаяць негатыўным з’явам у грамадстве і пазбегнуць сацыяльнай ізаляванасці.

### 4.3. Адукацыя ў сферы культуры

Захаванне і развіццё культуры, выхаванне павагі да традыцый і стымуляванне да творчасці не магчыма без адукацыі. Адукацыя адыгрывае адну з галоўных роляў у падрыхтоўцы людзей да таго, каб яны змаглі пранікнуцца сваёй культурай, стаць яе часткай.

Перад дзяржавай на шляху развіцця адукацыі ў сферы культуры стаяць дзве ўзаемазвязаныя задачы. Першая з іх – арганізацыя адукацыі насельніцтва для таго, каб яно магло атрымоўваць задавальненне ад культурнага жыцця і ўдзельнічаць у ім у поўнай меры. Не менш важнай з’яўляецца задача развіцця адукацыі, якая накіравана на падрыхтоўку пэўнай колькасці людзей да здзяйснення сваёй прафесійнай дзейнасці і кар’еры ў сферы культуры.

З набыццём незалежнасці Рэспублікі Беларусь узнікла неабходнасць стварэння нацыянальнай сістэмы прафесійнай адукацыі, што запатрабавала рэфармавання з улікам сацыяльна-эканамічных, палітычных, ідэалагічных рэалій пры абавязковым захаванні эфектыўнага вопыту, які быў назапашаны ў мінулыя гады.

У 1999 г. у мэтах забеспячэння ўмоў для дыферэнцыраванага навучання вучняў, авалодання імі ведамі і ўменнямі па асобных вучэбных прадметах на паглыбленым узроўні, развіцця інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу навучэнскай моладзі загадам міністра адукацыі было зацверджана Прыкладнае палажэнне аб агульнаадукацыйных школах (класах) з паглыбленным вывучэннем асобных прадметаў, эстэтычным і фізкультарна-спартыўным ухіламі.

Школы (класы) з эстэтычным (музычным, харавым, мастацкім, архітэктурна-мастацкім, харэаграфічным, тэатральным, агульнаэстэтычным) ухіламі забяспечваюць вучням агульную сярэднюю адукацыю і паглыбленае авалоданне ведамі і ўменнямі па профільных вучэбных дысцыплінах, працоўную і прафесійную падрыхтоўку, развіццё творчых здольнасцей адпаведна іх інтарэсам і схільнасцям.

У 2003/04 навучальным годзе ў 481 школе працавалі класы з рознымі ўхіламі, у якіх навучаліся 102 024 вучні падрыхтоўчых і 1–11 класаў (у сельскай мясцовасці адпаведна 118 школы і 8343 вучні). У 185 школах былі арганізаваны агульна-эстэтычныя класы, у 103 школах – мастацкія, у 96 – харэаграфічныя, у 92 – музычныя (харавыя), у 42 школах – тэатральныя і г. д. У параўнанні з папярэднім навучальным годам колькасць такіх школ павялічылася на 33 [249].

У той перыяд у краіне праводзілася сумесная праца ўстаноў культуры і адукацыі па выхаванні дзяцей, падлеткаў, моладзі сродкамі традыцыйнай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

мастацкай культуры. На дасягненне гэтай мэты былі накіраваны такія рэспубліканскія праекты, як «Берагіня», «Танцавальны фальклор і дзеці», «Беларуская полька». Іх арганізатарам і куратарам выступаў Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры.

Вялікая роля ў мастацкім выхаванні належала прафесійным мастацкім калектывам, тэатрам, музеям, канцэртным арганізацыям. Станоўчай тэндэнцыяй стала запрашэнне ў школы прадстаўнікоў творчых прафесій для вядзення пазакласнай работы (арганізацыі тэатральных, танцавальных, харэаграфічных гурткоў і г. д.). Для вучняў школ арганізоўваліся спецыяльныя канцэртныя праграмы, непасрэдна ў школах дэманстраваліся тэатральныя пастаноўкі. Папулярнымі былі тыдні тэатра, кнігі, музыкі, выяўленчага мастацтва для дзяцей і моладзі, якія праводзіліся рэгулярна.

Установы культуры і мастацтва стваралі ўмовы для развіцця творчых здольнасцей, фарміравання эстэтычных густаў, магчымасці далучэння да лепшых дасягненняў айчыннай і сусветнай культуры навучэнцаў агульнаадукацыйных школ.

У канцы 1990 – пачатку 2000-х гг. у Слуцку, Маладзечне, Вілейцы і Мядзелі былі створаны цэнтры мастацкай творчасці навучэнцаў. Цэнтры ў выніку эксперыменту па ўкараненні эстэтычнага ўсенавучу вучняў агульнаадукацыйных школ намаганнямі работнікаў культуры і адукацыіператварыліся ў дзяржаўныя ўстановы, дзе звыш 3,5 тыс. вучняў займаліся па спецыяльных праграмах эстэтычнага цыкла, працавалі студыі, гурткі, вялася паўсядзённая праца па далучэнні дзяцей да свету мастацтва.

Асноўнай формай ***пачатковай мастацкай адукацыі*** з'яўлялася сетка дзіцячых школ мастацтваў розных тыпаў (музычныя, харавыя, мастацкія, харэаграфічныя, мастацкіх рамёстваў і г. д.).

У 1990-я гг. у Беларусі адбываўся працэс рэфармавання сістэмы адукацыі. Пачынаючы з 1992 г. былі рэалізаваны меры па пераглядзе зместу мастацкай адукацыі. На працягу 1992–1996 гг. былі распрацаваны новыя вучэбныя планы па музычным, выяўленчым і харэаграфічным відах мастацтваў для дзіцячых школ мастацтваў. Новыя падыходы да навучання ў гэтых школах прадугледжвалі яго дыферэнцыяцыю – эстэтычнае для усіх навучэнцаў і прафесійна арыентаванае для больш адораных дзяцей. Прадметы па выбары дазволілі вучням праяўляць індывідуальныя творчыя здольнасці [356, с. 228, 229].

На пачатак 1995 г. колькасць дзіцячых школ мастацтваў дасягнула 537 (з іх 399 – музычныя школы, 24 – мастацкія, 5 – харэаграфічныя, 109 – школы мастацтваў). Агульная колькасць навучэнцаў у іх складала 83 867 чалавек. Пры гэтым тэатральнаму мастацтву навучалася толькі 2 %, эстраднаму – 0,25 % вучняў [356, с. 229].

Па стане на 1 верасня 1999 г. у краіне дзейнічала 524 дзіцячыя школы мастацтваў, з якіх 325 – музычныя, 162 – школы мастацтваў, 24 – мастацкія, 5 – харэаграфічныя, 3 – духавых і ўдарных інструментаў і інш. З іх у сельскай мясцовасці – 244. Кантынгент вучняў складаў 85,6 тыс. чалавек. Колькасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацкіх і харэаграфічных школ на працягу дзесяцігоддзя заставалася нязменнай. Дадзеныя ўстановы былі размешчаны па абласцях дастаткова раўнамерна. У канцы 1990-х гг. назіралася ўстойлівая тэндэнцыя да росту кантынгенту іх вучняў, асабліва ў мастацкіх школах, дзе ў параўнанні з 1997 г. у 1999 г. колькасць вучняў узрасла на 12 %. Як у музычных, так і ў мастацкіх школах у той час былі ўведзены новыя вучэбныя планы, якія прадугледжвалі дыферэнцыялізацыю працэсу навучання. Разам са школамі, якія спецыялізаваліся на навучанні якому-небудзь асобнаму віду мастацтва, існаваў і такі тып школ, які ўключаў у сябе аддзяленні розных відаў мастацтваў. Гэта дзіцячыя школы, якія ўяўлялі сабой своеасаблівыя комплексныя цэнтры эстэтычнай адукацыі, дзе больш поўна задавальняліся патрэбнасці дзяцей у пачатковай мастацкай, музычнай, харэаграфічнай, тэатральнай адукацыі, развіваліся іх творчыя здольнасці. Калі ў 1987 г. у рэспубліцы налічвалася 18 такіх школ, то на 1 верасня 1999 г. іх стала 162. Такі рост быў абумоўлены тэндэнцыяй да змены профілю музычных школ у школы мастацтваў. Дзіцячыя школы мастацтваў складалі 31 % ад усёй колькасці вучэбных устаноў пачатковага звяна. На тэатральных аддзяленнях займаліся 2 % ад агульнай колькасці навучэнцаў, на мастацкіх – 11, харэаграфічных – 16, музычных – 69 %. Лічбы сведчылі аб дамінаванні музычнай адукацыі. Побач з гэтым існавала тэндэнцыя да павелічэння колькасці дзяцей, якія займаліся ў класах выяўленчага, харэаграфічнага і тэатральнага профілю, а таксама ў школах (аддзяленнях) народнага мастацтва (народны танец, рамёствы і промыслы) [439, спр. 353, арк. 7, 12].

Паспяховая дзейнасць дзіцячых школ мастацтваў і здзяйсненне ў поўнай меры ўсіх іх функцый залежала ад розных форм узаемасувязі з сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі. Такая пераемнасць павінна была будавацца на выпрацоўцы сумесных планаў работы метадычных аб’яднанняў, правядзенні майстар-класаў, праслухоўванняў, кансультацый, справаздачных канцэртаў. Аднак у канцы 1990-х гг. паміж гэтымі двума звёнамі назіралася аслабленне кантактаў, апошнія часцей насілі выпадковы характар [439, спр. 353, арк. 12, 13].

Пераўтварэнне вузкапрофільных (як правіла, музычных) школ у школы мастацтваў дазволіла істотна павялічыць колькасць навучэнцаў. Гэта было асабліва важна для невялікіх раённых гарадоў, дзе дзіцячая школа мастацтваў з’яўляецца адзіным цэнтрам пачатковай мастацкай адукацыі. Так, за перыяд з 1997 па 2010 г. колькасць музычных школ скарацілася амаль у 2 разы (з 363 да 178), а колькасць школ мастацтваў узрасла больш чым удвая (з 133 да 295). Пры гэтым агульная колькасць дзіцячых школ мастацкай адукацыі змянілася нязначна. Пасля некаторага змяншэння ў пачатку 2000-х гг. яна амаль дасягнула ўзроўню другой паловы 1990-х гг. У гэты ж перыяд назіраўся пастаянны рост колькасці навучэнцаў (за выключэннем 2002 г.) (табл. 9).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 9.* **Колькасць дзіцячых школ мастацкай адукацыі [204]**

| Тып школ | Год | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1997 | 2000 | 2002 | 2004 | 2006 | 2008 | 2010 |
| Музычныя | 363 | 316 | 290 | 261 | 227 | 207 | 178 |
| *З іх на сяле* | 210 | 197 | 164 | 145 | 125 | 121 | 98 |
| Духавых і ўдарных інструментаў | – | 4 | 4 | 2 | 2 | – | – |
| Харэаграфічныя | – | 6 | 7 | 8 | 9 | 9 | 9 |
| Мастацкія | 24 | 24 | 24 | 24 | 23 | 23 | 25 |
| Школы мастацтваў | 133 | 171 | 191 | 211 | 247 | 269 | 295 |
| *З іх на сяле* | 47 | 62 | 76 | 79 | 98 | 124 | 117 |
| Народных рамёстваў | 1 | 1 | 2 | 2 | 5 | – | – |
| Дзіцячыя тэатральныя | – | – | – | 1 | 1 | – | – |
| Іншыя (фальклорныя, народнага танца і г. д.) | 5 | 4 | 1 | – | 1 | – | – |
| *З іх на сяле* | – | – | 1 | – | – | – | – |
| Вячэрнія школы агульнай музычнай адукацыі | 1 | 1 | – | – | – | – | – |
| Астатнія | – | – | – | 5 | 8 | 5 | 6 |
| **Усяго** | **527** | **527** | **519** | **509** | **515** | **522** | **523** |
| *З іх на сяле* | 257 | 259 | 274 | 224 | 223 | 250 | 221 |
| **Агульная колькасць навучэнцаў** | **85542** | **89070** | **87533** | **91946** | **96522** | **101100** | **104843** |

У сярэдзіне 2000-х гг. адбыўся перавод навучання ў дзіцячых музычных школах на новыя вучэбныя планы, якія прадугледжвалі падзел працэсу навучання і ў адпаведнасці з гэтым уключалі ў сябе агульную музычную адукацыю і прафесійную музычную арыентацыю. Такім чынам, дакладна вызначыліся ўстаноўкі і мэты працэсу навучання ў музычнай школе: частка вучняў атрымлівалі агульную эстэтычную адукацыю, а найбольш адораныя рыхтаваліся да працягу адукацыі на наступным узроўні. Згодна з гэтымі планамі, асаблівая роля адводзілася прадметам па выбары, што давала вучням рэальную магчымасць задавальняць уласныя інтарэсы і выяўляць індывідуальныя здольнасці.

Характэрнай асаблівасцю пачатку XXI ст. з'явілася адкрыццё ў дзіцячых школах мастацтваў аддзяленняў народнага мастацтва, промыслаў і рамёстваў. Практычна ўсе яны былі створаны на базе студый, гурткоў, дамоў рамёстваў, клубаў народных майстроў і да т. п. Адкрыццё такіх аддзяленняў звязана з адраджэннем і развіццём традыцый народнага мастацтва тых ці іншых рэгіёнаў рэспублікі. Стварэнню ж самастойных навучальных устаноў такога ж тыпу перашкаджала адсутнасць мэтанакіраванай і планамернай сістэмы падрыхтоўкі адпаведных спецыялістаў, а таксама дакладнай структуры навучальных устаноў, якая б адпавядала традыцыям і патрэбнасцям кожнага рэгіёна рэспублікі. У 2005 г. існавала толькі адна школа мастацкіх рамёстваў, дзе навучалася 256 чалавек і працавала 24 выкладчыка (у 1998 г. было 205 чалавек і 26 выкладчыкаў) [271].

Па дадзеных на 2008 г., Беларусь з'яўлялася лідарам сярод краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў з насельніцтвам менш за 20 млн чалавек як па колькасці дзіцячых школ мастацтваў, так і па колькасці навучэнцаў. У адносных паказчыках Беларусь апярэджвала некаторыя краіны з насельніцтвам звыш

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

20 млн чалавек. Так, саступаючы Украіне па колькасці насельніцтва ў 5 разоў, у нашай краіне было толькі ў 2,8 разы менш школ мастацтваў, а навучэнцаў у іх – у 3,2 разы. Маючы колькасць насельніцтва у 15 разоў меншую за Расію, Беларусь саступала па колькасці школ у 10 разоў, па колькасці навучэнцаў – у 14 разоў. Пры гэтым у нашай краіне пры дастаткова стабільнай колькасці дзіцячых школ мастацтваў у 2000–2008 гг. назіраўся высокі і ўстойлівы рост колькасці навучэнцаў – амаль 14 %. У Расіі за гэты ж перыяд – 7,5 %, ва Украіне – амаль 8 % [81, т. 5, арк. 14–15].

У 2008–2010 гг. Міністэрства культуры выступіла ініцыятарам змен у дзейнасці дзіцячых школ мастацтваў. Было зацверджана новае Палажэнне аб дзіцячай школе мастацтваў, узаконена плата за навучанне, уведзена ў Адзіны кваліфікацыйны даведнік пасад служачых пасада «настаўнік установы пазашкольнага выхавання і навучання ў сферы культуры» вызначаны тэрмін адпачынку для працуючых на гэтай пасадзе на ўзроўні настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі [356, с. 104].

Сярод недахопаў пачатковай ступені мастацкай адукацыі з'яўляўся нізкі паказчык прафесійна арыентаваных навучэнцаў. Колькасць дзяцей, якія рыхтаваліся да паступлення ў навучальныя ўстановы культуры і мастацтва на працягу другой паловы 2000-х гг., заставалася на ўзроўні 8 % ад агульнага кантынгенту дзіцячых школ мастацтваў [103, с. 104].

У рэспубліцы склалася сістэма правядзення дзіцячых і маладзёжных творчых спаборніцтваў, многія з якіх мелі статус міжнародных. Яны стымулявалі развіццё творчых здольнасцей дзяцей, дазвалялі выявіць і прафесійна зарыентаваць найбольш адораную вучнёўскую моладзь. Сярод іх: музычныя фестывалі і конкурсы, дзіцячыя пленэры, прысвечаныя выдатным мастакам. Сярод іх традыцыйнымі былі конкурс юных кампазітараў у Гродна, фестываль імя Агінскага у Смаргоні, конкурс юных піяністаў імя Цвятаевай у Барысаве, Рэспубліканскі конкурс імя Жыновіча для юных выканаўцаў на народных інструментах. З мэтай падтрымкі дзяцей чарнобыльскай зоны ў Гомелі праводзіўся Міжнародны фестываль-конкурс «Музыка надзеі». Як бачна, па музычных і мастацкіх спецыяльнасцях правядзенне конкурсаў насіла сістэмны характар, а па іншых відах мастацтва (харэаграфічнае, тэатральнае) гэта форма амаль не выкарыстоўвалася [439, спр. 353, арк. 13].

Асаблівы клопат дзяржавы – адораныя дзеці, таленавітая моладзь, якія дасягнулі выключных поспехаў у творчасці. Гэтаму ў поўнай меры садзейнічаў спецыяльны фонд па падтрымцы таленавітай моладзі, створаны Указам Прэзідэнта ў студзені 1996 г. Сродкі фонду накіроўваліся на набыццё музычных інструментаў, ажыццяўленне стажыровак, пленэраў, майстар-класаў, на арганізацыю публікацый. Акрамя таго, быў створаны Цэнтр па рабоце з адоранай моладдзю, дзе быў сабраны ўнікальны матэрыял для электроннага каталога, устаноўлена цесная сувязь з абласнымі ўпраўленнямі культуры, наладжана супрацоўніцтва з Міжнароднай дабрачыннай праграмай «Новыя імёны». Былі здзейснены захады па пошуку і прыцягненні адораных дзяцей і моладзі да вучобы ў лепшых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкладчыкаў рэспублікі, сярод якіх выкладчыкі дзвюх акадэмій – музыкі і мастацтваў: народны артыст СССР В. Елізар'еў, заслужаныя дзеячы мастацтваў В. Рахленка і Л. Шаломенцава, народны мастак Беларусі Г. Вашчанка.

Наступным звяном прафесійнай мастацкай адукацыі з'яўлялася сетка *сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў (ССНУ).* Іх задачы былі шматгранныя: падрыхтоўка навучэнцаў для работы ў пачатковым звяне ў якасці выкладчыкаў, падрыхтоўка канцэртмайстраў, артыстаў, кіраўнікоў калектываў, а таксама абітурыентаў вышэйшага звяна прафесійнай адукацыі.

У 1991–1996 гг. адбылася першая хваля структурнай рэарганізацыі сістэмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі галіны. Створаныя ў 1994 г. вучэбныя планы для ССНУ вызначылі асноўныя прыярытэты і мэты новай адукацыйнай палітыкі на дадзеным этапе навучання. Яна выяўлялася ў гуманітарным змесце агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі навучэнцаў і ўзмацненні педагагічнай накіраванасці навучання, чым і было абумоўлена ўвядзенне ў вучэбны працэс блока музычна-педагагічных прадметаў, а таксама дзяржаўнага экзамену ў адпаведнасці з кваліфікацыяй выкладчыка. Акрамя таго, новыя вучэбныя планы прадугледжвалі адвядзенне значнага аб'ёму гадзін на правядзенне факультатываў і кансультацый, што дазваляла ў нейкай ступені надаць вучэбнаму працэсу гнуткасць і развіць індывідуальныя здольнасці кожнага навучэнца.

Прайшла рэарганізацыя ўстаноў адукацыі. Культурна-асветныя вучылішчы спачатку былі пераўтвораны ў вучылішчы мастацтваў, а затым, часткова, у каледжы. Адбылося пераўтварэнне Магілёўскага, Віцебскага, Гродзенскага, Мінскага культпрасветвучылішчаў у вучылішчы мастацтваў і культуры, дзе рыхтаваліся па спецыяльнасцях выяўленчага і тэатральнага мастацтва, была пашырана падрыхтоўка па харэаграфіі. Самастойнай навучальнай установай стаў філіял Мінскага мастацкага вучылішча ў г. Гомелі, што дало магчымасць мэтанакіравана забяспечваць спецыялістамі ўстановы культуры і мастацтва чарнобыльскі рэгіён. На 1 кастрычніка 1996 г. дзейнічала 9 музычных вучылішчаў, 2 каледжы (Брэсцкі музычны каледж імя Г. Шырмы і Гомельскі каледж мастацтваў імя М. Сакалоўскага), 2 мастацкія вучылішчы і адно вучылішча культуры, 1 харэаграфічнае вучылішча і 4 вучылішчы мастацтваў, бібліятэчны тэхнікум і Рэспубліканскі ліцэй пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі – усяго 21 установа [356, с. 230].

Сярэдняя спецыяльная адукацыя ў Беларусі атрымала новы імпульс, абумоўлены з'яўленнем новых спецыялізацый. Да 1998 г. у рэспубліцы нельга было атрымаць адукацыю па эстрадна-цыркавым напрамку. Для забеспячэння патрэб на базе Мінскага музычнага вучылішча была адкрыта спецыяльнасць «Цыркавое мастацтва».

План прыёму ў навучальныя ўстановы вызначаўся ў адпаведнасці з патрэбай у кадрах устаноў культуры і мастацтваў абласцей. У мэтах ажыццяўлення больш адраснай падрыхтоўкі спецыялістаў для сельскіх дамоў культуры, школ мастацтваў выкарыстоўваўся мэтавы прыём абітурыентаў: да 20–30 %

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад лічбаў прыёму ў навучальныя ўстановы Брэсцкай і Гродзенскай абласцей, да 70 % – Магілёўскай і Віцебскай. Мэтавы прыём станоўча ўздзейнічаў на вынікі размеркавання маладых спецыялістаў. Напрыклад, у 1997 г. у параўнанні з 1995 г. працэнт накіраваных на работу выпускнікоў істотна ўзрос у Гомельскім (з 48 да 89 %), Брэсцкім (з 62 да 76 %) каледжах, Лідскім (з 63 да 89 %) і Віцебскім (з 66 да 83 %) вучылішчах. Побач з гэтым у Наваполацкім музычным вучылішчы гэты паказчык істотна зменшыўся – з 91 % у 1994 г. да 72 % ў 1997 г. [439, спр. 352, арк. 206].

З мэтай якаснага і поўнага забеспячэння спецыялістамі ўстаноў культуры і народнай творчасці, якія знаходзіліся ў сельскай мясцовасці, на тэрыторыях, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, у 1998 г. было прынята Палажэнне аб мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў у сярэдніх спецыяльных навучальных установах сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [439, спр. 352, арк. 242].

У 1990-я гг. востра стаяла праблема размеркавання выпускнікоў. За 1994–1997 гг. з агульнай колькасці размеркаваных выпускнікоў Віцебскага вучылішча мастацтваў і Брэсцкага музычнага каледжа да работы па накіраванні прыступілі толькі адпаведна 22 % і 28 % выхаванцаў гэтых навучальных устаноў [439, спр. 352, арк. 202].

Новая палітыка ў сферы адукацыі ў 2001–2006 гг. была накіравана на захаванне ўсёй сеткі навучальных устаноў, фарміраванне сучаснай канцэпцыі развіцця адукацыі, на вызначэнне прафесійнай арыентацыі кожнай навучальнай установы. Сярэдняя спецыяльная адукацыі ў Беларусі атрымала новы імпульс, абумоўлены распрацоўкай першага пакалення адукацыйных стандартаў, з’яўленнем новых спецыялізацый. Напрыклад, у 2006 г. у Брэсцкім дзяржаўным музычным каледжы і Мінскім дзяржаўным каледжы мастацтваў пачалося навучанне па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады».

У другой палове 2000-х гг. сістэма сярэдняй спецыяльнай адукацыі перажыла аптымізацыю структуры падрыхтоўкі спецыялістаў. У 2006–2010 гг. адбылося абнаўленне зместу і павышэнне якасці падрыхтоўкі кадраў, палепшылася навукова-метадычнае, інфармацыйнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне. У гэты перыяд быў выдзелены будынак Гомельскаму дзяржаўнаму мастацкаму вучылішчу, былі ўведзены ў эксплуатацыю новы будынак і інтэрнат Гродзенскага дзяржаўнага музычнага вучылішча [356, с. 236].

Пачынаючы з 2009/10 навучальнага года, у адпаведнасці з заказам кінастудыі «Беларусьфільм» у Мінскім дзяржаўным мастацкім вучылішчы імя А. Глебава пачалася вясціся падрыхтоўка спецыялістаў у галіне анімацыі. Яна здзяйснялася ў рамках існуючых вучэбных планаў па спецыяльнасцях «Дызайн (па напрамках)» і «Жывапіс (па напрамках)» за кошт факультатыўных заняткаў [82, т. 5, арк. 55].

Як відаць з табл. 10, пасля росту колькасці навучэнцаў у 1997–2000 г. (7010 чал. у 1997 г., 7402 чал. у 2000 г.) у наступныя гады адбыўся некаторы спад (7306 чал. у 2002 г.) і стабілізацыя (7250 чал. у 2003 г., 7263 чал. у 2006 г.). Пазней назі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ралася падзенне да 7090 чал. у 2008 г. і рэзкае павелічэнне амаль на 240 чалавек у 2009 г., што было выклікана значным ростам колькасці прыёму выпускнікоў базавай школы ў сувязі з пераходам на 11-гадовае навучанне (табл. 18). Ужо ў 2010 г. коль-касць навучэнцаў зноў стала на ўзроўні 2008 г.

*Табліца 10.* **Агульная колькасць навучэнцаў на пачатак навучальнага года [160; 271; 754, с. 115]**

| Тып ССНУ, форма навучання | Год | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
| Музычныя ССНУ | 3520 | 3501 | 3611 | 3741 | 3763 | 3711 | 3642 | 3609 | 3571 | 3581 | 3508 | 3376 | 3525 | 2956 |
| дзённая | 3500 | 3478 | 3582 | 3708 | 3729 | 3678 | 3620 | 3584 | 3543 | 3550 | 3476 | 3346 | 3491 | 2956 |
| завочная | 20 | 23 | 29 | 33 | 34 | 33 | 22 | 25 | 28 | 31 | 32 | 30 | 34 | |
| ССНУ мастацтваў | 1886 | 1927 | 1956 | 2 002 | 2095 | 2044 | 2046 | 2115 | 2195 | 2213 | 2269 | 2238 | 2912 | 3322 |
| дзённая | 1617 | 1659 | 1683 | 1717 | 1771 | 1752 | 1766 | 1801 | 1858 | 1892 | 1885 | 1856 | 2382 | 2771 |
| завочная | 269 | 268 | 273 | 285 | 324 | 292 | 280 | 314 | 337 | 321 | 384 | 382 | 530 | 551 |
| ССНУ харэаграфічныя | 245 | 246 | 257 | 264 | 261 | 273 | 280 | 273 | 285 | 284 | 270 | 269 | 264 | 266 |
| ССНУ культуры | 1359 | 1380 | 1400 | 1395 | 1364 | 1278 | 1282 | 1258 | 1204 | 1185 | 1179 | 1207 | 626 | 543 |
| дзённая | 932 | 953 | 977 | 989 | 954 | 883 | 910 | 886 | 798 | 839 | 839 | 820 | 369 | 315 |
| завочная | 427 | 427 | 423 | 406 | 410 | 395 | 372 | 372 | 406 | 346 | 340 | 387 | 257 | 228 |
| Усяго па ССНУ | 7010 | 7 054 | 7 224 | 7 402 | 7 483 | 7306 | 7250 | 7255 | 7255 | 7263 | 7226 | 7090 | 7327 | 7087 |
| дзённая | 6294 | 6336 | 6499 | 6678 | 6715 | 6586 | 6576 | 6544 | 6484 | 6565 | 6470 | 6291 | 6506 | 6308 |
| завочная | 716 | 718 | 725 | 724 | 768 | 720 | 674 | 711 | 771 | 698 | 756 | 799 | 821 | 779 |

*Табліца 11.* **Прыём навучэнцаў у ССНУ культуры і мастацтваў [271; 754, с. 116]**

| Тып установы | Форма навучання | Год | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
| ССНУ музычныя | Усяго | 930 | 947 | 959 | 945 | 1015 | 945 | 907 | 919 | 956 | 946 | 874 | 885 | 1084 | 787 |
| | Дзённая | 925 | 935 | 950 | 937 | 1005 | 939 | 902 | 913 | 944 | 938 | 862 | 880 | 1071 | 787 |
| | Завочная | 5 | 12 | 9 | 8 | 10 | 6 | 5 | 6 | 12 | 8 | 12 | 5 | 13 | – |
| ССНУ мастацтваў | Усяго | 497 | 548 | 586 | 602 | 605 | 586 | 609 | 652 | 646 | 605 | 631 | 638 | 865 | 900 |
| | Дзённая | 437 | 478 | 521 | 522 | 500 | 495 | 523 | 549 | 527 | 546 | 504 | 522 | 713 | 799 |
| | Завочная | 60 | 70 | 65 | 80 | 105 | 91 | 86 | 103 | 119 | 59 | 127 | 116 | 152 | 101 |
| Беларускі дзяржаўны харэаграфічны каледж | Дзённая | 31 | 37 | 36 | 33 | 39 | 44 | 35 | 37 | 44 | 44 | 44 | 41 | 36 | 40 |
| ССНУ культуры | Усяго | 545 | 542 | 543 | 507 | 509 | 497 | 534 | 458 | 449 | 452 | 436 | 429 | 261 | 247 |
| | Дзённая | 359 | 380 | 371 | 360 | 355 | 343 | 385 | 301 | 308 | 351 | 281 | 340 | 171 | 157 |
| | Завочная | 186 | 162 | 172 | 147 | 154 | 154 | 149 | 157 | 141 | 101 | 155 | 89 | 90 | 90 |
| **Усяго па ССНУ** | **Усяго** | **2003** | **2074** | **2124** | **2087** | **2168** | **2072** | **2085** | **2066** | **2095** | **2047** | **1985** | **1993** | **2246** | **1974** |
| | Дзённая | 1752 | 1830 | 1878 | 1852 | 1899 | 1821 | 1845 | 1800 | 1823 | 1879 | 1691 | 1783 | 1991 | 1783 |
| | Завочная | 251 | 244 | 246 | 235 | 269 | 251 | 240 | 266 | 272 | 168 | 294 | 210 | 255 | 191 |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 12.* **Выпуск навучэнцаў у ССНУ культуры і мастацтваў [271; 754, с. 117]**

| Тып установы | Форма навучання | Год | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
| ССНУ музычныя | Усяго | 733 | 806 | 737 | 829 | 1015 | 863 | 869 | 823 | 895 | 818 | 820 | 817 | 825 | 769 |
| | Дзённая | 733 | 800 | 732 | 824 | 1005 | 856 | 858 | 820 | 886 | 812 | 815 | 815 | 815 | 769 |
| | Завочная | – | 6 | 5 | 5 | 10 | 7 | 11 | 3 | 9 | 6 | 5 | 2 | 10 | |
| ССНУ мастацтваў | Усяго | 441 | 445 | 491 | 444 | 605 | 545 | 498 | 502 | 487 | 503 | 484 | 585 | 695 | 806 |
| | Дзённая | 387 | 378 | 429 | 383 | 500 | 431 | 412 | 438 | 404 | 440 | 424 | 478 | 568 | 716 |
| | Завочная | 54 | 67 | 62 | 61 | 105 | 114 | 86 | 64 | 83 | 63 | 60 | 107 | 127 | 90 |
| Беларускі дзяржаўны харэаграфічны каледж | Дзённая | 25 | 34 | 10 | 15 | 39 | 33 | 18 | 25 | 25 | 34 | 29 | 15 | 22 | 25 |
| ССНУ культуры | Усяго | 411 | 443 | 449 | 470 | 509 | 514 | 478 | 421 | 443 | 424 | 429 | 372 | 212 | 295 |
| | Дзённая | 255 | 292 | 273 | 303 | 355 | 350 | 317 | 277 | 341 | 269 | 276 | 337 | 145 | 193 |
| | Завочная | 156 | 151 | 176 | 167 | 154 | 164 | 161 | 144 | 102 | 155 | 153 | 35 | 67 | 102 |
| **Агульная колькасць па ССНУ** | **Усяго** | **1610** | **1728** | **1687** | **1758** | **2168** | **1955** | **1863** | **1771** | **1850** | **1779** | **1762** | **1789** | **1754** | **1895** |
| | Дзённая | 1400 | 1504 | 1444 | 1525 | 1899 | 1670 | 1605 | 1560 | 1656 | 1555 | 1544 | 1645 | 1550 | 1703 |
| | Завочная | 210 | 224 | 243 | 233 | 285 | 285 | 258 | 211 | 194 | 224 | 218 | 144 | 204 | 192 |

На працягу 2008–2009 гг. Міністэрства культуры распрацавала новае пакаленне адукацыйных стандартаў, была перагледжана і абноўлена кваліфікацыйная структура ў разрэзе спецыяльнасцей і спецыялізацый мастацкай адукацыі.

У 2010 г. падрыхтоўка спецыялістаў у 21 установе сярэдняй спецыяльнай адукацыі сферы культуры здзяйснялася па 13 спецыяльнасцях, 28 напрамках спецыяльнасцей і 10 спецыялізацыях. Агульная колькасць навучэнцаў складала 7 тыс. чалавек (гл. табл. 10). Выпуск спецыялістаў у 2010 г. склаў амаль 1900 чалавек (табл. 12) [271].

Асобную групу ствараюць прафесійна-тэхнічныя вучылішчы мастацкага профілю, якія ў вывучаемы перыяд вялі падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў-выканаўцаў для вытворчасці на фабрыках мастацкіх вырабаў, у мастацка-рэстаўрацыйных майстэрнях, на керамічных і фарфоравых заводах, забяспечвалі кадрамі культурна-асветніцкія ўстановы (напрыклад, дамы рамёстваў), рыхтавалі майстроў навучання для студый і гурткоў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Да іх ліку адносіліся: Бабруйскае вышэйшае мастацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча (ПТВ), Мірскае ПТВ рэстаўратараў, Кобрынскае ПТВ дэкаратыўнага роспісу, Мінскае ПТВ будаўнікоў № 25 і інш.

Аднак у краіне адчуваўся дэфіцыт спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Асабліва гэта закранула кінагаліну. На пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры ў маі 2007 г. разглядалася пытанне падрыхтоўкі кадраў для кінагаліны. Спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй – кінамеханікаў і інжынераў – рыхтавалі толькі ў адной навучальнай установе – Мінскім каледжы бытавога абслугоўвання. Асноўная доля навучэнцаў паходзілі з Мінска і Мінскай вобласці. Каледж не меў інтэрната, і гэта не спрыяла прытоку мала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дых людзей з глыбінкі. У далейшым становішча палепшылася. У Івацэвіцкім прафесійным ліцэі і Гомельскім каледжы мастацтваў імя І. Сакалоўскага пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па спецыяльнасці «відэадэманстратар». Пры гэтым асноўным шляхам падрыхтоўкі кінамеханікаў, відэадэманстратараў і фільмаправерШчыкаў заставалася настаўніцтва на месцы з наступнай атэстацыяй дзяржаўнай кваліфікацыйнай камісіяй [82, т. 5, арк. 56].

***Вышэйшыя навучальныя ўстановы*** аб'ядноўваюць і каардынуюць дзейнасць усёй сістэмы мастацкай адукацыі, з'яўляюцца яе галоўным звяном.

Галоўную ролю ў сістэме мастацкай адукацыі Беларусі ў вывучаемы перыяд адыгрывалі тры вышэйшыя навучальныя ўстановы – Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.

Адным з вядучых навукова-педагагічных цэнтраў у галіне гуманітарных навук (музыказнаўства, фальклярыстыка, сацыялогія, эстэтыка, музычная педагогіка) з'яўлялася *Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі*, створаная ў 1992 г. на базе Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Статус акадэміі абумовіў стварэнне тут шматузроўневай арганізацыі падрыхтоўкі студэнтаў. Вынікам стала пераўтварэнне навучальнай установы ў буйны адукацыйны цэнтр нацыянальнага прафесійнага і выканальніцкага мастацтва, музыказнаўства і педагогікі. Акадэмія адкрыла свой філіял у Магілёве – педагагічны факультэт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (створаны ў 1990 г.).

Прыкметна відазмянілася структура навуковага сектара Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. У прыватнасці, былі створаны кафедры беларускай музыкі і харэаграфіі, чатыры кафедры ў Магілёўскім філіяле акадэміі музыкі, адкрыта праблемная навукова-даследчая лабараторыя музыкі, адноўлена дзейнасць аспірантуры па спецыяльнасцях «Музычнае мастацтва», «Методыка выкладання музычных дысцыплін» і «Эстэтыка». З 1995 г. пачалася падрыхтоўка бакалаўраў і магістраў.

У 2000 г. Беларускай акадэміі музыкі быў нададзены статус вядучай вышэйшай навучальнай установы нацыянальнай сістэмы адукацыі ў галіне музычнага мастацтва.

У 2002 г. Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі ўключала 6 факультэтаў, 23 кафедры, 10 філіялаў кафедраў у Магілёве, Брэсце, Гродна, магістратуру, аспірантуру, дактарантуру, шэраг музычных калектываў (аркестраў, хораў і ансамбляў), оперную студыю, многія аддзелы і падраздзяленні, якія непасрэдна забяспечвалі арганізацыю вучэбнага працэсу.

У мэтах паляпшэння кадравай сітуацыі ў рэгіёнах і ў гарадах Брэсце і Гродна ў 2002 г. былі адкрыты філіялы кафедраў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі на базе Брэсцкага музычнага каледжа імя Рыгора Шырмы і Гродзенскага дзяржаўнага музычнага вучылішча. У 2003 г. філіялы пачалі працаваць у Віцебску і Гомелі.

У маі 2002 г. Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. Вынікам наведвання стаў пратакол

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

даручэнняў па рэалізацыі мерапрыемстваў па падтрымцы і развіцці акадэміі. У прыватнасці, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы навучальнай установы, стварэнне маладзёжнага опернага тэатра, адкрыццё новай спецыяльнасці «Рэжысура музычнага тэатра». Была распрацавана і зацверджана праграма «Удасканаленне мастацкай адукацыі і выхавання навучэнскай моладзі». На філіялы кафедраў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі на базе сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў галіны ў гарадах Брэсце. Гродна, Віцебску, Гомелі ў 2003 г. было залічана 40 чалавек (па 10 чалавек на кожны філіял). Для стварэння Маладзёжнага опернага тэатра на баланс Акадэміі музыкі быў перададзены будынак па вул. Казлова, 17 [439, спр. 887, арк. 217].

У 2007 г. у Акадэміі музыкі навучаліся звыш 1000 студэнтаў, у тым ліку каля 200 замежных, больш за 100 магістрантаў, аспірантаў і асістэнтаў-стажораў [701, с. 30].

У 1991 г. Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут быў рэарганізаваны ў *Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў* (БДАМ). Яна ўяўляла сабой верхнюю ступень усёй сістэмы мастацкай адукацыі ў галіне выяўленчага і тэатральнага мастацтва. У дадзенай навучальнай установе вялася падрыхтоўка кадраў па 14 спецыяльнасцях, у 1989 г. пачалася падрыхтоўка рэжысёраў ігравога і дакументальнага кіно. У 1992 г. тут быў праведзены першы набор на дзённую форму навучання па спецыяльнасці «Мастацтвазнаўства», а ў 1993 г. – па спецыяльнасці «Тэатразнаўства». У 1993–1994 гг. былі адкрыты новыя кафедры: «Мадэліраванне адзення і мастацкага тэкстылю», «Праектаванне выставак і рэкламы», «Кінатэлемастацтва». У 1997 г. быў здзейснены першы выпуск па спецыяльнасцях «Рэжысёр і мастак анімацыйнага кіно» і «Кінааператар». Толькі ў пачатку 2000-х гг. з адкрыццём кафедры харэаграфіі ў БДАМ у Беларусі пачалі рыхтаваць прафесіяналаў такога кшталту, як харэограф-пастаноўшчык, харэограф-рэпетытар. Да гэтага падрыхтоўка вялася ў Санкт-Пецярбургу.

15 мая 2003 г. з лекцыяй у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў выступіў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. Прэзідэнт падкрэсліў адметную ролю акадэміі ў падрыхтоўцы кадраў культуры: «Акадэмія мастацтваў – гэта творчы, навуковы і вучэбны цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў практычна ва ўсіх відах прафесійнага мастацтва. Цэнтр, які адыгрывае першасную ролю ў фарміраванні інтэлігенцыі нашай маладой, незалежнай, суверэннай дзяржавы» [387, с. 4].

У ходзе выканання пратакола даручэнняў, дадзеных па выніку наведвання Главой дзяржавы Акадэміі мастацтваў, з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь былі выдзелены грошы на набыццё 63 камп’ютараў, пачаліся падрыхтоўчыя работы на рэканструкцыі інтэрната акадэміі, студэнтаў сталі далучаць да выканання работ па афармленні г. Мінска, іх работы з’явіліся ў парках і скверах сталіцы і інш. [439, спр. 887, арк. 217–219].

Беларуская акадэмія мастацтваў на працягу многіх гадоў вяла навучанне па такіх спецыяльнасцях, як «Акцёрскае мастацтва», «Рэжысура», «Тэатра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

знаўства». Адным з важных момантаў рэфармавання тэатральнай адукацыі стала ўвядзенне мэтавага вочна-завочнага акцёрскага навучання. У 2002 г. па такой форме ў БДАМ праходзілі падрыхтоўку 87 акцёраў для тэатраў Брэста, Віцебска, Гомеля, Магілёва, Мазыра, Слоніма, Маладзечна (14 з іх былі прыняты па мэтавых заяўках у 2002 г. [439, спр. 587, арк. 49].

Неабходна заўважыць, што вышэйшую адукацыю па спецыяльнасцях «Рэжысура», «Акцёрскае мастацтва» ў вывучаемы перыяд можна было атрымаць і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў.

У сувязі з невялікай запатрабаванасцю галіны ў кадрах пэўных спецыяльнасцей БДАМ па шэрагу напрамкаў ажыццяўляла прыём раз у некалькі гадоў:

«Акцёрскае мастацтва (музычны тэатр)» – раз у чатыры гады;

«Мастацтвазнаўства (арганізацыя тэатральнай дзейнасці)», «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (вырабы з керамікі)» – адзін раз у 5 гадоў;

«Рэжысура кіно і тэлебачання (дакументальны фільм)» – пасля перапынку больш чым у 10 гадоў новы набор быў здзейснены ў 2009 г. [69, т. 7, арк. 2; 103, с. 100–101].

За 2001–2005 гг. значна павялічылася колькасць навучэнцаў акадэміі. Калі ў 2001 г. іх налічвалася 841 чалавек, у 2005 г. лічба склала 1266 чалавек. У далейшым назіралася стабілізацыя гэтага паказчыка. Так, у 2010 г. колькасць студэнтаў складала 1177 чалавек [1, с. 4; 271].

У 2005 г. адбыўся першы ў гісторыі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў набор студэнтаў на тэатральны факультэт па спецыяльнасці «Кінатэлезнаўства». На мастацкім факультэце былі адкрыты такія спецыяльнасці, як «Фатаграфіка», «Тэлерэклама», «Дызайн віртуальнага асяроддзя». У 2007 г. быў здзейснены набор на спецыяльнасць «Кінатэлеаператарства (кінааператарства)». У 2008 г. у акадэміі пачалася падрыхтоўка па новых спецыялізацыях – «Рэжысура кіно і тэлебачання (анімацыйныя дзеянні)», «Жывапіс (выяўленчае рашэнне фільма)» і «Рэстаўрацыя» [79, т. 7, арк. 2; 105, с. 110].

У адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы з мэтай падрыхтоўкі кінематаграфічных кадраў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў у красавіку 2010 г. быў адкрыты факультэт экранных мастацтваў на базе існуючых кафедраў рэжысуры экранных мастацтваў і аператарскага майстэрства экранных мастацтваў, а таксама створана новая кафедра менеджменту, гісторыі і тэорыі экранных мастацтваў. На факультэце ў той час вучыўся 421 студэнт, у тым ліку 241 – на дзённай форме навучання [104, с. 87].

У 1993 г. Мінскі інстытут культуры быў пераватораны ў *Беларускі ўніверсітэт культуры (БДУК)*. Адбылася маштабная рэарганізацыя факультэтаў і кафедраў, у выніку чаго пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па новых спецыяльнасцях і спецыялізацыях. Актывізаваліся міжнародныя сувязі, адкрылася магістратура. З мэтай забеспячэння ўстаноў культуры Гомельскай вобласці спецыялістамі з вышэйшай адукацыяй у 1996 г. на базе Мазырскага музычна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

га вучылішча быў адкрыты філіял факультэта завочнага навучання БДУК. Падрыхтоўка спецыялістаў на ім вялася па спецыялізацыях: харавая музыка народная, інструментальная музыка народная.

У адпаведнасці з «Канцэпцыяй развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь» на створаным у 1993 г. факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм пачалася падрыхтоўка спецыялістаў для масавых (публічных), дзіцячых і школьных, навукова-тэхнічных і спецыялізаваных бібліятэк. З'явіліся функцыянальныя спецыялізацыі: менеджар бібліятэчнай справы і бібліятэкар-бібліёграф аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэм. У другой палове 1990-х гг. з улікам шэрага сацыяльна-эканамічных фактараў прыярытэт надаваўся падрыхтоўцы спецыялістаў праз сістэму завочнага навучання. Цікавым падаецца факт, што ў гэты перыяд факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага ўніверсітэта культуры быў зацікаўлены ў паступленні на дзённую форму навучання мінчан. Гэта тлумачылася тым, што, напрыклад, у 1996 г. заявак з бібліятэк Мінска на выпускнікоў было значна больш, чым студэнтаў, якія мелі пастаянную прапіску. А вось з раённых і, даволі часта, з абласных бібліятэк (за выключэннем Гомеля і Магілёва) заявак не было [778, с. 94–95].

У 1997/98 навучальным годзе ў краіне пачалася падрыхтоўка па новых спецыялізацыях: бібліятэказнаўства і бібліяграфія старажытнай і рэдкай кнігі, бібліятэказнаўства і краязнаўства, краязнаўства і арганізацыя кніжнага гандлю. Спецыялісты з ведамі, якія набліжаны да прафесіі музеязнаўцы і архівіста, былі вельмі запатрабаваны ў аддзелах рэдкай кнігі, а бібліятэкары-краязнаўцы – у вясковых і гарадскіх публічных бібліятэках, дзе адным з галоўных напрамкаў дзейнасці з'яўлялася адраджэнне нацыянальнай культуры [778, с. 95].

У 1999 г. загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь універсітэту быў нададзены статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі ў сферы культуры.

Загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 08.10.2004 г. № 166 Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры» быў перайменаваны ва ўстанову адукацыі «*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*» (БДУКіМ).

На 1 студзеня 2000 г. колькасць студэнтаў тут складала 3992 (на 202 чалавекі больш, чым у 1997 г.). У далейшым яна пастаянна павялічвалася, дасягнуўшы ў 2010 г. 5878 чалавек (звесткі і па Мазырскім філіяле) [271].

У 1996 г. пачалася падрыхтоўка спецыялістаў для айчыннага кінематографа – кінадраматургаў і кінасцэнарыстаў. Аднак з 2004 г. набор на гэтыя спецыяльнасці быў спынены [449].

Змены закранулі і падрыхтоўку спецыялістаў па іншых напрамках. Напрыклад, факультэт бібліятэчна-інфармацыйных сістэм Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва ў 2003 г. быў ператвораны ў факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый. Універсітэт пашырыў падрыхтоўку спецыялістаў па здвоеных спецыяльнасцях, што дазволіла маладому спецыялісту больш упэўнена адчуваць сябе на рынку працы. Гэта стала магчымым



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з прыняццем у 2002 г. «Агульнадзяржаўнага класіфікатара Рэспублікі Беларусь. Спецыяльнасці і кваліфікацыі». Адпаведна яму такая спецыяльнасць, як «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», атрымала наступныя напрамкі: менеджмент, аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы, інфармацыйнае забеспячэнне (па сферах), філалогія і лінгвістыка, кніжны гандаль. Ва ўніверсітэта з'явілася магчымасць прысвойваць такія новыя кваліфікацыі, як: «Бібліятэкар-бібліёграф, спецыяліст па аўтаматызаваных бібліятэчна-інфармацыйных сістэмах», «Бібліятэкар-бібліёграф, выкладчык, перакладчык», «Бібліятэкар – бібліёграф, спецыяліст па інфармацыі» і інш. У 2004 г. факультэт здзяйсняў набор па 8 з 16 заяўленых у згаданым класіфікатары спецыяльнасцях [861]. У 2005 г. была адкрыта новая спецыяльнасць «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі (інфармацыйнае абслугоўванне)» з прысваеннем кваліфікацыі «Спецыяліст па інфармацыі і камунікацыі, менеджар інфармацыйных рэсурсаў».

З 2002 г. кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры БДУКіМ распачала набор на новую спецыяльнасць «Кампаратыўнае мастацтвазнаўства».

Патрабаваннем часу стала адкрыццё завочнага аддзялення факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, на якім пачалі рыхтаваць спецыялістаў па бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве, інфармацыйным забеспячэнні ў навукова-тэхнічным і медыцынскім комплексе, аўтаматызаваным бібліятэчна-інфармацыйным сістэмам, бібліятэчным абслугоўванні дзяцей і юнацтва. З 2007 г. на скарочаны тэрмін навучання (4 гады) на дадзенае аддзяленне прымаліся выпускнікі 2007 г. Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума і выпускнікі папярэдніх гадоў, якія працягвалі працаваць па спецыяльнасці.

Універсітэт штогод карэкціраваў планы і парадак прыёму студэнтаў, зыходзячы з рэальнага стану рэчаў. Напрыклад, у 2009 г. у краіне налічвалася каля 3800 клубных устаноў, больш за 90 % з якіх знаходзілася ў сельскай мясцовасці. Пры гэтым забяспечанасць спецыялістамі з вышэйшай адукацыяй у іх складала каля 28 %. Зыходзячы з гэтага, у парадак прыёму студэнтаў у 2009 г. быў уведзены набор па спецыяльнасці «Сацыяльна-культурная дзейнасць» па спецыялізацыях «Арганізацыя і методыка сацыяльна-культурнай дзейнасці ў культурна-дасугавых установах» з кваліфікацыяй «Спецыяліст па сацыяльна-культурнай дзейнасці. Выкладчык» [77, т. 8, арк. 36].

Двойчы, у 1999 і 2000 гг., Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка наведваў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры. У адпаведнасці з пратаколамі даручэнняў па выніках наведвання ўніверсітэт атрымаў будынак па вул. Маскоўская, 18а, у якім размясціліся чатыры кафедры навучальнай установы. У Палацы Рэспублікі была створана і перададзена ў распараджэнне ўніверсітэта Мастацкая галерэя, якая адкрылася 25 красавіка 2002 г. выстаўкай работ студэнтаў Універсітэта культуры і навучэнцаў Мінскага дзяржаўнага мастацкага вучылішча імя А. К. Глебава. У падпарадкаванне ўніверсітэта быў перададзены Дзяржаўны маладзёжны тэатр эстрады, вялося праектаванне спартыўна-культурнага цэнтра ўніверсітэта, быў створаны студэнцкі эстрадны аркестр.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне гісторыі развіцця сістэмы падрыхтоўкі кадраў для ўстаноў культуры ў перыяд незалежнасці Рэспублікі Беларусь дазваляе выдзеліць ***два перыяды*** ў гэтым працэсе. *Першы* ахоплівае 1991–1999 гг. У гэты час вышэйшая школа перажыла структурную перабудову. Ва ўстановах і арганізацыях культуры, мастацтва і народнай творчасці адчувальна акрэсліліся праблемы забяспечанасці спецыялістамі з вышэйшай і, у некалькі меншай ступені, з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй [439, спр. 352, арк. 10].

У сістэме падрыхтоўкі кадраў назіраліся негатыўныя працэсы: было аслаблена метадычнае ўзаемадзеянне ўсіх звёнаў сістэмы адукацыі галіны, зменшана падрыхтоўка па некаторых спецыяльнасцях, хранічна слабой з'яўлялася падрыхтоўка па шэрагу спецыяльнасцей у ССНУ, адставала падрыхтоўка выкладчыкаў-харэографаў. Значна зменшыўся прыток маладых спецыялістаў у ССНУ, страчаны навуковы патэнцыял у Беларускай акадэміі мастацтваў, не быў ліквідаваны паралелізм у падрыхтоўцы спецыялістаў Мінскага музычнага вучылішча і Мінскага вучылішча культуры, заставаліся не ўдакладненымі напрамкі падрыхтоўкі спецыялістаў паміж трыма ВНУ [439, спр. 149, арк. 140].

Аналіз размеркавання колькасці навучэнцаў па ВНУ рэспублікі ў 1990-я гг. сведчыў, што структура прыёму ў іх не адлюстроўвала патрэбнасці грамадства ў кадрах з вышэйшай адукацыяй. У якасці пацвярджэння гэтаму можна прывесці параўнанне прыёму студэнтаў па двух напрамках: культура і мастацтва, з аднаго боку, і ваенных спецыялістаў, з другога. Толькі ў Ваенную акадэмію за кошт дзяржаўнага бюджэту штогод у 1990-х прымалася 1000 курсантаў. У той час па трох ВНУ культуры і мастацтва ў 1996 г. быў здзейснены набор толькі колькасцю 790 чалавек [191, с. 46–47].

У 1998 г. на падставе вывучэння стану патрэбы ўстаноў Міністэрствам культуры быў распрацаваны і накіраваны Міністэрству эканомікі перспектыўны план падрыхтоўкі спецыялістаў у навучальных установах галіны да 2005 г. Ён прадугледжваў паступовае павелічэнне кантынгенту прыёму ў разрэзе найбольш патрэбных спецыяльнасцей і спецыялізацый. Аднак дадзены план па прычыне існаваўшага на той час дэфіцыту дзяржбюджэтнага фінансавання не выконваўся [439, спр. 352, арк. 11]. Для вырашэння пытання ў кастрычніку 1999 г. Міністэрства культуры выходзіла з прапановай уключэння ў праект пастановы восьмай сесіі першага склікання Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь палажэнняў аб давядзенні прыёму па мэтавых кантрактных накіраваннях абласцямі жыхароў сельскіх рэгіёнаў краіны ў ВНУ культуры і мастацтваў да 30% і ў ССНУ культуры і мастацтваў – да 50% ад плана прыёму; увядзенні кантрактнай формы пры прыёме на работу маладых спецыялістаў у сельскія ўстановы культуры і народнай творчасці [439, спр. 296, арк. 251 зв.].

У 1990-х гг. назіралася негатыўная тэндэнцыя да аслаблення сувязей паміж вышэйшымі навучальнымі ўстановамі культуры і ўстановамі культуры, што выкарыстоўваюць такіх спецыялістаў. Яна знайшла сваё адлюстраванне ў змян-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шэнні колькасці выпускнікоў, якія накіроўваліся на працу па размеркаванні. Напрыклад, у 1996 г. Акадэмія мастацтваў увогуле адмовілася ад размеркавання: з 62 выпускнікоў накіраванні на работу атрымалі ўсяго 3 чалавекі, у Акадэміі музыкі – з 118 41 чалавек, ва Універсітэце культуры – з 279 выпускнікоў першае месца працы атрымалі па размеркаванні 157 чалавек [439, спр. 145, арк. 154].

У 1996 г. у Беларускай акадэміі мастацтваў па афіцыйнай просьбе старшыні мастацкага савета Дзяржаўнага музычнага тэатра ўпершыню быў набраны курс па спецыялізацыях «Акцёрскае мастацтва музычнага тэатра» і «Рэжысёрскае мастацтва музычнага тэатра». У 2000 г. пры размеркаванні выпускнікоў заявак на іх не было. І гэта нягледзячы на тое, што на курс быў здзейснены спецнабор. Каментуючы сітуацыю, тэатральны крытык Т. Арлова заўважала: «а гэта тэатральная хвароба (штампы і пошласць. – *Д. К.*) усё глыбей захоплівае любімы горадам музычны тэатр. Неабходна толькі зірнуць на яго рэпертуарную палітыку і работы апошніх гадоў – цяжка паверыць, што з гэтым калектывам калісьці працаваў Раман Вікцюк. […] У музычна дасканалых, класічных аперэтах проста няма каму спяваць. Тэатр закрывае рэпертуарныя нішы просценькімі назвамі, нічуць не задумваючыся аб перспектыве развіцця гэтага спецыфічнага музычнага жанру. Цяперашняе маладое пакаленне не хоча ісці ўслед за традыцыямі старой аперэты. Яго ідэал – мюзікл міравога класа. […] Чаму ж не дадзена здзейсніцца гэтай мастацкай перспектыве [на дыпломным канцэрце выпускнікі прадставілі самастойна прыдуманую кампазіцыю па матывах мюзіклаў Дж. Кандэра «Чыкага» і Фр. Уэбба «Пацалунак жанчыны-павука». – *Д. К.*]? Таму, што сённяшні Дзяржаўны музычны тэатр так працаваць не ўмее. Няма ў яго маладых кадраў, якія не сапсаваныя тэатральшчынай, здольныя захапіць незвычайнасцю тэатральнага почырку. Таму, відаць, тэатр і не пажадаў прыняць у свае сцены дзесяць таленавітых юнакоў» [624].

*Другі перыяд* пачынаецца ў 2000 г., калі Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь 28 сакавіка прыняў пастанову «Аб зацверджанні палажэння аб мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў», што ў значнай ступені ўдакладніла практыку правядзення мэтава-кантрактнага прыёму, удасканаліла тэхніку адбору абітурыентаў-кантрактнікаў [439, спр. 352, арк. 11].

У 2000 г. колькасць паступіўшых у ВНУ культуры і мастацтва дасягнула 1263 чалавекі, у 2006 г. – 1728 чалавек (з іх 985 – для навучання на бюджэтнай аснове), а ў 2010 г. – 1937 чалавек (гл. табл. 13). У 2010 г. у ВНУ культуры і мастацтва навучаліся 8378 студэнтаў, у тым ліку на дзённай форме – 5081, завочнай – 3297. Колькасць студэнцкай моладзі ў ВНУ галіны за 2008–2010 гг. павялічылася на 4,5 % [439, спр. 352, арк. 87].

За трынаццацігадовы перыяд (1997–2010 гг.) ВНУ культуры і мастацтва больш чым у 2 разы павялічылі выпуск спецыялістаў: з 664 чалавек у 1997 г. да 1436 чалавек у 2010 г. Найбольш істотны рост назіраўся ў 2000 г. і 2010 г. (гл. табл. 14).

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

*Табліца 13.* **Вынікі прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы культуры і мастацтваў [160; 271; 754, с. 126]**

| Установа | Форма навучання | Год | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2002 | 2001 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
| Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі | Усяго (з філіяламі) | 199 | 202 | 228 | 213 | 204 | 220 | 227 | 226 | 215 | 228 | 239 | 256 | 242 | 261 |
| | Дзённая | 189 | 192 | 221 | 203 | 194 | 203 | 227 | 219 | 215 | 228 | 239 | 256 | 242 | 261 |
| | Завочная | 10 | 10 | 7 | 10 | 10 | 10 | – | – | – | – | – | – | – | – |
| | Вячэрняя | – | – | – | – | – | 7 | – | – | – | – | – | – | – | – |
| Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў | Усяго | 139 | 156 | 152 | 190 | 231 | 249 | 251 | 331 | 274 | 285 | 323 | 286 | 290 | 286 |
| | Дзённая | 116 | 136 | 124 | 136 | 159 | 180 | 198 | 250 | 214 | 225 | 229 | 224 | 228 | 224 |
| | Завочная | 23 | 20 | 28 | 54 | 72 | 69 | 53 | 81 | 60 | 60 | 94 | 62 | 62 | 62 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў | Усяго | 877 | 913 | 910 | 860 | 804 | 852 | 850 | 1134 | 1252 | 1215 | 1211 | 1221 | 1473 | 1390 |
| | Дзённая | 500 | 520 | 530 | 515 | 459 | 497 | 495 | 561 | 562 | 656 | 669 | 621 | 707 | 667 |
| | Завочная | 377 | 393 | 380 | 345 | 345 | 355 | 355 | 573 | 690 | 559 | 542 | 600 | 766 | 723 |
| **Усяго па ВНУ** | **Усяго** | **1215** | **1271** | **1290** | **1263** | **1239** | **1321** | **1328** | **1691** | **1741** | **1728** | **1773** | **1763** | **2005** | **1937** |
| У тым ліку па формах навучання | Дзённая | 805 | 848 | 875 | 854 | 812 | 880 | 920 | 1030 | 991 | 1109 | 1137 | 1101 | 1177 | 1152 |
| | Завочная | 410 | 423 | 415 | 409 | 427 | 434 | 408 | 654 | 750 | 619 | 636 | 662 | 828 | 785 |
| | Вячэрняя | – | – | – | – | – | 7 | – | – | – | – | – | – | – | – |

*Табліца 14.* **Выпуск спецыялістаў вышэйшымі навучальнымі ўстановамі культуры і мастацтваў [162; 276; 754, с. 122]**

| Установа | Год | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
| Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі | 136 | 127 | 167 | 151 | 180 | 171 | 181 | 192 | 185 | 194 | 212 | 214 | 188 | 204 |
| Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў | 102 | 110 | 75 | 113 | 160 | 140 | 118 | 137 | 143 | 218 | 199 | 223 | 248 | 259 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў | 426 | 490 | 533 | 683 | 687 | 731 | 760 | 711 | 689 | 722 | 706 | 786 | 1048 | 973 |
| **Усяго па ВНУ** | **664** | **727** | **775** | **947** | **1027** | **1042** | **1059** | **1040** | **1017** | **1134** | **1117** | **1223** | **1484** | **1436** |
| У тым ліку па формах навучання: | – | – | – | – | 1027 | – | – | – | – | – | – | – | – | – |
| дзённая | 392 | 529 | 572 | 666 | 652 | 651 | 670 | 677 | 655 | 724 | 709 | 781 | 837 | 827 |
| завочная | 272 | 198 | 203 | 279 | 375 | 383 | 389 | 360 | 354 | 410 | 408 | 442 | 647 | 602 |
| вячэрняя | – | – | – | 2 | – | 8 | – | 3 | 8 | – | – | – | – | 7 |

Але гэты поспех прывёў да ўзнікнення іншай праблемы. Калі ў другой палове 1990 – пачатку 2000-х гг. лічбы прыёму ў ВНУ былі значна меншыя за паказчыкі выпуску спецыялістаў сярэднімі навучальнымі ўстановамі культуры і мастацтва, то ў другой палове 2000-х гг. яны пераўзышлі апошні. Незбалан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

саванасць падрыхтоўкі кадраў назіралася і ў педагагічнай сферы, сістэме падрыхтоўкі і працаўладкавання інжынерна-тэхнічных кадраў. Калі ў гэтых галінах відавочнай была значная перавытворчасць спецыялістаў, то ў галіне культуры іх не хапала.

Складанай заставалася сітуацыя з працаўладкаваннем выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. За 2005–2006 гг. амаль 400 чалавек, якія атрымалі спецыяльнасць па бюджэтнай аснове, не працавалі. Асабліва дрэнна было з працаўладкаваннем выпускнікоў Мінскага музычнага вучылішча (35 чалавек не былі працаўладкаваныя), Мінскага мастацкага вучылішча (25 чалавек), Гомельскага мастацкага вучылішча (11 чалавек) [439, спр. 886, арк. 48].

Не ўсё было добра і з сістэмай мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў. Кожны год да ўстаноў адукацыі даводзіўся план мэтавага набору. За перыяд 2001–2005 гг. выкананне плану прыёму ў ВНУ абітурыентаў па мэтавым накіраванні склала 61 %. За гэты ж перыяд скончылі вучобу 72 чалавека з мэтавым накіраваннем. З іх 68 былі накіраваны на працу адпаведна заключанай дамовы. Пацвердзілі працаўладкаванне па месцы размеркавання 56 чалавек. Здаралася, што аддзелы культуры, якія накіроўвалі для мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў, пазней адмаўляліся ад падрыхтаванага спецыяліста. У 2005 г. з просьбай аб пераразмеркаванні ў Міністэрства культуры звярнуліся 5 выпускнікоў БДУКіМ [74, арк. 27].

У 2005 г. у БДУКіМ замест планаваных 25 чалавек на мэтавыя месцы былі залічаны толькі 13 з 27 абітурыентаў. Непасрэдна з Магілёўскай вобласці не было накіравана ніводнага чалавека, з Гомельскай – 3, Віцебскай – 2. Як паказалі вынікі, некаторыя абітурыенты не мелі адпаведнай падрыхтоўкі для паступлення ў ВНУ. За перыяд з 2003 па 2005 г. не было ніводнага паступаючага па мэтавым накіраванні на спецыяльнасці «Народны танец», «Бальны танец», «Інструментальная музыка духавая», «Інструментальная музыка», «Духавыя інструменты (народныя)». У 2005 г. на спецыяльнасць «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» на 8 планавых месцаў было пададзена толькі 3 заявы, хаця спецыялісты падобнага профілю запатрабаваны ў сельскай мясцовасці [74, арк. 31–34]. Для выпраўлення становішча быў выдадзены спецыяльны загад Міністра культуры [439, спр. 1060, арк. 29–30].

Сярод прычын, якія абумоўлівалі невыкананне заданняў прыёму на мэтавыя месцы, як адзначалася ў рашэнні калегіі Міністэрства культуры ад 30 мая 2006 г., наступныя: недастатковая работа абласных упраўленняў культуры па арганізацыі адбору абітурыентаў для паступлення ва ўніверсітэт, нізкі ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў, выпадкі афармлення аддзеламі культуры райвыканкамаў дакументаў на мэтавую падрыхтоўку асоб, якія не мелі на гэта права, недастатковая дзейнасць па прафарыентацыі выпускнікоў школ, адборы таленавітай моладзі на спецыяльнасці культуры і мастацтваў на працягу ўсяго навучальнага года [74, с. 28–30].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2006 г. у БДУКіМ адбываўся прыём абітурыентаў на 27 мэтавых месцаў па 14 спецыяльнасцях, напрамках і спецыялізацыях. Пры гэтым жадаючых паступаць на спецыяльнасць «Народныя абрады і святы» было ў 15 разоў болей за колькасць месцаў, на «Народныя рамёствы» – у 12 разоў. Побач з гэтым ад шэрагу абласцей не было ніводнага кандыдата на такія спецыяльнасці, як «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны» (не накіравалі кандыдатаў Брэсцкая, Гродзенская, Мінская вобласці), «Менеджмент сацыяльна-культурнай сферы» (Брэсцкая, Мінская вобласці), «Сацыяльна-культурная дзейнасць» (Брэсцкая, Гродзенская, Мінская вобласці), «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (беларуская мова)» (усе вобласці) [74, с. 34].

У галіновай праграме «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь» на 2006–2010 гг. былі адзначаны праблемы, звязаныя з падрыхтоўкай спецыялістаў галіны. Да іх былі аднесены: нізкі ўзровень забяспечанасці галіны кадрамі з вышэйшай адукацыяй у рэгіёнах; невыкананне планавых заданняў мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў; захаванне высокай запатрабаванасці ў кадрах па некаторых спецыяльнасцях («Харэаграфія», «Рэжысура свят і абрадаў», «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», «Фартэпіяна»); неабходнасць умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы і абнаўлення музычнага інструментарыю, тэхнічных сродкаў навучання якаснымі мадэлямі, папаўненне фондаў бібліятэк і фанатэк.

Да гэтых праблем неабходна дадаць існаваўшае дубліраванне спецыяльнасцей і спецыялізацый у многіх ВНУ. Вельмі яскрава гэта выявілася ў сістэме культуралагічнай і мастацтвазнаўчай адукацыі. У краіне адбывалася распыленне падрыхтоўкі спецыялістаў па розных навучальных установах, якія не мелі неабходнай матэрыяльнай і педагагічнай асновы [191, с. 49–50].

Акрамя названых вышэйшых спецыяльных устаноў спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй для галіны культуры ў вывучаемы перыяд рыхтавалі спецыялізаваныя факультэты Віцебскага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка і інш. У камерцыйных ВНУ, такіх як Інстытут сучасных ведаў і Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, існавалі факультэты мастацтваў. Акрамя гэтага, Інстытут сучасных ведаў вёў падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасцях «Мастацтва эстрады», «Культуралогія», «Дызайн». На педагагічных ці мастацкіх факультэтах амаль усіх беларускіх класічных універсітэтаў вялася падрыхтоўка па спецыяльнасці педагога-мастака. Напрыклад, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (БДУ) праводзіў падрыхтоўку спецыялістаў з кваліфікацыяй «Мастак народных рамёстваў, выкладчык спецыяльных дысцыплін». Па спецыяльнасці «Культуралогія» пачалі здзяйсняць набор Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны і шэраг іншых універсітэтаў, а таксама недзяржаўныя інстытуты. Па спецыяльнасці «Народная творчасць» рыхтавалі спецыялістаў у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце, Брэсцкім дзяржаўным універсітэце, Інстытуце сучасных ведаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу 1990–1995 гг. музейныя спецыяльнасці адкрыліся спачатку на гістарычным факультэце БДУ (1992 г.), а затым у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтва (1994 г.) і Еўрапейскім гуманітарным універсітэце.

У 2000 г. у Беларускім дзяржаўным універсітэце адкрылася кафедра мастацтваў, якая распачала падрыхтоўку па спецыяльнасцям «Дызайн» і «Мастацтвазнаўства» (з 2003 г. у складзе Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ). Новым у падрыхтоўцы з'явілася спалучэнне трэнінгу ў галіне праектавання, кампазіцыі, жывапісу і малюнка, пластыкі, формаўтварэння з выкарыстаннем навейшых інфармацыйных і матэматычных тэхналогій мадэлявання асяроддзя, культурнымі і экалагічнымі фактарамі прафесіі. Універсітэт рыхтаваў дызайнераў па тэорыі і гісторыі мастацтва і дызайну, сучасным стратэгіям формаўтварэння і праектавання, камп'ютарным тэхналогіям, замежным мовам. У планах універсітэта было ўвядзенне новай спецыялізацыі «Дызайн асяроддзя» пабач з існуючай спецыялізацыяй «Дызайн інтэр'ера». [289]

З 1992 г. прыватны Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава вёў прафесійную падрыхтоўку мэнеджараў і кіраўнікоў арганізацый культуры і мастацтва па спецыялізацыі «Прадзюсарства ў сферы мастацтваў» спецыяльнасці «Культуралогія (прыкладная)». У гэтым жа інстытуце з 1996 г. можна было атрымаць кваліфікацыю «Прадзюсар» па напрамку «Прадзюсарства» спецыяльнасці «Мастацтва эстрады». А з 2006 г. Інстытут сучасных ведаў пашырыў падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасці «Дызайн», адкрыўшы напрамак «Дызайн (віртуальнага асяроддзя)».

У краіне вялася падрыхтоўка і па педагагічных спецыяльнасцях культуры і мастацтва. Акрамя ВНУ, якія падпарадкоўваліся Міністэрству культуры, такіх спецыялістаў рыхтаваў Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт (музычна-педагагічны факультэт і факультэт народнай культуры). У Магілёўскім і Брэсцкім універсітэтах – педагагічныя факультэты, у Гродзенскім універсітэце – факультэт мастацтваў.

У пачатку 2000-х гг. наспела неабходнасць распрацоўкі праграм і падрыхтоўкі значна больш шырокай палітры спецыяльнасцей, якія адпавядалі б новым умовам дзейнасці, асабліва ў сферы вольнага часу. Патрабаваліся спецыялісты ў галіне рэкламна-выставачнай дзейнасці, юрыспрудэнцыі і права ў галіне культуры, мастацтвазнаўцы-маркетолагі, эканамісты культуралагічнага профілю, фінансавыя менеджары інфармацыйнага бізнесу і бібліятэчнай справы, бібліятэкары-бібліятэрапеўты [191, с. 67].

Увядзенне новых спецыяльнасцей у ВНУ ішло наперадзе працэсу ўнясення змен у пералік прафесій рабочых і пасад служачых. Напрыклад, ідучы за павевамі новага часу, навучальныя ўстановы пачалі падрыхтоўку спецыялістаў з прысваеннем кваліфікацыі «Прадзюсар» яшчэ напачатку 1990-х гг. Аднак кваліфікацыйная характарыстыка на пасаду прадзюсара была зацверджана



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрствам працы Рэспублікі Беларусь толькі ў 1997 г. (разам з пасадай культуролага, прафесіяй прыватнага прадпрымальніка).

Падобныя працэсы назіраліся і ў далейшым [340]. Напрыклад, яшчэ ў 2010 г. у наменклатуры пасад установаў сацыяльна-культурнай дзейнасці захоўвалася пасада «культарганізатар», затое не было такіх, як «менеджар», «спецыяліст па інфармацыі», «менеджар па міжнародным культурным сувязям», «маркетолаг». Гэта ў значнай ступені зніжала прывабнасць новых спецыяльнасцей сярод студэнтаў і абітурыентаў [83, арк. 70].

Побач з гэтым шмат па якіх спецыяльнасцях служачых дапускалася прыняцце на працу спецыялістаў, якія не мелі спецыяльнай адукацыі (па спецыяльнасці) ці мелі любую вышэйшую адукацыю ці любую вышэйшую ў рамках некалькіх профіляў адукацыю, а таксама было дазволена займаць шмат якія пасады адначасова і выпускнікам ВНУ і выпускнікам ССНУ [10].

Рэаліі новага часу патрабавалі перагляду палітыкі дзяржавы адносна некаторых аспектаў культурнага жыцця. Так, у адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 9 сакавіка 2005 г. № 3 «Аб некаторых мерах па супрацьдзеянню гандлю людзьмі» Савет Міністраў пастановай ад 14 мая 2005 г. № 486 зацвердзіў комплекс мерапрыемстваў па развіцці канцэртнай і культурна-забаўляльнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь з мэтай забеспячэння шырокага прыцягнення ў яе маладых дзеячаў мастацтва і культуры, а таксама па стварэнні ўмоў для занятасці асоб, якія працавалі ў мадэльным бізнесе, на 2005–2008 гг. Пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ад 18 ліпеня 2005 г. № 88 былі ўнесены адпаведныя змены і дапаўненні ў Адзіны тарыфна-кваліфікацыйны даведнік работ і прафесій рабочых і Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь «Прафесіі рабочых і пасады служачых», дзе знайшла адлюстраванне спецыяльнасць «Мадэль (дэманстратар адзення)» [439, спр. 1051, арк. 49–50].

Па даручэнні Кіраўніка дзяржавы ў 2009–2010 гг. у Акадэміі мастацтваў і Акадэміі музыкі быў праведзены эксперымент: прыём абітурыентаў здзяйсняўся па конкурсе на падставе агульнай сумы балаў па выніках правядзення этапаў уступнага іспыту па прадмеце «творчасць», сярэдняга бала, атрыманага па выніках уступных іспытаў у форме цэнтралізаванага тэсціравання, і сярэдняга бала атэстата аб адукацыі.

ВНУ галіны сумесна са спецыяльным фондам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі ў 2010 г. пачалі работу па павышэнні якасці падрыхтоўкі кадраў шляхам арганізацыі стажыровак маладых выкладчыкаў і навучання найбольш таленавітых студэнтаў у вядучых прафесараў і спецыялістаў замежных ВНУ. Рашэннем Кіраўніка дзяржавы былі падтрыманы заяўкі ВНУ галіны на выдзяленне адпаведнага гранту. Было запланавана навучанне выкладчыкаў па спецыяльнасці «Мастацтва эстрады» (г. Масква), напрамку спецыяльнасці «Мандаліна» (г. Кёльн); студэнтаў – па напрамках спецыяльнасці «Рэжысура кіно і тэлебачання (мастацкі фільм)», «Кінатэлеаператарства (кінааператарства)», «Рэжысура тэатра (тэатр лялек)», «Рэжысура



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(телебачанне)», «Скрыпка» (г. Масква), «Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва (рэстаўрацыя)» (г. Прага) [104, с. 87].

Аб тым, што асобныя маладыя спецыялісты – выпускнікі ВНУ культуры і мастацтва з'яўляліся вельмі запатрабаванымі на рынку працы сведчаць факты. Так, у 2005 г. з 160 выпускнікоў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі без месца працы засталіся толькі 9. Прычыны вялікай запатрабаванасці выпускнікоў акадэміі музыкі ў тым, што і дзіцячыя музычныя школы, і нават самадзейныя калектывы – усе пачалі аддаваць перавагу спецыялістам з вышэйшай адукацыяй. Народныя ансамблі ў гэты перыяд карысталіся вялікім поспехам, вялі багатае канцэртнае жыццё, атрымлівалі замежныя запрашэнні. Гэтыя акалічнасці выклікалі зацікаўленасць у тым, каб у іх на пастаяннай аснове працавалі высокапрафесійныя калектывы, прыходзіў музыкант шырокай спецыялізацыі, які не толькі валодаў бы сваім інструментам, але і мог бы прадырыжыраваць, узначаліць выканальніцкі калектыў [273].

У гэтым жа годзе БДУКіМ толькі на 50 % здолеў забяспечыць заяўкі ад дзяржаўных арганізацый па спецыяльнасці «Кіраўнік харэаграфічнага калектыву», на 40 % – па спецыяльнасці «Бібліятэчны і інфармацыйны работнік», на 35 % – па спецыяльнасці «Харавая народная творчасць» [190].

У 2006 г. 13 % выпускнікоў БДУКіМ былі накіраваны ў г. Мінск, 21 % – у Мінскую вобласць, 38 – у іншыя ўстановы рэспубліканскага падпарадкавання. Фактычна 72 % выпускнікоў засталіся ў Мінску і Мінскай вобласці. Вядома, што амаль усе установы рэспубліканскага падпарадкавання былі размешчаны ў Мінску. Выключэнне складалі мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», Музей Беларускага Палесся ў г. Пінску, Гомельскі дзяржаўны цырк і Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа ў Віцебску. У выніку Брэсцкая і Віцебская вобласці атрымалі па 7 % выпускнікоў, Магілёўская – 13, Гродзенская і Гомельская – па 4 % [76, т. 1, арк. 47].

Не ўсе выпускнікі прыбывалі на месца размеркавання. Усяго за перыяд з красавіка па кастрычнік 2009 г. з 25 выпускнікоў Беларускай акадэміі мастацтваў, накіраваных за межы г. Мінска, прыбылі ў вобласці 6 чалавек. З 89 выпускнікоў, якія атрымалі з 2005 па 2009 г. накіраванні за межы сталіцы, прыступілі да работы 16 чалавек. За гэты ж перыяд па розных прычынах былі пераразмеркаваны ці не з'явіліся на месца размеркавання 73 выпускнікі акадэміі (65 %). Асноўнымі прычынамі пераразмеркавання з'яўляліся: адсутнасць магчымасцей у абласных арганізацый, якія мелі патрэбу ў маладых спецыялістах, выканаць умову па абаспячэнні жыллём; неадпаведнасць пасады штатнага раскладу арганізацыі і спецыяльнасці, пазначанай у дыпломе; узровень заработнай платы, які не дазваляў задаволіць мінімальныя патрэбнасці маладога чалавека [79, т. 7, арк. 14–15].

З мэтай аптымізацыі сістэмы падрыхтоўкі кадраў для кінавідэагаліны была распрацавана спецыяльная Міжведамасная праграма на 2006–2015 гг. У 2007 г. праграма была перапрацавана, удакладнены спісы маладых кінематаграфістаў, якія навучаліся ў беларускіх і расійскіх ВНУ. Будучых спецыялістаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для беларускага кінамастацтва рыхтавалі Усерасійскі дзяржаўны інстытут кінематаграфіі (26 чалавек), Санкт-Пецярбурскі ўніверсітэт кіно і тэлебачання (24 чалавекі), Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Беларусі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. Пры гэтым агульная лічба навучэнцаў у беларускіх ВНУ складала толькі 11 чалавек [112, с. 79].

У канцы вывучаемага перыяду праблема ўкамплектаванасці ўстаноў і арганізацый культуры кадрамі з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй заставалася актуальнай. Так, на пачатак 2009 г. укамплектаванасць спецыялістамі з вышэйшай адукацыяй складала ў рэгіёнах 39,1 %, па краіне ў цэлым – 44,3 %. Амаль кожны дзявяты работнік галіны быў практыкам (12,1 % у рэгіёнах і 11,5 % у цэлым па краіне) [79, т. 7, арк. 10].

Актуальнымі заставалі пытанні ўкамплектавання тэатральных устаноў кадрамі з вышэйшай адукацыяй. Напрыклад, у 2009 г. заяўкі арганізацый галіны пры размеркаванні выпускнікоў былі выкананы толькі на 45 %. Сярэдні выпускны курс па спецыяльнасці «акцёрскае мастацтва» складаў не больш за 10–12 чалавек. Набор на спецыяльнасць «Акцёр драматычнага тэатра» штогод не праводзіўся [79, т. 7, арк. 15].

Востры дэфіцыт у канцы 2000-х гг. назіраўся ў сферы падрыхтоўкі спецыялістаў духавой музыкі, кіраўнікоў харавых і інструментальных калектываў, выкладчыкаў, інструменталістаў, спевакоў [77, т. 8, арк. 39].

Шэраг праблем меўся ў арганізацыі падрыхтоўкі пэўных кадраў. Так, для навучання студэнтаў па спецыялізацыі «Акцёрскае мастацтва музычнага тэатра» ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў у канцы вывучаемага перыяду не хапала абсталяваных вучэбных класаў для самастойных заняткаў, адчуваўся недахоп літаратуры па спецыяльным музычным дысцыплінам. Камплектацыя вучэбных груп здзяйснялася студэнтамі, якія мелі значную розніцу ў вакальнай і музычна-тэарэтычнай падрыхтоўцы, што зніжала ўзровень падрыхтоўкі будучых спецыялістаў [79, т. 7, арк. 15].

З набыццём незалежнасці сярод іншага паўстала праблема падрыхтоўкі ўласных ***навуковых кадраў*** у галіне культуры і мастацтва. Напрыклад, падрыхтоўка навуковых кадраў для бібліятэчнай справы да сярэдзіны 1990-х гг. здзяйснялася толькі ў аспірантурах Маскоўскага і Санкт-Пецярбургскага дзяржаўных інстытутаў культуры (МДІК і С-ПДІК) і ў дактарантуры МДІК.

Аспірантура БДУКіМ пачала сваю дзейнасць у 1989 г., калі быў здзейснены набор на спецыяльнасць «Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці» (педагагічныя навукі). У далейшым да яе дадаліся «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» (1996 г.), «Тэорыя і гісторыя культуры» (культуралогія); «Тэорыя і гісторыя мастацтва» (мастацтвазнаўства; 1996 г.); «Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб’ектаў» (1999 г.). З 1998 г. працавала дактарантура па гэтых жа спецыяльнасцях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1996 г. упершыню ў гісторыі беларускай вышэйшай музычнай школы ў Акадэміі музыкі быў створаны савет па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата (з 2001 г. – доктара) мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.02 «Музычнае мастацтва, мастацтвазнаўства». У 2010 г. у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі працавала аспірантура па спецыяльнасці 13.00.08 «Тэорыя і методыка прафесійнай адукацыі», рыхтавалі кандыдатаў і дактароў навук па спецыяльнасці 17.00.02 «Музычнае мастацтва, мастацтвазнаўства».

У БДАМ дзейнічаў савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па спецыяльнасцях 17.00.01 «Тэатральнае мастацтва», 17.00.03 «Кіно і іншыя віды мастацтва», 17.00.04 «Выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура», 17.00.06 «Тэхнічная эстэтыка і дызайн».

Сярэдні ўзрост кадраў вышэйшай кваліфікацыі (дактароў і кандыдатаў навук, што працавалі ў сферы культуры) у 2000 г. складаў 58 гадоў. Гэты факт патрабаваў актывізаваць намаганні па прыцягненні творчай моладзі ў навуку, стымулявання даследаванняў у сферы культуры, набліжэння іх да патрэб галіны.

У якасці дадатку да галіновай праграмы «Кадры культуры: 2001–2005 гг.» прыведзены перспектыўныя патрэбнасці ў навуковых кадрах вышэйшай кваліфікацыі на перыяд да 2010 г. у разрэзе навук і спецыяльнасцей [439, спр. 1049, арк. 163–177]. Сярод вялікага пераліку знайшлі месца такія спецыяльнасці, як «Анатомія чалавека» (медыцынскія навукі), «Агульная псіхалогія» (псіхалагічныя навукі), «Сацыялогія духоўнага жыцця» (сацыяльныя навукі), «Германскія і раманскія мовы» (філалагічныя навукі), «Тэхналогія і абсталяванне дрэваапрацоўчай вытворчасці» (тэхнічныя навукі) і інш. Па-за ўвагай засталіся спецыяльнасці з такіх галін, як эканамічныя навукі, палітычныя навукі, інфармацыйныя тэхналогіі, дзяржаўнае кіраванне, архівазнаўства.

Адным са шляхоў павышэння якасці кадраў у вывучаемы перыяд з'яўлялася сістэма **перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі.** Да найстарэйшага факультэта павышэння кваліфікацыі, створанага яшчэ ў 1976 г., у пачатку XXI ст. дадаліся новыя. У 2002 г. факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў быў створаны ў структуры БДУКіМ. У 2003 г. факультэт прайшоў дзяржаўную акрэдытацыю ў Міністэрстве адукацыі Рэспублікі Беларусь і атрымаў права на павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў па напрамках, профільных для ўніверсітэта, а таксама на перападрыхтоўку кадраў з прысваеннем кваліфікацыі.

У 2005 г. факультэт павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў быў адкрыты ў БДАМ. Першы набор слухачоў на перападрыхтоўку быў здзейснены ў 2007 г. па спецыяльнасці «Дызайн графічны», «Рэжысура відэафільма». Першы набор завочнага аддзялення па спецыяльнасцям «Дызайн-менеджмент», «Рэжысура відэафільма» і «Гукарэжысура» быў здзейснены ў 2009 г. [803].

Вядучай установай у сістэме павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў сферы культуры ў вывучаемы перыяд з'яўляўся Беларускі дзяржаўны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інстытут праблем культуры (БелДІПК). У сярэдзіне 2000-х г. у інстытуце штогод на бюджэтнай аснове праходзілі навучанне звыш 1500 слухачоў. З 1994 г. у ім вялася перападрыхтоўка кадраў па дзвюх спецыяльнасцях: ландшафтна-паркавая архітэктура і музеязнаўства. Пры інстытуце з 1994 па 2000 г. дзейнічала вочна-завочная Школа музеялогіі, якая займалася перападрыхтоўкай музейных супрацоўнікаў без адрыву ад асноўнага месца працы. За час існавання апошняй дыпломы атрымалі 45 навуковых супрацоўнікаў, 98 % якіх працягвалі працаваць у музейнай сферы [106, с. 36].

З 1995 г. пры БелДІПК паспяхова працавала міжнародная летняя школа *«Нясвіжская акадэмія»*, створаная намаганнямі дзеячаў беларускай культуры і пры падтрымцы міністэрстваў культуры Беларусі і Польшчы, а таксама міжнароднай арганізацыі па ахове і рэстаўрацыі паркаў, садоў і гістарычных мясцін (ІКАМОС). У 1995 г. першыя 11 выпускнікоў атрымалі веды па ландшафтна-паркавай архітэктуры. У 1996 г. у акадэміі прайшлі курсы па пытаннях аховы і кансервацыі гістарычных могілак. Вынікам іх сталі зробленыя ўдзельнікамі практыкі інвентары могілак у Міры і Клецку. Пад патранажам ІКАМОС былі арганізаваны заняткі па ахове прыродна-культурных ландшафтаў (1997 г.), тэорыі і практыкі аховы і дагляду гістарычных садоў і паркаў (1998 г.). Праблематыцы рэстаўрацыі архітэктуры, яе адаптацыі і аднаўленню гарадоў прысвячаліся заняткі ў «Нясвіжскай акадэміі» летам 1999 г. Заняткі летам 2000 г. прайшлі ў Гародні і былі прысвечаны дэталёваму знаёмству з гістарычнымі каналамі і воднымі шляхамі, разгляду іх гістарычнага ўжытку. Удзел у «Нясвіжскай акадэміі» звычайна бралі прадстаўнікі Беларусі, Украіны, Расіі, Польшчы, Літвы [840].

У снежні 2007 г. БелДІПК быў далучаны да Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у якасці Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. У канцы 2010 г. ён быў пераўтвораны ў самастойную дзяржаўную ўстанову адукацыі – Інстытут культуры Беларусі (Інбелкульт). У Інбелкульце побач з павышэннем кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў здзяйснялася перападрыхтоўка кадраў на базе вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі па спецыяльнасцях: «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», «Культурна-дасугавая дзейнасць», «Экскурсійна-музейная дзейнасць» [356, с. 244].

У галіне культуры склалася сістэма бесперапыннага прафесійнага навучання кіруючых работнікаў і спецыялістаў. У рэгіёнах важную ролю ў гэтым адыгрывалі абласныя курсы і аддзяленні павышэння кваліфікацыі: Брэсцкія і Віцебскія абласныя курсы павышэння кваліфікацыі, аддзяленні павышэння кваліфікацыі ў структуры Гродзенскага і Гомельскага дзяржаўных каледжаў мастацтваў. У першай палове 2000-х гг. у навучальных установах галіны культуры кожны год звыш 3 тыс. спецыялістаў ажыццяўлялі павышэнне кваліфікацыі практычна па ўсёй наменклатуры спецыяльнасцей сферы культуры [168, с. 50].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праведзены аналіз дазваляе гаварыць аб тым, што ў вывучаемы перыяд адбыліся значныя якасныя змены ў галіне адукацыі ў сферы культуры. Нягледзячы на перашкоды пераходнага перыяду, у рэспубліцы здолелі захаваць сетку навучальных устаноў пачатковага ўзроўню. Адбыліся яе аптымізацыя і ўдасканаленне, пачалі дзейнічаць установы рознага профілю. Вызначылася тэндэнцыя да перапрафілявання дзіцячых музычных школ у дзіцячыя школы мастацтваў, дзе ажыццяўлялася комплекснае эстэтычнае навучанне і выхаванне.

Перамены закранулі і сярэдняе звяно прафесійнай адукацыі. Пачалі дзейнічаць навучальныя ўстановы новага тыпу – каледжы, гімназіі, ліцэі. Падрыхтоўка спецыялістаў вялася з улікам асаблівасцей пэўных рэгіёнаў, адкрыліся новыя спецыяльнасці.

Асаблівасцю трансфармацыйных працэсаў у вышэйшай школе стала павышэнне статусу дадзеных навучальных устаноў. Патрабаваннем новых умоў незалежнага існавання краіны стала адкрыццё новых спецыяльнасцей і напрамкаў, падрыхтоўка па якіх раней у рэспубліцы не вялася. Значная ўвага ў апошнія гады надавалася матэрыяльнаму стану дадзеных устаноў. Прыкметай новага часу стала падрыхтоўка спецыялістаў за ўласныя сродкі навучэнцаў.

Разам з гэтым заставаліся не вырашанымі некаторыя праблемы падрыхтоўкі спецыялістаў галіны, звязаныя ў першую чаргу з недастатковым забеспячэннем спецыялістамі рэгіёнаў, дэфіцытам кадраў асобных спецыяльнасцей, недастатковым матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем.

Наш аналіз дазваляе гаварыць аб недапрацаванасці і недастатковай прадуманасці існуючага ў краіне ў канцы 2000-х гг. пераліку спецыяльнасцей і кваліфікацый у адносінах да сферы культуры. Распрацоўшчыкі не здолелі здзейсніць комплексны падыход. Калі па адных спецыяльнасцях быў распрацаваны пералік напрамкаў, то па іншых нельга было знайсці такой спецыялізацыі, па якой можна было б атрымаць падрыхтоўку з прысваеннем кваліфікацыі, якая б адпавядала існуючай пасадзе ў галіне народнай гаспадаркі [340].

У вывучаемы перыяд востра стаяла пытанне аб пераарыентацыі навучальнага працэсу на сучасныя патрабаванні насельніцтва. Назіраўся працэс паступовага развіцця спецыяльнасцей, якія прадугледжвалі актыўнае выкарыстанне новых тэхналогій. Пачалася падрыхтоўка кадраў па асобных спецыяльнасцях, навучанне па якіх раней вялося ў Расіі. Перагледжаны пералік спецыяльнасцей і кваліфікацый дазволіў праводзіць падрыхтоўку спецыялістаў па новых напрамках. На рынку працы з'явіліся работнікі са здвоенымі спецыяльнасцямі. У краіне пачалася падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для навуковай сферы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глава 5

# КУЛЬТУРНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ І ІНДУСТРЫІ КУЛЬТУРЫ

## 5.1. Мастацкая літаратура: у пошуках новых ідэалаў

Набыццё незалежнасці стала падзеяй, якая закранула ўсе бакі грамадскага жыцця Беларусі. Працэсы нацыянальна-культурнага адраджэння, якія пачаліся ў час перабудовы, былі дамінуючымі ў новую эпоху. Адной з асноўных прыкмет новага часу стала разнастайнасць літаратурна-мастацкіх выданняў. Адсутнасць цэнзуры стварала спрыяльныя ўмовы для творчасці. Літаратуравед М. Тычына, аналізуючы беларускую літаратуру канца XX ст., заўважае: «У канцы XX ст. з'явіліся прыкметы "стомленасці" ад празмерна ідэалагізаванага мастацтва і заўважна ўзрасла цікавасць да прапушчаных літаратурных эпох, мадэрнізму і постмадэрнізму як сведчанне імкнення ісці ў нагу з прагрэсам і пастаянна пераадольваць духоўную правінцыйнасць» [67, с. 104]. З другога боку, эканамічны крызіс, у якім апынулася маладая дзяржава, прывёў да значнага скарачэння накладаў літаратурна-мастацкіх выданняў, а пісьменнікаў паставіў ва ўмовы выжывання. Рынак патрабаваў ад творцаў не толькі мастацкіх здольнасцей, але і ўмення займацца мэнеджментам і рэкламай. На першае месца стала пытанне не творчасці, а пошуку грошай на выданне сваіх твораў. Да таго ж у мінулым засталіся творчыя семінары, абмен вопытам, праца з маладымі літаратарамі.

Крызісны стан грамадства 1990-х гг. наклаў свой адбітак на літаратурную творчасць. Творцы знаходзіліся ў пошуку сваіх індывідуальных стыляў, робячы акцэнт на арыгінальнасці, парадаксальнасці, эксперыментальнасці, экзатычнасці. Характарызуючы літаратурную сітуацыю пачатку 1990-х гг., вядомая літаратуразнаўца Л. Сінькова (на той час – Л. Корань) у сваім артыкуле «Ці лёгка быць геніем?» пісала: «У друку пачалі з'яўляцца вершы, апавяданні, эсэ маладых аўтараў з лексікай абстрактнай, архаізаванай, запазычанай – "гарадской", у дарэформенным правапісе. Моднымі зрабіліся "закрытыя" тэмы: з жыцця савецкага войска, пра дэбілізм і шызафрэнію ў розных ракурсах, побытавае хамства, увогуле пра што-небудзь гідкае, непрыемнае – яшчэ ў межах "мастацтва галоснасці", але з намёкам на экзістэнцыю і натуралізм. Распаўсюдзіліся таксама эфектныя персаналіі, сяброўскія прысвячэнні, цьмяныя спасылкі і эпіграфы, як бы ўпершыню прамоўленыя для гіпатэтычнага рэцыпіента, нейкага дрымучасаўковага беларуса» [718, с. 228].

У гэты перыяд аўтары вызначаюцца актыўным пошукам новых тэм, новых літаратурных форм. Назіраецца рост лірычнай паэзіі, папулярнасць невялікіх апавяданняў, мініяцюр, навел, метафар. У літаратуру прыйшлі новыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

маладыя творцы са сваім поглядам на жыццё, светаўспрыняццем. Для творчасці сяброў *Таварыства вольных літаратараў* (створана ў 1995 г. у Полацку) характэрны сацыяльны гратэск і дэманстратыўная правакацыйнасць: кніга вершаў С. Адамовіча «Зваротныя правакацыі» (1994), зборнік Ю. Гумянюка «Водар цела (псіхадэлічнае мастацтва)» (1992), «Твар Тутанхамона» (1994), «Рытуал» (1999). У «POST SCRIPTUM» да кнігі «Твар Тутанхамона» Гумянюк пісаў: «Гэта кніга ёсць апошні металёвы цвік, якім я прыбіў сацрэалізм да крыжа беларускай паэзіі».

У рэчышчы «кананічных» *неамадэрнізму ці постмадэрнізму* ў пачатку XXI ст. напісаны раман «Рэканструкцыя неба» (2002) В. Гапеевай, «Імя грушы: раман у трох мемуарах» (2005) С. Балаханава, раманы «Замак пабудаваны з крапівы» (2008) З. Вішнёва, «Бег» (2008) А. Талстова, «Тэатральныя дэманы» (2010) І. Сіна. Найбольш плённа ў гэтым напрамку працаваў А. Бахарэвіч[1].

Спрэчкі сярод літаратурных крытыкаў у вызначэнні стылю выклікаў і твор І. Бабкова «Адам Клакоцкі і ягоныя цені: раман у 10-ці эпізодах» (2001), польскі пераклад якога праз 8 год пасля арыгінальнага выдання намінаваўся на атрыманне літаратурнай прэміі «Ангелус». Адны абвяшчалі яго «першай беларускай постмадэрнісцкай аповесцю», іншыя настойвалі на тым, што паэтыка твораў І. Бабкова ўгрунтавана хутчэй у «магічным рэалізме», чым уласна ў постмадэрнізме [830].

Вельмі папулярнай у сярэдзіне 1990-х гг. становіцца *драма абсурду*. У гэты час з'явіліся п'есы: «Ого, год!» С. Мінскевіча, «Драматургічныя тэксты» А. Асташонка, «Vita brevis, або нагавіцы святога Георгія» М. Клімковіча і М. Шайбака. Як пародыю на постмадэрновую драматургію вызначаў жанр сваёй п'есы «Крывавая імша» (1995) І. Сідарук[2].

Неабходна заўважыць, што творы, напісаныя ў новых для беларускай літаратуры стылях, не карысталіся вялікай папулярнасцю ў чытача, які не разумеў філасофіі творцаў. Не былі яны абдораны ўвагай літаратурнай крытыкі і літаратуразнаўцамі. Для пашырэння сваёй папулярнасці сябры Таварыства вольных літаратараў у 1993 г. заснавалі літаратурную прэмію «Гліняны Вялес». Гэтай назвай яны імкнуліся падкрэсліць яе дачыненне да нонканфармізму (не «залаты» і не «крыштальны») і неакансэрватызму (Вялес – старажытны паганскі бог, які апекаваўся мастацтвам). Прэмія прысуджалася за лепшую, на думку тэвээлаўцаў, беларускую мастацкую кнігу года. Першым лаўрэатам прэміі стаў І. Бабкоў за кнігу «Solus Rex» (1993). У 2003 г. прэмія была прысуджана пісьменніку П. Васючэнку за кнігу для дзяцей «Жылі-былі паны Кубліцкія да

[1] Зборнік «Практычны дапаможнік па руйнаваньні гарадоў і проза 1997–2001» (2002), раманы «Праклятыя госці сталіцы» (2008), «Сарока на шыбеніцы» (2007–2008).

[2] Ён жа з'яўляецца аўтарам фарсу-абсурду «Галава» (1992) і п'есы «Плач, саксафон» (1996), а таксама кнігі прозы «Квадратная варона» (2001).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заблоцкія». Гэты быў першы выпадак, калі прэмія была прысуджана кнізе, якая выйшла ў дзяржаўным выдавецтве[1].

Нягледзячы на шматлікія намаганні, па меркаванні асобных крытыкаў, у беларускай літаратуры так і не было створана твораў, якія б вызначаліся сваёй «мадэрновасцю». Аналізуючы творы беларускіх аўтараў, якія пазіцыянавалі сваю творчасць як постмадэрнісцкую, крытык Д. Жукоўскі ў 2004 г. сцвярджаў: «постмадэрнісцкіх тэкстаў у поўным сэнсе гэтага слова ў нас няма. […] Постмадэрнісцкі арсенал у беларускай літаратуры карыстаецца вялікім попытам, спробаў стварыць паслядоўна постмадэрнісцкі тэкст – нашмат меней, не кажучы ўжо пра поспех» [238, с. 90]. На думку крытыка, постмадэрнісцкія прыёмы зрабіліся агульнаўжывальнымі, а таму і не могуць вызначыць «ступень постмадэрновасці» твора.

Навізной тэм, інтэртэкстуальнасцю твораў вызначаліся творчыя пошукі А. Хадановіча. Спалучэннем іроніі з пародыяй, рэальнасці з фантазіяй, выкарыстанне «трасянкі» ўласціва яго кнігам «Старыя вершы» (2003), «Лісты з-пад коўдры» (2004).

Надзвычай цікавай з'явай, па меркаванні літаратурнага крытыка І. Шаўляковай, у 2000-х гг. сталася проза А. Брава, першая аповесць якой «Бязлітасны мой воін» пабачыла свет у 2001 г.[2]. «Проза гэтага аўтара паўстае з дзіўнага сінтэзу жорсткай рэалістычнасці, нават натуралістычнасці, і пранізлівай эмацыйнай шчырасці, якая на піку аповеду пераходзіць у пачуццёвую аголенасць», – заўважае крытык І. Шаўлякова [830].

У вывучаемы перыяд развіліся *прыгодніцкі і дэтэктыўны* жанры, у якіх з'явіліся новыя жанрава-стылёвыя прыёмы (антыўтопія, сацыяльны гратэск, фантастыка). Да антыўтопій належаць «Краіна Хлудаў» (1994) А. Мінкіна і В. Галкова, «Ахутавана» (1994) А. Бароўскага. У 1991 г. выйшаў першы беларускі трылер «Каханка д'ябла, або Карона Вітаўта Вялікага» (1991) М. Шайбака (М. Адамчыка). Ён жа аўтар зборніка дэтэктыўных твораў «Забойства на Калядах» (1994), а сумесна з У. Адамчыкам і М. Клімковічам (пад літаратурным псеўданімам Т. Сабоцкая) – рамана «Сапежынскі прывід» (1993). Да дэтэктыў-

---

[1] Лаўрэатамі прэміі акрамя згаданых былі: Л. Сільнова за зборнік малюнкаў-вершаў «Рысасловы» (1994), А. Разанаў за зборнік вершаў «Паляванне ў райскай даліне» (1995), С. Адамовіч за зборнік «Каханьне пад акупацыяй» (1996), празаік Л. Вашко за зборнік апавяданняў «Паэты-цары» (1997), пісьменнік У. Арлоў за зборнік эсэ «Божая кароўка зь пятай авэню» (1998), паэт М. Папека за зборнік «Чарнавікі...» (1999), празаік С. Астравец за зборнік «Цэнзарскія нажніцы» (2000), паэт В. Сьлінко за зборнік «Штольні вясны» (2001), А. Бухарэвіч за кнігу «Практычны дапаможнік па руйнаваньні гарадоў» (2002), А. Брава за зборнік прозы «Камендацкі час для ластавак» (2004), С. Дубавец за зборнік эсэ «Вострая Брама» (2005), В. Акудовіч за кнігу «Дыялогі з Богам» (2006), А. Мінкін за зборнік вершаў «Пэнаты» (2007 г.), Б. Пятровіч за зборнік прозы «Жыць ня страшна» (2008), В. Казько за раман «Бунт незапатрабаванага праху» (2009), У. Някляеў за зборнік паэзіі «Кон: вершы двух стагоддзяў» (2010).

[2] Дэбютны зборнік «Камендацкі час для ластавак» (2004) акрамя аднайменнай змясціў аповесць «Імя Ценю – Святло (Гісторыя адной фабіі)» (2003), апавяданні «Тапіць дзяўчатак тут дазволена» (2002), «Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца» (2004). Аўтар рамана «Менада і яе сатыры» (2008) і інш.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нага жанру адносіцца кніга Ф. Сіўко «Апошняе падарожжа ў краіну ліваў» (1997). Л. Рублеўская – аўтар прыгодніцкіх твораў «Сэрца мармуровага анёла» (2000), «Пярсцёнак апошняга імператара» (2002), «Золата забытых магіл» (2004).

У беларускай літаратуры з'явілася шмат твораў, напісаных у жанры навуковай і сацыяльнай фантастыкі. Да твораў фантастычнага жанру адносяцца аповесць «Кентаўры» (1993) В. Гігевіча, раман «Пятая цэнтурыя, трыццаць другі катрэн» Ю. Станкевіча (2004), кніга «Белы мурашнік» (1993) і п'еса «Пясочны гадзіннік» (2004) П. Васючэнкі, аповесць «Вязень пясочнага гадзінніка» (2004) М. Шамякінай, фантасмагорыя «Спакушэнне» (2003) А. Бароўскага. У жанры сацыяльнай фантастыкі, антыўтопіі вытрымана кніга «Праўдзівая гісторыя Краіны Хлудаў: кароткія антыўтопіі» А. Мінскіна (у суаўтарстве з В. Галкіным, 1994). Плённа ў жанры фантастыкі працавала Р. Баравікова. У 2002 г. выйшла кніга яе фантастычных апавяданняў «Вячэра манекенаў», трылогія для дзяцей «З казак старога астранаўта» (2005). Спалучэннем фантастычных вобразаў з прыгодніцкім сюжэтам вызначаюцца творы С. Мінскевіча: аповесць «Забаўкі для маладых» (1995), раман-фэнтэзі «Сад замкнёных гор» (2004) і раман «Зорныя гульні» (2005).

У гэты перыяд працягвалі працаваць пісьменнікі і паэты старэйшага пакалення. У іх творчасці знайшлі сваё адлюстраванне праблемы сучаснасці і пераасэнсавання мінулага, сцвярджаліся нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці. Як заўважае літаратуразнаўца С. Андраюк, «праяўленне разбуджанай новымі жыццёвымі ўмовамі творчай энергіі пайшло на асваенне новых пластоў рэчаіснасці, да гэтага па тых ці іншых прычынах не асвоеных, адкрыццё новых тэм і распрацоўку характараў, свабодную рэалізацыю індывідуальных творчых магчымасцей... І сама літаратура, і творчасць кожнага пісьменніка паасобку ўзбагачаецца жанрава, сама апавядальная манера становіцца больш публіцыстычна адкрытай і лірычна непасрэднай» [67, с. 97].

Вялікую папулярнасць набыла *аўтабіяграфічная і мемуарная белетрыстыка*. Пабачылі свет зборнік Я. Брыля «Пішу як жыву» (1994), творы У. Арлова («Мой радавод да пятага калена», 1993), Л. Галубовіча («Зацемкі з левай кішэні», 1998), Ю. Станкевіча («Сезонныя гульні ў футбол», 2002), А. Клінава («Малая падарожная кніжка па Горадзе Сонца», 2008). Да мемуарнага жанру ў апошнія гады жыцця звярнуўся В. Быкаў. Вясной 2002 г. аўтар завяршыў працу над кнігай «Доўгая дарога дадому».

Пісьменнікі і паэты знаёмілі чытача са сваімі перажываннямі, поглядамі на жыццё, выказвалі сваю грамадзянскую пазіцыю ў дзённіках і запісных кніжках. У вывучаемы перыяд іх выдалі Я. Брыль і І. Шамякін, В. Адамчык і І. Пташнікаў, Я. Сіпакоў і Б. Сачанка, Г. Далідовіч і В. Шніп.

Драматычныя старонкі народнага жыцця, звязаныя з *палітычнымі рэпрэсіямі*, апісваў у сваіх апавяданнях «Францужанкі» (1997) і «Тры пуды жыта» (1998) І. Пташнікаў. Тэму рэпрэсій закранаюць у сваёй творчасці літаратары, якія на сабе адчулі ўвесь жах той пары. У 1991 г. выйшла апошняя частка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўтабіяграфічнай трылогіі С. Грахоўскага – аповесць «З воўчым білетам». У гэтым жа годзе была надрукаваны аповесць П. Пруднікава «Пекла», а ў 1993 г. – аповесць «За калючым дротам».

Эпічныя творы, прысвечаныя гісторыі беларускай *вёскі*, у пачатку 1990-х гг. скончылі В. Адамчык і Б. Сачанка. Раман «Голас крыві брата твайго» В. Адамчыка завяршыў тэтралогію аб трагічным лёсе беларускай вёскі Заходняй Беларусі ў даваенныя і пасляваенныя гады. Раманы «Вяртанне да віны» і «Не ўсе мы прападзем» сталі заключнымі ў пенталогіі Б. Сачанкі аб партызанскай барацьбе ў беларускай вёсцы. Панарамная карціна жыцця заходне-беларускага сялянства і інтэлігенцыі з канца 1940-х гг. створана ў рамане Г. Далідовіча «Заходнікі» (1992 г.), за які пісьменніку была прысуджана Дзяржаўная прэмія Беларусі імя Янкі Купалы (1996 г.). А. Рыбак у 2009 г. скончыў раман «На раздарожжы» трылогіі пра жыццё гаротнай і галоднай пасляваеннай вёскі.

*Тэма Вялікай Айчыннай вайны* ў даследуемы перыяд заставалася адной з самых папулярных. Ёй прысвечаны аповесці А. Адамовіча «Венера» (1993) і «Нямко» (1993), М. Дубоўскага «У кожнага – свая вайна» (2005), аповесць-эсэ А. Кобец-Філімонавай «Распятая Хатынь» (2005), аповесць А. Рыбака «Хрумкач» (2008). Мастацка-дакументальная аповесць Ф. Баторына «Чорны год» (2010) расказвае пра лёс яўрэйскага падполля г. Мінска. Апавяданні пра дзяцей і падлеткаў, якія дапамагалі партызанам і падпольшчыкам змагацца з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, сабраны ў зборніку В. Гурскага «Цяжкая дарога» (2010). Розныя аспекты гэтай важнай для беларускага народа тэмы прадстаўлены ў п'есах С. Бартохавай «Такая доўгая навальніца» (2003), М. Шэлегава «Яма» (2004), Я. Папова «Бліндаж» (2004), А. Дударава «Ты помніш, Алёша...» (2004).

Да апошніх дзён свайго жыцця творча працаваў В. Быкаў. Грамадзянскай пазіцыяй вызначаецца яго кніга публіцыстыкі і эсэістыкі «Крыжовы шлях» (1998). Вечным праблемам чалавечага існавання ў часы выпрабаванняў, у жорсткіх і непрадказальных умовах прысвечаны аповесці «Сцюжа» (1993), «Пакахай мяне, салдацік» (1993), «Балота» (2001), «Афганец» (2003), кніга апавяданняў «Сцяна» (1997).

Творы новага перыяду вызначаюцца *мастацка-этычнай і грамадзянскай праблематыкай*. Да падзей мінулага і сучаснасці звяртаўся І. Навуменка, які стварыў трылогію «Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва» (1997) і яе працяг «Любімы горад» (1999). Востра ўспрымаў рэчаіснасць, драматызуючы яе, адмаўляючы новыя ідэалы ў сваіх творах, І. Шамякін[1]. Маральна-этычныя тэмы пераважаюць у творчасці В. Казько (аповесць «Прахожы», 1995), У. Дамашэвіча[2], п'есах М. Клебановіча «Збродныя душы» (1997), Р. Баравіковай «Пятля часу» (1995), Г. Марчука «Блудны муж і Варвара» (1997).

---

[1] Раман «Губернатар» (2000), аповесці «Выкармак» (1996), «Завіхрэнне» (1998), «Сатанінскі тур» (1995), «Стары рамантык» (2000), «У засені палаца» (2000).

[2] Аповесці «Месяц у Раі, або Аддай сэрца людзям» (2006), «Фінская лазня, або Цяжка ў гэта паверыць» (2006), раман «На мяжы цярпення» (2007).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У шэрагу аўтараў, якім не абыякавы маральны стан грамадства, лёс роднага краю, беларускай вёскі, гісторыі роднай зямлі, выдзяляецца А. Федарэнка, які толькі за 1990-я гг. надрукаваў каля дзесяці аповесцей, сярод якіх найбольш адметныя: «Вёска» (1995), «Такое кароткае лета» (1994), «Ланцуг» (1994), кніга прозы «Смута» (1994, літаратурная прэмія імя І. Мележа), «Шчарбаты талер» (1999), «Тры талеры» (2000).

Станаўленне беларускай дзяржаўнасці, пошукі шляхоў далейшага нацыянальна-дзяржаўнага развіцця стымулявалі пісьменнікаў да стварэння твораў на *гістарычную тэматыку*. У рэчышчы нацыянальнай гістарычнай прозы працавалі В. Іпатава[1], В. Коўтун[2], У. Арлоў[3], А. Наварыч («Літоўскі воўк», 2005), А. Пашкевіч («Пляц Волі», 2001), Л. Рублеўская («Скокі смерці», 2005; «Золата забытых магілаў», 2004).

Зацікаўленасць да мінулага праявілася і ў беларускіх драматургаў А. Петрашкевіча[4] і А. Дударава[5]. Вобраз Барбары Радзівіл знаходзіўся ў цэнтры ўвагі ў аднайменнай п’есе Р. Баравіковай (1994).

У вывучаемы перыяд у літаратуру прыйшло новае пакаленне творцаў, якія сваёй малой радзімай лічаць *горад*. Пры чым не толькі па нараджэнні, але і па выхаванні, культуры, светапоглядзе. Асяроддзю горада, псіхалогіі і характару яго жыхароў прысвечаны творы А. Асташонка («Жоўты колер белага снегу», 2005), А. Глобуса («Койданава», 1997), Л. Дранько-Майсюка («Месца і Свет», 2000), Л. Рублеўскай («Старасвецкія міфы горада Б*», 2002), Ю. Станкевіча («Любіць ноч – права пацукоў», 2000), А. Казлова («Горад у нябёсах», 2004), М. Стральцова (зборнік «Ад маладзіка да поўні», 2005), А. Бахарэвіча (зборнік «Ніякай літасці Валянціне Г.», 2006; раман «Праклятыя госьці сталіцы», 2008).

Сапраўднай трагедыяй для нашага народа стала *Чарнобыльская катастрофа*. Як заўважае літаратуразнаўца А. Бельскі, «Чарнобыльская трагедыя зрабілася галоўнай ідэйна-тэматычнай лініяй сучаснай літаратуры, гэта шмат у чым вызначальная сэнсаўтваральная з’ява ў сучаснай мастацкай свядомасці» [127, № 3, с. 5]. Ён адзначае, што паводле падлікаў, на чарнобыльскую тэму з’явілася больш за 500 вершаў, каля двух дзясяткаў паэм, больш за паўсотню твораў эпічнай прозы і драматургіі. Найбольш значнымі з’яўляюцца раман «Злая зорка» (1993) і аповесць «Зона павышанай радыяцыі» (1997) І. Шамякіна,

---

[1] Раманы «Залатая жрыца Ашвінаў», «Чорная княгіня» (2000), «Альгердава дзіда» (2002), «Вяшчун Гедыміна» (2001), «Знак вялікага магістра» (2009), зборнік «Прадыслава» (1997).

[2] Раман «Крыж міласэрнасці» (1996) прысвечаны лёсу Алаізы Пашкевіч (Цёткі), а раман-жыціе «Пакліканыя» (2002) – жыццёваму шляху Еўфрасінні Полацкай.

[3] «Міласць князя Гераніма» (1993), «Пяць мужчын у леснічоўцы» (1994), «Рэквіем для бензапілы» (1998), «Сны імператара» (2001), кнігі гістарычнай эсэістыкі, прысвечаныя Еўфрасінні Полацкай («Еўфрасіння Полацкая», 1992), Ігнату Грынявіцкаму («Прысуд выканаў невядомы», 1992 г.), полацкай гісторыі («Таямніцы полацкай гісторыі», 1994 г.).

[4] П’есы «Воля на крыжы» (1994), «Меч Рагвалода» (1996).

[5] П’есы «Купала» (1994), «Князь Вітаўт» (1997), «Рагнеда і Уладзімір» (1998), «Палачанка» (1998), «Чорная панна Нясвіжа» (1999).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аповесць «Ваўчыная яма» (1999) В. Быкава, кніга прозы «Права на адсяленне» (2001) Н. Рыбік, кніга лірыкі «Чорны боль» (2003) В. Вабішчэвіча, раман «Палыновы вецер» (2005) Л. Левановіча. М. Мятліцкі цалкам прысвяціў гэтай тэме чатыры кнігі: «Палескі смутак» (1991), «Бабчын» (1996), «Хойніцкі сшытак» (1999), «Замкнёны дом» (2005). На гэту ж тэму напісаны п'есы А. Дударава «Адцуранне» (1994), А. Петрашкевіча «Дагарэла свечачка да палічкі» (1993), В. Ткачова «Усміхаўся месяц белай вішні» (1996).

Кніга С. Законнікава «Чорны конь апакаліпсісу» (1996), якая была выдадзена ў Польшчы і складалася з паэм «Чорная быль» і «Зязюля», атрымала Міжнародную літаратурную прэмію імя В. Гулевіча.

Грамадска-палітычны крызіс, *бездухоўнасць пачатку 1990-х гадоў* не мог не адбіцца на творчасці паэтаў і пісьменнікаў. У гэты перыяд выйшаў шэраг кніг, напоўненых перажываннямі, змрочнымі танамі. Да іх ліку можна аднесці паэтычныя зборнікі А. Мінкіна «Расколіна» (1991), С. Шаха «Пад высокай лагодай нябёс» (1995), В. Шніпа «На рэштках Храма» (1994), П. Шруба «Чорнабелае святло» (1995). Парадоксы і супярэчнасці часу знайшлі сваё адлюстраванне ў кнігах Р. Барадуліна («Міласэрнасць плахі», 1992), А. Вялюгіна («Заклён на скрутны вір», 1994), В. Зуёнка «Пісьмы з гэтага свету», 1995), А. Лойкі («Неўміручасць», 2000).

Адначасова працягваў існаваць *лірычны жанр* як адзін з самых папулярных у беларускай паэзіі. Аб'ектам перажыванняў творцаў з'яўляецца свет кахання і нерэалізаваных мар. Мастацка-псіхалагічнай глыбінёй вызначаюцца зборнікі Р. Баравіковай («Сад на капялюшыку каханай», 1998), Л. Дранько-Майсюка («Стомленасць Парыжам», 1995), Г. Каржанеўскай («Асенні мёд», 1999), А. Спрынчан («Вершы ад А», 2004), І. Багдановіч («Сармацкі альбом», 2004), Л. Рублеўскай («Шыпшына для Пані», 2007).

Побач з гэтым назіраецца *эратызацыя* мастацкага тэксту. Найбольш яскравымі ўзорамі гэтага з'яўляюцца: аповесць «Эрагенная зона» (1996) В. Чаропкі, кнігі «Дамавікамерон» (1989–2001) А. Глобуса, «Саната Арганата» (1993) І. Сідарука, раман «Апосталы Нірваны» (1995) Ю. Гуменюка, кнігі С. Адамовіча «Зваротныя правакацыі» (1994) і «Плавільшчыкі расы» (1999).

Крызіс грамадства, пошук новых ідэалаў прымусіў аўтараў звярнуцца да хрысціянскіх матываў у творчасці. Зварот да Бога пасля працяглага перыяду атэізму стаў крыніцай, з якой чэрпалі натхненне Д. Бічэль («Божа мой, Божа», 1993), І. Багдановіч («Вялікдзень», 1993), Р. Барадулін («Евангелле ад Мамы», 1995), Н. Гілевіч («На высокім алтары», 1994), В. Шніп («На рэштках Храма», 1994).

Неабходна адзначыць, што літаратуры незалежнай Беларусі ўласцівы ***полілінгвістычны характар***. У вывучаемы перыяд назіраўся ўздым нацыянальнай самасвядомасці прадстаўнікоў іншых нацый і народнасцей, якія насяляюць Беларусь. У краіне ствараліся і актыўна працавалі нацыянальна-культурныя таварыствы і суполкі, якія выпускалі свае перыядычныя выданні, кнігі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і зборнікі на роднай мове. Яскравым прыкладам з'яўляецца творчасць армяна-курдскага паэта, старшыні таварыства курдаў «Курдыстан» Г. Чарказяна, які з 1960-х гг. жыў і працаваў у Беларусі. У 1992 г. у перакладзе на рускую мову выйшла яго кніга вершаў «Обожженные жаваронки», у 2004 г. – «Тоска по дому». Сярод яўрэйскіх пісьменнікаў, якія пісалі на ідыш, неабходна адзначыць Г. Рэлеса і Ф. Баторына.

Рускамоўная літаратура Беларусі ў гэты час папоўнілася творамі М. Чаргінца[1]. Празаік А. Сульянаў у вывучаемы перыяд напісаў шэраг дакументальных твораў, прысвечаных лёсам маршала Жукава, Л. Берыі, сакратара ЦК КПБ А. Кузьміна. У 2006 г. выйшла яго кніга «Пушкин. Элиз Кутузова и Долли Фикельмон», у якой ён разглядае лёс рускага паэта праз прызму яго стасункаў з жанчынамі. Раманы «Прыжок дьявола» (2001) і «Завещание Сталина» (2003) прадставіў па суд чытача Э. Скобелеў.

Сярод пісьменнікаў Беларусі вызначаліся творцы, якія добра арыентаваліся ў кан'юнктуры кніжнага рынку і прапаноўвалі кнігі, якія хутка станавіліся папулярнымі. Шырокую вядомасць атрымаў рускамоўны пісьменнік А. Жвалеўскі, былы чэмпіён Беларусі па Клубе Вясёлых і Знаходлівых, фізік па адукацыі. У 2002 г. яго кніга (у суаўтарстве з І. Мыцько) «Пори Гартер и каменный философ», напісаная ў якасці пародыі на вядомую гісторыю пра Гары Потэра, карысталася вялікім попытам і некалькі разоў перавыдавалася. У 2005 г. ён атрымаў расійскую прэмію «Золотая мечта» ў намінацыі «самая смешная кніга»[2].

Папулярнасцю сярод чытачоў карысталіся творы рускамоўных аўтараў С. Клімковіча[3], Т. Лісіцкай[4], Н. Батраковай[5].

Больш чым на 20 моў перакладзена «Чарнобыльская малітва» (1998) рускамоўнай пісьменніцы С. Алексіевіч. Сама аўтарка атрымала еўрапейскую літаратурную прэмію імя Ё. Г. Гердэра, расійскую прэмію «Трыумф», літаратурную прэмію «Сведкі міру» (Францыя).

Такім чынам, літаратурная творчасць, вызваленая аб ідэалагічнага дыктату, вызначылася разнастайнасцю літаратурных форм (ад рэалізму да постмадэрнізму) і жанраў (ад класічнага апавядання і аповесці да рамана-даследавання, трагікамедыі, драмы абсурду, рамана-фэнтэзі), эстэтычнымі пошукамі, наватарскімі ідэямі, пашырэннем тэматыкі твораў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[1] «Кремлевский колодец» (1998), «Илоты безумия» (1995), «Однажды в марте» (2000), «По божьей воле» (2000), «Смертельный квадрат» (2000), «Тайна Овального кабинета» (2001), «Последний герой» (2003).

[2] А. Жвалеўскі – аўтар шэрага кніг для дзяцей і дарослых: «Мастер силы» (2005), «Мастер сглаза» (2005), «Я заслуживаю большего! Любовь по правилам и без» (совместно с Я. Пастернак, 2007) і інш.

[3] Раманы «Шаг в никуда», «Танцует осень», «Одиночество в раю», «Обитель неспящих», «Три строки о радости, три строки о грусти», «Забвение сердец».

[4] Раманы «Идиотки» (2006), «Тихий центр» (2007).

[5] Раманы «Площадь согласия», «Территория души».

### 5.2. Выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное і манументальнае мастацтва

#### *5.2.1. Выяўленчае мастацтва*

Сацыяльна-палітычныя ўмовы пачатку 1990-х гадоў дазволілі мастакам адчуць свабоду ў творчым выяўленні. Аднак разам з паляпшэннем умоў для творчасці новая эканамічная сітуацыя значна пагоршыла фінансавае становішча творцаў. Фінансавы крызіс у значнай ступені адбіўся і на даходах мастакоў, таму што стаўкі на закупку твораў выяўленчага мастацтва былі вельмі нізкімі ў параўнанні з тымі, што маглі прапанаваць прыватныя галерэі. Гэтая з'ява перашкаджала музеям набываць творы ў свае фонды [438, спр. 44, арк. 86].

У першай палове 1990-х гг. рэзка скарацілася колькасць дзяржзаказаў на творы мастацтва. Складанае эканамічнае становішча дзяржавы выклікала жорсткі рэжым эканоміі і істотнае скарачэнне капіталаўкладанняў у сферу культуры і мастацтва. Праведзены Беларускім інстытутам праблем культуры параўнальны аналіз аб'ёмаў і структуры фінансавання выяўленчага мастацтва за 1992 і 1995 гг. зафіксаваў тэндэнцыю да зніжэння ўзроўню дзяржаўнага патранажу мастацтва і скарачэння магчымасцей рэалізацыі культурных ініцыятыў [814, с. 37].

Практычна невырашальнай стала праблема забеспячэння мастакоў майстэрнямі, якаснымі матэрыяламі для працы. Як адзначала ў 1996 г. І. Голубева, «практыка фарміравання цаны на творы мастацтва пры ажыццяўленні дзяржзаказу, калі сабекошт твора можа значна перавышаць цану, знізіла інтарэс мастакоў да распрацоўкі сюжэтна-тэматычных кампазіцый. Пад пагрозу стаівіцца станковы жывапіс, які рэдка дзе ў свеце захаваўся, выдаткі на яго беларускі мастак не ў стане пакрыць за кошт атрыманага ганарару» [814, с. 38].

Новыя ўмовы існавання прывялі да *змены прыярытэтных напрамкаў* у мастацтве. На месца сюжэтна-тэматычнай карціне прыходзіць твор, асноўнай каштоўнасцю якога з'яўляецца эстэтычная ацэнка, якую дае глядач. Мастак вымушаны арыентавацца на спажыўца. Менавіта кан'юнктура рынку становіцца вырашальнай пры выбары апошнім сюжэтаў. Мастакі зразумелі, што прыёмы пісьма, тэматычная пабудова твора, памер павінны быць разлічаны не на музей, а на калекцыянера. Гэта зусім іншае мастацтва ў адрозненне ад сацрэалістычнага. І змены ў творчай скіраванасці маладзейшых калег сталі непазбежнымі: у творах пашырыўся пейзажны жывапіс, узрасло захапленне дэкаратыўнымі эфектамі, ідэалістычнымі матывамі.

Мастацкае жыццё Беларусі пачатку 1990-х гг. адзначалася вострай палемікай паміж прадстаўнікамі розных напрамкаў, пашырэннем міжнароднага абмену. Адначасова мастацтва рэзка эстэтызавалася. Індывідуальныя задачы пошуку канцэпцыі асобы ў сучасным свеце часцей сталі замяняцца эксперыментальнай форматворчасцю [140, с. 157].

Адным з самых папулярных жанраў у вывучаемы перыяд быў гістарычны. Мастакі звярталіся як да падзей і асоб сівой даўніны («Пагоня на Грунвальд»



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. Борздага, «Партрэт вялікага канцлера Льва Сапегі» А. Марачкіна), так і да трагічнай гісторыі XX ст.

Шмат увагі гістарычнай тэматыцы надавалі ў сваёй творчасці мастакі – члены творчай суполкі «Пагоня» Я. Кулік, А. Марачкін, Г. Скрыпнічэнка і інш. [836, с. 177]. Мастакі гэтай суполкі не толькі паказвалі свае творы, але і арганізоўвалі тэматычныя выставы, прысвечаныя знакамітым творцам з Беларусі. У 1998 г. імі была арганізавана выстава, прысвечаная памяці мастака А. Пятрухны і 110-годдзю з дня нараджэння Я. Драздовіча. Акрамя прац мастака тут былі і творы, зробленыя падчас пленэру на яго радзіме [826].

Адной з папулярных тэм у творчасці мастакоў стала экалагічная праблема ў цэлым і Чарнобыльская катастрофа ў прыватнасці. З ёй пераклікаецца пейзажны жывапіс беларускіх вёсак і гарадоў. Сярод жывапісных работ вызначаюцца карціны Г. Вашчанкі «Мой дом – мая боль», В. Барабанцава «Зона», Г. Тураўскай «Памяці 26 красавіка 1986 года», В. Шкаруба «Дзічок». Вялікая жывапісная серыя пейзажаў А. Бараноўскага «Гарызонты Айчыны» была адзначана Дзяржаўнай прэміяй.

Жывапіс Беларусі ў канцы XX ст. выразна падзяліўся на дзве асноўныя плыні – фігуратыўны і нефігуратыўны. Пошук шматзначнасці вобраза з выкарыстаннем як традыцыйных прыёмаў рэалістычнага жывапісу, так і элементаў мадэрнізму XX ст. быў уласцівы творчасці У. Зінкевіча, В. Альшэўскага [234, с. 360–361].

У тэхніцы выканання ўсё большае значэнне набывала фактурная распрацоўка паверхні карціны, што дазваляла ўбачыць за прастатой сюжэту складаны псіхалагічны падтэкст. Гэта было ўласціва для творчасці А. Грышкевіча, А. Задорына і Б. Казакова [234, с. 364].

Характэрнай асаблівасцю мастацтва 1990-х гг. стала падмена мастакамі навакольнай рэальнасці сканструяванай, выдуманай, віртуальнай. У гэтых адносінах выдзяляецца творчасць У. Кожуха. Традыцыі авангарду пачатку XX ст. віцебскай мастацкай школы развівалі ў сваёй творчасці Л. Русава, В. Касцючэнка, Г. Лойка [234, с. 367].

У 2005 г. упершыню работы беларускіх мастакоў І. Басава, Л. Хобатава, В. Шкаруба, І. Цішына, У. Цеслера, С. Войчанка, Р. Вашкевіча, А. Залорына і Н. Залознай былі прадстаўлены на Венецыянскім біенале [806].

Акрамя класічных відаў мастацтва трывалае месца на культурнай сцэне занялі фотамастацтва, арт-дызайн, мастацтва акцый і інш. Беларускаму выяўленчаму мастацтву ў XXI ст. былі характэрны працэсы пашырэння жанрававыразнага спектра, асваення новых тэхнік і тэхналогій стварэння выявы (відэатэхніка, камп’ютар).

Ацэньваючы развіццё беларускага выяўленчага мастацтва ў канцы XX – пачатку XXI ст., вядомы мастацтвазнаўца Р. Смольскі адзначаў: «Пры ўсіх складанасцях, цяжкасцях і супярэчнасцях сучаснага творчага працэсу ў выяўленчым мастацтве, абумоўленых у тым ліку і беспрэцэдэнтна моцнай экспансіяй



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заходняй масавай культуры ў самых разнастайных яе праявах, вядучыя беларускія мастакі дэманструюць не толькі высокі прафесіяналізм і вернасць традыцыям нацыянальнай мастацкай школы (аснову якой складае рэалістычны напрамак), але і ўменне знаходзіць новыя выяўленчыя рашэнні творчых ідэй у сваіх творах» [726, с. 9].

У вывучаемы перыяд развіваўся станковы жывапіс. Пры афармленні залі ўрачыстых пасяджэнняў Гомельскага краязнаўчага музея мастакамі У. Зінкевічам. У. Савічам і В. Альшэўскім быў створаны эталонны ўзор параднага беларускага жывапіснага партрэта. Заўважны ўклад у дасягненні нацыянальнай школы жывапіснага партрэта ўнёс М. Савіцкі, які стварыў партрэтную галерэю прэзідэнтаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі [726, с. 9].

У 1990-я гг. значна пераглядаліся музейныя фонды, ствараліся новыя экспазіцыі, таму існавала вялікая патрэба ўзбагаціць фонды сучаснымі творамі выяўленчага мастацтва (у асноўным гістарычнай і краязнаўчай тэматыкі). Да таго ж менавіта ў 1990-я гг. колькасць музеяў і галерэй значна ўзрасла, што пацягнула за сабой цікавасць да твораў выяўленчага мастацтва з боку дзяржавы. Напрыклад, у 1991 г. статус галерэі атрымаў рэспубліканскі Палац мастацтваў. Да гэтага часу ў ім выстаўляліся творы выяўленчага мастацтва, а з атрыманнем новага статусу ў галерэі з’явілася магчымасць гандляваць імі [144].

Прыкметай новага часу стала адкрыццё ў краіне ***прыватных мастацкіх галерэй***. Іх галоўным адрозненнем ад існаваўшых на Захадзе была амаль поўная адсутнасць камерцыйных мэт. Прыватныя галерэі існавалі ў асноўным на энтузіязме іх стваральнікаў, фактычна абстрагуючыся ад функцыі пасрэдніка паміж пакупнікoм і мастаком.

Адметна, што саўладальнікам адной з першых прыватных галерэй Мінска – Vita Nova – быў М. Халезін, які ў далейшым стаў кіраўніком Свабоднага тэатра. Значную папулярнасць сярод мінчан мела галерэя «Шостая лінія».

У сакавіку 1993 г. у Віцебску дзякуючы дапамозе беларусаў-эмігрантаў з Амерыкі, якую арганізаваў С. Сокалаў-Воюш, была адкрыта прыватная галерэя «У Пушкіна» – першая ў навейшай гісторыі Беларусі галерэя сучаснага постмадэрнізму маладых жывапісцаў з Полацка, Гродна, Віцебска. Яе ўладальнікам быў вядомы мастак А. Пушкін. За перыяд 1993–1995 гг. было праведзена 8 значных выставак жывапісу, графікі, скульптуры, сучаснай фатаграфіі, пластычнага перфомансу. Неабходна адзначыць, што да апошняга галерэя была сапраўднай эксперыментальнай лабараторыяй. Аднак у канцы 1995 г. за «парушэнне статута і нямэтавае выкарыстанне памяшкання» яна была зачынена.

У канцы 1993 г. у г. Гродна была адкрыта прыватная галерэя «У майстра» ў выкупленым памяшканні. Апошняя акалічнасць садзейнічала яе доўгаму існаванню. Уладальнікам не трэба было хваляваца аб павелічэнні арэнднай платы ці спыненні дамова арэнды, як гаспадару іншай прыватнай галерэі «Тызенгауз» у тым жа горадзе. У 2008 г. далейшы лёс апошняй, якая належала індывідуальнаму прадпрымальніку, была пастаўлена пад сумненне ў сувязі з новымі ўмовамі арэнднай платы за памяшканні. Толькі пасля выступлення



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэспубліканскай газеты «Звязда» ў абарону «Тызенгауза» было прынята рашэнне аб прымяненні паніжаючага каэфіцыента арэнднай платы [353].

У 2004 г. да ліку прыватных галерэй дадалося яшчэ некалькі, уладальнікамі якіх былі самі мастакі. У мястэчку Ракаў браты Валерый (скульптар) і Фелікс (мастак) Янушкевічы адкрылі прыватную галерэю «Янушкевічы», якая размясцілася ў сямейнай сядзібе. А ў Мінску пачала працаваць прыватная галерэя мастака А. Смоляка «Эрмітаж».

Сярод аматараў мастацтва былі папулярнымі прыватныя галерэі сталіцы «Зямля людзей» і «Да-Сандр Арт», уладальнікамі якіх былі прадпрымальнікі. Першая была адкрыта ў 2001 г. французам, які ў Беларусі вёў свой бізнес. Яна праіснавала толькі два гады. Уладальнікам другой выступіла прыватная фірма–вытворца лялек «Мальвіна». Галерэя спецыялізавалася на рэалізме і неарэалізме і паспяхова існавала з 2004 г. ва ўласным памяшканні.

Папулярызацыяй прац беларускіх мастакоў акрамя галерэй займаліся і прыватныя начныя клубы. У іх гэта было прадыктавана ў першую чаргу пошукам новых рашэнняў у афармленні інтэр'ераў з мэтай прыцягнення публікі. Першаадкрывальнікам у 2007 г. выступіў начны клуб «Изюм», які арганізаваў серыю вечароў «Изюмительный пленер». У рамках праекта прайшлі выставы работ шэрага мастакоў.

Нягледзячы на цяжкія эканамічныя ўмовы, дзяржава працягвала ***закупку твораў*** мастакоў. Галоўным акумулятарам гэтага працэсу з'яўлялася Міністэрства культуры разам з абласнымі ўпраўленнямі культуры. У 1992 г. Міністэрства абвясціла конкурс на атрыманне дзяржаўнага заказу на стварэнне твораў выяўленчага мастацтва гістарычнай тэматыкі. Мэтай правядзення конкурсу было не толькі развіццё гістарычнага жанру, але і папулярызацыя беларускай гісторыі сярод насельніцтва. Творы гістарычнага жанру ў той час былі вельмі неабходнымі ў музейнай справе, якая перажывала перыяд актыўнага пераабсталявання экспазіцый. Конкурс разлічваўся на доўгатэрміновы перыяд. Фактычна, канчатковы тэрмін падвядзення вынікаў у «Палажэнні» не быў вызначаны. Кожныя два гады, пачынаючы з 1992 г., у кастрычніку павінны былі падводзіцца вынікі працы мастакоў, скульптараў, графікаў – удзельнікаў конкурсу. Творы па эскізах, прынятых журы, у наступным часе маглі быць выкананы ў рамках дзяржзаказу. Міністэрства культуры разам з некаторымі рэспубліканскімі музеямі, згодна з «Палажэннем», абвяшчала асноўныя тэмы конкурсу, якія суправаджаліся неабходным для канкурсантаў навукова-даведачным матэрыялам [438, спр. 2071, арк. 229–231]. Большая частка тэм, прапанаваных для конкурсу на 1992–1994 гг., была прысвечана сярэдневяковай гісторыі Беларусі: «Веча ў Полацку», «Паганскае свята», «Давід Гарадзенскі – супраць крыжакоў» і г. д. Планавалася размясціць гэтыя творы ў экспазіцыі Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі.

У 1994 г. праходзіла выстава твораў выяўленчага мастацтва «Жыве Беларусь!», прысвечаная 50-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У рамках гэтай выставы Міністэрствам быў арганізаваны дзярж-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заказ вядучым мастакам, удзельнікам гэтай выставы, згодна з якім стварылася каля 40 прац.

У 1995 г. набыццё твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва стала больш актыўным, аб чым сведчаць пратаколы пасяджэнняў Дзяржаўнай экспертнай камісіі Міністэрства культуры і друку па творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Карціны, скульптура і іншыя творы набываліся па заяўках музеяў у аўтараў ці з выстаў. Экспертныя камісіі Міністэрства выязджалі на месцы (у абласныя і іншыя музеі), каб зрабіць ацэнку твораў для закупкі іх музеямі – не абавязкова за дзяржаўны кошт, таксама за кошт мясцовых органаў ці асабіста музея.

За 1996 г. за кошт цэнтралізаваных сродкаў Міністэрства было набыта каля 250 твораў выяўленчага мастацтва ад 142 мастакоў. Дадзеныя па закупцы праз абласныя ўпраўленні культуры за гэты перыяд не выяўлены. Па ўскосных звестках найбольш актыўнымі ў гэтай справе з’яўляліся ўпраўленні культуры Магілёўскага і Віцебскага аблвыканкамаў, што можна патлумачыць наяўнасцю ў згаданых абласцях мастацкіх абласных музеяў. Міністэрства культуры вуснамі начальніка аддзела музеяў і выставак С. І. Маслоўскага выказвалася аб тым, што «ў складаных эканамічным становішчы мастакі без дзяржаўнай падтрымкі сваёй творчасці проста не змогуць выжыць. Далёка не кожны з іх мае магчымасць у сілу самых розных абставін прабіцца на арт-рынак за межамі краіны. Тым самым без змены акцэнтаў у гэтай справе з боку дзяржаўных структур мы можам страціць не толькі асобных мастакоў, але і тыя мастацкія творчыя пошукі і адгалінаванні, якія маюць месца ў жанрах і накірунках выяўленчага мастацтва рэспублікі на сучасным этапе» [439, спр. 149, арк. 59].

Са стварэннем у 1996 г. спецыяльнага Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва становішча ў гэтым напрамку палепшылася. У перыяд з 2001 па 2005 г. было вылучана грантаў на 290 млн рублёў. Актывізавалася дзейнасць сістэмы дзяржаўнага заказу [168, с. 42].

У 2007 г. Міністэрства культуры з рэспубліканскіх, тэматычных і персанальных выставак беларускіх мастакоў набыло па заяўках музеяў краіны 45 твораў. За кошт гранта Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва ў гэтым жа годзе было набыта яшчэ 42 творы [794]. За перыд 2005 – першай паловы 2007 г. дзяржаўнымі музеямі было набыта за кошт цэнтралізаваных сродкаў, грантаў Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва 238 твораў беларускіх мастакоў [76, т. 6, арк. 28]. Найбольш буйная закупка твораў мастакоў была ў 2009 г., калі Міністэрства культуры з рэспубліканскіх, тэматычных і персанальных юбілейных выставак беларускіх мастакоў па запатрабаванні музеяў краіны для іх экспазіцыі за кошт цэнтралізаваных сродкаў набыло 169 твораў [103, с. 85].

У вывучаемы перыяд актыўна развіваўся ***пленэрны рух***. Прыкладам могуць служыць пленэры ў гонар Фердынанда Рушчыца ў Валожынскім раёне ці Шагалаўскія пленэры на Віцебшчыне.

У чэрвені 1994 г. у Віцебску прайшоў І Міжнародны пленэр імя М. Шагала, у якім прынялі ўдзел 42 мастакі з розных краін, а потым яны падаравалі па адной сваёй карціне Віцебскаму Шагалаўскаму цэнтру. Падчас правядзення пленэра ў горадзе было арганізавана некалькі выстаў: «75 гадоў Віцебскай мастацкай школе», «Жывапіс Іегуды Пэна», «Скульптура У. Слабодчыкава» і інш. Фінансавая падтрымка гэтай акцыі была аказана банкамі «Беларусь», «Знешэканомбанк», Віцебскім Камерцыйным, Сусветным яўрэйскім размеркавальным фондам «Джойнт», якія да таго ж выдалі да пачатку пленэру каталог твораў яго ўдзельнікаў. Пасольствы Германіі, Польшчы, Ізраіля і Латвіі ўнеслі свае сродкі ў фонд рэканструкцыі мемарыяльнага музея М. Шагала [58].

У верасні 1995 г. Міжнародны пленэр па жывапісе праходзіў у г. п. Тураў (Гомельская вобласць). Мэтай яго правядзення была «прапаганда гісторыкакультурнай спадчыны тураўскай зямлі». У пленэры ўдзельнічалі каля 20 мастакоў з Бранскай, Чарнігаўскай, Жытомірскай абласцей і Беларусі [438, спр. 45, арк. 41–43]. Міжнародны пленэр, прысвечаны 190-годдзю са дня нараджэння Н. Орды, праводзіўся ў чэрвені 1996 г. Арганізатарамі гэтай акцыі выступалі Міністэрства культуры і Фонд Н. Орды. Прыблізна ў той самы час (14 мая – 7 чэрвеня 1996 г.) быў арганізаваны Міжнародны пленэр па жывапісе імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі на тэрыторыі Магілёўскай вобласці. Мастацкая суполка «Пагоня» праводзіла два пленэры на радзіме Я. Драздовіча (верасень 1996 г. і жнівень 1998 г.), у арганізацыі якіх Міністэрства ўдзелу не прымала. Падтрымку гэтай акцыі аказвалі Культурна-асветнае таварыства імя Я. Драздовіча ў Германавічах і Віцебскі фонд імя Сапегі [826]. Летам 1999 г. у Буда-Кашалёўскім раёне Гомельскай вобласці праходзіў Міжнародны пленэр па жывапісе, які быў прысвечаны памяці народнага мастака СССР Я. Я. Маісеенкі і арганізаваны непасрэдна Міністэрствам культуры пры падтрымцы мясцовых улад.

У 2003–2005 гг. прайшлі пленэры па жывапісе – імя Г. Ніскага і В. Цвірко ў г. Гомелі, імя В. Бялыніцкага-Бірулі ў г. Магілёве, імя М. Селешчука ў г. Брэсце.

Усталявалася практыка прымеркавання мастацкіх выстаў да музычных і тэатральных фестываляў. Напрыклад, у час правядзення фестывалю «Славянскі базар» 1999 г. адбылася прэзентацыя выставы «Я з вечна вандроўных», прысвечанай беларускаму мастаку, ураджэнцу Віцебшчыны Я. Драздовічу [196]. 23 ліпеня 1992 г. у час правядзення першага фестывалю ў Віцебску быў адкрыты Арт-цэнтр М. Шагала, які займаўся даследаваннем і папулярызацыяй творчасці мастака, праводзіў шагалаўскія пленэры [749].

У 2003 г. адной з буйных выставак, што атрымалі вялікі грамадскі рэзананс, з'явілася рэспубліканская мастацкая выстаўка «Мастакі тэатра, кіно і тэлебачання – трэцяму тысячагоддзю», што адбылася ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі Беларускага саюза мастакоў.

З 2 па 26 мая 2007 г. у Палацы мастацтваў у г. Мінску праходзіла выстаўка «Посттрадыцыя. Фарбы Радзімы» секцыі жывапісу творчага саюза мастакоў. У ёй удзельнічалі творы 26 мастакоў Беларусі. Па выніках 7 лепшых твораў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

былі набыты ў фонды музеяў за кошт сродкаў Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Падчас выстаўкі адбылася канферэнцыя па абмеркаванні яе вынікаў і праблем сучаснага выяўленчага мастацтва.

Юбілей Янкі Купалы і Якуба Коласа ў 2007 г. быў адзначаны буйной выстаўкай «Мастацкія каласавіны». Таксама былі праведзены выстаўкі «Фарбы Радзімы» і манументальнага мастацтва.

З мэтай актуалізацыі каштоўнасці і ўнікальнасці выяўленчага мастацтва, паказу разнастайнасці яго кірункаў і жанраў, самабытнасці беларускай мастацкай школы ў 2010 г. упершыню Міністэрствам культуры была арганізавана Рэспубліканская выстаўка «Зямля пад белымі крыламі». У гэтым маштабным праекце былі задзейнічаны ўсе буйныя выставачныя залы мастацкіх музеяў і галерэй Мінска, Брэста, Віцебска, Гомеля, Гродна, Магілёва, Слуцка. У рамках праекта адбыўся абмен выстаўкамі паміж абласцямі. Усяго 47 мерапрыемстваў прайшлі з верасня па снежань 2010 г. на 19 пляцоўках. Гэта мастацкая акцыя дала магчымасць не толькі аднавіць творчыя сувязі паміж мастакамі розных рэгіёнаў, але і прыцягнуць да выяўленчага мастацтва ўвагу шырокага кола гледачоў.

Выстаўка стала сапраўдным штуршком для актывізацыі мастацкага жыцця ў Беларусі і закранула вялікую колькасць мастакоў розных пакаленняў і школ. Яна адкрылася 3 верасня ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. На выстаўцы былі прадстаўлены 243 творы 148 аўтараў перыяду існавання незалежнай Рэспублікі Беларусь. 30 верасня яе наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Кіраўнік дзяржавы акрэсліў важныя праблемы развіцця выяўленчага мастацтва ў рэспубліцы: стварэнне ў Мінску Цэнтра сучаснага мастацтва, паляпшэнне ўмоў творчай дзейнасці мастакоў, асабліва маладых творцаў, папулярызацыя выяўленчага мастацтва з мэтай узмацнення яго ролі ў краіне, прэзентацыя яго за мяжой, запатрабаванасць мастакоў у рэгіёнах, праблемы набыцця твораў мастацтва ў рэгіёнах, павышэнне прафесійнага ўзроўню мастакоў і інш. [104, с. 75].

Асвятленне мастацкага жыцця краіны ў гэты перыяд было б няпоўным без ***вызначэння недахопаў***. Найбольш значны – адсутнасць мастацтвазнаўчай крытыкі твораў. У канцы 2004 г. у рэдакцыі часопіса «Мастацтва» адбыўся круглы стол, на якім абмяркоўваўся стан выяўленчага мастацтва. На ім рэдактар аддзела выяўленчага мастацтва часопіса Н. Шаранговіч адзначала, што «хоць у рэспубліцы і асабліва ў Мінску рэгулярна праводзяцца шматлікія выставы, адчуваецца недахоп дакладнай інфармацыі аб мастацкім жыцці краіны. Гэта сведчыць пра нявызначанасць стратэгіі мастацкага жыцця і адсутнасць шырокай тэарэтычнай дыскусіі… Мала выдаецца альбомаў, каталогаў, манаграфій па праблемах сучаснага выяўленчага мастацтва Беларусі. Не хапае і мастацкіх галерэй, якія б маглі шырока прапагандаваць мастацтва праз інфармацыйныя матэрыялы» [817, с. 14].

Адсутнасць навукова абгрунтаванай праграмы развіцця выяўленчага мастацтва, па меркаванні мастацтвазнаўцаў, адмоўна паўплывала на агульны



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзровень сучаснай культуры. Як адзначала Н. Шаранговіч, у творчых працах мастакоў таго часу адсутнічала жанравая чысціня: «сённяшнія мастакі звяртаюць увагу на інтэрпрэтацыі, рэфлексуюць на класічныя тэмы, яднаюць на адным палатне розныя жанры, шукаюць новае на памежжы стыляў, у нагрувашчванні тэхнік. Амаль цалкам знікла сюжэтна-тэматычная карціна, пераважаюць пейзажны жывапіс, дэкаратыўныя сюжэты… Многія высокія пазіцыі аказаліся пад пагрозай быць страчанымі. Найперш гэта тычыцца манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, а таксама развіцця такіх жанраў, як партрэт» [827].

Р. Смольскі сярод адмоўных тэндэнцый у развіцці беларускага выяўленчага мастацтва ў першую чаргу выдзеліў арыентацыю некаторай часткі беларускіх мастакоў на заходні рынак, дзе вызначальную ролю адыгрываў камерцыйны аспект. Па-другое, пашырэнне працэсу ўкаранення ідэй і каштоўнасцей «масавай культуры» ў мастацкае жыццё краіны. Вынікам яго стала «ўкараненне ў свядомасці пэўнай часткі нашай мастацкай грамадскасці некрытычных адносін да псеўдаавангарду, спекулятыўныя спробы ўзвесці ў нейкі эстэтычны абсалют творчы метад М. Шагала, К. Малевіча і адначасова «нізпавергнуць» фігуратыўную манеру пісьма ў беларускім выяўленчым мастацтве». Вядомы крытык заклікаў мастацтвазнаўчую навуку і мастацкую крытыку «паставіць трывалую заслону на шляху пранікнення разбуральных, нізкапробных плыняў масавай культуры, якія прапаведуюць культ нізкіх жаданняў, насілля і жорсткасці» [726, с. 11].

«Дзеячы культуры і мастацтва павінны адстойваць прыярытэт агульначалавечых прагрэсіўных каштоўнасцей, павышаць тым самым духоўны патэнцыял грамадства. Калі мастак стварае для свайго народа, атрымлівае ад яго прызнанне, то адчувае сябе карысным для грамадства. Выяўленчае мастацтва не можа дасягнуць значных вышынь, калі ім цікавяцца толькі прадстаўнікі так званай эліты», – адзначалася ў аналітычнай запісцы «Аб мерах па развіцці і захаванні самабытнасці беларускай прафесійнай мастацкай творчасці і нацыянальнай мастацкай школы ва ўмовах экспансіі заходняй масавай культуры» [25, с. 84].

Недахоп інфармацыі аб мастацкім жыцці краіны, адсутнасць шырокай тэарэтычнай дыскусіі па праблемах сучаснага выяўленчага мастацтва адзначалася ў рашэнні калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 90 ад 20.10.2005 г.

У гэтым жа дакуменце канстатавалася адсутнасць развітай сістэмы абменных выставак з мастакамі краін СНД, малая колькасць абменных выставак сталічных мастакоў у абласцях і абласных мастакоў у сталіцы. Звярталася ўвага на ўдасканаленне працы па выхаванні маладога пакалення творчай моладзі ў лепшых традыцыях беларускага выяўленчага мастацтва. Відавочнай была неабходнасць правядзення пленэраў жывапісу, графікі, скульптуры, а таксама выставачных праектаў моладзі. Падкрэслівалася, што творчую актыўнасць моладзі неабходна стымуляваць закупкай твораў. Патрабавала ўдасканалення сістэма фарміравання калекцый сучаснага нацыянальнага выяўленчага ма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стацтва. Прапаноўвалася распрацаваць канцэпцыю фарміравання як калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, так і абласных музеяў, выставачных залаў і галерэй [439, спр. 1049, арк. 142].

У кастрычніку 2007 г. на калегі Міністэрства культуры разглядалася работа Экспертнай камісіі па выяўленчым і дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (работа Камісіі праводзілася ў адпаведнасці з Палажэннем, зацверджаным загадам Міністра культуры Рэспублікі Беларусь ад 12.03.2001 г.) па фарміраванні калекцый ва ўстановах культуры рэспублікі [76, т. 6, арк. 28].

У пастанове па гэтым пытанні адзначалася, што «важным напрамкам работы Камісіі з'яўляецца супрацьдзеянне пранікненню ў мастацкае жыццё краіны кітчу, прафесійнай няслушнасці, маральнай непаўнацэннасці асобных работ мастакоў» [76, т. 6, арк. 28]. Мастацтвазнаўца Р. Смольскі сярод мастакоў–прыхільнікаў кітчу называў імёны Л. Леўчанка, А. Смоляка, Р. Вашкевіча, Р. Заслонава, У. Жбанава [726, с. 11]. Па меркаванні мастацтвазнаўцаў, гэта праява была «выклікана неабходнасцю пошуку фінансавых сродкаў, здабыць якія зараз магчыма праз адкрыты продаж твораў альбо выкананне заказу асобы з нізкім мастацкім густам» [25, с. 93].

Экспертная камісія не праводзіла сістэмнай работы па каардынацыі фарміравання калекцый мастацкіх галерэй і дзяржаўных музеяў. Меліся выпадкі, калі камісіяй дапускаліся творчыя кампрамісы, якія зніжалі высокамастацкія крытэрыі адзнакі работ мастакоў. Патрабавала ўдасканалення арганізацыя сістэмы дзяржаўнага сацыяльна-творчага заказу, пашырэння яго тэматычнага спектра за кошт адлюстравання сродкамі мастацтва сучасных дасягненняў грамадства, яркіх асабовых праяў беларускага народа, асэнсавання яго гісторыі і гістарычнай перспектывы [76, т. 6, арк. 29].

Адной з праблем у працы Экспертнай камісіі з'яўлялася адсутнасць канцэпцыі музеяў па фарміраванні калекцый. Асабліва гэта тычылася абласных музеяў, дзе ў фонды набываліся ў асноўным работы мясцовых мастакоў, у выніку чаго назапашваўся неэкспазіцыйны матэрыял. Камісіі рэкамендавалася больш дасканала падыходзіць да адбору твораў для абласных і раённых музеяў, папаўняць іх калекцыі творамі вядучых майстроў беларускага выяўленчага мастацтва, народных і заслужаных мастакоў, лаўрэатаў дзяржаўных прэмій [76, т. 6, арк. 34–35].

Недахопам у рабоце Экспертнай камісіі з'яўлялася папаўненне музейных калекцый вялікай колькасцю твораў пейзажнага жанру, што зніжала іх каштоўнасць. Неабходна было ўдзяліць належную ўвагу стварэнню тэматычных фігуратыўных кампазіцый, якія б адлюстроўвалі сучасныя сацыяльныя і эканамічныя пераўтварэнні ў нашым грамадстве [76, т. 6, арк. 35].

У рабоце камісіі з моладдзю адсутнічаў сацыяльна-творчы заказ дзяржавы маладым талентам на стварэнне твораў для новых аб'ектаў культуры і тых, што рэканструююцца, а таксама для музейных калекцый.

Экспертнай камісіяй часта адхіляліся ад набыцця работы мастакоў, якія былі выкананы на пленэрах, арганізаваных у абласцях рэспублікі, па прычыне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нізкіх ці недастатковых мастацкіх якасцей. Бачылася, што прыцягненне да ўдзелу ў пленэрах народных, заслужаных мастакоў дазволіць падняць узровень работ яго ўдзельнікаў, прадставіць на справаздачных выставах творы высокага прафесійнага ўзроўню і папоўніць імі стацыянарныя музейныя экспазіцыі [76, т. 6, арк. 35].

Не праводзіліся штогадовыя выставы па выніках рэгіянальных пленэраў, на якіх экспертная камісія магла б даваць адзнаку работам мастакоў і рэкамендаваць творы для калекцый музеяў [76, т. 6, арк. 35].

Адмоўнае ўздзеянне на работу камісіі аказвала адсутнасць крытыкі. Крытычны матэрыял у сродках масавай інфармацыі, правядзенне рэспубліканскіх канферэнцый па праблемах развіцця беларускага выяўленчага мастацтва, якія б вызначалі тэндэнцыі і перспектывы развіцця апошняга, істотна маглі б паўплываць на вынікі творчай дзейнасці мастакоў і работу камісіі [76, т. 6, арк. 35].

### *5.2.2. Скульптура*

Скульптура ў вывучаемы перыяд перажывала вялікія змены – у ёй з'явіліся новыя тэмы, вобразы, новае стаўленне да гледача. Адна з такіх тэндэнцый – стварэнне твораў паркавай скульптуры. Напрыклад, «Дама на лаўцы», «Прахожы» і іншыя скульптара У. Жбанава. Цікавасць да падобных твораў з боку ўлады сведчыла аб змене адносін да скульптуры ў грамадстве, ім надавалася функцыя ўпрыгожвання горада, стварэння ўтульнай для чалавека жылой прасторы.

У вывучаемы перыяд аўтараў і заказчыка ў асобе Міністэрства культуры, мясцовых улад ці грамадскіх арганізацый цікавілі помнікі беларускім дзеячам, забытым у часы савецкай улады. У 1992 г. былі адкрыты наступныя помнікі: У. Караткевічу, (скульптар І. Голубеў), М. Шагалу ў Віцебску (скульптар А. Гвоздзікаў), А. Міцкевічу (скульптар В. Янушкевіч), мемарыяльная дошка ў гонар Ф. Скарыны ў Падуі. У наступныя гады працягвалася ўстаноўка помнікаў знакамітым дзеячам беларускай гісторыі і культуры: Ф. Скарыне ў Лідзе (1993), Я. Драздовічу ў Мінску (1993), І. Гашкевічу ў Астраўцы (1994), У. Караткевічу ў Оршы (1994, скульптар І. Казак), В. К. Бялыніцкаму-Бірулю ў Магілёве (1996), гістарычным падзеям (мемарыял на Буйніцкім полі пад Магілёвам (1995)). У 1996 г. пасля некалькіх гадоў спрэчак і дыскусій у цэнтры Мінска, насупраць Траецкага прадмесця, урачыста быў адкрыты помнік воінам-інтэрнацыяналістам, якія загінулі ў Афганістане [672, с. 34–39].

Новым напрамкам творчасці для беларускіх скульптараў з'явілася рэлігійная тэматыка. Адной з самых таленавітых і значных прац стала бронзавая скульптурная кампазіцыя «Архангел Міхаіл перамагае змея», устаноўленая ў 1996 г. каля касцёла святых Сымона і Алены ў Мінску. Аўтарам гэтага твора стаў І. Голубеў, які ў той час быў адным з самых запатрабаваных скульптараў у Беларусі. Кампазіцыя ўяўляла з сябе постаць Архангела, які пранізвае кап'ём распластанага на зямлі змея [163, с. 172]. Узвядзенне гэтага манумента



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звязана з ростам ролі рэлігійных аб'яднанняў у Беларусі і паказвала значэнне хрысціянства ў духоўным адраджэнні краіны.

Сярод помнікаў і манументаў, якія былі ўстаноўлены ў другой палове 1990-х гг., выдзяляюцца: помнік мастаку і музыканту Напалеону Ордзе скульптара І. Голубева (г. Іванава, 1996), бюсты мастакоў П. Масленікава (Магілёў, 1997) і А. Астаповіча (Мінск, 1997), бюст А. Багдановіча (в. Халопенічы, Крупскі раён, 1997), бюст А. Міцкевіча (Гродна, 1998), помнікі М. Доўнар-Запольскаму (Рэчыца, 1997), М. Танку (Мядзельскі раён, 1997), Я. Баршчэўскаму (в. Мурагі Расонскага раёна, скульптар В. Янушкевіч). У 1998–2000 гг. было ўстаноўлена некалькі помнікаў знакамітым асветнікам Беларусі ва ўнутраным дворыку БДУ, сярод якіх помнікі Ф. Скарыне (1998), М. Гусоўскаму (1998), Е. Полацкай (1998), С. Буднаму і В. Цяпінскаму (2000). Яшчэ адзін помнік Е. Полацкай (скульптар І. Голубеў) быў адкрыты на яе радзіме ў г. Полацку ў верасні 2000 г.

Ініцыятарамі ўстаноўкі помніка ў другой палове 1990-х гг. часта былі грамадскія арганізацыі, фінансавую дапамогу аказвалі і пасольствы розных краін. Напрыклад, скульптуры Ф. Скарыны і М. Гусоўскага, устаноўленыя ў дворыку БДУ, былі падараваны ўніверсітэту Мінскім грамадска-асветніцкім клубам «Спадчына», а помнік-храм воінам-інтэрнацыяналістам у Траецкім прадмесці ўзводзіўся пры актыўным удзеле арганізацыі былых удзельнікаў вайны ў Афганістане. Яшчэ адным прыкладам можа служыць адкрыццё мемарыяла ахвярам Халакосту на месцы былога яўрэйскага гета (адкрыты 10 ліпеня 2000 г. у Мінску). Стварэнне гэтага помніка фінансавалася пры дапамозе шматлікіх грамадскіх арганізацый, Федэрацыі яўрэйскіх абшчын СНД, пасольства Ізраіля ў Беларусі [672, с. 39–43]. Сустракаюцца прыклады фінансавання помнікаў з крыніц прыватнага капіталу, як было з помнікам Рагнедзе ў Заслаўі (скульптар А. Арцімовіч, архітэктар І. Марозаў) [70].

У вывучаемы перыяд кардынальным чынам змяніліся падыходы да фінансавання ўстаноўкі твора манументальнай скульптуры. Як станоўчую тэндэнцыю можна адзначыць рост цікавасці да манументальнай скульптуры мясцовых улад. Калі раней яны былі толькі пасіўнымі выканальнікамі ідэй, якія прыходзілі зверху, ці імкнуліся «прабіць» устаноўку чарговага бюста правадыра, каб падняць свой прэстыж, то пазней яны спрабавалі падкрэсліць гістарычныя і культурныя асаблівасці свайго горада ўстаноўкай помніка знакамітаму земляку. Помнік звычайна ставіўся ў гістарычным цэнтры горада і надаваў яму новы духоўны сэнс: бюст А. Міцкевічу ў Гродне (1998 г., скульптар А. Заспіцкі, архітэктар Ю. Казакоў), помнік князю Давыду ў Давыд-Гарадку (2000 г., скульптар А. Дранец, архітэктар Л. Левін), помнік святой Сафіі Слуцкай у Слуцку (2000 г., скульптар М. Іськоў, архітэктар М. Лук'янчык) [153, с. 3]. У 1999 г. быў адкрыты помнік ахвярам трагедыі на Нямізе, створаны скульптарам Г. Буралкіным і архітэктарам А. Чадовічам каля перахода станцыі метро «Няміга» [153, с. 5].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пачатку XXI ст. геаграфія ўстаноўленых манументальных помнікаў значна пашырылася: князю Барысу (г. Барысаў, 2002 г., скульптар А. Арцімовіч), Кірыле Тураўскаму (г. Гомель, 2004 г., скульптары бацька і сын Гумілеўскія), Сафіі Слуцкай (г. Слуцк, 2007 г., скульптар М. Іནькаў). У верасні 2007 г. быў адкрыты помнік Усяславу Брачыславічу ў Полацку (скульптар А. Прохараў). Вялікую ўвагу грамадскасці выклікаў архітэктурна-скульптурны знак «Беларусь партызанская» ў г. Мінску (2005 г., скульптар В. Занковіч). 2008 г. быў азнаменаваны адкрыццём помнікаў Вінцэнту Дуніну-Марцінкевічу ў Бабруйску (скульптар Л. Гумілеўскі), Сямёну Зорычу ў Шклове (скульптар У. Слабодчыкаў). У 2009 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка 1000-годдзя г. Брэста, на якім адлюстраваны выдатныя асобы і этапы развіцця горада, якія адыгралі значную ролю ў яго гісторыі.

У 2006 г. была завершана работа па стварэнні мемарыяльнага комплексу дзецям, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай, у г. п. Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна. Узвядзенне мемарыяла было распачата ў 1994 г., але з-за праблем з фінансаваннем будаўніцтва закончылася толькі ў снежні 2006 г. Мемарыял спраектаваны творчай майстэрняй заслужанага архітэктара Беларусі Л. Левіна. Яго адкрывае скульптура адзінокай дзяўчынкі. Цэнтрам кампазіцыі ўнікальнага помніка з'яўляецца «Плошча Сонца». Па высаджаным яблыневым садзе разыходзяцца «прамяні» (алеі) гэтага «сонца». Адзін з іх чорнага колеру – «Прамень Памяці», ён з'яўляецца галоўным уваходам у комплекс і ідзе праз «мёртвы клас» з белых партаў і школьнай дошкі, дзе размяшчаюцца мальберты з малюнкамі, выкананымі дзецьмі ў канцлагерах. Пасярэдзіне дошкі – «Белы ветразь» – мара дзяцінства.

У сувязі са святкаваннем 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў былі створаны помнікі, манументы і памятныя знакі, якія адлюстравалі трагічныя старонкі гісторыі вайны. У г. Магілёве памяці дзяцей-сірот быў прысвечаны мемарыял «Дзецям вайны» (архітэктар І. Марозаў, скульптар У. Слабодчыкаў). Аб пакутах мірных жыхароў нагадаў помнік вязням Камянецкага гета ў в. Дараганава Магілёўскай вобласці, а таксама мемарыяльная дошка памяці загінуўшых пацыентаў Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы. У 2010 г. быў адкрыты помнік закатаваным яўрэям у г. Глуску і мемарыяльная дошка памяці падпольшчыкаў мінскага гета ў сталіцы.

Узбагачэнне гарадской прасторы адбываецца праз правядзенне скульптурных пленэраў. Працы, створаныя падчас іх правядзення, заставаліся ў горадзе, які прымаў пленэр. Самыя значныя з іх – І Міжнародны скульптурны пленэр імя А. Анікейчыка ў Мінску (1998), пленэры ў Салігорску (1999) і Гомелі (2000, 2001) [153, с. 6]. Звычайна для пленэра выбіраецца якая-небудзь тэма і матэрыял, з якім працуе скульптар. У 1999 г. падчас І Рэспубліканскага пленэра па скульптуры матэрыялам быў абраны вапняк, у 2001 г. – дрэва. Тэма пленэра, які праходзіў у Гомелі, называлася «У свеце казак». Працы, створаныя 10 беларускімі скульптарамі і Я. Кісліцкім (Швецыя), упрыгожылі гэты абласны цэнтр [84].

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

У лістападзе 2007 г. у Палацы мастацтваў (г. Мінск) прайшла рэспубліканская мастацкая выстаўка «Манументальнае мастацтва Беларусі». На ёй былі прадстаўлены матэрыялы па найбольш значных манументальных аб'ектах, створаных за апошняе 20-годдзе, а таксама творы мастакоў секцыі манументальнага мастацтва Беларускага саюза мастакоў. Экспертная камісія выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва вызначыла 15 твораў мастакоў з гэтай выстаўкі, якія музеі пажадалі набыць у свае фонды.

У другой палове 1990-х гг. значна аслабеў дзяржаўны кантроль у справе ўстаноўкі ***манументальнай скульптуры***, што часам прыводзіла да з'яўлення ў гарадах твораў, якія мелі недастаткова высокі мастацкі ўзровень. Мясцовыя ўлады і грамадскія арганізацыі мелі больш магчымасцей фінансаваць устаноўку помнікаў, чым цэнтральныя ўлады. Таму часам яны дзейнічалі ў абыход Міністэрства культуры і Саюза мастакоў, працуючы на прамую са скульптрам. 6 верасня 2000 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіў «Палажэнне аб парадку праектавання, стварэння (будаўніцтва), рэканструкцыі і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», якое было распрацавана Міністэрствам культуры. Кантроль за ўзвядзеннем помнікаў быў ускладзены на прафесіяналаў [153, с. 6].

Адпаведна дадзенай пастанове мемарыяльныя ансамблі, манументы і помнікі агульнарэспубліканскага значэння, помнікі, помнікі-бюсты і надмогільныя помнікі вядомым асобам павінны былі стварацца на падставе рашэнняў аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

З мэтай удасканалення парадку ўвекавечання памяці вядомых дзеячаў і гістарычных падзей сродкамі манументальнага мастацтва ў 2000 г. быў створаны Рэспубліканскі мастацка-экспертны савет па манументальным мастацтве. Яго задачай было ўсебаковае абмеркаванне праблем развіцця манументальнага мастацтва ў краіне, выпрацоўка практычных рэкамендацый і разгляд канкрэтных пытанняў, звязаных з праектаваннем помнікаў, манументаў, мемарыяльных дошак і іншых твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Пры разглядзе праектаў аўтарам даваліся канкрэтныя рэкамендацыі па ўдасканаленні вобразна-пластычнай трактоўкі, архітэктурнай прывязцы, добраўпарадкаванні прылеглай тэрыторыі [439, спр. 742, арк. 181–183].

Аднак і ў наступныя гады мясцовыя органы дапускалі парушэнні ў выкананні дадзенага палажэння. Аб гэтым вёў гаворку міністр культуры У. Матвейчук на выніковай калегіі ў студзені 2008 г.: «Сярод праблем манументальнага мастацтва сёння дакладна вызначылася адна – законнасць устаноўкі аб'ектаў манументальнага мастацтва, няведанне, а мабыць, і нежаданне мясцовага кіраўніцтва своечасова ўзгадняць пытанні праектавання, экспертнага суправаджэння і дзяржаўнай прыёмкі твораў манументалістыкі з Міністэрствам культуры і Рэспубліканскім мастацка-экспертным саветам. Сёння ў рэгіёнах назіраецца шэраг парушэнняў заканадаўства ў гэтай сферы. У Віцебскай вобласці скульптурная кампазіцыя-помнік К. Тызенгаузу (Паставы) устаноў-



РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

лена без дазволу выканаўчых органаў улады, яе эскізны праект не разглядаўся экспертным саветам. Гэткая ж сітуацыя – і на Гомельшчыне з мемарыяльным комплексам «Памяць» (Добруш), помнікамі-бюстамі П. Батаву і Героям Савецкага Саюза – ураджэнцам Лоеўскага раёна (Лоеў)» [794, с. 3].

На гэтай жа галегіі намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення, начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь І. Дрыга звяртала ўвагу і на іншыя праблемы: «Істотна зменшылася практыка правядзення адкрытых рэспубліканскіх конкурсаў на праекты буйных твораў манументальнага мастацтва. Сёння ладзяцца пераважна бліц-конкурсы, вельмі часта фармальныя, «падагнаныя» пад канкрэтнае гатовае рашэнне. Такая акалічнасць не спрыяе развіццю канкурэнтнага асяродку і не дае магчымасці выбраць сапраўды найлепшы праект. Таму найбуйнейшым ініцыятывам у гэтай галіне павінна папярэднічаць аб'яўленне шырокага рэспубліканскага конкурсу... Неабходна ўзмацніць ролю Рэспубліканскага манументальнага савета, прызначанага ацэньваць мастацкую вартасць прапанаваных праектаў» [216, с. 4].

Згаданая праблема неаднаразова абмяркоўвалася і ў мастацкім асяроддзі. Старшыня секцыі скульптуры Беларускага саюза мастакоў У. Слабодчыкаў звяртаў увагу на тое, што стварэнне ў сталіцы цікавых класічных аб'ектаў, не аднапланавых, а розных як па форме, так і па змесце, – важнейшая задача на сённяшні дзень. На яго думку, «разнастайнасць пластычных падыходаў узбагаціць гарадское асяроддзе, паставіць нашу сталіцу ў шэраг буйнейшых цэнтраў еўрапейскай культуры» [721, с. 11].

З мэтай паляпшэння працэсу стварэння, рэканструкцыі і прыёмкі твораў манументальнага мастацтва ў 2008 г. Міністэрства культуры распрацавала новае «Палажэнне аб парадку стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» [33]. Згодна з пастановай, былі створаны абласныя і Мінскі гарадскі экспертныя саветы, якія разглядалі і давалі заключэнні аб манументальных творах, што ўстанаўліваліся на тэрыторыі іх вобласці. Помнікі, што ўстанаўліваліся ў абласных цэнтрах і г. Мінску, падлягалі экспертызе Рэспубліканскага мастацка-экспертнага савета па манументальным мастацтве.

У мэтах далейшага развіцця манументальнага мастацтва ў 2009 г. была распрацавана канцэпцыя манументальна-гістарычнай прапаганды Рэспублікі Беларусь, у якой сродкамі манументальнай пластыкі прапанавана ўшанаваць памяць вядомых гістарычных дзеячаў і найбольш адметных гістарычных падзей дзяржаўнай і мясцовай значнасці ў вялікіх і малых гарадах Беларусі. У межах канцэпцыі быў прапанаваны праект плана стварэння манументальных аб'ектаў на 2009–2012 гг. [103, с. 86–87].

Мастацкія пошукі новай пластычнай і вобразнай выразнасці найбольш закранулі ***станковую скульптуру***. Вялікую ўвагу скульптары надавалі рэлігійнай тэматыцы. Асноўным заказчыкам твораў на хрысціянскія тэмы з'яўлялася каталіцкая царква. Такія творы, як «Іаан Хрысціцель», «Архангел Міхаіл»,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Зняцце з крыжа», «Распяцце» і іншыя скульптара А. Шомава, «Пакаянне», «Галгофа», «Жонкі-міраносіцы» Н. Апіёк, творы У. Ламейкі, У. Панцялеева, У. Слабодчыкава, А. Мятліцкага, А. Фінскага носяць рысы адраджэння старажытных традыцый увасаблення біблейскіх сюжэтаў.

Скульптары не ў меншай ступені, чым жывапісцы і графікі, былі арыентаваны на заходні мастацкі рынак. Скульптурная пластыка апынулася пад моцным уплывам рынку. Жаданне мастакоў не толькі выстаўляць свае творы, але і прадаваць іх вяло да вузкай спецыялізацыі ў пэўным жанры – анімалістыка, партрэт, свабодная пластыка [236, с. 373].

У цэлым, на думку В. І. Жука, «сучасная станкавая скульптура не толькі больш разнастайная паводле тэматыкі, пластычных і кампазіцыйных вырашэнняў за манументальную, але і дэманстрыруе асаблівае жыццё пластычнай формы, а не яго пасіўную імітацыю» [237, с. 332–334].

Падзеяй у мастацкім жыцці Беларусі навейшага часу стала правядзенне ў верасні 2008 г. Першага Беларускага біенале жывапісу, графікі і скульптуры, на якім былі прадстаўлены 240 твораў 164 маладых і знакамітых беларускіх творцаў [198]. Напярэдадні XX з’езда Беларускага саюза мастакоў у снежні 2010 г. адбылося Другое Беларускае біенале.

### *5.2.3. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*

Крызіс пачатку 1990-х гг. адмоўна адбіўся на дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Ліквідацыя Мастацкага фонду Беларусі, а з ім і дзяржзаказу прывялі да значнага скарачэння творцаў, якія працавалі ў гэтай сферы. Адным з нешматлікіх напрамкаў прымянення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва стала аздабленне аб’ектаў грамадскага прызначэння. Яскравым прыкладам комплекснага падыходу ў афармленні з’яўляецца інтэр’ер Палаца Рэспублікі, які аздоблены габеленамі-заслонамі В. Грыдзіна, Г. Крываблоцкай, В. Маркавец-Бартлавай і інш. [710, с. 667].

Новыя ўмовы існавання прымусілі творцаў шукаць новыя пластычныя рашэнні. Узоры з керамікі і мастацкага шкла сталі вызначацца шырынёй тэматыкі, шматфукцыянальнасцю. Арыентацыя на эстэтыку, задавальненне мастацкіх густаў спажыўца прывяла да спалучэння сродкаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з набыткамі дызайну, скульптуры, архітэктуры і інш. [710, с. 667].

Творчыя эксперыменты з рознымі тэхнікамі, пошукі ў галіне формаўтварэння, пластыкі, вобразнасці вызначаюць керамічныя кампазіцыі В. Калтыгіна, Т. Кіршчынай, М. Кляцкова, Т. Сакаловай, шкляную пластыку У. Мурахвера і інш. [710, с. 667].

Разнастайнасцю тэматыкі і творчых пошукаў, эксперыментамі ў галіне тэхналогіі, структуры і фактуры тканін вызначаўся габелен. Найбольш значным творам з’яўляецца манументальны «Габелен стагоддзя» А. Кішчанкі (1995), афіцыйна прызнаны самым вялікім габеленам свету (14x19 м). На габелене размешчаны выявы 80 вядомых палітыкаў і дзеячаў культуры XX ст. Ён быў уручную вытканы на Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Кішчанка – аўтар габелена «Чарнобыль» (1995), які знаходзіўся ў будынку ААН у Нью-Ёрку.

Як своеасаблівая рэакцыя на ўсеагульнае захапленне манументальна-дэкаратыўнымі творамі з іх непрыдатнасцю да камернага жылога інтэр’ера заявіў пра сябе міні-габелен (творы В. Грыдзінай, Г. Крываблоцкай).

Пачынаючы з другой паловы 1990-х гг. пытанням выяўленчага, манументальнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтваў надавалася значная ўвага ў распрацаваных Міністэрствам культуры перспектыўных праграмах развіцця культуры.

У 1996 г. Міністэрства культуры распрацавала «Прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнай культурнай палітыкі на 1997–2000 гг.» для першачарговага фінансавання. Гарантавалася штогадовае правядзенне рэспубліканскіх мастацкіх выстаў з конкурсным падыходам да фарміравання іх экспазіцый. Важная роля адводзілася праектаванню помнікаў дзеячам гісторыі, культуры, навукі і значным гістарычным падзеям. З’яўленне гэтага дакумента спрыяла больш асэнсаванаму планаванню дзейнасці дзяржавы ў напрамку стварэння помнікаў, мэтанакіраванаму выдзяленню сродкаў з агульнадзяржаўных і мясцовых крыніц фінансавання.

Дзяржаўная праграма «Функцыяніраванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года» звяртала ўвагу на неабходнасць вывучэння ўзаемаадносін дзяржавы і мастацтва з улікам вопыту іншых краін, наладжванне кантактаў з еўрапейскімі і ўсходнімі мастацкімі рынкамі, набліжэнне мастацтва да спажыўца, абуджэнне эканамічнай зацікаўленасці творцаў і канкурэнцыю паміж імі.

У дакуменце адзначалася неабходнасць клопату аб эстэтычнай і мастацкай вартасці твораў, удасканаленне сістэмы мэтанакіраванай фінасавай і арганізацыйнай падтрымкі ўсіх відаў выяўленчага і дэкарытыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну і павышэнне сацыяльнага статусу мастака.

У якасці прыярытэту называлася ўдасканаленне сацыяльна-культурнай інфраструктуры для паспяховага развіцця як дзяржаўных, так і недзяржаўных форм падтрымкі выяўленчага і дэкарытыўна-прыкладнога мастацтва, дызайну. У якасці першачарговых мер называлася будаўніцтва новых майстэрняў, умацаванне навучальнай і вытворчай базы вышэйшых і сярэдніх спецыяльных устаноў у сферы выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Распрацоўшчыкі праграмы рабілі акцэнт на неабходнасці удасканалення і развіцця сістэмы грантаў для мастакоў і спецыяльных стыпендый для творчай моладзі, падтрымку выставачнай дзейнасці. Дапамогі патрабавала кніжная графіка, плакат, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Асаблівай увагі заслугоўвала распаўсюджанне «візуальнай» культуры сярод шырокіх колаў насельніцтва. У гэтых мэтах адзначалася неабходнасць працягу працы над стварэннем сеткі мастацкіх галерэй, філіялаў музеяў у населеных пунктах рэспублікі [208, с. 35].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Галіновая праграма «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.» у сферы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і дызайну сярод асноўных мэт палітыкі дзяржавы назвала павышэнне ўзроўню дзяржаўнага заказу на стварэнне твораў мастацтва, стварэнне і рэалізацыю адзінай канцэпцыі фарміравання і прапаганды агульнанацыянальнай калекцыі выяўленчага мастацтва Беларусі, стварэнне і рэалізацыю сістэмы стымулявання творчасці маладых мастакоў, скульптараў, дызайнераў праз арганізацыю і правядзенне міжнародных пленэраў, выставак і іншых міжнародных праектаў [168, с. 12].

Такім чынам, беларускае мастацтва ў разгледжаны перыяд узбагацілася мноствам новых твораў, тэм і вобразаў. Выхавалася новае пакаленне мастакоў і скульптараў, якія інакш глядзелі на навакольны свет і па-новаму ўвасаблялі яго ў сваіх працах. Шмат новых помнікаў з’явілася на вуліцах беларускіх гарадоў, большасць з іх прысвечана знакамітым асобам гісторыі і культуры, дзейнасць якіх атрымала належную ацэнку. Як станоўчы момант неабходна адзначыць з’яўленне на Беларусі прыватных і грамадскіх галерэй.

Мастацтва адлюстроўвала ўсе плыні і напрамкі, якія існавалі ў свеце. Дэмакратызацыя жыцця і атрыманне краінай незалежнасці спрыяльна паўплывалі на скульптуру і жывапіс. Адначасова мэнавіта сродкамі манументальнага мастацтва вялося патрыятычнае выхаванне, падкрэслівалася нацыянальная самабытнасць беларускай культуры і гісторыі.

Нават пры абмежаваных фінансавых магчымасцях дзяржава актыўна садзейнічала развіццю беларускага жывапісу і скульптуры. Міністэрствам культуры ў супрацоўніцтве з Саюзам мастакоў рэгулярна праводзіліся конкурсы на стварэнне твораў жывапісу, скульптуры, прыкладнага мастацтва. У абласных музеях адкрываліся мастацкія аддзелы, у 1997 г. з’явіўся музей Сучаснага выяўленчага мастацтва, калекцыю якога склалі творы апошняй чвэрці XX ст. Спробай актывізацыі мастацкага жыцця краіны можна лічыць практыку правядзення  пленэраў у розных мясцінах Беларусі. Міністэрства культуры і рэгіянальныя ўлады прымалі ўдзел у арганізацыі і фінансаванні большасці гэтых мерапрыемстваў. Творы, якія з’ўляліся падчас правядзення пленэраў у гонар М. Шагала, Н. Орды, П. Мясленікава, часцей за ўсё траплялі ў калекцыі мясцовых мастацкіх музеяў. Праводзілі свае пленэры і творчыя суполкі без удзелу Міністэрства, што сведчыць аб разнастайнасці формаў арганізацыі мастацкага жыцця Беларусі ў гэты перыяд.

У краіне склалася ўстойлівая сістэма дзяржаўнай падтрымкі мастацтва. З 1996 г. дзейнічае спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Адным з прыярытэтных напрамкаў стала фарміраванне музейнага фонду шляхам здзяйснення дзяржаўнага заказу і набыцця новых твораў беларускіх аўтараў.

Побач з гэтым у вывучаемы перыяд у сферы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і манументальнага мастацтва існаваў шэраг праблем. Да іх адно-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сяцца: адсутнасць шырокай тэарэтычнай дыскусіі па праблемах сучаснага мастацтва, адсутнасць развітай сістэмы абменных выставак, недастатковая праца з маладымі кадрамі, удасканаленне сістэмы фарміравання калекцый сучаснага выяўленчага мастацтва, фарміраванне ў насельніцтва мастацкага густу, неразвітасць арт-рынку, сацыяльная неабароненасць творцаў.

### 5.3. Музычнае мастацтва

Музычнае мастацтва, як і іншыя сферы культуры, адчула на сабе новыя эканамічныя ўмовы першых гадоў існавання незалежнай дзяржавы. Адной з адмоўных праяў гэтага працэсу было скарачэнне колькасці канцэртаў, якія праводзілі беларускія прафесійныя музычныя калектывы. У параўнанні з 1990 г. у 1994 г. гэты паказчык паменшыўся на 7377, а ў 1998 г. знізіўся яшчэ на 520 мерапрыемстваў [752, с. 16]. У 1990-я гг. назіраліся некаторыя новыя тэндэнцыі развіцця музычнага мастацтва, якія былі характэрны беларускай культуры ў цэлым. У першую чаргу неабходна назваць рэарганізацыю музычных аб'яднанняў, стварэнне новых творчых калектываў, з'ўленне музычных фестываляў. Ідэя стварэння новых традыцый у музычным жыцці належала прафесійным (часцей за ўсё дзяржаўным) калектывам, якія самастойна шукалі фінансаванне пад свае мерапрыемствы і выпрацоўвалі іх канцэпцыі.

Дзяржаўная праграма «*Функцыяніраванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года*» адзначала адну з галоўных задач, якая на той час стаяла перад дзяржавай і грамадствам, – захаванне і далейшае развіццё выдатных традыцый айчыннай кампазітарскай, музычна-выканальніцкай і балетнай школ, якія былі сфарміраваны ў мінулыя гады. Патрабавала вырашэння праблема развіцця айчыннага шоу-бізнесу, прапаганда нацыянальнай эстраднай творчасці [208, с. 34].

Мэты, якія ўтрымліваліся ў *Галіновай праграме «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.»*, насілі больш прагматычны характар: «захаванне шматжанравасці музычнага мастацтва, развіццё ўсіх тыпаў творчых калектываў і форм канцэртнага абслугоўвання; пашырэнне колькасці творчых калектываў, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай сферы, на 10–15 %; павелічэнне колькасці слухачоў у цэлым на 25 %; стварэнне на базе дзяржаўных канцэртных арганізацый прадзюсарскіх цэнтраў, эстрадных калектываў; павелічэнне колькасці эстрадных канцэртаў, якія будуць праводзіцца па лініі дзяржаўных канцэртных арганізацый, на 200–250 %; павышэнне арганізацыйнага і змястоўнага ўзроўню музычных фестываляў прафесійнага мастацтва, стварэнне на іх базе турыстычных праграм, прыцягненне максімальна шырокага кола міжнароднай грамадскасці» [168, с. 40–41].

Развіццё беларускага музычнага мастацтва садзейнічала стварэнню ***новых твораў*** буйной формы, значна ўзрасла папулярнасць сімфанічных жанраў. У гэты перыяд Міністэрства культуры абвясціла конкурс на стварэнне лепшага твора да юбілею Ф. Скарыны, у выніку чаго з'явіліся такія творы, як сімфоніі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У. Дарохіна «Францыск Скарына: жыццё і бессмяротнасць», «Lux aeterna» («Вечнае святло») Я. Паплаўскага, містэрыя «Францыск» для баса і аркестра А. Літвіноўскага і інш. Зразумела, што кампазітараў хвалявалі тыя ж самыя тэмы, што і пісьменнікаў, мастакоў, дзеячаў тэатральнага мастацтва: асэнсаванне сталінскіх рэпрэсій (8-я сімфонія «Памяці ахвяраў сталінізму» Ф. Пыталева, 4-я сімфонія «Курапаты» К. Цесакова), чарнобыльская трагедыя (10-я сімфонія «Чорная быль» Ф. Пыталева, «Цэзій-137» В. Кузняцова). Па-новаму асэнсоўваліся і перапрацоўваліся авангардысцкія ўплывы заходняй культуры, што адлюстравалася ў творы «Супрэматызм» Н. Голубевай і інш. [131].

У гэты перыяд абнаўляльную ролю адыгрывалі прадстаўнікі новай кампазітарскай генерацыі – В. Капыцько, У. Каральчук, В. Кузняцоў, А. Літвіноўскі, Д. Лыбін, Я. Паплаўскі, Л. Сімаковіч, А. Хадоска і інш. Працягвалася пашырэнне вобразна-паэтычнага дыяпазону беларускай музыкі. Яна ўзбагацілася літургічнымі жанрамі, музычнай сімволікай знаменных спеваў, харалам. Найбольш яскрава гэта адлюстравалася ў вакальна-сімфанічнай і харавой музыцы. Гэта харавыя кантаты, усяночныя, канцэрты і мініяцюры А. Бандарэнкі, А. Безансон, А. Літвіноўскага, Я. Паплаўскага, Л. Шлег, А. Хадоскі. Адраджаецца жанр імшы: «Грыгарыянская імша» А. Літвіноўскага, «Меса ў гонар святога Францыска Асізскага» В. Капыцько, «Нясвіжская імша» Ф. Шымкевіча і А. Залётнева.

Ідэі нацыянальнага адраджэння стымулявалі цікавасць да гістарычнага мінулага. Падзеяй у нацыянальнай культуры 1990-х гг. стала пастаноўка балета «Жарсці» («Рагнеда») А. Мдзівані, аднаактнага балета «Кругаверць» А. Залётнева па матывах беларускіх народных балад; «Спеваў даўнейшых ліцвінаў» В. Кузняцова (на тэксты Я. Чачота), кантаты «Куранты» В. Капыцько (па матэрыялах ананімнага зборніка XVII ст.).

Шмат твораў набывала дзяржава па дзяржзаказе. Напрыклад, толькі ў 2007 г. было набыта больш за 200 твораў беларускіх кампазітараў розных жанраў. Сярод іх: сімфонія «Касмічная» С. Бельцюкова, канцэрт для скрыпкі з сімфанічным аркестрам Д. Лыбіна, сімфонія-канцэрт для фартэпіяна з сімфанічным аркестрам Ф. Пыталева, інструментальныя і вакальна-інструментальныя творы Г. Гарэлавай, В. Кузняцова, В. Карэтнікава, А. Безансон, А. Кароткінай, Я. Паплаўскага, новы цыкл песен І. Лучанка, эстрадныя шлягеры А. Елісеенкава, М. Сацуры, А. Атрашкевіч, Л. Захлеўнага, Э. Зарыцкага і інш. [112, с. 64].

У 2009 г. па дзяржаўным заказе было набыта звыш 170 арыгінальных твораў беларускіх кампазітараў, а таксама аранжыровак і аркестровак для нацыянальных і акадэмічных калектываў. Сярод іх сімфонія-балет «Кароль Лір» С. Бельцакова, сімфонія «Амаркорд» С. Янковіча, канцэрты для цымбал з аркестрам В. Кузняцова, для аргана з аркестрам В. Падгайскай, квартэт № 2 Г. Гарэлавай, інструментальныя творы У. Курьяна, М. Літвіна, А. Безансона і інш. [81, т. 1, арк. 61].

Сярод ***прафесійных музычных калектываў*** разнастайнасцю дзейнасці вызначаўся створаны ў 1987 г. Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі, які



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзначальваў М. Фінберг. Гэты творчы калектыў вельмі актыўна папулярызаваў беларускае старадаўняе і сучаснае мастацтва, з'яўляўся ініцыятарам, арганізатарам і актыўным удзельнікам многіх музычных фестываляў і імпрэз, сярод якіх «Маладзечна», «Музы Нясвіжа» і джазавы. Менавіта ў выкананні гэтага аркестра ўпершыню прагучалі большасць новых твораў беларускіх кампазітараў. М. Фінберг у 1994 г. атрымаў званне народнага артыста Беларусі [81, т. 1, арк. 433]. За высокае выканальніцкае майстэрства, значны ўклад у развіццё беларускага мастацтва калектыву аркестра ў 1998 г. было прысвоена званне «заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь», а ў 2005 г. першаму ў краіне быў нададзены статус «нацыянальны» [123, с. 12]. У структуру Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі ўваходзілі Біг-бэнд, ансамбль трубачоў «Інтрада», Камерны аркестр, Актэт драўляных духавых інструментаў [133]. Творчае крэда аркестра, на думку яго кіраўніка М. Фінберга, – «нацыянальная аснова нашай творчай дзейнасці, праца над нацыянальным музычным матэрыялам… Мы заўсёды адштурхоўваліся ад беларускай нацыянальнай паэзіі, прычым пераважна класічнай…» [143]. Аркестр выконваў творы беларускіх кампазітараў буйных формаў, як класікаў, так і сучасных.

Працэс стварэння новых музычных калектываў у вывучаемы перыяд ішоў па двух шляхах: непасрэднае ўтварэнне прафесійнага калектыву праз набор прафесійных музыкантаў, другі – наданне афіцыйнага прафесійнага статусу аматарскаму калектыву, які меў высокія творчыя дасягненні. Прыкладам другога варыянта стварэння калектыву можа служыць Камерны канцэртны аркестр народных інструментаў Рэспублікі Беларусь, загад аб стварэнні якога быў падпісаны міністрам культуры ў канцы 1997 г. Гэты калектыў пад назвай «Менск» з'явіўся на пачатку 1990-х гг. на базе самадзейнага аркестра народных інструментаў Беларускай політэхнічнай акадэміі, куды ўліліся прафесійныя музыканты. Паступова калектыў набыў папулярнасць, шмат гастраляваў. 7 мая 1998 г. канцэртам у зале Белдзяржфілармоніі адбылася прэзентацыя калектыву ўжо ў новым статусе. Фінансаванне дзейнасці аркестра не мела адной сталай крыніцы. Каля пяці гадоў гэты калектыў падтрымліваў кіраўнік «Мінскпрамбанка» Я. Краўцоў, які не толькі плаціў зарплату музыкантам, але і падарыў ім сцэнічныя касцюмы. Дзякуючы гэтай падтрымцы калектыў змог выстаяць у складаных эканамічных умовах [772].

Часам развіццё творчага калектыву прыводзіла да таго, што на яго базе ствараліся вялікія творчыя аб'яднанні. Прыкладам можа служыць нацыянальнае тэатральна-канцэртнае аб'яднанне «Беларуская капэла», якое ў 1992 г. было ўтворана на базе аднайменнага музычнага калектыву. Мэтай яго стварэння стала адраджэнне нацыянальнай старажытнай музычнай культуры, даследаванне і ўключэнне ў культурнае жыццё музычнай спадчыны, прапаганда сучаснай музыкі беларускіх кампазітараў. Стваральнікі тэатральна-канцэртнага аб'яднання зыходзілі з думкі, што ў мінулым Беларусь была асяродкам еўрапейскай музычнай культуры і неабходна адрадзіць гэтыя традыцыі. Дзейнасць «Беларускай капэлы» садзейнічала з'яўленню тэатральных і кан-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэртных твораў на музыку старажытных беларускіх кампазітараў: аднаактовага балета кампазітара В. Кузняцова па творах Агінскага (1995) і пастаноўка на сцэне опернага тэатра оперы «Фаўст» А. Радзівіла (1999) [787, с. 109–110].

У студзені 1994 г. «Беларуская капэла» стала арганізатарам новай музычнай імпрэзы пад назвай «Каляды ў "Беларускай капэле"», у рамках якой тры вечары запар гучала музыка кампазітараў беларускага замежжа: М. Куліковіча-Шчаглова, М. Равенскага, Р. Самохіна, Э. Зубковіч, Я. Тарасевіча, Д. Верасава, І. Мацiеўскага. Гэтыя кампазітары, нават жывучы за мяжой, пісалі творы на вершы беларускіх паэтаў, прапагандавалі беларускі фальклор, вывучалі яго [676]. За перыяд свайго існавання Нацыянальнае тэатральна-канцэртнае аб'яднанне «Беларуская капэла» актыўна паўплывала на ўзбагачэнне рэпертуару многіх прафесійных музычных калектываў творамі старажытнай і сучаснай беларускай музыкі, праводзіла сваю палітыку актывізацыі культурнага жыцця краіны ў нацыянальным рэчышчы, надала адметнасць творчасці многіх калектываў, садзейнічала папулярызацыі беларускай камернай і сімфанічнай музыкі ў слухача. Другі аспект дзейнасці капэлы – выдавецтва нот, даследаванні ў галіне гісторыі музыкі, адраджэнне старажытнай музычнай спадчыны [637].

У верасні 2003 г. «Беларуская капэла» ўвайшла ў склад Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы Рэспублікі Беларусь.

У 1992 г. сфарміраваўся Канцэртны сімфанічны аркестр Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі «Маладая Беларусь» (дырыжор – М. Козінец). З 1995 г. пачынае сваю гісторыю ансамбль «Сімфаніетта» пры Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь [637].

У рэпертуары калектываў, ансамбляў і салістаў з'явіліся творы старажытнай музыкі і найноўшых напрамкаў XX ст., шырока выконваліся творы беларускіх кампазітараў, былі ўзноўлены невядомыя ці забытыя старонкі музычнай творчасці кампазітараў мінулых стагоддзяў. Важнейшай тэндэнцыяй стала пашырэнне жанравай сферы і павышэнне тэхнічнага майстэрства музыкантаў. Напрыклад, у рэпертуар Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча арганічна ўвайшла духоўная музыка, традыцыйныя беларускія абрады, звязаныя са сцэнічным рашэннем канцэртных праграм. Народны аркестр хору стаў выконваць сімфоніі і эстрадныя песні, а акадэмічны сімфанічны аркестр – канцэртныя оперы і балет [123, с. 13, 14].

На пачатак 2008 г. у сістэме Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь знаходзілася 77 пастаянных прафесійных калектываў. Самую вялікую колькасць з іх утрымлівалі Дзяржаўнае аб'яднанне «Белканцэрт» (24 калектывы), Беларуская дзяржаўная філармонія (13), Магілёўская абласная філармонія (11) [753, с. 17]. Значная работа па канцэртным абслугоўванні насельніцтва праводзілася абласнымі філармоніямі, аднак назіраліся пэўныя праблемы. Аб гэтым на калегіі Міністэрства культуры па выніках 2007 г. гаварыла дырэктар дзяржаўнай канцэртнай установы «Віцебская абласная філармонія»: «Сёння – хочам таго альбо не – мы абавязаны арыентавацца на рэальны попыт і залежым ад яго, у першую чаргу ў плане выканання аб'ёму платных паслуг. Аднак



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кан’юнктурная арыентацыя небяспечная, бо пагражае спыненнем узнаўлення цэлага культурнага пласта. Застануцца толькі тыя артысты, якія лёгка “прадаюцца”, і творы, што маюць мала агульнага з мастацтвам. У канцэртных праграмах не часта з’яўляюцца малавядомыя творы, сучасная музыка, выканаўцы-пачаткоўцы. На змену слухацкай аўдыторыі мінулых дзесяцігоддзяў прыйшло маладое пакаленне, якое менш арыентуецца на сапраўдныя культурныя каштоўнасці і губляецца пад націскам піяру» [630].

Як ўжо адзначалася, у першай палове 1990-х гг. праходзіў працэс скарачэння колькасці канцэртаў і іх слухачоў, што адбывалася па эканамічных прычынах. За перыяд з 1991 па 1995 г. больш чым у 2 разы скарацілася колькасць наведванняў тэатраў і канцэртных устаноў краіны [367, с. 9]. У такіх умовах на Беларусі пашыраўся і набіраў папулярнасць ***конкурсна-фестывальны рух***.

Адзін з першых музычных фестываляў незалежнай Беларусі – «Адраджэнне беларускай капэлы», які ўпершыню адбыўся ў кастрычніку 1991 г. Ён быў арганізаваны саюзамі музычных і тэатральных дзеячаў і Белдзяржфілармоніяй. Мастацкім кіраўніком гэтага мерапрыемства быў В. Скарабагатаў. Асноўнай мэтай правядзення фестывалю з’яўлялася адраджэнне старажытных еўрапейскіх традыцый капэлы, пашыраных на тэрыторыі Беларусі ў XVII–XVIII стст. [837]. Аднак неабходна прызнаць, што магчымасць выконваць старажытную музыку з’явілася толькі тады, калі быў назапашаны нотны матэрыял у даследчыкаў, з’явіліся выканаўцы і ансамблі, здольныя выканаць гэтыя творы. Вывучэннем і выкананнем старажытнай музыкі займаліся ансамбль салістаў «Класік-Авангард» пад кіраўніцтвам У. Байдаева, камерны мужчынскі хор «Унія», камерны хор Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі пад кіраўніцтвам К. Насаева, ансамбль старадаўняй музыкі «Кантабіле» і многія іншыя.

Традыцыяй стала штогадовая накіраванасць мерапрыемства на пэўны музычны напрамак ці творчасць кампазітара. На першым фестывалі гучала музыка эпох Барока і Класіцызму, на другім выконваліся галоўным чынам творы замежных аўтараў, творчасць якіх мела дачыненне да Беларусі, на трэцім фестывалі – сучасная камерная музыка. Адным з адкрыццяў IV фестывалю «Адраджэнне беларускай капэлы» былі фартэпіянныя творы Напалеона Орды, якія выконваў на сваім канцэрце І. Алоўнікаў. Н. Ордзе быў прысвечаны і XVI фестываль. Падчас іншых канцэртаў Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр выконваў творы М. Ельскага, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы разам з тым жа аркестрам – музыку В. Казлоўскага да трагедыі Озерава «Фінгал» [818]. Большасць з іх у савецкія часы былі невядомыя ў Беларусі і ў 1990-я гг. зноў былі ўключаны ў культурны ўжытак, іх творы пачалі выконвацца, гучаць, сталі вядомы беларускім музыкантам і слухачам.

Самым знакамітым з усіх беларускіх фестываляў у разглядаемы перыяд стаў «Славянскі базар». Ён даваў магчымасць бліжэй пазнаёміцца з мастацтвам розных народаў, і не толькі славянскіх. У сярэдзіне 1980-х гг. у Віцебску

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пабудавалі адзін з самых вялікіх у Еўропе (у ім размешчана 5 тыс. месцаў) летні амфітэатр. Гэты будынак быў створаны спецыяльна для фестывалю польскай песні. Менавіта гэты фестываль і лічыцца непасрэдным папярэднікам «Славянскага базару», які нарадзіўся ў 1992 г. У той час складана было ўявіць сабе яго далейшы лёс: з часу яго заснавання было шмат фінансавых цяжкасцей і гучных скандалаў. Аднак кожны год у Віцебск прыязджалі ўсё больш гасцей, таленавітых спевакоў і музыкантаў, даўно гэта з'ява выйшла за рамкі толькі музычнага фестывалю. За «Славянскім базарам» замацаваўся выраз «фестываль фестываляў».

Сфарміраваліся даволі трывалыя прынцыпы арганізацыі фестывальнай праграмы. Ён працягваецца каля тыдня, штогод праводзяцца нацыянальныя дні культуры Беларусі, Расіі, Украіны, якія заканчваюцца вялікім канцэртам майстроў мастацтва кожнай краіны. У снежні 1993 г. «Славянскі базар» быў прыняты ў міжнародную Федэрацыю Фестывальных Арганізацый (FIDOF), якая прызнала гэты фестываль лепшым у свеце за 2000 г. Галоўны стрыжань свята – конкурс маладых выканаўцаў, які збірае штогод прыкладна 15–20 маладых спевакоў.

У чэрвені 1993 г. упершыню прайшоў Фестываль беларускай песні і паэзіі ў г. Маладзечна, які стаў традыцыйным. Мэтай яго правядзення стала папулярызацыя беларускай музыкі і паэзіі, абуджэнне цікавасці да беларускай мовы і мастацтва. Арганізатарамі і ідэйнымі натхняльнікамі фестывалю сталі тагачасны мэр г. Маладзечна Г. Карпенка, мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Рэспублікі Беларусь М. Фінберг і галоўны рэдактар творчага аб'яднання музычных і забаўляльных праграм Дзяржтэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь Б. Бахціяраў. У арганізацыі фестывалю прынялі ўдзел Міністэрства культуры, Беларускі інстытут праблем культуры, Міжнародны фонд «Спадчына Чарнобыля», Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, газета «Рэспубліка». Яшчэ адна з мэт фестывалю – пошук новых таленавітых эстрадных выканаўцаў. Дзеля гэтага праводзіўся конкурс маладых выканаўцаў [392, с. 435].

У рамках музычнага фестывалю «Маладзечна» звычайна праводзіліся канцэрты лепшых музычных і харавых калектываў краіны, такіх як Дзяржаўны хор імя Г. Цітовіча, Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам М. Фінберга, Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр імя Жыновіча, выступалі папулярныя беларускія выканаўцы [297]. У канцэпцыі фестывалю «Маладзечна-98» з'явіліся новыя рысы: усе спевакі – і зоркі, і маладыя канкурсанты – выконвалі песні толькі ў рэжыме «жывога гуку» (гэту ідэю выказаў і падтрымліваў мастацкі кіраўнік фестывалю М. Фінберг). Другая асаблівасць – спалучэнне музыкі народнай, эстраднай і року. Галоўная ўмова ўдзелу выканаўцаў – усе творы, незалежна ад мастацкага напрамку, павінны былі гучаць па-беларуску [852]. У 2009 г. прайшоў дзясяты фестываль. Яго асаблівасцю было тое, што ён доўжыўся толькі адзін дзень (IX фестываль працягваўся 2 дні, а VIII – тры) [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1995 г. з’явіўся яшчэ адзін фестываль, прысвечаны адраджэнню музычнай спадчыны Беларусі, – старадаўняй беларускай інструментальнай музыкі «Музы Нясвіжа», ініцыятарам і ідэйным натхняльнікам якога быў М. Фінберг. У Беларусі на тыя часы гэта быў адзіны фестываль камернай музыкі, які праводзіўся ў невялікім раённым цэнтры. Фінансаванне фестывалю адбывалася за кошт Міністэрства культуры, абласных і мясцовых улад, спонсараў. Для кожнага фестывалю «Музы Нясвіжа» выбіралася якая-небудзь агульная тэма. У 1999 г. гэта была тэма «Музычныя сталіцы свету» [132]. Асноўнай тэмай фестывалю «Музы Нясвіжа» ў 2001 г. была музыка эпох Класіцызму і Рамантызму. [134] Тэма XV фестывалю (2010 г.) стала музыка Ф. Шапэна.

У гонар кампазітара С. Манюшкі з 2000 г. у г. Чэрвені пачалі праводзіць штогадовы музычны фестываль «Убельскія ластаўкі», на якім выконвалася музыка С. Манюшкі і класічныя оперныя творы. У праграме фестывалю быў конкурс маладых вакалістаў (18–23 гады).

Традыцыйнымі ў Полацку сталі міжнародны фестываль старадаўняй і сучаснай камернай музыкі і міжнародны фестываль арганнай музыкі «Званы Сафіі».

Па ініцыятыве Беларускай каталіцкай грамады і рымска-каталіцкай парафіі ў Магілёве з 1993 г. праводзіўся міжнародны фестываль хрысціянскай музыкі «Магутны Божа» з удзелам калектываў з Расіі, Польшчы, Украіны, Германіі, Францыі, Лацінскай Амерыкі, Нідэрландаў. Гэта свята фінансавалі ў асноўным недзяржаўныя арганізацыі, Міністэрства культуры матэрыяльна не падтрымлівала фестываль. Паступова ў арганізацыю фестывалю былі ўцягнуты ўлады г. Магілёва, існаваў фонд «Магутны Божа».

У конкурснай праграме ўдзельнічалі прафесійныя, прыходскія хоры, дзіцячыя і маладзёжныя ансамблі, індывідуальныя выканаўцы. Адной з умоў удзелу з’яўлялася абавязковае выкананне якога-небудзь беларускага твора (ноты канкурсанты атрымлівалі загадзя) [133]. Напрыклад, на конкурсе вакалістаў IX фестывалю (2003 г.) у 1-м туры абавязковым з’яўлялася выкананне псалма на словы Сімяона Полацкага, у 2-м – адной з малітваў С. Манюшкі [143]. На III фестывалі адбылася прэм’ера літургічных твораў сучасных беларускіх кампазітараў А. Залётнава і С. Бельцюкова ў выкананні камернага хору «Санорус» пад кіраўніцтвам А. Шута [64].

Пад патранажам Беларускага Экзархата ў Мінску рэгулярна праводзіўся міжнародны фестываль праваслаўных песнапенняў.

У лістападзе 1994 г. у Мінску быў праведзены Першы Міжнародны конкурс музыкантаў-выканаўцаў на духавых інструментах з дрэва (флейта, габой, кларнет і фагот). З 1995 г. раз на тры гады праводзіўся Міжнародны конкурс «Музыка надзеі» для музыкантаў-выканаўцаў на духавых і ўдарных інструментах па дзвюх узроставых групах (да 14 і да 16 гадоў). У 1999 г. адбыўся Першы Міжнародны конкурс камерных ансамбляў імя М. К. Агінскага (г. Смаргонь), у 2002 г. – Першы Міжнародны конкурс выканаўцаў на народных інструментах імя І. Жыновіча, у 2003 г. – Першы Міжнародны конкурс выканаўцаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на струнных смычковых інструментах імя М. Ельскага, у 2005 г. – Міжнародны конкурс піяністаў «Мінск–2005», у 2007 г. – Другі Міжнародны конкурс выканаўцаў на народных інструментах імя І. Жыновіча, у 2008 г. у Мінску праводзіліся V Адкрытыя маладзёжныя Дэльфійскія гульні дзяржаў – удзельніц СНД, у 2010 г. адбыўся Міжнародны конкурс піяністаў «Мінск – 2010» [123, с. 15].

Паслядоўнае ажыццяўленне ў сярэдзіне 1990-х гг. *Праграмы развіцця прафесійнага музычнага мастацтва* краіны паслужыла асновай стварэння айчынных творчых калектываў практычна ва ўсіх абласных філармоніях. Калі ў пачатку 1990-х гг. прафесійныя музычныя калектывы існавалі толькі ў г. Мінску, то ў 1996 г. ***канцэртнае абслугоўванне*** ажыццяўлялася больш чым 70 аркестрамі, ансамблямі і канцэртнымі брыгадамі абласных філармоній. У той час больш за 80 % канцэртаў у рэспубліцы праводзілася айчыннымі творчымі калектывамі і выканаўцамі. У мэтах актыўнага прыцягнення маладых эстрадных выканаўцаў у канцэртнае жыццё рэспублікі быў створаны Дзяржаўны маладзёжны тэатр эстрады [439, спр. 148, арк. 12].

Побач з гэтым калегія Міністэрства культуры ў 1997 г. канстатавала, што некаторыя канцэртныя арганізацыі недаацэньвалі сацыяльную ролю канцэртнага абслугоўвання насельніцтва, не выпрацоўвалі найбольш рацыянальныя формы культурнага абслугоўвання, што вяло да зніжэння паказчыкаў іх дзейнасці. У 1996 г. відавочнай была тэндэнцыя да скарачэння колькасці канцэртаў і глядацкай аўдыторыі, а таксама паказчыкаў колькасці наведванняў на 1 тыс. чалавек насельніцтва ніжэй сярэдніх па рэспубліцы ў Віцебскай, Брэсцкай і Гродзенскай абласцях. Недапушчальна нізкі, па меркаванні калегіі, быў сярэдні ўзровень колькасці гледачоў на адным канцэрце ў Мінску і Мінскай вобласці. Карэннага перагляду патрабавала праграма канцэртнага абслугоўвання сяла. У сувязі з гэтым бачылася мэтазгодным аднавіць правядзенне фестывалю «Майстры мастацтваў – працаўнікам сяла» на базе клубных устаноў культуры. Канстатавалася відавочнае зніжэнне ролі мастацкіх саветаў дзяржаўных калектываў у планаванні і арганізацыі рэпертуарна-гастрольнай дзейнасці творчых калектываў Белдзяржфілармоніі, Дзяржаўнага аб'яднання «Белканцэрт», некаторых абласных філармоній [439, спр. 148, арк. 13].

У многім недахопы канцэртнай справы ў рэспубліцы былі звязаны са стратай каардынуючай ролі галоўнай канцэртнай арганізацыі – Белдзяржфілармоніі. Калегія лічыла неабходным перагляд сістэмы дзяржаўнага заказу, яе сацыяльную накіраванасць, у першую чаргу з улікам інтарэсаў моладзі [439, спр. 148, арк. 13].

У другой палове 1990-х гг. у сістэме прадстаўлення паслуг ў сферы гастрольна-канцэртнай дзейнасці яскрава абазначыліся дзве катэгорыі суб'ектаў гаспадарання (дзяржаўныя і недзяржаўныя), якія былі ў стане прафесійна і якасна здзяйсняць гастрольна-канцэртную работу.

Да першай катэгорыі адносіліся: Беларуская дзяржаўная філармонія як галаўная канцэртна-гастрольная арганізацыя, абласныя філармоніі, тэатры і канцэртныя залы муніцыпальнага і рэспубліканскага падпарадкавання, Дзяр-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жаўнае аб’яднанне «Белканцэрт», гарнізонныя дамы афіцэраў і інш. У 2001 г. у складзе Белдзяржфілармоніі функцыянавала 12 творчых падраздзяленняў і калектываў. У тым ліку: Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр, Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Р. Шырмы, Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр імя Г. Жыновіча, Дзяржаўны камерны хор, ансамблі «Камерата», «Купалінка», «Класік-авангард». У дзяржаўным аб’яднанні «Белканцэрт» – 17. У тым ліку: ансамбль «Сябры», «Беларускія песняры», «Чараўніцы», «Палац», «Радзівіл-тэатр» і інш. [439, спр. 117, арк. 12].

Па меркаванні спецыялістаў Міністэрства культуры ў 1998 г. гэтыя арганізацыі мелі вялізны вопыт працы з гастралюючымі выканаўцамі, разгалінаваную інфраструктуру па арганізацыі гледача, правільным вядзенні білетнай гаспадаркі, падрыхтоўцы рэкламы, прыёме гастрольных калектываў з вялікай колькасцю ўдзельнікаў [439, спр. 226, арк. 184–185].

Да другой катэгорыі адносіліся прыватныя кампаніі. Найбольш значнай і актыўнай з іх было ААТ «Класс-клуб ДК». За 1997 г. яна правяла шэраг гастроляў выканаўцаў сусветнага ўзроўню: Д. Хварастоўскага, рок-гурту «Scorpions», групы «ДДТ» і інш. Спецыялісты Міністэрства культуры сярод добра зарэкамендаваўшых сябе фірм называлі «Дэльта-шоу тэатр спорту і песні А. Скарахода» (канцэрты груп «Дэльта», «Новы Іерусалім», «Army of Lovers» (Швецыя)), ААТ «Залатая пчала» (канцэрты груп «А-Студио», «На-на», К. Арбакайтэ, І. Панароўскай); ЗАТ «Меццо Форте» (канцэрты груп «Браво», «Лицей», «Ляпис Трубецкой», «Иванушки International», М. Жванецкага) [439, спр. 226, арк. 185].

Дадзеныя кампаніі характарызаваліся як маючыя неабходныя абаротныя сродкі і з неабходным вопытам гастрольна-канцэртнай работы. Як правіла, пры правядзенні буйных акцый яны прыбягалі да разавага дадатковага прыцягнення персаналу, абслугоўваючага гастролі. «Узровень праводзімых мерапрыемстваў дастаткова высокі, хаця часам сустракаюцца асобныя выпадкі неабгрунтаванага завышэння кошту білетаў і адмены загадзя запланаваных канцэртаў, што выклікае негатыўную рэакцыю некаторай часткі аўдыторыі», – адзначалі спецыялісты Міністэрства [439, спр. 226, арк. 185].

Як самая неаднародная і «рызыкоўная» група характарызаваліся прыватныя прадпрымальнікі-індывідуалы. Іх дзейнасць часта была дастаткова не падмацавана фінансава і разлічана на пакрыццё гастрольных выдаткаў у першую чаргу за кошт продажу білетаў. Яны абмяжоўваліся пракатам выканаўцаў, невялікіх эстрадных і цыркавых калектываў, загадзя разлічваючы на канцэртныя пляцоўкі ўмяшчальнасцю да 150–200 чалавек (рэстараны, дыскатэкі, начныя шоу, вар’етэ, клубы і інш.). Мерапрыемствы, якія праводзіліся дадзенай групай прадпрымальнікаў, часцей за іншых суправаджаліся скандаламі і выклікалі абгрунтаванае абурэнне гледачоў і выканаўцаў. Нярэдкімі былі выпадкі, калі непасрэдна перад канцэртам выканаўцу ўльтыматыўна даводзілі да ведама, што яго ганарар значна зніжаны з-за недастатковага ўзроўню рэа-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лізацыі білетаў, што выклікала заканамерную рэакцыю ў адказ. Міністэрству культуры былі вядомы выпадкі прамога падману публікі, калі анансаваўся адзін выканаўца, а на мерапрыемствы высвятлялася, што будзе выступаць іншы [439, спр. 226, арк. 185].

З мэтай упарадкавання гастрольна-канцэртнай дзейнасці ў ліпені 1998 г. было ўведзена ліцэнзаванне [495]. За выдачу ліцэнзіі неабходна было заплаціць 1000 мінімальных заробкаў, а за працяг ліцэнзіі – 500 мінімальных заробкаў [462]. Такі памер быў абумоўлены, на думку Міністэрства культуры, тым, што для суб'ектаў гаспадарання другой катэгорыі, якія мелі неабходны вопыт і ўстойлівую кан'юнктуру, заплаціць названую суму не ўяўляла вялікай складанасці. Акрамя гэтага, меркавалася, што такі памер платы за ліцэнзію «дазволіць аўтаматычна выбракаваць усе магчымыя "левыя" пракатныя фірмы, якія эпізадычна займаліся канцэртнай дзейнасцю, у асноўным нелегальна працуючых у сельскай мясцовасці, прыкрываючыся не існаваўшымі дазволамі дзяржаўных органаў» [439, спр. 226, арк. 185–186]. Ад абавязковага атрымання ліцэнзіі на ўсе віды гастрольна-канцэртнай дзейнасці вызвалялася Беларуская дзяржаўная філармонія і філармоніі абласнога падпарадкавання ў выпадку, калі яны займаліся асноўнай дзейнасцю ў адпаведнасці са сваімі статутамі.

Прынятыя меры не змянілі становішча з канцэртным абслугоўваннем. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь па выніках нарады з дзеячамі і работнікамі культуры 1 лютага 2001 г. вымушаны быў даць даручэнне палепшыць канцэртнае абслугоўванне насельніцтва краіны. У красавіку 2001 г. калегія Міністэрства культуры крытычна выказвалася аб дзейнасці дзяржаўных канцэртных устаноў: «арганізацыя канцэртнай дзейнасці не адпавядае сучасным патрабаванням духоўна-эстэтычнага выхавання насельніцтва рэспублікі, у першую чаргу моладзі і падрастаючага пакалення. Адсутнічае адзіная дзяржаўная палітыка канцэртных арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў, прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці. Рэспубліканскія канцэртныя арганізацыі – Беларуская дзяржаўная філармонія і Дзяржаўнае аб'яднанне «Белканцэрт» – практычна згубілі ролю каардынатара рэспубліканскіх цэнтраў канцэртнай дзейнасці, а таксама канкурэнтаздольнасць на рэспубліканскім і міжнародным музычных рынках» [439, спр. 117, арк. 10].

Асноўнымі нявырашанымі праблемамі з'яўляліся: бессістэмнасць прапаганды беларускага філарманічнага і эстраднага мастацтва, неканкурэнтаздольнасць рэспубліканскіх канцэртных арганізацый у правядзенні гастроляў замежных выканаўцаў на камерцыйнай аснове, адсутнасць планавання падрыхтоўкі і паўнавартаснага выкарыстання творчых дадзеных эстрадных выканаўцаў, у тым ліку творчай моладзі, у канцэртным абслугоўванні насельніцтва рэспублікі, у выніку чаго канцэртныя арганізацыі не выкарыстоўвалі магчымасці накіравання прыбытку ад канцэртнай дзейнасці на ўмацаванне матэрыяльнай базы філарманічных і эстрадных выканаўцаў і калектываў, на стварэнне афішы і рэкламу дасягненняў беларускага музычнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэта прыводзіла да зніжэння канкурэнтаздольнасці айчынных выканаўцаў і калектываў на міжнароднай арэне.

Калегія адзначала нізкую актыўнасць Дзяржаўнага аб'яднання «Белканцэрт». Асабістымі сіламі яно ў 2000 г. ажыццявіла толькі 272 канцэрта – у сярэднім на адзін калектыў 11,8 канцэртаў. Некаторыя калектывы толькі фармальна лічыліся ў дадзенай канцэртнай арганізацыі, праводзілі па 2–4 канцэрты ў год: калектыў А. Ісаева – 3, калектыў У. Ухцінскага – 4, група В. Вронскай – 1, ансамбль «Чараўніцы» – 3. Разам з тым адміністрацыйна-кіраўнічы апарат аб'яднання налічваў 21 чалавека, якія ўтрымліваліся за кошт адлічэнняў ад асноўнай дзейнасці арганізацыі [439, спр. 117, арк. 13].

У выніку калегія вымушана была канстатаваць, што асноўнымі пастаўшчыкамі на рэспубліканскі рынак канцэртных праграм сталі ТАА «Клас-клуб Джаз-крафт», УП «Віртуозы сцэны», ЗАТ «Альфа-радыё», ТАА «Пратэкінгандаль» і іншыя камерцыйныя структуры [439, спр. 117, арк. 13].

У 2002 г. ліцэнзаванне было заменена выдачай дазвольнага пасведчання на права правядзення гастрольнай дзейнасці [607]. Плата за выдачу пасведчання складала ад 1 % (для суб'ектаў гаспадарання, якія арганізоўвалі гастрольную дзейнасць беларускіх калектываў і выканаўцаў) да 3 % (гастролі замежных калектываў і выканаўцаў) ад агульнага кошту білетаў на кожнае мерапрыемства, якое праводзілася ў тэрмін, пазначаны ў пасведчанні [519]. Пазней памер аплаты быў прывязаны да колькасці месцаў у тэатральна-канцэртных залах і вызначаўся ў базавых велічынях. Пры гэтым існаваў паніжаючы каэфіцыент за выступленні артыстаў беларускай эстрады [520].

Але ўжо ў кастрычніку 2002 г. на калегіі Міністэрства культуры побач з некаторымі поспехамі звярталася ўвага на шэраг праблем. Гэта нізкая эфектыўнасць эканамічнай дзейнасці ўласных калектываў і салістаў, адсутнасць дакладна прадуманай сістэмы рэкламы дзейнасці філармоніі, малая колькасць ажыццёўленых самастойных камерцыйных праектаў. Цікава, што на думку спецыялістаў Міністэрства, некаторыя праблемы арганізацыі канцэртнага жыцця былі звязаны з адменай ліцэнзавання гастрольна-канцэртнай дзейнасці, якая і была ініцыявана Міністэрствам [439, спр. 117, арк. 13]. Выказвалася думка аб неабходнасці ўдасканалення палажэння аб парадку арганізацыі гастрольнай дзейнасці на тэрыторыі краіны, выдачы гастрольных пасведчанняў. Праблемай для Міністэрства культуры было рэзкае павелічэнне суб'ектаў канцэртнай дзейнасці, многія з якіх не валодалі неабходным вопытам, адукацыйным узроўнем для прафесійнай арганізацыі канцэртнай дзейнасці. Была практыка, калі асобныя клубныя ўстановы прымалі ў штат заезныя эстрадныя калектывы ў мэтах вызвалення іх ад аплаты за выдачу гастрольных пасведчанняў. Самым слабым звяном бачылася каардынацыя дзейнасці абласных філармоній і Белдзяржфілармоніі. Карэннага змянення патрабаваў прынцып распрацоўкі рэспубліканскага і абласнога планаў па канцэртным абслугоўванні насельніцтва рэспублікі [539, спр. 587, арк. 71–72].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2003 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь даручыў узмацніць ролю дзяржаўных канцэртных арганізацый у здзяйсненні гастрольна-канцэртнага абслугоўвання насельніцтва рэспублікі, актывізаваць іх гастрольна-канцэртнай дзейнасць. У нанава зацверджаным у верасні 2003 г. Пастановай Урада № 1190 Палажэнні аб парадку арганізацыі гастрольнай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь [479] былі прадугледжаны меры ўпарадкавання дзейнасці недзяржаўных суб'ектаў гаспадарання, у першую чаргу індывідуальных прадпрымальнікаў, а таксама льготы для дзяржаўных канцэртных арганізацый, якія самастойна арганізоўваюць канцэртную дзейнасць, у тым ліку камерцыйныя канцэрты.

Істотным змяненнем стала ўвядзенне для індывідуальных прадпрымальнікаў абмежавання на здзяйсненне канцэртнай дзейнасці. Яны маглі арганізоўваць канцэрты толькі ў залах, колькасць месцаў у якіх не перавышала 150. У новай рэдакцыі нарматыўнага прававога акта ўпершыню было дакладна вызначана кола арганізацый, якія вызваляліся ад аплаты за выдачу пасведчання:

дзяржаўныя тэатральна-відовішчныя арганізацыі, якія прымалі на сваіх плошчах гастралюючыя творчыя калектывы і выканаўцаў, пры ўмове, што ўсе разлікі, звязаныя з правядзеннем гастроляў, уключаючы выплату ганарараў, здзяйсняюцца тэатральна-відовішчнымі арганізацыямі, якія праводзяць мерапрыемства;

установы культуры і адукацыі, якія арганізоўвалі гастролі калектываў мастацкай самадзейнасці, што мелі званне «народны», «узорны» ці «заслужаны», і знаходзіліся ў іх структуры.

Ад атрымання пасведчання вызваляліся дзяржаўныя тэатральна-відовішчныя арганізацыі пры правядзенні канцэртаў, спектакляў і іншых культурна-відовішчных мерапрыемстваў сіламі ўласных творчых калектываў і выканаўцаў у сваіх памяшканнях і залах, дзяржаўныя стацыянарныя цыркі пры здзяйсненні сваёй статутнай дзейнасці, а таксама Белдзяржфілармонія пры арганізацыі канцэртаў гастралюючых калектываў у сваіх памяшканнях.

Прадугледжаныя меры, па меркаванні Міністэрства культуры, у пэўнай ступені перашкаджалі магчымасці ўхілення ад выплаты падаткаў прыватнымі структурамі і стваралі неабходныя ўмовы для дзяржаўных канцэртных арганізацый [439, спр. 733, арк. 165].

У даведцы па дадзеным пытанні адзначалася, што «мерапрыемствы, якія праводзяцца Міністэрствам культуры, накіраваны на стварэнне льготных умоў для беларускіх калектываў і выканаўцаў, упарадкаванне адносін з недзяржаўнымі структурамі, якія выконваюць гастрольна-канцэртную работу» [439, спр. 733, арк. 169].

Калі памер платы за выдачу пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства не змяніўся, то паніжаючыя каэфіцыенты былі перагледжаны. Максімальны паніжаючы каэфіцыент складаў 0,25 за выдачу пасведчання ва ўстановах дашкольнай і школьнай адукацыі, пазашкольнага выхавання. Паніжаючыя каэфіцыенты, акрамя гэтага, былі за-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цверджаны для дзяржаўных тэатральна-відовішчных арганізацый, якія карысталіся дзяржаўнымі датацыямі [518].

Першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь У. Рылатка адзначаў, што прыняцце Пастановы № 1190 было выклікана, перш за ўсё, неабходнасцю далейшага ўпарадкавання гастрольна-канцэртнай дзейнасці. Па-другое, неабходна было абараніць правы гледачоў, бо ў апошнія гады даволі распаўсюджаным стаў наўмысны падман-продаж білетаў на неіснуючыя праекты. Па новых правілах, перш чым правесці чарговы канцэрт, трэба было заплаціць не толькі за арэнду памяшкання, але і за спецыяльнае пасведчанне на канкрэтны канцэрт. Дзяржаўныя арганізацыі пры аплаце атрымлівалі паніжаючы каэфіцыент. Рашэнні па ўвядзенні гастрольных пасведчанняў пачалі прымацца мясцовымі ўладамі яшчэ ў 2001 г. Засноўваліся яны на Законе «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» [703].

На пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па выніках працы ў 2003 г. міністр культуры даў наступныя тлумачэнні прыняцця згаданай пастановы: «Прыняцце дадзенага нарматыўнага акта было складаным. Мы будзем працаваць над гэтай тэмай, але парадак навядзём усе разам, бо гэта садзейнічае бачнай актывізацыі гастрольна-канцэртнай работы дзяржаўных устаноў. *Неабходна стварыць самыя добразычлівыя ўмовы для работы дзяржаўных канцэртных арганізацый* [курсіў наш. – *Д. К.*]» [439, спр. 886, арк. 46].

Большасць асноўных прыватных прадзюсарскіх цэнтраў («Клас-Клуб ДК», «Альфа-Канцэрт», Малы тэатр, «Віртуозы сцэны», «Арт Мьюзік Сервіс») выказалі сваю незадаволенасць новымі правіламі. Яны звярталіся да намесніка старшыні пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве У. Крука з заявай, у якой прапаноўвалі браць працэнт не ад агульнага кошту білетаў, а ад кошту рэалізаваных. Дырэктар «Клас-Клуба ДК» Г. Шульман адзначаў, што з моманту ўвядзення новых правіл колькасць праведзеных культурна-асветных мерапрыемстваў зменшылася больш чым у 3 разы. Па яго меркаванні, гэта цягнула за сабой скарачэнне паступленняў у бюджэт падатковых плацяжоў, негатыўна ўздзейнічала на міждзяржаўны культурны абмен, на развіццё культуры наогул [825].

Пастанова № 1190 не прадзейнічала нават год. Яна была адменена пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 верасня 2004 г. № 1130 «Аб зацвярджэнні палажэння аб парадку арганізацыі гастрольна-канцэртнай дзейнасці на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» [606].

Істотна быў перагледжаны памер платы за выдачу пасведчання. Ад атрымання пасведчання былі вызвалены:

дзяржаўныя тэатральна-відовішчныя арганізацыі, якія здзяйснялі гэту дзейнасць сіламі ўласных творчых калектываў і выканаўцаў на ўласных сцэнічных плошчах;

Белдзяржфілармонія, дзяржаўныя тэатральна-відовішчныя арганізацыі, якія мелі статус «нацыянальны», «акадэмічны», званне «Заслужаны калектыў Рэс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публікі Беларусь» і пры гэтым здзяйснялі гастрольна-канцэртную дзейнасць сіламі ўласных творчых калектываў і выканаўцаў;

тэатральна-відовішчныя арганізацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, якія здзяйснялі гастрольна-канцэртную дзейнасць сіламі ўласных творчых калектываў і выканаўцаў.

Ад платы за выдачу пасведчання былі вызвалены:

дзяржаўныя тэатральна-відовішчныя арганізацыі, якія здзяйснялі ці арганізоўвалі гастролі;

установы культуры і адукацыі, якія арганізоўвалі гастролі беларускіх дзяржаўных прафесійных творчых калектываў і выканаўцаў, а таксама здзяйснялі гастрольна-канцэртную дзейнасць калектываў мастацкай самадзейнасці са званнем «народны», «узорны» ці званнем «Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь»;

тэатральна-відовішчныя арганізацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі пры арганізацыі імі гастроляў беларускіх прафесійных і аматарскіх творчых калектываў і выканаўцаў.

Найменш (3 базавыя велічыні) неабходна было заплаціць, калі мерапрыемства праводзілася ў залі да 150 чалавек. Паніжаючы каэфіцыент уводзіўся для суб'ектаў гастрольна-відовішчнай дзейнасці, якія здзяйснялі гэту дзейнасць сіламі ўласных творчых калектываў ці арганізуючых гастролі беларускіх прафесійных і аматарскіх калектываў і выканаўцаў (у памеры 0,1) [521].

Па меркаванні прадстаўнікоў Міністэрства культуры, прыняцце дадзенага дакумента дазволіла значна ўпарадкаваць стан гастрольна-канцэртнай работы ў рэспубліцы, цэнтралізаваць працэсы рэгулявання і кіравання канцэртнай дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь, спрасціць працэс арганізацыі і правядзення гастрольна-канцэртных мерапрыемстваў дзяржаўнымі тэатральна-відовішчнымі арганізацыямі, эканоміць дзяржаўныя асігнаванні на атрыманне гастрольнага пасведчання, стварыла неабходныя ўмовы для паспяховага здзяйснення камерцыйных праектаў, павелічэння ўласных даходаў і росту паказчыка аказання платных паслуг насельніцтву, пашырыла магчымасці па прапагандзе творчасці айчынных выканаўцаў [439, спр. 1046, арк. 256].

У 2004 г. гастрольна-канцэртную дзейнасць у краіне здзяйснялі 15 дзяржаўных тэатральна-відовішчных арганізацый рэспубліканскага і абласнога падпарадкавання, якія аб'ядноўвалі каля 1500 чалавек артыстычнага персаналу. Прадстаўленыя льготы ў 2004 г. у параўнанні з папярэднім годам дазволілі на 23 % павялічыць аб'ём платных паслуг культуры ў супастаўляльных цэнах [439, спр. 1046, арк. 256].

У цэлым, як адзначалася спецыялістамі Міністэрства культуры, для *дзяржаўных* [курсіў наш. – *Д. К.*] тэатральна-відовішчных арганізацый былі створаны спрыяльныя ўмовы для здзяйснення сваёй асноўнай дзейнасці, рэалізацыі сваіх камерцыйных праектаў. Падтрымка беларускага прафесійнага мастацтва была вызначана таксама і ўстанаўленнем ільготнага каэфіцыента для арандатараў, якія здзяйснялі канцэртна-відовішчную дзейнасць у залежнасці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ад яе жанру, а таксама для канцэртных залаў г. Мінска (рашэнне Рэспубліканскай камісіі па ўпарадкаванні выкарыстання адміністрацыйных будынкаў, пабудоў, вытворчых плошчаў і іншых аб'ектаў дзяржаўнай уласнасці ад 3 лютага 2005 г. № 24) [439, спр. 1047, арк. 167–168].

Гэтыя меры, як адзначалі спецыялісты Міністэрства культуры, дазволілі павялічыць колькасць мерапрыемстваў па краіне, якія праводзіліся філармоніямі, тэатрамі, дамамі і палацамі культуры, лядовымі палацамі і іншымі ўстановамі культуры ў абласцях рэспублікі і г. Мінску, а таксама дапамаглі стварыць *неабходны баланс на рынку канцэртнай дзейнасці з перавагай дзяржаўных канцэртных арганізацый перад камерцыйнымі* [курсіў наш. – *Д. К.*] [439, спр. 1047, арк. 168].

Спецыялістамі Міністэрства культуры ацэньваліся як адмоўныя моманты канкурэнцыі для Белдзяржцырка, што ўзнікалі з-за паралельных выступленняў недзяржаўных цыркавых калектываў. Для недапушчэння падобных сітуацый гаварылася аб неабходнасці ўзгодненых дзеянняў упраўлення культуры Мінгарвыканкама, які кантраляваў работы прыватных цыркавых праграм, і Белдзяржцырка [439, спр. 1047, арк. 171].

У 2004 г. пасведчанні на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў акрамя дзяржаўных тэатральна-відовішчных арганізацый рэспублікі атрымалі каля 27 недзяржаўных структур-рэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь. Аднак у агульным аб'ёме выдадзеных пасведчанняў іх доля склала каля 3 % (46 пасведчанняў з 1465 выдадзеных) [439, спр. 1046, арк. 259]. У цэлым па краіне скарацілася колькасць пасведчанняў на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў, выдадзеных недзяржаўным арганізацыям і індывідуальным прадпрымальнікам. Так, у г. Мінску ў перыяд з верасня 2004 па сакавік 2005 г. упраўленнем культуры Мінгарвыканкама асобам недзяржаўнай формы ўласнасці было выдадзена 70 пасведчанняў (за адпаведны перыяд 2003–2004 гг. – 101) [439, спр. 1047, арк. 159].

Новая сістэма арганізацыі і правядзення гатрольна-канцэртнай дзейнасці выклікала шмат пытанняў і прапаноў. Прагрэсіравала тэндэнцыя да правядзення мерапрыемстваў з парушэннем адпаведнага палажэння аб парадку арганізацыі гастрольна-канцэртнай дзейнасці. Ва ўсіх рэгіёнах на працягу 2004 г. меліся факты правядзення канцэртаў без набыцця гастрольнага пасведчання. Пры адсутнасці належнага кантролю з боку абласных упраўленняў культуры і ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама некаторыя юрыдычныя асобы ігнаравалі агульнапрынятыя ў краіне нормы арганізацыі дадзенай работы. Паўсюдна і бескантрольна праводзіліся канцэрты ў школах і дзіцячых садках. Заставаліся нізкімі паказчыкі атрымання даходаў ад правядзення камерцыйных мерапрыемстваў. Міністэрства культуры патрабавала ліквідаваць практыку правядзення філармоніямі камерцыйных мерапрыемстваў з сумай плануемых даходаў заведама ніжэй, чым кошт гастрольнага пасведчання. Міністэрства культуры звяртала ўвагу адпаведных юрыдычных асоб, а таксама адказных асоб дзяржаўных органаў, якія кантралявалі гаспадарчую дзейнасць

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКИ

у населеных пунктах, на той факт, што выступленні артыстаў у клубах і рэстаранах таксама адносяцца да канцэртнай дзейнасці, якая патрабуе адпаведнага пасведчання, калі выканаўца (група выканаўцаў) не з'яўляецца штатным супрацоўнікам дадзенай установы [439, спр. 1046, арк. 262]. Міністэрства культуры канстатавала факт зніжэння паказчыкаў гастрольна-канцэртнай дзейнасці, асабліва па абслугоўванні сельскай, дзіцячай і юнацкай аўдыторыі [439, спр. 1046, арк. 264].

Высокая аплата за гастрольнае пасведчанне не давала магчымасці беларускім артыстам праводзіць свае выступленні ў Палацах культуры. Для залаў ад 500 да 1000 месцаў кошт пасведчання прыкладна раўняўся кошту арэнды памяшкання. Чыноўнікамі Міністэрства культуры ў 2005 г. выказвалася прапанова аб увядзенні паніжаючага каэфіцыента для беларускіх артыстаў [439, спр. 1047, арк. 178–179].

На іх жа думку, патрабавала рашэння праблема ведамасных Палацаў культуры, такіх як ДК прафсаюзаў, ДК МАЗ, МТЗ, чыгуначнікаў і інш. З-за адсутнасці дапамогі з боку прадпрыемстваў яны знаходзіліся ў цяжкім фінансавым становішчы. Адной з асноўных крыніц іх даходаў з'яўлялася правядзенне платных мерапрыемстваў. Пры гэтым яны плацілі за гастрольнае пасведчанне як камерцыйныя структуры і былі пастаўлены ў няроўныя ўмовы з канцэртнай залай «Мінск» і Палацам Рэспублікі, якія былі вызвалены ад аплаты за гастрольныя пасведчанні [439, спр. 1047, арк. 179].

Пастановай Міністэрства культуры ад 14 кастрычніка 2005 г. № 24 былі ўнесены істотныя змены ў нарматывы аплаты працы за гастрольнае пасведчанне. Былі ўстаноўлены паніжаючыя каэфіцыенты пры рабоце з беларускімі выканаўцамі (у памеры 0,1) і дзіцячай аўдыторыяй (у памеры 0,05), што стварыла спрыяльныя ўмовы для пашырэння прапаганды творчасці айчынных кампазітараў і выканаўцаў, павелічэння колькасці мерапрыемстваў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі ў 2005 г. на 13,9 % у параўнанні з 2004 г. [73, арк. 136].

У мэтах здзяйснення кантролю за якасцю канцэртных праграм дзяржаўных прафесійных калектываў мастацкай творчасці і асобных выканаўцаў загадам Міністэрства культуры ад 10 кастрычніка 2006 г. № 232 было зацверджана Палажэнне і створана Рэспубліканская мастацка-экспертная рада па ацэнцы якасці канцэртных праграм [76, т. 2, арк. 270].

Найбольш істотныя пытанні далейшага ўдасканалення гастрольна-канцэртнага абслугоўвання насельніцтва рэспублікі разглядаліся на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 28 лістапада 2006 г. Вынікам стала распрацоўка асобнага Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб арганізацыі гастрольна-канцэртнай дзейнасці» [76, т. 2, арк. 269]. Ён быў падпісаны толькі ў маі 2008 г. [570]. Нарматыўны прававы акт увёў дзяржпошліну за выдачу пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства. Калі раней парадак аплаты вызначала Міністэрства культуры, то цяпер за гэта адказвала Міністэрства па падатках і зборах. Указ захаваў вызваленне ад выдачы пасведчання на права арганізацыі і правя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў для акрэсленых раней устаноў і арганізацый. Сярод новых былі Нацыянальная тэлерадыёкампанія, ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал», «Сталічнае тэлебачанне».

Істотнай зменай стала ўвядзенне абавязковага атрымання пасведчання арганізацыямі, якія аказвалі паслугі па арганізацыі вольнага часу грамадзян шляхам правядзення дыскатэк, прадстаўлення іншых забаўляльных культурна-дасугавых паслуг і (ці) паслуг грамадскага харчавання, калі кошт аказваемых імі паслуг уключаў у сябе кошт правядзення культурна-забаўляльнага мерапрыемства. Пры гэтым у выпадку арганізацыі культурна-забаўляльнага мерапрыемства сіламі работнікаў калектываў мастацкай творчасці і выканаўцаў, якія знаходзіліся ў штаце пазначаных арганізацый, на ўласных сцэнічных пляцоўках пасведчанне выдавалася на культурна-відовішчныя мерапрыемствы, што праводзіліся на працягу месяца.

У мэтах узмацнення кантролю за якасцю праграм культурна-відовішчных мерапрыемстваў упраўленні культуры стваралі мастацка-экспертныя камісіі (рады), якім было нададзена права азнаямлення з аўдыё-, відэа- і друкаванымі матэрыяламі праграмы культурна-відовішчнага мерапрыемства ці па магчымасці праслухоўвання (прагляду) выступленняў. Па выніках гэтага яны давалі заключэнне аб адпаведнасці зместу дадзенага мерапрыемства асноўным задачам рэгулявання гастрольна-канцэртнай дзейнасці.

У канцы даследуемага перыяду быў прыняты Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 кастрычніка 2010 г. № 542 «Аб правядзенні культурна-відовішчных мерапрыемстваў», які з 1 студзеня 2011 г. адмяніў выдачу пасведчанняў. Быў уведзены паведамленчы прынцып. Па меркаванні Міністэрства культуры, нарматыўны прававы акт быў накіраваны на далейшую лібералізацыю эканамічнай дзейнасці, а таксама зняцце неабгрунтаваных бюракратычных абмежаванняў у сферы арганізацыі культурна-відовішчных мерапрыемстваў і фарміравання ў Рэспубліцы Беларусь сучаснага цывілізаванага шоу-бізнеса. Паведамленчы прынцып павінен быў дазволіць дзяржаўным органам планаваць і рэгуляваць дзейнасць, звязаную з правядзеннем культурна-відовішчнага мерапрыемства, не наносячы шкоды інтарэсам гледачоў, выканаўцаў, прадзюсараў, стварыць роўныя ўмовы для суб'ектаў гаспадарання любой формы ўласнасці [82, т. 7, арк. 26–27].

Значнай падзеяй у гісторыі культурнага жыцця Беларусі стала ўвядзенне ў 2002 г. у эксплуатацыю ў сталіцы Канцэртнай залы Палаца Рэспублікі на 2700 месцаў. У 2005 г. пасля істотнага рамонту і тэхнічнага пераабсталявання адкрылася Беларуская дзяржаўная філармонія. У ёй быў створаны Малы зал імя Рыгора Шырмы на 200 месцаў.

Побач з гэтым дзяржава рабіла захады па развіцці ***беларускай эстрады***. У 2003 г. у выніку сумеснай працы Міністэрства культуры з Міністэрствам інфармацыі, Белтэлерадыёкампаніяй, іншымі зацікаўленымі бакамі было прынята рашэнне аб абавязковым 50 %-ным суадносінах гучання беларускіх выканаўцаў у агульным аб'ёме вяшчання каналаў. У 2004 г. Міністэрства інфармацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абавязала беларускія радыёстанцыі з 1 студзеня 2005 г. аддаваць тры чвэрці свайго эфіру беларускай музыцы, што павінна было спрыяць папулярызацыі творчасці айчынных выканаўцаў. Аднак гэта не прывяло да радыкальнага росту папулярнасці беларускіх выканаўцаў у асяроддзі асноўных спажыўцоў папулярнай музыкі [81, т. 1, арк. 116].

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка звяртаў увагу на неабходнасць удзяляць больш увагі маладым талентам. Прычына таго, што нашы таленты больш праяўляюць сябе за мяжой, ён бачыў у неэфектыўнай працы з імі. У якасці прыкладу прыводзіліся імёны Наталлі Падольскай (прадстаўляла ў 2005 г. Расію на конкурсе «Еўрабачанне») і Руслана Аляхно (перамог у 2004 г. на конкурсе «Народны артыст», што ішоў на Расійскім тэлебачанні) [614].

У 2005 г. спецыяльнай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь быў зацверджаны комплекс мерапрыемстваў па развіцці канцэртнай і культурна-забаўляльнай дзейнасці ў нашай краіне [578]. На базе філармоній абласнога падпарадкавання ў наступныя гады былі створаны прадзюсарскія цэнтры (эстрадныя аддзелы) прапаганды творчасці маладых беларускіх эстрадных выканаўцаў. У 2010 г. іх налічвалася чатыры – у Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай філармоніях. Аднак у краіне не было даступных сцэнічных пляцовак для маладых выканаўцаў, адпаведных музычных праграм на тэлебачанні [80, т. 1, арк. 114, 115].

Айчынная рок-музыка з'яўляецца адной з праяў маладзёжнай культуры. Яе маштабнае развіццё пачалося ў канцы 1980-х гг., хаця пачатак быў закладзены ў 1970-х творчасцю ансамбляў «Песняры» і «Сузор'е». Менавіта «Песняры» распачалі эстрадную плынь сцэнічнага фальклору. Гэты напрамак прадоўжыў фолк-рок-гурт «Палац», створаны ў 1992 г. (мастацкі кіраўнік А. Хаменка). У яго ўвайшлі прафесійныя музыканты, якія мелі вопыт працы ў розных музычных стылях. Асновай для аб'яднання стаў беларускі аўтэнтычны фальклор, які выконваўся музыкантамі як у арыгінальным гучанні, так і ў розных стылявых апрацоўках. У складзе гурту побач з традыцыйнымі музычнымі інструментамі гралі такія аўтэнтычныя беларускія інструменты, як ліра, дуда, цымбалы, жалейка, дудка, сурма. «Палац» удзельнічаў шмат у якіх фестывалях Заходняй Еўропы і краін СНД. У 1993 г. па выніках фестывалю радыё Франс Інтэрнасіяналь ён патрапіў у дзясятку лепшых калектываў Усходняй Еўропы.

З цягам часу былі створаны гурты «Юр'е» і «Крыві». Першы з іх працаваў у кірунку этна-рок-шоу, другі вызначыў сваю стылістыку як арт-мадэрн-фолк [195, с. 42].

У 1996 г. сфарміраваўся гурт «Троіца» (мастацкі кіраўнік І. Кірчук). У 1997 г. ён ужо выступаў на фестывалі «Песні канца XX веку» (арганізатар Ю. Шэўчук) у Санкт-Пецярбургу побач з такімі вядомымі расійскімі гуртамі, як «ДДТ» і «Аліса». У 1997 г. «Троіца» наведала з канцэртамі Галандыю, дзе музыкаў зноў чакаў поспех. Замест запланаваных трох канцэртаў гурт змог адыграць усе дзе-вяць. Галандцаў вельмі зацікавіла манера спеву, тэксты, а таксама інструменты калектыву, большасць з якіх была рарытэтамі з уласнай калекцыі І. Кірчука.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З гэтага году пачынаюцца актыўныя канцэрты гурту практычна па ўсёй Еўропе. «Троіца» наведала Аўстрыю, Германію, Венгрыю, Партугалію, Польшчу, Харватыю, Славенію. На вялікі жаль, на сваёй радзіме ў той час гурт выступаў мала. Гэта было выклікана нізкім інтарэсам беларускай публікі як да стылю музыкі «Троіцы», так і да свайго фальклору.

У 1998 г. у Галандыі выйшаў паўнавартасны першы альбом, названы проста – «Троіца». У 2000 г. тамсама – сольная праца І. Кірчука пад назвай «Спадчына загінуўшых вёсак», а ў 2001 г. – альбом «Журавы» (у 2002 г. быў перавыдадзены спецыяльна для Беларусі). Першы альбом, які цалкам быў запісаны на Беларусі, – «Сем» – выйшаў у 2004 г. [177]. Дзейнасць этна-трыо «Троіца» – яскравы прыклад таго, як беларуская музыка можа быць папулярнай за мяжой. Вядомасць гурт набыў менавіта па-за межамі нашай краіны, а толькі потым стаў папулярным у Беларусі.

Амаль цалкам з народных спеваў складаўся рэпертуар такіх гуртоў, як «Стары Ольса» і «Аляксандра і Канстанцін». Менавіта гэтыя калектывы часцей за ўсё прадстаўлялі Беларусь на буйных канцэртах і музычных фестывалях не толькі ў Беларусі, але і ў Германіі, Польшчы, Францыі і інш. [141]. У 2003 г. пачаў працу танцавальны склад гурту «Стары Ольса» – тэатр «Явaрына». Вялікай папулярнасцю карысталіся праводзімыя гуртом «Сярэднявечныя дыскатэкі» ў маладзёжных клубах.

Трэба адзначыць, што большасць маладых рок-гуртоў была рускамоўнай. Яны спасылаліся на кан'юнктуру музычнага рынку, на большую канкурэнтаздольнасць расійскага прадукту. Аднак толькі некалькі з іх сталі сапраўды паспяховымі праектамі. Гэта ў першую чаргу тычыцца груп «Ляпис Трубецкой» і «Краски». Пазней на расійскі музычны рынак прабілася група «Леприконсы».

Разам з гэтым даследчыкі звярталі ўвагу на тое, што «калі нейкая беларуская музыка і аказваецца запатрабаванай за мяжой, то ў абсалютнай большасці выпадкаў гэта фальклорна арыентаваны напрамак. Асабліва падабаюцца замежнаму слухачу сучасныя эксперыменты ў рэчышчы старой эстэтыкі. Аб гэтым раней сведчыла творчасць ансамбля «Песняры», а сёння – «Крыві» і «Троіцы»» [712].

У значнай ступені на развіццё беларускай рок-музыкі канца XX – пачатку XXI ст. паўплываў мастак і паэт М. Анемпадыстаў, які паклаў пачатак так званай супольнасці (калі збіраюцца разам некалькі музыкантаў з розных гуртоў і агульнымі намаганнямі запісваюць альбом). У 1997 г. М. Анемпадыстаў ініцыяваў запіс першага супольнага праекта пад назвай «Народны альбом», у якім узялі ўдзел усе вядучыя беларускія музыканты. Праект меў вялікі поспех, быў перавыдадзены і заахвоціў артыстаў да далейшай «супольнай» працы. Такім чынам з'явіліся калядны альбом «Сьвяты вечар» і альбом беларускіх маршаў і гімнаў «Я нарадзіўся тут». У далейшым былі альбомы «застольнага праекта» «Крамбамбуля». Першы з іх – «Паўлітра добрага настрою» – атрымаў «Рок-карону 2002».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод беларускамоўных гуртоў, выступаўшых у рок-стылі, у пачатку 1990-х гг. выдзяляліся створаныя на аснове мінскага гурту «Бонда» (1984 г.) «Ulis» (1989 г., адзіны з беларускіх гуртоў, які выступаў з серыяй канцэртаў у Лондане) і «Крама» (1991 г.). Яны, а таксама «N. R. M.» (1994 г.), «PARTYZONE» (1994) доўгі час вызначалі асноўны напрамак развіцця беларускамоўнага року.

У вывучаемы перыяд існавалі, але па розных прычынах перасталі праводзіцца такія рок-фестывалі, як «На Купалле», «Рок па вакацыях», «Фэст Беларускай маладзёжнай» і інш.

Па выніках продажу альбомаў сетка музычных магазінаў «Містэрыя гуку» ў 2007 г. адзначыла пераможцаў: гурты «J:Морс», «Тяни-Толкай», «N. R. M.», «Ляпис Трубецкой», «Без Билета», «Да Винчи», «Крама» і супольны праект «Крамбамбуля».

З 2008 г. праводзіўся конкурс на атрыманне музычнай прэміі Experty.by. Па яго выніках у 2010 г. адразу ў чатырох намінацыях перамог альбом гурта «Дзецідзяцей» «Рух». Прызы замежных і народных экспертаў атрымаў альбом гурту «Hvarna» «Кола вяртанняў». Ён жа названы лепшым фолк-альбомам. Прыз за лепшы поп-альбом не ўручаўся з-за адсутнасці работ, якія атрымалаі значную адзнаку [876].

Навейшая гісторыя рок-музыкі Беларусі пацвердзіла, што рок-музыканты сваёй творчасцю не могуць заставацца па-за палітыкай. У 2004 г. пасля ўдзелу ў дазволеным уладамі канцэрце, прысвечаным 10-годдзю прэзідэнцтва А. Лукашэнка, у гуртоў-удзельнікаў сталі ўзнікаць складанасці з арганізацыяй канцэртаў і ратацыяй у эфіры радыёстанцый, ім перасталі выдаваць гастрольныя пасведчанні, і гурты вымушаны былі ў сваёй краіне выступаць ці падпольна, ці пад іншымі назвамі. Становішча змянілася ў канцы 2007 г. пасля сустрэчы з лідарамі гуртоў «Крама», «N. R. M.», «Палац» і «Нейра Дзюбель» тагачаснага кіраўніка ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Алега Праляскоўскага [633].

Музычную культуру Беларусі нельга ўявіць без інструментальна-песеннай эстрады. У вывучаемы перыяд заваявалі папулярнасць выканаўцы маладога пакалення І. Дарафеева, І. Афанасьева, А. Саладуха, М. Скорыкаў, Гюнеш, П. Ялфімаў, Г. Шаркунова, Герман і шмат іншых.

На эстрадзе з'явіліся яркія салісты-інструменталісты (П. Неўмяржыцкі), джазавыя калектывы, калектывы рок-напрамкаў і авангарднай музыкі, выканаўцы на ўдарных інструментах, клавішнікі, гітарысты, скрыпачы і інш. Узрос прафесіяналізм многіх эстрадных аранжыроўшчыкаў, павысіўся ўзровень тэхнічнага аснашчэння студый гуказапісу, што абумовіла ў пэўнай ступені прыкметнае павышэнне ўзроўню тэхнічнага выканання. Павялічылася колькасць прэзентацый аўдыёдыскаў беларускіх выканаўцаў. Сталі больш актыўна з'яўляцца песні на беларускай мове [80, т. 3, арк. 126].

Пачынаючы з 2004 г. Беларусь удзельнічала ў конкурсе песні «Еўрабачанне». Першымі прадстаўнікамі стаў дуэт «Аляксандра і Канстанцін». Найлепшым было выступленне ў 2007 г. Дзмітрыя Калдуна, які заняў 6-е месца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў фінале. Значна больш поспехаў было на дзіцячым «Еўрабачанні», у якім наша краіна ўдзельнічала з 2003 г. Беларусы двойчы – у 2005 і 2007 гг. – займалі першае месца. Гэта былі Ксенія Сітнік і Аляксей Жыгалковіч. А ў 2006 г. Андрэй Кунец заняў другую пазіцыю. У 2010 г. у адпаведнасці з рашэннем Еўрапейскага вяшчальнага саюза дзіцячае «Еўрабачанне» прайшло ў г. Мінску.

У канцы вывучаемага перыяду музычна-эстраднае мастацтва Беларусі ўключала як дзяржаўныя, так і недзяржаўныя арганізацыі. У дзяржаўным сектары працавала 8 арганізацый: заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь Нацыянальны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь, маладзёжны тэатр эстрады, Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры», Беларуская дзяржаўная філармонія, Гомельская, Гродзенская, Магілёўская і Віцебская абласныя філармоніі. Колькасць мастацка-артыстычнага персаналу складала 300 ча-лавек. Асноўнымі крыніцамі фінансавання дзяржаўных канцэртных арганізацый з'яўляліся субсідыі з бюджэту і ўласныя даходы.

У недзяржаўным сектары эстрадных выканаўцаў, якія працавалі на прафесійнай аснове, былі такія прыватныя кампаніі, як «Музычны прадзюсарскі цэнтр», прадзюсарскі цэнтр «Спамаш», музычна-прадзюсарскі цэнтр «Беларусы», шэраг прыватных прадзюсараў. У гэтай сферы працавала каля 20 прыватных прадзюсарскіх цэнтраў і фірм, каля 130 груп і самастойных выканаўцаў розных напрамкаў, студыі відэа- і гуказапісу [80, т. 3, арк. 125].

Праблемы развіцця ў Беларусі музычна-эстраднага мастацтва разглядаліся на пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у ліпені 2010 г. На ёй канстатавалася захаванасць у краіне дзяржаўнай сістэмы падрыхтоўкі і прасоўвання эстрадных артыстаў і калектываў. У пастанове калегіі былі акрэслены асноўныя праблемы ў гэтай сферы: адсутнасць спрыяльных умоў для развіцця сістэмы прадзюсарства, прыцягнення прыватнага капіталу ў шоу-бізнес. У значнай колькасці пляцовак у рэгіёнах рэспублікі адсутнічала неабходнае для правядзення эстрадных канцэртаў абсталяванне і музычны інструментарый. Тыповай праблемай, характэрнай для ўсёй рэспублікі, была адсутнасць сістэмнага планавання выканаўцамі і калектывамі сваіх канцэртаў, што не дазваляла арганізатарам правільна спланаваць сваю дзейнасць, своечасова падрыхтавацца да канцэрта, забяспечыць бытавы і тэхнічны райдар [80, т. 3, арк. 106, 113].

Адной з асноўных праблем развіцця эстрады была недастатковая медыйная падтрымка. Ва ўмовах канкурэнцыі з расійскай эстрадай існавала праблема з рэкламай беларускіх артыстаў і калектываў на тэлеканалах, якія прадстаўлялі льготныя тарыфы на рэкламу на аднолькавым узроўні як для беларускіх, так і расійскіх артыстаў [80, т. 3, арк. 106].

Агульным недахопам у развіцці сучаснай беларускай эстрады, на думку спецыялістаў Міністэрства культуры, можна было лічыць слабую літаратурную аснову, адсутнасць яркага і запамінальнага меладызму [80, т. 3, арк. 106].

Міністэрства культуры падрыхтавала праект канцэпцыі развіцця ў Рэспубліцы Беларусь сістэмы прадзюсарства ў сферы эстраднага музычнага ма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стацтва. У ёй была дадзена больш падрабязная характарыстыка праблем. Нягледзячы на тое, што ў краіне ў канцы вывучаемага перыяду існавалі ўсе асноўныя элементы структуры шоу-бізнесу (было некалькі выпускаючых лэйблаў, студый, прадзюсараў), яны былі недастаткова развітымі. Папулярныя выканаўцы і калектывы імкнуліся звяртацца да замежных вытворцаў фанаграм і відэакліпаў. Не быў развіты канкурэнтны беларускі шоу-бізнес, які б мог забяспечыць прасоўванне беларускай эстраднай музыкі за мяжу [80, т. 3, арк. 115].

У беларускім шоу-бізнесе фактычна адсутнічала канкурэнцыя, працягвалі задаваць тон выканаўцы, якія сфарміраваліся яшчэ ў моцных традыцыях савецкай эстрады. Відавочнай была супярэчнасць паміж статусам артыстаў, якія працавалі ў дзяржаўных арганізацыях, і тымі, хто працаваў з індывідуальнымі прадзюсарамі альбо прыватнымі прадзюсарскімі цэнтрамі. Першыя мелі пастаянную фінансавую падтрымку, і перад імі не стаяла задачы акупіць укладзеныя сродкі. У той жа час другая група артыстаў знаходзілася ў больш жорсткіх эканамічных умовах [80, т. 3, арк. 116].

Такім чынам, адной з асаблівасцей развіцця беларускага музычнага мастацтва ў вывучаемы перыяд было пашырэнне цікавасці выканаўцаў і калектываў да твораў сучасных беларускіх кампазітараў. Гэта ў першую чаргу звязана са стварэннем новых творчых калектываў, правядзеннем нацыянальных музычных фестываляў і конкурсаў. Другой асаблівасцю можна назваць з'яўленне і пераўтварэнне ў лік традыцыйных вялікай колькасці музычных фестываляў, кожны з якіх меў свой уласны кірунак і канцэпцыю. Адраджэнню і папулярызацыі старажытнай музыкі былі прысвечаны фестывалі «Музы Нясвіжа» ў Нясвіжы, «Адраджэнне беларускай капэлы» ў Мінску, «Убельскія ластаўкі» ў Чэрвені і інш.

Музычнае жыццё Беларусі стала больш адметным, узбагацілася новымі творамі і вярнула да жыцця мноства твораў старажытнай музыкі. Аднак яно не абмяжоўвалася канцэртамі класічнай і камерный музыкі, пастаноўкамі опер і балетаў. Вельмі актыўна ў 1990-я гг. развіваўся жанр песні. Акрамя знакамітых гуртоў «Сябры», «Верасы» і «Песняры» з'явіліся шматлікія творчыя калектывы, дзейнасць якіх развівалася ў розных стылістычных напрамках: рок, фольк-рок, аўтарская песня і іншыя. Папулярнымі ў Беларусі сталі гурты «Нейра Дзюбель», «Ляпис Трубяцкой», «Палац», «Крыві», «Стары Ольса» і многія іншыя. Некаторыя з гэтых гуртоў выступалі выключна на беларускай мове.

Нягледзячы на тое, што ў Беларусі не склалася паўнацэннага рынку шоу-бізнэсу, тут адбывалася сваё адметнае музычнае жыццё, у якім важную ролю адыгрывала дзяржава. На працягу 1998–2010 гг. былі здзейснены некалькі спробаў упарадкавання гастрольнай дзейнасці: ад увядзення ліцэнзавання ў 1998 г. да стварэння мастацка-экспертныя камісій (радаў) у 2008 г. Ліцэнзаванне ў 2002 г. была заменена выдачай пасведчання на права правядзення гастрольнай дзейнасці і падзелам суб'ектаў гаспадарання на дзве няроўныя катэгорыі: дзяржаўныя і камерцыйныя. Першыя атрымалі істотныя прэферэнцыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4. Тэатральная творчасць

У 1991 г. у Беларусі існаваў 21 прафесійны дзяржаўны тэатр (з іх 2 музычныя, 7 лялечных, 1 дзіцячы і 11 драматычных). Паступова іх колькасць павялічвалася. Былі заснаваны ў Мінску: Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі (1992), Тэатр беларускай арміі (2004), у Маладзечне – Мінскі абласны драматычны тэатр (1993), у Пінску – Палескі драматычны тэатр (2006). У 1992 г. быў арганізаваны прыватны Гомельскі Незалежны тэатр, які ў 1999 г. атрымаў статус Гомельскага гарадскога эксперыментальнага маладзёжнага тэатра-студыі.

У 2010 г. у краіне налічвалася 27 дзяржаўны тэатраў. З іх 26 – тэатры сістэмы Мінкультуры і 1 – сістэмы Міністэрства абароны (Драматычны тэатр Беларускай арміі). Маладзёжны тэатр эстрады, які таксама дзейнічаў у сістэме Мінкультуры, па віду і спецыфіцы сваёй дзейнасці адносіўся да канцэртных арганізацый.

У новых умовах аднаўленай дзяржаўнасці ў некаторых тэатраў з'явіўся новы статус. Па стане на 2010 г. чатыры тэатры краіны мелі статус «нацыянальны»: драматычныя – імя Янкі Купалы (прысвоены ў 1993 г.), Якуба Коласа (2001), Максіма Горкага (1999); Акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета (1996 г.); 6 тэатраў – званне «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь»: Гомельскі абласны драматычны тэатр (у 1999 г.), Брэсцкі абласны тэатр драмы і музыкі (2005), Беларускі дзяржаўны музычны тэатр (2001), Беларускі тэатр «Лялька»(Віцебск, 2000), Брэсцкі тэатр лялек (2007), Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі (2010).

Дынаміка змены колькасці тэатраў адлюстравана ў табл. 1. Заўважым, што па дадзеных за 2008 г. па краінах – удзельніцах СНД Беларусь займала перадапошняе месца па колькасці тэатраў на 1 млн чалавек насельніцтва (2,9) [81, т. 5, арк. 16].

*Табліца 1.* **Колькасць дзяржаўных тэатраў [360, с. 47; 362, с. 93; 442, с. 135; 689, с. 105; 691, с. 126; 694, с. 188; 698, с. 237; 798, с. 36–37]**

| Паказчык | Год | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1990 | 1991 | 1992 | 1993 | 1995[1] | 1997 | 1999 | 2003 | 2006 | 2008 | 2009 | 2010 |
| **Усяго** | **21** | **21** | **23** | **24** | **24** | **26** | **27** | **28** | **29** | **28** | **27** | **27** |
| Оперы і балета | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 | 1 | 1 | 1 |
| Драмы і музкамедыі | 12 | 12 | 14 | 15 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 19 | 18 | 18 |
| Дзіцячых і юнага гледача | 8 | 8 | 8 | 8 | 8 | 8 | 8 | 8 | 8 | 9 | 8 | 8 |

Непасрэдна дзейнасць тэатраў па ахопе насельніцтва і колькасці пастановак за перыяд 1991–2010 гг. характарызуецца супярэчлівымі статыстычнымі дадзенымі. У перыяд да 1997 г. уключна назіралася скарачэнне колькасці гледачоў. Калі ў 1990 г. іх было 2603 тыс. чалавек на адзін спектакль, то ў 1997 г. – толькі 1666 тыс. Пасля часовага ўздыму ў 1998–2001 гг. (максімальная колькасць – 2178 тыс. у 1999 г.) назіралася павольнае змяншэнне да 2003 г. уключна,

[1] Акрамя гэтага, у 1995 г. у краіне працавалі тры недзяржаўныя тэатры, якія абслужылі 28 тыс. гледачоў.

невялікае павышэнне да 2005 г. і рост больш чым на 120 тыс. наведвальнікаў у 2007 г. у параўнанні з 2005 г.

З тэатраў рэспубліканскага падпарадкавання па колькасці гледачоў (з улікам ранішніх спектакляў) у 2007 г. лідзіравалі Нацыянальны тэатр балета (157,5 тыс.), імя Янкі Купалы (131 тыс.), мясцовага падпарадкавання – Беларускі дзяржаўны музычны тэатр (193,2 тыс.), Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа (80,6 тыс.), Гомельскі абласны драмтэатр (73,5 тыс.)[1].

Па-іншаму выглядае статыстыка колькасці мерапрыемстваў. У рэкордны па наведвальніках 1999 г. гэта лічба не была рэкорднай – 6919 спектакляў у параўнанні, напрыклад, з 6926 у папярэднім 1998 г., калі тэатры наведалі толькі 1856 тыс. чалавек. Пачынаючы з 2001 г. дадзены паказчык няўмольна рос – ад 6576 да 9013 у 2010 г. Значна перавысіўшы 1999 г. па колькасці мерапрыемстваў, тэатры так і не дасягнулі паказчыка гэтага года па наведвальніках.

*Табліца 2.* **Дзейнасць дзяржаўных тэатраў Рэспублікі Беларусь [360, с. 47; 362, с. 94–98; 620, с. 34; 621, с. 41; 752, с. 18; 796, с. 36–40; 797, с. 32–36; 798, с. 36–37]**

| Год | Колькасць мерапрыемстваў, праведзеных за год | | Колькасць гледачоў у тэатрах | | Запаўняльнасць залаў, % | Новых пастановак | Колькасць наведванняў на 1000 насельніцтва | Месцы ў тэатрах на 100 000 насельніцтва |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | агульная, тыс. чал. | сярэдняя на адно мерапрыемства, чал. | агульная, тыс. чал. | сярэдняя на адзін спектакль, чал. | | | | |
| 1990 | 7316 | 348,4 | 2603 | 356 | 89 | 81 | 254 | 83 |
| 1994 | 6426 | 268 | 2045 | 318 | – | – | – | – |
| 1995 | 6334 | 263,9 | 1780 | 281 | 69 | 94 | 175 | 96 |
| 1996 | 6614 | 276 | 1694 | 256 | – | – | 165 | – |
| 1997 | 6609 | 254 | 1666 | 252 | – | – | 162 | – |
| 1998 | 6926 | 266 | 1856 | 268 | – | – | 181 | – |
| 1999 | 6919 | 256 | 2178 | 315 | – | – | 217 | – |
| 2000 | 6812 | 252 | 2047 | 300 | 84 | 119 | 205 | 97 |
| 2001 | 6576 | 244 | 1854 | 282 | 81 | 131 | 186 | 94 |
| 2002 | 6965 | 258 | 1809 | 260 | – | 116 | 182 | – |
| 2003 | 7127 | 255 | 1772 | 249 | – | – | 179 | – |
| 2004 | 7226 | 258 | 1793 | 248 | – | 159 | 182 | 97 |
| 2005 | 7602 | 272 | 1842 | 242 | 80 | 167 | 191 | 86 |
| 2006 | 7762 | 268 | 1824 | 235 | 62 | 132 | 187 | 113 |
| 2007 | 8182 | 282 | 1949 | 238 | 63 | 129 | 201 | 113 |
| 2008 | 8314 | 297 | 1907 | 229 | 74 | 137 | 200 | 89 |
| 2009 | 8 194 | 303 | 1 931 | 236 | 61 | 146 | 203 | 110 |
| 2010 | 9 013 | 334 | 1 981 | 220 | 62 | 130 | 209 | 100 |

[1] Уласныя падлікі па [313].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Імкнучыся прыцягнуць наведвальнікаў, тэатры пастаянна павялічвалі колькасць новых пастановак. Калі ў 1990 г. іх было 81, то ў 1995 г. – 94. Найбольшым паказчык быў у 2005 г. – 167.

Асноўныя паказчыкі дзейнасці тэатраў за разглядаемы перыяд адлюстраваны ў табл. 2.

Рэкорднымі па сярэдняй запаўняльнасці залаў былі 1999 і 2000 гг. – 84 %. Пазней назіраўся некаторы спад і стабілізацыя ў межах 60 % у другой палове 2000-х гг. (выключэннем стаў 2008 г.). На жаль, не для ўсіх тэатраў характэрны такі высокі працэнт. Найменшымі паказчыкамі запаўняльнасці залы ў 2007 г. вызначыўся Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча (43 %), Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы (51 %). На паказчыкі апошняга, таксама як і на паказчыкі наведвання Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра балета, адмоўна паўплываў часовы пераезд на час рэканструкцыі будынка тэатраў[1].

Вялікай праблемай першых гадоў сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі была няспынная тэндэнцыя да пагаршэння ***матэрыяльнага стану*** непасрэдна тэатральных устаноў і галіны ў цэлым. Недахоп матэрыяльных сродкаў яскрава адлюстраваўся на звужэнні гастрольнай дзейнасці тэатраў і творчых калектываў. У першай палове 1990-х гг. ніводнага знакамітага калектыву з Масквы, Санкт-Пецярбурга, Кіева не было ў Мінску з гастролямі. Цяжкая эканамічная сітуацыя ў галіне культуры адбівалася на працы Міністэрства. У 1992 г. не ўдалося правесці Беларускі міжнародны фестываль тэатраў лялек, ён быў перанесены на 1993 г. Фінансаванне галіны культуры ў 1995 г. знаходзілася ў такім становішчы, што многія запланаваныя традыцыйныя мерапрыемствы апынуліся па-за бюджэтным фінансаваннем. Сярод іх фестывалі «Мінская вясна», «Славянскі базар», «Адраджэнне беларускай капэлы», «Музычнае Палессе», IV Беларускі тэатральны фестываль і некаторыя іншыя [438, спр. 44, арк. 91].

Значнай стратай для тэатральнага мастацтва першай паловы 1990-х гг. было закрыццё ў 1993 г. адзінага ў Беларусі прафесійнага тэатра народнага тыпу – Гомельскага фальклорнага музычна-драматычнага тэатра «Жалейка» (існаваў з 1990 г., арганізатар і кіраўнік М. Макарцоў). Тэатр быў вандроўным, большасць паказаў адбывалася на гастролях. Працаваў пераважна на Гомельшчыне і Магілёўшчыне. Калектыў прапагандаваў традыцыі народнага мастацтва, яго сцэнічныя відовішчы былі заснаваны на аўтэнтычным тэатральным фальклоры пераважна палескага рэгіёна [787, с. 289].

[1] Адказваючы на пытанне аб тым, што будзе з тэатрам, калі пачнецца генеральны рамонт будынку, у інтэрв'ю «Беларускай газеце» мастацкі кіраўнік тэатра В. Елізар'еў адказаў: «Нельга дапусціць, каб балетная трупа выехала з гэтага памяшкання. У нас каля 30 назваў актыўнага рэпертуару (мала хто ў свеце можа пахваліцца такой афішай), і мы утрымліваем артыстаў у тэатры шмат у чым менавіта дзякуючы багаццю рэпертуара, бо магчымасці па заробку ў нас вельмі сціплыя. Пры пераездзе ў гэты цудоўны "акварыум" мы згубім 75 працэнтаў рэпертуару, разам з тым, баюся, згубім і трупу. Я паўтараю гэта ва ўсіх інстанцыях. На мой погляд, тэатр неабходна рамантаваць паэтапна, не высяляючы артыстаў» [243].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пачатку 2000-х гг. тэатры адчулі зніжэнне аб’ёму бюджэтнага фінансавання і вымушаны былі шукаць шляхі больш шырокага выкарыстання пазабюджэтных сродкаў і павышэння ўласных даходаў. Да 2002 г. тэатры атрымлівалі з дзяржаўнага бюджэту субсідыі, якія забяспечвалі пастановачныя выдаткі на новыя спектаклі, на заработную плату з налічэннямі, аплату камунальных паслуг. У 2002–2003 гг. субсідыі тэатрам былі дадзены толькі на заработную плату з налічэннямі. У такіх умовах адной з крыніц фінансавання новых пастановак у тэатрах рэспубліканскага падпарадкавання сталі цэнтралізаваныя сродкі Міністэрства культуры і сродкі Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. У мэтах павелічэння даходаў тэатральных устаноў Міністэрствам культуры былі прыняты меры па пашырэнні платных паслуг і прывядзенні кошту білетаў у адпаведнасць з рэальнымі затратамі на пастаноўку спектакляў [439, спр. 733, арк. 29]. Тэатры пачалі актыўна асвойваць новыя формы дзейнасці і аказваць разнастайныя віды платных паслуг насельніцтву. Кіраўніцтва тэатраў атрымала права ўстанаўліваць свае цэны на 75 % месцаў у глядацкай зале, а 25 % білетаў мелі фіксаваны кошт. З мэтай заробку дадатковых сродкаў далейшае развіццё сталі атрымоўваць такія напрамкі дзейнасці, як стварэнне малых сцэн, эксперыментальных спектакляў [129].

Сталай мадэлі стацыянарнага рэпертуарнага тэатра ў новых сацыяльна-эканамічных умовах давялося ўступіць у жорсткую канкурэнцыю з іншымі тэатральнымі і відовішчнымі формамі. На думку тэатральнага крытыка Т. Команавай, у новых сацыяльна-эканамічных умовах тэатр паўстаў перад неабходнасцю не толькі ствараць, але і самастойна «прадаваць» спектаклі, ён адчуў патрэбу не толькі ў «гандлярах», але і ў дасведчаных маркетолагах, аўтарах-тэхнолагах і іншых спецыялістах, якія здольны пралічыць «рэнтабельнасць» таго ці іншага тэатральнага праекта. У выніку ўсё часцей прыходзілася гаварыць аб далёкасці тых ці іншых тэатральных пастановак ад прынцыпаў сапраўднасці мастацкага твора [300].

Погляды крытыка пацвярджаюцца матэрыяламі калегіі Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь, на якой у сакавіку 1995 г. разглядалася пытанне аб рэпертуарна-творчай дзейнасці драматычных тэатраў Беларусі і выніках работы за 1994 г. [37]. У рашэнні адзначалася, што вострая барацьба за гледача, якая ўзнікла са з’яўленнем недзяржаўнай сеткі тэатраў, спаборніцтва за права займацца творчасцю, распад былых каштоўнасцей, змяненне структуры тэатральнай аўдыторыі, у якой следам за студэнцкай моладдзю ўсё больш значнае месца стала займаць група прадпрымальнікаў, вымушала тэатры ісці на адпаведную пераарыентацыю ў сваёй творчасці. У рэпертуарным пракаце ўсё менш месца знаходзілася для сучаснай грамадска значнай п’есы, якую пастунова замяняла драматургія дэтэктыўнага і забаўляльнага жанраў. З 84 новых работ у 1994 г. было толькі 11 пастановак



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сусветнай класікі, 23 – беларускай драматургіі (пры гэтым 14 былі падрыхтаваны па дзяржаўным заказе). У сувязі са складанасцямі эканамічнага парадку многія тэатры зменшылі колькасць выпуску новых спектакляў, сталі арыентавацца на драматургію камернага плана, пастаноўку п’ес на малых сцэнах. Гэта не спрыяла задачам шырокага выкарыстання мастацкага патэнцыялу калектываў, забеспячэнню нармальнага творчага клімату, прыводзіла да прастою кадраў штатнай рэжысуры.

Яскравым прыкладам канкурэнцыі дзяржаўнаму стацыянарнаму тэатру з’яўляецца ***антрэпрыза***[1], якая набыла значную папулярнасць менавіта ў сярэдзіне – другой палове 1990-х гг. Антрэпрызы не з’яўляліся дзяржаўнымі, а працавалі на прынцыпах самаакупнасці і былі накіраваны на камерцыйны поспех. У тыя часы арганізацыйна-прававыя і юрыдычныя аспекты рэгулявання дзейнасці антрэпрызы заставаліся да канца не вырашанымі. У беларускім заканадаўстве не было палажэнняў, вызначаючых фармальны статус такіх арганізацый (спалучэнне прыкмет прадпрыемства і грамадскай арганізацыі). Значныя змены адбыліся ў перыяд з 2000 па 2006 гг. Створаныя ў гэты час тэатральныя ініцыятывы атрымалі статус некамерцыйных ці камерцыйных арганізацый.

Першай установай, якая дзейнічала па законах антрэпрызы, быў Прыватны тэатр на Юбілейнай плошчы, створаны ў канцы 1993 г. (заснавальнік А. Ільіных – выпускнік Беларускай акадэміі мастацтваў, прадпрымальнік). Аднак ён нядоўга праіснаваў. На прынцыпах самаакупнасці дзейнічаў тэатр «Бульвар смеху», адкрыты ў 1994 г. Г. Давыдзько. У 1997 г. з’явілася першая прыватная тэатральная антрэпрыза «Тэатральныя зоркі» пры Беларускім камерцыйным універсітэце кіравання. У тым жа годзе пачала існаваць створаная прадзюсарам У. Ушаковым антрэпрыза «Віртуозы сцэны» (дзейнічала да 2004 г.). Яна запрашала для пастаноўкі спектакляў самых знакамітых беларускіх рэжысёраў, акцёраў тэатра і кіно, арганізоўвала выступленні ў Беларусі расійскіх антрэпрыз. Выбар спектакляў не абмяжоўваўся якім-небудзь адным напрамкам [405]. У 2000 г. рэжысёр Я. Валабуеў, вядомы сваімі спектаклямі «Сублімацыя кахання», «Дурацкае каханне», «Жорж Дандэн, ці Абдураны муж», пастаўленых у рамках антрэпрызы «Віртуозы сцэны», адкрыў свой прыватны антрэпрызны тэатр «Беларускія сезоны».

У 1999 г. пачалася дзейнасць прадзюсарскага цэнтра «Альфа-радыё», а з 2000 г. – «Нікола-тэатра». У 2004 г. В. Ушакоў адкрыў Сучасны мастацкі тэатр (спыніўшы дзейнасць «Віртуозаў сцэны»). Спектаклем «Больш чым дождж…» (рэжысёр П. Адамчыкаў) у 1998 г. пачала дзейнасць антрэпрыза Беларускага фонду развіцця культуры. У 2004 г. па законах антрэпрызы пачаў працаваць «Новы тэатр».

---

[1] Антрэпрызай з’яўляецца прыватнае ідовішчнае прадпрыемства, якое ствараецца і кіруецца антрэпрэнёрам і прадугледжвае ўдзел у канкрэтнай пастаноўцы (на вызначаны тэрмін) акцёраў з розных тэатраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Некамерцыйнай арганізацыяй з'яўлялася створаная ў 2000 г. у форме прыватнага ўнітарнага прадпрыемства тэатральная антрэпрыза «Беларускія сезоны» (з 2006 г. – «Тэатральны каўчэг»). Пэўны час у структуры грамадскага аб'яднання «Форціс» існаваў тэатр «Кампанія».

Аднак заканадаўства прымушала арганізатараў антрэпрыз плаціць даволі высокі падатак, што зніжала іх камерцыйны поспех, хаця падтрымку аказвалі спонсары. З'яўленне антрэпрыз на Беларусі можна разглядаць як паказчык пераймання заходніх традыцый у арганізацыі культурнага жыцця, уключэння ў сусветныя працэсы развіцця мастацтва. У нейкім родзе антрэпрызы стала канкурэнтам дзяржаўнаму рэпертуарнаму тэатру, новай формай арганізацыі дзейнасці мастацкіх устаноў. Тлумачачы поспех антрэпрызы тэатральны крытык Т. Арлова ў 2000 г. адзначала: «Чаму сёння так паспяхова развіваецца прыватная антрэпрыза? І акцёры, і рэжысёры, якія хочуць працаваць, шукаюць магчымасцей ставіць і гуляць у другіх тэатрах. […] Нам да тэатральнага плюралізму далёка. Новы штуршок да развіцця можа даць студыя, эксперымент, з каторых вырастаюць новыя тэатры, якія забяспечваюць рух наперад. […] Рэальна толькі брадвейская сістэма пракату спектакляў прыносіць грошы. У нас па гэтай сістэме спрабуе працаваць Малы тэатр Ігара Забары» [253].

Антрэпрызныя тэатральныя праекты з канца 1990-х гг. былі толькі часткай дзейнасці іх арганізатараў і ўладальнікаў. Напрыклад, Малы тэатр і «Віртуозы сцэны» ператварыліся ў буйныя прадзюсарскія цэнтры, якія займаліся арганізацыяй гастроляў расійскіх тэатраў.

Аднак развіццё дадзенага напрамку ў 2003 г. сутыкнулася з непрадбачнымі цяжкасцямі. Яны былі створаны пастановай Савета Міністраў, якая ўнесла змены ў парадак арганізацыі гастрольнай дзейнасці на тэрыторыі краіны [479]. Па новых правілах перад тым, як правесці відовішчнае мерапрыемства, неабходна было аплаціць не толькі арэнду памяшкання, але і спецыяльнае пасведчанне на канкрэтнае мерапрыемства. Пры гэтым дзяржаўныя арганізацыі атрымалі паніжаючы каэфіцыент па аплаце [518, 703].

Ацэньваючы згаданую пастанову ў 2005 г., заснавальнік тэатра «Бульвар смеху», а ў той час дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Г. Давыдзька адзначаў той факт, што палажэнні дакумента апынуліся «не зусім прадуманымі». У выніку «аказалася поўнасцю ліквідавана беларуская недзяржаўная тэатральная ініцыятыва. Загінулі ўсе антрэпрызы... І гледачы, і акцёры былі задаволены антрэпрызамі. Ды і жыццё тэатральнае бурліла! А пастановай усё гэты было перакрэслена» [196].

У далейшым паніжаючы каэфіцыент быў пакінуты толькі для тэатральна-відовішчных калектываў, якія арганізоўвалі мерапрыемствы сваімі сіламі, а таксама для мерапрыемстваў для дзяцей. Аднак застаўся вялікі спіс дзяржаўных арганізацый (якія ў 2004 г. папоўніўся арганізацыямі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі), якім згаданае пасведчанне ўвогуле не было патрэбна[1].

[1] Больш падрабязна гл. у раздзеле 5.3 «Музычнае мастацтва».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Істотнай праблемай для існаваўшых у 1990-я гг. антрэпрыз была адсутнасць стацыянарных, арэндуемых пляцовак. Гэта значна ўскладняла стварэнне пастаяннай пракатнай афішы. Калектывы ігралі свае спектаклі час ад часу. На адной сцэне Дома культуры Ф. Дзяржынскага адначасова паказвалі спектаклі антрэпрыза «Віртуозы сцэны», антрэпрыза прадзюсарскага цэнтра «Альфа-радыё» і «Нікола-тэатр». У далейшым у тэтральных праектаў з'явіліся свае арэндуемыя пляцоўкі. Гэта дазволіла больш-менш рэгулярна паказваць спектаклі. Напрыклад, тэатрам сучаснай драматургіі «Тэатральны каўчэг» за 2005/06 г. тэатральны сезон было здзейснена 42 паказы ў Мінску і 4 на гастролях і фестывалях (усяго ў рэпертуары было 6 спектакляў). Тэатрам «Кампанія» за сезон 2006/07 г. было здзейснена 23 паказы ў Мінску і 2 на гастролях (усяго ў рэпертуары было 3 спектакля) [409].

Адсутнасць у беларускіх антрэпрынёраў магчымасці мець уласныя тэатральныя будынкі нарадзіла практыку прадстаўлення дзяржаўнымі тэатрамі ўласных пляцовак для паказаў. За пэўную плату тэатральным антрэпрызам прадстаўлялася права пракату спектакляў на сцэнах стацыянарных тэатраў. Так, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы супрацоўнічаў з прадзюсарскім цэнтрам «Magic» і антрэпрызай Беларускага фонду культуры. А тэатр-студыя кінакцёра ўзаемадзейнічала з таварыствам з дадатковай адказнасцю «Новы тэатр» [409].

Спецыфіка работы калектываў тэатральнай антрэпрызы вызначалася і такім фактам, як удзел у стварэнні спектакляў запрошаных з дзяржаўных тэатраў акцёраў. Узровень занятасці апошніх у стацыянарных калектывах быў вырашальным пры планаванні пракату пастановак антрэпрызы.

Малая колькасць спектакляў у рэпертуары (ад шасці ў «Тэатральным каўчэгу» да двух у «Новым тэатры»), няўстойлівы фінансавы стан калектываў не дазвалялі беларускай антрэпрызе шырока гастраляваць у рэгіёнах [409].

У разглядаемы перыяд узнікалі нешматлікія ***прыватныя тэатры***. Амаль усе яны існавалі непрацяглы час. У 1992 г. у Гомелі быў заснаваны першы ў Беларусі прыватны Незалежны тэатр, фундатарам і апекуном якога быў прадпрымальнік Р. Фіглін. Трупа складалася з сямі пастаянных акцёраў пад кіраўніцтвам Я. Натапава і ставіла разнапланавыя спектаклі. Тэатр падтрымліваўся некалькімі фірмамі-спонсарамі, але перажыў няпросты перыяд, калі загінуў яго фундатар Р. Фіглін. Пасля смерці прадпрымальніка падтрымкай тэатра займалася яго сястра Г. Шофман. Трупа тэатра паменшылася да чатырох пастаянных акцёраў [677, с. 112]. У 1999 г. тэатр быў пераўтвораны ў Гомельскі гарадскі эксперыментальны маладзёжны тэатр-студыю.

Пачаўся новы этап і ў дзейнасці недзяржаўных тэатраў-студый. У фестывалі «Студыйныя каляды-91» прымалі ўдзел 11 тэатраў з Мінска. Плённае развіццё студыйнага руху з'явілася важнай справай у тэатральным жыцці Беларусі. Студыйны рух узбагаціў новымі фарбамі і адценнямі агульную тэатральную палітру Беларусі, унёс новыя тэатральныя ідэі, рэжысёрскія імёны, стылі, новую тэатральную эстэтыку. Лідарамі студыйнага руху сталі Р. Таліпаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. Баркоўскі, М. Трухан, У. Матросаў, В. Грыгалюнас, У. Савіцкі, В. Іназемцаў. Аднак існавалі студыі нядоўга. Непераадольнай перашкодай для іх з'явіліся матэрыяльныя цяжкасці, адсутнасць дзяржаўнай датацыі.

У 1995 г. засталося толькі пяць тэатраў-студый. Пад пагрозай знікнення знаходзіўся эксперыментальны тэатр-студыя «Арт-Цэнтр». З моманту ўзнікнення ў канцы 1987 г. ім было здзейснена 22 пастаноўкі, з якіх 12 былі адрасаваны дзецям. Тэатр пастаянна праводзіў дабрачынныя спектаклі для асобных катэгорый дзяцей – сірот, інвалідаў, з малазабяспечаных сем'яў. Шэраг гадоў кіраўніцтвам тэатра выплачваліся імянныя пенсіі і стыпендыі студэнтам Беларускай акадэміі мастацтваў. Аднак выяўленыя ў ходзе праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці тэатра парушэнні ў выплаце падаткаў прывялі да таго, што дзейнасць апошняга фактычна спынілася ў верасні 1994 г. Пры гэтым штрафныя санкцыі раслі. У 1992 г. «Арт-Цэнтр» падатковай інспекцыяй быў аднесены да малых прадпрыемстваў, што прывяло да значных змен у выплаце падаткаў. Пры гэтым тэатр не займаўся ніякай камерцыйнай дзейнасцю. А з 1 студзеня 1995 г. ён, як і ўсе тэатры-студыі, страціў ільготу па арэнднай плаце [438, спр. 55, арк. 172–174].

Гісторыя з «Арт-Цэнтрам» з'яўляецца яскравым прыкладам прычын паступовага знікнення небюджэтных тэатраў.

Побач з гэтай гісторыяй у 1994–1995 гг. лепш выглядала становішча музычнага тэатра-студыі «Казка», які працаваў на базе Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі з 1990 г. Яго дзейнасць падтрымлівалі Міністэрства культуры, Дзіцячы фонд Беларусі, Мінгарвыканкам. Так, Міністэрства культуры толькі за 1992 і 1993 гг. ажыццявіла чатыры дзяржаўныя заказы і часткова ці поўнасцю фінансавала выпуск чатырох спектакляў. Міністэрства лічыла неабходным для паўнавартаснай дзейнасці тэатра забяспечыць дзяржаўнае бюджэтнае фінансаванне штатнай трупы тэатра, а таксама пабудаваць спецыяльны будынак з адпаведным абсталяваннем. Аднак, улічваючы неспрыяльныя эканамічныя ўмовы, Міністэрства выказвалася за падтрымку дзейнасці тэатра-студыі на базе Дзяржаўнага музычнага тэатра без утрымання арэнднай платы [438, спр. 57, арк. 76].

У першай палове 1990-х гг. перыяд творчага ўздыму і матэрыяльнай стабільнасці перажываў Альтэрнатыўны тэатр (пачаў дзейнасць у 1990 г., заснавальнік, мастацкі кіраўнік і рэжысёр В. Грыгалюнас). Сваімі наватарскімі пастаноўкамі і прадуманай рэкламай тэатр прыцягваў да сябе шмат гледачоў. Дзейнасць тэатра не абмяжоўвалася толькі пастаноўкай спектакляў – вельмі важная ўвага надавалася і розным культурным акцыям: арганізацыя вечароў «Клас-клуба», «Рок-абанемент» [400], заснаванне прэміі «Рок-каранацыя» (з 1994 г.), правядзенне творчых аглядаў спектакляў (напрыклад, «Студзеньскія вечары» ў 1993 г.) [402].

Фінансаванне Альтэрнатыўнага тэатра ў першай палове 1990-х гг. было арганізавана як замкнутая самаакупная сістэма, але ў сярэдзіне 1990-х гг. у тэатра пачаліся фінансавыя цяжкасці. Новы ўладальнік памяшкання тэатра «Пріорбанк» рэзка павялічыў арэндную плату, і тэатр меў пазыкі [439, спр. 92,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арк. 126]. Гэта сітуацыя абвастрылася канфліктам паміж трупай і рэжысёрам. У пачатку 1996 г. тэатр вызваліў памяшканне і спыніў сваё існаванне, а праз некалькі месяцаў з трупы Альтэрнатыўнага тэатра быў створаны Малы тэатр пры Фондзе дапамогі развіццю культуры, які ўзначаліў акцёр І. Забара. Малы тэатр паказваў спектаклі былога Альтэрнатыўнага тэатра, а потым пачаў здзяйсняць і свае пастаноўкі. Праз некаторы час у выніку канфлікту паміж фондам і тэатрам апошні атрымаў падтрымку Беларускага саюза тэатральных дзеячаў, у памяшканні якога і выступаў. Пры Фондзе дапамогі развіццю культуры таксама існавала трупа пад назвай «Малы тэатр», што выклікала шматлікія спрэчкі [400, с. 7].

Рэдкім прыкладам арганізацыі дзяржаўнага тэатра на базе тэатра-студыі служаць гісторыя Мінскага муніцыпальнага тэатра драмы «Дзе-Я?», які вырас з тэатра-студыі пад кіраўніцтвам рэжысёра М. Трухана, адкрытага ў 1986 г. Атрыманне звання мініцыпальнага тэатра ў 1992 г. дазволіла вырашыць праблему з пастаянным памяшканнем. Мінскі гарвыканкам перадаў у арэнду тэатру залу, якая належыла кінатэатру «Радзіма». З 2003 г. гэты будынак тэатр атрымаў у маёмасць. Ад пачатку свайго існавання тэатр актыўна працаваў над нацыянальным рэпертуарам, імкнуўшыся ўвасобіць праблемы духоўнага адраджэння ў спектаклях [789, с. 62]. У памяшканні тэатра з 2003 г. функцыянавала Дзіцячая тэатральная школа, якая мела статус дзяржаўнай. У чэрвені 2004 г. тэатр змяніў сваю назву на Новы драматычны тэатр г. Мінска.

Адна з яскравых рыс перамен у беларускім тэатры 1990-х гг. – змена рэпертуару. На яго ў новых умовах станоўча паўплывала дэмакратызацыя ***рэпертуарнай палітыкі*** Міністэрства культуры. У 1991 г. загадам міністра культуры было зацверджана новае «Палажэнне аб рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі пры Савеце па мастацтве Міністэрства культуры Беларусі». У гэтым дакументе былі вызначаны асноўныя напрамкі дзейнасці калегіі, дакладна акрэслены яе функцыі. У «Палажэнні» калегія была названа «дзяржаўна-грамадскім экспертным фарміраваннем», склад якога пераглядаўся кожныя тры гады. Галоўная мэта дзейнасці калегіі – «ажыццяўленне курсу нацыянальнай палітыкі ў галіне рэпертуарнай дзейнасці драматычных і лялечных тэатраў, аказанне арганізацыйна-творчай дапамогі ў стварэнні новых твораў беларускай драматургіі і сцэнічнага мастацтва (дзяржзаказы на п’есы, інсцэніроўкі і спектаклі), папаўненне рэпертуару тэатраў лепшымі п’есамі сусветнай драматургіі ў перакладзе на беларускую мову» [438, спр. 2051, арк. 86].

З дакумента яскрава відаць, як змянілася роля калегіі Міністэрства ў адносінах «творца – дзяржава». Фактычна яна страціла функцыю нагляду над усім рэпертуарам тэатраў і канцэртных устаноў. Калегія атрымала права пасля абмеркавання рэкамендаваць Міністэрству заключыць дагавор на стварэнне п’ес ці спектакляў, прымаць п’есы, створаныя па дагаворы, набываць гатовыя творы, заказваць пераклад. Міністэрства заключала дагаворы дзяржзаказу галоўным чынам з членамі Саюза пісьменнікаў альбо з аўтарамі, рэкамендаванымі тэатрамі, Рэспубліканскім тэатрам-лабараторыяй беларускай драматур-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гіі, журы драматургічных конкурсаў і г. д. Старшыня калегіі разам з кіраўніцтвам тэатра-заказчыка выпрацоўваў памеры ганарару, які выплачваўся аўтару. Па загадзе Міністэрства ў склад калегіі ўвайшлі 8 чалавек (2 супрацоўніка Міністэрства, 2 – Інстытута мастацтвазнаўства і фальклора Акадэміі навук Беларусі, мастацтвазнаўцы, рэжысёр, драматург і г. д.) [438, спр. 2051, арк. 87–88].

У сувязі са зменамі ў структуры органаў дзяржаўнага кіравання ў перыяд 1995–1996 гг. гэта фарміраванне не дзейнічала. У канцы 1996 г. была створана рэпертуарна-рэдакцыйная калегія па драматургіі аддзела тэатраў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Палажэнне аб ёй амаль нічым не адрознівалася ад папярэдняга. Адзіны момант – папярэдняя калегія існавала пры савеце па мастацтве і пераабіралася раз у тры гады, новая – пры аддзеле тэатраў і пераабіралася раз у два гады [36].

Аналіз развіцця драматургіі і сцэнічнага мастацтва першай паловы 1990-х гг. сведчыць аб значных зрухах. Сакавіцкая 1995 г. калегія Міністэрства культуры і друку адзначала, што творчай адметнай рысай дзейнасці некаторых калектываў стала іх імкненне пашырыць сродкі сцэнічнай выразнасці, аднавіць мову тэатральных прадстаўленняў. Мастацкаму эксперыменту ў пэўнай ступені спрыялі працэс свабоднай міграцыі рэжысёрскіх і акцёрскіх кадраў, магчымасць ствараць часовыя творчыя акцёрскія ансамблі па прынцыпе творчага аднадумства [37].

У новых сацыяльна-палітычных умовах існавала выразная неабходнасць стварэння свайго ўласнага нацыянальнага рэпертуару, які б адлюстроўваў надзённыя праблемы сучаснасці і слаўныя старонкі гісторыі. Міністэрства культуры і Саюз тэатральных дзеячаў у 1990-я гг. сумесна правялі некалькі творчых конкурсаў, якія стымулявалі стварэнне п’ес беларускімі драматургамі. У 1995 г. такі конкурс прайшоў пад дэвізам «Гісторыя і сучаснасць», на ім было прадстаўлена 40 п’ес, у 1997 г. – пад дэвізам «Чалавек і час» (92 творы), у 2000 г. – «Дыялогі вякоў» (90 п’ес), у 2002 г. – «Чалавек і грамадства», у 2004 г. – «Дзень Перамогі».

З ростам цікавасці да беларускай драматургіі нарадзілася ідэя стварыць тэатр, на сцэне якога маглі б здзяйсняцца пастаноўкі твораў маладых аўтараў, якія не маглі прэтэндаваць на акадэмічныя падмосткі, дзе значна цяжэй эксперыментаваць. Такім тэатрам стаў Дзяржаўны тэатр-лабараторыя нацыянальнай драматургіі «Вольная сцэна» пад кіраўніцтвам рэжысёра В. Мазынскага, які адкрыўся ў Мінску ў 1992 г. прэм’ерай спектакля «Ку-ку». Аўтарам п’есы быў прыкуты да ложка М. Арахоўскі, які ў 1991 г. даслаў яе на конкурс драматургічных твораў. У творы элементы рэалістычнага пісьма арганічна спалучаліся з авангардызмам.

Падрыхтоўка спектакля ў гэтым тэатры адбывалася нетрадыцыйным чынам. Малады драматург, твор якога быў абраны для пастаноўкі, на некалькі месяцаў залічваўся ў склад трупы і быў удзельнікам пастановачнага працэсу. Гэта дазваляла яму атрымліваць практычны вопыт вырашэння сцэнічных праблем. Часам наўмысна ў гэтым тэатры ўшчамляліся асобныя інтарэсы акцёраў і нават



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гледачоў, але ўсё працавала на драматурга [706, с. 3]. Адной з самых галоўных мэт дзейнасці тэатра было адкрыццё новых імёнаў у беларускай драматургіі, праца з маладымі драматургамі і распрацоўка новых напрамкаў і мастацкіх сродкаў у тэатры. Таму спектаклі Тэатра-лабараторыі так не падобны адзін да аднаго, як і іх аўтары. Былі пастаўлены п'есы І. Сідарука «Галава», Р. Баравіковай «Барбара Радзівіл», У. Рудава «Брат мой, Сымоне», С. Кавалёва «Заложніца кахання», М. Адамчыка і М. Клімковіча «Віта брэвіс, або Нагавіцы святога Георгія», «Прынц Мабук» А. Дударава, «Узлёт кар'еры Артура VI» паводле Б. Брэхта і інш. [789]. У 2000 г. рэжысёр В. Мазынскі цалкам сыходзіць са структуры Дзяржаўнага тэатра, і яго праект «Вольная сцэна» набывае прыватны характар. Дзяржаўны Тэатр-лабараторыя пераўтвараецца ў тэатр беларускай драматургіі.

У снежні 1998 г. на калегіі Міністэрства культуры абмяркоўвалася пытанне заключэння дагавораў з беларускімі драматургамі на стварэнне п'ес у рамках драматургічнага цыкла «Гістарычныя хронікі Беларусі 12–19 стст.», якія павінны былі ствараецца на сродкі гранта Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Было абрана для фінансавання тры п'есы з шасці прапанаваных (А. Дударава «Чорная панна», С. Кавалёва «Смерць Мельпамены», У. Бутрамеева «Казімір Лышчынскі»).

Большасць гістарычных твораў беларускай драматургіі 1990-х гг. прысвячалася пераломным момантам у беларускай гісторыі і знакамітым яе асобам. Творчае пераасэнсаванне падзей старажытнасці дало штуршок для развіцця нацыянальнага тэатра. З 1991 па 2001 г. на сцэнах беларускіх тэатраў было пастаўлена 7 аўтарскіх п'ес, прысвечаных гісторыі Беларусі, дзве інсцэніроўкі, адна опера і адзін балет. Больш за ўсё драматургаў і рэжысёраў цікавілі вобразы Рагнеды (спектаклі паводле п'ес «Звон – не малітва» І. Чыгрынава, «Уладзімір і Рагнеда» А. Дударава, балет «Жарсці» А. Мдзівані), Ягайлы і Вітаўта («Купала» А. Дударава і інсцэніроўка паэмы «Песня пра зубра» М. Гусоўскага), Барбары Радзівіл («Барбара Радзівіл» Р. Баравіковай і «Чорная панна Нясвіжа» А. Дударава). Цэлыя тры пастаноўкі перажыла п'еса С. Кавалёва «Саламея». Большасць узгаданых вышэй спектакляў была створана з дапамогай мэтавай падтрымкі Міністэрства культуры або па дзяржаўным заказе [635, с. 24].

У сувязі са складаным эканамічным становішчам, у якім знаходзіліся тэатры ў канцы 1990-х гг., назіралася зніжэнне колькасці новых пастановак. Пры гэтым усё больш значную ролю ў творчасці тэатраў набываў дзяржаўны заказ, але і ён змяншаўся: калі раней стваралася да 20 пастановак, то ў 1999 г. – толькі 12, а ў 2000 г. – 9. Па гэтай і іншых прычынах заставаўся мала выкарыстаны рэпертуарны «партфель» сучаснай беларускай драматургіі, аснову якога складалі п'есы пераможцаў конкурсу на стварэнне п'ес для тэатраў. На конкурс, які праходзіў у 2000 г. пад лозунгам «Дыялог вякоў», было прадстаўлена 90 драматычных твораў, з якіх 20 былі адзначаны ўзнагародамі і прапанаваны тэатрам. Па выніках конкурсу быў падрыхтаваны чарговы (шосты) выпуск

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

альманаха «Беларуская драматургія – 2000», Міністэрствам было набыта 24 новых арыгінальных і перакладных твора [439, спр. 414, арк. 11].

З прычыны таго, што пастаноўка оперных спектакляў патрабавала ўкладання вялікіх сродкаў (яны значна даражэйшыя за іншыя тэатральныя пастаноўкі), оперны тэатр актывізаваў пастаноўку твораў у канцэртна-сцэнічным выкананні. Сярод такіх пастановак былі оперы «Моцарт і Сальеры» М. Рымскага-Корсакава (1991), «Барыс Гадуноў» М. Мусаргскага (1998), «Паяцы» Р. Леанкавала (1998), «Набука» Дж. Вердзі (1999), «Фауст» А. Радзівіла (1999). Неабходна прызнаць, што выкананне оперы ў канцэртным варыянце (калі адсутнічаюць дэкарацыі, абмежавана драматычнае дзейства) значна саступала традыцыйнаму. Аднак такі варыянт падрыхтоўкі спектакляў дазваляў хутчэй узбагачаць рэпертуар (оперныя пастаноўкі звычайна рыхтуюцца па некалькі гадоў), лягчэй вывозіць спектаклі на міжнародныя фестывалі, у якіх з сярэдзіны 1990-х гг. усё актыўней пачаў удзельнічаць Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы. Гэта паўплывала і на пачатак пастановак опер на мове арыгіналу («Тоска» Дж. Пучыні (1995), «Лючыя ды Ламермур» Г. Даніцэці на італьянскай мове (1999) і інш.).

У тэатральна-музычнай творчасці аўтары звярнуліся да сусветнай і рускай класікі: камічныя оперы «Юбілей» і «Мядзведзь» С. Картэса паводле А. Чэхава (2002, 2009), камерны балет-сімвал «Макбет» В. Кузняцова паводле У. Шэкспіра (2000), аднаактовая опера «Запіскі вар'ята» В. Кузняцова паводле М. Гогаля (2005).

Працягваўся працэс стварэння і пастаноўкі *оперных твораў* сучасных беларускіх кампазітараў (оперы Я. Глебава «Майстар і Маргарыта» (1992), С. Картэса «Візіт дамы» (1995) [730, с. 343]. У снежні 1992 г. адбылася прэм'ера оперы «Князь Наваградскі» кампазітара А. Бандарэнкі на лібрэта В. Іпатавай па п'есе Л. Пракопчыка, створанай па дзяржаўным заказе з боку Міністэрства культуры [399]. Нягледзячы на некаторыя недахопы оперы, «Князь Наваградскі» – адлюстраванне новай тэндэнцыі ў сучаснай музыцы: пранікненне нацыянальнай тэматыкі і гістарычных вобразаў не толькі ў творы малой, але і вялікай музычна-драматургічнай формы, працэс фарміравання нацыянальнай试 купнай і балетнай музычнай школы. У 1994 г. А. Бандарэнка быў удастоены Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за гэты твор, аднак па некаторых прычынах опера «Князь Наваградскі» была знята з рэпертуару [392, с. 429].

На працягу 1990-х гг. быў пастаўлены толькі адзін вялікі *балет, напісаны беларускім кампазітарам*, – «Жарсці» («Рагнеда») А. Мдзівані. Ажыццявіў пастаноўку, прэм'ера якой адбылася 28 ліпеня 1995 г., балетмайстар В. Елізар'еў. Лібрэта створана на сюжэт з беларускай гісторыі. Балет «Жарсці» – адна з самых адметных з'яў ва ўсім беларускім мастацтве 1990-х гг., твор, які быў высока ацэнены ў свеце. Міжнародная асацыяцыя танца ў Парыжы адзначыла калектыў тэатра балета прэміяй «Бенуа дэ ла данс», назваўшы пастаноўку балета «Жарсці» лепшай у свеце за 1995 г. Калектыў стваральнікаў быў

адзначаны Дзяржаўнай Прэміяй Рэспублікі Беларусь [850, с. 343–344]. Акрамя балета «Жарсці» ў рэпертуары Нацыянальнага тэатра балета існавалі толькі два невялікія спектаклі на музыку беларускіх кампазітараў – аднаактовыя балеты «Кругаверць» А. Залётава (1996) і «Макбэт» В. Кузняцова (2000).

Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі (з 2000 г. – заслужаны калектыў Беларускі дзяржаўны музычны тэатр Рэспублікі Беларусь, у 2009 г. тэатр атрымаў статус акадэмічнага) у 1990-я гг. ажыццявіў пастаноўку толькі двух твораў беларускіх кампазітараў – мюзіклаў У. Кандрусевіча «Джулія» (1991) і «Шклянка вады» (1994). Заставалася ў рэпертуары музычная камедыя Я. Глебава «Міліянерка», да 1994 г. на працягу 15 сезонаў ішла народная камедыя Р. Суруса «Несцерка». Ні адзін з новых спектакляў не грунтаваўся на нацыянальным матэрыяле. Творы беларускіх кампазітараў увогуле на сцэне тэатра ставіліся вельмі рэдка і існавалі ўсяго па некалькі сезонаў (выключэннем стала «Шклянка вады», якая заставалася ў афішы тэатра на працягу ўсяго перыяду даследавання). Большасць рэпертуару гэтага тэатра ў 1990-я гг. складалі класічныя і савецкія аперэты. Мюзікл У. Кандрусевіча «Джулія» быў пастаўлены ў музычным тэатры ў сезоне 1991/92 г., пасля таго, як праляжаў каля дзесяці гадоў на паліцы.

Некаторы час на базе Тэатра музычнай камедыі існаваў самастойны калектыў – дзіцячы музычны тэатр «Казка», створаны ў 1991 г. Гэты калектыў падрыхтаваў некалькі твораў: «Гісторыя Кая і Герды» С. Баневіча, «Дзіцячы альбом» П. Чайкоўскага, оперу «Вясновая песня» і мюзікл «Прыгоды ў замку Алфавіт» беларускага кампазітара В. Войціка. У 1996 г. тэатр спыніў свае існаванне [850, с. 344–346].

Каля года ішоў на сцэне тэатра дзіцячы спектакль «Калі заспявае певень» (музыка А. Чыркуна, лібрэта Г. Марчука), створаны тэатрам «Казка» па дзяржаўным заказе на нацыянальным матэрыяле. Аднак крытыкі адзначылі вельмі нізкі мастацкі ўзровень гэтага спектакля, і кіраўніцтва тэатра зняло яго з пракату. Неабходна прызнаць, што за гэты перыяд значна ўзняўся ўзровень прафесіяналізму балетнай трупы тэатра, на базе якой у 1992 г. узнік самастойны харэаграфічны калектыў «Мінск-балет», які ажыццявіў пастаноўку некалькіх аднаактовых балетаў [392, с. 432].

Адметная асаблівасць тэатральнага жыцця 1990 – пачатку 2000-х гг. – шматлікія пастаноўкі класічнай беларускай драматургіі. Значнае месца занялі творы В. Дуніна-Марцінкевіча: «Ідылія» («Сялянка») у Тэатры імя Янкі Купалы (рэж. М. Пінігін), «Залёты» ў Тэатры імя Якуба Коласа (рэж. Ю. Лізянгевіч), «Пінская шляхта» ў Тэатры імя В. Дуніна-Марцінкевіча (рэж. С. Палешчанкоў), Тэатры юнага гледача (рэж. Р. Баравік) і Тэатры імя Янкі Купалы (рэж. М. Пінігін), «Вечары ў Люцынцы» ў Тэатры імя В. Дуніна-Марцінкевіча (рэж. У. Караткевіч). Вялікай папулярнасцю карысталіся творы Янкі Купалы: «Тутэйшыя» ў Тэатры імя Янкі Купалы (рэж. М. Пінігін) і Гродзенскім Тэатры лялек (рэж. М. Андрэеў), «Раскіданае гняздо» ў Тэатры імя М. Горкага (рэж. Б. Лу-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэнка) і ў Мінскім абласным тэатры (рэж. В. Баравік), «Паўлінка» ў Гомельскім і Гродзенскім тэатрах, «Прымакі» ў Тэатры юнага гледача і Мінскім абласным тэатры, «Адвечная песня» ў Тэатры беларускай драматургіі.

Новае тэатральнае жыццё набыла драматургія Ф. Аляхновіча. Прапагандыстам і папулярызатарам яго твораў стаў рэжысёр М. Трухан, які ў мінскім тэатры «Дзе-Я?» ажыццявіў пастаноўкі «Чорт і баба» (з В. Баркоўвскім), «Здань», «Круці…», «У кіпцюрах ГПУ». У Маладзечне была пастаўлена п’еса «Пан міністр» (рэж. В. Растрыжэнкаў), у тэатры-студыі «Абзац» і Беларускім універсітэце культуры – «Нясконченая драма» (рэж. У. Савіцкі).

Пераважная большасць згаданых спектакляў ішла на ***беларускай мове***. Менавіта ў першай палове 1990-х гг. паступова больш актыўна пачалі ў рамках дзяржзаказу ажыццяўляць пастаноўку беларускамоўных спектакляў. У 1994 г. такім чынам было падрыхтавана 19 спектакляў. Сродкі, запланаваныя на гэту дзейнасць на 1995 г., дазвалялі выканаць толькі 60% гадавога аб’ёму работ. Дзяржаўная датацыя, выдзеленая на 1995 г. тэатральна-відовішчным прадпрыемствам, магла забяспечыць іх патрэбы толькі на 55 % [438, спр. 10, арк. 87]. З сярэдзіны 1990-х гг. колькасць беларускамоўных пастановак пачала зніжацца. Дадзеныя табл. 3 аб гэтым яскрава сведчаць. Калі ў 1994–1995 гг. доля апошніх складала адпаведна 46 і 49 %, то ў наступныя гады гэты паказчык складаў: у 1996 і 1998 гг. – 44 %, у 1997 г. – 45, 1999 і 2001 гг. – 40, 2000 г. – 37, 2003 г. – 34 і 2007 г. – 28 %. Пры гэтым неабходна ўлічваць, што лічбы адносна кожнай з абласцей выглядаюць па-рознаму: калі абласныя тэатры Віцебска і Мінска працавалі выключна на беларускай мове (100 %), то гомельскія і магілёўскія тэатры рыхтавалі самую малую колькасць пастановак (але не паказаных спектакляў!) на беларускай мове – у 1998 г. яны складалі адпаведна 16 і 9 % ад агульнай колькасці [368, с. 108].

*Табліца 3.* **Спектаклі на беларускай мове**[1] **[271; 621, с. 43; 751, с. 18; 796, с. 38]**

| Вобласць | Доля спектакляў на беларускай мове, % | | | | | | | | Доля гледачоў на беларускамоўных спектаклях, % | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1994 | 1995 | 1997 | 1999 | 2001 | 2003 | 2005 | 2007 | 1994 | 1995 | 1996 | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001 | 2003 | 2005 | 2007 |
| Брэсцкая | 40 | 47 | 58 | 15 | 23 | 5 | 13,4 | 12 | 46 | 50 | 32 | 52 | 38 | 12 | 10 | 20 | 4,6 | 16,2 | – |
| Віцебская | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 93 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | 100 | |
| Гомельская | 33 | 39 | 27 | 27 | 17 | 11,5 | 5,3 | 12 | 24 | 26 | 17 | 25 | 16 | 17 | 9 | 13 | 11 | 3 | |
| Гродзенская | 37 | 39 | 35 | 33 | 28 | 27 | 10,9 | 17 | 33 | 35 | 33 | 29 | 29 | 27 | 31 | 25 | 20 | 9 | |
| Магілёўская | 14 | 22 | 11 | 9 | 10 | 2,5 | 4,7 | 3 | 13 | 16 | 13 | 8 | 9 | 8 | 6 | 9 | 2,6 | 4 | |
| Мінская | 98 | 100 | 100 | 88 | 100 | 97,5 | 84,5 | 66 | 96 | 100 | 100 | 100 | 100 | 92 | 98 | 100 | 98 | 92,1 | |
| г. Мінск | 48 | 47 | 44 | 44 | 46 | 40 | 39,7 | 35 | 36 | 33 | 34 | 33 | 32 | 31 | 29 | 34 | 30 | 30,5 | |
| **Па краіне** | **46** | **49** | **45** | **40** | **40** | **34** | **32,8** | **28** | **37** | **38** | **36** | **36** | **35** | **31** | **29** | **32** | **28** | **28** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2007 г. у рэпертуары тэатраў краіны было 912 пастановак, з іх 281 (30 %) – на беларускай мове. Новых пастановак на беларускай мове – 40. Неабходна адзначыць, што ў Віцебскай вобласці ўсе пастаноўкі ішлі на беларускай мове (65). Аднак статыстыка агульнай колькасці спектакляў дае толькі 93 %. Гэта тлумачыцца ўлікам спектакляў, якія былі пастаўлены гастралёрамі. На статыстычныя паказчыкі па Мінскай вобласці акрамя гастралёраў значнае ўздзеянне аказвала творчасць Драматычнага тэатра Беларускай арміі, у якім усе пастаноўкі ішлі на рускай мове. З 58 пастановак для Мінскай вобласці 46 ішлі на беларускай мове (79 %) [612, с. 43].

Нягледзячы на відавочныя дасягненні, ***творчая сітуацыя*** ў тэатральным мастацтве не выклікала задавальнення ў тэатральных крытыкаў і чыноўнікаў. Ацэнку становішча першай паловы 1990-х гг. даў вядомы мастацтвазнаўца Р. Б. Смольскі: «адной з цэнтральных прынцыпова важных праблем творчага працэсу стала аб'ектыўная неабходнасць перабудовы тэатральнай свядомасці. […] Сённяшнія пакаленні рэжысёраў, драматургаў, акцёраў, мастакоў і іншых творцаў выгадаваны пэўнай тэатральнай сістэмай. […] Канфармізм, кан'юнктурнасць і іншыя «хваробы» не спрыялі раскрыццю ўсяго мастакоўскага патэнцыялу беларускіх рэжысёраў, драматургаў, акцёраў. […] Першая палова гэтага дзесяцігоддзя прайшлі пад знакам відавочнага крызісу беларускай рэжысуры. Фактычна ні адзін з вядучых беларускіх рэжысёраў (В. Раеўскі, Б. Луцэнка, В. Маслюк, В. Мазынскі і інш.) у гэты перыяд не стварыў ні аднаго безумоўна ўдалага спектакля. Толькі дзве пастаноўкі Мікалая Пінігіна на купалаўскай сцэне («Тутэйшыя» Я. Купалы, «Ідылія» В. Дуніна-Марцінкевіча) выклікалі вялікую цікавасць гледачоў і мелі значны грамадскі рэзананс. За пастаноўку «Тутэйшых» М. Пінігін быў справядліва адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь» [731, с. 399–400].

З вядомым крытыкам было салідарна і Міністэрства культуры. На калегіі ў кастрычніку 1996 г. разглядалася пытанне аб выніках тэатральнага сезона 1995–1996 гг. у драматычных тэатрах рэспублікі [11]. Была адзначана практычная адсутнасць яркіх перспектыўных дэбютаў у рэжысуры, акцёрскім майстэрстве, сцэнаграфіі, што сведчыла аб вастрыні праблемы творчай моладзі і звязаных з гэтым перспектывах развіцця ўсяго айчыннага мастацтва. У новых умовах, калі адбывалася пераарыентацыя эстэтычных густаў, змяніліся адносіны да традыцыйных мастацкіх каштоўнасцей, структура тэатральнай аўдыторыі, скарачаліся бюджэтныя выдаткі на культуру, стаяла задача пошуку сацыяльна-аптымальных шляхоў рэканструкцыі тэатра, стварэння фінансавага механізма падтрымкі якаснага мастацтва, а не проста агульнага фінансавання ўстаноў культуры. На калегіі выказвалася думка аб тым, што далейшаму развіццю тэатральнай справы магло б садзейнічаць існаванне розных мадэляў тэатра, рознай формы ўласнасці, нацыянальнай прыналежнасці і г. д. Чакалася, што гэта ўнясе ў беларускую тэатральную культуру новыя жыватворныя імпульсы і элемент творчага спаборніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адным з рашэнняў калегіі было правядзенне выязнога пасяджэння ў сакавіку 1997 г. па пытанні вытворча-творчай дзейнасці Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы [42]. У рашэнні вялікая ўвага была звернута на недахопы: выпадковасць у выбары рэпертуару, недастаткова ўзважаныя рашэнні аб пастаноўцы спектакляў, запрашэнні не самых лепшых рэжысёраў і сцэнографаў, неапраўданасць пераносу студэнцкіх тэатральных работ на акадэмічную сцэну, доўгія прастоі штатнай рэжысуры, вельмі малое месца мастацкага савета тэатра ў вырашэнні творчых пытанняў, дрэнная дзейнасць літаратурнай часткі тэатра. Прычына бачылася ў страце калектывам дакладных канцэптуальных падыходаў у фарміраванні рэпертуарнай палітыкі, адсутнасці прадуманай, перспектыўнай праграмы мастацкай дзейнасці, заняпадзе практыкі цесных кантактаў з аўтарскім актывам. Па выніках 1996 г. запаўняльнасць глядзельнай залы складала 57,6 %.

Звярталася ўвага на пагаршэнне сітуацыі адносна твораў беларускіх аўтараў. Калі ў 1995 г. беларуская драматургія ў рэпертуары тэатраў займала 36,3 %, то ў 1996 г. – 26,9 %. Чатыры з сямі спектакляў па п’есах беларускіх аўтараў мелі ўзрост ад 6 да 17 гадоў. Гэта дало падставы для вываду аб пасіўных адносінах тэатра да сваіх асноўных прыярытэтаў. У першую чаргу гэта тычылася работы, звязанай з прапагандай нацыянальна-культурнай спадчыны, фарміравання сродкамі сучаснага рэпертуару нацыянальнай самасвядомасці народа. Вывады пацвярджаліся матэрыяламі сацыялагічнага даследавання канца 1996 г. Вялікай праблемай было невыкананне планаў выпуску новых спектакляў, творчыя прастоі рэжысёраў. В. Раеўскі за перыяд з 1992 па 1996 г. выпусціў толькі адзін спектакль («Ромул Вялікі» Ф. Дзюрэнмата). На працягу больш за тры гады не было новых пастановак М. Пінігіна. Тэатр некалькі разоў пераносіў тэрміны здачы спектакля «Купала» А. Дударава, работу над якім пачаў па дзяржаўным заказе ў лістападзе 1994 г. У рашэнні калегіі побач з канкрэтнымі караючымі мерамі (вымова мастацкаму кіраўніку В. Раеўскаму, рэкамендацыя перагледзець кантракт з дырэктарам тэатра І. Вашкевічам) былі агульныя рэкамендацыі кшталту: распрацаваць прапановы ў галіне падрыхтоўкі і выхавання тэатральных спецыялістаў неабходнага профілю, узмацніць кантроль за работай падпарадкаваных Міністэрству тэатраў, пашырыць практыку дзяржаўнага заказу на беларускую драматургію.

Сярод канкрэтных прапаноў была арганізацыя цыкла сумесных семінараў рэжысёраў, драматургаў, філосафаў, гісторыкаў і тэатразнаўцаў на тэму «Беларускі тэатр, яго месца, стан, праблемы развіцця», падрыхтоўка Праграмы перспектыўнага развіцця тэатра як цэнтра нацыянальнай тэатральнай культуры.

Упраўленням культуры аблвыканкамаў і Мінгарвыканкама сумесна з падпарадкаванымі тэатрамі прадпісвалася карэнным чынам павысіць ролю і адказнасць кіраўніцтва тэатраў у справе фарміравання высокаякаснага рэпертуару, прыёмцы новых пастановак, аналізе стану афішы і пракату спектакляў. На кіраўніцтва тэатраў ускладаўся абавязак аднаўлення арганізаванай работы з гледачамі з мэтай вывучэння запатрабаванняў насельніцтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праблемы рэпертуару тэатраў і ў далейшым неаднаразова разглядаліся на ўзроўні Міністэрства культуры і ўсіх зацікаўленых.

У снежні 1999 г. на калегіі Міністэрства было разгледжана пытанне ***прыярытэтных напрамкаў развіцця тэатральнай справы*** ў Рэспубліцы Беларусь. На ёй былі падведзены вынікі выканання прынятых у 1989 г. «Напрамкаў развіцця тэатральнай культуры ў Беларусі» і ўхвалена канцэпцыя прыярытэтных напрамкаў развіцця тэатральнай справы на бліжэйшы перыяд [439, спр. 284, арк. 34]. Канцэпцыя адзначала, што на бліжэйшую перспектыву асновай сцэнічнага мастацтва Беларусі будуць з'яўляцца дзяржаўныя, рэпертуарныя, з пастаяннай трупай тэатры. У дакуменце звярталася ўвага на нізкую забяспечанасць тэатрамі на 1 млн насельніцтва. У Беларусі гэта лічба (калі ўлічваць і недзяржаўныя трупы) у 1999 г. складала 3 тэатры. У той час, як у Аўстрыі – 24 тэатры на 1 млн насельніцтва, у Швецыі – 13,6, у Францыі – 9,6, у Англіі – 8,9, у Расіі – 3,2 тэатры. Не лепш выглядала становішча і ў параўнанні г. Мінска з еўрапейскімі сталіцамі. У г. Мінску на 1 млн насельніцтва прыходзілася 10 тэатраў, у г. Маскве – 20, у Вене – 63. Колькасць тэатраў – яскравы паказчык стану і ўзроўню культурных і эканамічных умоў у той ці іншай краіне. Таму праблема пашырэння дзяржаўнай тэатральнай сеткі, па меркаванні распрацоўшчыкаў канцэпцыі, з'ўлася не толькі ўласнай праблемай тэатральнай культуры Беларусі, але і пытаннем прэстыжу нашай краіны. У якасці шляхоў вырашэння праблемы рэкамендавалася мясцовым органам культуры пры стварэнні тэатральнага асяродку абапірацца на існуючыя самадзейныя творчыя калектывы, народныя, узорныя тэатры як прыступкі для пераходу ў статус прафесійнага тэатра. Канцэпцыя прапаноўвала прааналізаваць магчымасць стварэння прафесійных тэатральных труп у гарадах Баранавічы, Пінск, Барысаў, Полацк, Ліда, Светлагорск [439, спр. 284, арк. 41–42].

У якасці прыярытэтнай задачы для дзяржаўных органаў культуры, грамадскіх арганізацый і творчых саюзаў называлася далейшае развіццё нацыянальнага сцэнічнага мастацтва, яго далучэнне да творчага вопыту і мастацкіх здабыткаў іншых тэатральных культур свету, удасканаленне працэсу беларусізацыі ў сферы тэатра. Паспяховасць вырашэння праблемы звязвалася з правядзеннем адпаведнай ганарарнай палітыкі, дзяржзаказаў, конкурсаў, актывізацыяй працы абласных тэатраў з беларускімі драматургамі на мове арыгінала, стварэннем спрыяльных умоў для творчай працы маладых драматургаў, пастаянна дзеючых майстар-класаў вядомых літаратараў.

У сферы падрыхтоўкі кадраў для тэатральнай культуры канцэпцыя называла ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы творчых ВНУ, адкрыццё новых спецыяльнасцей (загадчык пастановачнай часткі, грымёр, бутафор), стварэнне ў Беларускай акадэміі мастацтваў факультэта падрыхтоўкі творчых кадраў (мастацкі кіраўнік і галоўны рэжысёр, галоўны мастак), арганізацыя ў Мінску і абласных цэнтрах ліцэяў з тэатральна-мастацкім ухілам, правядзенне стажыровак у замежных цэнтрах тэатральнай культуры. У мэтах развіцця і ўзбагачэння тэатральнага працэсу новымі ідэямі, думкамі, творчымі праектамі пра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дугледжвалася праводзіць навукова-творчыя канферэнцыі, сімпозіумы, сацыялагічныя даследаванні, удасканаліць сістэму тэатральных фестываляў [279].

Новыя *«Прыярытэтныя напрамкі развіцця тэатральнай справы»* былі зацверджаны на ліпеньскім 2001 г. пасяджэнні калегіі [439, спр. 414, арк. 12, 20–36].

Палітыка дзяржавы ў галіне тэатральнага мастацтва на перыяд 2001–2005 гг. была акрэслена ў *Дзяржаўнай праграме «Функцыяніраванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года».* У ёй было закладзена патрабаванне ад тэатральных дзеячаў актыўных намаганняў у пошуках новага зместу і новай сцэнічнай мовы ў адлюстраванні рэчаіснасці і спасціжэнні таямніц быцця, пераасэнсавання месца, функцыі, ролі тэатральнага мастацтва ў грамадскіх стасунках.

Праграма падкрэслівала неабходнасць ажыццяўлення далейшай падтрымкі дзяржаўных, стацыянарных рэпертуарных тэатраў, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, падтрымку беларускай драматургіі, удасканаленне сістэмы падрыхтоўкі кадраў для тэатра, прыняцце Закона «Аб тэатральнай дзейнасці», пошук навукова абгрунтаванага нарматыўнага падыходу да разліку датацыі для кожнага тэатра, увядзенне дагаворна-кантрактнай сістэмы для работнікаў, развіццё і ўдасканаленне разнастайных форм унутранага самакіравання [208, с. 33].

*Галіновая праграма «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.»* сярод прыярытэтных пытанняў, патрабуючых вырашэння, называла: павышэнне мастацкага ўзроўню спектакляў, якія грунтуюцца на змястоўнай драматургіі, спалучаюць у сабе яркую сцэнаграфію і касцюмы, вызначаюцца акцёрскім прафесіяналізмам і самастойнымі рэжысёрскімі канцэпцыямі; актывізацыю намаганняў па фарміраванні аўдыторыі гледача, рост грамадскай цікавасці да тэатра; значнае пашырэнне гастрольнай дзейнасці ў краіне і за яе межамі; умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы тэатраў на аснове сучасных тэхналогій; арганізацыю падрыхтоўкі кадраў галіны на ўзроўні сучасных патрабаванняў і інш. У якасці плануемых вынікаў былі вызначаны: ахоп тэатральным абслугоўваннем шырокага кола насельніцтва Беларусі як буйных, так і малых гарадоў, населеных пунктаў сельскай мясцовасці, якія маюць тэатральныя пляцоўкі; павелічэнне аўдыторыі гледача ў цэлым на 10 %; павелічэнне ў структуры тэатраў твораў сучаснай і класічнай нацыянальнай драматургіі, удзельная вага якой складзе 45 % [168, с. 36–37].

У кастрычніку 2006 г. прайшла сустрэча міністра культуры Рэспублікі Беларусь з тэатральнымі творцамі. У сваім дакладзе начальнік упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь М. Казловіч адзначаў: «Першая і самая галоўная праблема рэпертуару дзяржаўных тэатраў Беларусі – недастатковы ахоп усіх сацыяльных слаёў глядацкай аўдыторыі. Адсутнасць ці малая колькасць у рэпертуары кампактных і дынамічных спектакляў, прызначаных для выезду ў раённыя цэнтры і сельскую мясцовасць, не задавальняе ў поўнай меры культурныя запатрабаванні сельскіх жыхароў, а тэатры пазбаўляе значнай часткі аўдыторыі» [425]. У якасці прыкладаў прыводзіўся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гомельскі абласны драматычны тэатр, які займаў месца лідара ў рэспубліцы па выязной дзейнасці, меў у выніку ў бягучым рэпертуары 45 спектакляў. Нацыянальны Тэатр імя Я. Коласа – 39. У ТЮГу, Рускім тэатры, Магілёўскім абласным, Маладзёжным тэатрах колькасць спектакляў была ўдвая меншая.

М. Казловіч звяртаў увагу на тое, што наспела вострая неабходнасць актыўнага ўключэння ўсіх дзяржаўных тэатральных калектываў (пры мінімальнай падтрымцы дзяржавы) у тэрытарыяльнае абслугоўванне рэгіёнаў. У сувязі з гэтым асаблівай увагі патрабавалі маладыя тэатры – Слонімскі драматычны тэатр (створаны ў 1990 г.), Мінскі абласны драматычны тэатр у г. Маладзечне (1991), Палескі драматычны тэатр у г. Пінску (2006). Нават іх месцазнаходжанне паказвае на тое, што асновай іх дзейнасці павінны стаць выезды ў рэгіёны. Адзначалася, што тэатры павінны імкнуцца да таго, каб іх спектаклі былі запатрабаваны ў бліжэйшых раённых цэнтрах, у сельскай мясцовасці. Аснову рэпертуару гэтых тэатраў складала беларуская драматургія на беларускай мове, таму правільна выбраная рэпертуарная скіраванасць павінна была атрымаць далейшае развіццё. Карэннай праблемай выязной дзейнасці кожнага тэатра, на думку М. Казловіча, было стварэнне выязнога сучаснага, актуальнага, запатрабаванага ва ўсіх раёнах рэспублікі рэпертуару.

У 2003 г. у адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2003 г. № 10/179 аб рэпертуарнай палітыцы дзяржаўных тэатраў пры Беларускім саюзе тэатральных дзеячаў быў створаны Цэнтр па захаванні, прапагандзе і распаўсюджанні новых п’ес беларускіх аўтараў, закупленых Міністэрствам культуры [439, спр. 731, арк. 50].

У верасні 2003 г. адбылася калегія Міністэрства культуры, на якой былі разгледжаны пытанні стану ***рэпертуарна-творчай дзейнасці*** дзяржаўных тэатраў краіны за перыяд 2001–2002 гг. і першую палову 2003 г. На ёй адзначалася, што пры ўсёй значнасці праблемна-тэматычных і мастацкіх здабыткаў новых пастановак у рэпертуары не хапала драматургічных твораў, якія былі б накіраваны на кансалідацыю сучаснага грамадства і прапагандавалі актыўны ўдзел шырокіх слаёў насельніцтва ў справе вырашэння праблем будаўніцтва маладой суверэннай беларускай дзяржавы [439, спр. 733, арк. 10].

Міністэрства культуры вяло планавую работу па закупцы новых твораў драматургіі ў рэпертуар беларускіх тэатраў. За 2001–2004 гг. было набыта 115 арыгінальных і перакладных твораў беларускіх аўтараў [71, арк. 38]. Пры гэтым удзельная вага новых пастановак па гэтых творах за перыяд 2002–2004 гг. зменшылася на 19 % [161]. У рэпертуары айчынных тэатраў беларускія творы займалі меншае месца, чым маглі б. Тэатры, у тым ліку і нацыянальныя, амаль не падавалі прыкладу эксперыментальнага асваення твораў беларускай драматургіі [439, спр. 1048, арк. 4].

З мэтай далейшага ўзбагачэння рэпертуару тэатраў новымі творамі сучаснай беларускай драматургіі з 2005 г. Міністэрства культуры раз у два гады пачало праводзіць конкурс па стварэнні п’ес для тэатра. З кастрычніка 2005 г. па кастрычнік 2006 г. праходзіў І Рэспубліканскі конкурс тэатральных паста-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новак па творах нацыянальнай класічнай і сучаснай беларускай драматургіі (у далейшым яго планавалася зрабіць штогадовым) [439, спр. 1049, арк. 25–27; 789].

Адзначаныя праблемы знайшлі сваё месца ў плане мерапрыемстваў па рэалізацыі даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па паляпшэнні рэпертуарнай палітыкі дзяржаўных тэатраў рэспублікі [301]. Аналіз рэпертуару 2006 г. па рэспубліцы паказаў, што толькі 23 % у ім – гэта сучасная беларуская драматургія, 7 – беларуская класіка, 34 – сусветная класіка, 37 % – сучасная замежная драматургія.

Сучасная беларуская драматургія ў 2006 г. складала значную частку рэпертуару ў Маладзечанскім драматычным тэатры – 15 найменняў, Гомельскім абласным драмтэатры – 12, ТЮГу – 11, Нацыянальным тэатры імя Янкі Купалы – 11, Нацыянальным тэатры лялек – 2 [794].

За сезон 2006/07 г. адбыўся прэм'ерны паказ 148 спектакляў, што склала звыш 20 % ад колькасці спектакляў бягучага рэпертуару. За тры гады была аказана фінансавая падтрымка па рэалізацыі новых праектаў 15 тэатральным калектывам і створана 33 спектаклі. Распараджэннем Кіраўніка дзяржавы ў 2007 г. была падтрымана пастаноўка яшчэ 7 тэатральных праектаў. З мэтай аказання практычнай дапамогі Міністэрства культуры сумесна з Беларускім саюзам літаратурна-мастацкіх крытыкаў праводзіла аналіз пастановачнай дзейнасці тэатраў [76, т. 6, арк. 17–18].

Побач з гэтым большасць спектакляў драматычных тэатраў была арыентавана на шырокага гледача, і недастаткова было спектакляў для маладзёжнай аўдыторыі. Рэпертуар лялечных спектакляў патрабаваў насычэння творамі беларускіх аўтараў. Музычным тэатрам рэкамендавалася працягнуць работу па пошуку твораў айчынных аўтараў і нацыянальнага матэрыялу. Фінансавай і арганізацыйнай падтрымкі патрабавалі Гомельскі драматычны тэатр і Магілёўскі тэатр драмы і камедыі, у якіх паказчык запаўняльнасці залы склаў у 2006 г. адпаведна 65 і 34,4 % [76, т. 6, арк. 18].

У рэпертуары не хапала спектакляў на актуальную сучасную тэматыку, буйных нацыянальных праектаў, аналагічных «Паўлінцы» і «Несцерцы» [794].

У 2009 г. у адпаведнасці з рашэннем Савета Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва былі выдзелены гранты на пастаноўку спектакляў «Дзікае паляванне караля Стаха» ў Магілёўскім абласным тэатры лялек. У рамках дзяржаўнага заказу Міністэрства культуры ў 2009 г. выдзеліла сродкі на пастаноўку спектакляў па творах беларускай і рускай класікі, сучасных беларускіх драматургаў: «Вяселле» А. Чэхава і «Хам» па аднайменнай аповесці Э. Ажэшкі ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, «Вандроўкі ў Нью-Йорку» А. Паповай у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, «Ветрагоны» В. Галубка, «Вядзьмарка і Дыназаўрык» А. Якімовіча ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа, «Бег» па М. Булгакаву ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага, «Хачу быць Цэзарам» А. Макаёнка ў Магілёўскім абласным драматычным тэатры, «Тарас на Парнасе» С. Кавалёва ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры, «Магічнае люстра пана Твардоўскага» С. Ка-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

валёва ў Гродзенскім абласным тэатры лялек, «Пецярбургскі ліхвяр» М. Някрасава ў Мазырскім драматычным тэатры імя І. Мележа, «Чаму старэюць людзі» А. Вярцінскага ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек, «Парог» А. Дударава ў Тэатры-студыі імя Е. Міровіча Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў [81, т. 1, арк. 61].

У тым жа годзе Міністэрствам культуры былі выдзелены сродкі на пастаноўку спектакляў да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: «Не мой...» А. Адамовіча ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, «Калі скончыцца вайна» П. Пражко ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі, «Апошнія сведкі» па аднайменнай аповесці С. Алексіевіч у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа, «Бліндаж» А. Паповай у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача, «Не пакідай мяне» А. Дударава ў Слонімскім драматычным тэатры.

Побач з акрэсленай праблемай у апошнія гады вывучаемага перыяду вызначылася станоўчая тэндэнцыя ў рэпертуарнай палітыцы тэатраў адносна пастановак твораў сусветнай класікі. Так, працэнт новых пастановак класічнай драматургіі ўзрос з 13 % у 2002 г. да 37 % у 2005 г. [71, арк. 38]. «Гэта сведчыць аб тым, што сістэма працы па ўдасканаленні акцёрскага майстэрства, прыцягненне гледача да высокіх маральных каштоўнасцей і эканамічная падтрымка дзяржавай тэатральнай справы (менавіта класічныя праекты вымагаюць значных фінансавых укладанняў) знаходзіцца на сур'ёзным узроўні», – адзначалася на сустрэчы міністра культуры з кіраўнікамі дзяржаўных тэатраў рэспублікі 8 кастрычніка 2006 г. [425].

Разам з гэтым пытанне сусветнай класікі ў рэпертуары паспяхова вырашалася не ва ўсіх тэатрах рэспублікі. Для параўнання – Віцебскі тэатр «Лялька» ў 2006 г. меў 12 спектакляў па творах сусветнай класікі, што абумоўлівае вялікія поспехі тэатра ў краіне і за мяжой, Мінскі ж гарадскі тэатр лялек – усяго тры. Вялікія праблемы ў гэтым сэнсе існавалі ў беларускага ТЮГа, у рэпертуары якога таксама было толькі тры найменні паводле твораў сусветнай класікі [425].

Параўноўваючы беларускі тэатр з літоўскім, беларускі тэатральны аглядальнік А. Данскі ў 2006 г. заўважаў: «Літоўскі тэатр – адзін з самых магутных ў свеце. Літоўцам удалося тое, што не ўдалося беларусам, – сварыць высокамастацкую тэатральную мову, заснаваную на нацыянальнай ідэнтычнасці» [211].

Акрэсленая праблема непарыўна звязана са станам беларускай драматургіі. Як ужо адзначалася вышэй, Міністэрства неаднаразова праводзіла конкурсы п'ес. З 1994 г. Міністэрствам культуры выдаваўся зборнік «Беларуская драматургія», у якім змяшчаліся лепшыя новыя п'есы айчынных аўтараў.

Неаднаразова праблемы драматургіі разглядаліся на навукова-практычных семінарах і канферэнцыях. У 2001 г. на базе Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі з удзелам рэжысёраў і загадчыкаў літчастак тэатраў быў праведзены Міжнародны семінар драматургаў Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы. У лістападзе 2002 г. на базе гэтага ж тэатра адбылася навукова-практыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ная канферэнцыя па праблемах развіцця драматургічнага жанру. У маі 2004 г. прайшоў семінар «Рэжысёры і драматургі: прынцыпы творчага ўзаемадзеяння». На ім быў акрэслены шэраг праблем, якія патрабавалі вырашэння. Большасць рэжысёраў скардзілася на тое, што вельмі складана знайсці цікавы драматургічны твор. Правінцыйныя тэатры імкнуліся да знаёмства з новымі п'есамі, але часта не ведалі, дзе іх знайсці. Пры гэтым сітуацыя ў сталічных тэатрах складвалася наадварот – яны часцей адмаўлялі драматургам. Са шкадаваннем удзельнікі семінару гаварылі аб тым, што перастаў выходзіць часопіс «Тэатральная творчасць», у якім публікаваліся п'есы беларускіх аўтараў. Адзначалася, што творчасць айчынных драматургаў існуе як бы ў пэўнай інфармацыйнай ізаляцыі [63].

У лютым 2005 г. Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы арганізаваў практычны семінар маладой беларускай драматургіі. 15 красавіка 2005 г. у краіне быў абвешчаны І Міжнародны конкурс сучаснай драматургіі «Свабодны тэатр», арганізатарамі якога выступілі грамадскае аб'яднанне «Гільдыя беларускіх драматургаў і сцэнарыстаў» і тэатр-студыя «Малы тэатр».

На калегіі Міністэрства культуры ў лютым 1997 г. была зацверджана *Праграма падрыхтоўкі і падтрымкі нацыянальных дырыжорскіх і рэжысёрскіх кадраў*. Яна прадугледжавала правядзенне ў 1998 г. агляду творчых работ маладых рэжысёраў на базе Рэспубліканскай творчай майстэрні ў Мінску, ажыццяўленне стажыровак рэжысёраў у тэатрах Мінска, краінах блізкага і далёкага замежжа. У планах было аказанне падтрымкі маладым рэжысёрам праз дзяржаўны заказ на пастаноўку спектакляў па творах беларускіх аўтараў і на беларускай мове (4–5 дзяржзаказаў), прадстаўленне магчымасці пастаноўкі спектакляў студэнтам 3–5 курсаў рэжысёрскага факультэта ў драматычных і лялечных тэатрах краіны і па заяўках Беларускай акадэміі мастацтваў. Дэкларааваўся намер прадставіць лепшыя творчыя работы маладых рэжысёраў для ўключэння іх у нацыянальныя і міжнародныя фестывалі [439, спр. 145, арк. 202–203].

Пачатак XXI ст. быў адзначаны новымі імёнамі ***маладых драматургаў***. У тэатрах з поспехам ішлі п'есы А. Курэйчыка «Понцій Пілат», «П'емонцкі звер», «Крылы», С. Бартохавай «Няпрошаны госць», А. Карэліна «Зона Х», «Лавантэн».

Некаторыя крытыкі адзначалі, што ў шэрагу выпадкаў назіраўся такі парадокс: у Беларусі маладыя аўтары прыцягвалі да сябе ўвагу толькі тады, калі атрымлівалі прызнанне за межамі сваёй краіны. Імёны П. Пражко, М. Халезіна, Д. Балыка сталі вядомы пасля іх прызнання на буйных расійскіх драматургічных конкурсах «Евразия» і «Действующие лица» [148]. А. Курэйчык выклікаў да сябе інтарэс пасля таго, як яго п'есы былі пастаўлены ў МХАТе імя А. Чэхава і ў Маскоўскім драматычным тэатры імя У. Маякоўскага. Але трэба адзначыць, што амаль усе яго драматургічныя творы былі пастаўлены ў розных тэатрах Беларусі, а на спектакль «Згублены рай» быў атрыманы грант Прэзідэнта краіны. Вясной 2005 г. п'еса маладога драматурга «Тры часіны і адзін лёс» была пастаўлена на сцэне Новага драматычнага тэатра ў Мінску [281].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

А. Курэйчык у 2004 г. выказваўся наступным чынам: «нягледзячы на багатыя традыцыі, беларускі тэатр усё ж адстае па развіццю ад сваіх асноўных канкурэнтаў: польскага, літоўскага і расійскага тэатраў. Так здарылася таму, што ў Беларусі колькасна мала тэатраў. Як вынік – пакуль не атрымалася сфарміраваць паўнавартасны тэатральны рынак, дастаткова ёмісты, каб ахапіць увесь дыяпазон тэатральнага мастацтва: ад класікі да авангарду. Беларускі тэатр слаба асвойвае новыя тэатральныя тэхналогіі, неахвотна ідзе на эксперыменты і пошукі новых форм і ідэй» [372].

З мэтай назапашвання і захавання лепшых узораў сучаснай нацыянальнай драматургіі, прапаганды і распаўсюджвання новых п'ес (у тым ліку праз сетку Інтэрнэт), прыцягнення ў працэс тэатральнай творчасці маладых рэжысёраў і драматургаў, правядзення тэатральных эксперыментаў, вывучэння і ўкаранення ў Беларусі самых новых дасягненняў, ідэй і тэхналогій сусветнага тэатра пры Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры з кастрычніка 2003 г. пачаў дзейнічаць Цэнтр беларускай драматургіі [108, с. 90]. Праз некаторы час пасля стварэння ў дзейнасці цэнтра з'явіліся складаныя праблемы, амаль год пра яго нічога не было чуваць. Спектаклі, якія ён прадстаўляў, – эксперыментальныя, нават эпатажныя, але яны мелі свайго гледача. Праца цэнтра была прызнана нездавальняючай [415]. У сакавіку 2007 г. ён прадоўжыў працу пры Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі.

За сезон 2005/06 г. у тэатрах рэспублікі маладымі рэжысёрамі было ажыццёўлена 30 пастановак. Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі з'яўляўся лідарам па пастаноўцы п'ес сучасных беларускіх драматургаў і ўдзелу маладых рэжысёраў у творчым працэсе [80, с. 38].

У 2007 г. толькі ў Цэнтры беларускай драматургіі было рэалізавана 6 праектаў маладых рэжысёраў. На Малой сцэне тэатра імя Янкі Купалы і сцэне Беларускай акадэміі мастацтваў былі пастаўлены два спектаклі маладых рэжысёраў – пераможцаў конкурсу рэжысёрскіх эксплікацый.

У 2010 г. у цэнтры працавалі 10 супрацоўнікаў. Сярод мерапрыемстваў былі чыткі новых п'ес беларускіх і замежных аўтараў, драматургічныя on-line праекты, паказы эксперыментальных рэжысёрскіх работ, дзейнасць драматургічнай лабараторыі з удзелам замежных драматургаў і крытыкаў, відэапрагляды спектакляў, круглыя сталы з удзелам крытыкаў, журналістаў, драматургаў і рэжысёраў. Маладыя драматургі і рэжысёры мелі магчымасць ствараць тут сумесныя праекты і прадстаўляць іх шырокай аўдуторыі. За час дзейнасці цэнтра ў рамках яго мерапрыемстваў шырокай аўдыторыі было прадстаўлена больш за 10 новых беларускіх аўтараў. Сярод іх В. Красоўскі, Д. Доўгар, А. Бібікаў, К. Сцешык, П. Расолька, Д. Багаслаўскі, В. Гапеева, Т. Ламонава, М. Савельева, Л. Новікава. Тут дэбютавалі пачынаючыя рэжысёры С. Анцэлевіч, С. Івашкевіч, Д. Фёдараў, А. Кудрэвіч, С. Рошчына, Т. Ачыпоўская, В. Кананенка, А. Марчанка, В. Дранько-Майсюк [83, арк. 203].

Створаны ў цэнтры спектакль «Сталіца Эраўнд», які ў 2007 г. стаў дэбютам драматурга С. Гіргеля і рэжысёра В. Саратокінай, увайшоў у рэпертуар



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, удзельнічаў у шэрагу міжнародных фестываляў. За гады працы тут склаліся творчыя тандэмы «драматург – рэжысёр». Дзякуючы ім у 2009 г. адбыўся шэраг прэм’ер – «Мае рукі» (драматург Д. Багаслаўскі, рэжысёр С. Анцэлевіч), «За кратамі» (драматург М. Шымчык, рэжысёр Н. Мельнікава), аўтарскія праекты М. Рудкоўскага «Сляпая зорка» і А. Бібікава «Яма» [83, арк. 204].

Аднак пры відавочных поспехах праца цэнтра па распаўсюджанні новых твораў беларускай драматургіі па тэатрах краіны, на думку спецыялістаў Міністэрства культуры, была недастатковай. Кантакты з тэатрамі па пытаннях работы з новымі творамі беларускіх аўтараў не насілі сістэмнага характару. Патрабавалася больш актыўная ўвага цэнтра да працы з тэатрамі па развіцці і распаўсюджванні беларускай драматургіі [83, арк. 207].

З мэтай заахвочвання творчых дасягненняў беларускага тэатральнага мастацтва ў 1992 г. Міністэрства культуры і Беларускі саюз тэатральных дзеячаў заснавалі імянныя ***тэатральныя прэміі***. Яны прысуджаліся раз у два гады за яркія творчыя дасягненні ў беларускім тэатральным мастацтве [438, спр. 2072, арк. 89–90]. Прэмія імя Л. Александроўскай прысуджалася артыстам і пастаноўшчыкам спектакляў музычных тэатраў. Ёй былі ўзнагароджаны Н. Гайда, А. Ранцанц, Н. Руднева, група салістаў балета «Жарсці», Э. Пелагейчанка, Т. Глаголева і інш. Прэмія імя І. Буйніцкага прысуджалася артыстам драматычных тэатраў. Былі ўзнагароджаны: Р. Янкоўскі, А. Клімава, І. Забара, Т. Кокштыс, С. Журавель, М. Кірычэнка і інш. Сярод лаўрэатаў прэміі імя Е. Міровіча, якая прысуджалася рэжысёрам, драматургам, сцэнографам, кампазітарам, балетмайстрам, – Б. Гарлаван, М. Пінігін, В. Елізар’еў, А. Андросік. Прэміі імя Л. Мазалеўскай за творчыя дасягненні ў галіне тэатральнага мастацтва для дзяцей былі ўдастоены А. Ляляўскі, А. Фаміна, У. Кандрусевіч, А. Жугжда, А. Сідараў, Ю. Вута, У. Караткевіч, А. Анросік, В. Кавалерава. Прэмія імя К. Крапівы прысуджалася драматургам, тэатральным крытыкам, тэатразнаўцам. Ёй былі ўзнагароджаны У. Няфёд, Г. Барышаў, Ю. Чурко, М. Арахоўскі, А. Папова, А. Сабалеўскі.

Беларускі саюз тэатральных дзеячаў штогод уручаў прызы: «Крыштальная Паўлінка», «Крыштальны анёл», «Крыштальная зорка», «Крыштальная кветка».

У мэтах далейшага развіцця нацыянальнага тэатральнага мастацтва, стымулявання творчай дзейнасці прафесійных тэатраў у 2010 г. была заснавана Нацыянальная тэатральная прэмія [22].

Развіццё тэатральнага мастацтва нельга ўявіць без ***тэатральнай крытыкі***. Яе крызіс стаў найбольш адчувальны ў апошнія гады вывучаемага перыяду. У 2006 г. тагачасны начальнік Упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры М. Казловіч падкрэсліваў: «за апошнія 3–4 гады былі здадзены важнейшыя пазіцыі ў мастацкай тэатральнай крытыцы. Калі некалькі гадоў таму была наладжана сістэмная праца ў гэтай галіне, створана сур’ёзная база крытычнага асэнсавання асноўных тэндэнцый развіцця беларускага тэатра, дык сёння, з прычын аб’ектыўнага і суб’ектыўнага парадку, адсутнасці неабходнага фінанса-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вання, запатрабаванням крытыкі як навукі надаецца ўсё меней і меней увагі. У сувязі з гэтым узнікае вострая неабходнасць аднаўлення сістэмы ў новай якасці, у цеснай сувязі з творчымі саюзамі. І тэатры ў гэтых адносінах павінны таксама праявіць максімум удзелу, бо калі тэатр не хоча запрашаць да сябе таэтральнага крытыка, значыць, тэатр не хоча ведаць праўду пра сябе. Але нішто так не шкодзіць развіццю тэатра, як адсутнасць прынцыповага і аб'ектыўнага аналізу ўсіх сфер яго дзейнасці».

У 2007 г. Міністэрства культуры сумесна з Беларускім саюзам літаратурна-мастацкіх крытыкаў прааналізавала творчую дзейнасць драматычных тэатраў краіны. Падчас прагляду спектакляў і іх абмеркавання на мастацкіх саветах тэатраў крытыкі аналізавалі рэпертуарную палітыку, творчы стан і патэнцыял тэатраў. Па выніках гэтай працы 19 снежня 2007 г. была праведзена навуковая канферэнцыя па актуальных праблемах тэатральнага мастацтва і падрыхтавана даведачнае выданне «Прэм'еры 2006–2007 у тэатрах Беларусі».

Справе актывізацыі творчага працэсу, духу спаборніцтва, задачы павышэння кола гледачоў спрыяў ***фестывальны рух***, які сфарміраваўся ў 1990-х гг. так, што практычна кожная вобласць мела сваё адметнае тэатральнае свята.

У красавіку 1991 г. упершыню ў Мінску праводзіўся Міжнародны тэатральны фестываль «Славянскія тэатральныя сустрэчы». У ім прынялі ўдзел творчыя калектывы з Беларусі, Украіны, Расіі, Польшчы, Славеніі і Славакіі. З 1994 г. фестываль пад гэтай назвай стаў праводзіцца ў Гомелі. У 1992 г. у Гродна ў апошні раз на тэрыторыі Беларусі адбыўся Міжнародны фестываль з серыі «Прыбалтыйская тэатральная вясна», які звычайна праходзіў у Рызе, Вільнюсе, Таліне і Мінску [788, с. 481–482].

З 1993 г. праводзіўся Міжнародны фестываль монаспектакляў «Я» ў Мінску, у якім прымалі ўдзел госці з Англіі, Германіі, Францыі, Польшчы, Расіі, Украіны, Літвы і Беларусі[1]. З 1994 г. у Маладзечне адбываўся рэспубліканскі тэатральны фестываль «Маладзечанская сакавіца», арганізаваны Міністэрствам культуры і Саюзам тэатральных дзеячаў з мэтай актывізацыі развіцця беларускага тэатральнага мастацтва [788, с. 485].

У 1996 г. упершыню адбыўся Міжнародны тэатральны фестываль «Белая вежа». Даволі хутка развівалася геаграфія ўдзельнікаў фестывалю. Калі ў 1996 г. у Брэст прыехала 17 труп з 6 краін, то ў 2003 г. – 29 з 14 краін. На думку спецыялістаў, гэты фестываль цалкам адпавядаў ўзроўню міжнароднага фестывалю [727].

Вялікая колькасць разнапланавых тэатральных фестываляў папоўнілася ў 1998 г. Рэспубліканскім фестывалем нацыянальнай драматургіі імя В. І. Дуніна-Марцінкевіча, які праводзіўся раз у тры гады ў г. Бабруйску. Яго арганізатары спадзяваліся, што ён будзе садзейнічаць развіццю беларускай драма-

[1] Да 1998 г. прайшло тры фестывалі. Пасля перапынку ён адрадзіўся ў 2004 г., калі ў Мінску быў праведзены першы этап. Другі этап IV фестывалю прайшоў у 2005 г. у Маладзечне. Фестываль стаў праводзіцца раз у тры гады. У 2008 г. на сцэне тэатра імя Я. Міровіча гледачы маглі пазнаёміцца з удзельнікамі V фестывалю.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тургіі. Усяго за акрэслены перыяд фестываль праходзіў тройчы (у 1998, 2001, 2008 гг.). Па ўмовах конкурсу ў ім маглі прымаць удзел толькі тыя спектаклі, якія былі пастаўлены ў перыяд паміж двума фестывалямі. У рамках конкурсу ў 1998 г. было паказана 7 спектакляў [788, с. 480]. У 2001 г. на ўдзел у конкурсе прэтэндавала 35 спектакляў, у рамках фестывалю глядач убачыў 8 з іх [146].

Фестывальны рух у поўнай меры датычыўся не толькі драматычных ці музычных тэатраў, але і тэатраў лялек. З 1990 г. праходзіў Беларускі міжнародны фестываль тэатраў лялек. За акрэслены перыяд адбылося 6 фестываляў лялечных тэатраў (1990, 1993, 1995, 1999, 2008 і 2009 гг.) На «Белай вежы» лялечныя тэатры таксама ўдзельнічалі ў конкурснай праграме, іх спектаклі ацэньвала самастойнае журы.

Яркай культурнай падзеяй у 2003 г. стаў I Міжнародны фестываль сучаснага тэатра «Адкрыты фармат». Арганізатарамі выступілі Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, антрэпрыза «Віртуозы сцэны», Цэнтр сучаснай драматургіі і рэжысуры. У аснову канцэпцыі правядзення фестывалю было пакладзена жаданне арганізатараў пазнаёміць тэатральную грамадскасць з найбольш яркімі і нетыповымі спектаклямі замежных тэатраў (у дадзеным выпадку – расійскіх, польскіх, шведскіх, чэшскіх), даць магчымасць гледачу ўбачыць не запрошаныя антрэпрызныя, камерцыйныя спектаклі, а перадавы, некамерцыйны тэатр. На фестывалі быў прадстаўлены 21 спектакль з шасці краін свету. У 2004 г. замест «Адкрытага фармату» адбыўся Міжнародны фестываль тэатральнага мастацтва «Панарама», удзел у якім узялі тэатры таксама з шасці краін свету, якія прадставілі мінскім гледачам 13 спектакляў. «Панарама» стаў традыцыйным фестывалем [779].

У далейшым Міністэрства культуры паставіла мэту ўпарадкавання колькасці фестываляў. Падтрымліваючы дадзены крок, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення – начальнік Упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь І. Дрыга на справаздачнай калегіі Міністэрства культуры за 2007 г. заўважыла, што «што трэба ісці не толькі шляхам аптымізацыі колькасці, але і паляпшэння якаснага ўзроўню. Належыць выразна ўсведамляць, з якой мэтай мы праводзім той ці іншы міжнародны фестываль і што гэта дае нашаму мастацтву. Прыкладам, на Беларусі праходзяць тры міжнародныя тэатральныя фестывалі – «Панарама», «Белая вежа» і «Славянскія тэатральныя сустрэчы». Але, на жаль, беларуская прысутнасць на іх зазвычай абмежавана некалькімі спектаклямі сталічных тэатраў і тэатра таго рэгіёна, дзе ладзіцца фестываль. Таму трэба задумацца над тым, што дае кожны з гэтых форумаў для развіцця менавіта беларускага тэатральнага мастацтва. І, магчыма, зрабіць акцэнт на правядзенне фестывалю, прысвечанага ўласна беларускаму тэатру. Трэба даць нашым тэатрам магчымасць убачыць, хто на якім узроўні працуе, – тады з’явіцца памкненне да ўдасканалення ўласнага» [216, с. 5].

Такім чынам, развал СССР, атрыманне Беларуссю незалежнасці і эканамічны крызіс значна паўплывалі на развіццё беларускага тэатра ў першай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палове 1990-х гг. Сярод гэтых фактараў можна вызначыць як станоўчыя, так і адмоўныя. З аднаго боку, тэатры атрымалі нічым не абмежаваную творчую свабоду. Аднак значна пагоршылася фінансаванне – скараціліся выдаткі на новыя пастаноўкі, замерла гастрольнае жыццё краіны. У такіх эканамічных умовах тэатры пачалі актыўна займацца пошукамі дадатковых крыніц фінансавання. Дзяржаўнаму тэатру прыйшлося канкурыраваць з прыватным, пашырыліся антрэпрызныя пастаноўкі.

У канцы 1980 – першай палове 1990-х гг. актыўна ствараліся і дзейнічалі эксперыментальныя тэатры-студыі, якія сталі пляцоўкамі для ажыццяўлення вопытаў па ўкараненні новых падыходаў да арганізацыі і фінансавання творчых праектаў. Праца некаторых тэатральных студый паступова прыйшла ў заняпад. Асобныя студыі дасягнулі прафесійнага ўзроўню, і на іх аснове ўзніклі тэатры: мінскі драматычны «Дзе-Я?» (1992 г., з 2004 г. – Новы драматычны тэатр) і Альтэрнатыўны (1990 г., з 1996 г. – Малы тэатр).

У вывучаемы перыяд павялічылася колькасць дзяржаўных тэатраў – з 21 у 1991 г. да 27 у 2010 г.

У Беларусі з'явіліся такія традыцыйныя фестывалі, як фестываль монаспектакляў «Я», «Славянскія тэатральныя сустрэчы», «Белая вежа», «Маладзечанская сакавіца», «Панарама» і інш. Большасць беларускіх тэатральных фестываляў праходзіла ў абласных і раённых гарадах краіны. Гэта павышала мастацкі ўзровень саміх рэгіянальных тэатраў, дазваляла правінцыйнаму гледачу пазнаёміцца з працамі лепшых тэатраў краіны і замежжа. Важную арганізацыйную ролю ў тэатральным руху адыгрывалі мясцовыя ўлады і спонсары.

Дзейнасць Міністэрства культуры была скіравана на падтрымку развіцця стацыянарнага рэпертуарнага тэатра, беларускай драматургіі. Значна змяніўся рэпертуар усіх беларускіх тэатраў. Былі ажыццёўлены знакавыя пастаноўкі беларускай класікі («Тутэйшыя» Я. Купалы і «Ідылія» В. Дуніна-Марцінкевіча ў Купалаўскім тэатры), актыўна ставіліся творы сучасных драматургаў (А. Дударава, Р. Баравіковай, С. Кавалёва). Павялічылася колькасць пастановак, прысвечаных беларускай гісторыі і сучаснасці.

За рэдкім выключэннем, у Беларусі амаль ўсе тэатры з'яўляліся дзяржаўнымі. Асноўныя сродкі на ўтрыманне тэатральных калектываў, правядзенне тэатральных фестываляў і конкурсаў даваў дзяржаўны бюджэт рэспубліканскага і рэгіянальнага ўзроўняў. Пастаяннай была закупка твораў і пастаноўка у рамках дзяржзаказу.

## 5.5. Кінавідэавытворчасць і кінавідэапракат

### *5.5.1. Кінавідэавытворчасць*

Кіно з'яўляецца адным з найбольш папулярных сярод спажыўцоў відаў мастацкай творчасці. Беларускае кінамастацтва, як і іншыя галіны культуры, у найноўшай гісторыі Рэспублікі Беларусь перажыло перыяд заняпаду і адраджэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1993 г. кінагаліна нашай краіны складалася з фільмавытворчасці на базе кінастудыі «Беларусьфільм», рэспубліканскага вытворча-творчага аб'яднання «Белвідэацэнтр», 7 рэгіянальных вытворчых аб'яднанняў «Кінавідэапракат» са службамі «Кінатэхпрама», фільмабазамі і кінавідэасеткай, навучальных устаноў па падрыхтоўцы творчых кадраў з вышэйшай адукацыяй і спецыялістаў сярэдняга звяна для кінавідэасеткі, Саюза кінематаграфістаў і грамадскай арганізацыі кінааматараў.

Арганізацыйная форма дзяржаўнага кіравання нацыянальнай кінематаграфіяй у 2006 г. перажыла рэфармаванне. Замест створанага яшчэ ў 1989 г. Упраўлення кінавідэамастацтваў пры Міністэрстве культуры быў створаны Дэпартамент па кінематаграфіі [537].

Новыя сацыяльна-эканамічныя ўмовы пачатку 1990-х гг. садзейнічалі творчаму ўздыму і стварэнню ***новых суб'ектаў кінапрацэсу***, якія былі незалежнымі ад дзяржавы.

Яшчэ ў маі 1991 г. на VII з'ездзе Саюза кінематаграфістаў рэспублікі была прынята культурна-камерцыйная праграма, якая прадугледжвала наладжванне ўласнай кіна-, відэавытворчасці, развіццё альтэрнатыўнага пракату фільмаў. У рамках выканання праграмы ў 1993 г. пры саюзе былі створаны творчыя студыі. Апошнія не плацілі арэнднай платы, былі поўнай ці частковай уласнасцю саюза і сплачвалі яму да 15 % свайго прыбытку. Незалежныя студыі ствараліся як пры Кінафондзе, так і пры праўленні Саюза кінематаграфістаў.

Знаходжанне «пад крылом» творчага саюза дапамагала студыям вырашаць праблемы фінансавання вытворчасці і арганізацыі кінапракату. Найбольш яскравым сведчанне гэтага з'яўляецца атрыманне ў 1992 г. дзяржаўнага заказу на вытворчасць студыяй «Арт-фільм» кінакарціны «Голас брата твайго» (рэж. В. Рыбараў) і студыяй «Кадр-2» – кінакарціны «Душа мая, Марыя» (рэж. В. Нікіфараў). А фільм Беларускай незалежнай студыі «НС» «Кааператыў “Палітбюро”, ці Будзе доўгім развітанне» (рэж. М. Пташук) быў закуплены Міністэрствам культуры пасля выхаду з вытворчасці ў 1993 г.

Найбольш плённай і працяглай была дзейнасць студый «Арцель М» (маст. кір. А. Карпаў-малодшы) і «Таццяна» (старшыня праўлення Т. Логінава). Першая выпусціла чатыры мастацкія гульнявыя стужкі, тэлекарціну і тры відэафільмы-спектаклі, шэраг дакументальных стужак і рэкламных ролікаў. Кінастудыя «Таццяна» займалася ў асноўным дакументальным кіно [438, спр. 54, арк. 11–12]. Значная месца ў яе дзейнасці надавалася арганізацыі грамадскіх мерапрыемстваў. У перыяд з 1991 па 1999 г. студыя выступіла ініцыятарам пяці міжнародных фестываляў жаночага кіно ў Мінску і міжнароднага фестывалю праваабарончага кіно ў 1998 г. З 1997 г. па ініцыятыве студыі ў краіне праводзіўся фестываль аматарскіх і студэнцкіх фільмаў [658, с. 199].

Існаванне незалежных студый садзейнічала жанравай разнастайнасці беларускага кіно. Менавіта яны імкнуліся ствараць эксперыментальныя некамерцыйныя стужкі. Напрыклад, уплыў постмадэрнізму заўважны ў фільмах «Аўстрыйскае поле», «Мона Ліза», «Грэх прытворства». Аднак жорсткія рэаліі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часу прымусілі вытворцаў быць больш прагматычнымі, арганізоўваць сваю дзейнасць у адпаведнасці з патрабаваннямі рынку: улічваць запыты гледачоў, змены кан'юнктуры рынку, выкарыстоўваць маркетынгавыя стратэгіі пры вытворчасці і продажы карцін. Напрыклад, для скарачэння часу і грашовых выдаткаў студыя «Арцель М» арганізоўвала здымкі гатовых спектакляў. Тры фільмы студыі былі зняты на відэаносьбітах, а не на кінаплёнцы. Гэта не толькі змяншала затраты на вытворчасць, але і на тыражыраванне. Відэафармат дазваляў арганізаваць паказы ў відэасалонах. Толькі пры наяўнасці попыту на фільмы яны пераводзіліся на кінастужку для дэманстрацыі ў кінатэатрах. Так адбылося з відэафільмам «Акупацыя. Містэрыі», знятым у 2004 г. рэжысёрам А. Кудзіненкам на базе «Маладзёжнай студыі XXI век» сумесна з незалежнай відэастудыяй «Навігатар». Хутка змянілася і жанравая накіраванасць. Пачалі здымаць баявікі[1], дэтэктывы, камедыі. Адной з найбольш прыбытковых у практыцы стала знятая ў 2000 г. ЗАТ «Відэакампанія "Відэафакт" эксцэнтрычная камедыя «Армія выратавання» (рэж. Я. Краўцоў).

У анімацыйным кіно ў 1990-я гг. таксама, як і ў іншых сферах кінавытворчасці, ствараліся і дзейнічалі студыі: «АФ-Цэнтр» (кір. А. Белавусаў), «Анімацыйны беларускі цэнтр – АБЦ» (на ёй у 1993 г. рэжысёрам і сцэнарыстам А. Белавусавым быў зняты першы беларускі поўнаметражны анімацыйны фільм «Дэкамерон»), МП «Студыя-3» (стваральнікі Л. Шукалюкоў, В. Чыкіна).

Росквіт студый скончыўся крызісам сярэдзіны 1990-х гг. Яго прычыны акрэсліў былы мастацкі кіраўнік студыі «Арцель-М» А. Карпаў-малодшы: «Незалежныя студыі былі залежны ад тых эканамічных і сацыяльных прычын (выдачы банкаўскіх пазык, напрыклад), якія абумовілі іх падзенне. Яны рванулі раней часу ўперад, і іх гібель была непазбежна. Неразвітасць кінарынку таго часу не дазволіла студыям развіцца далей ў вялікія прадзюсарскія цэнтры. Далейшае станаўленне эканомікі Беларусі шляхам фінансавай рэгламентацыі сферы мастацтва прывяло да закрыцця студый» [658, с. 203]. Даследчыца А. Пастоева далучае да гэтых прычын няўменне кіраўнікоў студый арыентавацца ў механізме пракату, малы вопыт працы ў нестабільнай рынкавай сітуацыі, а таксама адмову кінастудыі «Беларусьфільм» падпісаць дамову аб аказанні вытворчых паслуг незалежным студыям з улікам росту інфляцыі [658, с. 202].

Іншыя даследчыкі сярод прычын нерэалізаванасці многіх творчых намераў незалежных студый называюць канфлікт паміж імі і дзяржаўнымі структурамі. У аснове якога – «прынцыповае неразуменне адказнымі прадстаўнікамі кіруючых інстанцый ролі і патэнцыйных магчымасцей незалежных студый у развіцці кінематографа краіны, а таксама ігнараванне імі асноватворных прынцыпаў новай мадэлі кінавытворчасці» [179, с. 152].

Паступовы заняпад незалежнага кіно ў Беларусі быў выкліканы «не толькі бюракратычнай інерцыйнасцю, але і глыбокім супрацьстаяннем дзвюх груп

[1] Першы беларускі баявік «Д'ябальская карусель» быў зняты на студыі «Фобос-С» рэжысёрам Н. Грабенкіным у 1994 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вядучых кінамайстроў краіны, адна з якіх выступала нібыта ад імя “Беларусьфільма”, а другая нібыта ад імя Саюза кінематаграфістаў» [179, с. 153].

За перыяд 1990-х гг. было выпушчана звыш 60 поўнаметражных фільмаў нацыянальнага кінематографа. Аднак ва ўмовах сацыяльна-палітычных перамен большасць з іх засталася незапатрабаванай пракатнымі арганізацыямі. Сярод стужак, якія мелі поспех на тэлебачанні, неабходна вызначыць шматсерыйны фільм «Белыя адзенні» рэжысёра Л. Белазаровіча (1992), другую і трэцюю часткі кінааповесці «Любіць па-рускі» рэжысёра Я. Мацвеева (1996, 1999). Некалькі ўзнагарод на міжнародных конкурсах атрымалі стужкі «Я – Іван, ты – Абрам» (незалежная кінакампанія ВІТТ і французская кампанія «Ашэт Прэм’ер», рэж. І. Зоберман, 1993) і «Падзенне даверху» (рэж. А. Трафімава, 1998) [292].

У 2000 г. на экраны выйшла кінастужка М. Пташука «У жніўні 44-га...», якая стала апошняй работай рэжысёра.

На мяжы стагоддзяў у беларускім кіно адбылася змена пакаленняў. З жыцця пайшлі вядомыя майстры беларускага кіно – В. Тураў, Ю. Марухін, М. Пташук, У. Шавялевіч. Ім на змену прыйшлі новыя рэжысёры – У. Аслюк, Г. Адамовіч, А. Кудзіненкаў, А. Колбышаў.

Сярод работ 2000-х гг. вызначаецца «Інсайт» (рэж. Р. Грыцкова, 2009), «Зграя» (рэж. Д. Зайцаў, 2008), ваенная драма «Дняпроўскі рубеж» (рэж. Д. Скварцоў, 2009), меладрама «Трамвай у Парыж» (рэж. Д. Лось, 2010), гісторыкапсіхалагічная драма «Ваўкі» (рэж. А. Колбышаў, 2009), трылер «Масакра» (рэж. А. Кудзіненкаў, 2010), дзіцячы фільм «Навагоднія прыгоды ў ліпені» (рэжысёры І. Паўлаў і А. Турава, 2008).

Побач з развіццём вытворчасці мастацкіх фільмаў у краіне працягваў развівацца жанр ***дакументальнага кіно***.

Значныя змены закранулі жанр кінахронікі. Замест выпускаў «Піянера Беларусі» у 1991 г. стаў выходзіць штоквартальнік «Дзянніца», выпускі «Савецкай Беларусі» пачалі выходзіць пад назвай «Беларусь». Паступова кінахроніка звялася толькі да падрыхтоўкі штомесячнікаў «Беларусь», якія больш-менш рэгулярна выходзілі да канца 1993 г. У 1995 г. быў здзейснены яго адзін выпуск, у 1996 – тры, у 1997 – адзін, у 1998 г. – сем. Выпускі кінаальманаху працягваліся і ў наступныя гады. Найбольш растыражыраваным стаў выпуск 2006 г. пад назвай «Трое з дзесяці мільёнаў» [704, с. 42].

У 1990-х гг. на творчым аб’яднанні «Тэлефільм» былі створаны фільмы на экалагічную тэматыку: «Бярэзінскі запаведнік» (рэж. Л. Гедравічус, 1994–1995), «Нёман» (рэж. В. Жыгалка, 2000), чарнобыльскі цыкл «Нараўлянскія эцюды» (рэж. В. Басаў, 1996–1998) [719, с. 40]. Прызнаным майстрам фільмаў пра флору і фаўну Беларусі быў рэжысёр «Белвідэацэнтра» І. Бышнёў. Сярод іх: «Вялікі лес» (2008), «Лёс зубра» (2008), «Рака жыцця» (пра р. Прыпяць, 2009), «Жыццё тураўскага лугу» (2010 г.) і інш. На юнага гледача разлічаны дакументальны фільме І. Бышнёва «Ваўчыца па імені Дайя» (2008) [299].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1998 г. Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь быў адзначаны тэлерэжысёр В. Шэвялевіч, які стварыў шэраг фільмаў хрысціянскай тэматыкі – «Уладыка» (1993), «Полацкая Сафія» (1995), «Пад крыламі Ефрасінні» (1996), «Лісты аб добрым і прыгожым» (1998–1999). У 1999 г. рэжысёр быў узнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Ён жа з'яўляўся аўтарам тэлефільмаў на гістарычную тэматыку: «Прыйдзі і віждь» (1992), «Адлучэнне» (1992), «Пастка для зубра» (1994), «Беларусь на крыжы вякоў» (2000–2002). Апошнім праектам рэжысёра стаў шматсерыйны дакументальны фільм «Навейшая гісторыя Беларусі», стваральнікі якога былі адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры за 2004 г.

Сярод лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» 2005 г. быў кінарэжысёр студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм» Ю. Гарулёў. Спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2004 г. атрымаў галоўны рэжысёр «Белвідэацэнтра» А. Карпаў за стварэнне дакументальнага фільма «Палітра памяці» да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад фашызму. Гэтую ж узнагароду за дасягненні ў 2005 г. атрымаў кінарэжысёр студыі «Летапіс» А. Алай.

У 2009 г. кінарэжысёр М. Князеў за стварэнне дакументальных фільмаў «Вароты», «Беларускі космас», «Матэрыя вобразу», «Сустрэча» атрымаў прэмію Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ў галіне літаратуры, мастацтва, журналістыкі і самадзейнай творчасці.

У 2009 г. кінастудыя «Беларусьфільм» была адзначана дыпломам Міністэрства культуры і турызму Украіны «за прадстаўленую праграму фільмаў сельскай тэматыкі» на IX Кіеўскім міжнародным фестывалі дакументальных фільмаў «Кіналетапіс-2010» [664].

У 1989 г. для стварэння відэафільмаў разнастайнай тэматыкі было створана вытворча-творчае прадпрыемства *«Беларускі відэацэнтр»*. Яго супрацоўнікамі праводзіліся здымкі дакументальных партрэтаў дзеячаў культуры краіны, культурных падзей, дасягненняў у сферы прафесійнага мастацтва і народнай культуры. Рэжысёры і сцэнарысты стваралі аповеды пра культурна-палітычныя падзеі, сучасную беларускую культуру, духоўнае жыццё Беларусі, яе гісторыю, прыроду. У Белвідэацэнтры быў створаны фонд экраннай гісторыка-культурнай спадчыны [719, с. 41].

Асноўнымі тэмамі беларускага дакументальнага кіно ў вывучаемы перыяд былі праблемы гісторыі і сучаснага жыцця Беларусі. Шэраг фільмаў стварыў рэжысёр С. Гайдук: «Вянок цярністых васількоў» (пра Л. Геніюш, 1992), «Той, хто апярэдзіў час» (пра А. Дубко, 2006), «Так трымаць, Верцялішкі» (пра В. Равяка, 2006), «Пясняр з Нарачанскага края» (пра М. Танка, 2007), «Кандрат Крапіва» (2010).

Новае бачанне гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прадстаўлена ў карцінах А. Алаева «Чорная дарога» (1992), «Адрынуты» (1993), «Гастэла» (1997), «Салдаты Італіі» (2002). У аснову відэафільма рэжысёра А. Карпава-малодшага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Палітра памяці (Вялікая Айчынная вайна 1941–1945 гг. на палотнах беларускіх мастакоў)» (2004) былі пакладзены 437 карцін беларускіх мастакоў ваеннай тэматыкі. У перыяд працы здымачная група прагледзела 3000 жывапісных палотнаў, якія захоўваліся ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. У выніку атрымаўся аповед пра складаны і гераічны час мовай выяўленчага мастацтва.

Рэаліям сучаснага жыцця былі прысвечаны фільмы Г. Адамовіч «Палюбі мяне чорненькім» (1992), «Канікулы для сіраты» (1999), «Лінія бацькі» (1999); рэпартажны фільм В. Жыгалко «Вясна 1999 года» (1999).

Не заставаліся па-за ўвагай рэжысёраў падзеі і асобы культурнага жыцця Беларусі. Гэта фільмы-партрэты рэжысёра «Белвідэацэнтра» В. Скварцовай «Па імені і жыціе...» (пра мітрапаліта Філарэта, 2006), «Свет і цені майго лёсу» (пра актрысу В. Клебановіч, 2006), «Ігар Лучанок. Мелодыя лёсу» (2008), «Анатоль» (пра А. Ярмоленка, 2008), «Ён песню сэрцам адчуваў...» (пра Г. Цітовіча, 2010).

Адным з прызнаных лідараў беларускага дакументальнага кіно XXI ст. з'яўляецца В. Аслюк. Ён аўтар стужак «Вечная тэма» (1998), «Добры вечар, сад, сад…» (1998), «Андрэевы камяні» (1999), «Мы жывём на краі» (2002), «Кола» (2003), «Працяг» (2003), «Вальс» (2008), «Андрэй» (2010). На канец 2010 г. В. Аслюк быў лаўрэатам больш за 30 прэстыжных еўрапейскіх кінапрэмій, у тым ліку прыза «Еўропа-2002» за лепшы негульнёвы еўрапейскі фільм года «Мы жывем на краі», з'яўляўся членам Еўрапейскай кінаакадэміі [283, с. 24].

У 2006 г. спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь былі адзначаны аўтары цыкла навукова-папулярных відэафільмаў «Чарнобыльскія джунглі. 20 гадоў без чалавека» «Белвідэацэнтра» І. Бышнёў і П. Зубрыцкі.

Дакументальныя фільмы вызначаліся свабодай жанравай інтэрпрэтацыі рэжысёраў, стварэннем імі ўласных жанраў. Адной з яскравых работ з пункту гледжання развіцця жанрава-стылёвых форм стаў фільм рэжысёра Н. Гаркуновай «Нясыграная роля» (1999). Стужка арыгінальная па сюжэтнай кампазіцыі: разглядаецца творчасць М. Гогаля і адначасова творчы лёс заслужанага артыста Беларусі В. Манаева. Да аўтарскага лірыка-паэтычнага напрамку ў кіно адносіцца фільм В. Шышова «Вяртанне ў рай» (1999), прысвечаны творчасці беларускага мастака В Бялыніцкага-Бірулі [758, с. 12–13].

Сярод першапраходцаў аўтарскага кіно быў У. Бокун, які як кіраўнік прыватнай кінакампаніі ўжо ў XXI ст. стварыў цыкл дакументальных стужак «Зваротны адлік» [284].

У сферы дакументальнага кіно прыватнымі студыямі былі рэалізаваны праекты, якія мелі яскрава выражаную ідэйна-палітычную накіраванасць. Прыкладам служаць стужкі рэжысёраў В. Дашука і Ю. Хашчавацкага.

Рэжысёр, аператар, сцэнарыст, журналіст В. Дашук стварыў уласную кінастудыю, на якой зняў дакументальныя кароткаметражныя фільмы аб падзеях у Беларусі: «Паміж Сатаной і Богам» (1997), «Ноч доўгіх нажоў» (1998), «Рэпар-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таж з клеткі для трусоў» (2000), «Дэкамерон па-беларуску» (2003), «Magnum misteria» (2004), «Салдат Васіль Быкаў» (2005).

Работы Ю. Хашчавацкага не вызначаюцца арыгінальнымі рэжысёрскімі рашэннямі. Ён выкарыстаў вядомыя прапагандысцкія прыёмы і стылістыку палітычнага памфлета. Дакументальныя стужкі «Звычайны прэзідэнт» (1996), «Плошча» (2007), «Назад, у мінулае» (2007) былі забаронены ў Беларусі, але гэта толькі садзейнічала росту цікавасці да іх. Фільмы капіраваліся і распаўсюджваліся ў лакальных камп'ютарных сетках.

У 1995 г. вялікі рэзананс у грамадстве выклікаў зняты рэжысёрам Ю. Азаронкам дакументальны фільм «Нянавісць: дзеці падману» [152, с. 6; 853]. Фільм быў паказаны на беларускім тэлебачанні 2 разы напярэдадні рэферэндуму 1995 г. Рэжысёр правёў параўнальнае апісанне калабарацыяністаў часоў Вялікай Айчыннай вайны і сучасных беларускіх нацыяналістаў. У 1996 г. Ю. Азаронак зняў фільм «Закуліса», у якім распавядалася аб сувязі беларускіх апазіцыянераў з замежнымі палітычнымі і фінансавымі сіламі. У 2001 г. ён стварыў дакументальны тэлецыкл «Тайныя спружыны палітыкі», у якім асвяціў дзейнасць апазіцыі і разнастайных замежных фондаў і цэнтраў у негатыўным плане. У наступныя гады ён стварыў аўтарскую тэлепраграму «Канспіралогія» (2004), зняў шасцісерыйны фільм «Духоўная вайна» (2006) і інш. За першы ён быў узнагароджаны спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва за высокія творчыя дасягненні ў 2004 г. Другі быў адзначаны прызом Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі «За вернасць маральным ідэалам у кінамастацтве».

Асобны напрамак кінамастацтва ўяўляе сабой ***мультыплікацыя***. Адметным у гісторыі беларускай мультыплікацыя з'яўляецца 1996 г., калі рэжысёр-мультыплікатар В. Бакуновіч стварыў першы беларускі камп'ютарны маляваны фільм «Мілы, мілы дом».

Сярод рэжысёраў, плённа працуючых у гэты перыяд, неабходна выдзеліць І. Волчака («Скерца», 1994; «Пастараль», 1998; «Як Несцерка скарб знайшоў», 2004; «Як Несцерка гаршчкі прадаваў», 2008), І. Кадзюкову (цыкл з 9 фільмаў пад назвай «Калядныя апавяданні», 1994–2004), У. і А. Пяткевічаў («Сны», 1992; «Казкі лесу», 1996; «Ёрш і верабей», 1999; «Песенька пра канарэйку», 2002), М. Тумеля («Чароўная дудка», 1998; «Мячык», 2000; «Непахісны Чэн», 2006, «Аповесць мінулых гадоў», 2006, 2007, 2008, 2010; «Выцінанка-выразанка», 2010), А. Ленкіна («Чаго на свеце не бывае», 1996; «Церам-церамок», 1998; «Зімоўе звяроў», 1999; «Яма, танцы, чатыры струны», 2002; «Аповесць мінулых гадоў», 2006, 2007, 2008, 2010; «Пра сяброўства, Шарыка і лятаючую талерку», 2008; «Птаха», 2009), Н. Хаткевіч («Іван-да-Мар'я пра каханне», 1997; «Аповесць мінулых гадоў», 2007, 2008, 2010), А. Тураву («Хапун», 1993; «Балада пра тры апельсіны», 1996; «Казка пра сінюю світку», 1997; «Музыка-чарадзей, 2001). Сярод мастакоў-аніматараў – А. Мацюшэўскую, Т. Кульбіцкую, В. Чыкіну, Н. Касцючэнка, Т. Жыткоўскую («Фантазёрка», 1999; «Перацэнка каштоўнасцей», 2001).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1994 г. на студыі анімацыйных фільмаў «Беларусьфільма» рэжысёрам А. Ленкіным былі зняты дзве серыі фільма «Рэактыўны парсючок», які ў далейшым ператварыўся ў сумесны расійска-беларускі праект.

У 2006–2009 гг. штогод кінастудыя выпускала па пяць мультыплікацыйных фільмаў [264–266]. Найбольш прадуктыўным атрымаўся 2010 г. – 7 фільмаў [360, с. 97]. Пачынаючы з 2007 г. і па 2010 г. штогод выходзіла па аднаму фільму пра Несцерку [746]. У 2006 г. кінарэжысёр І. Волчак разам з М. Тумелем, А. Ленкіным і інш. пачалі здымкі мультсерыяла «Аповесць мінулых гадоў». За пяць гадоў было выпушчана пяць серый.

У краіне рэгулярна праводзіліся ***кінафестывалі***. У 1993 г. студыяй «ТэлеАРС» быў заснаваны штогадовы фестываль-агляд постсавецкага ігравога кіно «Лістапад». У 1996 г. ён набыў дзяржаўны статус і ператварыўся ў Міжнародны кінафестываль краін СНД і Балтыі, а пазней – Мінскі міжнародны кінафестываль. З 1993 г. у краіне праводзіўся Міжнародны фестываль жаночага кіно. З 1997 г. – фестываль аматарскіх і студэнцкіх фільмаў. У 1998 г. дзіцячая кінастудыя «Даквіст» правяла першы Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў «Анімаёўка». Пазней ён стаў праводзіцца ў Магілёве. З 1997 г. праводзіўся Нацыянальны фестываль беларускіх фільмаў у Брэсце. Толькі ў 2006 г. адбыліся: III Мінскі міжнародны фестываль экалагічных фільмаў «EKAFILM», IX Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў «Анімаёўка» (г. Магілёў), XIII Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад».

На VII Рэспубліканскім фестывалі беларускіх фільмаў у 2010 г. гран-пры атрымаў мастацкі фільм «Ваўкі» вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм» (рэж. А. Колбышаў). Спецыяльны дыплом «За пошук у жанры эксцэнтрычнай камедыі» журы прысудзіла рэжысёру А. Канановічу. Лепшым сярод анімацыйных быў прызнаны фільм «Аповесць мінулых гадоў», сярод тэлевізійных – «Снайпер. Зброя адплаты».

### *5.5.2. Дзяржаўная палітыка ў галіне кінавідэавытворчасці*

Дзяржаўны кінематограф у пачатку 1990-х гг. знаходзіўся ў цяжкім стане. Кінастудыя «Беларусьфільм» здолела захаваць ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі вытворча-творчую базу і кадры спецыялістаў. Аднак крызісныя з'явы былі відавочнымі. Рэзка скараціўся аб'ём вытворчасці на сродкі дзяржаўнай датацыі, што было выклікана значным павышэннем цэн на тарыфы і паслугі. У 1993 г. пачалася работа над вытворчасцю 3 мастацкіх, 24 дакументальна-публіцыстычных і хранікальных фільмаў і 4 мультыплікацыйных стужак. Тэлевізійныя фільмы не здымаліся з-за адсутнасці сродкаў [439, спр. 10, арк. 147].

Для параўнання, у 1989 г. кінастудыя выпусціла 6 поўнаметражных мастацкіх фільмаў, 7 шматсерыйных мастацкіх, 4 хроніка-публіцыстычных і навукова-папулярных карцін, 22 інфармацыйна-хранікальныя і спецыялізаваныя кіначасопісы, 6 мультыплікацыйных стужак. Па вытворчасці тэлевізійных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фільмаў, якая ажыццяўлялася па заказе былога Дзяржкамрадыё СССР, кінастудыя «Беларусьфільм» займала другое месца сярод студый Савецкага Саюза [439, спр. 10, арк. 148].

Адносна 1989 г. у 1993 г. у 2 разы скарацілася забяспечанасць кінастудыі матэрыяламі і рэсурсамі, неабходнымі для фільмавытворчасці. Зусім адсутнічалі матэрыяльныя фонды на мадэрнізацыю і рамонт тэхнічнага абсталявання і спецыялізаваных вытворчых магутнасцей.

Для ажыццяўлення паслядоўнай дзяржаўнай палітыкі ў кінематаграфіі з мэтай павышэння яе выхаваўчага, маральна-духоўнага ўплыву на грамадства Міністэрства культуры распрацавала комплексную праграму, якая прадугледжвала павелічэнне аб'ёму вытворчасці беларускіх кінавідэатэлефільмаў шляхам дзяржаўна-творчага заказу, падрыхтоўку творчых і тэхнічных кадраў для кінематаграфіі [439, спр. 10, арк. 148–149].

Планавалася заключыць доўгатэрміновы дагавор з дзяржаўнай тэлерадыёкампаніяй на вытворчасць беларускіх фільмаў для тэлебачання; аказаць фінансавую і матэрыяльна-тэхнічную падтрымку кінастудыі «Беларусьфільм»; стварыць вучэбную студыю на базе кінастудыі [439, спр. 10, арк. 149–150].

Аднак выкананне дзяржаўнага творчага заказу было не гарантавана ў сувязі з неадпаведнасцю выдзеленых бюджэтных сродкаў фактычным затратам у сувязі з інфляцыяй. Пад пагрозай зрыву знаходзілася завяршэнне вытворчасці карцін, у здымкі якіх былі ўкладзены немалыя сродкі [439, спр. 10, арк. 148].

Крытычнае становішча галіны патрабавала неадкладных захадаў палітычнага, прававога і эканамічнага характару. У лютым 1993 г. калегія Міністэрства культуры вырашыла прасіць Урад і Камісію Вярхоўнага Савета па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны аб уключэнні Закона «Аб кінематаграфічнай дзейнасці» ў павестку сесіі 1993 г. Падведамасным кіна-, відэавытворчым і кіна-, відэавідовішчным прадпрыемствам забаранялася стварэнне, распаўсюджанне, дэманстрацыя і рэклама кіна-, тэле- і відэафільмаў, якія прапагандавалі ці змяшчалі элементы парнаграфіі, культ насілля і жорсткасці, зневажалі чалавечую годнасць і разыходзіліся з агульнапрынятымі ў грамадстве нормамі маралі, спрыялі здзяйсненню правапарушэнняў. Было вырашана пры Беларускім інстытуце праблем культуры арганізаваць курсы падрыхтоўкі спецыялістаў па кінавідэамаркетынгу і падрыхтоўкі кадраў кінавідэагаліны [439, спр. 3, арк. 2–4].

Шмат змен прадугледжвала пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай падтрымцы нацыянальнай кінематаграфіі» ад 29 верасня 1993 г. Планавалася стварыць спецыяльны галіновы орган кіравання – нацыянальную кінавідэакампанію [12]. Першым крокам павінна было стаць далучэнне рэспубліканскага вытворчага аб'яднання «Белвідэацэнтр» да кінастудыі «Беларусьфільм». Адначасова вялася работа па стварэнні канцэрна «Белкінавідэапракат». Планавалася ў далейшым іх аб'яднанне ў нацыянальную кінавідэакампанію Рэспублікі Беларусь. Гэтай жа пастановай прадугледжвалася фінансаванне не менш пяці мастацкіх кінафільмаў у год (у тым ліку аднаго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фільма дзіцяча-юнацкага рэпертуару), 20 адзінак хранікальна-дакументальных фільмаў, трох поўнаметражных мастацка-публіцыстычных фільмаў, 20 кіначасопісаў, 15 хранікальна-летапісных сюжэтаў, 10 мультыплікацыйных фільмаў, а таксама 26 назваў відэапрадукцыі агульным аб’ёмам 13 гадзін.

У сакавіку 1994 г. на калегіі Міністэрства культуры разглядалася пытанне стану і перспектыў нацыянальнай кінематаграфіі. Размова ішла не столькі пра развіццё, колькі пра захаванне беларускай кінематаграфіі ў складаных умовах пераходу да рыначнай эканомікі. На калегіі выказваліся меркаванні аб раздробленасці сістэмы вытворчасці кінафільмаў і раз’яднанасці кінавідэапракату. Такое становішча не спрыяла жыццястойкасці беларускай кінематаграфіі. Выказваліся думкі аб неабходнасці прынцыпова іншага падыходу да інтэграцыі кінагаліны на дзяржаўным узроўні, стварэння адпаведнага органа каардынацыі і рэгулявання кінематаграфічнай дзейнасці новага тыпу. Калегія даручыла распрацаваць комплексную праграму падрыхтоўкі кінематаграфічных кадраў [43].

Адным з напрамкаў дзейнасці па захаванні і развіцці беларускай кінематаграфіі ў той час бачылася вытворчасць і пракат кіна-, відэа- і тэлевізійных фільмаў сумесна з замежнымі партнёрамі [439, спр. 10, арк. 13].

У 1994–1995 гг. кінастудыя «Беларусьфільм» апынулася на мяжы распаду, страты значнай колькасці прафесійных кадраў. Такое становішча ў той час назіралася ва ўсім постсавецкім кінематографе. У Арменіі ў 1996 г. быў зняты адзін мастацкі фільм, «Малдова-фільм» зняла дзве кароткаметражныя стужкі, некалькі гадоў кіно не здымалася ў Літве, а ў 1997 г. у вытворчасці знаходзіўся мастацкі фільм. У Кіргізіі ў тым жа годзе ішла праца над адной мастацкай стужкай сумесна з французамі, толькі дакументальныя фільмы здымаў «Таджыкфільм». У Латвіі і на Ялцінскай кінастудыі вытворчасць была спынена. Амаль два гады бяздзейнічала кінастудыя імя М. Горкага. У 1995 г. на «Масфільме» былі зняты чатыры кінастужкі, адна кінакарціна – на «Ленфільме» ў 1996 г. [439, спр. 163, арк. 111].

У такіх крызісных умовах на кінастудыі «Беларусьфільм» было прынята рашэнне прыцягнуць замежны капітал для стварэння сумесных фільмаў. Першы кантракт быў падпісаны з ізраільскай фірмай «Roman Golan» (праект «Маскоўская сувязь»). У далейшым правы на вытворчасць фільма былі перададзены нямецкай фірме А. Браунера «C. C. C. Film kunst». З ёй на працягу 1994–1995 гг. акрамя згаданага былі створаны яшчэ тры фільмы («Супермозг», «Луіза і Джэк-пот», «З пекла ў пекла»). Гэта дазволіла захаваць студыю, штат унікальных спецыялістаў, а таксама выкарыстоўваць атрыманую валюту для забеспячэння здымак бюджэтных фільмаў шляхам закупкі кінаплёнкі, абсталявання, матэрыялаў, пагашэння валютнага крэдыту. Пры падпісанні кантрактаў на ўсе вышэйзгаданыя фільмы кінастыдыі ўдалося забяспечыць эксклюзіўнае права на продаж карцін на тэрыторыі былога СССР. Аднак у далейшым заказчыкі знайшлі больш выгадныя і камфортныя ўмовы працы, што прывяло да зніжэння аб’ёму работ за кошт пазабюджэтных сродкаў [439, спр. 163, арк. 111].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8 жніўня 1996 г. кінастудыю «Беларусьфільм» наведаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Ім былі дадзены даручэнні, накіраваныя на далейшае развіццё кінамастацтва, павышэнне творчага патэнцыялу беларускага кінематографа, узмацненне матэрыяльна-тэхнічнай базы кінастудыі, павышэнне надбавак да заработнай платы работнікам кінастудыі. Быў прадугледжаны выпуск у рамках дзяржзаказу пяці поўнаметражных мастацкіх і 23 дакументальных кінафільмаў, у тым ліку трох поўнаметражных кінафільмаў. Кінастудыі быў выдзелены 1 млн дол. на набыццё кінаабсталявання. Пачалася праца над сцэнарыем мастацкага фільма, які б змог прыцягнуць увагу гледача (такім фільма стала экранізацыя рамана У. Багамолава «Момант ісціны») [439, спр. 148, арк. 136–137].

27 снежня 1996 г. Урад краіны прыняў пастанову «Аб дадатковых мерах па захаванні і развіцці нацыянальнай кінематаграфіі і павышэнні ўзроўню кінавідэаабслугоўвання насельніцтва» [491]. Дакумент прадугледжваў распрацоўку ў 1997 г. праекта Закона «Аб кіно», творчай і эканамічнай праграмы тэатрастудыі кінаакцёра кінастудыі «Беларусьфільм», сумеснай міжведамаснай праграмы мерапрыемстваў па стварэнні сумеснай кінатэлевізійнай прадукцыі. Гэтай жа пастановай кінастудыя «Беларусьфільм» была перайменавана ў Нацыянальную кінастудыю «Беларусьфільм». Асобна адзначалася мэтазгоднасць стварэння ў краіне цэнтраў нацыянальных кінематаграфій дзяржаў – удзельніц СНД.

Пытанне развіцця нацыянальнага кінематографа заўсёды знаходзілася на кантроле ў Міністэрстве культуры. На калегіях неаднаразова разглядаліся тэматычныя планы вытворчасці фільмаў як кінастудыі «Беларусьфільм», так і ВТП «Белвідэацэнтр». Напрыклад, у рашэнні калегіі па гэтым пытанні ў лістападзе 1998 г. адзначалася неабходнасць больш грунтоўнай падрыхтоўкі плана кінастудыі, больш шырокага і мэтанакіраванага пошуку кінасцэнарыяў, а таксама заказаў замежных студый і фірм на вытворчасць кінапрадукцыі. Нацыянальнай кінастудыі даручалася стварыць сцэнарную групу з мэтай пастаяннага пошуку кінасцэнарыяў, распрацоўкі і падрыхтоўкі рэальнага перспектыўнага тэматычнага плана вытворчасці фільмаў і бізнес-планаў [44, с. 20].

У студзені 1998 г. міністрам культуры быў зацверджаны гадавы План мерапрыемстваў па ўдасканаленні дзейнасці Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Планавалася ў штатны расклад увесці пасаду мастацкага кіраўніка кінастудыі, стварыць агульны і самастойныя (па студыях) мастацкія саветы, сцэнарна-рэдакцыйную калегію. Сярод мерапрыемстваў была распрацоўка праекта стварэння гасразліковай групы. Яе задачай павінна была стаць максімізацыя вяртання дзяржбюджэтных сродкаў, патрачаных на выкананне сацыяльна-творчага заказу, удасканаленне работы па адборы і пошуку перспектыўных кінапраектаў, актыўным прыцягненні беларускіх і замежных інвестараў, пастаяннае вывучэнне попыту на кінапрадукцыю ў цэнтрах і рэгіёнах краін СНД, укараненне практыкі тыражыравання і продажу беларускіх фільмаў на відэакасетах з улікам камерцыйнай выгады. З мэтай павелічэння матэрыяльнай зацікаўленасці творчай групы ў рэалізацыі ствараемых фільмаў планавалася

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўвесці пагадзінную сістэму аплаты працы творчай групы фільма, удзяліўшы асаблівую ўвагу аплаце работы кінарэжысёра-пастаноўшчыка [439, спр. 212, арк. 261–262].

Эканамічны крызіс 1998 г. рэзка пагоршыў і так нядобры стан беларускай кінематаграфіі. Праз год, у верасні 1999 г., Беларускі саюз кінематаграфістаў (БСК) у спецыяльным звароце да дзяржаўных і ўрадавых органаў заклікаў звярнуць ўвагу на становішча нацыянальнай кінагаліны і прыняць неадкладныя меры па яе выратаванні. 16 лістапада 1999 г. на базе кінастудыі «Беларусьфільм» адбылося пашыранае пасяджэнне Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе і Мінскага абласнога вытворчага аб'яднання «Кінавідэапракат» з удзелам шырокага кола зацікаўленых. У прынятай па яе выніках пастанове гаварылася аб кроках па далейшым развіцці і ўдасканаленні заканадаўчай і нарматыўна-прававой базы для галін нацыянальнай кінематаграфіі і кінавідэамастацтва, якаснай перабудове арганізацыйнай структуры кіравання, кадравага забеспячэння, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў для гэтых галін культуры і мастацтва. Найбольш істотнай была прапанова аб распрацоўцы праекта закона «Аб кінематаграфічнай дзейнасці» [439, спр. 298, арк. 131–134].

У сакавіку 2000 г. адбыўся пазачарговы з'езд БСК, на якім разглядалася пытанне аб крытычнай сітуацыі ў беларускім кінематографе.

Аналізуючы вынікі развіцця кінематаграфіі Беларусі ў 1990-х гг., А. Бязуглы звяртаў увагу на тое, што «дырэктыўна-распарадчыя метады кіравання ў сённяшніх умовах даюць кароткатэрміновы эфект. Кардынальна рэгуляваць працэсы можна толькі эканамічным шляхам пры спалучэнні бюджэтных і пазабюджэтных крыніц фінансавання галіны.... Практыка размеркавання сродкаў дзяржаўнага бюджэту сведчыць аб тым, што часам у сферы вытворчасці і пракату фільмаў, па сутнасці, інвесціруецца тэхналагічны працэс, а не канечны вынік, і упор робіцца не на інтарэс гледача да фільма (як вынік дзяржаўнай падтрымкі), а на асваенне выдзеленых сродкаў» [96, с. 119, 121].

З выказанай А. Бязуглым пазіцыяй пераклікаюцца ацэнкі тагачаснага першага сакратара Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз кінематаграфістаў» А. Шкадарэвіча. Сярод суб'ектыўных фактараў, якія паўплывалі на крызісны стан нацыянальнага кінематографа, ён адзначаў кіраўнічы непрафесіяналізм як адказных асоб Міністэрства культуры, так і кіраўнікоў кінастудыі «Беларусьфільм». Акрамя гэтага, па меркаванні А. Шкадарэвіча, «усе тыя, хто павінен быў своечасова перабудавацца, па-ранейшаму працягваюць працаваць па сістэме «валавы аб'ём–склад»... Пры стварэнні «валавога аб'ёму» не столькі важна, чым ён будзе напоўнены, галоўнае не турбаваць сябе... Галоўнае – прыгожа адрапартаваць» [832, с. 48]. Падкрэсліваючы значэнне дзяржаўнага заказу на кінавідэапрадукцыю, спецыяліст-практык заўважае, што «назначэнне гэтай падтрымкі падвергнута скажэнню. Мы трацім дзяржаўныя грошы на ўсё, што заўгодна, але толькі не на сапраўднае нацыя-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нальнае кінамастацтва... Павінен быць створаны Незалежны экспертны савет, куды павінны ўвайсці "кінааўтарытэты", тыя, хто ставіць меркаванні прафесійнай годнасці вышэй за меркаванні сяброўства і асабістай выгады» [832, с. 49]. Пытанне развіцця нацыянальнага кінематографа аўтар звязваў з развіццём інстытута прадзюсарства, перабудовай усёй сістэмы кіравання галіной.

Пра гэта ж гаварыў і вядомы рэжысёр анімацыйных фільмаў А. Ленкін: «Наша бяда яшчэ ў тым, што ў нас няма інстытута прадзюсарства. Ніхто толкам не можа сказаць нам, што і як неабходна здымаць. За дзяржаўныя грошы, якія выдзяляюцца на мультыплікацыю, ніхто не адказвае. Кінастудыі "Беларусьфільм" неабходны прадзюсар, які здабываў бы гэтыя грошы, укладаў іх у вытворчасць, а самае галоўнае – адказваў бы за тое, што гэтыя грошы потым вернуцца… З увядзеннем інстытута прадзюсарства былі б вырашаны праблемы з ганарарамі. Раней я як рэжысёр і аўтар сцэнарыя ад кожнага продажу атрымоўваў 7 %. Гэта невялікія грошы, але яны дазвалялі не думаць, будзеш ты сёння вячэраць ці не. Потым нейкія светлыя галовы выдалі дакумент «у мэтах матэрыяльнай зацікаўленасці аўтараў карціны…», і гэтыя працэнты з нас знялі… Яна [матэрыяльная зацікаўленасць. – *Д. К.*] тут жа сама па сабе адпала» [832, с. 50].

Становішча не змянілася і пазней. Так, у 2008 г. тагачасны генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» У. Замяталін падкрэсліваў: «Прадзюсарства на кінастудыі існуе. Прадзюсар – дзяржава, і нікуды ад гэтага не падзецца. […] Мы імкнемся рабіць якаснае кіно, і яго галоўным прадзюсарам павінна заставацца дзяржава» [66, с. 5]. Цытата сведчыць аб неразуменні дырэктарам кінастудыі сутнасці прадзюсіравання. Гэта не дзіўна, калі ўлічыць, што ў той час побач з эканамічным складнікам больш важным быў ідэалагічны. Так, на пасяджэнні калегі Міністэрства культуры па выніках працы за 2003 г. У. Матвейчук адзначаў, што «Міністэрства культуры ў галіне кінавідэамастацтва кіруецца прынцыпам – галоўным вынікам развіцця павінна стаць ідэалагічнае ўздзеянне айчыннай экраннай прадукцыі на грамадзян Беларусі і фарміраванне станоўчага іміджу нашай краіны за мяжою» [439, спр. 886, арк. 49].

У пачатку XXI ст. кінастудыя «Беларусьфільм» у асноўным прадстаўляла платныя паслугі і свае базы для вытворчасці фільмаў замежным вытворцам. Пры гэтым прыбытак ад рэалізацыі кінапрадукта кінастудыя не мела. На той час у Беларусі, адзінай з постсавецкіх краін, захоўвалася амаль стопрацэнтнае дзяржаўнае фінансаванне кінавытворчасці [106, с. 18–20].

У 2004 г. быў прыняты распрацаваны яшчэ ў канцы 1990-х гг. закон, рэгулюючы кінавытворчасць, – ***«Закон аб кінематаграфіі ў Рэспубліцы Беларусь»***. Ён быў накіраваны на вырашэнне не толькі сацыяльна-эканамічных, але і ідэалагічных пытанняў, вызначыў асноўныя прынцыпы і напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы кінематаграфіі:

прызнанне кінематаграфіі сферай культуры, абавязковай умовай існавання якой з'яўляецца развіццё творчай, вытворчай, тэхнічнай, адукацыйнай, навуковай і інфармацыйнай базы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адказнасць дзяржавы за захаванне і развіццё нацыянальнай кінематаграфіі;

падтрымка прыярытэтных напрамкаў развіцця кінематаграфіі;

стварэнне спрыяльных умоў для развіцця спонсарства і дабрачыннасці ў сферы кінематаграфіі;

стварэнне умоў для таго, каб творы кінамастацтва былі дасягальнымі для шырокіх колаў грамадскасці.

Закон вызначыў прыярытэтныя задачы дзяржавы ў акрэсленых вышэй мэтах:

развіццё сеткі арганізацый кінематаграфіі, стымуляванне стварэння і развіцця арганізацый кінематаграфіі незалежна ад арганізацыйна-прававых норм і форм уласнасці;

забеспячэнне ўмоў для павышэння прафесійнага росту творчай моладзі;

гарантаванне вытворчасці фільмаў для дзяцей і моладзі;

стварэнне ўмоў для выкарыстання кінематаграфіі ў мэтах эстэтычнага, духоўнага-маральнага выхавання, асветы і адукацыі.

Закон увёў вызначэнне «нацыянальны фільм»[1] – фільм, сцэнарый якога асвятляе падзеі гісторыі і культуры Рэспублікі Беларусь ці адлюстроўвае найбольш важныя з'явы сучаснасці, якія маюць грамадскую, гістарычную і культурную значнасць, пры гэтым не менш 70 % складу здымачнай групы, якая стварае фільм, – грамадзяне Рэспублікі Беларусь, і фінансаванне выдаткаў па яго вытворчасці здзяйсняецца, як правіла, за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовых бюджэтаў. У канцы 2004 г. асобнай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь было зацверджана «Палажэнне аб нацыянальным фільме».

У *Дзяржаўнай праграме «Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г.»* у напрамку развіцця кіна- і відэамастацтва звярталася ўвага на вырашэнне праблемы развіцця нацыянальнай кінадраматургіі, падрыхтоўкі кадраў, неабходнасць «надаць максімум увагі падрыхтоўцы маладых рэжысёраў, сцэнарыстаў, вырашыць пытанні тэматычнага планавання, пракату, кінаадукацыі і кінапрапаганды», прапаганду нацыянальнага кінамастацтва сродкамі тэлебачання і відэапракату. Асаблівай увагі, па меркаванні распрацоўшчыкаў дакумента, патрабаваў відэарынак [208, с. 36].

Комплексны практычны ўплыў на развіццё галіны ў 2000-х гг. мелі рашэнні Главы дзяржавы. У прыватнасці, перадача будынка кінастудыі з дзяржаўнай маёмасці ў прыватную адпаведна Указу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад

[1] Дадзенае вызначэнне не з'яўляецца знаходкай беларускіх законатворцаў. Такі тэрмін утрымлівае мадэльны закон «Аб дзяржаўнай падтрымцы кінематаграфіі», прыняты на 14-м пленарным пасяджэнні Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц СНД у кастрычніку 1999 г. Адпаведна яму: «нацыянальны фільм – твор, які адлюстроўвае спецыфіку нацыянальнай кінематаграфіі. Дадзенае вызначэнне выкарыстоўваецца ў мэтах стварэння сістэмы абароны аўтарскіх і сумежных правоў на тэрыторыях сваіх дзяржаў, стварэння ўмоў развіцця нацыянальнай кінавытворчасці, пракату і паказу фільмаў, прадстаўлення іх на міжнародных фестывалях і конкурсах, удзелу ў сумеснай кінавытворчасці з улікам міжнародных норм і пагадненняў». Акрамя гэтага, значная колькасць палажэнняў згаданага дакумента ўвайшла ў беларускі закон без якіх-небудзь змен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13 ліпеня 2001 г. [483] дазволіў Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» штомесячна эканоміць суму, эквівалентную 4 тыс. дол. ЗША. Распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2001 г. № 164 «Аб вызваленні рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў «Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" і "Беларускі відэацэнтр" ад уплаты падатку на прыбытак» дазволіла кінастудыі за кошт падатку на прыбытак у памеры 30 % адпаведных сум часткова прафінансаваць у 2001 г. вытворчасць поўнаметражнага гульнёвага фільма «Прыкаваны» («Жанчына з сабачкам») рэжысёра В. Рыбарава. У 2002 г. за кошт гэтай ільготы планавалася запусціць кароткаметражную мастацкую стужку «Ліст Філіні» (рэжысёры Д. Зайцаў і А. Туровіч) [439, спр. 584, арк. 15]. Апошні фільм выйшаў на экраны ў 2006 г.

На працягу 2001 г. былі прыняты распараджэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб выдзяленні грашовых сродкаў на стварэнне мастацкага фільма «Анастасія Слуцкая», аб вызваленні «Беларускага відэацэнтра» ад платы мытных пошлін, падатку на дабаўленую вартасць і мытных збораў за мытнае афармленне тэлевізійнага абсталявання, а таксама пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб мінімальных стаўках і парадку выплаты аўтарскага і іншых відаў узнагароджання ў кінематаграфіі і аб міжкарцінным перапынку мастацка-вытворчага персаналу кінастудыі «Беларусьфільм» [439, спр. 584, арк. 15].

Адпаведна пратаколу даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 чэрвеня 2001 г. № 23 Нацыянальная тэлерадыёкампанія па ўзгадненні з Міністэрствам культуры павінна была забяспечыць тэлевізійную трансляцыю ўсёй кінавідэапрадукцыі, якая выраблялася Нацыянальнай кінастудыяй «Беларусьфільм» і «Беларускім відэацэнтрам». Гэта было выканана не ў поўным аб'ёме. Напрыклад, у 2003 г., калі ў рэспубліцы шырока адзначалася гадавіна Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, у эфіры на працягу 9–11 мая не быў паказаны ніводны дакументальны фільм вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм» і «Белвідэацэнтра», пры тым, што ў фондах знаходзілася 94 дакументальных і 11 відэафільмаў па дадзенай тэматыцы [439, спр. 731, арк. 126].

На сустрэчы з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі ў снежні 2003 г. Прэзідэнт даручыў вырашыць пытанне пашырэння паказу беларускіх фільмаў на айчынных тэлеканалах, а таксама паўтарыў патрабаванне аб стварэнні не менш шасці айчынных кінастужак у год і мастацкага фільма да 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне [736].

Па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дадзенага на сустрэчы з прадстаўнікамі кінавідэагаліны ў чэрвені 2001 г. з мэтай аб'яднання творчых намаганняў маладых кінематаграфістаў, была створана «Маладзёжная студыя XXI». Студыя стваралася на ўмовах гаспадарчага разліку, і рэалізацыя ўласных праектаў павінна была здзяйсняцца за кошт пазабюджэтных сродкаў. За першы год існавання студыі быў рэалізаваны толькі адзіны праект – «Фестываль аднаго фільма» ў мінскім кінатэатры «Кастрычнік», які з-за канфліктнай сітуацыі (парушэнне правоў на публічную дэманстрацыю кінастужкі «Манхолланд Драйв») праз некалькі месяцаў пасля пачатку быў прыпынены. Студыя не здолела асвоіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асноўныя віды дзейнасці адпаведна статуту. Да таго ж у спісы «Маладзёжнай студыі XXI» былі ўключаны кінематаграфісты, якія перакрочылі саракагадовы рубеж, больш паловы тых, хто лічыўся ў яе складзе, набліжаліся да гэтага ўзросту і ўжо заявілі аб сабе як прафесіяналы [439, спр. 730, арк. 154–155].

За перыяд са студзеня 2001 па люты 2006 г. кіраўнік дзяржавы даў 59 даручэнняў па пытаннях кінематаграфіі. За гэты ж перыяд праблемы айчыннага кінематографа абмяркоўваліся на сямі пасяджэннях калегіі Міністэрства культуры [72, арк. 115].

Сярод даручэнняў Прэзідэнта былі таксама пытанні змены парадку выплаты і памеру аўтарскага, пастановачнага ўзнагароджання асобам, якія ўдзельнічалі ў стварэнні кінавідэапрадукцыі; павышэння тарыфных разрадаў работнікам кінагаліны; комплекснай мадэрнізацыі Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм»; рэарганізацыі структуры апошняй, упарадкаванне яе вытворча-мастацкага персаналу; распрацоўкі міжведамаснай праграмы падрыхтоўкі кадраў для кінавідэагаліны; змены парадку фінансавання вытворчасці мастацкіх фільмаў з унясеннем у каштарыс выдаткаў на рэкламу; пашырэння практыкі фінансавання вытворчасці кінавідэапрадукцыі і набыцця тэхналагічнага абсталявання за кошт ільготных крэдытаў; пашырэння выкарыстання беларускай фільмапрадукцыі ў навучальным працэсе; будаўніцтва жылога дома для работнікаў кінавідэагаліны і тэлебачання і інш. [439, спр. 1048, арк. 8–12].

З мэтай пошуку новых талентаў у 2003 г. быў заснаваны адкрыты маладзёжны конкурс на стварэнне кінапраектаў, прысвечаных нацыянальнай тэматыцы [439, спр. 730, арк. 149, 154; 573]. Фактычна ён складаўся з двух конкурсаў – на стварэнне літаратурнага сцэнарыя мастацкага фільма і на стварэнне сцэнарыяў дакументальных фільмаў, сацыяльных ролікаў.

Калегіяй Міністэрства культуры ў снежні 2004 г. былі зацверджаны *«Мерапрыемствы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па далейшаму развіццю беларускай кінематаграфіі на 2005–2010 гг.».* Прадугледжвалася стварэнне Каардынацыйнай рады па закупцы кінавідэапрадукцыі (створана 25 сакавіка 2005 г.). На павелічэнне колькасці і павышэнне якасці прадукцыі для кінапракату і беларускіх каналаў было накіравана рашэнне пашырыць практыку фінансавання вытворчасці мастацкіх фільмаў за кошт прадстаўлення льготных крэдытаў і пазык па дзяржаўным сацыяльна-творчым заказе. З мэтай стварэння ўмоў для работы маладых кінематаграфістаў у вытворчасці кінавідэапрадукцыі, а таксама для вядзення новых умоў гаспадарання «Маладзёжнай студыі» планавалася штогод накіроўваць не менш за 30 % бюджэтных сродкаў, якія выдзяляліся Міністэрству культуры для вытворчасці прадукцыі па дзяржаўным сацыяльна-творчаму заказе, на стварэнне фільмаў маладымі кінематаграфістамі. Сярод іншых мерапрыемстваў была работа па пашырэнні выпуску кінавідэапрадукцыі сумеснай вытворчасці, а таксама па заказах беларускіх тэлеканалаў, дзяржаўных устаноў і арганізацый Рэспублікі Беларусь; актывізацыя прасоўвання беларускай фільмапрадукцыі на ўнутраны і міжнародны кінарынак з забеспячэннем павышэння ўдзельнай вагі прыбытку ад рэалізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў фінансаванні вытворчасці прадукцыі; меры па ўмацаванні кадравага складу і зніжэння бягучасці кадраў на кінастудыі «Беларусьфільм» і інш. (усяго 23 пункты) [439, спр. 890, арк. 84–91].

Шэраг мерапрыемстваў быў рэалізаваны ў першыя гады пасля прыняцця дадзенага дакумента. У 2005 г. пачала працу створаная пры Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры лабараторыя эканамічных і прававых пытанняў кіно [72, арк. 122].

За кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту ў 2005 г. былі створаны два поўнаметражныя мастацкія кінафільмы і два серыялы: «Глыбокая плынь» (рэж. М. Касымаў, І. Паўлаў) і «Я памятаю...» (да 20-годдзя аварыі на Чарнобыльскай АЭС, рэж. С. Сычоў), чатырохсерыйны беларуска-расійскі тэлевізійны мастацкі фільм «Пяшчотная зіма» (рэж. І. Волах, Г. Пармас) і чатырохсерыйны фільм «Тры талеры» (рэж. І. Чацверыкоў).

Пашырылася практыка фінансавання вытворчасці мастацкіх фільмаў за кошт прадстаўлення льготных крэдытаў і пазык па дзяржаўным сацыяльна-творчым заказе. У 2006 г. асобнай пастановай Савета Міністраў кінастудыі «Беларусьфільм» была выдзелена бюджэтная пазыка на стварэнне дзіцячага поўнаметражнага мастацкага фільма «Навагоднія прыгоды ў ліпені». Па сацыяльна-творчым заказе ў 2006 г. былі створаны тры мастацкія фільмы («Я памятаю...», «Нябачаны край», «Спакуса»). У гэтым жа годзе былі выпушчаны 13 хранікальна-дакументальных фільмаў, 1 мастацка-публіцыстычны, 8 сацыяльных ролікаў, 7 анімацыйных, 1 відэаальманах. Вытворча-творчым рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Беларускі відэацэнтр» у 2006 г. па дзяржаўным сацыяльна-творчым заказе было створана 27 відэафільмаў, 4 сацыяльныя відэаролікі і 36 летапісных матэрыялаў [111, с. 116, 119].

У тым жа годзе быў зменены парадак фінансавання вытворчасці мастацкіх фільмаў з унясеннем у каштарыс выдаткаў на інфармацыйна-рэкламную падтрымку кінавідэапраектаў, якія ствараюцца па дзяржаўным сацыяльна-творчым заказе.

У новай галіновай праграме, прынятай ў 2006 г., былі ўдакладнены папярэднія і пастаўлены новыя мэты і задачы [168, с. 47–48].

У прыведзенай ніжэй табл. 4 мы параўноўваем асноўныя задачы, над вырашэннем якіх працавала кінагаліна ў 2001–2005 і 2006–2010 гг. [112, с. 80–81; 110, с. 103]. З яе відаць, якія змены адбыліся ў асобных ключавых напрамках дзейнасці.

У краіне была распрацавана Міжведамасная праграма падрыхтоўкі кадраў для кінавідэагаліны на 2006–2015 гг. У 2007 г. Міністэрства культуры распрацавала план-графік стажыроўкі маладых кінематаграфістаў на базе кінастудыі падчас здымкаў беларуска-расійскіх фільмаў [112, с. 79].

У пачатку 2007 г. Міністэрствам культуры было праведзена вывучэнне стану спраў на Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Побач са станоўчай дынамікай у пытаннях вытворчай дысцыпліны, прыкметным паляпшэннем мікраклімату ў працоўным калектыве кінастудыі адзначаўся шэраг недахопаў. Праверка выявіла шэраг пралікаў у працы цэнтралізаванай бухгал-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрыі кінастудыі. Па выніках 2006 г. прадпрыемства адпрацавала з вялікімі стратамі, не было выканана даручэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб штогадовай вытворчасці 6 поўнаметражных гульнявых фільмаў: з 10 поўнаметражных мастацкіх гульнявых стужак, якія знаходзіліся ў вытворчасці ў 2006 г., былі прыняты толькі тры («Я памятаю...», «Нябачаны край», «Спакуса»). У сувязі з тым, што стужка «Я памятаю...» з’яўлялася заліковай адзінкай 2005 г., з планавых фільмаў 2006 г. былі выраблены толькі дзве адзінкі [76, т. 1, арк. 198–199, 213].

*Табліца 4.* **Параўнанне асноўных задач кінагаліны ў 2001–2010 гг.**

<table>
<tr><th>2001–2005 гг.</th><th colspan="2">2006–2010 гг.</th></tr>
<tr><td>Павелічэнне выпуску сумесных беларуска-расійскіх мастацкіх, дакументальных і мультыплікацыйных фільмаў</td><td colspan="2">Актывізацыя работы па рэалізацыі сумесных кінапраектаў і прыцягненне дадатковых інвестыцый у кінавытворчасць; прыцягненне расійскіх кінематаграфістаў для рэалізацыі беларускіх і сумесных кінапраектаў (рэжысёраў, кампазітараў, аператараў, мастакоў)</td></tr>
<tr><td>Развіццё тэхнічнай і тэхналагічнай базы фільмавытворчых прадпрыемстваў</td><td colspan="2">Паэтапная рэалізацыя інвестыцыйнага праекта комплекснай мадэрнізацыі матэрыяльна-тэхнічнай базы кінастудыі з выкарыстаннем найноўшых тэхнічных і тэхналагічных дасягненняў; тэхнічнае пераабсталяванне Белвідэацэнтра і рэканструкцыя будынка прадпрыемства</td></tr>
<tr><td>Развіццё заканадаўчай і нарматыўнай базы кінавідэагаліны</td><td colspan="2">Далейшае ўдасканаленне нарматыўнай прававой базы кінематаграфіі</td></tr>
<tr><td>Падрыхтоўка кадраў маладых творчых работнікаў</td><td colspan="2">Сістэмная падрыхтоўка і перападрыхтоўка творчых і тэхнічных кадраў для фільмавытворчасці ў беларускіх і расійскіх ВНУ кінематаграфіі. Арганізацыя стажыровак маладых кінематаграфістаў</td></tr>
<tr><td>Асваенне:<br>выпуску тэлесерыялаў<br>выпуску прадукцыі на відэаносьбітах</td><td rowspan="5">Новыя мэты</td><td>шырокае прыцягненне кансультантаў па спецыфічных пытаннях рэалізацыі інвестыцый</td></tr>
<tr><td>Стварэнне ўмоў па ўкараненні гукавых стандартаў «Dolby Stereo» ў кінатэатрах і відэапаказу ў стандартным і перасоўным варыянтах</td><td>паляпшэнне інфармацыйна-рэкламнай работы на ўсіх этапах вытворчасці фільма</td></tr>
<tr><td>Павелічэнне долі паказу нацыянальнай кінавідэапрадукцыі на беларускіх тэлевізійных каналах</td><td rowspan="3">актывізацыя пошуку сцэнарнага матэрыялу шляхам правядзення тэматычных конкурсаў, мэтавай перапрацоўкі (напісанне пад заказ) літаратурных твораў, закупкі аўтарскіх правоў у расійскіх аўтараў</td></tr>
<tr><td>Пашырэнне паказу айчыннай кінавідэапрадукцыі ў рамках фестываляў і дзён кіно за мяжой</td></tr>
<tr><td>Павышэнне ўзроўню кінематаграфічных мерапрыемстваў, што праводзяцца ў рэспубліцы</td></tr>
</table>

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

На кінастудыі меліся пралікі ў арганізацыі фільмавытворчасці – з-за несвоечасовай падрыхтоўкі кінапраектаў (пакет дакументаў – літаратурны сцэнарый, каштарыс, дамова, каляндарна-пастановачны план), падраздзяленні і персанал кінастудыі былі загружаны нераўнамерна, а ў канцы года работа вялася ў аўральным рэжыме, што не садзейнічала яе якасці. Праверка адзначыла той факт, што нераўнамернасць загрузкі вытворчых магутнасцей кінастудыі адмоўна ўплывала на эфектыўнасць выкарыстання персаналу, у прыватнасці, значная колькасць работнікаў перыядычна знаходзілася ў прастоі. Напрыклад, у 2006 г. у прымусовым прастоі знаходзіліся 55 спецыялістаў студыі гульнявых фільмаў, па студыі «Летапіс» – з агульнай колькасці 34 работніка ў розныя перыяды вымушаны простой аплочваўся 33; па студыі мультыплікацыйных фільмаў – 10 з 13 работнікаў [76, т. 1, арк. 213–214].

У 2007 г. пачалася рэканструкцыя кінастудыі «Беларусьфільм». Планавалася, што да 1 верасня 2009 г. на ёй будзе праведзены капітальны рамонт, на 50 % адновяцца памяшканні, з'явяцца два новыя павільёны, гасцініца, рэстаран, кавярня, сталовая. Акрамя рэканструкцыі за кошт інвестараў планавалася пабудаваць 10 тыс. квадратных метраў жылля для супрацоўнікаў кінастудыі. Кінастудыю чакала глыбокая мадэрнізацыя тэхналагічнага працэсу вытворчасці фільмаў [792]. На жаль, эканамічны крызіс 2009 г. не дазволіў рэалізаваць задуманае[1].

12 верасня 2008 г. Прэзідэнт краіны наведаў новы шматзальны кінатэатр «Беларусь» у Мінску. У сваім выступленні ён закрануў праблемныя бакі галіны. Была звернута ўвага на вельмі нізкі працэнт фільмаў беларускай вытворчасці, якія дэманструюцца. У кінатэатрах краіны ў 2008 г. паказвалі 36 % фільмаў вытворчасці ЗША, 30 расійскіх, 24 еўрапейскіх і толькі 5 % вытворчасці кінастудыі «Беларусьфільм». А. Лукашэнка выказаў незадаволенасць развіццём беларускага кінематографа: «15 гадоў назад мною былі пастаўлены задачы па развіццю кінематаграфіі. Час прайшоў, а дзе вынікі?» Дзяржава працягвала па-ранейшаму ўкладваць у галіну немалыя сродкі, не атрымоўваючы пры гэтым адэкватнай аддачы. Прэзідэнт даручыў з 2009 г. вывесці кінагаліну Беларусі на самаакупнасць. Гаворка ішла аб неабходнасці пераходу на новыя формы працы, калі рэжысёр зацікаўлены ў прасоўванні свайго прадукту на кінарынку. Былі адзначаны праблемы з кадрамі. Сярэдні ўзрост рэжысёраў складаў 60 гадоў. На думку Кіраўніка дзяржавы, да вытворчасці кінапрадукцыі неабходна прыцягваць маладых перспектыўных спецыялістаў.

Генеральны дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» У. Замяталін адзначыў, што ў апошнія гады адбываўся працэс змены пакаленняў. Асноўныя надзеі ў гэты перыяд ўскладаліся на рэжысёраў, якія скончылі студыі Турава і Пташука. Адной з праблем кінастудыі было стварэнне поўнага цыклу кінавытворчасці. На момант сустрэчы на кінастудыі немагчыма было забяспечыць поўны цыкл кінавытворчасці. З гэтай мэтай даводзілася пастаянна звяртацца ў Маскву, траціць немалыя сродкі [61].

[1] У пачатку 2013 г. тэрмін рэканструкцыі кінастудыі быў падоўжаны да 2015 г. гл., [499].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На прэс-канферэнцыі 17 верасня 2008 г. кіраўнік кінастудыі распавёў пра іншыя праблемы. Асноўнай з якіх з'яўлялася падатковая. Паводле яго слоў, на падаткаабкладанне кінастудыі распаўсюджваліся правілы, прынятыя для вытворчых прадпрыемстваў. Пасля выплаты 18 % падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ) кінастудыя плаціла з сумы, якая заставалася, 25 % іншых падаткаў, у ліку якіх падатак на прыбытак, падатак на нерухомасць, якая існуе на тэрыторыі кінастудыі, і нават 2 % сельгаспадатку. Пры гэтым, у Расіі кінавытворчасць абкладалася толькі 18 % ПДВ. «Гэта і называецца дзяржаўная падтрымка кінематографа», – заўважаў У. Замяталін.

Ён таксама выказаў незадаволенасць існаваўшымі планавымі паказчыкамі, якія кінастудыя павінна была выконваць нароўні з заводамі і іншымі прадпрыемствамі. У іх ліку – планы па эканоміі электраэнергіі, якія, на думку гендырэктара, для «Беларусьфільма» павінны быць адаптаваныя. «Кінастудыя не можа ў цемры здымаць кіно», – падкрэсліў ён.

«Да кінастудыі павінен быць трапяткі і клапатлівы падыход», – падтрымаў пазіцыю У. Замяталіна дырэктар дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры М. Буданаў.

У. Замяталін таксама агучыў праблему страты аўтарскіх правоў на прыблізна 5 тыс. фільмаў кінастудыі, якія пасля распаду СССР засталіся ў архівах Расіі: «Беларусь мае права прапанаваць Расіі вярнуць назад тое, што ёй не належыць» [854].

Акрамя таго, па словах У. Замяталіна, для «Беларусьфільма» на той час была характэрна праблема недахопу кадраў. Па-першае, у краіне бракавала кваліфікаваных выкладчыкаў для падрыхтоўкі моладзі. «Сярод выкладчыцкага складу – у асноўным былыя камсамольскія, партыйныя работнікі, журналісты, якія навучаюць прафесійных рэжысёраў і акцёраў», – заявіў ён. Па-другое, на думку гендырэктара кінастудыі, у Беларусі адсутнічала методыка пошуку і адбору талентаў, нацыянальная школа. Акрамя таго, існавала праблема ўцечкі кадраў за мяжу, у Расію, дзе магчымасці і зарплаты большыя.

Аналіз ***колькасных паказчыкаў*** кінавытворчасці ў вывучаемы перыяд не дазваляе гаварыць аб заўважных станоўчых зменах. У 1992 г. на кінастудыі «Беларусьфільм» было выпушчана 30 стужак (гульнявых, дакументальных, анімацыйных), у 1993 г. гэты паказчык склаў 26, у 1994 г. – 28, 1995 – 24, 1996 – 24, 1997 – 22, 1998 – 32, 1999 – 18, 2000 – 20, 2001 – 19, 2002 – 14, 2003 г. – 14 [179, с. 131]. У 2004 г. былі зняты 13 (без уліку дакументальных), у 2005 г. – 19, 2006 г. – 22 (з іх 2 стужкі – «Формула кахання» і «Маёр Ветраў» – выйшлі ў пракат у 2007 г. і ўвайшлі ў афіцыйную справаздачу за 2007 г.), у 2007 г. – 22 (5 мастацкіх (без уліку дзвюх агавораных раней), 5 мультыплікацыйных і 12 дакументальных кінастужак) [264].

На працягу 2008–2010 гг. кінастудыя «Беларусьфільм» і «Беларускі відэацэнтр» стабільна павялічвалі выпуск фільмапрадукцыі. За 2010 г. былі створаны 12 поўнаметражных мастацкіх, 74 дакументальныя і 7 анімацыйных фільмаў [104, с. 78].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У лістападзе 2010 г. на экраны кінатэатраў рэспублікі выйшаў сумесны беларуска-расійскі мастацкі фільм «Брэсцкая крэпасць», які ўпершыню быў створаны за кошт сродкаў Саюзнай дзяржавы.

Пры гэтым назіраліся выпадкі выпуску фільмаў нізкай якасці. У 1994 г. былі праведзены работы па падрыхтоўцы і запуску двух мастацкіх фільмаў: «На Чорных лядах» па сцэнарыі В. Быкава і В. Панамарова і «Птушкі без гнёздаў» па сцэнарыі Я. Грыгор'ева. Абодва фільмы ў творчых адносінах аказаліся няўдалымі, неаднаразова выпраўляліся, у тым ліку пры ўдзеле народнага артыста СССР В. Турава, пасля рэдакцыі ў апошнім варыянце былі значна скарочаны. У выніку ні адна з копій фільма на пачатак 1997 г. не была прададзена. Міністэрства культуры ў 1997 г. адзначала нізкую акупнасць усіх беларускіх фільмаў. Толькі ў 1995 г. на кінастудыі «Беларусьфільм» пачаў дзейнічаць рэкламна-камерцыйны аддзел. Вядома, што работа па рэалізацыі фільмаў патрабуе доўгага часу. Па нарматывах былога Дзяржкіно СССР тэрмін акупнасці фільма вызначаўся ў 3–5 гадоў. Пры гэтым неабходна памятаць аб добра адладжанай у той час сістэме Усесаюзнага кінапракату. У новых умовах нельга было гаварыць аб акупнасці беларускіх фільмаў і звароце затрачаных бюджэтных сродкаў. Вяртанне дзяржбюджэтных сродкаў у 1995 г. склала 3,1 %, у 1996 г. – 4,1, за дзесяць месяцаў 1997 г. – 12,1 % [439, спр. 163, арк. 110].

Наколькі прадукцыя беларускіх кінематаграфістаў карысталася попытам, сведчыць наступны факт. У чэрвені 2003 г. на 55-м Міждзяржаўным кінарынку ў г. Сочы мастацкая стужка, створаная ў адпаведнасці з даручэннем Кіраўніка дзяржавы з вялікім фінансаваннем, «Анастасія Слуцкая» была паказаны двойчы. У выніку было заключана 6 дамоў з пракатнымі арганізацыямі Омска, Валгаграда, Пермі, Сочы, Чыты, Ханты-Мансійску. Сума здзелкі склала каля 11,5 тыс. дол. ЗША. Для параўнання. Ад прэм'ернага паказу ў 2003 г. новага мастацкага фільма «Паміж жыццём і смерцю» на канале ОРТ (Грамадскае расійскае тэлебачанне) было атрымана 14 тыс. дол. ЗША. Значна большым попытам карыстаўся альманах дакументальных фільмаў сацыяльнай тэматыкі беларускай вытворчасці «Права на надзею». Было заключана дамоў на 63 (!) кінакопіі на агульную суму каля 17 тыс. дол. ЗША. У сярэднім прыбытак ад адной часткі склаў звыш 500 дол. ЗША [439, спр. 748, арк. 202–203].

Аналіз эфектыўнасці выкарыстання фільмаў, выпушчаных кінастудыяй за перыяд з 2002 па 2006 г., паказаў, што асноўная іх частка рэалізавалася на ўнутраным рынку Рэспублікі Беларусь, г. зн. кінапракатным арганізацыям у абмежаванай колькасці. Прыкладам можа служыць тое, што на тэрыторыі краіны было прададзена чатыры копіі стужкі «Павадыр» (вытворчасць 2002 г.), тры копіі стужкі «Дунечка» (2004), сем копій «Глыбокай плыні» (вытворчасць 2005 г., прададзена толькі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь), адна копія стужкі «Яшчэ аб вайне» (2005), шэсць копій «Спакусы» (2006), ніводнай копіі стужкі «Экстаз на маніторы» (2004). За перыяд 2002–2006 гг. у Расійскай Федэрацыі было рэалізавана фільмаў выпуску мінулых гадоў: 53 – мастацкіх, 19 – мультыплікацыйных, 331 – дакументальны на агульную суму 5,74 млн



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

расійскіх рублёў і 13,72 тыс. дол. ЗША. Найбольшым попытам у Расійскай Федэрацыі карысталіся фільмы «Зорка Венера» (2000), «Бальная сукня» (2003), «Вам заданне» (2004), «Маленькія ўцекачы» (2005). Асобы попыт у Расійскай Федэрацыі атрымала тэматыка дакументальных фільмаў вострай сацыяльнай накіраванасці (праблемы наркаманіі, алкагалізму, моладзевай тэматыкі). На постсавецкай прасторы кінастудыя з'яўлялася адзіным вытворцам, мэтанакіравана працуючым у гэтым жанры [76, т. 1, арк. 217].

У 2002 г. 18 дакументальных фільмаў «Белвідэацэнтра» былі паказаны на расійскім канале «Культура». Адзін з іх – «Спадарожнікі Сатурна» (рэж. С. Агеенка, аўтар сцэнарыя С. Трахімёнак) – увайшоў у дзясятку найбольш рэйтынгавых тэлевізійных выпускаў канала па выніках года. Камерцыйны поспех у параўнанні з гэтым быў нязначны – у межах 300 дол. ЗША за адзін фільм, што складала прыблізна 5 % ад кошту вытворчасці відэафільма хронаметражом 26 хвілін.

Што датычылася супрацоўніцтва з беларускімі каналамі, то колькасць паказаў у першым квартале 2003 г. (34) была значна большай, чым у 2002 г., а па расцэнках значна меншай (19 дол. ЗША на Сталічным тэлебачанні, 50 дол. ЗША на Беларускім тэлебачанні і Агульнанацыянальным тэлебачанні за 26-хвілінны фільм), чым пры паказе па расійскім каналам. У суме ўсе 34 паказы былі эквівалентныя двум паказам на расійскім канале «Культура» [439, спр. 748, арк. 203].

У цэлым за 2007–2009 гг. было вернута 6,2 % сродкаў, якія былі ўкладзены ў вытворчасць усіх відаў фільмапрадукцыі (выдаткі склалі 56,87 млрд рублёў, даходы – 3,39 млрд рублёў). З выпушчаных у гэты перыд мастацкіх кінаі тэлефільмаў поўнасцю акупілі сябе і прынеслі прыбытак толькі два тэлесерыялы сумеснай вытворчасці – «Маёр Ветраў» (121,6 %), і «У чэрвені 41-га» (152,5 %). На 20–30 % былі вернуты затраты на вытворчасць яшчэ чатырох мастацкіх фільмаў. Акупнасць астатніх заставалася на ўзроўні ад 0,4 («Зграя») да 14 % («Радзіма ці смерць»). Чатыры фільмы ўвогуле не прынеслі ні рубля прыбытку [81, т. 12, арк. 115].

Заставаліся нізкімі (ад 2,3 да 0,1 %) паказчыкі звароту сродкаў, укладзеных у вытворчасць анімацыйных і дакументальных фільмаў. Частка дакументальных фільмаў увогуле заставалася незапатрабаванай. Напрыклад, за два гады продажаў было вернута 6,9 % сродкаў (для мастацкіх фільмаў – 8,5 %, для анімацыйных – 1,4, для дакуметальных – 1,6 %). Не быў атрыманы прыбытак ад 11 з 34 дакументальных фільмаў [81, т. 12, арк. 115].

Не назіралася высокай акупнасці фільмаў вытворчасці прадпрыемства «Беларускі відэацэнтр». На пачатак 2010 г. зварот сродкаў, укладзеных у вытворчасць фільмаў выпуску 2007 г., склаў 4,4 %, 2008 г. – 5,9, 2009 г. – 4,8 % [81, т. 12, арк. 116].

Як адзначаў у 2011 г. намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці і планаванні Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» І. Колб, «у нашай краіне акупнасць любога кінапраекта практычна не залежыць ад якасці фільма. Нават калі наша карціна пераможа ва ўсіх намінацыях прэміі "Оскар",



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

за першыя паўтара гады пасля выхаду фільма ў пракат максімальны даход кінастудыі не перавысіць 50 000 дол. ЗША» [202]. Даходнасць на тэрыторыі Беларусі ў той час складала 4–7 % ад кошту вытворчасці, бо цэны ў кінапракаце і на тэлебачанні былі вельмі нізкімі. Каб фільм акупаўся, на думку спецыяліста, неабходна было перадусім арыентавацца на замежны рынак. У прыватнасці, на Расію. Адна хвіліна паказу стужкі на расійскім Першым канале была ў тысячу разоў даражэй, чым на любым з беларускіх тэлеканалаў. Дзякуючы паказам на цэнтральных расійскіх каналах карціна «У чэрвені 41-га» акупілася на 189 %, а кінастужкі «Снайпер» і «Пакушэнне» – на 140 % [202].

Замест стварэння спрыяльных эканамічна-прававых умоў для вытворчасці, дэбюракратызацыі працэсу Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «лічыла магчымым даручыць Міністэрству культуры» ў 2010 г. здзейсніць зварот не менш за 30 % сродкаў, укладзеных у вытворчасць мастацкіх кінафільмаў і тэлефільмаў вытворчасці 2007–2009 гг., забяспечыўшы пры гэтым поўны зварот укладзеных сродкаў і атрыманне прыбытку ад сумесных камерцыйных кінапраектаў. Бачылася неабходнасць актывізацыі работы па рэалізацыі анімацыйных і хроніка-дакументальных фільмаў 2007–2009 гг. выпуску, прыняцце мер па аптымізацыі вытворчасці хроніка-дакументальных кінафільмаў з мэтай прадухілення выпуску незапатрабаваных кінастужак [81, т. 12, арк. 116].

Нацыянальная кінастудыя «Беларусьфільм» распрацавала план мерапрыемстваў па забеспячэнні паэтапнага выхаду на акупнасць фільмапрадукцыі. Для павышэння гэтага паказчыку неабходна было выпрацаваць больш выразную маркетынгавую стратэгію па распаўсюджванні айчынных фільмаў на замежныя рынкі, укараненні ў працэс фільмавытворчасці сучасных метадаў інфармацыйна-рэкламнай работы і тэхналагічнага абсталявання, аптымізацыі выдаткоўвання сродкаў рэспубліканскага бюджэту і выкарыстанні для вытворчасці кінавідэапрадукцыі ўсіх рэсурсаў, у першую чаргу інвестыцый і пазабюджэтных крыніц.

Міністэрства культуры адзначала неабходнасць у неадкладнай распрацоўцы пратэкцыянісцкіх мер па развіцці фільмавытворчых арганізацый шляхам спрыяльнага механізму падаткаабкладання і прадстаўлення крэдытаў з нізкай працэнтнай стаўкай для стварэння кінавідэапрадукцыі [81, т. 2, арк. 98].

У справаздачы міністра культуры Рэспублікі Беларусь П. Латушкі на імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па выніках выканання даручэння па акупнасці фільмаў канстатавалася недасягненне ў 2010 г. паказчыка ў 30 %. Галоўнай прычынай называлася адсутнасць эканамічнай зацікаўленасці і эканамічнай адказнасці кінастудыі за рэалізацыю створанай кінапрадукцыі. Акрамя гэтага, на працэнт звароту затрачаных сродкаў уплывалі наступныя абставіны:

адсутнасць у краіне сістэмы кінапрадзюсіравання;

недастатковы аб’ём сумеснай з замежнымі партнёрамі фільмавытворчасці, што дазваляе пашыраць рынкі збыту прадукцыі і паляпшае яе якасць і канкурэнтаздольнасць;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практычны няўдзел айчынных тэлеканалаў у сумеснай з кінастудыяй вытворчасці фільмаў;

абмежаваная магчымасць звароту затрачаных сродкаў праз айчынны кінапракат. Так, за 2010 г. на вытворчасць фільмаў з дзяржаўнага бюджэту было выдзелена 23,8 млрд рублёў. У кінавідэасетцы платныя паслугі ад кінапаказу за 9 месяцаў 2010 г. склалі 33,5 млрд рублёў. З гэтай лічбы касавы збор ад паказу беларускіх фільмаў склаў толькі 0,7 млрд рублёў, што склала каля 3 % ад затрат [82, т. 1, арк. 1–3].

У красавіку 2009 г. намеснікам прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь была зацверджана Канцэпцыя развіцця кінематаграфіі Рэспублікі Беларусь на 2009–2014 гг. [81, т. 7, арк. 19–34]. Яна ўтрымлівала шэраг мерапрыемстваў па наступных напрамках:

удасканаленне нарматыўнай прававой базы кінематаграфіі. Прадугледжвалася ўнясенне змен і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб кінематаграфіі», прыняцце новых палажэнняў аб нацыянальным фільме і фільме, якi выпускаецца па дзяржаўным заказе, аб правядзенні рэспубліканскіх конкурсаў на стварэнне такіх фільмаў пры дзяржаўнай падтрымцы. Была запланавана распрацоўка сістэмы мер па забеспячэнні дзяржаўнага контролю за выплатай аўтарскага ўзнагароджання стваральнікам кінавідэапрадукцыі, а таксама перагляд у бок павышэння мінімальных ставак аўтарскага і іншых відаў узнагароджання ў кінематаграфіі. Прадугледжвалася вырашыць пытанні аплаты працы штатных супрацоўнікаў кінавытворчых арганізацый, якія выконваюць работы (аказваюць паслугі) па грамадзянска-прававым дамовам з гэтымі арганізацыямі. Ставілася задача прывесці дзейнічаючыя прававыя акты, якія датычылі пытанняў функцыянавання кінавідэапракатных арганізацый і аплаты працы іх работнікаў, у адпаведнасць з новымі ўмовамі іх дзейнасці. Лічылася неабходным прыняць меры па ўдасканаленні механізму цэнаўтварэння ў кінавідэапракаце;

стратэгія развіцця кінавідэавытворчасці. Прадугледжваўся перавод планавання ў гэтай сферы з вытворчага прынцыпу на прафесійна-творчы, распрацоўка і зацверджанне тыповай сістэмы паказчыкаў планавання для кінематографа. Ставілася мэтай, пачынаючы з 2009 г., прыняць меры па забеспячэнні акупнасці вытворчасці беларускіх поўнаметражных мастацкіх, дакументальных і анімацыйных фільмаў кінастудыі і відэафільмаў відэацэнтра. Далейшае развіццё кінастудыі «Беларусьфільм» бачылася ў напрамку ўніверсальнай кінавытворчай арганізацыі, якая здзяйсняе ўласную вытворчасць і аказвае паслугі беларускім і замежным кінавытворцам. Утрымлівалася прапанова аб абавязковым штогадовым адлічэнні 5 % ад атрыманага прыбытку кінастудыі ў рэспубліканскі бюджэт. Планавалася арганізацыя пры «Беларусьфільме» вытворчасці ліцэнзаваных DVD-дыскаў. Пасля завяршэння рэканструкцыі кінастудыя павінна была паэтапна перайсці на самаакупнасць, а таксама павінен быў змяніцца падыход да фінансавання кінавідэавытворчасці шляхам конкурснага размеркавання фінансавых сродкаў на ўмовах заказу для дзяржаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных патрэб у аб’ёме не больш за 70 % каштарыснага кошту. Неабходным бачылася пасля завяршэння рэканструкцыі кінастудыі прыняцце мер па прыцягненні пазыкаў і пазабюджэтных сродкаў для вытворчасці кінапрадукцыі ў памеры не менш за 50 % ад аб’ёму бюджэтных сродкаў. Прадугледжвалася распрацоўка пратэкцыяніскіх мер па развіцці кінавытворчых арганізацый розных форм уласнасці, у тым ліку шляхам стварэння спрыяльнага механізму падаткаабкладання і прадстаўлення пазык з нізкай працэнтнай стаўкай для стварэння кінавідэапрадукцыі, зыходзячы з вопыту развіцця кінематаграфіі ў замежных краінах [82, т. 1, арк. 1–7];

стратэгія развіцця кінавідэапракату і кінавідэапаказу[1];

падрыхтоўка кадраў для кінематаграфічнай галіны[2];

мадэрнізацыя матэрыяльнай базы кінавідэавытворчых і кінавідэапракатных арганізацый[3];

фестывальны рух.

За першыя два гады рэалізацыі канцэпцыі быў падрыхтаваны праект змен у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб кінематаграфіі». Аднак ён быў адхілены па выніках сустрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з дзеячамі культуры па пытаннях развіцця кінематаграфіі ў кастрычніку 2010 г. і вернуты на дапрацоўку. У дапрацаваным і накіраваным у Парламент 31 снежня 2010 г. законапраекце былі ўключаны нормы аб вытворчасці фільмаў па дзяржаўным сацыяльна-творчым заказе і аб нацыянальным фільме, прадугледжаны патрабаванні, якія прад’яўляюцца да вытворчасці фільмаў па дзяржаўным сацыяльна-творчым заказе, дэталёва ўрэгуляваны ўмовы вытворчасці нацыянальных фільмаў [82, т. 1, арк. 3].

Істотнай праблемай для кінавытворчасці была залішняя бюракратызацыя гэтага працэсу. Пытанне ўзнімалася на сустрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з дзеячамі культуры па пытаннях развіцця кінематаграфіі ў кастрычніку 2010 г. Сістэма ўліку, справаздачнасці і фінансавання была беспрэцэдэнтнай па колькасці існуючых абмежаванняў і нормаў. Працэс стварэння фільма прыраўноўваўся да завадскога кантэйнера з абавязковым для яго жорсткім нарміраваннем у мэтах выканання тэхналогіі вытворчасці [82, т. 1, арк. 111]. Так, рэжысёр А. Кудзіненка ў 2010 г. адзначаў: «На “Беларусьфільме” многія рэчы дыктуе планавы аддзел. На кожнае рашэнне трэба сабраць па 12 подпісаў. Гэта пекла! Даводзіцца траціць уласныя нервы, сродкі, час» [92, с. 10].

Крыніцамі празмернай забюракратызаванасці працэсу фільмавытворчасці былі палажэнні дзейнічаючага на той час заканадаўства (працоўнага, падатковага, фінансавага), якія не ўлічвалі спецыфікі працэсу вытворчасці фільмаў, яго шматфункцыянальнасці, унікальнасці выпусканай прадукцыі, нежаданне дзяржаўных органаў кіравання (на ўзроўні міністэрстваў) унікаць у сутнасць

[1] Аналіз праведзены ў раздзеле 5.5.3 «Кінавідэапракат».

[2] Прыклады рэалізацыі прыведзены ў раздзеле 4.3 «Адукацыя ў сферы культуры».

[3] Аналіз праведзены ў раздзеле 5.5.3 «Кінавідэапракат».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праблем кінематаграфіі, адсутнасць ведаў спецыфікі кінавытворчасці [82, т. 1, арк. 112].

Напрыклад, Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь накладваў абмежаванні на працягласць працоўнага дня для ўдзельнікаў кінавытворчасці. Каляндарна-пастановачны план вытворчасці фільма фарміраваўся, зыходзячы з нармаванай загрузкі працоўных рэсурсаў. Так, зверхурочныя работы не павінны былі перавышаць 4 гадзін на працягу двух дзён і 120 гадзін у год. Гранічная колькасць працоўных дзён, якія маглі выкарыстоўвацца для прыцягнення работнікаў да працы, раўнялася 12 выхадным дням у год.

Вынікам дзеяння такога абмежавання на кінастудыі «Беларусьфільм» быў адток падрыхтаваных кінастудыяй кадраў на кінакампаніі недзяржаўнай формы ўласнасці, дзе яны працавалі па 10–12 гадзін па грамадзянска-прававых дамовах, атрымліваючы больш высокі заробак за больш працяглы працоўны дзень. Унясенне змен у Працоўны кодэкс магло даволіць не толькі захаваць кадры, але і істотна скараціць тэрміны вытворчасці [82, т. 1, арк. 112].

Адной з праў бюракратызму ў сферы фільмавытворчасці з'яўлялася ігнараванне меркавання кінастудыі пры складанні плану бюджэтнага фінансавання па сацыяльна-творчым заказе з боку Міністэрства фінансаў. Бюджэтныя сродкі накіроўваліся з разбіўкай па кварталам без уліку рэальных патрэбнасцей кінастудыі. Такім чынам, план гадавога фінансавання стаў вызначальным фактарам фарміравання плану запуску–выпуску фільмапрадукцыі. Гэта пазбаўляла кінастудыю гнуткасці як у рашэнні пытанняў рацыянальнай загрузкі вытворчых магутнасцей, так і ў прыцягненні да супрацоўніцтва замежных партнёраў [82, т. 1, арк. 112].

З мэтай вырашэння акрэсленных праблем Міністэрства культуры на пасяджанні міжведамаснай рабочай групы ў снежні 2010 г. разгледзела План прапаноў па дэбюракратызацыі працэсу фільмавытворчасці [82, т. 1, арк. 108–109].

### *5.5.3. Кінавідэапракат*

У пачатку 1990-х гг. кінапракат апынуўся ў крызісе, які быў звязаны са скарачэннем аб'ёмаў дзяржзаказу, адсутнасцю прафесійнай маркетынгавай службы, ліквідацыяй цэнтралізаванай сістэмы і стварэннем самастойных кінавідэааб'яднанняў (шасці абласных і мінскага гарадскога). Дзейнасць апошніх не падлягала адзінай пракатнай палітыцы. Імкненне да прыбытку прывяло да рэпертуарнага дысбалансу на карысць амерыканскай забаўляльнай кінапрадукцыі і зніккненню з экранаў фільмаў беларускай вытворчасці. У выніку атрымання кінавідэапракатнымі арганізацыямі і кінавідэавідовішчнымі ўстановамі правоў звычайных прадпрыемстваў без уліку культурнай накіраванасці іх дзейнасці галіна кінавідэапракату ўсё больш камерцыялізавалася. Зусім няпростай была справа з кінатэатрамі, калектывы якіх выйшлі са складу вытворчых аб'яднанняў і перайшлі на арэндныя адносіны. Прававым падмуркам пераходу на арэнду сталі Законы Рэспублікі Беларусь «Аб арэндзе» і «Аб прадпры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

емствах». Аднак гэтыя законы не прадугледжвалі магчымасці ўмяшання ва ўнутраную дзейнасць з боку арэндадацеля. Добрая на першы погляд норма выключала магчымасць рэгулявання рэпертуару. У выніку арэндныя кінатэатры працавалі амаль цалкам на замежных стужках. Выказвалася прапанова прадугледзець у праекце Закона аб экраннай культуры забарону арэнды дзяржаўнай кінавідэасеткі для ажыццяўлення дзяржаўнага ўплыву на рэпертуар [439, спр. 3, арк. 2, 8].

Відавочным стаў працэс змены профілю кінатэатраў, адток з кінасеткі кваліфікаваных спецыялістаў у камерцыйныя структуры, што выклікала штучную канкурэнцыю паміж пракатнымі арганізацыямі, узнікненне стыхійнага ўнутранага рынку кінавідэапрадукцыі і канцэнтрацыі яго ў буйных гарадах рэспублікі.

У пачатку 1990-х гг. назіралася зніжэнне эканамічнай эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўнага сектара. Пры росце сум дзярждатацый на падтрымку сістэмы кінавідэапракату і павелічэння кошту паслуг адбывалася інтэнсіўнае скарачэнне ахопу насельніцтва гэтымі паслугамі. Калі ў 1990 г. кінаўстановак налічвалася 6916, то ў 1993 г. – 4168, што на 40 % менш (гл. табл. 5). Скарачэнне ў асноўным адбывалася за кошт кінакропак у сельскай мясцовасці і гарадскіх сярэдніх школах. Цалкам зніклі перасовачныя кінаўстаноўкі. Побач з гэтым у краіне адсутнічалі функцыянальныя механізмы кіравання кінавідэапракатнай сеткай, знікалі арганізацыйныя формы работы з аўдыторыяй. Асаблівы непакой выклікаў дзіцячы і юнацкі кінарэпертуар. З 198 стацыянарных кінатэатраў у рэспубліцы 5 былі спецыялізаванымі дзіцячымі. У 1993 г. захаваўся адзін – «Піянер» у Мінску [439, спр. 10, арк. 145; спр. 3, арк. 2].

Адбыўся значны спад колькасці наведванняў гледачамі кінавідэазалаў. Толькі ў першай палове 1993 г. было страчана 18 млн 584 тыс. кінанаведвальнікаў адносна 1992 г. Сярэдняя запаўняльнасць глядзельнай залы ў той час складала: у г. Мінску – 22 %, у абласных цэнтрах – 17 % [439, спр. 10, арк. 146].

Забеспячэнне кінавідэасеткі экраннай прадукцыяй імкліва даражэла. Кошт фільма ў сярэднім складаў 1 млн рублёў. Ліцэнзійны дазвол на дэманстрацыю на тэрыторыі рэспублікі – ад 1,5 да 4 млн рублёў, а часам да 7–8 млн рублёў за адзін кінафільм. На ўсю кінасетку патрабавалася не менш 5 копій фільма, а кожная з іх каштавала 200–350 тыс. рублёў. Адзін відэафільм з коштам касеты каштаваў 10–15 тыс. рублёў без ліцэнзіі. Для задавальнення кінасеткі неабходна было закупляць кожны год каля 300 назваў кінафільмаў. Пры прыведзеных коштах сфарміраваць паўнацэнны рэпертуар было немагчыма. Перавага аўтаматычна аддавалася больш таннай прадукцыі [439, спр. 10, арк. 146].

Апынуўшыся ў складаных эканамічных умовах фарміравання недзяржаўных камерцыйных структур у галіне кінарынку, кінатэатры вымушаны былі карыстацца паслугамі пасрэднікаў. На тэрыторыі Беларусі іх у 1993 г. налічвалася да 20. Асноўная колькасць з Масквы, Екацерынбурга, Ульянаўска, Пермі, Данецка і г. д. Гэтыя фірмы вывозілі да 60 % наяўных грошай ад касавых збораў [439, спр. 10, арк. 146].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Стыхійны рост прадпрымальніцкай ініцыятывы ў галіне кінапракату не толькі не спрыяў умацаванню яго эканамічнага і матэрыяльна-тэхнічнага стану, але і з'яўляўся моцным дэстабілізуючым фактарам. У прыватнасці, шматлікія гульнёвыя аўтаматы збіралі ў фае кінатэатраў адпаведную публіку, што абвастрала крымінагенную сітуацыю [439, спр. 10, арк. 146].

У лютым 1993 г. калегія Міністэрства культуры вырашыла распрацаваць праект стварэння Дзяржаўнай рэспубліканскай кінавідэапракатнай кампаніі. Планавалася цэнтралізаваць закупку кінавідэафільмаў у маштабах рэспублікі, наладзіць рэгулярны дубляж лепшых узораў замежнага кінамастацтва на беларускую мову, упарадкаваць узаемаадносіны паміж дзяржаўным кінавідэапракатам і альтэрнатыўным пракатам, абмежаваць аплату паслуг пасрэднікаў у пракаце фільмаў, правесці перарэгістрацыю кінатэатраў, кінаўстановак і відэазалаў з мэтай аптымізацыі структуры кінавідэасеткі.

Калегія лічыла неабходным увайсці ва Урад з просьбай прыраўняць падаткаабкладанне камунальных паслуг для кінавідэасеткі, паменшыць падаткі і мытныя пошліны для прадпрыемстваў, якія выраблялі кінатэхналагічнае абсталяванне і запасныя часткі для яго, да норм, якія на той час былі ўстаноўлены для культасветустаноў, а таксама аб пераводзе вясковай і часткова гарадской кінавідэасеткі на бюджэтнае фінансаванне. Было вырашана стварыць у цэнтральным апараце Міністэрства аддзел па кінематаграфіі і кінафікацыі з функцыямі каардынацыі і кантролю за развіццём кінапрацэсу і ўсебаковага забеспячэння яго эфектыўнасці [439, спр. 3, арк. 2–4].

На забеспячэнне адзінага парадку дэманстрацыі кінавідэапрадукцыі на тэрыторыі краіны была накіравана распрацаваная ў 1993 г. Міністэрствам культуры комплексная праграма. Яна ўключала цэнтралізаванае фарміраванне кінавідэарэпертуару, узмацненне базавых пазіцый нацыянальнага кінематографа ў візуальных камунікацыях, абмежаванне самастойнасці гаспадарчай дзейнасці кінавідэасеткі, выдзяленне ўзорна-паказальных, апорных кінавідэаўстановак і кінатэатраў, якія на практыцы ажыццяўлялі культурную палітыку дзяржавы [439, спр. 10, арк. 148–149].

Створаны ў сакавіку 1993 г. Дзяржаўны рэгістр кінавідэафільмаў і кінавідэапраграм узяў пад кантроль суб'екты кінавідэабізнесу і стаў ажыццяўляць адзіны парадак дэманстрацыі кінавідэатвораў на тэрыторыі краіны.

Адным з напрамкаў дзейнасці Дзяржрэгістра было забеспячэнне падрыхтоўкі дакументаў на выдачу Міністэрствам культуры юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) на здымкі, тыражаванне, дэманстрацыю і пракат кінавідэапрадукцыі, а таксама абарот эратычнай прадукцыі. У 2003 г. супрацоўнікамі Дзяржрэгістра былі падрыхтаваны 123 ліцэнзіі на кінавідэадзейнасць. З 1 лістапада 2003 г. у адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2003 г. № 17 ліцэнзаванне Міністэрствам культуры згаданых відаў дзейнасці было спынена. Замест іх сталі выдавацца пракатныя пасведчанні [439, спр. 887, арк. 137].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Крокам у вырашэнні праблем кінапракату стала прыняцце 29 верасня 1993 г. пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай падтрымцы нацыянальнай кінематаграфіі». Аблвыканкамам і Мінгарвыканкаму сумесна з Міністэрствам культуры даручалася прыняць неадкладныя меры для захавання ў гарадскіх і сельскіх населеных пунктах аптымальна неабходнай колькасці кінатэатраў і кінавідэаўстановак і павысіць эфектыўнасць іх выкарыстання для паляпшэння культурнага абслугоўвання насельніцтва [12].

На жаль, палажэнні дакумента ў сувязі з эканамічным крызісам так і засталіся нявыкананымі. Напрыклад, мясцовыя ўлады аказаліся не ў стане ўтрымліваць сельскія кінаўстаноўкі ў іх ранейшай колькасці. Таму была распрацавана сістэма дамоўных адносін з кінамеханікамі, якія сталі атрымліваць 80–100 % касавага збору пры ўмове, што працавалі 8 дзён у месяц ці па 3 гадзіны ў дзень. З-за недахопу грошай не было магчымасці прыраўняць гэтую катэгорыю кінамеханікаў да сельскіх культасветработнікаў [438, спр. 8, арк. 84]. У такіх умовах працягваўся масавы адток кваліфікаваных кадраў. Сярэдняя зарплата ў чэрвені 1994 г. па сістэме кінавідэапракату была ў 2 разы меншая за афіцыйную сярэднерэспубліканскую. А сельскія кінамеханікі атрымлівалі ад 20 да 50 % сярэдняга заробку па галіне ці згаданыя вышэй 90 % касавага збору па дагавору з ВА «Кінавідэапракат». Частка з іх не атрымлівалі нават мінімальнай зарплаты. Кінавідэасетка працягвала скарачацца. З тых установак, якія фармальна існавалі ў абласцях да сярэдзіны 1994 г., працавала толькі 45 %. Работнікі былі на няпэўны час адпраўлены ў адпачынак без утрымання. У Баранавічах з 200-тысячным насельніцтвам не засталося ніводнага кінатэатра [438, спр. 10, арк. 10–11].

З-за недахопу сродкаў на ўтрыманне кінавідэасеткі, а таксама перадачы кінатэатраў з абласной у гарадскую ўласнасць апошнія сталі выкарыстоўвацца пад іншыя патрэбы. Адсутнічалі сродкі на капітальны рамонт будынкаў. Было спынена набыццё кінапраекцыйнай тэхнікі, апаратура працавала на знос, асабліва ў буйных кінатэатрах, дзе былі ўстаноўлены праектары вытворчасці краін далёкага замежжа. З-за недахопу грошай на ўтрыманне кінавідовішчных устаноў частку кінатэатраў выканкамы вымушаны былі ў адпаведнасці з заканадаўствам здаць у арэнду працоўным калектывам [438, спр. 10, арк. 11].

Немалыя дзяржаўныя сродкі, якія накіроўваліся непасрэдна ў аблвыканкамы, распыляліся пры набыцці кінапрадукцыі. У выніку гэтага рэпертуар бяднеў у жанравым і ў якасным сэнсе. Міністэрства не мела рычагоў для выпраўлення сітуацыі. Напрыклад, на працягу 1994 г. і за першы квартал 1995 г. рэгістрацыйныя пасведчанні ў Дзяржаўным рэгістры атрымалі 217 мастацкіх кінастужак, у асноўным узятых у арэнду (на пракат). З іх 127 – вытворчасці ЗША, 16 – Францыі, 14 – Італіі, 44 – краін СНД. Асноўны аб’ём экраннага часу (да 80 %) складалі амерыканскія фільмы катэгорыі «Б» – так званай другараднай прадукцыі, прызначанай для маларазвітых краін. Нізкія ідэйна-мастацкія якасці рэпертуару былі асноўнай прычынай скарачэння колькасці наведвальнікаў кінатэатраў. Было відавочна, што пры дзярждатацыі, якая ў той час ажыццяў-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

лялася, сфарміраваць паўнавартасны рэпертуар было немагчыма. Фільмы набываліся ў вельмі абмежаванай колькасці і перавага аддавалася больш таннай па кошце прадукцыі. Аснову рэпертуару складалі стужкі, ўзятыя на пракат. Ва ўмовах арэнды кінафільмаў да 45 % наяўных грошай ад касавых збораў вывозілася за мяжу. Да гэтага неабходна дадаць 15 % ад сумы ліцэнзіі на права пракату, якія спаганяліся ў дзяржаўны бюджэт. Гэта рабіла нявыгадным браць кінафільмы ў арэнду [438, спр. 57, арк. 130–131].

З іншага боку, немагчымым станавілася і набыццё фільмаў ва ўласнасць. З-за таго, што кінапракатныя арганізацыі былі самастойнымі юрыдычнымі асобамі, ім прыходзілася паасобку плаціць за ліцэнзіі на права пракату і за выраб фільмакопіі. З-за недахопу грошай не было магчымасці набываць сур’ёзныя ў мастацкім сэнсе кінатворы славутых рэжысёраў [438, спр. 57, арк. 130–131].

Былі практычна спынены навуковыя даследаванні ў экранных тэхналогіях. Не ўкараняліся дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэсу. Абсалютную большасць з 120 кінематаграфічных спецыяльнасцей можна было атрымаць па-за межамі краіны. Відавочным стала адставанне тэхнічных і тэхналагічных магчымасцей нацыянальнай экраннай культуры ад бурнага развіцця камунікатыўных і трансляцыйных сістэм. Кінагаліна не мела цэнтралізаванай службы забеспячэння і развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы, якая з-за значнай амартызацыі патрабавала карэннага абнаўлення і рэканструкцыі. Практычна ўсе запчасткі для праекцыйнай апаратуры даводзілася набываць па-за межамі Беларусі за валюту. Кінатэхнічнае абсталяванне ў сваёй большасці не адпавядала сучасным стандартам, што адбівалася на канкурэнтаздольнасці фільмапрадукцыі на міжнародных кінарынках і не давала магчымасці якасна дэманстраваць замежныя кінастужкі [438, спр. 10, арк. 13].

Галіна кінапракату прайшла шлях рэформаў. У 1992 г. гарадскія і раённыя кінавідэапрадпрыемствы Брэсцкай вобласці былі перададзены з абласной уласнасці гарвыканкамам. У абласной уласнасці засталіся толькі арганізацыі кінапракату гарадоў Брэста, Баранавіч і Пінска. Гарадскія і раённыя кінавідэапрадпрыемствы дэлегіравалі паўнамоцтвы і некаторыя функцыі кіравання кінасеткай абласному кінавідэааб’яднанню. У 1996 г. рашэннем аблвыканкама на базе трох кінавідэапракатных прадпрыемстваў было створана Брэсцкае абласное дзяржаўнае кінавідэааб’яднанне. У 2001 г. кінавідэапрадпрыемства Брэсцкага раёна было ліквідавана з перадачай функцый кінавідэаабслугоўвання аддзелу культуры. У далейшым кінаўстаноўкі былі перададзены на баланс выканкамаў сельскіх саветаў дэпутатаў [439, спр. 754, арк. 34].

Мінскі, Гродзенскі, Гомельскі і Віцебскі аблвыканкамы ў адрозненні ад Брэсцкага не перадалі з абласной уласнасці ў раённую прадпрыемствы і арганізацыі кінавідэасеткі. Усе прадпрыемствы кіно заставаліся структурнымі падраздзяленнямі абласных кінавідэааб’яднанняў, і бюджэтныя асігнаванні кінавідэасеткі ў гэтых абласцях былі значна большыя, чым у Брэсцкай [439, спр. 754, арк. 24].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У красавіку 1996 г. Міністэрства культуры накіравала ва Урад краіны прапановы па паляпшэнні кінавідэабслугоўвання насельніцтва. Найбольш важным напрамкам паляпшэння фінансавага становішча кінавідэасеткі і, як вынік, кінаабслугоўвання насельніцтва, бачылася ўдасканаленне сістэмы падаткаабкладання. У выпадку прыраўнання дзяржаўных гасразліковых пракатных арганізацый па падатках да дзяржбюджэтнай сферы адпаведныя адлічэнні павінны былі скласці 1,7 замест 20,7 %. Гэта дазволіла б выкарыстоўваць грошы, якія б заставаліся на рахунку гэтых арганізацый, на набыццё кінавідэафільмаў і рэканструкцыю матэрыяльна-тэхнічнай базы [439, спр. 92, арк. 47].

Вельмі важным бачылася больш эфектыўнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў, якія накіроўваліся на дзяржаўны кінапракат праз аблвыканкамы і Мінгарвыканкам. Пры накіраванні гэтых сродкаў праз Міністэрства культуры было б выключана дубліраванне плацяжоў, распыленне грошай і іх нямэтавае выкарыстанне. У то жа час кантроль за бюджэтнай датацыяй на кінапракат з боку Міністэрства культуры дазволіў бы цэнтралізаваць закупку сацыяльна значнай кінавідэапрдукцыі (у першую чаргу краін СНД) і ажыццяўляць адзіную рэпертуарную палітыку [439, спр. 92, арк. 47].

У 1996 г. бачылася найбольш перспектыўным напрамкам захавання кінасеткі і паляпшэння абслугоўвання насельніцтва арэнда працоўнымі калектывамі і акцыяніраванне кінатэатраў. У краіне на той час 17 буйных кінатэатраў працавалі на арэндных адносінах, цалкам самафінансаваліся, не выкарыстоўвалі грошай з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Прадстаўлялася мэтазгодным дазволіць гэтым кінатэатрам большую гаспадарчую самастойнасць, у прыватнасці, здаваць у субарэнду памяшканні без шкоды для кінапаказу пры ўмове накіравання ўсёй атрыманай сумы на паляпшэнне абслугоўвання гледачоў. На той час дзейнічала рашэнне Мінгарвыканкама аб утрыманні 50 % аб субарэнднай платы ў гарадскі бюджэт, што пагаршала фінансавае становішча кінатэатраў [439, спр. 92, арк. 48].

У канцы 1996 г. Урад краіны спецыяльнай пастановай [491] прадугледзеў захаванне ў гарадах абласнога падпарадкавання не менш за адзін кінатэатр на 150 тыс. жыхароў і не менш за адзін кінатэатр у раённым цэнтры. Дакумент рэкамендаваў мясцовым Саветам дэпутатаў прадставіць дзяржаўным кінатэатрам ільготы па падатках і іншых плацяжах, якія паступаюць у мясцовыя бюджэты.

Побач з ёй працягвала дзейнічаць Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай падтрымцы нацыянальнай кінематаграфіі» [12]. У 1997 г. Міністэрства культуры адзначала, што за час, які прайшоў пасля прыняцця дакумента, для цэнтралізаванага набыцця кінавідэафільмаў (якіх планавалася набываць 300 у год) грошы не выдзяляліся. Фарміраванне паўнавартаснага рэпертуару кінатэатраў краіны стала непасільнай задачай. У сувязі з вострым недахопам фінансавых сродкаў кінапракатныя арганізацыі краіны закуплялі ў год па адной-дзве копіі 60–65 найменняў кінафільмаў, якія ў асноў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным ужо былі ў выкарыстанні. Такой колькасці кінакопій было недастаткова для патрэб пракату краіны [439, спр. 158, арк. 58].

Недахоп фінансавых сродкаў не дазваляў кінапракатным айчынным арганізацыям набываць нават нешматлікія стужкі, што выпускала кінастудыя «Беларусьфільм». Перавага аддавалася больш танным замежным кінафільмам. Напрыклад, фільм «Павадыр» у 2002 г. не быў куплены Брэсцкай, Віцебскай і Магілёўскай абласцямі, «Зорку Венеру» не набыў Віцебскі кінапракат. З набытымі айчыннымі фільмамі ў розных рэгіёнах працавалі па-рознаму. Так, калі па Мінскай вобласці карціну «Зорка Венера» пaглядзелі 34 118 маленькіх гледачоў, то па Магілёўскай вобласці толькі 7150, ці ў 5 разоў менш. На фільме «У жніўні 44-га» ў Мінскай вобласці былі 16 723 гледача, а ў Брэсцкай вобласці ў 4 разы менш – 4425 чалавек [439, спр. 587, арк. 49]. Лепшыя паказчыкі былі ў «Анастасіі Слуцкай» – у сталіцы стужку пaглядзелі 72 753 чалавекі (да сярэдзіны 2004 г.). Для параўнання адзначым, што амерыканскі фільм «Гладыятар», які дэманстраваўся ў той жа перыяд, сабраў 155 553 чалавекі [179, с. 139].

У снежні 2002 – студзені 2004 г. супрацоўнікі Беларускага інстытута праблем культуры правялі сацыялагічнае даследаванне па тэме «Глядацкая аўдыторыя як індыкатар дзейнасці кінематографа». Даследаванне адлюстравала нізкую арыентацыю гледача на беларускі кінематограф – 14 % рэальнай студэнцкай аўдыторыі і 12,7 % патэнцыяльнай. Трэць з апытанай патэнцыяльнай аўдыторыі выказала негатыўнае стаўленне да беларускага кіно. Апытанне рэальнай кінааўдыторыі паказала, што 29,5 % рэспандэнтаў не назвалі ніводнага беларускага фільма, які ім запомніўся, 18 % наогул не ведалі беларускіх фільмаў, 8,5 % рэспандэнтаў патэнцыяльнай аўдыторыі хацелі б глядзець фільмы на беларускай мове [109, с. 96].

З мэтай павышэння эканамічнай і сацыяльнай эфектыўнасці дзейнасці кінавідэапракатных устаноў востра адчувалася неабходнасць дзяржаўнай падтрымкі ў фарміраванні і папаўненні фільмафонду, у першую чаргу кінафільмаў для дзяцей і юнацтва і беларускай фільмапрадукцыі на відэаносьбітах [439, спр. 587, арк. 49].

Міністэрствам культуры як станоўчы адзначаўся вопыт Брэсцкай вобласці па падыходзе да кінапракату як да бізнесу. Брэсцкі аблвыканкам здаў на 5 гадоў індывідуальнаму прадпрымальніку вялікі зал вядучага кінатэатра г. Брэста «Беларусь», дзе бізнесовец за ўласны кошт усталяваў сістэму «Долбі-стэрэа». Пінскі гарвыканкам пайшоў тым жа шляхам, і з мая 2002 г. кінатэатр «Перамога» пачаў працаваць у сістэме «Долбі». На аснове пагаднення з прыватнай фірмай аб сумесным аказанні паслуг Гродзенскі кінавідэапракат устанавіў у верасні 2002 г. такую ж сістэму ў кінатэатры «Юбілейны» ў г. Лідзе. За першыя 4 дні работы быў выкананы месячны план [439, спр. 587, арк. 47].

5 снежня 2002 г. калегія Міністэрства культуры абмяркоўвала вынікі кінавідэаабслугоўвання насельніцтва. Была звернута ўвага на працяг працэсу скарачэння стацыянарных кінаўстановак, што прыводзіла да скарачэння колькасці гледачоў. За перыяд з 1990 па 2001 г. агульная колькасць кінаўстановак



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скарацілася ў 2,3 разы (у сельскай мясцовасці – у 2 разы), колькасць месцаў для гледачоў – у 1,8 разы. Самае вялікае скарачэнне кінаўстановак (у 2,6 разы) адбылося ў Гомельскай вобласці. Агульная лічба наведванняў скарацілася ў 10,5 разы (табл. 5). Сярод праблем, якія стрымлівалі паляпшэнне кінавідэаабслугоўвання насельніцтва, была састарэласць кінапраекцыйнага абсталявання, значная амартызацыя будынкаў (80 % з іх патрабавалі рамонту і мадэрнізацыі). Пэўныя праблемы на шляху паляпшэння кінавідэаабслугоўвання стварала адсутнасць цэласнасці кінавідэасеткі і органаў кіравання кінафікацыяй у некаторых абласцях [439, спр. 587, арк. 40].

*Табліца 5.* **Колькасць кінаўстановак і відэаўстановак, наведванне [621, с. 23,31; 683, с. 238; 685, с. 245; 696, с. 126; 698, с. 237; 797, с. 46, 48]**

| Паказчык | Год | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1990 | 1991 | 1993 | 1995 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2005 | 2007 | 2009 | 2010 |
| **Кінаўстаноўкі** | 6916 | 5976 | 4168 | 3780 | 3063 | 2951 | 2642 | 2329 | 1997 | 1715 | 1212 | 992 |
| Наведвальнікаў, млн | 117 | 94 | 30 | 12,4 | 11,8 | 11 | 8,3 | 8,4 | 8,7 | 8,7 | 9,0 | 9,4 |
| **Відэаўстаноўкі** | 483 | – | 319 | 266 | 331 | 346 | 367 | – | 459 | 583 | 683 | 748 |
| Наведвальнікаў, млн | 4,8 | – | 2,3 | 1,3 | 2,2 | 2,3 | 2,2 | – | 4,4 | 5,4 | 5,8 | 5,97 |

Як сведчаць дадзеныя табл. 5, падзенне колькасці кінаўстановак і колькасці наведвальнікаў адбывалася да 2005 г. Затым назіралася адносная стабілізацыя і некаторы рост колькасці наведвальнікаў пры скарачэнні кінаўстановак: пры скарачэнні колькасці кінаўстановак у 2 разы (з 1997 да 992) на 8 % павялічылася колькасць наведвальнікаў. Побач з гэтым адбываліся працэсы пашырэння выкарыстання іншых відаў экранных тэхналогій: адкрываліся новыя відэазалы, развівалася кабельнае тэлебачанне. Найбольшы эфект з пункту гледжання пашырэння рэпертуару і паляпшэння якасці паказу мела выкарыстанне відэапраектных установак. У адпаведнасці з пратаколам даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 чэрвеня 2001 г. № 23 за кошт мясцовых бюджэтаў толькі ў 2002 г. было набыта 26 відэапраектных комплексаў [107, с. 50–51]. На канец 2006 г. у краіне дзейнічала каля 400 такіх відэасістэм [111, с. 126]. У наступныя гады іх колькасць працягвала расці, і ў 2010 г. іх налічвалася 748 адзінак. З мэтай прыцягнення гледачоў праводзілася аснашчэнне кінатэатраў гукавымі сістэмамі Dolby, праводзіўся капітальны рамонт і рэканструкцыя кіназалаў. На 1 студзеня 2007 г. у рэспубліцы былі абсталяваны гэтымі сістэмамі 25 кіназалаў [111, с. 126].

У верасні 2008 г. у Мінску адкрыўся першы ў краіне мультыплекс «Беларусь», які налічваў пяць кіназалаў. У 2010 г. у кінатэатрах гарадоў Барысаў, Брэст, Гомель, Гродна, Ліда і Мінск былі ўсталяваны сістэмы лічбавага 3D-кінапаказу [104, с. 81].

У табл. 6 прыведзены паказчыкі наведвання ў разліку на аднаго жыхара. Як можна заўважыць, адзіным месцам, дзе назіралася павелічэнне колькасці гледачоў, быў г. Мінск. У перыяд з 1997 па 2001 г. у сталіцы назіралася павелічэнне ў 3 разы. Гэтаму спрыялі змены ў рэпертуарнай палітыцы. На экранах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з’явіліся фільмы класа «А», прэм’ерныя, фестывальныя і г. д. Па-новаму стала будавацца праца з гледачом. У кінатэатрах з’явіліся льготныя кінасеансы. Аднак і гэтыя меры не дазволілі ўтрымаць гледача. У далейшым лічба наведванняў зменшылася на чвэрць у 2007 г. у параўнанні з 2001 г. Толькі ў 2010 г. назіраўся некаторы рост гэтага паказчыка. У той жа час наведанне кінасеансаў у Мінскай вобласці няўхільна падала на фоне неістотнага паляпшэння становішча ў іншых абласцях у 2010 г.

*Табліца 6.* **Колькасць наведванняў кінасеансаў у сярэднім на аднаго жыхара (уласныя падлікі па [107, с. 55; 621, с. 30; 796, с. 26])**

| Вобласць | Год | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 1990 | 1995 | 2001 | 2007 | 2010 |
| Брэсцкая | 11,7 | 1,2 | 0,9 | 0,4 | 0,5 |
| Віцебская | 11,4 | 0,7 | 0,6 | 0,3 | 0,3 |
| Гомельская | 12,4 | 1,3 | 0,7 | 0,7 | 0,8 |
| Гродзенская | 10,8 | 1,4 | 0,6 | 0,4 | 0,5 |
| Мінская | 12,1 | 1,6 | 1,5 | 1,2 | 1,0 |
| Магілёўская | 10,1 | 1,4 | 0,5 | 0,7 | 0,7 |
| г. Мінск | 11,0 | 0,9 | 2,7 | 2,0 | 2,4 |
| **Па краіне** | **11,5** | **1,2** | **1,1** | **0,9** | **1,0** |

У рэпертуарнай палітыцы для дарослай аўдыторыі назіралася перавага амерыканскай кінапрадукцыі, якая давала тры чацвёртых усіх даходаў [109, с. 91]. Напрыклад, у 2002 г. кінавідэапракатныя арганізацыі краіны набылі 174 мастацкія кінастужкі. З іх вытворчасці Беларусі – 3 (1,7 %), Расіі – 28 (16 %), ЗША – 100 (57 %), краін Еўропы – 35 (20 %). За пяць месяцаў 2003 г. для дарослай аўдыторыі было паказана мастацкіх фільмаў вытворчасці ЗША – 39,8 %, краін Еўропы – 20,3, Расіі – 26,7, Беларусі – 4,5 %. Па дзіцячых фільмах паказчыкі былі наступныя: вытворчасці ЗША – 17 %, краін Еўропы – 16, Расіі – 55,8, Беларусі – 6,2 %. Па дакументальным кіно: вытворчасці Расіі – 63,8 %, Беларусі – 29,8 % [439, спр. 748, арк. 219–220].

З мэтай выпраўлення становішча з рэпертуарам, пашырэння геаграфіі краін-вытворцаў, знаёмства гледача з цікавымі творчымі праектамі з верасня 2002 г. у г. Мінску стаў рэалізоўвацца праект «Кінафармат 4×4», які хутка набыў папулярнасць сярод гледачоў. Праект праіснаваў да 2009 г.

Непасрэдным фарміраваннем кінавідэарэпертуару кінатэатраў, кінавідэаўстановак абласцей і г. Мінска займаліся адпаведныя кінавідэапрадпрыемствы, пры якіх дзейнічалі рэпертуарныя камісіі. З мэтай павелічэння долі фільмакопій беларускай і расійскай вытворчасці і рэгулявання колькасці фільмапрадукцыі замежных краін 24 сакавіка 2005 г. была створана Каардынацыйная рада па закупцы кінавідэапрадукцыі. У выніку змен у рэпертуарнай палітыцы кінавідэапракатных арганізацый у кінатэатрах краіны ў 2005 г. назіраўся рост колькасці паказаў прадукцыі расійскай і беларускай вытворчасці (больш за 40 % ад агульнай колькасці фільмаў для дарослай аўдыторыі і больш за 60 % –

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

для дзіцячай). У выніку прынятых захадаў назіралася паступовае павелічэнне паступленняў ад рэалізацыі прадукцыі кінастудыі «Беларусьфільм»: 2001 г. – 46,3 тыс. дол ЗША, 2004 г. – звыш 100 тыс. дол. ЗША, 2005 г. – 293,8 тыс. дол. ЗША [72, арк. 134].

У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2005 г. на ўпраўленні ідэалагічнай работы аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама быў ускладзены кантроль за рэпертуарнай палітыкай і набыццём новай фільмапрадукцыі [77, т. 4, арк. 7].

Па выніках працы кінапракатных арганізацый у 2006–2007 гг. відавочным быў рост колькасці набываемай кінапрадукцыі. У 2006 г. – 295 новых кінакопій, у 2007 г. – 614. Найбольшую колькасць набытых у 2007 г. кінакопій складалі стужкі вытворчасці ЗША – 301 (49 %), далей ішла Расія – 183 (29,8 %), краіны Еўропы – 92 (15,0 %), Беларусь – 24 (3,9 %), іншыя краіны – 14 (2,3 %). Па жанравай тэматыцы стужкі 2007 г. размяркоўваліся наступным чынам: трылеры – 143, камедыі – 77, прыгодніцкія – 17, дзіцячыя – 69.

Найбольшая колькасць кінастужак у 2007 г. была выпушчана на кінаэкраны прадпрыемства «Кінавідэапракат» Мінгарвыканкама – 144. Далей ішла Магілёўская вобласць – 133, Брэсцкая – 110, Мінская – 97, Гомельская – 51, Віцебская – 48, Гродзенская – 31.

Усяго за 2007 г. у кінатэатрах і на кінаўстаноўках краіны было паказана 11 325 копій кінафільмаў, у тым ліку:

мастацкіх для дарослых – 4380 (па краіне вытворчасці: ЗША – 1547 (35,3 %), Расія – 1513 (34,5 %), краіны Еўропы – 765 (17,5 %), Беларусь – 302 (6,9 %), іншыя краіны – 253 (5,8 %));

мастацкіх фільмаў для дзяцей – 3967 (па краіне вытворчасці: Расія – 2167 (54,6 %), ЗША – 750 (19,0 %), краіны Еўропы – 563 (14,2 %), Беларусь – 340 (8,5 %), іншыя краіны – 147 (3,7 %));

дакументальных – 2978 (па краіне вытворчасці: Расія – 1457 (49,0 %), Беларусь – 1140 (38,3 %), краіны Еўропы – 291 (9,8 %), іншыя краіны – 90 (2,9 %)).

На відэаўстаноўках дэманстравалася 4187 мастацкіх відэафільмаў. З іх: ЗША – 2513, Расіі – 935, краін Еўропы – 512, Беларусі – 4, Азіі – 87, іншых краін – 136 [77, т. 4, арк. 14].

Эканамічныя цяжкасці пачатку 2000-х гг. прымусілі кіраўніцтва Брэсцкага аблвыканкама пайсці на непапулярныя меры. У 2002 г. Брэсцкае абласное дзяржаўнае кінавідэаб’яднанне было рэарганізавана ва ўстанову культуры «Брэсцкае абласное дзяржаўнае кінавідэааб’яднанне», а рашэннем райвыканкамаў раённыя кінавідэапрадпрыемствы былі рэарганізаваны ва ўстановы культуры «Дырэкцыі кінавідэасеткі аблвыканкамаў». У дакладной запісцы намесніка старшыні аблвыканкама Э. Г. Сакалова на імя старшыні аблвыканкама В. Б. Далгалёва адзначалася, што «дзяржава не мае магчымасці і далей аказваць фінансавую падтрымку кінавідэааб’яднанню. Яна не павінна гэтага рабіць». Прапаноўвалася ліквідаваць абласную кінавідэапракатную арганізацыю, спыніць практыку выдзялення арганізацыям кінавідэасеткі бюджэтных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асігнаванняў, ліквідаваць сельскія кінаўстаноўкі, а замест іх абсталяваць у сельскай мясцовасці кабельнае тэлебачанне. Гарадскія кінатэатры прапаноўвалася ў асноўным прадаць з аўкцыёну без захавання профілю [439, спр. 754, арк. 19].

Нягледзячы на пратэсты работнікаў кінасеткі, рашэннем аблвыканкама № 675 ад 25.11.2002 г. райвыканкамам было даручана ў мэтах эканоміі і рацыянальнага выкарыстання бюджэтных сродкаў вырашыць пытанне аб перадачы функцый кінавідэавідовішчных арганізацый раённым аддзелам культуры, максімальна аптымізуючы раённую кінавідэасетку. У выніку праводзімых рэформ у Івацэвіцкім раёне ўсе сельскія кінаўстаноўкі (31) былі ліквідаваны. У Пінскім раёне ў выніку далучэння кінасеткі да аддзела культуры з 46 сельскіх кінаўстановак засталіся толькі 6 [439, спр. 754, арк. 20].

За перыяд 2003–2005 гг. у Брэсцкай вобласці адбыліся станоўчыя змены. У 2005 г. была адноўлена работа сельскіх кінаўстановак у Ганцавіцкім раёне. На працягу трох гадоў у вобласці было адкрыта 22 кіназалаў, пашырылася сетка пунктаў пракату відэакасет, на працягу 2004–2005 гг. адкрылася 13 аўтакінавідэаперасовак для абслугоўвання населеных пунктаў, дзе не было кінаўстановак. Побач з гэтым з-за недастатковага фінансавання ў Брэсцкай вобласці бяздзейнічала 31 кінаўстаноўка тэатральнага тыпа ў буйных населеных пунктах. Матэрыяльная база кінасеткі і кінавідэапракату вобласці не абнаўлялася звыш 15 гадоў, не набывалася новая кінаапаратура і кіназапчасткі. Будынкі кінатэатраў патрабавалі рэканструкцыі і рамонту. Было зачынена 285 сельскіх кінаўстановак. У Пінску адзіны кінатэатр «Победа» быў здадзены ў арэнду індывідуальнаму прадпрымальніку, які абсталяваў яго сістэмай «Долбі-стэрэа» і дэманстраваў пераважна камерцыйныя фільмы. Установа культуры «Пінская гарадская кінавідэасетка» здзяйсняла толькі кінавідэабслугоўванне дзяцей у дзіцячых садках, школах відэаперасоўнай установай і дэманстравала па адным дзіцячым сеансе ў дзень са згоды індывідуальнага прадпрымальніка. У арэнду індывідуальнаму прадпрымальніку ў г. Брэсце была здадзена «вялікая» зала кінатэатра «Беларусь» [439, спр. 1049, арк. 54].

У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 чэрвеня 2005 г. № 10/130 у краіне праводзілася стварэнне адзінай структуры кінавідэасеткі і сістэмы кіравання кінавідэапракатнымі прадпрыемствамі. У Брэсцкай вобласці асобным рашэннем аблвыканкама ў ліпені 2005 г. было створана КУП «Кінавідэапракат» з філіяламі ў гарадах Баранавічы і Пінск з захаваннем за Упраўленнем культуры аблвыканкама кіравання дадзеным органам галіновага кіравання. У Віцебскай вобласці ў 2005 г. было адменена рашэнне аблвыканкама аб перадачы шэрагу кінатэатраў у раённую ўласнасць. Кінатэатры засталіся на балансе УП «Кінавідэапракат» Віцебскага аблвыканкама. У Магілёўскай вобласці ў тым жа годзе кінавідэапрадпрыемствы былі перададзены як маёмасныя комплексы ў абласную ўласнасць. З раённай у абласную камунальную ўласнасць бязвыплатна была перададзена маёмасць аддзелаў культуры, якая прызначалася для кінавідэаблугоўвання насельніцтва. У г. Мінску ў той



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

час 17 кінатэатраў былі аб’яднаны ў адзіную сетку, пераўтвораны ў філіялы структуры УП «Кінавідэапракат» Мінскага гарвыканкама [72, арк. 142].

Праз два гады адбылася новая рэарганізацыя. Гарвыканкамам і райвыканкамам былі перададзены будынкі, пабудовы і іншая маёмасць кінапракатных арганізацый акрамя той, што знаходзілася ў абласных цэнтрах. У Брэсцкай вобласці былі створаны кінавідэацэнтры аддзелаў культуры райвыканкамаў без стварэння юрыдычнай асобы. Баранавіцкі кінатэатр «Кастрычнік» і Пінская гарадская кінавідэасетка сталі асобнымі ўстановамі культуры. У Віцебскай вобласці былі створаны кінавідэацэнтры раённых і гарадскіх аддзелаў культуры без стварэння юрыдычных асоб. У Гомельскай вобласці – раённыя камунальныя кінавідовішчныя ўнітарныя прадпрыемствы. У Гродзенскай – камунальныя ўнітарныя кінавідовішчныя прадпрыемствы «Райкінавідэасетка». У Магілёўскай – структурныя падраздзяленні аддзелаў культуры гаррайвыканкамаў, а таксама камунальнае ўнітарнае прадпрыемства (КУП) «Бабруйсккіно». У Мінскай вобласці былі створаны КУП раёнаў і г. Жодзіна. У падпарадкаванні КУП «Мінаблкінавідэапракат» захаваліся кінатэатры «Кастрычнік» у г. Барысаве, «Юнацтва» ў г. Валожыне, «Эра» у г. Дзяржынску, «Радзіма» ў г. Маладзечна, «Кастрычнік» у г. Мар’іна Горка, «Беларусь» у г. Слуцку, «Зорка Венера» ў г. Салігорску, а таксама фільмабазы [81, т. 9, арк. 88–89].

У 2010 г. у структуру ўнітаранага прадпрыемства «Кінавідэапракат» Мінгарвыканкама ўваходзіла 15 філіялаў (кінатэатраў). Кінатэатры аказвалі дадатковыя паслугі па правядзенні інфармацыйна-забаўляльных праграм, арганізацыі цэнтраў культуры і вольнага часу, кропак грамадскага харчавання. У 6 кінатэатрах працавалі ўласныя бары.

За перыяд 2001–2009 гг. удзельная вага бюджэтнага фінансавання прадпрыемства на пакрыццё страт ад гаспадарчай дзейнасці скарацілася з 33,4 да 5,9 %. У 2009 г. на кожны атрыманы рубель ад кінаабслугоўвання насельніцтва спатрэбілася 0,059 рублі дзяржаўных датацый, калі сярэдні паказчык па краіне складаў 1,52 рублі [80, т. 4, арк. 212–213].

Шэраг мерапрыемстваў у напрамку развіцця кінавідэапракату і кінавідэапаказу ўтрымлівала Канцэпцыя развіцця кінематаграфіі Рэспублікі Беларусь на 2009–2014 гг. За першыя гады яе рэалізацыі былі дасягнуты пэўныя вынікі. Міністэрства культуры сумесна з зацікаўленымі разгледзела магчымасць ўвядзення дыферэнцыраванага падаткаабкладання пракату і паказу замежнай і нацыянальнай кінавідэапрадукцыі. З 2010 г. пры набыцці замежнай прадукцыі кінавідэапракатныя прадпрыемствы сплачвалі падатак на дабаўленую вартасць і падатак на прыбытак замежных юрыдычных асоб. Пры набыцці кінавідэапрадукцыі нацыянальных вытворцаў гэтыя падаткі не налічваліся [81, т. 7, арк. 26].

Міністэрства культуры сумесна з аблвыканкамамі, кінастудыяй і відэацэнтрам распрацавалі і рэалізавалі мерапрыемствы па правядзенні адзінай рэпертуарнай палітыкі ў дзяржаўных кінавідэапракатных арганізацыях. Кінастудыя і відэацэнтр актывізавалі распаўсюджанне рэкламнай прадукцыі новых бела-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рускіх фільмаў. У 2010 г. быў праведзены VII Рэспубліканскі фестываль беларускіх фільмаў у г. Брэсце. Аргкамітэтам гэтага форуму быў заснаваны прыз «За прапаганду беларускіх фільмаў» сярод кінавідэапракатных арганізацый рэспублікі. Пераможцам стаў кінапракат Мінскай вобласці.

Пачынаючы з 2010 г. у бюджэтах абласцей і г. Мінска было запланавана выдзяленне субсідый на пакрыццё страт дзяржаўных кінавідэапракатных арганізацый пры паказе фільмаў беларускай вытворчасці, прызнаных у вызначаным парадку нацыянальнымі і створаных па дзяржаўным заказе. Датацыі атрымалі дзяржаўныя арганізацыі, якія займаліся пракатам і паказам фільмаў у сельскай мясцовасці, малых і сярэдніх гарадах, а таксама гарадах абласнога падпарадкавання. Субсідзіраваўся кінавідэапаказ і кінавідэапракат некамерцыйных і дзіцячых фільмаў, арганізацыя спецыяльных сеансаў для сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва па льготных коштах [81, т. 7, арк. 27].

Для кінавідэаабслугоўвання сельскага насельніцтва праводзілася работа па набыцці стацыянарных і перасоўных відэапракатных комплексаў. Толькі за першае паўгоддзе 2010 г. было набыта 12 відэапраекцыйных сістэм і адзін аўтамабіль [81, т. 7, арк. 33].

Значна больш складаным было рэалізаваць палажэнні канцэпцыі аб прыцягненні замежных фірм на беларускі рынак для інвеставання сродкаў у рэканструкцыю кінатэатраў.

Канцэпцыя прадугледжвала паступовы пераход арганізацый кінавідэапракату і кінапаказу ў г. Мінску і абласных цэнтрах на самаакупнасць. Гэта пытанне разглядалася на калегіі Міністэрства культуры ў красавіку 2010 г. На ёй адзначалася пэўная работа кінавідэапракатных арганізацый па нарошчванні аб’ёмаў дадатковых паслуг у кінатэатрах, абнаўленні інтэр’ераў і стварэнні для наведвальнікаў максімальна камфортных умоў. Акрамя дэманстрацыі кінавідэастужак у будынках кінатэатраў праводзіліся культурна-масавыя мерапрыемствы. Фае і дапаможныя памяшканні выкарыстоўваліся для арганізацыі грамадскага харчавання, дыскатэк, відэагульняў, а таксама іншых спадарожных паслуг: кам’ютарных клубаў і інтэрнэту, пракату відэакасет і DVD-дыскаў, розных спартыўных гульняў, аказання побытавых паслуг насельніцтву [80, т. 2, арк. 99].

Не давалі вынікаў перамовы з дыстрыб’ютарамі аб першачарговым паказе замежных фільмаў на ўмовах бясплатнага атрымання матэрыяльных носьбітаў з наступным пералічэннем дыстрыб’ютару за дадзеныя правы не больш за 50 % валавога збору.

У стадыі кансультацый і аналізу нарматыўнай прававой базы ў 2010 г. знаходзілася праца па стварэнні ўмоў і дзяржаўных гарантый для развіцця прыватнага кінапракату і кінапаказу пры ўмове прыярытэтнага пракату і паказу апошнімі беларускай кінавідэапрадукцыі. На той час працавалі толькі два прыватныя кінатэатры ў Баранавічах і Мінску [81, т. 7, арк. 27–28].

Канцэпцыяй было прадугледжана прыярытэтнае стварэнне пры правядзенні рэканструкцыі кінатэатраў у сталіцы, абласных цэнтрах і гарадах абла-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

снога падпарадкавання шматзальных кінатэатраў. У 2010 г. Міністэрства культуры ініцыявала даручэнне прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь аблвыканкамам і Мінгарвыканкаму пры рэалізацыі інвестыцыйных праектаў па будаўніцтве гандлёвых цэнтраў прадугледжваць размяшчэнне ў іх шматзальных лічбавых кінатэатраў. Да 2014 г. планавалася ўсталяваць у кінатэатрах гарадоў з насельніцтвам звыш 50 тыс. чалавек гукавыя сістэмы «Долбі-стэрэа» [81, т. 7, арк. 32–33].

Такім чынам, кінавытворчасць перажывала нялепшыя часы. Творчы ўздым пачатку 1990-х гг. перайшоў у зацяжны крызіс, які быў пераадолены шляхам істотнага павелічэння дзяржаўнага фінансавання матэрыяльна-тэхнічнай базы, пашырэння дзяржзаказу. На дзяржаўным узроўні неаднаразова прымаліся палажэнні па рашэнні задач захавання і рэфармавання галіны. У 2004 г. быў прыняты закон «Аб кінематаграфіі», які быў накіраваны на вырашэнне як сацыяльна-эканамічных, так і ідэалагічных задач.

Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы, кінагаліна краіны здолела рэалізаваць выпуск сумеснай беларуска-расійскай кінапрадукцыі, наладзіць паступовую мадэрнізацыю тэхнічнай базы галіны, падрыхтоўку ўласных кадраў, павялічыць долю паказу нацыянальнай кінапрадукцыі на тэлеэкранах.

### 5.6. Сродкі масавай інфармацыі

Правядзенне сацыяльна-эканамічных рэформ, палітычных пераўтварэнняў нельга ўявіць без сродкаў масавай інфармацыі.

Выступаючы перад студэнтамі на адкрыцці новага корпуса БДУ ў лютым 2008 г., Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка падкрэсліваў: «Важнейшы кампанент нашага грамадства – сродкі масавай інфармацыі. Уплыў тэлебачання, прэсы і Інтэрнэта адчуваецца літаральна ва ўсіх сферах нашага жыцця. Яны не толькі інфармуюць нас аб усім, што адбываецца ў краіне і свеце, а яшчэ вучаць, выхоўваюць, далучаюць да культуры і забаўляюць. Яны прызнаны забяспечваць зваротную сувязь улады з народам, ставіць праблемныя пытанні перад органамі дзяржкіравання. [...] Сродкі масавай інфармацыі з'яўляюцца важнейшым кампанентам грамадзянскай супольнасці ў Беларусі. СМІ сёння сталі адным з самых аператыўных і надзейных барометраў грамадскай думкі. [...] У ідэалогіі прафесію журналіста замяніць цяжка, а сродкі масавай інфармацыі – немагчыма. Таму яны не могуць быць прыватызаваны» [117].

У вывучаемы перыяд пачалі выходзіць «Народная газета» (1990) і «Рэспубліка» (1991). Адной з прыкмет змен на рынку СМІ незалежнай Беларусі стала ***пашырэнне недзяржаўных (альтэрнатыўных) выданняў***: партый і рухаў, грамадскіх аб'яднанняў, творчых і прафесійных саюзаў, міністэрстваў, агенцтваў, акцыянерных таварыстваў, прыватных асоб і прадпрымальнікаў: «Коммунист Белоруссии. Мы и время», «Наша слова», «Наша доля», «7 дней» (усе з 1990 г.), «Наша ніва», «Белорусский рынок», «Культура», «Прессбол» (усе з 1991 г.), «Згода», «Белорусская деловая газета», «Национальная экономическая газета»

(усе з 1992 г.), «Аргументы и факты в Белоруссии» (з 1993 г.), «Товарищ», «Ва-банкъ» (абедзве з 1994 г.), «Белорусская газета», «Народная воля», «Белорусская лесная газета», «Белорусская торговая газета» (усе з 1995 г.) і інш.

Выдаўцы ўсё больш сталі арыентавацца на попыт спажыўцоў. Гэта адлюстравалася ў спецыялізацыі перыядычных выданняў. На рынку з'явіліся такія часопісы, як «Главный бухгалтер», «Кадровик», «Секретарское дело», «Архівы і справаводства», «Судовы веснік» і інш.

У 1990-я гг. у краіне было адноўлена выданне «Епархиальных новостей». Пачалі выходзіць канфесійныя выданні: «Царкоўнае слова» (з 1992 г.), «Преображение» (Слуцк, з 1994 г.), «Верую» (Бабруйск, з 1996 г.), «Духовный вестник» (Брэст, з 1997 г.), «Православный вестник» (Гродна, з 1998 г.). З'явіліся перыядычныя выданні нацыянальных супольнасцей Беларусі: часопісы «Байрам» («Свята», з 1991 г.), «Magazyn Polski» (з 1992 г.), газета «Украінець в Беларусі» (з 2001 г.).

Другая палова 1990-х гг. характарызуецца бумам забаўляльных часопісаў, арыентаваных у першую чаргу на моладзь. Побач з імі значныя тыражы мелі такія выданні, як «Аргументы и факты в Белоруссии», «Комсомольская правда в Белоруссии».

Прыватная ініцыятыва і падтрымка разнастайных недзяржаўных фондаў, якія хутка ўзнікалі і таксама хутка знікалі, падаравалі чытачу новыя газеты і часопісы, якія сталі асяродкамі нараджэння новых літаратурна-мастацкіх канцэпцый. Напрыклад, у Полацку на працягу 1990–1996 гг. намаганнямі А. Аркуша выдаваўся літаратурны альманах «Ксэракс Беларусі». У 1995 г. у Мінску быў заснаваны «Кстати: литературный альманах», які выдаваўся пры садзейнічанні Беларускага фонду Дж. Сораса. Выданне было разлічана на рускамоўных літаратараў і інтэлектуалаў, якія не ўваходзілі ў склад Саюза пісьменнікаў і не мелі магчымасці друкавацца на старонках афіцыйных выданняў. З-за фінансавых прычын да 2000 г. было выдадзена толькі два нумары. Значнай падзеяй стала аднаўленне ў 1991 г. выдання газеты «Наша Ніва», якая цалкам мела прыватнае фінансаванне. На жаль, газета за гэты час трансфармавалася ў бок грамадска-палітычнай тэматыкі, значна зменшыўшы аб'ём літаратурных матэрыялаў.

З літаратурна-выдавецкімі ініцыятывамі выступілі і грамадскія арганізацыі. Яшчэ ў 1988 г. быў заснаваны літаратурна-мастацкі і інфармацыйна-публіцыстычны веснік «Надежда» Беларускага таварыства інвалідаў. З 1997 г. у Мінску штогод выходзіў часопіс «Монолог», у якім побач з прозай і паэзіяй друкаваліся агляды па мастацтве, інтэрв'ю з дзеячамі сусветнай культуры. Часопіс вызначаўся сваім мастацкім афармленнем і паліграфічным выданнем. На рэспубліканскім конкурсе «Мастацтва кнігі – 2002» ён быў прызнаны лепшым літаратурна-мастацкім выданнем па выяўленчым мастацтве. Сярод падпісчыкаў часопіса былі буйнейшыя бібліятэкі свету, а таксама кафедры славістыкі вядучых навучальных устаноў краін свету. У 1995 г. Беларускае аб'яднанне яўрэйскіх абшчын і арганізацый заснавала ў Віцебску часопіс



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Мишпоха» з мэтай «знаёміць чытачоў, перадусім маладых, з яўрэйскай гісторыяй і культурай».

Не засталіся незаўважанымі і такія выданні, як філасофска-культуралагічны часопіс Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта «Топас» (заснаваны ў 1998 г.) і літаратурна-культуралагічны часопіс Беларускага калегіума «Паміж» (заснаваны ў 2002 г.), часопіс Інстытута сучасных ведаў «Немига литературная» (пазней выдаўцом стала выдавецтва «Тэхнапрынт», з 2007 г. выдаваўся пад назвай «Новая Немига литературная»), выданні рэгіянальнай пісьменніцкай арганізацыі «Полоцкая ветвь» – газета «Вестник культуры», штоквартальны часопіс «Западная Двина» і альманах «Катарсизм».

Адносна творчага крэда часопіса «Западная Двина» яго галоўны рэдактар А. Зайцаў заўважаў, што «часопіс меркаваўся не як арэна літаратурных, а тым больш палітычных баталій. Выданне з'яўляецца прыватнай ініцыятывай людзей, якія спрабуюць запоўніць прабел на рынку літаратурных часопісаў, стварыць здаровую канкурэнцыю ўжо існуючым «Неману» і «Немиге литературной», а таксама прадставіць чытачу ўвесь цвет нашага аб'яднання» [869].

Заслугоўвае ўвагі адзначаны малой Букераўскай прэміяй за 1994 г. часопіс «Идиот: витебский литературный журнал», які выдаваўся з 1983 г. у самвыдаце, пазней (з № 29) – тыпаграфскім спосабам. Да 2001 г. было выдадзена 80 нумароў. Творчым крэда выдання было выказванне аб тым, што «ідыёцкая літаратура – гэта літаратура незвычайнасці тых, хто жыве ў Віцебску» [869].

Побач з недзяржаўным друкам працягвалі існаваць дзяржаўныя выданні, якія не змянілі сваёй пазіцыі ў адносінах да літаратараў, пэўнага творчага напрамку. Аб пазіцыі часопіса «Неман» сведчаць наступныя словы галоўнага рэдактара Н. Чайка: «мы не дапускаем эпатажных постмадэрнісцкіх выкрутаў. Не забаўляемся і разнастайнымі "фэнтэзі". Адвяргаем рознага роду "коды да Вінчы", лічачы іх здзекам над традыцыяй і пачуццямі веруючых. Трымаем курс на здаровы кансерватызм» [3]. Шлях ад дзяржаўнага да прыватнага, а затым зноў да дзяржаўнага прайшоў часопіс «Крыніца», які быў заснаваны ў 1988 г. як «грамадска-палітычны і літаратурна-мастацкі часопіс ЦК ЛКСМБ і СП БССР». Часопіс у 1990 г. меў рэкордны тыраж у 500 000 экзэмпляраў і быў вядомы на прасторах усяго СССР. З 2003 г. часопіс змяніў назву на «Славянский свет» і ў хуткім часе спыніў сваё існаванне.

Шырокую вядомасць за межамі Беларусі меў часопіс «Фантакрим – MEGA», які выдаваўся з 1991 да 1997 г. у Мінску і стаў першым айчынным часопісам фантастыкі. На яго старонках друкаваліся не толькі айчынныя, але і замежныя аўтары. Са спыненнем выдання фантастычныя творы сталі больш друкавацца ў часопісе «Першацвет», якія быў створаны на базе літаратурнага аб'яднання пры газеце «Чырвоная змена» ў 1993 г. А. Масарэнкам. Часопіс быў першай трыбунай для маладых літаратараў і праіснаваў да 2001 г. Традыцыі друкавання фантастыкі пераняў часопіс «Маладосць» (дадатак «Фантаст»).

У гісторыі развіцця айчыннай літаратуры і культуралогіі 1990-х гг. адметнае месца займае штомесячны дадатак да газеты «Культура» – літаратурна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

філасофскі сшытак «ЗНО», які выдаваўся з 1993 па 1997 г. Яго старонкі былі адкрытыя для публікацыі мастацкіх твораў як традыцыйнага жанру, так і эксперыментальных. З асяродку «ЗНО» выйшлі заснавальнікі «часопіса па філасофіі ды сацыяльных навуках» «Фрагмэнты» (выходзіў з 1996 па 2002 г.) і «народнага часопіса» «ARCHE» (заснаваны ў 1998 г.).

***Дынаміка развіцця сектара друкаваных СМІ*** на працягу 1990–2010 гг. прадстаўлена у табл. 7. Аналіз дадзеных сведчыць аб рэзкім скарачэнні тыражоў часопісаў у 1991 г. Працэс працягваўся да 1995 г. Толькі ў 2006 г. быў дасягнуты ўзровень 1992 г. Пры гэтым колькасць назваў часопісаў за аналізуемы перыяд узрасла амаль у 5,5 разы. У той жа час дынаміка агульнага разавага тыражу газет выглядае па-іншаму. З 1990 па 1994 г. назіраўся рост, пасля падзення ў 1995 г. тыраж рос да 2001 г. уключна. У наступныя гады назіраліся хістанні з відавочным трэндам да падзення. Неабходна адзначыць і той факт, што ў параўнанні з часопісамі, дзе назіраўся пастаянны рост колькасці назваў выданняў, у сферы газет быў двухгадовы перыяд (2005–2006 гг.) змяншэння колькасці выданняў. Цікава, што ў 1995 г. зменшылася колькасць часопісаў на беларускай мове, аднак колькасць беларускамоўных газет – павялічылася. Пры гэтым, калі ў наступныя гады беларускамоўных часопісаў пабольшала, то ў газетнай сферы паказчык 1995 г. так і не быў дасягнуты. А пачынаючы з 2004 г. назіралася тэндэнцыя да скарачэння.

Па стане на 1 ліпеня 2010 г. у краіне было зарэгістравана 1308 перыядычных выданняў, у тым ліку 667 газет, 605 часопісаў, 36 бюлетэней, 9 каталогаў, 1 альманах (гл. табл. 8). Аналіз прэсы паводле заснавальнікаў дае падставы сцвярджаць аб тэндэнцыі да павелічэння колькасці зарэгістраваных дзяржаўных выданняў. Калі на 1 красавіка 1998 г. налічвалася 264 дзяржаўныя выданні і 751 недзяржаўнае, то на 20 снежня 2002 г. суадносіны складалі адпаведна 369 і 781. У наступныя гады адбыўся істотны рост колькасці недзяржаўных выданнў. Так, па стане на 1 ліпеня 2010 г. было 399 дзяржаўных і 909 недзяржаўных выданняў. За перыяд з 1998 па 2010 г. рост дзяржаўных выданняў склаў 135 адзінак, а недзяржаўных – 158. Заўважна стабілізацыя суадносін дзяржаўных і недзяржаўных выданняў. Калі ў 1998 г. паказчык складаў 1 да 2,8 на карысць апошніх, то ў 2002 г. – 1 да 2,11, а ў 2010 г. – 1 да 2,28.

Прыкметай пачатку 2000-х гг. стала пашырэнне недзяржаўнага сектара ў рэгіёнах. У 2006 г. колькасць такіх рэгіянальных выданняў складала амаль 60 назваў: «Рэгіянальная газета» (Маладзечна, з 1995 г.), «Борисовский курьер» (з 1996 г.), «Принеманские вести» (Ліда, з 1999 г.), «Регион» (Мар'іна Горка, з 2000 г.) і інш. Па дадзеных даследавання IREX PROMEDIA, у 2000 г. «Новую газету Смаргоні» чыталі 93 % дарослага насельніцтва горада, «Газету Слонімскую» – 87 % [812, с. 37].

Нягледзячы на значную перавагу ў колькасных суадносінах недзяржаўных выданняў, на інфармацыйным полі краіны дамінавалі дзяржаўныя. Аб гэтым сведчаць тыражы (табл. 9)



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 7.* **Дынаміка распаўсюджання друкаваных СМІ за перыяд 1990–2010 гг. [360, с. 58; 685, с. 233; 686, с. 90; 691, с. 129; 694, с. 189; 695, с. 255; 696, с. 226; 697, с. 221; 798, с. 56]**

| Год | Часопісы | | | | Газеты | | | | На 1 жыхара | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | колькасць назваў | гадавы тыраж, млн экз. | з іх на бел. мове | гадавы тыраж, млн экз. | назваў | разавы тыраж, млн экз. | з іх на бел. мове | разавы тыраж, млн экз. | часопісаў (гадавы тыраж | газет (разавы тыраж) |
| 1990 | 129 | 54,1 | 36 | 33,3 | 224 | 5,7 | 135 | 2,3 | 5,3 | 0,6 |
| 1991 | 138 | 34,5 | 40 | 16,2 | 282 | 5,8 | 158 | 2,3 | 3,4 | 0,6 |
| 1992 | 155 | 31,7 | 45 | 15,4 | 348 | 6,6 | 183 | 2,4 | 3,0 | 0,6 |
| 1993 | 198 | 22,8 | 66 | 11,3 | 351 | 6,3 | 188 | 2,2 | 2,2 | 0,6 |
| 1994 | 215 | 18,1 | 81 | 8,2 | 424 | 9,1 | 196 | 2,7 | 1,8 | 0,9 |
| 1995 | 225 | 11,5 | 77 | 5,7 | 494 | 8,5 | 210 | 2,7 | 1,1 | 0,8 |
| 1996 | 269 | 11,8 | 99 | 5,3 | 512 | 9,1 | 199 | 2,3 | 1,2 | 0,9 |
| 1997 | 302 | 13,6 | 111 | 5,6 | 558 | 9,3 | 190 | 2,2 | 1,3 | 0,9 |
| 1998 | 318 | 14,7 | 109 | 5,7 | 580 | 10,5 | 199 | 2,4 | 1,5 | 1,0 |
| 1999 | 331 | 15,1 | 112 | 4,7 | 590 | 11,2 | 198 | 2,0 | 1,5 | 1,1 |
| 2000 | 354 | 16,7 | 111 | 4,3 | 610 | 11,4 | 202 | 1,8 | 1,7 | 1,1 |
| 2001 | 394 | 18,9 | 112 | 4,1 | 633 | 12,3 | 199 | 1,5 | 1,9 | 1,1 |
| 2002 | 428 | 20,7 | 122 | 3,4 | 669 | 11,3 | 203 | 1,3 | 2,0 | 0,9 |
| 2003 | 498 | 19,0 | 120 | 3,1 | 711 | 11,4 | 202 | 1,2 | 1,9 | 1,2 |
| 2004 | 535 | 20,9 | 120 | 3,3 | 722 | 10,9 | 198 | 1,1 | 2,1 | 1,1 |
| 2005 | 563 | 28,1 | 120 | 3,4 | 729 | 10,3 | 197 | 1,1 | 2,9 | 1,05 |
| 2006 | 648 | 31,2 | 131 | 3,4 | 697 | 10,5 | 193 | 1,2 | 3,2 | 1,1 |
| 2007 | 714 | 38,1 | 137 | 3,4 | 682 | 10,9 | 185 | 1,1 | 4,0 | 1,1 |
| 2008 | 777 | 41,5 | 143 | 3,4 | 689 | 10,0 | 179 | 1,1 | 4,3 | 1,0 |
| 2009 | 884 | 54,0 | 153 | 3,3 | 700 | 8,7 | 183 | 1,2 | 5,6 | 0,9 |
| 2010 | 885 | 59,1 | 147 | 3,2 | 713 | 8,1 | 185 | 1,2 | 6,2 | 0,8 |

*Табліца 8.* **Звесткі аб рэгістрацыі друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў на 1 ліпеня 2010 г. [248]**

| Колькасць зарэгістраваных друкаваных СМІ – 1308 | | | |
|---|---|---|---|
| Віды выданняў | усяго | дзяржаўныя | недзяржаўныя |
| Газеты | 657 | 212 | 454 |
| Часопісы | 605 | 174 | 406 |
| Бюлетэні | 36 | 12 | 24 |
| Каталогі | 9 | – | 6 |
| Альманахі | 1 | 1 | – |
| Колькасць зарэгістраваных інфармацыйных агенцтваў – 8 | | | |
| З іх | | 2 | 6 |

У 2003 г. супрацоўнікі Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі правялі даследаванне сферы СМІ краіны. Адпаведна яго вынікам, найбольш уплывовай з'яўлялася газета «Беларусь сегодня» («Советская Белоруссия»). Яе пастаянна чыталі 27 % апытаных, час ад часу – 28 %. На другім месцы знаходзілася газета

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Рэспубліка» (8,5 % пастаянных чытачоў і 20 % – час ад часу). На трэцім месцы знаходзіліся «Семь дней» (5,9 % пастаянных і 20 % – час ад часу). Сярод недзяржаўнай прэсы ў тройку лідараў уваходзілі «Народная воля» (адпаведна 3 і 8,8 %), «Свободные новости» (1,9 і 9,2 %), «Белорусская деловая газета» (2 і 9 %) [773, с. 17].

*Табліца 9.* **Тыражы некаторых грамадска-палітычных выданняў на 20 студзеня 2002 г. [219, с. 81–82]**

| Выданне | Падпісны тыраж |
|---|---|
| Дзяржаўныя | |
| «Советская Белоруссия» | 346724 |
| «Звязда» | 58197 |
| «Белорусская нива» | 56497 |
| «Рэспубліка» | 59735 |
| «Народная газета» | 77417 |
| «Знамя юности» | 6492 |
| Недзяржаўныя | |
| «Беларускі час» | 18423 |
| «Белорусская газета» | 2378 |
| «Белорусская деловая газета» | 7356 |
| «Белорусский рынок» | 3712 |
| «Народная воля» | 18608 |
| «Свободные новости» | 4810 |
| «Товарищ» | 2314 |

Як бачна, па папулярнасці сярод дзяржаўных газет вылучалася «Советская Белоруссия». Інфармацыю аб тым, якім чынам газета на працягу дастаткова працяглага перыяду з'яўлялася самай значнай па тыражы, даюць выказванні галоўнага рэдактара «Гомельскай праўды» В. М. Логвіна на рэспубліканскай нарадзе рэдактараў дзяржаўных газет (Мінск, сакавік 2000 г.). Кіраўнік абласной газеты заявіў, што «Советской Белоруссии» дзяржава ставарае «парніковыя» ўмовы. З-за празмерных фінансавых датацый газета мае магчымасць дэмпінгавай падпісной цаной зманьваць небагатага чытача ў свой актыў. Чытачы ў большасці сваёй не маглі дазволіць сабе выпісваць па некалькі выданняў. І тое, што для аднаго з выданняў ствараліся лепшыя ўмовы, не ішло на карысць ні выдаўцу, ні газеце. «У Гомелі наша газета мае ў 1,7 разы больш падпісчыкаў, чым «Советская Белоруссия». І тыя, хто хацеў бы данесці да чытача інфармацыю праз адну газету, я перакананы, робяць вялікую памылку. "Парніковы эфект" уносіць дысгармонію ў інфармацыйную прастору», – заяўляў В. М. Логвін [381].

Акрамя падпіскі газеты рэалізоўваліся праз рознічны гандаль. Пры гэтым, калі доля паступлення ў розніцу дзяржаўных выданняў была нязначная (напрыклад, у ліпені 2001 г. з агульнага тыражу ў 351 195 экз. «Советской Белоруссии» ў розніцу паступіла толькі 6896 экз.), то незалежныя газеты ў асноў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным распаўсюджваліся праз кіёскі (у студзені 2002 г. з агульнага тыражу «Белорусской газеты» ў 17 300 экз. у розніцу паступіла 14 922 экз.). Аналіз звестак па спісанні газет дзвюх груп дастаткова добра характарызуе зацікаўленасці спажыўцоў, а таксама сведчыць аб больш аператыўнай, мэтанакіраванай рабоце выданняў, якія не фінансаваліся з дзяржаўнага бюджэту (табл. 10). Па меркаванні С. В. Дубовіка, такі стан рэчаў сведчыў аб тым, што ў краіне адбываўся «плаўны пераход рэгулярных аўдыторый дзяржаўных газет да альтэрнатыўных» [219, с. 88].

*Табліца 10.* **Дадзеныя па рэалізацыі тыражоў некаторых выданняў на снежань 2002 г. [219, с. 88]**

| Выданне | Тыраж на рэалізацыю ў Мінску, тыс. экз. | Спісанне ў Мінску, % | Найбольшы % спісання, вобласць |
|---|---|---|---|
| «Звязда» | 10,1 | 4,94 | 30,8 (Гомельская) |
| «Народная газета» | 39,2 | 14,12 | 12,5 (Мінская, Віцебская) |
| «Рэспубліка» | 66,8 | 23,36 | 34,5 (Гомельская) |
| «Советская Белоруссия» | 16,1 | 15,39 | 21,59 (Магілёўская) |
| «Белорусская деловая газета» | 10,45 | 13,19 | 8 (Брэсцкая) |
| «Белорусская газета» | 29,8 | 1,3 | 7–10 |
| «Народная воля» | 168 | 0,9 | 7,27 (Віцебская) |
| «Свободные новости плюс» | 42,5 | 1,16 | 5 (сярэдні паказчык па абласцях) |

У пачатку XXI ст. суадносіны цэнтральнай і рэгіянальнай прэсы практычна зраўняліся. Так, у 2006 г. яны былі наступныя: 971 тыс. экз. рэгіянальнай прэсы і 850 тыс. экз. рэспубліканскай. З пачатку XXI ст. назіралася тэндэнцыя да паступовага павелічэння колькасці прыбытковых выданняў. Калі ў 2000 г. з прыбыткам працавалі 10, у 2001 г. – 11, то ўжо ў 2002 г. – 21, а ў 2006 г. – 30 рэдакцыйных калектываў [218, с. 63].

Па выніках сацыялагічных апытанняў у 2009 г. сярод газет, якія выпісвалі, лідзіруючыя пазіцыі займалі раённыя газеты (55,3 %). На другім месцы знаходзілася «Саветская Белоруссия» (46,2 %). У недзяржаўным сектары найбольш прыхільнікаў мелі «Комсомольская правда в Белоруссии» (28,5 %) і «Аргументы и факты в Белоруссии» (24,5 %). Такі ж парадак размеркавання быў і пры адказе на пытанне «Якія газеты Вы часцей за ўсё чытаеце?» – адпаведна 29,6 %, 28,7, 25,1, 20,1 %. Калі гаварыць аб набыцці выданняў, то на першым месцы была «Комсомольская правда в Белоруссии» (44,7 %). На другім месцы з істотным адрывам – «Советская Белоруссия» (34,2 %). Ёй мала саступалі «Аргументы и факты в Белоруссии» (33,0 %) і раённыя газеты (28,3 %) [682, с. 54, 55].

Найбольш станоўчых якасцей чытачы адзначылі ў «БелГазеты» (89,1 %), «Советской Белоруссии» (86,4 %), «Обозревателе» (84,7 %), «Аргументах и фактах в Белоруссии» (83,5 %), абласных газетах (82,5 %), «Рэспубліцы» (82,5 %). Найбольш актуальныя і значныя матэрыялы, на думку апытаных, на сваіх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старонках друкавалі раённыя і абласныя газеты. Аб'ектыўнасць і даставернасць асвятляемых падзей у найбольшай ступені былі ўласцівы такім газетам, як «Обозреватель», «Знамя юности», «Белорусская нива», «БелГазета», «Звязда», «Советская Белоруссия», «Аргументы и факты в Белоруссии», абласным газетам. Побач з гэтым удзельнікі апытання лічылі, што скажэнне інфармацыі прысутнічала ў «Народнай волі», раённых газетах, «Комсомольской правде в Белоруссии». Для апошняй, па меркаванні чытачоў, таксама былі характэрны пагоня за сенсацыяй, «смажанымі» фактамі і неістотныя тэмы. Нягледзячы на гэта, дадзеная газета побач з «Обозревателем», «Советской Белоруссией», «Аргументами и фактами в Белоруссии», «Рэспублікай» аргументавана і пераканаўча прадстаўляла інфармацыю [682, с. 58].

Удзельнікі апытання адзначылі, што артыкулы такіх выданняў, як «Комсомольская правда в Белоруссии», «Обозреватель», «Аргументы и факты в Белоруссии», «Народная воля» прадстаўлялі розныя пункты погляду, а раённыя газеты падавалі матэрыял аднабока. Практычна адсутнічалі крытычныя артыкулы ў «Знамени юности», «Звяздзе», «Белорусской ниве» [682, с. 58].

Звыш паловы чытачоў (55,0 %) ацэньвалі якасць беларускіх газет і часопісаў як «сярэдняе», і толькі 22,4 % выставілі адзнаку «высокае». Толькі 7 % апытаных пазначылі нізкую якасць друкаваных СМІ. Сярод недахопаў называліся: адсутнасць новых ідэй, неаб'ектыўнасць асвятлення падзей (залішняя ідэалагізацыя падачы матэрыялу). Адзначалася нязначная колькасць публікацый, якія прымушалі чытача думаць, ігнараванне рэальных праблем, аднастайнасць і штампы ў падачы матэрыялу [682, с. 59].

Нягледзячы на недахопы, чытачы найперш давяралі такім газетам, як «Советская Белоруссия» (54,1 %), «Рэспубліка» (52,3 %), абласным і раённым газетам (адпаведна 51,1 і 48,0 %). Значна меншы ўзровень даверу быў да недзяржаўнай прэсы: ад 43 % у «Аргументов и фактов в Белоруссии» да 23 % у «БелГазеты». Пры гэтым да недзяржаўнай прэсы быў большы недавер: «Наша ніва» і «БелГазета» атрымалі прыкладна па 11 %. «Народнай волі» выказаў недавер кожны пяты апытаны [682, с. 59–60].

Змены закранулі не толькі сістэму перыядычных выданняў але і *структуру кіравання* гэтым сегментам дзяржаўнай культурнай палітыкі. У студзені 1992 г. былі ліквідаваны дзяржаўныя камітэты Рэспублікі Беларусь па друку, па тэлебачанні і радыёвяшчанні. На іх базе было створана Міністэрства інфармацыі. Яно праіснавала да сакавіка 1994 г., калі было аб'яднана з Міністэрствам культуры. Аб'яднанне было нядоўгім. Ужо ў лістападзе 1995 г. адбыўся падзел адзінага органа на Міністэрства культуры і Дзяржаўны камітэт па друку. З верасня 2001 г. апошні быў пераўтвораны ў Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. На яго былі ўскладзены функцыі дзяржаўнага рэгулявання ў сферы перадачы і распаўсюджання інфармацыі.

Журналісты краіны ў даследуемы перыяд мелі магчымасць удзелу ў двух *прафесійных грамадскіх аб'яднаннях* – Беларускім саюзе журналістаў (заснаваны ў 1959 г.) і Беларускай асацыяцыі журналістаў (БАЖ, створана ў 1995 г.). Дадзе-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя арганізацыі выконвалі функцыі абароны правоў і інтарэсаў сваіх сяброў, удзельнічалі ў вырашэнні канфліктаў, займаліся распаўсюджаннем ведаў.

Асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў галіне сродкаў масавай інфармацыі былі закладзены ў ***Законе 1995 г. «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі»*** [517]. У 2008 г. ён быў прыняты ў новай рэдакцыі і з новай назвай – «Аб сродках масавай інфармацыі» [556]. Асноўнымі прынцыпамі дзейнасці СМІ ў Беларусі закон 2008 г. абвяшчаў дакладнасць, законнасць інфармацыі, роўнасць усіх суб’ектаў (фізічных і юрыдычных асоб) на распаўсюджанне і атрыманне масавай інфармацыі, павагу правоў і свабод чалавека, разнастайнасць меркаванняў, развіццё нацыянальнай культуры, абарону маралі, выкананне нормаў прафесійнай этыкі журналістамі і прынятых нормаў маралі. Асобныя артыкулы прысвечаны дэкларацыі свабоды меркаванняў, перакананняў і іх свабоднаму выражэнню (арт. 5), недапушчальнасці манапалізацыі СМІ (арт. 6) і незаконнага абмежавання свабоды апошніх (арт. 7).

Імкненне дзяржавы да кантролю за дзейнасцю прэсы спачатку адбілася на рэспубліканскіх газетах. У снежні 1994 г. кіраўніцтва выдавецтва «Беларускі дом друку» ў адпаведнасці з распараджэннем Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь адмовілася друкаваць звярстаныя і накіраваныя ў друк нумары нацыянальных газет «Звязда», «Советская Белоруссия», «Рэспубліка» з тэкстам дакладу дэпутата Вярхоўнага Савета С. Антончыка. 22 і 23 снежня 1994 г. гэтыя нумары газет выйшлі з пустымі старонкамі на месцы меркаванага дакладу. Два нумары парламенцкай газеты «Народная газета», якая таксама размясціла даклад, наогул не выйшлі[1].

У студзені 1995 г. рыхтаваўся зварот дэпутатаў Вярхоўнага Савета XII склікання ў Канстытуцыйны суд з просьбай разглядзець на прадмет канстытуцыйнасці распараджэнне кіраўніка спраў Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь У. Лазоўскага аб забароне на пралангацыю дагавораў выдавецтва «Беларускі дом друку» з шэрагам рэспубліканскіх выданняў [642].

4 студзеня 1995 г. выйшла распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь *«Аб некаторых пытаннях дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі».* У адпаведнасці з ім кіраўнікі сродкаў масавай інфармацыі, якія датаваліся з дзяржаўнага бюджэту, заснавальнікамі якіх з’яўляліся дзяржаўныя органы, былі пераведзены на кантрактную сістэму найму. Галоўных рэдактараў рэспубліканскіх перыядычных выданняў, фінансаваных з дзяржаўнага бюджэту, за выключэннем газет «Звязда», «Советская Белоруссия», «Народная газета», часопіса «Беларуская думка», пачаў прызначаць Урад па ўзгадненні з Адміністрацыяй Прэ-

[1] У далейшым выпадкі з’яўлення «белых плямаў» паўтараліся. Аднак яны тычыліся недзяржаўнай прэсы. Напрыклад, 20 снежня 2000 г. «Наша свабода» выйшла з белымі плямамі на месцы сатырычна-гумарыстычнага раздзелу «Stinger». Кіраўніцтва друкарні «Мэджык» адмовілася друкаваць гэта раздзел з-за прэтэнзій з боку прадстаўнікоў Дзяржкамдруку да папярэдняга выпуску газеты. 31 жніўня 2001 г. з «белымі плямамі» выйшлі два спецвыпускі «Предпринимательской газеты». Публікацыю артыкулаў «Послание соотечественникам» и «А ты уже дал свое согласие стать соучастником преступления?» забараніў друкаваць першы намеснік старшыні Дзяржкамдруку У. Глушакоў, які выконваў абавязкі дырэктара прыватнай друкарні «Мэджык».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зідэнта Рэспублікі Беларусь. Да 1 лютага 1996 г. былі перагледжаны колькасць, структура і склад заснавальнікаў перыядычных выданняў, датаваных з бюджэту. Статус абласных, гарадскіх, аб'яднаных і раённых газет, заснавальнікамі якіх з'яўляліся выканаўчыя камітэты, быў вызначаны як выданняў гэтых органаў. Пры гэтым галоўныя рэдактары пазначаных газет пачалі зацвярджацца выканкамамі мясцовых органаў улады і былі прыраўняны па ўзроўні заробку да начальнікаў адпаведных упраўленняў (аддзелаў) культуры выканкамаў. Ураду сумесна з Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь было даручана аснасціць раённыя і гарадскія газеты, заснавальнікамі якіх з'яўляліся выканкамы, камп'ютарнай тэхнікай і ўключыць іх у інфармацыйную сістэму Беларускага тэлеграфнага агенцтва. Гарадскія і раённыя тыпаграфіі былі перададзены выканкамам. Дзяржаўныя рэспубліканскія і мясцовыя СМІ пачалі цэнтралізавана забяспечвацца паперай праз Дзяржаўны камітэт па друку. Было ўстаноўлена мэтавае дзяржаўнае размеркаванне выпускнікоў факультэта журналістыкі БДУ ў раённыя і гарадскія газеты. На працягу студзеня–лютага 1996 г. Дзяржкамітэтам па друку была праведзена перарэгістрацыя перыядычных выданняў; недзяржаўных тэлерадыёкампаній – у Дзяржаўнай камісіі па радыёчастотах.

У канцы 1997 г. асобнай пастановай (Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 снежня 1997 г. № 1591) пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь была створана Грамадская рада па спрэчных пытаннях, якія ўзнікалі ў працэсе прымянення Закона «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі». Адпаведна Палажэнню аб дадзеным органе (зацверджана Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 19 студзеня 1998 № 59), ён з'яўляўся кансультатыўна-аналітычным і меў мэту аказання садзейнічання кампетэнтным дзяржаўным органам у правільным прымяненні Закона аб друку і больш поўнай рэалізацыі яго патрабаванняў адносна перыядычных друкаваных выданняў. Рада магла выносіць заключэнні аб наяўнасці (адсутнасці) у матэрыялах, надрукаваных ў перыядычным друку, парушэнняў патрабаванняў артыкула 5 Закона «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі», уносіць прапановы ва Урад краіны аб удасканаленні заканадаўства аб друку. Рада дзейнічала на грамадскіх пачатках[1].

Дзяржава працягвала аказваць *дапамогу сацыяльна значымым перыядычным выданням*. З рэспубліканскага бюджэту праз Міністэрства інфармацыі выдзяляліся фінансавыя субсідыі рэдакцыям дзіцячых, маладзёжных, літаратурна-мастацкіх і культуралагічных, адукацыйных, спецыялізаваных і шэрагу грамадска-палітычных выданняў. Пералік дадзеных выданняў пастаянна змяншаўся. Калі ў 2001 г. субсідзіравалася 47 газет і часопісаў, то ў 2008 г. – 30 [86]. Практычна поўнасцю арыентаванымі на бюджэтныя субсідыі былі рэдакцыі часопісаў «Першацвет», «Маладосць», «Крыніца», газеты «Культура», «Літаратура і мастацтва» і інш. Яны ж мелі вельмі нязначную індывідуальную

[1] У новым Законе «Аб сродках масавай інфармацыі» 2008 г. было прадугледжана стварэнне грамадскай Каардынацыйнай рады ў сферы масавай інфармацыі (арт. 28). Рашэнні дадзенага органа мелі рэкамендацыйны характар.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падпіску (на першы квартал 2002 г.): «Полымя» – 298, «Всемирная литература» – 152, «Культура» – 163 падпісчыкі [219, с. 89].

У 2002 г. у Беларусі для аптымізацыі выпуску культуралагічных, літаратурных і мастацкіх перыядычных выданняў былі створаны рэдакцыйна-выдавецкія ўстановы «Літаратура і мастацтва» і «Культура і мастацтва». Першая аб'яднала рэдакцыі літаратурна-мастацкіх выданняў «Літаратура і мастацтва», «Полымя», «Маладосць», «Неман», «Всемирная литература». У склад другой увайшлі рэдакцыі газеты «Культура» і часопіса «Мастацтва».

Другім напрамкам клопату дзяржавы была *рэгіянальная прэса*. У пачатку 1990-х гг. агульны тыраж абласных, гарадскіх і раённых газет значна саступаў тыражу рэспубліканскіх грамадска-палітычных выданняў. У 1999 г. у Адміністрацыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь быў прааналізаваны ўвесь комплекс праблем абласных, гарадскіх і раённых газет. Па выніках было выдадзена распараджэнне аб выдзяленні рэдакцыям матэрыяльных сродкаў на ўмацаванне іх матэрыяльна-тэхнічнай базы і набыццё аўтатранспартных сродкаў. У 2000 г. пабачыла свет распараджэнне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, якое ўжо датычыла вырашэння падобных праблем «рэдакцый газет і часопісаў, якія фінансуюцца з бюджэту» [217, с. 123].

Аб наступствах падтрымкі прэсы дзяржавай у 2000 г. выказваўся даследчык В. І. Дубовік, аналізуючы раённы друк: «гэта дапамога можа стацца "сабе даражэй": бо не сакрэт, што датацыі, крэдыты, субсідыі і г. д. – палка з двума канцамі: з аднаго боку, без іх выданню цяжка выжыць, а з другога – з імі яно лёгка падпадае пад уплыў, які вызначае яго пазіцыю. Такое аб'ектыўнае становішча дзяржаўнай прэсы – быць паміж молатам (уладай) і кавадлам (грамадствам)» [217, с. 123].

Даследаванне было б няпоўным без асвятлення праблемы ***ўзаемаадносін дзяржавы і недзяржаўных (прыватных, альтэрнатыўных) СМІ***. Неабходна адзначыць, што сам працэс станаўлення прыватнага сектара СМІ ў вывучаемы перыяд меў негатыўныя моманты. Імкненне журналістаў такіх выданняў да пошуку сенсацыі прыводзіла да публікацыі неправераных звестак. Гэта, у сваю чаргу, выклікала судовыя позвы да журналістаў і выданняў[1]. Палітычная

[1] Першай газетай, якая спыніла сваё існаванне не па сваёй волі, была «Свабода». У лістападзе 1997 г. рашэннем Вярхоўнага гаспадарчага суда была анулявана яе рэгістрацыя за парушэнні ў адпаведнасці з артыкулам 5 Закона «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі». У жніўні 2002 г. было спынена выданне газеты «Наша свабода». У дадзеным выпадку гэта адбылося з-за судовай позвы на той час старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю А. Тозіка да газеты і яе журналіста за паклёп. Сумы выплат з'явіліся спусташальнымі для выдання. Па рашэнні гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці ў лістападзе 2001 г. была зачынена газета «Пагоня». А ў чэрвені 2002 г. яе галоўны рэдактар М. Маркевіч і журналіст П. Мажэйка былі прыгавораны да абмежавання свабоды (адпаведна да двух з паловай і двух гадоў) у адпаведнасці з артыкулам 367 Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь (паклёп у адносінах да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь). Па гэтым жа артыкуле да двух гадоў абмежавання свабоды быў прыгавораны рэдактар газеты «Рабочий» В. Івашкевіч. У 2004 г. «Белорусская деловая газета» па рашэнні суда павінна была выплаціць позву за паклёп. У 2005 г. газета не прайшла перарэгістрацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заангажаванасць асобных выданняў, іх адкрытая дэманстрацыя апазіцыйнасці, відавочная тэндэнцыйнасць прыводзіла да адлучэння іх ад паліграфічнай базы і сістэмы распаўсюджання. Аналізуючы працэсы, якія адбываліся ў сферы альтэрнатыўных СМІ, даследчык С. В. Дубовік гаварыў аб ператварэнні іх у спецыфічную групу з наступнымі характэрнымі рысамі: ярка выяўленая кланавасць; завышаная патрабавальнасць да сваёй краіны; некрытычнасць у адносінах да сябе; адсутнасць высокапрафесійных кадраў; наяўнасць замежнага ўплыву; кругавая парука [217, с. 58]. Ён звяртаў увагу на тую акалічнасць, што «сістэма масмедыйных выданняў такога тыпу даўно ператварылася ў дзейсны палітычны інструмент барацьбы з існуючым у краіне грамадска-палітычным ладам, гэта адна з найбольш выніковых структур усёй беларускай апазіцыйнай сістэмы» [217, с. 59].

Яшчэ ў сакавіку 1995 г. у інтэрв’ю газеце «Звязда» тагачасны начальнік Галоўнага ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі Адміністрацыі Прэзідэнта У. Замяталін на пытанне аб тым, якія б былі дзеянні Прэзідэнта, калі б у прыватных газетах з’явіліся публікацыі ці лісты, кшталту надрукаванага ў «Народнай газеце» «Ліста да Прэзідэнта»[1], адказаў наступным чынам: «Першае, што, як мне здаецца, ён зрабіў бы – прапанаваў бы Міністэрству культуры і друку скасаваць дагавор з рэдакцыямі гэтых газет па іх распаўсюджванні. І, зразумела, наступнае – гэта дзеянні, якія не дазволілі б гэтым рэдакцыям друкаваць свае выданні на дзяржаўнай паліграфічнай базе» [793]. Сам жа Прэзідэнт у сваім выступленні перад дэпутатамі Вярхоўнага Савета адзначыў: «Хацеў бы спадзявацца, што з інцыдэнту з “Народнай газетай” сур’ёзныя вывады зробяць і іншыя сродкі масавай інфармацыі рэспублікі. Са свайго боку я заяўляю, што не дапушчу разгулу, паклёпу, шэльмавання, інтрыганства на тэлебачанні, радыё і ў друку, як бы дорага ні аплочваліся гэтыя брудныя акцыі зацікаўленымі коламі» [436]. У працяг думкі прывядзём яшчэ адно выказванне У. Замяталіна: «Дзяржава, калі яна, канешне, сапраўдная, павінна ўлічваць тое, што ў свеце існуе такое паняцце, як інфармацыйная бяспека. Сёння роля яе невымерна ўзрасла і ў нейкім сэнсе зраўнялася з праблемай бяспекі ў цэлым. Гэта палітычнае пытанне, яно ў нейкай меры тычыцца як дзяржаўных, так і недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Для рашэння яго існуюць пэўныя палажэнні Канстытуцыі, закон аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі. На жаль, нашы выдаўцы, рэдактары і журналісты не жадаюць лічыцца з законам. Даводзіцца ім нагадваць аб гэтым» [152, с. 6].

У пачатку XXI ст. дзяржава працягвала змагацца з парушэннямі ў недзяржаўных сродках масавай інфармацыі. У канцы 2005 – у пачатку 2006 г. з рэдакцыямі найбольш палітычна заангажаваных недзяржаўных выданняў скасавалі дамовы прадпрыемствы «Белпошты» і сістэмы Саюздруку. Таксама папоўніўся спіс выданняў, якім адмовілі ў друкаванні айчынныя друкарні. Па падліках Беларускай асацыяцыі журналістаў у падпісныя каталогі «Белпошты»

[1] За дадзеную публікацыю ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь быў зняты са сваёй пасады галоўны рэдактар парламенцкай газеты «Народная газета».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на 2006 г. не трапіла 16 недзяржаўных выданняў («Народная воля», «Товарищ», «Салідарнасць», «Згода», «Витебский курьер М», «БДГ. Деловая газета», «Наша ніва», «Борисовские новости», «Інтэкс-прэс», «Ганцавіцкі час» і інш.). 19 прыватных газет (у тым ліку названыя вышэй) па стане на канец 2005 г. страцілі магчымасць распаўсюджвання праз кіёскі «Белсаюздруку»[1].

Асобныя рэдакцыі спрабавалі наладзіць уласную сістэму распаўсюджвання. Аднак у адпаведнасці з Законам «Аб паштовай сувязі» з 1 мая 2004 г. было ўведзена абавязковае ліцэнзаванне паслуг сувязі, сярод якіх – правядзенне падпіскі на перыядычныя выданні і дастаўкі іх чытачам. Існаваўшыя сістэмы недзяржаўнага распаўсюджання (прадпрыемства «Марат», ТАА «Выдавецкі дом "Інтэкс-прэс"), якія самі выпускалі газеты, арганізоўвалі падпіску і распаўсюджанне, былі пазбаўлены ліцэнзій на апошнія два віды дзейнасці. У гэтым кроку дзяржавы было відавочнае парушэнне артыкула 25 Закона «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі», які дэклараваў: «распаўсюджанне прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі здзяйсняецца рэдакцыяй непасрэдна або на дагаворных ці іншых законных падставах прадпрыемствамі сувязі, дзяржаўнымі, кааператыўнымі арганізацыямі і грамадскімі аб'яднаннямі, а таксама грамадзянамі».

Вяртанне недзяржаўнай прэсы ў дзяржаўныя сістэмы распаўсюджвання і практыка прымянення заканадаўства ў барацьбе з экстрэмізмам былі галоўнымі тэмамі размовы кіраўніцтва Беларускай асацыяцыі журналістаў з памочнікам прэзідэнта, начальнікам Галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта У. Янчэўскім 26 лістапада 2008 г. Першым яе вынікам стала вяртанне ў дзяржаўную сістэму распаўсюджання і падпісныя каталогі газет «Наша ніва» і «Народная воля».

Сектарам, у якім дзяржава доўгі час не магла наладзіць кантроль, была сусветная сетка ***Інтэрнэт***. Першай дзяржаўнай газетай, якая пачала прадстаўляць сваю Інтэрнэт-версію з 24 ліпеня 1996 г., стала газета «Вечерний Минск». У 1999 г. побач з сайтамі цэнтральных рэспубліканскіх газет існавалі сайты рэгіянальных выданняў («Новая газета Сморгони», «Газета Слонімская», «Витебский курьер») [137].

Па дадзеных каталогаў «Акавіта», «Tut.by», «Open.by» і інш., колькасць перыядычных выданняў, прадстаўленых у сетцы, на пачатак 2005 г. не перавышала 150–170, у той час як зарэгістраваных друкаваных перыядычных выданняў на той час было больш за 1200. Першае сеткавае інфармацыйна-аналітычнае выданне «Беларускія навіны» (www.naviny.by) з'явілася 1 верасня 2002 г. У ім было каля паўтара дзясятка рубрык. Абнаўленне адбывалася штодзённа. Навіны з'яўляліся кожныя 15–20 хвілін. У верасні 2004 г. з'явілася выданне «Краіна. BY» (www.kraina.by), якое таксама мела грамадска-палітычную накіраванасць.

[1] Толькі «Рэгіянальная газета» (Маладзечна) дамаглася вяртання ў кіёскі саюздруку Мінскай вобласці (магчыма, паспрыялі шматлікія лісты абураных чытачоў у інстанцыі). Але распаўсюджванне «Рэгіянальнай газеты» абцяжарыла тое, што яе перавялі з рэспубліканскага каталога ў мінскі абласны (газету ж выпісвалі і ў Гродзенскай вобласці, і нават у сталіцы).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да дзяржаўных сеткавых СМІ адносіліся сайты інфармацыйнага агенцтва «БелТА» (www.belta.by), Нацыянальнага прэс-цэнтра (www.bpc.by) і інш. [183, с. 25].

С. В. Дубовік характарызаваў інтэрнэт-СМІ не толькі як эфектыўны спосаб падачы інфармацыі, але і як надзвычай дзейсны і перспектыўны інструмент уздзеяння на грамадзян [219, с. 177]. Некаторыя даследчыкі выказвалі меркаванне аб неабходнасці распрацоўкі прававых асноў развіцця сеткавых СМІ, патрабавання аб замацаванні на ўзроўні закона паняццяў «сайт сеткі Інтэрнэт», «электронная версія традыцыйнага СМІ», «сеткавы СМІ» [183, с. 26–27].

Аб значэнні інтэрнэт-версій перыядычных выданняў у жыцці грамадства сведчыць намер дзяржавы ўпарадкаваць іх рэгістрацыю. Шмат дыскусій выклікала наступнае палажэнне прынятага ў 2008 г. Закона «Аб сродках масавай інфармацыі» (ч. 2 арт. 3): «дзеянне дадзенага Закона распаўсюджваецца на аналагі друкаваных, тэлевізійных і радыёвяшчальных сродкаў масавай інфармацыі, якія распаўсюджваюцца праз глабальную камп'ютарную сетку Інтэрнэт, за выключэннем патрабаванняў аб дзяржаўнай Рэгістрацыі сродкаў масавай інфармацыі». У частцы 1 артыкула 11 дадзенага закона агаворвалася, што парадак рэгістрацыі СМІ, якія распаўсюджваюцца праз Інтэрнэт, павінен быць вызначаны Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Толькі ў красавіку 2010 г. была прынята пастанова Савета Міністраў аб парадку дзяржаўнай рэгістрацыі інфармацыйных сетак, сістэм і рэсурсаў нацыянальнага сегменту глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь [512]. Адпаведна гэтаму нарматыўнаму прававому акту ў краіне быў створаны Дзяржаўны рэестр, рэгістрацыі ў якім падлягалі сярод іншага і інтэрнэт-сайты.

Значныя змены перажыло **тэлебачанне.** У інфармацыйнай прасторы былі створаны перадумовы для развіцця рынку тэлепраграм, пашырыліся магчымасці для адкрыцця і функцыянавання новых каналаў розных форм уласнасці. У 1994 г. была створана Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь. З 1 студзеня 1993 г. Дзяржтэлерадыёкампанія Беларусі стала правадзейным членам Еўрапейскага вяшчальнага саюза. Побач з ёй у краіне дзейнічалі недзяржаўныя тэлевізійныя каналы ў рэгіёнах і асобных гарадах. У першай палове 1990-х гг. іх налічвалася каля 150 [648, с. 67].

Уласныя праграмы на той час мелі толькі 25 недзяржаўных тэлекампаній. Найбольш адметнымі з іх былі дзве незалежныя тэлекампаніі – «ФІТ» і «Свой круг». Яны рыхтавалі такія перадачы, як «Эканамікст», «Галерэя», «Абібок», «Праспект».

На сярэдзіну 1990-х гг. прыпадае маса рэарганізацый і перабудоў. Мяняюцца рубрыкі, перапрацоўваецца сетка вяшчання, расце колькасць забаўляльных праграм, узрастае цікаўнасць да крымінальных праграм. Камерцыялізацыя эфіру прыводзіць да рэзкага павелічэння долі рэкламных матэрыялаў [648, с. 68].

Пастаянныя рэарганізацыі прывялі не проста да знікнення з экранаў вядомых перадач, але і звальнення вопытных журналістаў. На нізкі ўзровень



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вяшчання сваё ўздзеянне аказвалі недастатковы вопыт маладых кадраў, а таксама захаванне старых метадаў працы.

У 1995 г. тагачасны старшыня Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі Г. Кісель у інтэрв'ю газеце «Рэспубліка» адзначаў прычыны таго, што «на фоне "Астанкіна" і Расійскага тэлебачання наша тэлерадыёкампанія глядзіцца бледна»: «Расія, Масква з'яўляліся стрыжнем Саюза, усе фінансавыя, тэхнічныя, інтэлектуальныя сродкі накіроўваліся менавіта туды. Калі СССР разваліўся, мы засталіся, вобразна кажучы, у чым нарадзіліся, – не хапае кваліфікаваных кадраў, няма тэхнічнага аснашчэння, вопыту вяшчання на нацыянальнай тэрыторыі. Адсюль усе беды і праблемы. Плюс да вышэйсказанага: частка здольных, творчых работнікаў сышлі з нашай сістэмы, знайшоўшы больш высокааплочваемыя месцы. Калі дадаць, што апошняе тэхнічнае пераўзбраенне тэлебачання праводзілася амаль дваццаць гадоў таму, то многа хто зразумее, у якім становішчы мы цяпер знаходзімся» [662].

У эфірнай сетцы з'явілася шмат перадач, прысвечаных гісторыі і культуры Беларусі, – «Беларускія каляды», «Тэлесябрына», «Спадчына», «Галасы мінулага», «Багацце беларускай гісторыі».

У пачатку 1990-х гг. з'явіліся новыя рубрыкі, а ў 1993 г. трыма рэспубліканскімі міністэрствамі (інфармацыі, культуры і сувязі) быў абвешчаны творчы конкурс пад назвай «Адкрыты тэлеканал». Яго мэтай было далучэнне да асваення нацыянальнай інфармацыйнай прасторы дзяржаўных і недзяржаўных інфармацыйных структур, журналістаў, іншых творчых работнікаў.

У 1990-я гг. паступова адбываецца тэхнічнае пераабсталяванне тэлебачання, значна пашыраецца аб'ём вяшчання.

Перыяд канца 1990-х гг. стаў часам кардынальных, структурна-творчых пераўтварэнняў. Адбываецца значнае абнаўленне тэлеэфіру. У ім з'яўляюцца значныя дыскусійныя праграмы – ток-шоу «Карамболь», «Гэта мая праца», «Рэзананс», «Спажывецкая карзіна», «Палітычныя дыскусіі», «Сядзіба», «Крымінальная хроніка», «Беларускі хіт-парад», праграмы пад агульнай назвай «Кантакт», прамыя лініі, дэбаты.

Да 1998 г. на Беларускім тэлебачанні выходзілі навучальныя перадачы для сярэдняй школы па беларускай літаратуры, гісторыі і геаграфіі, а таксама існавала рубрыка «Педагагічны экран» і відэакурсы для тых, хто вывучае замежныя мовы.

Значныя змены не прывялі да чаканага выніку. Назіралася падзенне глядацкай аўдыторыі. Калі ў 1997 г. перадачы беларускага тэлебачання глядзелі 12 % тэлегледачоў, то ў 2000 г. – толькі 9 % [648, с. 72].

У 2000 г. Беларускае тэлебачанне атрымоўвае назву Першага нацыянальнага тэлеканала. З восені на канале пачалі праводзіць новую канцэпцыю вяшчання, якая прывяла да значнага скарачэння супрацоўнікаў і павелічэння канкурэнцыі. У эфіры з'явілася ранішняя праграма «Добрай раніцы, Беларусь!», перадачы «Зона Х», «Вялікі сняданак», «Адысея каманды Кухто» і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для паляпшэння інфармавання насельніцтва было створана Агенцтва тэлевізійных навін (АТН) – асноўны інфарматар і інтэрпрэтатар падзей у краіне і за яе межамі.

Калі ў сярэдзіне 1990-х гг. праграмная палітыка Беларускага тэлебачання будавалася паводле сістэмы «інфармацыя – спорт – музыка», то ў 2000 г. былі ўведзены чатыры прыярытэтныя напрамкі: інфармацыйны, грамадска-палітычны, мастацкі і спартыўны.

З сярэдзіны 1990-х гг. ішла размова аб адкрыцці другога нацыянальнага тэлеканала. Аб гэтым у згаданым вышэй інтэрв'ю гаварыў Г. Кісель: «Найбольш верагодна, што з наступнага года мы пачнем двух-трохчасавое вяшчанне ў суткі на другім канале і будзем паступова яго нарошчваць. Аднак зноў-такі неабходны частоты. Значыць, неабходна будзе прыбіраць які-небудзь расійскі канал. "Астанкіна" і "Расія" – выключаюцца. Па-першае, рашэнне па ім павінна прымацца на ўзроўні прэзідэнтаў. Па-другое, нашы людзі ўжо прывыклі да гэтых каналаў, і я, напрыклад, лічу не маю права пазбаўляць іх той інфармацыі, якую яны атрымліваюць» [662].

Сітуацыя змянілася ў пачатку 2000-х гг. У кіраўніцтва дзяржавы змяніліся погляды на трансляцыю на суверэннай тэрыторыі Беларусі замежных расійскіх каналаў, вяшчальная палітыка (у першую чаргу інфармацыйная) якіх не адпавядала дзяржаўным інтарэсам Беларусі. Ужо не звярталася ўвага на тое, што «нашы людзі прывыклі да гэтых каналаў» і на тое, што «не маем права пазбаўляць іх той інфармацыі, якую яны атрымліваюць». Менавіта апошняе адыграла вырашальную ролю пры прыняцці непапулярных рашэнняў.

У 2001 г. пачаў дзейнічаць новы тэлеканал – Сталічнае тэлебачанне (СТБ). У 2002 г. у эфір выйшлі перадачы Агульнанацыянальнага тэлебачання (АНТ). У гэтым жа годзе быў адкрыты Першы музычны канал. У 2003 г. да названых далучыўся канал «Лад». Уласнае вяшчанне на Беларусь у 2004 г. адкрыла міждзяржаўная тэлерадыёкампанія «Мір». У 2005 г. быў створаны новы міжнародны спадарожнікавы канал «Беларусь-ТБ», арыентаваны на замежных гледачоў.

У 2002 г., па дадзеных апытання, праведзенага Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі, амаль палова апытаных не мела магчымасці глядзець канал СТБ. Гэты канал быў найбольш папулярны сярод мінчан. Сярод усіх апытаных па папулярнасці вызначыўся канал АНТ. Колькасць рэспандэнтаў, якія глядзелі АНТ, вырас з 57,1 % у 2002 г. да 70,5 % у 2003 г. Аднак, як сведчылі апытанні, найбольшы рэйтынг мелі расійскія каналы РТР і НТВ [773, с. 18].

Па дадзеных даследавання вучоных Інстытута сацыялогіі, расійскія тэлевізійныя каналы і расійскія друкаваныя выданні аказвалі рашаючае, асноўнае ўздзеянне на беларускую аўдыторыю. Гэты факт нельга разглядаць як станоўчы з пункту гледжання станаўлення нацыянальнай тоеснасці беларускага народа.

З 4 ліпеня 2006 г. пачаў сваё вяшчанне тэлеканал «НТВ-Беларусь». Гэта беларускі дзяржаўны камерцыйны канал, які вяшчаў на тэрыторыі Рэспублікі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь на падставе канцэпцыі, сеткі вяшчання і праграмнага прадукту тэлеканала НТВ. Аснову яго эфіру складала прадукцыя тэлеканала НТВ, выработленая расійскім бокам, якая закуплялася на падставе заключанага дагавора, а таксама серыялы і фільмы, набытыя галоўнай дырэкцыяй ліцэнзійных праграм і кінапаказу Белтэлерадыёкампаніі. Тэлеканал НТВ пазіцыянаваўся як тэлеканал для мужчынскай аўдыторыі, і гэтым была абумоўлена яго жанравая структура.

З 2005 г. у Беларусі ў мэтах інфармацыйнага суправаджэння праектаў тэлевізійнага вяшчання, а таксама для фарміравання станоўчага іміджу тэлевізійных праектаў, якія рэалізаваліся як на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, так і за яе межамі, Міністэрствам інфармацыі штогод праводзіўся нацыянальны тэлевізійны конкурс «Тэлевяршыня». Вынікі конкурсу падводзіліся па дзвюх групах: тэлевізійныя праекты і тэлевізійныя персаналіі. У першай пераможцы вызначаліся па 11 намінацыях (лепшая інфармацыйная, грамадска-палітычная, культурна-забаўляльная, спартыўная праграма, праграма для дзяцей і юнацтва, лепшы тэлевізійны фільм, лепшая сацыяльная рэклама, лепшы тэлевізійны дызайн, лепшая праграма навін рэгіянальнага тэлебачання, лепшы рэгіянальны праект года, гран-пры «Тэлевізійны праект года»). У другой – 8 намінацый (лепшы вядучы інфармацыйнай, грамадска-палітычнай, музычна-забаўляльнай, спартыўнай праграм, лепшы вядучы рэгіянальнага тэлебачання, лепшы рэпарцёр, рэжысёр, аператар).

Па выніках сацыялагічных апытанняў, праведзеных Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у рэйтынгу тэлевізійных каналаў у 2008 г. першае месца займала Агульнанацыянальнае тэлебачанне (АНТ). Яго штодзень глядзелі 77 % апытаных рэспандэнтаў. На другім месцы па папулярнасці знаходзіўся Першы тэлеканал (56 %). Далей ішлі тэлеканалы «Лад» (40 %), «Расія» (37 %), «Сталічнае тэлебачанне» (34 %) і «НТВ-Беларусь» (28 %) [680, с. 57].

У 2009 г. на першае месца ў пераліку навасных перадач, якія грамадзяне глядзелі найбольш часта, з вялікім адрывам вышла перадача «Нашы навіны» (АНТ). Яе адзначылі звыш палавіны апытаных (52,6 %). Далей ішлі «Навіны» на Першым канале (32,1 %) і тры перадачы расійскіх каналаў – «Сегодня» (НТВ), «Вести» (РТР) і «Время» (ГРТ).

Удзельнікі апытання часцей за ўсё глядзелі інфармацыйна-аналітычныя тэлеперадачы, якія трансліраваліся на каналах АНТ і Першым канале (БТ). Лідарам з'яўлялася праграма «Контуры» (АНТ) (34,1 % апытаных). Далей са значным адрывам ішлі ток-шоу «Выбар» (АНТ, 16,3 %) і «Панарама» на Першым канале (13,8 %) [682, с. 47].

Аднак па станоўчых якасцях першыя чатыры месцы лепшых каналаў рэспандэнты аддалі замежным: «ОРТ-Россия» (90,3 % станоўчых якасцей), «РТР-Россия» (88,0), EuroNews (86,3), «НТВ- Россия» (85,1 %). Менавіта гэтым каналам, па меркаванні тэлегледачоў, былі ўласцівы такія якасці, як аб'ектыўнасць і даставернасць, пераканаўчасць, аргументаванасць інфармацыі, адлюстраванне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

розных пунктаў погляду, даступнасць для разумення і ўспрыняцця матэрыялу. У беларускіх каналаў рэспандэнты ў першую чаргу адзначалі актуальнасць і сацыяльную значнасць матэрыялу [682, с. 48–49].

Побач з гэтым найбольшым даверам карысталіся менавіта беларускія тэлеканалы АНТ і Першы канал (БТ). Агульнанацыянальнаму тэлебачанню поўнасцю давяралі 61,2 % апытаных, Беларускаму тэлебачанню – 55,8 % [682, с. 52].

У змесце перадач беларускага тэлебачання насельніцтва бачыла нямала недахопаў. У выніку адзнака яго дзейнасці была «сярэдняй» (52,1 %). Сярод адмоўных бакоў называлася перайманне ад расійскіх каналаў, недастатковае адлюстраванне рэальных праблем, адсутнасць новых, свежых ідэй, недастатковасць арыгінальных айчынных праграм, залішняя ідэалагізацыя падаваемага матэрыялу, адсутнасць якасных забаўляльных праграм, нязначная колькасць перадач, якія прымушаюць гледача думаць, аднастайнасць і штампы ў падачы матэрыялу, адсутнасць альтэрнатыўнага пункту погляду [682, с. 50].

Развіццё сродкаў масавай інфармацыі непарыўна звязана з тэхналагічным прагрэсам. Істотныя змены адбыліся з укараненнем лічбавых тэхналогій апрацоўкі і перадачы сігналу. У снежні 2008 г. была зацверджана Дзяржаўная праграма ўкаранення лічбавага тэлевізійнага і радыёвяшчання ў краіне да 2015 г. [597]. Яе асноўная мэта – аказанне паслуг па трансляцыі тэлевізійных праграм, стварэнне ўмоў для развіцця навукаёмкіх галін, асваенне вытворчасці новых відаў прымаючай і перадаючай апаратуры тэлевізійнага і радыёвяшчання і інш. Стварэнне змешаных сетак лічбавага і аналагавага тэлевізійнага вяшчання з паступовай заменай абсталявання аналагавага тэлевяшчання на лічбавае было прадугледжана на другім этапе рэалізацыі праграмы ў 2010–2015 гг. З 1 ліпеня 2005 г. з радыётэлевізійнай перадаючай станцыі ў Калодзішчах на частаце 48-га канала на г. Мінск і бліжэйшыя раёны было пачата пастаяннае вяшчанне лічбавага пакета з 4 тэлепраграм (Першы тэлеканал, АНТ, СТБ, Лад) і адной радыёвяшчальнай праграмы «Першы нацыянальны канал радыё». У 2007 г. вяшчанне лічбавага пакета з 4 тэлепраграм пачалося ў г. Магілёве, г. п. Шаркаўшчына (Віцебская вобласць), в. Тракенікі (Гродзенская вобласць) [668].

У 2006 г. была зацверджана Дзяржаўная праграма развіцця спадарожнікавага тэлевізійнага вяшчання да 2010 г. [598]. Асноўным назначэннем такога віду вяшчання з’яўлялася арганізацыя міжнароднага вяшчання як сродку актыўнай інтэграцыі ў сусветны культурны працэс і глабальную інфармацыйную прастору. Міжнароднае тэлевізійнае вяшчанне разглядалася як інструмент знешняй дзяржаўнай палітыкі і павінна было забяспечыць інфармацыйную прысутнасць Рэспублікі Беларусь на тэрыторыі іншых дзяржаў, садзейнічаць рэалізацыі нацыянальных, культурных і іншых правоў і законных інтарэсаў этнічных беларусаў, выхадцаў з Рэспублікі Беларусь, якія пражывалі за межамі яе тэрыторыі. У 2008 г. з дапамогай спадарожнікавых сістэм здзяйснялася трансляцыя трох тэлевізійных праграм беларускай вытворчасці: Беларусь-ТБ, СТБ, Першы музычны канал.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вынікі сацыялагічнага апытання, праведзенага ў 2009 г., паказалі страту наземным эфірным вяшчаннем прыярытэтаў па распаўсюджанні тэлевізійнага сігналу. У той час толькі палова рэспандэнтаў (50,9 %) глядзелі эфірнае тэлебачанне, 43,9 % – кабельнае і 13,3 % – спадарожнікавае. Пры гэтым выказвалі жаданне глядзець эфірнае тэлебачанне толькі 30,1 % (22,3 гараджан і 55,1 % сялян) грамадзян, кабельнае – 41,7 (20,7 сялян і 48,4 % гараджан), спадарожнікавае – 41,4 % (на сяле – 38,4, у горадзе – 42,4%) [682, с. 44, 45].

Перамены закранулі і ***радыёвяшчанне***. У пачатку 1990-х гг. істотна знізілася колькасць праграм раённага (рэгіянальнага) радыё.

Галоўная роля ў абнаўленні беларускага радыёвяшчання ў першай палове 1990-х гг. прыналежала інфармацыйнай праграме «Радыёфакт» (першы эфір – 4 сакавіка 1991 г.). Яна выходзіла 5 разоў на тыдзень ранкам і працягвалася 1 гадзіну (з 7 да 8 гадзін).

У вячэрнім эфіры ў 1992 г. з'явілася перадача «Постфактум-радыё», якая, па-сутнасці, падводзіла вынік інфармацыйнага дня.

Цікавыя новыя напрамкі ў вяшчанні шукалі іншыя радыёстанцыі. У кастрычніку 1992 г. «Беларуская маладзёжная» атрымала дадатковы прамы эфір на другой радыёпраграме. Загучалі маладзёжныя выпускі «Музыка тоўстых», «Квадракола», «Сусветная служба "Беларускай маладзёжнай"». Радыёстанцыя была зачынена напярэдадні выбараў 1994 г., бо была ці не адзінай станцыяй на дзяржаўным радыё, якая адважылася даць магчымасць выступіць у прамым эфіры кандыдату ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. Гэта не спадабалася тагачаснаму кіраўніку Урада В. Кебічу. У заяве радыёстанцыі з гэтай нагоды адзначалася: «9 чэрвеня намеснікам старшыні Дзяржтэлерадыё С. Булацкім было афіцыйна засведчана, што «Беларуская маладзёжная» пазбаўляецца статусу радыёстанцыі...». У заяве прыводзіліся прыклады ўмяшання дзяржаўных структур ў працу радыёстанцыі. Сярод іх – адхіленні вядучых ад эфіру, адміністрацыйныя спагнанні за парушэнні «інструкцый» па выдачы ў эфір, патрабаванні звальнення асобных журналістаў, забароны цэлых праграм і радыёдзён, папярэдняе праслухоўванне і рэцэнзаванне матэрыялаў, якія павінны выйсці ў эфір. Былі выпадкі, калі матэрыялы «адвозіліся ў Саўмін для праверкі на адпаведнасць афіцыйным установкам. На сустрэчы з выбаршчыкамі ў Магілёве 8 чэрвеня 1994 г. В. Кебіч зазначыў, што "Беларуская маладзёжная" «палівала» Урад і асабіста яго «брудам», і параіў тым, хто жадае, каб радыёстанцыя існавала, знайсці сродкі на адкрыццё незалежнай «хвалі» [246]. «Беларуская маладзёжная» аб'ядналася з радыёстанцыяй «Крыніца» ў новую праграму «Радыё-2», якая вяшчала на сярэдніх хвалях. Папулярнасцю карысталіся такія яе рубрыкі, як «Жыццяпіс» (пра гісторыю краіны), «Мястэчка» (апавяданні пра малыя гарады Беларусі), «Эдэльвейс» (турыстычная праграма), «Слова для душы» (перадача для вернікаў).

З пачатку 1990-х гг. на хвалях другой праграмы беларускага радыё загучала радыёстанцыя «Сталіца», якая аб'яднала вяшчанне на Мінск і Мінскую вобласць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З прыняццем Закона «Аб друку і сродках масавай інфармацыі» і Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай камісіі па радыёчастотах» (лістапад 1995 г.) у Беларусі пачало развівацца і камерцыйнае радыёвяшчанне. Першая недзяржаўная FM-станцыя пачала сваю працу 24 красавіка 1993 г.

У другой палове 1990-х гг. беларускае дзяржаўнае радыё перажывала крызіс. Адчуваўся недахоп прафесійных кадраў. Шматлікія рэарганізацыі не давалі чаканага выніку. На змяншэнне аўдыторыі слухачоў аказвала ўплыў канкурэнцыя з боку камерцыйных FM-каналаў.

1 верасня 1996 г. было зачынена «Радыё-101,2» – адзіная недзяржаўная радыёстанцыя на беларускай мове. У далейшым частата 101,2 МГц была перададзена рэспубліканскай маладзёжнай арганізацыі.

Аснова палітыкі вяшчання Беларускага радыё ў пачатку 2000-х гг. – масавасць, дасягальнасць, вялікі аб'ём інфармацыі, аператыўнасць і актуальнасць. У 2002 г. на базе Радыё-1 быў створаны Першы нацыянальны канал, на базе Радыё-2 – канал «Культура». Ідэя апошняга сфармулявана ў слогане «Мы выбіраем вечныя каштоўнасці». У эфіры з'явіліся новыя перадачы – «Вакол гадзінніка», «Цытата дня», «Праграма "А"», «Сямейнае радыё». Павялічылася колькасць маладзёжных і дзіцячых праграм («Адкрытая пляцоўка», «Канспект», «Інтэрнэт-прастора»).

У 2003 г. радыё перайшло на лічбавае вяшчанне. Гэта дазволіла павысіць якасць запісу, зменшыць колькасць запісаных перадач, пашырыць кантакты са слухачамі.

У 2004 г. Беларускае радыё вяло перадачы на двух нацыянальных каналах (Першы нацыянальны канал і «Культура») і трох радыёстанцыях («Радыус-FM», «Беларусь» і «Сталіца»).

Самай рэйтынгавай стала праграмай «Вітаем, віншуем, жадаем!», сацыяльная перадача «Зваротная сувязь». На канале «Культура» была створана інфармацыйная служба, якая асвятляла падзеі культурнага жыцця Беларусі і замежжа. Значную папулярнасць у слухача набыў цыкл перадач «Сучаснае беларускае апавяданне».

На замежжа працаваў радыёканал «Беларусь». Яго вяшчанне вялося на беларускай, рускай, нямецкай і англійскай мовах.

Да дзяржаўных радыёканалаў неабходна дадаць камерцыйныя FM-станцыі. Па дадзеных на 1 лістапада 2008 г. іх налічвалася 21 (гл. табл. 11).

Наяўнасць значнага выбару крыніц інфармацыі выклікала разгубленасць у спажыўца. Ён часам не ведаў, якой інфармацыі давяраць. Па дадзеных даследаванняў Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, у 2002–2003 гг. існавала відавочная тэндэнцыя: рос недавер як да дзяржаўных, так і да недзяржаўных СМІ. Не давяралі дзяржаўным СМІ 35,6 % апытаных, недзяржаўным – 38,7 %. Інфармацыі дзяржаўных СМІ давяралі 23,6 % апытаных, недзяржаўных – 16,3 % [810, с. 16].

У 2009 г. найбольшай папулярнасцю ў грамадзян карыстаўся Першы нацыянальны канал Беларускага радыё. Яго перадачы часта слухалі 22,4 % апы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

таных. Далей ішла радыёстанцыя «Радыус-FM» (14,7 %). Сярод перадач Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё найбольш папулярнай перадачай былі «Навіны» (63,8 %). Каля 40 % слухачоў аддавалі перавагу «Радыёфакту». На трэцім месцы апынуўся «Постфактум» (21,5 %) [682, с. 63].

Найбольшай колькасцю станоўчых якасцей (звыш 90 %) слухачы надзялілі «Радыё АНТ» і «Аўтарадыё». Найменш такіх якасцей было ў мясцовага радыё (65 %) і «Мелодый веку» (36 %). Высокі прафесіяналізм работнікаў адзначылі слухачы «Рускага радыё», «Аўтарадыё», «Радыё АНТ», «Альфа Радыё», «Пілот-FM». Недастатковы ўзровень прафесіяналізму часцей пазначалі слухачы каналаў «Мелодыі веку», мясцовага радыё, «Культуры» [682, с. 66].

*Табліца 11.* **Звесткі аб зарэгістраваных радыё- і тэлепраграмах на 1 лістапада 2008 г. [247]**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Колькасць зарэгістраваных праграм | 225 | | |
| У тым ліку: | – | | |
| радыёпраграм | 158 | | |
| дзяржаўных | 137 | | |
| недзяржаўных | 21 | | |
| тэлепраграм | 67 | | |
| дзяржаўных | 27 | | |
| недзяржаўных | 40 | | |
| СМІ па відах заснавальнікаў | | | |
| Заснавальнікі | Колькасць СМІ | | |
| | усяго | радыёпраграмы | тэлепраграмы |
| Мясцовыя выканаўчыя камітэты | 113 | 104 | 9 |
| Саветы дэпутатаў | 60 | 59 | 1 |
| Дзяржаўныя арганізацыі | 58 | 42 | 16 |
| Недзяржаўныя арганізацыі | 56 | 19 | 37 |
| Сумесныя прадпрыемствы | 2 | 1 | 1 |
| Грамадскія аб’яднанні | 3 | 2 | 1 |
| Грамадзяне | 3 | 2 | 1 |

Кожны трэці рэспандэнт адзначыў паляпшэнні ў дзейнасці радыё. Гараджане былі больш крытычнымі, чым жыхары сяла. Паляпшэнні ў працы ўбачылі 44,3 % сялян і толькі 28,5 % гараджан. Але меркаванню сялян можна давяраць болей, бо яны слухалі радыё часцей за гараджан (адпаведна 46,9 і 41,0 %) [682, с. 60, 66].

Сярод недахопаў айчыннага радыё рэспандэнты адзначалі недастатковасць арыгінальных праграм, адсутнасць навых ідэй, перайманне ў расійскіх каналаў, аднастайнасць і штампы ў падачы матэрыялаў [682, с. 66].

Такім чынам, галіна СМІ ў даследуемы перыяд перажыла няпростыя трансфармацыі не толькі ідэйнай накіраванасці, але і форм працы, укаранення новых тэхналогій. Магутны ўплыў на яе развіццё пачалі аказваць рынка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вые механізмы. Значная колькасць суб'ектаў галіны перайшла на самаакупнасць.

На рынку перыядычных выданняў з'явіліся недзяржаўныя літаратурныя выдавецтвы і выданні, толькі некаторыя з іх здолелі праіснаваць дастаткова працяглы час. Істотныя змены закранулі і дзяржаўныя выдавецтвы і выданні. Адсутнасць дзяржаўнай падтрымкі прымусіла шукаць новыя шляхі выхаду з крызіснага становішча. У 2002 г. быў створаны рэдакцыйна-выдавецкі холдынг «Літаратура і мастацтва».

У вывучаемы перыяд адбыліся значныя змены ў сістэме кантролю і кіравання СМІ, змесце апошніх, тэхніцы падачы матэрыялу. У гэтай сферы хуткімі тэмпамі пачала развівацца канкурэнцыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глава

6

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА

## 6.1. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Адным з прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь у вывучаемы перыяд з’яўлялася ахова гісторыка-культурнай спадчыны. Эфектыўнасць дзеянняў у гэтай сферы забяспечвала заканадаўчая база, якая пачала фарміравацца яшчэ ў савецкі час[1].

Аб незадавальняючым стане справы аховы помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны гаварылася ў прэамбуле пастановы Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР *«Аб рэарганізацыі справы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларускай ССР»*, прынятай 16 мая 1991 г. [534]. Асноўная адказнасць за такі стан рэчаў ускладалася на органы выканаўчай улады усіх узроўняў.

З мэтай пераадолення ведамаснага падыходу да справы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, належнай арганізацыі выяўлення, уліку, захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей, кантролю за навукова-метадычнай абгрунтаванасцю звязаных з імі работ, удасканалення прававой базы ў разглядаемай галіне і распаўсюджання яго патрабаванняў на каштоўныя дасягненні духоўнай культуры Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР даручыў распрацаваць праект новага Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. У ім павінны былі быць прадугледжаны мерапрыемствы па ўліку і захаванні дасягненняў як матэрыяльнай, так і духоўнай культуры шматнацыянальнага насельніцтва краіны, а таксама стварэнне незалежнага ад органаў выканаўчай улады ўсіх узроўняў спецыялізаванага дзяржаўнага органа па ахове гісторыка-культурнай спадчыны – Дзяржаўнай інспекцыі па ахове помнікаў гісторыі і культуры.

Раздзел III «Гісторыка-культурная спадчына Рэспублікі Беларусь» *Закона «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь»* (1991 г.) вызначыў, што да гісторыка-культурнай спадчыны належаць матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, якія маюць нязменнае гістарычнае значэнне для народаў Беларусі незалежна ад аўтарскіх, маёмасных правоў на іх, часу стварэння і месцазнаходжання, у тым ліку і за межамі Рэспублікі Беларусь (арт. 12). Закон таксама вызначыў асаблівасці вывазу культурных каштоўнасцей з тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (арт. 13) і палітыку вяртання на тэрыторыю дзяржавы культурных каштоўнасцей, незаконна вывезеных за яе межы (арт. 14).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[1] Першым беларускім законам па пытаннях аховы культурных каштоўнасцей, аховы і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны быў Закон БССР «Аб ахове помнікаў культуры» ад 26 снежня 1969 г.

13 лістапада 1992 г. быў прыняты ***Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны»*** [574], які быў накіраваны на рэгуляванне адносін з мэтай захавання, належнага ўтрымання, адпаведнага рацыянальнага выкарыстання і памнажэння гісторыка-культурнай спадчыны. У прэамбуле закона было адначана, што «спадчына Рэспублікі Беларусь, створаная народам Беларусі, з'яўляецца яго набыткам, неад'емнай часткай дасягненняў міравой цывілізацыі. Яе духоўныя, мастацкія і дакументальныя вартасці ствараюць неабходныя ўмовы духоўнага, інтэлектуальнага і эканамічнага развіцця грамадства».

Да яго прыняцця дзейнічалі палажэнні Закона Беларускай ССР «Аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» (1978 г.). У новым законе быў улічаны сусветны вопыт, рэкамендацыі і палажэнні міжнародных прававых актаў (канвенцый), а таксама практычны вопыт працы Інспекцыі па ахове помнікаў гісторыі і культуры. У новым законе былі размежаваны паняцці гісторыка-культурнай спадчыны і гісторыка-культурных каштоўнасцей. Калі пад першым разумелася ўся сукупнасць адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях, то пад самімі каштоўнасцямі разумеліся найбольш адметныя матэрыяльныя аб'екты і нематэрыяльныя праявы чалавечай творчасці, якія маюць выдатныя духоўныя, эстэтычныя і дакументальныя вартасці і ўзяты пад ахову дзяржавы ў парадку, вызначаным згаданым законам (арт. 2).

У законе прыведзена класіфікацыя каштоўнасцей на матэрыяльныя і духоўныя. Першыя, у сваю чаргу, былі падзелены на рухомыя і нерухомыя, а другія – фіксаваныя і ўвасобленыя. Законам была дакладна акрэслена сістэма ўліку і аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей, кампетэнцыя спецыялізаванага органа аховы і сам парадак надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці матэрыяльным аб'ектам і нематэрыяльным праявам чалавечай творчасці, магчымыя спосабы іх знаходжання, а таксама крытэрыі адбору.

Адпаведна закону дзяржаўная палітыка ў галіне ўліку і аховы гісторыка-культурнай спадчыны вызначалася Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь і ажыццяўлялася Саветам Міністраў праз спецыялізаваны дзяржаўны орган аховы гісторыка-культурнай спадчыны – Дзяржаўную інспекцыю (артыкулы 6 і 7). У 1998 г. такім спецыяльным органам стаў Камітэт па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры [474].

Выпрацоўкай і ўдасканаленнем навукова-метадычнай палітыкі ў галіне ўліку, аховы, зберажэння, аднаўлення, выкарыстання, памнажэння і вяртання гісторыка-культурнай спадчыны ажыццяўляла Беларуская рэспубліканская рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны (арт. 11).

Матэрыяльныя аб'екты і нематэрыяльныя праяўленні чалавечай творчасці, якім у адпаведнасці з гэтым законам быў нададзены статус каштоўнасцей, павінны былі ўносіцца ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей (арт. 21). Дзеля захавання і сістэматызацыі ўліковых дакументаў і звестак аб адметных выніках і сведчаннях гістарычнага развіцця народа краіны, страча-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных матэрыяльных аб’ектах і нематэрыяльных праяў чалавечай творчасці, якія б маглі атрымаць статус гісторыка-матэрыяльных каштоўнасцей, ствараўся Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне (арт. 25).

Асобны раздзел закона (раздзел III) «Захаванне і аднаўленне гісторыка-культурных каштоўнасцей» утрымліваў прынцыпы захавання саміх каштоўнасцей і іх асяроддзя. Пры гэтым было вызначана паняцце «калекцыя» як навукова абгрунтаванага збору рухомых матэрыяльных каштоўнасцей ці эталонаў фіксаваных духоўных каштоўнасцей, якія належаць аднаму ўласніку. Увядзенне гэтага паняцця было звязана з неабходнасцю забароны магчымага разукамплектавання калекцый, паколькі яны пры гэтым гублялі сваю каштоўнасць [439, спр. 215, арк. 177].

Акрамя вышэй пералічаных пытанняў гэты раздзел рэгуляваў парадак вывазу за межы краіны ўсіх відаў каштоўнасцей, мерапрыемствы па захаванні духоўных фіксаваных і ўвасобленных духоўных каштоўнасцей. Пры гэтым была ўдзелена ўвага і такой катэгорыі, як матэрыяльныя аб’екты і нематэрыяльныя праявы чалавечай творчасці, «уласных вартасцей якіх недастаткова для надання ім статусу каштоўнасці».

Закон падзяліў матэрыяльныя каштоўнасці на чатыры катэгорыі (ад нулявой да трэцяй), а духоўныя – на дзве («А» і «Б»).

У раздзеле былі вызначаны віды работ, якія мелі адносіны да каштоўнасцей, парадак атрымання дазволу на правядзенне асобных відаў работ, сертыфіката на права допуску на правядзенне прац на каштоўнасцях, узгаднення праектакаштарыснай дакументацыі, правы навуковага кіраўніка работ. Асобна рэгуляваліся змены духоўных каштоўнасцей.

Праблемы ўласнасці на каштоўнасці рэгуляваў раздзел IV закона. Спецыфіка падзелу на матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці прапанавала розныя падыходы да вызначэння правоў уласнасці на іх. Калі матэрыяльныя каштоўнасці маглі належаць дзяржаве, фізічным і юрыдычным асобам, то ўвасобленыя духоўныя каштоўнасці знаходзіліся ва ўласнасці асоб, якія гэтымі каштоўнасцямі валодалі, незалежна ад часу і абставін іх засваення (арт. 67). Правы ўласнасці на ўвасобленыя духоўныя каштоўнасці станавіліся юрыдычным фактам з моманту атрымання персанальнага пасведчання, якое не падлягала перадачы іншым асобам. Такое пасведчанне надавала ўласніку статус народнага майстра Рэспублікі Беларусь.

Асобнымі артыкуламі рэгуляваліся абавязкі ўласнікаў гісторыка-культурных каштоўнасцей, вызначаліся абмежаванні правоў уласніка і карыстальніка матэрыяльнымі каштоўнасцямі, правы ўласнікаў увасобленых духоўных каштоўнасцей, абавязкі дзяржавы па забеспячэнні захаванасці і даступнасці для карыстальніка каштоўнасцей, аўтарскія правы на каштоўнасці, права спадчыннасці каштоўнасцей, парадак змены ўласніка каштоўнасцей.

Быў акрэслены парадак вызначэння права ўласнасці на каштоўнасці, якія на момант іх выяўлення ці надання ім статусу каштоўнасці не мелі ўласніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Закон вызначаў права ўласнасці на нанава выяўленыя, не вядомыя раней матэрыяльныя аб'екты і прадметы, не набыўшыя статусу каштоўнасці (арт. 80, 81).

Умовы выкарыстання і ўтрымання каштоўнасцей былі абгавораны ў раздзеле V. Для кожнай канкрэтнай матэрыяльнай каштоўнасці Дзяржаўная інспекцыя па ахове спадчыны павінна была вызначыць дадатковыя да патрабаванняў дадзенага закона індывідуальныя ўмовы ўтрымання і выкарыстання, парадак правядзення ўсякага віду звязаных з ёй работ, а таксама іншыя абмежаванні дзейнасці ўласнікаў і карыстальнікаў каштоўнасцей (арт. 84). Гэтыя патрабаванні фіксаваліся ў складзеных па вызначанай форме ахоўных абавязацельствах.

Фінансаванне аховы і зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны ажыццяўлялася за кошт дзяржаўных выдаткаў, сродкаў уласнікаў ці карыстальнікаў каштоўнасцей, а таксама сродкаў, што спаганяліся з парушальнікаў рэжыму ўтрымання каштоўнасцей і патрабаванняў закону, і іншых сродкаў, якія паступаюць на законных падставах (арт. 86).

Пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь павінен быў быць створаны мэтавы Фонд аховы, захавання і аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны народа Беларусі (арт. 88). Сродкі фонду павінны былі складацца з добраахвотных ахвяраванняў; адлічэнняў ад прыбыткаў, атрыманых пры выкарыстанні гісторыка-культурных каштоўнасцей у камерцыйных мэтах і ў выніку дзейнасці, якая непасрэдна ўздзейнічала на каштоўнасці; ад кампенсацый і штрафаў за супрацьпраўную дзейнасць у галіне аховы каштоўнасцей. На жаль, як паказала жыццё, фонд не быў створаны.

Асобныя пытанні захавання і выкарыстання гісторыка-культурных каштоўнасцей у 1990-х гг. былі замацаваны ў шэрагу іншых заканадаўчых актаў – Законе «Аб нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспубліцы Беларусь», «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь», «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь», «Аб асновах архітэктурнай і горадабудаўнічай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні ў Рэспубліцы Беларусь», Кодэксе «Аб зямлі».

Прынцыпова новы этап у справе аховы і адраджэння гісторыка-культурнай спадчыны гарадоў Беларусі пачаўся з прыняццем 23 ліпеня 2001 г. Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб першачарговых мерах па захаванні і адраджэнні гістарычных цэнтраў гарадоў Беларусі» [529], якая зацвердзіла Праграму першапачатковых мер па захаванні і адраджэнні гістарычнай забудовы гарадоў Беларусі. У мэтах яе выканання пачалася пашпартызацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей, распрацоўка гісторыка-архітэктурных і інжынерных абрунтаванняў рэгенерацыі гарадоў Гомеля, Нясвіжа, Браслава, Пастаў, Турава, гістарычнага квартала «Верхні горад» у г. Мінску і інш.

8 кастрычніка 2002 г. асобнай пастановай Савета Міністраў быў зацверджаны Пералік прыярытэтных аб'ектаў рэстаўрацыі гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь і Доўгатэрміновая праграма распрацоўкі і ажыц-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цяўлення праектаў рэгенерацыі гарадской забудовы, якая мае важнае гісторыка-культурнае значэнне [535].

На ўрэгуляванне пытанняў аховы археалагічных аб'ектаў з мэтай іх выкарыстання ў інтарэсах гуманітарнай адукацыі, навукі і культуры, развіцця чалавека было накіравана зацверджанае Урадам 22 мая 2002 г. Палажэнне аб ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ.

У першай палове 2000-х гг. быў прыняты шэраг нарматыўных прававых актаў, накіраваных на ўлік, захаванне і ўзнаўленне асобных аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны краіны (г. п. Мір, г. Нясвіж, г. Мінск) [515; 531; 599].

9 студзеня 2006 г. быў прыняты новы Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» [9].

Як адзначаў І. Э. Мартыненка, «прадэкларaваная і праведзеная рэарганізацыя, выкліканая прыняццем новага закона (маецца на ўвазе закон 1992 г. – *Д. К.*), прывяла да змяшання прававых паняццяў. Нарматыўныя акты, якія былі прыняты пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі, і падзаконныя прававыя акты, якія прымаліся ў адпаведнасці з імі да 2001 г., адрозніваюцца ўнутранай супярэчнасцю і ў значнай ступені не забяспечваюць належнай прававой аховы гісторыка-культурнай спадчыны. На практыцы гэта прывяло да нізкай эфектыўнасці правапрымяняльнай дзейнасці» [416, с. 28].

Прыняцце новага закона было абумоўлена істотнымі зменамі сацыяльна-эканамічных і палітычных умоў жыцця беларускага грамадства, правядзеннем сур'ёзных рэформаў сістэмы нацыянальнага заканадаўства. З моманту прыняцця закона (1992 г.) пачала дзейнічаць новая Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, якая рэфармавала сістэму дзяржаўнай улады ў рэспубліцы, а таксама асновы прававога статусу асобы, у тым ліку ў галіне культуры. У 1998 г. быў прыняты Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь, у 1999 г. былі ўнесены змены і дапаўненні ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь. Развіццё нацыянальнага заканадаўства прывяло да ўзнікнення юрыдычных калізій і няўзгодненасці паміж Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» і прынятымі пазней нарматыўнымі прававымі актамі. Існавалі таксама тэрміналагічныя разыходжанні паміж згаданым законам і Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь, законамі «Аб падатках і зборах, якія ўзымаюцца ў бюджэт Рэспублікі Беларусь», «Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» і іншымі заканадаўчымі актамі.

Важным палажэннем новага закона было вызначэнне ролі грамадскіх арганізацый, статутамі якіх была прадугледжана дзейнасць па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

У мэтах выканання палажэнняў закона былі прыняты прававыя акты, якія рэгулявалі парадак дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей, здзяйсненне навуковага кіраўніцтва за выкананнем рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ на помніках, кампетэнцыя Беларускай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спачыны [31]; парадак здзяйснення адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвала непасрэднае ўздзеянне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на гісторыка-культурную каштоўнасць ці зоны аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці [32]; парадак пакрыцця страт, якія былі панесены юрыдычнай або фізічнай асобай па прычыне выпадковага выяўлення нерухомага матэрыяльнага аб'екта, які можа прадстаўляць гісторыка-культурную каштоўнасць [583].

Для прыцягнення ў сферу рэстаўрацыі *пазабюджэтных асігнаванняў* у 1991 г. Галоўрэстаўрацыя выступіла з ініцыятывай стварэння на аснове гістарычнай забудовы г. Мінска акцыянернага таварыства «Стары Менск», а ў 1992 г. – на Шпітальным востраве ў г. Брэсце акцыянернага таварыства «Старое Бярэсце» [438, спр. 12, арк. 167].

Выкананнем рамонтна-рэстаўрацыйных і праектна-пошукавых работ у 1993 г. акрамя 10 арганізацый сістэмы Галоўнага ўпраўлення па рэстаўрацыі і кансервацыі займаліся 24 прадпрыемствы і арганізацыі недзяржаўнай формы ўласнасці [438, воп. 12, арк. 167].

Для стварэння ўмоў прыцягнення і замацавання кваліфікаваных спецыялістаў-рэстаўратараў камітэтам ажыццяўлялася фінансаванне за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту жыллёвага будаўніцтва. У 1993 г. было завершана будаўніцтва 40-кватэрнага жылога дома ў г. Гродна, 12-кватэрнага жылога дома ў г. Пінску, 3-кватэрнага жылога дома ў г. Прыжаны, будаваліся дамы ў гарадах Віцебск, Брэст, Полацк [438, воп. 12, арк. 168].

Ва ўмовах недахопу бюджэтных сродкаў Міністэрства культуры ў 1996 г. распрацавала *Прыкладнае часовае палажэнне аб мэтавым фінансаванні прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай культурнай палітыкі*. У яго быў закладзены прынцып аб накіраванні на фінансаванне аб'ектаў і праектаў, вызначаных палажэннем, не больш за 30 % ад затрат на культуру з бюджэту краіны. Выдзяленне сродкаў на фінансаванне «прыярытэтных напрамкаў» павінна было ажыццяўляцца ў першую чаргу і поўнасцю, нават калі гэта будзе прыносіць шкоду іншым расходам. На пасяджэнні калегіі Міністэрства культуры 28 лістапада 1996 г. быў зацверджаны пералік прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай культурнай палітыкі Беларусі на 1997–2000 гг. Асобным спісам ішлі 13 помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны, рэстаўрацыі і рэканструкцыі якіх надаваліся фінансавыя прыярытэты ў вызначаны перыяд [34].

6 мая 2002 г. Пастановай Урада было зацверджана *Палажэнне аб парадку вызначэння чарговасці ў фінансаванні работ па зберажэнню і аднаўленню матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнацей і ўдзелу ў ім дзяржавы* [486]. Па чарговасці і ступені ўдзелу дзяржавы ў фінансаванні рэстаўрацыйных работ гісторыка-культурныя каштоўнасці былі паддзелены на 5 груп: «А», «Б», «В», «Г» і «Д». Да групы «А» былі аднесены матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, уключаныя ў Спіс прыярытэтных аб'ектаў рэстаўрацыі[1].

[1] На той час гэты спіс складаўся з 10 аб'ектаў: Камянецкая вежа, Спасская царква ў г. Полацку, Барысаглебская (Каложская) царква ў г. Гродна, замкавы комплекс «Мір», Царква абарончага тыпу ў в. Сынкавічы, Навагрудскі замак, Лідскі замак, Езуіцкі калегіум у г. Мсціслаўлі, будынак Тэатра оперы і балета ў г. Мінску, Нясвіжскі палаца-паркавы ансамбль. Гл.: [74, арк. 31 зв.]



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фінансаванне з дзяржаўнага бюджэту навукова-рэстаўрацыйных работ на каштоўнасцях, аднесеных да групы «А», павінна было ажыццяўляцца ў першую чаргу. Пры адсутнасці спецыяльных фондаў рэстаўрацыі асобных каштоўнасцей, аднесеных да групы «А», а таксама грантаў і добраахвотных ахвяраванняў на іх аднаўленне сродкамі дзяржаўнага бюджэту павінна было забяспечвацца 100 % каштарыснага кошту ўсіх навукова-даследчых работ.

Да групы «Б» былі аднесены матэрыяльныя аб’екты, уключаныя ў Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца пад пагрозай страты. Да групы «В» – матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія знаходзіліся ва ўласнасці (мелі балансавую прыналежнасць) дзяржаўных устаноў культуры, навукі і асветы. У групу «Г» увайшлі матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія знаходзіліся ва ўласнасці рэлігійных суполак. Да катэгорыі «Д» былі аднесены ўсе астатнія матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія не ўвайшлі ў папярэднія катэгорыі [439, спр. 417, арк. 28–29 зв.].

18 кастрычніка 2007 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у мэтах стварэння ўмоў належнага захавання, аднаўлення, утрымання і выкарыстання асобных відаў гісторыка-культурных каштоўнасцей і зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей зацверджана Палажэнне аб парадку ажыццяўлення адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурную каштоўнасць або зоны аховы нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, выплаты кампенсацый за шкоду, што прычыняецца гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей [32]. Адлічэнні накіроўваліся ў фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

Метадычнае, арганізацыйнае садзейнічанне і кантроль за своечасовасцю і паўнатой ажыццяўлення адлічэнняў і выплаты кампенсацый ускладалася на Міністэрства культуры і адпаведныя структурныя падраздзяленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў [19].

Сродкі фонду выкарыстоўваліся на мэты, накіраваныя на ахову гісторыка-культурнай спадчыны. Па творчых праектах і абгрунтаваных прапановах па ахове гісторыка-культурнай спадчыны для прыняцця рашэнняў аб выдзяленні сродкаў на іх рэалізацыю Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры прадстаўляла, згодна з яе кампетэнцыяй, у савет фонду экспертнае заключэнне [31].

У сувязі з абмежаванасцю бюджэтных сродкаў для пашырэння рэстаўрацыйна-аднаўленчых мерапрыемстваў неабходны былі новыя крыніцы фінансавання. Міністэрства культуры ў якасці адной з іх разглядала дзейнасць па арганізацыі латарэй і выступіла заснавальнікам латарэі «Скарбніца», распаўсюджанне якой пачалося яшчэ ў 2003 г. Міністэрствам культуры сумесна з Навагрудскім раённым выканаўчым камітэтам у 2010 г. было арганізавана



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правядзенне акцыі «Рэстаўрацыя Навагрудскага замка» з уключэннем сродкаў ад рэалізацыі латарэі «Скарбніца» [104, с. 19].

Рэстаўрацыя аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны адбывалася і ў рамках Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы. Мэтавае выдзяленне сродкаў дазволіла за 2005–2010 гг. рэалізаваць шэраг праектаў. Сярод іх – рэстаўрацыя Палацу Пашкевічаў у г. Гомелі (2005 г.), рэканструкцыя былых саляных складоў у г. Віцебску (2007 г.), рэстаўрацыя манументальнага жывапісу архікафедральнага касцёла ў г. Мінску (2007 г.), рэстаўрацыя палаца Пацёмкіна ў г. Крычаве (2008 г.), рэстаўрацыяі і рэканструкцыя будынку Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь (2009 г.) [81, т. 11, арк. 49].

З мэтай выпрацоўкі мер па захаванні і эфектыўным выкарыстанні гістарычных замкаў (іх фрагментаў) нашай краіны Міністэрства культуры падрыхтавала спецыяльную праграму «Замкі Беларусі». Яна была накіравана на вызначэнне крыніц фінансавання работ, каардынацыю дзеянняў зацікаўленых органаў рэспубліканскага і мясцовага ўзроўняў улады, выпрацоўку сумесных падыходаў па выкарыстанні магчымасцей супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі[1].

На працягу даследуемага перыяду адбываліся ***змены ў структуры органаў дзяржаўнага кіравання рэстаўрацыйнай галіной***. Галоўнае ўпраўленне па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь было створана ў 1991 г. у адпаведнасці з Пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (№ 709-XII) «Аб рэарганізацыі справы аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь». Ініцыятарам яго прыняцця было Міністэрства культуры, якое ў лісце ад 21 снежня 1990 г. на адрас Савета Міністраў адзначала, што асноўнай прычынай прыняцця неадкладных мер у сферы рэстаўрацыі і неабходнасці стварэння спецыялізаванага органа дзяржаўнага кіравання рэстаўрацыйнай галіной з'яўляецца адсутнасць у рэспубліцы дзеяздольнай сістэмы кіравання ў рэстаўрацыі і ахове гісторыка-культурнай спадчыны, адсутнасць канцэпцыі бюджэтных асігнаванняў па найбольш значных аб'ектах, незацікаўленасць з боку органаў мясцовай улады, прадпрыемстваў, арганізацый у выдзяленні сродкаў і матэрыяльна-тэхнічых рэсурсаў на кансервацыю і рэстаўрацыю гісторыка-культурных каштоўнасцей [438, спр. 12, арк. 170]. У прэамбуле самой пастановы адзначаўся дрэнны стан спраў аховы помнікаў: «...органы выканаўчай улады ўсіх узроўняў аб'ектыўна не зацікаўлены ў захаванні гісторыка-культурнай спадчыны, што па статыстыцы з'яўляецца прычынай пераважнай большасці парушэнняў Закона Беларускай ССР аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры» [534].

Замест аб'яднання рэстаўрацыйных сіл у краіне ў 1991 г. было скасавана аб'яднанне «Белрэстаўрацыя», якое ажыццяўляла кааардынацыю і метадычную палітыку ў рэстаўрацыйнай справе, накіроўвала намаганні па падрыхтоўцы кадраў, стварэнне рэстаўрацыйна-рамонтнай базы на месцах. За два гады, што

---

[1] У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 снежня 2010 г. праграма была распрацавана і прынята ў якасці дзяржаўнай на 2012–2018 гг.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прайшлі пасля гэтага, адбылося скарачэнне колькасці работнікаў з 2 тыс. да 898 чалавек, занятых рэстаўрацыйнымі работамі. Выказваліся думкі аб тым, што адбывалася распыленне сродкаў па вялікай колькасці аб’ектаў, што не дазваляла планава весці работы па завяршэнні рэстаўрацыі найбольш важных помнікаў гісторыі і культуры. Аддзяленне пытанняў рэстаўрацыі ад кампетэнцыі Міністэрства культуры ў 1991 г. штучна раз’яднала гэты адзіны арганізм, калі ў аднаго помніка з’явілася некалькі гаспадароў, кожны з якіх па-рознаму бачыў канцэпцыю яго выкарыстання. На этапе праектавання і рэстаўрацыі – адзін, на этапе прыстасавання і захавання – другі. Гэта параджала шматлікія цяжкасці, бо абсалютная большасць (звыш 90 %) рэстаўрыруемых помнікаў прыстасоўвалася пад патрэбы культуры. У той час пытаннямі аховы, рэстаўрацыі і захавання помнікаў гісторыі і культуры займаліся Галоўнае ўпраўленне па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры і Дзяржаўная інспекцыя па ахове гісторыка-культурнай спадчыны [439, спр. 8, арк. 136].

У верасні 1994 г. была праведзена рэарганізацыя Галоўнага ўпраўлення па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь у Камітэт па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў у структуры Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Асноўнымі напрамкамі яго дзейнасці былі вызначаны: забеспячэнне фінансавання рамонтна-рэстаўрацыйных работ у рэгіёнах рэспублікі; развіццё і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы рэстаўрацыйных арганізацый. У пачатку 1990-х гг. адбывалася стварэнне новых і рэарганізацыя дзеючых арэндных прадпрыемстваў у дзяржаўныя пры заснаванні іх камітэтам і мясцовымі органамі кіравання. У 1992–1993 гг. рэарганізавана з арэнднага ў дзяржаўнае прадпрыемства «Магілёўрэстаўрацыя», створаны дзяржпрадпрыемствы «Полацкрэстаўрацыя», а таксама «Праектрэстаўрацыя»[1] ў г. Мінску [438, спр. 12, арк. 171].

У чэрвені 2001 г. адбылася рэарганізацыя Камітэта па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь шляхам зліцця з Камітэтам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны [30]. З лістапада таго ж года – Дэпартамент па ахове гісторыка культурнай спадчыны і рэстаўрацыі [154], з красавіка 2004 г. – Упраўленне па ахове гісторыка культурнай спадчыны і рэстаўрацыі без права юрыдычнай асобы [513].

У краіне склалася ***служба нагляду за аховай гісторыка-культурнай спадчыны***. Інспектары па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўваходзілі ў сістэму органаў культуры ўсіх аблвыканкамаў, а таксама ў аддзелы культуры шэрага гарвыканкамаў. Работнікі гэтай катэгорыі мелі двайную падпарадкаванасць (мясцоваму выканкаму і Міністэрству культуры). Агульная колькасць работнікаў дадзенай сферы ў 2007 г. прадстаўлена ў табл. 1.

---

[1] Загадам міністра культуры Рэспублікі Беларусь ад 28 лістапада 2005 г. № 217 УП «Праектрэстаўрацыя» рэарганізавана шляхам далучэння да яе даччынага навукова-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белінфармрэстаўрацыя». Загадам Мінскага гарадскога тэрытарыяльнага фонду дзяржаўнай маёмасці ад 31 снежня 2008 г. № 196 УП «Праектрэстаўрацыя» ператворана ў адкрытае акцыянернае таварыства «Праектрэстаўрацыя».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 1.* **Спецыялісты, адказныя за ахову гісторыка-культурнай спадчыны ў 2007 г. [76, т. 6, арк. 152]**

| Вобласць | Ва ўпраўленнях культуры абласных (Мінскага гарадскога) выканкамаў | У райгарвыканкамах | | | | агульная колькасць |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | аддзелы культуры | музейныя работнікі | метадысты раённых метадцэнтраў | работнікі цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы | |
| Брэсцкая | 1 | 5 | – | 14 | – | 20 |
| Віцебская | 1 | 8 | 13 | 1 | 2 | 25 |
| Гомельская | 1 | 2 | 16 | 4 | 1 | 24 |
| Гродзенская | 1 | 7 | 2 | 6 | 3 | 19 |
| Магілёўская | 1 | 5 | 18 | – | – | 24 |
| Мінская | 1 | 6 | 14 | 4 | 1 | 26 |
| г. Мінск | 1 | – | – | – | – | 1 |
| Усяго | 7 | 33 | 63 | 29 | 7 | 139 |

У 2010 г. па абласцях у гэтай сферы працавалі 134 чалавекі. Але з іх толькі 49 з’яўляліся вызваленымі, г. зн. займаліся аховай помнікаў прафесійна і адказна. Усе астатнія – сумяшчальнікі: альбо бібліятэкар, альбо музейны ці клубны работнік. Калі ўлічыць іх кваліфікацыю, дасведчанасць і залежнасць ад рэгіянальнага кіраўніцтва, то гаварыць аб эфектыўнасці не даводзілася. Так, у Магілёўскім раёне функцыі аховы спадчыны выконваў тэхнік гаспадарчай групы аддзела культуры райвыканкама. У штаты ўпраўленняў культуры аблвыканкамаў, а таксама штаты аддзелаў культуры Кобрынскага, Пінскага, Нясвіжскага, Мазырскага, Лідскага, Слонімскага, Навагрудскага, Бабруйскага і Мсціслаўскага райвыканкамаў распараджэннем Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь былі ўведзены пасады спецыялістаў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Аднак на гэтых спецыялістаў былі ўскладзены і пытанні па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў, пытанні манументальнага мастацтва, музеяў, кадравай работы і інш. [80, т. 5, арк. 156; 784, с. 4].

У другой палове 2010 г. Міністэрства культуры правяло 19 праверак выканання заканадаўства ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны 41 гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Пытанні выканання заканадаўства па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ў Брэсцкай, Гродзенскай, Віцебскай і Мінскай абласцях і г. Мінску ў 2010 г. былі разгледжаны Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь. У ходзе праверак органамі пракурорскага нагляду былі вызначаны недахопы ў арганізацыі работы па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Адзначана, што ў рэгіёнах краіны не былі прызначаны службовыя асобы, адказныя за захаванасць каштоўнасцей; адсутнічаў належны ўлік аб’ектаў спадчыны: некаторыя аб’екты не мелі ўліковых дакументаў (уліковая картка, пашпарт), не былі ўсталяваны ахоўныя дошкі, не падпісаны ахоўныя абавязацельствы. Былі выяўлены выпадкі выканання работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях без дазволу Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [80, т. 5, арк. 146–147].

У 2010 г. Камітэт дзяржаўнага кантролю звярнуў увагу на распаўсюджанне ў краіне ценявога бізнесу па гандлі прадметамі старыны, якія былі вынайдзены

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пры правядзенні несанкцыянаваных археалагічных раскопак. Паспяховай дзейнасці так званых чорных капальнікаў спрыяла сярод іншага недасканаласць існаваўшай на той час сістэмы кантролю і нагляду за захаваннем гісторыка-культурнай спадчыны. Навядзенне парадку сіламі Міністэрства культуры было немагчыма, бо яго супрацоўнікі (інспектары) пры выўленні несанкцыянаваных раскопак не маглі ні затрымаць, ні знайсці фізічную асобу ці яго транспартны сродак. У выніку «чорныя капальнікі» беспакарана разбуралі культурны слой, наносілі страты эканамічным інтарэсам дзяржавы, а таксама яе гісторыка-культурнай спадчыне. Камітэт дзяржаўнага кантролю ў 2010 г. выказаўся за распрацоўку на ўзроўні Савета Міністраў сістэмы мер, накіраваных на забеспячэнне неабходнага кантролю і нагляду ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны  [81, т. 3, арк. 19–20].

Названыя ў прадстаўленні парушэнні заканадаўства сведчылі аб неабходнасці ўзмацнення адказнасці Міністэрства культуры, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, уласнікаў і ўладальнікаў гісторыка-культурных каштоўнасцей і прыняцця мер па ажыццяўленні найбольш дзейснага кантролю па ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей, за правядзеннем работ, умовамі ўтрымання і выкарыстання аб'ектаў спадчыны [104, с. 17].

У 2010 г. пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь быў зацверджаны распрацаваны Міністэрствам культуры План мерапрыемстваў па забеспячэнні кантролю і нагляду ў сферы аховы гісторыка-культурнай спад-чыны. Згодна з гэтым дакументам, таксама планавалася стварэнне міжведамаснай інспекцыі па ахове гісторыка-культурай спадчыны ды ўнясенне неабходных змяненняў у дзеючае заканадаўства [815].

У тым жа годзе на ўзроўні намесніка прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь быў зацверджаны дэталёвы план распрацоўкі сістэмы мер па забеспячэнні кантролю і нагляду ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Міністэрства культуры распрацавала канцэпцыю праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове археалагічнай спадчыны». У ім меркавалася вызначыць меры па ахове археалагічных аб'ектаў пры правядзенні земляных і будаўнічых работ, устанавіць парадак правядзення навуковых даследаванняў помнікаў археалогіі, правы і абавязкі іх даследчыкаў, увесці абмежаванні на выкарыстанне металашукальнікаў і іншага пошукавага абсталявання [81, т. 6, арк. 12–14].

У кастрычніку 2010 г. калегія Міністэрства культуры прыняла шэраг рашэнняў, накіраваных на забеспячэнне адпаведнага выканання заканадаўства ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны [80, т. 5, арк. 147–151]. Калегія рэкамендавала разгледзець пытанне аб увядзенні ў апараты адзелаў культуры пасад спецыялістаў па ахове спадчыны (пры наяўнасці ў рэгіёне 50 і звыш гісторыка-культурных аб'ектаў); падрыхтаваць прапановы па рэарганізацыі сістэмы аховы спадчыны; прасіць Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь аб аказанні супрацоўнікам органаў пракурорскага нагляду дапамогі спецыялістам гар/райвыканкамаў у вырашэнні пытанняў прыцягнення да адказнасці вінаватых у невыканані заканадаўства ў сферы аховы гісторыка-культурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спадчыны. Калегія рэкамендавала Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радзе па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры запрашаць да ўдзелу ў пасяджэннях незалежных экспертаў з мэтай усебаковага разгляду і падрыхтоўкі заключэнняў па праектнай дакументацыі.

Акрамя гэтага, калегіяй былі вызначаны тэрміны па распрацоўцы і ўнясенні на разгляд раённых і гарадскіх Саветаў дэпутатаў рэгіянальных праграм па ахове спадчыны, вызначэнні на месцах асоб, упаўнаважаных складаць пратаколы аб адміністрацыйных правапарушэннях ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны з наступным інфармаваннем Міністэрства культуры. У рашэнні была адзначана неабходнасць правядзення абласных і Мінскага гарадскога семінараў па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Упраўленням культуры аблвыканкамаў было даручана прааналізаваць ход выканання зацверджанага на ўзроўні намесніка прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь 19 лістапада 2009 г. Плана дзеянняў па перадачы невыкарыстоўваемых сядзіб, якія знаходзяцца ў сельскай мясцовасці і малых гарадскіх паселішчах, суб’ектам аграэкатурызму.

Па стане на 1998 г. у Рэспубліцы Беларусь мелі юрыдычную сілу некалькі рэгламентуючых ***улік каштоўнасцей*** дакументаў. *Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь*, фарміраванне якога ажыццяўлялася паводле артыкула 21 Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, утрымліваў 282 нерухомых аб’екта, 6 камплектаў рухомых прадметаў і 50 духоўных каштоўнасцей. (На 1.07.2001 г. – 467 нерухомых аб’ектаў спадчыны, 26 рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей, што складаліся з 6816 прадметаў, і 50 духоўных каштоўнасцей [439, спр. 415, арк. 9] .) *Спіс помнікаў гісторыі і культуры рэспубліканскага значэння БССР* (зацверджаны пастановай Савета Міністраў БССР ад 18.02.1988 г. № 32) складалі 3496 нерухомых аб’ектаў. Спісы помнікаў мясцовага значэння Брэсцкай, Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай абласцей, а таксама г. Мінска ўтрымлівалі адпаведна 135, 206, 231, 331, 415, 3629, 259 нерухомых аб’ектаў. Самым вялікім быў *Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі* (зацверджаны пастановай Савета Міністраў БССР ад 01.10.1984 г. № 350), які ўключаў 14 322 нерухомыя аб’екты. Патрабаванні Закона «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» распаўсюджваліся на 15 769 гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [439, спр. 209, арк. 49].

Спецыялістамі выказвалася думка аб тым, што ўлік матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей на той час быў даволі поўным, а па пэўных пазіцыях нават неабгрунтавана шырокім. У прыватнасці, гэта датычыла ў першую чаргу гістарычных аб’ектаў, шэраг з якіх не адпавядаў нават заканадаўчым крытэрыям, што дзейнічалі на момант іх уключэння ў дзяржаўныя спісы. На работы на такіх аб’ектах распаўсюджваліся значныя падатковыя льготы. Імі карыстаўся, напрыклад, будынак Камароўскага рынку ў г. Мінску, уключаны ў свой час навукоўцамі ў Збор помнікаў гісторыі і куль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры Беларусі. Такія факты наводзілі спецыялістаў на думку аб неабходнасці пазбаўлення названага збору статусу афіцыйнага дакумента па пытаннях аховы каштоўнасцей. Чакаемае пры гэтым памяншэнне колькасці прынятых пад ахову матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей магло кампенсавацца ўключэннем у спісы нанава выяўленых нерухомых аб’ектаў. Напрыклад, у 1998 г. чакалі разгляду 93 прапановы наконт удакладнення Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей. Іх аўтары прасілі надаць статус каштоўнасці 263 аб’ектам і пазбавіць гэтага статусу 145 прынятых пад ахову помнікаў гісторыі і культуры [439, спр. 209, арк. 49].

Побач з гэтым існавалі і іншыя погляды. Напрыклад, у жніўні 2001 г. калегія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь разгледзела пытанне «Аб зберажэнні гісторыка-культурнай спадчыны ў Гродзенскай вобласці». Паводле розных спісаў, на тэрыторыі Гродзенскай вобласці на індывідуальным уліку ў 2001 г. знаходзіліся 1572 аб’екты. З іх у г. Гродна налічвалася 38 архітэктурных помнікаў. Акрамя гэтага, гістарычны цэнтр горада, як помнік горадабудаўніцтва і архітэктуры комплекснага характару, уключаў звыш 500 аб’ектаў шараговай забудовы. У той жа час па Гродзенскай вобласці ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей было ўключана толькі 74 аб’екты спадчыны, з якіх 55 знаходзілася ў г. Навагрудку і толькі 3 у г. Гродна. Спецыялісты адзначалі, што адсутнасць завершанага паводле дзеючага заканадаўства дзяржаўнага ўліковага дакумента з’яўлялася немалаважным фактам, які ўскладняў ажыццяўленне эфектыўных мерапрыемстваў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. На пераважнай большасці гісторыка-культурных каштоўнасцей на той час не былі ўстаноўлены ахоўныя дошкі, што прадугледжвалася артыкулам 31 Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Значная колькасць гістарычных помнікаў была пазбаўлена належнай увагі з боку інспектарскіх службаў па іх ахове. Не была ў поўнай меры арганізавана работа па падпісанні ахоўных абавязацельстваў з уласнікамі каштоўнасцей (патрабаванне арт. 84 Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны) [439, спр. 415, арк. 10].

Спецыялісты адзначалі, што «з-пад дзеяння Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны фактычна выпаў поўны комплекс археалагічных помнікаў». Адсутнасць паўнавартаснага дзяржаўнага дакумента па ўліку аб’ектаў спадчыны ўскладняў правядзенне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ і прыцягненне на іх патрэбы пазабюджэтных інвестыцый [439, спр. 415, арк. 10].

З іншых істотных праблем уліку матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей выдзялялася прывязка археалагічных аб’ектаў. Гэта адна з найбольш шматлікіх груп каштоўнасцей на практыцы аказалася безабароннай ад знішчэння ў першую чаргу менавіта па прычынах неканкрэтнасці вызначэння месцазнаходжання кожнага з аб’ектаў. Сітуацыя ўскладнялася яшчэ і тым, што індэнтыфікацыю археалагічнага аб’екта па знешнім выглядзе мог ажыццявіць толькі спецыяліст. У шэрагу ж выпадкаў (селішча, бескурганны могільнік і інш.) нават для спецыяліста візуальнага агляду было недастаткова, неабходны былі натуральныя даследаванні [439, спр. 209, арк. 50].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Значна менш праблем было ва ўліку матэрыяльных рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. На думку спецыялістаў, яны маглі ўзнікнуць на стадыі кантактаў органаў дзяржаўнай улады з прыватнымі калекцыянерамі. Значна больш пытанняў паўставала з улікам духоўных каштоўнасцей. Для іх вырашэння Беларускім дзяржаўным інстытутам праблем культуры было праведзена даследаванне «Канцэпцыя і методыка выяўлення і аховы духоўных гісторыка-культурных каштоўнасцей» [439, спр. 209, арк. 50].

На працягу 1990-х гг. адбыліся некаторыя станоўчыя вынікі. Была створана сістэма бюджэтнага інвеставання рэстаўрацыйных работ, у якой значная роля была адведзена службам заказчыка, утвораным у аблвыканкамах, іншых мясцовых выканаўчых і распарадчых органах.

У адпаведнасці з артыкулам 25 Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны быў створаны Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь. З пачатку асноўная ўвага пры яго фарміраванні надавалася матэрыяльным нерухомым гісторыка-культурным каштоўнасцям, пазней пачала ўключацца інфармацыя аб рухомых матэрыяльных каштоўнасцях, помніках археалогіі, духоўных гісторыка-культурных каштоўнасцях [439, спр. 413, арк. 20].

На працягу 2006–2007 гг. быў пераглеџаны пералік аб’ектаў, якім быў нададзены статус гісторыка-культурных каштоўнасцей [27, 41]. У яго ўвашлі каля 5 тыс. аб’ектаў.

У Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у 2007 г. знаходзіліся 4710 гісторыка-культурных каштоўнасцей, у тым ліку: 66 рухомых матэрыяльных (прадметы антыкварыяту, клады, кнігі, абразы, карціны і інш.), 52 нематэрыяльныя (50 гербоў і два абрады – «Юр’е» і «Ваджэнне і пахаванне стралы»), 4592 нерухомыя матэрыяльныя аб’екты спадчыны. Звесткі па абласцях прыведзены ў табл. 2.

*Табліца 2.* **Звесткі аб нерухомых матэрыяльных аб’ектах спадчыны, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь па стане на 2007 г. [76, т. 6, арк. 154]**

| Вобласць | Помнікі архітэктуры, горадабудаўніцтва | | | | Усяго | Помнікі гісторыі, запаведныя месцы | | | | Усяго | Помнікі мастацтва | | | | Усяго | Помнікі археалогіі | | | | Усяго | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | катэгорыі | | | | | катэгорыі | | | | | катэгорыі | | | | | катэгорыі | | | | | |
| | 0 | 1 | 2 | 3 | | 0 | 1 | 2 | 3 | | 0 | 1 | 2 | 3 | | 0 | 1 | 2 | 3 | | |
| Брэсцкая | 1 | 4 | 120 | 189 | 314 | 1 | – | 1 | 226 | 228 | – | – | 6 | 2 | 8 | – | – | 1 | 160 | 161 | 711 |
| Віцебская | 2 | 2 | 68 | 199 | 271 | – | – | 1 | 253 | 254 | – | – | 2 | 2 | 4 | – | – | – | 345 | 345 | 874 |
| Гомельская | 1 | 2 | 26 | 136 | 165 | – | – | – | 286 | 286 | – | – | 1 | 7 | 8 | – | – | 1 | 376 | 377 | 836 |
| Гродзенская | 5 | 12 | 101 | 106 | 224 | 1 | 2 | 5 | 84 | 92 | – | – | 1 | 2 | 3 | – | – | 10 | 319 | 329 | 648 |
| Мінская | 2 | 7 | 74 | 109 | 192 | – | 2 | 3 | 147 | 152 | – | – | 3 | 1 | 4 | – | – | 1 | 305 | 306 | 654 |
| Магілёўская | – | 3 | 24 | 88 | 115 | – | 2 | 1 | 125 | 128 | – | – | – | 4 | 4 | – | – | 1 | 333 | 334 | 581 |
| г. Мінск | – | 2 | 73 | 164 | 239 | – | 1 | 2 | 13 | 16 | – | – | 27 | 1 | 28 | – | – | – | 5 | 5 | 287 |
| **УСЯГО** | **11** | **30** | **478** | **990** | **1524** | **2** | **7** | **13** | **1131** | **1152** | **0** | **0** | **40** | **19** | **59** | **0** | **0** | **14** | **1843** | **1857** | **4592** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Колькасць аб’ектаў нерухомай спадчыны, унесеных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей, з года ў год павялічвалася. Толькі за перыяд з 2007 па 2010 г. спіс папоўніўся 665 пазіцыямі, ці амаль на 13 % (табл. 3). Такія істотныя змены звязаны з актывізацыяй дзейнасці спецыялістаў Магілёўскай вобласці па ўнясенні аб’ектаў у згаданы спіс. Так, помнікаў археалогіі, якія знаходзяцца на тэрыторыі вобласці, за перыяд 2008–2010 гг. было ўключана 465. Аднак колькасць помнікаў архітэктуры на Магілёўшчыне за 5 гадоў зменшылася на 45 %. За згаданы перыяд неістотнае змяншэнне па гэтай катэгорыі аб’ектаў назіралася толькі ў Мінскай вобласці.

*Табліца 3.* **Нерухомыя аб’екты спадчыны, якія ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь у 2005–2010 гг. [360, с. 30–31]**

| Вобласць, год | Усяго | Помнікі | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | архітэктуры | гісторыі | мастацтва | археалогіі |
| Брэсцкая | | | | | |
| 2005 | 693 | 288 | 225 | 17 | 163 |
| 2008 | 725 | 330 | 226 | 8 | 161 |
| 2010 | 740 | 339 | 228 | 7 | 162 |
| Віцебская | | | | | |
| 2005 | 863 | 266 | 254 | 15 | 328 |
| 2008 | 885 | 283 | 252 | 4 | 346 |
| 2010 | 922 | 290 | 256 | 4 | 368 |
| Гомельская | | | | | |
| 2005 | 834 | 166 | 282 | 11 | 375 |
| 2008 | 844 | 166 | 293 | 8 | 377 |
| 2010 | 864 | 167 | 311 | 8 | 377 |
| Гродзенская | | | | | |
| 2005 | 645 | 210 | 87 | 28 | 320 |
| 2008 | 676 | 252 | 94 | 3 | 329 |
| 2010 | 725 | 296 | 95 | 4 | 329 |
| г. Мінск | | | | | |
| 2005 | 283 | 239 | 11 | 29 | 4 |
| 2008 | 288 | 239 | 16 | 28 | 5 |
| 2010 | 294 | 242 | 17 | 29 | 5 |
| Мінская | | | | | |
| 2005 | 674 | 207 | 148 | 9 | 310 |
| 2008 | 654 | 194 | 150 | 4 | 306 |
| 2010 | 657 | 194 | 151 | 4 | 305 |
| Магілёўская | | | | | |
| 2005 | 692 | 221 | 124 | 13 | 334 |
| 2008 | 590 | 120 | 129 | 4 | 335 |
| 2010 | 1055 | 121 | 129 | 4 | 800 |
| Па краіне | | | | | |
| 2005 | 4684 | 1597 | 1131 | 122 | 1834 |
| 2008 | 4662 | 1584 | 1160 | 59 | 1859 |
| 2010 | 5257 | 1649 | 1187 | 60 | 2346 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па стане на пачатак 2010 г. статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці быў нададзены: абрадам Веткаўскага, Жыткавіцкага раёнаў Гомельскай вобласці, Капыльскага і Салігорскага раёнаў Мінскай вобласці; песенным традыцыям Ельскага і Лельчыцкага раёнаў Гомельскай вобласці, Чавускага раёна Магілёўскай вобласці і Любанскага раёна Мінскай вобласці; традыцыйным рамёствам Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці і Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці. Абрад «Калядныя цары» в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці быў уключаны ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якая знаходзіцца пад пагрозай знішчэння. Былі падрыхтаваны і накіраваны ў штаб-кватэру ЮНЕСКА матэрыялы па ўключэнні ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай спадчыны чалавецтва ЮНЕСКА рамеснай традыцыі «Творчасць майстроў-шапавалаў Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці» [103, с. 12, 14].

Законам Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» ***ахова*** трактавалася як сістэма арганізацыйных, прававых і эканамічных мер па зберажэнні каштоўнасцей ад: 1) знішчэння або пагрозы знішчэння; 2) знікнення або пагрозы знікнення; 3) прычынення або пагрозы прычынення шкоды; 4) пагаршэння або пагрозы пагаршэння тэхнічнага стану; 5) навукова неабгрунтаваных змен, уключаючы асяроддзе; 6) пагаршэння ўмоў успрымання.

Па першых дзвюх пазіцыях у краіне былі зафіксаваны факты парушэння закона ў выглядзе знішчэння каштоўнасцей у дачыненні да археалагічных аб’ектаў. За 1997–1998 гг. Камітэт па ахове гісторыка-культурнай спадчыны атрымаў звесткі аб 15 фактах знішчэння фрагментаў археалагічнага культурнага пласта, 13 фактаў пацвердзіліся ў ходзе праверак, было выдадзена 11 прадпісанняў на забарону дзейнасці, што прыводзіла да знішчэння археалагічнага культурнага слоя [439, спр. 209, арк. 51].

Мелі месца спробы ініцыяваць знос архітэктурных каштоўнасцей. Яскравым прыкладам у канцы 1990-х гг. было імкненне Гомельскага гарвыканкама дабіцца дазволу на знос выдатнейшага ўзору савецкага канструктывізму – «Дома камуны» ў г. Гомелі [439, спр. 209, арк. 51].

Па пытанні прычынення або пагрозы прычынення шкоды каштоўнасцям свядомыя выпадкі былі рэдкімі. На першым этапе ўвядзення ў дзеянне Закона «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» прама ці ўскосна парушальнікамі гэтай пазіцыі былі даследчыкі археалагічнага культурнага слоя. Напрыклад, быў высечаны фрагмент старажытнай драўлянай забудовы, што быў выяўлены ў шурфе ў г. Віцебску, замест таго, каб пашырыць памеры раскопу і вывучыць пабудову цалкам. Быў пакінуты незакрытым раскоп на месцы існавання былога фарнага касцёла ў г. Гродна, што прывяло да абрушэння фрагментаў культурнага слоя на сценках і іншых пашкоджанняў, а таксама да маральных страт (у культурным слоі выявіліся чалавечыя астанкі). У выніку прынятых мер двум вінаватым археолагам па выпадку ў г. Гродна не былі выдадзены сертыфікаты па праца натуральных даследаванняў. Камітэт выступіў супраць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэгістрацыі ў далейшым адкрытых лістоў на права правядзення раскопак гэтымі археолагамі [439, спр. 209, арк. 52].

У снежні 2000 г. з мэтай правядзення аналізу стану спраў і падрыхтоўкі канкрэтных прапаноў па выпраўленні недахопаў у сферы захавання гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрствам культуры была створана міжведамасная камісія.

Разгледзеўшы заўвагі органаў пракурорскага нагляду, камісія прыйшла да высновы, што з часу прыняцця ў 1992 г. Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны заставаліся неажыццёўленымі шэраг яго вызначальных палажэнняў [439, спр. 413, арк. 20].

Камісія адзначала, што за 8 гадоў з даты ўвядзення ў дзеянне артыкула 21 закона, якія прадугледжваў стварэнне Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, у яго было ўключана толькі каля 500 помнікаў даўніны з амаль 17 тыс., прынятых пад ахову дзяржавы ў 1970 – пачатку 1990-х гг.[1]. Гэта складала ўсяго каля 2,6 % ад агульнай колькасці ахоўваемых аб'ектаў. Астатнія 97,4 % помнікаў гісторыі і культуры, якім паводле артыкула 45 закона належала надаць катэгорыю каштоўнасці, былі фактычна выведзены за рамкі дзеяння заканадаўчага акта. Такім чынам, на думку спецыялістаў, была створана сітуацыя, калі ў дачыненні да арганізацыі работ на пераважнай большасці аб'ектаў культурнай спадчыны маглі прымацца адвольныя рашэнні без увагі да патрабаванняў дзеючага заканадаўства [439, спр. 413, арк. 20–21].

Без нарматыўнага ўрэгулявання ў пачатку 2000-х гг. заставаўся шэраг палажэнняў, якія былі выразна акрэслены ў асобных артыкулах Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Напрыклад, неўрэгуляванасць дзеянняў па разборцы аварыйных канструкцый гістарычных будынкаў прыводзіла да таго, што пад гэтым выглядам здзяйсняўся поўны знос помнікаў (што было катэгарычна забаронена артыкулам 28 закона) з наступным узвядзеннем новых будынкаў на месцы страчаных аб'ектаў культурнай спадчыны. Не выконвалася норма закона аб распрацоўцы праектаў зон аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей у індывідуальным парадку для кожнай матэрыяльнай нерухомай каштоўнасці (артыкулы 29, 30). Дакументацыя на выкананне работ на апошніх, як правіла, узгаднялася Камітэтам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны без праектаў зон аховы.

На той час так і не была зацверджана ва ўстаноўленым парадку форма ахоўных дошак, якія павінны былі ўстанаўлівацца на падставе артыкула 31. Не быў вызначаны парадак выдачы сертыфікатаў спецыялістам на права правядзення работ на каштоўнасцях (артыкулы 52, 53). За ўвесь перыяд дзеяння За-

[1] На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у пачатку 1990-х на дзяржаўным уліку знаходзіліся каля 17 тыс. матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, з якіх 3496 аб'ектаў былі прыняты пад ахову рэспубліканскага значэння Пастановай Савета Міністраў БССР № 32 ад 18 лютага 1988 г. У шэрагу апошніх вылучаюцца 415 помнікаў архітэктуры, 167 – мастацтва, 1096 – гісторыі, 1818 – архітэктуры, якія мелі розную ступень захаванасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны кваліфікацыя спецыялістаў сертыфікатамі не пацвярджалася. Выключэнне складалі археалагічныя раскопкі, на права выканання якіх адкрытыя лісты чатырох форм выдаваў Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Пры адсутнасці акрэсленых крытэрыяў праходзіла працэдура прызначэння і забеспячэння дзейнасці навуковага кіраўніка, у тым ліку і без пацвярджэння сертыфікатам кваліфікацыі спецыялістаў (артыкулы 57, 58). Адсутнічала эканамічнае абгрунтаванне аплаты працы навуковага кіраўніка на аб’екце гісторыка-культурнай спадчыны.

Заставаліся не выкананымі або выкананымі толькі часткова асобныя палажэнні Закона аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, якія рэгламентавалі ажыццяўленне канкрэтных дзеянняў. Акрамя фарміравання інфармацыі Банка звестак (арт. 25) толькі за кошт помнікаў архітэктуры не была забяспечана перадача ў Банк звестак бясплатных экзэмпляраў навукова-даследчай і праектна-каштарыснай дакументацыі на ўсе віды работ на каштоўнасцях і ў зонах іх аховы, а таксама рэспубліканскіх друкаваных выданняў, у якіх разглядаліся пытанні гісторыка-культурнай спадчыны. Не было арганізавана належнае афармленне ахоўных абавязацельстваў (арт. 84), што ўскладняла правядзенне захаваўчых мерапрыемстваў на каштоўнасцях, сярод якіх – ажыццяўленне ўліковай палітыкі і работа з уласнікамі і карыстальнікамі каштоўнасцей. Адсутнічаў фонд аховы, зберажэння і аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны народа Беларусі (арт. 88). У дзейнасці Беларускай рэспубліканскай Навукова-метадычнай рады (арт. 11) назіралася адсутнасць належнай падрыхтоўкі пытанняў, якія выносіліся на яе разгляд, што зніжала значэнне Рады ў справе захавання культурнай спадчыны, прыводзіла да нерацыянальнага выкарыстання часу і інтэлектуальнага патэнцыялу яе сяброў. Прынятце ў асобных выпадках недастаткова ўзважаных рашэнняў (будынак на вул. Герцэна, 12 або шматузроўневая аўтастаянка на 500 машын у межах помніка горадабудаўніцтва і архітэктуры рэспубліканскага значэння – Верхняга горада на вул. Няміга ў Мінску) [439, спр. 413, арк. 20–21].

Найбольш складаныя пытанні ўліку, захавання, аднаўлення, утрымання, выкарыстання і змены гісторыка-культурных каштоўнасцей катэгорыі 0, 1, 2 разглядаліся на пасяджэннях Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры, якая праводзілася штомесячна, а ў пэўных выпадках – з выездам у рэгіёны краіны [76, т. 6, арк. 152–153].

На працягу 2007 г. работы праводзіліся на 12 аб’ектах гісторыка-культурнай спадчыны камунальнай уласнасці, фінансуемых Міністэрствам культуры ў парадку долевага ўдзелу за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту [76, т. 6, арк. 153].

Калегія Міністэрства культуры ў 2007 г. адзначала як вельмі эфектыўны вопыт Брэсцкай вобласці, дзе на працягу шэрага гадоў дзейнічала адладжаная сістэма аховы спадчыны. Стратэгічныя напрамкі і арганізацыя практычнага рашэння пытанняў аховы спадчыны на тэрыторыі вобласці былі падкантрольныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абласной міжведамаснай каардынацыйнай радзе па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны, якую ўзначальваў старшыня аблвыканкама, сакратаром з’яўляўся спецыяліст упраўлення культуры [76, т. 6, арк. 153].

Заслугоўвала ўвагі дзейнасць Пружанскага, Ляхавіцкага, Бярозаўскага і Івацэвіцкага раёнаў па прыцягненні школьнікаў і грамадскіх аб’яднанняў да выканання работ у гістарычных парках, па добраўпарадкаванні ў Іванаўскім раёне аб’ектаў «Геадэзічнай дугі Струве», уключаных у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, па замацаванні шэфаў ад прадпрыемстваў г. Брэста за добраўпарадкаваннем фартыфікацыйных збудаванняў Брэсцкай крэпасці. Абагульнены вопыт Брэсцкага аблвыканкама быў рэкамендаваны для выкарыстання ва ўсіх абласцях краіны, але ўкараненне яго адбывалася недастаткова актыўна [76, т. 6, арк. 155].

У Віцебскай вобласці былі здзейснены мерапрыемствы, вызначаныя Комплекснай доўгатэрміновай праграмай развіцця г. Полацка і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, што дазволіла пачаць распрацоўку канкрэтных напрамкаў, аб’яднаных у Комплексную доўгатэрміновую праграму развіцця г. Полацка як вядучага культурна-турыстычнага цэнтра Рэспублікі Беларусь да 2015 г. [76, т. 6, арк. 155].

У 2006 г. пры Мінскім гарвыканкаме быў створаны і функцыянаваў аператыўны штаб па рэалізацыі комплекснай праграмы рэканструкцыі, рэстаўрацыі і добраўпарадкавання гістарычнага цэнтра г. Мінска, праводзілася працы па рэканструкцыі і рэстаўрацыі Лошыцкага сядзібна-паркавага комплексу і прылеглых тэрыторый [76, т. 6, арк. 155].

На працягу 2006–2007 гг. быў распрацаваны турыстычны маршрут «Залатое кола Гомельшчыны», па маршрутах якога праводзіліся ўладкаванне гістарычных месцаў, помнікаў, стварэнне неабходнай інфраструктуры, развіваўся прыдарожны сэрвіс [76, т. 6, арк. 155–156].

У Гродзенскай вобласці значная ўвага была нададзена рашэнню пытанняў гістарычнай часткі абласнога цэнтра, рэстаўрацыі Аўгустоўскага канала з наступным уключэннем у сферу турыстычнага абслугоўвання. Для прыцягнення турыстаў у зонах аб’ектаў спадчыны праводзіліся культурныя акцыі, відовішчныя мерапрыемствы, фальклорныя і народныя святы. Шырокую папулярнасць набылі фестывалі «Аўгустоўскі канал у культуры трох народаў», сярэдневяковай культуры «Замак Гедэміна» (г. Ліда), «Навагрудскі замак», Беларускі фестываль мастацтваў «Мірскі замак», тэатралізаванае свята «Анненскі кірмаш» (г. п. Зельва) [76, т. 6, арк. 156].

Побач з відавочнымі поспехамі былі і недахопы. Да іх ліку адносілася недастатковая арганізацыя правядзення інспектарскіх праверак зместу і выкарыстання аб’ектаў спадчыны, што прыводзіла да грубых парушэнняў заканадаўства ў ходзе рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ ці іншага ўздзеяння на гісторыка-культурныя каштоўнасці. Нізкім заставаўся ўзровень кваліфікацыі работнікаў, якія вялі пытанні аховы спадчыны ў рай- і гарвыканкамах, асабліва ў Віцебскай і Магілёўскай абласцях. На месцах была слаба арганізавана

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работа па інвентарызацыі гістарычнай забудовы гарадоў Полацка, Пінска, Магілёва, Заслаўля, шэрага малых гарадоў і населеных пунктаў, якія мелі гістарычныя значныя мясціны. Патрабавала вырашэння пытанне функцыянальнага прыстасавання былых сядзібна-паркавых комплексаў, паркаў, якія знаходзіліся ў безгаспадарчым ці аварыйным стане за межамі населеных пунктаў. Рашэнне гэтай праблемы дазволіла пачаць вырашаць пытанні рэстаўрацыі сядзібаў у вёсцы Лынтупы Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці, у вёсцы Жылічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці [76, т. 6, арк. 157, 160].

Нізкі працэнт вырабу пашпартоў аб'ектаў спадчыны і праектаў зон іх аховы не дазваляў ствараць належныя ўмовы для захавання адметных якасцей гісторыка-культурных каштоўнасцей, што вяло да страты іх гістарычнай дакладнасці, змены навакольнага асяроддзя. Усяго, адпаведна дзеючым у розныя перыяды заканадаўчым нормам, па стане на 2007 г. было распрацавана 42 праекты зон аховы, і толькі 21 з іх быў зацверджаны пастановамі Міністэрства культуры [76, т. 6, арк. 157, 160].

Найбольш цярпелі ад разбуральнага ўздзеяння помнікі археалогіі. Існавала неабходнасць узмацнення кантролю выканання рэгламентаў аховы культурнага слоя ў гістарычных цэнтрах гарадоў, дзе працэсы гаспадарчай дзейнасці насілі найбольш цяжкія наступствы, якія прыводзілі да знішчэння археалагічных аб'ектаў. Побач з гэтым неабходна было мяняць падыходы да захавання археалагічнай спадчыны, размешчанай у севазваротах, лясных угоддзях, паставіўшы такім чынам заслону «чорным капальнікам». [76, т. 6, арк. 156, 160]

Калегія Міністэрства культуры ў 2007 г. выказвала прапанову аб узмацненні ўпраўленнямі культуры працы па арганізацыі мерапрыемстваў, накіраваных на выяўленне і вывучэнне захаваўшыхся аўтэнтычных праяў народнай творчасці – прыкладаў наяўнай нематэрыяльнай (духоўнай) спадчыны, што прадстаўляюць рэгіянальныя асаблівасці Рэспублікі Беларусь, для наступнага ўключэння ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [76, т. 6, арк. 158].

Адным са складнікаў спадчыны народа Беларусі з'яўляецца ***спадчына***, якая засталася на ***тэрыторыі, пацярпелай ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС***. У сакавіку 1991 г. было прынята рашэнне аб стварэнні Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі ў раёнах, пацярпеўшых ад аварыі на ЧАЭС [539]. Экспедыцыя каардынавала ўсе працы па выратаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей у зоне адсялення, мела філіялы ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях.

Вынікам дзейнасці экспедыцыі стала стварэнне фонду твораў традыцыйнай народнай культуры і мастацтва паўднёва-ўсходняга рэгіёна Беларусі, які налічваў звыш 3 тыс. экспанатаў. Пасля правядзення сіламі супрацоўнікаў экспедыцыі дэзактывацыі і рэстаўрацыі яны былі размешчаны ў Музеі старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук [420, с. 112].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1993 г. быў выдадзены «Звод помнікаў археалогіі чарнобыльскай зоны», у які былі ўключаны 924 аб'екты з апісаннем месца знаходжання, стану помніка, вынікаў даследавання і бібліяграфічнымі звесткамі.

У пачатку 2001 г. экспедыцыя перастала дзейнічаць у сувязі са спыненнем фінансавання [6].

У лістападзе 1999 г. калегія Міністэрства культуры разгледзела пытанне *«Аб стане аховы і рэстаўрацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь»*. Яно было ініцыявана даручэннем старшыні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, зробленым на выніках разгляду ліста прадстаўнікоў навуковай і творчай інтэлігенцыі па праблеме захавання гісторыка-культурнай спадчыны г. Мінска.

Праблемны зварот інтэлігенцыі аб негатыўных працэсах у справе збярэжэння гісторыка-культурнай спадчыны ў перыяд актывізацыі работы органаў дзяржаўнай улады ў дадзеным напрамку сведчыў, на думку спецыялістаў, аб неналежным стане гісторыка-культурнай спадчыны ў Беларусі і недастатковасці мер, прымаемых для паляпшэння сітуацыі. Са зместу адкрытага ліста вынікала, што найбольшую занепакоенасць выклікалі ў той час пошукі варыянтаў прыцягнення да справы рэстаўрацыі каштоўнасцей пазабюджэтных інвестыцый (стварэнне акцыянернага таварыства, перадача каштоўнасцей у недзяржаўныя формы ўласнасці) і павелічэнне колькасці паўнапраўных удзельнікаў аднаўленчага працэсу [439, спр. 283, арк. 34].

У рашэнні калегіі адзначалася, «што ўплыў сацыяльна-эканамічных змен на практыку аховы і рэстаўрацыі гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь неадназначна ўспрымаецца грамадскасцю, і з гэтай прычыны праводзімая ў гэтым напрамку дзяржаўная палітыка павінна перыядычна аргументавана асвятляцца ў сродках масавай інфармацыі» [439, спр. 283, арк. 30].

Нягледзячы на прымаемыя захады, крытыка справы аховы гісторыка-культурнай спадчыны з боку грамадскасці працягвалася і ў наступныя гады. У 2001 г. своеасаблівай акцыяй пратэсту сталі крытычныя артыкулы і лісты-звароты ў рэдакцыі газет спецыялістаў вядучых арганізацый, звязаных з даследаваннем і аховай гісторыка-культурнай спадчыны, занепакоеных планамі будаўніцтва шматузроўневай аўтастаянкі з аб'ектамі гандлёвага і адміністрацыйнага прызначэння па вул. Няміга на тэрыторыі Верхняга горада г. Мінска. Значны грамадскі рэзананс мелі публікацыі за ўратаванне мемарыяла Курапаты з нагоды мяркуемага будаўніцтва кальцавой аўтадарогі на дадзенай тэрыторыі, аховы Кальварыйскіх могілак, захаванне будынка былой сінагогі па вул. Дзямітрава, 3 у г. Мінску, якія, нягледзячы на ўсе пратэсты, быў разбураны [439, спр. 585, арк. 54].

Доўгі час у краіне быў не распрацаваным механізм і парадак узаемадзеяння з грамадскімі арганізацыямі па здзяйсненні сумеснага канролю за выкананнем заканадаўства па ахове спадчыны і вядзення сумеснай тлумачальнай працы сярод насельніцтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У мэтах забеспячэння рэалізацыі артыкула 4 Закона *«Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь»* (2006 г.), які надаў грамадскім арганізацыям магчымасць шырокага супрацоўніцтва з дзяржаўнымі органамі ў вызначаным напрамку, а таксама ажыццяўлення грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны, 22 кастрычніка 2008 г. было прынята *Палажэнне аб парадку ажыццяўлення грамадскімі аб'яднаннямі грамадскага кантролю за выкананнем заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны* [608]. Такі кантроль павінен быў здзяйсняцца шляхам удзелу прадстаўнікоў рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў у складзе *грамадскай назіральнай камісіі пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны*. Правам здзяйснення грамадскага кантролю валодалі толькі члены камісіі. Камісія стваралася з дзесяці прадстаўнікоў зарэгістраваных у вызначаным парадку рэспубліканскіх грамадскіх аб'яднанняў, статутнай мэтай ці прыярытэтным напрамкам дзейнасці якіх з'яўлялася ахова гісторыка-культурнай спадчыны, і прадстаўніка Міністэрства культуры. Адпаведна загаду міністра культуры, месцы ў камісіі атрымалі прадстаўнікі Беларускага саюза архітэктараў, Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Беларускага камітэта Міжнароднага савета па помніках і мясцінах (ІКАМОС), Беларускага фонду культуры, БНФ «Адраджэнне», «Гісторыкі», Беларускага саюза мастакоў [78, т. 2, арк. 196–197].

Камісіі надавалася права здзяйсняць грамадскі кантроль на пытаннях выканання патрабаванняў ахоўных абавязацельстваў у адносінах да гісторыка-культурных каштоўнасцей; выканання парадку і (альбо) умоў правядзення работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях або здзяйснення дзеянняў, якія стваралі пагрозу гісторыка-культурным каштоўнасцям; выканання рэжымаў утрымання і (альбо) выкарыстання зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; наяўнасці на нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях ахоўных дошак адзінага ўзору; выканання патрабаванняў аб абмежаванні правоў уласніка (карыстальніка) гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Як заўважаў старшыня грамадскай камісіі А. Бутэвіч, «задача камісіі – зменшыць шкодныя ўплывы ўсіх арганізацый і структураў, якія маюць дачыненне да помнікаў, на гэтыя помнікі. […] Там, дзе мы маем будынак, гістарычны аб'ект – там трэба максімальна захоўваць аўтэнтыку. Пра гэта казаў на выніковай калегіі міністр культуры – нельга рэстаўрацыю пераўтвараць у будаўніцтва!.. Але ж гэткае будаўніцтва ў нас – занадта часта!..» [373].

А. Бутэвіч прыводзіў прыклады парушэнняў: «Незаконна знішчаны экскаватарам помнік архітэктуры па Рэвалюцыйнай, 24а, пачаліся без дазволу працы на гарадской сядзібе на плошчы Свабоды, 15, зняцце даху па вуліцы Кірылы і Мяфодзія, 8 у Мінску. Вуліца Гандлёвая рызыкуе быць забудаваная немаведама чым. Ужо былі пасяджэнні на гэтую тэму з "Мінскай спадчынай". І Грамадская камісія тут замінае, блытаецца пад нагамі, не дае разбураць!



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыклад – нам удалося адстаяць унікальную печ на аднаўленні царквы Святога Духа. Яе збіраліся знішчыць, пракласці на гэтым месцы фундамент – мы дамагліся, каб унікальная печ засталася. З трывожных сігналаў – Полацк, дзе Еўфрасіннеўская царква з зялёнага колеру змяніла дах на залацісты – чаго ніколі не было!.. І тут прычына не ў “падабаецца – не падабаецца”. Ёсць гісторыя, ёсць аўтэнтыка – і так павінна быць» [373].

Стварэнне грамадскай назіральнай камісіі актывізавала дзейнасць грамадскіх арганізацый у справе аховы спадчыны. Найбольш уплывовай сярод іх было *Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры*. Яго старшыня з’яўляўся членам згаданай камісіі. Таварыства неаднаразова звярталася да шырокай грамадскасці, Міністэрства культуры, Генеральнай пракуратуры з заявамі аб выяўленых парушэннях ахоўнага заканадаўства. Напрыклад, у 2008 г. былі знішчаны наступныя помнікі, унесеныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей: дом па вуліцы Рэвалюцыйнай, 17 у г. Мінску, драўляны свіран XIX ст. з в. Янавічы Клецкага раёна, культурны пласт гістарычных цэнтраў Мінска і Гродна [747].

Сябры таварыства ўдзельнічалі ў працах па захаванні значных помнікаў. Сумесна з аб’яднаннем «Рэгіянэт» у жніўні 2008 г. быў праведзены міжнародны валан-цёрскі летнік у рамках праграмы «Меморыя» ў Паставах 2008 г. [747].

Актыўная праца Таварыства па захаванні гістарычнага цэнтра Мінска прывяла арганізацыю да напружаных адносін з Мінгарвыканкамам. У выніку ў канцы красавіка 2008 г. з боку КУП «Мінская спадчына» была скасавана дамова арэнды на памяшканне па вул. Старажоўскай, 5. Усе спробы таварыства заключыць новую дамову і на ўмовах ільготнай арэнднай платы не ўдаліся [747].

Негатыўныя працэсы адбываліся і ўнутры арганізацыі. Так, у 2008 г. практычна перастала працаваць Мінскае гарадское аддзяленне, яго кіраўніцтва ігнаравала ўсе магчымыя формы працы – ад заснавання новых структур да рэагавання на парушэнні заканадаўства ў г. Мінску [747].

Аб адсутнасці паразумення з зацікаўленымі бакамі гаварыў і старшыня грамадскай камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны А. Бутэвіч: «Мы ж даём сігналы, адсочваем праблемы. Але кожны раз сутыкаемся з неразуменнем і чуем: а нашто нам захоўваць гэтую гнілую крокву, мы новую зробім! Таму ў Лошыцы робіцца новы будынак, таму ў доме па Рэвалюцыйнай, 24а знішчылі роспісы на сценах, таму ў Міры па старадаўнім парку пракладвалі бульдозерам дарожкі, каб пакласці непатрэбную там плітку, агаліўшы карані дрэваў і прыкрыўшы іх затым камянямі. […] У нас жа стаўленне да помнікаў архітэктуры вельмі легкадумнае. Людзі не разумеюць, што калі будынак з’яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю, – у яго нельга цвік забіць без дазволу спецыялістаў!.. У нас жа, на жаль, гаспадар можа зрабіць усё, што заўгодна, і пасля будзе даказваць сваю праўду. Калі б за тыя парушэнні, якія цяпер адбываюцца, хоць каго пакаралі – гэта было б не толькі пакараннем аднаму чалавеку, але і прыкладам для іншых: дзяржава ў стане пакараць парушальнікаў» [373].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З атрыманнем незалежнасці Рэспублікі Беларусь актуальнымі сталі пытанні ***рэстытуцыі і ідэнтыфікацыі*** гісторыка-культурных каштоўнасцей. З 14 лютага 1992 г. на тэрыторыі Беларусі ўступіла ў сілу пагадненне дзяржаў – членаў СНД *«Аб вяртанні культурных і гістарычных каштоўнацей дзяржавам іх паходжання»*. У пагадненні быў вызначаны механізм, па якім павінна была адбывацца працэдура вяртання спадчыны. Дакумент уступіў ў сілу з моманту яго падпісання краінамі-удзельніцамі. Расія, аднак, спецыяльнай пастановай Вярхоўнага Савета Расійскай Федэрацыі ад 19 лютага 1992 г. прыпыніла яго дзеянне на сваёй тэрыторыі да прыняцця адпаведных заканадаўчых актаў, што фактычна надало пагадненню дэкларатыўны характар [439, спр. 888, арк. 72].

Далейшых крокаў па вырашэнні адзначанай праблемы на заканадаўчым узроўні ў Беларусі не было.

У 1992 г. была створана *Дзяржаўная камісія па рэстытуцыі пры Міністэрстве культуры*. Аднак яе дзейнасць працягвалася нядоўга. Фактычна пытаннямі выяўлення, вяртання, сумеснага выкарыстання і ўвядзення ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі, на працягу ўсяго вывучаемага перыяду займалася грамадская камісія *«Вяртанне і захаванне нацыянальных культурных каштоўнасцей»*, якая была створана яшчэ ў 1987 г. пры Беларускім фондзе культуры (камісія «Вяртанне»). Была праведзена вялікая работа па дакументаванні звестак і стварэнні адзінай картатэкі гэтых каштоўнасцей. Па распараджэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2004 г. намаганнямі Дэпартамента па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры была створана Канцэпцыя электроннага каталога гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь [439, спр. 888, арк. 72–73].

Важным крокам у палітыцы «вяртання каштоўнацей» бачылася стварэнне сістэмы мерапрыемстваў у рамках так званай мяккай рэстытуцыі. Гэта фарміраванне нацыянальнай калекцыі кампакт-дыскаў страчанай спадчыны, правядзенне разнастайных міжнародных выставак беларускіх каштоўнасцей, інтэрнэт-сесій, міжнароных канферэнцый і семінараў, публікацыі і г. д. [439, спр. 888, арк. 73].

Дзейнасць *Дзяржаўнай міжведамаснай камісіі* была адноўлена ў пачатку 2009 г. (на гэты раз пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь). Яе асноўнымі задачамі былі: вызначэнне прыярытэтных для Рэспублікі Беларусь напрамкаў, выпрацоўка прапаноў, рэкамендацый у вызначанай сферы [23].

З мэтай скаардынаваць дзейнасць рэстаўрацыйных саветаў музеяў, бібліятэк, іншых юрыдычных і фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, якія праводзяць работы па рэстаўрацыі і кансервацыі, пры Міністэрстве культуры быў створаны *Рэспубліканскі рэстаўрацыйны савет па культурных каштоўнасцях*. Рашэнне аб стварэнні савета было прадыктавана неабходнасцю ўзмацнення працы, надання большай увагі пытанням рэстаўрацыі і кансервацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей. У склад новага ор-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гана ўвайшлі 14 прафесійных спецыялістаў па пытаннях рэстаўрацыі. Сярод функцый рады важнае месца займалі разгляд і прыняцце рашэнняў па пытаннях арганізацыі, даследаванне і ажыццяўленне працэсаў рэстаўрацыі і кансервацыі культурных каштоўнасцей, падрыхтоўка заключэнняў па выкананых работах, ацэнка якасці праведзеных работ і адпаведнасці іх методыкі правядзення работ па рэстаўрацыі і кансервацыі культурных каштоўнасцей [80, т. 1, арк. 174].

Рэстаўрацыйны савет таксама быў надзелены правам уносіць прапановы і рэкамендацыі па паляпшэнні і ўдасканаленні рэстаўрацыйнай дзейнасці, па падрыхтоўцы рэкамендацый аб узроўні кваліфікацыі мастакоў-рэстаўратараў і ўнясенні прапаноў па разглядзе іх кваліфікацыі з мэтай прысваення адпаведнай катэгорыі. Гэты орган атрымаў права пры неабходнасці прыцягваць для правядзення рэстаўрацыі культурных каштоўнасцей або кансультацый па пытаннях выканання рэстаўрацыйных работ спецыялістаў з іншых краін, узгадняць ўмовы і парадак правядзення стажыровак мастакоў-растаўратараў.

Такім чынам, за два дзесяцігоддзі ў краіне была распрацавана дзейсная нарматыўная прававая база, накіраваная на ўзмацненне аховы аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, іх кансервацыю і рэстаўрацыю, прыцягненне да адказнасці вінаватых у наўмысным разбурэнні ці пашкоджанні каштоўнасцей. У краіне вялася работа па выяўленні, вывучэнні, класіфікацыі, уліку і папулярызацыі найбольш адметных аб'ектаў матэрыяльнай і нематэрыяльнай творчасці.

Побач з гэтым актуальнымі былі пытанні прадухілення пашкоджання і знішчэння помнікаў матэрыяльнай спадчыны. Відавочным было супрацьстаянне грамадскасці і выканаўцаў рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ. У 2008 г. была створана сістэма грамадскага кантролю за захаваннем гісторыка-культурнай спадчыны, што значна актывізавала дзейнасць грамадскіх арганізацый у гэтым напрамку. Грамадскія арганізацыі дэманстравалі дасягненні і ў справе аднаўлення помнікаў гісторыі і культуры. Дзейнічалі дабрачынныя фонды.

Недахоп бюджэтных сродкаў, адсутнасць спецыялістаў не дазвалялі рэалізоўваць планы па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў матэрыяльнай культуры. Не быў створаны мэтавы Фонд аховы, захавання і аднаўлення гісторыка-культурнай спадчыны народа Беларусі. Частку яго функцый узяў на сябе Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Міністэрства культуры ва ўмовах адсутнасці заканадаўчых стымулаў развіцця мецэнацтва і спонсарства імкнулася прыцягнуць пазабюджэтныя сродкі праз заснаваную ім латарэю «Скарбніца».

### 6.2. Архівы

Асноўнымі захавальнікамі дакументальнай спадчыны народа Беларусі з'яўляюцца архівы. Пераўтварэнне Беларускай ССР у незалежную суверэнную дзяржаву Рэспубліку Беларусь у пачатку 1990-х гг. прывяло да кардынальных змен і ў архіўнай галіне краіны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першая палова 1990-х гг. была адзначана шэрагам ***змен у структуры архіваў***. У красавіку 1992 г. былы Цэнтральны партыйны архіў КПБ і Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў у Мінску былі аб’яднаны ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). Абласныя партыйныя архівы Брэсцкай і Віцебскай абласцей былі далучаны да адпаведных дзяржаўных архіваў, а партыйныя архівы Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей былі пераўтвораны ў філіялы дзяржаўных архіваў.

У кастрычніку 1992 г. замест Галоўнага архіўнага ўпраўлення быў створаны Камітэт па архівам і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (Белкамархіў). У маі 1993 г. Цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі быў перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны архіў, а Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў у г. Гродна – у Беларускі дзяржаўны гістарычны архіў.

10 жніўня 1992 г. Цэнтральны гістарычны архіў у г. Мінску быў пераўтвораны ў Цэнтр гістарычных дакументаў у складзе Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, а праз некалькі месяцаў (у лістападзе) быў ліквідаваны. Праверка дзейнасці НАРБ у 1994 г. паказала беспадстаўнасць аб’яднання двух комплексаў дакументаў, якія не маюць ніякіх прыкмет агульнасці (дакументаў феадальнай і капіталістычных эпох з дакументамі адной палітычнай структуры эпохі сацыялізму). У чэрвені 1995 г. былы Нацыянальны архіў быў расфарміраваны. Комплекс дакументаў былога Цэнтральнага партыйнага архіва быў перададзены ў Беларускі дзяржаўны архіў. Да апошняга перайшла і назва «Нацыянальны архіў» (НАРБ). Дакументы былога партыйнага архіва Мінскай вобласці былі перададзены ў Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. На базе фондаў былога Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў г. Мінску быў створаны Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, а Беларускі дзяржаўны гістарычны архіў перайменаваны ў Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна.

На гэтым пераўтварэнні не скончыліся. У 1996 г. філіялы абласных архіваў былі пераўтвораны ў занальныя дзяржаўныя архівы (ЗДА), а былыя партыйныя архівы Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей – у Дзяржаўныя архівы грамадскіх аб’яднанняў. У студзені 1997 г. Белкамархіў быў пераўтвораны ў Дзяржаўны камітэт па архівах і справаводстве Рэспублікі Беларусь (Дзяржкамархіў), яго старшыня быў уведзены ў склад Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Да гэтага перыяду адносіцца і распрацоўка першага праграмнага дакумента, які акрэсліваў перспектывы развіцця галіны на бліжэйшы час, – пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 464 ад 26 сакавіка 1998 г. «Аб асноўных напрамках развіцця архіўнай справы і справаводства ў Рэспубліцы Беларусь да 2000 года» [571]. Яе галоўнай мэтай было забеспячэнне захаванасці дакументаў ліквідаваных устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў, а таксама суб’ектаў гаспадарання недзяржаўнай формы ўласнасці, якія забяспечваюць выкананне сацыяльна-эканамічных правоў грамадзян у краіне. Шлях рэалізацыі праблемы бачыўся ў стварэнні сеткі раённых і гарадскіх архіваў па асабістым складзе. У 1999 г. аблвыканкамамі (за выключэннем Брэсцкага) былі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыняты адпаведныя рашэнні. Да пачатку 2001 г. было створана 100 такіх архіваў. Сур'ёзнай праблемай на той час была адсутнасць аддзела па архівам і справаводстве ў структуры Мінскага гарвыканкама, а таксама раённых і гарадскога архіваў у г. Мінску.

З 1999 г. у структуры архіваў пачаў працаваць архіў электронных дакументаў як падраздзяленне створанага ў канцы 1998 г. Беларускага навукова-даследчага цэнтра электроннай дакументацыі. У 2000 г. архіў здзейсніў першы прыём электронных дакументаў [456].

Пачатак XXI ст. быў адзначаны пераўтварэннямі дзяржаўнага органа кіравання архівамі і справаводствам. У верасні 2001 г. замест Дзяржкамархіва была створана дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны цэнтр па архівах і справаводстве» (Цэнтрархіў), падпарадкаваны Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь. Найбольш сур'ёзнай праблемай, звязанай з гэтым пераўтварэннем, з'явілася згуба Цэнтрархівам функцый рэспубліканскага органа кіравання па архівам і справаводстве. Гэта пазбавіла новую ўстанову магчымасці выдаваць нарматыўныя прававыя акты не толькі міжведамаснага, але і ведамаснага характару. Не з'яўляючыся дзяржаўным органам, Цэнтрархіў не меў права аднясення звестак да дзяржаўных сакрэтаў, што магло нанесці шкоду інтарэсам нацыянальнай бяспекі краіны. Значныя змены закранулі і сістэму мясцовых органаў кіравання па архівам і справаводстве. Свой былы статус захаваў толькі аддзел па архівам і справаводстве Віцебскага аблвыканкама. У іншых аблвыканкамах аддзелы былі перададзены ў падпарадкаванне Кіраўніцтва справамі, а ў Брэсцкім аблвыканкаме – ліквідаваны [562].

Становішча змянілася да лепшага ў 2002 г., калі было прынята рашэнне аб пераўтварэнні Цэнтрархіва ў Камітэт па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. Такім чынам, у сістэме дзяржаўнай архіўнай службы быў адноўлены рэспубліканскі орган кіравання, надзелены адпаведнымі правамі і паўнамоцтвамі. У Брэсцкім аблвыканкаме быў адноўлены аддзел па архівам і справаводстве. У структуры Мінскага гарвыканкама быў створаны аддзел па архівам.

Пераломным у дзейнасці па стварэнні тэрытарыяльных (раённых і гарадскіх) архіваў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (па асабістым складзе) стаў 2002 г. У той час пачалі працу апошнія з запланаваных архіваў у Гродзенскай і Мінскай абласцях, поўнасцю на працягу года была адноўлена сетка райгарархіваў у Брэсцкай вобласці, завершаны арганізацыйныя працэдуры па стварэнні Мінскага гарадскога архіва. Усяго ў краіне такіх архіваў налічвалася 127. З іх па стане на 2003 г. юрыдычнымі асобамі былі 23 архіва, структурнымі падраздзяленнямі гарвыканкамаў з'яўляліся 13 архіваў, структурнымі падраздзяленнямі райвыканкамаў – 90 [530]. Па стане на пачатак 2007 г. у тэрытарыяльных (гарадскіх і раённых) архівах мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія камплектаваліся дакументамі ліквідаваных суб'ектаў гаспадарання і па асабістым складзе, знаходзілася на захаванні 12 013 фондаў, 410 506 адзінак захоўвання [182].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У маі 2006 г. Камітэт па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь быў далучаны да Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь. У складзе Міністэрства быў створаны Дэпартамент па архівах і справаводстве.

З атрыманнем незалежнасці пачалася праца па стварэнні нацыянальнай ***прававой базы*** для архіваў. У савецкі перыяд архіўнае будаўніцтва рэгулявалася пастановамі Урада, нарматыўнымі прававымі актамі Галоўархіва СССР. У 1994 г. быў прыняты *Закон «Аб Нацыянальным архіўным фондзе і архівах у Рэспубліцы Беларусь»* [510] (новая рэдакцыя – 1999 г.). Упершыню распрацаваны закон вызначыў асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў архіўнай справе, увёў паняцце Нацыянальнага архіўнага фонду, вызначыў меры па забеспячэнні яго захаванасці, прынцыпы камплектавання дзяржархіваў, правілы доступу карыстальнікаў да архіўных дакументаў. У законе было вызначана паняцце «тэхнатронны дакумент» (дакумент, стварэнне і ўзнаўленне якога патрабуе прымянення спецыяльных тэхнічных сродкаў і сучасных тэхналогій).

У 1996 г. было зацверджана Палажэнне аб Нацыянальным архіўным фондзе Рэспублікі Беларусь. У 1997 г. Кодэкс Рэспублікі Беларусь ад адміністрацыйных правапарушэннях быў дапоўнены чатырма артыкуламі, якія прадугледжвалі адміністрацыйную адказнасць за парушэнне архіўнага заканадаўства. Закон, які ўводзіў дадзеныя змены, зацвердзіў органы Дзяржаўнай інспекцыі па архіўнай справе і вядзенні справаводства [156, с. 71]. Згаданыя артыкулы былі захаваны і ў рэдакцыях кодэкса 2003 і 2007 гг. Аднак у 2009 г. іх колькасць паменшылася. З кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях быў выключаны артыкул, які ўстанаўліваў адміністрацыйную адказнасць за парушэнне заканадаўства аб справаводстве [464].

Па стане на 1 студзеня 2008 г. у дзяржаўных архівах было ўлічана і знаходзілася на захаванні 68 743 фондаў, 12 264 079 адзінак захавання на папяровай аснове; 34 239 адзінак захавання кінадакументаў; 797 адзінак захавання відэадакументаў; 236 288 адзінак захавання фотадакументаў; 12 137 адзінак захавання фонадакументаў; 220 адзінак захавання электронных дакументаў і 565 музейных прадметаў [53].

За дваццацігадовы перыяд колькасць архіўных дакументаў павялічылася больш чым на 60 %. Пры гэтым фотадакументаў – на 80 %, фонадакументаў – больш чым у 2 разы. Пры нязначным павелічэнні колькасці архіваў у 2 разы павялічылася колькасць работнікаў (табл. 4).

Па стане на 1 студзеня 2008 г. у спісах арганізацый – крыніц камплектавання рэспубліканскіх, абласных і занальных дзяржаўных архіваў краіны налічвалася 8555 арганізацый, з іх 5917 (69 %) – дзяржаўнай формы ўласнасці, 1653 (19 %) – недзяржаўнай, 985 (12 %) – грамадскіх, дзяржаўна-грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый. Акрамя гэтага, у спісы арганізацый – крыніц камплектавання было ўключана 17 арганізацый, якія захоўвалі інфармацыйныя рэсурсы і дакументы ў электронным выглядзе, а таксама 208 арганізацый, якія захоўвалі аўдыёвізуальныя дакументы [53, с. 8].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 4.* **Дзейнасць дзяржаўных архіваў [360, с. 46; 362, с. 52]**

| Паказчык | Год | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1990 | 1995 | 2000 | 2001 | 2005 | 2010 |
| Колькасць архіваў | 28 | 36 | 36 | 36 | 31 | 31 |
| У іх знаходзіцца:<br>архіўных дакументаў, млн | 7,4 | 10,5 | 11,0 | 11,1 | 11,4 | 12,1 |
| кінадакументаў, тыс. | 22,4 | 25,4 | 28,1 | 29,6 | 33,4 | 37,1 |
| фотадакументаў, тыс. | 141,5 | 168,4 | 183,0 | 212,0 | 227,5 | 256,8 |
| фонадакументаў, тыс. | 6,7 | 8,8 | 9,8 | 9,8 | 10,7 | 14,7 |
| электронных дакументаў | – | – | – | 152 | 307 | 502 |
| карт і чарцяжоў, тыс. | 394,0 | 414,0 | 434,0 | 439,0 | – | – |
| Колькасць работнікаў, чал. | 606 | 1023 | 1153 | 1100 | 1213 | 1214 |
| Выканана запытаў грамадска-прававога характару, тыс. | 30,7 | 80,0 | 41,1 | 47,0 | 25,8 | 29,3 |
| Колькасць даследчыкаў, якія працавалі ў чытальных залах, чал. | 1429 | 2061 | 3259 | 3349 | – | – |

У другой палове 1990-х гг. архіўная галіна працавала ў няпростых ***эканамічных умовах***. Фінансаванне дзяржаўных архіўных устаноў здзяйснялася ў мінімальным аб’ёме, што дазваляла рэалізаваць асноўныя напрамкі дзейнасці і падтрымліваць толькі неабходныя тэхналагічныя рэжымы захоўвання архіўных дакументаў. Найбольш праблемным быў 1999 г., калі галіна не атрымала ўсіх запланаваных сродкаў на капітальны рамонт і інвестыцыйную праграму, адбываліся затрымкі з выдзяленнем сродкаў [207]. У 2000 г. некаторыя артыкулы выдаткаў дзяржаўнай архіўнай службы былі ўрэзаны ў 2–3 разы. У першую чаргу гэта закранула капітальны рамонт і інвестыцыйныя капіталаўкладанні. З запланаваных сродкаў было атрымана толькі 86 % [563]. У 2001 г. на ўтрыманне рэспубліканскіх дзяржархіваў было выдзелена 90 % запланаваных сродкаў, на навуковую дзейнасць – 91 %. У сувязі з тым, што і на 2002 г. бюджэт не ў поўным аб’ёме вырашаў пытанні фінансавання бягучага ўтрымання архіўных устаноў, ставілася задача актывізацыі пазабюджэтнай дзейнасці [562, с. 8–10]. Толькі ў 2004 г. архіўная галіна здолела на 100 % выканаць рэспубліканскі бюджэт. У гэтым жа годзе аб’ём атрыманых пазабюджэтных сродкаў склаў 25,4 % да бюджэтнага фінансавання [564].

На вырашэнне праблемы ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы архіўных устаноў былі накіраваны асноўныя палажэнні галіновай праграмы «Архівы Беларусі (2006–2010)» [665].

Значнай праблемай для архіўнай галіны на працягу ўсяго перыяду, ахопленага даследаваннем, з’яўляўся невысокі ўзровень заработнай платы. Падняць яго архівы здолелі за кошт пазабюджэтнага фінансавання. Напрыклад, у 2004 г. удзельная вага пазабюджэтных сродкаў у заробку склала 27 %, што ў 4 разы перавысіла планаваны аб’ём. У 2005 г. у сярэднім за месяц з пазабюджэтных сродкаў кожнаму работніку сістэмы даплачвалася звыш 23 дол. ЗША у эквіваленце. Гэта быў адзін з самых высокіх паказчыкаў сярод галін бю-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

джэтнай сферы. Аднак, нягледзячы на поспехі, у 2005 г. не быў выкананы даведзены Саветам Міністраў паказчык па росце заработнай платы. Ён склаў 97,6 % ад планавага. Асноўнымі прычынамі невыканання з'яўлялася існуючая на той момант сістэма аплаты працы работнікаў дзяржаўных архіваў, якая дазваляла выплочваць за кошт бюджэтных сродкаў толькі 86 % ад планавага памеру заработнай платы. Да гэтага трэба дадаць зацвярджэнне завышаных прагнозных паказчыкаў без уліку рэальных умоў іх выканання. Нізкія заробкі былі асноўнай прычынай звальнення работнікаў. Толькі ў 2007 г. гэты паказчык склаў 12,5 % [565].

У 1990-х гг. востра стаяла ***кадравае пытанне***. У перыяд існавання СССР у Беларусі не рыхтаваліся архіўныя кадры з вышэйшай профільнай адукацыяй, патрэбнасць у іх рэалізоўвалася за кошт запрашэння ў рэспубліку выпускнікоў Маскоўскага дзяржаўнага гісторыка-архіўнага інстытута і іншых ВНУ Расійскай Федэрацыі. Пасля 1991 г. прыток гэтых спецыялістаў у Рэспубліку Беларусь спыніўся, у выніку чаго галіну давялося камплектаваць работнікамі, якія не мелі іншы раз нават агульнай гістарычнай адукацыі. Па ініцыятыве Белкамархіва ў верасні 1992 г. гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пачаў рыхтаваць кадры для галіны па спецыяльнасці «гісторыка-архівазнаўства» [834, с. 121], а з верасня 2001 г. – «дакументазнаўства і інфармацыйнае забеспячэнне кіравання». Аднак відавочным у вывучаемы перыяд было змяншэнне колькасці спецыялістаў са спецыяльнай гісторыка-архіўнай адукацыяй і спецыялістаў ва ўзросце да 30 гадоў. Адначасова ўзрасла колькасць работнікаў прадпенсійнага і пенсійнага ўзросту. Становішча змянілася да лепшага ў пачатку XXI ст. Па стане на 1 студзеня 2005 г. агульная колькасць работнікаў галіны складала 1371 чалавек (168 – работнікі рай-, гараддзелаў), у тым ліку 1145 – на пасадах кіраўнікоў і спецыялістаў. Сярод апошніх 602 чалавекі мелі вышэйшую адукацыю, што складала 62,1 % (у 1996 г. – 56,8 %). Павялічылася колькасць работнікаў, якія мелі спецыяльную гісторыка-архіўную адукацыю: у 1996 г. – 89 чалавек, у 2004 г. – 175 (18 % ад агульнай колькасці кіраўнікоў і спецыялістаў). Назіралася тэндэнцыя да росту колькасці работнікаў на пасадах кіраўнікоў і спецыялістаў ва ўзросце да 30 гадоў. Калі ў 1996 г. яна складала 16,9 %, то ў 2004 г. – 21,4 % [52]. Аднак тэндэнцыя да старэння кадраў не была пераадолена. Калі ў 1996 г. работнікі, старэйшыя за 50 гадоў, складалі 21,7 % ад агульнай колькасці, то ў 2007 г. гэты паказчык узрос напалову і склаў 33,4 % [565].

Для падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў 1999 г. у адпаведнасці з рашэннем Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Беларусі пры Беларускім навукова-даследчым інстытуце дакументазнаўства і архіўнай справы была адкрыта аспірантура. Прыём у яе здзяйсняўся па дзвюм спецыяльнасцям – дакументалістыка, дакументазнаўства і архівазнаўства (05.25.02) і гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання (07.00.09).

Прыярытэтным напрамкам дзейнасці архіваў было ***забеспячэнне захаванасці дакументаў***. Не хапала плошчаў, замаруджваліся тэмпы рамонту і рэкан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

струкцыі будынкаў, не адпавядала актуальным патрабаванням тэхнічнае аснашчэнне[1]. Напрыклад, доўгі час нявырашаным заставалася пытанне аб пераносе ў іншы будынак Нацыянальнага гістарычнага архіва ў г. Гродна. Прыстасаваны будынак 1798 г. пабудовы не адпавядаў патрабаванням пажарнай бяспекі, не забяспечваў аптымальных умоў захавання дакументаў, загружанасць архівасховішчаў складала 240 % [55, с. 7]. У 2007 г. быў знойдзены будынак для архіва, а ў 2008 г. пачаліся работы па яго перапрафіляванні. Па стане на 2007 г. дзве трэці (19 з 32) дзяржархіваў мелі ступень загружанасці архівасховішчаў звыш 90 % [53, с. 8]. У 2010 г. на 100 % і болей былі загружаны архівасховішчы ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, дзяржаўных архівах Брэсцкай і Гомельская абласцей, Занальным дзяржаўным архіве ў г. Барысаве, Віцебскім гарадскім архіве [51, с. 9].

Ва ўмовах нестабільнага тэмпературна-вільготнаснага, санітарна-біялагічнага рэжымаў паскоранымі тэмпамі ішлі працэсы старэння дакументаў, аслаблення фізічнай асновы. У дзяржархівах па стане на 2003 г. ад 15 да 65 % дакументаў патрабавалі рэстаўрацыі. Тэрміновую неабходнасць аднаўлення затухаючых тэкстаў мелі дакументы дарэвалюцыйнага перыяду і 20–30-х гадоў XX ст. [666]. З-за адсутнасці сродкаў у 2003 г. была прыпынена рэканструкцыя будынку пад занальны архіў у г. Рэчыцы. Рэспубліканская тэхнічная лабараторыя мікрафільмавання страхавога фонду дакументацыі ў г. Гомелі ў гэтым жа годзе ўвогуле спыніла работы па стварэнні страхавога фонду на стужцы «Мікрат-500» у сувязі з немагчымасцю забяспечыць неабходную якасць мікрафільмаў пры існуючым тэхналагічным працэсе [566]. У 2005 г. адбылося тэхнічнае перааснашчэнне лабараторыі, што дазволіла асвоіць новыя тэхналогіі рэстаўрацыі і пераплёту дакументаў, а таксама аднавіць стварэнне фонду карыстання на пазітыўнай стужцы [567].

Важным крокам у напрамку вырашэння актуальных праблем забеспячэння захаванасці архіўных дакументаў стала прынятая ў 2003 г. «Праграма па захаванні архіўнай дакументальнай спадчыны – складаючай часткі інфармацыйнага рэсурсу грамадства на 2003–2010 гг.». Дакумент прадугледзеў комплекс мерапрыемстваў па пашырэнні нарматыўна-метадычнай базы па арганізацыі захавання дакументаў, выхаду на якасна новы ўзровень рэсурснага забеспячэння працэсаў захаванасці і набліжэння іх да сучасных патрабаванняў, пашырэнні ўкаранення і выкарыстання ў практыцы работы сучасных тэхналогій і тэхнічных сродкаў, выпрацоўцы строгага эканамічнага абгрунтавання і дыферэнцыраванага падыходу да іх з улікам прыярытэтаў іх каштоўнасці і фізічнага стану.

У ходзе рэалізацыі дадзенай праграмы ў 2006–2009 гг. былі ўведзены ў эксплуатацыю пасля рэканструкцыі будынкі ЗДА ў Рэчыцы, Оршы і Маладзечне, пашыраны плошчы архівасховішча ЗДА ў г. Ліда. Выкананы капітальны рамонт будынкаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, Дзяржаўнага архіва

[1] Больш падрабязна гл.: [54].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадскіх арганізацый Гродзенскай вобласці, ЗДА ў гарадах Жлобіне, Мазыры, Пінску, Слуцку [51, с. 8]. Улічваючы, што будынкі архіваў з'яўляюцца аб'ектамі павышанай пажарнай бяспекі, былі выкананы значныя аб'ёмы работ па аснашчэнні архіваў сродкамі пажаратушэння і супрацьпажарнай сігналізацыі. У мэтах абароны ад несанкцыянаванага доступу і выкрадання дакументаў (што мела месца ў Расіі, Украіне і іншых краінах) будынкі архіваў былі абсталяванны сучаснымі сістэмамі ахоўнай сігналізацыі.

У сувязі з прыняццем у канцы 2005 г. Кіраўніком дзяржавы рашэння аб размяшчэнні Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь на плошчах новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на працягу 2006 г. была здзейснена распрацоўка дакументацыі па абсталяванні і перапрафіляванні выдзеленых памяшканняў і завершаны будаўніча-мантажныя работы. У новым будынку НАРБ пачаў працаваць з верасня 2007 г.

У 2007 г. для Рэспубліканскай тэхнічнай лабараторыі мікрафільмавання страхавога фонду была закуплена навейшая вакуумная ўстаноўка для рэстаўрацыі архіўных дакументаў. Тэхнічнае перааснашчэнне лабараторыі дазволіла не толькі аднавіць у 2007 г. стварэнне мікрафотакопій фонду карыстання, але і запланаваць павелічэнне аб'ёмаў мікрафільмавання на 2008 г. [565].

Адным з актуальных напрамкаў дзейнасці архіваў з мэтай забеспячэння захаванасці дакументаў з'яўлялася *стварэнне фонду карыстання і страхавога фонду*. У маі 2001 г. Дзяржаўны камітэт па архівам і справаводстве Рэспублікі Беларусь зацвердзіў «Асноўныя напрамкі развіцця архіўнай справы і справаводства ў Рэспубліцы Беларусь на 2001–2005 гг.» [626]. У дакуменце асаблівая ўвага надавалася стварэнню страхавога фонду і фонду карыстання асабліва каштоўных дакументаў шляхам іх мікрафільмавання і лічбавага капіравання, стварэнню Зводу Нацыянальнага архіўнага фонду і камп'ютарызацыі яго асноўнай часткі – Цэнтральнага фондавага каталога, стварэння інтэрнэт-сервера органа дзяржаўнага кіравання архівамі і справаводствам, укараненню ў практыку работы дзяржаўных архіваў тыпавых аўтаматызаваных тэхналогій, а ў дзяржархівах – інфармацыйна-пошукавай сістэмы на базе тэхналогій «інтэрнэт-інтранет».

Найбольш перспектыўнай у 2005–2007 гг. бачылася рэалізацыя пастаўленай задачы шляхам алічбоўкі дакументаў з наступнай камп'ютарнай апрацоўкай і запісам на машынны носьбіт. Паралельна з гэтым вялася работа па пошуку новых шляхоў стварэння страхавога фонду [428, с. 79–80]. Па стане на 2004 г. страхавы фонд меў толькі 2,03 % спраў ад агульнага аб'ёму НАФ краіны. Яго стварэннем займаліся Цэнтральная лабараторыя мікрафільміравання і рэстаўрацыі дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь у г. Мінску і Рэспубліканская тэхнічная лабараторыя мікрафільміравання страхавога фонду дакументацыі ў г. Гомелі. Работа ў гэтым напрамку лабараторыямі абласных архіваў спынілася ў канцы 1980 – пачатку 1990-х гг. з-за зношанасці абсталявання і адсутнасці плёнкі. Выхад быў знойдзены ў канцы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1990-х гг. – архівы пачалі выкарыстоўваць тэхналогію сканіравання дакументаў [375, с. 114–119; 429, с. 105–114]. У 2005 г. было прынята рашэнне аб стварэнні фонду лічбавых копій архіўных дакументаў на базе архіва электронных дакументаў Беларускага навукова-даследчага цэнтра электроннай дакументацыі. Для гэтага было закуплена новае абсталяванне – кніжныя сканеры, тэхналогія сканіравання на якіх значна адрознівалася ад звычайных планшэтных. Супрацоўнікі галіны вялі даследаванні шляхоў укаранення камп'ютарных тэхналогій па аднаўленні затухаючага тэксту дакументаў, стварэнні фонду карыстання шляхам алічбоўкі мікрафотакопій страхавога фонду без прыцягнення арыгінальных дакументаў, распрацоўцы тэхналогіі абароны інфармацыі ў камп'ютарных базах ад несанкцыянаванага доступу [679].

У 1997 г. была прынята *Канцэпцыя аўтаматызацыі архіўнай галіны Рэспублікі Беларусь*. Аднак яна не мела дакладна сфармуліраваных стратэгічных напрамкаў рашэння пастаўленых задач. Асобныя архівы распрацавалі і ўвялі ў эксплуатацыю праграмнае забеспячэнне, якое было арыентавана толькі на спецыфіку іх работы і не адпавядала патрабаванням, вызначаным канцэпцыяй аб стварэнні тыпавых інфармацыйных тэхналогій. Значным недахопам было выкарыстанне неэфектыўных тэхналогій, што прыводзіла да стварэння маральна састарэлага праграмнага забеспячэння.

З мэтай ліквідацыі адзначаных недахопаў і пераходу да планамернай і метадычна абгрунтаванай работы па інфарматызацыі ў 2005 г. была зацверджана «Стратэгія аўтаматызацыі архіўнай галіны (2005–2010 гг.)». Побач з такімі актуальнымі пытаннямі, як аўтаматызацыя асноўнай дзейнасці дзяржаўнай галіны, арганізацыя ўзаемадзеяння дзяржаўных архіўных устаноў на базе электроннай пошты і Інтэрнэту, дакумент закранаў і такі напрамак, як перспектыўнае стварэнне рэспубліканскай інфармацыйнай сістэмы з адкрытым доступам «Нацыянальны архіўны фонд Рэспублікі Беларусь». Галаўной арганізацыяй па распрацоўцы аўтаматызаваных сістэм для дзяржаўнай архіўнай галіны з 2002 г. з'яўляўся Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі [767].

У 2010 г. была падрыхтавана да ўводу ў прамысловую эксплуатацыю тыпавая аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма дзяржаўнага архіва. На завяршаючым этапе знаходзілася стварэнне аўтаматызаванай сістэмы Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь [51, с. 10].

Сярод праблем, якія стаялі перад архіўнай галіной, было пытанне захаванасці дакументаў, што знаходзіліся ў арганізацыях звыш вызначаных тэрмінаў. Шмат у якіх архіўных установах, напрыклад, Мінскай вобласці, гэтыя аб'ёмы былі дастаткова значнымі. Адным са шляхоў рашэння праблемы бачыўся шлях заключэння дамоваў з арганізацыямі аб прадаўжэнні тэрмінаў ведамаснага захоўвання, у першую чаргу з тымі, дзе забяспечвалася адпаведная захаванасць дакументаў. Прыярытэтным на 2003 г. было вызначана рашэнне праблемы прыёму на дзяржзахаванне дакументаў з пратэрмінаваным тэрмінам ведамаснага захоўвання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На ведамасным захаванні на пачатак 2008 г. знаходзілася 1 997 902 справы пастаяннага захоўвання ўпраўленчай дакументацыі за 1943–2007 гг. Пры гэтым звыш вызначанага тэрміну ведамаснага захоўвання – 24 % спраў. Асабліва неспрыяльнай была сітуацыя з захаваннем кіна-, відэа-, аўдыёдакументаў. Паказчык па пераўзыходжанні ведамаснага захоўвання гэтых дакументаў складаў 99 %. Гэта было абумоўлена адсутнасцю ў арганізацый тэхнічных магчымасцей падрыхтоўкі гэтых дакументаў да перадачы на дзяржаўнае захаванне [546].

Новым напрамкам камплектавання дзяржаўных архіваў у вывучаемы перыяд стаў *прыём дакументаў арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці і грамадскіх арганізацый*. У 1999 г. было прынята «Палажэнне аб парадку ўліку і захавання архіўных дакументаў пры прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці». Аналізуючы стан работы ў гэтым напрамку, калегія органа дзяржаўнага кіравання архівамі і справаводствам краіны ў 2000 г. адзначала шэраг недахопаў пры афармленні парадку далейшага захавання дакументаў ў арганізацыях на момант змены форм уласнасці. На той час толькі архіўныя установы Віцебскай вобласці здолелі правільна арганізаваць і правесці работу. Калегія звяртала ўвагу дзяржархіваў на неабходнасць заключэння дамоваў з арганізацыямі недзяржаўнай формы ўласнасці [563].

Адной з крыніц папаўнення фондаў дзяржаўных архіваў з'яўляўся прыём на захаванне дакументаў асабістага паходжання. Толькі за 2000 г. было прынята 1428 такіх справаў. З іх 543 справы – дзяржархівамі Віцебскай вобласці [563].

Дзейнасць дзяржаўных архіваў не можа існаваць без ***выкарыстання дакументаў***.

У выніку перадачы ў склад дзяржаўнай архіўнай службы дакументаў былых партыйных архіваў архіўны фонд краіны папоўніўся масівам каштоўных дакументаў. Адным з напрамкаў па ўвядзенні дакументаў КПБ у навуковы зварот з'яўлялася іх рассакрэчванне (перавод рэжымных дакументаў у адкрытае карыстанне). За перыяд з 1996 па 2005 г. было рассакрэчана 10 % ад агульнай колькасці фондаў КПБ. Аднак з-за адсутнасці агульнай метадалогіі, рэгламентуючай дадзены працэс, амаль ва ўсіх архівах узнікалі істотныя цяжкасці па практычнай рэалізацыі апошняга [239, с. 93–93]. Побач з рассакрэчваннем вяліся работы па ўдасканаленні навукова-даведачнага апарату. Для паскарэння работ была распрацавана «Праграма па развіцці і ўдасканаленні ўліку і навукова-даведачнага апарата да дакументаў былых партыйных архіваў Рэспублікі Беларусь на 1998–2005 гг.» [663, с. 97].

Архівы як захавальнікі дакументальнай спадчыны садзейнічалі вырашэнню разнастайных пытанняў, звязаных з рэалізацыяй правоў грамадзян. Штогод у архіўныя ўстановы прыходзіла некалькі тысяч зваротаў ад жыхароў нашай краіны, а таксама замежжа. Значная работа ў 1990 – пачатку 2000-х гг. праводзілася па забеспячэнні былых ахвяр нацысцкага рэжыму архіўнымі даведкамі з мэтай рашэння праблемы выплаты кампенсацыі фондам «Узаемаразуменне і прымірэнне».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Побач з выданнем даведнікаў па фондам актывізавалася публікацыя дакументаў. Значнай падзеяй стала выданне ў 1999 г. першай кнігі серыі «Беларусь у актавых кнігах XVI–XVIII стст.» – «Магілёўскі магістрат 1580–1581, 1588» [240, с. 82]. У кастрычніку 1999 г. была створана Археаграфічная камісія – галіновы навуковы цэнтр, які распрацоўваў пытанні тэорыі, гісторыі і методыкі археаграфіі, а таксама каардынаваў дзейнасць архіўных устаноў па публікацыі гістарычных дакументаў [734, с. 31]. Толькі за перыяд 2001–2006 гг. архівістамі было апублікавана звыш 30 зборнікаў дакументаў, манаграфій, даведнікаў, здзейснена 6 выпускаў Беларускага археаграфічнага штогодніка і тры выпускі «Архіварыуса». У 2003 г. быў зацверджаны «План публікацыі дакументаў Нацыянальнага архіўнага фонду на 2003–2008 гг.». Толькі ў 2006 г. выйшла ў свет 14 зборнікаў дакументаў, навуковых даведнікаў, манаграфій, 11 з якіх былі падрыхтаваны рэспубліканскімі дзяржаўнымі архівамі.

У 2002 г. аўтары пяцітомнага цыкла прац «Беларускія остэрбайтэры» сталі лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Падрыхтаваны архівістамі «Даведнік аб месцах прымусовага ўтрымання насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. 1941–1944 гг.» адыграў важную ролю пры правядзенні кампенсацыйных выплат, устанаўленні сацыяльных ільгот ахвярам нацызму.

Дзяржаўнымі архівамі вялася актыўная выставачная дзейнасць. У маі – чэрвені 2006 г. у Маскве ў Выставачнай зале федэральных архіваў экспанавалася выстава «Запаведная справа ў Расіі і Рэспубліцы Беларусь. Канец XIX – пачатак XXI стагоддзя». У тым жа годзе ў Палацы Рэспублікі экспанавалася выстава да 20-годдзя Чарнобыльскай катастрофы.

Дакументы дзяржаўных архіваў шырока выкарыстоўваліся пры падрыхтоўцы дакументальных фільмаў, тэле- і радыёперадач.

Новым напрамкам у дзейнасці архіўнай галіны ў пачатку 90-х гадоў XX ст. стала работа ў вобласці тэрытарыяльнай ***геральдыкі***. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 лютага 1994 г. № 89 «Аб зацвярджэнні палажэння аб Гербавым матрыкулу Рэспублікі Беларусь» перад архівістамі была пастаўлена задача ўзнаўлення гістарычных і стварэння новых гербоў для гарадоў і гарадскіх пасёлкаў.

Новы імпульс развіццю тэрытарыяльнай і ведамаснай геральдыкі Беларусі прыдаў Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 жніўня 2002 г. № 441 «Аб утварэнні Геральдычнага савета пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і некаторых мерах па ўдасканаленні парадку заснавання і дзяржаўнай рэгістрацыі ордэнаў, медалёў і афіцыйных геральдычных сімвалаў» [228].

Важнай задачай першых гадоў незалежнасці стала ***наладжванне супрацоўніцтва*** паміж былымі савецкімі рэспублікамі, уваходжанне ў сусветную культурную прастору. У 1992–1994 гг. адбылося тры сустрэчы кіраўнікоў архіўных службаў краін – удзельніц СНД. У перыяд незалежнасці актывізавалася супрацоўніцтва ў рамках Міжнароднага савета архіваў (МСА) і яго рэгіянальных аддзяленняў – Еўрапейскага і Еўраазіяцкага (створаны ў 2000 г.). Пад



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эгідай Міжнароднага савета архіваў у 1999–2000 гг. сумесна з архівістамі Аўстрыі, Балгарыі, Харватыі, Фінляндыі, Польшчы і іншых краін Беларусь удзельнічала ў падрыхтоўцы даведніка «Агульная архіўная спадчына краін і народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы» [207]. Шырокае міжнароднае супрацоўніцтва здзяйснялася ў сферы выдання дакументаў, арганізацыі выставак, расшырэння доступу да пошукавых сродкаў. Напрыклад, у 2007 г. сумесна з Інстытутам імя Л. Больцмана па даследаванні наступстваў войнаў (Аўстрыя) быў выдадзены зборнік «Аўстрыйскія і судзецкія немцы перад савецкімі ваеннымі трыбуналамі ў Беларусі. 1945–1950 гг.»; сумесна з Расійскім дзяржаўным ваенным архівам – зборнік «Напярэдадні. Заходняя асобая ваенная акруга (канец 1939 г. – 1941 г.)».

У канцэпцыю міжнароднага супрацоўніцтва ўваходзіла выяўленне за мяжой дакументаў, якія маюць дачыненне да гісторыі Беларусі і знаходзяцца на архіўным захаванні за яе межамі. Рэспубліка Беларусь была першай краінай з СНД, якая наладзіла ў канцы 1994 г. супрацоўніцтва з Міжнароднай службай пошуку [450, с. 23].

Пры непасрэдным удзеле органаў і ўстаноў дзяржаўнай архіўнай службы 30 лістапада – 2 снежня 2006 г. у Мінску была праведзена міжнародная канферэнцыя «Праграма ЮНЕСКА “Памяць свету”: дзейнасць бібліятэк, архіваў, музеяў па захаванню дакументальнай спадчыны».

Плённым было міжнароднае супрацоўніцтва ў межах выканання праграмы «Памяць Беларусі». У 2007 г. адбыўся абмен копіямі дакументаў архіва Радзівілаў, якія захоўваліся ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі і Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве. У выніку абмену беларускі бок атрымаў мікрафотакопіі дакументаў па гісторыі Беларусі з былога Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў (12 556 кадраў мікрафотакопій 212 інвентароў маёнткаў Нясвіжскай ардынацыі за перыяд з 1605 па 1888 гг.) [833, с. 99–100].

У ліпені 2008 г. Нясвіжская калекцыя архіўных і бібліятэчных матэрыялаў Радзівілаў была ўключана ў рэестр «Памяць свету» ЮНЕСКА. Гэта адбылося дзякуючы сумесным намаганням архівістаў і бібліятэкараў Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны і Фінляндыі [457, с. 15].

Такім чынам, у вывучаемы перыяд адбылося значнае павелічэнне колькасці дзяржаўных архіўных устаноў, сфарміравалася трывалая нарматыўная прававая база, адбылося ўкараненне новых тэхналогій, было адноўлена і пашырана міжнароднае супрацоўніцтва. У краіне пачалася падрыхтоўка ўласных кадраў для архіўнай галіны. Даследчыкі атрымалі магчымасць доступу да рассакрэчаных дакументаў, значная работа праводзілася ў напрамку выканання запытаў грамадзян. Актыўна выкарыстоўваўся праграмны падыход пры рэалізацыі асноўных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі ў галіне архіваў. Разам з тым цяжкасці сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі прывялі да неаднаразовай змены статусу дзяржаўнага органа кіравання галіной, не дазволілі ў поўным аб’ёме вырашыць пытанні матэрыяльна-тэхнічнага стану архіваў, замацавання кадраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 6.3. Бібліятэкі

Значная частка інтэлектуальнай спадчыны знаходзіцца ў фондах бібліятэк – важных складніках духоўнага і матэрыяльнага багацця, культурнага і інфармацыйнага патэнцыялу грамадства. Бібліятэкі выконваюць шэраг важнейшых агульных і спецыфічных сацыяльных функцый. У сацыяльным плане яны з'яўляюцца адным са сродкаў забеспячэння камунікацыі, перш за ўсё дзякуючы стварэнню, захаванню інфармацыі і забеспячэнню доступу да яе. У культурным плане ажыццяўляюць гістарычную трансляцыю ведаў у рамках культурнай камунікацыі.

Закон, які акрэсліваў дзейнасць бібліятэк, уступіў у дзеянне ў 1995 г. пад назвай «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» [458].

У законе бібліятэка была ўпершыню вызначана як сацыяльна-культурны і інфармацыйны інстытут грамадства, які ажыццяўляе збор, захаванне і перадачу інфармацыі для задавальнення патрэб грамадства.

Неразуменне сутнасці бібліятэк і недаацэнка іх дзейнасці ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага крызісу пачатку 1990-х гг. выклікала абуральныя з'явы, такія як продаж памяшканняў бібліятэк, перавод іх у горшыя ўмовы і нават беспадстаўнае закрыццё. Гэта прывяло да разбурэння дзяржаўнай, прафсаюзнай і іншых бібліятэчных сетак, узнікнення рэальнай неабходнасці на заканадаўчай аснове абараніць бібліятэкі і іх фонды, якія з'яўляюцца агульнадзяржаўнай уласнасцю, ускласці адказнасць за лёс бібліятэк на іх заснавальнікаў. Гэтыя палажэнні былі закладзены ў главе 2 «Стварэнне, рэгістрацыя і ліквідацыя бібліятэк».

Глава 3 «Узаемаадносіны чытача бібліятэкі і карыстальніка яе паслугамі» гарантавала роўныя правы грамадзян на бібліятэчнае абслугоўванне па месцы жыхарства, вучобы, работы, адпачынку або лячэння; замацавала бясплатнасць асноўных відаў бібліятэчных паслуг; абавязала бібліятэкі ствараць умовы для прыярытэтнага абслугоўвання сацыяльна безабаронных слаёў грамадства (інвалідаў, навучэнцаў, пенсіянераў, беспрацоўных).

Упершыню заканадаўча замацоўвалася права бібліятэк самастойна ўстанаўліваць сваю структуру, штаты, сістэму аплаты працы работнікаў у межах вызначаных сродкаў; вызначаць формы і метады работы ў адпаведнасці са статутам бібліятэкі.

У адрозненні ад існаваўшай сістэмы закон надаваў бібліятэкам права самастойнага выбару каналаў і крыніц камплектавання, фарміравання фондаў з улікам прынцыпаў палітычнага, нацыянальнага і рэлігійнага нейтралітэту (глава 4 «Бібліятэчныя фонды»).

У главе 5 («Сістэма бібліятэк Рэспублікі Беларусь») была вызначана неабходнасць існавання адзінай сістэмы бібліятэк незалежна ад ведамаснай прыналежнасці з мэтай аптымальнага выкарыстання бібліятэчных рэсурсаў і стварэння роўных магчымасцей у атрыманні насельніцтвам бібліятэчных паслуг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асобным артыкулам (арт. 20) быў вызначаны комплекс функцый Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па забеспячэнні вычарпальнай паўнаты нацыянальнага фонду і ўніверсальнага збору замежных выданняў. Нацыянальная бібліятэка была вызначана як навукова-даследчы і каардынацыйны цэнтр у галіне бібліятэказнаўства і аўтаматызацыі бібліятэк.

Закон прадугледжваў ільготныя тарыфы на перасылку выданняў з фондаў бібліятэк (арт. 28). Падобная практыка існавала ў большасці краін свету згодна з Міжнароднай паштовай канвенцыяй 1953 г.

Законам былі адзначаны адпаведныя ўмовы аплаты працы і іншыя сацыяльныя гарантыі бібліятэкарам (арт. 29, 31).

У 2002 г. Закон «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» быў прыняты ў новай рэдакцыі [45]. Адзначым, што калі першая рэдакцыя прымалася на рускай мове, то другая – на беларускай. Менавіта ў новай рэдакцыі было дадзена вызначэнне тэрміна «бібліятэчная справа» – галіна інфармацыйнай, культурна-асветнай і адукацыйнай дзейнасці, задачамі якой з'яўляюцца стварэнне і развіццё сеткі бібліятэк, фарміраванне і апрацоўка бібліятэчных фондаў, арганізацыя бібліятэчнага, інфармацыйнага і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк, падрыхтоўка бібліятэчных кадраў, навуковае і метадычнае забеспячэнне дзейнасці бібліятэк.

Асновай дзяржаўнай палітыкі ў галіне бібліятэчнай справы, адпаведна з законам, з'яўлялася забеспячэнне рэалізацыі права грамадзян на бібліятэчнае, інфармацыйнае і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне.

У адрозненні ад першай рэдакцыі быў значна пашыраны спектр абавязкаў дзяржавы па развіцці бібліятэчнай справы і інфармацыйных рэсурсаў у краіне; правы бібліятэк у вызначэнні зместу і форм сваёй дзейнасці, эканамічнай і гаспадарчай сферах. У новай рэдакцыі з'явіліся асобныя артыкулы, прысвечаныя пытанням фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння бібліятэк; асноўным напрамкам дзяржаўнага рэгулявання бібліятэчнай справы і функцыям Міністэрства культуры. Дадзена паняцце відаў бібліятэк па формах уласнасці, значэнні, змесце фондаў, прызначэнні.

Аналізуючы ***дзейнасць бібліятэк у пачатку 1990-х гг.***, трэба адзначыць, што гэта быў вельмі складаны перыяд у іх рабоце, бо эканамічны крызіс і сацыяльна-эканамічныя наступствы аварыі на ЧАЭС прывялі да значнага скарачэння фінансавання апошніх. Адбывалася інтэнсіўнае скарачэнне бібліятэчнай сеткі ў сельскай мясцовасці. Гэты працэс пачаўся некалькі раней, але тады ён быў абумоўлены аб'ектыўнай прычынай – змяншэннем колькасці сельскага насельніцтва. Толькі за 1990–1995 гг. у сельскай мясцовасці былі зачынены 677 бібліятэк. Калі ўлічыць, што кожная з іх абслугоўвала не адзін, а некалькі невялікіх населеных пунктаў, то атрымліваецца, што жыхары прыкладна 1800 вёсак пазбавіліся магчымасці карыстацца бібліятэчнымі фондамі і страцілі, па сутнасці, адзіную ўстанову, дзе маглі з карысцю для сябе правесці вольны час і далучыцца да духоўных каштоўнасцей [671, с. 56].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Не здолелі масавыя бібліятэкі захаваць у ранейшым выглядзе і сваю стацыянарную сетку. Калі ў 1993 г. бібліятэчныя пункты працавалі пры 2167 бібліятэках, то ў 1995 г. – пры 1640. І зноў жа гэта закранула ў першую чаргу сельскую мясцовасць, дзе з дапамогай бібліятэк абслугоўваліся маланаселеныя і аддаленыя ад стацыянарных бібліятэк вёскі. Закрыццё бібліятэк, скарачэнне колькасці бібліятэчных пунктаў сталі першапрычынай скарачэння чытачоў у сельскай мясцовасці.

Аналізуючы становішча бібліятэк, некаторыя даследчыкі выказвалі меркаванне аб тым, што колькасць бібліятэк «становіцца празмернай, што па структуры сваёй працы і слабым матэрыяльна-тэхнічным абсталяванні, а таксама ў сілу захавання састарэлых формаў абслугоўвання большасць з іх не адпавядае змяніўшымся патрабаванням інфарматызацыі насельніцтва. […] Эра панавання кніжнай культуры змяняецца камп'ютарнай культурай. […] Менавіта пад гэтым маштабным вуглом пагляду павінна пераглядацца падрыхтоўка і перападрыхтоўка бібліятэчных кадраў». Прапаноўвалася паступова скарачаць колькасць бібліятэк, асабліва дробных, разумна узбуйняючы частку з іх, паралельна праводзіць тэхналагічнае пераабсталяванне бібліятэк, аснашчаць іх спецыялізаванымі камп'ютарнымі сістэмамі, а на вёсцы – і выязной сістэмай абслугоўвання насельніцтва [831, с. 24–25].

Развіццё бібліятэчнай галіны ў далейшым якраз і адбывалася ў дадзеных напрамках. Штуршок вырашэнню праблем бібліятэк дала пастанова Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай падтрымцы культуры» ад 1 красавіка 1996 г. № 229. У пастанове даручалася Міністэрству культуры распрацаваць прапановы аб парадку забеспячэння бібліятэк абавязковымі экзэмплярамі друкаваных выданняў; разгледзець з адпаведнымі міністэрствамі і цэнтральнымі органамі дзяржаўнага кіравання пытанне аб ільготных малааб'ёмных кантэйнерных перавозках дакументаў і перасылцы дакументаў бібліятэкам па міжбібліятэчным абанеменце для камплектавання бібліятэчных фондаў. Міністэрству сувязі і інфармацыі даручалася забяспечыць падключэнне аўтаматызаваных інфармацыйных сістэм бібліятэк да існуючых каналаў сувязі і інфармацыйных сетак. Міністэрству фінансаў сумесна з Міністэрствам культуры даручалася штогод пры распрацоўцы праектаў дзяржаўнага бюджэту на культуру прадугледжваць фінансавыя сродкі на камп'ютарызацыю бібліятэк, музеяў, а таксама на стварэнне аўтаматызаванай бібліятэчна-інфармацыйнай сістэмы ў Беларускім універсітэце культуры [439, спр. 92, арк. 1–2].

18 чэрвеня 1996 г. была прынята спецыяльная пастанова Камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь №5/66 «Аб ходзе выканання ў Рэспубліцы Беларусь Закона "Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь"». Для яе выканання Міністэрства культуры звярталася ў Кабінет Міністраў з просьбай даць даручэнні міністэрствам па рэалізацыі асобных пунктаў згаданай пастановы парламента. Патрабавалася ўдасканаленне падатковага заканадаўства: уключэнне бібліятэк у спіс устаноў, якія вызваля-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

юцца ад падаткаў на прыбытак і дабаўленую вартасць; вызваленне ад падатку на дабаўленую вартасць і прыбытак пры атрыманні фінансавых сродкаў ад замежных грамадскіх фондаў і ўстаноў для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэк; вызваленне ад падаткаабкладання фінансавых сродкаў, якія бібліятэкі атрымлівалі ад аказання платных паслуг; устанаўленне льготных тарыфаў па падаткаабкладанні ўстаноў і юрыдычных асоб, якія аказвалі фінансавую дапамогу бібліятэкам; устанаўленне льготнага падаткаабкладання ад арэнды памяшканняў бібліятэк. У пералік артыкулаў класіфікацыі даходаў і выдаткаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў неабходна было ўключыць артыкул «камплектаванне бібліятэк», а таксама вызваліць бібліятэкі ад абкладання мытнымі пошлінамі і падаткам на дабаўленую вартасць пры мытным афармленні кніг і перыёдыкі, якія дастаўляюцца з-за мяжы, па гуманітарнай дапамозе [439, спр. 96, арк. 43].

28 чэрвеня 1996 г. Камісія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы і культуры прыняла пастанову па вырашэнні пытання выратавання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і падтрымкі бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь. На імя Прэзідэнта краіны быў накіраваны зварот [439, спр. 97, арк. 42]. У ім звярталася ўвага на крытычнае і складанае становішча ў гэтай галіне культуры. Канстатаваўся факт павольнай распрацоўкі нарматыўных і інструктыўных актаў, якія б стымулявалі працэс далейшага развіцця і ўдасканалення бібліятэк, узмацнення іх фінансавай і іншай матэрыяльнай дапамогі ў аўтаматызацыі і камп'ютарызацыі гэтых устаноў культуры, ільготным падаткаабкладанні, умацаванні іх матэрыяльнай базы, у забеспячэнні новымі экзэмплярамі кніг і іншай літаратуры. Асабліва ў цяжкім стане знаходзілася Нацыянальная бібліятэка. У звароце пералічваліся факты і рабіўся вывад аб тым, што востра наспела неабходнасць будаўніцтва ў краіне новага комплексу Нацыянальнай бібліятэкі, эскізны праект якога быў завершаны ў 1993 г. [439, спр. 96, арк. 43–47].

У 1996 г. была зацверджана *«Канцэпцыя развіцця бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы Беларусь»*. У якасці прыярытэтных напрамкаў дзейнасці публічных бібліятэк на перыяд да 2000 г. яна вызначыла два – ***камплектаванне фондаў*** і ***аўтаматызацыю***. У гэты перыяд вялася распрацоўка праектаў законаў аб абавязковым экзэмпляры і Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, мэтавай праграмы па кансервацыі, рэстаўрацыі і захаванні помнікаў кніжнай культуры. У 1999 г. пры Міністэрстве быў створаны міжведамасны бібліятэчны савет [35, с. 13].

Значны рост кошту кніг з адначасовым зніжэннем фінансавання бібліятэк прывёў да памяншэння новых паступленняў у фонды публічных бібліятэк краіны, якія ў той час фактычна не папаўняліся сучаснымі відамі носьбітаў інфармацыі: кампакт-дыскамі, відэакасетамі і інш. У параўнанні з 1990 г. у 1997 г. сукупны фонд публічных бібліятэк скараціўся амаль на 9,3 млн экз. (13,2 %). Бягучыя паступленні паменшыліся больш чым на 35 %. За 1995–1997 гг. рэпертуар паступленняў у сярэднім на адну публічную бібліятэку не перавышаў 15 назваў. Павялічылася дыспрапорцыя паміж магчымасцямі бібліятэк і запат-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рабаваннямі насельніцтва. У параўнанні з 1990 г. аб'ём выдзяляемых сродкаў скараціўся амаль у 2 разы і склаў у 1997 г. каля 8 %. Але і гэтыя мізэрныя сродкі ў шэрагу выпадкаў траплялі ў бібліятэкі нерэгулярна. У практыцы з'яўлялася ўсё больш прыкладаў выдзялення бюджэтных сродкаў толькі на выплату заработнай платы.

У такіх умовах Міністэрствам культуры былі прыняты меры па паляпшэнні становішча з камплектаваннем бібліятэк: распрацаваны рэкамендацыі па ўстанаўленні нарматыву фінансавання на папаўненне фонду бібліятэк у памеры 15 % ад агульнай сумы, выдзеленай на фінансаванне бібліятэчнай дзейнасці; зацверджаны «Пералік перыядычных выданняў для падпіскі публічнымі бібліятэкамі». Згодна з існаваўшым на той час міжнародным стандартам, рэкамендавалася набываць штогод 250 новых кніг і 50 назваў перыядычных выданняў з разліку на 1 тыс. жыхароў зоны абслугоўвання публічнай бібліятэкі. Таму Міністэрства культуры звярталася з просьбай замацаваць палажэнне аб аднясенні фінансавання на камплектаванне публічных бібліятэк і падпіскі на перыядычныя выданні да абароненых артыкулаў мясцовых бюджэтаў і выдзяляць на папаўненне фондаў не менш за 15 % ад агульнай сумы, прадугледжанай на ўтрыманне бібліятэк, а таксама ўстанавіць рэгулярнасць выдзялення сродкаў (не радзей як адзін раз у квартал), каб надаць сістэмнасць набыццю літаратуры, а таксама дастатковасць рэпертуару перыёдыкі, які б задаволіў патрэбу ў ім насельніцтва рэгіёна [439, спр. 209, арк. 39–40].

Здзейсненныя меры далі вынік. У 1997 г. упершыню за 7 гадоў быў спынены працэс памяншэння штогадовых паступленняў. У параўнанні з 1996 г. за 1997 г. аб'ём новых паступленняў павялічыўся на 19,6 % [439, спр. 222, арк. 199]. Аднак на практыцы ўстаноўлены нарматыў фінансавання камплектавання не выконваўся. У 1998 г. ён склаў у сярэднім 8–9 % (у Віцебскай вобласці – 6 %, у Брэсцкай – 6,9 %) замест прадугледжаных 15 % ад агульнага фінансавання бібліятэк [35, с. 15].

Асобнай пастановай Кабінета Міністраў ад 24 чэрвеня 1996 г. быў зацверджаны парадак рассылкі абавязковых бясплатных і платных экзэмпляраў друкаваных выданняў [17] (апошняя рэдакцыя – 19 мая 2000 г.). Дакумент замяніў Пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 снежня 1991 г. № 499 «Аб парадку рассылкі кантрольных і абавязковых экзэмпляраў твораў друку». У ліпені 1997 г. Дзяржкамдрукам Рэспублікі Беларусь была зацверджана «Інструкцыя аб парадку рассылкі абавязковых платных экзэмпляраў друкаваных выданняў». Усе паліграфічныя прадпрыемствы Рэспублікі Беларусь павінны былі дасылаць да 15 экзэмпляраў сваёй прадукцыі ў бібліятэчны калектар для далейшага распаўсюджвання па адпаведных бібліятэках краіны. На жаль, бібліятэкі канстатавалі абсалютную неэфектыўнасць сістэмы для якаснага развіцця фондаў. Так, з 15 тыс. экзэмпляраў дакументаў, набытых Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі (далей – НББ) за першую палову 2001 г., толькі 115 экзэмпляраў было куплена ў бібліятэчным калектары як платны абавязковы экзэмпляр [714].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Незаменныя страты ў інфармацыйным полі краіны прынесла адсутнасць з 1995 г. абавязковага экзэмпляра расійскіх друкаваных выданняў. Шматлікія і настойлівыя высілкі НББ па адраджэнні сістэмы абмену абавязковымі экзэмплярамі на новай, эквівалентнай і ўзаемавыгаднай аснове, звароты ў вышэйшыя дзяржаўныя ўстановы, падрыхтоўка праектаў шматбаковых і двухбаковых пагадненняў у рамках СНД і Саюза Расіі і Беларусі не прывялі да канструктыўнага вырашэння гэтай праблемы. Між тым абавязковы экзэмпляр расійскіх выданняў доўгі час быў не толькі асновай фарміравання ўніверсальнага фонду НББ, але і праз добра наладжаную сістэму пераразмеркавання літаратуры істотна папаўняў калекцыі рэспубліканскіх бібліятэк-дэпазітарыяў. Пра гэта сведчаць наступныя дадзеныя: толькі ў 1992–1993 гг. з Расійскай кніжнай палаты ў фонды НББ паступіла адпаведна 67 000 экз. (40 000 экз. кніг і 27 000 экз. часопісаў) і 49 000 экз. (28 000 экз. кніг і 21 000 экз. часопісаў). За гэты ж перыяд было перададзена ў фонды рэспубліканскіх бібліятэк і бібліятэк сістэмы Мінкульта: у 1992 г. – 46 264 экз., у 1993 г. – 18 200 экз. няпрофільных, дублетных выданняў, атрыманых у асноўным у якасці расійскага абавязковага экзэмпляра [714].

***Аўтаматызацыя*** дзейнасці бібліятэк пачалася з распрацоўкі аўтаматызаванай бібліятэчнай сістэмы дзяржаўных бібліятэк у адпаведнасці з загадам яшчэ Міністэрства культуры БССР *«Аб стварэнні Рэспубліканскай аўтаматызаванай інфармацыйнай бібліятэчнай сістэмы»* ад 1 снежня 1989 г. № 184. Галоўная ўвага пры практычнай рэалізацыі ў пачатку 1990-х гг. была засяроджана на праблемах аўтаматызацыі ўнутрыбібліятэчных працэсаў, фарміравання і актуалізацыі бібліятэчных інфармацыйных рэсурсаў, у першую чаргу электронных каталогаў. У 1995 г. аўтаматызацыя ажыццяўлялася па тыпавых праграмах у 5 абласных бібліятэках, апрача Брэсцкай, 10 цэнтралізаваных бібліятэчных сістэмах (2 – г. Мінска, Баранавіцкай гарадской Брэсцкай вобласці, 7 – Магілёўскай вобласці). На базе Магілёўскай абласной бібліятэкі адпрацоўвалася мадэль узаемадзеяння Нацыянальнай і абласных бібліятэк. У гэты перыд на базе Нацыянальнай бібліятэкі і Беларускага інстытута праблем культуры вялася падрыхтоўка спецыялістаў, здольных ажыццяўляць аўтаматызацыю [47, с. 13].

Найбольш важным для бібліятэк у гэты перыяд з’яўлялася паскораная камп’ютарызацыя, перавод інфармацыйных рэсурсаў з папяровых носьбітаў у электронную форму, доступ да электронных рэсурсаў, развіццё сістэмы абмену інфармацыяй з дапамогай Інтэрнэт. Далейшыя работы былі накіраваны на развіццё сродкаў аддаленага доступу карыстальнікаў бібліятэк да іншых інфармацыйных рэсурсаў, укараненне новых тэхналогій дастаўкі дакументаў і міжбібліятэчнага абмену данымі. Гэтыя працэсы заклалі аснову якасна новай сістэмы інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання [841, с. 41].

Гаварыць аб значных дасягненнях на той перыд нельга. З-за адсутнасці фінансавых сродкаў для набыцця замежных баз данных (CD-ROM, выкарыстанне тэлекамунікацыйных сродкаў Інтэрнэт) інфармаванасць чытачоў была



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абмежаванай. Перашкоды на шляху аўтаматызацыі стварала неадпаведнасць традыцыйных бібліятэчных тэхналогій новым патрабаванням. Да нерацыянальнага выкарыстання сродкаў прыводзіла адсутнасць каардынацыі паміж установамі, падведамаснымі Міністэрству культуры, а таксама арганізацыямі іншых ведамстваў у вырашэнні праблем аўтаматызацыі [47, с. 14].

Задачы, якія стаялі перад бібліятэкамі, не ў поўнай меры ўсведамляліся мясцовымі органамі ўлады, якія падтрымлівалі ў асноўным культурна-асветную дзейнасць бібліятэк. Недаацэньвалася значэнне аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў, укаранення новых інфармацыйных тэхналогій. Вынікам гэтага стаў нізкі ўзровень абнаўлення бібліятэчных фондаў з-за хранічнай недастатковасці фінансавання. Існавалі праблемы з забеспячэннем публічных бібліятэк прафесійна падрыхтаванымі кадрамі. Адчувалася недастатковая перападрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў для работы ва ўмовах аўтаматызацыі бібліятэк, яна не мела канкрэтнага мэтанакіраванага характару [35, с. 15].

Адной з важных агульнанацыянальных задач другой паловы 1990-х гг. з'явілася фарміраванне ў Рэспубліцы Беларусь адзінай інфармацыйна-прававой прасторы. З мэтай забеспячэння насельніцтва рэспублікі дакладнай і своечасовай інфармацыяй было пачата стварэнне на базе бібліятэк Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь *публічных цэнтраў прававой інфармацыі* (ПЦПІ) [525]. Работу па фарміраванні сеткі ПЦПІ ў рэгіёнах узначалілі абласныя бібліятэкі ў адпаведнасці з рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «Аб дзейнасці абласных навуковых бібліятэк як навукова-метадычных цэнтраў» ад 28 кастрычніка 1999 г. № 8. Функцыі Рэспубліканскага навукова-метадычнага цэнтра па маніторынгу і забеспячэнні дзейнасці ПЦПІ выконвала НББ.

Згодна з статыстычнымі дадзенымі, у рэспубліцы на базе публічных бібліятэк у 2005 г. функцыяніравала 157 ПЦПІ. Яны забяспечвалі карыстальнікам свабодны доступ да афіцыйнай прававой інфармацыі [294, с. 6].

Развіццё бібліятэчнай справы ў пачатку XXI ст. набыло ***праграмны характар***. У табл. 5. прыведзены асноўныя прыярытэты развіцця галіны, якія былі вызначаны дзвюма дзяржаўнымі праграмамі развіцця культуры. У *Дзяржаўнай праграме «Функцыяніраванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года»* адзначаліся факты, якія характарызавалі становішча сферы ў канцы 1990-х гг. Сярод іх – скарачэнне фондаў на 20 % у сельскай мясцовасці, размяшчэнне амаль паловы бібліятэк у невялікіх (да 50 м$^2$) памяшканнях. Канстатаваўся факт неадпаведнасці тагачасным патрабаванням тэхнічнага пераабсталявання бібліятэк, неабходнага для захавання, рэстаўрацыі і кансервацыі фондаў, тыражыравання і камп'ютарнай сістэмы ўліку, сістэматызацыі і апрацоўкі кніг [208, с. 23].

Як можна заўважыць, у пачатку XXI ст. для бібліятэк актуальным было акрамя вырашэння праблем камплектавання зберажэнне фондаў, паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы, падрыхтоўка кадраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 5.* **Асноўныя прыярытэтныя напрамкі развіцця бібліятэчнай справы Беларусі (толькі публічныя бібліятэкі Міністэрства культуры) у 2001–2010 гг. [168, с. 26; 208, с. 23]**

<table>
<tr><th colspan="3">Год</th></tr>
<tr><th>2001–2005</th><th colspan="2">2006–2010</th></tr>
<tr><td>Камплектаванне, зберажэнне і эфектыўнае выкарыстанне наяўных бібліятэчных фондаў</td><td colspan="2">Забеспячэнне выдзялення сродкаў (не менш за 15 % ад агульнай сумы бюджэтнага фінансавання дзейнасці бібліятэк) на папаўненне кніжных фондаў</td></tr>
<tr><td>Удасканаленне заканадаўчай базы бібліятэчнай справы і аховы кніжных фондаў</td><td colspan="2">Удакладненне нарматыўна-прававых асноў функцыянавання Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і нарматыўна-прававой базы дзейнасці публічных бібліятэк</td></tr>
<tr><td>Паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы бібліятэчных установаў</td><td colspan="2">Умацаванне матэрыяльнай базы бібліятэк з мэтай пашырэння пераліку платных паслуг для павелічэння аб’ёмаў пазабюджэтнага фінансавання, накіраванага на папаўненне кніжных фондаў бібліятэк</td></tr>
<tr><td>Каардынацыя работы і ўсталяванне міжбібліятэчных сувязей на рэгіянальным і агульнадзяржаўным узроўнях</td><td colspan="2">Стварэнне карпаратыўнай сеткі бібліятэк з выкарыстаннем тэлекамунікацый, цэнтра карпаратыўнай каталагізацыі і сумеснага выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў</td></tr>
<tr><td>Кансервацыя і рэстаўрацыя кніг, перыядычных выданняў, гістарычных дакументаў</td><td rowspan="6">Новыя задачы</td><td>ажыццяўленне рэтраканверсіі картачных каталогаў і стварэнне імідж-каталога на аснове электроннага графічнага вобраза картачных каталогаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі</td></tr>
<tr><td>Развіццё навукова-даследчай і асветнай дзейнасці бібліятэк</td><td>стварэнне on-line інтэрнэт-каталогаў абласных бібліятэк</td></tr>
<tr><td>Падрыхтоўка кадраў і павышэнне іх кваліфікацыі</td><td>заканчэнне аўтаматызацыі публічных бібліятэк да 2008 г. і падключэнне бібліятэк да Інтэрнэта</td></tr>
<tr><td></td><td>распрацоўка Канцэпцыі рэгіянальнага інфармацыйнага цэнтра на базе абласной бібліятэкі</td></tr>
<tr><td></td><td>забеспячэнне рэалізацыі дзяржаўнай праграмы «Памяць Беларусі»</td></tr>
<tr><td></td><td>развіццё бібліятэчнага абслугоўвання малых населеных пунктаў з дапамогай бібліобусаў</td></tr>
</table>

У другой палове 2000-х гг. перад галіной быў пастаўлены шэраг задач, звязаных з інфарматызацыяй дзейнасці, стварэння інтэрнэт-каталогаў абласных бібліятэк, імідж-каталога Нацыянальнай бібліятэкі, стварэння карпаратыўнай сеткі бібліятэк.

У канцы 1990 – пачатку 2000-х гг. мясцовымі ўладамі вялася мэтанакіраваная работа па ***рэарганізацыі сеткі бібліятэк***. У выніку частка бібліятэк з невялікай колькасцю чытачоў была пераўтворана ў бібліятэчныя пункты, а некаторыя з іх аб’яднаны з клубамі, і на гэтай базе створаны новыя комплексныя ўстановы – клубы-бібліятэкі і бібліятэкі-клубы, праводзілася аб’яднанне сельскіх і школьных бібліятэк, у некаторых населеных пунктах бібліятэкі ўвайшлі ў склад дамоў сацыяльных паслуг. Гарадскія цэнтралізаваныя бібліятэчныя сістэмы аб’ядноўваліся з раённымі, гарадскія бібліятэкі – з прафсаюзнымі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

У канцы 1990 – пачатку 2000-х гг. у сетку публічных бібліятэк увайшлі новыя фарміраванні. Гэта перш за ўсё бібліятэкі-музеі пераважна краязнаўчай накіраванасці.

У 2002 г. у краіне налічвалася 11,5 тыс. бібліятэчных устаноў, сярод якіх – 4,7 тыс. публічных бібліятэк Міністэрства культуры, 5,6 тыс. – Міністэрства адукацыі, 0,3 тыс. – тэхнічных, 0,4 тыс. – прафсаюзных, 0,2 тыс. – медыцынскіх і іншых ведамстваў. Сукупны кніжны фонд складаў больш за 240 млн экзэмпляраў [107, с. 187].

За перыяд 2000–2004 гг. на 15 (7,6 %) скарацілася колькасць бібліятэк Міністэрства аховы здароўя, што ў большасці выпадкаў звязана з рэарганізацыяй устаноў, пры якіх яны функцыяніравалі. З 2000 г. з той жа прычыны на 67 адзінак (31,8 %) паменшылася сетка прафсаюзных бібліятэк, школьных – на 173 (4,2 %), бібліятэк вайсковых часцей – на 22 (18 %) [294, с. 4].

Па статыстычных дадзеных на 1 студзеня 2005 г., сетка бібліятэк Міністэрства культуры налічвала 4263 бібліятэкі. Сетка навукова-тэхнічных бібліятэк складала 453, бібліятэк Міністэрства аховы здароўя – 185, прафсаюзных – 240, школьных бібліятэк – 3915, бібліятэк вайсковых частак – 98, бібліятэк аграпрамысловага комплексу – 80, бібліятэк ВНУ – 51, царкоўных – 341. У бібліятэках краіны працавалі каля 17 тыс. спецыялістаў, у тым ліку 9410 – у бібліятэках сістэмы Міністэрства культуры [294, с. 4].

У 2006 г. бібліятэчная сістэма краіны ўключала каля 10 тыс. публічных і спецыяльных бібліятэк з сукупным аб’ёмам фонду каля 250 млн экзэмпляраў. Самай буйной па-ранейшаму заставалася сетка сістэмы Міністэрства культуры – 4215 бібліятэк. Сетка навукова-тэхнічных бібліятэк налічвала 469, Міністэрства аховы здароўя – 180, прафсаюзных – 240, школьных – 3840, воінскіх часцей – 98, аграпрамысловага комплексу – 80, ВНУ – 57, царкоўных – 342 бібліятэкі [111, с. 58].

У табл. 6 прыведзены асноўныя паказчыкі дзейнасці бібліятэчнай галіны краіны за перыд 1990–2010 гг.

*Табліца 6.* **Паказчыкі па ўсёй сферы публічных бібліятэк [360, с. 72; 622, с. 5–10; 685, с. 241; 686, с. 101; 688, с. 100; 796, с. 6–10; 797, с. 1–6; 798, с. 5–9]**

| Паказчык | Год | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1990 | 1995 | 1997 | 1999 | 2001 | 2003 | 2005 | 2007 | 2009 | 2010 |
| Колькасць бібліятэк | 6239 | 5367 | 5245 | 5216 | 5166 | 4743 | 4584 | 4325 | 3865 | 3849 |
| *У тым ліку на сяле* | 4991 | 4290 | 4184 | 4160 | 4117 | 3722 | 3610 | 3386 | 3188 | 3153 |
| Бібліятэчны фонд, млн экз. | 93,3 | 80,9 | 78,9 | 78,3 | 77,1 | 74,2 | 71,7 | 70,4 | 67,7 | 67,0 |
| *У тым ліку бібліятэк на сяле* | 47,4 | 38,1 | 36,7 | 35,9 | 34,8 | 32,3 | 30,6 | 29,3 | – | – |
| Колькасць чытачоў, тыс. | 4822,6 | 4419,3 | 4442,5 | 4522,2 | 4521,0 | 4329,0 | 4186,7 | 4021,2 | 3801,0 | 3810,3 |
| *У тым ліку на сяле* | 2097,0 | 1859,3 | 1803,3 | 1763,8 | 1734,4 | 1587,7 | 1489,2 | 1417,4 | 1272,0 | 1250,0 |
| Колькасць бібліятэчнага фонду на 1 чытача, экз. | 19 | 18 | 18 | 17 | 17 | 17 | 17 | 17,5 | 18 | 18 |
| На 100 чалавек насельніцтва, чыт. | 47 | 43 | 44 | 45 | 45 | 44 | 43 | 42 | 40 | 40 |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дадзеныя сведчаць, што з 1990 па 2010 г. у Рэспубліцы Беларусь адбылося скарачэнне бібліятэчнай сеткі на 2790 адзінак, ці на 45 %, чытачоў – на 801,4 тыс., ці на 16,6 %. Пры гэтым заўважным быў пяцігадовы перыяд адноснай стабілізацыі (1997–2001 гг.), калі колькасць бібліятэк зменшылася толькі на 79 адзінак (сельскіх – на 67). У гэты ж перыяд адносна стабільным заставаўся бібліятэчны фонд, колькасць чытачоў у параўнанні з 1995 г. нават расла. У далейшым становішча пагоршылася, а ў сельскай мясцовасці ўвогуле выглядала катастрафічным. Калі за перыяд 1995–2001 гг. колькасць чытачоў у сельскай мясцовасці скарацілася на 124,9 тыс. чалавек, то толькі за два гады (2001–2002 гг.) – на 192 тыс. пры скарачэнні сеткі бібліятэк на сяле на 392 адзінкі. Істотнае скарачэнне сеткі бібліятэк адбылося ў перыяд 2007–2009 гг. – на 460 адзінак (з іх 198 на сяле). Фактычна за два гады па краіне была ліквідавана кожная дзясятая бібліятэка (на сяле – кожная шостая).

Як вядома, сэнс існавання бібліятэцы надаюць яе карыстальнікі, і ўся яе дзейнасць скіравана на ***абслугоўванне*** і задавальненне іх патрэб. У першую чаргу гэта новыя групы чытацкай аўдыторыі з запытамі, якія раней не сустракаліся, у сувязі з узнікненнем новых форм занятасці і г. д.

Для вырашэння пастаўленых задач бібліятэкі ішлі рознымі шляхамі. Некаторыя з іх стваралі спецыялізаваны профіль абслугоўвання. Напрыклад, у Магілёве ў 2001 г. з’явілася бібліятэка эстэтычнага выхавання, сямейны культурны цэнтр вольнага часу. У многіх цэнтралізаваных бібліятэчных сістэмах былі створаны інфармацыйныя цэнтры рознай накіраванасці: сацыяльна-інфармацыйныя, дзелавой і фактаграфічнай інфармацыі і інш. [106, с. 44].

Многія цэнтральныя бібліятэчныя сістэмы (далей – ЦБС) распрацавалі комплексныя праграмы работы з рознымі катэгорыямі маладых чытачоў, разлічаныя на перспектыву. Сярод іх можна вылучыць праект Хоцімскай ЦБС «Моладзь і падлеткі ў XXI стагоддзі», які атрымаў у 2001 г. фінансавую падтрымку са сродкаў Фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. На новае пакаленне карыстальнікаў была разлічана праграма Мінскай гарадской ЦБС «Гуманітарная бібліятэка XXI стагоддзя». У рамках праграмы ў 2001 г. на базе цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Янкі Купалы была створана сістэма маладзёжных клубаў (літаратурнага, музычнага, кінаклуба) і галерэя візуальных мастацтваў.

Да ліку прыярытэтных адносілася работа па абслугоўванні сацыяльна неабароненых слаёў насельніцтва (інваліды, хворыя, старыя людзі і інш.). У большасці бібліятэк былі створаны базы даных аб іх, працавалі школы міласэрнасці, удзельнікі якіх клапаціліся аб хворых людзях. «Спяшайцеся зрабіць дабро», – пад такой назвай прайшлі конкурсы-агляды па абслугоўванні сацыяльна неабароненых людзей у 2001 г.

У рамках комплекснай праграмы «Жывая памяць Гомельшчыны» бібліятэкамі гэтай вобласці быў сабраны ўнікальны фонд краязнаўчых матэрыялаў на сучасных носьбітах. З выкарыстаннем новых камп’ютарных тэхналогій тут стваралася абласная база дадзеных «Спадчына Гомельшчыны» па тэмах «Знакамітыя землякі» і «Помнікі» [106, с. 45].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У пошуку новых форм працы бібліятэкі пачалі супрацоўнічаць з Праваслаўнай царквой. Спачатку гэта былі нядзельныя школы на базе публічных бібліятэк, пазней – асветніцкія цэнтры. Сярод апошніх – пры бібліятэцы № 11 г. Гомеля. Традыцыйным стаў удзел бібліятэк у Кірыла-Мяфодзіеўскіх і Свята-Ефрасіннеўскіх чытаннях, у Днях славянскай пісьменнасці і культуры [108, с. 191–192].

Працэнт ахопу насельніцтва абслугоўваннем публічнымі бібліятэкамі у цэлым па краіне ў 2005 г. складаў 36 %. Пры гэтым на сяле – 52 %. Паказальнік чытальнасці быў на ўзроўні 18,6 %, абарачальнасці – 1,1 %. У сярэднім колькасць чытачоў, што прыпадала на адну публічную бібліятэку, раўнялася 1 тыс. У гарадах на адну бібліятэку ў сярэднім прыпадала 3 тыс. чытачоў, у сельскай мясцовасці – 400.

Працягвалася рэарганізацыя сеткі бібліятэк. У гарадах гэта выявілася ў адных выпадках у аб’яднанні публічных, гарадскіх і раённых бібліятэк, у іншых – у пераводзе бібліятэк розных ведамстваў, у першую чаргу прафсаюзных, у бібліятэчную сетку Міністэрства культуры. У 2004 г. сталі гарадскімі філіяламі спецыяльныя бібліятэкі для людзей з аслабленым зрокам у Мінску і Брэсце. На працягу 2000–2004 гг. штогод у сярэднім у гарадах адкрывалася тры публічныя бібліятэкі. З’явіліся і актыўна працавалі новыя арганізацыйныя структуры: бібліятэкі-клубы, бібліятэкі-музеі, дамы і цэнтры сацыяльных паслуг, культурна-адукацыйныя і эстэтычныя цэнтры.

Найбольшыя змены адбыліся ў сетцы сельскіх бібліятэк. Адна сельская бібліятэка ў 2005 г. абслугоўвала ў сярэднім 7 сельскіх населеных пунктаў. У сувязі з гэтым востра паўстала пытанне аб дзяржаўнай падтрымцы бібліятэчнага абслугоўвання ў сельскай мясцовасці [294, с. 5].

Некаторае зніжэнне вастрыні праблемы з бібліятэчным абслугоўваннем сельскіх жыхароў звязвалася з выкананнем *Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі на 2005–2010 гг.* Хоць у ходзе яе рэалізацыі і не спынілася скарачэнне бібліятэк[1], бо закрываліся неперспектыўныя бібліятэкі ў вёсках, дзе засталося зусім мала насельніцтва, і трымаць стацыянарную бібліятэку фінансава было немэтазгодна, у практыку ўвайшлі бібліобусы – бібліятэкі на колах [781]. Побач з гэтым адбывалася ўмацаванне бібліятэк аграгарадкоў. У 2006 г. сельскае насельніцтва абслугоўвалі 226 бібліятэк-клубаў, 117 клубаў-бібліятэк, 4 бібліятэкі-музеі. У некаторых абласцях (Віцебская, Брэсцкая, Магілёўская) практыкавалася аб’яднанне сельскіх бібліятэк са школьнымі [111, с. 59]. Гродзенская вобласць у 2007 г. лідзіравала па нестацыянарным абслугоўванні. Там выкарыстоўваліся і новыя формы абслугоўвання, новыя метады ў працы [781][2].

[1] У 2007 г. найбольшае скарачэнне прайшло ў Гродзенскай вобласці. Тут скарацілі 81 бібліятэку, а за 9 месяцаў 2008 г. – 7. У той час як у Віцебскай вобласці скарацілі 24 бібліятэкі, а ў Брэсцкай – 14.

[2] Больш падрабязна дзейнасць бібліятэк па абслугоўванні розных катэгорый чытачоў разгледжана ў раздзеле 4.2. «Удзел у культурным жыцці і праблема забеспячэння роўнага доступу да культуры».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У перыяд 2000–2004 гг. ***паступленні дакументаў*** у фонды публічных бібліятэк Міністэрства культуры некалькі павялічыліся (на 254,2 тыс. адз.) і складалі ў сярэднім на адну бібліятэку 429 экз. У той жа час колькасць літаратуры, што спісвалася (састарэлая і якая мала выкарыстоўвалася), перавышала колькасць новых паступленняў. Гэта адна з асноўных прычын скарачэння аб'ёму бібліятэчнага фонду у тым ліку ў сельскай мясцовасці – на 4513,7 тыс. экз. (13 %). У асноўным на гэты стан уплывала абмежаванасць фінансавых сродкаў на камплектаванне бібліятэчных фондаў. У большасці абласцей на гэтыя мэты выдзялялася ў 2001 г. 10–12 % бюджэтных сродкаў замест рэкамендуемых Міністэрствам 15 %. Штогод спісанне старой літаратуры перавышала рост новых паступленняў амаль у 1,5–2 разы [106, с. 45]. Па меркаванні спецыялістаў, змяніць сітуацыю магло аднаўленне выдання спісу сацыяльна значнай літаратуры з улікам патрэбнасцей бібліятэк [294, с. 5].

Значны рост кошту кніг і падпіскі з адначасовым зніжэннем фінансавання бібліятэк у 2003 г. прывёў да змяншэння колькасці новых паступленняў у фонды публічных бібліятэк у параўнанні з 2000 г. на 35 %. У параўнанні з 2002 г. у 3 разы зменшыліся выдаткі на цэнтралізаванае набыццё кніг для бібліятэк. Стан камплектавання публічных бібліятэк залежаў ад рашэння мясцовых органаў улады. Прэзідэнтам краіны была пастаўлена задача арганізацыі падпіскі на беларускія перыядычныя выданні ўсімі публічнымі бібліятэкамі [439, спр. 886, с. 55].

У 2003 г. зноў вярнуліся да распрацоўкі праекта Закона *«Аб абавязковым экзэмпляры дакументаў»* (як гаварылася вышэй, першая спроба яго падрыхтоўкі была здзейснена ў канцы 1990-х гг.). Праца над ім завяршылася прыняццем у 2008 г. Закона *«Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях абавязковага бясплатнага экзэмпляра дакументаў і бібліятэчнай справы»* [477]. У тым жа годзе было зацверджана Палажэнне аб абавязковым бясплатным экзэмпляры дакументаў [610]. Закон 2008 г. унёс дапаўненні ў Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 21 красавіка 2003 г. (увёў штраф у памеры ад 20 да 50 базавых велічынь за парушэнне ўстаноўленага парадку рассылкі абавязковых бясплатных экзэмпляраў дакументаў, якія не адносяцца да перыядычных друкаваных выданняў).

Як можна заўважыць, па-за рамкамі Закона 2008 г. засталіся платныя абавязковыя экзэмпляры[1]. З іншага боку, патрабаванне аб абавязковым платным экземпляры прымушала бібліятэкі выдаткоўваць сродкі, якіх не хапала, на набыццё згаданай прадукцыі.

---

[1] Адзначым, што ў Расійскай Федэрацыі дзейнічаў Федэральны закон № 77-ФЗ «Аб абавязковым экзэмпляры» ад 29 снежня 1994 г. (са зменамі, унесенымі Федэральным законам ад 26.03.2008 № 28-ФЗ).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па выніках праверкі Камітэта дзяржаўнага кантролю па пытаннях камплектавання фондаў бібліятэк сацыяльна значнай літаратурай, якая выдаецца ў рамках дзяржзаказу, Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь было даручана аблвыканкамам і Мінгарвыканкаму накіраваць, пачынаючы з 2006 г., не менш за 15 % ад агульнай сумы бюджэтнага фінансавання, якая выдзяляецца на дзейнасць бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры, на папаўненне фондаў гэтых устаноў, ажыццяўляць закупкі кніг, выдадзеных у рамках дзяржзаказу, для камплектавання бібліятэк непасрэдна ў выдавецтвах без гандлёвых надбавак; умацаваць матэрыяльную базу публічных бібліятэк з мэтай пашырэння пераліку платных паслуг, аказваемых бібліятэкамі насельніцтву, у тым ліку на вёсцы, а таксама павялічыць аб'ёмы пазабюджэтнага фінансавання, накіраванага на папаўненне кніжных фондаў бібліятэк [110, с. 202].

Распараджэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 23 лютага 2007 г. прадпісвала накіроўваць не менш за 15 % сродкаў з мясцовых бюджэтаў, выдзяляемых на ўтрыманне бібліятэк, на мэты камплектавання. Гэта прынесла добрыя вынікі. За 2008 г. на бібліятэкі Міністэрства культуры было патрачана з мясцовых бюджэтаў каля 118 826,0 млн руб. (прыкладна 42,5 млн дол. ЗША). У тым ліку на камплектаванне фондаў выдаткавана каля 22 757,1 млн руб. (звыш 8 млн дол. ЗША). У 2008 г. памер бюджэтнага фінансавання на камплектаванне склаў 19,2 %. Своеасаблівым лідарам з'яўлялася Гомельская вобласць, дзе кіраўнікі бібліятэк знаходзілі паразуменне з мясцовымі ўладамі. У іх на камплектаванне фондаў ішло каля 27,2 % [780, с. 5].

Акрамя згаданых вышэй дакументаў на паляпшэнне камплектавання дзяржаўных публічных бібліятэк былі накіраваны даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб узаемадзеянні з грамадскім аб'яднаннем «Саюз пісьменнікаў Беларусі» (ад 7 чэрвеня 2006 г.), аб наданні бібліятэкам права закупляць сацыяльна значныя выданні напрамую ў выдавецтвах і праз абласныя кнігагандлюючыя прадпрыемствы (ад 14 лютага 2008 г.), даручэнне Главы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб уключэнні ў спіс сацыяльна значных выданняў і камплектавання фондаў публічных бібліятэк выданнямі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (ад 29 лістапада 2008 г.), даручэнне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь аб камплектаванні фондаў выданнямі Выдавецтва Беларускага экзархату (11 снежня 2009 г.) [81, т. 3, арк. 3].

Па выніках 2009 г. у сярэднім па рэспубліцы на камплектаванне фондаў бібліятэк з бюджэтнага фінансавання было выдзелена 17,4 %. Зноў на першым месцы была Гомельская вобласць (21,8 %). На апошнім – Гродзенская, у якой фактычна паказчык не быў выкананы (14,5 %). Найменш сродкаў было накіравана ў Слонімскім раёне (5,3 %) і г. Бабруйску (7,3 %) [81, т. 1, арк. 89].

Усяго за 2009 г. публічнымі бібліятэкамі было набыта 97 805 сацыяльна значных выданняў, а таксама 35 504 экзэмпляры кніг Выдавецтва Беларускага экзархату.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Акрамя гэтага, у рэгіёнах існавала практыка фінансавання камплектавання за кошт пазабюджэтных сродкаў, у асноўным для папаўнення так званых камерцыйных фондаў. На гэтыя мэты было выдзелена ў цэлым па краіне 461,4 млн руб., а аб'ём атрыманых сродкаў ад платных паслуг з выкарыстаннем згаданага фонду дазволіў атрымаць прыбытак, які ў 2 разы перавысіў выдаткі (1 032,31 млн руб.). [81, т. 3, арк. 3].

Сярод закупленных у 2009 г. выданні замежнага паходжання склалі 24,2 % ад агульнай колькасці неперыядычных выданняў, сярод перыядычных – 41 %. Кнігі складалі 96,4 % ад усіх неперыядычных выданняў. З іх 40 % – мастацкая літаратура. На долю аўдыёвізуальных і электронных дакументаў прыпадала 2,0 і 1,1 % адпаведна. У сярэднім па краіне на адзін раён выпісвалася каля 39 назваў газет і 153 назвы часопісаў. Пры гэтым больш за палову сродкаў, якія выдзяляліся на камплектаванне, выдаткоўвалася на падпіску на перыядычныя выданні. Гэта было абумоўлена высокім узроўнем і пастаянным ростам цэн на паслугі РУП «Белпошта», адзінага ў Беларусі прадпрыемства, якое мела ліцэнзію на здзяйсненне гэтага віду дзейнасці і якое фактычна з'яўлялася манапалістам у дадзенай сферы [81, т. 3, арк. 4].

У цэлым па краіне ў канцы вывучаемага перыяду склалася практыка камплектавання бібліятэчных фондаў праз абласныя кнігагандлюючыя арганізацыі. Побач з гэтым праводзілася закупка выданняў напрамую ў выдавецтвах. Дакументы закупаліся на раённую сетку праз цэнтралізаваныя бібліятэкі, якія іх апрацоўвалі і затым размяркоўвалі па філіялах. Толькі ў Магілёўскай вобласці ў 2010 г. была адноўлена практыка цэнтралізаванай закупкі і размеркавання выданняў праз абласную бібліятэку для бібліятэк рэгіёна [81, т. 3, арк. 4].

Спецыялісты выдзялялі некалькі праблем, якія існавалі ў той час у справе камплектавання дзяржаўных публічных бібліятэк. Па-першае, для больш поўнага якаснага задавальнення інфармацыйных запытаў чытачоў патрабавалася пастаяннае папаўненне фондаў за кошт набыцця дакументаў, выдадзеных як у Беларусі, так і за мяжой (у першую чаргу ў Расіі). Аднак на рэгіянальным узроўні пастаянна ўзнікалі пытанні з аплатай рахункаў на замежныя выданні, хаця ніякіх абмежаванняў у гэтым не існавала. Праблема заключалася ў недастатковай наяўнасці і неабходнасці эканоміі фінансавых сродкаў. На месцах існавала недастатковае разуменне з боку мясцовых органаў улады таго факта, што асноўнай функцыяй бібліятэкі з'яўляецца прадстаўленне своечасовай аператыўнай інфармацыі. Без яе наяўнасці існаванне такой установы, як бібліятэка, не мае сэнсу.

Па-другое, у фондах бібліятэк адчуваўся недахоп кніг і перыядычных выданняў, неабходных для якаснага абслугоўвання чытачоў у галіне эканомікі, інфармацыйных тэхналогій, філасофіі, псіхалогіі, права, мастацтва, навукова-папулярнай, вытворчай, даведачнай літаратуры па сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, навучальнай літаратуры для дзяцей. Прадукцыя беларускіх выдавецтваў толькі часткова магла задаволіць запыты карыстальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Па-трэцяе, у Беларусі ў абмежаванай колькасці выпускаліся дакументы на электронных носьбітах. А яны былі вельмі запатрабаванымі для паўнавартаснай працы інфармацыйна-адукацыйных і мультымедыйных цэнтраў пры публічных бібліятэках.

На забеспячэнне захаванасці найбольш каштоўнага рэпертуару дакументальных помнікаў, што захоўваліся ў бібліятэках, архівах, музеях краіны, была накіравана *праграма «Памяць Беларусі»,* якая распрацоўвалася на базе Нацыянальнай бібліятэкі ў адпаведнасці з Пратаколам даручэнняў нарады ў прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь С. С. Сідорскага (23 снежня 2004 г. № 05/1 14 Пр., п. 5). Меркавалася, што яна стане дзяржаўнай, але гэты статус праграма не атрымала. Задача яе рэалізацыі была пастаўлена асобным заданнем № 8 з тэрмінамі рэалізацыі ў 2006–2010 гг. у галіновай праграме «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.». У далейшым праект праграмы «Памяць Беларусі» неаднаразова пераглядаўся, пераносіліся тэрміны рэалізацыі на пазнейшыя перыяды (да 2015 г. уключна). Мэтай праграмы з'яўляліся дзяржаўны ўлік і захаванне дзяржаўных помнікаў, інфармацыйнае забеспячэнне багацця і значэння культурнай спадчыны нацыі; інтэграцыя рэсурсаў і ўвядзенне ў навуковы і культурны зварот дакументальных помнікаў, якія захоўваліся на той час у беларускіх бібліятэках, музеях, архівах, а таксама за межамі краіны; паляпшэнне ўмоў фізічнай захаванасці найбольш каштоўных дакументальных помнікаў; фарміраванне агульнадаступных электронных інфармацыйных рэсурсаў, якія трывала захоўваюць і адлюстроўваюць гісторыю і культуру Беларусі; распаўсюджанне ведаў аб нацыянальнай спадчыне. Праграма была накіравана на папаўненне Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь; стварэнне рэестра найбольш каштоўных і значных дакументаў; стварэнне цэнтра і лабараторыі алічбоўкі, рэпрадуцыравання, рэстаўрацыі і кансервацыі дакументальных помнікаў; фарміраванне электронных інфармацыйных рэсурсаў і арганізацыю дыстанцыйнага доступу да іх; арганізацыю сістэмы інфармацыі аб дакументальных помніках; папулярызацыю дакументальнай спадчыны [74, арк. 39–40; 82, т. 7, арк. 18].

Сярод значных праблем галіны было ўдасканаленне ***матэрыяльна-тэхнічнай базы***. Напрыклад, у 1997 г. патрабавалі капітальнага рамонту 374 бібліятэкі, 34 знаходзіліся ў аварыйным стане, 284 бібліятэкі не ацяпляліся. Толькі 22 % ад агульнай колькасці бібліятэк мелі тэлевізары, 17 – магнітафоны, 1,3 – відэамагнітафоны, 0,9 % – камп'ютары [841, с. 4].

У 2001 г. у аварыйным стане знаходзілася 21 бібліятэка, для 296 патрабаваўся капітальны рамонт. Многія сельскія бібліятэкі не ацяпляліся [106, с. 47]. У 2006 г. у Гродзенскай вобласці не ацяпляліся 6 бібліятэк, у Гомельскай – 32. У Гомельскай вобласці капітальны рамонт патрабаваўся 87 бібліятэкам, у аварыйным стане знаходзіліся 7 бібліятэк. У Магілёўскай вобласці ў новых сучасных памяшканнях мелі патрэбу 26 % цэнтральных раённых бібліятэк. У Гродзенскай вобласці капітальны рамонт патрабаваўся 25 бібліятэкам, бягучы – 130.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Шмат у якіх бібліятэках адсутнічала тэлефонная сувязь. У Гомельскай вобласці былі не тэлефанізіраваны 384 бібліятэкі, у Гродзенскай – 173 [76, т. 1, арк. 56].

Як відаць з табл. 6 (с. 371), асноўнымі задачамі ў перыяд 2006–2010 гг. былі задачы, звязаныя з інфарматызацыяй. Калі, як ужо згадвалася, у 1997 г. толькі 0,9 % бібліятэк мелі камп'ютары, то па стане на 2005 г. у аўтаматызаваным рэжыме працавалі ўсе буйныя бібліятэкі краіны, а таксама 97 % цэнтральных гарадскіх і раённых бібліятэк. Бібліятэкі краіны мелі вэб-сайты, на якіх размяшчаліся інфармацыйныя рэсурсы ўласнай генерацыі. Сукупны аб'ём электронных каталогаў складаў каля 5,5 млн запісаў. На базе НББ з удзелам буйнейшых бібліятэк рэспублікі здзяйснялася распрацоўка і стварэнне зводнага электроннага каталога бібліятэк Беларусі з сеткавым інтэрфейсам аддаленага доступу [294, с. 7].

На канец 2008 г. у 64,5 % цэнтральных публічных бібліятэк, што выкарыстоўвалі тыпавы праграмны прадукт, бібліятэчныя працэсы былі аўтаматызаваны ў поўным аб'ёме. Плануемая тэмпы камп'ютарызацыі публічных бібліятэк не вытрымліваліся. Большая палова дадзеных устаноў культуры ў канцы 2008 г. не мела камп'ютараў. На 3930 публічных і абласных бібліятэк прыходзілася 3043 адзінакі камп'ютарнай тэхнікі, камп'ютарызавана – 31,6 %. Падключаны да Інтэрнэту былі толькі 20,6 % ад агульнай колькасці бібліятэк. Самы нізкі працэнт камп'ютарызацыі назіраўся ў Брэсцкай і Гомельскай абласцях, падключэння да Інтэрнэту – у Мінску і Гомельскай вобласці [431, с. 3].

Дадзенаму працэсу перашкаджала становішча тэлекамунікацый інфраструктуры бібліятэчнай сеткі, адсутнасць вопыту сумеснага выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў, фінансавыя і кадравыя праблемы, недасканаласць нарматыўна-прававой базы і інш. Акрамя аўтаматызацыі прыярытэтнымі напрамкамі развіцця з'яўлялася каардынацыя ў фарміраванні інфармацыйных рэсурсаў, інтэграцыя інфраструктуры бібліятэк усіх узроўняў у адзіную бібліятэчную сетку і інфармацыйнае ўзаемадзеянне, а таксама паступовае ператварэнне бібліятэк у даведачна-інфармацыйныя цэнтры.

У Дзяржаўную праграму інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь на 2003–2005 гг. і на перспектыву да 2010 г. «Электронная Беларусь» былі ўключаны пяць бібліятэчных праектаў, тры з якія непасрэдна адносяцца да разглядаемай праблематыкі. Гэта: 1) распрацоўка на аснове інтэрнэт–інтранэт-тэхналогій тыпавога праекту «Электроннай бібліятэкі» з аддаленым доступам пры дапамозе карпаратыўнай сеткавай інфраструктуры; 2) укараненне ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі праграмна-тэхнічнага комплексу для алічбоўкі і архівіравання старадрукаў і рэдкіх выданняў; 3) стварэнне карпаратыўнай бібліятэчнай сеткі ў складзе НББ, рэспубліканскіх і абласных бібліятэк і рэгіянальных інфармацыйных цэнтраў; 4) стварэнне сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі выданняў і вядзення зводнага электроннага каталога; 5) стварэнне на базе Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі інфармацыйнай сістэмы дзяржаўнай бібліяграфічнай інфармацыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У канцы даследуемага перыяду актыўнае развіццё атрымала інфармацыйна-бібліятэчнае абслугоўванне ў электронным асяроддзі. Бібліятэкі рэспублікі фарміравалі электронные каталогі і базы дадзеных. Інавацыйнай стала арганізацыя інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання на базе віртуальнай чытальнай залы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Гэта дазволіла значна пашырыць геаграфічныя межы доступу карыстальнікаў да электронных інфармацыйных рэсурсаў. Віртуальная чытальная зала Нацыянальнай бібліятэкі ў канцы 2010 г. была даступная ў 37 бібліятэках краіны [377, с. 146].

Мясцовымі спецыялістамі быў распрацаваны камунікатыўны фармат прадстаўлення бібліяграфічных запісаў у машыначытаемай форме (BELMARC), а таксама камунікатыўны фармат прадстаўлення аўтарытэтных/нарматыўных запісаў у машыначытаемай форме (BELMARC/AUTHORITIES). Адным з неабходных элементаў паспяховага функцыянавання нацыянальнай электроннай бібліятэкі з'ўлялася аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма стварэння і вядзення нацыянальных баз даных аўтарытэтных/нарматыўных запісаў. У краіне была створана аснова для фарміравання нацыянальнай сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі і зводнага элетроннага каталога [377, с. 146].

Фарміраванне нацыянальнай інфармацыйнай інфраструктуры ў новым XXI ст. было звязана з перспектывамі развіцця ***Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі***. 8 жніўня 2002 г. адбылася цырымонія адкрыцця Нацыянальнага цэнтра інфармацыі і дакументацыі ЮНЕСКА і іншых міжнародных арганізацый у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Бібліятэка атрымала статус дэпазітарыя матэрыялаў ААН, ЮНЕСКА, Савета Еўропы, АБСЕ і інш.

Прымаючы пад увагу ўзрослую значнасць інфармацыі як глабальнага рэсурсу развіцця грамадства і ролю Нацыянальнай бібліятэкі ў аперыраванні гэтым рэсурсам, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь 7 сакавіка 2002 г. падпісаў Указ № 153 «Аб будаўніцтве будынка дзяржаўнай установы "Нацыянальная бібліятэка Беларусі"». Будынак быў уведзены ў эксплуатацыю ў чэрвені 2006 г.

Новую Нацыянальную бібліятэку разглядалі перш за ўсё як рэспубліканскі інфармацыйны цэнтр, што ажыццяўляе структураванне і эфектыўнае выкарыстанне набытых чалавецтвам інфармацыйных рэсурсаў. Разам з іншымі відамі дзейнасці, якія звязаны з рэалізацыяй інфармацыйнай функцыі Нацыянальнай бібліятэкі як галоўнай бібліятэкі краіны, на яе была ўскладзена місія рэспубліканскага інфармацыйна-камунікацыйнага цэнтра ў галіне інавацыйнай дзейнасці, а таксама *рэспубліканскага сацыякультурнага цэнтра*, які выконвае комплекс задач па забеспячэнні культурна-асветнай, рэкрэацыйнай і творчай дзейнасці як карыстальнікаў бібліятэкі, так і наведвальнікаў сацыякультурных мерапрыемстваў.

У 2008 г. быў значна зменены артыкул 23 Закона «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь», які вызначаў статус Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і замацаваў яе функцыі і задачы. У ім быў замацаваны статус Нацыянальнай бібліятэкі як інфармацыйнага і грамадска-культурнага цэнтра, значна пашыраны яе функцыі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, у вывучаемы перыяд бібліятэкі рэспублікі ўступілі ў новы этап свайго развіцця. Адбылася рэарганізацыя дзейнасці бібліятэк, змяніліся традыцыйныя бібліятэчныя тэхналогіі, характар узаемадзеяння з разнастайнымі сацыяльнымі групамі, укараняліся інавацыйныя формы абслугоўвання чытачоў. Асобныя бібліятэкіператварыліся ў сучасныя інфармацыйна-культурныя ўстановы, інфармацыйныя цэнтры, цэнтры сацыяльных і адукацыйных ініцыятыў, культуры вольнага часу.

### 6.4. Музеі

Музеі Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца асноўнымі збіральнікамі і сховішчамі помнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа і іншых народаў свету, рухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей, а таксама помнікаў прыроды і твораў мастацтва.

Адносіны, якія ўзнікалі з забеспячэннем арганізацыйна-прававых і эканамічных гарантый стварэння і дзейнасці музеяў, былі вызначаны ў 1996 г. Законам Рэспублікі Беларусь *«Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь»* [503]. Адпаведна яму асноўнымі функцыямі музея з'ўляліся збор, вывучэнне, экспанаванне, папулярызацыя і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны, садзейнічанне павышэнню адукацыйнага ўзроўню насельніцтва, распаўсюджванню ведаў пра чалавека і яго асяроддзе, служэнне духоўнаму развіццю грамадства. Да прыняцця закона дзейнічала «Палажэнне пра Музейны фонд Рэспублікі Беларусь», зацверджанае загадам Міністэрства культуры ад 8 мая 1992 г. № 51 [436, спр. 2071, арк. 108–114].

Акрамя згаданага закона дзейнасць музеяў у вывучаемы перыяд рэгулявалася асобнымі палажэннямі законаў Рэспублікі Беларусь: «Аб культуры» [24] (арт.12, 16, 34), «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» [574] (арт. 35–38, 48, 69, 70), «Аб уласнасці».

У далейшым закон «Аб культуры» быў прыняты ў новай рэдакцыі, што прывяло да няўзгодненасці з ім Закона «Аб музеях і Музейным фондзе». У 2005 г. апошні быў прыняты ў новай рэдакцыі [26]. У ёй былі вызначаны асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы музейнай справы, правы і абавязкі музеяў і іх наведвальнікаў, віды музейнай дзейнасці, шляхі камплектавання музейных фондаў, крыніцы фінансавання музеяў, прадугледжваўся парадак стварэння і ліквідацыі музеяў, асаблівасці прававога становішча і парадку дзейнасці некаторых музеяў; палажэнні аб уключэнні музейных прадметаў і музейных калекцый у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь і іх выключэнні з гэтага фонду, аб цэнтралізаваным уліку музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, аб дзяржаўным кантролі за станам фонду. Наколькі апошняе было актуальна, сведчаць факты. На пачатак 2001 г. навуковую інвентарызацыю прайшло толькі 48 % асноўнага фонду. Сярод музейных калекцый найбольш вывучанымі былі калекцыі нумізматыкі (да 15 %),



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фотаматэрыялаў (14,9 %), дакументаў (14,5 %), археалогіі (14 %). Астатнія і таго менш [106, с. 38].

Для цэнтралізаванага ўліку музейных прадметаў і музейных каштоўнасцей законам была закладзена норма стварэння і вядзення Дзяржаўнага каталога музейнага фонду. Актуальнасць гэтай задачы пацвердзілі вынікі зверкі музейных прадметаў дзяржаўных музеяў сістэмы Міністэрства культуры, якая была праведзена на працягу 2006–2007 гг. у адпаведнасці з пратаколам даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2005 г. па рэалізацыі прапаноў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь па забеспячэнні захаванасці гісторыка-культурных каштоўнасцей, актывізацыі і павышэнні работы музеяў Рэспублікі Беларусь. Такая поўная зверка адбывалася ўпершыню за ўсю гісторыю існавання беларускіх музеяў. У выніку не было выяўлена 2743 музейных прадметаў, што склала 0,09 % Музейнага фонду. Праверка паказала, што 10 835 тысяч музейных прадметаў падлягалі пераводу ў навукова-дапаможны фонд як страціўшыя сваю гістарычную, культурную ці мастацкую каштоўнасць. У асноўным гэта былі матэрыялы з газет, часопісаў, іншыя нязначныя рэчы, якія былі памылкова ўключаны ў склад фонду музея па прычыне прафесійнай недасведчанасці шэрагу супрацоўнікаў музеяў [112, с. 18].

Парадак фарміравання, вядзення, захавання, выкарыстання Музейнага фонду быў замацаваны ў «Палажэнні аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» [20]. Асобнай інструкцыяй Міністэрства культуры быў вызначаны парадак камплектавання музейных фондаў, унутрымузейнага ўліку, навуковай апрацоўкі і захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў [18].

Для асобных катэгорый грамадзян у Законе было прадугледжана наданне права бясплатнага (ільготнага) наведвання створаных на аснове ўласных музейных фондаў экспазіцый і выставак музеяў, якія поўнасцю або часткова фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў.

Аднак закон не ліквідаваў да канца неразбярыхі ў класіфікацыі музеяў адпаведна форме юрыдычнай уласнасці. Напрыклад, з яго тэкста зніклі ведамасныя музеі, якія дэ-факта існавалі ў Беларусі на працягу апошніх 80 гадоў, а іх колькасць на момант прыняцця новай рэдакцыі закона перавышала 300 адзінак. Акрамя гэтага, у законе не было сказана ні слова пра акрэдытацыйныя стандарты, неабходнасць у якіх, па меркаванні спецыялістаў, даўно наспела і была звязана з павелічэннем колькасці ўстаноў, якія называлі сябе музеямі, але па сутнасці такімі не з'яўляліся [85].

У табл. 7 прыведзена ***дынаміка змен сеткі дзяржаўных музеяў***. Неабходна заўважыць, што музеі Міністэрства культуры складалі прыкладна толькі дзясятую частку ўсіх існаваўшых у краіне музеяў. Напрыклад, у 2006 г. сетка Міністэрства культуры налічвала 137 музеяў і 55 філіялаў. Побач з ёй існавала больш за 1600 музеяў, уласнікамі якіх з'яўляліся арганізацыі іншых ведамстваў: Міністэрства адукацыі, Міністэрства аховы здароўя, Нацыянальны банк

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэспубліκі Беларусь і інш. Акрамя гэтага, існавалі два прыватных музея [111, с. 53]. На пачатак 2009 г. у Беларусі налічвалася амаль 2 тыс. музеяў, з якіх 1,5 тыс. існавалі ва ўстановах адукацыі, амаль 140 былі ведамаснымі, 14 прыватных музеяў, 52 – дзяржаўных [124].

У 1989–2001 гг. на аснове дамовы аб сумеснай фінансавай і навуковай дзейнасці існавала Аб'яднанне дзяржаўных літаратурных музеяў, якое ўключала чатыры музеі з філіяламі. Яно дапамагло музеям у станаўленні, пашырэнні сеткі філіялаў. Напрыклад, за 1990–1998 гг. толькі Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры адкрыў 8 філіялаў.

*Табліца 7.* **Колькасць дзяржаўных музеяў [192, с. 424; 360, с. 32; 442, с. 134; 621, с. 32; 622, с. 30; 694, с. 187; 698, с. 236; 699, с. 244; 798, с. 26]**

| Паказчык | Год | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1990 | 1991 | 1993 | 1995 | 1997 | 1999 | 2000 | 2001 | 2003 | 2005 | 2007 | 2009 | 2010 |
| **Усяго**[1] | 111 | 121 | 139 | 146 | 151 | 135 | 134 | 134 | 136 | 139 | 148 | 155 | 158 |
| У тым ліку: гістарычныя | 28 | 30 | 36 | 34 | 34 | 31 | 32 | 32 | 31 | 33 | 35 | 43 | 43 |
| мемарыяльныя | 17 | 20 | 23 | 22 | 23 | 14 | 14 | 14 | 14 | 10 | 73[2] | 82[2] | 86[2] |
| краязнаўчыя | 56 | 58 | 65 | 68 | 73 | 71 | 70 | 70 | 71 | 71 | | | |
| прыродазнаўча-навуковыя | 2 | 2 | 3 | 3 | 3 | 3 | 3 | 3 | 3 | 3 | 14 | 1 | 1 |
| мастацтвазнаўчыя | 7 | 9 | 9 | 12 | 11 | 12 | 11 | 11 | 13 | 14 | 14 | 15 | 15 |
| літаратурныя | 1 | 1 | 2 | 6 | 6 | 2 | 2 | 2 | 2 | 6 | 8 | 7 | 7 |
| галіновыя | – | 1 | 1 | 1 | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 | 2 | 4 | 7 | 6 |
| **Колькасць наведванняў за год, млн чал.** | **4,6** | **3,6** | **2,7** | **2,8** | **3,3** | **3,5** | **3,8** | **3,9** | **3,6** | **4,0** | **3,8** | **4,58** | **4,9** |
| **Колькасць наведванняў, на 100 чал.** | **45** | **35** | **26** | **28** | **31** | **34** | **38** | **39** | **36** | **40** | **38** | **48** | **53** |

З а ў в а г а. [1]Для 1990–1997 гг. – з філіяламі. [2]Комплексныя.

Як відаць з табл. 7, назіраўся паступовы рост дзяржаўнай музейнай сеткі. Найбольш актыўна працэс музеяфікацыі адбываўся ў 1991–1995 гг.: было створана 35 новых музеяў і філіялаў. Аднак сярэдняя колькасць наведванняў за гэты ж перыяд склала прыкладна толькі 66 % ад ўзроўню 1990 г. Пачынаючы з 1995 г. назіраўся яе паступовы рост, які змяніўся кароткачасовым спадам 2002–2003 гг.

У параўнанні з краінамі – удзельніцамі СНД па агульнай колькасці наведванняў музеяў за год у 2008 г. Беларусь нязначна саступала Казахстану і істотна пераўзыходзіла ўсе астатнія краіны з насельніцтвам менш за 20 млн чалавек. Па колькасці наведвальнікаў наша краіна саступала толькі Украіне і Расіі. Побач з гэтым па сярэднестатыстычным прыросце колькасці музеяў у год за перыяд 2000–2008 гг. Беларусь істотна саступала групе краін з насельніцтвам менш за 20 млн чалавек (13 супраць 23 %) [81, т. 5, арк. 15].

Многае ў працы з наведвальнікамі залежала ад саміх музеяў, ад іх ролі ў сацыяльна-культурным жыцці рэгіёна. Так, 14 музеяў Брэсцкай вобласці ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2003 г. (10 % ад колькасці працуючых дзяржаўных музеяў па краіне) абслугоўвалі амаль 19 % усіх наведвальнікаў па краіне, а ў той жа час 24 музеі Магілёўскай вобласці (18 % ад усіх музеяў) займалі апошняе месца па колькасці наведвальнікаў – 6,2 % (табл. 8). Для большай аб'ектыўнасці неабходна адзначыць, што амаль чвэрць усіх наведванняў музеяў Брэсцкай вобласці даваў мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой». Напрыклад, у 2007 г. яго наведала 179 548 чалавек пры агульнай лічбе па ўсіх музеях вобласці 623,4 тыс. чалавек.

У наступныя гады адбылася пэўная карэкціроўка паказчыкаў. Як відаць з табл. 8, назіралася значнае падзенне колькасці наведвальнікаў у Брэсцкай вобласці (за 2006–2007 гг. на 14,3 тыс. чалавек у разліку на адзін музей) пры нязначным росце паказчыкаў у Магілёўскай вобласці. Палепшылася справа ў музеях Віцебскай і Гродзенскай абласцей. У цэлым па краіне паказчыкі 2007 г. былі горшымі за ўсе папярэднія гады перыяду 2000–2006 гг.

Цікавым падаецца факт, што на першым месцы па наведванні (у разліку на аднаго супрацоўніка) па выніках 2008 г. стаў невялічкі музей Касцюшкі ў в. Мерачоўшчына ў Івацэвіцкім раёне [124].

*Табліца 8.* **Колькасць наведвальнікаў дзяржаўных музеяў на працягу года, 2000–2010 гг., тыс. чал. [271; 621, с. 32; 622, с. 30; 796, с. 24, 27]**

| Год | Паказчык | Брэсцкая вобласць | Віцебская вобласць | Гомельская вобласць | Гродзенская вобласць | Магілёўская вобласць | Мінская вобласць | г. Мінск | Па галіне |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2000 | Колькасць музеяў / з іх адкрытых для наведвання | 13/11 | 28/25 | 20/19 | 15/14 | 24/22 | 18/18 | 16/16 | 134/125 |
| | Колькасць наведвальнікаў на 1 музей, тыс. чал. | 56,8 | 27,8 | 17,9 | 21,3 | 10,9 | 28,0 | 52,0 | 30,4 |
| 2003 | Колькасць музеяў / з іх адкрытых для наведвання | 14/14 | 27/26 | 21/20 | 15/14 | 24/24 | 18/18 | 17/17 | 136/133 |
| | Колькасць наведвальнікаў на 1 музей, тыс. чал. | 48,6 | 23,5 | 16,2 | 21,7 | 9,5 | 31,7 | 53,8 | 27,3 |
| 2005 | Колькасць музеяў / з іх адкрытых для наведвання | 14/14 | 28/28 | 21/20 | 15/14 | 24/24 | 19/19 | 18/16 | 139/135 |
| | Колькасць наведвальнікаў на 1 музей, тыс. чал. | 51,0 | 22,1 | 18,6 | 23,9 | 10,1 | 34,1 | 65,4 | 29,5 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заканчэнне табл. 8*

| Год | Паказчык | Брэсцкая вобласць | Віцебская вобласць | Гомельская вобласць | Гродзенская вобласць | Магілёўская вобласць | Мінская вобласць | г. Мінск | Па галіне |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2007 | Колькасць музеяў / з іх адкрытых для наведвання | 17/17 | 27/27 | 27/24 | 15/13 | 24/23 | 21/21 | 17/16 | 148/141 |
| | Колькасць наведвальнікаў на 1 музей, тыс. чал. | 36,7 | 25,4 | 18,1 | 25,9 | 10,5 | 26,2 | 58,1 | 27,2 |
| 2009 | Колькасць музеяў / з іх адкрытых для наведвання | 19/18 | 27/27 | 30/29 | 16/16 | 24/24 | 22/22 | 17/17 | 155/153 |
| | Колькасць наведвальнікаў на 1 музей, тыс. чал. | 41,0 | 27,8 | 18,8 | 23,1 | 14,8 | 32,0 | 62,5 | 29,6 |
| 2010 | Колькасць музеяў / з іх адкрытых для наведвання | 19/19 | 27/27 | 29/29 | 17/16 | 24/24 | 25/25 | 17/17 | 158/157 |
| | Колькасць наведвальнікаў на 1 музей, тыс. чал. | 41,2 | 27,2 | 21,2 | 23,8 | 17,0 | 31,3 | 75,6 | 31,7 |

З а ў в а г а. Па г. Мінску за перыяд пасля 2007 г. прыводзяцца звесткі па музеях рэспубліканскага падпарадкавання, да якіх адносіліся музеі, непасрэдна падпарадкаваныя Міністэрству культуры незалежна ад іх тэрытарыяльнага размяшчэння. Звесткі за 2009–2010 гг. атрыманы з Інтэграванага банку дадзеных устаноў культуры [271] і адрозніваюцца ад звестак, якія можна атрымаць ад органаў дзяржаўнай статыстычнай службы. Так, колькасць музеяў прыведзена без уліку філіялаў, а паказчык наведання разлічваўся шляхам падзелу агульнай колькасці наведвальнікаў на агульную колькасць музеяў.

У пачатку 1990-х гг. адбыліся ***значныя перамены***, якія закранулі ўсю музейную справу, сістэму кіравання і арганізацыі музеяў, іх метадалагічныя і канцэптуальныя асновы, звязаныя з палітычнымі пераўтварэннямі, характэрнымі для таго часу. Назіралася значнае падзенне колькасці наведвальнікаў. Толькі за перыяд 1991–1993 гг. музеі «страцілі» 900 тыс. чалавек (гл. табл. 7). У гэты час шмат якія музеі вымушаны былі на некаторы час спыніць прыём наведвальнікаў з-за неадпаведнасці навуковага зместу экспазіцыі і мастацкай формы новым рэаліям. Частка з іх была мадэрнізавана. Асабліва гэта закранула музеі народнай славы.

Становішча музейнай галіны ў першыя гады незалежнасці характарызавалася наступнымі недахопамі: а) амаль поўная нявывучанасць і недаследаванасць фондавых калекцый; б) традыцыйныя экспазіцыі з ухілам на адлюстраванне сучаснасці (больш за 70 % плошчаў); в) слабая матэрыяльна-тэхнічная



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

база; г) адсутнасць сістэматызаванага камплектавання фондавых калекцый з ухілам на гісторыю края (асабліва па Сярэднявеччы, XVII – пачатку XX ст. і г. д.); д) выкарыстанне ў папулярызатарскай і прапагандысцкай працы састарэлых форм; е) адсутнасць сістэмы падрыхтоўкі ўласных кадраў і інш. [751, с. 45].

Яшчэ адной асаблівасцю становішча музеяў пачатку 1990-х гг. стала перадача царкве культавых помнікаў, у якіх да гэтага размяшчаліся музеі. Так здарылася з Музеем гісторыі рэлігіі ў Гродна, які вымушаны быў выселіцца з Каложскай царквы і карпусоў базыльянскага манастыра.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці сацыяльна-эканамічнага крызісу, у пачатку 1990-х гг. назіралася павелічэнне музейнай сеткі, перагляд экспазіцый. На развіццё музейнай справы ў гэты перыяд значны штуршок аказала атрыманне незалежнасці, адраджэнне нацыянальнай культуры і гісторыі, зацікаўленасць станам музеяў з боку мясцовых улад. З іншага боку, фактычнае спыненне з развалам СССР турыстычнага патоку прымусіла музейных работнікаў змагацца за мясцовага наведвальніка шляхам стварэння шматлікіх выставак. Гэтаму садзейнічала ліквідацыя ранейшых жорсткіх ідэалагічных пастулатаў, старых схем і канонаў. Музеі больш увагі сталі надаваць ранейшым перыядам гісторыі, пашырылі плошчы пад паказ для калекцый нумізматыкі, археалогіі, мастацтва, народных промыслаў. У 1993 г. былі адкрыты 8 новых экспазіцый у новых музеях і філіялах. На хвалі новых настрояў і даследавання раней закрытых тэм Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры стварыў выставу «Покліч», якая адлюстроўвала літаратурны працэс у Беларусі 1920–1930-х гг. Значна пашырылася тэматыка і змест экспазіцыі мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»: да асноўнай тэмы абароны крэпасці ў чэрвені 1941 г. дадаліся раздзелы, прысвечаныя яе гісторыі, абароне польскім гарнізонам у верасні 1939 г.

Цікаўнасць да «белых плямаў» гісторыі прывяла да актывізацыі іх вывучэння музейнымі супрацоўнікамі, выяўлення і атрыбуцыі новых помнікаў. У 1990-я гг. у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры адбыліся такія выставы, як «Сто рарытэтаў беларускай культуры», «Старажытная геральдыка Беларусі», «Спадчына, якая належыць Беларусі», выставы, прысвечаныя паўстанню Тадэвуша Касцюшкі і ўтварэнню Беларускай Народнай Рэспублікі.

У 1990-я гг. у сувязі са значнымі трансфармацыямі ў музейнай сферы змяніўся статус рэгіянальных музеяў. Яны сталі імкнуцца стаць навукова-даследчымі і культурнымі цэнтрамі рэгіёнаў, пераўтварыліся ў кангламерат музеяў, што адлюстроўваюць розныя аспекты сацыяльна-культурнай гісторыі краю.

Музеі шукалі новыя формы ***працы з наведвальнікамі***. Як адзначаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Г. Лукашэнка на нарадзе «Аб мерах па рашэнні праблем развіцця культуры і мастацтва» 1 лютага 2001 г., «пераасэнсаванне сацыяльнай ролі музеяў у новых эканамічных умовах дазволіла ім стаць больш актыўнымі даследчымі сістэмамі, адукацыйнымі, культурнымі цэнтрамі вольнага часу» [386]. Былі распрацаваны комплексныя праграмы працы музеяў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з аўдыторыяй, сфарміраваны аддзелы і сектары музейнай педагогікі. Калі раней аб’ектам асаблівай увагі музейных работнікаў былі толькі дзеці, то тэндэнцыяй пачатку XXI ст. стала стварэнне спецыяльных праграм для падлеткаў, студэнтаў, сталых людзей, інвалідаў. У некаторых музеях пачалі выкарыстоўвацца музейныя абанементы. Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік ахапіў спецыяльнай праграмай дзяцей-інвалідаў. Нацыянальны мастацкі музей актыўна ўкараняў клубныя формы працы з аўдыторый. Дзейнасць клуба «Цюбік» пры музеі, разлічанага на маленькіх наведвальнікаў, атрымала прызнанне сярод айчынных і расійскіх музейных педагогаў. Клуб працаваў па арыгінальных аўтарскіх методыках і валодаў унікальным вопытам працы з музейнымі наведвальнікамі [107, с. 59].

Традыцыйнымі сталі папулярныя канцэртныя і тэатральныя праграмы ў Дзяржаўным музеі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, літаратурныя салоны і батлеечныя спектаклі ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча, гістарычныя і краязнаўчыя віктарыны ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі, этнаграфічныя майстэрні і школы ў Браслаўскім музейным аб’яднанні [756, с. 642]. З 2005 г. у краіне сталі праводзіцца «Ночы музеяў».

У табл. 9 прыведзены *асноўныя прыярытэтныя напрамкі развіцця дзяржаўнай музейнай сеткі* ў 2001–2010 гг. Як можна заўважыць, амаль усе напрамкі дзейнасці, вызначаныя ў Дзяржаўнай праграме «Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года», атрымалі сваё развіццё ў палажэннях наступнай галіновай праграмы. Толькі такія напрамкі, як пашырэнне музейнай сеткі, развіццё музейнага маркетынгу, забеспячэнне сацыяльнай абароны музейных работнікаў, не сталі прыярытэтнымі ў новым пяцігоддзі. Можна зрабіць вывад, што яны фактычна былі выкананы і не патрабавалі асаблівай увагі. Аднак у дадатку да галіновай праграмы сярод пераліку асноўных плануемых мерапрыемстваў значыцца адкрыццё на працягу пяцігоддзя 24 новых дзяржаўных музейных устаноў і столькі ж па колькасці філіялаў [168, с. 86]. У адрозненне ад папярэдняга этапу праграмай на 2006–2010 гг. ставілася задача пашырэння міжнародных сувязей і супрацоўніцтва ў межах розных музейных арганізацый і Міжнароднага савета па музеях (ІКОМ).

Галоўнае адрозненне Праграмы на 2006–2010 гг. – асаблівая ўвага праблеме кансервацыі і рэстаўрацыі. У гэтым напрамку планавалася стварыць на базе Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Рэспубліканскі цэнтр і лабараторыю прэвентыўнай кансервацыі, рэстаўрацыйных майстэрань у мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой», Нацыянальным Полацкім гісторыка-культурным музеі-запаведніку, Гомельскім абласным краязнаўчым музеі, Магілёўскім абласным мастацкім музеі.

У мэтах павышэння эфектыўнасці музейнай галіны Міністэрствам культуры ў ліпені 2004 г. была зацверджана *Канцэпцыя развіцця музейнай справы ў Рэспубліцы Беларусь да 2010 г.* А ў 2005 г. – *Рэспубліканская праграма развіцця музейнай справы Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.* [439,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

спр. 1049, арк. 37]. Асноўная мэта апошняй – вызначэнне сістэмы мерапрыемстваў па адаптацыі да сучасных сацыяльна-эканамічных умоў усіх музейных інстытутаў праз укараненне ў іх дзейнасць новых прагрэсіўных тэхналогій, выкарыстанне на практыцы сучасных арганізацыйна-гаспадарчых мадэлей, павышэнне прафесійнай кваліфікацыі музейных работнікаў, упарадкаванне і аптымізацыя дзейнасці па вывучэнні і захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія ўтрымліваюцца ў музейных фондах. Яна прадугледжвала шэраг істотных напрамкаў дзейнасці. Сярод іх – удасканаленне сістэмы кіравання дзяржаўнай музейнай галіной; далейшая версіфікацыя і рэструктурызацыя музейнай сеткі; удасканаленне матэрыяльна-тэхнічнай базы музеяў; рэканструкцыя і тэхнічнае забеспячэнне музейных фондаў; мадэрнізацыя сістэмы аховы і жыццязабеспячэння музейных фондаў; павышэнне колькаснага і якаснага ўзроўняў камплектавання музейных збораў; укараненне новых інфармацыйных тэхналогій; стварэнне Дзяржаўнага зводнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь; развіццё прэвентыўнай кансервацыі і рэстаўрацыі музейных прадметаў; удасканаленне музейна-камунікатыўнай палітыкі і далейшае развіццё экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці [439, спр. 1049, арк. 37].

*Табліца 9.* **Асноўныя прыярытэтныя напрамкі развіцця музейнай справы Беларусі (толькі музеі Міністэрства культуры) у 2001–2010 гг. [168, с. 23–24; 224, с. 22]**

| Перыяд | |
|---|---|
| 2001–2005 гг. | 2006–2010 гг. |
| Удасканаленне музейнай палітыкі, развіццё музейнай сеткі | Удасканаленне нарматыўна-прававой базы дзейнасці музейных устаноў |
| Наладжванне актыўнага інфармацыйнага абмену | Стварэнне карпаратыўнай інфармацыйнай сеткі |
| Развіццё музейнага маркетынгу | – |
| Уніфікацыя і стандартызацыя музейнай дакументацыі ва ўмовах камп'ютарызацыі музейнай сферы | Перавод музейнай дакументацыі на электронныя носьбіты |
| Умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы | Умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы |
| Укараненне сучасных тэлекамунікацыйных тэхналогій | Садзейнічанне інтэграцыі існуючых музейных інфармацыйных рэсурсаў у адзіны нацыянальны інтэрнэт-рэсурс |
| Стварэнне адзінага банка дадзеных дзяржаўнага і недзяржаўнага фондаў музейных каштоўнасцей | Стварэнне Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду |
| Укараненне ў музейную справу новых метадаў гаспадарання | Больш эфектыўнае выкарыстанне магчымасцей музеяў для ўнутранага і міжнароднага турызму |
| Павышэнне кваліфікацыі музейных кадраў, развіццё музейных спецыяльнасцей | Развіццё прэвентыўнай кансервацыі і рэстаўрацыі музейных прадметаў |
| Забеспячэнне сацыяльнай абароны музейных работнікаў | – |
| – | Развіццё міжнародных сувязей і супрацоўніцтва ў межах розных музейных арганізацый і ICOM |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ажыццяўленне мерапрыемстваў, прадугледжаных праграмай, павінна было паспрыяць узрастанню ролі музеяў у грамадстве, больш эфектыўнаму развіццю музейнай сеткі, інфарматызацыі і камерцыялізацыі музейнай сферы, развіццю яе патэнцыялу ў культурным турызме, павышэнню прафесійнага ўзроўню музейных работнікаў, інтэграцыі беларускіх музеяў у сусветны культурны кантэкст [439, спр. 1049, арк. 37].

У рамках выканання праграмы новыя музеі адкрыліся ў Жодзіна (24.06.2008 г.) і Петрыкаве (сакавік 2008 г.). Акрамя таго, да канца 2010 г. планавалася ажыццяўленне капітальнага рамонту 53 падобных устаноў культуры, адкрыццё 24 новых філіялаў, а з 80 экспазіцый, што меркавалася наладзіць, 39 павінны былі быць створаны ў музеях нацыянальнага значэння [280].

24 красавіка 2010 г. адбылася ўрачыстая закладка капсулы на будаўніцтве новага будынка гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Міністэрствам культуры было таксама прынята рашэнне аб стварэнні Дзяржаўнага зводнага электроннага каталога музейных каштоўнасцей. Аўтаматызацыя працэсу ўліку і навуковай інвентарызацыі фондаў музеяў пачалася ў 2002 г.

Адносна гістарычных музеяў Канцэпцыя развіцця музейнай справы да 2010 г. прагназавала іх развіццё толькі ў кантэксце запаўнення пэўных лакун у музейнай тыпалогіі. Адзначалася сацыяльная і культурная мэтазгоднасць стварэння рэспубліканскага музея археалогіі ці археапарка. Прадметная база для гэтага існавала, а Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук былі распрацаваны праектныя дакументы. Другім цікавым праектам быў музей этнічнай гісторыі. У планах быў пазначаны музей г. Мінска, праект музеефікацыі былога канцлагера ў Трасцянцы [280, с. 10].

Канцэпцыя прагназавала актыўны рост у будучым музеяў-тэрыторый (музеяў-запаведнікаў, экамузеяў) у адпаведнасці з сусветнымі тэндэнцыямі па зберажэнні і музеефікацыі культурных ландшафтаў, якія звязаны з развіццём культурнага і экатурызму. У гэту групу ў 2003 г. уваходзілі чатыры гісторыка-культурных запаведніка (Нацыянальны Полацкі і Нясвіжскі музеі-запаведнікі, гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе», Дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту), тры мемарыяльныя комплексы («Брэсцкая крэпасць», «Хатынь», «Дальва»). Гэтыя музеі адносіліся да рэкрэацыйнага тыпу і былі арыентаваны на культурны турызм [280, с. 11].

За першыя два гады выканання праграмы ў Мінскай вобласці было створана 10 новых экспазіцый. Побач з гэтым з-за адсутнасці фінансавання на капітальны рамонт будынкаў, выдзеленых для музейных аб'ектаў, а таксама на распрацоўку экспазіцыі, не было магчымасці стварыць іх у філіяле «Рыбакова хата» пры Мядзельскім музеі народнай славы і «Музеі Космаса» пры Слуцкім краязнаўчым музеі. Пяць музеяў патрабавалі капітальнага рамонту з павелічэннем плошчаў. Вострa стаяла праблема недахопу плошчаў у Барысаўскім аб'яднаным музеі. Пры арганізацыі выстаў даводзілася часова закрываць існуючыя экспазіцыі. Відавочнай была неабходнасць будаўніцтва новага будынку для музея [76, т. 4, арк. 228, 231–232].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ліпені 2006 г. новы будынак атрымаў Мінскі абласны краязнаўчы музей. У асобных будынках на 2007 г. у Мінскай вобласці былі размешчаны 15 музеяў, у будынках, якія сумесна эксплуатаваліся з іншымі ўстановамі, – 4 [76, т. 4, арк. 228].

Аднак па-ранейшаму беларускія музеі былі недастаткова ўцягнуты ў сферу культурнага турызму: амаль не прапаноўвалі свае адметныя паслугі турыстам, слаба развівалі сваю маркетынгавую палітыку ва ўмовах канкурэнцыі. Напрыклад, у 2007 г. з 19 дзяржаўных музеяў Мінскай вобласці 12 не былі падключаны да сеткі Інтэрнэт. Уласныя сайты мелі толькі два музеі [76, т. 4, арк. 232]. Найбольш паспяховым праектам рэалізацыі крэатыўных здольнасцей, накіраваных на развіццё і нарошчванне аўдыторыі, назіралася ў супрацоўнікаў прыватнага музея «Дудуткі» – музея старажытных народных промыслаў і тэхналогій. Ініцыятарам яго стварэння ў 1993 г. быў журналіст, пісьменнік і прадпрымальнік Я. Будзінас. Асновай паслужылі фрагменты сядзібна-паркавага комплексу Ельскіх у в. Дудуткі (Пухавіцкі раён). Крыніцай фінансавання сталі спонсарскія сродкі. Першапачаткова планавалася стварэнне прадпрыемства па вытворчасці прадуктаў харчавання па старажытных рэцэптах. У далейшым тут была рэалізавана ідэя музейнага адпачынку праз музейныя атракцыёны. Госці гэтага музея не толькі маглі наведаць аўтэнтычны млын, рамесныя цэхі, паслухаць аповед аб гісторыі беларускай кулінарыі, але і самі паўдзельнічаць у вырабе прадметаў у кузні і сталярні, праехаць вярхом на кані ці арандаваць пралётку або веласіпед. Побач з гэтым паспяховым праектам неабходна згадаць лёс Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, заснаванага ў 1976 г. і адкрытага ў 1987 г. На 2006 г. яго тэрыторыя складала 151 га (з плануемых 250), на якой было размешчана 34 помнікі народнага дойлідства (трохі больш за дзясятую частку з планаванага). На месцы запланаванага яшчэ ў 1992–1993 гг. новага сектара драўляных прадмесцяў гарадоў у 2006 г. экспанаваўся толькі дом пачатку XX ст. з Мінска. Шэраг аб'ектаў, перавезеных у музей з розных рэгіёнаў Беларусі, захоўваліся ў разабраным выглядзе (фрагменты Мінскага замчышча XI–XIII стст., мячэць, чыгуначная станцыя, жылыя дамы) [382, с. 191].

Другім вядомым прыватным музеем быў мастацкі збор Анатоля Белага ў г. Старыя Дарогі, адкрыты ў 2001 г. Некаторы час існаваў у Докшыцкім раёне прыватны этнагарафічны музей Юрыя Гіля «Засцянковая хата», а ў вёсцы Трокенікі на Астравеччыне – прыватны музей беларускай фаўны Мечыслава Змітровіча. Прыватны музей самавараў, у аснову якога была пакладзена калекцыя з больш за 200 самавараў, сабраных М. Шаўцовым, працаваў у гандлёвым цэнтры «Ждановічы» з 2002 г.

У Гродна ў 1996 г. пачалася гісторыя ўнікальнага прыватнага *музея-аптэкі*. Яго ўладальнікам быў навукова-вытворчы кааператыў «Біятэст». З аднаго боку, гэта была аптэка з самым шырокім у горадзе асартыментам лекаў, з другога – выстава, дзе была прадстаўлена гісторыя развіцця аптэчнай справы ў Беларусі. Тут можна было пабачыць старажытныя рэцэпты, прыборы, лекі,

архіўныя здымкі. Усё гэта адбывалася ў будынку, дзе больш за 300 гадоў таму размяшчалася адна з першых беларускіх аптэк. Першая музейная экспазіцыя ўзнікла дзякуючы дапамозе гараджан і праіснавала да 2004 г. У далейшым з прыцягненнем спецыялістаў музейнай справы была распрацавана пастаянная экспазіцыя ў залі плошчай 50 кв. метраў («куточак алхіміка», фрагмент рэцэптурнай залі мяжы XIX–XX стст., куток гісторыі аптэкі) [309, с. 290].

Да 90-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Полацку быў адкрыты прыватны музей «Эпоха Леніна», уладаром якога з’яўляўся Мікалай Панкрат. Музей налічвае звыш за 400 скульптурных выяў правадыра пралетарыяту і іншых асоб, чыя дзейнасць звязана з савецкай эпохай [270].

У верасні 2004 г. у Мінску пачаў працаваць прыватны музей-выстава фотаапаратуры і фатаграфіі «Мир фото». У аснову была пакладзена калекцыя фотаапаратаў В. Пятровіча, якая налічвала каля 500 экзэмпляраў.

У вывучаемы перыяд пашыралася колькасць ***ведамасных музеяў***. Сярод іх шырока вядомыя ў рэспубліцы Музей старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Музей беларускай міліцыі пры Міністэрстве ўнутраных спраў, Музей гісторыі фізічнай культуры і спорту, Музей гісторыі медыцыны Беларусі (1993), Музей мастацтва цацкі пры Тэатры лялек (1996), Музей Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі (1998), Музей сувязі Міністэрства сувязі (2000) ды інш. Толькі за перыяд 2003–2006 гг. пачалі працаваць музей гісторыі Белдзяржтэлерадыёкампаніі, музей гісторыі Савецкага раёна г. Мінска, музей Гродзенскага аблспажыўсаюза, музей гісторыі спажывецкай кааперацыі ў г. Камянцы, музей Палесскага аддзялення ТАА «Белаграпрамбанка» ў г. Пінску, Музей беларускіх остарбайтараў фонду «Узаемапаразуменне і прымірэнне», Музей Уладзіміра Мулявіна пры Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Музей камсамольскага і маладзёжнага руху БРСМ, Музей беларускай мытні, Музей алімпійскай славы Беларусі [109, с. 55].

Шырокая сетка музеяў дзейнічала на Беларускай чыгунцы. У пачатку 1990-х гг. кіраўніцтва дарогі адзначала падзенне цікавасці людзей да культурна-гістарычнай спадчыны, што прывяло да істотнага скарачэння наведання музейных устаноў. Так, за 9 месяцаў 1994 г. гэты паказчык знізіўся больш за 30 % у параўнанні з адапаведным перыядам папярэдняга года. Умовы эканамічнай нестабільнасці спрыялі таму, што матэрыяльна-тэхнічная база асобных музеяў была ў нездавальняючым стане. Кіраўніцтва чыгункі разам з дарожным прафсаюзным камітэтам рэкамендавала музеям укараняць новыя формы працы. Да іх адносіліся: выязныя выставы ў працоўных калектывах, ушанаванне працоўных дынастый, прысвячэнні ў рабочыя, трансляцыя відэафільмаў і інш. [440, арк. 362–365].

У мэтах удасканалення масава-асветнай працы музеяў, а таксама пакояў баявой і працоўнай славы, захавання традыцый і павышэння прэстыжу чыгуначных прафесій, маральнага і патрыятычнага выхавання ў лепшых баявых і працоўных традыцыях чыгуначнікаў з 1988 г. было арганізавана штогадовае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

правядзенне агляду-кункурсу на лепшы музей і пакой баявой і працоўнай славы Беларускай чыгункі.

Сетка музяў чыгункі пашыралася. У 1999 г. у Баранавіцкім аддзяленні быў адкрыты першы на дарозе музей гісторыі чыгуначнай тэхнікі [811]. У 2002 г. падобны музей пачаў дзейнічаць у Брэсцкім лакаматыўным дэпо. Па выніках працы за 2009 г. музей стаў лаўрэатам конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» у намінацыі «Паслугі насельніцтву» [805].

У 2010 г. на Беларускай чыгунцы налічвалася 18 музеяў і 23 пакоі баявой і працоўнай славы. Яны працавалі пры аддзяленнях чыгункі і адасобленных структурных падраздзяленнях (філіялах), а таксама ў навучальных установах Беларускай чыгункі. Іх фонды налічвалі звыш 46 тыс. адзінак захоўвання. Толькі ў фондах музея гісторыі Беларускай чыгункі знаходзілася звыш 13 тыс. адзінак захоўвання [262, с. 752].

У XXI ст. значна ўзраслі патрабаванні да музеяў з боку наведвальнікаў. Адначасова існаванне ў новых ўмовах гаспадарання ўскладнілі ***эканамічны стан музеяў***. Яны ўсё больш адчувалі неабходнасць у дадатковых сродках для папаўнення калекцый, захавання і экспанавання таго, што накоплена. Як адзначалася ў *Дзяржаўнай праграме «Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г.»*, «яшчэ адна рыса сучаснай сітуацыі – гэта рэсурсны дэфіцыт, які працягвае паглыбляцца і ва ўмовах якога даводзіцца існаваць беларускім музеям. Патрабуюць рамонту многія музейныя будынкі. У рэспубліцы не хапае адпаведных фондасховішчаў; састарэла тэхнічная база; назіраецца інфармацыйны голад (большасць музеяў не ў стане выпісаць замежныя музейныя часопісы, а свайго прафесійнага выдання ў Беларусі не існуе); не хапае сродкаў для папаўнення музейнага фонду і г. д.» [208, с. 22]. Асноўным шляхам да паляпшэння становішча стала развіццё платных паслуг, пошук спонсараў.

Праблема заставалася нявырашанай і ў наступныя гады. Напрыклад, у 2007 г. агульны прырост музейнага фонду склаў усяго 1,8 % (46 099 адзінак) [112, с. 20].

Магчымасці экспанавання музейных фондаў былі абмежаваныя недастатковасцю экспазіцыйных і выставачных плошчаў. Большасць музейных будынкаў была прыстасавана да музейнай дзейнасці, не мела абсталяваных памяшканняў для супрацоўнікаў, недастатковыя і часта нязручныя экспазіцыйныя плошчы [439, спр. 888, арк. 63]. У 2006 г. пашырэнне плошчаў патрабавалі Барысаўскі дзяржаўны аб'яднаны музей, Дзяржаўны музей прыроды і экалогіі Рэспублікі Беларусь, Івацэвіцкі дзяржаўны музей; 35 % існуючых музейных будынкаў патрабавалі капітальнага рамонту [111, с. 54]. У той жа час Дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту не меў уласнага адміністрацыйнага будынка і размяшчаўся ў арэндаваным памяшканні на ўскрайку г. Мінска. Не было вырашана пытанне з будаўніцтвам фондасховішча для гэтага музея, і яго калекцыі былі раскіданы па розных, таксама арэндаваных памяшканнях у г. Мінску [439, спр. 888, арк. 63].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэаліі 2000-х праяўляліся ў дзейнасці музеяў праз адключэнне камунальных паслуг за несвоечасовыя плацяжы (электраэнергіі, сувязі, цяпла), адсутнасць сродкаў на пазаведамасную ахову, што стварала пагрозу гібелі музейных збораў. Хранічныя неплацяжы адбіліся на экспазіцыйным будаўніцтве ў краіне. У 2004 г. са 131 музея сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь 40 не мелі пастаяннай экспазіцыі, а яшчэ палова ад гэтай колькасці мела патрэбу ў рэканструкцыі. Былі і такія музеі, дзе перманентны рамонт вёўся больш за 20 гадоў, як, напрыклад, у Мінскім краязнаўчым музеі (г. Маладзечна), Ашмянскім, Смаргонскім гісторыка-краязнаўчых музеях [439, спр. 888, арк. 63].

Побач з гэтым назіраліся і станоўчыя тэндэнцыі. Толькі ў 2004 г. Гомельскі абласны краязнаўчы музей атрымаў дадатковы будынак для стварэння ваеннагістарычнай экспазіцыі, была адкрыта пастаянная экспазіцыя Калінкавіцкага гісторыка-краязнаўчага музея, адрамантаваны і музеефікаваны будынак Веткаўскага музея народнай творчасці [439, спр. 888, арк. 62].

Важнай падзеяй у музейным жыцці стала адкрыццё ў 2006 г. новага корпуса Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. У выніку гэтага экспазіцыйныя плошчы музея павялічыліся больш чым у 4 разы. 1 верасня 2008 г. адкрылася стацыянарная экспазіцыя ў залах першага пускавога комплексу Палацавага ансамбля Радзівілаў у Нясвіжы, а 1 снежня 2008 г. – 6-я музейная экспазіцыя ў замкавым комплексе «Мір» і капліца князёў Святаполк-Мірскіх.

Аднак спецыялісты лічылі, што станоўчыя прыклады былі хутчэй выключэннем з правіл. Са змяненнем у 1996 г. арганізацыйна-прававой формы фінансавання музейных устаноў і адмаўлення ад бытаваўшага ў 1990-х гг. «новага гаспадарчага механізма», прававое поле і фінансавыя магчымасці музеяў значна звузіліся. Пачынаючы з 1996 г. адбывалася ўкараненне элементаў нарматыўнага фінансавання, дэталізаванага па асобных артыкулах бюджэтнай класіфікацыі, а з 2000 г. быў уведзены казначэйскі кантроль над размеркаваннем бюджэтных сродкаў. Усе гэтыя навеўвядзенні, на думку многіх кіраўнікоў музейных устаноў, з’яўляліся істотнай перашкодай для развіцця самастойнай гаспадарчай дзейнасці музеяў і стрымлівалі актыўны творчы пошук і наватарскія праекты [439, спр. 888, арк. 64].

Істотнай праблемай у канцы 1990-х гг. была матэрыяльная база ***рэстаўрацыйных*** майстэрань як у музеях, так і ў спецыялізаваных рэстаўрацыйных фарміраваннях па абласцях. У большасці выпадкаў пад майстэрні былі выдзелены непрыстасаваныя памяшканні. Адсутнасць належнай вентыляцыі, апаратуры і іншага абсталявання не дазваляла на належным узроўні праводзіць не толькі папярэднія даследаванні музейных прадметаў да рэстаўрацыі, але і дакладна весці гэты працэс. Забяспечанасць майстэрань абсталяваннем і неабходным інструментарыем ажыццяўлялася па самых мінімальных патрэбах, што было звязана, перш за ўсё, з адсутнасцю фінансавання па адпаведных артыкулах. Яшчэ больш складаным было становішча з забеспячэннем дзейнасці рэстаўратараў неабходнымі матэрыяламі. Большасць з іх (хімічныя для апра-

цоўкі, розныя разнавіднасці клеявых кампанентаў, тканіны для дубліравання, ніткі для рэстаўрацыі старажытнага аддзення, розныя па колеры скуры і г. д.) у нашай краіне не вырабляліся, і набыццё іх патрабавала валютных сродкаў [439, спр. 351, арк. 12].

Тыя меры, якія шэраг музеяў праводзіў па забеспячэнні захаванасці сваіх збораў, у большасці сваёй з’яўляліся «самадзейнасцю» і залежалі ад пазіцыі кіраўнікоў гэтых музеяў і ад іх прафесійнай этыкі [439, спр. 888, арк. 63].

Нізкія тэмпы правядзення рэстаўрацыйных работ, а таксама работ па кансервацыі прадметаў з музейных калекцый сведчыла не аб іх належнай захаванасці, а аб штогадовых стратах. Становішча, якое склалася ў канцы 1990-х гг., пацвярджалася дакументальнымі зваротамі да Міністэрства культуры ад музеяў, у якіх выкладаліся просьбы аб спісанні з уліку тых ці іншых прадметаў з самых розных калекцый. Абгрунтоўвалася гэта фізічнымі, хімічнымі, біялагічнымі альбо іншымі пашкоджаннямі іх стану [439, спр. 351, арк. 13].

У 1999 г. пры большасці музеяў рэспубліканскага і абласнога падпарадкавання, дзе працавалі рэстаўратары, былі створаны рэстаўрацыйныя саветы. У лютым 1999 г. пачаў дзейнасць Рэспубліканскі рэстаўрацыйны савет, на які былі ўскладзены абавязкі вырашэння найбольш складаных і спрэчных пытанняў у галіне рэстаўрацыі рухомых музейных каштоўнасцей, правядзенне атэстацыі рэстаўратараў і прысваенне ім катэгарыйнасці, а таксама вырашэнне іншых арганізацыйных і юрыдычных пытанняў [439, спр. 351, арк. 11].

У сакавіку 2000 г. на калегіі Міністэрства культуры разглядалася пытанне аб стане і праблемах рэстаўрацыі рухомых музейных каштоўнасцей, падрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў рэстаўратараў для музейных устаноў рэспублікі. На ёй адзначалася, што кардынальных і тэрміновых рашэнняў патрабавалі праблемы падрыхтоўкі мастакоў-рэстаўратараў, вызначэння іх катэгарыйнасці і аплаты працы, арганізацыі стажыровак і павышэння кваліфікацыі [439, спр. 351, арк. 10].

З разрывам прафесійных сувязей з калегамі іншых краін рэстаўратары Беларусі адчувалі ў сваёй рабоце недахоп інфармацыйнага забеспячэння, асабліва па частцы новых методык, а таксама знаёмства з апошнімі дасягненнямі ў галіне рэстаўрацыі. На агульным стане справы адмоўна адбівалася адсутнасць Рэспубліканскага рэстаўрацыйнага цэнтра, наяўнасць якога не толькі дазволіла б мець цэнтралізаваную базу дадзеных па пытаннях і праблемах рэстаўрацыі рухомых музейных каштоўнасцей, але і дала б магчымасць на яго базе праводзіць стажыроўкі і павышэнне кваліфікацыі беларускіх рэстаўратараў у майстар-класах пад кіраўніцтвам спецыялістаў вышэйшай і І катэгорый [439, спр. 351, арк. 11]. Першыя захады па арганізацыі такога цэнтра былі зроблены ў канцы 1980 – пачатку 1990-х гг. У той час быў падрыхтаваны праект пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, статут цэнтра, вызначана месца размяшчэння, але пазнейшыя палітычныя і эканамічныя катаклізмы спынілі справу. Рашэннем калегіі Міністэрства культуры ў сакавіку 2000 г. такі цэнтр павінен быў быць створаны на плошчах Нацыянальнага мастацкага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музея [439, спр. 351, арк. 12]. Аднак і ў 2010 г. ідэя не была рэалізавана. У Дзяржпраграме «Культура Беларусі» на 2011–2015 гг. асобна было прапісана стварэнне на базе Рэстаўрацыйных майстэрняў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспубліканскага цэнтра рэстаўрацыі і кансервацыі [632].

Як сведчаць дадзеныя табл. 10, у 2001 г. адзначалася істотнае (у 2 разы) скарачэнне долі музейных рэчаў, што патрабавалі рэстаўрацыі, у параўнанні з 1999 г. Аднак у наступныя гады становішча толькі пагаршалася. У 2001 г. большасць музеяў не мела ў сваім штаце адзінкі рэстаўратара, а асобы, якія працавалі на гэтай пасадзе, былі ў асноўным непрафесіяналамі. Найбольш крытычным была сітуацыя ў Магілёўскай вобласці, дзе за перыяд 2001–2007 гг. колькасць патрабуючых рэстаўрацыі музейных рэчаў павялічылася ў 3 разы, а колькасць адрэстаўраваных дасягнула нулявой адзнакі. У параўнанні з 2001 г. у 2007 г. доля адрэстаўраваных рэчаў павялічылася толькі ў г. Мінску пры агульным павелічэнні долі патрабуючых рэстаўрацыі.

*Табліца 10.* **Становішча музейных фондаў [271; 754, с. 88]**

| Вобласць | Колькасць музейных рэчаў, што патрабуюць рэстаўрацыі, доля ад фонду (%) | | | | Адрэстаўравана на працягу года, доля ад патрабуючых рэстаўрацыі (%) | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Год | | | | | | | |
| | 1999 | 2001 | 2003 | 2007 | 1999 | 2001 | 2003 | 2007 |
| Брэсцкая | 9,0 | 5,0 | 4,7 | 4,4 | 1,0 | 2,8 | 1,3 | 1,7 |
| Віцебская | 0,5 | 0,5 | 0,5 | 0,4 | 8,3 | 10,1 | 3,3 | 5,5 |
| Гомельская | 0,8 | 0,8 | 2,9 | 2,9 | 8,7 | 3,9 | 0,4 | 3,1 |
| Гродзенская | 4,4 | 4,8 | 4,8 | 4,5 | 0,8 | 1,2 | 0,5 | 0,9 |
| Магілёўская | 6,5 | 6,3 | 6,3 | 18,1 | 1,5 | 0,4 | 0,3 | 0,0 |
| Мінская | 2,2 | 2,4 | 2,3 | 1,6 | 9,8 | 8,7 | 5,4 | 7,2 |
| г. Мінск | 9,8 | 8,4 | 8,4 | 9,0 | 2,0 | 1,0 | 1,4 | 2,5 |
| Рэспубліканскага падпарадкавання | 5,3 | – | 4,7 | 8,3 | 2,0 | – | 1,3 | 1,7 |
| Усяго па краіне | 9,0 | 4,5 | 4,7 | 5,6 | 1,0 | 1,8 | 1,3 | 1,3 |

Найбольшых намаганняў па рэстаўрацыі і кансервацыі патрабавалі калекцыі жывапісу (алейнага, тэмпернага, графікі), нумізматыкі, друкаваных выданняў, дакументаў, археалогіі, этнаграфіі і побыту, зброі [439, спр. 351, арк. 10].

У Беларусі не існавала сваёй школы рэстаўратараў, а навучанне за межамі краіны было звязана са значнымі фінансавымі затратамі [106, с. 37]. У 2004 г. рэстаўрацыйныя аддзелы былі толькі ў двух вядучых музеях краіны – Нацыянальным мастацкім музеі і Нацыянальным музеі гісторыі і культуры. Беларусі. У першым вяліся работы па рэстаўрацыі жывапісу, і працавалі некалькі дыпламаваных спецыялістаў, а ў другім – спецыялісты з адпаведнымі дыпломамі адсутнічалі. Кансервацыяй археалагічных матэрыялаў у Беларусі не займаўся ніхто, хаця менавіта гэтыя матэрыялы складалі самыя вялікія музейныя калекцыі [439, спр. 888, арк. 70].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З дапамогай ЮНЕСКА ў 2005 г. пры Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі быў адкрыты Цэнтр прэвентыўнай кансервацыі і праведзена 1-я школа музейных кансерватараў, слухачамі якой сталі 18 супрацоўнікаў з 11 дзяржаўных музеяў [110, с. 55].

Адным з прыярытэтных напрамкаў музейнай палітыкі Беларусі быў збор, вывучэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. У 2004 г. толькі дзяржаўны ***музейны фонд*** складаў 3 671 292 музейныя прадметы (2 587 284 адзінкі асноўнага і 1 084 008 навукова-дапаможнага фондаў); 27 % асноўнага фонду захоўвалася ў музеях рэспубліканскага падпарадкавання. Самыя буйныя зборы мелі Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі (266 782 адзінкі), Віцебскі абласны краязнаўчы музей (188 733 адзінкі), Гродзенскі абласны гісторыка-археалагічны музей (164 545 адзінак) [439, спр. 888, арк. 64].

У сістэме музейных калекцый у 2004 г. найбольшую долю складалі калекцыі археалогіі (17,5 % ад асноўнага фонду) і нумізматыкі (16 %). Далей ішлі калекцыя друкаваных выданняў (12,6 %), дакументаў (12,4 %), фотаматэрыялаў (12,4 %). Самую нешматлікую калекцыю складалі рукапісныя кнігі – 511 адзінак [439, спр. 888, арк. 65, 66].

Па дадзеных лабараторыі музейнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры, атрыманых на падставе вывучэння інфармацыйных карт музеяў, музейныя прадметы катэгорыі «0» у агульным аб'ёме асноўнага фонду складалі ў 2004 г. не больш за 2 %, катэгорыі «1» – каля 25 %. Самыя рэпрэзентатыўныя зборы былі ў Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, Веткаўскага музея народнай творчасці, Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея, Гомельскага абласнога краязнаўчага музея. Рэдкімі калекцыямі і прадметамі валодалі Брэсцкі, Віцебскі, Магілёўскі, Мінскі абласныя музеі, шэраг раённых музеяў [439, спр. 888, арк. 65, 66].

Сістэматычнае камплектаванне музейных фондаў з'яўляецца выразным паказчыкам жыццядзейнасці музея. Аднак у 2001–2003 гг. назіралася зніжэнне штогадовага прыросту музейнага фонду да 1,8–2 % у параўнанні з 4–5 %, якія былі ў пачатку 1990-х гг. Зніжэнне тэмпаў музейнага камплектавання было выклікана фінансавымі праблемамі, з якімі музеі сутыкнуліся на пачатку 2000-х гг. [439, спр. 888, арк. 65].

Скарачэнне бюджэтных асігнаванняў на патрэбы камплектавання вяло да зніжэння як колькасных, так і якасных паказчыкаў музейнага фонду. Найбольш каштоўныя рэчы часта не даходзілі да музейных фондаў, асядаючы ў прыватных калекцыях, альбо ішлі на антыкварныя рынкі за межамі краіны. У кантэксце тых задач, якія Беларусь паставіла перад сабой, распачаўшы музеефікацыю такіх буйных гістарычных помнікаў, як Нясвіжскі і Мірскі замкі, спецыялістамі выказвалася меркаванне аб стварэнні рэспубліканскага фонду для мэтанакіраванай закупкі найбольш каштоўных прадметаў гісторыі і культуры. Падобныя фонды існавалі ў многіх краінах (напрыклад, у Польшчы і Расіі). Вялікую дапамогу музеям у камплектаванні аказвала дзейнасць Экспертнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

камісіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па размеркаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія затрымлівала беларуская мытня [439, спр. 888, арк. 65].

З-за гэтага былі вельмі нізкія тэмпы рэстаўрацыі. Напрыклад, на пачатак 2000 г. было адрэстаўравана 2,7 % музейных прадметаў. У наступныя гады становішча пагоршылася. У 2001 г. 4,5 % асноўнага фонду патрабавала рэстаўрацыі, а на працягу года праз яе прайшло толькі 1,8 % ад патрабуемага [439, спр. 888, арк. 65].

Такім чынам, у вывучаемы перыяд адбывалася паступовае ўдасканальванне сістэмы кіравання, мадэрнізацыя матэрыяльна-тэхнічнай базы дзяржаўных музеяў, структурнае рэфармаванне ўсіх відаў музейнай дзейнасці, развіццё новых інфармацыйных тэхналогій у музейнай справе.

### 6.5. Турызм

Турызм у Беларусі з'яўляецца часткай нацыянальнай эканомікі і сацыяльна-культурнага жыцця грамадства. На яго развіццё ўплываюць сацыяльна-эканамічныя, грамадска-палітычныя, экалагічныя і іншыя фактары. З атрыманнем незалежнасці заўважна ўзрасла ўвага да выкарыстання ўнутранага турыстычнага патэнцыялу, фарміравання на яго аснове турыстычнага прадукту для айчынных і замежных турыстаў. Новыя ўмовы гаспадарання, якія грунтаваліся на рынкавых механізмах, садзейнічалі стварэнню канкурэнтназдольнага турыстычнага комплексу. Лібералізацыя працэдуры выезду грамадзян за мяжу прывяла да істотнага павелічэння колькасці замежных паездак. З іншага боку, новая геапалітычная сітуацыя, ліквідацыя адзінай турыстычнай прасторы ў межах СССР, сістэмы маршрутнага турызму патрабавалі вырашэння такіх пытанняў, як пошук самастойных выхадаў на міжнародныя турыстычныя рынкі, стварэнне сістэмы падрыхтоўкі кадраў, правядзенне працы па адкрыцці замежных турыстычных прадстаўніцтваў, наладжванне дзелавых кантактаў і сувязей з міжнароднымі і нацыянальнымі турыстычнымі арганізацыямі. Не спрыялі станоўчаму іміджу краіны маштабныя наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

У пачатку 1990-х гг. турыстычная галіна краіны ўяўляла сабой мноства арганізацый. Яны дзейнічалі ва ўмовах высокай інфляцыі, нізкай пакупной здольнасці насельніцтва, пастаяннага росту транспартных паслуг. Турыстычныя фірмы арыентаваліся на атрыманне прыбытку, што адбывалася ў першую чаргу за кошт значнага падзення якасці паслуг, зварочвання інвестыцыйнага працэсу, разбурэння інфраструктуры. У выніку турыстычны паток атрымаў яскрава выражаны знешні напрамак, а Беларусь амаль знікла з турыстычнай карты.

У сярэдзіне 1990-х гг. у Беларусі ў якасці прыярытэтнай была выбрана «сацыяльна-рэгулюемая мадэль развіцця турыстычнага рынку пры вядучай ролі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаўнага кіравання ў мэтах канцэнтрацыі інвестыцыйных патокаў і каардынацыі намаганняў па асваенні рэкрэацыйных рэсурсаў, фарміраванні і прасоўванню нацыянальнага турыстычнага прадукту» [828, с. 4]. Адказназнымі за распрацоўку і рэалізацыю турыстычнай палітыкі ў перыяд з 1994–1995 гг. былі два органа – Упраўленне міжнароднага турызму Міністэрства знешнеэканамічных сувязей Рэспублікі Беларусь і Камітэт па спорту і турызму Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. 10 лістапада 1995 г. было створана асобнае Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь, у складзе якога дзейнічала Упраўленне па турызму (з 2006 г. – Дэпартамент па турызму) [561].

Перад створаным ***Міністэрствам спорту і турызму*** стаялі наступныя галоўныя задачы ў галіне турызму [605]:

1. Тэрміновае рэфармаванне нацыянальнага турыстычнага комплексу з мэтай забеспячэння яго выхаду на міжнародныя рынкі, стварэнне канкурэнтаздольнага турыстычнага прадукту, паскоранае развіццё сферы турызму, прыцягненне замежных турыстаў і павелічэнне валютных паступленняў у краіну.

2. Падрыхтоўка і ўкараненне адаптаванай да міжнародных стандартаў нарматыўна-прававой базы ў працэс кіравання турыстычным комплексам.

3. Стварэнне ў краіне здаровага асяроддзя на рынку турыстычных паслуг, пераадоленне яго раздробленасці, фарміраванне высакаякаснага дзяржаўнага сектара турызму, якія абапіраецца на інфраструктуру, што знаходзіцца ў дзяржаўнай уласнасці.

4. Стварэнне шырокай гамы рэкламна-інфармацыйнага прадукту, які забяспечвае прасоўванне нацыянальнага турыстычнага прадукту на асноўныя міжнародныя турыстычныя рынкі.

З улікам гэтых задач у перыяд з 1996 па 2000 г. быў здзейснены комплекс мерапрыемстваў па развіцці турызму ў краіне. З мэтай аднаўлення кіруемасці турыстычным комплексам і павышэння эфектыўнасці яго працы Міністэрства спорту і турызму пачало ўкараненне Дзяржаўнай праграмы развіцця фізічнай культуры, спорту і турызму на перыяд да 2002 г. [509], увяло ў дзеянне «Часовыя правілы дзейнасці ў сферы турызму на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь» [159], у тым ліку ліцэнзаванне дзейнасці турыстычных фірмаў [258]. У практыку работы турыстычных прадпрыемстваў былі ўведзены адзіны турыстычны ваўчара [612], дыспетчарскія журналы ўліку прыёму–адпраўкі турыстаў [461] і тэхналагічная карта турыстычнага маршруту [460]. Гэта дазволіла павысіць адказнасць кіраўнікоў турфірм перад кліентам, больш дакладна вызначыць абавязкі кіраўніка вытворцы турыстычных паслуг, забяспечыць умовы для кантролю за фінансавымі разлікамі турфірм, платай імі падаткаў [166, с. 23].

Для развіцця замежнага турызму ў 1996 г. закрытае акцыянернае таварыства «Белінтурыст» было рэарганізавана ў Нацыянальны турыстычны канцэрн «Белінтурыст» пад ведамствам Міністэрства спорту і турызму. Канцэрн стаў здзяйсняць кіраванне прадпрыемствамі і арганізацыямі, якія ўваходзілі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яго склад і адносіліся да дзяржаўнай формы ўласнасці: гасцінічны комплекс «Юбілейны», дзяржаўная турыстычна-камерцыйная фірма «Вест-Інтур» (г. Брэст), вытворчы камбінат «Інтурыст», дзяржаўнае прадпрыемства «Беларускі комплекс "Юнацтва"» [540].

У 2004 г. Нацыянальны турыстычны канцэрн «Белінтурыст» быў пераўтвораны ў рэспубліканскае турыстычнае прадпрыемства «Белінтурыст». З яго падпарадкавання былі выключаны юрыдычныя асобы [527].

У 2000 г. для павышэння эфектыўнасці дзяржаўнага рэгулявання сферы турызму была створана Міжведамасная экспертна-каардынацыйная рада па турызме пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь [496]. Падобныя рады былі сфарміраваны пры аблвыканкамах і Мінскім гарвыканкаме.

У верасні 2001 г. з мэтай сервіснага абслугоўвання ўдзельнікаў турыстычнага рынку (у першую чаргу сертыфікацыі паслуг, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кіраўнікоў і спецыялістаў турыстычнай індустрыі) было створана ўнітарнае прадпрыемства «Нацыянальнае агенцтва па турызму Рэспублікі Беларусь» [542].

У 1999 г. у мэтах павышэння эфектыўнасці працы турыстычных прадпрыемстваў, стварэння ўмоў для развіцця рынку турыстычных паслуг быў прыняты ***Закон «Аб турызме»*** [558].

У Закон «Аб турызме» некалькі разоў уносіліся змены. Напрыклад, у 2003 г. ён быў дапоўнены палажэннямі аб турыстычнай дамове. У 2007 г. закон быў прыняты ў новай рэдакцыі. У ёй паняцце «турысцкі» было заменена на «турыстычны», што звязана не толькі з моўнымі нормамі, але і з тым, што ў Грамадзянскім кодэксе выкарыстоўваецца тэрмін «турыстычныя паслугі». Былі ўнесены карэктывы ў вызначэнне турыстычнай дамовы, якая раней разглядалася як «пагадненне паміж тураператарам ці (і) турагентам і турыстам», а цяпер як «здзелка паміж выканаўцам (суб'ектам турыстычнай дзейнасці) і заказчыкам (удзельнікам турыстычнай дзейнасці)». З закона было выключана паняцце «турыстычнага прадукту», больш поўна размежаваны прававы статус турагента і тураператара. Прынцыпова новай нормай рэдакцыі 2007 г. стала глава адносна арганізацыі экскурсійнага абслугоўвання [472].

У мэтах выканання палажэнняў новай рэдакцыі Закона «Аб турызме» было распрацавана Палажэнне аб парадку і ўмовах правядзення прафесійнай атэстацыі, якая пацвярджае кваліфікацыю экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, а таксама Палажэнне аб парадку вядзення нацыянальнага рэестра экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў [604], змяніліся падыходы да турыстычнага ваўчара [559].

Побач з гэтым у вывучаемы перыяд беларускае заканадаўства не прыраўноўвала абслугоўванне замежных наведвальнікаў да экспартных паслуг, што не адпавядала нормам міжнароднага права. Па гэтай прычыне прадпрыемствы, якія забяспечвалі праграмы абслугоўвання замежных наведвальнікаў, не маглі разлічваць на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі, якімі карысталіся



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспарцёры ў традыцыйных галінах эканомікі. З улікам спецыфікі рэалізацыі турыстычных паслуг вызначэнне іх экспартнага характару неабходна лічыць не вываз за межы мытнай тэрыторыі, як у выпадку з традыцыйным экспартам тавараў, а сам факт рэалізацыі паслуг нерэзідэнту, які суправаджаецца прытокам валютных паступленняў [700, с. 137–138].

Адным з напрамкаў развіцця турызму ў краіне быў ***дзіцячы***. Нягледзячы на значныя перашкоды, працягвалі дзейнічаць Рэспубліканская станцыя юных турыстаў (з 1991 г. – Рэспубліканскі цэнтр дзіцяча-юнацкага турызму і экскурсій), Мінская гарадская станцыя юных турыстаў (з 1991 г. – Мінскі гарадскі цэнтр дзіцяча-юнацкага турызму і экскурсій). У структуры апошняй арганізацыі з'явіліся аддзелы краязнаўства, гуртковай працы, турызму, падарожжаў і экскурсій, спартыўнага арыентавання, турыстычная база. Не перасталі дзейнічаць аднаўленыя ў 1990 г. курсы па падрыхтоўцы грамадскіх турыстычных кадраў.

У 1992 г. пачалося правядзенне Усебеларускай турыстычна-краязнаўчай экспедыцыі вучнёўскай моладзі «Наш край». Паступова пашыраўся спектр турыстычных спаборніцтваў. Акрамя пешаходнага турызму і спартыўнага арыентавання сталі праводзіцца спаборніцтвы па водным, лыжным і велатурызму. У 1992 г. былі ўпершыню праведзены спаборніцтвы па тэхніцы лыжнага турызму «Серабрыстая лыжня», па тэхніцы воднага турызму – «Блакітная хваля» і «Свіслач». 1993 год стаў годам правядзення першага злёту па тэхніцы велатурызму «Пралеска» і злёту юных геолагаў, а таксама першых рэспубліканскіх спаборніцтваў па спартыўным скалалазанні ў залах. З 1994 г. на прасторы СНД была аднаўлена традыцыя правядзення турыстычных злётаў гарадоў-герояў, і ў 1996 г. горад Мінск прымаў удзельнікаў гэтага мерапрыемства.

У 1997 г. шляхам аб'яднання гарадской станцыі юных натуралістаў і гарадскога Цэнтра дзіцяча-юнацкага турызму і экскурсій быў створаны Мінскі гарадскі турыстычна-экалагічны цэнтр. [210]

У 1993 г. у г. Мінску была праведзена Міжнародная нарада намеснікаў міністраў, дырэктараў рэспубліканскіх станцый юных турыстаў дзяржаў СНД па каардынацыі турысцкай дзейнасці вучняў.

Асобным напрамкам з'яўляецца дзіцячы клубны турызм. Калі ў 1998 г. у краіне функцыянавала 25 самастойных баз і клубаў, то ў 2001 г. – 21. Змяншэнне адбылося за кошт павелічэння турыстычных цэнтраў і станцый (1998 г. – 26, 2003 г. – 30). Год ад году павялічвалася колькасць турыстычна-краязнаўчых гурткоў. Калі ў 1998 г. іх было 2385, то праз 5 гадоў – 2518. Рост склаў 5,5 % [795, с. 6, 7].

У 2001 г. Рэспубліканскі цэнтр дзіцяча-юнацкага турызму і экскурсій быў перайменаваны ў Рэспублікаснкі цэнтр турызму і краязнаўства вучнёўскай моладзі.

Перыяд перабудовы прывёў да роспуску Усесаюзнай федэрацыі турызму і стварэння Турысцка-спартыўнага саюза СССР (1990 г.), які ў 1992 г. быў пераўтвораны ў Міжнародны турысцка-спартыўны саюз. Пры гэтым у Расіі,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Украіне, Беларусі былі створаны рэспубліканскія турысцка-спартыўныя саюзы і захаваны федэрацыі спартыўнага турызму. *Беларускі турысцка-спартыўны саюз* як грамадская арганізацыя быў зарэгістраваны ў верасні 1991 г. Асноўнай працай было правядзенне злётаў і спаборніцтваў, каардынацыя дзейнасці абласных і раённых турклубаў, колькасць якіх рэзка скарацілася з-за адсутнасці дапамогі. У 1995 г. арганізацыя перарэгістравалася з новай назвай – Рэспубліканскі турысцка-спартыўны саюз (РТСС). У гэтым жа годзе быў распрацаваны план адраджэння спартыўнага турызму ў краіне. У маі 1995 г. РТСС забяспечыў і прафінансаваў удзел каманды г. Мінска ў традыцыйным турыстычным злёце гарадоў-герояў ў г. Адэсе. Летам гэтага ж года ў ваколіцах вёскі Жодзішкі Смаргонскага раёна быў створаны першы ў Беларусі вучэбна-трэніровачны палігон і выдадзены спартыўныя тапаграфічныя карты мясцовасці [412].

Сярод грамадскіх арганізацый, якія пачалі сваю дзейнасць у сярэдзіне 1990-х гг., неабходна назваць створаную ў студзені 1995 г. Беларускую асацыяцыю турыстычных агенцтваў.

У снежні 1996 г. да кола грамадскіх арганізацый далучылася Беларуская федэрацыя турызму, асноўнымі задачамі якой стала стварэнне нацыянальных паркаў як віду турызму, падрыхтоўка спецыялістаў для будучай інфраструктуры.

У далейшым колькасць грамадскіх арганізацый павялічылася. Былі створаны: Беларускі саюз турыстычных арганізацый, Беларускае грамадскае аб’яднанне спартыўнага турызму, Беларуская асацыяцыя экскурсаводаў, гідаў-перакладчыкаў і кіраўнікоў турыстычных груп, асацыяцыя турыстычных фірм пры Саюзе прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя Куняўскага, асацыяцыя экаагратурызму.

Даследаванне ***дынамікі колькасці турыстычных прадпрыемстваў*** у перыяд 2000–2010 гг. дазваляе канстатаваць некаторае падзенне ў 2003 і 2005 гг. колькасці арганізацый, якія здзяйснялі турыстычную дзейнасць, а затым паступовае павелічэнне, якое ў 2008 і 2009 гг. было адзначана ростам амаль на чвэрць ад паказчыка папярэдняга года (табл. 11). Неабходна заўважыць, што змяншэнне колькасці адбывалася толькі за кошт прыватных арганізацый. Колькасць дзяржаўных на працягу ўсяго перыяду павялічвалася.

*Табліца 11.* **Колькасць арганізацый, якія здзяйснялі турыстычную дзейнасць, па формах уласнасці (адзінак) [782, с. 35; 783, с. 24; 784, с. 35]**

| Паказчык | Год | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2000 | 2003 | 2004 | 2005 | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
| Турарганізацыі ўсіх форм уласнасці | 415 | 400 | 417 | 402 | 434 | 463 | 577 | 720 | 783 |
| У тым ліку па формах уласнасці | | | | | | | | | |
| дзяржаўныя | 28 | 34 | 37 | 40 | 48 | 52 | 84 | 114 | 116 |
| прыватныя | 378 | 352 | 368 | 349 | 373 | 394 | 473 | 588 | 640 |
| замежныя | 9 | 14 | 12 | 13 | 13 | 17 | 20 | 18 | 27 |

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Геаграфічна турыстычныя прапрыемствы былі размеркаваны нераўнамерна. У 2008 г. амаль 56 % ад іх агульнай колькасці знаходзілася ў сталіцы, 10,6 – у Брэсцкай вобласці, 8,5 – у Віцебскай, 5,9 – у Гомельскай, 6,4 – у Гродзенскай, 7,5 – у Мінскай, 5,5 % – у Магілёўскай вобласці [782, с. 36]. Гэта сведчыла, з аднаго боку, аб рэзкай тэрытарыяльнай дыспрапарцыянальнасці развіцця турызму, з другога – аб наяўнасці значных унутраных рэзерваў па развіцці турызму, якія не рэалізоўваліся з-за нізкага ўзроўню забяспечнасці паслугамі інфраструктурнага комплексу.

Паспяховаму развіццю турыстычнай галіны ў вывучаемы перыяд перашкаджалі празмернае падаткаабкладанне, частыя змены заканадаўства, нізкая пакупная здольнасць насельніцтва, нізкая канкурэнтная здольнасць турыстычнага прадукту, дэфіцыт кваліфікаваных кадраў і неабходных прадпрымальніцкіх навыкаў, цяжкасці з рэгістрацыяй (як саміх фірм, так і асобных відаў турыстычнай індустрыі), малая колькасць гасцініц адпаведнага класа, значны знос матэрыяльнай базы [293, с. 263].

Як можна заўважыць з табл. 12, на працягу 1992–2010 гг. было некалькі пікаў прыёму турыстаў турыстычнымі арганізацыямі краіны – 1992, 1998, 2007 гг. Пры гэтым, былі два гады, калі назіраўся значны прырост: 1998 г. – павелічэнне ў 3,5 разы ў параўнанні з папярэднім годам, і 2005 г. – на 34,5 % у параўнанні з 2004 г. Цікава, што ў наступныя за адзначанымі гады назіралася некаторае падзенне паказчыкаў. На працягу 1998–1999 гг. і ў 2006 г. назіраўся нязначны спад. У цэлым у даследуемы прамежак заўважны тры перыяды спаду, якія звязаны з крызіснымі гадамі, – перыяд 1993–1996 гг., 1999–2000 гг. і 2008–2009 гг. У 1993 г. скарачэнне адбылося на 33 %, у 1999 г. – на 17, а ў 2000 г. – на 22 % у параўнанні з папярэднім годам. Пасля аднаснага «рыўку» ў 2007 г. назіраўся спад у 2008 г. Гэта тлумачыцца пачаткам эканамічнага крызісу. З іншага боку, паказчыкі сведчаць, што галіна дасягнула мяжы росту і пры наяўных механізмах далейшай станоўчай дынамікі ўязнога турызму чакаць не прыходзіцца. За 10 гадоў пасля папярэдняга эканамічнага крызісу турфірмы здолелі толькі дасягнуць і замацавацца на ўзроўні 1998 г.

Рэзкі скачок статыстычных паказчыкаў 1998 г. тлумачыцца не ростам папулярнасці Беларусі на сусветным турыстычным рынку, а ўвядзеннем новых дакументаў справаздачнасці ў сферы міжнароднага турызму (ваўчар на прыём замежных турыстаў).

Лічбы ж выязнога турызму праз турфірмы Беларусі ў гэты ж перыяд мелі іншую дынаміку. Калі паказчыкі ўязнога турызму ў 1998 г. дасягнулі максімуму, то колькасць выехаўшых ў гэтым жа годзе скарацілася. Аднак з наступнага і да 2002 г. назіраўся рост. Пры гэтым значны. У 2000 г. – на 38 % у параўнанні з папярэднім. Станоўчая дынаміка змянілася рэзкім спадам (амаль на 54 %) у 2004 г. У 2005 г. лічба крышку павялічылася, аднак у наступныя гады назіраўся няўмольны спад, пры гэтым у 2008 г. – рэзкі (на 24 %). У цэлым за 8 гадоў колькасць турыстаў, якія выязджалі праз турфірмы краіны, скарацілася на 70 %.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 12.* **Дынаміка ўязнога і замежнага турызму (1992–2010 гг.), тыс. чал. [360, с. 127, 128; 692, с. 199; 693, с. 209; 699, с. 249, 251; 782, с. 22, 23, 28, 38, 39; 783, с. 14, 15, 17, 18, 24, 25]**

| Год | Уезд замежных грамадзян у Рэспубліку Беларусь з мэтай турызму | Колькасць замежных турыстаў, прынятых арганізацыямі, якія здзяйснялі турыстычную дзейнасць | Выезд за мяжу грамадзян Рэспублікі Беларусь з мэтай турызму | Колькасць турыстаў, адпраўленых за мяжу арганізацыямі, якія здзяйснялі турыстычную дзейнасць |
|---|---|---|---|---|
| 1992 | – | 41,3 | – | 315,8 |
| 1993 | – | 23,4 | – | 411,9 |
| 1994 | – | 25,1 | – | 488,3 |
| 1995 | – | 16,8 | – | 625,8 |
| 1996 | – | 18,7 | – | 703,1 |
| 1997 | – | 26,4 | – | 969,0 |
| 1998 | – | 91,2 | – | 900,5 |
| 1999 | – | 75,5 | – | 934,2 |
| 2000 | 609,2 | 60,2 | 2091,8 | 1289,0 |
| 2002 | – | 63,4 | – | 1436,4 |
| 2003 | 359,6 | 64,2 | 3128,6 | 1108,2 |
| 2004 | 452,1 | 67,5 | 3015,4 | 514,6 |
| 2005 | 462,8 | 90,8 | 3571,5 | 572,4 |
| 2006 | 361,4 | 89,5 | 2499,9 | 525,4 |
| 2007 | 308,5 | 105,4 | 2314,4 | 516,7 |
| 2008 | 122,3 | 91,6 | 721,6 | 380,3 |
| 2009 | 101,4 | 95,5 | 427,8 | 316,3 |
| 2010 | 79,7 | 120,0 | 286,9 | 414,7 |

Параўнанне працы турарганізацый па прыёме і адпраўцы турыстаў сведчыць аб існаванні на працягу ўсяго перыяду значнай перавагі на карысць апошняга.

Заўважым, што методыка збору статыстычных дазеных у Беларусі ў вывучаемы перыяд значна адрознівалася ад рэкамендацый Сусветнай турыстычнай арганізацыі. Нацыянальныя органы статыстыкі фіксавалі толькі арганізаваны паток замежных турыстаў, якія карысталіся паслугамі турыстычных фірм Беларусі, што не дазваляла вызначыць агульную велічыню ўезду. Таму ў табл. 12 (другая і чацвёртая калонкі) прыведзены дадзеныя Дзяржаўнага камітэта памежных войск аб колькасці грамадзян, якія дэкларавалі сваю мэту наведання як «турызм». Параўнанне двух напрамкаў у гэтым выпадку выглядае па-іншаму. Калі ў 2000 г. суадносіны ўезд–выезд былі 1:3,4, то ў 2010 г. яны пагоршыліся – 1:3,6. Па разліках Сусветнай турыстычнай арганізацыі для паспяховага функцыянавання нацыянальнай галіны турызму суадносіны павінны быць 3:1 на карысць уязнога турызму.

Нельга, аднак, не адзначыць павышэнне эфектыўнасці працы беларускіх арганізацый турызму. Калі ў 2000 г. турфірмы прынялі толькі кожнага дзясятага замежнага турыста, а адправілі шэсць з дзесяці, то ў 2008 г. праз турфірмы прыехала ў Беларусь сем з дзесяці турыстаў, а выехаў кожны другі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Побач з гэтым заўважна і іншая тэндэнцыя – значнае скарачэнне (у 5 разоў) колькасці турыстаў, наведаўшых Беларусь. Прычым скарачэнне больш чым у 2 разы адбылося ў 2008 г. у параўнанні з 2007 г. Адносна выязнога турызму за перыяд 2000–2010 гг. скарачэнне было у 3 разы. Пры гэтым ў 2008 г. за мяжу выехалі толькі 73 чалавекі з 100 падарожнікаў 2007 г.

Значнае падзенне колькасці выяздного турызму ў 2004 г. тлумачыцца ўваходжаннем краін – суседак Беларусі ў Еўрапейскі Саюз і ўвядзеннем візавага рэжыму. Цікава, што колькасць наведвальнікаў нашай краіны з турыстычнымі мэтамі ў тым жа годзе ўзрасла. Рост назіраўся і ў 2005 г. Аднак ў наступныя гады – толькі спад.

Цікавымі выглядаюць і лічбы выязджаючых па асобных краінах. Напрыклад, у агульнай масе выехаўшых праз турфірмы ў 1992 г. 92 чалавекі з 100 накіроўваліся ў Польшчу. У 1995 і 1996 гг. – 85 чалавек з 100. Пасля некаторага падзення паказчык узняўся да 85 чалавек у 2000 г. Гэта былі ў большасці гандляры, якім у той час для наведання Польшчы неабходна было набыць турыстычны ваўчар, што і прыводзіла да такіх значнай колькасці турыстаў. Становішча рэзка змянілася ў 2004 г., калі ў Польшчу выехаў толькі кожны пяты. У далейшым адбылося рэзкае скарачэнне. А ў 2008 г. нават у параўнанні з 2007 г. падзенне было ў 9 разоў.

Аналіз лічбаў выезду жыхароў Беларусі за мяжу без уліку Польшчы сведчыць аб іх агульным росце. Найбольш хуткімі тэмпамі ён адбываўся ў перыяд 1992–1997 гг.: з 1992 па 1995 г. – у 3,7 раза, з 1995 па 1997 г. – у 2,2 раза. У перыяд 1997–2000 гг. назіралася нязначнае калыханне паказчыкаў, звязанае з крызісам. У наступныя гады – станоўчая дынаміка. Калі ў 2000 г. лічба была 205,3 тыс. чалавек, то ў 2008 – 383,2 тыс. Рост склаў 1,8 раза. У «дакрызісны» 2007 г. лічбы былі яшчэ лепшымі – назіраўся рост у 2,2 раза ў параўнанні з 2000 г.

У табл. 13 прыведзены паказчыкі выезду беларускіх турыстаў у асобныя краіны. Аналіз дазваляе гаварыць аб пераарыентацыі паездак з Польшчы, Расіі на Егіпет, Турцыю, Італію і Францыю. Нават у «крызісны» 2008 г. паездкі ў гэтыя краіны павялічыліся. Цікавым выглядае значнае ў параўнанні з 2000 г. павелічэнне колькасці паездак ва Украіну і павелічэнне амаль у 4,5 раза за 2000–2007 гг. паездак у Літву. У «аўтсайдарах» у 2009 г. апынулася Румынія, рост колькасці наведвальнікаў у якую на працягу папярэдніх 5 гадоў вырас у 7,6 раза. Пасля ўваходжання краіны ў Еўрапейскі Саюз колькасць паездак пайшла на спад.

У Беларусі ўдзельная вага сектара паслуг у сукупным экспарце тавараў і паслуг у 2002 г. склала 13,1 %, а ўдзельная вага турыстычных паслуг у сукупным экспарце паслуг – 14,3 %. Аналіз дынамікі ўплыву турыстычных паступленняў на плацёжны баланс сведчыць аб тым, што ва ўмовах значнага дэфіцыту турыстычнага балансу эканамічнае значэнне міжнароднага турызму ў Беларусі ў 1990-я гг. зніжалася. Доля даходаў ад турызму ў валавым унутраным прадукце ў 2000 г. зменшылася ў 4 разы ў параўнанні з 1993 г. і склала



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

0,1 %. Толькі ў 2001 г. сталі заўважнымі прыкметы стабілізацыі: упершыню за час незалежнага развіцця краіны доля турызму ў структуры макраэканамічных паказчыкаў перавысіла 1% (гл. табл. 14).

Прычыны такога гаротнага стану, па меркаванні спецыялістаў, палягалі ў адсутнасці эфектыўнага механізма фарміравання і рэгулявання турыстычнага рынку. Выхад са складанага становішча бачыўся ў стварэнні моцнай турыстычнай адміністрацыі, заснаванай на прынцыпе «гнуткага кіравання» сферай. Сярод метадаў уздзеяння на развіццё ўязнога турызму называлася палітыка падатковага, крэдытнага стымулявання, фарміраванне іміджу краіны, новыя падыходы да вызначэння бяспекі турыстычных паслуг, выкарыстанне ўнутраных і знешніх крыніц фінансавання са значным ухілам на прыцягненне знешніх інвестыцый. Істотнай перашкодай на шляху павелічэння колькасці замежных турыстаў былі значныя кошты віз, працягласць працэдуры атрымання апошніх [57, с. 119–120]. У той жа час, напрыклад, суседняя Польшча ў 1990-х гг. заключыла пагадненні аб бязвізавым турыстычным абмене з 60 краінамі. Беларусь жа мела бязвізавы турыстычны абмен толькі з краінамі СНД (акрамя Туркменістана), Македоніяй, Сербіяй і Чарнагорыяй, Манголій, В’етнамам, КНДР і Кубай.

*Табліца 13.* **Колькасць турыстаў, якія наведалі асобныя краіны ў 1992–2010 гг. [692, с. 201; 693, с. 211; 694, с. 210; 782, с. 22, 23, 28, 38, 39; 783, с. 14,15, 17,18, 24, 25; 784, с. 39]**

| Краіна | Год | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1992 | 1995 | 1998 | 2000 | 2003 | 2005 | 2007 | 2009 | 2010 |
| Балгарыя | 1,15 | 5,9 | 25,9 | 10,9 | 10,0 | 13,8 | 22,6 | 21,9 | 30,8 |
| Венгрыя | 1,23 | 4,7 | 2,6 | 7,3 | 2,9 | 2,7 | 1,7 | 1,1 | 1,3 |
| Германія | 0,7 | 3,2 | 14,8 | 7,8 | 2,7 | 2,7 | 1,4 | 1,1 | 1,4 |
| Грэцыя | 0,07 | 1,0 | 1,6 | 0,8 | 1,4 | 0,4 | 1,5 | 3,4 | 4,3 |
| Егіпет | 0,03 | 0,2 | 0,4 | 2,5 | 6,1 | 16,5 | 24,8 | 43,9 | 50,8 |
| Злучанае Каралеўства | 0,04 | 0,05 | 0,6 | 0,6 | 1,2 | 1,4 | 0,8 | 0,8 | 0,6 |
| Іспанія | 0,008 | 0,8 | 3,1 | 4,7 | 3,7 | 2,9 | 3,9 | 3,2 | 4,0 |
| Італія | 0,17 | 0,17 | 1,8 | 3,3 | 2,5 | 3,7 | 5,7 | 4,7 | 5,9 |
| Кітай | 5,2 | 0,3 | 0,03 | 0,24 | 0,013 | 0,09 | 0,8 | 0,7 | 0,7 |
| Латвія | – | 0,04 | 2,2 | 0,8 | 0,8 | 1,3 | 5,9 | 1,6 | 1,4 |
| Літва | – | 8,6 | 37,8 | 11,9 | 21,8 | 34,7 | 53,4 | 7,9 | 13,9 |
| Польшча | 291,7 | 534,6 | 685,6 | 1092,7 | 733,1 | 106,3 | 65,2 | 10,7 | 21,4 |
| Расія | – | – | – | 77,8 | 178 | 160 | 78,4 | 20,9 | 25,8 |
| Румынія | 5,5 | – | 0,2 | 0,5 | 1,8 | 11,2 | 13,8 | 3,4 | 2,2 |
| Туніс | – | 0,03 | 0,3 | 0,08 | 0,4 | 2,2 | 2,2 | 1,7 | 1,7 |
| Турцыя | 2,7 | 4,3 | 10,4 | 7,5 | 15,7 | 32,3 | 43,4 | 65,0 | 83,4 |
| Украіна | – | – | – | 29,4 | 92,9 | 144 | 154,6 | 97,7 | 132,3 |
| Францыя | 0,04 | 0,38 | 4,8 | 2,9 | 7,8 | 5,2 | 4,5 | 4,4 | 5,1 |
| Чэшская Рэспубліка | – | 3,2 | 15,2 | 17,5 | 15,8 | 18,6 | 17,6 | 8,0 | 9,0 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Табліца 14.* **Дынаміка турыстычных паступленняў у структуры макраэканамічных паказчыкаў Рэспублікі Беларусь 1993–2006 гг. [164, с. 212; 167, с. 124]**

| Доля даходаў ад турызму | Год | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1993 | 1996 | 1999 | 2000 | 2001 | 2002 | 2005 | 2006 |
| У ВУП, % | 0,4 | 0,2 | 0,1 | 0,1 | 1,5 | 1,3 | 0,6 | 1,1 |
| У аб'ёме экспарту, % | 1,3 | 0,5 | 0,2 | 1,2 | 2,3 | 2,5 | 1,57 | 1,8 |

На павелічэнне паказчыкаў ўязнога турызму была накіравана Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «Аб стварэнні турыстычных зонаў» ад 30 мая 2005 г. [543].

Неабходна адзначыць, што ў турыстычнай галіне Беларусі на працягу 2000–2006 гг. назіралася скарачэнне колькасці занятых. Калі ў 2000 г. іх было 13,1 тыс. чалавек, то ў 2006 г. – 8,2 тыс. [783, с. 77]. Скарачэнне склала амаль 28 %. У той час, як па дадзеных Сусветнай турыстычнай арганізацыі, турызм у сусветнай вытворчасці ў 2003 г. забяспечыў занятасць каля 8,3 % насельніцтва свету.

На працягу 1990-х гг. Беларусь не здолела стварыць канкурэнтаздольны *нацыянальны турыстычны прадукт* і была прадстаўлена на сусветным турыстычным рынку як нязначны па маштабе імпарцёр, які не здолеў заваяваць і ўтрымаць уласную рынкавую экспартную нішу. Праблема патрабавала тэрміновага вырашэння ў сувязі з інтэнсіўным развіццём рынку турыстычных паслуг, накіраваных на прыём, у суседніх краінах. Апошнія сталі практыкаваць новыя формы турызму – агратурызм, экатурызм, пазнавальныя, паляўнічыя туры і да т. п. [700, с. 120].

У пачатку 2000-х гг. у краіне адсутнічала каардынацыя навукова-даследчай дзейнасці ў сферы турызму і дзейсныя механізмы ўкаранення вынікаў навуковых распрацовак. Патрабавала ўдасканалення сістэма сбору і апрацоўкі статыстычных дадзеных. Яе неразвітасць істотна абмяжоўвала магчымасці аналізу функцыянавання турыстычнага комплексу і распрацоўкі практычных рэкамендацый па павышэнні эфектыўнасці яго дзейнасці. У краіне практычна адсутнічаў механізм рэкламна-інфармацыйнага забеспячэння нацыянальнага турыстычнага прадукту, турыстычна-інфармацыйныя цэнтры. У мэтых развіцця турызму практычна не выкарыстоўваліся консульскія службы. А ўдзел краіны ў буйных еўрапейскіх турыстычных кірмашах і выставах у 1990-я гг. здзяйсняўся на ўзроўні канкурыруючай прапановы асобных фірм без прадстаўлення агульнага нацыянальнага стэнда [700, с. 139–141].

У выніку ў снежні 2000 г. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь была зацверджана *Нацыянальная праграма развіцця турызму Рэспублікі Беларусь на 2001–2005 гг.* [444, с. 13]. У ёй быў адзначаны істотны заняпад унутранага турызму, адсутнасць дакладнага механізма прыцягнення ўнутраных і знешніх інвестыцый у развіццё галіны, сістэмы навуковага і рэкламна-інфармацыйнага забеспячэння прасоўвання нацыянальнага турыстычнага прадукту. Нізкая па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

купная здольнасць насельніцтва, рост кошту транспартных паслуг у той час аказвалі негатыўнае ўздзеянне на развіццё дзіцячага, маладзёжнага, самадзельнага, спартыўнага і экалагічнага турызму. Па меркаванні распрацоўшчыкаў праграмы, недахоп бюджэтных сродкаў на датацыі ў сацыяльны турызм прыводзіў да недаступнасці ўдзелу ў падарожжах асноўнай масы насельніцтва, асабліва сацыяльна неабароненых слаёў.

У праграме сярод іншых напрамкаў быў выдзелены рэлігійны (паломнічы) турызм, які звязаны з наведваннем рэлігійных святыняў і духоўным удасканаленнем і мае два вектары: пакланенне галоўным рэлігійным святыням за межамі Беларусі (для хрысціян – Іерусалім і Рым; для мусульман – Мекка і Медына); наведанне рэлігійных святыняў на тэрыторыі Беларусі як жыхарамі краіны, так і замежнікамі.

Цэнтрамі рэлігійнага турызму для праваслаўных былі прыняты Жыровіцкі манастыр (Цудадзейны абраз Жыровіцкай Маці Божай), Спаса-Еўфрасіннеўскі манастыр у Полацку (мошчы святой Еўфрасінні Полацкай), Свята-Духаў Кафедральны сабор у Мінску (галоўны праваслаўны храм у Беларусі). Для каталікоў: касцёл у Будславе (Цудадзейны абраз), Брыгіцкі кляштар у Гродна [444, с. 21].

Складаная сітуацыя ў галіне не заставалася па-за ўвагай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. 1 снежня 2004 г. асобным пунктам пратакола даручэнняў Кіраўніка дзяржавы было запісана: «забяспечыць развіццё турыстычнай індустрыі на ўзроўні сусветных стандартаў, ва ўсіх месцах выкарыстоўваць для гэтага патэнцыял тураператараў, іх ініцыятыву і інвестыцыі. Давесці канкрэтныя заданні па развіцці адзначанай інфраструктуры да суб'ектаў гаспадарання, якія маюць ліцэнзіі на здзяйсненне турыстычнай дзейнасці» [664, с. 60].

Пры абмеркаванні вынікаў выканання Нацыянальнай праграмы развіцця турызму на 2001–2005 гг. на пасяджэнні грамадскага савета пры Міністэрстве спорту і турызму з боку практыкаў гучала крытыка стану галіны па забеспячэнні развіцця ўязнога турызму. У месцах, куды прыязджалі турысты, не было рэстаранаў нацыянальнай кухні, выбару сувеніраў, анімацыйных праграм. У Мірскім замку нельга было сфатаграфавацца з рыцарам, бо яго там не было. Цэнтры турызму – Навагрудак, Слонім і іншыя – нічога не атрымоўвалі ад турыстаў. З-за недасканаласці падатковага заканадаўства мясцовыя ўлады не былі зацікаўлены ў росце турпатокаў [451].

Да гэтых праблем неабходна дадаць непадрыхтаванасць *рэгіянальных музеяў да працы з турыстамі*. У 2006 г. супрацоўнікамі Інстытута мастацтвазнаўства этнаграфіі і фальклору было праведзена анкетаванне рэгіянальных музеяў. Адказалі на анкету 57 музеяў. Апытанне выявіла, што некаторыя музеі, якія знаходзіліся на тэрыторыях з багатай этнаграфічнай спадчынай (гарады Ветка, Тураў, Лепель, Глыбокае), не ўключалі ў сферу сваёй дзейнасці экскурсіі па раёне. Толькі два музеі станоўча адказалі на пытанне аб правядзенні экскурсій на замежнай мове. Больш за палову музеяў выказаліся аб тым, што замежная мова ў экскурсійным абслугоўванні ім не патрэбна. Сярод іх – Нацыянальны

РЭПОЗІТОРИЙ БГУКИ

гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж». Каля 60 % рэспандэнтаў канстатавалі адсутнасць выдання інфармацыйна-рэкламных матэрыялаў. Толькі 15 % музеяў рэалізоўвалі сувенірную прадукцыю, 63 % музеяў не працавалі ў суботу ці нядзелю. А шэсць былі зачынены ў абодва дні. Рэжым працы музеяў супадаў з працягласцю працоўнага дня (з 9.00 да 17.00 ці 18.00), што дазваляла прымаць у асноўным толькі навучэнцаў. Толькі два музеі мелі магчымасць размясціць турыстаў на начлег, 17 музеяў з 54 не мелі наладжанага супрацоўніцтва з турыстычнымі прадпрыемствамі. Сярод іх не толькі размешчаныя ў невялікіх населеных пунктах, але і краязнаўчыя ў Брэсце і Гродна [139].

Па ацэнках спецыялістаў, на 2003 г. для турыстычна-экскурсійнага паказу выкарыстоўвалася менш за 10 % гісторыка-культурных помнікаў. У пазнавальна-экскурсійных мэтах можна было выкарыстоўваць каля 2 тыс. аб’ектаў, якія ў большасці захаваліся, але часткова патрабавалі рэстаўрацыі ці добраўпарадкавання прылеглай тэрыторыі [257, с. 17].

У 2005 г. была прынята новая ***Нацыянальная праграма развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.*** [600]. У працэсе рэалізацыі мерапрыемстваў толькі ў 2006 г. было абсталявана 259 аб’ектаў турыстычнай інфраструктуры, вызначаны межы 27 турыстычных зон. Для ўдасканалення структуры кіравання турызмам быў створаны Дэпартамент па турызме Міністэрства спорту і турызму, у абласных цэнтрах былі адкрыты філіялы Нацыянальнага агенцтва па турызме, пры аблвыканкамах, Мінскім гарвыканкаме створаны каардынацыйныя рады па турызме. Для актывізацыі развіцця галіны ў рэгіёнах былі зацверджаны планы-схемы развіцця інфраструктуры ва ўсіх 118 адміністрацыйных раёнах краіны.

На 1 снежня 2007 г. у Беларусі налічвалася 284 аб’екты размяшчэння турыстаў (гасцініцы, матэлі, кемпінгі) агульнай умяшчальнасцю 24 тыс. месцаў.

У чэрвені 2006 г. на калегіі Міністэрства культуры былі зацверджаны мерапрыемствы гэтага органа дзяржаўнага кіравання па рэалізацыі Нацыянальнай праграмы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь на 2006–2010 гг. Дакумент быў накіраваны на рашэнне наступных задач: стварэнне адзінай культурнай прасторы Беларусі, захаванне і рацыянальнае выкарыстанне гісторыка-культурнай спадчыны і аб’ектаў галіны культуры; адраджэнне цэнтраў нацыянальных рамёстваў, арганізацыю выстаў, продаж сувенірнай прадукцыі народных майстроў і ўмельцаў на тэрыторыі 27 турыстычных зон, захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны (вуснага і музычнага фальклору), удасканаленне сістэмы культурнага абслугоўвання насельніцтва, развіццё індустрыі забавы і арганізацыі вольнага часу з выкарыстанне аб’ектаў культуры, удасканаленне сістэмы падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў галіны культуры, актыўнае ўцягненне моладзі ў працэс далучэння да матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей Беларусі, удзел у нацыянальных і міжнародных акцыях з мэтай прасоўвання турыстычных магчымасцей Рэспублікі Беларусь на айчынным і міжнародным турыстычных рынках, заканадаўчае забеспячэнне захавання



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурнай спадчыны, прыцягненне інвестыцый для захавання і ўтрымання аб'ектаў галіны культуры [74, арк. 219].

Сярод канкрэтных крокаў прадугледжвалася стварэнне да верасня 2006 г. базы дадзеных аб размяшчэнні аб'ектаў культуры ў турыстычных зонах з улікам генеральнай схемы будаўніцтва і размяшчэння аб'ектаў турыстычнай інфраструктуры, складанне да кастрычніка таго ж года плана-схемы размяшчэння матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей на тэрыторыі турыстычных зон. Упраўленні культуры аблвыканкамаў сумесна з Міністэрствам культуры павінны былі падрыхтаваць прапановы па стварэнні ў кожнай вобласці 1–2 аб'ектаў турыстычнай прывабліваемасці са штогадовым правядзеннем разнастайных культурных акцый, відовішчных мерапрыемстваў, фальклорных шоу і (ці) народных сезонных свят. Значная ўвага сярод мерапрыемстваў была нададзена пашырэнню інфармацыі аб аб'ектах культуры. Міністэрства культуры брала на сябе абавязак рэгулярна прадстаўляць матэрыялы для інтэрнэт-сайта аб турыстычных магчымасцях Беларусі з інфармацыяй аб аб'ектах культуры ў турыстычных зонах і праводзімых там культурных мерапрыемствах. Шэраг мерапрыемстваў было накіравана на падрыхтоўку, выданне і перавыданне матэрыялаў аб турыстычных магчымасцях Беларусі, спалучэнне канцэртнай, фестывальнай, выставачнай, культурна-адпачынкавай дзейнасці з турызмам, удзел у міжнародных турыстычных праектах і інш. [74, арк. 209–218].

У 2007 г. Нацыянальная праграма развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь была прынята ў новай рэдакцыі на 2008–2010 гг. [601]. У першую чаргу былі перагледжаны планавыя эканамічныя паказчыкі ў бок павелічэння (за выключэннем колькасці прынятых турыстаў). Акрамя гэтага з задач праграмы былі выключаны палажэнні адносна ўзмацнення ролі дзяржаўнага кіравання галіной. Гэта тлумачыцца ў першую чаргу зменамі, якія адбыліся ў 2006–2007 гг. у дадзеным напрамку і вышэй ужо былі адзначаны.

Па асобных паказчыках Нацыянальная праграма не была выканана. Былі праведзены работы на 803 аб'ектах індустрыі турызму (пры плане 841), уведзена ў эксплуатацыю 708 аб'ектаў (83 %). Работы працягваліся на 95 аб'ектах. З-за адсутнасці сродкаў 38 аб'ектаў мясцовымі выканаўчымі органамі былі перанесены ў Дзяржаўную праграму развіцця турызму на 2011–2015 гг. Адначасова былі дадаткова ўведзены 825 аб'ектаў турыстычнай індустрыі [268, с. 44].

Гомельскім аблвыканкамам не былі створаны аб'екты турыстычнай дзейнасці ў чатырох раёнах, Гродзенскім – у адным. Брэсцкі аблвыканкам не адкрыў рэгіянальны турыстычна-інфармацыйны цэнтр у г. Бяла-Падляска (Польшча), Гродзенскі – у г. Друскенікі (Літва), Гомельскі – у гарадах Бранск (Расійскаая Федэрацыя) і Чарнігаў (Украіна) [268, с. 52].

Па выніках 2010 г. экспарт турыстычных паслуг склаў 146,7 млн дол. ЗША (135 % пры плане 119–120%) [268, с. 47].

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2007 г. № 265 была прынята Дзяржаўная комплексная праграма развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў на 2007–2010 гг. Рэалізацыя праграмы ўключала сярод

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іншых і пытанні захавання, утрымання, выкарыстання аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны на аснове сістэмы арганізацыйных, прававых і эканамічных мер, развіцця турыстычнай дзейнасці. Для гэтага было запланавана аднаўленне зон гістарычнай забудовы, стварэння дзейсных стымулаў для развіцця рамёстваў і відаў дзейнасці, заснаваных на мясцовых народных традыцыях.

Новым напрамкам у развіцці турыстычнага сектара Беларусі ў пачатку XXI ст. стаў ***сельскі турызм***. На першым этапе свайго станаўлення ён развіваўся практычна спантанна. Яго асноўнымі суб'ектамі былі гаспадары сядзібаў, фермеры і прыватныя прадпрымальнікі. Пэўная арганізаванасць і каардынацыя адбывалася дзякуючы працы двух беларускіх грамадскіх аб'яднанняў – «Аграэкатурызм» (створана ў 1997 г.) і «Адпачынак у вёсцы». Менавіта першае аб'яднанне ініцыявала вывучэнне міжнароднага вопыту ў дадзенай сферы, а ў 2002 г. выступіла арганізатарам міжнароднага семінара па развіцці агратурызму ў Беларусі.

Становішча карэнным чынам змянілася пасля выдання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 чэрвеня 2006 г. «Аб мерах па развіццю аграэкатурызму ў Рэспубліцы Беларусь» [499], у якім упершыню былі вызначаны прававыя асновы па прыёме і абслугоўванні турыстаў у аграсядзібах. З гэтага часу праблемай аграэкатурызму ў краіне пачалі займацца дзяржаўныя структуры. Выданне ўказа, стала сур'ёзным і дзейсным крокам наперад, аднак сам змест дакумента быў успрыняты суб'ектамі аграэкатурыстычнай дзейнасці неадназначна. З аднаго боку, дакумент меў прагрэсіўныя палажэнні і артыкулы. Напрыклад, артыкул 5 змяшчаў палажэнне аб тым, што пры наяўнасці пяці (не болей) пакояў, якія прадстаўляюцца для размяшчэння аграэкатурыстаў, гэта дзейнасць не прызнаецца прадпрымальніцтвам і не падлягае падаткаабкладанню. З другога боку, указ выключыў са сферы агратурызму пасёлкі гарадскога тыпу і гарады раённага падпарадкавання. На практыцы менавіта шмат у якіх з іх паспяхова працавалі аграсядзібы. Не да канца прадуманым, па меркаванні шмат якіх удзельнікаў сельскага турызму, быў пункт 4, які выключаў удзел у агратурыстычнай дзейнасці гарадскіх жыхароў, якія мелі дамы ў вёсцы і валодалі вялікім і разнастайным патэнцыялам для аказання комплексу паслуг турыстам [187, с. 192].

Рэалізаваныя меры дазволілі значна пашырыць колькасць суб'ектаў аграэкатурызму. Калі ў 2007 г. іх было 188 адзінак, то ў 2010 г. лічба вырасла больш чым у 6,5 раза і склала 1247. У лідарах па колькасці суб'ектаў была Віцебская вобласць, а па тэмпах росту за чатыры гады – Магілёўская, на тэрыторыі якой за 2007–2010 гг. колькасць сядзіб узрасла амаль у 15 разоў. Найбольшы рост паказчыкаў адбыўся ў 2008 г. (табл. 15).

Новым напрамкам у экатурызме сталі велападарожжы. Напрыклад, у 2006 г. у Белавежскай пушчы быў апрабіраваны кальцавы веламаршрут, які звязаў беларускую і польскую часткі пушчы і задзейнічаў аграсядзібы на тэрыторыі абодвух дзяржаў. Не менш цікавы велапаход быў здзейснены па тэрыторыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Еўрарэгіёна Буг, які ўключаў у сябе прыродныя багацці Беларусі, Польшчы і Украіны. Але эксплуатацыя гэтых маршрутаў сутыкалася з дзвюмя асноўнымі цяжкасцямі. Першая – забарона на перасячэнне беларуска-польскай і польска-ўкраінскай мяжы пешаходам і веласіпедыстам. Другая – адсутнасць аграсядзіб у беларускай частцы Еўрарэгіёна [187, с. 194].

*Табліца 15.* **Колькасць суб'ектаў аграэкатурызму ў 2006–2010 гг. [784, с. 65]**

| Вобласць | Год | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 2006 | 2007 | 2008 | 2009 | 2010 |
| Брэсцкая | 4 | 32 | 75 | 146 | 151 |
| Віцебская | 5 | 50 | 157 | 273 | 322 |
| Гомельская | 5 | 11 | 31 | 60 | 131 |
| Гродзенская | 11 | 33 | 70 | 156 | 180 |
| Мінская | 7 | 48 | 125 | 214 | 255 |
| Магілёўская | 2 | 14 | 16 | 78 | 208 |
| **Па краіне** | **34** | **188** | **474** | **927** | **1247** |

Новым элементам экалагічнага турызму Беларусі з 2005 г. сталі «зялёныя» маршруты («Greenways»). У лютым 2005 г. у Мінску была прынята дэкларацыя «Зялёныя шляхі Беларусі». Яе ініцыятарам стаў Польскі фонд «Партнёрства для навакольнага асяроддзя» і грамадскае аб'яднанне «Агра- і экатурызм». Значны ўнёсак у справу развіцця зялёных маршрутаў зрабіў праект, падтрыманы офісам АБСЕ ў Мінску «Арганізацыя зялёных маршрутаў як сродак развіцця турызму ў сельскіх рэгіёнах Беларусі» (май – лістапад 2005).

Па стане на 2007 г. у краіне былі распрацаваны 7 першых «зялёных» маршрутаў, якія прайшлі ўздоўж рэк – традыцыйных гістарычных гандлёвых шляхоў, натуральных прыродных калідораў. Сярод іх маршруты «Край жоўтых гарлачыкаў і сівых валуноў» па Лепельскім раёне Віцебскай вобласці, «Воднымі маршрутамі Вялікага княства Літоўскага» па рэках Грыдва, Шчара і Нёман, «Блакітныя каралі Расон» (Расонскі раён) і г. д. [650, с. 196–197].

У лістападзе 2009 г. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь быў зацверджаны распрацаваны Міністэрствам культуры сумесна з Міністэрствам спорту і турызму план дзеянняў па перадачы нявыкарыстаных сядзіб, якія знаходзяцца ў сельскай месцовасці і малых гарадскіх пасяленнях, суб'ектам аграэкатурызму. На той час у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь знаходзілася 176 гістарычных сядзіб, з якіх 46 былі прапанаваны для перадачы інвестарам. Фактычна да пачатку 2011 г. толькі пяць з іх перайшлі новым уласнікам. Гэта сядзібныя комплексы ў вёсцы Свяцк Гродзенскай вобласці, вёсцы Краскі і г. п Поразава Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці, вёсцы Відзы-Лоўчынскія Браслаўскага раёна і г. п. Лынтупы Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці [83, арк. 78].

Станоўчым прыкладам захавання сядзібных комплексаў з'яўляецца дзейнасць фермерскай гаспадаркі «Панскі маёнтак» у вёсцы Сула Стаўбцоўскага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

раёна. Для стварэння культурна-турыстычнага комплексу там былі прыстасаваны гаспадарчыя пабудовы былой сядзібы канца XVIII – пачатку XIX ст. Была адноўлена стайня, збудаваны адкрыты манеж, праводзілася рэстаўрацыя будынка пад гасцініцу [83, арк. 78].

Нязначная колькасць перададзеных сядзіб у значнай меры абумоўлівалася адсутнасцю на аб'ектах праваўстанаўліваючых дакументаў: пасведчанняў аб дзяржаўнай рэгістрацыі, выпісак з рэгістрацыйных кніг аб правах, абмежаваннях правоў, тэхнічных пашпартоў, звестак аб коштах аб'ектаў. Фактычна ўсе сядзібы, якім быў нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, не мелі праектаў зон аховы. Гэта не дазваляла атрымаць звесткі аб іх граніцах і рэгламентах работ на прылеглых тэрыторыях. Даходзіла да прамога парушэння заканадаўства, калі на гісторыка-культурных каштоўнацях па рашэнні райвыканкамаў пачыналіся работы. Так адбылося ў вёсцы Усялюб Навагрудскага раёна і Жамыслаўль Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці. З іншага боку, з-за адсутнасці работ па кансервацыі аб'екты спадчыны даводзіліся да аварыйнага стану і пры поўнай бяздзейнасці іх уласнікаў разбураліся. Гэта назіралася ў в. Сёмкава Мінскага раёна, в. Каралінова Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці, г. п. Жалудок Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, г. Нароўля Гомельскай вобласці [83, арк. 79].

Пытанні рэалізацыі згаданага вышэй плана дзеянняў былі разгледжаны на калегіі Міністэрства культуры ў кастрычніку 2010 г. Па яе выніках былі распрацаваны і накіраваны ў аблвыканкамы рэкамендацыі аб паслядоўнасці дзеянняў па перадачы нявыкарыстаных сядзіб, якія знаходзяцца ў сельскай мясцовасці ці малых гарадскіх пасяленнях, суб'ектам аграэкатурызму.

Істотнай праблемай у вывучаемы перыяд быў адукацыйны узровень ***работнікаў сферы турызму***. У 2006 г. вышэйшую адукацыю мелі 34,2 % работнікаў [783, с. 79]. Адчуваўся недахоп у высокакваліфікаваных спецыялістах у сярэдніх і малых гарадах, дзе турызм толькі пачынаў развівацца.

Падрыхтоўка кадраў для галіны пачалася ў 1995 г., калі Міністэрства спорту і турызму сумесна з Міністэрствам адукацыі і навукі выдалі загад «Аб выкарыстанні турызму і экскурсій у дзейнасці навучальных устаноў». Турызм як прадмет стаў вывучацца ў ВНУ, тэхнікумах і школах краіны.

Першая кафедра міжнароднага турызму была створана ў 1994 г. у Інстытуце прадпрымальніцкай дзейнасці. Яна была выпускаючай па спецыяльнасці «Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве» (спецыялізацыя «Эканоміка і кіраванне турызмам»).

Увосень 1998 г. падобная кафедра пачала працаваць на факультэце міжнародных адносін БДУ. Яна рыхтавала студэнтаў па спецыяльнасці «Менеджмент» са спецыялізацыяй «Менеджмент у сферы міжнароднага турызму».

Падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасці «Эканоміка і кіраванне сацыяльна-культурнай сферай» са спецыялізацыямі «Эканоміка і кіраванне турызмам» і «Эканоміка і кіраванне гасцінічнай і рэстараннай гаспадаркай» з 1998 г. вялася ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У верасні 1996 г. на геаграфічным факультэце БДУ была створана Асацыяцыя экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў. У тым жа годзе на гэтым жа факультэце быў здзейснены набор у Вышэйшую школу экскурсаводаў, якая пачала падрыхтоўку метадыстаў, экскурсаводаў, кіраўнікоў турыстычных груп. У 1998 г. яна была пераўтворана ў Вышэйшую школу экскурсаводаў і менеджараў турызму. Гэта дазволіла аб'яднаць у адзіны комплекс сістэму падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў. За час існавання Вышэйшай школы ў ёй прайшлі перападрыхтоўку каля 100 чалавек. У 2006 г. яна стала структурным падраздзяленнем Інстытута бесперапыннай адукацыі БДУ. Перападрыхтоўку турыстычнах кадраў узяў на сябе створаны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізкультуры і спорту Міжнародны інстытут турызму.

Нягледзячы на даволі шматлікую колькасць навучальных цэнтраў па падрыхтоўцы спецыялістаў для турызму, у пачатку 2000-х гг. у краіне пачаў адчувацца недахоп «вузкіх» спецыялістаў з добрым валоданнем ведамі ў сферы фінансаў, грамадскіх сувязей (PR), краіназнаўства, камп'ютарных тэхналогій, работы з персаналам, спецыялізаваных відах турызму.

Спецыялісты-практыкі адзначалі невысокі ўзровень падрыхтоўкі на большасці турыстычных кафедр краіны. Шмат якія з іх існавалі ў навучальных установах, якія не з'яўляліся профільнымі адносна турыстычнай дзейнасці і не мелі неабходнай матэрыяльнай базы, вучэбна-метадычных матэрыялаў і кваліфікаваных выкладчыкаў. Адсутнічаў сістэмны падыход да рашэння праблемы падрыхтоўкі кадраў, дакладнае ўяўленне аб наяўнай і перспектыўнай запатрабаванасці ў кадрах рознай спецыялізацыі і ўзроўню кваліфікацыі. У навучальных установах займаліся ў асноўным падрыхтоўкай эканамістаў-менеджараў, у той час як фактычна не здзяйснялася навучанне экскурсаводаў, гідаў-перакладчыкаў, кіраўнікоў турыстычных груп. У стадыі станаўлення знаходзілася сістэма перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі турыстычных кадраў [234, с. 302–305].

Гэтыя моманты былі адзначаны ў Нацыянальнай праграме развіцця турызму на 2001–2005 гг. Аднак і ў Праграме на 2006–2010 гг. значная ўвага была нададзена кадраваму пытанню. Гэта сведчыць аб нявырашанасці праблемы. На новую пяцігодку была пастаўлена задача стварэння сістэмы бесперапыннй адукацыі па ўсіх спецыяльнасцях індустрыі турызму і гасціннасці на базе адукацыйнага стандарту пры ўзаемадзеянні суб'ектаў турыстычнай інфраструктуры і ўстаноў адукацыі; выкарыстання магчымасцей дзяржаўнага заказу па падрыхтоўцы спецыялістаў па найбольш значных і перспектыўных напрамках турыстычнай дзейнасці; прывядзенне структуры падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы турызму ў адпаведнасці з запатрабаваннямі турыстычнага рынку ў цэлым і асобных рэгіёнаў. Асобна ў праграме была адзначана неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў для суб'ектаў турыстычнай індустрыі з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй (сярэдняга турыстычнага персаналу) на базе дзейнічаючых устаноў адукацыі, якія забяспечвалі атрыманне сярэдняй спецыяльнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адукацыі ў сферы абслугоўвання і паслуг (гасцінічна-рэстаранны бізнес, бытавое, транспартнае абслугоўванне і інш.) [600].

Першым крокам на шляху рэалізацыі пастаўленых задач стала стварэнне ў 2007 г. на базе БДУ фізкультуры і спорту Нацыянальнага цэнтра па перападрыхтоўцы турыстычных кадраў.

У 2007 г. у краіне налічвалася 13 вышэйшых навучальных устаноў, якія займаліся падрыхтоўкай кадраў для турызму (у 1999 г. – 16). Сем знаходзіліся ў Мінску, але лічба выпускнікоў выглядала нязначнай – 546 маладых спецыялістаў дзённай формы навучання і 351 – завочнай [601]. Гэта пры тым, што ў краіне дзейнічала 463 турыстычныя арганізацыі [783, с. 118].

Нацыянальная праграма развіцця турызму на 2008–2010 гг. адзначала неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, зыходзячы з прыярытэтных турыстычных напрамкаў кожнага рэгіёна, ствараемых турыстычных аб’ектаў і комплексаў, спецыялістаў па арганізацыі пазнавальнага, экалагічнага, агратурызму, дзелавога, рэлігійнага і інш. [601].

Адной з адчувальных праблем у сферы турызму была празмерная колькасць турыстычных кадраў у г. Мінску і іх востры дэфіцыт у рэгіёнах, сярэдніх і малых гарадах. Толькі ў 69 раёнах краіны з 118 у 2007 г. здзяйснялася турыстычная дзейнасць [601].

Па стане на канец 2010 г. падрыхтоўку кадраў для індустрыі турызму па розных напрамках вялі 20 ВНУ, а таксама 8 ССНУ і 120 навучальных устаноў сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Перападрыхтоўку на ўзроўні вышэйшай адукацыі здзяйснялі 6 устаноў адукацыі: Інстытут турызму Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, Інстытут бесперапыннай адукацыі БДУ, а таксама Брэсцкі, Гродзенскі, Полацкі і Магілёўскі ўніверсітэты. Выпуск 2010 г. склаў 1,6 тыс. спецыялістаў па турыстычных спецыяльнасцях, набор – 2234 чалавекі [268, с. 43].

Аднак кваліфікаваных кадраў па-ранейшаму не хапала. Асабліва тых, хто свабодна валодаў замежнымі мовамі. Адчуваўся востры дэфіцыт прафесіяналаў у сферы агратурызму [268, с. 52].

З наданнем незалежнасці ў Беларусі з’явілася магчымасць паўнавартаснага развіцця ***міжнароднага супрацоўніцтва*** ў сферы турызму. За перыяд з 1990 па 2010 г. краіна заключыла 18 міжурадавых пагадненняў з іншымі дзяржавамі аб супрацоўніцтве ў галіне турызму. Міжведамасныя пагадненні (протаколы, мемарандумы) аб супрацоўніцтве ў дадзенай галіне былі заключаны з Іранам (2002), Літвой (2002), Славакіяй (2007), В’етнамам (2008), Казахстанам (2009) [647]. У 1993 г. пагадненне аб бязвізавых паездках арганізаваных груп турыстаў было заключана паміж Беларуссю і Кітаем.

Аналіз геаграфіі заключаных пагадненняў сведчыць аб тым, што знешняя турыстычная палітыка краіны не ў поўнай меры ўлічвала ступень прыярытэтнасці рынкаў збыту турыстычных паслуг, што зніжала яе эфектыўнасць. Напрыклад, былі заключаны пагадненні з Кубай і Сірыяй, якія не ўваходзілі ў лік вядучых турыстаўтвараючых краін для Беларусі. У той жа час з такімі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краінамі – лідарамі па адпраўцы турыстаў у Беларусь, як Вялікабрытанія, Германія, ЗША, Італія і інш., афіцыйныя пагадненні адсутнічалі. З іншага боку, гэта не перашкаджала развіццю супрацоўніцтва, што ставіць пад сумненне эфектыўнасць намаганняў па падрыхтоўцы і падпісанню падобнага кшталту міжнародных дакументаў.

Неэфектыўна развівалася супрацоўніцтва ў межах Садружнасці Незалежных Дзяржаў, пачатак якому быў пакладзены Пагадненнем аб супрацоўніцтве ў галіне турызму краін – удзельніц СНД ад 23 снежня 1993 г. [733]. За перыяд з 2002 па 2006 г. не было праведзена ніводнага пасяджэння Міждзяржаўнага савета па турызме краін СНД. Акрамя таго, рашэнні, якія прымаліся дадзеным органам, насілі рэкамендацыйны характар. Так і не была сфарміравана адзіная інфармацыйная сетка турызму краін – удзельніц пагаднення. Не былі адноўлены былыя і не адкрыты новыя турыстычныя маршруты, недастаткова эфектыўна вялася праца па спрашчэнні памежных, мытных фармальнасцей, забеспячэнні асабістай бяспекі турыстаў, распрацоўцы міждзяржаўных праграм і праектаў па асваенні турыстычных рэгіёнаў [164].

Турызм з'яўляўся адным з напрамкаў дзейнасці ў рамках створаных еўрарэгіёнаў «Буг», «Нёман», «Азёрны край», «Белавежская пушча», «Днепр». Гэта дазволіла аб'яднаць фінансавыя магчымасці краін, развіваць турыстычную інфраструктуру і фарміраваць адзіную турыстычную прастору, эфектыўна асвойваць сумесную гісторыка-культурную спадчыну, ствараць новыя працоўныя месцы.

Дасягненнем на шляху міжнароднага супрацоўніцтва стала прыняцце ў 2005 г. Рэспублікі Беларусь у Сусветную турыстычную арганізацыю.

Такім чынам, у развіцці галіны турызму можна выдзеліць тры перыяды – 1991–1995 гг. (да стварэння асобнага міністэрства), 1996–1999 гг. (да прыняцця першай праграмы развіцця галіны) і 2000–2010 гг. На першы перыяд прыпадаюць структурныя змены ўсяго народнагаспадарчага комплексу Беларусі, фарміраванне новых сфер вытворча-гаспадарчай дзейнасці. Менавіта ў гэты перыяд адбывалася фарміраванне асноў рэформ эканомікі, быў здзейснены пераход ад адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання да механізму рэгулявання працэсамі, якія адбываліся ва ўсіх сферах народнай гаспадаркі. На першым этапе турыстычныя прадпрыемствы развіваліся ва ўмовах свабоднай канкурэнцыі.

На другім этапе быў узяты курс на ўзмацненне ролі дзяржавы ў рэгуляванні дадзеным сектарам. Было створана асобнае Міністэрства спорту і турызму, распрацавана Дзяржаўная праграма развіцця фізічнай культуры, спорту і турызму на перыяд да 2002 г., уведзена ліцэнзаванне дзейнасці турыстычных фірм, адзіны турыстычны ваўчар, распрацаваны часовыя правілы арганізацыі турыстычнай дзейнасці і прыняты закон «Аб турызме». На гэты перыяд прыходзіцца значнае пашырэнне колькасці навучальных устаноў, якія пачалі падрыхтоўку кадраў для галіны, а таксама эканамічны крызіс 1998–1999 гг.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На трэцім этапе адбывалася ўдасканаленне сістэмы дзяржаўнага кіравання галіной, распрацоўка і прыняцце трох нацыянальных праграм развіцця турызму. У гэты час усё больш увагі надавалася праблемам павелічэння колькасці і якасці ўнутранага і ўязнога турызму. Значныя крокі наперад дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы зрабіў агра- і экатурызм. Краіна стала паўнавартасным членам Міжнароднай турыстычнай арганізацыі.

### 6.6. Традыцыйная культура

Адной з асноўных задач культурнай палітыкі нашай дзяржавы ў вывучаемы перыяд з'яўлялася захаванне традыцыйнай культуры. Станаўленне суверэнітэту Рэспублікі Беларусь спрыяла значнаму павелічэнню ўвагі грамадства да народнай вусна-паэтычнай творчасці, адраджэнню каляндарных свят і абрадаў, народна-харэаграфічнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. У вытокаў нацыянальна-культурнага адраджэння стаялі грамадскія аб'яднанні гісторыка-культурнай накіраванасці: «Талака» (існавала ў 1985–1991 гг. у Мінску), «Паходня» (існавала ў 1986–1991 гг. у Гародні) і інш.

Значным крокам на шляху захавання нацыянальнай культурнай спадчыны з'явілася наданне Законам «Аб мовах у Беларускай ССР» беларускай мове статусу дзяржаўнай. 20 верасня 1990 г. Саветам Міністраў БССР была прынята «Дзяржаўная праграма развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў Беларускай ССР». У 17-м артыкуле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. было запісана: «Дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь з'яўляецца беларуская мова. Рэспубліка Беларусь забяспечвае свабоднае выкарыстанне рускай мовы як мовы міжнацыянальных зносін». Натуральна, нельга было чакаць, што ўсё насельніцтва краіны адназначна ўспрыме гэту рэформу. Па рашэнні рэферэндуму аб мовах 14 мая 1995 г. у Канстытуцыі статус дзяржаўнай мовы нараўне з беларускай атрымала і руская – 83,1 % удзельнікаў рэферэндуму выказалі сваё жаданне надаць рускай мове статус, роўны беларускай.

У *Законе «Аб культуры»* [24], прынятым у 1991 г., сярод абавязкаў дзяржавы ў галіне культуры адзначалася стварэнне гарантый і стымулаў захавання традыцыйнай культуры (арт. 5), усебаковай падтрымкі развіцця традыцыйнай культуры ў цэлым і яе розных жанраў з боку рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады (арт. 19). На мясцовыя саветы і органы кіравання культурай накладаваўся абавязак забеспячэння арганізацыйнай і фінансавай падтрымкі развіцця традыцыйнай культуры і стварэння ўмоў для адкрыцця творчых майстэрань і школ народных майстроў.

У змест тэрміна «традыцыйная культура» закон уключаў аўтэнтычны фальклор, звычаі, абрады, святы, традыцыйныя промыслы і рамёствы і інш.

У 1993 г. Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь была зацверджана *Праграма дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры на 1994–1996 гг.* [611]. У ёй адзначалася неабходнасць новага комплекснага падыходу да праблем адраджэння, захавання і развіцця народнага мастацтва, мастацкіх промыслаў і

рамёстваў. Звярталася ўвага на неабходнасць рознабаковай дзяржаўнай падтрымкі народнага мастацтва, носьбітаў і захавальнікаў яго традыцый у складаных умовах фарміравання рыначных адносін. У праграме ўтрымліваліся палажэнні аб распрацоўцы праекта Закона «Аб народных мастацкіх промыслах і рамёствах», нарматыўных прававых актаў, у якіх бы вызначаўся прававы статус народнага майстра, парадак прысуджэння званняў «народны майстар» і «заслужаны майстар Рэспублікі Беларусь», парадак індывідуальнага навучання пры народных майстрах і інш.

У праграме ўтрымліваліся прапановы па стварэнні сістэмы мерапрыемстваў, накіраваных на адраджэнне, падтрымку і развіццё народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў. Сярод іх: арганізацыя і правядзенне раз у пяць гадоў Усебеларускага свята-конкурсу народных рамёстваў; аднаўленне практыкі правядзення раённых і абласных аглядаў народнага мастацтва, якія павінны заканчвацца прадстаўнічымі рэспубліканскімі выставамі; правядзенне выстаў, конкурсаў і пленэраў, накіраваных на стымуляванне развіцця асобных, найбольш характэрных і самабытных, а таксама рэдкіх і забытых ці адноўленых відаў народнага мастацтва. Дакумент прадугледжваў меры па захаванні існаваўшых цэнтраў самабытных відаў народнага мастацтва, падтрымцы народных майстроў, уключэнні ў разрад нацыянальнага здабытку і пад ахову дзяржавы як гісторыка-культурнай каштоўнасці жывых праяў народнага мастацтва.

Асобны раздзел праграмы быў прысвечаны актывізацыі дзейнасці па зборы і захаванні ўзораў традыцыйнага народнага мастацтва, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення. Прыярытэт у гэтай працы адводзіўся музеям. На той час у Беларусі толькі тры музеі мелі статус музеяў народнага мастацтва (у Раўбічах, Ветцы і Моталі). Выказвалася прапанова стварэння Нацыянальнага музея народнага мастацтва і мастацкіх рамёстваў, рэгіянальных музеяў народнага мастацтва, а таксама спецыялізаваных музеяў, дамоў-музеяў народных майстроў і музеяў-майстэрань. На практыцы былі створаны толькі некалькі музеяў. У 1996 г. Дом рамёстваў у г. Браславе быў рэарганізаваны ў Музей рамёстваў (пазней перайменаваны ў Музей традыцыйнай культуры). У 1998 г. адчыніў дзверы для наведвальнікаў Музей традыцыйнага ручнога ткацтва ў г. Полацку. З 1999 г. пачынаецца гісторыя музея «Бездзежскі фартушок» у Драгічынскім раёне. У 2006 г. у Івянецкі музей традыцыйнай культуры быў пераўтвораны былы мемарыяльны музей Ф. Дзяржынскага.

У мэтах рэалізацыі праграмных падыходаў у наступныя гады былі распрацаваны і зацверджаны мэтавыя праграмы «Адраджэнне ручнога ўзорчатага ткацтва», «Беларускі ручнік», «Адраджэнне традыцый мастацкай культуры Палесся», распрацаваны рэгіянальныя (абласныя) і шэраг мясцовых (раённых праграм) [356, с. 196].

Арганізатарскую і каардынуючую ролю ў сферы народнага мастацтва і мастацкіх промыслаў адпаведна праграме павінны былі ўзяць на сябе новыя тыпы ўстаноў культуры – дамы і цэнтры рамёстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сакавіку 1997 г. калегія Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь прыняла пастанову *«Аб захаванні і падтрымцы традыцыйнай культуры»* [439, спр. 207, арк. 102]. Яна замацавала ў якасці аднаго з прыярытэтных напрамкаў палітыкі Міністэрства задачы аднаўлення, зберажэння, падтрымкі, аховы і папулярызацыі традыцыйнай культуры. Органам і ўстановам культуры ўсіх узроўняў рэкамендавалася звярнуць увагу на неабходнасць актывізацыі работы па зберажэнні і падтрымцы традыцыйнай культуры, фальклору свайго рэгіёна. Перад згаданымі суб'ектамі ставіліся задачы надання новых імпульсаў існаванню жывой традыцыі праз мэтанакіраваную работу з ёй у культурна-асветных і навучальных установах; стварэння сістэмы пераемнасці фальклорнага і рамесніцкага вопыту; адраджэння забытых альбо рэдкіх тэхналогій народнага рамяства; падтрымкі носьбітаў і знаўцаў традыцыі; трансляцыі лепшых узораў аўтэнтычнага фальклору ў мастацкай самадзейнасці і прафесійнай творчасці; вывучэння і фіксацыі фальклору сваіх месцаў, яго папулярызацыі і распаўсюджвання.

З мэтай развіцця рэгіянальных асаблівасцей народнага мастацтва калегія ўхваліла і выдзеліла фінансаванне на рэгіянальныя мэтавыя праграмы Веткаўскага музея народнай творчасці «Стварэнне Цэнтра па вывучэнню і захаванню традыцыйных рамёстваў рэгіёна», аддзела культуры Лепельскага райвыканкама «Захаванне народных традыцый», Івянецкага абласнога музея Ф. Э. Дзяржынскага «Вяртанне да вытокаў».

Калегія зацвердзіла палажэнне аб спецыяльных прэміях Міністэрства культуры за выдатныя дасягненні і асабісты ўклад у захаванне і развіццё народных культурных традыцый. Акрамя гэтага, былі дадзены распараджэнні, накіраваныя на стварэнне нарматыўнага і арганізацыйнага забеспячэння падтрымкі традыцыйнай культуры: распрацаваць палажэнні аб народным майстры і аўтэнтычным фальклорным калектыве; метадычныя рэкамендацыі па тыпалагізацыі, формах, метадах і напрамках дзейнасці ўстаноў сферы традыцыйнай культуры; метадычныя рэкамендацыі па фарміраванні фота-, фона-, фідэаархіваў; распрацаваць тэхнічнае заданне на стварэнне тэматычнага раздзела для электроннай энцыклапедыі культуры; прадставіць прапановы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы спецыялістаў вызначанага профілю з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй; вызначыць мэтазгоднасць стварэння асобных спецыялізаваных музеяў народнага мастацтва і рамёстваў, музеяў народных майстроў; вырашыць лёс калекцыі твораў інсітнага мастацтва Ф. Л. Максімава; ухваліць ідэю стварэння перыядычнага выдання Беларускага інстытута праблем культуры «Народная творчасць».

Праца з рознымі формамі матэрыяльнай і духоўнай традыцыйнай культуры ажыццяўлялася ва ***ўстановах комплекснага характару***, якія мелі розныя найменні пры падобных функцыях: дамы (цэнтры) фальклору, рамёстваў, народнай творчасці, народных традыцый [709, с. 17]. Гэтыя ўстановы запоўнілі арганізацыйна-метадычны вакуум, утвораны пасля ліквідацыі рэспублікан-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

скіх навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культпрасветработы і Міжсаюзнага дома самадзейнай творчасці [829, с. 214]. Ва ўзаемадзеянні з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі, творчымі саюзамі, навучальнымі ўстановамі, добраахвотнымі таварыствамі, іншымі дзяржаўнымі і недзяржаўнымі структурамі яны садзейнічалі развіццю народнага мастацтва, мастацкіх промыслаў і рамёстваў. Напрыклад, праз арганізацыю гурткоў па навучанні саломапляценню, ганчарству, вышыўкі, ткацтву, разьбярству і іншым народным рамёствам дамы (цэнтры) рамёстваў займаліся выхаваннем нацыянальна свядомага грамадства, далучалі да традыцыйнага мастацтва шырокія колы насельніцтва і асабліва моладзь. Акрамя гэтага, супрацоўнікі цэнтраў займаліся збіраннем, захаваннем, кваліфікацыяй і сістэматызацыяй традыцыйных рамёстваў, адраджэннем традыцыйных унікальных тэхналогій, арганізацыяй вытворчасці вырабаў паводле старадаўніх мясцовых узораў. Яны арганізоўвалі фестывалі і агляды народнай творчасці, выставы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, аказвалі метадычную і практычную дапамогу калектывам мастацкай самадзейнасці [48; 670].

Першы Дом рамёстваў быў створаны ў г. Глыбокім у 1990 г. У 1992 г. іх налічвалася 12, і ўсе яны размяшчаліся ў Віцебскай вобласці [715, с. 687]. У 2010 г. дамы рамёстваў былі ў кожным раёне Віцебскай вобласці. На Брэстчыне была распаўсюджана практыка адкрыцця школ рамёстваў. Гэта было абумоўлена асаблівасцю рэгіёна. Тут, асабліва на Палессі, больш, чым дзе, захаваліся жывыя крыніцы народных рамёстваў. Таму пры майстрах, якія валодалі аўтэнтычным рамяством, і адкрываліся такія школы. Шырокую вядомасць атрымалі бандарская школа ў г. Іванаве, школа падвойнага ткацтва ў в. Падбеллі Камянецкага раёна. Адзіным жывым ганчарным цэнтрам у Беларусі была школа ганчарства ў в. Гароднай. Гэта вёска стала цэнтрам правядзення штогадовага міжнароднага пленэру ганчароў [760]. Да 1996 г. у краіне былі створана 63 дамы фальклору, народнай творчасці. Найбольшая іх колькасць была ў Гомельскай вобласці [168, с. 28].

*Табліца 16.* **Колькасць новых тыпаў культурна-асветных установ [271]**

| Вобласць | Дамы, цэнтры рамёстваў народных майстроў | | | | | | | | Дамы, цэнтры фальклору, народнай творчасці, нацыянальнай культуры | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Год | | | | | | | | | | | | | | | |
| | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001 | 2003 | 2005 | 2008 | 1997 | 1998 | 1999 | 2000 | 2001 | 2003 | 2005 | 5008 |
| Брэсцкая | 5 | 5 | 5 | 5 | 6 | 17 | 18 | 20 | 2 | 8 | 10 | 10 | 14 | 5 | 5 | 8 |
| Віцебская | 21 | 24 | 22 | 22 | 24 | 2 | 2 | 6 | 1 | – | – | 2 | 2 | 21 | 24 | 25 |
| Гомельская | 7 | 8 | 11 | 13 | 16 | 17 | 17 | 32 | 33 | 31 | 31 | 33 | 32 | 13 | 17 | 17 |
| Гродзенская | 2 | 3 | 4 | 6 | 6 | 10 | 8 | 18 | 4 | 8 | 8 | 8 | 8 | 6 | 18 | 20 |
| Магілёўская | 4 | 4 | 6 | 7 | 7 | 1 | 2 | 6 | 2 | – | – | 2 | 3 | 6 | 6 | 11 |
| Мінская | 7 | 14 | 19 | 21 | 23 | 17 | 16 | 19 | 13 | 15 | 15 | 19 | 24 | 14 | 17 | 14 |
| **Усяго** | **46** | **58** | **67** | **74** | **82** | **64** | **63** | **101** | **55** | **62** | **64** | **74** | **83** | **65** | **87** | **95** |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Структурнымі падраздзяленнямі абласнога маштабу, якія ў даследуемы перыяд праводзілі асноўную работу ў галіне народнай культуры, былі *абласныя навукова-метадычныя цэнтры народнай творчасці* (АНМЦНТ). Пры іх працавалі аддзелы традыцыйнай культуры, аматарскай творчасці, інфармацыйна-аналітычны, рэпертуарна-выдавецкі. Дапамогу ў працы цэнтрам аказвалі раённыя арганізацыйна-метадычныя цэнтры народнай творчасці, раённыя цэнтры культуры, раённыя цэнтры народнай творчасці [829, с. 219–220].

У адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 верасня 1993 г. № 643 быў створаны *Беларускі дзяржаўны канцэрн народных мастацкіх промыслаў* («Белмастацпромыслы»). Ініцыятарам яго стварэння стала асацыяцыя «Беларускія народныя мастацкія промыслы». Канцэрн аб'яднаў прадпрыемствы, якія займаліся выпускам вырабаў народных промыслаў і рамёстваў. Мэтай яго стварэння было адраджэнне страчаных, захаванне і далейшае развіццё існуючых народных мастацкіх промыслаў, забеспячэнне запатрабаванняў насельніцтва ў вырабах традыцыйных промыслаў і рамёстваў, стварэнне ўмоў сацыяльна-эканамічнага развіцця прадпрыемстваў і забеспячэння іх сыравінай, матэрыяламі, абсталяваннем і г. д, аказання ім метадалагічнай дапамогі па пытаннях распрацоўкі прагнозных паказчыкаў развіцця, цэнаўтварэння, а таксама для арганізацыі аптовага і рознічнага гандлю вырабамі народных мастацкіх промыслаў, асваення новых рынкаў збыту і стварэння сеткі фірменых магазінаў і да т. п. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 28 верасня 1994 г. № 127 Беларускі дзяржаўны канцэрн народных мастацкіх промыслаў быў падпарадкаваны Упраўленню справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З 1 студзеня 2007 г. канцэрн быў пераўтвораны ў дзяржаўнае вытворча-гандлёвае аб'яднанне «Белмастацпромыслы».

Распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 мая 1996 г. № 149 «Аб аказанні фінансавай дапамогі народным мастацкім промыслам» у мэтах адраджэння, захавання і развіцця ў краіне народных мастацкіх промыслаў, задавальнення патрэбнасці насельніцтва ў іх вырабах Міністэрству фінансаў і тагачаснай Галоўнай дзяржаўнай падатковай інспекцыі пры Кабінеце Міністраў Рэспублікі Беларусь было прадпісана кампенсаваць у 1996 г. юрыдычным асобам незалежна ад форм уласнасці і падначаленасці ўзятыя з іх сумы падаткаў на дабаўленую вартасць па прадукцыі традыцыйных народных мастацкіх промыслаў ручной работы. У мэтах яго выканання 23 верасня 1996 г. была прынята пастанова Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад № 625 «Аб зацверджанні парадку кампенсацыі сумаў падатку на дабаўленую вартасць па прадукцыі традыцыйных мастацкіх промыслаў ручной работы».

У адпаведнасці са згаданым распараджэннем і на падставе пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2000 г. № 1908 «Аб зацверджанні Дзяржаўнага рэестра вырабаў народных промыслаў (рамёстваў)» у 2007 г. пры дзяржаўным вытворча-гандлёвым аб'яднанні «Белмастацпромыслы» была створана экспертная камісія па аднясенні прадукцыі прадпрыемстваў народных промыслаў (рамёстваў) да вырабаў народных промыслаў (рамёстваў). Камісія разглядала вырабы ўтылітарнага і (ці) дэкаратыўнага прызначэння, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

былі створаны ў адпаведнасці з беларускімі традыцыямі народнага мастацтва, промыслаў і рамёстваў на падставе традыцыйных прыёмаў ручной працы, а таксама з дапамогай машын і механізмаў [620].

Прадукцыя, якая была аднесена да вырабаў народных промыслаў (рамёстваў), магла быць вызвалена ад абкладання падаткам на дабаўленую вартасць. Галоўнай умовай для гэтага з'яўлялася яе адпаведнасць Пераліку вырабаў народных промыслаў (рамёстваў) прызнанай мастацкай вартасці, які быў зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 10 лютага 2004 г. № 146 і перазацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у 2006 г. [582].

У 1999 г. быў прыняты *Закон Рэспублікі Беларусь «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь»* [29]. Ён вызначыў асноўныя прынцыпы дзяржаўнага рэгулявання і падтрымкі народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) як неад'емнай часткі нацыянальнай культуры і гісторыі беларускага народа. У законе былі акрэслены асноўныя паняцці, звязаныя з прававой дзейнасцю ў дадзенай галіне, зацверджаны статус «народны майстар».

Законам (арт. 3) было вызначана, што дзяржаўная палітыка ў галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) забяспечваецца шляхам: ажыццяўлення бюджэтнага фінансавання народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) дзяржаўных юрыдычных асоб; распрацоўкі і рэалізацыі спецыяльных дзяржаўных праграм у гэтай галіне; садзейнічання развіццю матэрыяльнай базы для дзейнасці народных майстроў, прадпрыемстваў народных промыслаў (рамёстваў), а таксама развіццю дабрачыннасці і мецэнацтва ў гэтай галіне; прадастаўлення іншых гарантый дзяржавы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Гэтыя палажэнні закона грунтаваліся на артыкуле 15 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, які прадугледжваў адказнасць дзяржавы за захаванасць гісторыка-культурнай спадчыны.

У якасці пэўных арганізацыйна-прававых форм дзяржаўных гарантый падтрымкі і развіцця народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) у Рэспубліцы Беларусь закон прадугледжваў распрацоўку рэспубліканскіх праграм дзяржаўнай падтрымкі народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў), стварэнне Дзяржаўнага фонду падтрымкі народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў). Аднак на справе гэтыя палажэнні не выконваліся. У дзяржаве замацавалася практыка падтрымкі народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў) у рамках дзяржаўных праграм захавання і развіцця культуры, дзейнасці спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Не знайшла свайго практычнага ўвасаблення норма 2-й часткі артыкула 13 Закона аб пацвярджэнні статусу прадпрыемства народных промыслаў (рамёстваў) Атэстатам аб паходжанні промыслу (рамяства).

Акрамя таго, прадугледжаная артыкулам 28 закона інфармацыйная сістэма «Нацыянальны банк даных у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў)» не была створана як асобная самастойная інфармацыйная сістэма. На практыцы інфармацыйныя звесткі па розных напрамках народнага

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

мастацтва, народных промыслах (рамёствах) былі ўключаны ў інфармацыйную сістэму «Інтэграваны банк даных устаноў культуры». Аднак яна не захоўвала электронныя копіі твораў народнага мастацтва і вырабаў народных промыслаў і рамёстваў, тэкставую, графічную, відэа- і аўдыёінфармацыю. А гэтыя аб'екты павінны былі стаць галоўнымі ў Нацыянальным банку даных у галіне народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў). На практыцы алічбоўкай у другой палове 2000-х гг. па розных методыках займаліся: аддзел традыцыйнай культуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, вучэбна-навуковая лабараторыя беларускага фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Некаторыя нормы закона «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах)» былі ўдакладнены асобнымі нарматыўнымі дакументамі. Дзейнасць у нашай краіне аўтэнтычных фальклорных калектываў мастацкай творчасці і народных (узорных) самадзейных калектываў у 1999 г. была замацавана асобнымі палажэннямі Міністэрства культуры [7]. З 2008 г. замест вызначэння «самадзейны» сталі выкарыстоўваць вызначэнне «непрафесійны (аматарскі)» калектыў мастацкай творчасці [21; 28]. Было распрацавана Палажэнне аб Нацыянальнай выстаўцы твораў народнага мастацтва [14] і перагледжана Палажэнне аб Цэнтры (Доме) рамёстваў [48].

У 2000 г. была прынята *Рэспубліканская праграма па захаванні і падтрымцы народнага мастацтва, народных промыслаў і рамёстваў у Рэспубліцы Беларусь* [705]. На рэгіянальным узроўні ў Мінскай вобласці найбольш актыўна распрацоўваліся абласныя і раённыя праграмы падтрымкі традыцыйнай культуры.

У 2000 г. пры Міністэрстве культуры была створана экспертная камісія па народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) [16]. У яе склад увайшлі прадстаўнікі дзяржаўных органаў, арганізацый культуры, грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз майстроў народнай творчасці», мастакі, мастацтвазнаўцы, этнографы і іншыя спецыялісты, чыя дзейнасць была звязана з захаваннем культурнай спадчыны, развіццём традыцый народнага мастацтва, народных рамёстваў (промыслаў). У кампетэнцыю камісіі ўваходзілі пытанні надання статусу народнага майстра ў галіне народнага мастацтва, разгляд вырабаў народных промыслаў (рамёстваў) на прадмет іх адпаведнасці традыцыям народнай культуры, метадычная праца ў вызначаным напрамку.

У прынятай у 2004 г. новай рэдакцыі закона «Аб культуры» адсутнічаў асобны артыкул, прысвечаны традыцыйнай культуры. Акцэнт быў зроблены на падтрымку народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў).

У 2005 г. Указам Прэзідэнта Беларусі № 225 *«Аб некаторых пытаннях ажыццяўлення фізічнымі асобамі рамеснай дзейнасці»* быў вызначаны пералік з 6 відаў дзейнасці, ажыццяўляць якую рамеснікі могуць, не рэгіструючыся як індывідуальныя прадпрымальнікі. Дастаткова было стаць на ўлік у падатковым органе па месцы жыхарства, запоўніць заяву ўсталяванай формы і выплаціць (адзін раз у каляндарны год) збор у памеры адной базавай велі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыні. Незалежна ад колькасці відаў дзейнасці, якімі займаецца майстар, памер збору не змяняўся. У далейшым шляхам унясення змен і дапаўненняў да ўказа пералік відаў дзейнасці пашыраўся і ў канцы вывучаемага перыяду ахопліваў больш за два дзясяткі.

За дзесяць гадоў існавання Камісіі па народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) статус народнага майстра атрымалі 65 чалавек. Звычайна статус набывалі толькі тыя, што працавалі пры дамах рамёстваў, удзельнічалі ў пастаянных выстаўках. Іншыя майстры не бачылі ў гэтым статусе ніякай неабходнасці, бо ён не надаваў ніякіх матэрыяльных прэферэнцый. Не працавалі з-за адсутнасці канкрэтызацыі практыкі выканання палажэнні падатковага заканадаўства, якія прадугледжвалі поўнае ці частковае вызваленне народных майстроў ад выплаты падаткаў [675]. Не было рэалізавана палажэнне згаданага закона аб стварэнні Нацыянальнага музея народнага мастацтва.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь выступіла ініцыятарам шырокага ***фестывальнага руху*** з мэтай папулярызацыі асаблівасцей рэгіянальнай традыцыйнай культуры. У 1994 г. у Пінску адбыўся першы Міжнародны фестываль фальклору. У ім былі прадстаўлена багацце рэгіянальнай вусна-паэтычнай спадчыны, народных гульняў, інструментальнай музыкі, народнай харэаграфіі. На жаль, працягу правядзення гэтага фестывалю ў вывучаемы перыяд не было.

Нематэрыяльная спадчына жыхароў Беларусі была прадстаўлена на Міжнародным фестывалі народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» (заснаваны ў канцы 1980-х гг., першыя два прайшлі ў Віцебску, з 1992 г. праводзіўся ў Паставах [646]), Міжнародным фестывалі харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (праводзіўся з 1987 г. раз у два гады ў Гомелі), рэспубліканскім фестывалі народнага танца «Беларуская полька» (Чачэрск, 1993, 1994, 1996, 2000 гг.), фестывалі нацыянальных культур (праводзіўся з 1996 г. раз у два гады ў Гродна), фальклорным фестывалі «Берагіня» (праводзіўся ў г. п. Акцябрскі Гомельскай вобласці з 1998 г. кожныя два гады).

З рэальным станам традыцыйнай культуры можна было пазнаёміцца на выстаўках народнай творчасці «Вечназялёнае дрэва рамёстваў» (1996 г.) і нацыянальнай выстаўцы сучаснага народнага мастацтва «Жывыя крыніцы» (1998, 2006 гг.). У 2010 г. упершыню быў праведзены Рэспубліканскі конкурс «Лепшы беларускі сувенір», які прайшоў пры падтрымцы Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

17–18 верасня 2010 г. на тэрыторыі дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Нацыянальны парк "Прыпяцкі"» у вёсцы Ляскавічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці адбыўся першы фестываль этнакультурных традыцый «Покліч Палесся». Асноўныя задачы фестывалю – падтрымка і развіццё самабытнай палесскай культуры, папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны, садзейнічанне развіццю турыстычнай зоны. У фестывалі прынялі ўдзел аматарскія калектывы, майстры народнага мастацтва з 11 раёнаў Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Усяго ўдзельнічалі амаль 900 артыстаў і каля 8 тыс. гледачоў [377, с. 147].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адпаведнасці з Праграмай дзяржаўнай падтрымкі традыцыйнай культуры на 1994–1996 гг. і артыкулам 23 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь» у мэтах стымулявання развіцця народнага мастацтва, народных промыслаў (рамёстваў), папулярызацыі гэтай галіны ў краіне не радзей за адзін раз у пяць гадоў планавалася праводзіць Нацыянальныя выстаўкі твораў народнага мастацтва і вырабаў народных промыслаў і рамёстваў [14]. На практыцы гэта палажэнне не было рэалізавана. Аднак у 2007 г. па ініцыятыве Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці ў Мінску ў Лошыцкім парку прайшоў фестываль-кірмаш «Вясновы букет». З наступнага года ён стаў рэспубліканскім. Такім чынам, яго можна лічыць пераемнікам так і ні разу не праведзенай Нацыянальнай выстаўкі твораў народнага мастацтва. Арганізацыяй яго падрыхтоўкі і правядзеннем займалася згаданае грамадскае аб'яднанне, таму ў ім маглі прыняць удзел майстры народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва грамадскага аб'яднання «Беларускі Саюз майстроў народнай творчасці», дамоў і цэнтраў рамёстваў, дзіцячых школ мастацтваў і іншых устаноў культуры, якія пастаянна ці перыядычна займаліся тым ці іншым відам народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і рамяства [39] Асноўную частку праграмы фестывалю-кірмашу складаў конкурс сярод майстроў народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, які меў дзве часткі: конкурс работ народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з прадстаўленнем майстрамі калекцый уласных творчых работ і майстар-класы па стварэнні работ народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з дэманстрацыяй творчых працэсаў і рамесніцкіх прыёмаў выканання творчай работы (адной ці некалькіх).

У 2004 г. Беларусь ратыфікавала *Канвенцыю ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны*. Па стане на пачатак 2010 г. статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці атрымалі 59 аб'ектаў, сярод якіх абрады Веткаўскага, Жыткавіцкага раёнаў Гомельскай вобласці, Капыльскага і Салігорскага раёнаў Мінскай вобласці; песенныя традыцыі Ельскага і Лельчыцкага раёнаў Гомельскай вобласці, Чавускага раёна Магілёўскай вобласці і Любанскага раёна Мінскай вобласці; традыцыйнае ганчарнае рамяство і промыслы в. Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці; абрад «Варвараўская свечка» вёскі Басценавічы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці; творчасць майстроў-шапавалаў Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці; тэхналогія вырабу ўнікальных беларускіх драўляных музычных інструментаў майстрамі Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці. Абрад «Калядныя цары» вёскі Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці быў уключаны ў Спіс сусветнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якая знаходзіцца пад пагрозай знішчэння [103, с. 12, 14; 377, с. 144].

*Даследаваннем і захоўваннем фальклору* ў фіксаваных формах займаліся навуковыя і культурна-асветныя, вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны. З 1992 г. супрацоўнікамі лабараторыі традыцыйнага мастацтва БелДПК, а затым аддзела традыцыйнай культуры БДУКіМ падчас экспедыцыйна-палявых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследаванняў было запісана каля тысячы аўдыёкасет з фальклорнымі матэрыяламі. Іх алічбоўка была распачата ў 2005 г. у межах доўгатэрміновага даследчага праекта «Сучасны стан традыцыйнай мастацкай культуры беларусаў: даследаванне і практыка», які ажыццяўляўся з 1993 г. (навуковы кіраўнік Т. Б. Варфаламеева). Унікальнасць праекта заключаецца ў тым, што спецыялісты-этнографы імкнуцца вывучаць не той фальклор, які быў запісаны 100 або 50 гадоў таму, а зафіксаваць тую фальклорную спадчыну, якая яшчэ была ва ўжытку альбо ў памяці нашых сучаснікаў – жыхароў розных рэгіёнаў Беларусі. Пры фінансавай дапамозе абласных выканаўчых камітэтаў было праведзена комплекснае фальклорна-этнаграфічнае экспедыцыйнае даследаванне ўсіх 6 абласцей рэспублікі. Вынікам працы стала выданне шасцітомнай серыі. У 2006 г. быў выпушчаны камплект з пяці CD пад назвай «Этнічная музыка беларусаў» (укладальнік І. В. Мазюк), у якім адлюстраваны рэгіянальныя музычныя традыцыі рэспублікі [380, с. 106–107].

Намаганнямі загадчыка вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ, старшыні Саюза фалькларыстаў Беларусі В. Д. Ліцьвінкі архіў запісаў, зробленых выкладчыкамі і студэнтамі БДУ у 1960-х – 1990-х гг. падчас фальклорнай практыкі ў самых розных рэгіёнах Беларусі, быў занесены ў базу даных ЮНЕСКА як сусветны культурны скарб [380, с. 107].

Такім чынам, сферы традыцыйнай культуры ў параўнанні з іншымі галінамі культуры ў вывучаемы перыяд з боку органаў дзяржаўнай улады ўдзялялася мала ўвагі. На працягу апошняга дзесяцігоддзя XX ст. былі прыняты дзве дзяржаўныя праграмы, Закон «Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах)», некалькі абласных і раённых праграм. Асобныя прававыя акты былі накіраваны на стварэнне падатковых стымулаў для развіцця народных мастацкіх промыслаў. На практыцы асобныя палажэнні згаданых нарматыўных прававых актаў не былі рэалізаваныя.

У XXI ст. дзейнасць у сферы нарматыўнага прававога і праграмна-стратэгічнага забеспячэння аховы традыцыйнай культуры абмежавалася ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які рэгуляваў рамесную дзейнасць грамадзян краіны, а таксама перазацвярджаннем асобных палажэнняў аб калектывах мастацкай творчасці.

Асноўнымі суб’ектамі рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне традыцыйнай культуры сталі дамы (цэнтры) рамёстваў, фальклору, народных промыслаў, абласныя цэнтры народнай творчасці, раённыя (гарадскія) метадычныя цэнтры, клубныя ўстановы. Значную працу ў гэтым напрамку здзяйснялі грамадскія арганізацыі. Сумеснымі намаганнямі розных суб’ектаў культурнай дзейнасці ў краіне склалася сістэма фестываляў і выставак, накіраваных на папулярызацыю традыцыйнай культуры.

Далучэнне Беларусі да Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны дазволіла актывізаваць працу па наданні статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці розным праявам традыцыйнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Глава 7

# ЗНЕШНЯЯ КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА

## 7.1. Распрацоўка прававой базы і вызначэнне канцэпцыі

Выхад адноўленай незалежнай Рэспублікі Беларусь на міжнародную арэну не толькі прывёў да неабходнасці перагляду палітычнай і эканамічнай базы жыцця краіны, але і прымусіў пераглядзець і культурную палітыку, у першую чаргу яе ідэалагічную накіраванасць.

Данесці ўсё багацце колераў і адценняў культур народаў Беларусі, стварыць станоўчы вобраз краіны на міжнароднай арэне, паказаць прыхільнасць да еўрапейскай культурнай традыцыі, знайсці аптымальную мадэль культурных узаемадачыненняў з нашымі ўсходнімі і заходнімі суседзямі стала адной з галоўных задач знешняй палітыкі нашай дзяржавы.

Пасля 1991 г. знікла абавязковая ўмова адміністрацыйнага кантролю за цыркуляцыяй культурных даброт праз дзяржаўныя межы, перасталі ўжывацца сродкі, якія стваралі ідэалагічна-палітычныя перашкоды міжнародным культурным патокам.

Адраджэнне каштоўнасцей культуры, працэсы дэмакратызацыі жыцця грамадства, нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва патрабавалі правядзення работы па стварэнні ***заканадаўчай базы*** для паспяховага развіцця культуры, яе асноўных галін. Паступова выспявала разуменне таго, што знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь павінна будавацца як палітыка стварэння ўмоў поўнай рэалізацыі нашай краінай сваіх нацыянальных інтарэсаў у сусветным супольніцтве. Пры гэтым яна павінна адпавядаць жыццёвым інтарэсам усіх сваіх грамадзян.

Прынятая ў сакавіку 1994 г. (са зменамі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 г. і 17 кастрычніка 2004 г.) Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь падвяла юрыдычную базу пад знешнюю палітыку і дыпламатыю беларускай дзяржавы. У артыкуле 18 было занатавана, што «Рэспубліка Беларусь у сваёй знешняй палітыцы зыходзіць з прынцыпаў роўнасці дзяржаў, непрымянення сілы або пагрозы сілай, непарушнасці межаў, мірнага ўрэгулявання спрэчак, неўмяшання ва ўнутраныя справы і іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права».

Артыкул 8 замацаваў прызнанне нашай дзяржавай прыярытэту «агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права» і забеспячэнне ёй «адпаведнасці ім заканадаўства». У адпаведнасці з гэтым жа артыкулам «не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі».

Ужо ў Законе «Аб культуры» (ліпень 1991 г.) асобны раздзел (XIII, арт. 49) быў прысвечаны знешнім культурным сувязям. У ім адзначалася, што Рэспуб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліцы Беларусь належыць выключнае права ўстанаўліваць і развіваць знешнія культурныя сувязі, заключаць міжнародныя дамовы і пагадненні ў галіне культуры, здзяйсняць узаемны абмен дасягненнямі культуры. Прадпрыемствы, установы і арганізацыі культуры, грамадскія аб'яднанні, творчыя саюзы атрымалі права самастойна заключаць дамовы (кантракты) з замежнымі юрыдычнымі і фізічнымі асобамі на любыя формы супрацоўніцтва ў сферы культуры [24].

За развіццё міжнародных культурных кантактаў у вывучаемы перыяд адказвала Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, якое рэалізоўвала задачы знешняй культурнай палітыкі ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам замежных спраў, дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі, дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі розных узроўняў.

Канкрэтнымі ***міжнароднымі прававымі крыніцамі*** культурных сувязей Рэспублікі Беларусь з іншымі дзяржавамі з'яўляліся: дагаворы аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе, міжурадавыя пагадненні аб культурным супрацоўніцтве; міжведамасныя пагадненні па асобным пытанням культурнага супрацоўніцтва; канкрэтныя міжурадавыя і міжведамасныя планы і праграмы культурных сувязей Рэспублікі Беларусь.

Пагадненні і пратаколы аб культурным супрацоўніцтве прадугледжвалі шырокі ўзаемны абмен дасягненнямі нацыянальных культур самымі разнастайнымі шляхамі, сярод якіх – наладжванне фестываляў, выстаў выяўленчага мастацтва, абмен калектывамі народнай творчасці, асобнымі выканаўцамі, тэатральнымі калектывамі; арганізацыю стажыровак, семінараў, канферэнцый; пастаянны інфармацыйны абмен. Не было абыдзена ўвагай супрацоўніцтва ў галіне кінамастацтва, бібліятэчнай і музейнай справы, аховы помнікаў, дапамога беларускай дыяспары і нацыянальным меншасцям у Беларусі.

Дзеючыя ў вывучаемы перыяд міжнародныя дакументы па пытаннях міжнароднага культурнага супрацоўніцтва пацвярджалі прыхільнасць дзяржаў агульнапрызнаным прынцыпам міжнародных адносін і таксама вызначалі іх у якасці асновапакладаючых. Аналагічныя прынцыпы міжнароднага культурнага супрацоўніцтва былі закладзены і ў шэрагу двухбаковых пагадненняў. Так, у прэамбуле Дагавора аб дружбе і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Саюзнай Рэспублікай Югаславія [197] было адзначана, што яго Дагаворныя Бакі, «зыходзячы з традыцыйных дружалюбных адносін паміж народамі дзвюх краін, іх гістарычнай, культурнай і духоўнай блізкасці, поўныя рашучасці сумесна дзейнічаць з мэтай пабудовы свабоднай і дэмакратычнай Еўропы, заснаванай на прыхільнасці да каштоўнасцей дэмакратыі, павагі да правоў чалавека, будучы перакананымі, што такое супрацоўніцтва адпавядае доўгатэрміновым інтарэсам Дагаворных Бакоў і спрыяе ўмацаванню міру і бяспекі ў Еўропе, кіруючыся агульнапрызнанымі прынцыпамі і нормамі міжнароднага права, у тым ліку тымі, якія замацаваны ў Статуце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Хельсінскім Заключным Акце, Парыжскай Хартыі для Новай Еўропы, дакументах Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а таксама міжнародным абавязацельствам па правах чалавека дамовіліся аб ніжэйпададзеным».

Шматбаковыя пагадненні можна падзяліць на ўніверсальныя (сусветныя) і спецыяльныя міжнародныя дагаворы. Першыя вызначаюць асновапакладаючыя прынцыпы і мэты міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры (Статут ЮНЕСКА, Дэкларацыя прынцыпаў міжнароднага культурнага супрацоўніцтва). Другія – рэгулююць адносіны дзяржаў у той ці іншай галіне культуры (Канвенцыя аб абароне культурных каштоўнасцей у выніку ўзброеных канфліктаў 1954 г.; Палажэнне аб увозе матэрыялаў адукацыйнага, навуковага і культурнага характару).

Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай міжнародных Канвенцый у сферы культуры: Канвенцыі ЮНЕСКА па абароне сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (з 1988 г.), Канвенцыі ЮНЕСКА па абароне культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту (з 1997 г.), Бернскай канвенцыі па ахове літаратурных і мастацкіх твораў (з 1997 г.), Еўрапейскай культурнай канвенцыі (з 1993 г.). У 2004 г. Рэспубліка Беларусь зацвердзіла Канвенцыю аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (уступіла ў сілу для Беларусі ў 2006 г.), а ў жніўні 2006 г. далучылася да Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове і заахвочванні разнастайнасці форм культурнага самавыражэння.

Указаныя пагадненні не выключаюць магчымасці заключэння пагадненняў паміж групамі краін, дзяржавамі пэўнага рэгіёна. Яны могуць насіць як агульны характар (закранаць розныя бакі супрацоўніцтва), так і вызначаць сферу дзейнасці. Да першых з іх адносяцца такія дакументы, як Статут Савета Еўропы, Статут Цэнтральна-Еўрапейскай Ініцыятывы, Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе, Парыжская Хартыя для новай Еўропы, Канвенцыя краін Чарнаморскага рэгіёна аб супрацоўніцтве ў галінах культуры, адукацыі, навукі і інфармацыі.

У сувязі з гэтым адметным з'яўляецца Пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь з Еўрапейскімі Супольніцтвамі ды іх дзяржавамі-членамі [629][1].У прэамбуле гаварылася, што пагадненне заключана, зыходзячы з жадання Дагаворных Бакоў «падтрымліваць працэс рэгіянальнага супрацоўніцтва з суседнімі краінамі [...] дзеля таго, каб спрыяць росквіту і стабільнасці гэтага рэгіёна [...] развіваць і рабіць разнастайным культурнае супрацоўніцтва, а таксама ўдасканальваць абмен інфармацыяй на ўзроўні міністраў і парламенцкім узроўні (Камітэт па Парламенцкім Супрацоўніцтве)».

Раздзел VIII пагаднення быў прысвечаны супрацоўніцтву ў галіне культуры. У адпаведнасці з артыкулам 80, «бакі абавязуюцца садзейнічаць, спрыяць і дапамагаць развіццю культурнага супрацоўніцтва. Калі гэта слушна, супрацоўніцтва можа развівацца на базе праграм культурнага супрацоўніцтва Супольніцтва ці некалькіх дзяржаў-членаў, а таксама надалей можа развівацца дзейнасць па ўзаемнаму інтарэсу».

[1] Дакумент быў ратыфікаваны парламентам Рэспублікі Беларусь і ўпаўнаважанымі органамі толькі шасці дзяржаў-членаў. Па гэтай прычыне ён не ўступіў у дзеянне.

Зыходзячы з палажэнняў Пагаднення, напрыканцы пятага года пасля ўваходжання яго ў сілу, Рэспубліка Беларусь павінна была далучыцца да шматбаковых канвенцый аб ахове правоў інтэлектуальнай, прамысловай і камерцыйнай дзейнасці.

6 сакавіка 1993 г. у Стамбуле адбылося заключэнне Канвенцыі краін Чарнаморскага рэгіёна аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі, навукі і інфармацыі [278]. Ад імя Рэспублікі Беларусь яе падпісаў міністр культуры Я. Вайтовіч. Сярод краін – удзельніц канвенцыі з Цэнтральнай Еўропы з'яўляліся Рэспубліка Албанія і Румынія. У гэтым шматбаковым дакуменце адзначалася важнасць развіцця больш цеснага і шырокага супрацоўніцтва ў вызначаных сферах для найбольш эфектыўнага выкарыстання багацця векавых традыцый і культурнай спадчыны, плённасці кантактаў і ўзаемадзеяння паміж рознымі культурамі, якія маюць спецыфічныя рысы Чарнаморскай культурнай прасторы, на падставе ўзаемнай павагі, узаемадзеяння і цярпімасці.

Дагаворы аб дружбе і супрацоўніцтве, міжурадавыя і міжведамасныя пагадненні аб культурным супрацоўніцтве – прававыя дакументы агульнарэгулятыўнага характару. У іх бакі вызначаюць прынцыпы і прававы рэжым узаемаадносін паміж дзяржавамі, сферы магчымых кантактаў, бяруць на сябе абавязацельствы па развіцці і паглыбленні сувязей у галіне культуры, указваюць мэты і задачы гэтага віда супрацоўніцтва.

Наяўнасць у прававых актах агульнапалітычнага характару ўзаемных абавязацельстваў, накіраваных на развіццё культурнага супрацоўніцтва, можна разглядаць як сведчанне таго, што згаданыя краіны прызнаюць гэты від міжнародных сувязей як састаўную і неад'емную частку іх міжнародных кантактаў.

Напрыклад, артыкул 13 Дагавора аб дружбе і супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Саюзнай Рэспублікай Югаславія прысвячаецца супрацоўніцтву ў галіне культуры, адукацыі, мастацтва, інфармацыі і іншых сферах [197].

Аналагічныя артыкулы маюць усе дагаворы, дэкларацыі аб сяброўстве і супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь з іншымі дзяржавамі, якія дзейнічалі ў вывучаемы перыяд.

У прэамбуле Пагаднення паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Балгарыя аб супрацоўніцтве і галіне адукацыі, навукі і культуры (19.10.1993 г.) указвалася: «Урад Рэспублікі Беларусь і Урад Рэспублікі Балгарыя, кіруючыся жаданнем развіваць і замацоўваць сяброўскія адносіны паміж народамі абедзвюх краін; грунтуючыся на папярэднім вопыце і традыцыі ўзаемакарыснага супрацоўніцтва ў культурнай галіне і ўлічваючы новыя акалічнасці грамадска-палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага развіцця ў дзвюх краінах; кіруючыся ўзаемнымі інтарэсамі ў больш поўнай інфармацыі і ўзаемным пазнанні народаў Беларусі і Балгарыі. Будучы ўпэўненымі, што супрацоўніцтва ў галінах адукацыі, навукі і культуры будзе садзейнічаць больш цеснаму збліжэнню народаў і развіццю адносін паміж дзвюма краінамі, кіруючыся прынцыпамі і мэтамі Заключнага Акта Нарады па бяспецы і супра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цоўніцтве ў Еўропе і Парыжскай хартыі для Новай Еўропы, дамовіліся аб наступным...»

Прынцыпы сяброўства, якія грунтуюцца на папярэднім вопыце і традыцыях культурнага супрацоўніца, не з'яўляліся адзінымі пры наладжванні ўзаемаадносін паміж краінамі. Улічваліся новыя акалічнасці развіцця ўсіх сфер унутрыдзяржаўнай палітыкі, прынцыпы і нормы міжнароднага права, агульнаеўрапейскіх міжнародных актаў.

Міжурадавыя і міжведамасныя пагадненні Рэспублікі Беларусь аб культурным супрацоўніцтве прадугледжвалі прававую магчымасць узнікнення і развіцця непасрэдных сувязей паміж асобнымі рэгіёнамі краін, а таксама культурнымі ўстановамі. Апошнім такое права было прадастаўлена законамі Рэспублікі Беларусь, якія вызначалі арганізацыйна-прававыя асновы іх дзейнасці. Асобныя раздзелы законаў былі прысвечаны міжнародным адносінам. Напрыклад, у Законе «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» (у рэдакцыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 11 лістапада 2002 г.) у такі раздзел уваходзілі два артыкулы. Артыкул 32 вызначаў міжнароднае супрацоўніцтва бібліятэчных устаноў і арганізацый [45].

У Пагадненні аб супрацоўніцтве паміж уладамі Гродзенскай вобласці і Сувалкаўскага ваяводства аб развіцці прыгранічных і культурных сувязей вызначалася, што яно заключаецца на падставе рашэнняў Дагавора паміж Рэспублікай Польшча і Рэспублікай Беларусь аб супрацоўніцтве ад 23 чэрвеня 1992 г., Пагаднення паміж Урадамі Рэспублікі Польшча і Рэспублікі Беларусь аб асноўных прынцыпах прыгранічнага супрацоўніцтва ад 24 красавіка 1992 г., Канвенцыі аб пагранічным супрацоўніцтве паміж супольніцтвамі і тэрытарыяльнымі ўладамі, прынятай у Мадрыдзе 21 мая 1980 г. [339].

У сваю чаргу, пагадненні паміж уладамі асобных адміністрацыйных адзінак з'яўляліся падставай для наладжвання сувязей паміж асобнымі ведамствамі тэрытарыяльных выканаўчых улад.

Так, у Пагадненні паміж упраўленнем культуры Гродзенскага аблвыканкама і аддзелам культуры, спорту і турызму ваяводскай управы ў Беластоку аб культурным супрацоўніцтве на 1996–1998 гг. указвалася, што яно заключана, «грунтуючыся на пагадненні паміж уладамі Беластоцкага ваяводства Рэспублікі Польшча і ўладамі Гродзенскай вобласці» [339].

Канкрэтная рэалізацыя пагадненняў, якія змяшчаюцца ў агульнарэгулятыўных пагадняннях, прадугледжваецца ў *прававых дакументах планава-выканаўчага характару.* Да іх адносяцца міжурадавыя і міжведамасныя планы і праграмы супрацоўніцтва беларускай дзяржавы. Гэтыя планы і праграмы прадугледжвалі непасрэдны ўдзел беларускіх арганізацый і ўстаноў у міжнародным культурным супрацоўніцтве. Пры гэтым ініцыятыва магла зыходзіць як непасрэдна ад дадзенай арганізацыі ці ўстановы, так і ад выканаўчага органа.

Да паўнамоцтваў дзяржаўных арганізацый краіны адносіліся права на вылучэнне прапаноў аб заключэнні дамоў, планаванне сумесна з другім бокам канкрэтных мерапрыемстваў, устанаўленне тэрмінаў іх рэалізацыі, вызначэнне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўдзельнікаў супрацоўніцтва, рэгуляванне парадку фінансавання (як правіла, фінансавыя абавязацельствы па рэалізацыі мерапрыемстваў бралі на сябе прымаючыя бакі). Праект дамовы і рабочага плана праходзіў стадыю адабрэння ў вышэйшых рэспубліканскіх установах, пасля чаго ён набываў канчатковую юрыдычную сілу.

Напрыклад, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у чэрвені 1993 г. выдала загад «Аб упарадкаванні гастрольнай дзейнасці за межамі Рэспублікі Беларусь тэатраў і канцэртных арганізацый, навучальных устаноў» [439, спр. 1, арк. 118–120]. У ім давалася даручэнне аддзелу міжнародных сувязей Міністэрства разам з аддзелам мастацтваў «штогод распрацоўваць і зацвярджаць на Савеце па мастацтву план міжнародных гастроляў тэатраў і канцэртных арганізацый, творчых калектываў, навучальных устаноў. Садзейнічаць творчым калектывам у падрыхтоўцы спектакляў, канцэртных праграм, выданні рэкламнай прадукцыі. Своечасова праводзіць перагаворы з адпаведнымі міністэрствамі, арганізацыямі за мяжой аб садзейнічанні, выкарыстанні сродкаў масавай інфармацыі для асвятлення гастроляў творчых калектываў Рэспублікі Беларусь. Сістэматычна, сумесна з эканамічнымі і юрыдычнымі службамі міністэрства праводзіць экспертызу дагавораў, заключаных з замежнымі партнёрамі, аказваць метадычную дапамогу ў іх распрацоўцы, арганізаваць вучобу кіраўнікоў паездак». Кіраўнікам тэатраў, канцэртных арганізацый, навучальных устаноў мастацтва было даручана прыняць неабходныя меры, якія б прадугледжвалі «... заключэнне пагадненняў з замежнымі партнёрамі на ўзаемакарыснай падставе, якая забяспечвае сацыяльныя гарантыі творчых калектываў і членаў дэлегацыі».

Неабходна адзначыць, што не ўсе галіны міжнародных адносін рэгулююцца нормамі права, не ўсе іх удзельнікі прызнаюцца суб’ектамі міжнароднага права. Недзяржаўны ўзровень – прыклад таго, калі яго ўдзельнікі (міжнародныя няўрадавыя арганізацыі, нацыянальныя грамадскія арганізацыі, асобныя людзі) не з’яўляюцца суб’ектамі міжнароднага права, і адносіны, якія ўзнікаюць паміж імі, рэгулююцца не нормамі міжнароднага права, а статутамі міжнародных няўрадавых і нацыянальных арганізацый, двухбаковымі і шматбаковымі пагадненнямі паміж гэтымі арганізацыямі, арганізацыйнымі звычаямі. Разам з тым міжнароднае права аказвае рэгулюючае ўздзеянне на функцыянаванне няўрадавых форм супрацоўніцтва. Міжнародныя пагадненні, заключаныя Рэспублікай Беларусь з іншымі дзяржавамі, вызначалі агульныя і спецыяльныя прынцыпы ўзаемаадносін бакоў, сферы супрацоўніцтва і канкрэтных выканаўцаў, прадугледжвалі садзейнічанне развіццю і пашырэнню кантактаў не толькі дзяржаўных, але і няўрадавых (грамадскіх) устаноў і аб’яднанняў.

Так, артыкул 12 Міжурадавага Пагаднення Рэспублікі Беларусь і Злучанага Каралеўства Вялікабрытанія і Паўночнай Ірландыі аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі, навукі і культуры (1995) мае наступны змест: «Дагаворныя Бакі заахвочваюць прамое супрацоўніцтва і абмены паміж няўрадавымі арганізацыямі ва ўсіх галінах, прадугледжаных гэтым Пагадненнем».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аналіз гэтага і іншых спецыяльных дагавораў Рэспублікі Беларусь аб культурным супрацоўніцтве, міжведамасных пагадненняў па асобных пытаннях культурнага супрацоўніцтва сведчыць аб тым, што практычна ўсе гэтыя дакументы ўтрымоўваюць палажэнні, якія носяць агульнаўстановачны характар у вызначэнні напрамкаў міжнароднай дзейнасці грамадскіх арганізацый.

Пытанне ***ўдасканалення сістэмы сувязей*** з замежнымі краінамі ў галіне культуры разглядалася ў Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь ўжо ў 1991 г. У снежні гэтага года ў Савет Міністраў былі накіраваны прапановы па гэтым пытанні [438, спр. 2060, арк. 241–245]. Канстатуючы той факт, што прадстаўленне рэспубліцы права самастойнага здзяйснення культурных сувязей з замежнымі краінамі, дэмакратызацыя і дэцэнтралізацыя культурных сувязей, увядзенне механізма прамой знешнепалітычнай дзейнасці ў сферы культуры радыкальна змянілі сітуацыю, Міністэрства культуры звяртала ўвагу на тое, што магчымасць удзелу ў міжнародных абменах недастаткова выкарыстоўвалася з-за адсутнасці ўласнай канцэпцыі замежных культурных сувязей. Такая канцэпцыя павінна была мець распрацаваную сістэму нацыянальных прыярытэтаў, якія ўлічвалі б ужо існуючыя сувязі з суседнімі дзяржавамі і рэгіёнамі, замежнымі зямляцтвамі. На сістэму культурных абменаў адмоўнае ўздзеянне аказвала слабая каардынацыя і планаванне ў цэнтры і ў краіне, адсутнасць дастаткова кваліфікаваных кадраў, навыкаў дзелавых сувязей з замежнымі партнёрамі, недастатковае веданне міжнароднай кан’юнктуры. Гэта ўзмацнялася няведаннем замежнымі спецыялізаванымі фірмамі і імпрэсарыё, а часта і грамадскасцю краін культуры народа Беларусі, яе асобнага месца ў кантэксце славянскіх краін.

Асобая значнасць надавалася культурнаму ўзаемадзеянню са славянскімі краінамі. Неабходна адзначыць, што, яшчэ знаходзячыся ў складзе СССР, наша рэспубліка на ўзроўні Міністэрства культуры заключыла дагаворы аб прамым культурным супрацоўніцтве з Польшчай, Славеніяй, Славакіяй.

Другім напрамкам бачылася ўстанаўленне прамых культурных кантактаў з краінамі Бенілюксу, Германіяй, Вялікабрытаніяй, Францыяй, Скандынаўскімі краінамі.

Новай дамінантай культурнай палітыкі рэспублікі павінны былі стаць узаемаадносіны з беларускім зямляцтвам за мяжой. Прапаноўвалася гэтыя пытанні выносіць на абмеркаванне пры правядзенні перамоў з ЗША, Канадай, Аўстраліяй, Аргенцінай і інш.

Цікавай выглядала прапанова аб тым, каб Беларусь выступіла ініцыятарам адметных культурных акцый, накіраваных на ўмацаванне ў Еўропе прынцыпаў адзінай культурнай прасторы. Напрыклад, з нагоды 80-годдзя з дня пачатку І Сусветнай вайны рэспубліка магла ініцыіраваць правядзенне на сваёй тэрыторыі мемарыяльных мерапрыемстваў, прысвечаных памяці ўсіх загінуўшых падчас міравых канфліктаў ХХ ст.

У напрамку ўмацавання сувязей па лініі «поўнач – поўдзень» Еўропы Беларусь магла выступіць адным з арганізатараў мерапрыемстваў, прысвечаных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тысячагоддзю пачатку кантактаў паміж Скандынавіяй і Прычарнамор’ем па так званым шляху з варагаў у грэкі.

У сувязі з павелічэннем аб’ёму міжнародных сувязей Міністэрства культуры і падначаленых яму ўстаноў, неабходнасцю распрацоўкі і своечасовага прыняцця рашэнняў па пытаннях міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне культуры ў пачатку 1993 г. быў створаны Савет па міжнароднай дзейнасці Міністэрства культуры [439, спр. 1, арк. 1–2].

У наступныя гады работа над ***канцэпцыяй*** знешняй палітыкі Беларусі ў галіне культуры працягвалася. Першая спроба яе прыняцця як асобнага дакумента была ў кастрычніку 1995 г. на калегіі Міністэрства культуры і друку [438, спр. 46, арк. 4–10]. Аднак канцэпцыя не была зацверджана. Другая спроба – у канцы 90-х гадоў XX ст. На гэты раз – у выглядзе раздзела Дзяржаўнай праграмы «Функцыянаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 г.» [208]. Параўнанне праекта 1996 г. з раздзелам дзяржаўнай праграмы дазваляе зрабіць некаторыя абагульненні і адзначыць адрозненні.

Абодва дакументы вызначаюць *прынцыпы* развіцця міжнародных сувязей і міжнароднага супрацоўніцтва. Сярод іх: а) суверэннасць зносін; б) парытэтнасць; в) адпаведнасць нацыянальным інтарэсам, садзейнічанне развіццю нацыянальнай культуры і росту яе ўкладу ў сусветную духоўную скарбніцу; г) сістэмнасць; д) дзяржаўная падтрымка (уключаючы і фінансавую), а таксама актыўная дапамога недзяржаўных устаноў і арганізацый з выкарыстаннем пазабюджэтных сродкаў фінансавання.

Асноўнымі задачамі і мэтамі ў развіцці міжнародных культурных дачыненняў дакументы называюць:

садзейнічанне ўзаемаўзбагачэнню духоўнага жыцця народаў Беларусі;

азнаямленне свету з мастацтвам рэспублікі;

інтэграцыя беларускай культуры і мастацтва ў духоўнае жыццё ўсяго свету, у еўрапейскую і сусветную інфармацыйную прастору, міжнародны кніжны рынак;

удзел у праграмах і праектах міжнародных арганізацый;

сувязі з беларусамі за мяжой.

Выкананне вызначаных задач і мэт павінна было весціся пры пастаянным пашырэнні і ўдасканаленні наступных прыярытэтных напрамкаў дзейнасці.

1. Стварэнне і адбудова трывалага дагаворна-прававога падмурку ў адпаведнасці з міжнароднымі нормамі. Адзначалася, што на рэгіянальным узроўні супрацоўніцтва можа здзяйсняцца як у рамках падпісаных дагаворных дакументаў, так і на аснове прамых сувязей з акцэнтам на прыгранічнае супрацоўніцтва.

2. Актывізацыя супрацоўніцтва ў галіне прафесійнай мастацкай творчасці, мастацкай адукацыі, у галінах фальклору, захавання культурнай спадчыны, пошуку і вяртання страчаных культурных каштоўнасцей. Прыярытэтным у гэтым напрамку праект 1995 г. вызначаў культурнае супрацоўніцтва ў першую чаргу з Расіяй, Украінай, Літвой, Польшчай, Латвіяй, ФРГ, Францыяй, Вялі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кабрытаніяй, Славакіяй, Малдовай, Эстоніяй, Чэхіяй, Славеніяй, Румыніяй, Балгарыяй, Турцыяй, КНР і ЗША. У раздзеле дзяржаўнай праграмы пералік адсутнічаў.

3. Удзел у праграмах і праектах міжнародных арганізацый. Праект 1995 г. надаваў вялікае значэнне папулярызацыі беларускай культуры праз актывізацыю дзейнасці краіны ў складзе міжнародных арганізацый, такіх як ЮНЕСКА, ААН, Савет Еўропы, а таксама няўрадавых, грамадскіх, прафесійных міжнародных арганізацый. Для ўдзелу ў апошніх павінны былі ствараюца нацыянальныя камітэты і арганізацыі прафесіяналаў з выдзяленнем фінансавых сродкаў для забеспячэння не толькі членства Беларусі ў іх, але і ўдзелу ў ажыццяўленні сумесных праграм. У раздзеле Дзяржаўнай праграмы толькі канстатавалася неабходнасць дзеянняў і прыводзіўся больш канкрэтны пералік арганізацый.

4. Сувязь з беларусамі замежжа. У гэтым напрамку праект 1995 г. прадугледжваў наданне сувязям з беларускай дыяспарай, суполкамі суайчыннікаў у розных краінах свету пастаяннага і надзённага характару. Ахова іх інтарэсаў павінна была прадугледжвацца ў пагадненнях і праграмах супрацоўніцтва. Падкрэслівалася неабходнасць выдзялення на гэта пэўных фінансавых і матэрыяльных сродкаў. Звярталася ўвага на неабходнасць пошуку новых форм стасункаў з беларусамі замежжа як на агульнарэспубліканскім, так і на рэгіянальным узроўнях з мэтай стварэння ўмоў для захавання беларускай культурнай спадчыны на падставе прынцыпаў узаемнай карысці.

У Дзяржаўнай праграме адзначалася неабходнасць падтрымкі сувязі з беларускай дыяспарай, суполкамі суайчыннікаў у розных краінах свету ў сферах інфармацыі, адукацыі, культурнага абмену і іншых узаемадачыненняў. Абарона інтарэсаў суайчыннікаў, згодна з дакументам, мела на мэце садзейнічанне забеспячэнню іх нацыянальна-культурных запатрабаванняў, захаванню беларускай культурнай спадчыны ў краінах іх пражывання і прадугледжвалася ў пагадненнях і праграмах супрацоўніцтва з выдзяленнем неабходных фінансавых і матэрыяльных сродкаў. Канстатаваўся намер Рэспублікі Беларусь усімі спосабамі, якія прызнаны міжнародным правам, не дапускаць ушчамлення культурных і іншых правоў сваіх суайчыннікаў за мяжой.

5. Знешнеэканамічная дзейнасць, маркетынг, менеджмент у галіне культуры і друку, рэклама. (Гэты пункт існуе толькі ў праекце 1995 г.) Цікава, які сэнс укладваўся ў яго. Адзначалася надзвычайная актуальнасць ва ўмовах цяжкага эканамічнага крызісу рашэння пытанняў, звязаных з экспартам «культурнай» і друкаванай прадукцыі за межы Беларусі, наладжваннем знешнеэканамічных каналаў супрацоўніцтва, вывучэннем імпартных магчымасцей суседніх краін, еўрапейскага рынку, ажыццяўленнем рэкламнай дзейнасці. Сярод розных шляхоў выканання работ па рэкламе быў выдзелены і такі, як садзейнічанне доступу беларускай перыёдыкі і кніг да чытачоў замежжа, больш мэтанакіраванае прыцягненне да гэтай работы арганізацый суайчыннікаў за мяжой.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праект 1995 г. звяртаў увагу на такую акалічнасць, як неабходнасць увядзення ў большасці пасольстваў Рэспублікі Беларусь за мяжой пасады саветнікаў ці аташэ па пытаннях культуры для больш кампетэнтнага і эфектыўнага ажыццяўлення міжнароднага культурнага супрацоўніцтва.

Вызначаныя напрамкі дзейнасці засталіся і ў *Галіновай праграме «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006–2010 гг.»* [168, с. 66]. Для параўнання прывядзем іх:

абмен у галіне культуры;

супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі ў галіне культуры, з міжнароднымі і рэгіянальнымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі дзяржаў;

удзел у сумесных міжнародных праектах і праграмах;

фарміраванне дагаворнай базы міжнароднага культурнага супрацоўніцтва;

прыцягненне да супрацоўніцтва рэгіёнаў краіны, развіццё міжрэгіянальнага і прыгранічнага супрацоўніцтва;

падтрымка сувязей з арганізацыямі суайчыннікаў за мяжой.

Акрамя згаданых дакументаў канцэптуальныя асновы знешняй культурнай палітыкі нашай краіны акрэсліваліся іншымі нарматыўнымі прававымі актамі.

У лістападзе 2005 г. быў прыняты закон «*Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь*». Адной са сфер рэалізацыі знешняй палітыкі законам вызначана міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне культуры. Сярод асноўных задач знешняй палітыкі нашай краіны называецца раўнапраўная інтэграцыя ў сусветную культурную прастору, стварэнне спрыяльных знешнепалітычных і знешнеэканамічных умоў для павышэння інтэлектуальнага і духоўнага патэнцыялу дзяржавы, фарміраванне добрасуседскіх адносін з сумежнымі дзяржавамі, садзейнічанне рэалізацыі нацыянальных і культурных інтарэсаў этнічных беларусаў, якія пражываюць за межамі рэспублікі, прыцягненне знешніх інтэлектуальных і навуковых рэсурсаў ў мэтах культурнага развіцця Беларусі.

Як можна заўважыць, закон не згадвае «шматвектарнасць» знешняй палітыкі. У галіне культурнага супрацоўніцтва яскрава прасочваюцца асноўныя напрамкі: краіны-суседзі і падтрымка беларускай дыяспары. Акрамя гэтага, закон звяртае ўвагу на важнасць культурнага аспекту ў развіцці трансгранічнага супрацоўніцтва.

Больш дакладнае акрэсленне задач, прынцыпаў, напрамкаў і прававых асноў знешняй палітыкі (міжнароднага культурнага супрацоўніцтва) пададзены ў новай рэдакцыі Закона аб культуры (2004 г.). Перад суб'ектамі культурнай дзейнасці закон паставіў наступныя задачы: узбагачэнне культурнага жыцця беларускага народа, далучэнне грамадзян, што пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, да каштоўнасцей сусветнай культуры; азнаямленне сусветнай грамадскасці з культурай Беларусі; інтэграцыя беларускай нацыянальнай культуры ў сусветную культуру і сусветную інфармацыйную прастору. Асноўнымі напрамкамі былі вызначаны: міжнародны культурны абмен; культурныя сувязі з суайчыннікамі за мяжой; захаванне, ахова, стварэнне і выкарыстанне куль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турных каштоўнасцей; навукова-даследчая дзейнасць; правядзенне фестываляў, конкурсаў, аглядаў і іншых культурных мерапрыемстваў.

Актывізацыі знешнекультурнай дзейнасці спрыялі ўказы Кіраўніка дзяржавы. 5 лютага 1998 г. уступіў у сілу Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 65 аб мерах па павышэнні эфектыўнасці візітаў у замежныя дзяржавы дэлегацый на чале з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і рэалізацыі дамоўленасцей, дасягнутых у ходзе гэтых візітаў. Указ абавязаў рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання стварыць камп'ютарызаваны ўлік міжнародных дамоўленасцей, якія былі дасягнуты на вышэйшым узроўні. Указ таксама ўвёў у дзеянне Палажэнне аб арганізацыі візітаў у замежныя дзяржавы дэлегацый Рэспублікі Беларусь на чале з Прэзідэнтам. Палажэнне ўключала такія напрамкі работы, як перспектыўнае планаванне, арганізацыя, забеспячэнне візітаў і кантроль за выкананнем дамоўленасцей, дасягнутых падчас візітаў. З мэтай выканння ўказа асобным загадам па Міністэрстве культуры ў структуры апошняга пачаўся весціся кам'ютарызаваны ўлік дасягнутых дамоўленасцей, кожны квартал у Міністэрства замежных спраў накіроўваліся справаздачы аб выканні адпаведных даручэнняў. Праз год – 1 сакавіка 1999 г. – выйшаў новы Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 118, які ануляваў вышэйзгаданае палажэнне і ўвёў у дзеянне новы нарматыўны дакумент – палажэнне аб планаванні, арганізацыі візітаў на вышэйшым узроўні і кантролі за выканнем дасягнутых у іх ходзе дамоўленасцей.

Практычнай рэалізацыі асноўных напрамкаў знешняй культурнай палітыкі дапамагалі ***мэтавыя праграмы***. Першай і бадай што найбольш значнай была дзяржаўная праграма *«Беларусы ў свеце»*, зацверджаная Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у 1993 г. Яна вызначала асноўныя напрамкі работы з беларусамі замежжа, тэрміны выканання і адказныя ўстановы. Асноўнай мэтай праграмы было мацаванне сувязей з суродзічамі, аказанне ім разнастайнай дапамогі па захаванні нацыянальнай культуры, распрацоўка шэрага мерапрыемстваў для знаёмства нашых замежных суайчыннікаў з гісторыяй і культурай Беларусі, навуковае даследаванне гісторыі беларускай дыяспары, шырокае азнаямленне грамадскасці нашай краіны з культурна-мастацкай спадчынай беларускага замежжа.

Згодна з праграмай, адным з напрамкаў дзейнасці Міністэрства культуры з'яўлялася падтрымка беларускай дыяспары. У яе рамках адбывалася папаўненне беларускай літаратурай бібліятэк розных устаноў за межамі краіны [145].

У структуры Міністэрства культуры быў створаны *Каардынацыйны Савет па рабоце з беларускім замежжам*. Штогод распрацоўваўся асобны план работы ў вызначаным напрамку.

У далейшым са стварэннем Дзяржкамітэту па справах рэлігій і нацыянальнасцей адказнасць за яе выкананне была перададзена апошняму.

У 1998 г. была зацверджана Дзяржаўная праграма інфармацыйнага забеспячэння знешнепалітычнай і знешнеэканамічнай дзейнасці на 1999 г. У мэтах яе выканання Міністэрства культуры выдала загад аб мерах па інфармацыйным



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забеспячэнні міжнароднай дзейнасці Міністэрства культуры ў 1999 г. Сярод апошніх называлася падрыхтоўка рэкламна-інфармацыйных выданняў, удзел у выпуску марак, серыі рэкламных відэаролікаў, пачатак стварэння відэа- і фанатэкі, кампакт-дыскаў, распрацоўка і стварэнне інфармацыйнай базы дадзеных па асноўных напрамках і аспектах дзейнасці Міністэрства для наступнага размяшчэння ў Інтэрнэце, распрацоўка і накіраванне ў МЗС для распаўсюджання дыпламатычнымі і консульскімі ўстановамі кароткай рэпрэзентатыўнай інфармацыі аб асноўных паказчыках і дасягненнях у развіцці галіны культуры [439, спр. 231, арк. 170–171].

Спецыялісты Міністэрства адзначалі ***цяжкасці,*** з якімі даводзілася сутыкацца пры рэалізацыі знешніх сувязей у галіне культуры камерцыйнай накіраванасці. Існуючы рынак культурных паслуг неабходна было заваёўваць. Пры гэтым для выхаду на гэты рынак беларускім артыстам даводзілася весці барацьбу з канкурэнтамі з іншых краін. Перавышэнне прапановы над попытам дазваляла еўрапейскім імпрэсарыё і арт-фірмам дыктаваць свае, часам прыніжальныя, умовы. У гэтым плане сказвалася адсутнасць вопыту і навыкаў правядзення міжнароднага культурнага менеджменту, а таксама адсутнасць кваліфікаваных менеджараў і юрыстаў-міжнароднікаў. Адмоўны ўплыў і няздольнасць на неабходным узроўні забяспечыць запуск аднаго з асноўных механізмаў рэалізацыі знешнекамерцыйнай дзейнасці – рэкламы [439, спр. 217, арк. 35–36].

Аб апошніх акалічнасцях выказвалася ў 1996 г. вядомая салістка беларускай оперы Н. Кастэнка: «За апошнія гады адбылося шэсць гастрольных паездак нашай опернай трупы ў Іспанію... "Сусветны рынак"... Мы нават не выйшлі на яго. Нас ніхто не ведае. І наогул мы знаходзімся ў ізаляцыі ад сусветнай культуры – тэатральнай, музычнай. Нашы афішы ў Іспаніі былі безыменнымі. "Аіда" беларускага тэатра – і ўсё! А хто спявае Аіду, Амнерыс, Радамеса – ніхто не ведае. Нашы тэатры знаходзяцца ў жабрацкім становішчы. І імпрэсарыё вельмі ўмела гэта выкарыстоўваюць. Калі мы не пагаджаемся на рабскія ўмовы працы, знойдуцца іншыя, хто згодны» [288].

Не спрыяла развіццю культурнай дыпламатыі і такая акалічнасць, як вызначэнне Міністэрства культуры ў якасці галоўнага ведамства. Напрыклад, сярод мерапрыемстваў міждзяржаўнай праграмы доўгатэрміновага эканамічнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Украіны на 1999–2008 гг. прадугледжвалася, што партнёрам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у справе падрыхтоўкі праекта пагаднення аб заснаванні і ўмовах дзейнасці інфармацыйна-культурных цэнтраў з украінскага боку выступіць нацыянальнае Міністэрства замежных спраў. Рэалізацыя гэтага новага для Міністэрства культуры напрамку дзейнасці ўжо на самым пачатку выклікала складанасці працэдурнага парадку. Міністр культуры звяртаў увагу Савета Міністраў на тое, што існуючая практыка падрыхтоўкі пагадненняў аб заснаванні і наглядзе за дзейнасцю інфармацыйна-культурных цэнтраў, а таксама вопыт работы краін-суседзяў сведчылі, што гэтыя пытанні ўваходзілі ў кампетэнцыю Міністэрства замежных спраў. Напрыклад, у Польшчы нагляд за дзейнасцю



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэнтраў у той час ажыццяўляла Міністэрства замежных спраў, у Расійскай Федэрацыі – дыпламатычныя прадстаўніцтвы Расіі за рубяжом і Расійскі цэнтр міжнароднага навуковага і культурнага супрацоўніцтва пры Урадзе Расійскай Федэрацыі. У сувязі з гэтым Міністэрства культуры прасіла Савет Міністраў вызначыць у якасці галоўнага выканаўцы з беларускага боку Міністэрства замежных спраў [439, спр. 289, арк. 48].

Такім чынам, прававой базай, рэгулюючай механізмы вызначэння і ажыццяўлення ўдзелу Рэспублікі Беларусь у міжнародным культурным супрацоўніцтве ў вызначаны перыяд, з'яўляліся шматбаковыя і двухбаковыя дамовы, падпісаныя ад імя Рэспублікі Беларусь, Урада Рэспублікі Беларусь і рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў, распрацаваныя на іх падставе праграмы і планы. Пералічаныя прававыя дакументы з'яўляліся рознымі па сваёй юрыдычнай сіле, прадугледжвалі розныя функцыі ў дзейнічаючым арганізацыйна-прававым механізме міжнароднага культурнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь.

У вывучаемы перыяд у Беларусі была створана канцэпцыя знешняй культурнай палітыкі, заснаваная на прынцыпах ўсебаковага культурнага абмену, эфектыўнага выкарыстання багацця векавых культурных кантактаў і культурнай спадчыны, імкнення да плённасці кантактаў і ўзаемадзеяння паміж рознымі культурамі.

Аднак дасягнутыя дамоўленасці выконваліся не заўсёды, у прыватнасці абавязацельствы па абмене творчымі калектывамі, па стварэнні культурна-інфармацыйных цэнтраў. Асноўная прычына – недастатковае фінансаванне. На ўзровень эфектыўнасці знешняй культурнай палітыкі непасрэднае ўздзеянне аказвала наяўнасць высокакваліфікаваных кадраў, узаемная зацікаўленасць у супрацоўніцтве, жыццядзейнасць беларускай дыяспары, адлегласць паміж краінамі.

### 7.2. Двухбаковае культурнае супрацоўніцтва

Адным з найбольш трывалых і плённых відаў культурнага супрацоўніцтва з'яўляюцца двухбаковыя сувязі.

У вывучаемы перыяд Рэспублікай Беларусь было заключана звыш 40 міжурадавых і міжведамасных пагадненняў і дэкларацый, якія датычыліся супрацоўніцтва ў галіне культуры (гл. табл. 1). Найбольш плённымі ў гэтым напрамку былі 1995 і 1996 гг. Геаграфія краін-партнёраў яскрава сведчыць аб шматвектарнасці знешняй культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Адметным з'яўляецца факт заключэння першых міжурадавых дакументаў аб культурным супрацоўніцтве з такімі блізкімі па культуры краінамі, як Польшчай і Балгарыяй, і такімі геаграфічна і культурна далёкімі, як Кітай і Індыя.

Першай краінай-суседкай, з якой было падпісана міжведамаснае пагадненне, была Літва. Гэта адбылося яшчэ ў рамках СССР 5 лютага 1989 г. у г. Мінску. Пагадненне было заключана на тры гады з працягам. Перазаключэнне адбы-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лося ў 1993 г. Артыкулам 12 гэтага пагаднення прадугледжвалася штогадовая падрыхтоўка і зацвярджэнне праграм канкрэтнага супрацоўніцтва, умовы арганізацыі і фінансавання [439, спр. 37, арк. 4–6]. У далейшым такія праграмы заключаліся на два гады.

Па колькасці заключаных двухбаковых міжнародных прававых актаў у перыяд 1992–1995 гг. лідарам была Польшча. Міжурадавая дэкларацыя 1992 г. аб супрацоўніцтве Беларусі і Польшчы ў галіне культуры, навукі і адукацыі ў 1995 г. была заменена Міжурадавым дагаворам. Акрамя гэтага, было заключана асобнае Міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны (1995).

*Табліца 1.* **Дынаміка заключэння Рэспублікай Беларусь двухбаковых міжнародных прававых актаў, якія рэгулявалі адносіны ў галіне культуры (1992–2010 гг.) [439, спр. 217, арк. 37–46; спр. 220, арк. 11–113; 646; 647]**

| Год | Пагадненні, дэкларацыі | | Міжведамасныя пратаколы | Праграмы, планы |
|---|---|---|---|---|
| | міжурадавыя | міжведамасныя | | |
| 1992 | Кітай (25.11.)<br>Польшча (18.11.) | | | Польшча (на 2 гады) |
| 1993 | Індыя (14.05)<br>Балгарыя (19.10.) | Літва (05.02.)<br>Украіна (10.02.) | | Літва (05.02, на 2 гады) |
| 1994 | Германія (03.03., не ўступіла ў моц, аднак прымянялася з дня падпісання)<br>Узбекістан (міждзяржаўнае, 22.12.) | | | |
| 1995 | Расія (21.01.)<br>Польшча (25.03.)<br>Румынія (07.05.)<br>Іран (14.07.)<br>Вялікабрытанія (25.07.)<br>Турцыя (08.08.)<br>Польшча (27.11.) | Малдова (11.09.) | Кітай (14.12, на 3 гады)<br>Пратакол сесіі змешанай беларуска-германскай камісіі па культурным супрацоўніцтве (10.11.) | Літва |
| 1996 | Казахстан (17.01.)<br>Югаславія (06.09.)<br>Таджыкістан (15.05., не ўступіла ў моц) | Азербайджан (06.03.)<br>Расія (Калінінградская вобласць, (02.10.) | Расія (кіно, 19.04, на 2 гады)<br>Расія (Масква, 14.10, на 3 гады) | Італія (27.09. міжурадавая рабочая праграма на 4 гады) |
| 1997 | | Польшча (06.03, на 4 гады)<br>Куба (15.09.) | Расія (28.01, на 1 год)<br>Польшча (06.03, на адзін год)<br>Расія (Адміністрацыя Санкт-Пецярбурга, 16.05, на 2 гады) | План сумесных мерапрыемстваў у рамках Садружнасці Беларусі і Расіі (28.01, на 1 год)<br>Украіна (міжведамасная, 12.05, на 2 гады) |
| 1998 | Сірыя (11.03.) | Расія (Мурманская вобласць, 28.09, на 3 гады) | Расія (10.02, на 1 год) | Індыя (міжурадавая, на 3 гады) |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заканчэнне табл. 1*

| Год | Пагадненні, дэкларацыі | | Міжведамасныя пратаколы | Праграмы, планы |
|---|---|---|---|---|
| | міжурадавыя | міжведамасныя | | |
| 1999 | | Казахстан (04.11.)<br>Расія (Краснадарскі край, 17.03, на 2 гады)<br>Расія (Сарataўская вобласць, 15.04, на 5 гадоў) | Украіна (Крым, 18.02, на 5 гадоў) | |
| 2000 | Ізраіль (11.04, ратыфікавана Беларуссю 07.05.2007 г.) | | | Украіна (міжведамасная, 08.07, на 3 гады)<br>Турцыя (міжурадавая, 15.11, на 3 гады) |
| 2001 | | Расія (Мурманская вобласць, 28.03, на 3 гады)<br>Расія (Краснадарскі край, 13.08, на 4 гады)<br>Малдова (28.08.)<br>Літва (22.11.) | Кітай (24.04, на 3 гады)<br>Расія (13.12, на 1 год) | Індыя (міжурадавая, 15.11, на 4 гады)<br>Літва (22.11, на 2 гады) |
| 2002 | | Латвія (18.04) | | |
| 2003 | | Арменія (17.10.) | Украіна (16.06.)<br>Расія (21.01, на 1 год)<br>Кітай (28.11, на 3 гады) | |
| 2004 | Егіпет (24.06.)<br>Іран (10.09.) | Ліван (07.06.)<br>Эстонія (24.08.) | Балгарыя (27.07, на 2 гады)<br>Расія (на 1 год) | |
| 2005 | | Славакія (18.10.) | | Літва(28.09, на 2 гады) |
| 2006 | Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка (28.08.) | | Сірыя (13.04, на 3 гады)<br>Расія (24.01, на 1 год) | |
| 2007 | Карэя (05.11.)<br>Венесуэла (міждзяржаўная, 08.12.) | В’етнам (21.12.) | Кітай (05.11, на 3 гады)<br>Турцыя (18.04.)<br>Расія (г. Масква, 02.04.) | Індыя (міжурадавая, 16.04, на 3 гады)<br>Літва (04.10, на 2 гады) |
| 2008 | | | Расія (12.07, на 2 гады)<br>Кыргызстан (11.10, на 4 гады) | Расія (Масква, 15.01, на 2 гады)<br>Арменія (20.05, на 3 гады) |
| 2009 | Катар (13.04.) | Літва (12.09)<br>Туркменістан (19.06) | | Расія |
| 2010 | Украіна (29.04.)<br>Францыя (20.01.) | | | Літва<br>Сірыя (28.04.)<br>Украіна<br>Расія<br>г. Масква |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Апошняй краінай-суседкай, з якой было падпісана двухбаковае міжведамаснае пагадненне, стала Латвія (2002 г.). У вывучаемы перыяд заўважна і паступовая змена геаграфіі новых партнёраў. Пратакол аб супрацоўніцтве з Польшчай (1997 г.) стаў адным з апошніх міжнародных пагадненняў, заключаных Рэспублікай Беларусь з дзяржавамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы. Міністэрства культуры неаднаразова звярталася да адпаведных структур еўрапейскіх дзяржаў з прапановамі аб далейшай распрацоўцы міжведамасных пагадненняў. Аднак па прычынам палітычнага характару з боку замежных партнёраў гэтыя звароты не атрымалі належнага адказу [823, с. 54].

У перыяд 1996–2001 гг. назіралася значнае павелічэнне дагаворна-прававой базы з Расійскай Федэрацыяй, а ў перыяд 2004–2010 гг. – перавага новых партнёраў з іншых кантынентаў пры захаванні трывалых сувязей з Расіяй, актывізацыя супрацоўніцтва з Літвой і Украінай (гл. табл. 1).

Наладжванню плённых кантактаў спрыялі замежныя візіты кіраўніцтва краіны і Міністэрства культуры.

Толькі за 1998 г. Міністэрства культуры атрымала 7 пратаколаў даручэнняў па выніках візітаў Кіраўніка дзяржавы. Праўда, не ва ўсіх выпадках даручэнні выконваліся. Напрыклад, пасля візіту Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Саюзную Рэспубліку Югаславія Міністэрству культуры было даручана правесці гастролі ансамбля «Чысты голас» у Югаславіі і Дні культуры Югаславіі ў Рэспубліцы Беларусь. Гастролі не адбыліся ў сувязі са складаным становішчам у рэгіёне, а Дні культуры прайшлі ў снежні 1998 г. [439, спр. 278, арк. 167–168]. Адсутнасць эканамічнай мэтазгоднасці для Беларусі не дазволіла правесці Дні культуры Беларусі ў Прыморскім краі ў 1999 г. Мерапрыемства было ўнесена ў План па рэалізацыі дамоўленасцей, дасягнутых у ходзе сустрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з губернатарам Прыморскага краю 23 лютага 1998 г. Па прычыне недахопу фінансавых сродкаў не было выканана даручэнне аб арганізацыі гастроляў у 2000 г. у Навасібірскай вобласці ансамбля «Харошкі» [439, спр. 350, арк. 285–287].

У час рабочага візіту ў 2004 г. у Егіпет (які адбыўся ўпершыню за гісторыю афіцыйных адносін у галіне культуры) міністра культуры Рэспублікі Беларусь кіраўніцтвам Міністэрства культуры гэтай краіны была выказана зацікаўленасць у супрацоўніцтве кансерваторыі г. Каіра з Беларускай дзяржаўнай акадэміяй музыкі, адзначана важнасць абмену перакладамі твораў аўтараў дзвюх краін [110, с. 29].

У тым жа годзе міністр культуры Рэспублікі Беларусь Л. П. Гуляка наведаў з рабочым візітам Эстонію для падпісання міжведамаснага пагаднення з Міністэрствам культуры Эстонскай Рэспублікі. Эстонскі бок прапанаваў вывучыць магчымасці сумеснай кінавытворчасці з выкарыстаннем тэхнічнай базы і абсталявання Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», падтрымаў прапанову беларускага боку аб умацаванні прамых кантактаў паміж нацыянальнымі бібліятэкамі Беларусі і Эстоніі [110, с. 31].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Толькі ў 2010 г. міністр культуры П. Латушка правёў перамовы з міністрамі культуры Літвы, Польшчы, Сербіі, Чэхіі, Латвіі, главамі дыпламатычных прадстаўніцтваў Італіі, Чэхіі, Славакіі, Сірыі, Ірана, Грузіі, Украіны, паслом Мальтыйскага ордэна і дырэктарам Бюро ЮНЕСКА ў Маскве [104, с. 126–130].

Наладжванню больш цесных культурных сувязей паміж дзяржавамі, практычнаму здзяйсненню міжурадавых пагадненняў і дэталёвай распрацоўцы праграм сумесных дзеянняў у даследуемы перыяд спрыяла праца ***сумесных камісій*** – беларуска-нямецкай па культурным супрацоўніцтве і беларуска-польскай кансультатыўнай камісіі па справах гісторыка-культурнай спадчыны, створаных, згодна з пагадненнямі, урадамі адпаведных краін.

Першая сесія *беларуска-нямецкай камісіі* адбылася 8–10 лістапада 1995 г. Па яе выніках быў падпісаны пратакол. Дакумент закранаў розныя бакі культурнага і адукацыйнага супрацоўніцтва. У ім асобна выдзялялася дзейнасць культурных устаноў краіны на тэрыторыі краіны-партнёра. Была закладзена аснова наладжвання пракатаў кінастужак праз арганізацыю «Інтэр Нацыёнес» і Нямецкі культурны цэнтр (Інстытут імя Гётэ) для дэманстрацыі падчас кінафестываляў і тыдняў нямецкіх фільмаў.

У заканчэнні адзначалася, што бакі па заслугах ацанілі дзейнасць у культурнай галіне няўрадавых грамадскіх аб'яднанняў і груп. Была дасягнутая дамова аб арганізацыі ў 1996 г. 2-й сесіі камісіі, аднак яна не адбылася.

Больш працяглай і плённай была работа *беларуска-польскай кансультацыйнай камісіі па справах гісторыка-культурнай спадчыны*. Мэтай яе існавання было вывучэнне праблем, што назбіраліся за працяглы гістарычны перыяд, распрацоўка навукова абгрунтаваных рэкамендацый урадам абедзвюх краін па вырашэнні пытанняў узаемаадносін да сумеснай гісторыка-культурнай спадчыны і да гісторыка-культурных каштоўнасцей аднаго з бакоў, што знаходзяцца на тэрыторыі другога боку, а таксама выкананне іншых даручэнняў абодвух урадаў [321, 338].

У вывучаемы перыяд з'явіліся новыя формы культурнага супрацоўніцтва Беларусі з замежнымі краінамі. Гэта ***культурныя цэнтры***. Сярод іх на тэрыторыі нашай краіны можа назваць Брытанскі савет, Нямецкі культурны цэнтр (Інстытут імя Гётэ), Польскі інстытут, Французскі адукацыйны цэнтр, Інфармацыйны цэнтр ЗША, Інфармацыйны цэнтр японскай культуры. У 2004 г. пачаў працу Італа-беларускі цэнтр супрацоўніцтва і адукацыі «Сардынія». У 2009 г. адкрыўся Лацінаамерыканскі культурны цэнтр імя Сімона Балівара. Вялася работа па арганізацыі аналагічных устаноў нашай краіны ў дзяржавах Еўропы.

Прававая аснова іх дзейнасці была закладзена ў двухбаковых пагадненнях Беларусі, пратаколах аб супрацоўніцтве і інш.

Напрыклад, у адпаведнасці з міжурадавым Пагадненнем паміж Рэспублікай Беларусь і Злучаным Каралеўствам Вялікабрытанія і Паўночнай Ірландыі аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі, навукі і культуры (арт. 14) Брытанскі Савет

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

дзейнічаў у якасці галоўнага агента Урада Злучанага Каралеўства ў выкананні палажэнняў пагаднення.

Аб актуальнасці стварэння ў замежных краінах беларускіх культурных цэнтраў Міністэрства культуры гаварыла яшчэ ў 1992 г. У той час прадпрымаліся захады з мэтай стварэння Цэнтра беларускай культуры ў Маскве на базе Беларускага пастаяннага прадстаўніцтва. Змест працы такіх цэнтраў бачыўся ў распаўсюджванні беларускай літаратуры, дзейнасці курсаў беларускай мовы, развіцці культурнага і навуковага супрацоўніцтва і інш. Аднак кіраўніцтва Міністэрства адзначала, што ўсё гэта магчыма толькі пры ўмовах выдзялення адпаведных фінансавых сродкаў на ўтрыманне штата супрацоўнікаў і арэнду памяшканняў. Другім пытаннем, якое патрабавала вырашэння, было вызначэнне ўрадам дзяржаўных органаў ці грамадскіх арганізацый, пры якіях павінна было ажыццяўляцца фінансаванне і каардынацыя дзейнасці культурных цэнтраў. Кіраўніцтву Міністэрства культуры бачылася мэтазгодным аб'яднанне Таварыства сувязі з суайчыннікамі за мяжой «Радзіма» і Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі ў адзіны цэнтр прапаганды беларускай культуры за межамі рэспублікі, які б часткова фінансаваўся за кошт дзяржаўнага бюджэту праз Міністэрства замежных спраў ці Міністэрства культуры. Такі цэнтр мог бы пачаць работу па стварэнні культурных прадстаўніцтваў Беларусі за мяжой адначасова са стварэннем дыпламатычных і гандлёвых прадстаўніцтваў [438, спр. 2074, арк. 115–116].

Праца па стварэнні культурных цэнтраў Беларусі за мяжой зацягнулася на шмат гадоў, нягледзячы на тое, што яшчэ ў 1996 г. былі падрыхтаваны міжурадавыя пагадненні аб заснаванні і ўмовах дзейнасці цэнтраў з Расійскай Федэрацыяй, Рэспублікай Польшча, Дзяржавай Ізраіль, Беларусь змагла адкрыць толькі Культурны цэнтр пры Пасольстве краіны ў Рэспубліцы Польшча, які размясціўся ў г. Беластоку (2008 г.) [136]. Адной з перашкод на гэтым шляху з'яўлялася адсутнасць адзінага дзяржаўнага падыходу і стандарту. Напрыклад, не было вызначана галаўнога міністэрства, якое б адказвала за стварэнне будучых цэнтраў беларускай культуры за мяжой, а таксама за кантроль дзейнасці існуючых і будучых культурных цэнтраў замежных краін на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Напрыклад, Беларускі інфармацыйна-культурны і навукова-тэхнічны цэнтр у Маскве павінен быў здзяйсняць сваю дзейнасць пад агульным кіраўніцтвам главы дыпламатычнага прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі. Нагляд за дзейнасцю Беларускага культурна цэнтра ў Ізраілі – Пасольства Рэспублікі Беларусь у гэтай краіне. А вось Культурны цэнтр у Польшчы павінен быў дзейнічаць пад патранажам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [439, спр. 104, арк. 219–220]. Цяжкасці былі і палітычнага характару. Напрыклад, Міжурадавае пагадненне аб узаемным заснаванні і дзейнасці культурных цэнтраў паміж Рэспублікай Беларусь і Дзяржавай Ізраіль, падпісанае 11 красавіка 2000 г. у Іерусаліме, беларускім бокам было ратыфікавана толькі 7 мая 2007 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з найбольш маштабных форм міжнароднага культурнага супрацоўніцтва ў вывучаемы перыяд былі ***Дні культуры***.

Першым такім мерапрыемствам ва ўмовах незалежнасці сталі Дні культуры Беларусі ў Нідэрландах (правінцыя Оверысель), якія прайшлі з 15 па 22 снежня 1991 г. і ўключалі ў сябе канцэрты фальклорнага ансамбля «Крупіцкія музыкі», выставу традыцыйнага мастацтва (абразы, ткацтва, шкло, дэкаратыўна-прыкладныя вырабы), фотавыставу работ народных майстроў, дэманстрацыю відэафільмаў і інш. Правядзенне Дзён культуры выклікала вялікую цікавасць грамадскасці Нідэрландаў, прадстаўнікоў афіцыйных устаноў і арганізацый, шырока адлюстроўвалася па радыё, у прэсе. Дванаццаць прадстаўленняў, якія прайшлі ў пяці гарадах Нідэрландаў, наведалі больш за 10 тыс. чалавек.

Да адкрыцця Дзён культуры быў прымеркаваны візіт афіцыйнай дэлегацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, у выніку якога былі дасягнуты дамоўленасці аб пашырэнні культурных сувязей, падпісанні неабходных дакументаў [438, спр. 2071, арк. 7].

У чэрвені 1993 г. пры садзейнічанні Міністэрства культуры прайшлі Дні культуры кантона Ааргау (Швейцарыя) у Мінску, у лістападзе 1994 г. і лістападзе 1995 г. у Мінску праходзілі Дні культуры Польшчы.

За 1999–2000 гг. былі праведзены Дні культуры Беларусі ў КНР, Малдове, Аўтаномнай Рэспубліцы Крым, Дні беларускай культуры ў Рызе, Дні традыцыйнай культуры, традыцыйнага мастацтва і кухні беларускага народа ў Берліне, Дні беларускага кіно ў Адэсе. У Беларусі адбыліся Дні культуры Мурманскай вобласці, Краснадарскага краю, Яраслаўскай вобласці, Рэспублікі Арменія.

У 2005 г. упершыню прайшлі Дні культуры Беларусі ў Арменіі. Акрамя гэтага, падобныя мерапрыемствы адбыліся ў Сербіі і Кітаі. У тым жа годзе ў нашай краіне прайшлі Дні культуры Арабскай Рэспублікі Егіпет, Калінінградскай вобласці, Тыдзень культуры Ірана.

У сакавіку 2008 г. упершыню ў гісторыі двухбаковых адносін адбыліся Дні культуры Рэспублікі Беларусь у Сірыі. Яны былі прымеркаваны да 15-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін. У гэтым жа годзе таксама ўпершыню адбыліся Дні культуры нашай краіны ў ПАР, Кыргызстане, Азербайджане. Акрамя гэтага, падобныя мерапрыемствы былі праведзены ў Егіпце, Кітаі, Славакіі.

На працягу 2010 г. Міністэрствам культуры быў арганізаваны і праведзены шэраг мерапрыемстваў у форме Года і Дзён культуры Беларусі ў замежных краінах, у тым ліку Расіі, Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, Венгрыі, Казахстане, Літве, Украіне, Кітаі.

Сярод краін-суседзяў плённымі былі культурныя кантакты з Украінай. Толькі ў 1990-х гг. Дні культуры Украіны ў Беларусі прайшлі чатыры разы (1994, 1995, 1996, 1997 гг.), у той час як Дні культуры Беларусі ва Украіне толькі адзін раз (1993 г.). У новым дзесяцігоддзі статыстыка была на карысць Беларусі: Дні культуры Рэспублікі Беларусь ва Украіне адбыліся тройчы (2002, 2003, 2010 гг.), а Дні культуры Украіны ў нашай краіне – толькі адзін раз (2004 г.).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гэтыя маштабныя мерапрыемствы дапаўнялі Дні Кіева ў Мінску (2002 г.), Дні Мінска ў Кіеве (2003 г.), Дні Рэспублікі Беларусь у Крыме (1999 г.), Дні беларускай культуры ў Вінніцы (2001 г.), грамадска-культурная акцыя «Мы – беларусы» з удзелам вядучых творчых калектываў і выканаўцаў краіны, якая адбылася ў 2008 г. у Кіеве [848, с. 239].

Дасягненнем можна лічыць правядзенне ў красавіку 2002 г. Дзён культуры Беларусі ў Францыі. Гэта падзея адбылася ўпершыню за 10 гадоў існавання дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі па ініцыятыве Пасольства Беларусі ў Францыі і дзякуючы падтрымцы вядомага французскага куцюр'е П. Кардэна. Падкрэслім, што афіцыйным партнёрам мерапрыемства былі не прадстаўнікі афіцыйных улад, а прыватная асоба, што не характэрна для такога кшталту мерапрыемстваў. У рамках Дзён на сцэне Тэатра П'ера Кардэна быў паказаны спектакль «Шагал... Шагал...» у пастаноўцы Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа. Асаблівасцю Дзён культуры стала іх сувязь з імем М. Шагала. Сем яго арыгінальных карцін, спецыяльна атрыманых П. Кардэнам для выставы, былі размешчаны разам з творамі сучасных беларускіх жывапісцаў, графікаў, скульптараў. Акрамя выставы і п'есы французскі глядач мог пабываць на канцэртах ансамбля «Класік-Авангард» і салістаў Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Рэспублікі Беларусь [423].

Аднак не заўсёды можна гаварыць аб тым, што замежны глядач знаёміўся менавіта з беларускай культурай. У ліпені 2008 г. у Кітаі прайшлі Дні культуры Рэспублікі Беларусь. На гала-канцэрце афіцыйнага адкрыцця і на канцэрце ў г. Хуайджоу выступілі артысты Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча. Кітайскі глядач сярод іншага пачуў песні, якія нельга назваць беларускімі народнымі, – «Рабінушка», «Кацюша», «Калінка», «Падмаскоўныя вечары», а таксама ўбачыў танец «Мяцеліца». Сапраўднае беларускае мастацтва было прадстаўлена на выстаўцы сучаснага беларускага жывапісу ў Сталічнай бібліятэцы г. Пекіна. Гэта былі творы пяці беларускіх мастакоў аднаго пакалення – В. Саевіча, У. Зінкевіча, У. Тоўсціка, В. Альшэўскага і В. Шкарубы [547].

Побач з Днямі культуры шырокае распаўсюджанне набыла практыка правядзення Дзён кіно краіны. У 1998 і 1999 гг. адбыліся Дні беларускага кіно ва Украіне. Дні ўкраінскага кіно ў Беларусі ў 1990-х г. праводзіліся тройчы (1995, 1997, 1998 гг.). У 2002 г. у Беларусі адбыліся Дні іранскага і ўкраінскага кіно. У 2003 і 2005 гг. – Дні беларускага кіно ў Літве і Малдове, а ў 2004 г. – у Польшчы і Славакіі.

Дзеячы беларускай культуры пастаянна прымалі ўдзел у двухбаковых мерапрыемствах, якія па сваёй галоўнай накіраванасці не насілі культурнага характару. У час правядзення восенню 1997 г. у Вялікабрытаніі Дзён эканомікі Беларусі адбылася серыя канцэртаў ансамбля «Купалінка», была арганізавана фотавыстава і выстава работ беларускіх мастакоў. Неабходнасць такога мерапрыемства была прадыктавана палітычнымі матывамі. Дні эканомікі былі накіраваны на разбурэнне склаўшыхся адмоўных стэрэатыпаў і стварэнне ўмоў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для аднаўлення ўзроўню двухбаковага супрацоўніцтва ў палітыцы, эканоміцы і культуры. Важным момантам з'ялялася тое, што Вялікабрытанія ў 1998 г. старшынствавала ў вышэйшых органах Еўрапейскага Саюза. У такіх умовах наладжванне канструктыўнага палітычнага дыялогу з афіцыйным Лонданам разглядалася як наступны крок да спынення ізаляцыйных тэндэнцый ў адносінах да Беларусі ў краінах Еўрапейскага Саюза [439, спр. 217, арк. 19].

Дзейнасць Міністэрства культуры па выкананні дамоўленасцей у рамках дзеючых дагавораў характарызавалася рознай ступенню актыўнасці. З 1998 г. найбольш актыўныя ***кантакты*** ажыццяўляліся ***з Расійскай Федэрацыяй***. З Міністэрствам культуры і масавых камунікацый Расіі і Федэральным агенцтвам па культуры і кінематаграфіі Расіі амаль штогод падпісваліся міжведамасныя дакументы аб супрацоўніцтве канкрэтнага зместу.

Умацаванню беларуска-расійскіх культурных сувязей садзейнічалі працэсы пабудовы Саюзнай дзяржавы. За 2000–2003 гг. з агульнага бюджэту былі выдзелены сродкі на рэканструкцыю мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Значная частка выдаткаў на правядзенне Славянскага базару ў Віцебску таксама пакрывалася з саюзнага бюджэту. У 2003 г. былі ўстаноўлены спецыяльныя прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне культуры. Першымі лаўрэатамі з Беларусі сталі І. Шамякін і А. Дудараў. У 2007–2008 гг. прэміі атрымалі народны артыст Беларусі У. Гасцюхін і дырэктар і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь, народны артыст Беларусі М. Фінберг.

Культурнае супрацоўніцтва стала адной са складаючых частак Канцэпцыі сацыяльнага развіцця Саюзнай дзяржавы да 2005 г. Адпаведна дакументу рэальная перспектыва кантактаў культур народаў Беларусі і Расіі бачылася ў стварэнні адзінай культурнай прасторы, у якой знойдзе сваё месца кожная свабодная і раўнапраўная нацыянальная культуры. Галоўнай мэтай выступала гуманізацыя ўсіх сфер грамадства, паступовае пераўтварэнне яго ў адзін з цэнтральных кампанентаў цэласнай стратэгіі развіцця і ўзаемаўзбагачэння. Асноўнымі напрамкамі і прыярытэтамі культурнай палітыкі саюзнай дзяржавы былі: стварэнне эканамічных умоў для развіцця творчай актыўнасці; уніфікацыя заканадаўчай базы; дзяржаўная падтрымка культуры; забеспячэнне міжнацыянальных і міждзяржаўных культурных кантактаў паміж дзвюма дзяржавамі; захаванне і выкарыстанне культурнай спадчыны; стварэнне адзінай інфармацыйнай прасторы; падтрымка спонсарства і мецэнацтва; развіццё навукі і адукацыі ў галіне культуры і інш.

У красавіку 2005 г. дзеянне канцэпцыі было працягнута да 2010 г. [305].

З мэтай рэалізацыі палажэнняў канцэпцыі сумесным рашэннем калегій міністэрстваў культуры дзвюх краін 2004 год быў абвешчаны Годам культуры Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі. Цырымонія адкрыцця Года культуры прайшла на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Расіі паказам балета С. Пракоф'ева «Рамэо і Джульета». У наступны дзень на гэтай жа

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сцэне была паказана опера М. Мусаргскага «Хаваншчына» ў выкананні артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы Рэспублікі Беларусь.

Як бачым, беларускія артысты прадставілі на суд маскоўскім гледачам пастаноўкі па творах рускіх аўтараў. Не зразумела, чым яны пры гэтым кіраваліся. У тэатрах Масквы гэтыя творы таксама былі ў рэпертуары. Чаму не паказаць нешта нацыянальнае, пастаўленае па творах беларускіх кампазітараў? Ці ў нас на той час не было чым ганарыцца?

Праз год на беларускай зямлі прайшлі мерапрыемствы ў рамках Года расійскай культуры. Можа, расіяне з павагі да беларускай культуры паказалі на мінскай сцэне пастаноўкі па творах беларускіх аўтараў? Не. Гледачам прапанавалі балет «Спячая прыгажуня» і «Лебядзінае возера» Маскоўскага дзяржаўнага тэатра «Рускі балет» пад кіраўніцтвам В. Гардзеева.

Самы актыўны і непасрэдны ўдзел у мерапрыемствах Года культуры Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі прынялі ўсе вобласці Беларусі, чые прафесійныя калектывы, творчыя саюзы і калектывы мастацкай самадзейнасці прадстаўлялі свае дасягненні ў рэгіёнах Расіі. Да прыкладу, калектывы г. Віцебска ўдзельнічалі ў культурных акцыях у г. Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці, г. Обнінску Калужскай вобласці, г. Санк-Пецярбургу, а абласное аддзяленне Саюза мастакоў Беларусі прадстаўляла ў г. Смаленску выстаўку «Мастакі Віцебшчыны», дзе экспанавалася каля 40 карцін. Беларускі дзяржаўны тэатр лялек правёў паспяховыя гастролі ў г. Арэнбургу, а Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр удзельнічаў у фестывалі «Славянскія тэатральныя сустрэчы» ў г. Бранску, дзе быў адзначаны спецыяльным прызам журы. Тэатральныя калектывы з Беларусі прынялі ўдзел у Міжнародным фестывалі «Сустрэчы ў Расіі» (г. Санкт-Пецярбург), а Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі правёў гастролі ў г. Іркуцку, дзе паказаў 14 спектакляў. Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль народнай песні «Церніца» прыняў удзел у Днях культуры Беларусі ў Новасібірскай вобласці. Тамсама прайшлі і Дні беларускага кіно [109, с. 23].

У рамках года культуры ў Дзяржаўнай Траццякоўскай галерэі прайшла выстаўка старажытнабеларускага жывапісу, рускага мастацтва XVIII – пачатку XX ст. і мастацтва Беларусі XX ст. пад назвай «100 шэдэўраў з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь». Выклікае зноў жа здзіўленне прысутнасць сярод карцін работ расійскіх мастакоў. Атрымліваецца, што без іх беларускі музей не здолеў бы сабраць 100 шэдэўраў... Зноў жа ж праз год у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі прайшла выстава карцін з фондаў Траццякоўкі. Сярод работ не было карцін беларускіх мастакоў, хаця яны ў фондах гэтага музея ёсць.

Год культуры Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі ў 2010 г. адкрыўся спектаклем «Легенда аб Уленшпігелі» ў выкананні артыстаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. У Дзяржаўным цэнтральным музеі сучаснай гісторыі Расіі экспанавалася выстаўка «Belart.by. Маладыя мастакі Беларусі». У гала-канцэрце майстроў мастацтваў Беларусі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на цырымоніі закрыцця Года культуры ўдзельнічалі ансамбль музыкі, песні і танца «Белыя росы» Гродзенскай абласной філармоніі і дзіцячы калектыў народнай студыі саломапляцення «Натхненне» аддзела культуры Клецкага раённага выканаўчага камітэта Мінскай вобласці. У Траццякоўскай галерэі экспанавалася мастацкая выстаўка з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, прысвечаная 200-годдзю з дня нараджэння І. Ф. Хруцкага [104, с. 128].

Адной з форм двухбаковага культурнага супрацоўніцтва з'яўляўся ўдзел адораных дзяцей з Беларусі і Расіі ў буйных сумесных творчых праектах. Яскравым прыкладам з'яўляецца правядзенне ў г. Маскве майстар-класаў для навучэнцаў мастацкіх навучальных устаноў Расіі і Беларусі пад дэвізам «Саюзная дзяржава – маладым талентам XXI стагоддзя». На базе Цэнтральнай музычнай школы пры Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі імя П. Чайкоўскага майстар-класы праводзілі вядучыя педагогі. Па выніках мерапрыемства лепшыя з навучэнцаў – удзельнікаў майстар-класаў увайшлі ў склад Маладзёжнага беларуска-расійскага сімфанічнага аркестра. Яго дэбют адбыўся на канцэрце, прысвечаным Дню яднання народаў Беларусі і Расіі.

З бюджэта Саюзнай дзяржавы падтрымліваўся фестываль «Творчасць юных», які праводзіўся штогод з 2008 г. у жніўні ў г. Анапе. З 2005 г. у г. Смаленску праводзіўся Фестываль творчасці інвалідаў Саюзнай дзяржавы.

Важнае значэнне ў захаванні і развіцці культурнай прасторы Саюзнай дзяржавы мела супрацоўніцва асобных устаноў. У 2008 г. была заключана дамова аб супрацоўніцтве паміж Расійскай дзяржаўнай бібліятэкай і Нацыянальным мастацкім музеем Рэспублікі Беларусь. У тым жа годзе была падпісана дамова аб рэалізацыі сумеснага праекта «Скарбы славянскай культуры» паміж Расійскай дзяржаўнай бібліятэкай і Нацыянальнай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь. У 2009 г. быў створаны Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы [267].

Плённым у 2000-х гг. было беларуска-расійскае супрацоўніцтва ў галіне кінавідэамастацтва. Сярод сумесных праектаў – мастацкія фільмы «У чэрвені 41-га», «Снайпер», «Брэсцкая крэпасць», тэлесерыял «Пяшчотная зіма», мультфільм «Рэактыўны парсючок-7», дакументальныя стужкі «Сустрэча на Эльбе» і «Маленкія остэрбайтэры». У г. Мінску на базе кінатэатра «Цэнтральны» працаваў Цэнтр расійскай кінематаграфіі.

Побач з гэтым на шляху культурнага супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы былі і перашкоды. Да іх ліку адносіцца недастатковае і несвоечасовае фінансаванне культурных праектаў з бюджэту Саюзнай дзяржавы, неадпаведнасць нарматыўна-прававых актаў, што рэгулююць адносіны ў сферы культуры, і інш.

Важным напрамкам міждзяржаўных адносін з'яўлялася ўмацаванне ***сувязей з беларусамі замежжа***. У 1993 г. асобнай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь была зацверджана праграма *«Беларусы ў свеце».*

У адпаведнасці з праграмай дзяржава давала магчымасць беларусам замежжа атрымліваць адукацыю ў навучальных установах Рэспублікі Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бясплатна і па-за конкурсам. Дакументам, якія сведчыў пра беларускае паходжанне будучага абітурыента, было хадайніцтва ад суполкі беларускай дыяспары. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 80 ад 07.02.2005 г. зменены парадак паступлення ў вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь беларусаў замежжа. Па прынятых правілах беларусы замежжа сталі паступаць у ВНУ і сярэдне-спецыяльныя ўстановы на тых жа ўмовах, што і грамадзяне Рэспублікі Беларусь, – на конкурснай аснове.

Дзяржкамітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей у 1999 г. заключыў Пагадненне аб супрацоўніцтве з Міністэрствам па справах федэрацыі і нацыянальнасцей Расійскай Федэрацыі. Асноўная мэта дакумента – падтрымка беларускіх і рускіх аб'яднанняў адпаведна ў Расіі і Беларусі, каардынацыя дзейнасці па падтрымцы суайчыннікаў з гэтых краін у трэціх краінах; правядзенне сумесных мерапрыемстваў; стажыроўкі спецыялістаў, абмен вопытам работы, інфармацыяй і т. д.

У 1997 г. падобнае пагадненне было заключана паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Малдова. У адпаведнасці з ім была створана Беларуска-Малдаўская міжведамасная дарадчая камісія па забеспячэнні правоў асоб, якія прыналежаць да нацыянальных супольнасцей.

У ліпені 1999 г. у Кіеве было падпісана Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай аб супрацоўніцтве па забеспячэнні правоў асоб, якія прыналежаць да нацыянальных супольнасцей, а ў верасні 1999 г. – Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Дзяржкамітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей і Дэпартаментам нацыянальных меншасцей і эміграцыі пры Урадзе Літоўскай Рэспублікі.

У адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай «Беларусы ў свеце», Праграмай падтрымкі нацыянальна-культурнага развіцця беларусаў Польшчы на 1997–2000 гг. Міністэрства культуры аказвала інфармацыйную, метадычную, арганізацыйна-практычную і фінансавую дапамогу беларускім таварыствам замежжа ў іх культурна-асветніцкай дзейнасці.

Трывалыя сувязі былі ўсталяваны з *Беларускім грамадска-культурным таварыствам у Польшчы (БГКТ)*. У 1994–1995 гг. на матэрыялах БГКТ быў выдадзены «Беларускі каляндар»; выраблена мемарыяльная дошка ў гонар заснавальніка беларускага ліцэя ў Бельску-Падляскім Я. Кастыцэвіча, перададзены 12 сцэнічных касцюмаў, музычныя інструменты. Дзіцячаму саду з беларускай мовай навучання ў г. Беластоку падараваны тэлевізар, відэамагнітафон, відэазапісы; 35 вучняў і настаўнікаў беларускіх школ Беласточчыны былі прыняты ў Мінску з арганізацыяй пражывання, харчавання і культурнай праграмы, 6 мастацкіх калектываў (у тым ліку ансамбль «Сябры») па накіраванні Міністэрства прынялі ўдзел у мерапрыемствах БГКТ. Пяць кіраўнікоў беларускіх калектываў Беласточчыны прайшлі навучанне ў БелІПК. У сувязі з 40-годдзем БГКТ актывісты Таварыства былі ўзнагароджаны ганаровымі граматамі Міністэрства культуры, старшыня таварыства Я. Сычэўскі ўзнагароджаны медалём Ф. Скарыны.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З восені 1986 г. у г. Гайнаўка Беластоцкага ваяводства вялося будаўніцтва Музея і асяродку беларускай культуры. У снежні 1992 г. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па просьбе Грамадскага камітэта пабудовы музея звярнулася да Старшыні Савета Міністраў адносна дапамогі беларусам Беласточчыны ў стварэнні экспазіцыі музея і ўдзелу ў гэтай справе спецыялістаў з нашай рэспублікі. Была створана рабочая група, якая пачала працу над навуковай канцэпцыяй музея. У 1995 г. канцэпцыя была ўзгоднена і прынята да выканання. Работа вялася за кошт сродкаў, якія вылучаліся з рэспубліканскага бюджэту на дзейнасць музеяў. Разам з навуковай былі распрацаваны мастацкая канцэпцыя і генеральнае рашэнне экспазіцыі, над якой працаваў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь вядомы мастак Э. Г. Агуновіч [438, спр. 53, арк. 67].

У наступныя гады беларускі бок аказваў дапамогу ў арганізацыі і правядзенні традыцыйных фестываляў «Беларуская песня» і «Беласток–Гродна». Міністэрства культуры прыняло ўдзел у XIII з’ездзе БГКТ (1997) Згодна з Праграмай падтрымкі нацыянальна-культурнага развіцця беларусаў Польшчы на 1997–2000 гг., былі пашыты і перададзены сцэнічныя касцюмы шэрагу самадзейных калектываў Беластоцкага ваяводства. Галоўнай управе БГКТ у Беластоку былі перададзены інфармацыйна-рэкламныя матэрыялы, відэааўдыёкасеты з запісамі прафесійных і самадзейных мастацкіх калектываў, фестываляў і свят, народнай, класічнай і эстраднай музыкі. Для ўдзелу ў традыцыйных святах беларускай культуры, якія праводзіліся ў розных гарадах і вёсках Беласточчыны, толькі ў 1998 г. было накіравана 10 лепшых самадзейных мастацкіх калектываў Беларусі.

Згодна з дзяржаўнай праграмай «Беларусы ў свеце», на працягу 1994–1997 гг. акрамя згаданага ТБК у Беластоку была аказана дапамога таварыствам беларускай культуры ў Маскве, Санкт-Пецярбургу, Калінінградзе, Набярэжных Чалнах (усе – Расійская Федэрацыя), Львове, Кіеве, аўтаномнай рэспубліцы Крым (усе – Украіна), Бішкеку (Таджыкістан), Рызе, Даўгаўпілсе (абодва – Латвія), Радзе беларускіх аб’яднанняў у Таліне (Эстонія), Вільнюсе (Літва), абшчыне «Беларусь» у Кішынёве (Малдавія), Цэнтру беларускай культуры ў Шальчынінкаі (Літва), беларускай абшчыне Науляя (Літва) [439, спр. 194, арк. 16–19].

Асноўнай формай дапамогі ў адпаведнасці з просьбамі з’яўлялася перадача бібліятэчак беларускай літаратуры, нотных зборнікаў, сцэнічных касцюмаў, музычных інструментаў, абсталявання, накіраванне прафесійных і самадзейных мастацкіх калектываў на святы беларускай культуры, фестывалі песні і танца, рэгіянальныя сустрэчы беларусаў. Толькі за 1998 г. сцэнічныя касцюмы атрымалі беларускія фальклорныя калектывы ў Калінінградскай вобласці, Рэспубліцы Комі, г. Масквы, Шальчынінкайскага раёна Літвы [439, спр. 288, арк. 254–256].

Стварэнне найбольш спрыяльных умоў для задавальнення нацыянальна-культурных патрэб насельніцтва беларускай нацыянальнасці ў Літве было вызначана як адзін з напрамкаў дзеянняў у рамках міжведамаснага пагаднення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паміж Міністэрствам культуры і друку Беларусі і Міністэрствам культуры і адукацыі Літвы, заключанага ў 1994 г. Значнай падзеяй стала адкрыццё 18 ліпеня 1994 г. у Шальчынінкаі Беларускага культурнага цэнтра. У фінансаванні рамонту выдзеленых у мясцовым Доме культуры памяшканняў для цэнтра і далейшым іх абсталяванні прымалі ўдзел побач з Міністэрствам культуры і друку Рэспублікі Беларусь Гродзенскі аблвыканкам, Воранаўскі райвыканкам. Таварыству беларускай культуры ў г. Вільні ў тым жа годзе была аказана матэрыяльная дапамога ў выглядзе музычных інструментаў, сцэнічных касцюмаў, офіснай тэхнікі, метадычных дапаможнікаў і інш. [439, спр. 71, арк. 315–316].

Міністэрства культуры прымала ўдзел у правядзенні І З'езда беларусаў свету і арганізавала ў сябе прыём дэлегатаў з бліжняга замежжа, І З'езда беларусаў краін Балтыі, навукова-практычных канферэнцый «Культура беларускага замежжа» Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў. Было прафінансавана выданне двух зборнікаў «Культура беларускага замежжа». Па рэкамендацыях таварыстваў беларускай культуры ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы культуры і мастацтва прымаліся маладыя суайчыннікі з Польшчы. Беларускі дзяржаўны інстытут праблем культуры сумесна з таварыствам «Радзіма» праводзіў курсы для кіраўнікоў самадзейных калектываў ТБК. За 1994–1997 гг. іх было накіравана 30 чалавек [439, спр. 194, арк. 14].

Фальклорныя калектывы з розных рэгіёнаў Беларусі прымалі ўдзел у святах і днях беларускай культуры, якія праводзіліся ў суполках беларусаў замежжа. У 1998 г. у г. Шальчынінкай (Літва) і г. Цірaспаль (Прыднястроўе) прыняў удзел ансамбль танца «Вязынка» Магілёўскай абласной філармоніі, у Калінінградскай вобласці – мужчынскі камерны хор «Унія» і народны фальклорны калектыў «Бялыніцкія музыкі», у г. Вільнюсе (Літва) – народны ансамбль танца «Юнацтва» г. Баранавічы і фальклорны ансамбль народнай музыкі «Паазер'е» Пастаўскай дзіцячай музычнай школы, у г. Даўгаўпілсе (Латвія) – фальклорны ансамбль «На падворку» г. Браслава, у г. Кішынёве (Малдова) – ансамбль Мінскага музычнага вучылішча імя Глінкі [439, спр. 288, арк. 254].

Па запрашэнні Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве ў 1998 г. Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур разам з гуртамі «Дзянніца» і «Мінскі гармонік» было праведзена пад г. Вільнюсам беларускае абрадавае свята «Купалле», а ў г. Нарва (Эстонія) ў тым жа годзе ў рамках свята «Пакроўскія гульні» прынялі ўдзел майстры Лепельскага раённага Дома рамёстваў. На ўрачыстым адкрыцці беларускага падворка беларуска-эстонскаму культурнаму аб'яднанню «Спадчына» быў перададзены ткацкі станок і жаночы нацыянальны касцюм ручнога вырабу [439, спр. 288, арк. 255].

На жаль, не ва ўсе гады справа па падтрымцы беларусаў замежжа ішла добра. У 1999 г. Міністэрства фінансаў не выдзеліла сродкаў на гэтыя мэты, хаця планавалася, што Міністэрства культуры іх атрымае амаль на 80 % болей, чым у папярэднім годзе [439, спр. 288, арк. 256].

Шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне сувязей з суайчыннікамі за мяжой, былі прадугледжаны «Праграмай развіцця канфесійнай сферы,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальных адносін і супрацоўніцтва з суайчыннікамі за мяжой на 2006–2010 гг.».

У вывучаемы перыяд Урадам Беларусі была рэалізавана спецыяльная праграма супрацоўніцтва з беларускай меншасцю ў Польшчы пад назвай «Беларусы ў Польшчы ў 2005–2010 гадах» [197]. Распрацавала праграму Міністэрства замежных спраў Беларусі пры ўдзеле міністэрстваў культуры, адукацыі, інфармацыі, эканомікі, гандлю, Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей, Нацыянальнай акадэміі навук і інш. Сродкі ў сувязі з канкрэтнымі мерапрыемствамі выдзяляліся з бюджэтаў адпаведных міністэрстваў і ведамстваў, абласных выканаўчых камітэтаў і прадпрыемстваў. Праграма была скіравана на падтрымку беларусаў у захаванні нацыянальнай і культурнай самабытнасці, спрыянне нацыянальнай адукацыі на беларускай мове, супрацоўніцтва навуковых устаноў, якія займаюцца беларускай мовай, і арганізацыю курсаў павышэння кваліфікацыі настаўнікаў з Польшчы, якія навучаюць беларускай мове, падтрымку супрацоўніцтва з прадпрымальнікамі беларускага паходжання і інш.

У адпаведнасці з мерапрыемствамі па рэалізацыі праграмы Міністэрства культуры сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам нацыянальных культур аказвала пастаяннае садзейнічанне беларускім аб'яднанням у Польшчы. Штогод праводзілася каля 100 разнастайных культурных мерапрыемстваў: агульнапольскі фестываль «Беларуская песня», фестываль «Музычныя дыялогі над Бугам», святы беларускай культуры, абрадавыя святы, навуковыя канферэнцыі, алімпіяды беларускай мовы, конкурсы «Роднае слова», «Пазнай Беларусь» і інш. Традыцыйнымі сталі тыдні беларускага кіно, дні культуры, выступленні прафесійных і аматарскіх тэатраў і іншых творчых калектываў, майстар-класы, курсы і семінары-стажыроўкі для беларускіх самадзейных калектываў і іх кіраўнікоў з Польшчы [81, т. 1, арк. 54].

Важную ролю ў пашырэнні культурнай прысутнасці Беларусі ў Польшчы і ў падтрымцы дзейнасці беларускай меншасці ў гэтай краіне адыгрываў створаны ў 2008 г. Культурны цэнтр Беларусі (г. Беласток).

Сярод знакавых мерапрыемстваў 2010 г. па падтрымцы дзейнасці аб'яднанняў беларусаў за мяжой – удзел Міністэрства культуры Беларусі ў правядзенні гала-канцэрта XVII Агульнапольскага фестывалю «Беларуская песня – 2010» у г. Беластоку (Польшча). У якасці падарунка арганізатару мерапрыемства – Беларускаму грамадска-культурнаму таварыству ў Польшчы – былі ўручаны два тэлевізары «Гарызонт». Для пераможцаў агульнапольскага конкурсу «Пазнай Беларусь», арганізатарам якога выступіў Культурны цэнтр Беларусі ў Польшчы, Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь былі выдзелены тэлевізары «Гарызонт» і камплект кніг А. Бутэвіча і У. Ягоўдзіка «На далонях вечнасці». Праз дыпламатычныя прадстаўніцтвы Беларусі ў Польшчы для Музея і цэнтра беларускай культуры ў Гайнаўцы перададзены ў дар камплект гукаўзмацняльнай апаратуры [104, с. 104].

У 2007 г. была пачата рэалізацыя буйнога праекта «Адміністрацыйны рэгіён Беларусі – арганізацыя суайчыннікаў за мяжою». Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей быў арганізаваны конкурс на лепшае су-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працоўніцтва адміністрацыйных рэгіёнаў Беларусі са структурамі дыяспары за мяжой [533].

Значнай падзеяй стаў Пяты з'езд беларусаў свету (2009) і стварэнне *Кансультацыйнай рады кіраўнікоў грамадскіх арганізацый суайчыннікаў, якія пражываюць за мяжою* [188].

Пяты з'ед беларусаў свету прыняў праграму «Беларусы ў свеце» на 2009–2013 гг. У напрамку культурнага супрацоўніцтва яна прадугледжвала пашырэнне выдання кніг, прысвечаных беларускім дыяспарам, гісторыі і культуры Беларусі, аказанне дапамогі беларусам замежжа ў правядзенні культурна-асветных мерапрыемстваў, пашырэнні кантактаў з моладдзю беларускіх дыяспар, садзейнічанне развіццю нацыянальнага турызму праз арганізацыю падарожжаў і адпачынку ў Беларусі беларусаў замежжа і іх дзяцей [659].

У канцы вывучаемага перыяду назіралася актывізацыя намаганняў па супрацоўніцтве з беларусамі замежжа. Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь быў распрацаваны «План мерапрыемстваў па развіццю стратэгічнага партнёрства з беларускай дыяспарай на 2010 г.». Акрамя гэтага, Міністэрства культуры актыўна ўдзельнічала ў здзяйсненні Плана мерапрыемстваў па рэалізацыі ініцыятыў, прапанаваных удзельнікамі V з'езда беларусаў свету, а таксама штогадовага Плана дзейнасці Культурнага цэнтра Беларусі ў Польшчы. У снежні 2010 г. быў створаны Інстытут культуры Беларусі, у структуры якога прадугледжваўся аддзел па пытаннях беларускай дыяспары [104, с. 103].

Знакавай падзеяй у развіцці супрацоўніцтва беларускай дзяржавы з суайчыннікамі за мяжой стала стварэнне пры Міністэрстве культуры Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа. Першае пасяджэнне савета адбылося ў чэрвені 2010 г. У ім прынялі ўдзел кіраўнікі беларускіх аб'яднанняў з Расіі, Малдовы, Украіны, Польшчы, Латвіі, Літвы і Эстоніі, а таксама кіраўнікі Міжнароднага грамадскага аб'яднання «Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына"» і Беларускага таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой «Радзіма» [104, с. 103].

Такім чынам, у вывучаемы перыяд наша краіна здолела наладзіць трывалую сістэму двухбаковага культурнага супрацоўніцтва. Побач з такімі традыцыйнымі мерапрыемствамі, як дні культуры, умацаванню культурых кантактаў спрыяла дзейнасць адукацыйна-культурных цэнтраў, праца сумесных камісій па культурным супрацоўніцтве. Сярод краін-партнёраў найбольш плённа развіваліся культурныя кантакты з Расійскай Федэрацыяй, што тлумачыцца паглыбленнем сувязей у рамках Саюзнай дзяржавы. Пастаянствам вызначалася супрацоўніцтва ў галіне культуры з Літвой, Кітаем, Польшчай.

Важным напрамкам у двухбаковых кантактах стала падтрымка беларускай дыяспары, якая набыла праграмны і змястоўны характар.

Значнай перашкодай на шляху пашырэння двухбаковых культурных сувязей на дзяржаўным узроўні сталі праблемы фінансавага плана. Негатыўную ролю ў развіцці культурных кантактаў Беларусі адыгралі сур'ёзныя палітычныя рознагалоссі з асобнымі краінамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 7.3. Шматбаковае і рэгіянальнае супрацоўніцтва

У вывучаемы перыяд Рэспубліка Беларусь удзельнічала ў рабоце такіх міжнародных міжурадавых арганізацый, як ЮНЕСКА, Савет Еўропы, Цэнтральна-Еўрапейская ініцыятыва, а таксама ва няўрадавых грамадскіх, прафесійных міжнародных арганізацыях: Міжнародным савеце па ахове помнікаў і славутых месцаў (ІКОМАС), Міжнародным савеце музеяў (ІКОМ), Міжнародным савеце арганізатараў фестываляў фальклору (МСАФФ), Міжнародным інстытуце тэатра (МІТ), Міжнародным савеце музыкі (МСМ), Міжнароднай асацыяцыі мастацкіх крытыкаў (МАМК) і інш.

Удзел у шматбаковым супрацоўніцтве дазваляў Рэспубліцы Беларусь падтрымліваць міжнародныя кантакты з большасцю краін Еўропы. Пры гэтым характар міждзяржаўных сувязей Рэспублікі Беларусь вызначаўся ў сукупнасці з дзеючым унутраным заканадаўствам, комплексам спецыяльных міжнародных прынцыпаў і нормаў.

Цэнтральнае месца ў шматбаковым супрацоўніцтве Беларусі з краінамі Цэнтральнай і Заходняй Еўропы займала іх сумесная дзейнасць у ***Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па пытаннях адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКА)***.

У канцы 1991 г. з афіцыйным візітам нашу краіну наведаў па запрашэнні Урада Генеральны дырэктар ЮНЕСКА Ф. Маёр. Вынікам візіту стала падпісанне пратакола-мемарандума аб супрацоўніцтве паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і ЮНЕСКА.

Рэальны ўдзел Беларусі ў сусветнай гуманітарнай і культурнай прасторы звязаны з паўнавартаснай актыўнасцю краіны ў ЮНЕСКА, з'яўляецца тым базісам, на якім з усімі падставамі можна будаваць усебаковае эканамічнае і палітычнае супрацоўніцтва з развітымі краінамі ў рамках шматбаковых адносін.

Акрамя гэтага, выкарыстанне магчымасцей, якія прадстаўляюцца ў рамках Арганізацыі, дазваляла Беларусі ўдзельнічаць у важнейшых міжнародных праграмах у галіне культуры, навукі, адукацыі, выкарыстоўваць каштоўнейшы інтэлектуальны патэнцыял, які накоплены Арганізацыяй, у інтарэсах развіцця краіны, прыцягваць фінансавыя магчымасці Арганізацыі дзеля падтрымкі невытворчай сферы.

Канкрэтнымі пытаннямі ўдзелу Беларусі ў рабоце ЮНЕСКА займалася Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА (створаная ў 1956 г.) і Пастаяннае прадстаўніцтва краіны пры ЮНЕСКА. Самае непасрэднае дачыненне да ўсёй праблематыкі, якая вырашаецца па лініі ЮНЕСКА, мела Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. У сістэме Міністэрства працаваў сакратарыят Нацыянальнай камісіі.

Асноўную работу па ўмацаванні сувязей паміж Сакратарыятам і іншымі органамі ЮНЕСКА, з аднаго боку, і рознымі арганізацыямі і ведамствамі – з другога праводзіла Нацыянальная камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. Камісія прымала актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да чарговых сесій



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Генеральнай канферэнцыі, садзейнічала наладжванню кантактаў паміж культурна-асветнымі ўстановамі Беларусі, каардынавала іх работу па ажыццяўленні важнейшых мерапрыемстваў ЮНЕСКА, інфармавала зацікаўленыя ўстановы і арганізацыі аб дзейнасці ЮНЕСКА, аб разнастайных мерапрыемствах, якія ёй намячаліся. Склад камісіі, які ўключаў прадстаўнікоў асноўных зацікаўленых урадавых ведамстваў, навукова-даследчых і культурна-асветных устаноў і арганізацый, дазваляў у любы час на пасяджэннях і ў рабочым парадку вывучыць і ўдакладніць планы развіцця міжнародных сувязей у галіне культуры, навукі і асветы, якія распрацоўваліся ў асобных установах і арганізацыях, накіроўваць заяўкі на атрыманне грантаў у межах рэалізуемых Арганізацыяй разнастайных праграм удзелу.

Камісія вывучала таксама прапановы, якія былі накіраваны на ўдасканаленне дзейнасці ЮНЕСКА і форм супрацоўніцтва Арганізацыі з работнікамі культуры, асветы і навукі Рэспублікі Беларусь, а таксама зацвярджала планы работы, у адпаведнасці з якімі праводзіліся разнастайныя мерапрыемствы; імкнулася прыцягнуць да праблем ЮНЕСКА шырокую культурна-асветную і навуковую грамадскасць краіны. У рамках камісіі па меры неабходнасці ствараліся камітэты, якія аб'ядноўвалі буйных спецыялістаў разнастайных галін навукі, выдатных дзеячаў адукацыі, літаратуры і мастацтва.

У рамках ЮНЕСКА існавала выдатная магчымасць пашырэння двухбаковага супрацоўніцтва з краінамі праз узаемадзеянне з іх нацыянальнымі камісіямі, што мела вялікае значэнне.

Беларусь з'яўлялася ўдзельніцай усіх канвенцый ЮНЕСКА ў галіне культуры, што давала ёй права браць удзел ва ўсіх мерапрыемствах, якія праводзіліся ў рамках рэалізацыі гэтых канвенцый. Наша краіна прымала ўдзел у мерапрыемствах Арганізацыі, прымеркаваных да 100-годдзя кіно, прадставіла ў Сакратарыят інфармацыю аб архіўных кінаматэрыялах, якія маюць патрэбу ў захаванні. Вядомы беларускі кінарэжысёр В. Тураў быў уключаны ў склад сусветнага журы, аднак па прычынах фінансавага характару не прымаў удзелу ў пасяджэннях журы. З кастрычніка 1992 г. у Беларусі пачаў дзейнічаць Нацыянальны цэнтр Міжнароднага інстытута тэатра ЮНЕСКА [439, спр. 10, арк. 22–23].

Значным дасягненнем беларускага мастацтва з'яўляецца ўзнагароджанне ў 1996 г. дырэктара Беларускага тэатра оперы і балета В. Елізар'ева Міжнароднай прэміяй ЮНЕСКА ў галіне балета «Бенуа дэ ля данс» за пастаноўку балета «Жарсці» («Рагнеда»). У штаб-кватэры ЮНЕСКА адбыўся канцэрт лаўрэатаў прэміі, у якім прынялі ўдзел артысты беларускага балета.

Адной з найбольш маштабных праграм, рэалізуемых ЮНЕСКА ў 1990-х гг., была праграма «ЮНЕСКА – Чарнобыль». У маі 1995 г. у Мінск была накіравана група экспертаў па прафесійна-тэхнічнай адукацыі з Германіі для аказання садзейнічання спецыялістам з Беларусі ў галіне рэстаўрацыі. У сакавіку 1995 г. Беларусь наведала група экспертаў для абмеркавання пытанняў супрацоўніцтва ў межах праекта «Музыка надзеі». У прыватнасці, абмяркоўваліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пытанні стажыроўкі ў музычных установах еўрапейскіх краін маладых музыкантаў з Беларусі. Па запрашэнні Францыі ў 1996 г. 12 студэнтаў з Беларускай акадэміі музыкі стажыраваліся ў гэтай краіне за кошт пазабюджэтных сродкаў праграмы «ЮНЕСКА – Чарнобыль» [674].

На сутыку культуры, адукацыі і інфарматыкі была створана праграма ЮНЕСКА «Памяць свету» – «Memoria mundi». Праграма займалася пытаннямі захавання, папулярызацыі і пераносу на электронныя носьбіты дакументальнай культурнай спадчыны. Нацыянальная бібліятэка Беларусі падрыхтавала матэрыял, у тым ліку і на электронных носьбітах, для ўключэння ў сусветны рэгістр па гэтай праграме. Якасць падрыхтоўкі была высока ацэнена ў Сакратарыяце ЮНЕСКА. Неабходна адзначыць, што членамі Нацыянальнай камісіі было ўтворана нефармальнае аб'яднанне па супрацоўніцтве ў рамках гэтай праграмы – Memoria Albaruthenica. Сама праграма і магчымасці дзеянняў у яе рамках неаднаразова абмяркоўваліся. Наступным этапам павінна была стаць фармалізацыя гэтага аб'яднання і выпрацоўка тактыкі дзеянняў у галіне захавання, рэстаўрацыі, новых форм трансляцыі, падрыхтоўкі спецыялістаў, папулярызацыі дакументальнай культурнай спадчыны. У верасні 1993 г. у Пултуску (Польшча) адбыліся рэгіянальныя кансультацыі па захаванні дакументальнай спадчыны ў краінах Усходняй і Цэнтральнай Еўропы.

Беларусь з'яўлялася актыўнай удзельніцай мерапрыемстваў, праводзімых ААН у рамках дзесяцігоддзя развіцця культуры (1988–1997 гг.). Як краіна-удзельніца яна атрымоўвала разнастайную дапамогу па падрыхтоўцы планаў захавання культурнай спадчыны ў межах праграмы «Развіццё культуры: спадчына і творчасць», правядзенні аднаўленчых работ і развіцці людскіх рэсурсаў, у падрыхтоўцы і павышэнні майстэрства творчых работнікаў, заахвочванні мастацкай адукацыі моладзі. Канкрэтная работа ў гэтым напрамку заключалася ў арганізацыі і правядзенні Міністэрствам культуры сумесна з Нацыянальным навукова-асветным цэнтрам імя Ф. Скарыны і Незалежным цэнтрам «НЕФ» міжнароднага сімпозіума па прававым, эканамічным і сацыяльным аспектам абароны культурнай спадчыны і яе рэстытуцыі (19–20.06.1997 г., г. Мінск).

Па прапанове Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь быў праведзены адбор кандыдатаў на ўдзел у конкурсе стыпендыятаў ЮНЕСКА ў розных галінах культуры і мастацтва. Міністэрствам культуры былі падрыхтаваны для разгляду ў Сакратарыяце ЮНЕСКА праекты па аднаўленні гістарычных і культурных помнікаў, якія адносяцца да нацыянальных дасягненняў Беларусі (сярод іх планы па рэстаўрацыі Нясвіжскага і Мірскага замкаў).

У рамках сусветнай дэкады развіцця культуры ў кастрычніку 1993 г. у Мінску адбыўся першы Міжнародны фестываль монаспектакляў «Я» (другі – у 1996 г.).

Нацыянальная бібліятэка Беларусі сумесна з Навуковым цэнтрам агульнаславянскіх даследаванняў (Масква), Інстытутам славяназнаўства і балканістыкі (Масква), Беластоцкім навуковым таварыствам Польскай акадэміі навук

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і Беларускім фондам культуры з'яўлялася асноўным выканаўцам праграмы «Гісторыя кніжнай культуры Падляшша», якая праводзілася пад эгідай ЮНЕСКА ў рамках славянскага праекта. Праграма прадугледжвала даследаванне пісьмовай, кніжнай культуры Падляшша, якая ўяўляе сабой найбольш канцэнтраванае выражэнне важнейшых рыс духоўнай культуру некалькіх славянскіх і неславянскіх народаў, звязаных з лёсамі гэтага краю, перадусім беларусаў, палякаў, украінцаў, літоўцаў і рускіх.

З атрыманнем незалежнасці Беларусь упершыню змагла самастойна выступіць з прапановамі, якія дазволілі карыстацца сродкамі з рэгулярнага бюджэту арганізацыі. Генеральная канферэнцыя ўхваліла гэтыя прапановы. Іх падтрымалі краіны з усіх геаграфічных рэгіёнаў, што з'явілася сведчаннем цікаўнасці сусветнай супольнасці да праблем, якія паставіла Беларусь. Шмат якія дэлегацыі асобна падкрэслівалі той факт, што прапанаваныя ёй рашэнні адпавядалі патрабаванням не толькі самой Беларусі, але перш за ўсё рэгіёна Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, што асабліва віталася арганізацыяй.

Стала традыцыяй правядзенне ў дні сесій Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА беларускай дэлегацыяй нацыянальных вечарын. У 1991 г. – з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча, у 1993 г. – да 100-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры М. Гарэцкага. У Штаб-кватэры ЮНЕСКА ў 1994 г. прайшлі Дні беларускай культуры, у 1996 г. – выстава «Традыцыйнае мастацтва Палесся» (да 10-годдзя Чарнобыльскай катастрофы).

Аднак на шляху супрацоўніцтва з ЮНЕСКА былі пэўныя перашкоды. Так, да 1994 г. Беларусь не выплачвала рэгулярны ўзнос у Фонд сусветнай спадчыны, таму яна не магла прэтэндаваць на выбранне ў члены камітэта па культурнай спадчыне і атрымаць экспертную і матэрыяльную дапамогу з Фонду і з боку Камітэта [439, спр. 71, арк. 309, 313].

У 1995 г. Беларусь узяла на сябе абавязак вярнуць назапашаную запазычанасць шасцю гадавымі выплатамі, адначасова выплачваючы ўзносы ў рэгулярны бюджэт ЮНЕСКА, і як удзельніца Канвенцыі па ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны – у Фонд культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Да 29-й сесіі Генеральнай канферэнцыі былі праведзены адпаведныя выплаты па запазычанасці за 1996 і 1997 гг. і выплачана асноўная частка сумы ўзносаў. Такім чынам, пытанне аб пазбаўленні нашай краіны права голасу на 29-й сесіі Генеральнай канферэнцыі не ўздымалася.

Як адзначалася на пасяджэнні Камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА 5 лютага 1996 г., «Рэспубліка Беларусь, з'яўляючыся адным з найбольш значных плацельшчыкаў і выплачваючы поўнасцю свой узнос, магла б разлічваць на атрыманне ад арганізацыі сродкаў, значна пераўзыходзячых суму яе ўзносу. Набыты за чатыры гады вопыт самастойнага, па-за рамкамі СССР, удзелу ў арганізацыі і напрацаваны рэспублікай за гэты час аўтарытэт дазваляюць гаварыць аб гэтым з дадатковай доляй ўпэўненасці... Беларусь заявіла аб сабе як краіне з высокім інтэлектуальным патэнцыялам, з багатымі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнымі традыцыямі і культурай, здольнай працаваць з сусветным супольніцтвам на роўных і прапанаваць яму многія са сваіх дасягненняў» [674].

6–8 верасня 1998 г. нашу краіну наведаў Генеральны дырэктар ЮНЕСКА Ф. Маёр. У ходзе сустрэчы быў падпісаны Мемарандум аб супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь з ЮНЕСКА. Гэта дазволіла значна актывізаваць кантакты. У лютым 1999 г. быў створаны Нацыянальны камітэт ІКОМ (Міжнароднай рады музеяў). Нацыянальная камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА на сваім пасяджэнні ў лютым 1999 г. прыняла рашэнне аб распрацоўцы Міністэрствам культуры і яго Камітэтам па ахове гісторыка-культурнай спадчыны дакументацыі па ўключэнні аднаго з архітэктурных помнікаў у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА [439, спр. 289, арк. 24–25].

У вывучаемы перыяд Рэспубліка Беларусь прымала значныя намаганні па ўключэнні ў Спіс сусветнай спадчыны аб'ектаў, якія знаходзяцца на яе тэрыторыі. У 2000 г. спіс папоўніўся Замкавым комплексам у Міры. Наведванне ў 2003–2005 гг. нашай краіны экспертамі ЮНЕСКА дазволіла падрыхтаваць і прадставіць ў Цэнтр сусветнай спадчыны матэрыялы папярэдняга спісу, у які ўвайшло дзесяць матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. У 2005 г. Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА папоўніўся архітэктурна-культурным комплексам роду Радзівілаў у Нясвіжы і геадэзічнай дугой Струвэ.

Аб плённасці кантактаў з гэтай міжнароднай арганізацыяй сведчаць рэгулярныя візіты ў нашу краіну генеральных дырэктараў ЮНЕСКА. Як ужо згадвалася раней, у 1990-х гг. нашу краіну двойчы наведваў Ф. Маёр. А ў 2002 г. адбыўся візіт у Беларусь Генеральнага дырэктара ЮНЕСКА К. Мацууры.

У 2002 г. Міністр культуры нашай краіны прыняў удзел у пасяджэнні III круглага стала міністраў культуры дзяржаў – членаў ЮНЕСКА па праблемах нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў г. Стамбуле (Турцыя). У 2008 г. – у рабоце канферэнцыі ў г. Баку (Азербайджан) міністраў культуры дзяржаў – членаў Еўрапейскай культурнай канвенцыі. У рамках канферэнцыі адбыўся круглы стол на тэму «Агульная аснова для міжкультурнага дыялогу», а таксама дыскусія на тэму «Праграмы культурнай палітыкі і ініцыятывы і міжкультурны дыялог: новыя канцэпцыі ў кіраванні культурнай разнастайнасцю» і «Спадчына і міжкультурны дыялог – ад нацыянальнай да агульнай спадчыны» [105, с. 135].

У красавіку 2007 г. у Мінску прайшла Міжнародная канферэнцыя «Канвенцыі ЮНЕСКА ў галіне аховы культурнай спадчыны і нацыянальнае заканадаўства дзяржаў – удзельніц СНД». На ёй былі разгледжаны праблемы гарманізацыі нацыянальнага заканадаўства ў вызначаным напрамку з фундаментальнымі прынцыпамі міжнароднага права і нарматыўнымі інструментамі ЮНЕСКА, выпрацаванымі для абароны культурных каштоўнасцей.

Пачынаючы з 16 верасня 1992 г., Рэспубліка Беларусь мела статус «спецыяльна запрошанай» дзяржавы ў рамках дзейнасці Парламенцкай Асамблеі ***Савета Еўропы***. Дэлегацыя Вярхоўнага Савета Беларусі чатыры разы ў год прымала ўдзел у рабоце ПАСЕ. 12 сакавіка 1993 г. Рэспубліка Беларусь падала



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заяўку на ўступленне ў Савет Еўропы. У студзені 1997 г. Бюро ПАСЕ прыняло рашэнне аб прыпыненні статусу «спецыяльна запрошанага» ў адносінах да Парламента Беларусі. У выніку быў таксама спынены разгляд заяўкі Рэспублікі Беларусь на ўступленне ў Савет Еўропы і замарожана двухбаковая праграма супрацоўніцтва.

У такой сітуацыі ўзаемадзеянне з Саветам Еўропы працягвала развівацца ў рамках шэрагу канвенцый, да якіх далучылася наша краіна. У першую чаргу – Еўрапейскай культурнай канвенцыі. Далучэнне Рэспублікі Беларусь да яе ў кастрычніку 1993 г. дазволіла атрымаць доступ да праграм еўрапейскага супрацоўніцтва ў галіне культуры, адукацыі, спорту, СМІ і інш. Савет Еўропы выдзяляў сродкі на стажыроўкі, кансультацыі, правядзенне міжнародных семінараў, канферэнцый і г. д. За няпоўныя 5 гадоў (09.1992 г. – 12.1996 г.) больш за 300 прадстаўнікоў разнастайных галін улады Беларусі (сярод іх і прадстаўнікі ўстаноў культуры) прымалі ўдзел у канферэнцыях, семінарах, стажыроўках, арганізаваных у рамках Савета Еўропы [215, с. 167–168].

Савет Еўропы наладжваў і фінансаваў аналагічныя мерапрыемствы і ў Беларусі. Сярод іх – міжнародны семінар «Культурная палітыка і еўрапейскае культурнае супрацоўніцтва» (11–14 кастрычніка 1994 г., г. Мінск), Міжнародны семінар ІКАМОС па праблематыцы аховы паркаў і ландшафтаў (05.06.1995 г., г. Нясвіж), міжнародны семінар «Трансрэгіянальныя і інтэрнацынальныя аспекты культурнай палітыкі» (10–11.1996 г., г. Мінск).

Найбольшую цікаўнасць выклікаў міжнародны семінар-прадстаўленне праграмы «Культурныя шляхі праз Беларусь» з удзелам кіраўніка праграмы Савета Еўропы Д. Ранконі (09.1995 г., г. Полацк), арганізаваны Міністэрствам культуры і друку Рэспублікі Беларусь, Саветам культурных ініцыятыў і Полацкім гарвыканкамам.

З Саветам Еўропы ў справе ўдасканалення заканадаўчай базы Беларусі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны плённа супрацоўнічала Дзяржаўная інспекцыя Рэспублікі Беларусь па ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

У 1999 г. пад старшынствам міністра культуры быў створаны Кіруючы камітэт па супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Саветам Еўропы ў галіне культурнай спадчыны. На першым пасяджэнні камітэта ў ліпені 1999 г. быў разгледжаны план мерапрыемстваў па правядзенні ў нашай краіне кампаніі «Еўропа – агульная спадчына». Было вырашана далучыцца да трансгранічных праектаў Савета Еўропы «Асноўныя рэлігійныя месцы», «Міжнародны відэаконкурс», праектаў «Еўрапейская асацыяцыя гістарычных гарадоў», «Міжнародны фотаконкурс», «Панарама еўрапейскай музычнай спадчыны», «Кіно і еўрапейская спадчына», «Сталіцы, што чакаюць свайго адкрыцця» [439, спр. 293, арк. 194–195].

Па запрашэнні кіраўніцтва Дэпартамента культуры і культурнай спадчыны Савета Еўропы прадстаўнікі Міністэрства культуры ў 2002 г. удзельнічалі ў цырымоніі адкрыцця Еўрапейскіх дзён спадчыны ў гарадах Боне і Эсэне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(Германія), у сустрэчы груп каардынатараў Еўрапейскіх дзён спадчыны ў г. Страсбургу (Францыя) [106, с. 35].

З чэрвеня 1994 г. Рэспубліка Беларусь з'яўлялася асацыяваным, а з чэрвеня 1996 г. – паўнапраўным членам рэгіянальнага аб'яднання ***Цэнтральна-Еўрапейская Ініцыятыва (ЦЕІ)***, створанага ў 1989 г. краінамі дунайска-адрыятычнага субрэгіёна з мэтай пашырэння эканамічнага, культурнага і палітычнага супрацоўніцтва дзяржаў Цэнтральна-Еўрапейскага рэгіёна. У 1996 г. у склад ЦЕІ ўваходзіла 15 дзяржаў. Ніякіх уступных ці членскіх узносаў ад дзяржаў не патрабавалася. Кожная краіна несла выдаткі толькі ў тых галінах супрацоўніцтва і па тых канкрэтных праектах, у якіх яна была зацікаўлена.

У рамках ЦЕІ на канец 1996 г. дзейнічала 16 рабочых груп па больш за 120 праектам. Сярод іх – група па культуры (краіна-старшыня – Славакія).

Неабходна адзначыць, што за час свайго ўдзелу ў рабоце Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятывы Рэспубліка Беларусь не выступіла з праектам якога-небудзь мерапрыемства ў разнастайных галінах супрацоўніцтва. Хаця не выклікае сумнення, што актывізацыя ўдзелу ў рабоце гэтай арганізацыі дазволіла б наладзіць больш гібкую і прагматычную рэгіянальную кааперацыю ў правядзенні дадатковага моста з ЕС пры садзейнічанні такіх краін-удзельніц, як Італія і Аўстрыя. Не трэба забывацца і пра тое, што гэта рэгіянальнае аб'яднанне з сярэдзіны 1990-х гг. ставіла сваёй асноўнай задачай садзейнічанне тым дзяржавам-членам, якія жадаюць уступіць у Еўрапейскі Саюз.

У вывучаемы перыяд плённа развівалася культурнае супрацоўніцтва ў рамках ***Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)***. Базавым дакументам міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў галіне культуры з'яўлялася Пагадненне аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, падпісанае 15 мая 1992 г. главамі ўрадаў дзяржаў – членаў СНД. У 1995 г. быў створаны Савет па культурным супрацоўніцтве дзяржаў – членаў СНД. У мэтах актывізацыі работы Савета рашэннем XVIII пасяджэння ў 2003 г. быў павышаны статус прадстаўніцтва ў ім да ўзроўню міністраў культуры. Адметнымі падзеямі ў рамках супрацоўніцтва сталі два кангрэса дзеячаў культуры і мастацтва дзяржаў – членаў Садружнасці ў 1996 і 2004 гг. Пленарнае пасяджэнне Другога Кангрэса прайшло на базе Мірскага замка, а практычная частка – у г. Гродна ў рамках V Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур [109, с. 27].

З мэтай уніфікацыі розных відаў культурнай дзейнасці Міжпарламенцкая Асамблея СНД прыняла мадэльныя законы «Аб ахове археалагічнай спадчыны» (1996), Мадэльны бібліятэчны кодэкс для дзяржаў – удзельніц СНД (1996), «Аб музейным фондзе і музеях» (1996), «Аб мецэнацтве і дабрачыннай дзейнасці» (1997), «Аб народных мастацкіх промыслах» (1999), «Аб тэатры і тэатральнай дзейнасці» (2001), «Аб клубным адпачынку» (2003), «Аб культуры» (2004) і інш.

У мэтах развіцця культурных сувязей Беларусь удзельнічала ў працы шасці рабочых груп Савета па культурным супрацоўніцтве: па пытаннях народнай мастацкай творчасці, па развіцці Дэльфійскага руху, распрацоўцы ком-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

плексу мерапрыемстваў па рэалізацыі шматбаковых пагадненняў аб культурным супрацоўніцтве, вывучэнні і параўнальным аналізе заканадаўчага забеспячэння культуры краін-членаў, па культурнай палітыцы, навукова-метадычным супрацоўніцтве ў галіне мастацкай творчасці.

Савет па культурным супрацоўніцтве ініцыяваў прыняцце шэрага дакументаў: пагадненняў аб стварэнні сістэмы міжбібліятэчнага абанемента краін – удзельніц СНД (1999), аб вывазе і ўвозе культурных каштоўнасцей (2001), аб сумеснай фільмавытворчасці (2008) і інш.

У сакавіку 2006 г. Беларусь падпісала Пагадненне аб гуманітарным супрацоўніцтве дзяржаў – членаў СНД і выступіла сузаснавальніцай Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва. Дзейнасць фонду ажыццяўлялася на падставе Рамачнай стратэгіі да 2013 г.

Адметным стала правядзенне ў Мінску ў кастрычніку 2008 г. маладзёжных Дэльфійскіх гульняў, удзел у якіх прынялі музыканты, спевакі, танцоры, артысты цырку, мастакі, фатографы, дызайнеры, дыджэі.

Як найбольш перспектыўная форма супрацоўніцтва ў рамках СНД з'яўляліся сумесныя мерапрыемствы. Сярод іх такія праводзімыя на Беларусі, як кінафестываль «Лістапад» (Мінск), музычны фестываль «Залаты шлягер» (Магілёў).

У 2006 г. міністр культуры прыняў удзел у рабоце XX і XXI пасяджэнняў Савета па культурным супрацоўніцтве краін – удзельніц СНГ.

На XXI пасяджэні вострую дыскусію выклікала пытанне аб навукова-метадычным супрацоўніцтве ў галіне мастацкай адукацыі ў рамках СНД. Міністр культуры Беларусі праінфармаваў членаў Савета аб сістэме бесперапыннай мастацкай адукацыі ў нашай краіне і ўнёс канкрэтныя прапановы па праблемах навукова-метадычнага супрацоўніцтва ў галіне мастацкай адукацыі ў рамках СНД. У прыватнасці, былі ўнесены прапановы аб стварэнні міждзяржаўнай рабочай групы па ўзаемадзеянні ў галіне мастацкай адукацыі, аб распрацоўцы міждзяржаўных праграм развіцця сістэмы мастацкай адукацыі ў дзяржавах СНД, аб вызначэнні каардынуючых цэнтраў па рэалізацыі дадзенай праграмы, аб стварэнні адзінай інфармацыйнай сістэмы па пытаннях мастацкай адукацыі у дзяржавах СНД [111, с. 163–164].

На працягу 2006 г. прадстаўнікі Міністэрства культуры Беларусі прымалі непасрэдны ўдзел у пасяджэнні рабочай групы па культурнай палітыцы дзяржаў – удзельніц СНД і рабочай групы па вывучэнні і параўнальным аналізе заканадаўчага забеспячэння культуры дзяржаў – удзельніц СНД [111, с. 164].

У лістападзе 2007 г. дэлегацыя Рэспублікі Беларусь прыняла ўдзел у рабоце Другога форуму творчай і навуковай інтэлігенцыі дзяржаў–удзельніц СНД у г. Астана (Казахстан).

Прадстаўнікі Беларусі прымалі ўдзел у сумесных мерапрыемствах СНД: Першым міжнародным фестывалі нацыянальных мастацтваў дзяржаў – удзельніц СНД (2002 г., г. Масква), навукова-практычнай канферэнцыі «Міжкультурны дыялог на постсавецкай прасторы ў кантэксце глабалізацыі» (2003 г.,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

г. Кіеў), Рэгіянальнай канферэнцыі дзяржаў – удзельніц СНД «Культурная палітыка – палітыка для культуры: новы профіль палітыкі ў сферы культуры» (2009 г., г. Ерэван), Адкрытым кінафестывалі краін СНД, Латвіі, Літвы і Эстоніі «Кінашок» (г. Анапа), Форуме нацыянальных кінематаграфістаў краін СНД і Балтыі (г. Масква), Бакінскім міжнародным кінафестывалі «Усход – Захад» і інш.

Аднак нельга гаварыць аб тым, што культурнае супрацоўніцтва ў рамках СНД развівалася без перашкод. Значнай праблемай, якую нарадзіў развал СССР, было вяртанне культурных каштоўнасцей. Першым крокам на шляху яе вырашэння стала падпісанне 14 лютага 1992 г. краінамі – удзельніцамі СНД пагаднення аб вяртанні культурных і гістарычных каштоўнасцей дзяржавам іх паходжання [485]. Яно было накіравана на пошук і вызначэнне канкрэтных катэгорый культурных каштоўнасцей, якія належалі адной дзяржаве і знаходзіліся ў другой дзяржаве Садружнасці, для далейшага вяртання ў краіну паходжання. На жаль, праз некалькі дзён пасля падпісання – 19 лютага – пастановай Вярхоўнага Савета Расійскай Федэрацыі яно было прыпынена на тэрыторыі гэтай краіны. А ў 1995 г. – дэнансавана як неадпавядаючае заканадаўству Расіі [799, с. 158].

Дэкларатыўнымі заставаліся таксама палажэнні аб рэстытуцыі артыкула 3 Пагаднення аб супрацоўніцтве краін – удзельніц СНД у галіне культуры ад 15 мая 1992 г. У прыватнасці, так і не была створана Міждзяржаўная экспертная камісія СНД для разгляду пытанняў і падрыхтоўкі рэкамендацый па рэстытуцыі культурна-мастацкіх каштоўнасцей.

У вывучаемы перыяд адбылося станаўленне і актывізацыя ***рэгіянальнага супрацоўніцтва***. У 1995 г. кіраўніцтва Гродзенскага аблвыканкама заключыла пагадненне аб развіцці прыгранічных гаспадарчых і культурных сувязей з уладамі Сувалкаўскага (люты 1995 г.) і Беластоцкага (сакавік 1996 г.) ваяводстваў. У сакавіку 1996 г. было падпісана Пагадненне паміж упраўленнем культуры Гродзенскага аблвыканкама і аддзелам культуры, спорту і турызму ваяводскай управы ў Беластоку аб культурным супрацоўніцтве на 1996–1998 гг. У 1997 г. былі заключаны дагаворы аб партнёрскіх і сяброўскіх адносінах паміж Брэсцкай вобласцю і Бельска-Падляскім ваяводствам.

У 1990-х гг. разгарнуўся рух гарадоў-пабрацімаў. Для каардынацыі працы ў 1993 г. была створана Беларуская асацыяцыя пародненых гарадоў. 13–15 мая 2002 г. у Брэсце адбылася першая сустрэча гарадоў – партнёраў Беларусі і Польшчы. Падчас яе 21 беларускі горад падпісаў пагадненне аб пабрацімстве з 26 гарадамі Польшчы. На канец 2004 г. 32 беларускія гарады ўсталявалі партнёрскія адносіны з 37 польскімі гарадамі [212, с. 567–568].

Пашырэнне магчымасцей адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у сферы міжнароднага супрацоўніцтва былі заканадаўча замацаваны ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» (люты 1991 г.). У новай рэдакцыі закона ад 10 студзеня 2000 г. было зафіксавана права органаў улады ўдзельнічаць ў стварэнні сумесных з замежнымі партнёрамі навуковых, куль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турных, турыстычных, фізкультурна-аздараўленчых, рэабілітацыйных цэнтраў, іншых арганізацый [471].

У вывучаемы перыяд Віцебская вобласць цесна супрацоўнічала са Смаленскай і Пскоўскай абласцямі Расіі, з рэгіёнамі Латвіі, Літвы, Брэсцкая вобласць – з Чарнігаўскай вобласцю Украіны, з упраўленнем культуры Заходняй адміністрацыйнай акругі г. Масквы. Трывалымі былі культурныя кантакты паміж установамі культуры Гродзенскай і Брэсцкай абласцей і Беларускім грамадска-культурным таварыствам у Польшчы. У 2009 г. была падпісана дамова аб супрацоўніцтве паміж гарадамі Гродна і Беласток, пагадненне аб супрацоўніцтве паміж упраўленнямі адукацыі Гродзенскага аблвыканкама і куратарыяй адукацыі ў г. Беластоку на 2009–2011 гг.

Новыя магчымасці культурнага супрацоўніцтва прадставіліся з стварэннем еўрарэгіёнаў. Браслаўскі, Верхнядзвінскі, Міёрскі, Пастаўскі і Глыбоцкі раёны актыўна развівалі культурнае супрацоўніцтва з памежнымі раёнамі Літвы і Латвіі ў рамках еўрарэгіёна «Азёрны край» (створаны ў 1999 г.). Асноўнымі культурнымі праектамі, якія рэалізоўваліся ў рамках еўрарэгіёна, былі менеджмент і маркетынг сельскага турызму і штогадовы фестываль народнай творчасці «Дзвіна–Даўгава–Двіна».

Трансгранічны экалагічны і культурны турызм з'яўляўся адным з напрамкаў дзейнасці еўрарэгіёнаў «Буг» (створаны ў 1995 г., з беларускага боку ўваходзіла Брэсцкая вобласць), «Нёман» (1997 г., Гродзенская вобласць) і «Белавежская пушча (2002 г., Камянецкі, Пружанскі, Свіслацкі раёны).

Штогадовай у канцы 2000-х гг. стала праводзімая ў г. Гродна шматгаліновая выстава-кірмаш «Еўрарэгіён "Нёман"». У межах праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Невядомая Еўропа – развіццё турыстычнай інфраструктуры польска-беларускага памежжа ў раёне Аўгустоўскага канала і ракі Нёман» было распрацавана 11 турыстычных маршрутаў з наступнай іх маркіроўкай у 2010 г., а ў г. Гродна пачаў працаваць турысцка-інфармацыйны цэнтр.

Супрацоўніцтва Беларусі і рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі было закладзена ў 1998 г., калі Савет Міністраў прыняў спецыяльную пастанову аб пашырэнні культурных сувязей з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі [439, спр. 228, арк. 210–211]. Яно грунтавалася на міжурадавым Пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне культуры, адукацыі і навукі, заключаным 21 лютага 1995 г. Культурнае супрацоўніцтва ў 1999–2000 гг. адбывалася ў рамках выканання міжведамаснай Рабочай праграмы аб сумеснай дзейнасці ў галіне кінематаграфіі і відэамастацтва.

Толькі на працягу 1997–1998 гг. Міністэрствам культуры былі ўсталяваны кантакты з Новасібірскай, Яраслаўскай, Пскоўскай, Арэнбургскай, Мурманскай, Разанскай, Ліпецкай абласцямі, з Краснадарскім, Прыморскім і Стаўрапольскім краямі, Рэспублікай Комі [439, спр. 287, арк. 67–68].

У 2006 г. пад лозунгам «Крокі насустрач» ва ўсіх абласцях Беларусі, за выключэннем Віцебскай, прайшлі Дні культуры Стаўрапольскага і Краснадарскага краёў, Калінінградскай, Яраслаўскай, Новасібірскай і Свярдлоўскай абласцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыкладам міжрэгіянальнага супрацоўніцтва з’яўляецца развіццё сувязей паміж Мінскам, Гродна, Магілёвам і Масквой у тэатральнай сферы. У 2006 г. у Маскве прайшлі гастролі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага, Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Гродзенскага абласнога тэатра лялек, творчых калектываў Магілёўскай вобласці. У Беларусі – гастролі МХАТ імя Горкага, Цэнтральнага тэатра Расійскай Арміі, Маскоўскага тэатра імя Ярмолавай.

Такім чынам, у вывучаемы перыяд незалежная Рэспубліка Беларусь змагла не толькі захаваць, але і пашырыць міжнароднае супрацоўніцтва праз міжурадавыя ўстановы, дзейнасць якіх закранае сферу культуры.

Былі закладзены асновы «беларускай школы» супрацоўніцтва з ЮНЕСКА. Беларусь атрымала магчымасць самастойна ўдзельнічаць у важнейшых міжнародных праграмах Арганізацыі, наладжваць у яе рамках двухбаковае супрацоўніцтва з краінамі свету, у першую чаргу Цэнтральнай і Заходняй Еўропы.

Адначасова на шляху супрацоўніцтва з ЮНЕСКА былі пэўныя перашкоды. Больш разнастайнаму ўдзелу ў рабоце камітэтаў Арганізацыі, выкарыстанню дапамогі з яе фондаў перашкаджала запазычанасць па рэгулярным узносам з боку нашай краіны. Свой адбітак на характар адносін з ЮНЕСКА наклала адсутнасць належнай забяспечанасці нашай дэлегацыі на сесіях Генеральнай Асамблеі ўказаннямі і рэкамендацыямі Міністэрства замежных спраў.

Культурнае супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з такой рэгіянальнай арганізацыяй, як Савет Еўропы, у вывучаемы перыяд адбывалася ў рамках шэрага канвенцый, да якіх далучылася наша краіна. У першую чаргу – Еўрапейскай культурнай канвенцыі. Неабходна адзначыць праяўленую зацікаўленасць з боку Савета Еўропы да нашай краіны праз наладжванне фінансавання ўдзелу прадстаўнікоў Беларусі ў праграмах еўрапейскага супольніцтва, правядзення семінараў, прысвечаных культурнай тэматыцы, на тэрыторыі нашай краіны [338].

Пэўную кампенсацыю парушаным культурным сувязям, існаваўшым у рамках СССР, прынесла супрацоўніцтва ў рамках СНД.

На жаль, Беларусь не здолела выкарыстаць магчымасці ўдзелу ў Цэнтральна-Еўрапейскай ініцыятыве для ўмацавання культурных сувязей.

З сярэдзіны 1990-х гг. пачаўся працэс наладжвання трансгранічнага супрацоўніцтва. Значную трываласць яму надалі як заключаныя пагадненні паміж органамі ўлады, так і стварэнне еўрарэгіёнаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

У нарматыўнай прававой базе Рэспублікі Беларусь у вывучаемы перыяд не існавала вызначэння «культурная палітыка». Асновы ўзаемаадносін і кампетэнцыі суб'ектаў культурнай дзейнасці былі закладзены раздзелам III «Грамадзянін, дзяржава і культура» Закона «Аб культуры», прынятым 4 чэрвеня 1991 г. У новай рэдакцыі закона (2004 г.) прысутнічала вызначэнне «дзяржаўная палітыка ў галіне культуры», якое давалася праз апісанне існуючай сістэмы механізмаў і сродкаў практычнай іх рэалізацыі.

Адносіны органаў заканадаўчай і выканаўчай улады і сектара культуры на працягу вывучаемага перыяду перажылі некалькі этапаў. У пачатку 1990-х гг. яны будаваліся ў рамках ліберальнай мадэлі, для якой уласціва свабоднае развіццё канкурэнцыі і стварэнне ўмоў для развіцця дзяржаўнага і прыватнага сектараў. У канцы 1990-х гг. роля дяржавы ў рэгуляванні развіцця працэсаў, якія адбывалі ў сферы культуры, стала больш заўважнай. Адбылася паступовая трансфармацыя мадэлі ў бок сацыял-дэмакратычнай з уласцівым ёй абмежаваным рэгуляваннем эканамічных працэсаў, сацыяльнай арыентаванасцю эканомікі і стварэннем магутнага дзяржаўнага сектара. Улады адкрыта сталі выказвацца аб прыярэтэце дзяржаўнага сектара перад прыватным, ствараць няроўныя ўмовы існавання (падатковыя льготы, зніжэнне арэнднай платы і да т. п. для дзяржаўнага сектара).

У канцы вывучаемага перыяду ў сістэме адносін ўлады і сферы культуры ўсё болей сталі прасочвацца тэндэнцыі да дзяржаўнага патэрналізму. Улады заявілі аб рэсурснай залежнасці інтэлігенцыі ад дзяржавы, аб увязанні дзяржаўнай падтрымкі з выніковасцю працы творцаў. Асаблівая ўвага пры гэтым стала звяртацца на ідэалагічны складнік у творчасці.

Асноўныя мэты дзяржавы ў галіне культуры ў вывучаемы перыяд былі накіраваны на рэалізацыю правоў грамадзян у галіне культуры, забеспячэнне ідэалагічнай і палітычнай незалежнасці культуры, свабоду творчасці, фінансавую і матэрыяльную падтрымку культуры і сацыяльную абарону яе работнікаў, фарміраванне эстэтычнага жыццёвага асяроддзя. Пры гэтым асноўныя прыярытэтныя напрамкі рэалізацыі дадзеных мэт на ўсім працягу даследуемага перыяду не змяніліся. Дзеянні дзяржавы і грамадскіх аб'яднанняў былі накіраваны на ахову спадчыны, мовы, народнай творчасці; стварэнне і папулярызацыю твораў мастацтва і літаратуры для дзяцей; стварэнне ўмоў для эстэтычнай адукацыі і выхавання дзяцей і моладзі; папулярызацыю класічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і лепшых сучасных твораў мастацкай літаратуры і мастацтва; забеспячэнне развіцця культуры ў сельскай мясцовасці.

Разгляд праблемы дзяржаўнага рэгулявання культурнай сферы значна звужае паняцце «культура». Яна прадстаўляецца як асобная сфера са сваім наборам інстытуцый і асобных частак. Асноўнымі вектарамі культурнай палітыкі пры гэтым з'яўляліся: гісторыка-культурная спадчына, распаўсюджанне культурнага прадукту, стварэнне інфраструктуры, непасрэдна сфера творчасці, даследчая дзейнасць, падрыхтоўка кадраў, адукацыя. А асноўнымі механізмамі здзяйснення – палітыка-прававы, адміністрацыйны, эканамічны і кадравы.

Адным з галоўных механізмаў рэгулявання ўзаемаадносін дзяржавы і сферы культурнай дзейнасці з'яўляўся *палітыка-прававы*. З набыццём незалежнасці адбылася значная актывізацыя законатворчай дзейнасці. Працэсы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ва ўмовах трансфармацыйных працэсаў патрабавалі стварэння адпаведнай нарматыўнай прававой базы. Палажэнні прынятага ў 1991 г. Закона аб культуры патрабавалі далейшага развіцця заканадаўства. Праблема актуалізавалася з прыняццем Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

У фарміраванні заканадаўчай базы культурнай дзейнасці выдзяляюцца два этапы. Мяжой з'яўляецца прыняцце новага Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь у 1998 г., палажэнні якога патрабавалі ўнясення змен ва ўжо распрацаваныя і дзейнічаючыя нарматыўныя прававыя акты. Усе асноўныя галіны культурнай дзейнасці (ахова гісторыка-культурнай спадчыны, музеі, архівы, бібліятэкі, народнае мастацтва і промыслы, кінавытворчасць) атрымалі заканадаўчае забеспячэнне. Асобны закон рэгуляваў адносіны дзяржавы і творчых работнікаў і творчых саюзаў, культурныя і іншыя правы нацыянальных меншасцей, аўтарскія і сумежныя правы. У мэтах рэалізацыі права грамадзян на ўдзел у культурным жыцці заканадаўча былі замацаваны дзяржаўныя мінімальныя стандарты ў галіне культуры.

У той жа час адсутнасць заканадаўства аб дабрачыннасці і спонсарстве не дазволіла развіцца гэтай дзейнасці ў культуры.

Рэалізацыя на практыцы палажэнняў заканадаўства адбывалася шляхам распрацоўкі праграм па здзяйсненні асноўных прыярэтных напрамкаў культурнай дзейнасці. Калі ў перыяд 1991–2000 гг. існавалі толькі праграмы па развіцці яе асобных сфер, то з пачаткам новага стагоддзя была прынята першая галіновая праграма, разлічаная на пяць гадоў. У далейшым праграмна-мэтавы падыход стаў асноўным у вызначэнні перспектыў развіцця культурнай сферы.

Новыя сацыяльна-эканамічныя рэаліі аказалі значнае ўздзеянне на трасфармацыю *фінансавага механізма* здзяйснення культурнай палітыкі. Жорсткія ўмовы крызісу прывялі да істотнага скарачэння сацыяльна-творчага заказу, магчымасцей дзяржаўнай падтрымкі культурных ініцыятыў. Адным са шляхоў выхаду з крызісу бачылася скарачэнне і аптымізацыі сеткі ўстаноў культуры, перадача аб'ектаў з рэспубліканскай у камунальную ўласнасць. Найбольш істотнае скарачэнне адбылося ў перыяд 1991–1995 гг. У 1992 г. дзяржава ада-

брала ў творчых саюзаў ільготу па падатку на дабаўленую вартасць і вызваленне ад падатку на прыбытак.

Дзяржава так і не здолела забяспечыць заканадаўча ўстаноўлены нарматыў па фінансаванні культуры ў памеры 3 % ад аб'ёму дзяржаўнага бюджэту. У 2004 г. гэты нарматыў быў перагледжаны. Было вызначана, што да 2009 г. дзяржаўнае фінансаванне культуры павінна дасягнуць 1 % ад аб'ёму валавага ўнутранага прадукту, што таксама не было выканана.

Значныя змены адбыліся і ў структуры бюджэтных выдаткаў. Асноўнай крыніцай фінансавання дзяржаўных устаноў культуры сталі мясцовыя бюджэты, на якія прыходзілася звыш трох чацвёртых ад агульнага аб'ёму фінансавання.

Новыя ўмовы патрабавалі ад устаноў культуры пошуку дадатковых крыніц фінансавання. У краіне не атрымалі развіцця прадугледжаныя Законам аб культуры ў рэдакцыі 1991 г. добраахвотныя фонды развіцця культуры. Меркавалася, што крыніцамі іх папаўнення стане правядзенне латарэй, аўкцыёнаў, выстаў, выпуск каштоўных папер, прыватныя ахвяраванні. Змена прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, умацаванне ролі дзяржавы ў падтрымцы культуры прывяла да стварэння дзяржаўных фондаў падтрымкі культуры, сістэмы прэмій і грантаў. Побач з гэтым адбывалася паступовае пашырэнне аказання платных паслуг насельніцтву, пазабюджэтнай дзейнасці.

З мэтай прыцягнення дадатковых *пазабюджэтных сродкаў* дзяржаўныя ўстановы культуры, якія фінансаваліся з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, а таксама творчыя саюзы ў 2001 г. былі вызвалены ад уплаты падатку на прыбытак і падатку на дабаўленую вартасць з накіраваннем вызваленых сум на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы і сацыяльнай абароны.

У краіне пашырылася прыватная ініцыятыва, адбылося фарміраванне рынку культуры.

Адным з прыярытэтаў дзяржаўнай культурнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўлялася забеспячэнне рэалізацыі грамадзянамі права на *ўдзел у культурным жыцці*. Дзяржава аказвала садзейнічанне нацыянальна-культурнаму развіццю прадстаўнікоў нятытульных этнасаў, асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, сацыяльна ізаляваных грамадзян. Пры планаванні стварэння дзяржаўных арганізацый культуры ўлічваліся гістарычныя, нацыянальныя і геаграфічныя асаблівасці мясцовасці. У 1995 г. быў створаны Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур (РЦНК), які каардынаваў дзейнасць нацыянальна-культурных аб'яднанняў, аказваў ім інфармацыйную, метадычную, творчую і практычную дапамогу. У краіне сфарміравалася шырокая сетка нацыянальна-куль-турных аб'яднанняў, таварыстваў івалідаў, ветэранаў, жаночых, моладзевых і дзіцячых грамадскіх арганізацый. Быў распрацаваны механізм мэтавага фінансавання нацыянальна-культурнай дзейнасці на рэспубліканскім і мясцовым узроўнях. Вызначаная яшчэ ў першай рэдакцыі Закона аб культуры прыярытэтная ўвага да развіцця культуры ў сельскай мясцовасці атрымала значную падтрымку ў рамках Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вёскі на 2005–2010 гг. Адным са шляхоў садзейнічання развіццю культуры стала ўкараненне інфармацыйных камп'ютарных тэхналогій у рамках Дзяржаўнай праграмы «Электронная Беларусь» (2003–2010).

На жаль, адзінкавымі былі праграмы і праекты, накіраваныя на забеспячэнне культурных запытаў асяродкаў з абмежаваным доступам да культуры – эмігрантаў, бежанцаў, маламаёмасных, інвалідаў, беспрацоўных, хворых, вязняў і г. д. У большасці сваёй гэта было звязана з тым, што вырашэнне праблем дадзеных асяродкаў з'яўлялася адной з асноўных задач не культурнай, а сацыяльнай палітыкі дзяржавы. Культурны аспект праблемы сацыяльнага ўключэння з'яўляўся інтэграванай часткай больш маштабных праграм як цэнтральных, так і рэгіянальных мясцовых органаў улады. Установы культуры краіны актыўна ўдзельнічалі ў выкананні рэспубліканскіх праграм «Дзеці-інваліды», «Дзеці Чарнобыля», «Сацыяльнае забеспячэнне дзяцей і сям'і», «Жанчыны Рэспублікі Беларусь», «Моладзь Беларусі», а таксама праграм па праблемах інваліднасці, пажылых людзей, здаровага ладу жыцця і інш.

Важнай задачай рэалізацыі культурнай палітыкі была *эстэтычная адукацыя і выхаванне.* У краіне сталі ствараецца школы (класы) з эстэтычным ухілам. Шэраг рэспубліканскіх праектаў быў накіраваны на выхаванне дзяцей, падлеткаў, моладзі сродкамі традыцыйнай мастацкай культуры. Пастаянным стаў удзел прадстаўнікоў творчых прафесій у пазакласнай рабоце школ, арганізацыя спецыяльных канцэртных праграм, дэманстрацыя тэатральных пастановак. Станоўчыя вынікі атрымаў праведзены на мяжы стагоддзяў эксперымент па ўкараненні эстэтычнага ўсенавучу вучняў агульнаадукацыйных школ.

Важным сродкам эстэтычнага выхавання з'яўлялася выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное і манументальнае мастацтва. Менавіта праз мастацтва вялося патрыятычнае выхаванне, падкрэслівалася нацыянальная самабытнасць беларускай культуры і гісторыі. Манументальнае мастацтва праз паркавую скульптуру пачало выконваць функцыю ўпрыгожвання населеных пунктаў, ствараць утуль-ную для чалавека жылую прастору. Арыентацыя на эстэтыку, задавальненне мастацкіх густаў спажыўца прывялі да спалучэння сродкаў дэкаратыўна-пры-кладнога мастацтва з набыткамі дызайну, скульптуры, архітэктуры і інш.

Асаблівай увагі заслугоўвала распаўсюджанне «візуальнай» культуры сярод шырокіх колаў насельніцтва. У гэтых мэтах праводзілася праца над стварэннем мастацкіх галерэй, філіялаў музеяў у населеных пунктах рэспублікі. Толькі сетка дзяржаўных музеяў павялічылася ў вывучаемы перыяд больш чым на 30 %. У новых эканамічных умовах адбылося пераасэнсаванне сацыяльнай ролі музеяў. Праз комплексныя праграмы працы з аўдыторыяй, аддзелы і сектары музейнай педагогікі яны сталі адукацыйнымі, культурнымі цэнтрамі вольнага часу. Калі раней аб'ектам асаблівай увагі музейных работнікаў былі толькі дзеці, то тэндэнцыяй пачатку XXI ст. стала стварэнне спецыяльных праграм для падлеткаў, студэнтаў, сталых людзей, інвалідаў.

Паўнавартасная рэалізацыя мэт культурнай палітыкі немагчыма без *кадраў.* Значныя змены адбываліся менавіта ў прафесійнай адукацыі. У краіне захава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лася сістэма пачатковай мастацкай адукацыі. Пры гэтым назіралася тэндэнцыя да перапрафілявання дзіцячых музычных школ у школы мастацтваў, дзе ажыццяўлялася комплекснае эстэтычнае навучанне і выхаванне. Гэта дазволіла істотна павялічыць колькасць навучэнцаў. Характэрнай асаблівасцю пачатку XXI ст. з'явілася адкрыццё ў дзіцячых школах мастацтваў аддзяленняў народнага мастацтва, промыслаў і рамёстваў.

Перамены закранулі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. У канцы 1990-х гг. былі створаны навучальныя ўстановы новага тыпу (каледжы, вучылішчы культуры і мастацтваў), ССНУ перайшлі ў прамое падпарадкаванне Міністэрству культуры. У шэрагу вучылішчаў была распачата падрыхтоўка па новых спецыяльнасцях тэатральнага, цыркавога, мастацкага, харэаграфічнага напрамкаў.

Змянілі свой статус тры вышэйшыя навучальныя ўстановы ў сферы культуры. Значна пашырыўся спектр спецыяльнасцей і спецыялізацый, па якіх вялася падрыхтоўка. У сярэдзіне 1990-х гг. завяршылася структурная перабудова па падрыхтоцы спецыялістаў у галіне харэаграфічнага мастацтва. У краіне пачалі рыхтавацца спецыялісты з вышэйшай адукацыяй па шэрагу новых спецыяльнасцей, у тым ліку для архіўнай галіны. ВНУ пашырылі падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі.

Негатыўная тэндэнцыя да змяншэння колькасці выпускнікоў, якія атрымоўвалі накіраванне на працу, што набыла шырокае распаўсюджанне ў 1990-х гг., стала вырашацца ў 2000-х гг. У 2006 г. накіраванне на працу атрымалі 96 % выпускнікоў ВНУ культуры і мастацтва. Побач з гэтым значнай была цякучасць маладых кадраў. Побач з нізкай заработнай платай на гэта ўплывала дрэннае сацыяльна-бытавое забеспячэнне маладых спецылістаў на месцах.

Разам з гэтым заставаліся не вырашанымі некаторыя праблемы, звязаныя ў першую чаргу з недастатковым забеспячэннем спецыялістамі рэгіёнаў, дэфіцытам кадраў асобных спецыяльнасцей, недастатковым матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем. Увядзенне новых спецыяльнасцей у ВНУ часам ішло наперадзе працэсу ўнясення змен у пералік прафесій рабочых і пасад служачых, што не дазваляла выпускніку атрымаць працу па спецыяльнасці.

З іншага боку, развіццё новых тэхналогій, змена культурных запатрабаванняў, негатыўныя сацыяльна-эканамічныя працэсы прывялі да істотнага змяншэння попыту на некаторыя віды культурных паслуг з боку спажыўцоў культурных добрат, што абумовіла скарачэнне колькасці ўстаноў культуры і змяншэнне патрэбнасці ў спецыялістах пэўных сегментаў культурнай сферы.

У вывучаемы перыяд складаным заставалася пытанне забеспячэння спецыялістамі раёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Нават пры існаваўшым з 1999 г. мэтавым наборы заданні прыёму не выконваліся.

У перыяд, ахоплены даследаваннем, папулярным стала ўяўленне аб партнёрстве ў адносінах *грамадскасці* і дзяржаўных органаў у сферы культуры. На практыцы дэкларуемае дзяржаўна-грамадскае партнёрства ў акрэсленай сферы рэалізоўвалася слаба. У краіне не былі створаны арганізацыйныя схемы і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мадэлі сувязей паміж структурамі дзяржаўнага кіравання, установамі культуры, творчымі аб’яднаннямі і іншымі грамадскімі арганізацыямі. Прадстаўнікі грамадскасці ўдзельнічалі ў разнастайных аркамітэтах па правядзенні конкурсаў, фестываляў і да т. п., камісіях па прысуджэнні прэмій і ўзнагарод, журы культурных мерапрыемстваў, уваходзілі ў шэраг дарадчых і экспертных органаў па пытаннях культуры і мастацтва (Рэспубліканскі грамадскі савет, грамадская назіральная камісія пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, Рэспубліканскі мастацка-экспертны савет па манументальным мастацтве, мастацка-экспертная Рада па ацэнцы якасці канцэртных праграм, Рэспубліканская экспертная камісія па прадухіленні прапаганды парнаграфіі, насілля і жорскасці, Рэпертуарна-рэдакцыйная калегія пры Савеце па мастацтве Міністэрства культуры Беларусі, Кансультатыўны савет па справах беларусаў замежжа і інш.).

Асобную групу стваралі творчыя грамадскія арганізацыі. На працягу даследуемага перыяду іх дзейнасць сутыкалася са шматлікімі праблемамі. Нормы заканадаўства фактычна не рэалізоўваліся на практыцы. Не спрыяла развіццю грамадскіх арганізацый значнае абмежаванне іх вытворча-гаспадарчай дзейнасці.

На фінансавую дапамогу з боку дзяржавы маглі разлічваць толькі дзяржаўна-грамадскія арганізацыі і творчыя саюзы. Апошнія ў 2001 г. былі вызвалены ад выплаты падатку на прыбытак і на дабаўленую вартасць. Пры гэтым дзяржава была зацікаўлена ў развіцці канструктыўнага супрацоўніцтва.

Пашырэнне міжнароднай дзейнасці спрыяла стварэнню ў Беларусі нацыянальных камітэтаў разнастайных міжнародных арганізацый – Міжнароднага савета па ахове гісторыка-культурнай спадчыны (ІКОМАС), міжнароднага савета музеяў (ІКОМ), Міжнароднага савета арганізатараў фестываляў фальклору (МСАФФ), Міжнароднага інстытута тэатра (МІТ), Міжнароднага савета музыкі (МСМ), Міжнароднай асацыяцыі мастацкіх крытыкаў (МАМК) і інш.

Актыўнасцю вызначаліся грамадскія арганізацыі ў такіх прыярытэтных напрамках рэалізацыі культурнай палітыкі, як ахова спадчыны, мовы, народнай творчасці; стварэнне і папулярызацыі твораў мастацтва і літаратуры. Побач з гэтым праведзенае даследаванне не дазваляе гаварыць аб істотнай ролі грамадскіх аб’яднанняў у выпрацоўцы і рэалізацыі культурнай палітыкі.

Развіццё асноўных сфер *прафесійнай культурнай дзейнасці* ў вывучаемы перыяд праходзіла ва ўмовах творчай свабоды, эстэтычных пошукаў, зацікаўленасці нацыянальнай гісторыяй. Значнае ўздзеянне на творчую дзейнасць аказалі новыя сацыяльна-эканамічныя ўмовы, у першую чаргу фарміраванне рынку ў сферы культуры. Рынак патрабаваў ад творцаў не толькі мастацкіх здольнасцей, але і ўмення займацца менеджментам і рэкламай. На першае месца стала пытанне не творчасці, а пошуку грошай. Гэта знайшло ўвасабленне ў пашырэнні спектра літаратурных форм і жанраў, тэматыкі літаратурных твораў. Прыватная ініцыятыва і падтрымка разнастайных недзяржаўных фондаў, якія хутка ўзнікалі і таксама хутка знікалі, падаравалі спажыўцу новыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурныя праекты, садзейнічалі нараджэнню мастацкіх канцэпцый. Лібералізацыя рынку СМІ прывяла да хуткага развіцця канкурэнцыі, з’яўленню прыватнага сектара на рынку, новых радыё- і тэлеканалаў. У аналізуемы перыяд СМІ пачалі актыўна выкарыстоўваць магчымасці сеткі Інтэрнэт, здзяйсняўся пераход вяшчання на лічбавыя тэхналогіі.

У новых сацыяльна-эканамічных умовах дзяржаўнаму тэатру давялося канкурыраваць з прыватным, які стаў месцам для ўкаранення новых падыходаў да арганізацыі і фінансавання новых праектаў. У вывучаемы перыяд сфарміравалася новае пакаленне мастакоў і скульптараў, якія інакш глядзелі на навакольны свет і па-новаму ўвасаблялі яго ў сваіх працах. Сродкамі манументальнага мастацтва вялося патрыятычнае выхаванне, падкрэслівалася нацыянальная самабытнасць беларускай культуры і гісторыі, чаго не хапала ў папярэднія перыяды. Музычнае жыццё Беларусі стала больш адметным, узбагацілася новымі творамі і вярнула да жыцця мноства твораў старажытнай музыкі. Вельмі актыўна развіваўся жанр песні, з’явіліся шматлікія творчыя калектывы, дзейнасць якіх развівалася і развіваецца ў розных стылістычных напрамках: рок, фольк-рок, аўтарская песня і інш.

Нягледзячы на тое, што ў Беларусі не склалася паўнацэннага рынку культуры, тут адбывалася сваё адметнае жыццё, у якім важную ролю адыгрывала дзяржава. Рост ролі дзяржавы ў рэгуляванні развіцця культурных працэсаў назіраўся з канца 1990-х гг. Асабліва яскрава гэта праявілася ў тэатральнай сферы, кінамастацтве, СМІ. У якасці прыярытэту быў абраны стацыянарны дзяржаўны тэатр з пастаяннай трупай, павялічылася дзяржаўнае фінансаванне кінавытворчасці, прадпрымаліся крокі па развіцці нацыянальнай кінадраматургіі. У сферы СМІ роля дзяржавы заключалася ў забеспячэнні роўнасці ўсіх суб’ектаў у распаўсюджанні і атрыманні масавай інфармацыі, недапушчэнні манапалізацыі СМІ, падтрымцы сацыяльна-значных выданняў.

Побач з гэтым у вывучаемы перыяд існаваў шэраг праблем. Да іх адносяцца: адсутнасць шырокай тэарэтычнай дыскусіі па праблемах сучаснага мастацтва, развітай сістэмы абменных выставак, недастатковая праца з маладымі кадрамі, удасканаленне сістэмы папаўнення калекцый сучаснага выяўленчага мастацтва, фарміраванне ў насельніцтва мастацкага густу, неразвітасць артрынку, сацыяльная неабароненасць творцаў.

Значныя змены адбыліся ў сферах, звязаных з захаваннем *гісторыка-культурнай спадчыны*. У краіне здзяйснялася праца па выяўленні і пастаноўцы на ўлік аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, вяліся пошукі аптымальнай мадэлі кіравання сферай аховы спадчыны. Аб малой эфектыўнасці апошняй сведчылі шматлікія выпадкі парушэнняў ахоўнага заканадаўства. Відавочнай была недастатковая кампетэнцыя ўпаўнаважаных асоб на месцах. Адмоўны ўплыў на захаванасць рухомых аб’ектаў спадчыны аказвала адсутнасць кадраў рэстаўратараў.

Значныя намаганні дзяржавы былі накіраваны на ўдасканаленне праблемы захавання архіўнай спадчыны. У краіне адбылося істотнае павелічэнне колькасці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзяржаўных архіўных устаноў. Даследчыкі атрымалі магчымасць доступу да рассакрэчаных дакументаў. Новым напрамкам камплектавання дзяржаўных архіваў у вывучаемы перыяд стаў прыём дакументаў арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці і грамадскіх арганізацый.

Цяжкасці сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі прывялі да скарачэння аб'ёмаў бібліятэчнага фонду публічных бібліятэк, праблемы з бібліятэчным абслугоўваннем сельскіх жыхароў, немагчымасці ў поўным аб'ёме вырашыць пытанні матэрыяльна-тэхнічнага стану, замацавання кадраў.

Побач са скарачэннем бібліятэк істотнае змяніўся характар іх узаемадзеяння з разнастайнымі сацыяльнымі групамі. Асобныя бібліятэкі пераўтварыліся ў сучасныя інфармацыйна-культурныя ўстановы, інфармацыйныя цэнтры, цэнтры сацыяльных і адукацыйных ініцыятыў, культуры вольнага часу.

У першай палове 1990-х гг. побач з істотным павелічэннем колькасці музеяў і філіялаў назіралася значнае падзенне колькасці наведвальнікаў. У гэты час шмат якія музеі вымушаны былі перагледзець метадалагічныя і канцэптуальныя асновы дзейнасці. Яшчэ адной асаблівасцю дадзенага перыяду стала перадача царкве культавых помнікаў, у якіх размяшчаліся да гэтага музеі. У гэты ж час пачалося стварэнне сеткі мемарыяльных музеяў, звязаных з вядомымі дзеячамі навукі і культуры Беларусі, развіццё музеяў-тэрыторый (сядзібных комплексаў, музеяў-запаведнікаў і інш.). З атрыманнем незалежнасці ў Беларусі пачалося фарміраванне ўласнай музеялагічнай школы.

У XXI ст. значна ўзраслі патрабаванні да музеяў з боку наведвальнікаў. Музеі па-ранейшаму былі недастаткова ўцягнуты ў сферу культурнага турызму, слаба развівалі сваю маркетынгавую палітыку ва ўмовах канкурэнцыі.

З ахова культурнай спадчыны непарыўна звязаны культурны турызм. Праведзены аналіз дазволіў выдзеліць тры перыяды ў развіцці галіны турызму – 1991–1995 гг. (да стварэння асобнага міністэрства), 1996–1999 гг. (да прыняцця першай праграмы развіцця галіны) і 2000–2008 гг. (прыняцце першай праграмы развіцця галіны). На першым этапе турыстычныя прадпрыемствы развіваліся ва ўмовах свабоднай канкурэнцыі. На другім этапе быў узяты курс на ўзмацненне ролі дзяржавы ў рэгуляванні дадзеным сектарам. На трэцім этапе адбывалася ўдасканаленне сістэмы дзяржаўнага кіравання галіной. У гэты час усё больш увагі надавалася праблемам павелічэння колькасці і якасці ўнутранага і ўязнога турызму.

Асобны напрамак культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь ўтварала *знешняя культурная* дзейнасць. Знешняя культурная палітыка з'яўлялася адным з напрамкаў рэалізацыі задач знешнепалітычнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь, накіраванай на забеспячэнне спрыяльных знешніх умоў для развіцця краіны, фарміраванне яе станоўчага вобразу, папулярызацыю ведаў і пошуку новых шляхоў для дзейснага супрацоўніцтва, умацаванне міжнародных пазіцый краіны і яе міжнароднага аўтарытэту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Знешняя культурная палітыка ў вывучаемы перыяд рэалізоўвалася праз комплекс мер, якія прымаліся дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі па пашырэнні культурнага абмену, захаванні, развіцці і распаўсюджанні культурных каштоўнасцей, падтрымцы суайчыннікаў за мяжой і беларускай дыяспары шляхам выкарыстання арганізацыйна-прававых, фінансава-матэрыяльнага, кадравага і інфармацыйнага механізмаў.

Культурныя кантакты развівалася як на двухбаковым, так і на шматбаковым узроўнях. Пастаянным і трывалым было супрацоўніцтва з Расіяй, Літвой, Кітаем, Польшчай, дзейнасць у ЮНЕСКА і СНД. Пашырылася трансгранічнае і рэгіянальнае супрацоўніцтва. Беларусь здолела пашырыць колькасць аб'ектаў, унесеных у спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, а таксама ў рэгістр аб'ектаў дакументальнай спадчыны ЮНЕСКА «Памяць свету».

Больш плённым кантактам і рэалізацыі сумесных планаў побач з недастатковым фінансаваннем перашкаджала вызначэнне ў якасці адказнага за рэалізацыю знешняй культурнай палітыкі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, якое не мела належнай кампетэнцыі і кадраў. Адным з істотных пытанняў міжнароднага культурнага супрацоўніцтва, якое паўстала з развалам СССР, было вяртанне гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Практыка паказала, што знешняя культурная палітыка патрабуе тэарэтычнай распрацоўкі і падрыхтоўкі спецыялістаў. Культура з'яўляецца камерцыйным прадуктам. Таму садзейнічанне яе прасоўванню на замежны рынак павінна абапірацца на папярэднія сацыялагічныя даследаванні і маркетынгавыя рашэнні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

1. «Апгрэйд» Свядомасці супраць уцечкі «залатога запасу» // Культура. – 2009. – 5–11 лістап. – С. 4–5.

2. «Дагнаць і перагнаць» Каны або выпрацаваць уласную канцэпцыю // Культура. – 2009. – 19–25 снеж. – С. 6.

3. «Нёману» – глубокое течение [Итервью В. Дашкевича с главным редактором «Нёмана» Н. Чайкой] // Белорусская нива. – 2006. – 1 дек. – С. 3.

4. 13 чэрвеня Маладзечна прыме традыцыйны фестываль нацыянальнай песні і паэзіі «Маладзечна-2009» // Афіц. сайт Белтэлерадыёкампаніі [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступу: http://www.tvr.by/bel/culture.asp?id=11979.

5. ІІ Няфёдаўскія чытанні. З подзвігам у сэрцы: тэма Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім мастацтве XX – пачатку XXI стагоддзя: зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-творчай канф., Мінск, 24–25 сак. 2005 г. – Мінск: БДАМ, 2005. – 212 с.

6. А справа зусім не ў рэанімацыі… Што засталося ад дзяржэкспедыцыі? // Культура. – 2003. – 1–7 сак. – С. 4.

7. Аб аўтэнтычным фальклорным гурце ў Рэспубліцы Беларусь: палажэнне М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 30 крас. 1999 г. // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 1999. – № 44. – 8/361.

8. Аб аўтэнтычным фальклорным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь: пастанова М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 11 крас. 2008 г., № 13 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2008. – 8/18715.

9. Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь: Закон Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2006 г., № 98-З // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2006. – № 9. – 2/1195.

10. Аб выніках працы па аптымізацыі структуры спецыяльнасцей па ступенях адукацыі, унясенню зменаў у агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь «Спецыльнасці і кваліфікацыі»: рашэнне Прэзідыума рэспубліканскага савета рэктараў вышэйшых навучальных установ, 9 лістап. 2006 г., № 4 // Рэсп. савет рэктараў навуч. установ [Электронны рэсурс]. – 2007. – Рэжым доступу: http://srrb.niks.by/info/resh09_10_06_4.htm.

11. Аб выніках тэатральнага сезона 1995–1996 гг. у драматычных тэатрах рэспублікі: рашэнне калегіі М-ва культуры Рэсп. Беларусь ад 24 кастр. 1996 г. № 7, п. 2 // Асноўныя службовыя дакументы. – 1996. – 2-е паўгоддзе / Нац. б-ка Беларусі. – 1996. – С. 6–13.

12. Аб дзяржаўнай падтрымцы нацыянальнай кінематаграфіі: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 29 верас. 1993 г., № 647 // Збор пастаноў урада Рэсп. Беларусь. – 1993. – № 26–27. – Арт. 531.

13. Аб зацвярджэнні інструкцыі аб парадку стварэння і адкрыцця музеяў і іх экспазіцый: загад М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 18 ліп. 1997 г., № 206 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 1999. – 9/1970.

14. Аб зацвярджэнні Палажэння аб Нацыянальнай выстаўцы твораў народнага мастацтва: пастанова М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 8 чэрв. 2000 г., № 12 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2000. – № 60. – 8/3617.

15. Аб зацвярджэнні Палажэння аб парадку прысваення звання «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь»: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 15 крас. 1998 г., № 600 // Збор дэкрэтаў, указаў Прэзідэнта і пастаноў Урада Рэсп. Беларусь. – 1998. – № 11. – Арт. 305.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. Аб зацвярджэнні Палажэння аб экспертнай камісіі па народнаму мастацтву, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь: пастанова М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 13 снеж. 2000 г., № 27 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2001. – № 12. – 8/4690.

17. Аб зацвярджэнні Парадку рассылкі абавязковых бясплатных і платных экзэмпляраў друкаваных выданняў: пастанова Кабінета Міністраў Рэсп. Беларусь, 24 чэрв. 1996 г., № 419 // Собр. указов Президента и постановлений Кабинета Министров Респ. Беларусь. – 1996 г. – № 18. – Ст. 444.

18. Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку камплектавання музейных фондаў, унутрымузейнага ўліку, навуковай апрацоўкі і захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў і Палажэння аб фондава-закупачнай камісіі музея: пастанова М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 1 лістап. 2007 г., № 44 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2008 г. – № 54. – 8/18050.

19. Аб зацвярджэнні Палажэння аб мерах па рэалізацыі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18 кастр. 2007 г., № 527: пастанова М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 14 снеж. 2007 г., № 50 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2008. – № 29. – 8/17815.

20. Аб зацвярджэнні Палажэння аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 10 чэрв. 2006 г., № 730 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2006. – № 93. – 5/22433.

21. Аб зацвярджэнні Палажэння аб народным (узорным) непрафесійным (аматарскім) калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь: пастанова М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 6 лістап. 2008 г., № 38 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2008. – № 302. – 8/19882.

22. Аб зацвярджэнні Палажэння аб правядзенні рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія»: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 29 верас. 2010 г., № 1404 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2010. – 5/32560.

23. Аб Камісіі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 16 студз. 2009 г., № 43 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2009. – № 19. – 5/29151.

24. Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь: Закон Рэсп. Беларусь, 4 чэрв. 1991 г., № 832-XII // Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. – 1991. – № 20. – Арт. 291.

25. Аб мерах па развіцці і захаванні самабытнасці беларускай прафесійнай мастацкай творчасці і нацыянальнай мастацкай школы ва ўмовах экспансіі заходняй масавай культуры: аналіт. запіска / Р. Смольскі (кір. творчага калектыву). – Мінск: б. в., 2006. – 132 с.

26. Аб музеях і Музейным фондзе: Закон Рэсп. Беларусь, 12 снеж. 2005 г., № 70-З // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2005. – № 197. – 2/1167.

27. Аб наданні статусу і катэгорый гісторыка-культурнай каштоўнасці і ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г., № 578: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 3 верас. 2008 г., № 1288 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2008. – № 222. – 5/28291.

28. Аб народным (узорным) самадзейным калектыве мастацкай творчасці ў Рэспубліцы Беларусь: палажэнне М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 5 мая 1999 г. // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 1999. – № 44. – 8/373.

29. Аб народным мастацтве, народных промыслах (рамёствах) у Рэспубліцы Беларусь: Закон Рэсп. Беларусь, 9 ліп. 1999 г., № 282-З // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 1999. – № 56. – 2/62.

30. Аб некаторых мерах па ўдасканаленню сістэмы органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы аховы і рэстаўрацыі гісторыка-культурнай спадчыны: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 8 чэрв. 2001 г., № 862 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь, 2001 г. – № 59. – 5/6195.

31. Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 15 чэрв. 2006 г., № 762 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2006. – № 103. – 5/22474.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

32. Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны: Указ Прэзідэнта Рэсп. Беларусь, 18 кастр. 2007 г., № 527 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2007. – № 252. – 1/9038.

33. Аб некаторых пытаннях стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 19 верас. 2008., № 1372 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2008. – № 235. – 5/28395.

34. Аб прыярытэтных напрамках дзяржаўнай культурнай палітыкі на 1997–2000 гг.: рашэнне калегіі М-ва культуры Рэсп. Беларусь ад 27 лістап. 1996 г., № 8, п. 1 // Асноўныя службовыя дакументы. – 1996. – 2-е паўгоддзе / Нац. б-ка Беларусі. – 1996. – С. 15–18.

35. Аб рэалізацыі асноўных кірункаў дзейнасці публічных бібліятэк Беларусі: рашэнне калегіі М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 29 кастр. 1998, № 9, п. 1 // Асноўныя службовыя дакументы. – 1998. – 2 паўгоддзе / Нац. б-ка Беларусі. – 1998. – С. 13–17.

36. Аб рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі па драматургіі: загад М-ва культуры Рэсп. Беларусь, 27 снеж. 1996 г., № 331 // Асноўныя службовыя дакументы. – 1996. – 2-е паўгоддзе / Нац. б-ка Рэсп. Беларусь. – 1996. – С. 129–132.

37. Аб рэпертуарна-творчай дзейнасці драматычных тэатраў Беларусі і выніках работы за 1994 год: рашэнне калегіі М-ва культуры і друку Рэсп. Беларусь ад 14 сак. 1995 г., № 3, п. 1 // Асноўныя службовыя дакументы. – 1995. – 1-е паўгоддзе / Нац. б-ка Беларусі. – 1995. – С. 19–26.

38. Аб Рэспубліканскім грамадскім савеце па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь: пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 24 лістап. 2010 г., №1719 // Нац. рэестр прававых актаў Рэсп. Беларусь. – 2010. – № 288. – 5/32896.

